Праваабарончы цэнтр «Вясна»

# Агляд-Хроніка

## парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2005 годзе

Менск 2006

© Праваабарончы цэнтр «Вясна», 2006

## **УСТУП:** асноўныя тэндэнцыі і абагульненьні

У 2005 годзе ў Беларусі назіралася значнае пагаршэньне агульнага становішча ў сферы правоў чалавека. Аб'ектам парушэньня сталі правы і свабоды як грамадзянскага і палітычнага шэрагу, так і сацыяльна-эканамічныя і культурныя правы. Гэтыя парушэньні носяць сістэмны характар, абумоўлены сьвядомай палітыкай дзяржаўнай улады і яе вышэйшых кіраўнікоў, уключна з прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам. Пры гэтым парушэньні правоў чалавека зьяўляюцца ня столькі пабочным эфектам аўтарытарнага дзяржаўнага панаваньня, сколькі выкарыстоўваюцца ўладамі сьвядома як інструмент барацьбы з палітычнымі апанентамі і як сродак нагнятаньня ў грамадстве атмасферы страху.

Негатыўная дынаміка характарызуецца павелічэньнем выпадкаў парушэньня правоў чалавека, зафіксаваных праваабаронцамі і, адпаведна, ростам колькасьці ахвяраў парушэньня правоў чалавека альбо дыскрымінацыі. У беларускіх умовах пры высокай латэнтнасьці парушэньняў правоў чалавека і пры павелічэньні прыхаванасьці гэтых фактаў, пры надзвычайных складанасьцях праваабарончай дзейнасьці разам з агульным страхам, што пануе ў грамадстве, гэткае павелічэньне паказчыкаў сьведчыць пра драматычнае ўзмацненьне жорсткасьці беларускага рэжыму.

Акрамя павелічэньня колькасьці зафіксаваных фактаў парушэньня правоў чалавека варта адзначыць і пашырэньне новых формаў, абумоўленых, часьцей за ўсё, удасканаленьнем рэпрэсіўнай машыны дзяржавы, павелічэньнем заканадаўчых абмежаваньняў і ўзмацненьнем ідэалагічнага і адміністрацыйнага кантролю над грамадзкім жыцьцём і індывідамі. Назіралася паглыбленьне канфлікту паміж дзяржаўнай уладай і індывідам, узрастала ўмяшальніцтва дзяржавы ў прыватнае жыцьцё грамадзянаў, узмацніўся ціск і рэпрэсіі супраць палітычных апанентаў дзеючай улады. Асабліва істотна дзяржава ўмешвалася ў сферу свабоды меркаваньняў, у тым ліку ў сферу свабоды слова, а таксама ў сферу свабоды мірных сходаў і аб'яднаньняў. Надзвычай распаўсюджанымі сталі парушэньні правоў чалавека, зьвязаныя з дыскрымінацыяй па палітычных, нацыянальных і рэлігійных прыкметах, з

выкарыстаньнем прадстаўнікамі ўладаў гвалту, а таксама з катаваньнямі і іншымі прыніжаючымі чалавечую годнасьць спосабамі ўзьдзеяньня. Засталася нявырашанай праблема зьнікненьня вядомых людзей. У краіне існуе і выконваецца сьмяротнае пакараньне.

Негатыўнае ўзьдзеяньне парушэньняў правоў чалавека на грамадзтва ўзрастае праз адсутнасьць эфектыўных механізмаў аднаўленьня парушаных правоў: у Беларусі адсутнічае незалежны і справядлівы суд, падпарадкаваны выключна закону; незалежныя медыі знаходзяцца на мяжы зьнішчэньня; адсутнічаюць пасады ўпаўнаважанага па правах чалавека і іншыя інстытуцыі прававой дзяржавы. У нацыянальнай прававой сістэме не выконваецца прынцып законнасьці: акты, якія выдаюцца прэзідэнтам, маюць большую юрыдычную сілу, чым законы. Гэта выводзіць дзяржаўны апарат з поля закону, а таксама дазваляе легітымізаваць абсалютна любыя незаконныя захады супраць чалавека з боку дзяржаўнай улады, стварае ўмовы для свавольства адной асобы.

Трэба падкрэсьліць, што беларускі ўрад перайшоў да поўнага адмаўленьня каштоўнасьцяў правоў чалавека. Яны больш не зьяўляюцца для дзяржаўнай улады тым асьпектам, які трэба ўлічваць пры выпрацоўцы дзяржаўнай палітыкі. Крытыка з боку праваабаронцаў на нацыянальным узроўні ўладамі абсалютна не ўспрымаецца, а самі праваабаронцы і праваабарончыя структуры  падпадаюць пад рэпрэсіі. Крытыка з боку праваабаронцаў на міжнародным узроўні (з боку міжнародных арганізацыяў і іншых дзяржаваў, а таксама з боку міжнародных і замежных няўрадавых арганізацыяў) успрымаецца як праяўленьне палітычнага ціску на рэжым прэзідэнта Лукашэнкі, элемент інфармацыйнай вайны супраць беларускай дзяржавы. У сваю чаргу, разам з абвінавачаньнем у палітыцы “падвойных стандартаў” беларускі рэжым актыўна выкарыстоўвае на міжнароднай арэне рыторыку правоў чалавека з мэтай абвінавачаньня Злучаных Штатаў і краінаў Эўропы ў парушэньні правоў чалавека ў сваіх уласных краінах. Ва ўмовах міжнароднай ізаляцыі Беларусі гэткая палітыка прыводзіць Беларусь да хаўрусу з іншымі дыктатарскімі дзяржавамі-ізгоямі.

Лагічным наступствам зьяўляецца імкненьне да  ізаляцыі. У дачыненьні да сусьветнай сістэмы правоў чалавека гэта праяўляецца ў выглядзе ігнараваньня міжнародных нормаў і стандартаў, у адкрытай адмове ад міжнародных і міждзяржаўных механізмаў абароны правоў чалавека. Беларускі ўрад сістэматычна не выконвае тыя абавязацельствы, якія Рэспубліка Беларусь узяла на сябе праз падпісаньне адпаведных міжнародных дамоваў, дэманструецца непрыняцьце высноваў Камісіі па правах чалавека Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў і Камітэту па правах чалавека. Непадпарадкаваньне нормам Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, невыкананьне рашэньняў Камітэту па правах чалавека ААН па зваротах грамадзянаў Беларусі, непрадстаўленьне чарговых справаздачаў па выкананьні Пакту сьведчаць пра тое, што Беларусь фактычна выходзіць з сістэмы міжнароднай абароны правоў чалавека Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў.

## Пашырэньне заканадаўчай базы для палітычных рэпрэсіяў

У 2005 годзе ў заканадаўства Рэспублікі Беларусь былі ўнесеныя шэраг зьменаў, якія яшчэ больш абмежавалі правы і свабоды грамадзянаў. Зьмененае заканадаўства пра палітычныя партыі, грамадзкія аб'яднаньні і фонды. Унесеныя зьмены ў заканадаўства пра адукацыю, а таксама абмежаваныя магчымасьці моладзі і некаторых іншых катэгорыяў людзей на выезд за мяжу на навучаньне альбо з іншымі прыватнымі мэтамі. Заканадаўча пашыраныя кампетэнцыі сьпецслужбаў і асабліва Камітэту дзяржаўнай бясьпекі, а таксама межы выкарыстаньня сьпецыяльных сродкаў і зброі. Уведзены ў дзеяньне дазвол аператыўным службам пранікаць у жытло грамадзяніна ці ў офіс арганізацыі, нават замежнай, ня маючы санкцыі пракуратуры. Усталяваная адказнасьць за разгалошваньне зьветак пра супрацоўнікаў Камітэту дзяржаўнай бясьпекі, якія негалосна працуюць у арганізацыях, аб'яднаньнях і ўстановах.

Найбольш істотным стала ўнясеньне зьменаў у Крымінальны кодэкс, якімі ўсталяваная адказнасьць за праявы палітычнай і грамадзкай актыўнасьці. 25 лістапада ў першым чытаньні і 2 сьнежня ў другім чытаньні Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прыняла папраўкі ў Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы, якія ўзмацнілі адказнасьць "за справы, накіраваныя супраць чалавека і грамадзкай бясьпекі". Законапраект быў унесены ў парламент ад імя прэзідэнта з адзнакай "тэрмінова" – ягоны разгляд адбываўся ў паскораным парадку, з вялікім розгаласам сярод беларускай і сусьветнай грамадзкасьці.

Крымінальны кодэкс дапоўніўся шэрагам новых артыкулаў. Норма артыкулу 193-1 прадугледжвае, што арганізацыя дзейнасьці альбо ўдзел у дзейнасьці арганізацыяў і фондаў, у адносінах да якіх уступіла ў сілу рашэньне аб прыпыненьні іх дзейнасьці альбо закрыцьці, караецца штрафам альбо арыштам на тэрмін да шасьці месяцаў, альбо пазбаўленьнем волі на тэрмін да двух гадоў. Ва ўмовах, калі значная колькасьць няўрадавых арганізацыяў Беларусі пазбаўленая рэгістрацыі, а атрымаць афіцыйны статус для незалежнай ад уладаў грамадзкай структуры практычна немагчыма, гэтая норма аўтаматычна запісвае ў злачынцы тысячы беларускіх грамадзянаў. Асоба, якая добраахвотна спыніла ўдзел у такой арганізацыі і заявіла аб гэтым адпаведным дзяржаўным органам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасьці, калі ў яе дзеяньнях няма складу іншага злачынства. У артыкул 193 ("Арганізацыя альбо кіраўніцтва грамадзкім аб'яднаньнем, рэлігійнай арганізацыяй, якія пасягаюць на асобу, правы і абавязкі грамадзянаў") уведзеная норма, якая павялічвае памер адказнасьці за гэтае злачынства, калі яно ўчыненае ў форме незарэгістраванай грамадзкай арганізацыі.

Артыкул 293 Крымінальнага кодэксу дапоўнены нормай, згодна з якой за навучаньне альбо іншую падрыхтоўку асобаў для ўдзелу ў масавых беспарадках альбо фінансаваньне падобных справаў чакаецца пакараньне арыштам на тэрмін да шасьці месяцаў альбо пазбаўленьне волі на тэрмін

да трох гадоў. З улікам таго, што дадзены артыкул пра масавыя беспарадкі ўжо ўтрымліваў нормы пра арганізацыю масавых беспарадкаў (частка 1), то гэтая навэла азначае крыміналізацыю тых дзеяньняў, якія фактычна масавымі беспарадкамі не зьяўляюцца і не парушаюць грамадзкі парадак. Існуе вялікая верагоднасьць, што дадзеная норма можа быць выкарыстаная супраць любой адукацыйна-асьветніцкай дзейнасьці, якая, на думку дзяржслужбоўцаў, у перспектыве можа пагражаць устойлівасьці аўтарытарнага рэжыму ў Беларусі. Фармулёўкі, якія ўжываюцца ў дадзеным артыкуле (“навучаньне альбо іншая падрыхтоўка асобаў...”, “фінансаваньне альбо іншае матэрыяльнае забесьпячэньне”), дазваляюць трактаваць гэтую норму адвольным чынам і прыцягваць да адказнасьці нават і без фактычнай наяўнасьці аб’ектыўнай часткі складу злачынства.

Артыкул 342 Крымінальнага кодэксу дапоўнены палажэньнем, што навучаньне альбо іншая падрыхтоўка асобаў для ўдзелу ў групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак (зьвязаныя з непадпарадкаваньнем законным патрабаваньням супрацоўнікаў улады альбо тыя, што выклікалі парушэньне працы транспарту, прадпрыемстваў, установаў альбо арганізацыяў), а таксама фінансаваньне альбо іншае матэрыяльнае забесьпячэньне такой дзейнасьці пры адсутнасьці прыкметаў больш цяжкага злачынства цягне за сабой пакараньне арыштам да шасьці месяцаў альбо пазбаўленьне волі на тэрмін да двух гадоў. Відавочна, што дадзеная навэла ідзе ў пары з папярэдняй нормай артыкулу 293 і стварае магчымасьць прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці тых асобаў, якія вядуць асьветніцкую дзейнасьць у галіне грамадзянскай актыўнасьці. Пад дадзеную норму падпадае палітычная і грамадзянская актыўнасьць, якая відавочна не зьвязаная з арганізацыяй масавых беспарадкаў – акцыі негвалтоўнага супраціву, страйкі, перакрыцьцё транспартных шляхоў, флэшмобы, галадоўкі і інш.

Згодна з новай рэдакцыяй Крымінальнага кодэксу, узмацняецца адказнасьць за публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады альбо гвалтоўнай зьмены канстытуцыйнага ладу (артыкул 361). За гэта прадугледжанае пакараньне ад шасьці месяцаў арышту да пазбаўленьня волі на тэрмін да трох гадоў. Пры гэтым значна пашыраецца аб’ект абароны, які ахоўваецца дадзеным артыкулам, і павялічваецца спектр магчымых сродкаў распаўсюду дадзеных заклікаў: “Публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады альбо гвалтоўнай зьмены канстытуцыйнага ладу, альбо здрады дзяржаве, альбо ўчыненьню тэрарыстычнага акту, альбо дыверсіі, альбо ўчыненьню іншых дзеяньняў на шкоду зьнешняй бясьпекі Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасьці, нацыянальнай бясьпецы і абароназдольнасьці, альбо распаўсюд матэрыялаў, якія ўтрымліваюць гэткія заклікі”. Асабліва караюцца такія заклікі, калі яны зьвернутыя да замежнай дзяржавы, замежнай альбо міжнароднай арганізацыі. Прадугледжанае пакараньне — арышт на тэрмін ад шасьці месяцаў да трох гадоў (калі гэтыя заклікі будуць распаўсюджвацца праз СМІ, пакараньне ўзрасьце — паз-

баўленьне волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў). Відавочна, што вызначэньне злачынных дзеяньняў без канкрэтызацыі магчымых метадаў учыненьня злачынства дазваляе пераўтварыць дадзены артыкул у дзейсны сродак барацьбы са свабодай слова і з палітычнымі апанентамі. Фактычна, любая праява незадаволенасьці дзеючым рэжымам і заклік да зьмяненьня становішча можа быць трактаваны як злачынны.

Крымінальны кодэкс таксама дапоўнены новым артыкулам 369-1 — "Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь". Пад дыскрэдытацыяй разумеецца "прадастаўленьне замежнай дзяржаве, замежнай альбо міжнароднай арганізацыі заведама ілжывай інфармацыі аб палітычным, эканамічным і сацыяльным, ваенным альбо міжнародным палажэньні Рэспублікі Беларусь, прававым палажэньні грамадзян Рэспублікі Беларусь альбо яе органаў улады". За такія дзеяньні прадугледжанае пакараньне арыштам на тэрмін да шасьці месяцаў альбо пазбаўленьнем волі на тэрмін да двух гадоў. Пры наяўнасьці ў Крымінальным кодэксе агульнай адказнасьці за паклёп, новая норма можа прымяняцца фактычна выключна супраць палітычных апанентаў.

Праваабаронцы Беларусі расцанілі папраўкі ў крымінальнае заканадаўства як "законнае" абгрунтаваньне для ажыцьцяўленьня крымінальнага перасьледу апанентаў дзеючай улады, разьвязваньне рук сілавым структурам і адкрыты шлях да масавых рэпрэсіяў у Беларусі.

Законапраект "Аб супрацьдзеяньні экстрэмізму", распрацаваны і ўнесены на разгляд Камітэтам дзяржаўнай бясьпекі Беларусі, які ў 2005 годзе быў прыняты Палатай прадстаўнікоў у першым чытаньні і рыхтуецца да другога чытаньня, утрымлівае яшчэ больш жорсткія меры, што могуць быць ужытыя ў дачыненьні да іншадумцаў. Згодна з законапраектам, прафілактыку праяваў экстрэмізму будуць ажыцьцяўляць органы пракуратуры, Міністэрства юстыцыі, КДБ і іншыя дзяржаўныя органы. Яны будуць выносіць афіцыйныя папярэджаньні арганізацыям і грамадзянам аб недапушчальнасьці "экстрэміцкай дзейнасьці".

Адначасова адбылася фактычная дэкрыміналізацыя карупцыі – заканадаўча ўсталяванае вызваленьне ад крымінальнай адказнасьці асобаў, якія ўчынілі эканамічныя злачынствы і добраахвотна кампенсавалі нанесеныя страты. У 2005 годзе вялікі грамадзкі розгалас атрымаў выпадак з кіраўніком упраўленьня справамі прэзідэнта Галінай Жураўковай, якую суд прызнаў вінаватай у выкраданьні з дзяржаўнай казны больш як мільёна даляраў. За гэтыя злоўжываньні спадарыня Жураўкова была асуджаная на чатыры гады зьняволеньня з канфіскацыяй маёмасьці, але Аляксандр Лукашэнка памілаваў яе пасьля ўступленьня прысуду ў законную сілу.

Такім чынам, на працягу 2005 году ўдасканальваўся механізм рэпрэсіяў, уведзеныя цалкам законныя падставы для палітычнага перасьледу і крымінальнага зьняволеньня апанентаў улады напярэдадні значных палітычных кампаніяў. Адначасова лаяльнай да рэжыму эліце дадзеныя знакі таго, што ўчыненыя злачынствы могуць застацца без пакараньня пры захаваньні палітычнай адданасьці рэжыму.

## Перасьлед іншадумцаў і палітычных апанентаў

У 2005 годзе ў Беларусі павялічылася колькасьць палітычных зьняволеных. За кратамі заставаліся Міхаіл Марыніч, Валерый Леванеўскі (асуджаныя ў 2004 годзе), у 2005 годзе асуджаны да пазбаўленьня волі Сяргей Скрабец, да абмежаваньня волі з высылкай ў аддаленыя раёны асуджаныя Мікола Статкевіч, Павел Севярынец і Андрэй Клімаў. Палітзьняволеныя Юры Бандажэўскі і Аляксандр Васільеў вызваленыя з-за кратаў дзякуючы амністыі.

У жніўні 2005 году выйшаў на волю былы рэктар Гомельскага медыцынскага ўніверсітэту прафесар Юры Бандажэўскі, асуджаны на 8 гадоў калоніі па абвінавачаньні ў хабарніцтве. Па меркаваньні праваабаронцаў, рэпрэсіі супраць навукоўцы былі выкліканыя тым, што вынікі ягоных дасьледаваньняў разыходзіліся з пазіцыяй афіцыйнай медыцыны адносна наступстваў Чарнобыльскай катастрофы.

На волю таксама выйшаў адзін з лідэраў прадпрымальніцкага руху Беларусі Аляксандр Васільеў, асуджаны разам з Валерыем Леванеўскім да двух с паловай гадоў зьняволеньня за абразу прэзідэнта Лукашэнкі. Амністыя не была выкарыстаная ў дачыненьні да Леванеўскага, які працягвае адбываць пакараньне.

Працягвае знаходзіцца за кратамі экс-міністр зьнешнеэканамічных сувязяў, Надзвычайны і Паўнамоцны Амбасадар Рэспублікі Беларусь Міхаіл Марыніч. 30 снежня 2004 года ён быў асуджаны на 5 гадоў пазбаўленьня волі з канфіскацыяй маёмасьці па абвінавачаньні ў прыўлашчаньні камп'ютараў амбасады ЗША. Нягледзячы на тое, што амбасада Злучаных Штатаў ня мела прэтэнзіяў да спадара Марыніча – гэта было высьветлена і падчас папярэдняга сьледзтва, і пацьверджана на судзе ў адмысловай заяве Дзяржэпартаменту Злучаных Штатаў, суд прызнаў М. Марыніча вінаватым ва ўчыненьні крымінальнага злачынства, прадугледжанага артыкулам 210 Крымінальнага кодэксу, ч. 4 “Крадзёж шляхам выкарыстаньня службовага становішча ў асабліва буйным памеры”. Увесь ход сьледзтва і судовага разгляду дадзенай справы сьведчыў пра тое, што крымінальны перасьлед і асуджэньне Міхаіла Марыніча выкліканыя ягонай грамадзянскай пазіцыяй і актыўнай палітычнай дзейнасьцю. Калегія Менаблсуда скасавала тэрмін пазбаўленьня волі Марынічу да 3,5 гадоў, улічваючы яго папярэднія заслугі перад дзяржавай, узрост і стан здароўя. У сакавіку Міхаіл Марыніч перанёс інсульт у Аршанскай калоніі ўзмоцненага рэжыму. Толькі дзякуючы патрабаваньням беларускай і міжнароднай грамадзкасьці, хворага вязьня перавялі ў рэспубліканскі турэмны шпіталь у Менску, а пасьля замянілі месца адбываньня пакараньня на менскую калонію УЖ 15/1.

Відавочным прыкладам палітычнай расправы зьяўляецца крымінальны перасьлед дэпутата Палаты прадстаўнікоў другога скліканьня, кіраўніка парламенцкай групы “Рэспубліка” Сяргея Скрабца. Прадчуваючы перасьлед з боку беларускіх уладаў за палітычную дзейнасьць, экс-дэпутат зьвяртаўся да прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна з просьбаю аб палітычным пры-

тулку, але ягоная просьба не была задаволеная. У траўні Сяргею Скрабцу прад'явілі абвінавачаньне паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэксу — ч. 1, арт. 13 (падрыхтоўка да злачынства) і ч. 2. арт. 431 (даваньне хабару): нібыта палітык зьбіраўся даць хабар супрацоўнікам пракуратуры і суда за вынясеньне апраўдальнага прысуду па справе аднаго свайго знаёмага. Падчас папярэдняга сьледзтва Сяргей Скрабец заявіў пра намер балатавацца на прэзідэнцкіх выбарах 2006 году – ягоная ініцыятыўная група была зарэгістраваная Цэнтральнай камісіяй па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэферэндумаў, але не набрала неабходнай для вылучэньня колькасьці подпісаў грамадзянаў. Беларускія праваабаронцы перакананыя, што сапраўдныя прычыны ізаляцыі С.Скрабца — палітычныя.

У 2005 годзе абвінавачаньне ва ўчыненьні крымінальнага злачынства было прад'яўленае Андрэю Клімаву — дэпутату Вярхоўнага Савету 13 скліканьня, аднаму з ініцыятараў імпічменту А.Лукашэнку ў 1996 годзе, бізнэсоўцы. У чэрвені апазіцыйнага палітыка пакаралі абмежаваньнем волі на паўтары гады за арганізацыю дэманстрацыі 25 сакавіка, якая праходзіла пад лозунгамі адстаўкі Аляксандра Лукашэнкі. Андрэю Клімаву таксама было прад'яўленае абвінавачаньне ў паклёпе на прэзідэнта, аднак справа была спыненая.

У траўні суд Цэнтральнага раёну сталіцы вынес прысуды Міколу Статкевічу (старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада)) і экс-кіраўніку "Маладога Фронту" Паўлу Севярынцу — па тры гады абмежаваньня волі. Іх прызналі вінаватымі ў арганізацыі несанкцыянаваных вулічных акцыяў пратэсту супраць сфальсіфікаваных вынікаў парламенцкіх выбараў і рэферэндуму 18 і 19 кастрычніка 2004 году ў Менску. П.Севярынец і М.Статкевіч за гэтую акцыю ўжо прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе 15 і 10 сутак арышту, але калі па факце несанкцыянаванай дэманстрацыі была ўзбуджаная крымінальная справа, палітыкі апынуліся ў якасьці абвінавачваемых.

Адсутнасьць аб'ектыўнай і незалежнай судовай сістэмы (усе судзьдзі ў краіне прызначаюцца прэзідэнтам і могуць быць звольненыя са сваіх пасадаў прэзідэнтам) робіць магчымым выкарыстаньне падобных механізмаў крымінальнага перасьледу дзеля барацьбы з палітычнымі апанентамі дзеючага рэжыму. Таксама пагроза крымінальнага перасьледу, асабліва па артыкулах Крымінальнага кодэксу 367 "Паклёп на прэзідэнта", 368 "Зьнявага прэзідэнта" і 369 "Зьнявага прадстаўніка ўлады", выкарыстоўваецца супраць крытыкаў існуючага рэжыму – праваабаронцаў, журналістаў, апазіцыйных палітыкаў. У 2005 годзе зафіксавана некалькі выпадкаў выкарыстаньня гэтых артыкулаў.

Сярод справаў па аналагічных абвінавачаньнях у 2005 годзе вылучаецца крымінальны перасьлед стваральнікаў анімацыйных фільмаў, у якіх высьмейвалася асоба беларускага дыктатара. Сябры грамадзянскай ініцыятывы "Трэці шлях" стварылі мультклуб і распаўсюджвалі свае творы праз Інтэрнэт. Менская пракуратура па гэтым факце распачала крымінальную справу за

зьнявагу Аляксандра Лукашэнкі. Супрацоўнікі КДБ, якія ўвайшлі ў сьледчую групу, правялі ператрусы на кватэрах сяброў мультклубу ў Менску і Гародні, сканфіскавалі больш за дзесяць кампутараў і ўсе носьбіты інфармацыі. Да канца году гэтая справа яшчэ не была завершаная, аднак некаторыя са стваральнікаў анімацыяў атрымалі палітычны прытулак за мяжой.

Крымінальны перасьлед ужываўся да прадстаўнікоў дэмакратычна абранага кіраўніцтва “Саюзу палякаў на Беларусі” падчас надзвычай моцнага ціску на гэтую арганізацыю. Па надуманых падставах аператыўна-сьледчыя дзеяньні ажыцьцяўляліся ў дачыненьні да кіраўніцы “Саюзу палякаў на Беларусі” Анжалікі Борыс, намесьніка старшыні Веслава Кеўляка, рэдактара газеты “Glos z nad Niemna” Анджэя Пісальніка, рэдактара “Magazyna Polskiego” Андрэя Пачобута.

Гучны розгалас атрымаў крымінальны перасьлед ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча, які зьвязваюць з ягонай актыўнасьцю як лідэра прадпрымальніцкага руху на Гарадзеншчыне. Справа супраць яго вядзецца паводле часткі 2 артыкулу 243 Крымінальнага кодэксу, што датычыць ухіленьня ад уплаты падаткаў, якое нанесла страты ў асабліва буйным памеры. Мікалай Аўтуховіч у знак пратэсту супраць ілжывых абвінавачаньняў 72 дні за кратамі трымаў галадоўку пратэсту.

У 2005 годзе ўзбуджана некалькі крымінальных справаў за графіці палітычнага зьместу. Такія справы зьяўляюцца ня толькі відам крымінальнага перасьледу апазіцыйнай моладзі, але і фармальнай падставай для правядзеньня вобыскаў у кватэрах грамадзкіх актывістаў і офісах грамадзкіх арганізацыяў, для допытаў і іншых сьледчых дзеяньняў.

У Беларусі дзеючая ўлада шырока выкарыстоўвае сродкі адміністрацыйнага перасьледу ў барацьбе са сваімі палітычнымі апанентамі. Па-ранейшаму актыўна выкарыстоўваюцца арышты, фізічная сіла і сьпецыяльныя сродкі супраць удзельнікаў мірных дэманстрацыяў. Найбольшая колькасьць мірных дэманстрантаў была затрыманая ў 2005 годзе падчас акцыяў у Дзень Волі 25 сакавіка і падчас “Чарнобыльскага шляху” 26 красавіка ў Менску. Падчас акцыі 26 красавіка, прысьвечанай чарговым угодкам Чарнобыльскай катастрофы, былі затрыманыя і асуджаныя ня толькі грамадзяне Беларусі, але і Украіны і Расіі. Суды па дадзеных справах выносяць выключна рашэньні пра арышт альбо штаф у вялікім памеры, зьнікла практыка вынясеньня папярэджаньняў і спыненьня вытворчасьці па справах за адсутнасьцю складу правапарушэньня, суды па гэтай катэгорыі справаў часта зьяўляюцца ўсяго толькі фармальнасьцю.

Падчас мірных акцыяў праваахоўныя органы часта выкарыстоўваюць неабгрунтавана жорсткія дзеяньні, катаваньні і зьбіцьцё мірных дэманстрантаў і затрыманых, пры гэтым ніякага пакараньня за свае дзеяньні не нясуць. Так, Сьвятлана Завадзкая падчас акцыі памяці ў пятую гадавіну зьнікненьня яе мужа, журналіста Дзьмітрыя Завадзкага, была зьбітая супрацоўнікам АМАПу Давідовічам. Нягледзячы на тое, што факт зьбіцьця быў падмацаваны відэазапісам, пракуратура і суд адмовіліся прыцягваць да адказнасьці супрацоўніка міліцыі.

Падчас акцыі 16 верасьня траўмы рознай ступені цяжкасьці атрымалі шасьцёра яе ўдзельнікаў. З дыягназам “чэрапна-мазгавая траўма” быў дастаўлены ў бальніцу моладзевы актывіст Мікіта Сасім. Пасьля лячэньня ў стацыянары Сасім накіраваў скаргі на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў праваахоўных органаў у пракуратуру і суд, але ніхто да адказнасьці так і ня быў прыцягнуты.

Асаблівую заклапочанасьць выклікае прыцягненьне да адміністрацыйнай адказнасьці па абвінавачаньні ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве асобаў, якія зьбіраліся ў закрытых памяшканьнях, напрыклад, у кватэрах. Так, арыштам на 15 сутак па такім абвінавачаньні быў пакараны дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі 12-га скліканьня Сяргей Антончык. За правядзеньне “несанкцыянаванага сходу” ў двары ўласнага дому штрафам у памеры 40 базавых велічыняў пакараны актывіст Партыі камуністаў Беларускай Анатоль Новік.

Шырока прымянялася практыка адміністрацыйнага перасьледу ў дачыненьні да сяброў рэлігійных суполак, найперш пратэстанцкіх. Правядзеньне набажэнстваў кваліфікавалася як несанкцыянаваны сход, адпаведна, выносіліся пакараньні ў выглядзе велізарных штрафаў. Неаднаразова да адміністрацыйнай адказнасьці за правядзеньне набажэнстваў прыцягваліся адміністратар Царквы “Новае жыцьцё” Васіль Юрэвіч і пастар Вячаслаў Ганчарэнка.

Шматлікім затрыманьням і пакараньням на працягу году падвяргаліся грамадзяне, якія распаўсюджвалі выданьні з альтэрнатыўнай інфармацыяй. Пры гэтым затрымліваліся як асобы, якія распаўсюджвалі зарэгістраваныя выданьні (напрыклад, газеты “Народня воля”, “Время” і інш.), так і ня маючыя рэгістрацыі Міністэрства інфармацыі. Асабліва шмат па такіх абвінавачаньнях было затрымана і пакарана ў адміністрацыйным парадку моладзевых актывістаў.

Адвольныя арышты і затрыманьні палітычных актывістаў сталі для Беларусі паўсядзённай справай – у 2005 годзе зафіксаваныя сотні такіх выпадкаў. Пры гэтым далёка не заўсёды выконваюцца патрабаваньні працэсуальнага заканадаўства – парушаецца вызначаны законам тэрмін затрыманьня, не складаюцца пратаколы затрыманьня, адбываюцца незаконныя выняткі рэчаў і дакументаў. Правядзеньне вобыскаў бяз санкцыі пракурора органамі міліцыі і КДБ таксама было распаўсюджанай практыкай у сталіцы і ў рэгіёнах.

## Звальненьні і ціск па месцы працы альбо вучобы

Акрамя крымінальнага і адміністрацыйнага перасьледу для барацьбы з палітычнымі апанентамі і іншадумцамі ўлады шырока выкарыстоўваюць пагрозы і дыскрымінацыю па месцы працы альбо вучобы. У 2005 годзе былі пашыраныя выпадкі звальненьня з працы грамадзкіх і палітычных актывістаў альбо шантажаваньне магчымасьцю звальненьня. Наяўнасьць у Беларусі кантрактнай формы найму на дзяржаўныя прадпрыемствы пры ўмовах, калі 80% наёмных супрацоўнікаў працуюць на прадпрыемствах з дзяржаў-

най формай уласнасьці, стварае магчымасьці для палітычнага перасьледу па месцы працы. Гэта пацьвярджаецца фактамі звальненьня, напрыклад, старшыні першаснай арганізацыі Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ) Наваполацкай ЦЭЦ Вадзіма Духоменкі, сяброў Рады СПБ Юрыя Абухова і Юрыя Гайчанкі, старшыні Жлобінскай раённай арганізацыі Партыі камуністаў Беларускай Валерыя Рыбчанкі, актывісткі грамадзкага руху "Разам" Марыі Багдановіч, старшыні суполкі прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасьці Юрася Дарашэнкі, лідэра суполкі Свабоднага прафсаюзу акцыянернага таварыства "Заслаўебурвод" Уладзіміра Феакцістава, дырэктара школы з Горак Леаніда Гаравога, выкладчыка паліталогіі Магілёўскага дзяржаўнага унівэрсітэту Паўла Усава і іншых.

З Нацыянальнай акадэміі навук зволненыя шэраг вядучых навукоўцаў, вядомых сваёй нязгодай з уладнай палітыкай у галіне навукі. Кіраўніцтва Інстытуту гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук адмовілася працягнуць кантракт з вядомымі гісторыкамі Г. Сагановічам, У.Анішчанкам і Андрэем Кіштымавым. Вельмі распаўсюджанымі зьяўляюцца выпадкі ціску на выкладчыкаў і настаўнікаў, нелаяльных да рэжыму Лукашэнкі.

Напрыканцы 2005 году, з пачаткам кампаніі па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, актывізаваўся ціск па месцы працы на тых асобаў, якія выявілі жаданьне працаваць у ініцыятыўных групах апазіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты.

Адлічэньні студэнтаў і навучэнцаў з вышэйшых і сярэдніх навучальных установаў за іх грамадзкую актыўнасьць і перакананьні таксама зьяўляюцца важнай зброяй уладаў у барацьбе з іншадумствам. У 2005 годзе перасьлед па месцы вучобы атрымаў юрыдычнае абгрунтаваньне ў загадзе міністра адукацыі А. Радзькова "Аб мерах па недапушчэньні спробаў уцягваньня навучэнцаў і студэнтаў у супрацьпраўную дзейнасьць палітычнага кшталту". Дакумент, выдадзены для службовага карыстаньня, тлумачыць парадак правядзеньня ідэалагічнай працы са студэнтамі і навучэнцамі вышэйшых і сярэдніх навучальных установаў, а таксама вызначае асабістую адказнасьць кіраўнікоў органаў упраўленьня адукацыі і ўстановаў адукацыі "за факты ўдзелу навучэнцаў і студэнтаў ў несанкцыянаваных мерапрыемствах, супрацьпраўных дзеяньнях". Найбольш важным пунктам дадзенага дакументу зьяўляецца абавязковае правядзеньне службовых расьсьледаваньняў па фактах удзелу навучэнцаў і студэнтаў у несанкцыянаваных мерапрыемствах, якія праводзяцца апазіцыйнымі арганізацыямі. Таксама абавязковым стала прымяненьне "мераў выхаваўчага ўзьдзеяньня аж да адлічэньня ва ўстаноўленым парадку з ліку навучэнцаў і студэнтаў асобаў, якія ўдзельнічаюць у несанкцыянаваных мерапрыемствах, ўчыняюць супрацьпраўныя дзеяньні ў грамадзкіх месцах". Пасьля распаўсюду дадзенага дакументу ў навучальных установах краіны сталі распрацоўвацца ўласныя ўнутраныя дакументы, якія ўтрымліваюць адкрытую дыскрымінацыю па палітычнай прыкмеце. Адначасова ўсталёўваюцца ільготы тым студэнтам і навучэнцам, якія супрацоўнічаюць з праўрадавай моладзевай арганізацыяй "Беларускі рэспубліканскі саюз

моладзі”. Так, згодна з указам прэзідэнта №369 “Аб унясеньні дапаўненьняў ва ўказ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 верасьня 1996 г. №382”, такім актывістам прадугледжваюцца надбаўкі да стыпендыяў.

На працягу году ціск на студэнтаў і навучэнцаў, а таксама адлічэньні з вучобы за іншадумства набылі масавы характар. Так, з апошняга курсу Менскага педуніверсітэту адлічылі актывістку моладзевага руху “Зубр” Ірыну Тоўсьцік. Ідэалагічны прэсінг на студэнтаў аказваўся і на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэту, з-за чаго былі вымушаныя спыніць вучобу шэраг студэнтаў, была адлічаная журналістка Вольга Класкоўская. Гучны розгалас атрымала выключэньне з Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэту студэнткі-выдатніцы Тацяны Хомы. Афіцыйнай прычынай выключэньня адміністрацыя назвала тое, што Тацяна прапусьціла 3 дні заняткаў без дазволу дэканату для ўдзелу ў зьезьдзе Саюзу нацыянальных студэнцкіх аб’яднаньняў Еўропы (ESIB) – буйнейшай еўрапейскай студэнцкай арганізацыі, якая займаецца абаронай правоў і інтарэсаў студэнтаў у Еўропе. З вышэйшых навучальных установаў адлічылі Ігара Шчакарэвіча, Алеся Курсевіча, Яўгена Скрабутана, Алеся Зарэмбюка, Сержука Савіча, Яўгена Валкаўца, Паўла Красоўскага, Артура Фінькевіча, Зьмітра Чарткова і іншых.

За палітычныя перакананьні маладым людзям не даюць нават магчымасьці атрымаць сярэднюю адукацыю — адлічваюць са школаў і вучэльняў. Сержука Мурашку выключылі з Жодзінскага палітэхнікуму, Кірыла Шымановіча – з Менскага юрыдычнага каледжу, Паўла Каранюхіна — з Плешчаніцкай дзяржаўнай вучэльні алімпійскага рэзерву, Алеся Смольскага – з Сувораўскай вучэльні. Навучэнкам жодзінскай Жаночай гімназіі Наталі Максімавай і Вользе Галубец пагражалі адлічэньнем пасьля дзевяці гадоў навучаньня за салідарнасьць з выключанымі моладзевымі актывістамі. У Жодзіне маладыя людзі правялі галадоўку пратэсту супраць палітычных расправаў.

Актыўна ўжываўся супрацьзаконны ціск з боку Камітэту дзяржаўнай бясьпекі ў дачыненьні да моладзевых актывістаў і студэнтаў, неаднаразова фіксаваліся выпадкі вярбоўкі.

Каардынатару праваабарончай службы “Зубра” Ірыне Тоўсьцік ў пашпартна-візавай службе Кастрычніцкага раёну Менску адмовілі ставіць пячатку, якая сьведчыць аб тым, што “пашпарт прыгодны для шматразовых выездаў ва ўсе краіны сьвету”. У пашпартна-візавай службе Ірыне Тоўсьцік сказалі, што да яе “ўзьніклі пытаньні ў Камітэту дзяржаўнай бясьпекі”.

Супрацоўнікі КДБ спрабавалі завербаваць актывістку руху «Зубр» Вераніку Лазоўскую. 22 сакавіка ёй патэлефанавалі і прапанавалі прыйсьці ў Фрунзенскае раённае ўпраўленьне КДБ для “размовы”. Вераніка Лазоўская адмовілася ісьці бяз позвы, замест яе пайшоў яе бацька. Супрацоўнік КДБ прадэманстраваў бацьку Веранікі дыскету, на якой, па ягоных словах, сабраная інфармацыя пра дзяўчыну, і заявіў, што, каб ня мець праблемаў пры паступленьні ў ВНУ, Лазоўская мусіць пагадзіцца на супрацоўніцтва з КДБ.

Зафіксаваныя выпадкі, калі ціск з боку сьпецслужбаў аказваўся на баць-

коў моладзевых актывістаў. Так, бацьку баранавіцкага лідэра "Маладога Фронту" Сяргея Марчыка на працу тэлефанаваў намесьнік старшыні Баранавіцкага КДБ і пагражаў выключэньнем ягонага сына з унівэрсітэту, калі той ня спыніць сваёй актыўнасьці.

Такім чынам, у 2005 годзе адміністрацыйны перасьлед і ціск па месцы працы альбо вучобы быў пашыраным сродкам барацьбы з іншадумцамі. Асабліва безабароннай перад адміністрацыйным ціскам апынулася моладзь.

## Абмежаваньне свабоды слова, цэнзура і перасьлед незалежных медыяў

Па зьвестках Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, на пачатак 2006 году ў Беларусі налічвалася 1.222 перыядычных выданьняў (751 газета, 434 часопісы, 33 бюлетэні, 2 каталогі, 2 альманахі, 8 інфармацыйных агенцтваў), зарэгістравана 54 праграмы тэлевяшчаньня і 154 праграмы радыёвяшчаньня (дзяржаўнымі з іх зьяўляюцца 156, недзяржаўнымі -- 52). Па ацэнках аналітыкаў, у краіне засталося толькі 20 газет, якія публікуюць матэрыялы грамадзка-палітычнага зьместу і чыя рэдакцыйная палітыка не падпарадкаваная адміністрацыі. Незалежных ад уладаў радыё і тэлевізіі ў Беларусі няма – усе недзяржаўныя электронныя медыі абавязаныя ўзгадняць свой зьмест з дзяржаўнымі органамі (зьмест навінаў узгадняецца папярэдне), пастаянна вядзецца маніторынг зьместу передачаў, адсочваецца палітычная скіраванасьць паведамленьняў недзяржаўных радыёстанцыяў.

Улады на працягу году выкарыстоўвалі наступныя формы барацьбы са свабодай слова: спыненьне альбо прыпыненьне дзейнасьці медыяў, папярэдняя цэнзура і іншыя віды парушэньня прафесійнай самастойнасьці рэдакцыяў, крымінальныя справы за публікацыі ў СМІ, затрыманьні журналістаў і пісьмовыя папярэджаньні ў сувязі з прафесійнай дзейнасьцю, адмовы ў прадастаўленьні інфармацыі, эканамічны ціск на сродкі масавай інфармацыі, перашкоды ў вырабе і распаўсюдзе медыяў, падача неабгрунтаваных грамадзянскіх іскаў у судовыя інстанцыі, абмежавальнае выкарыстаньне інстытуту акрэдытацыі. Асобным накірункам стала абмежаваньне працы замежных журналістаў і абмежаваньні ў распаўсюдзе замежных сродкаў масавай інфармацыі.

У 2005 годзе ў Беларусі зноў зафіксаванае забойства журналіста. Карэспандэнт газеты "Народная воля" Васіль Гроднікаў быў знойдзены мёртвым раніцай 18 кастрычніка ў сваім доме ў Заслаўі (Менскі раён). Паводле вынікаў экспертызы, сьмерць журналіста наступіла з-за чэрапна-мазгавой траўмы, з дому ня зьнікла ніякіх рэчаў. У сваіх артыкулах Васіль Гроднікаў крытыкаваў рэжым і ягоную антыдэмакратычную палітыку. Калегі журналіста не выключаюць, што гэта магло быць палітычнае забойства. Улады адмовіліся ад расьсьледаваньня, трактуючы сьмерць Васіля Гроднікава як няшчасны выпадак.

Беларускія праваахоўныя органы не знайшлі забойцу журналісткі газеты "Салідарнасьць" Веранікі Чаркасавай, што загінула ў кастрычніку 2004 году ад шматлікіх нажавых удараў. Праваахоўныя органы адмаўляюцца расьсьле-

даваць версію зьверскага забойства ў сувязі з прафесійнай дзейнасьцю, у тым ліку з ранейшымі журналісцкімі расьсьледаваньнямі, ход сьледзтва наўмысна замаруджваецца, а ўвага скіроўваецца на побытавую версію. Так, у межах сьледзтва ажыцьцяўляюцца сьледчыя дзеяньні ў дачыненьні да непаўнагадовага сына журналісткі, які пазьней быў узяты пад варту па абвінавачаньні ў вырабе фальшывых грошай.

На працягу году былі пазбаўленыя рэгістрацыі газеты “День”, “Навінкі”, “Новая газета Сморгони”, “Маладзёжны праспект”. Многія выданьні, у тым ліку буйнейшая незалежная газета “Народная воля”, атрымалі папярэджаньні ад Міністэрства інфармацыі.

Шэраг выданьняў, згодна з указам прэзідэнта, былі вымушаныя зьмяніць свае назвы, выдаліўшы з іх словы “беларускі” і “нацыянальны”: “Белорусская деловая газета” прайшла перарэгістрацыю пад назвай “БДГ. Деловая газета”, “Белорусский рынок” – пад назвай “Белорусы и рынок”, “Белорусская газета» — “Белгазета”, “Национальная экономическая газета” — “Экономическая газета”.

Большасьць друкаваных выданьняў сутыкаліся з адмовамі з боку друкарняў – гэта адбывалася як у дачыненьні да канкрэтнага нумару газеты, так і ў дачыненьні да выданьня цалкам. Такія выпадкі зафіксаваныя ў дачыненьні да газеты “Glos znad Niemna” (выданьне “Саюзу палякаў на Беларусі”), пінскіх аў“Мясцовы час” і “Живая вода”, гарадзенскай газеты “Биржа информации”. Ня маючы магчымасьцяў друкавацца ў Беларусі, за мяжой выходзяць найбуйнейшыя недзяржаўныя газеты “Народная воля”, “БДГ. Деловая газета”, “Товарищ” і іншыя. Ажыцьцяўляецца мытны кантроль накладаў выданьняў, якія ўвозяцца ў Беларусь – вельмі часта пасьля перасячэньня мяжы іх затрымліваюць міліцыя альбо мытныя органы без законных падставаў.

Найбольш адчувальным ударам па незалежнай прэсе стала забарона на распаўсюд праз падпіску і сетку “Белсаюздрук”. У падпісны каталог на 2006 год ня ўключаныя каля дваццаці недзяржаўных газетаў, як цэнтральных, так і рэгіянальных: “Наша Ніва”, “Народная воля”, “Салідарнасьць”, “Згода”, “Рэгіянальная газета” (Маладэчна), “Газета Слонімская”, “Вольнае Глыбокае”, “Брэсцкі кур’ер” “Борисовские новости”, “Биржа информации” (Гародня), “Витебский курьер”, “Ляхавіцкі час”, “Нясьвіжскі час”, “Ганцавіцкі час”, “Местная газета” (Смаргонь) і іншыя. Прымаючы рашэньне выключыць з падпіснога каталогу на 2006 год большасьць незалежных газетаў, “Белпошта” пайшла на адкрытае парушэньне Закону «Аб паштовай сувязі». Перад гэтым, у 2004 годзе, быў уведзены ліцэнзаваны парадак паштовай дастаўкі друкаваных выданьняў да чытачоў – ліцэнзія на гэта была выдадзена толькі дзяржаўным прадпрыемствам. Адначасова практычна спынены гандаль недзяржаўнымі выданьнямі праз дзяржаўную сетку “Белсаюздрук”. Аказваецца ціск на прыватных распаўсюднікаў друкаваных выданьняў: зафіксавана шмат выпадкаў арыштаў і пакараньняў за распаўсюд незалежнай прэсы.

Па-ранейшаму распаўсюджаным сродкам эканамічнага ціску на медыі былі судовыя зыскі аб абароне гонару і годнасьці з патрабаваньнямі аб

кампенсацыі маральнай шкоды ў велізарных памерах. Такія зыскі падаваліся пераважна з боку дзяржаўных чыноўнікаў і яўна былі скіраваныя на банкруцтва выданьняў. Так, суд Цэнтральнага раёну Менску пастанавіў спагнаць на карысьць міністра фінансаў, кіраўніка Беларускай асацыяцыі гімнастыкі Мікалая Корбута 30 мільёнаў рублёў з рэдакцыі газеты “Прессбол” і 10 мільёнаў -- з галоўнага рэдактара выданьня Уладзіміра Беражкова. Суд Кастрычніцкага раёну Менску пастанавіў спагнаць на карысьць былога супрацоўніка АМАПу Сяргея Бядрыцкага 50 мільёнаў рублёў з рэдакцыі “БДГ. Деловая газета” і 5 мільёнаў рублёў – з журналіста Сяргея Сацука.

Найбольш цярпела на працягу году ад неабгрунтаваных зыскаў газета “Народная воля”. 100 мільёнаў рублёў (больш за 45 тысячаў даляраў) на карысьць лідэра Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Сяргея Гайдукевіча пастанавіў спагнаць з рэдакцыі суд Ленінскага раёну сталіцы. Сума спагнаньня стала адной з самых буйных за ўсю гісторыю судовых працэсаў з удзелам недзяржаўных беларускіх выданьняў. Галоўны рэдактар газеты Іосіф Сярэдзіч быў вымушаны зьвярнуцца да чытачоў па дапамогу, і ў выніку шырокай народнай падтрымкі «Народная воля» цалкам выплаціла кампенсацыю Сяргею Гайдукевічу. У гэты ж час суд Ленінскага раёну Менску абавязаў рэдакцыю выплаціць вялікія кампенсацыі шасьці грамадзянам па зысках, зьвязаных з публікацыяй прозьвішчаў сяброў руху “Воля народу”: у сьпіс патрапілі людзі, якія надалей адмовіліся ад свайго ўдзелу ў руху. Паказальна, што тэксты ўсіх зыскаў былі ідэнтычнымі.

Досьвед разгляду судовых скаргаў аб абароне гонару і годнасьці сьведчыць пра перадузятасьць беларускіх судоў, якія заўжды задавальняюць патрабаваньні, выстаўленыя на адрас незалежнай прэсы. У той жа час відавочна ілжывая інфармацыя з боку дзяржаўных медыяў ня можа быць абвергнутая ў судзе – нават пры наяўнасьці бясспрэчных доказаў судзьдзі не задавальняюць падобныя зыскі.

Такім чынам, у 2005 годзе працягваліся ранейшыя тэндэнцыі парушэньня свабоды слова і меркаваньняў, абмежаваньня свабоднай прэсы, якія прывялі да амаль поўнага вынішчэньня крыніцаў альтэрнатыўнай інфармацыі.

## Абмежаваньне свабоды аб’яднаньняў і перасьлед няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў

Беларускі ўрад на працягу году сістэматычна і мэтанакіравана ажыцьцяўляў перасьлед і абмежаваньне дзейнасьці незалежных ад дзяржаўнай улады няўрадавых арганізацыяў, палітычных партыяў і незалежных прафсаюзаў, а таксама іх актывістаў.

У 2005 годзе беларускае заканадаўства, датычнае няўрадавых арганізацыяў, кардынальна зьмянілася. Былі прынятыя новыя рэдакцыі Закону “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” і Закону “Аб палітычных партыях”; указам прэзідэнта быў значна зьменены прававы статус фондаў, значна абмежаваныя магчымасьці дзейнасьці для гэтай формы некамерцыйных юрыдыч-

ных асобаў; абмежаваныя магчымасьці няўрадавых арганізацыяў для атрыманьня ахвяраваньняў і міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

Беларускае заканадаўства адносна няўрадавых арганізацыяў зьяўляецца адным з самых жорсткіх у параўнаньні з суседнімі краінамі і краінамі СНД. Грамадзянскі кодэкс прадугледжвае магчымасьць існаваньня некалькіх формаў некамерцыйных арганізацыяў – грамадзкія аб'яднаньні, рэлігійныя аб'яднаньні, фонды, установы, асацыяцыі і саюзы. З іх найбольш пашыранай формай няўрадавых арганізацыяў, заснаванай на сяброўскім удзеле, зьяўляюцца грамадзкія аб'яднаньні, дзейнасьць якіх рэгулюецца сьпецыяльным Законам «Аб грамадзкіх аб'яднаньнях» ад 1994 году, у які ў 2005 годзе былі ўнесеныя значныя зьмены. Прыняцьце гэтых зьменаў адбывалася ў тэрміновым парадку і з парушэньнем парламенцкай працэдуры. У выніку адбылася легітымацыя тых абмежаваньняў дзейнасьці няўрадавых арганізацыяў, якія раней выкарыстоўваліся без законных падставаў: павялічаны пералік падставаў для ліквідацыі, заканадаўча замацаваная забарона на дзейнасьць незарэгістраваных грамадзкіх аб'яднаньняў і ўстаноўленая адказнасьць за яе, працэдура рэгістрацыі ўскладняецца неабгрунтаванымі абмежаваньнямі фармальнага зьместу. Сярод новых нормаў: магчымасьць прыпыненьня дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў, абавязак грамадзкіх аб'яднаньняў прадастаўляць штогадовыя справаздачы пра сваю дзейнасьць у органы юстыцыі да 1 сакавіка кожнага году, забарона на ажыцьцяўленьне грамадзкімі аб'яднаньнямі прадпрымальніцкай дзейнасьці. У пэўнай ступені зьмяніліся патрабаваньні да статутаў грамадзкіх аб'яднаньняў. Усім грамадзкім аб'яднаньням цягам 2005 і 2006 гадоў неабходна ўнесьці зьмены ў свае ўстаноўчыя дакументы, перапрацоўваючы статуты ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі абноўленага закону. Такім чынам, створаныя новыя перашкоды для стварэньня няўрадавых арганізацыяў, павялічаныя магчымасьці дзяржаўнага кантролю за іх дзейнасьцю.

Сярод абмежаваньняў пры стварэньні няўрадавых арганізацыяў патрэбна адзначыць вялікую грашовую пошліну (звыш $ 220 для грамадзкага аб'яднаньня нацыянальнага ўзроўню і каля $ 100 для мясцовых грамадзкіх аб'яднаньняў), а таксама патрабаваньні да юрыдычнага адрасу, які абавязкова павінен быць у адміністрацыйным памяшканьні – гэта патрабаваньне цяжка выканальнае ва ўмовах татальнага кантролю дзяржавы за выкарыстаньнем нерухомасьці. У 2005 годзе на падставе адсутнасьці юрыдычнага адрасу былі зачыненыя шэраг агульнанацыянальных і мясцовых грамадзкіх яб'яднаньняў.

Найбольш балюча неабходнасьць перарэгістрацыі юрыдычных адрасоў грамадзкіх аб'яднаньняў і палітычных партыяў у нежылым фондзе ўдарыла па іх арганізацыйных структурах і мясцовых аддзяленьнях – некалькі сотняў аддзяленьняў, філіяў, прадстаўніцтваў былі ліквідаваныя альбо зьнятыя з уліку па гэтай прычыне. Толькі нешматлікія арганізацыі здолелі прайсьці перарэгістрацыю. Найбольш яскравым прыкладам стала сітуацыя з Гомельскім

аддзяленьнем ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», якое з цяжкасьцю здолела адшукаць пад юрыдычны адрас памяшканьне ў тры квадратныя метры пад лесьвіцай у жылым доме. Тым ня менш, чыноўнікі запатрабавалі ад старшыні журналісцкай арганізацыі згоды ад санэпідэмстанцыі і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, хацяя гэтыя пытаньні ўжо былі зьнятыя ў дамове, завізаванай чыноўнікамі камунальных службаў. Некаторыя грамадзкія аб'яднаньні і палітычныя партыі спрабавалі адстойваць свае правы ў судовым парадку, аднак Вярхоўны суд не задаволіў ніводную скаргу — адмовы атрымалі грамадзкае аб`яднаньне «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны», Грамадзкае аб'яднаньне БНФ "Адраджэньне", Партыя камуністаў Беларуская, Аб'яднаная грамадзянская партыя і іншыя.

Праблема адсутнасьці юрыдычнага адрасу закранула ў 2005 годзе і рэлігійныя арганізацыі – шэраг рэлігійных суполак былі на гэтай падставе ліквідаваныя ўладамі, а на вернікаў аказваўся ціск з мэтай прымусіць іх адмовіцца ад практыкі супольных набажэнстваў.

Практыка разгляду пададзеных на рэгістрацыю дакументаў аб стварэньні грамадзкіх аб'яднаньняў сьведчыць, што гэтыя дакументы вывучаюцца з улікам палітычных перакананьняў стваральнікаў новага аб'яднаньня. Не рэгіструюцца тыя аб'яднаньні, якія не зьвязаныя палітычна з дзеючай уладай. Судовае абскарджаньне незаконнай ці беспадстаўнай адмовы ў рэгістрацыі няўрадавай арганізацыі зьяўляецца неэфектыўным – суды ніколі не становяцца на бок няўрадавай арганізацыі, ніколі не адмяняюць рашэньні пра нерэгістрацыю няўрадавай арганізацыі. Пры разглядзе спрэчак пра рэгістрацыю няўрадавых арганізацыяў суды не кіруюцца патрабаваньнямі закону, якія вызначаюць дастатковыя падставы для адмовы ў рэгістрацыі няўрадавай арганізацыі, а улічваюць нормы падзаконных актаў і эксьпертныя заключэньні адпаведнай камісіі, якія вельмі часта не грунтуюцца на праве. Стварэньне міжнародных няўрадавых арганізацыяў і прадстаўніцтваў замежных і міжнародных няўрадавых арганізацыяў у Беларусі таксама істотна абмежавана і зьвязана з вялікімі матэрыяльнымі выдаткамі.

Паказальным прыкладам таго, якім чынам беларускія ўлады трактуюць свабоду асацыяцыяў і свабоду сходаў, можа быць выпадак са спробай рэгістрацыі грамадзянскай ініцыятывы "Партнёрства". Яшчэ ў 2002 годзе гэтай ініцыятыве, што сьпецыялізуецца на назіраньні за выбарамі, было адмоўлена ў рэгістрацыі без законных падставаў. У кастрычніку 2005 году сябры "Партнёрства" намагаліся правесьці новы ўстаноўчы сход з мэтай рэгістрацыі арганізацыі. Міліцыянты спынілі гэты зьезд, абвінавацiўшы ўдзельнікаў у правядзеньні несанкцыянаванага сходу, каля 70 актывістаў трапілі ў аддзяленьне міліцыі. Лідэр арганізацыі Мікалай Астрэйка, ягоныя намесьнікі Эніра Браніцкая і Аляксандр Бондараў атрымалі па 15 сутак арышту, Сьвятлане Конавай вынесьлі штраф у памеры 30 базавых велічыняў.

Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, у 2005 годзе было зарэгістравана 61 грамадзкае аб'яднаньне, з іх 3 міжнародных, 13 нацыянальных і 45 мясцовых. Усяго на пачатак 2006 году ў краіне зарэгістравана 17 палітычных партыяў,

41 прафсаюз, 2.247 грамадзкіх аб'яднаньняў (239 міжнародных, 724 рэспубліканскіх и 1284 мясцовых), а таксама 16 саюзаў грамадзкіх аб'яднаньняў. Большасьць грамадзянскіх арганізацыяў і ініцыятываў дзейнічаюць без рэгістрацыі (іх колькасьць перавышае 2.000), што можа выклікаць крымінальны перасьлед іх удзельнікаў.

Акрамя пагаршэньня ўмоваў існаваньня для партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў, варта адзначыць зьмяненьне прававога рэгуляваньня дзейнасьці фондаў. Стварэньне фондаў і ўстановаў не рэгулюецца сьпецыяльнымі законамі і ажыцьцяўляецца на падставе ўказаў прэзідэнта. У 2005 годзе ўказам прэзідэнта ад 1 ліпеня "Аб некаторых мерах па ўпарадкаваньні дзейнасьці фондаў" была абвешчаная іх перарэгістрацыя – гэта балюча ўдарыла па тых аб'яднаньнях, што былі ліквідаваныя, а пасьля зарэгістраваліся ў форме фондаў. Згодна з указам, асоба, што раней уваходзіла ў кіраўнічую раду ліквідаванага грамадзкага аб'яднаньня, на працягу трох гадоў ня мае права быць заснавальнікам фонду. Як і грамадзкія аб'яднаньні, фонды павінныя рэгістравацца і кантралявацца Міністэрствам юстыцыі, уводзіцца паняцьце тэрыторыі дзейнасьці фондаў – яны дзеляцца на міжнародныя, мясцовыя і рэспубліканскія, пашыраныя падставы для іх ліквідацыі. Усталяваныя максімальна высокія патрабаваньні да ўнёскаў заснавальнікаў ва ўстаноўчы бюджэт фондаў: для стварэньня нацыянальнага альбо міжнароднага фонду трэба ўнесьці суму альбо маёмасьць на больш чым 14 000 даляраў, а для стварэньня мясцовга фонду ўстаноўчы ўнёсак не павінны быць меншы за 1 500 даляраў. Да 1 лютага 2006 году ўсе раней зарэгістраваныя фонды павінныя прайсьці працэдуру перарэгістрацыі.

Магчымасьці атрыманьня ахвяраваньняў для няўрадавых арганізацыяў аказаліся істотна абмежаванымі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь 1 ліпеня 2005 году падпісаў Указ № 300 "Аб прадастаўленьні і выкарыстаньні бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі". Атрыманьне дапамогі арганізацыямі, іншымі фізічнымі асобамі з мэтамі, якія не прадугледжаныя Указам № 300, магчымае толькі па рашэньні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ці з ягонай згоды.

Праверкі няўрадавых арганізацыяў з боку рэгіструючых і фінансавых органаў зьяўляюцца важным сродкам кантролю за дзейнасьцю аб'яднаньняў: практычна любая праверка можа пацягнуць за сабой санкцыі. Ліквідацыя і судовы перасьлед арганізацыяў носяць неправавы, карны характар – любое нязначнае парушэньне падзаконных актаў і інструкцыяў можа быць расцэненае судом як грубае і стаць падставай для ліквідацыі арганізацыі.

У 2005 годзе пашыранай заставалася практыка ліквідацыі найбольш уплывовых грамадзкіх аб'яднаньняў праз суд. У красавіку паводле зыску Міністэрства юстыцыі быў ліквідаваны аналітычны цэнтр — ГА "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў" (НІСЭПД). Прэтэнзіі да НІСЭПД былі вылучаныя стандартныя: па юрыдычным адрасе інстытут фактычна не знаходзіўся, да таго ж не даслаў Мінюсту справаздачу аб сваёй дзейнасьці (у прыватнасьці, не прадас-

тавіў чыноўнікам ад юстыцыі анкету аднога з апытаньняў) і г. д. Такім чынам, паводле дзяржаўных органаў, НІСЭПД злосна парушыў заканадаўства і ўласны статут. Разам з тым, рэальная прычына закрыцьця НІСЭПД добра вядомая — распаўсюд праўдзівай інфармацыі пра вынікі выбараў і рэферэндуму ў кастрычніку 2004 году. Ліквідацыя інстытуту была неабходная ўладам з мэтай прадухіленьня падобных сацыялагічных дасьледаваньняў падчас значных палітычных кампаніяў.

Усяго ў 2005 годзе судамі было ліквідавана 68 грамадзкіх аб'яднаньняў (17 рэспубліканскіх і 51 міжнароднае) — выпадкаў адмовы судамі ў зысках аб ліквідацыі не было. Сярод ліквідаваных арганізацыяў: Жаночы рух "Адраджэньне Айчыны", Грамадзкае аб'яднаньне "Усяслаў Чарадзей", Міжнароднае грамадзкае аб'яднаньне "Беларуская персьпектыва", "Аб'яднаньне беларускіх скаўтаў" і іншыя НДА. Пад ціскам з боку ўладаў 43 грамадзкія аб'яднаньні прынялі рашэньні аб самаліквідацыі. На працягу году грамадзкім аб'яднаньням вынесена 425 пісьмовых папярэджаньняў (на 161 пісьмовае папярэджаньне болей, чым у 2004 годзе). На адрас палітычных партыяў вынесена 32 пісьмовых папярэджаньні.

2005 год адзначыўся адкрытым умяшальніцтвам Мінюсту ва ўнутраныя справы грамадзкага аб'яднаньня "Саюз палякаў на Беларусі" (СПБ). Міністэрства юстыцыі не прызнала вынікаў зьезду СПБ, які прайшоў у сакавіку, і ў жаданьні захаваць на пасадзе старшыні "свайго" чалавека, рэжым пачаў маштабны наступ на новае кіраўніцтва арганізацыі. Пры дапамозе дзяржаўнай улады праўрадавая частка кіраўніцтва СПБ правяла новы з'езд, у выніку якога арганізацыя фактычна аказалася расколатая. Гэты канфлікт атрымаў шырокі розгалас і выйшаў на міжнародны ўзровень, паколькі быў успрыняты як праява ціску на польскую меньшасьць у Беларусі.

Такім чынам, Беларусь з краіны з неспрыяльным кліматам для структураў грамадзянскай супольнасьці пераўтварылася ў сапраўдную зону надзвычайнай небясьпекі для грамадзкіх актывістаў. Верагоднасьць апынуцца пад пагрозай крымінальнага перасьледу, рызыка патрапіць за краты альбо быць высланым на прымусовыя працы, небясьпека страціць маёмасьць альбо працу з-за сваёй грамадзка-палітычнай дзейнасьці, хісткі юрыдычны статус любой некамерцыйнай арганізацыі – усё гэта пераўтварае сучасную Беларусь у экстрэмальную зону для няўрадавых арганізацыяў.

### У Беларусі ўжываецца сьмяротнае пакараньне

У 2005 годзе было прыведзена ў выкананьне два рашэньні аб сьмяротным пакараньні (паводле дадзеных старшыні Вярхоўнага суда Валянціна Сукалы).

Беларусь – адзіная краіна ў Еўропе, якая ўжывае сьмяротнае пакараньне. Еўрапейскія і міжнародныя арганізацыі крытыкуюць Беларусь за выкарыстаньне сьмяротнага пакараньня. Падставай для крытыкі зьяўляецца ня толькі сама наяўнасьць гэткай меры пакараньня ў прававой сістэме, але і адсутнасьць інфармацыі аб практыцы выкананьня прысудаў.

## Ціск на праваабаронцаў і праваабарончыя арганізацыі

Палітычныя рэпрэсіі былі скіраваныя ня толькі на палітычных апанентаў існуючага палітычнага рэжыму. Моцны ціск аказваўся на праваабаронцаў і на праваабарончыя арганізацыі.

Была прыпыненая, а потым зноў узбуджаная крымінальная справа за паклёп на прэзідэнта супраць намесьніка старшыні "Беларускага Хельсінскага камітэту" Гары Паганяйлы за інтэрв'ю швецкаму тэлеканалу, у якім ён выказаў меркаваньне адносна магчымай датычнасьці вышэйшых кіраўнікоў беларускай дзяржавы да выкраданьняў і магчымых забойстваў вядомых палітыкаў, бізнэсоўцы і журналіста – Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзьмітрыя Завадзкага.

Пасьля таго, як Прэзідыум Вышэйшага гаспадарчага суда Беларусі адмяніў усе ранейшыя рашэньні гаспадарчых судоў па справе "Беларускага Хельсінскага камітэту" і прызнаў сапраўднымі прэтэнзіі падатковай службы да БХК, паўстала рэальная пагроза ўзнаўленьня крымінальнай справы супраць кіраўніка арганізацыі Тацяны Працькі і бухгалтара Тацяны Рудкевіч. Справа была ўзбуджаная яшчэ ў 2004 годзе на падставе быццам бы нявыплаты падаткаў з замежнай фінансавай дапамогі з боку Еўрапейскага саюзу, але потым прыпыненая. Нагадаем, што паводле рашэньня падатковых органаў праваабарончая арганізацыя мусіць сплаціць каля 75 тысячаў даляраў падаткаў і штрафных санкцыяў.

Аднаўленая крымінальная справа супраць праваабаронцы і дэпутата Маларыцкага райсавету Уладзіміра Малея, які абвінавачваецца ў паклёпе на старшыню Маларыцкага райвыканкаму. Дадзеная крымінальная справа прыпынялася ў сувязі з адсутнасьцю ў дзеяньнях У.Малея складу злачынства, але потым па ёй зноў пачаліся сьледчыя дзеяньні.

У кастрычніку з пнеўматычнага пісталету было абстралянае вакно кватэры жодзінскіх праваабаронцаў Аляксея і Сьвятланы Лапіцкіх. На наступную ноч пасьля абстрэлу вокны былі залітыя чорнай фарбай. Нягледзячы на тое, што па факце абстрэлу Жодзінскім ГАУС узбуджаная крымінальная справа, злачынцы не былі выяўленыя.

Беларускія ўлады не даюць магчымасьці наведаць Беларусь сьпецыяльнаму дакладчыку ААН па правах чалавека ў Беларусі Адрыяну Севярыну, лічачы яго знаходжаньне на тэрыторыі Беларусі недарэчным у гэтай якасьці.

Даводзіцца канстатаваць, што парушэньне правоў чалавека ў Беларусі пераўтварылася ў адзін з асноўных метадаў дзяржаўнага кіраваньня ва ўмовах дыктатуры. У 2005 годзе створаная беларускімі ўладамі машына рэпрэсіяў удасканальвалася і набывала выгляд легальна замацаванай структуры. Вырашэньне праблемы парушэньня правоў чалавека ў Беларусі немагчымае без зьмяненьня дзеючага палітычнага рэжыму.

# 1. Прававая база і зьмены ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, якія вядуць да абмежаваньня правоў грамадзянаў

***25 студзеня*** стала вядома, што на вясновую сесію Палаты прадстаўнікоў унесены распрацаваны ўрадам законапраект “Аб рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадзкіх аб’яднаньнях”. Праект прадугледжвае стварэньне псеўдаграмадзкіх структураў, кантраляваных і фінансаваных урадам, і распрацаваны па даручэньні ***Аляксандра Лукашэнкі***. Кіраўнік парламенцкай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ ***Аляксандр Сьвірыд*** прызнае, што такога закону ў Беларусі яшчэ не было, аднак аб’яднаньні дзяржаўна-грамадзкага тыпу ўжо існуюць, і ў іх сумяшчаецца дзяржаўная і грамадзкая ўласнасьць. Да гэткага тыпу аб’яднаньняў можна аднесьці БРСМ, жаночыя і вэтэранскія саюзы, якія выконваюць задачы ўладаў, у тым ліку актыўна накіроўваюць сваіх сябраў у выбарчыя камісіі. Старшыня Праваабарончага цэнтру “Вясна” ***Алесь Бяляцкі*** лічыць, што гэты законапраект сьведчыць пра імкненьне ўладаў вярнуцца да былой савецкай сістэмы псеўдаграмадзкіх аб’яднаньняў, адрадзіць грамадзкія структуры таталітарнага перыяду беларускай гісторыі.

***1 лютага*** ўступілі ў дзеяньне папраўкі ў Закон “Аб Унутраных войсках МУС Рэспублікі Беларусь”, якія былі прынятыя Палатай прадстаўнікоў па прапанове Адміністрацыі прэзідэнта. Цяпер байцы ўнутраных войскаў могуць прымяняць сьпецыяльныя сродкі, баявую тэхніку, а таксама зброю паводле загаду прэзідэнта краіны. Прынятыя нормы фактычна скасоўваюць паняцьце “злачыннага загаду”, паводле якога вайскоўцы маюць права адмовіцца, напрыклад, ад стральбы па мірных грамадзянах і наезду на іх танкамі і БТР. Аналітыкі лічаць, што зроблена гэта ў мэтах “не дапусьціць у краіне “памаранчавай“, “васільковай” альбо афарбаванай у іншыя колеры рэвалюцыі. Гаворыць юрыст ***Валянцін Стэфановіч***: “Лукашэнка не давярае сьпецслужбам і ставіць перад імі новыя задачы па кантролі за грамадзтвам, па недапушчэньню праяваў апазіцыйнай дзейнасьці. Гэта ўсё можна назваць трывожнымі тэндэнцыямі. У выніку зьменаў у “Законе аб унутраных войсках”, у артыкул, які рэгламентуе выкарыстаньне сьпецсродкаў і агнястрэльнай зброі, дададзеныя словы “і ў іншых выпадках, якія вызначаюцца прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь”. Пры гэтым не вызначаныя крытэрыі: у якіх выпадках прэзідэнт можа вырашыць, што сітуацыя вымагае выкарыстаньня зброі, якім чынам гэты загад будзе аддадзены – вусна, пісьмова? Гэтыя зьмены ў Закон ставяць пад пагрозу адно з асноўных правоў, якое гарантуецца нам – права на жыцьцё”.



***3 лютага*** стала вядома, што пры паступленьні на службу ў сілавыя

ведамствы – у КДБ, МУС, Раду Бясьпекі, органы пракуратуры, службу аховы прэзідэнта – патрабуецца запаўненьне адмысловай заявы. Тэкст заявы наступны: "У зьвязку з атрыманьнем допуску да дзяржаўных таямніцаў даю згоду на правядзеньне органамі дзяржаўнай бясьпекі Рэспублікі Беларусь адносна мяне праверачных мерапрыемстваў, а таксама на часовае абмежаваньне ў сувязі з гэтым права на недатыкальнасьць асабістага жыцьця"… Запаўняць такую паперу цяпер трэба ў двух выпадках: падчас прыёму на працу, а таксама пры падаўжэньні кантракту. Права недатыкальнасьці асабістага жыцьця зьяўляецца адным з галоўных ня толькі ў Канстытуцыі Беларусі, але і ў Дэкларацыі правоў чалавека ААН, якая ўхваленая ў тым ліку і беларускім бокам.

***15 лютага*** міністр інфармацыі Беларусі ***Уладзімір Русакевіч*** у інтэрвью «Інтэрфаксу» заявіў, што лічыць дачаснай адмову ад заканадаўчых нормаў, якія прадугледжваюць крымінальную адказнасьць за абразу гонару і годнасьці афіцыйных асобаў: "З цягам часу, калі палітычная культура грамадзтва будзе значна вышэйшая, неабходнасьць такой нормы адказнасьці адпадзе сама па сабе. Але гэта будзе няхутка". Міністр таксама падкрэсліў, што ў заканадаўстве большасьці еўрапейскіх краінаў норма адказнасьці журналіста за паклёп прысутнічае. Міністр не падтрымлівае сьцьвярджэньне, што «журналіст абавязаны крытыкаваць дзяржаву». «Добрая праца — крытыкаваць дзяржаву, а галоўнае бяспройгрышная. Праца журналіста перш за ўсё павінна быць стваральнай», — падкрэсьліў ён.

21 красавіка стала вядома, што згодна з новым загадам міністра юстыцыі ***Віктара Галаванава***, аргструктуры грамадзкіх аб'яднаньняў і палітычных партыяў павінны перарэгістраваць свае юрыдычныя адрасы да 1 чэрвеня бягучага году. "Упраўленьням юстыцыі дадзена даручэньне да пазначанага тэрміну гэтае пытаньне канчаткова закрыць", — адзначыў кіраўнік упраўленьня грамадзкіх аб'яднаньняў Міністэрства юстыцыі Алег Сьліжэўскі. Гэта значыць, што структуры тых партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў, якія не пададуць дакументы пра зьмену юрыдычнага адрасу, будуць зьнятыя з уліку. Нагадаем, што ў кастрычніку 2004 году Міністэрства юстыцыі зьвярнулася да ўсіх рэспубліканскіх грамадзкіх аб'яднаньняў і палітычных партыяў, якія маюць арганізацыйныя структуры ў кватэрах шматкватэрных жылых дамоў, з прапановай да 1 лютага 2005 г. перавесьці гэтыя структуры на юрыдычныя адрасы ў нежылых памяшканьнях альбо ў аднакватэрных (блакаваных) дамах. Аднак, паводле заявы А.Сьліжэўскага, далёка ня ўсе грамадзкія аб'яднаньні і палітычныя партыі справіліся з задачай перарэгістрацыі сваіх арганізацыйных структураў на новых юрыдычных адрасах. У выніку за некалькі апошніх тыдняў Міністэрствам юстыцыі вынесена некалькі дзясяткаў пісьмовых папярэджаньняў за згаданае парушэньне. Паколькі складанасьць тэрміновага выкананьня патра-

бабаваньняў Міністэрства юстыцыі стала відавочная, яно вырашыла працягнуць тэрмін для перарэгістрацыі арганізацыйных структураў да 1 чэрвеня.

***12 траўня*** Партыя БНФ накіравала зварот у Канстытуцыйны суд аб суадноснасьці Указу ***Аляксандра Лукашэнкі*** ад 7 траўня аб перайменаваньні шэрагу менскіх вуліцаў нормам Асноўнага Закону Рэспублікі Беларусь. Паводле старшыні арганізацыйна-прававой камісіі Партыі БНФ Уладзіміра Лабковіча, дадзены Указ парушае дзеючае беларускае заканадаўства, якое надае права зьмены назваў вуліц толькі мясьцовым Саветам дэпутатаў. “У прэзідэнта такога права няма, і ён перавысіў свае паўнамоцтвы”. Нагадаем, што сваім указам Лукашэнка перайменаваў прасьпект Францыска Скарыны ў прасьпект Незалежнасьці, прасьпект Пятра Машэрава — у прасьпект Пераможцаў, вуліцы Іерусалімская, Дразда і Варвашэні — у прасьпект Машэрава, а Старабарысаўскі тракт — у вуліцу Францыска Скарыны.

***25 траўня*** — ужо тыдзень, як у Беларусі пачаў дзейнічаць закон аб “Аб органах дзяржаўнай бясьпекі”. Новая рэдакцыя гэтага закону надае больш шырокія правы аператыўным службам. Цяпер яны могуць пранікаць ў жытло грамадзяніна ці ў офіс арганізацыі, нават замежнай, ня маючы санкцыі пракуратуры. Дазвол пракурора ўвогуле не патрэбны, дастаткова будзе толькі цягам сутак праінфармаваць пракурора, што пранікненьне адбылося ў аператыўных мэтах. Другім істотным новаўвядзеньнем закону зьяўляецца права сьпецслужбаў укараняць у любую арганізацыю сваіх тайных агентаў. Калі ж іх нехта рассакрэціць, законам прадугледжаная крымінальная адказнасьць. Мера пакараньня — да 5 гадоў турмы. Столькі ж атрымлівае той, хто абнародаваў дзяржаўны сакрэт.

***31 траўня Аляксандр Лукашэнка*** падпісаў указ, якім рэгламентуецца выкарыстаньне словаў “нацыянальны” і “беларускі” ў назвах камерцыйных і некамерцыйных арганізацыяў краіны. У прыватнасьці, словы “нацыянальны” і “беларускі” могуць выкарыстоўваць у сваіх назвах дзяржаўныя органы і арганізацыі з дзяржаўнай формай маёмасьці, а таксама СМІ, заснавальнікамі якіх зьяўляюцца дзяржаўныя органы. Палітычныя партыі, рэспубліканскія грамадзкія аб’яднаньні, прафсаюзы і банкі могуць выкарыстоўваць у назвах слова “беларускі”, але ня маюць права выкарыстоўваць слова “нацыянальны”. Недзяржаўныя незалежныя медыі ня маюць права выкарыстоўваць словы “беларускі” і “нацыянальны” ў сваіх назвах. Арганізацыі і медыі, назвы якіх не адпавядаюць указу, павінныя ў трохмесячны тэрмін прайсьці перарэгістрацыю. Указ тычыцца перадусім уплывовых незалежных бізнэс-выданьняў – “Белорусской деловой газеты”, “Белорусского рынка” і “Белорусской газеты”, якім давядзецца мяняць назвы. Кіраўнік Цэнтру прававой абароны СМІ пры Беларускай асацыяцыі жур-

налістаў ***Міхаіл Пастухоў*** лічыць, што згаданы ўказ абмяжоўвае канстытуцыйныя правы грамадзянаў Беларусі: "У дадзеным выпадку адбываецца неабгрунтаванае абмежаваньне свабоды выяўленьня меркаваньняў, свабоды выкарыстаньня дазволеных найменьняў і тэрмінаў. Я кажу пра абмежаваньне з той прычыны, што ў нас Канстытуцыя, артыкул 23 устанаўлівае ў якіх выпадках могуць абмяжоўвацца канстытуцыйныя правы і свабоды. Але тут абмежаваньне ўводзіцца неабгрунтавана. Без нейкіх сур'ёзных падставаў. А яшчэ: чаму ідзе такое дзяленьне на дзяржаўныя і недзяржаўныя структуры? Гэта яўная форма дыскрымінацыі недзяржаўных выданьняў, установаў і арганізацыяў. Тут у наяўнасьці абмежаваньне правоў пэўных структур. Гэтае абмежаваньне абцяжарвае становішча тых, хто меў у назвах "нацыянальны" і "беларускі". Напрыклад, той жа "Белорусский рынок" павінен прайсьці перарэгістрацыю. Чаму?"

***3 чэрвеня*** дэпутат Палаты прадстаўнікоў ***Сяргей Касьцян*** прапанаваў гвалтоўную стэрылізацыю асобаў, якія вядуць асацыяльны лад жыцьця. Гэта адбылося падчас абмеркаваньня праблемы: як і хто павінен кампенсаваць страты, якія нясе краіна за ўтрыманьне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забесьпячэньні.

***7 чэрвеня*** краўніцтва ***Партыі БНФ*** атрымала адмоўны адказ з сакратарыяту Канстытуцыйнага суда на зварот аб прызнаньні неадпавядаючым Канстытуцыі указу А. Лукашэнкі аб перайменаваньні цэнтральных вуліц і прасьпектаў Менску. У Канстытуцыйным судзе адмовіліся разглядаць пытаньне наконт законнасьці ўказу А. Лукашэнкі, спаслаўшыся на тое, што партыя ня мае права ініцыятывы судовага разьбіральніцтва ў Канстытуцыйным судзе. Такім правам надзеленыя прэзідэнт, парламент, урад. Паводле ўласнай ініцыятывы Канстытуцыйны суд таксама адмаўляецца правяраць законнасьць указу А. Лукашэнкі.

***7 чэрвеня*** ў ***Праваабарончы цэнтр "Вясна"*** патрапіў ліст Міністэрства адукацыі за подпісам міністра А.М. Радзькова, адрасаваны Упраўленьням адукацыі аблвыканкамаў і кіраўнікам установаў, якія забясьпечваюць атрыманьне вышэйшай і сярэдняй сьпецыяльнай адукацыі. Ліст "Аб мерах па недапушчэньні спробаў уцягваньня навучэнцаў і студэнтаў у супрацьпраўную дзейнасьць палітычнага кшталту", датаваны 23.05.2005 г. пад № 03-24/28-ДСП і ідзе з грыфам "Для службовага карыстаньня". Дадзены дакумент фатычна замацаваў ужо існуючую практыку перасьледу студэнтаў па палітычных матывах, які адбываецца ў навучальных установах краіны на працягу апошніх некалькіх год. Ліст прапануе ўзмацніць ідэалагічна-выхаваўчую працу сярод студэнтаў і навучэнцаў сярэдніх сьпецыяльных навучальных установаў у мэтах "нейтралізацыі спробаў уцягваньня студэнтаў у супрацьпраўную дзейнасьць палітычнага кшталту". Асаблівую занепакоенасьць выклікаюць яўна неканстытуцыйныя, пару-

шаючыя правы чалавека некаторыя пункты дадзенага ліста. Так, у прыватнасьці, прапануецца пашырыць практыку стварэньня ва ўстановах адукацыі саветаў і камісій па папярэджаньні супрацьпраўных паводзінаў навучэнцаў і студэнтаў, арганізаваць улік і індывідуальную працу з навучэнцамі і студэнтамі, схільнымі да ўчыненьня падобных дзеяньняў. Такім чынам, гэта азначае, што на асобны ўлік будуць ставіць грамадзка і палітычна актыўную моладзь. Гэта, безумоўна, мае антыканстытуцыйны характар, пасягае на асноўныя правы і свабоды чалавека. Настаўнікам і выкладчыкам ВНУ дадзеным лістом прапануецца “зрабіць усё магчымае, каб у студэнцкіх аудыторыях не было месца антыдзяржаўнай рыторыцы і крытыканцтва”. Варта нагадаць, што у адпаведнасьці з арт. 33 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кожнаму гарантуецца свабода меркаваньняў, перакананьняў і свабоднае іх выражэньне. Ніхто ня можа быць прымушаны да выражэньня сваіх перакананьняў ці адмаўленьня ад іх. Акрамя таго арт. 34 Канстытуцыі Беларусі гарантуе кожнаму грамадзяніну краіны права на атрыманьне, захоўваньне і распаўсюд поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасьці дзяржаўных органаў, грамадзкіх аб’яднаньняў, аб палітычным, эканамічным, культурным і міжнародным жыцьці, стане навакольнага асяродку. Дадзеным дакументам у ВНУ фаткычна ўводзіцца цэнзура. Гэта азначае, што ў навучальных установах можна будзе распаўсюджваць толькі ідэалагічна выверaную, “правільную” інфармацыю, што зноўку супярэчыць арт. 33 Канстытуцыі. Дадзеным лістом на кіраўнікоў навучальных установаў ускладзена персанальная адказнасьць за факты ўдзелу студэнтаў і навучэнцаў у несанкцыянаваных мерапрыемствах, якія праводзяцца апазіцыйнымі арганізацыямі. Ім рэкамендавана адлічаць студэнтаў і навучэнцаў з ВНУ і навучальных установаў. Трэба адзначыць, што ні Закон “Аб адукацыі”, ні палажэньні аб ВНУ і аб сярэдніх сьпецыяльных навучальных установах, зацьверджаныя Міністэрствам адукацыі, не ўтрымліваюць такой падставы адлічэньня з ВНУ, як “удзел у несанкцыянаваных мерапрыемствах, якія праводзіць апазіцыя”. Праваабаронца Алесь Бяляцкі лічыць, што такія меры, якія прапаноўвае міністр адукацыі А.Радзькоў, непазьбежна прывядуць да ўстанаўленьня фашыстоўскіх, таталітарных парадкаў у вышэйшых навучальных установах: “За палітычныя погляды і грамадзянскую пазіцыю беларусаў выключалі з царскіх універсітэтаў, з польскіх гімназіяў і з савецкіх інстытутаў. Зараз іх будуць пазбаўляць права на вышэйшую адукацыю ў лукашэнкаўскай Беларусі. Гэта сорам і ганьба, ад якой сёньняшняму міністру адукацыі, а таксама непасрэдным выканальнікам гэтага ліста не адмыцца да самай сьмерці”. Праваабаронцы заклікалі выкладчыкаў і адміністрацыі ВНУ не выконваць гэты антыканстытуцыйны ліст Міністэрства адукацыі, заставацца сапраўднымі інтэлігентамі і стаць у абарону правоў студэнтаў і навучэнцаў, незалежна ад іхніх палітычных поглядаў і перакананьняў.



***29 чэрвеня*** Палата прадстаўнікоў прыняла Закон “Аб унясеньні зьме-

наў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусь “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”. Законапраект павінен быць разгледжаны ў Савеце Рэспублікі, а ўступіць у сілу пасьля падпісаньня прэзідэнтам і апублікаваньня. Асноўная частка зьмяненьняў і дапаўненьняў у закон датычыцца замацаваньня ў ім тых падзаконных нормаў і практыкі праваўжываньня, якія ўжо існавалі ў беларускім праве (дэкрэты прэзідэнта, дакументы, зацьверджаныя Міністам). Аднак новая рэдакцыя ўстанаўлівае шэраг новых падставаў для ліквідацыі грамадзкіх аб’яднаньняў. Напрыклад, гэта норма пра прыпыненьне дзейнасьці грамадзкага аб’яднаньня за парушэньне ім заканадаўства. Раней такой меры спагнаньня для грамадзкіх аб’яднаньняў не існавала. Закон павялічвае магчымасьці ўмяшальніцтва дзяржавы ў дзейнасьць аб’яднаньняў, пашырае пералік кантрольных органаў і накірункаў кантраляваньня грамадзкіх аб’яднаньняў. У той жа час, у закон не закладзена ніякіх нормаў пра магчымасьць супрацоўніцтва дзяржавы і грамадзкіх аб’яднаньняў. Напрыклад, нормаў пра сацыяльную замову, якія існуюць ва ўсіх суседніх краінах. Новая рэдакцыя ўстанаўлівае, што ўсе грамадзкія аб’яднаньні будуць абавязаныя штогод прадстаўляць у рэгіструючы орган поўную справаздачу пра сваю дзейнасьць. Дадаецца таксама новы артыкул, які прадугледжвае прыпыненьне дзейнасьці грамадзкіх арганізацыяў па рашэньню суда да шасьці месяцаў. Прадпрымальніцкая дзейнасьць зможа ажыцьцяўляцца толькі праз стварэньне адмысловых камерцыйных структураў. Некаторыя з прынцыповых “белых плямаў” беларускага заканадаўства пра НДА не былі выпраўленыя ў новым нарматыўным акце. Так, не была заканадаўча ўрэгуляваная дзейнасьць Камісіі па рэгістрацыі (перарэгістрацыі) грамадзкіх аб’яднаньняў і палітычных партыяў, без заключэньня якой нельга зарэгістраваць грамадзкае аб’яднаньне. Прыняцьце новай рэдакцыі закону каментуе Каардынатар сістэмы калектыўнай абароны беларускіх НДА ***Юры Чавусаў***: “Пакуль яшчэ рана казаць пра тое, якім канкрэтным чынам новыя нормы паўплываюць на беларускі трэці сектар. Зыходзячы з наяўнага тэксту, магу сказаць, што шэраг абмежаваньняў права на аб’яднаньне, якія ўтрымліваюцца ў новай рэдакцыі закону, не адпавядаюць міжнародным стандартам правоў чалавека — гэта датычыцца найперш забароны на дзейнасьць незарэгістраваных аб’яднаньняў грамадзянаў, умяшальніцтва дзяржавы ў дзейнасьць аб’яднаньняў і абмежаваньняў у дзейнасьці арганізацыяў”.

***19 ліпеня*** ўказам ***Аляксандра Лукашэнкі*** Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі дадзена права ажыцьцяўляць грамадзкі кантроль за выкананьнем заканадаўства аб працы ў арганізацыях і ў індывідуальных прадпрымальнікаў — незалежна ад наяўнасьці сярод работнікаў сяброў прафсаюзаў. Згодна з новым указам, афіцыйныя прафсаюзы маюць права кантраляваць выкананьне працоўнага заканадаўства ў любых суб’ектах гаспадараньня. Старшыня Беларускага Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў ***Аляксандр Ярашук*** наконт новага ўказу выказаўся так: “Насамрэч, дзяр-

жава, улады разглядаюць Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі як частку дзяржаўнай сістэмы, як дзяржаўную структуру”. Раней афіцыйныя прафсаюзы маглі ажыцьцяўляць кантроль толькі ў арганізацыях, дзе працуюць сябры ФПБ і створаныя першасныя прафсаюзныя арганізацыі. Цяпер ім дадзена права кантраляваць і прыватных прадпрымальнікаў, прадпрыемствы ўсіх формаў уласнасьці.

***21 ліпеня*** ў Нацыянальным рэестры прававых актаў РБ зарэгістраваны Закону “Аб унясеньні змяненьняў і дапаўненьняў у Закон РБ “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”, які ***Аляксандр Лукашэнка*** падпісаў 19 ліпеня. Згодна з арт. 12 гэтага Закону, у назвах грамадзкіх аб’яднаньняў, а таксама іх арганізацыйных структураў больш нельга выкарыстоўваць словы “Рэспубліка Беларусь”, “Беларусь”, “беларускі”, “нацыянальны”, “народны”, “калі іншае ня вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь”. Дакумент прадпісвае ўсім грамадзкім арганізацыям і саюзам штогод да 1 сакавіка прадастаўляць у рэгіструючыя органы інфармацыю пра свой колькасны склад, арганізацыйныя структуры і праведзеныя за год мерапрыемствы.

***21 ліпеня*** Міністэрства працы і сацыяльнай абароны распрацавала праект закону, паводле якога ў Беларусі афіцыйна лічыцца беспрацоўным можна будзе ня больш за тры гады. Чыноўнікі тлумачаць гэта патрэбаю дапасаваць беларускае заканадаўства да расейскага, дзе існуе такая норма. У Міністэрстве працы лічаць, што многія людзі, якія стаяць на ўліку ў службе занятасьці, сьвядома не жадаюць працаўладкоўвацца. Кіраўнік управы міністэрства ***Мікалай Коханаў*** кажа, што сустракаюцца сталыя наведнікі службаў занятасьці са “стажам беспрацоўя” да дзевяці гадоў. Паводле ягоных словаў, сёньня на ўліку беспрацоўя зарэгістраваныя 74 тысячы чалавек, а колькасьць незанятых працоўных месцаў — 45 тысяч. Незалежныя аналітыкі называюць прапановы Мінпрацы спробаю штучна зьменшыць праблему беспрацоўя. Законапраект перададзены на разгляд Палаты прадстаўнікоў.

***28 ліпеня Аб’яднаная грамадзянская партыя*** зьвярнулася ў Канстытуцыйны суд з просьбай разгледзець указы і дэкрэты прэзідэнта, пастановы ўраду па пытаньнях прадпрымальніцкай дзейнасьці. На думку сяброў АГП, там шмат неадпаведнасьцяў Асноўнаму закону. У заяве Палітрады АГП сказана: “Беларускія ўлады праводзяць мэтанакіраваную палітыку зьнішчэньня нацыянальнага прадпрымальніцтва. Творчы патэнцыял самых актыўных грамадзянаў краіны блакуюць чыноўнікі”. Дзеяньні ўладаў, на думку кіраўніцтва АГП, “амаральныя і наносяць прамыя страты Беларусі”, паколькі дзяржава “не атрымлівае новых працоўных месцаў, інвестыцыяў, інавацыяў”. Яшчэ больш пагоршыў становішча бізнэсоўцаў Указ прэзідэнта № 285 ад 18 чэрвеня “Аб некаторых мерах па рэгуляваньні прадпрымальніцкай дзейнасьці”, адзначаецца ў дакуменце.

***2 жніўня*** стала вядома, што звыш 30 тысячаў дзяцей, што жывуць у Гомельскай вобласьці, страцілі сёлета права на бясплатнае аздараўленьне, прадугледжанае чарнобыльскім законам. Страта дзецьмі магчымасьці бясплатна падмацаваць здароўе зьвязанае з пастановай беларускага ўраду. Паводле яе, 48 населеных пунктаў, у тым ліку гарады Жлобін і Рагачоў, аб'яўленыя чыстымі ад радыяцыі. У рэгіёне цяпер пашыраецца аздараўленьне ў мясцовых летніках. Да 24 стацыянарных сёлета прыбавілася 8 летнікаў, арганізаваных на базе розных санаторыяў. Такім чынам мяркуецца аздаравіць 55 тысячаў дзяцей. Многія бацькі не ў захапленьні ад пашырэньня аздараўленьня менавіта ў сваім рэгіёне, дзе зямля асабліва моцна заражаная чарнобыльскай радыяцыяй.

***17 жніўня*** выйшаў новы варыянт прэзідэнцкага ўказу пра “Пра міжнародную тэхнічную дапамогу”, у якім забараняецца атрыманьне і выкарыстаньне міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў “антыканстытуцыйных мэтах”. Забараняецца атрымліваць міжнародную тэхнічную дапамогу «для захопу ці скіданьня дзяржаўнай улады, умяшальніцтва ва ўнутраныя справы Беларусі, для распальваньня сацыяльнай, нацыянальнай і рэлігійнай варожасьці». Дапамога таксама ня можа выкарыстоўвацца для падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў, рэферэндумаў, масавых акцыяў, вырабу агітацыйных матэрыялаў. У прэсавай службе Лукашэнкі паведамілі, што ўказ адносіць да міжнароднай тэхнічнай дапамогі бясплатную дапамогу ў форме арганізацыі і правядзеньня семінараў, канферэнцыяў і іншых грамадзкіх мерапрыемстваў. Арганізатары такіх мерапрыемстваў – атрымальнікі міжнароднай тэхнічнай дапамогі павіны падаваць інфармацыю аб іх арганізацыі і правядзеньні ў камісію па пытаньнях міжнароднага тэхнічнага супрацоўніцтва. Міжнародная тэхнічная дапамога – гэта грашовыя сродкі, дастаўка абсталяваньня ды іншай маёмасьці для рэалізацыі пэўных праектаў, а таксама правядзеньне канферэнцыяў ці семінараў. Атрымліваць дапамогу маюць права дзяржаўныя органы Рэспублікі Беларусь, юрыдычныя асобы і грамадзяне краіны. На думку прадстаўнікоў беларускага трэцяга сектару, станоўчых ці адмоўных зьменаў новы ўказ не прынясе: атрымаць фінансаваньне па лініі міжнародных донарскіх арганізацыяў будзе па-ранейшаму складана.

***23 жніўня Аляксандр Лукашэнка*** падпісаў Указ, які зьмякчае кантрактную сістэму найму працаўнікоў. Паводле прэсавай службы Аляксандра Лукашэнкі, Указ скіраваны на абмежаваньне суб'ектывізму наймальнікаў у пытаньнях заключэньня і спыненьня кантрактаў. Цяпер тэрмін працягу кантракту павінен быць ня меншым за адзін год. Тэрмін кантрактаў з цяжарнымі жанчынамі й тымі, хто знаходзіцца ў адпачынку з прычыны дагляду дзіцяці да трохгадовага ўзросту, мусіць быць ня меншым, чым да сканчэньня гэтых адпачынкаў. З жанчынамі 53 гадоў і мужчынамі 58 гадоў кантракты павінны заключацца ня менеі чым на два гады. Беларускі кан-

грэс дэмакратычных прафсаюзаў з 1999 году выступае супраць кантрактнай сістэмы, уведзенай Дэкрэтам Аляксандра Лукашэнкі нумар 29. Новы ўказ А.Лукашэнкі, хаця і зьмякчае негатыўныя наступствы кантрактнай сістэмы, у цэлым нічога не мяняе, лічыць лідэр БКДП спадар Ярашук: "Я з усёй адказнасьцю магу заявіць: гэта тое самае, што ўдасканаліць прыгоннае права ці рабаўладальніцкі лад. Па-сутнасьці, гэтыя крокі не скасоўваюць прыгоннага характару кантрактнай сістэмы, якая сёньня існуе ў краіне".

***12 верасьня*** прэс-служба прэзідэнта распаўсюдзіла інфармацыю аб тым, што ***Аляксандр Лукашэнка*** падпісаў указ, якім прадугледжаны парадак вызваленьня кіраўніком краіны ад крымінальнай адказнасьці асобаў, якія ўчынілі злачынствы, зьвязаныя з нанясеньнем стратаў дзяржаўнай уласнасьці. Згодна з указам, грамадзяніна могуць вызваліць ад крымінальнай адказнасьці, калі ён пакаяўся ў злачынстве, добраахвотна кампенсаваў страты, а таксама перадаў ва ўласнасьць дзяржаве прылады і сродкі ўчыненьня злачынства і маёмасьць, якую набыў злачынным шляхам. Неабходнасьць унясеньня зьменаў тлумачыцца тым, што гэта будзе стымуляваць пакаяньне асобы ў злачынстве і спрыяць прэвентыўным выхаваўчым мерам. Некаторыя юрысты і палітыкі лічаць, што ўказ перасьледуе іншыя мэты. На думку выканаўчага дырэктара БХК Алега Гулака, новы ўказ стане крокам да персаніфікацыі суда: "Падобныя ўказы сьведчаць аб тым, што кіраўнік дзяржавы ўсё больш манапалізуе ўладу, у тым ліку і судовую. Бярэ на сябе функцыі прызначэньня пакараньня і вызваленьня ад пакараньня. З другога боку, гэты ўказ перш за ўсё скіраваны на чыноўнікаў. Гэта метад паставіць у большую залежнасьць ад сябе чыноўнікаў: маўляў, добраахвотна ўсё вярні, будзь лаяльны да мяне — і я магу цябе памілаваць. Толькі я караю, я вызваляю, я бог, я — гаспадар. Гэта персаніфікацыя судовай улады".

***19 верасьня*** ў Канстытуцыйным судзе пачаўся разгляд справы наконт штампу ў пашпарце, які дазваляе выезд ва ўсе краіны сьвету. Паводле рашэньня Канстытуцыйнага суда ад 27 верасьня 2002 году, Савет Міністраў мусіў да 31 сьнежня 2005 году стварыць такую сістэму ўліку, якая дазволіць грамадзянам Беларусі выязджаць за мяжу бяз штампу ў пашпарце. Аднак беларускі ўрад зьвярнуўся ў Канстытуцыйны суд з просьбай працягнуць тэрмін рэалізацыі заключэньня. Прычына ў тым, што дзяржаўныя структуры не стварылі сьпецыяльную сістэму ўліку. У сваім выступе прадстаўнік сакратарыяту Савету Рэспублікі Аляксандр Філановіч нагадаў, што ў 2004 годзе амаль 350 тысяч чалавек атрымалі штамп у пашпарт і заплацілі за гэта больш за 9 мільярдаў рублёў. Паводле спадара Філановіча, гэтых грошай на траціну больш, чым патрабуецца для стварэньня сістэмы ўліку. У выніку атрымліваецца, што дзяржава займаецца продажам права выезду за мяжу і прадае гэтае права ўтрая даражэй, чым

эканамічна абгрунтавана. Гэта зьяўляецца эканамічным абмежаваньнем правоў грамадзянаў.

***21 верасьня*** прынятая пастанова Міністэрства юстыцыі, згодна з якой блокі палітычных партыяў і прафсаюзаў, а таксама рухі, ініцыятывы і кааліцыі грамадзянаў павінны мець дзяржаўную рэгістрацыю, забараняецца дзейнасьць незарэгістраваных грамадзкіх структураў на тэрыторыі Беларусі. Юрыст ***Уладзімір Лабковіч*** тлумачыць, што Грамадзянскі кодэкс не патрабуе рэгістрацыі грамадзянскіх ініцыятываў, а перадвыбарчыя блокі палітычных партыяў рэгіструюцца Цэнтрвыбаркамам: “Баюся, што выступленьне ад імя гэтых ініцыятываў будзе трактавацца як дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі з усімі наступствамі. Для сродкаў масавай інфармацыі гэта можа быць падставай для ліквідацыі, а для асобаў — прыцягненьне да адміністрацыйнай адказнасьці, штраф ці нават адміністрацыйны арышт. Гэта працяг падрыхтоўкі да прэзідэнцкай кампаніі. Паколькі асноўнымі суб’ектамі будуць якраз нефармальныя аб’яднаньні, таму што ўсе грамадзкія аб’яднаньні яны ўжо пазьнішчалі, яны цяпер як бы наносяць апошні ўдар”.

***4 кастрычніка*** Канстытуцыйны суд прыняў заключэньне па справе, якая была распачатая судом 5 верасьня па прапанове Савета Міністраў Беларусі. Урад прасіў памяняць тэрмін рэалізацыі заключэньня Канстытуцыйнага суда ад 27 верасьня 2002 году. Ранейшым рашэньнем суд прапанаваў ураду да 31 сьнежня 2005 году стварыць неабходную сістэму ўліку, якая б дазваляла грамадзянам Беларусі ажыцьцяўляць іх канстытуцыйнае права на свабоду перамяшчэньня без прастаўленьня ў пашпарце “дазваляльнай” адзнакі. Канстытуцыйны суд прызнаў, што адказныя дзяржаўныя структуры не прынялі неабходных мераў па выкананьні рашэньня суда. Аднак, улічваючы прапановы ўраду, падтрыманыя Палатай прадстаўнікоў (ініцыятарам вытворчасьці па справе), суд працягнуў тэрмін выкананьня свайго рашэньня. Ураду дадзены час “да завяршэньня працы па стварэньні адпаведнай сістэмы ўліку”. Ураду суд прапанаваў на час захаваньня штампаў у пашпартах, якія дазваляюць выезд ва ўсе краіны сьвету, прыняць дадатковыя захады па спрашчэньні парадку іх прастаўленьня.

***17 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка*** падпісаў указ аб зьменах у парадку вызваленьня суб’ектаў прадпрымальніцкай дзейнасьці ад эканамічнай адказнасьці. Згодна з указам, рашэньне аб вызваленьні суб’ектаў гаспадараньня ад эканамічнай адказнасьці, уключаючы ўжо вызначаную судом, прымаецца выключна кіраўніком дзяржавы. Пры гэтым прадугледжаная магчымасьць вызваленьня ад эканамічных санкцыяў ня толькі за падатковыя, але і за іншыя парушэньні, у тым ліку ў галіне будаўніцтва, мытнай справы, гандлю, банкаўскай дзейнасьці.

***27 кастрычніка*** Палатай прадстаўнікоў у першым чытаньні прыняты законапраект “Аб супрацьдзеяньні экстрэмізму”, які ставіць палітычных апанентаў цяперашняга беларускага рэжыму ў надзвычайна складаныя ўмовы. Па сутнасьці, любыя іх дзеяньні можна будзе падвесьці пад новы заканадаўчы акт. Сваё меркаваньне пра законапраект “Аб супрацьдзеяньні экстрэмізму” выказвае праваабаронца Алесь Бяляцкі: “Прапанаваны праект закону нічога асабліва новага не нясе, мала што дапаўняе. Таму асаблівага перапалоху рабіць ня трэба. Усё тое, што рабілі ўлады ў дачыненьні да грамадзкіх арганізацыяў, партыяў, асобаў, на падставе дзеючага заканадаўства, перанесена ў новы законапраект. Іншая справа, што зьмяняецца лексіка, і зьмяняюцца, я сказаў бы, ярлыкі, якія могуць быць пачэпленыя на няўрадавыя арганізацыі. Цяпер будуць казаць пра экстрэмізм. Гэта перадае большую нярвовасьць, у пэўнай ступені небясьпеку, якую, як быццам бы, улады бачаць сёньня ў дзейнасьці некаторых арганізацыяў і асобаў. Усе тыя кары, якія выкладзеныя ў згаданым законе (пісьмовае папярэджаньне, прыпыненьне дзейнасьці, ліквідацыя няўрадавых арганізацыяў), прапісаны ў законе аб няўрадавых арганізацыях. І на гэтай прававой аснове ўлады пасьпяхова распраўляюцца з грамадзкімі апанентамі. За тры гады спынена дзейнасьць больш як 150 арганізацыяў з дапамогаю Міністэрства юстыцыі. Тое ж тычыцца палітычных партыяў. У законе аб СМІ ёсьць усе абмежавальныя меры, якія цяпер унесеныя ў законапраект “Аб супрацьдзеяньні экстрэмізму”. Але там гэта не называецца экстрэмізмам. Цяпер мы проста пераходзім на іншы ўзровень палітычнай лексікі. Новы законапраект выконвае ролю прапагандысцкага і ідэалагічнага ціску».

***14 лістапада*** Савет Міністраў Беларусі прыняў пастанову, сутнасьць якой заключаецца ў больш жорсткім дзяржаўным кантролі за правядзеньнем сацыялагічных апытаньняў на грамадзка-палітычныя тэмы і публікацыяй іх вынікаў. Згодна з пастановай, усе сацыялагічныя дасьледаваньні палітычнага характару будзе кантраляваць Камісія па апытаньнях грамадзкай думкі пры Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Яна будзе займацца акрэдытацыяй юрыдычных асобаў, якія прэтэндуюць на правядзеньне апытаньняў грамадзкай думкі, зьвязаных з рэферэндумамі, выбарамі прэзідэнта і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і Савету Рэспублікі, а таксама грамадзка-палітычнай сітуацыяй у краіне і публікацыі вынікаў дасьледаваньняў у медыях. Камісія мае паўнамоцтвы кантраляваць дзейнасьць сацыялагічных службаў на любых этапах правядзеньня апытаньня, і ў выпадку выяўленьня парушэньняў Камісія можа скасаваць акрэдытацыю.

***25 лістапада*** Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прыняла ў першым чытаньні законапраект “Аб унясеньні дапаўненьняў і зьменаў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па

пытаньні ўзмацненьня адказнасьці за дзеяньні, скіраваныя супраць чалавека і грамадзкай бясьпекі", якi ў тэрміновым парадку быў унесены А. Лукашэнкам да разгляду парламенту. Дадзены законапраект прадугледжвае ўнясеньне дапаўненьняў і зьменаў у Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь. Так, у прыватнасьці, згодна з дадзеным законапраектам, у дзеючы Крымінальны кодэкс плануецца ўнесьці шэраг новых артыкулаў: незаконная арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, фонду альбо ўдзел у іх дзейнасьці; дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь і шэраг іншых артыкулаў падобнага кшталту. Гэтыя папраўкі прадугледжваюць арышт ад шасьці месяцаў да двух гадоў за ўдзел у дзейнасьці арганізацыяў, якія пазбавіліся дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама за прадастаўленьне замежнай дзяржаве або міжнароднай арганізацыі зьвестак аб палітычным, эканамічным, сацыяльным, ваенным ці міжнародным становішчы Рэспублікі Беларусь, якія суд палічыць лжывымі. Праваабаронцы Беларусі выступілі супраць увядзеньня палітычных артыкулаў у крымінальнае заканадаўства: "Прапанаваныя зьмены ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь супярэчаць ня толькі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, але і міжнародным актам у галіне правоў чалавека, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусь: Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнароднай дэкларацыі правоў чалавека, асноўным прынцыпам АБСЕ. Дадзеныя зьмены парушаюць такія асноватворныя прынцыпы правоў чалавека, як свабода меркаваньняў і пераканаваньняў, свабода атрыманьня і распаўсюду інфармацыі, свабода слова, свабода асацыяцыяў і інш.  Мы глыбока перакананыя, што гэты законапраект носіць выключна рэпрэсіўны характар, скіраваны на запалохваньне грамадзянаў краіны напярэдадні чарговых прэзідэнцкіх выбараў. На фоне агульнага пагаршэньня сітуацыі з правамі чалавека, фактычнай ліквідацыі незалежных СМІ, гэтыя зьмены дзеючага крымінальнага заканадаўства прывядуць да яшчэ большага ўзмацненьня палітычных рэпрэсіяў, увергнуць Беларусь у найгоршыя часы савецкага таталітарызму".

***У лістападзе Аляксандр Лукашэнка*** падпісаў чарговы дэкрэт, якім уносяцца зьмены і дадаткі ў ягоны сакавіцкі дэкрэт "Аб некаторых мерах па супрацьдзеяньні гандлю людзьмі". У новым дэкрэце №15, у прыватнасьці, адзначаецца, што арганізацыі, якія займаюцца працаўладкаваньнем беларускіх студэнтаў за мяжой падчас летніх вакацыяў, мусяць атрымаць адмысловую дзяржаўную ліцэнзію. Пры гэтым неабходная згода Міністэрства адукацыі па кожнай канкрэтнай студэнцкай праграме. У сакавіцкім дэкрэце ўжо было замацаванае палажэньне, згодна з якім выезд студэнтаў на вучобу за мяжу можа адбывацца толькі са згоды Мінадукацыі. У новым жа дакуменце рэгулюецца нават працэдура кароткатэрміновых выездаў студэнтаў і навучэнцаў для ўдзелу ў спартовых ці культурных мерапрыемствах. На іх цяпер таксама трэба мець дазвол Міністэрства адукацыі альбо мясцовых органаў выканаўчай улады. "Адназначна відаць,

што беларускія ўлады працягваюць палітыку самаізаляцыі краіны. Спрабуюць абмежаваць адукацыйныя, навучальныя, грамадзкія кантакты моладзі. Беларускія ўлады баяцца дэмакратычных уплываў, якія студэнты, навучэнцы, натуральна, прывязуць з-за мяжы, убачыўшы іншы ўзровень адносінаў у грамадзтве, чым той, які на сёньняшні дзень склаўся ў Беларусі", — лічыць праваабаронца Алесь Бяляцкі.

***1 сьнежня*** Абсерваторыя па абароне правоў праваабаронцаў, супольная праграма Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека (FIDH) і Сусьветнай Арганізацыі Супраць Катаваньняў (OMCT) выказала сваю найглыбейшую занепакоенасьць прыняцьцем 25 лістапада 2005 году Палатай прадстаўнікоў у першым чытаньні папраўак да беларускага Крымінальнага кодэксу, якія ўзмацняюць крымінальную адказнасьць за "Дзеяньні супраць асобаў і грамадзкай бясьпекі". "Абсерваторыя вельмі занепакоеная гэтай новай часткай заканадаўства, якая ўяўляе сур'ёзную пагрозу для самой дзейнасьці незалежных праваабаронцаў у Беларусі і зьяўляецца дадатковым інструментам уладаў для жорсткага падаўленьня грамадзянскай супольнасьці", — гаворыцца ў адмысловай заяве. Абсерваторыя таксама ўказвае, што гэтыя папраўкі ўтрымліваюць грубае парушэньне міжнародных інструментаў правоў чалавека і заклікае беларускія ўлады спыніць працэс прыняцця гэтых папраўак і прывесьці беларускае заканадаўства ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі з пункту гледжаньня свабоды аб'яднаньняў і выяўленьня.

***2 сьнежня*** Міжнародная Хельсінская Федэрацыя Правоў Чалавека і Беларускі Хельсінскі Камітэт выказалі глыбокую занепакоенасьць новым законапраектам, які "парушыць працу праваабаронцаў ды іншых сегментаў Беларускай грамадзянскай супольнасьці". "Недакладнасьць фармулёвак у прапанаваных папраўках да Крымінальнага і Крымінальна-працэсуальнага кодэксаў, — гаворыцца ў сумеснай заяве МХК і БХК, — дае ўладам магчымасьць для інтэрпрэтацыі законнай праваабарончай дзейнасьці як незаконных спробаў дыскрэдытаваць беларускую дзяржаву або пашкодзіць ейнаму іміджу". МХФ і БХК асудзілі прапанаваныя зьмены ў заканадаўстве на той падставе, што яны прадугледжваюць узмацненьне перасьледу актывістаў грамадзкай супольнасьці і зьяўляюцца відавочнай спробай далей абмежаваць прастору, у якой незалежныя галасы могуць выказваць сваё меркаваньне.

***2 сьнежня*** ўсяго адна гадзіна спатрэбілася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, каб прыняць у другім чытаньні папраўкі ў Крымінальны кодэкс. Пры галасаваньні за законапраект яго падтрымалі 97 дэпутатаў, і толькі чатыры выказаліся супраць. Для таго, каб гэты законапраект стаў законам, ён павінен быць ухвалены Саветам Рэспублікі і падпісаны кіраўніком дзяржавы. 8 сьнежня на пленарным паседжаньні павінныя разглядацца

папраўкі ў Крымінальны кодэкс, ухваленыя Палатай прадстаўнікоў. Як паведамілі ў эксьпертна-прававым упраўленьні Савету Рэспублікі, законапраект паступіў ад прэзідэнта на разгляд верхняй палаты гэтак жа ў тэрміновым парадку, як і ў ніжнюю палату.

***3 сьнежня*** кіраўнік Офісу АБСЕ ў Менску, амбасадар ***Оке Петэрсан*** выказаў глыбокую заклапочанасьць з нагоды прыняцьця Палатай прадстаўнікоў зьменаў у Крымінальны кодэкс Беларусі, якія “могуць нанесьці сур’ёзны ўдар па грамадзянскай супольнасьці і пэўных асобах”. “Прадугледжаныя законам палажэньні могуць прывесьці да грубых парушэньняў шэрагу прынцыпаў і абавязацельстваў АБСЕ, прынятых Беларусьсю, – сказаў амбасадар Аке Пэтэрсан. – Увядзеньне новага артыкулу “дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь” выклікае асаблівую заклапочанасьць, паколькі прадугледжваецца крымінальная адказнасьць за прадстаўленьне міжнароднай арганізацыі няпраўдзівай інфармацыі адносна сітуацыі ў краіне. Офіс АБСЕ ў Менску лічыць, што гэта можа мець адмоўныя наступствы для супрацоўніцтва паміж Офісам і грамадзянскай супольнасьцю і можа на справе падарваць намаганьні Офісу ў выкананьні свайго мандату”.

***8 сьнежня*** Савет Рэспублікі аднагалосна зацьвердзіў папраўкі да Крымінальнага кодэксу, унесеныя ад імя Лукашэнкі старшынёй КДБ. Сьпецыяліст у галіне крымінальнага права, прадстаўнік эксьпертна-прававога ўпраўленьня Савету Рэспублікі ***Васіль Цімошчанка*** сказаў, што прынцыповых заўваг па артыкуле “дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь” не было. Пакінулі і прапанаваныя пакараньні – да двух гадоў пазбаўленьня волі. Спадар Цімошчанка мяркуе, што пры адэкватным і дакладным выкананьні нормаў, гэты законапраект не павінен прывесьці да парушэньня правоў чалавека: “ Я лічу, што гэта норма блізкая да нормаў заканадаўства многіх еўрапейскіх краін і тут многае залежыць ад практыкі прымяненьня. Закон дастаткова ў гэтых адносінах канкрэтны і, я думаю, што парушэньняў не павінна быць”.

***8 сьнежня*** Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі ў другім чытаньні прыняла праект закону аб унясеньні зьменаў у Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы, якія прадугледжваюць вызваленьне ад крымінальнай адказнасьці асобаў, якія нанесьлі эканамічную страту дзяржаве пры вяртаньні гэтай страты і раскайваньні. Унесенымі зьменамі, у прыватнасьці, прадугледжваецца “вызаленьне ад крымінальнай адказнасьці ў сувязі з дабравольнай кампенсацыяй нанесенай страты”. Падчас абмеркаваньня законапраекту было заяўлена, што ён распрацаваны ў сувязі з выданьнем прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам адпаведнага ўказу, які ўступіць у дзеяньне толькі пасьля прыняцьця паправак у крымінальнае заканадаўства. Згодна з загадам, рашэньне аб

вызваленьні ад эканамічнай адказнасьці, у тым ліку ўжо прымененай судом, прымаецца выключна кіраўніком дзяржавы, растлумачылі ў прэзідэнцкай прэс-службе, дадаўшы, што "забясьпечаная магчымасьць вызваленьня ад эканамічных санкцыяў ня толькі за падаткавыя, але і за іншыя парушэньні, у тым ліку ў галіне будаўніцтва, мытнай справы, гандлю, банкаўскай дзейнасьці".

***9 сьнежня*** Рада БНР прыняла заяву ў сувязі з прыняцьцем паправак у Крымінальны кодэкс. "Рада БНР разглядае прыняцьце Палатай прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь паправак да Крымінальнага Кодэксу як чарговы крок у легалізацыі тэрору, скіраванага супроць усякай палітычнай, рэлігійнай, грамадзкай ці культурнай ініцыятывы, калі такая ініцыятыва непадкантрольная афіцыйнай уладзе. Крыміналізацыя грамадзянаў за гэтак званую "дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь" і за іхні ўдзел у грамадзкім жыцьці нішчыць права грамадзяніна на свабоду слова і свабоду асацыяцыі ды вяртае Беларусь у злачынную практыку часоў сталіншчыны", — гаворыцца ў заяве. Рада БНР таксама нагадвае, што любая спроба ўзурпацыі ўлады ў Беларусі, абмежаваньне правоў грамадзянаў і дзейнасьць, скіраваная на страту дзяржаўнай незалежнасьці, немінуча прывядуць да крымінальнай і маральнай адказнасьці цяперашняга кіраўніцтва рэспублікі.

***9 сьнежня*** Сусьветная кампанія за свабоду выказваньня ARTICLE 19 выступіла з заявай у сувязі з прыняцьцем абедзвюма палатамі беларускага парламента "драконаўскіх" паправак у Крымінальны кодэкс. На думку арганізацыі, гэта нанясе чарговы ўдар па свабодзе выказваньня, якая ў Беларусі і бяз гэтага падвяргаецца нападам. ARTICLE 19 лічыць дапаўненьні "несумяшчальнымі з правам на свабоду выказваньня, якое гарантавана беларускай Канстытуцыяй і артыкулам 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, якое Беларусь ратыфікавала". Арганізацыя заклікала Аляксандра Лукашэнку ўстрымацца ад падпісаньня законапраекту і наогул адмовіцца ад гэтай заканадаўчай ініцыятывы.

***16 сьнежня*** Палата прадстаўнікоў, якая, згодна з Канстытуцыяй, прызначае дату выбараў кіраўніка дзяржавы, на пазачарговым паседжаньні прызначыла выбары на 19 сакавіка. За гэта прагаласавалі ўсе 104 дэпутаты, якія знаходзіліся ў Авальнай зале. Уладзімір Канаплёў, які вёў паседжаньне, паведаміў, што эксьперты ў правядзеньні выбараў прызналі, што найлепшым часам для такіх кампаній зьяўляецца вясеньні перыяд. Многія палітыкі лічаць, што прызначэньне прэзідэнцкіх выбараў на 19 сакавіка ставіць у няроўныя ўмовы ўсіх удзельнікаў кампаніі. Былы старшыня Вярхоўнага Савету, юрыст Мечыслаў Грыб перакана765ны, што прызначаныя на 19 сакавіка выбары – датэрміновыя. Яны адбудуцца амаль за чатыры месяцы да сканчэньня паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі. Але датэрміновыя выбары праводзяцца толькі ў адным выпадку — калі вакан-

сія прэзідэнта застаецца вольная. Прычым парадак іх прызначэньня не прапісаны ў Канстытуцыі і заканадаўстве. Паводле спадара Грыба, Палата прадстаўнікоў узялася даволі вольна тлумачыць Канстытуцыю, замест таго, каб прыняць адпаведны закон. Мечыслаў Грыб сьцьвярджае, што ў краіне можа скласьціся сітуацыя падвойнага прэзідэнцтва.

***20 сьнежня*** ў Нацыянальны рэестр прававых актаў унесены Закон аб зьмяненьнях і дапаўненьнях у Крымінальны кодэкс, якія прадугледжваюць адказнасьць у выглядзе пазбаўленьня волі да 5 гадоў за дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь і органаў улады, за заклікі, якія могуць нанесьці ўрон краіне, дэстабілізацыю сітуацыі і іншыя дзеяньні. А. Лукашэнка падпісаў папраўкі яшчэ 15 сьнежня, але ягоная прэсавая служба аб гэтым не паведамляла. Папраўкі ў Крымінальны кодэкс уступаюць у сілу праз 10 дзён пасьля іх афіцыйнай публікацыі.

## 2. Сьмяротнае пакараньне – парушэньне права на жыцьцё

***24 студзеня*** на сустрэчы з журналістамі старшыня Вярхоўнага суда Беларусі ***Валянцін Сукала*** паведаміў, што ў 2004 годзе беларускімі судамі былі вынесеныя два сьмяротныя прысуды. Па ягоных словах, гэта гаворыць пра тое, што “мы рэальна падышлі да ўвядзеньня мараторыя на сьмяротнае пакараньне”. Альтэрнатывай прымяненьня вышэйшай меры пакараньня, па меркаваньні старшыні Вярхоўнага суда, стала ўвядзеньне новым Крымінальным кодэксам пажыцьцёвага зьняволеньня. У 2004 годзе на яго былі асуджаныя 12 чалавек. Гэта асобы, якія ўчынілі асабліва цяжкія злачынствы.

***5 красавіка*** Міжнародная праваабарончая арганізацыя ***“Amnesty International”*** у сваёй справаздачы за 2004 год паведаміла, што ўсё болей краінаў адмаўляюцца ад сьмяротнага пакараньня. Але пры гэтым за мінулы год было пакарана сьмерцю найбольш людзей, чым у любы іншы з апошніх 25 гадоў. Свой унёсак у гэта зрабіла і Беларусь. “Адзіная краіна ў Еўропе, якая дагэтуль ужывае сьмяротнае пакараньне – гэта Беларусь, і мы паведамілі пра пяць выпадкаў сьмяротнага пакараньня летась”, — сказала прадстаўніца “Amnesty International” ***Эда Дабравольна***. Спадарыня Дабравольна таксама паведаміла, што ў СНД акрамя Беларусі сьмяротнае пакараньне ўжывае толькі Узьбекістан, і абедзьве краіны не паведамляюць афіцыйна пра некаторыя выпадкі такога пакараньня.

***10 кастрычніка*** ў сьвеце адзначаецца дзень супраць сьмяротнага

пакараньня. Беларусь і Узьбекістан застаюцца апошнімі краінамі на тэрыторыі былога Савецкага Саюзу, дзе дагэтуль ужываецца сьмяротная кара. Гэта адзначыў у сваім звароце, прымеркаваным да Сусьветнага дня супраць сьмяротнага пакараньня, кіраўнік ПАСЕ Рэнэ Ван дэр Ліндэн. Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў мае прэтэнзіі да Беларусі ня толькі ў сувязі з захаваньнем сьмяротнай кары, але і адносна формы выкананьня сьмяротных прысудаў. У адмысловым мемарандуме ААН ў справе катаваньняў выкананьне сьмяротнай кары ў Беларусі прыроўненае да катаваньня-. Паводле дадзеных дэпартаменту выкананьня пакараньняў МУС, з 1997 году ў Беларусі было вынесена 126 сьмяротных прысудаў. У дэпартаменце між тым кажуць, што за апошнія гады колькасьць сьмяротных прысудаў паменела: калі напрыканцы 1990 гадоў суды выносілі па 30-40 сьмяротных прысудаў штогод, дык ў 2003-м годзе было вынесена ўжо толькі 4, а ў 2004 — толькі 2 сьмяротныя прысуды. Менскі сьледчы ізалятар — адзінае месца ў Беларусі, дзе выконваюцца сьмяротныя прысуды.Звычайна праходзіць ня меней за год паміж вынясеньнем прысуду і яго выкананьнем. Асуджаны на сьмерць мае права абскардзіць прысуд у Вярхоўным судзе, а апошняя ягоная надзея – камісія па памілаваньнях, якая дзейнічае пры прэзідэнце Беларусі. Любое з рашэньняў гэтай камісіі падпісвае асабіста ***Аляксандр Лукашэнка***.

## 3. Адстойваньне права на праўдзівую інфармацыю пра зьніклых

***12 студзеня*** на прэс-канферэнцыі кіраўнік МУС ***Уладзімір Навумаў*** заявіў, што органы ўнутраных справаў Беларусі робяць усё магчымае дзеля росшуку бяз вестак зьніклых беларускіх грамадзянаў. Пры гэтым ён падкрэсьліў, што не падзяляе бяз вестак зьніклых на звычайных грамадзянаў і “нечым адрозных ад усіх іншых” (пытаньне журналіста тычылася росшуку Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзьмітрыя Завадзкага). Міністр паведаміў, што на дадзены момант у Беларусі “астатак” бяз вестак зьніклых за апошнія 12 гадоў складае 1 000 чалавек. Гэта, па ягоных словах, адзін з найменшых паказчыкаў у краінах СНД. Зараз каля 100 беларускіх грамадзянаў расшукваецца за мяжой. Трэцяя частка з іх абвешчаная ў вышук па просьбе МУС рэспублікі ў краінах Еўрапейскага Саюзу. Увогуле, як адзначыў У. Навумаў, “праблема бяз вестак зьніклых існуе ў любым грамадзтве”.

***17 студзеня*** праваабаронца ***Алег Волчак*** перадаў у пракуратуру г.Менску дакументы, датычныя некаторых абставінаў зьнікненьня ў 1999 годзе былога міністра ўнутраных справаў Беларусі Юрыя Захаранкі. Пра гэта Алег

Волчак распавёў на прэзентацыі грамадзкага аб'яднаньня "Абаронцы Айчыны", якое аб'ядноўвае дэмакратычна настроеных былых супрацоўнікаў беларускіх праваахоўных органаў і сілавых структураў. Па словах праваабаронцы, дакументы ён атрымаў ад былых пракурорскіх работнікаў Дзьмітрыя Петрушкевіча і Алега Случака, якія ў пачатку 2001 году пакінулі Беларусь і на сёньняшні дзень пражываюць у ЗША. У сваю чаргу, як сказаў А. Волчак, некаторыя зьвесткі па справе аб зьнікненьні Ю. Захаранкі яны атрымалі з КДБ пасьля адстаўкі старшыні Камітэту дзяржаўнай бясьпекі Леаніда Ерына. Паводле інфармацыі Алега Волчака, у прадстаўленых у пракуратуру матэрыялах размова ідзе пра гісторыю стварэньня быццам бы існуючых у Беларусі "эскадронаў сьмерці", іх колькасным складзе і кіраўніцтве, падрабязнасьцях выкраданьня Юрыя Захаранкі, месцы ягонага пахаваньня. Акрамя таго, прыводзіцца сьпіс з 30 чалавек, якія, па сьцьвярджэньні Д. Петрушкевіча і А. Случака, могуць нешта ведаць пра дзейнасьць гэтых "эскадронаў сьмерці". У гэтым сьпісе – супрацоўнікі МУС, КДБ, пракуратуры.

***19 студзеня Зінаіда Ганчар*** накіравала лісты ў ФСБ і Пракуратуру Расійскай Федэрацыі, у якіх просіць кіраўнікоў праваахоўных органаў правесьці сьледзтва па справе выкраданьня яе мужа, віцэ-сьпікера Вярхоўнага Савету Беларусі 13-га скліканьня Віктара Ганчара. Жонка зьніклага палітыка ў сваіх лістах да кіраўнікоў ФСБ і пракуратуры Расіі спаслалася на заявы вышэйшых службовых асобаў Беларусі наконт таго, што да выкраданьня яе мужа могуць быць датычныя расейскія сьпецслужбы. Яна паведаміла, што пра гэта час ад часу паведамляюць беларускія дзяржаўныя СМІ. Зінаіда Ганчар просіць кіраўнікоў ФСБ і пракуратуры скарыстацца канвенцыяй аб прававой дапамозе паміж Расіяй і Беларусьсю.

***30 сакавіка*** праваабаронца ***Алесь Бяляцкі***, які прымаў удзел у працы 61-ай сесіі Камісіі па правах чалавека ААН у Жэневе, па просьбе жонкі зьніклага ў 1999 годзе вядомага палітыка Віктара Ганчара Зінаіды перадаў ад яе зварот да сьпецдакладчыка па Беларусі Адрыяна Севярына. У сваім звароце Зінаіда Ганчар перш за ўсё выказала шкадаваньне адносна таго, што з-за пазіцыі беларускіх уладаў Севярын не змог сустрэцца з роднымі выкрадзеных палітыкаў і журналіста. Яна таксама канстатавала, што на сёньняшні момант ні адно з патрабаваньняў, выкладзеных у папярэдняй Рэзалюцыі ААН, дзе выкладзеныя патрабаваньні да беларускіх уладаў аб правядзеньні поўнага, аб'ектыўнага і незалежнага расьсьледаваньня палітычна матываваных выкраданьняў і прыцягненьня да адказнасьці датычных да іх асобаў, ня выкананыя. Зінаіда Ганчар выказала спадзяваньне, што будзе прынятая чарговая Рэзалюцыя па Беларусі, і ў ёй будзе асуджаная пазіцыя беларускіх уладаў, якія ўтойваюць праўдзівую інфармацыю, спрыяюць пакрыцьцю злачынцаў. Пры гэтым З. Ганчар выказала ўпэўненасьць, што пры сёньняшнім рэжыме раскрыцьцё справаў палітычных выкраданьняў немагчымае.

***7 красавіка*** маці Дзьмітрыя Завадзкага ***Вольга Рыгораўна Завадзкая*** паведаміла, што атрымала паведамленьне з Пракуратуры Рэспублікі Беларусь пра "ўзнаўленьне папярэдняга расьследаваньня ў адпаведнасьці з ч.3 ст. 249 УПК Рэспублікі Беларусь", у якім сказана: "папярэдняе расьсьледваньне крымінальнай справы №980159, узбуджанай па факце бясьсьледнага зьнікненьня 7 ліпеня 2000 году Вашага сына Завадзкага Дзьмітрыя, 4 красавіка 2005 году ўзноўленае ў сувязі з неабходнасьцю правядзеньня сьледчых дзеяньняў па дадзенай справе".

***30 красавіка Вольга Завадзкая***, маці зьніклага аператара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага, ***Зінаіда Ганчар***, жонка зьніклага палітыка Віктара Ганчара, а таксамы сябры праваабарончых арганізацыяў наведалі маці Юрыя Захаранкі – ***Ульяну Захаранку***, якая жыве ў пасёлку Васілевічы Гомельскай вобласьці, каб павіншаваць яе з надыходзячым днём Перамогі. 7 траўня якраз спаўняецца шэсьць гадоў з моманту выкраданьня сына Ульяны Захаранка — былога міністра ўнутраных справаў, генерала Юрыя Захаранкі. Цягам мінулых гадоў улады так і не адказалі на пытаньне, дзе знаходзіцца Юрый Захаранка, а таксама Віктар Ганчар, Анатоль Красоўскі і Дзьмітрый Завадзкі. Ульяна Захаранка, як і раней, чакае свайго сына.

***4 траўня*** аднавіліся актыўныя сьледчыя дзеяньні па справе аб зьнікненьні аператара ОРТ ***Дзьмітрыя Завадзкага***. Сьледчую групу паранейшаму ўзначальвае сьледчы па асабліва важных справах Іван Бранчэль, які з памочнікамі ў 2001 годзе высьветліў, што да зьнікненьня аператара ОРТ датычная групоўка Ігнатовіча, які родам з Крупак, і ў час, калі зьнік Завадзкі, Ігнатовіча бачылі ва ўрочышчы Малінаўка пад Крупкамі з чалавекам, падобным да журналіста. Паводле хадайніцтва прадстаўніка сваякоў Завадзкага ***Гары Паганяйлы***, у Воршы сьледчая група рэспубліканскай пракуратуры правярае зьвесткі пра цела невядомага мужчыны, прывезенага ў 2000 годзе з Крупак і перазахаванага на мясцовых могілках. Паводле Гары Паганяйлы, невядомы можа быць Дзьмітрыем Завадзкім. У пракуратуры Беларусі не паведамляюць ніякіх падрабязнасьцяў, спасылаючыся на таямніцу сьледзтва.

***6 траўня*** ў Менску на Кастрычніцкай плошчы была спроба правесьці акцыю, прысьвечаную 6-й гадавіне зьнікненьня былога міністра ўнутраных справаў ***Юрыя Захаранкі***. Удзельнікі трымалі партрэты Юрыя Захаранкі, апранутага ў генеральскую парадную форму, спадзеючыся, што міліцыянты з разуменьнем паставяцца да акцыі і выкажуць нейкую даніну павагі былому міністру. Аднак яны змаглі прастаяць пару хвілінаў: адразу з двароў выйшлі сьпецпадразьдзяленьні байцоў АМАПу і выціснулі ўдзельнікаў з плошчы.

***7 траўня*** а першай гадзіне дня ў Віцебску 10 чалавек з бел-чырвона-

белымі шалікамі і партрэтамі зьніклага былога міністра ўнутраных справаў ***Юрыя Захаранкі*** выйшлі на пляц Волі і сталі ланцугом каля Мастацкага музею. Сябрам гарадзкіх арганізацый Аб'яднанай грамадзянскай партыі і Партыі БНФ, а таксама вядомаму праваабаронцы ***Валерыю Шчукіну***, які да іх далучыўся, удалося прастаяць на плошчы ўсяго хвілін дваццаць. Неўзабаве пад'ехалі некалькі міліцэйскіх машынаў. Намесьнік начальніка Кастрычніцкага райаддзелу Аляксей Шаховіч запатрабаваў, каб людзі з партрэтамі разышліся, у адваротным выпадку, запэўніў ён, усе яны будуць дастаўленыя ў пастарунак – добраахвотна або гвалтам. "Ланцуг неабыякавых людзей" на пляцы Волі распаўся. Партыйцы далей усклалі памятны вянок да Вечнага агню на Плошчы Перамогі. Некалькі міліцэйскіх машын праводзілі іх з Пляцу Волі па вуліцы Леніна, патрульныя міліцыянты сачылі за іхнымі дзеяньнямі аж да самага апошняга моманту, аднак ускладзены вянок з бел-чырвона-белай стужкай не кранулі.

***7 траўня*** каля 20-ці хвілінаў у Берасьці працягвалася акцыя, прымеркаваная да гадавіны зьнікненьня ***Юрыя Захаранкі***. Берасьцейскія актывісты апазіцыйных палітычных партыяў каля гандлёвага цэнтру "Юбілейны" ў мікрараёне "Усход" стварылі ланцуг і трымалі партрэты Юрыя Захаранкі, які зьнік шэсьць гадоў таму. Гэтыя дзеяньні адразу выклікалі ўвагу міліцыянтаў. Яны паведамілі, што акцыя несанкцыянаваная і запатрабавалі ад яе ўдзельнікаў разысьціся. Яшчэ праз некалькі хвілінаў былі затрыманыя старшыня абласной арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі ***Сьцяпан Навасельчан*** і ягоны сын ***Андрэй Навасельчан***, якіх адвезьлі ў пастарунак. Міліцыянты таксама спрабавалі затрымаць ***Зінаіду Міхнюк***, аднак астатнія ўдзельнікі акцыі зрабіць гэта не дазволілі. У пастарунку на Сьцяпана ды Андрэя Навасельчанаў былі складзеныя пратаколы нібыта за арганізацыю несанкцыянаванага сходу, што прывяло да парушэньня грамадзкага парадку.

***7 траўня*** ў Гародні адбыўся несанкцыянаваны пікет, прысьвечаны 6-м угодкам зьнікненьня ***Юрыя Захаранкі***. Акцыю наладзіў грамадзкі рух "Мы памятаем". Пікет працягваўся гадзіну – з 14.00 да 15.00. Пасьля гэтага шэсьць з сямі яго ўдзельнікаў былі затрыманыя і дастаўленыя ў Кастрычніцкі РУУС.

***7 траўня*** ў цэнтры Варшавы сябры Зьвязу на карысьць дэмакратыі ў Беларусі наладзілі пікет, прысьвечаны гадавіне зьнікненьня ***Юрыя Захаранкі***. Каля 15 чалавек раздавалі мінакам матэрыялы з інфармацыяй пра зьнікненьні апанентаў беларускага рэжыму, трымалі бел-чырвона-белыя сьцягі і плакаты: "Мы памятаем пра ахвяры рэжыму Лукашэнкі" ды іншыя. Адначасова з пікетам адбыўся перформанс: чалавек, пераапрануты ў Лукашэнку, у вайсковым мундзіры і касцы, ходзіць вайсковым крокам з аркушамі паперы, дзе напісана "Я не парушаю правы чалавека", "Я не зачы-

няю незалежныя газеты”, “Я не перасьледую апанентаў рэжыму” і “Я ня нішчу беларускую культуру”. Потым, калі гэтыя аркушы перагортваюцца, дык бачна, што з другога боку напісана: “Я ня маю з гэтым нічога супольнага”.

***7 траўня*** з 13 да 15 гадзінаў у горадзе Ландсхут блізу Мюнхену ***Зьвяз беларусаў Нямеччыны*** ладзіў пікет з нагоды шостай гадавіны зьнікненьня ***Юрыя Захаранкі***. Пікет быў дазволены гарадзкімі ўладамі. На плакатах, што трымалі пікетоўшчыкі, было напісана: “Юры Захаранка стаў ахвярай дыктатарскага рэжыму ў Беларусі”. Арганізатар пікету — палітычны ўцякач з Гомелю ***Яўген Мурашка***.

***20 траўня*** пракуратура Расіі прыслала ліст ***Зінаідзе Ганчар***, жонцы зьніклага шэсьць гадоў таму палітыка Віктара Ганчара. У ім паведамляецца, што ліст Зінаіды Ганчар кіраўніку ФСБ перададзены для разгляду ў Генеральную пракуратуру Расіі. “Як вынікае з Вашага звароту, Ваш муж скрадзены на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і крымінальная справа аб яго выкраданьні расьсьледуецца пракуратурай гораду Менску. Пры неабходнасьці аказаньня прававой дапамогі на тэрыторыі іншай дзяржавы пракуратура гораду Менску можа зьвярнуцца з адпаведным хадайніцтвам”, – адказала пракуратура Расеі. Прэс-сакратар Генеральнай пракуратуры Беларусі ***Юры Азаронак*** адмовіўся паведаміць, ці рабіў беларускі бок нейкія хадайніцтвы перад расейскім аб аказаньні прававой дапамогі. Маўляў, гэта працэсуальныя пытаньні, якія пры абнародаваньні могуць перашкодзіць сьледзтву.

***31 траўня Вольга Захаранка*** передала праз дыпламатычныя каналы ліст прэзідэнту ЗША ***Джорджу Бушу***. У гэтым пасланьні жонка былога міністра ўнутраных справаў Беларусі Юрыя Захаранкі, які быў выкрадзены ў траўні 1999 году, выказвае падзяку амерыканскаму прэзідэнту за маральную падтрымку сем’ям зьніклых палітыкаў. Паводле спадарыні Вольгі, беларускія ўлады ня толькі не прадпрымаюць дзеяньняў у пошуку вінаватых у палітычных зьнікненьнях, але ўсяляк адмаўляюць у атрыманьні хоць нейкай інфармацыі ад органаў пракуратуры, якія займаюцца расьсьледаваньнем крымінальнай справы па факце выкраданьня мужа. У лісьце да прэзідэнта ЗША Вольга Захаранка піша: “У мяне няма ілюзіяў, што пры дзейнай уладзе крымінальная справа будзе расьсьледавана органамі пракуратуры аб’ектыўна і ўсебакова. Цяпер адзіным выйсьцем у такой сітуацыі мы бачым узбуджэньне ў адной з еўрапейскіх краінаў крымінальнай справы па факце гвалтоўнага выкраданьня Юрыя Захаранкі”. Пасьля зьнікненьня мужа Вольга Захаранка папрасіла палітычнага прытулку ў Нямеччыне, дзе яна цяпер пражывае цягам пяці гадоў разам з дочкамі Юліяй і Аленай і пяцігадовым унукам.

***1 чэрвеня Алег Волчак***, прадстаўнік сям’і зьніклага экс-міністра ўнут-

раных справаў Беларусі ***Юрыя Захаранкі***, паведаміў, што нямецкія юрысты рыхтуюць для перадачы ў суд справу аб зьнікненьнях беларускіх палітыкаў. Паводле словаў А.Волчака, ён атрымаў ліст ад жонкі зьніклага палітыка Вольгі Захаранкі, якая цяпер жыве ў Нямеччыне. Яна, у прыватнасьці, піша, што пытаньне аб зьнікненьнях вывучалася нямецкімі юрыстамі амаль год і зараз ідзе падрыхтоўка да перадачы справы ў суд адной з еўрапейскіх краін. Нямецкія юрысты, паводле Волчака, будуць патрабаваць узбуджэньня крымінальнай справы ў дачыненьні да высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў, якія могуць быць датычныя да зьнікненьня Юрыя Захаранкі.

***7 ліпеня***, у пятую гадавіну зьнікненьня телеаператара ОРТ ***Дзьмітрыя Завадзкага***, "Рэпарцёры бяз межаў" і ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" прынялі сумесную заяву, у якой выказалі глыбокую заклапочанасьць "спакоем і бязьдзейнасьцю" беларускіх уладаў у справе расьследаваньня бясьследнага зьнікненьня Дзьмітрыя Завадзкага. Журналісцкія арганізацыі заклікалі ўлады даць дазвол замежным эксьпертам прыняць удзел у расьследаваньні, якое было аднаўлена 4 красавіка 2005 г., праз год пасьля закрыцьця справы.

***7 ліпеня БАЖ*** правёў Дзень памяці, прымеркаваны да 5-х угодкаў зьнікненьня аператара ОРТ, сябра арганізацыі ***Дзьмітрыя Завадзкага***. Прысутныя таксама ўзгадалі жорстка забітую ў кастрычніку 2004 году журналістку газеты "Салідарнасьць" ***Вераніку Чаркасаву***. Каля сарака журналістаў сабраліся ва ўрочышчы Курапаты. На Дні памяці прысутнічалі як калегі Веранікі і Дзьмітрыя, гэтак і іх блізкія. Прысутныя трымалі сьвечкі і партрэты Чаркасавай і Завадзкага. Паводле словаў намесьніка старшыні ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" ***Эдуарда Мельнікава***, месца правядзеньня мерапрыемства абранае невыпадкова, бо "забойствы і зьнікненьні журналістаў, проста людзей зьяўляюцца прыкметамі ўсіх таталітарных грамадзтваў, і сьведчаньне таму – Курапаты ". Пасьля кароткіх выступаў прысутныя паставілі сьвечкі да Вялікага Курапацкага крыжа. Мерапрыемства праходзіла пад пільным наглядам невядомых асобаў у цывільным і некалькіх міліцыянтаў у форме. У 18 гадзінаў на Кастрычніцкай плошчы Менску мусіў адбыцца "Ланцуг неабыякавых людзей", прысьвечаны 5-й гадавіне трагічнага зьнікненьня Дзьмітрыя Завадзкага. Але не пасьпелі людзі стаць на плошчы і разгарнуць плакаты з выяваю зьніклага журналіста, як зьявіліся амапаўцы і пачалі адцясьняць грамадзянаў у бок Сьвіслачы. Жонка Дзьмітрыя Завадзкага Сьвятлана, якая йшла побач з сынам Юрыем, атрымала ад амапаўца моцны ўдар кулаком у твар.

***16 верасьня*** разгонам скончылася акцыя, прысьвечаная шостай гадавіне зьнікненьня ***Віктара Ганчара*** і ***Анатоля Красоўскага***. У 18.00 на Кастрычніцкай плошчы Менску сабралася каля 100 чалавек, каб выка-

зацьсалідарнасьць з сем'ямі выкрадзеных палітыкаў, палітзьняволеных, запатрабаваць спыніць палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі. Удзельнікі акцыі сталі жывым ланцугом і разгарнулі партрэты зьніклых Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Юрыя Захаранкі і Дзьмітрыя Завадзкага. Праз некалькі хвілінаў на плошчы зьявіўся АМАП. Ланцуг разьбілі на дзьве часткі і сталі выштурхоўваць з плошчы ў накірунку да вуліцы Камсамольскай. Калі актывісты "Зубра" і "Маладога Фронту" сфармавалі невялікую калону і рушылі па Кастрычніцкай плошчы, тут жа на маладых людзей накінуліся яшчэ некалькі дзясяткаў амапаўцаў. Яны ўзялі ўдзельнікаў акцыі ў кола і сталі літаральна выцягваць з плошчы. Усё гэта суправаджалася зьбіцьцём, лаянкай і пагрозамі. Некалькі чалавек атрымалі цялесныя пашкоджаньні, у іх было парванае адзеньне. У актывістаў "Зубра" вырывалі з рук партрэты і сьцягі, тады адзін з іх зьняў з сябе джынсавую кашулю, адзеў на дрэўца і пачаў ёю размахваць. Пры гэтым удзельнікі скандавалі лозунг "Жыве Беларусь!". Некалькі разоў удзельнікі акцыі, выцесьненыя з плошчы, вярталіся і зноў станавіліся ў ланцуг, і некалькі разоў паўтараўся разгон.

***21 верасьня*** імёны ***Юрыя Захаранкі***, ***Віктара Ганчара***, ***Анатоля Красоўскага***, ***Дзьмітрыя Завадскага*** згадваліся ў Дзюсельдорфе, дзе прайшла міжнародная імпрэза на тэму "Зьніклыя – злачынствы перад чалавечнасьцю". Галоўныя рэфераты і дыскусіі прысьвечаныя арганізацыі палітычна матываваных зьнікненьняў людзей у Беларусі і Чачні.

***13 кастрычніка*** палітычная ***Рада дэмакратычных сілаў Беларусі*** ўхваліла ініцыятыву стварэньня грамадзкага трыбуналу па справе расьсьледаваньня зьнікненьняў і сьмерцяў беларускіх апазіцыянераў. Ініцыятыва стварэньня грамадзкага трыбуналу належыць ***Людміле Карпенка*** – удаве вядомага беларускага палітыка, які сышоў з жыцьця ў красавіку 1999 году пры загадкавых абставінах. Яна прапанавала стварыць такую структуру, якая б магла падрыхтаваць дакументальную базу для будучых судовых працэсаў над арганізатарамі і замоўцамі палітычных выкраданьняў і сьмерцяў у Беларусі ў 1999 і 2000 гадах. Мяркуецца, што грамадзкі трыбунал зьбярэ паказаньні сьведкаў і тых людзей, якія мелі дачыненьне да расьсьледаваньня справаў зьніклых. У тым ліку Людміла Карпенка прапанавала адмыслова апытаць сьведкаў, якія зьехалі за мяжу, баючыся перасьледу беларускіх уладаў.

***8 лістапада*** жонка выкрадзенага ў верасьні 1999 году палітыка Віктара Ганчара ***Зінаіда Ганчар*** накіравала ліст дэпутату Палаты прадстаўнікоў Анатолю Салаўёву, які на Асамблеі Міжпарламенцкага Саюзу прадставіў непраўдзівыя зьвесткі пра стан расьсьледаваньня справы выкрадзенага палітыка. У лісьце Зінаіда Ганчар, у прыватнасьці, адзначае: "Анатоль Міхайлавіч, калі б вас, як дэпутата, як чалавека, які асабіста ведаў Віктара Ганчара па Вярхоўным Савеце 13-га склікання, цікавіла гэтая

справа, вы б абавязкова ведалі, што на працягу апошніх двух гадоў яна не прыпынялася. Таму больш чым дзіўна чуць вашыя заявы пра "пастаянны кантроль" сёньняшняга парламенту за ходам расьследаваньня справы пра выкраданьне вашага калегі. Асабіста я ўпэўненая, што вы толькі абараняеце ўласны імідж у вачах міжнароднай супольнасьці і мэтанакіравана ўводзіце іх у зман. Вы зьяўляліся таксама дэпутатам Палаты прадстаўнікоў усіх папярэдніх скліканьняў. І, бясспрэчна, атрымлівалі ад мяне асабіста і грамадзкасьці звароты з просьбай падняць пытаньне пра ход расьследаваньня справы майго мужа. Вы не палічылі нават патрэбным, у адрозьненьне ад некаторых нешматлікіх вашых калег, адказаць на мае просьбы. Вы афіцэр, і для вас недаравальна сьпекуляваць імем Віктара Ганчара, горам маёй сям'і, каб абараніць сябе, сваю бездапаможнасьць і бязьдзейнасьць".

## 4. Палітычна матываваныя крымінальныя справы

***8 студзеня*** ўначы супрацоўнікі міліцыі затрымалі актывіста моладзевага руху "Зубр" ***Мікіту Сасіма*** за графіці "Свабоду Марынічу!" на некаторых будынках у цэнтры Менску. Яго трымалі амаль трое сутак у дзяжурнай частцы і ў ізалятары часовага ўтрыманьня і вызвалілі пад падпіску аб нявыезьдзе. Супраць Мікіты Сасіма ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 218 ч.1 Крымінальнага кодэксу (наўмыснае зьнішчэньне ці пашкоджаньне маёмасьці), згодна з якой суд можа пакараць яго штрафам альбо абмежаваньнем волі да двух гадоў альбо арыштам да трох месяцаў. Справу вядуць сьледчыя ўпраўленьня ўнутраных справаў Ленінскага раёну Менску.

***11 студзеня*** пасьля працяглага курсу лячэньня прафесар ***Юры Бандажэўскі*** зноў накіраваны ў папраўчую калонію-пасяленьне №26 ў Дзятлаўскім раёне Гомельскай вобласьці. На 6 студзеня 2005 году ён адбыў дзьве трацiны свайго тэрміну, і паўстае пытаньне аб зьмякчэньні пакараньня. Чакаецца, што цягам месяцу справу Бандажэўскага абмяркуе адмысловая камісія калоніі, дзе будзе вырашацца пытаньне пра ўмоўнадатэрміновае вызваленьне прафесара. Міжнародная супольнасьць неаднойчы заклікала беларускія ўлады вызваліць Юрыя Бандажэўскага, былога рэктара Гомельскага медінстытуту, арыштаванага ў ліпені 1999 і асуджанага на 8 гадоў турмы. Праваабаронцы лічаць, што Бандажэўскі зьняволены за свае дасьледаваньні аб узьдзеяньні радыяцыі на арганізм чалавека, вынікі якіх супярэчылі пазіцыі афіцыйнай медыцыны.

***11 студзеня Мікіта Сасім***, адзін з каардынатараў руху “Зубр”, у дачыненьні да якога напярэдадні ўзбуджаная крымінальная справа, вызвалены з ізалятару часовага ўтрыманьня. У дачыненьні да яго абрана мера стрыманьня – падпіска аб нявыезьдзе.

***11 студзеня*** пракуратура Ленінскага раёну Гародні афіцыйна папярэдзіла старшыню Менскай абласной арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Марыну Багдановіч***. Прычынай стаў выступ спадарыні Багдановіч як кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на Гарадзенскім абласным радыё. Пракуратура лічыць, што ў сваім выступе Марына Багдановіч дапусьціла паклёп на кіраўніка дзяржавы. Пракуроры ўбачылі прыкметы злачынства, прадугледжанага артыкулам 367 Крымінальнага кодэксу, у словах Марыны Багдановіч пра магчымую датычнасьць прэзідэнта да продажу няўлічанай бюджэтам зброі і разьмеркаваньня сродкаў, атрыманых ад гэтага. Пракурор Ленінскага раёну Гародні папярэдзіў яе аб недапушчальнасьці парушэньняў і патлумачыў, што ў выпадку іх паўтору Марына Багдановіч будзе прыцягнутая да адказнасьці. Падобныя праверкі пракуратурай у Менску таксама праводзяцца ў адносінах да кандыдатаў у дэпутаты ад апазіцыі Алега Волчака і Аляксандра Цынкевіча.

***13 студзеня*** адзін з лідэраў беларускай апазіцыі ***Міхаіл Марыніч***, асуджаны да 5 гадоў пазбаўленьня волі, пераведзены са сьледчага ізалятару Камітэту дзяржбясьпекі ў СІЗА на вуліцы Валадарскага.

***13 студзеня*** падчас першага ў новым годзе паседжаньня Пастаяннага Савету АБСЕ, на якое запрошаныя кіраўнікі офісаў і дэлегацыі 55 краінаў-удзельніц арганізацыі, кіраўнік Менскага офісу ***Эберхард Хайкен*** абмяркоўваў з новым старшынёй гэтай арганізацыі шэраг пытаньняў, датычных Беларусі. У цэнтры ўвагі быў таксама судовы працэс над беларускім палітычным дзеячом ***Міхаілам Марынічам***, які асуджаны на 5 гадоў пазбаўленьня волі. Дэталёвы даклад адносна гэтага працэсу офіс ужо прадставіў у Сакратарыят АБСЕ і зараз мае намер даведацца пра наступныя дзеяньні арганізацыі адносна Марыніча. Кіраўнік Менскага офісу запрасіў старшыню АБСЕ наведаць Беларусь і абмеркаваў з ім магчымасьці візіту ў Менск прадстаўніка АБСЕ па пытаньнях свабоды СМІ Міклаша Харашці.

***20 студзеня*** сьледчы па асабліва важных справах Менскай гарадзкой пракуратуры Сяргей Кухаронак дапытаў старшыню Менскай абласной арганізацыі АГП ***Марыну Багдановіч*** у якасьці сьведкі па крымінальнай справе, узбуджанай па факце правядзеньня прэс-канферэнцыі 14 кастрычніка 2004 году. На гэтай прэс-канферэнцыі лідэр АГП ***Анатоль Лябедзька*** заявіў журналістам пра неабгрунтаванае зьняцьце з выбарчага марафону кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў М. Багдановіч, якая

абвінавачаная ў паклёпе на прэзідэнта. “Допыт цягнуўся на працягу гадзіны, сьледчага цікавіла, чаму я балатавалася па Лідзкай выбарчай акрузе, кім раней працавала ў Лідзе, якую пасаду займаю ў партыі, на падставе чаго зрабіла выснову пра продаж зброі нашай краінай і чаму вырашыла, што даходы ад яго паступаюць непасрэдна Лукашэнку, — распавяла М.Багдановіч. – У гутарцы са сьледчым я таксама адзначыла, што, даведаўшыся пра рашэньне Лідзкай акруговай камісіі пра зьняцьце мяне з выбарчага марафону, я ў першую чаргу патэлефанавала старшыні нашай партыі Лябедзьку, і як толькі атрымала выпіску з рашэньня акруговай камісіі, тут жа факсам накіравала яе ў офіс выканкаму АГП. Таму Лябедзька агучыў на канферэнцыі факты, пацьверджаныя дакументамі”.

***25 студзеня*** амбасадар ЗША ***Джордж Крол*** сустрэўся са сваякамі палітвязьняў ***Валерыя Леванеўскага*** і ***Аляксандра Васільева***. На сустрэчы, што адбылася ў адным з гатэляў, былі абмеркаваныя пытаньні палітычных рэпрэсіяў у Беларусі, незаконных дзеяньняў супрацоўнікаў КДБ, шматлікія парушэньні заканадаўства з боку пракуратуры і судоў. Сваякі вязьняў паведамілі амерыканскаму амбасадару новыя факты па справе сваіх родных. Амбасадар заявіў, што амбасада ЗША будзе рабіць усё магчымае, каб вызваліць палітзьняволеных. Па словах амбасадара, на ўсіх афіцыйных сустрэчах з прадстаўнікамі беларускай улады ён уздымае дадзенае пытаньне.

***27 студзеня*** галоўнаму рэдактару недзяржаўнага грамадзка-палітычнага штотыднёвіка “Борисовские новости” ***Анатолю Букасу*** прад’явілі абвінавачаньне ў парушэньні двух артыкулаў Крымінальнага кодэксу. Пасьля разгляду матэрыялаў крымінальнай справы сьледчы аддзелу папярэдняга расьследаваньня Барысаўскага ГУУС Сяргей Казлоў прыйшоў да высновы, што Анатоль Букас парушыў ч.2 188 КК РБ (паклёп, які ўтрымліваецца ў публічным выступленьні альбо ў СМІ) і ч.2 арт. 189 КК РБ (наўмыснае прыніжэньне гонару і годнасьці асобы, выказанае ў непрыстойнай форме). Падставай для ўзбуджэньня справы стаў артыкул А. Букаса “Звезданутый пострел везде поспел, или Молчание ягнят”, які зьявіўся ў выпуску газеты № 12 (18-24-га сакавіка 2004 г.). У публікацыі ішла гаворка пра рэдактара газеты Барысаўскага гарвыканкаму “Адзінства” Веру Пратасевіч. Паводле А. Букаса, ягоны артыкул быў адказам на тры публікацыі Веры Пратасевіч, у якіх яна называла яго “дурно воспитанным издателем”, параўноўвала з дурным пеўнем і.г.д. У правядзеньні лінгвістычнай экспертызы гэтых публікацыяў у Барысаўскім ГУУС яму адмовілі. Галоўны рэдактар “Борисовских новостей” упэўнены, што справа супраць яго была ўзбуджаная па ініцыятыве гарвыканкаму. “Яны нядобрасумленным спосабам імкнуцца зьнішчыць канкурэнта афіцыйнай газеты, наклад і папулярнасьць якой значна саступаюць нашай, а разам з тым закрыць выданьне, якое друкуе не зусім прыемныя для гарвыканкаму матэрыялы”, –

лічыць А. Букас. У выпадку, калі А. Букаса прызнаюць вінаватым, яму можа пагражаць абмежаваньне волі тэрмінам да 3-х гадоў альбо пазбаўленьне волі да 2 гадоў.

***28 студзеня*** суд Гарадзенскай вобласьці пакінуў у сіле прысуд заснавальніку “Новой газеты Сморгони” ***Рамуальду Улану***. Справа ў тым, што 6 сьнежня 2003 году Рамуальд Улан, едучы на аўтамабілі, зьбіў веласіпедыстку. Жанчына атрымала цяжкія цялесныя пашкоджаньні. Р.Улан выплаціў ёй матэрыяльныя і маральныя страты і на судзе жанчына прасіла “не караць яго сурова”. Судом Смаргонскага раёну Улан быў прыгавораны да аднаго году пазбаўленьня волі з адбываньнем пакараньня ў калоніі-пасяленьні. Суд Гарадзенскай вобласьці разгледзеў касацыйную скаргу, што падаваў Рамуальд Улан, і пакінуў у сіле рашэньне першай інстанцыі. Р.Улан падрыхтаваў скаргу ў наглядную інстанцыю, але спадзяваньні, што пракуратура ці Вярхоўны суд popстануць на бок заснавальніка незалежнага выданьня, практычна роўныя нулю.

***30 студзеня*** больш за 300 сяброў Камітэту па абароне правоў зьняволеных пісьменьнікаў англійскага бюро ПЭН-клубу падпісалі петыцыю да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай датэрмінова вызваліць былога рэктара Гомельскага дзяржаўнага медінстытуту ***Юрыя Бандажэўскага***. Навукоўца зьяўляецца ганаровым сябрам англійскага бюро ПЭН-клубу. Аўтары звароту заклікаюць Аляксандра Лукашэнку “зрабіць усё магчымае” для вызваленьня беларускага прафесара “па гуманістычных меркаваньнях”.

***31 студзеня Дыяна Чаркасава***, маці забітай журналісткі ***Веранікі Чаркасавай***, труп якой знайшлі ў кастрычніку 2004 году ва ўласнай кватэры з больш чым 40 нажавымі раненьнямі, зьвярнулася да Генеральнага пракурора Пятра Міклашэвіча з просьбай не дапусьціць фальсіфікацыяў крымінальнай справы па факце забойства дачкі. Па-ранейшаму ў статусе падазраваемых знаходзяцца 15-гадовы сын журналісткі ***Антон Філімонаў*** і айчым Веранікі Чаркасавай.

***31 студзеня*** стала вядома, што ў палітзьняволенага ***Валерыя Леванеўскага*** рэзка пагоршыўся стан здароўя. Гэта адбылося пасьля галадоўкі пратэсту, якую ў адказ на парушэньне сваіх правоў правёў зьняволены. Па словах сына – Уладзіміра Леванеўскага, пасьля пераводу ў новую калонію 28 сьнежня Валеры Леванеўскі прабыў у “каранціне” да чацьвёртага студзеня, пасьля чаго быў накіраваны ў першы атрад. Ужо шостага студзеня Валеры Леванеўскі трапіў у штрафны ізалятар, дзе прабыў пятнаццаць сутак – да 21 студзеня. Чаму і за што Валеры Леванеўскі трапіў у штрафны ізалятар, родныя асуджанага ня ведаюць, а адміністрацыя калоніі ніякіх тлумачэньняў з гэтай нагоды не дае. З 9 студзеня Валеры Ле-

ванеўскі трымаў галадоўку, але быў вымушаны спыніць яе 14 студзеня з-за рэзкага болю ў сэрцы. Зьняволены знаходзіцца пад сталым наглядам лекара і чакае, што яго перавязуць у менскі рэспубліканскі шпіталь на медагляд. Што датычыцца пэрсьпектываў вызваленьня, дык тут Валеры Леванеўскі, па словах ягонага сына, настроены песімістычна. Адміністрацыя калоніі робіць усё, каб выставіць яго "злосным парушальнікам рэжыму". Сям'я Леванеўскага сьцьвярджае, што ня ўсе лісты, якія высылае Валеры Леванеўскі, даходзяць да іх.

***1 лютага*** сьледчыя пракуратуры г. Менску спрабавалі ў прымусовым парадку забраць са школы сына забітай у кастрычніку 2004 году журналісткі ***Веранікі Чаркасавай Антона Філімонава***, патлумачыўшы свае дзеяньні неабходнасьцю правядзеньня "стацыянарнай псіхіятрычнай экспэртызы". Група сьледчых на чале з Уладзімірам Чумачэнкам без папярэджаньня зьявілася ў школу №88, дзе вучыцца 15-гадовы Антон. Родныя даведаліся пра гэта ад самога падлетка, якому дазволілі патэлефанаваць дахаты, і адразу ж прыбеглі на месца падзеяў і прадухілілі дзеяньні сьледчых. Блізкія забітай журналісткі абураныя дзеяньнямі пракуратуры, лічаць іх беспадстаўнымі і амаральнымі. Яны ўпэўненыя, што нервовы зрыў, з якім Антон трапіў у лякарню неўзабаве пасьля забойства маці, шмат у чым тлумачыцца метадамі працы пракурорскіх сьледчых.

***1 лютага*** сябра АГП ***Аляксандра Цынкевіча*** выклікалі ў пракуратуру Цэнтральнага раёну Менску для тлумачэньняў. Выклік зьвязаны з тым, што падчас выбарчай кампаніі ў парламент актывіст АГП у сваёй праграме называў некаторыя ўказы А.Лукашэнкі "неразумнымі " і абяцаў змагацца за іх адмену. "Мне кажуць, што калі ў вашай улётцы напісана, што вы будзеце супраць неразумных указаў і дэкрэтаў, а ў нас усім вядома, што дэкрэты і ўказы падпісвае прэзідэнт Беларусі, значыць, вы яго зьневажаеце і наводзіце на яго паклёп", — заявіў Аляксандр Цынкевіч. Падобныя прэтэнзіі актывіст АГП назваў абсурднымі і незаконнымі і адмовіўся даваць тлумачэньні сьледчым. Ён сказаў, што не давярае пракуратуры, якая, на ягоную думку, не абараняе закону і правоў грамадзянаў.

***2 лютага*** маці забітай журналісткі ***Веранікі Чаркасавай*** трапіла на прыём да намесьніка пракурора г. Менску Мікалая Старавойтава, каб дамагчыся адмены пастановы пракуратуры аб правядзеньні стацыянарнай псіхіятрычнай экспэртызы сына Чаркасавай ***Антона Філімонава***, падпісанай 31-га студзеня старшым сьледчым пракуратуры г. Менску Уладзімірам Чумачэнкам. Санкцыянаваў экспэртызу асабіста першы намесьнік пракурора Мікалай Старавойтаў. Неабходнасьць правядзеньня экспэртызы тлумачыцца тым, што А. Філімонаў пасьля гвалтоўнай сьмерці маці быў пастаўлены на ўлік у гарадзкі дзіцяча-падлеткавы псіханеўралагічны дыспансэр, а ў канцы лістапада паступіў на стацыянарнае лекаваньне ў

рэспубліканскую клінічную псіхіятрычную бальніцу. Эксьпертызу даручана правесьці эксьпертам Дзяржаўнай службы медыцынскіх судовых эксьпертызаў, якая знаходзіцца ў падпарадкаваньні пракуратуры. На сустрэчы з першым намесьнікам пракурора, па словах Дыяны Чаркасавай, “гутарка была пра ўсё”. “З размовы вынікала, што ў іх няма іншых падазраваных”, – зазначыла жанчына. Дыяне Чаркасавай абяцалі толькі “падумаць”, а таксама папрасілі не ствараць перашкодаў для правядзеньня эксьпертызы і “супакоіць журналістаў”.

***4 лютага***, пасьля завяршэньня трохдзённага візіту ў Менск адмысловай Рабочай групы па справах Беларусі Парламенцкай асамблеі АБСЕ на чале з ***Утай Цапф***, сябры групы выказалі занепакоенасьць новымі дзеяньнямі беларускіх уладаў, скіраваных на ліквідацыю незалежных грамадзкіх арганізацыяў, а таксама судовым перасьледам ***Міхаіла Марыніча, Валерыя Леванеўскага, Аляксандра Васільева,*** адмовай у датэрміновым вызваленьні Юрыя Бандажэўскага. У выніковым дакуменце, падрыхтаваным Утай Цапф і яе калегамі, робіцца ацэнка аб недэмакратычным характары леташніх парламенцкіх выбараў. У сувязі з гэтым было заяўлена, што “Нацыянальны сход ня можа прадстаўляць сапраўднае волевыяўленьне беларускага народу”. Тым ня менш, Ута Цапф паведаміла, што Парламенцкая асамблея АБСЕ мае намер узнавіць дыялог паміж беларускімі ўладамі і палітычнай апазіцыяй.

***4 лютага*** сына забітай журналісткі Веранікі Чаркасавай ***Антона Філімонава*** бацька забраў у Маскву. Гэтыя дзеяньні прадыктаваныя намерам пракуратуры г. Менску на месяц пакласьці А. Філімонава на стацыянарную псіхіятрычную эксьпертызу. Існуе верагоднасьць таго, што беларуская пракуратура можа зьвярнуцца да расейскага боку з патрабаваньнем выдаць А. Філімонава як падазраванага ў забойстве, бо, згодна з іх пастановай, яму трэба прайсьці прымусовую псіхіятрычную эксьпертызу.

***7 лютага*** стала вядома, што адміністрацыя калоніі №19 у Магілёве, дзе адбывае пакараньне лідэр гарадзенскіх прадпрымальнікаў ***Валеры Леванеўскі***, аказвае на яго ціск. Пра гэта Леванеўскі распавёў у лісьце да сваёй сям’і. «На мяне “навесілі” шэраг парушэньняў, і цяпер я зьяўляюся злосным парушальнікам. У адпаведнасьці з патрабаваньнямі закону, я буду прызнаны такім ня менш за год. На злосных парушальнікаў не распаўсюджваюцца папраўчыя працы, умоўна-датэрміновае вызваленьне і амністыя. Паспрабую праз суд зьняць гэтыя парушэньні. Надзея памірае апошняй. Пакуль знаходзіўся ў штрафным ізалятары, напісаў больш за 40 скаргаў і заяваў па розных пытаньнях. Сядзець спакойна не атрымліваецца, хоць і спрабую, але самі разумееце, што прыніжаць ці зьняважаць сябе я не магу дазволіць. Вось так і ўзьнікаюць “канфлікты”», – піша В.Леванеўскі.

***7 лютага*** прэзідэнт Сусьветнай асацыяцыі газетаў ***Кэвін О'Рэйлі*** (Gavin O'Reilly) і прэзідэнт Сусьветнага форуму рэдактараў Джордж Брок (George Brock) накіравалі звароты шэрагу беларускіх афіцыйных асобаў, у якіх просяць забясьпечыць аб'ектыўнае расьследаваньне справы аб забойстве журналісткі Веранікі Чаркасавай і спыніць перасьлед яе сям'і. Лісты адрасаваныя Прэзідэнту РБ Аляксандру Лукашэнку, міністру ўнутраных справаў Уладзіміру Навумаву і Генеральнаму пракурору РБ Пятру Міклашэвічу. Копіі пасланьняў накіраваныя Генеральнаму сакратару ААН Кофі Анану (Kofi Annan) і Генеральнаму дырэктару UNESCO Коішыра Мацууры (Koichiro Matsuura). "Мы з павагай просім Вас гарантаваць, што пераслед сям'і Чаркасавай будзе тэрмінова спынены. Мы заклікаем Вас прадпрыняць усе неабходныя крокі для таго, каб фактам, высьветленым падчас незалежнага расьследаваньня, была нададзеная належная ўвага, каб афіцыйнае сьледзтва было праведзенае аб'ектыўна і непрадузята, і каб адказныя за забойства Чаркасавай у хуткім часе былі прыцягнутыя да адказнасьці", — гаворыцца ў звароце.

***18 лютага*** адвакат асуджаных лідэраў прадпрымальнікаў ***Валерыя Леванеўскага*** і ***Аляксандра Васільева*** накіраваў у Вышэйшы Суд Рэспублікі Беларусь наглядную скаргу на прысуд Ленінскага суда Гародні. "Былі пададзеныя дзьве скаргі, асобна па Васільеве і асобна па Леванеўскім. Мы просім Вярхоўны Суд адмяніць прысуд. Падчас суда ў Гародні былі дапушчаныя шматлікія працэсуальныя парушэньні, не былі ўлічаныя эксьпертныя аналізы, ня выклікалі сьведкаў, што на сьледзтве давалі сьведчаньні на карысьць абвінавачваемых. Сьведчаньні тых свьедкаў, што выступілі на судзе, разглядаліся амаль як у якасьці экспертызы, хаця лінгвістычную эксьпертызу павінны рабіць эксьперты", – патлумачыў адвакат асуджаных Аляксандр Бірылаў.

***18 лютага*** суд Менскай вобласьці разгледзеў касацыйную скаргу былога амбасадара, грамадзкага і палітычнага дзеяча ***Міхаіла Марыніча*** і зьменшыў яму тэрмін пакараньня да 3 гадоў і 6 месяцаў.

***23 лютага*** суд Цэнтральнага раёну г. Менску адхіліў скаргу адваката ***Антона Філімонава*** – сына забітай у кастрычніку 2004 году журналісткі **Веранікі Чаркасавай** – на рашэньне пракуратуры г. Менску аб прызначэньні стацыянарнай псіхіятрычнай эксьпертызы падлетка. Судовае паседжаньне было закрытым і доўжылася каля 40 хвілінаў. У залу суда падчас слуханьняў былі дапушчаныя толькі адвакат Анатоль Кулікоў, пацярпелая (маці забітай журналісткі Дыяна Чаркасава) і прадстаўнік пракуратуры Цэнтральнага раёну г. Менску. З усіх іх узялі падпіску аб неразгалошаньні матэрыялаў слуханьняў. Самога Антона Філімонава ў суд ня выклікалі, ён па-ранейшаму знаходзіцца ў Маскве ў свайго бацькі.

***24 лютага*** былога кандыдата ў дэпутаты ад АГП ***Аляксандра Цын-***

***кевіча*** выклікалі ў пракуратуру да сьледчага А.Мікалаева, які спрабаваў правесьці допыт партыйнага актывіста ў якасьці “сьведкі”. Справа ў тым, што сьведка ў адрозьненьне ад падазраваемых ня можа адмовіцца ад дачы паказаньняў. Пра гэта Цынкевіч і быў папярэджаны сьледчым. Аднак Цынкевіч адмовіўся ад адказаў на пытаньні сьледчага ў адпаведнасьці з арт. 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які гарантуе права не даваць паказаньні супраць сябе. 1 лютага пракурор Цэнтральнага раёну г.Менску Хадатовіч В., разгледзеўшы матэрыялы, якія паступілі з Цэнтральнай камісі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэферэндумаў, пастанавіў узбудзіць крымінальную справу па факце паклёпу ў адносінах да прэзідэнта па прыкметах злачынства, прадугледжанага ч.2 с.367 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Інфармацыя тычылася зьместу агітацыйных улётак, якія распаўсюджвалі кандыдаты, у тым ліку – А.Цынкевіч.

***24 лютага*** лідэра Партыі БНФ ***Вінцука Вячорку*** выклікалі ў якасьці сьведкі ў пракуратуру г. Менску ў сувязі з узбуджанай крымінальнай справе па факце правядзеньня прэс-канферэнцыі 15 кастрычніка 2004 г. лідэрамі Народнай кааліцыі “Пяцёрка плюс”. Падчас прэсавай канферэнцыі лідэры апазіцыйных партыяў заявілі аб мажлівых фальсіфікацыях падчас галасаваньня і прадэманстравалі журналістам праекты пратаколаў участковых выбарчых камісіяў з гатовымі лічбамі, а таксама зводныя табліцы па акрузе з разьмеркаваньнем галасоў на ўчастках. Перад пачаткам допыту Вінцук Вячорка запатрабаваў, каб пытаньні да яго былі сфармуляваныя па-беларуску. Сьледчы Кухаронак пагадзіўся. Аднак на шэраг пытаньняў Вінцук Вячорка адмовіўся адказаць у адпаведнасьці з арт. 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які гарантуе права не даваць паказаньні супраць сябе.

***4 сакавіка*** пракуратурай узбуджаная крымінальная справа па арт. 342 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (арганізацыя групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) па падзеях 3 сакавіка ў Гародні. Факты “парушэньняў грамадзкага парадку” выразіліся ў перакрыцьці руху на праезжай частцы вуліцы ўдзельнікамі акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. Санкцыя арт. 342 КК РБ прадугледжвае пакараньне ў выглядзе штрафу, арышту на тэрмін да шасьці месяцаў, абмежаваньня волі тэрмінам да 3 гадоў ці пазбаўленьня волі на гэты ж тэрмін.

***4 сакавіка*** дэпутат Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы (ПАРЕ) Хрыстас Пургурыдэс паведаміў, што 3 сакавіка на паседжаньні ў Парыжы была ўхваленая дэкларацыя камітэту па юрыдычных справах і правах чалавека ПАРЕ наконт прысуду ***Міхаілу Марынічу***. У заяве гаворыцца, што камітэт ПАРЕ “адзначае з глыбокай занепакоенасьцю нядаўні судовы пра-

цэс і пазбаўленьне волі Міхаіла Марыніча”. Камітэт ПАРЕ заклікаў беларускія ўлады неадкладна вызваліць Міхаіла Марыніча.

**9 сакавіка** агучанае рашэньне па касацыйнай скарзе, пададзенай адвакатам забітай журналісткі газеты “Салідарнасьць” ***Веранікі Чаркасавай*** В.Куліковым, якую разглядаў Менскі гарадзкі суд 4 сакавіка. Адвакат абскарджваў рашэньне суда Цэнтральнага раёну г.Менску ад 23 лютага, якім пакінутая ў сіле пастанова пракуратуры аб прызначэньні стацыянарнай псіхіятрычнай экспертызы сына журналісткі, ***Антона Філімонава***. Судзьдзя І.Крот адмяніў рашэньне аб прымусовым характары псіхіятрычнай экспертызы. Пры гэтым А.Філімонаў застаецца падазраваным у справе аб забойстве журналісткі. Цяпер ён знаходзіцца ў Маскве, куды яго забраў бацька пасьля спробы супрацоўнікаў пракуратуры зьвесьці падлетка на экспертызу са школьных заняткаў.

***9 сакавіка*** ў суд Першамайскага раёну г.Менску перададзеная крымінальная справа ў адносінах да былога прадпрымальніка і дэпутата ***Андрэя Клімава***. А.Клімаў абвінавачваецца ў паклёпе на Прэзідэнта (ч.2 арт.367 Крымінальнага кодэксу РБ) і зьнявазе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (ч.1 арт.368 Крымінальнага кодэксу РБ). У пастанове аб перадачы справы ў суд пазначана, што А.Клімаў, зьяўляючыся актыўным праціўнікам парадку кіраваньня ў Рэспубліцы Беларусь, імкнучыся правакацыйнымі спосабамі стварыць бачнасьць апазіцыйнай дзейнасьці, напісаў, арганізаваў выданьне і распаўсюд кніг ды ўлётак, якія ўтрымліваюць зьневажальныя выказваньні ў адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і абвінавачаньні ва ўчыненьні цяжкіх злачынстваў. Сьледзтва спасылаецца на кнігі А.Клімава “Восстание 2005”, “Очевидные истины”, “Я сделал свой выбор”.

***10 сакавіка*** стала вядома, што крымінальная справа аб забойстве журналісткі ***Веранікі Чаркасавай*** можа быць прыпыненая. Пра гэта паведаміў начальнік галоўнага ўпраўленьня ўнутраных справаў Менску Анатоль Куляшоў, які падкрэсьліў, што нават калі сьледчыя прымуць такое рашэньне з прычыны адсутнасьці канкрэтнага абвінавачанага, справа ўсё роўна застанецца на кантролі сталічнага аддзелу ўнутраных справаў. Паводле версіі калегаў Веранікі Чаркасавай са штотыднёвіка “Салідарнасьць”, забойства журналісткі магло мець палітычныя прычыны, паколькі ёсьць верагоднасьць таго, што Вераніка валодала сакрэтнай інфармацыяй пра пастаўкі беларускай зброі ў Ірак.

***11 сакавіка*** закончылася “доўгатэрміновае” спатканьне палітычнага вязьня ***Валерыя Леванеўскага*** са сваімі роднымі. Яно адбылося ў калоніі “Воўчыя норы” ў Івацэвіцкім раёне Берасьцейскай вобласьці. Гэтага спатканьня вязьню ўдалося дамагчыся толькі пасьля таго, як ён прыгразіў адміністрацыі калоніі, што абвесьціць галадоўку. Сын палітвязьня Уладзімір

Леванеўскі сказаў, што за пяць месяцаў ім удалося толькі другі раз спаткацца з бацькам. Паводле Уладзіміра, раней здаралася, што яны зьбіраліся выяжджаць да бацькі, але яму раптоўна забаранялі спатканьне, якое было дазволена напярэдадні.

***11 сакавіка*** ў 19.00 заканчваўся тэрмін дзесяцідзённага адміністрацыйнага арышту лідэра РГА "Персьпектыва" ***Анатоля Шумчанкі***, асуджанага да 10 дзён адміністрацыйнага арышту па ч.2 арт. 167.1 КаАП РБ за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу прадпрымальнікаў на Кастрычніцкай плошчы ў г. Менску 1 сакавіка. Аднак на свабоду са сьпецпрыёмніка ГУУС Менгарвыканкаму Анатоль Шумчанка так і ня выйшаў. Як стала вядома, 10 сакавіка супраць А. Шумчанкі была ўзбуджаная крымінальная справа па ч. 1 арт. 339 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (хуліганства). А. Шумчанка падазраецца ў тым, што нібыта зьбіў свайго сукамерніка падчас адбыцьця адміністрацыйнага арышту. 11 сакавіка А. Шумчанка быў этапаваны ў ізалятар часовага ўтрыманьня.

***12 сакавіка*** падчас канцэрту ў маскоўскім клубе «Китайский летчик Джао Да» быў арганізаваны збор подпісаў у абарону беларускіх вязьняў сумленьня ***Валерыя Леванеўскага*** і ***Аляксандра Васільева***, які стаў новай формай падтрымкі расейскімі рок-музыкамі акцыі "Міжнароднай Амністыі". Першымі свае "аўтографы" на падпісных лістах, адрасаваных прэзідэнту Беларусі, пакінулі перад пачаткам канцэрту музыкі-удзельнікі групы «Tequilajazzz». Да канца вечару гэты сьпіс папоўніўся многімі дзясяткамі подпісаў, якія актывісты "Міжнароднай Амністыі" плануюць аддаць супрацоўнікам амбасады Рэспублікі Беларусь дзеля перадачы іх прэзідэнту Лукашэнку.

***12 сакавіка*** лідэр РГА "Персьпектыва" ***Анатоль Шумчанка*** дастаўлены з ізалятарау часовага ўтрыманьня на допыт у РУУС Маскоўскага раёну г. Менску. Допыт А. Шумчанкі адбыўся у прысутнасьці адваката. У ходзе допыту абвінавачаньняў А. Шумчанку сьледзтвам прад'яўлена не было, і ён застаецца ў статусе падазраванага. Анатоль Шумчанка лічыць узбуджэньне крымінальнай справы супраць яго правакацыяй сьпецслужбаў з мэтай перашкодзіць правядзеньню далейшых акцыяў пратэсту прадпрымальнікаў, у прыватнасьці, акцыі 25 сакавіка.

***14 сакавіка*** каля 40 актывістаў руху "Зубр" прынялі ўдзел у акцыі ў падтрымку палітзьняволенага ***Міхаіла Марыніча***. Акцыя праходзіла з 18.00 да 18.30 на Кастрычніцкай плошчы ў Менску. Удзельнікі трымалі ў руках партрэты М. Марыніча, які знаходзіцца ў цяжкім стане ў медчастцы аршанскай калоніі строгага рэжыму. Адзін з каардынатараў руху "Зубр" ***Павел Юхневіч*** заявіў, што акцыя будзе працягвацца ўвесь тыдзень. Яе ўдзельнікі будуць кожны дзень зьбірацца ў 18.00 на Кастрычніцкай плош-

чы і патрабаваць ад уладаў вызваленьня М. Марыніча. Акцыя прайшла спакойна, ніхто затрыманы ня быў.

***14 сакавіка*** акцыю ў падтрымку беларускага палітзьняволенага ***Міхаіла Марыніча*** абвесьціла ўплывовая праваабарончая арганізацыя "Міжнародная Амністыя". Праваабарончая арганізацыя заклікала накіроўваць беларускім уладам лісты з патрабаваньнем тэрмінова вызваліць палітыка.

***14 сакавіка*** кіраўнік дэлегацыі Еўрапарламенту па адносінах з Беларусьсю ***Богдан Кліх*** і ягоны намесьнік ***Алдзіс Кушкіс*** заклікалі беларускія ўлады вызваліць палітзьняволенага ***Міхаіла Марыніча*** і аказаць яму тэрміновую медыцынскую дапамогу. "У дэлегацыі Еўрапарламенту па адносінах з Беларусьсю існуюць сур'ёзныя асьцярогі, што беларускія ўлады зьбіраюцца зьнішчыць Міхаіла Марыніча фізічна", — гаворыцца ў заяве прадстаўнікоў дэлегацыі Еўрапарламенту.

***14 сакавіка*** ў РУУС Маскоўскага раёну г. Менску адбыўся чарговы допыт па ўзбуджанай крымінальнай справе супраць ***Анатоля Шумчанкі***, які знаходзіцца ў СІЗА г. Менску па вуліцы Валадарскага. У ходзе допыту афіцыйнае абвінавачаньне Шумчанку прад'яўленае не было, але пракурор Маскоўскага раёну санкцыянаваў ягонае ўтрыманьне пад вартай на працягу яшчэ 7 дзён. Пасьля, у адпаведнасьці з нормамі Крымінальна-працэсуальнага кодэксу, Шумчанку павінна быць прад'яўлена абвінавачаньне альбо ён мусіць быць вызвалены.

***15 сакавіка*** жонка палітычнага вязьня ***Аляксандра Васільева – Наталя Васільева*** накіравала скаргу Генеральнаму пракурору, міністру ўнутраных справаў і ў іншыя установы, у якой адзначае неправамоцнасьць дзеяньняў адміністрацыі калоніі адносна яе мужа. Аляксандр Васільеў адбывае пакараньне ў аршанскай папраўчай калоніі. У яго праблемы са здароўем, але яго прымушаюць працаваць там, дзе патрэбныя фізічныя намаганьні. Тым часам іншыя вязьні, якія хочуць працаваць, працы ня маюць. Натальля Васільева зазначае, што пры гэтым у мужа з пенсіі вылічваюць штомесяц 60-100 тысячаў рублёў на ўтрыманьне ў калоніі.

***16 сакавіка*** жонка зьняволенага прафесара ***Юрыя Бандажэўскага*** атрымала ад начальніка дэпартаменту па выкананьні пакараньняў Міністэрства ўнутраных справаў Беларусі адказ на свой ліст, у якім яна абскарджвала адмову ва ўмоўна-датэрміновым вызваленьні яе мужа. У адказе гаворыцца, што "дэпартамент ня бачыць ніякіх парушэньняў законнасьці ў тэрмінах разгляду пытаньня аб умоўна-датэрміновым вызваленьні прафесара". Адмову камісіі калоніі-пасяленьня №26 дэпартамент лічыць "правамернай і абгрунтаванай". Дэпартамент вінаваціць прафесара ў тым, што ён, атрымаўшы дазвол на адпачынак у 7 сутак увосень 2004

году, у тэрмін не вярнуўся ў калонію, а прыбыў толькі на пачатку студзеня 2005 году. Але ў гэты тэрмін прафесар Бандажэўскі праходзіў курс лячэньня, у тым ліку ў адной з менскіх бальніц. Дэпартамент таксама вінаваціць прафесара, што пяць дзён той наогул не знаходзіўся ў медыцынскіх установах, а быў дома, што "зьяўляецца грубым парушэньнем устаноўленага парадку адбываньня пакараньняў". У лісьце сказана, што "адміністрацыя калоніі №26 праявіла гуманнасьць, бо не прымяніла адносна Бандажэўскага мераў спагнаньня".

***17 сакавіка Ігар і Павел Марынічы*** атрымалі чарговую адмову на просьбу сустрэцца ў менскім турэмным шпіталі з бацькам. Для размовы з братамі Марынічамі не выйшлі і дактары, якія лечаць палітвязьня. Паводле сыноў Марыніча, адміністрацыя менскай калоніі, на тэрыторыі якой знаходзіцца шпіталь, і ягоныя дактары таксама ня выканалі абяцаньне штодня падрабязна інфармаваць пра здароўе вязьня. У прэсавай службе Міністэрства ўнутраных справаў здароўе ***Міхаіла Марыніча*** назвалі "здавальняючым".

***18 сакавіка*** прад'яўленае абвінавачаньне лідэру арганізацыі прадпрымальнікаў «Перспектыва» ***Анатолю Шумчанку*** па арт. 339 ч.1 Крымінальнага кодэксу – хуліганства. Тэрмін утрыманьня пад вартай А.Шумчанкі працягнуты на "перыяд правядзеньня дазнаньня".

***18 сакавіка*** да ***Міхаіла Марыніча*** не дапусьцілі адваката. Пра гэта паведаміў сын Павел Марыніч, якому таксама не даюць дазвол на сустрэчу з бацькам. Кіраўнікі менскай калоніі, дзе ў шпіталі знаходзіцца пасьля інсульту Міхаіл Марыніч, спасылаліся на тое, што "хворага ня трэба турбаваць". Павел Марыніч не выключае, што здароўе бацькі пагоршылася.

***22 сакавіка Мікола Статкевіч*** быў выкліканы ў сьледчы камітэт ГУУС Менгарвыканкаму, дзе яму была прад'яўленая пастанова сьледчага аб тым, што ён прызнаны падазраваным па крымінальнай справе, узбуджанай па факце правядзеньня масавых акцыяў пратэсту супраць вынікаў рэферэндуму ў кастрычніку 2004 году. Абвінавачаньне прад'яўленае па арт. 342 Крымінальнага кодэксу – "арганізацыя групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх". У адносінах да М.Статкевіча ў якасьці меры стрыманьня абраная падпіска аб нявыезьдзе. Мікола Статкевіч лічыць гэтую справу палітычна матываванай і не зьбіраецца даваць ніякіх паказаньняў і знаёміцца з матэрыяламі справы.

***22 сакавіка*** стала вядома, што ў адносінах да ***Валерыя Леванеўскага*** ў калоніі №22 ў пасёлку Даманава Івацэвіцкага раёну Берасьцейскай вобласьці ладзяцца розныя правакацыі, а таксама прадпрымаюцца спробы ўзбудзіць супраць яго крымінальную справу. Прадстаўнікі адміністра-

цыі даюць невыканальныя і незаконныя загады, а потым за іх невыкананьне падвяргаюць адказнасьці ў выглядзе выдварэньня ў штрафны ізалятар ці памяшканьне камернага тыпу. Акрамя таго, да палітзьняволенага пачалі падсылаць правакатараў з ліку асуджаных, якія пішуць заявы на імя начальніка калоніі пра тое, што Леванеўскі заклікаў іх да непадпарадкаваньня адміністрацыі.

***23 сакавіка Павел Севярынец*** падчас допыту атрымаў афіцыйнае абвінавачаньне ў арганізацыі дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, па крымінальнай справе, распачатай сьледчым камітэтам пасьля падзеяў 18 і 19 кастрычніка 2004 году. Тады на Кастрычніцкую плошчу выйшлі каля 5 000 чалавек у знак пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў рэферэндуму і выбараў. Павел Севярынец даў сьледчым падпіску аб нявыезьдзе з Віцебску, дзе ён прапісаны ў кватэры бацькоў.

***25 сакавіка*** Вярхоўны суд адмовіў лідэрам Рэспубліканскага страйкаму прадпрымальнікаў ***Валерыю Леванеўскаму*** і ***Аляксандру Васільеву*** ў пераглядзе прысуду. Намесьнік старшыні Вярхоўнага суда Калінковіч палічыў, што падставаў для вынясеньня пратэсту няма, і пакінуў рашэньне суда Ленінскага раёну Гародні ў сіле.

***25 сакавіка*** ўзбуджаная крымінальная справа па факце правядзеньня акцыі 25 сакавіка ў Менску з нагоды 87-ых угодкаў абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Справа ўзбуджаная па арт. 342 Крымінальнага кодэксу – “арганізацыя групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх”.

***28 сакавіка Вячаслаў Сіўчык***, арыштаваны на 15 сутак, паведаміў, што ўдзельнікаў акцыі на працягу трох дзён, пакуль яны знаходзіліся ў сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку да суда, дапытвалі ў сьледчым камітэце ГУУС Менгарвыканкаму па крымінальнай справе, узбуджанай па факце падзеяў 25 сакавіка ў Менску.

***28 сакавіка*** былы прадпрымальнік, дэпутат Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня ***Андрэй Клімаў*** атрымаў пастанову аб пачатку вытворчасьці па яго крымінальнай справе. Крымінальную справу ў адносінах да А.Клімава расьсьледаваў старшы сьледчы па асабліва важных справах пракуратуры г.Менску Аляксандр Пікараў. А.Клімаў абвінавачваецца ў паклёпе на прэзідэнта (ч.2 арт.367 Крымінальнага кодэксу РБ) і ў зьнявазе прэзідэнта (ч.1 арт.368 Крымінальнага кодэксу РБ). У пастанове аб перадачы справы ў суд пазначана, што А.Клімаў напісаў, арганізаваў выданьне і распаўсюд кніг і ўлётак, якія ўтрымліваюць зьняважлівыя выказваньні ў адрас прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і абвінавачаньні ва ўчыненьні цяжкіх злачынстваў. Пачатак слуханьняў у Першамайскім судзе г.Менску прызна-

чаны на 6 красавіка. Судзьдзя Алена Ананіч папрасіла загадзя праінфармаваць пра наяўнасьць у падсуднага адваката.

***31 сакавіка*** сьледчы па справе лідэра арганізацыі “Персьпектыва” ***Анатоля Шумчанкі*** вынес пастанову пра зьмену меры стрыманьня з утрыманьня пад вартай на падпіску аб нявыезьдзе ў сувязі “са зьмяніўшыміся абставінамі справы”.

***4 красавіка*** высьветлілася, што беларускія ўлады падманулі высокапастаўленага прадстаўніка ААН, паабяцаўшы вызваліць ***Юрыя Бандажэўскага*** ў студзені 2005 году. Кіраўнік Рабочай групы па адвольных затрыманьнях (Working Group on Arbitrary Detention) пры ААН спадарыня ***Лэйла Зэругі***, якая ў жніўні 2004 году наведвала Беларусь у рамках місіі па грамадзянскіх і палітычных правах, уключаючы пытаньні катаваньняў і адвольных затрыманьняў (Civil and political rights including the questions of torture and detention), была вельмі зьдзіўленая, калі пры сустрэчы з праваабаронцам ***Алесем Бяляцкім*** у Жэневе даведалася, што прафесар Юры Бандажэўскі яшчэ дасюль знаходзіцца ў зьняволеньні. «Беларускія ўлады абяцалі мне выпусьціць яго ў студзені 2005 году», — паведаміла сп-ня Лэйла Зэругі.

***5 красавіка*** ў РУУС Ленінскага раёну г. Менску каардынатару моладзевага руху “Зубр” ***Мікіту Сасіму*** паведамілі, што крымінальная справа ў адносінах да яго спыненая ў сувязі з нязначнасьцю нанесенай шкоды. 8 студзеня Мікіта Сасім быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі і абвінавачаны ў тым, што напісаў “Свабоду Марынічу” на будынках па прасьпекце Францыска Скарыны і вуліцы Валадарскага ў Менску. Пасьля затрыманьня ён знаходзіўся трое сутак у ізалятары часовага ўтрыманьня, пасьля чаго яму было прад’яўленае абвінавачаньне па ч.1 арт. 218 Крымінальнага кодэксу (наўмыснае зьнішчэньне альбо пашкоджаньне маёмасьці).

***5 красавіка*** беларускі палітзьняволены ***Аляксандр Васільеў*** пераведзены з Аршанскай калоніі ўзмоцненага рэжыму ў Менск, у рэспубліканскую бальніцу для зьняволеных. Пра гэта паведаміў ***Павел Марыніч***, бацька якога — палітзьняволены ***Міхаіл Марыніч***, знаходзіцца ў той жа бальніцы на абсьледаваньні.

**5 красавіка** стала вядома, што працэс над дэпутатам Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня і бізнэсоўцам ***Андрэем Клімавым*** па абвінавачаньні ў паклёпе і абразе прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, прызначаны на 6 красавіка ў Першамайскім судзе Менску, будзе закрытым. Па якой прычыне – невядома. Ні судзьдзя Алена Ананіч, ні выконваючы абавязкі старшыні Першамайскага суда не адказалі на гэтае пытаньне журналістам. Загадчыца канцылярыі суда патлумачыла: “У нас распараджэньне нашага выконваючага абавязкі старшыні – ніякай інфармацыі не даваць”.

Вядома, што позву ў суд у якасьці сьведкі атрымаў паплечнік спадара Клімава ***Леанід Малахаў***, якога выклікалі падчас сьледзтва па гэтай крымінальнай справе. У сваю чаргу, Андрэй Клімаў паведаміў, што адмаўляецца ад паслугаў адваката і зьявіцца на працэсе, каб паказаць, што “ў краіне ёсьць людзі, якія не баяцца пракурорскага ці судовага самавольства ды іншага ціску з боку Лукашэнкі на апазіцыйных палітыкаў”.

***7 красавіка*** Аляксандр Бірылаў – адвакат палітвязьня ***Аляксандра Васільева***, паведаміў, што ў рэспубліканскай бальніцы для зьняволеных у Менску вязень пройдзе агульнае абсьледаваньне. Адміністрацыя паправўчай калоніі павінна была згадзіцца з гэтым, бо Аляксандр Васільеў наракаў, што з увагі на стан здароўя ён ня можа выконваць тых працаў, якія яго прымушаюць рабіць. Аляксандр Бірылаў гаворыць, што ў турэмным шпіталі вязень можа прабыць прыблізна месяц.

***13 красавіка*** Незалежная лабараторыя дасьледаваньняў радыеактыўнасьці CRIIRAD зьвярнулася да беларускіх уладаў з прапановай стварыць для зьняволенага прафесара ***Юрыя Бандажэўскага*** навуковую лабараторыю, дзе ён змог бы прадоўжыць свае дасьледаваньні ў галіне радыяцыйнай медыцыны. Пра гэтую прапанову CRIIRAD абвесьціў на міжнародным навуковым сыімпозіуме ў францускім Ліёне, у якім брала ўдзел жонка прафесара Галіна Бандажэўская. Стварэньне лабараторыі адмыслова для Бандажэўскага падтрымалі ўлады аднаго з эканамічных цэнтраў Францыі – Ліёнскага рэгіёну. Беларускія ўлады пакуль ніяк не адрэагавалі на гэтую прапанову, аднак CRIIRAD мяркуе прыкласьці ўсе намаганьні, каб зьняволены прафесар змог працягнуць свае навуковыя дасьледаваньні, якія ён пачаў яшчэ на пасадзе рэктара Гомельскага медыцынскага інстытуту. Прафесар Бандажэўскі станоўча ўспрыняў гэтую прапанову. Паводле ***Галіны Бандажэўскай***, лабараторыя будзе ствараецца і фінансавацца францускім бокам і будзе мець біялагічны характар, адмыслова для эксьперыментальных дасьледаваньняў.

***15 красавіка*** крымінальная справа супраць ***Паўла Севярынца*** і **Мікалая Статкевіча** перададзеная ў суд Ленінскага раёну Менску. Іх абвінавачваюць у арганізацыі масавых вулічных выступленьняў грамадзянаў 18 і 19 кастрычніка 2004 году супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і рэферэндуму. Мікола Статкевіч адмовіўся ад паслугаў адваката і сказаў, што ня будзе даваць паказаньняў у судзе і ўдзельнічаць у допыце сьведкаў. Паводле яго, крымінальная справа цалкам палітычная, скіраваная на нейтралізацыю актывістаў вулічных дэманстрацыяў. А таму прысуд, лічыць Мікола Статкевіч, будзе такі, які запатрабавалі ўлады. Актывіст “Маладога Фронту” Павел Севярынец знаходзіцца ў Віцебску пад падпіскай пра нявыезд. На працягу тыдня ён ня можа дабіцца ад пракуратуры дазволу прыехаць у Менск, каб сустрэцца са сваім адвакатам. Згодна з Крымі-

нальна-працэсуальным кодэксам, яму павінна быць гарантаваная неабходная колькасьць сустрэчаў з абаронцам. “Ніякага крыміналу ў дзеяньнях людзей 18 і 19 кастрычніка не было. Замова скіраваная на тое, каб стрымаць тых людзей, якія могуць арганізаваць грамадзка актыўныя палітычныя пратэсты. Безумоўна, вынік будзе прадвызначаны рашэньнем улады. Рашэньне будзе зыходзіць з палітычнай сітуацыі. Ну, і, безумоўна, рыхтуюся да самага горшага — да магчымага пазбаўленьня волі. Стаўлюся да гэтага спакойна”, — сказаў Павел Севярынец.

***19 красавіка*** маці ***Веранікі Чаркасавай*** Дыяна і айчым Уладзімір Мялешка правялі прэсавую канферэнцыю. Яны лічаць, што сьледзтва не рэагуе на заклікі міжнародных праваабарончых арганізацыяў разгледзець вэрсію забойства, зьвязаную з прафесійнай дзейнасьцю Веранікі. Паводле версіі калегаў Веранікі Чаркасавай са штотыднёвіка “Салідарнасьць”, забойства журналісткі магло мець палітычныя прычыны, паколькі ёсьць верагоднасьць таго, што журналістка валодала сакрэтнай інфармацыяй пра пастаўкі беларускай зброі ў Ірак. Журналіст «БДГ» Сяргей Сацук высьветліў, што за месяц да гібелі Вераніка Чаркасава пачала зьбіраць зьвесткі пра беларускі “Інфабанк”, які абслуговаў кантакты Беларусі з Іракам. Аляксандр Старыкевіч, рэдактар газеты “Салідарнасьць”, дзе працавала перад сьмерцю Вераніка Чаркасава, таксама лічыць палітычную версію асноўнай. Міжнародная арганізацыя “Рэпарцёры бяз межаў” заклікала беларускія ўлады расьсьледаваць палітычную версію забойства.

***22 красавіка*** ў Менску затрымалі ***Андрэя Клімава*** на аўтастаянцы на вуліцы Платонава і адвезьлі ў будынак па вуліцы Сапёраў, 7. Сьледчы Ігар Прахарэнкаў пазнаёміў Клімава з пастановай, паводле якой палітыка падазраюць у арганізацыі “групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак”, за падзеі 25 сакавіка, калі адбылася дэманстрацыя пад лозунгамі адстаўкі Аляксандра Лукашэнкі. Сьледчы вырашыў на 72 гадзіны пакінуць Андрэя Клімава ў камеры ізалятару часовага ўтрыманьня.

***25 красавіка*** Менская пракуратура прыняла рашэньне аб далейшым знаходжаньні ***Андрэя Клімава*** ў ізалятары часовага ўтрыманьня. Першамайскі суд пакуль ня вынес рашэньня па судовай справе за паклёп на прэзідэнта, а на А.Клімава супрацоўнікі сьледчага камітэту распачалі новую крымінальную справу – па абвінавачаньні ў арганізацыі “групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак” – за акцыю 25 сакавіка. Мяркуецца, што прысуд па ранейшай справе вынесены так і ня будзе. Справа ў тым, што першае паседжаньне адбылося 6 красавіка і, паводле рашэньня суда, наступнае перанесьлі на 25 красавіка — пракурор патлумачыла, што ёй неабходна сабраць дадатковую інфармацыю. Тым часам 22 красавіка Андрэя Клімава затрымалі і як падазраванага пакінулі ў ізалятары

часовага ўтрыманьня. Судовае паседжаньне ў Першамайскім судзе за паклёп на Аляксандра Лукашэнку прызначана на 19 траўня.

***25 красавіка*** амбасадары Літвы і Латвіі ***Ёнас Паслаўскас*** і ***Майра Мора*** наведалі ў турэмным шпіталі былога міністра і амбасадара ***Міхаіла Марыніча***, які адбывае тэрмін паводле абвінавачаньня, якое міжнародныя праваабарончыя арганізацыі і краіны Захаду лічаць палітычна матываваным. Амбасадары паказалі Міхаілу Марынічу сертыфікат аб тым, што Еўрапейскі рух Даніі даў яму званьне “Чалавек году – 2005”. Спадарыня Мора зазначыла, што ў Латвіі занепакоеныя лёсам Міхаіла Марыніча, асабліва тым, што апазіцыйны палітык у турме перанёс інсульт. Паводле Майры Моры, на ўмовы свайго ўтрыманьня Міхаіл Марыніч ня скардзіўся. Па яе словах, начальнік турэмнага шпіталю паведаміў, што пасьля 9 траўня да Міхаіла Марыніча яшчэ раз выклічуць цывільных лекараў для абсьледаваньня.

***26 красавіка*** – чарговая, 19-я гадавіна Чарнобыльскай катастрофы. Зьняволены прафесар ***Юры Бандажэўскі***, які адбывае пакараньне ў калоніі, тлумачыць спад цікавасьці да гэтай праблемы: “Апатыя ў грамадзтве – гэта дрэнна і адносна здароўя чалавека, і грамадзянскай пазіцыі. Гэта сьведчыць наогул пра ступень сьпеласьці ўсяго грамадзтва. Я перажываю за тое, што мы прапускаем вельмі важны перыяд, калі трэба прадпрымаць актыўныя дзеяньні адносна здароўя людзей. І калі гэта ўсё згорнута, калі колькасьцю лякарняў спрабуем ліквідаваць захворваемасьць, мы яе ніколі не ліквідуем. На жаль, губляем час для вывучэньня, каб нешта рабіць, трэба зразумець прычыны і наступствы захворваньня, а ня проста так абʼяўляць чарговыя лозунгі ці нейкія кампаніі”.

***26 красавіка*** – гадавіна арышту былога амбасадара і міністра ***Міхаіла Марыніча***, які адбывае пакараньне ў калоніі паводле судовага рашэньня нібыта за прыўлашчаньне кампутараў.

***12 траўня Таццяна Леановіч*** наведала свайго мужа ***Андрэя Клімава*** ў сьледчым ізалятары, якога трымаюць там з 22 красавіка. Сьледчыя абвінавачваюць палітыка ў арганізацыі вулічнай акцыі 25 сакавіка, якая нібыта прывяла да масавых беспарадкаў. Яшчэ адна крымінальная справа супраць Клімава, за паклёп на А.Лукашэнку, знаходзіцца ў Першамайскім судзе. Сьледзтва падоўжыла тэрмін знаходжаньня за кратамі Андрэя да 22 чэрвеня. Андрэй Клімаў адмовіўся ад паслугаў адваката. Апроч таго, ён заявіў сьледчаму, што ня будзе знаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы. Паводле яго, у палітычных справах і сьледзтва, і суд заангажаваныя, а на ролю статыста ён не пагаджаецца. Андрэй Клімаў у часе спатканьня з жонкай пацьвердзіў сваю ранейшую пазіцыю.

***15 траўня*** затрымалі былога дэпутата ***Сяргея Скрабца***. Пра гэта паве-

даміў памочнік экс-парламентара Сяргей Галаганюк. Затрыманьне адбылося каля кватэры Скрабца ва Уруччы, а затым яго перавезьлі ў Берасьце, дзе разьмясьцілі ў ізалятары часовага ўтрыманьня. Паводле Сяргея Галаганюка, экс-дэпутат здолеў патэлефанаваць яму з мабільнага тэлефона адразу пасьля затрыманьня. Людзі, якія затрымалі Сяргея Скрабца, прадставіліся яму як супрацоўнікі ўпраўленьня па справах барацьбы з арганізаванай злачыннасьцю: “Каля дзясятай гадзіны раніцы ён пайшоў у басейн. І яго затрымалі. Яго, мабыць, чакалі каля пад’езду, магчыма, званілі яму зьнізу, але ў яго дамафон быў адключаны. Скрабец спытаўся, на якой падставе яго затрымліваюць. Яму адказалі, па падазрэньні на тое, што ён хацеў даць хабар у памеры 30 тысячаў даляраў. Хацеў? Так жа можна любога затрымаць. Гэта ж нейкая бязглузьдзіца. У іх няма нічога...” Сяргей Скрабец пасьпеў таксама перадаць, што яго вязуць на допыт у Берасьце, бо супрацоўнікі Упраўленьня інкрымінуюць яму жаданьне даць хабар нейкай службовай асобе Берасьця. Літаральна праз гадзіну пасьля затрыманьня Сяргея Скрабца ў ягонай кватэры, а таксама ў кватэры ягоных бацькоў правяліператрусы. Пра гэта мне паведаміла жонка спадара Скрабца – Аляксандра: “Яны правялі ператрус у бацькоў, у нас дома. У нас шукалі нейкія дакументы, я пра іх нічога ня ведаю, пра нейкую брэсцкую справу, быццам бы Сяргей там прапаноўваў камусьці нейкі хабар. Пазабіралі ягоныя старыя дакументы, лісты... У бацькі быў архіў — выразкі газетныя, іншыя матэрыялы пра Сяргея, яны там парыліся, і што хацелі, тое забралі. Гэтаксама і ў нас. Забралі ягоны нататнік”. Паводле жонкі экс-дэпутата, “ператрусы праводзілі супрацоўнікі менскага ўпраўленьня па справах барацьбы з арганізаванай злачыннасьцю. У іх была на гэта санкцыя з Берасьця”. Сяргей Скрабец пасьпеў таксама перадаць жонцы, што ў Берасьці ягоным допытам будзе займацца следчы па асабліва важных справах Андрэй Ліванаў.

***16 траўня*** богламу дэпутату Палаты прадстаўнікоў ***Сяргею Скрабцу*** вызначылі меру стрыманьня — утрыманьне пад вартай. Крымінальная справа распачатая паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэксу — падрыхтоўка да злачынства і даваньне хабару. Міліцыя нібыта мае матэрыялы пра тое, што Сяргей Скрабец падбухторваў беспрацоўнага жыхара Бярозы даць хабар 30 тысяч даляраў ЗША супрацоўнікам абласных пракуратуры і суда. За гэтыя грошы быццам бы абяцалі вынесьці апраўдальны прысуд жыхару вёскі Гальшаны Столінскага раёну, які асуджаны на 24 гады за бандытызм і іншыя злачынствы.

***17 траўня*** кіраўнік офісу АБСЕ ў Менску амбасадар ***Эберхард Хайкен*** наведаў палітзьняволенага прафесара ***Юрыя Бандажэўскага***. Пасол Хайкен наведаў прафесара Бандажэўскага ўжо на ягоным новым месцы пасяленьня, у сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве “Беліцаагра” ў Лідзкім раёне, куды яго перавезьлі некалькі дзён таму і дзе ён пачынае працу сьлесарам на ферме.

***17 траўня Сяргей Скрабец*** абвясьціў галадоўку за кратамі. Пра гэта паведаміў памочнік экс-дэпутата Сяргей Галаганюк. Жонка Сяргея Скрабца Аляксандра працуе лекарам-тэрапеўтам і добра ведае, як небясьпечна пачынаць галадаць без папярэдняй падрыхтоўкі. Яна лічыць, што муж адмовіўся ад ежы яшчэ 15 траўня, адразу ж пасьля свайго арышту.

***23 траўня*** прад'яўленае абвінавачаньне былому дэпутату Палаты прадстаўнікоў ***Сяргею Скрабцу***. Абвінавачаньне прад'яўлена па тых жа артыкулах Крымінальнага кодэксу, па якіх была ўзбуджаная справа: падрыхтоўкі да злачынства і дача хабару. Сяргей Скрабец працягвае галадоўку пратэсту ў сьледчым ізалятары ў Берасьці.

***23 траўня*** ў судзе Цэнтральнага раёну Менску пачаўся суд над актывістамі апазіцыі ***Міколам Статкевічам*** і ***Паўлам Севярынцам***. Іх абвінавачваюць у арганізацыі масавых вулічных выступленьняў 18 і 19 кастрычніка 2004 году ў знак пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і рэферэндуму. Павел Севярынец лічыць гэтую судовую справу "працягам кампаніі палітычнай "зачысткі" перад выбарамі 2006 году". Мікола Статкевіч заявіў яшчэ падчас сьледзтва, што не прызнае гэты суд, і адмовіўся даваць паказаньні. Таксама М. Статкевіч сказаў, што ня лічыць беларускія суды незалежнымі і адмовіўся ўставаць, калі да яго зьвяртаўся судзьдзя. Судзьдзя Есіновіч, які вядзе крымінальную справу, расцаніў гэтыя дзеяньні як праяўленьне непавагі да суда. Пастанову аб прыцягненьні М. Статкевіча да адміністрацыйнай адказнасьці па арт. 166.1 КаАП Рэспублікі Беларусь вынес судзьдзя Цэнтральнага раёну Аляксей Бычко. Паводле вынесенай пастановы, М. Статкевіч арыштаваны на 10 сутак. Адразу з залы суда ён быў дастаўлены у сьпецпрыёмнік ГУУС Менгарвыканкаму на вул. Акрэсьціна.

***25 траўня*** працягваўся суд над ***Міколам Статкевічам*** і ***Паўлам Севярынцам*** у судзе Цэнтральнага раёну Менску. На думку Паўла Севярынца, паказаньні сьведкаў на судзе не паўплываюць належным чынам на фармулёўку прысуду. Лідэр АГП Анатоль Лябедзька, якога 19 кастрычніка амапаўцы зьбілі падчас затрыманьня, даваў паказаньні ў якасьці сьведкі. "Пракуратура высоўвае тыя абвінавачаньні, якіх не было ў прыродзе. Наколькі я ведаю, у справе няма ніводнага звароту ад менчукоў, якія жывуць на прасьпекце Скарыны, на вуліцы Энгельса, што ім нехта перашкаджаў. Па-другое, перакрыцьцё вуліцы — поўны абсурд. Кожны дзень трапляю ў сітуацыю, калі не магу выехаць на прасьпект Скарыны толькі таму, што Аляксандр Лукашэнка ў гэты час выяжджае са сваёй рэзідэнцыі. Але ж пракуратура не распачынае крымінальную справу з-за таго, што перакрыты дарожны рух на 5—10 хвілінаў", — кажа Лябедзька.

***25 траўня Валеры Леванеўскі*** заявіў, што абвесьціць галадоўку, калі ня будуць разгледжаныя ягоныя скаргі на дзеяньні турэмнай адміністрацыі і калі з пасады кіраўніка Дэпартаменту выкананьня пакараньняў Міністэрства ўнутраных справаў ня здымуць Уладзіміра Коўчура. Да спадара Коўчура Валеры Леванеўскі зьвяртаўся, каб абскардзіць пакараньні, якія наклала на яго адміністрацыя Івацэвіцкай калоніі нібыта за парушэньні турэмнага рэжыму. Спадар Леванеўскі лічыць іх незаконнымі, між тым, з-за гэтых пакараньняў яго могуць пазбавіць права на амністыю. Раней ён спрабаваў абскардзіць гэтыя пакараньні таксама праз суд, але судзьдзі вырашылі, што гэта ня ў іх кампетэнцыі. Уладзімір Коўчур таксама не дапамог вязьню. І цяпер Валеры Леванеўскі патрабуе ягонай адстаўкі. У выпадку невыкананьня ягоных патрабаваньняў аб разглядзе скаргаў і адстаўцы Коўчура гарадзенскі прадпрымальнік плануе з 1 чэрвеня распачаць галадоўку. Уладзімір Коўчур спакойна паставіўся да гэтых патрабаваньняў. Наконт прэтэнзіяў пра адсутнасьць рэакцыі на скаргі Леванеўскага Уладзімір Коўчур зазначыў: “На некаторыя адказваў, на некаторыя мой намесьнік мог адказваць. Правільна будзе сказаць гэтак, што на ўсе ягоныя скаргі ў дэпартамент адказы дадзеныя, а за якім подпісам, гэта, прабачце, ужо мне вырашаць”. Што да папярэджаньня Валерыя Леванеўскага пра галадоўку, то Уладзімір Коўчур сказаў, што гэта права любога вязьня.

***26 траўня*** ў судзе Цэнтральнага раёну Менску працягваўся разгляд крымінальнай справы ***Міколы Статкевіча*** і ***Паўла Севярынца***. У судзе сабралася некалькі дзясяткаў чалавек, каб прысутнічаць на судовым працэсе і падтрымаць актывістаў апазіцыі. У судовай зале апыталі апошніх сьведкаў, а потым адбыўся прагляд відэазапісу падзеяў 18 і 19 кастрычніка. Стужку прадставіла гарадзкое ўпраўленьне ўнутраных справаў. Павел Севярынец так пракаментаваў гэта: “Пасьля прагляду відэаматэрыялаў стала зразумела, што крымінальная версія гэтай справы не вытрымлівае ніякай крытыкі. Ніякага крыміналу, грубага парушэньня грамадзкага парадку, нецэнзурных выкрыкаў альбо нейкіх дзеяньняў, якія перашкаджаюць нармальнай жыцьцядзейнасьці жыхароў дамоў, як сфармулявана ў абвінавачаньні, не было. Уся стужка — гэта палітычны кліп. Разам з тым, працэс, мяркуючы з удакладненьняў судзьдзі, якія ён робіць падчас прагляду і апытаньня сьведкаў, маюць яўна абвінаваўчы ўхіл. Судзьдзя не хавае, што яго цікавіць менавіта пацьверджаньне віны, а не невінаватасьці. Гэтая справа нагадвае палітычную замову”.

***27 траўня*** пракурор Вадзім Пазьняк запатрабаваў асудзіць актывістаў апазіцыі ***Міколу Статкевіча*** і ***Паўла Севярынца*** да трох гадоў абмежаваньня волі.

***31 траўня*** суд Цэнтральнага раёну г. Менску вынес абвінаваўчы пры-

суд па крымінальнай справе супраць актывістаў апазіцыі ***Паўла Севярынца*** і ***Міколы Статкевіча***. Згодна з вынесеным прысудам, палітыкі былі асуджаныя да трох гадоў абмежаваньня волі.

***31 траўня*** ў Менску затрыманы ***Аляксандр Скрабец*** – малодшы брат экс-дэпутата ***Сяргея Скрабца***, якога пасьля гэтага перавезьлі ў Берасьце. Інфармацыю пра затрыманьне Аляксандра Скрабца пацьвердзіў Міхаіл Хоміч — адвакат Сяргея Скрабца. У чым канкрэтна падазраецца малодшы Скрабец, пакуль невядома. Але сьледчыя таксама пацьвярджаюць, што затрыманьне Аляксандра Скрабца зьвязанае менавіта са справай ягонага старэйшага брата.

***1 чэрвеня*** каля беларускай амбасады ў Брусэлі сябры “Беларускага еўрапейскага задзіночаньня” наладзілі акцыю пратэсту супраць прысуду ***Міколу Статкевічу*** і ***Паўлу Севярынцу***. Удзельнікі акцыі спрабавалі перадаць зварот да амбасадара, у якім папярэджвалі беларускія ўлады пра крымінальную адказнасьць за перасьлед актывістаў апазіцыі.

***2 чэрвеня Валеры Леванеўскі***, які адбывае пакараньне ў папраўчай калоніі № 22 (Івацэвіцкі раён Берасьцейскай вобласьці), аб’явіў галадоўку супраць парушэньня ягоных правоў і законных інтарэсаў. Асноўнае патрабаваньне, якое выстаўляе Валеры Леванеўскі, – адстаўка начальніка Дэпартаменту выкананьня пакараньняў пры МУС Уладзіміра Коўчура. Зьняволены Леванеўскі лічыць, што менавіта з-за ўказаньняў Коўчура ягоныя скаргі і заявы не разглядаюцца ва ўстаноўленым законам парадку, а многія з іх наогул не бяруцца да ўвагі.

***6 чэрвеня*** ў судзе Цэнтральнага раёну Менску пачаўся судовы працэс над дэпутатам Вярхоўнага Савету 13 скліканьня, бізнэсоўцам ***Андрэем Клімавым***. Яго абвінавачваюць у арганізацыі вулічнай акцыі 25 сакавіка, падчас якой нібыта адбываліся грубыя парушэньні грамадзкага парадку-. Дзяржаўным абвінаваўцам па справе прызначаны дарадца юстыцыі Вадзім Пазьняк. Судовае паседжаньне вядзе судзьдзя Сьвятлана Ганчар, якая дапытала сьведкаў-амапаўцаў, а таксама трох грамадзянаў, якія былі затрыманыя і адбылі адміністрацыйнае пакараньне за ўдзел у гэтай акцыі. Андрэй Клімаў адмовіўся ад адваката і ягоныя інтарэсы ў судзе прадстаўляе жонка Тацяна Леановіч. У Першамайскім судзе Менску ёсьць яшчэ адна крымінальная справа супраць Андрэя Клімава – за паклёп на Аляксандра Лукашэнку. Суд пачаўся 6 красавіка, але паседжаньні адновяцца пасьля вынясеньня прысуду ў Цэнтральным судзе.

***6 чэрвеня*** зьняволены лідэр гарадзенскіх прадпрымальнікаў ***Валеры Леванеўскі*** патрапіў у турэмную медычную частку, але не спыніў галадоўкі. Пра гэта паведамілі ў Дэпартаменце выкананьня пакараньняў. Пра здароўе

Валерыя Леванеўскага там адказалі: “Здавальняючае. Ён абвясьціў галадоўку, і таму яго зьмясьцілі ў медычную частку і паведамілі ў пракуратуру”.

***7 чэрвеня*** суд Цэнтральнага раёну Менску вырашыў лёс маёмасьці ***Міхаіла Марыніча***: прас, велатрэнажор і тэлевізар — толькі гэтыя рэчы пакінула судзьдзя Наталя Вайцяховіч былой жонцы і сынам Міхаіл Марыніча з ўсёй маёмасьці ў кватэры, дзе раней жыў асуджаны палітык. Сваякі прасілі судзьдзю скасаваць былое рашэньне аб канфіскацыі на той падставе, што Міхаіл Марыніч стварыў новую сям’ю і забраў сваю маёмасьць. На працэсе былі апытаныя сьведкі, якія давалі паказаньні адносна прыналежнасьці розных рэчаў з кватэры сваякам Міхаіла Марыніча, аднак толькі ў трох выпадках суд вырашыў спрэчку на карысьць сваякоў палітыка. Уся астатняя маёмасьць будзе канфіскаваная. Сыны Міхаіла Марыніча ўжо заявілі, што ня згодныя з гэтым рашэньнем і зьбіраюцца яго абскардзіць.

***9 чэрвеня*** ў Цэнтральным судзе Менску працягваўся судовы працэс над ***Андрэем Клімавым*** па абвінавачаньні ў арганізацыі акцыі 25-га сакавіка, падчас правядзеньня якой нібыта адбываліся масавыя парушэньні грамадзкага парадку. 8 чэрвеня быў зроблены перапынак, каб жонка Андрэя Тацяна Леановіч, якая зьяўляецца ягоным абаронцам, азнаёмілася з матэрыяламі крымінальнай справы і падрыхтавалася да выступу ў спрэчках. Але насамрэч суд забараняе Тацяне размаўляць з ім. Яна ня мае магчымасьці, як таго патрабуе Крымінальна-працэсуальны кодэкс, сустрэцца са сваім падабаронным сам-насам і выпрацаваць канцэпцыю абароны. Больш за тое, Тацяна планавала наведаць свайго мужа ў сьледчым ізалятары. Калі яна туды прыйшла, то ёй адмовілі, спаслаўшыся на службовую інструкцыю, якая забараняе сваякам наведваць сваіх падабаронных. Тая ліцэнзія, якую Тацяне выпісала судзьдзя Сьвятлана Ганчар, дазваляе сустракацца з мужам толькі ў будынку суда. Тацяна казала, што ледзь не страціла прытомнасьць, калі ўбачыла свайго мужа ў так званым “стакане” падчас судовага перапынку. Суд месьціцца на першым паверсе жылога дому. Арыштаваных трымаюць у падвале ў маленькіх закутках метр на паўметра і вышынёй прыкладна ў паўметра. Андрэй увесь перапынак стаяў у ім, падагнуўшы ногі. Канваіры забаранілі ёй даць мужу маленькую бутэльку вады. Яны паабяцалі, што, калі ён іх папросіць, то дадуць папіць з крану. У гэты дзень у судзе былі прагледжаныя ўсе відэазапісы, зробленыя супрацоўнікамі міліцыі і сьпецслужбамі. Тацяна Леановіч сказала, што “прагляд відэа вельмі яе ўразіў, было відаць, што амапаўцы жорстка выціснулі людзей з прасьпекту Скарыны і вуліцы Леніна, і ніякай акцыі насамрэч не адбылося”. Тацяна Леановіч абураная, што мужа абвінавачваюць у арганізацыі акцыі, якая не адбылася. Прамова пракурора Вадзіма Пазьняка доўжылася 15 хвілінаў. Адзіным доказам віны Андрэя Клімава было яго прызнаньне ў намаганьнях арганізаваць акцыю 25 сака-

віка, якая, нават паводле словаў самога Пазьняка, не адбылася. Тым ня менш, дзяржаўны абвінаваўца папрасіў пакараць падсуднага 3 гадамі пазбаўленьня волі з адбыцьцём ў папраўчай калоніі строгага рэжыму і давёў, што амністыя, якая была прынятая 6-га траўня, на Клімава не распаўсюджваецца.

***10 чэрвеня*** суд Цэнтральнага раёну Менску вынес прысуд дэпутату Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня, бізнэсоўцу і палітыку ***Андрэю Клімаву*** — паўтары гады абмежаваньня волі. У тэрмін былі залічаныя два месяцы, якія А. Клімаў ужо адседзеў, знаходзячыся пад вартай у СІЗА г. Менску. А. Клімаў быў вызвалены ў зале суда і мае 10 дзён на касацыйнае абскарджаньне вынесенага прысуду ў Менскім гарадзкім судзе. Прысуд вынесены паводле арт. 342 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (арганізацыя групавых дзеяньняў, што груба парушаюць грамадзкі парадак). Парушэньне, на думку сьледзтва, выразілася ў тым, што А. Клімаў арганізаваў і правёў несанкцыянаваную масавую акцыю ў цэнтры г. Менску 25 сакавіка. Аднак, гэта не апошняе судовае разьбіральніцтва ў адносінах да А. Клімава. Ён таксама абвінавачваецца ў паклёпе на прэзідэнта (ч. 2 арт. 368 КК) і ў абразе прэзідэнта (ч. 1 арт. 368 КК) за выказваньні ў адрас Аляксандра Лукашэнкі ў ягоных артыкулах і кнігах.

***10 чэрвеня*** ў Барысаве адноўлены разгляд мясцовым судом справы рэдактара недзяржаўнай газеты “Борисовские новости” ***Анатоля Букаса***. Крымінальная справа на Анатоля Букаса была заведзеная яшчэ летась. У лістападзе барысаўская пракуратура праінфармавала рэдактара “Барысаўскіх навінаў”, што напісаны ім у сакавіку 2004 году крытычны артыкул пра рэдактарку газеты Барысаўскага гарвыканкаму “Адзінства” Веру Пратасевіч трапляе пад дзеяньне Крымінальнага кодэксу. Артыкул называўся па-расейску “Звезданутый пострел везде поспел, или Молчание ягнят”. У студзені пракуратура ўдакладніла, што рэдактар недзяржаўнай газеты ўзьвёў паклёп ды абразіў рэдактарку афіцыйнай газеты.

***12 чэрвеня*** абрабаваны офіс ***Бабруйскай філіі праваабарончай арганізацыі “Вясна”.*** З памяшканьня вынеслі 10 крэслаў, тэлефон, гарбатнік, абагравальнік, зьнялі жалюзі і нават бел-чырвона-белы сьцяг. Праваабаронца ***Ігар  Ходзька*** знаходзіўся ў той момант у паездцы і атрымаў гэтую інфармацыю па тэлефоне. Прадстаўнікі праваахоўных органаў, прыехаўшы на месца злачынства, папрасілі даць сьпіс людзей, якія наведваюцца ў офіс, патлумачыўшы гэта тым, што трэба шукаць злачынцаў сярод “сваіх”. Па факце крадзяжу ўзбуджаная крымінальная справа.

***13 чэрвеня*** ў Барысаве па крымінальнай справе галоўнага рэдактара “Борисовских новостей” ***Анатоля Букаса*** пракурор папрасіў прызначыць

для абвінавачваемага пакараньне ў выглядзе штрафаў — па 30 базавых велічыняў па 188 і 189 артыкулах КК РБ.

***14 чэрвеня*** Берасьцейская пракуратура дала адмоўны адказ на хадайніцтва адваката Хоміча аб зьмене меры стрыманьня былому дэпутату ***Сяргею Скрабцу***. Адвакат паведаміў, што ён рыхтуе новае хадайніцтва – гэтым разам у суд. Пайшоў другі месяц галадоўкі Сяргея Скрабца за кратамі, але пракуратура адмовілася зьмяніць меру стрыманьня. Родныя ўжо некалькі разоў зьвярталіся да яго з просьбаю, каб ён спыніў галадоўку. З тым жа самым заклікам выступілі паплечнікі Скрабца па дэпутацкай групе “Рэспубліка” Валеры Фралоў і Уладзімір Парфяновіч. Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла таксама зьвярнулася да Сяргея Скрабца з просьбай спыніць галадоўку. Аналагічны зварот прыняло кіраўніцтва Аб’яднанай грамадзянскай партыі.

***15 чэрвеня*** стала вядома, што праблемы са здароўем сталі галоўнай прычынай спыненьня галадоўкі лідэрам гарадзенскіх прадпрымальнікаў ***Валерыем Леванеўскім***. Пра гэта паведаміў сын Леванеўскага Уладзімір, спаслаўшыся на ліст, атрыманы ад бацькі. Паводле ягоных словаў, бацька заявіў, што будзе штомесяц праводзіць галадоўкі і не адмаўляецца ні ад аднаго са сваіх патрабаваньняў. Вязень не давярае абяцаньням адміністрацыі калоніі наконт таго, што ў выпадку паводзінаў без парушэньняў турэмнай дысцыпліны праз паўгоду яго вызваляць умоўна-датэрмінова.

***15 чэрвеня*** гарадзенскі адвакат Аляксандр Бірылаў наведаў у Івацэвіцкай калоніі ***Валерыя Леванеўскага***. Паводле адваката, Валерый Леванеўскі схуднеў, але захаваў бадзёрасьць і добры настрой. Вязень казаў, што недахоп ежы яму кампенсавала добрае паветра, бо вакол калоніі шмат лясоў і паветра вельмі чыстае. Адвакат паведаміў, што ў выніку галадоўкі сустрэцца з Леванеўскім адмыслова прыяжджалі кіраўнік Берасьцейскай управы дэпартаменту выкананьня пакараньняў і намесьнік начальніка дэпартаменту з Менску. Аднак большасьць прэтэнзіяў Леванеўскага да адміністрацыі калоніі пакуль засталіся. Яны тычацца правілаў атрыманьня і адпраўленьня карэспандэнцыі. Валеры Леванеўскі лічыць, што правы вязьняў на карэспандэнцыю моцна абмяжоўваюцца. Прыкладам, за год знаходжаньня ў калоніі спадар Леванеўскі накіраваў каля ста розных лістоў і скаргаў, аднак, паводле ягоных зьвестак, дайшла іх да адрасатаў усяго дзясятая частка. Таму лідэр прадпрымальнікаў патрабуе ўдасканаліць сістэму ўліку скаргаў асуджаных і адказаў на гэтыя скаргі. Паколькі ягоныя патрабаваньні ня выкананыя, ён пакінуў за сабой права аднавіць галадоўку.

***16 чэрвеня*** суд г. Барысаву прызнаў рэдактара газеты “Борисовские новости” ***Анатоля Букаса*** вінаватым у парушэньні ч.2 188 КК РБ (паклёп, які ўтрымліваецца ў публічным выступленьні альбо ў СМІ) і ч.2 арт.

189 КК РБ (наўмыснае прыніжэньне гонару і годнасьці асобы, выказанае ў непрыстойнай форме). Судзьдзя Алена Самцэвіч абавязала яго выплаціць штраф у памеры 40 базавых велічыняў, а таксама 3 мільёны рублёў на кампенсацыю маральных стратаў рэдактару газеты Барысаўскага гарвыканкаму "Адзінства" Веры Пратасевіч.

***20 чэрвеня Валеры Леванеўскі*** пасьля галадоўкі патрапіў у турэмны шпіталь Івацэвіцкай калоніі. Як паведаміў сын Валерыя Леванеўскага Уладзімір, ягоны бацька адчувае болі ў сэрцы і праходзіць курс лячэньня.

***20 чэрвеня*** сьледчы Берасьцейскай пракуратуры Андрэй Ліванаў паведаміў, што справу ***Сяргея Скрабца*** будзе весьці іншы сьледчы. Паводле яго, гэта выклікана тым, што справу былога дэпутата запатрабавала да сябе рэспубліканская пракуратура.

***22 чэрвеня*** шэраг вядомых асобаў зьвярнуліся да былога дэпутата ***Сяргея Скрабца*** з заклікам спыніць галадоўку, якую той трымае ў зьняволеньні 40-ы дзень. "Палітычная справа Сяргея Скрабца ўжо адбылася. Цяперашняя галодоўка ня мае ўплыву на палітычны працэс, а важнасьць захаваньня чалавечага жыцьця павінна заўсёды пераважаць. Мы разумеем матывацыю палітыка, але хацелі б, каб і нашую матывацыю таго, што галадоўку трэба спыніць, зразумеў і Сяргей", – гаворыцца ў звароце. Сярод іншых, зварот падпісалі пісьменьнікі Рыгор Барадулін, Уладзімір Арлоў, Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Валянцін Тарас, музыкі – Аляксандр Кулінковіч, Ігар Варашкевіч, Лявон Вольскі, Сяргей Міхалок, Алег Хаменка, Вячаслаў Корань, Зьміцер Вайцюшкевіч, віцэ-прэзідэнт Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэй Бастунец, рэдактар часопіса "Абажур" Уладзімір Дзюба, журналіст Павал Мажэйка, былы судзьдзя Канстытуцыйнага суду, прафесар Міхаіл Пастухоў.

***22 чэрвеня*** ў пракуратуры агучылі некаторыя падрабязнасьці злачынстваў, у якіх пацярпелі журналісты. Пра справу апаратара ОРТ ***Дзьмітрыя Завадзкага*** паведамілі, што сьледчыя езьдзілі ў замежную камандзіроўку. Як ўдалося высьветліць, у справе аб зьнікненьні Дзьмітрыя Завадзкага сапраўды фігураваў нейкі былы сьпецназавец Рабцэвіч. Гэты чалавек нібыта меў дачыненьне ці то да аўтамабілю, на якім езьдзіла групоўка Ігнатовіча, ці то да золата, якое фігуравала ў справе. Але маці зьніклага журналіста ня думае, што сустрэча сьледчых з Рабцэвічам у Ізраілі пралье дадатковае сьвятло на лёс сына. "Яго трэба шукаць ў Беларусі, а езьдзіць у Ізраіль – значыць, губляць час і рабіць выгляд, што нешта робіцца. Гэтак можна езьдзіць па ўсім сьвеце за знаёмымі ці сваякамі падазраваных і пасьпяхова рапартаваць, што расьсьледаваньне працягваецца", – заявіла Вольга Завадзкая. Па справе забойства журналісткі газеты "Салідарнасьць" ***Веранікі Чаркасавай***, паводле пракуратуры, фігуруе "да дзесяці версіяў". Стрыма-

на пракаментавала заяву пракуратуры маці забітай Дыяна Чаркасава: “А ў нас няма ні новых версіяў, ні новых фактаў. Усё, што ёсьць, – гэта ў іх, але яны пра гэта, мяркую, ня скажуць”. Вядома, што сярод іншых фігуруе версія аб ірацкім сьледзе ў забойстве журналісткі. Гэтая версія грунтуецца на тым, што Вераніка Чаркасава як журналістка пабывала ў Іраку і нібыта зьбірала зьвесткі пра продаж беларускай збоі рэжыму Садама Хусэйна. У беларускіх медыях шмат пісалася пра тое, што забойства журналісткі было зроблена прафесійна. Падобныя справы, прызнаюць адмыслоўцы, альбо раскрываюць па гарачых сьлядах адразу, альбо не раскрываюць ніколі.

***22 чэрвеня*** стала вядома са словаў намесьніка Генеральнага пракурора Беларусі Мікалая Купрыянава, што абедзьве крымінальныя справы супраць ***Сяргея Скрабца*** аб’яднаныя ў адну. У красавіку 2003 году супраць Сяргея Скрабца ўзбудзілі першую справу — яго абвінавацілі ў выманьваньні крэдытаў у дзяржавы і арганізацыі злачыннай групы ў той час, калі ён узначальваў Гандлёвы дом “БелБабаеўскі”. У траўні 2005 году яго абвінавацілі ў другой справе — падрыхтоўка да злачынства і хабарніцтва.

***28 чэрвеня*** Менскі гарадзкі суд разгледзеў касацыйную скаргу на прысуд суда Цэнтральнага раёну Менску і пакінуў бяз зменаў прысуд у адносінах ***Міколы Статкевіча*** і ***Паўла Севярынца***. 31 траўня суд асудзіў апазіцыйных палітыкаў да трох гадоў абмежаваньня волі за арганізацыю 18-19 кастрычніка 2004 году масавых выступаў супраць сфальсіфікаваных вынікаў парламенцскіх выбараў і рэферэндуму. Адпаведна з амністыяй тэрмін абмежаваньня волі скарочаны ім на год. П.Севярынец і М.Статкевіч знаходзяцца пад падпіскай аб нявыезьдзе. Праз некалькі дзён палітыкаў адправяць у месцы адбываньня пакараньня.

***1 ліпеня*** сын палітзьняволенага ***Міхаіла Марыніча*** Павел паведаміў, ягоны бацька пераведзены з менскай калоніі УЖ 15/1 у Рэспубліканскі турэмны шпіталь. Па словах Паўла Марыніча, у бацькі ўзьніклі праблемы са зрокам. У гэты ж дзень ён зьвярнуўся да начальніка менскай калоніі Яўгена Ляся з просьбай дазволіць яму нечарговае спатканьне з бацькам у сувязі з хваробай, але дазволу не атрымаў.

***1 ліпеня*** суд Цэнтральнага раёну Менску разгледзеў хадайніцтва апазіцыйнага палітыка ***Сяргея Скрабца*** аб зьмяненьні меры стрыманьня і не знайшоў падставаў для яго задавальненьня. Такім чынам, Сяргей Скрабец па-ранейшаму застаецца пад арыштам у Берасьцейскім сьледчым ізалятары. Паколькі справай экс-парламентара ўжо два тыдні займаецца рэспубліканская пракуратура, адпаведна і разгляд хадайніцтва аб вызваленьні пад падпіску аб нявыезьдзе альбо пад хатні арышт давялося рабіць суду Цэнтральнага раёну сталіцы. Працэс ішоў менш чым паўгадзіны. Да таго ж з Берасьця ня змог прыехаць адвакат Сяргея Скрабца Міхаіл Хоміч,

і не было каму абараняць інтарэсы вязьня, не было каму патлумачыць судзьдзі Алене Ільіной пра стан здароўя чалавека, які галадаў каля сарака дзён. Прадстаўнік пракуратуры ў сваім выступе ў судзе казаў, што для зьмяненьня меры стрыманьня не існуе неабходных аргументаў.

***7 ліпеня*** палітвязьня ***Аляксандра Васільева*** пасьля абеду выпусьцілі з Менскай калоніі на вуліцы Кальварыйскай. У 20 гадзінаў ён вярнуўся дахаты ў Гародню. Днямі спадара Васільева запрасілі на камісію па справах амністыі і паведамілі, што ён падлягае амністыі як вязень, які адседзеў адну траціну свайго тэрміну і які мае няшмат парушэньняў. Аляксандру Васільеву 59 гадоў, ён падпалкоўнік запасу ўзброеных сілаў. Займаўся прадпрымальніцтвам і грамадзкай дзейнасьцю. 7 верасьня 2004 году яго разам з Валерыем Леванеўскім, з якім яны кіравалі страйкамам прадпрымальнікаў, асудзілі на 2 гады зьняволеньня кожнага — за публічную абразу прэзідэнта Лукашэнкі.

***7 ліпеня*** сям'я ***Валерыя Леванеўскага*** атрымала ад яго з калоніі ліст. Ён паведамляе, што яго не ўключылі ў сьпіс тых, хто падлягае амністыі, абвешчанай да 9 траўня. Яму гэта стала вядома загадзя, а 30 чэрвеня палітвязьня выклікалі на камісію па справах амністыі і сказалі, што яму адмоўлена ў выкарыстаньні адносна яго амністыі, бо ён зьяўляецца "злосным парушальнікам". У лісьце паведамляецца, што адзінай зьменай у жыцьці палітвязьня сталася тое, што яго нарэшце прынялі на працу ў медыцынскую частку калоніі днявальным, які фактычна зьяўляецца прыбіральшчыкам. Плаціць будуць 9 тысячаў рублёў за месяц.

***13 ліпеня*** маці і бацька экс-дэпутата ***Сяргея Скрабца*** наведалі яго ў Берасьцейскім сьледчым ізалятары, дзе ён знаходзіцца з 15 траўня. У ізалятары Сяргей Скрабец правёў галадоўку пратэсту, якая цягнулася каля 40 дзён. Ніна Рыгораўна, маці Сяргея Скрабца, нават пасьля сустрэчы з сынам гаворыць: "З выгляду ня скажаш, што ён спыніў галадоўку. Вельмі ён худы, вельмі. Сінякі пад вачыма". Нягледзячы на тое, што Скрабец за гэты час пахудзеў больш як на 20 кг, выглядае ён бадзёра. "Сказаў, што робіць фізічныя практыкаваньні, адціскаецца ад падлогі. І, кажа, ня трэба табе, мама, плакаць, але ісьці буду да канца. Яны мяне арыштавалі ні за што".

***19 ліпеня*** часоваму паверанаму Чэхіі ў Беларусі ***Уладзімеру Румлу*** і ягонаму калегу са Славаччыны ***Ёзэфу Мачышаку*** не далі дазволу на сустрэчу з беларускім палітвязьнем ***Міхаілам Марынічам***, які адбывае пакараньне ў менскай калоніі. Уладзімір Коўчур, кіраўнік дэпартаменту выкананьня пакараньняў, патлумачыў, што чэскага і славацкага дыпламатаў не пусьцілі да Міхаіла Марыніча, бо той ня мае грамадзянства Чэхіі ці Славаччыны.

***21 ліпеня*** стала вядома, што стан здароўя былога міністра, а цяпер

палітвязьня ***Міхаіла Марыніча*** палепшыўся, і яго перавялі з турэмнага шпіталю ў калонію. Паводле адваката Валянціны Шаханцовай, Міхаіл Марыніч чакае, што адносна яго будзе ўжытае ўмоўна-датэрміновае вызваленьне.

***25 ліпеня*** малодшы брат былога дэпутата ***Сяргея Скрабца*** Аляксандр паведаміў, што тэрмін утрыманьня пад вартай Сяргея працягнуты да 27 жніўня. Прадстаўнікі сьледзтва лічаць, што экс-дэпутат, будучы на волі, можа паўплываць на іншых удзельнікаў сьледчага працэсу, таму засьцерагаюцца зьмяняць меру стрыманьня.

***27 ліпеня*** праваахоўныя органы правялі вобыск на кватэры бацькоў ***Сяргея Скрабца***, пра што паведаміў малодшы брат былога дэпутата – Аляксандр Скрабец. Паводле ягоных словаў, 26 ліпеняператрус адбыўся і на ягонай кватэры. У яго быў канфіскаваны сістэмны блок персанальнага кампутару. Аляксандр Скрабец лічыць, што ягонаму брату нарэшце прад’яўленае абвінавачаньне ў выманьваньні крэдытаў ад дзяржавы, калі ён кіраваў “БелБабаеўскім” – беларускай філіяй расейскага Гандлёвага дому “Бабаеўскі”. І менавіта гэта стала падставай для ператрусу. Брат былога дэпутата таксама праходзіць па справе, якую вядзе сьледчы ў асабліва важных справах пракуратуры Беларусі Вячаслаў Цераховіч. Вось, што ён кажа: “Я ўчора пайшоў у сьледчы камітэт, а адтуль мяне пад рукі павялі ў пракуратуру да Цераховіча. Менавіта ў парадку арышту – пасадзілі ў машыну, зьлева і справа – міліцыянты. Я ўжо нават жонцы патэлефанаваў: рыхтуй спартовы касьцюм ды тапкі. Там мяне дапытвалі да вечару. Жонку маю павезьлі дамоў, і там зрабілі ператрус. Забралі ў мяне сістэмны блок ад кампутару, дакументы пазнаходзілі ўсялякія – і тыя, што маюць дачыненьне да справы, і тыя, што ня маюць. А напрыканцы дня Цераховіч сказаў: пакуль мы ня будзем зьмяняць вам меру стрыманьня”.

***27 ліпеня Паўла Севярынца*** выклікалі ў крымінальна-выканаўчую інсьпекцыю Першамайскага раёну Віцебску, дзе загадалі здаць пашпарт і вайсковы білет. Як патлумачылі супрацоўнікі інсьпекцыі, дакументы былі забраныя дзеля таго, што праз тыдзень спадар Севярынец мусіць зьявіцца на месца сваёй “хіміі”: у бліжэйшы час яму будзе паведамлены канкрэтны адрас месца пакараньня, куды ён абавязаны дабрацца цягам яшчэ трох дзён. Спадар Севярынец папрасіў, каб на астатні тыдзень яму выдалі замест пашпарту хаця б нейкую часовую даведку пра ягоную асобу, аднак міліцыянты адмовілі.

***27 ліпеня*** стала вядома, што зьняволенаму прафесару ***Юрыю Бандажэўскаму*** амніставалі адзін год. У выніку прафесар мусіць знаходзіцца ў папраўчай калоніі-пасяленьні №26 яшчэ прыкладна пяць з паловай месяцаў, да 6 студзеня 2006 году. Ці пойдуць улады на ўмоўна-датэрміновае вызваленьне навукоўцы, пакуль невядома. Паводле жонкі прафесара Га-

ліны Бандажэўскай, іншыя зьняволеныя гэтай жа калоніі, якім заставаўся няпоўны год, даўно ўжо выпушчаныя дахаты. Нагадаем, Юры Бандажэўскі на пачатку году меў шанец на ўмоўна – датэрміновае вызваленьне, паколькі адбыў дзьве траціны тэрміну, але яго ня вызвалілі. Адміністрацыя калоніі палічыла, што Бандажэўскі, маўляў, ня стаў на шлях выпраўленьня і не прызнаў сваёй віны.

***28 ліпеня*** прызначанае месца "хіміі" ***Міколу Статкевічу***: 29 ліпеня ён выязджае ў г.Баранавічы, дзе будзе адбываць вызначанае яму пакараньне. Нагадаем, што на баранавіцкай "хіміі" адбываў пакараньне рэдактар газеты "Рабочы" ***Віктар Івашкевіч***.

***2 жніўня Сяргея Скрабца*** перавезьлі з Берасьця ў Менск. На дарогу ад Берасьця да Менску, якую звычайны пасажырскі цягнік (ня кажучы ўжо пра хуткі) адольвае за пяць гадзін, Сяргей Скрабец мусіў патраціць аж пяць дзён.

***3 жніўня Браян Бэнэт***, амбасадар Вялікабрытаніі, якая цяпер старшынюе ў Еўразьвязе, і выканаўца абавязкаў кіраўніка офісу АБСЕ ***Ваграм Абаджан*** пабывалі ў менскай папраўчай калоніі №1, дзе адбывае пакараньне ***Міхаіл Марыніч***. І Еўразьвяз, і АБСЕ назіраюць сітуацыю з Міхаілам Марынічам з моманту ягонага арышту і выказваюць занепакоенасьць станам здароўя палітвязьня, заклікаючы да неадкладнага яго вызваленьня.

***4 жніўня Сяргей Скрабец*** меў першае спатканьне ў менскім сьледчым ізалятары на Валадарцы з жонкай Аляксандрай і сынам. Спатканьне працягвалася каля 45-50 хвілінаў. Сяргей Скрабец сказаў, што зараз яго задавальняе ежа, якую даюць у сьледчым ізалятары, таму што яна прыгатаваная на вадзе, і няма нічога тлустага ці вострага – толькі посныя кашы. Ён папрасіў перадць яму сухафрукты – разынкі, курагу, вітаміны, арэхі. Сяргей Скрабец, па ягоных словах, адчувае сябе някепска, займаецца фізкультурай, наколькі гэта магчыма ў камеры. Разам з ім у камеры чатыры чалавекі.

***9 жніўня*** Менскі гарадзкі суд пакінуў у сіле рашэньне суда Цэнтральнага раёну сталіцы, вынесенае апазіцыйнаму палітыку ***Андрэю Клімаву***.

***9 жніўня*** асуджаны ***Павел Севярынец*** усё яшчэ знаходзіцца ў Віцебску, бяз пашпарту, які ў яго забралі яшчэ 27-га ліпеня, і пад наглядам міліцыі. Раз на два дні ён павінен тэлефанаваць у крымінальна-выканаўчую інспекцыю, каб даведацца пра свой далейшы лёс. Сваё няпэўнае становішча Павал Севярынец акрэсьліў так: "Непрыемнасьць гэтага становішча палягае ў тым, што, паводле прысуду, мушу адбыць у зьняволеньні 2 гады, а фактычна ўжо некалькі лішніх месяцаў я жыву без прывядзеньня прысуду ў выкананьне, пад падпіскай аб нявыезьдзе, жыву некалькі тыдняў бяз

пашпарту. І кожны дзень чакаю, калі і куды мяне адправяць! Сэнс гэтага ўсяго я разумею: гэта псіхалагічны ціск".

***12 жніўня*** крымінальна-выканаўчая інсьпекцыя Першамайскага раёну Віцебска ўручыла ***Паўлу Севярынцу***, асуджанаму за арганізацыю акцыяў пратэсту супраць фальсіфікаваных вынікаў рэферэндуму 2004 году на два гады абмежаваньня волі, прадстаўленьне не пазьней за 15 жніўня прыбыць у вёску Ветрына Полацкага раёна для адбыцьця пакараньня.

***15 жніўня*** гарадзенская міліцыя ўзбудзіла крымінальную справу па факце крадзяжу пячаткі ***"Саюзу палякаў на Беларусі"***. На допыт у якасьці сьведкі была выкліканая ***Анжаліка Борыс***, якую дапытвалі больш за паўтары гадзіны.

***16 жніўня*** асуджаны на 2 гады абмежаваньня волі ***Павел Севярынец*** выехаў з камендатуры выпраўленчай установы на месца пастаяннай працы. Спачатку Севярынцу вызначылі месцам пакараньня гарадзкі пасёлак Ветрына. Зьявіўшыся 15 жніўня ў сьпецкамэндатуру дзеля адбыцьця пакараньня, Павел Севярынец даведаўся, што працаваць ён будзе ў лесправгасе штабелёўшчыкам на станцыі Алёшча, а жыць у інтэрнаце для "хімікаў" у вёсцы Малое Сітна Полацкага раёну, за 5 кіламетраў ад станцыі. Алёшча — апошняя беларуская станцыя на чыгуначнай лініі Полацак — Невель. Месьціцца яна ў 4-х кіламетрах ад расейскай мяжы і ў 42-х кіламетрах ад Полацку.

***16 жніўня*** супрацоўнікі КДБ Беларусі правялі вобыскі ў кватэрах сяброў грамадзянскай ініцыятывы "Трэці шлях", у якую ўваходзяць студэнты розных навучальных установаў, сярод якіх — ***Андрэй Абозаў*** і ***Павел Марозаў***. У выніку былі канфіскаваныя дванаццаць кампутараў, дзясяткі дыскаў і іншыя электронныя носьбіты інфармацыі. Заведзеная крымінальная справа, стваральнікаў мульцікаў падазраюць у абразе Аляксандра Лукашэнкі. Студэнты стварылі «Мультклуб» і ў Інтэрнэце распаўсюджвалі свае кароткія flash-фільмы. Героямі мульцікаў былі карыкатурныя вобразы кіраўнікоў краінаў, апазіцыйных дзеячоў і простых грамадзянаў — мульцікі былі на палітычную тэму. Студэнты казалі, што ведалі пра тое, што за імі сочаць, чытаюць перапіску, алеператрусы, а потым допыты і крымінальная справа сталі для іх нечаканасьцю. Сябры клубу спасылаліся на тое, што ва ўсіх краінах мультфільмы ў Інтэрнэце карыстаюцца попытам, але нікому яшчэ не прыйшло ў галаву распачаць крымінальныя справы супраць стваральнікаў шматлікіх мульцікаў на палітычныя тэмы. Павел Марозаў, сябра клубу, які даваў паказаньні ў КДБ, пракаментаваў падзеі так: "Калі мультыплікацыйны герой, падобны на Аляксандра Лукашэнку, гаворыць яго цытатамі, паводзіць сябе, як ён, і гэта выклікае сьмех, то чаму тады КДБ не прыходзіць зператрусам да супрацоўнікаў Белдзяржтэлерадыёкампаніі? Яны ж больш

за нас адлюстроўваюць жыцьцё прэзідэнта. Усе мы ведаем, што даволі часта і без мульцікаў народ сьмяецца з яго выказваньняў". Варта нагадаць, што ў XVII стагодзьдзі палітычная карыкатура зьявілася адразу ў Вялікай Брытаніі, Францыі і Галандыі. Імператар Напалеон здолеў ацаніць выгады ад палітычнай карыкатуры і нават спрыяў таму, каб мастакі малявалі зьедлівыя карыкатуры на яго, што толькі спрыяла ягонай папулярнасьці. Францускі прэзідэнт Шарль Дэ Голь нават зьбіраў калекцыю карыкатураў на сябе. Летась брытанская тэлебачаньне паказала мультфільм пра знакамітых Сімпсанаў, у якім у камічным выглядзе фігураваў прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тоні Блэр. Цікава адзначыць, што агучыў пародыю... сам Тоні Блэр. Існуе і іншая традыцыя. Папулярная праграма "Лялькі" на расейскім НТВ была зачыненая некалькі гадоў таму пасьля саркастычнай перадачы пра Пуціна. Што тычыцца цяперашняй беларускай гісторыі з мульцікамі пра Лукашэнку, то прыгадваецца анекдот савецкіх часоў. "Леанід Ільіч Брэжнеў зьбірае анекдоты пра сябе. Ужо два лагеры назьбіраў".

***16 жніўня*** супрацоўнікі КДБ наведаліся ў кватэру жыхара Гародні ***Алега Мініча***. У дзьверы кватэры пазванілі і прадставіліся тэлемайстрам. Напярэдадні гаспадар кватэры сапраўды выклікаў тэлемайстра, таму спакойна адчыніў дзьверы. У кватэру ўварваліся пяцёра супрацоўнікаў КДБ з пастановай аб правядзеньні вобыску. Ператрус быў праведзены таксама ў кватэры бацькоў Алега Мініча, якіх выклікалі з лецішча. Вышук у кватэры Алега Мініча доўжыўся некалькі гадзінаў. Пры тым была канфіскаваная ня толькі кампутарная тэхніка, але таксама ўсе нататнікі, сшыткі, паперкі і дыскі. Спадара Мініча завезьлі ў будынак Упраўленьня КДБ, дзе яму паведамілі пра распачынаньне крымінальнай справы па факце стварэньня мультфільмаў з персанажам, які моцна нагадвае Аляксандра Лукашэнку па артыкуле 368 частка 2 Крымінальнага кодэксу РБ — абраза прэзідэнта. Пасьля гэтага ў спадара Мініча ўзялі падпіску аб нявыезьдзе.

***16 жніўня*** прадстаўнік АБСЕ па пытаньнях свабоды слова ***Міклаш Харашці*** выказаў занепакоенасьць з нагоды магчымага прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці стваральнікаў сатырычных флэш-мультфільмаў у Інтэрнэце пра Аляксандра Лукашэнку. У адмысловай заяве спадар Харашці падкрэсьліў, што "сатыра ёсьць звычайны і нармальны спосаб выказваньня ў медыях дэмакратычных грамадзтваў". Паводле прадстаўніка АБСЕ, кваліфікацыя мультфільмаў як паклёпу ці зьнявагі цалкам супярэчыць прынцыпу свабоды палітычных дэбатаў. Ён нагадаў, што для забесьпячэньня грамадзкага кантролю за ўладай вышэйшыя службовыя асобы павінны цярпець больш жорсткую крытыку, чым звычайныя грамадзяне. Гэты прынцып замацаваны ў шматлікіх рашэньнях Еўрапейскага суда па правах чалавека, зазначыў спадар Харашці. Ён кажа, што Беларусь – адзіная краіна АБСЕ, дзе людзей садзяць у турму па абвінавачаньні ў паклёпе на прэзідэнта.

***16 жніўня*** стала вядома, што да ***Міхаіла Марыніча*** ўжытая амністыя. Былому міністру і амбасадару скарацілі тэрмін зьняволеньня на адзін год. Пра гэта паведаміла адвакат зьняволенага Валянціна Шаханцова. У дэпартаменце выкананьня пакараньняў Міністэрства унутраных спраў пацьвердзілі гэтыя зьвесткі. Такім чынам, цяпер пакараньне былому міністру і амбасадару складае 2,5 гады зьняволеньня. Адвакат Марыніча Валянціна Шаханцова кажа, што гэта больш за палову новага тэрміну і такім чынам зьявіліся шанцы на ўмоўна-датэрміновае вызваленьне. Гэтыя шанцы адвакат разглядае як вялікія. Таксама яна паведаміла, што стан здароўя Міхаіла Марыніча здавальняючы.

***19 жніўня*** адвакат Аляксандр Бірылаў наведаў ***Валерыя Леванеўскага*** ў Івацэвіцкай калоніі і меў з ім гадзінную размову. Вязень працягвае змаганьне за лепшыя умовы ўтрыманьня, піша скаргі на парушэньні сваіх правоў і правоў іншых зьняволеных, дамагаецца адказу на гэтыя скаргі. Адказы прыходзяць рэдка. Прынамсі, паводле зьвестак Леванеўскага, на 15 апошніх скаргаў ён не атрымаў ніводнага адказу. Нявольнік таксама паведаміў адвакату пра ціск на тых, хто яму дапамагае ў гэтай барацьбе. Найперш — гэта накладаньне адміністрацыйных пакараньняў за нязначныя парушэньні. Такія пакараньні маюць наступствам, у тым ліку, і тое, што вязень пазбаўляецца права на амністыю. Гэтак і адбылося з Валерыем Леванеўскім. Таксама аказваюць маральны ціск, — прыкладам, затрымліваюць пошту. Але найбольш балючым падаецца распаўсюджаньне адмоўных плётак, быццам такі чалавек насамрэч зьяўляецца агентам адміністрацыі калоніі, і давяраць яму нельга. “Леванеўскаму асабіста давялося праз усё гэта прайсьці”, — паведаміў адвакат Аляксандр Бірылаў.

***22 жніўня*** гарадзенец ***Алег Мініч*** быў выкліканы ў КДБ для дачы паказаньняў. Пры гэтым у яго па незразумелых прычынах адабралі пашпарт. Сьледчы Алег Варанецкі дапытаў ня толькі Алега Мініча, але і ягоную жонку Галіну, у якой таксама забраў пашпарт. Галіна Мініч абураная дзеяньнямі КДБ. На яе думку, сьледчы Варанецкі пайшоў на парушэньне закону дзеля запалохваньня сям’і. У той дзень у Менску супрацоўнікі КДБ дапыталі Паўла Марозава і Андрэя Абозава. У хлопцаў забралі ўсе дакументы. У Андрэя Абозава нават пасьведчаньне аб нараджэньні. Трэба адзначыць, што пашпарты сьледчыя забіраюць толькі ў падазраваных ці ў абвінавачаных. Ніхто з дапытаных такім пакуль не зьяўляецца. Кіраўнік сьледчай групы пракуратуры заявіў, што члены ініцыятывы “Трэці шлях” пакуль праходзяць па справе аб абразе Аляксандра Лукашэнкі як сьведкі. Тым ня менш, нікому з тых, хто праходзіць у справе як сьведка, супрацоўнікі КДБ не аддалі дакументы. Сьледчую групу ўзначальвае сьледчы пракуратуры Віктар Шабан. Ён паведаміў, што справу распачалі паводле факту абразы Аляксандра Лукашэнкі. Пакуль няма падазраваных і абвінавачаных. Усіх дапыталі ў якасьці сьведкаў, без адвакатаў.

***23 жніўня*** сьледчы па асабліва важных справах рэспубліканскай пракуратуры Вячаслаў Цераховіч афіцыйна прад'явіў абвінавачаньне вядомаму апазіцыйнаму палітыку, экс-парламентару ***Сяргею Скрабцу***. Дзеля гэтага сьледчы наведаў турэмны шпіталь па вуліцы Апанскага ў Менску, дзе цяпер знаходзіцца С. Скрабец. Адвакат Сяргея Скрабца Алег Дубавец пацьвердзіў факт прад'яўленьня абвінавачаньня, якое тычыцца выманьваньня крэдытаў у дзяржавы. Адносна крымінальнай справы былога дэпутата, з-за якой яго затрымалі, – падбухторваньне да дачы хабару, паводле адваката, па ёй спадара Скрабца абвінавацілі яшчэ раней. Алег Дубавец гаворыць, што Сяргей Скрабец па-ранейшаму адмаўляецца даваць паказаньні сьледзтву, бо лічыць сябе невінаватым.

***24 жніўня*** скарга ***Алега*** і ***Галіны Мінічаў*** у Гарадзенскую абласную пракуратуру на незаконнае адабраньне супрацоўнікамі КДБ іх пашпартоў засталася без задавальненьня. Для канчатковага разгляду справы па сутнасьці Гарадзенская абласная пракуратура пераправіла ліст Мінічаў у Менск, дзе нібыта і прымалася рашэньне пра адабраньне пашпартоў. Як параіў Мінічам пракурор Гарадзенскай абласной пракуратуры В. Лук'янаў, які курыруе стан законнасьці ў органах КДБ, замест пашпартоў яны могуць карыстацца актам выняцьця. Алег і Галіна Мініч расцэньваюць такое рашэньне і такія парады, як зьдзек над законам, здаровым сэнсам ды іхняй чалавечай годнасьцю. Пашпарты ў Алега і Галіны Мінічаў былі адабраныя старшым сьледчым сьледчага аддзелу УКГБ па Гарадзенскай вобласьці, капітанам юстыцыі А.А. Варанецкім "у рамках расьсьледаваньня крымінальнай справы № 05011110396". Дадзеная справа ўзбуджаная па факце зьяўленьня ў Інтэрнэце мультфільмаў, якія, на думку КДБ, утрымліваюць паклёп на прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку.

***25 жніўня Аляксандр Скрабец***, малодшы брат былога дэпутата, апазіцыйнага палітыка ***Сяргея Скрабца***, быў выкліканы ў рэспубліканскую пракуратуру. Там у яго ўзялі падпіску аб нявыезьдзе. Аляксандр Скрабец лічыцца саўдзельнікам па справе свайго старэйшага брата. Як і былога дэпутата, яго абвінавачваюць па трох артыкулах Крымінальнага кодэксу. Перадусім, сьледзтва лічыць абодвух братоў вінаватымі ў выманьваньні крэдытаў у дзяржавы. У пракуратуры Скрабцу-малодшаму паведамілі, што такім чынам яны нанесьлі шкоду дзяржаве ў памеры 498 тысячаў даляраў. Акрамя таго, абодва браты абвінавачваюцца ў падбухторваньні знаёмага, каб той даў хабар дзяржаўнаму абвінаваўцу і судзьдзі Берасьцейскага абласнога суда ў памеры 30 тысячаў даляраў. Сам Сяргей Скрабец, які цяпер знаходзіцца на абсьледаваньні ў турэмным шпіталі ў Менску, абвінавачаньні абвяргае. Ён зьвяртае ўвагу на тое, што крэдыты браліся ў банку пасьля таго, як яго абралі дэпутатам. І таму, згодна з Законам аб статусе дэпутата, ён раней спыніў прадпрымальніцкую дзейнасьць. Абвінавачаньні ў свой адрас экс-парламентар ацэньвае як помсту за палітыч-

ную дзейнасьць. Менавіта таму ён катэгарычна адмаўляецца даваць любыя паказаньні.

***25 жніўня*** рэдактар газеты «Глос з-над Нёмну» ***Анджэй Пісальнік*** названы падазраваным па крымінальнай справе, узбуджанай паводле артыкулу 185 Крымінальнага кодэксу на падставе заявы кіраўніка Польскага дому ў Шчучыне Віктара Богдана. Пастанова пра гэта была ўручаная актывісту Саюзу палякаў у Гарадзенскім абласным упраўленьні ўнутраных справаў, куды ён быў выкліканы ў якасьці сьведкі. Як вынікае з пастановы, падазраванымі разам з Анджэем Пісальнікам зьяўляюцца журналіст ***Андрэй Пачобут***, а таксама намесьнікі старшыні СПБ Юзэф Пажэцкі і Веслаў Кеўляк. “Нас абвінавачваюць у тым, што мы падчас наведваньня спадара Богдана ў ліпені нібыта спрабавалі запалохаць яго тым, што калі ён не аддасьць нам ключы ад Польскага дому ў Шчучыне, то мы зробім так, што яму ня будзе месца ні ў Беларусі, ні ў Польшчы. Акрамя таго, мы нібыта пагражалі, што ягоная дачка ня будзе вучыцца ў Польшчы. Дзякаваць Богу, ёсьць поўны відэазапіс той сустрэчы. Так што фальсіфікаваць справу не ўдасца”, — сказаў Анджэй Пісальнік. Нагадаем, што гэтая крымінальная справа ў ліпені ўжо разглядалася шчучынскай міліцыяй і была закрытая ў сувязі з адсутнасьцю складу злачынства ў дзеяньнях Пачобута, Пісальніка, Пажэцкага і Кеўляка. Аднак днямі шчучынскі пракурор Краеўскі наклаў на гэтае рашэньне пратэст і ўзнавіў вытворчасьць па справе.

***30 жніўня*** кіраўніцтва сьпецкамендатуры ў Баранавічах адмовіла ***Міколу Статкевічу*** ў магчымасьці наведаць Менск. Паводле закону, калі асуджаны цягам месяцу ня мае парушэньняў унутранага распарадку, адміністрацыя сьпецкамендатуры можа адпускаць яго раз на месяц наведваць сваю сям’ю тэрмінам да трох дзён. Адміністрацыя сьпецкамендатуры азнаёміла Міколу Статкевіча з двума лістамі. Першы з ЖЭСу, дзе ў Менску прапісаны Мікола Статкевіч. У ім сьцьвярджаецца, што ніякіх прэтэнзіяў да яго няма, запазычанасьцяў за камунальныя плацяжы няма. А другі ліст з гарадзкога аддзелу міліцыі Першамайскага раёну аб тым, што “ўу сувязі са складанай аператыўнай абстаноўкай, якая цяпер склалася, немэтазгодна наведваньне Менску Міколам Статкевічам”.

***30 жніўня*** справу стварэньня мультфільмаў пра палітычную сітуацыю ў Беларусі выказалі жаданьне працягнуць многія карыстальнікі Інтэрнэту ў замежжы. Між тым, сябры грамадзянскай ініцыятывы “Трэці шлях” пакуль маюць статус сьведкаў у крымінальнай справе па факце абразы Аляксандра Лукашэнкі, якую распачала Менская пракуратура за мультфільмы палітычнага зьместу на Інтэрнэт-сайце гэтай арганізацыі. Сябры ініцыятывы “Трэці шлях” ***Павел Марозаў*** і ***Андрэй Абозаў*** з 23 жніўня знаходзяцца ў Кіеве. Яны сустракаліся з украінскімі калегамі дзеля ўзнаўленьня працы сайту, бо ўся тэхніка канфіскаваная КДБ. Некаторы час доступ

на сайт быў заблакаваны. Павел Марозаў лічыць, што ў персьпектыве справа распаўсюджваньня мультфільмаў палітычнага зьместу ў Інтэрнэце будзе разьвівацца: “Нашыя ўкраінскія калегі выказалі нам падтрымку і жаданьне дапамагчы — каб не было для нас крымінальных наступстваў. Так што справа гэтая не загіне”.

***1 верасьня*** міжнародная арганізацыя абароны правоў мультыплікатараў і карыкатурыстаў запатрабавала спыніць перасьлед беларускіх калегаў. Прадстаўніцтвы гэтай міжнароднай арганізацыі знаходзяцца амаль ва ўсіх краінах сьвету. Лідэр арганізацыі доктар ***Роберт Расэл*** у Вашынгтоне заклікаў аніматараў накіроўваць свае заявы ў беларускія амбасады з патрабаваньнем спыніць перасьлед распаўсюднікаў мультфільмаў у Інтэрнэце. Сябры арганізацыі заяўляюць, што калі беларускія ўлады не спыняць перасьлед іх беларускіх калегаў, то цягам тыдня ў Інтэрнэце зьявяцца дзясяткі карыкатураў і мультфільмаў пра Аляксандра Лукашэнку і палітычную сітуацыю ў Беларусі. Некалькі заяваў паступілі ў беларускую амбасаду ў ЗША, у амбасады Еўрапейскіх краінаў. Сябра арганізацыі мультыплікатараў, вядомы ўкраінскі карыкатурыст Алег Смаль, каментуе сітуацыю: “Улада занадта сур’ёзна ўспрымае карыкатуру. Яна, відаць, усяго баіцца, калі такая рэакцыя. Калі ўлада пачынае змагацца з карыкатурыстамі, то яна адчувае пагрозу і на іншых накірунках. Можна ёй толькі паспачуваць. Я некалькі разоў маляваў нашых палітыкаў і Лукашэнку. Некаторыя нашы палітыкі калекцыянуюць мае малюнкі. Напрыклад, прэм’ерміністр Юлія Цімашэнка. А вось калі ўлады пачынаюць змагацца з карыкатурыстамі, то гэта ж лепшая для іх рэклама. Гэта ёсьць сьведчаньнем таго, што працуюць яны не дарма. Спадзяюся, што ва ўлады хопіць розуму не змагацца са сьмехам, бо гэта марная праца.”

***1 верасьня*** Вярхоўны суд Беларусі адказаў ***Валерыю Леванеўскаму*** на скаргу, якую той падаў яшчэ ў сакавіку. Лідэр гарадзенскіх прадпрымальнікаў спрабаваў аспрэчыць прысуд, паводле якога ён быў прызнаны вінаватым ў паклёпе на прэзідэнта Беларусі і пакараны да 2 гадоў зьняволеньня. Вярхоўны суд пакінуў прысуд бяз зьменаў.

***5 верасьня*** ў Івацэвіцкай калоніі №22 адкрылася бібліятэка, стварэньне якой ініцыяваў вязень калоніі, лідэр гарадзенскіх прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскі. Змаганьне за стварэньне бібліятэкі пачалося на пачатку 2005 году. Найбольш складана было атрымаць дазвол адміністрацыі і памяшканьне. Потым Валеры Леванеўскі накіраваў з калоніі дзясяткі лістоў з просьбай дасылаць кнігі. Пасылкі ішлі і працягваюць ісьці з усёй Беларусі, але сьпіс атрыманых калоніяй кніг падрабязна вывучае адміністрацыя. Пра гэта паведаміў Уладзімір Леванеўскі, сын палітвязьня, што ў турэмнай бібліятэцы існуе забарона на кнігі, якія ўтрымліваюць мапы, пляны мясцовасьці, а таксама апісаньні тэхналогіі вырабу зброі, выбуховых

рэчываў і прыстасаваньняў. Што да палітычнай цэнзуры, то дазволена перадаваць газеты, якія афіцыйна прадаюцца ў шапіках Беларусі.

***6 верасьня*** праграмісту ***Алегу Мінічу*** і ягонай жонцы ***Галіне Мініч*** сьледчы гарадзенскага КДБ вярнуў пашпарты, згодна з рашэньнем менскай пракуратуры. Алег Мініч і ягоная жонка Галіна на працягу двух тыдняў намагаліся вярнуць свае пашпарты, якія ў іх забраў сьледчы гарадзенскага КДБ Алег Варанецкі. Скаргу на дзеяньні сьледчага КДБ разглядаў Віктар Шабан, кіраўнік сьледчай групы. Ён забавязаў сьледчага вярнуць пашпарты.

***8 верасьня*** ў пракуратуры Шчучынскага раёну дапытаны былы намесьнік старшыні Саюзу палякаў ***Юзэф Пажэцкі***. Старшыня Шчучынскага аддзелу СПБ Віктар Богдан напісаў скаргу ў пракуратуру яшчэ ў ліпені, быццам Ю.Пажэцкі быў сярод тых, хто пагражаў ягонаму жыцьцю. Пажэцкі быў апошнім, каго дапыталі ў пракуратуры па гэтай справе. Там ужо пабывалі ***Анджэй Пісальнік*** — рэдактар газеты “Glos z nad Niemna”, ***Андрэй Пачобут*** — рэдактар “Magazyna Polskiego” і ***Веслаў Кеўляк*** — намесьнік старшыні Саюзу палякаў. Юзэф Пажэцкі сказаў, што распавядаў сьледчаму падрабязна аб тым, як ён разам з калегамі наведваў Шчучын і сустракаўся з Віктарам Богданам. Але тое, што яны пагражалі жыцьцю В.Богдана – лічыць поўнай хлусьнёй.

***8 верасьня*** адбылася прэзентацыя кнігі забітай журналісткі ***Веранікі Чаркасавай*** “Чырвоным па белым”, якую выдалі яе калегі. Гэта зборнік артыкулаў, нарысаў і эсэ, надрукаваных у недзяржаўных газетах з 1991 па 2004 год. На думку складальнікаў кнігі, гэтыя артыкулы — своеасаблівае люстэрка эпохі, гістарычны дакумент, напісаны рукой здольнай журналісткі. Адзін са складальнікаў кнігі Аляксандр Старыкевіч выказаў шкадаваньне, што сьледзтва дагэтуль ня здолела знайсьці забойцу Веранікі Чаркасавай. Ён патлумачыў, што выданьнем кнігі журналісты ўшанавалі памяць сваёй калегі.

***9 верасьня*** стала вядома, што камісія, якая вырашае пытаньні ўмоўна-датэрміновага вызваленьня вязьняў менскай калоніі, супраць таго, каб былы міністр і амбасадар ***Міхаіл Марыніч*** у бліжэйшы час выйшаў на волю. Жонка палітвязьня Тацяна Марыніч паведаміла, што яе муж прыкладае намаганьні, каб дамагчыся іншага рашэньня камісіі. Міхаіл Марыніч ня згодны з адмовай ва ўмоўна-датэрміновым вызваленьні, бо выконвае ўсе правілы, ня мае парушэньняў і да таго ж яму патрэбнае тэрміновае лячэньне. Паводле зьвестак Тацяны Марыніч, 22 верасьня адбудзецца новае паседжаньне камісіі, на якім канчаткова вырашыцца, ці вызваляць яе мужа.

***9 верасьня Сяргей Скрабец*** пасьля трох тыдняў медыцынскага абсь-

ледаваньня ў турэмным шпіталі зноў пераведзены ў камеру сьледчага ізалятару па вуліцы Валадарскага ў Менску. Пра гэта паведаміла жонка вязьня Аляксандра Скрабец.

***12 верасьня*** адміністрацыя Івацэвіцкай калоніі адмовілася перавесьці лідэра гарадзенскіх прадпрымальнікаў ***Валерыя Леванеўскага*** ў калонію-пасяленьне. Пра гэта паведаміў сын палітзьняволенага Уладзімір Леванеўскі, спаслаўшыся на апошні ліст ад бацькі: “Яму адмовілі ў зьмякчэньні пакараньня — у пераводзе ў калонію-пасяленьне нібыта на той падставе, што ён зьяўляецца злосным парушальнікам турэмнага рэжыму. Цяпер ён працягвае абскарджваць прысуд і пакараньні, якія на яго наклалі ў турме”. Валерыя Леванеўскага чатыры разы каралі за розныя парушэньні турэмнай дысцыпліны, у тым ліку накіроўвалі ў турэмны карцэр за парушэньне формы адзеньня. Вязень лічыць, што гэтак турэмная адміністрацыя помсьціла яму за скаргі, якія ён накіроўваў у вышэйшыя інстанцыі. Накладзеныя на гарадзенскага прадпрымальніка пакараньні ўжо сталі падставай для адмовы яму ў амністыі. Абскардзіць гэтыя пакараньні яму не ўдаецца, бо суды не прымаюць ягоных скаргаў да разгляду.

***13 верасьня*** асуджаны ***Мікола Статкевіч*** даведаўся, што з ягонай вайсковай пенсіі будуць вылічваць 50% грошай у бюджэт. Нагадаем, суд Цэнтральнага раёну Менску аштрафаваў апазіцыйнага палітыка за выступ на мітынгу прадпрымальнікаў 1 сакавіка. Паколькі на судовым паседжаньні Мікола Статкевіч адмовіўся ўстаць перад судзьдзёй, яго аштрафавалі яшчэ на 128 000 рублёў. Такім чынам, агульная сума склала каля 2 000 даляраў. Паводле заканадаўства, штрафы па адміністрацыйных справах могуць вылічваць ня больш за 20%. Так і было ад 1 чэрвеня. Потым, калі Мікола Статкевіч трапіў у Баранавіцкую сьпецкамендатуру, сітуацыя зьмянілася. З пенсіі пачалі вылічваць 40%. У банку яму патлумачылі, што ўпершыню атрымалі ліст з Мінюсту аб тым, што ў дадзеным выпадку можна складаць сумы штрафаў. Апазіцыйны палітык лічыць гэта сьведчаньнем ціску з боку ўладаў, каб пагоршыць яго матэрыяльнае становішча. На ягоную думку, распрацаваны комплекс мераў, скіраваны на прыніжэньне гонару і годнасьці.

***13 верасьня Павел Севярынец***, які адбывае пакараньне ў вёсцы Малое Сітна Полацкага раёну і яшчэ ў канцы жніўня зьвярнуўся да начальніка сьпецкамендатуры з просьбай дазволіць яму наведваць царкву, атрымаў адпаведны дазвол. Спадар Севярынец напісаў, што яму, як хрысьціяніну, належыць бываць у царкве мінімум раз на тыдзень, у нядзелю. Паколькі ў акрузе 40 кіламетраў няма ніякіх храмаў, у якасьці выключэньня Паўлу Севярынцу дазволена быць у царкве ў Полацку адзін раз на месяц, але пры гэтым толькі тры гадзіны знаходзіцца ў горадзе. Між тым розьніца паміж ранішнімі і вечаровымі аўтобусамі ў Полацку складае 7

гадзін, такім чынам, выканаць гэтае абмежаваньне немагчыма. Павел Севярынец сказаў, што будзе дабівацца магчымасьці нармальна езьдзіць у царкву і не раз на месяц, а кожную нядзелю.

***20 верасьня*** вызначана месца адбыцьця "хіміі" ***Андрэю Клімаву*** – горад Крупкі. Прызначана і дата адпраўкі – 22 верасьня. Андрэй Клімаў паведаміў, што будзе шукаць працу ў Крупскім раёне. Апазіцыйны палітык хоча працаваць у пажарнай частцы, бо ён мае досьвед у тушэньні пажараў. Ён лічыць, што ўлады сьпецыяльна накіравалі яго ў самы "глухі" раён Меншчыны, бо прыслухаліся да ягонай просьбы адпачыць.

***22 верасьня*** камісія менскай калоніі №1 па пытаньнях умоўна-датэрміновага вызваленьня зноў разгледзела справу ***Міхаіла Марыніча*** і паўторна адмовілася датэрмінова вызваліць яго. Гаворыць жонка Міхаіла Марыніча Тацяна: "На жаль, ніякія абставіны не былі ўлічаныя. Ні стан ягонага здароўя, ні ягоныя добрыя паводзіны". Паводле Тацяны Марыніч, неўзабаве адвакат падасьць заяву аб умоўна-датэрміновым вызваленьні Марыніча паводле стану здароўя. У турме былы міністр і амбасадар перанёс інсульт, у яго рэзка пагоршыўся зрок.

***27 верасьня*** стала вядома, што ***Валеры Леванеўскі*** дамагаецца адкрыцьця ў Івацэвіцкай калоніі пакоя для вернікаў розных канфесіяў, а таксама прапануе наладзіць для асуджаных кампутарныя курсы. Гэтыя ініцыятывы пакуль не падтрыманыя кіраўніцтвам адміністрацыі калоніі.

***28 верасьня*** асуджаны да абмежаваньня волі палітык ***Андрэй Клімаў*** атрымаў працу дворніка пры кінатэатры ў мястэчку Крупкі Менскай вобласьці. У кінатэатры, дзе Клімаў уладкаваўся дворнікам, працуе кампутарны клуб, у якім асуджаны будзе ахоўваць кампутарную тэхніку.

***3 кастрычніка*** прэсавая служба пракуратуры распаўсюдзіла паведамленьне для СМІ, у якім гаворыцца, што Рэспубліканская пракуратура завяршыла дарасьсьледаваньне крымінальнай справы вядомага апазіцыйнага палітыка ***Сяргея Скрабца***. Рэспубліканская пракуратура абвінавачвае Сяргея Скрабца ў трох парушэньнях закону — выманьваньні крэдытаў у дзяржавы, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці і падрыхтоўцы да дачы хабару. Паводле пракуратуры, спадар Скрабец, нягледзячы на тое, што быў абраны восеньню 2000-га году дэпутатам Палаты прадстаўнікоў і таму мусіў бы спыніць прадпрымальніцкую дзейнасьць, працягваў да лістападу 2001 году кіраваць асабіста і праз падстаўных асобаў "Гандлёвым домам "Бел-Бабаеўскае". Пракуратура таксама заяўляе, што былы парламентар сумесна са сваім братам Аляксандрам двойчы прадстаўляў сьвядома сфальсіфікаваныя дакументы і дамогся ў "Беларусбанку" валютных крэдытаў, якія нанесьлі страту дзяржаве ў памеры 498.220

даляраў ЗША. Сяргей Скрабец на гэтыя абвінавачаньні адказвае, што ён спыніў пасьля абраньня дэпутатам прадпрымальніцкую дзейнасьць. Што ж тычыцца крэдытаў, дык яны сапраўды былі атрыманыя. На гэтыя грошы купілі сельскагаспадарчую тэхніку, якую зьбіраліся прадаць за межамі Беларусі. І калі б яе раптоўна не канфіскавалі, дык адпаведныя фірмы ўжо даўно б разьлічыліся за пазыку. Сяргей Скрабец да апошняга часу знаходзіўся на абсьледаваньні ў рэспубліканскім турэмным шпіталі, 29 верасьня вярнуўся ў сьледчы ізалятар часовага ўтрыманьня па вуліцы Валадарскага ў Менску.

***4 кастрычніка*** зьняволены былы міністр і амбасадар ***Міхаіл Марыніч*** падаў скаргу ў адміністрацыю менскай калоніі на рашэньне турэмнай камісіі, якая адмовіла яму ва ўмоўна-датэрміновым вызваленьні. Таксама ён падаў хадайніцтва аб вызваленьні паводле стану здароўя. У Марыніча працягваецца хвароба зроку і ня зьніклі сімптомы перанесенага ў сакавіку інсульту.

***7 кастрычніка Валеры Леванеўскі*** зьвярнуўся ў Канстытуцыйны суд Беларусі з просьбай выправіць становішча, якое склалася са скаргамі беларускіх вязьняў. Палітзьняволены, спасылаючыся на ўласны прыклад, сьцьвярджае, што не працуе норма Канстытуцыі, паводле якой грамадзянін Беларусі мае права абскардзіць у судзе любое накладзенае на яго пакараньне. У Канстытуцыйным судзе гавораць, што скаргі асобных грамадзянаў іх суд не разглядае.

***7 кастрычніка*** крымінальную справу ***Сяргея Скрабца*** перадалі ў Вярхоўны суд. Адпаведнае паведамленьне атрымаў Аляксандр Скрабец — малодшы брат вядомага палітыка.

***12 кастрычніка*** родныя палітзьняволенага ***Сяргея Скрабца*** атрымалі адмову ў спатканьні. Жонка Сяргея Скрабца так патлумачыла гэта: “Сьледчы нам адмовіў у сустрэчы: вось мы перададзім справу ў суд, а там прасіце ў судзьдзі. І вось ужо месяц прайшоў, паўтара... І ў якім судзе, у якога судзьдзі? Проста ён не захацеў — і ўсё”. Пакуль імя судзьдзі, які будзе весьці справу спадара Скрабца, невядомае. Таму пакуль сваякі могуць толькі перадаць вязьню перадачу. Гэтым разам яму акрамя прадуктаў уклалі квітанцыю на падпіску “БДГ. Деловая газета”. Маці былога дэпутата Ніна Рыгораўна сказала, што на “Валадарцы”, дзе па-ранейшаму знаходзіцца яе старэйшы сын, існуе правіла: каб вязень атрымліваў нейкае выданьне, трэба ня толькі выпісаць яго на пошце, але і перадаць у ізалятар арыгінал альбо ксеракопію квітанцыі. Калі гэтага не зрабіць, дык і газета альбо часопіс ня дойдуць да адрасата. У гэтым бацькі Сяргея Скрабца пераканаліся, калі выпісалі яму “Народную волю”. Пэўны час вязень яе не атрымліваў таму, што бацькам ніхто не паведаміў пра турэмныя правілы.

***13 кастрычніка*** кіраўнік офісу АБСЕ ў Менску ***Оке Петэрсан*** сустрэўся ў Гародні з былым палітвязьнем ***Аляксандрам Васільевым*** і сынам палітвязьня ***Валерыя Леванеўскага Уладзімірам Леванеўскім***. Размова была, у прыватнасьці, аб знаходжаньні ў калоніі кіраўніка страйкаму прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага.

***14 кастрычніка*** ў Гародні затрыманы прадпрымальнік ***Мікалай Аўтуховіч***, калі ён разам з дырэктарам партнёрскай фірмы “Ніка-транс” ***Юрыем Лявонавым*** прыехаў у Камітэт фінансавых расьследаваньняў. Прадпрымальнік не чакаў крымінальнай справы супраць сябе і арышту, ён лічыць, што яго, па сутнасьці, заманілі. Юры Лявонаў сказаў, што сьледчы запрасіў яго азнаёміцца з матэрыяламі экспертызы па справе фірмы “Ніка-транс”. Адносна прыезду Аўтуховіча ён сказаў, што той можа прыехаць, калі захоча, але не настойваў на гэтым. Не чакаючы нічога кепскага, Аўтуховіч вырашыў таксама наведаць ўпраўленьне фінансавых расьследаваньняў, дзе яго адразу затрымалі. Яму было вылучанае абвінавачаньне ў няўплаце падаткаў. Сам Мікалай Аўтуховіч абвяргае гэтае абвінавачаньне. Прадпрымальнік сказаў, што Прэзідыум Вышэйшага гаспадарчага суду нядаўна адмяніў рашэньне адносна спагнаньня з яго вялікага штрафу (каля мільёну даляраў). Тым ня менш, Мікалаю Аўтуховічу пагражаюць зьняволеньнем за ўхіленьне ад уплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Справа супраць яго распачатае паводле другой часткі артыкулу 243 Крымінальнага кодэксу, што датычыць ухіленьня ад уплаты падаткаў і збораў, якое нанесла страты ў асабліва буйным памеры. Аўтуховіч знаходзіцца ў сьледчым ізалятары на тэрыторыі гарадзенскай турмы, куды яго даставілі позна ўвечары.

***17 кастрычніка Валеры Леванеўскі*** пераведзены з Івацэвіцкай калоніі ў Рэспубліканскі турэмны шпіталь у Менску. Паводле сваякоў вязьня, хвароба сэрца ў Леванеўскага абвастрылася пасьля галадовак на знак пратэсту супраць парушэньняў яго правоў. Па словах сына Леванеўскага Уладзіміра, “у яго пачалі балець сэрца і сьпіна, а ён ня ведае чаму. Вырашыў падлячыцца і адначасова абсьледавацца”.

***18 кастрычніка*** раніцай з траўмай галавы было знойдзенае цела журналіста ***Васіля Гроднікава*** ў ягоным доме ў Заслаўі. Васіль Гроднікаў — прафесійны журналіст, працаваў на “Беларусьфільме”, у агенцтве АПН. У апошнія гады стала друкаваўся ў “Народнай волі” з нататкамі на сацыяльна-палітычныя тэмы. Брат Васіля Гроднікава Мікалай не выключае, што гэта забойства. Ён сьцьвярджае, што грошы і каштоўныя рэчы з дому яго-нага брата ня зьніклі. Праверку абставінаў сьмерці журналіста Васіля Гроднікава вядзе крымінальная міліцыя Менскай вобласьці. У судова-медыцынскай экспертызе менскага абласнога шпіталю правялі экспертызу цела журналіста і выявілі, што прычынай сьмерці зьявілася чэрапна-маз-

гавая траўма. Але яны не даюць адказ, была сьмерць гвалтоўная ці не, высьветляць сьледчыя органы, міліцыя і пракуратура. Міжнародная арганізацыя “Рэпарцёры бяз межаў” заклікала ўлады Беларусі ўсебакова расьсьледаваць сьмерць Васіля Гроднікава. У адмысловай заяве арганізацыі адзначаецца, што Васіль Гроднікаў ня першы беларускі журналіст, які памёр загадкавай сьмерцю.

***18 кастрычніка*** сына забітай журналісткі ***Веранікі Чаркасавай*** выклікалі ў пракуратуру, каб азнаёміць яго з вынікамі судмедэксьпертызы. З матэрыялаў справы вынікае, што кроў на шуфлядцы кухоннай тумбачкі належыць Антону, сыну забітай журналісткі. 15-гадовы ***Антон Філімонаў*** размаўляў са сьледчым Віктарам Фешчанкам у прысутнасьці сваёй бабулі. Тое, што, паводле эксьпертызы, кроў, знойдзеная на кухоннай мэблі, належыць яму, Антон успрыняў як недарэчнасьць сьледзтва. Ён паведаміў: “Ізноў тая ж сітуацыя… Ізноў вяртаецца той кашмар…”. Антон Філімонаў праходзіць у справе як сьведка. Яго адпусьцілі дадому. Сьледчы Віктар Фешчанка запэўніў маці Веранікі Дыяну Чаркасаву, што сьледзтва справы не спыняе і адпрацоўвае ўсе версіі.

***18 кастрычніка*** палітзьняволены ***Валеры Леванеўскі*** падаў заяву ў Івацэвіцкі раённы суд. Валеры Леванеўскі лічыць, што адміністрацыя калоніі яму не даплаціла і просіць спагнаць з папраўчай калоніі N22 “Воўчыя норы” 481 тысячу рублёў. Вязень вырашыў падаць заяву ў суд пасьля таго, як даведаўся з матэрыялаў праверкі Бярозаўскай міжраённай інсьпекцыі працы, што за ліпень і жнівень яму нібыта пазначылі агулам толькі 82 гадзіны працы. Паводле Валерыя Леванеўскага, ён працуе штодня, без выходных прыбіральшчыкам у медыцынскай частцы калоніі, спалучаючы абавязкі санітара ды іншыя.

***19 кастрычніка*** адвакат Надзея Станкевіч наведала ў сьледчым ізалятары ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча*** і даведалася, што ён адразу пачаў галадоўку ў зьняволеньні: “ Ён з 14-га кастрычніка, з моманту затрыманьня, як абвясьціў галадоўку, так і галадае. Ня выключана, што апынецца на шпітальным ложку. Мы будзем прасіць, каб яму зьмянілі меру стрыманьня, але гэта ўжо будзе вырашаць суд”.

***25 кастрычніка*** адміністрацыя Баранавіцкай сьпецкамендатуры адмовіла палітзьняволенаму ***Міколу Статкевічу*** ў кароткачасовым адпачынку. Паводле заканадаўства, калі асуджаны не парушаў правілы ўнутранага распарадку і ня мае заўваг, то яго мусяць адпусьціць на трохдзённы адпачынак праз месяц з пачатку адбыцьця пакараньня. Першы раз адміністрацыя сьпецкамендатуры паведаміла Міколу Статкевічу, што з Менску прыйшоў ліст ад кіраўніка міліцыі Першамайскага раёну аб тым,

што візіт Статкевіча ў Менск можа дэстабілізаваць сітуацыю ў горадзе. Другі раз апазіцыйны палітык атрымаў аналагічны адказ. Мікола Статкевіч лічыць, што баранавіцкія міліцыянты дзейнічаюць згодна з загадам зьверху.

***25 кастрычніка*** родным апазіцыйнага палітыка ***Сяргея Скрабца***, якія спадзяваліся павіншаваць яго з 42-м днём народзінаў, адмовілі ў сустрэчы. Таму блізкія вязьня вымушаныя абмежавацца харчовай пасылкай. Жонка Сяргея Аляксандра Скрабец падрыхтавала мужу ўсяго паболей, каб хапіла і тым тром вязьням, якія знаходзяцца ў адной камеры з былым дэпутатам.

***27 кастрычніка*** ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” накіравала ў пракуратуру Менскага раёну запыт адносна абставінаў сьмерці сябра арганізацыі ***Васіля Гроднікава***. БАЖ просіць “з улікам грамадзкай значнасьці расьсьледаваньня” праінфармаваць пра ход і вынікі праверкі па гэтым факце, а таксама паведаміць, ці адпавядае рэчаіснасьці інфармацыя пра шматлікія сьляды крыві ў ягоным доме. З заклікам “правесьці неадкладнае і падрабязнае сьледзтва” па справе забойства В. Гроднікава да беларускіх уладаў зьвярнуўся Міжнародны інстытут прэсы (IPI). Дырэктар Інстытуту Яган Фрыц таксама заклікаў беларускія ўлады “зрабіць усё неабходнае дзеля прадухіленьня нападаў на журналістаў”. IPI зьвяртае ўвагу на тое, што Гроднікаў загінуў амаль праз год пасьля забойства Веранікі Чаркасавай — журналісткі незалежнай газеты “Салідарнасьць”. Міжнародны інстытут прэсы падкрэсьлівае, што абставіны яе забойства дагэтуль не высьветленыя, а беларускія ўлады, замест таго, каб зацікавіцца матывамі, зьвязанымі з яе прафесійнай дзейнасьцю, скіравалі сьледзтва супраць непаўнагадовага сына журналісткі.

***28 кастрычніка*** актывісту Саюзу палякаў журналісту ***Андрэю Пачобуту*** скасаваная мера стрыманьня — падпіска аб нявыезьдзе. Ён зьяўляецца падазраваным па крымінальнай справе (артыкул 185 Крымінальнага кодэксу) аб запалохваньні Віктара Богдана — дырэктара шчучынскага Дому польскага. Адначасова Гарадзенская абласная пракуратура працягнула на месяц тэрмін расьсьледаваньня гэтай справы.

***29 кастрычніка*** газета “Згода” (№39 за 29 кастрычніка-5 лістапада) у артыкуле “Бескампрамісная сьмерць” вылучыла версію, што ня выключана, што сьмерць журналіста ***Васіля Гроднікава*** магчыма зьвязаная з яго працай над артыкулам “Кідалы-3” — працягам серыі публікацыяў, дзе ўзгадваліся такія ведамствы, як КДБ і МУС. Па інфармацыі выданьня, два папярэднія артыкулы з серыі “Кідалы” былі прысьвечаныя кватэрным махінацыям ў Маладэчне. В. Гроднікаў зьбіраўся ў бліжэйшы час прыехаць у гэты горад на некалькі дзён, каб зьбіраць матэрыял для новай публікацыі. Паводле “Згоды”, у нататніку, які ляжаў на стале ў доме Гроднікава, на

першай старонцы быў накіданы план артыкулу з рабочай назвай “Забраніраваны офіс, альбо Некалькі бескампрамісных пытаньняў прэзідэнту рэспублікі і яго падначаленым службам”. Аўтары публікацыі таксама ставяць пад сумнеў аргументы сьледчых, якія дагэтуль не завялі крымінальнай справы па факце гібелі Гроднікава на падставе таго, што, маўляў, дом быў зачынены знутры, а вокны — цэлыя. “Вокны не зусім цэлыя, — піша газета. — На кухні, дзе быў знойдзены журналіст, пашкоджанае ўнутранае шкло. Вялікая трэшчына разыходзіцца промнямі. Яе, як зазначаюць родныя, раней не было”. Журналісты, якія наведалі месца падзеяў, зьвяртаюць увагу шмат на якія іншыя дэталі: зламаная табурэтка, у якой акрываўленыя і сядзеньне, і ножка; рассыпаныя на кухні крупы і запалкі (вялікая колькасьць паленых); сьляды крыві палосамі ў самых розных месцах дому і г.д.

***31 кастрычніка*** стала вядома, што пагоршыўся стан здароўя палітвязьня ***Міхаіла Марыніча***, і яго паклалі для лячэньня ў турэмны шпіталь. Як лічыць жонка зьняволенага Тацяна Марыніч, стан здароўя Міхаіла Марыніча рэзка пагоршыўся, бо ў памяшканьнях калоніі нізкая тэмпература. Тацяна Марыніч: “У яго проста аняменьне правай паловы тулава. А ў атрадах стаіць холад.

***3 лістапада*** суд адмовіўся зьмяніць меру стрыманьня для ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***, які 20 дзён галадае ў гарадзенскім СІЗА. Зьняволены разам з ягонымі адвакатамі прасіў вызваліць яго на час сьледзтва, зьмяніўшы меру стрыманьня. Аднак Ленінскі раённы суд пакінуў усё бяз зьменаў.

***11 лістапада*** палітзьняволенага ***Міколу Статкевіча*** адміністрацыя сьпецкамендатуры перавяла на хатні рэжым. Палітык можа цяпер жыць у свайго бацькі ў Баранавічах пры ўмове, што ня звольніцца з працы і штодня будзе адзначацца ў сьпецкамендатуры. Паводле заканадаўства, асуджаны, які цягам трох месяцаў ня меў заўвагаў за парушэньні ўнутранага распарадку, можа быць пераведзены на хатні рэжым — у тым выпадку, калі ягоныя сваякі будуць жыць разам з ім. У Міколы Статкевіча ў Баранавічах жыве бацька, якому патрэбны догляд. Адміністрацыя сьпецкамендатуры толькі аднойчы дазволіла апазіцыйнаму палітыку пераначаваць дома ў свайго бацькі. Апазіцыйны палітык назваў тры асноўныя прычыны, якія, верагодна, паўплывалі на рашэньне ўладаў перавесьці яго на хатні рэжым: “Пачалася дастаткова энергічная рэакцыя сацыял-дэмакратычных партнёраў “Народнай Грамады” ў Заходняй Еўропе. Другая прычына лакальна-мясцовага характару. За гэтыя месяцы, я так адчуваю, ужо “выдахліся” мясцовыя сьпецструктуры, таму што яны шмат намаганьняў трацілі на кантроль за мной. Яны спадзяюцца, што колькасьць замежных візітантаў, якіх яны чамусьці так палохаюцца, паменшыцца. Трэцяя група прычынаў — псіхалагічная. Улада ня можа дазволіць сваімі дзеяньнямі

ствараць рэпутацыю лідэраў апазіцыі як людзей годных, якія не баяцца, якія ахвяруюць". У лістападзе Міколу Статкевіча наведвалі прадстаўнікі швецкага парламенту разам з журналістамі. Раней да яго прыяжджаў амбасадар Нямеччыны ***Марцін Хэкер***. Кіраўнік швецкай дыпмісіі ў Беларусі ***Стэфан Эрыксан*** запэўніў беларускага палітыка, што швецкія сацыял-дэмакраты і надалей будуць супрацоўнічаць з партыяй, лідэрам якой зьяўляецца спадар Статкевіч.

***11 лістапада*** Гарадзенскі абласны гаспадарчы суд пакінуў правамоцным рашэньне аб спагнаньні 12 мільёнаў рублёў зямельнага падатку з ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***, які галадае на знак пратэсту. Апеляцыйную скаргу ад імя прадпрымальніка ў суд падаваў (па даверанасьці) юрыст Андрэй Кухцюк. Паводле яго, зараз застаецца яшчэ магчымасьць зьвярнуцца ў Вышэйшы гаспадарчы суд. Ваўкавыская падатковая інсьпекцыя вырашыла, што Мікалай Аўтуховіч нібыта самавольна заняў зямлю побач са сваім офісам і жылым домам. З гэтай прычыны за мінулы год яму налічылі падатак за зямлю ў дзесяць разоў большы за звычайны — 14 мільёнаў рублёў, з якіх 2 мільёны прадпрымальнік заплаціў. Цяпер з яго спаганяюць астатнюю суму плюс паўтары мільёны рублёў пені.

***13 лістапада*** лідэр гарадзенскіх прадпрымальнікаў ***Валеры Леванеўскі*** абвясьціў у Івацэвіцкай калоніі, дзе ён адбывае пакараньне, галадоўку. Пра гэта паведаміў адвакат вязьня Аляксандр Бірылаў. Паводле адваката, Валеры Леванеўскі пратэстуе супраць дзеяньняў некаторых супрацоўнікаў адміністрацыі і дамагаецца іх службовага пакараньня. Пра падзеі, якія сталі прычынай галадоўкі, распавёў сын Леванеўскага Уладзімір: "Намесьнік начальніка калоніі арганізаваўператрус асабістых рэчаў майго бацькі, знайшлі нейкае дробнае парушэньне і пакаралі яго пазбаўленьнем права на доўгатэрміновае спатканьне. Бацька лічыць, што гэтак з ім паквіталіся за тое, што ён працягвае скардзіцца ў розныя інстанцыі на парушэньні ягоных правоў і правоў вязьняў калоніі". Паводле адваката Аляксандра Бірылава, Леванеўскі адразу паведаміў пра галадоўку адміністрацыі калоніі і быў пераведзены ў медыцынскую частку, дзе за станам ягонага здароўя назіраюць. Валеры Леванеўскі п'е ваду і адмаўляецца толькі ад ежы. Ён мае намер галадаць, пакуль з яго ня здымуць пакараньня і не пакараюць супрацоўнікаў адміністрацыі, якія, як ён лічыць, зрабілі супраць яго правакацыю. "Наколькі мне вядома, у Леванеўскага знайшлі кнігу, якую ён мусіў здаць у бібліятэку. За гэтае дробнае парушэньне яму адмовілі ў спатканьні з жонкай і сынамі, што для вязьня вельмі адчувальна. Безумоўна, гэта неадэкватнае пакараньне за такую дробязь", — лічыць адвакат Аляксандр Бірылаў.

***14 лістапада*** жонка вядомага палітыка ***Сяргея Скрабца*** Аляксандра паведаміла, што яе муж аднавіў галадоўку за кратамі. Пра гэта яна даве-

далася з ягонага ліста. Сяргей Скрабец паведамляе, што ён апошнім часам дрэнна пачуваецца з прычыны рэгулярных прыступаў падагры. На абвастрэньне хваробы ўплывае і дрэннае харчаваньне.

***15 лістапада*** намесьніку старшыні “Саюзу палякаў на Беларусі” ***Юзэфу Пажэцкаму*** скасавалі ў пашпарце штамп аб дазволе выезду ва ўсе краіны сьвету. Юзэфа Пажэцкага выклікалі ў абласную міліцыю да сьледчага па крымінальнай справе аб фінансавых злоўжываньнях у Саюзе палякаў. У яго папрасілі пашпарт, у кабінеце прысутнічала супрацоўніца пашпартна-візавай службы, якая адразу скасавала яму штамп і вярнула пашпарт. Намесьніку старшыні СПБ патлумачылі гэта тым, што ён зьяўляецца падазраваным па іншай крымінальнай справе – аб запалохваньні дырэктара Дому польскага ў Шчучыне Віктара Богдана.

***15 лістапада*** сьледзтва прызначыла ваўкавыскаму прадпрымальніку ***Мікалаю Аўтуховічу***, які знаходзіцца пад арыштам у гарадзенскай турме, псіхіятрычную эксьпертызу. Гэтае рашэньне прынятае з-за таго, што Мікалай Аўтуховіч напісаў у заяве да начальніка турмы, што за праўду гатовы нават памерці за кратамі, і што, калі так здарыцца, ён загадзя абвінавачвае ў гэтым, перадусім, старшыню аблвыканкаму Уладзіміра Саўчанку “і тых людзей, якія ставілі свае подпісы, санкцыянуючы крымінальную справу”. Вязьня павінны абсьледаваць эксьперты, якія вызначаць: ці быў ён пры сьвядомасьці падчас ўчыненьня злачынства (няўплаты падаткаў у буйным памеры) і падчас знаходжаньня пад вартай у турме.

***15 лістапада*** гарадзенскі сьледчы Мікалай Аліхвер, які вядзе справу прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***, наведаў Ваўкавыск і дапытаў 14-гадовую дачку прадпрымальніка Кацю. Допыт дзяўчынкі адбыўся ў кабінеце дырэктара школы. Сьледчага цікавіла — дзе знаходзіцца яе маці дзяўчынкі Алена Аўтуховіч, ці размаўляе яна з ёй па тэлефоне? Ён імкнецца знайсьці Алену Аўтуховіч, якая зьехала на лячэньне, каб дапытаць яе па крымінальнай справе супраць прадпрыемства “Ніка-транс”, заснавальніцай якога яна зьяўляецца. Мікалай Аліхвер склаў пратакол допыту Каці Аўтуховіч і сказаў, каб яна яго падпісала.

***16 лістапада Анжаліка Борыс***, старшыня непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў, была выкліканая на допыт да сьледчага гарадзенскай міліцыі Дзьмітрыя Лабоўскага, які доўжыўся амаль тры гадзіны. Анжаліка Борыс удзельнічала ў вочных стаўках з Казімерам Знайдзінскім, адным з прызнаных уладамі намесьнікаў старшыні Саюзу палякаў і юрыстам арганізацыі Эдвардам Калошам. Яны сьцьвярджаюць, што Анжаліка Борыс раздавала сябрам СПБ гуманітарную дапамогу, якую прывозілі з Польшчы. Сп. Борыс патлумачыла сьледчаму, што за час яе праўленьня Саюз палякаў не атрымліваў ніякай гуманітарнай дапамогі. Яе разьмяркоўваў Тадэ-

вуш Кручкоўскі, які быў тады старшынёй арганізацыі. Таксама з Анжалікай Борыс сустракаўся і сьледчы Шчучынскай міліцыі А.Залога, які вядзе крымінальную справу аб запалохваньні дырэктара Дому польскага ў Шчучыне Віктара Богдана. А.Залога дапытваўся, ці не пагражала Анжаліка Борыс асабіста спадару Богдану. Вярнуўшыся з міліцыі, Анжаліка Борыс сказала, што там на яе аказваўся моцны псіхалагічны ціск.

***16 лістапада*** судзьдзя Вышэйшага гаспадарчага суда Кацярына Караткевіч правяла падрыхтоўчае паседжаньне адносна справы ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***. Паўтары месяцы таму Прэзідыум Вышэйшага гаспадарчага суда скасаваў усе папярэднія судовыя рашэньні адносна спагнаньня з Мікалая Аўтуховіча штрафных санкцыяў, супраць чаго ён змагаўся, будучы на волі. Прэзідыум вырашыў накіраваць справу аб штрафных санкцыях на новы разгляд, пастанавіўшы, што яна будзе разглядацца ў Менску самім Вышэйшым гаспадарчым судом. Аднак 14 кастрычніка ў Гародні супраць яго распачало крымінальную справу аб няўплаце падаткаў упраўленьне Дэпартаменту фінансавых расьсьледаваньняў па Гарадзенскай вобласьці, і ў той жа дзень арыштавалі прадпрымальніка. Разгляд справы ў Вышэйшым гаспадарчым судзе прызначаны на 30 лістапада.

***18 лістапада*** ў Шчучыне анулявалі штамп у пашпарце аб дазволе на выезд ва ўсе краіны сьвету ***Веславу Кеўляку*** — намесьніку старшыні “Саюзу палякаў на Беларусі” на чале з Анжалікай Борыс, якую не прызнаюць улады. Спадар Кеўляк прыехаў на чарговы допыт па справе аб запалохваньні дырэктара шчучынскага Дому польскага Віктара Богдана. У кабінеце сьледчага Андрэя Залогі знаходзілася супрацоўніца пашпартна-візавай службы, якая скасавала штамп. Веславу Кеўляку патлумачылі, што гэта зроблена па прычыне таго, што ён зьяўляецца падазраваным па справе Богдана. На допыт у Шчучын таксама прыехаў іншы намесьнік старшыні Саюзу палякаў Юзэф Пажэцкі, якому забаранілі выезд за мяжу на некалькі дзён раней.

***22 лістапада*** міжнародная арганізацыя ***“Рэпарцёры бяз межаў”*** заклікала беларускія ўлады правесьці сур’ёзнае расьследваньне верагоднасьці таго, што журналіст ***Васіль Гроднікаў*** быў забіты. “Гроднікаў працаваў над даволі рызыкоўнай тэмай перад сьмерцю, а для Беларусі ня рэдкасьць, калі журналісты робяцца аб’ектамі запалохваньня альбо фізічнага гвалту падчас расьследаваньня тэмаў, якія некаторым людзям хацелася б прыхаваць”, — заявілі “Рэпарцёры”. Яны нагадваюць, што В. Гроднікаў працаваў над артыкулам “Кідалы-3”, прысьвечаным кватэрным махінацыям, і што ў нататніку, які ляжаў на стале ў доме Гроднікава, быў накіданы план артыкулу з рабочай назвай “Забраніраваны офіс, альбо Некалькі бескампрамісных пытаньняў прэзідэнту рэспублікі і яго падначаленым службам”. “Рэпарцёры”

нагадваюць, што расьсьледаваньні забойства ***Веранікі Чаркасавай*** і зьнікненьня аператара ***Дзьмітрыя Завадзкага*** ня зрушылі з месца.

***28 лістапада*** Менская раённая пракуратура вырашыла не ўзбуджаць крымінальнай справы па факце гібелі пазаштатнага карэспандэнта "Народнай волі", сябра ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" ***Васіля Гроднікава***. Пра гэта паведаміў сьледчы па справе Дзьмітрый Кірыльчык. Па яго словах, рашэньне аб адмове было прынятае па прычыне адсутнасьці складу злачынства. Разам з тым, сьледчы адзначыў, што ня можа паведаміць прэсе вынікаў судова-медыцынскай экспэртызы: з імі, па яго словах, могуць азнаёміцца толькі блізкія Гроднікава. Сп. Кірыльчык таксама зазначыў, што грамадзкасьць і СМІ выказвалі вялікую цікавасьць да справы, але падкрэсьліў, што гэта не паўплывала на ход праверкі.

***30 лістапада*** "Рэпарцёры бяз межаў" накіравалі Аляксандру Лукашэнку ліст, у якім асудзілі рашэньне пракуратуры не ўзбуджаць крымінальнай справы па факце гібелі журналіста ***В. Гроднікава***. "Мы баімся, што ніколі не даведаемся, пры якіх абставінах сапраўды загінуў Васіль Гроднікаў, як гэта было ў выпадках з двума іншымі журналістамі — ***Веранікай Чаркасавай*** і ***Дзьмітрыем Завадзкім***", — гаворыцца ў звароце. "Гэтыя забойствы не павінныя заставацца беспакаранымі, — лічаць "Рэпарцёры". – Сем'і ахвяраў і беларускія людзі маюць права ведаць, што насамрэч здарылася". "Таму мы заклікаем вас не закрываць справы Васіля Гроднікава без грунтоўнага вывучэньня верагоднасьці ягонага забойства і без канчатковага атрыманьня рэальных вынікаў па справах аб падазронай смерці Веранікі Чаркасавай і Дзьмітрыя Завадзкага", — гаворыцца ў пасланьні "Рэпарцёраў бяз межаў".

***1 сьнежня*** пад Скідалем міліцыянты затрымалі галоўнага рэдактара газеты "Glos znad Niemna" ў эміграцыі" ***Анджэя Пісальніка*** і пад канвоем даставілі ў Ленінскі РАУС Гародні. У райаддзеле журналісту скасавалі пячатку ў пашпарце, якая дазваляе выезд ва ўсе краіны сьвету. Рэдактару газеты патлумачылі, што гэта зьвязана з тым, што ён зьяўляецца падазраваным па крымінальнай справе аб запалохваньні дырэктара шчучынскага Дому польскага Віктара Богдана.

***5 сьнежня*** сын вязьня ***Валерыя Леванеўскага*** Уладзімір, спаслаўшыся на супрацоўніка амбасады Нямеччыны ў Беларусі, паведаміў, што нямецкіх дыпламатаў не пускаюць да ягонага бацькі. Паводле ягоных зьвестак, яшчэ ў кастрычніку нямецкія дыпламаты накіравалі ў МЗС Беларусі ліст, у якім выклалі жаданьне сустрэцца з Валерыем Леванеўскім ў Івацэвіцкай калоніі, дзе гарадзенскі прадпрымальнік адбывае пакараньне. Днямі прыйшоў адказ на гэты ліст, у якім сказана, што "сустрэча з Валерыем Леванеўскім не ўяўляецца магчымай". Прычыны ў адказе не названыя.

***6 сьнежня Мікалаю Аўтуховічу*** ў турме ў прысутнасьці адвакатаў прад'явілі абвінавачаньне . Яно датычыць ухіленьня ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Сьледзтва наблізілася да заканчэньня. Паводле адваката Галіны Івановай, арыштаваны працягвае адмаўляцца ад ежы ўжо 54 дні, п'е толькі ваду. Галіна Іванова ўдакладніла: "Справа ня ў чыста турэмнай ежы, што ён яе ня хоча есьці, а гэта ягоны пратэст супраць незаконнага арышту: ён пісаў, чаму абвясьціў галадоўку. А канкрэтна турэмная ежа ці дамашняя тут ні пры чым, ён на гэтым не акцэнтаваў і нідзе не ўспамінаў, што кепска кормяць, таму галадоўку абвяшчае". Што датычыць турэмнай адміністрацыі, дык яна ўспрымае дзеяньні Мікалая Аўтуховіча як галадоўку, але няпоўную. Напрыклад, намесьнік начальніка турмы Аляксандр Аліеў заявіў, што арыштаваны ужываў мёд і гарбату, а таксама вітаміны. Бацька Аўтуховіча пацьвердзіў, што сапраўды сыну за краты перадавалі мёд. Былы выкладчык Гарадзенскага медуніверсітэту Сяргей Мальчык сам галадаў за кратамі, куды трапляў за несанкцыянаваныя мерапрыемствы, ён займаўся праваабарончай дзейнасьцю і дасьведчаны ў пытаньні галадовак як акцый пратэсту. Паводле яго, чалавек у спрыяльных умовах можа нават вытрымаць 80-90 дзён бяз ежы, хаця потым ня выключаны лятальны канец. Што датычыць вітамінаў, дык яны ня маюць пажыўных рэчываў і не зьяўляюцца ежай, зазначае ён.

***6 сьнежня*** крымінальная справа аб запалохваньні дырэктара Дому польскага Віктара Богдана перададзеная ў абласное УУС. Галоўны рэдактар газеты "Glos znad Niemna" ў эміграцыі" ***Анджэй Пісальнік*** езьдзіў у Шчучын на вочную стаўку з Віктарам Богданам, але яна не адбылася. Сьледчы патлумачыў, што справу ён перадаў у абласное Упраўленьне ўнутраных справаў і не пасьпеў папярэдзіць спадара Пісальніка.

***7 сьнежня*** зьняволены лідэр гарадзенскіх прадпрымальнікаў ***Валеры Леванеўскі*** спыніў галадоўку, якая цягнулася з 13 лістапада амаль тры тыдні. Ён пачаў галадаваць, патрабуючы пакараньня выканаўцы абавязкаў начальніка калоніі Міхаіла Кармановіча, які за незапраўлены ложак пакараў В. Леванеўскага пазбаўленьнем спатканьня са сваякамі, а потым забараніў яму атрымаць перадачу і атаварыцца ў турэмнай краме. Прычынай заканчэньня галадоўкі зьняволенага стаў прыезд у калонію праверкі, якая мусіць разабрацца ў скаргах вязьня.

***8 сьнежня*** намесьнік старшыні грамадзкага аб'яднаньня "Беларускі саюз веэтэранаў вайны ў Афганістане" ***Віктар Сівохін*** наведаў у турме ***Мікалая Аўтуховіча***, які зьяўляецца сябрам гэтай арганізацыі. Пасьля дзьвюхгадзіннай размовы з Мікалаем Аўтуховічам ён назваў стан арыштаванага даволі крытычным, што абумоўлена працяглай галадоўкай. Віктар Сівохін зазначыў, што калі ўбачыў зьняволенага, дык заплакаў, хаця, пад-

крэсьліў, што зьяўляецца баявым палкоўнікам. Ён лічыць, што ветэраны афганскай вайны вымушаныя зьвярнуцца да Генеральнага пракурора з просьбай зьмяніць меру стрыманьня Аўтуховічу, які нікуды не зьбіраецца ўцякаць: "Ветэран вайны ў Афганістане, які сумленна працаваў, даў працу людзям, ветэранам вайны, заробкі, ён чамусьці ізаляваны ад грамадзтва, хаця ягоны стан сёньня практычна крытычны — гэта я вам кажу, таму што я яго ведаў і бачыў такім жыцьцярадасным і магутным". Віктар Сівохін зазныў, што ўсе, хто ваяваў у Афганістане, вярнуліся з абвостраным пачуцьцём справядлівасьці. Гэта датычыць і Мікалая Аўтуховіча, кавалера ордэна "Чырвонага сьцягу" і медалёў "За адвагу" і "За баявыя заслугі". Віктар Сівохін не дае веры таму, што арыштаваны можа нешта ўжываць, галадаць ня поўнасьцю: "Які мёд! Гэта казкі! Я бачыў гэтага чалавека. Калі доктар даў яму таблетку вітамінную, яго адразу званітавала са сьлізьзю, у яго страўнік ужо адпрэчвае нават гэтыя вітаміны. Таму сёньня сітуацыя такая, што можам страціць чалавека ў мірны час. Я ня ведаю, якую пагрозу ён прадстаўляе ў Ваўкавыску і Гарадзенскай вобласьці, я не ўяўляю — якую пагрозу". Віктар Сівохін сказаў, што Аўтуховіч нагадвае зьнятага з крыжа, гэта "худы, абцягнуты скурай чалавек": "У нас сярэдні ўзрост тых, хто памёр пасьля Афганістану, — 48 гадоў. Пяць тысячаў хлопцаў памерлі. 771 чалавек загінуў за 10 гадоў вайны ў Афганістане, і 5 тысячаў сёньня на могілках — па Беларусі".

***9 сьнежня*** былы міністр і амбасадар ***Міхаіл Марыніч*** падаў у Вярхоўны суд скаргу на прысуд, які быў вынесены яму год таму Менскім раённым судом. Адвакат вязьня Валянціна Шаханцова распавяла пра аргументы, выкладзеныя ў скарзе яе падабароннага: "Напісалі, што ён не рабіў злачынства. Што абвінавачаньне не прадставіла ніякіх доказаў. Што ўсе сьведкі абвергглі абвінавачаньне ў тым, нібыта ён зрабіў злачынства праз злоўжываньне. Бо ўласьнік гэтай маёмасьці кампутараў) ня мае да яго прэтэнзіяў, паколькі ў іх існавала і дагэтуль існуе дамова, яна не спыненая. Зразумела, мы ня проста гэта пералічваем, а па-іншаму выкладаем гэтыя аргументы, бо скаргі ў розныя суды ўсё ж адрозьніваюцца. Але сутнасьць адна і тая ж: што ў ягоных дзеяньнях няма складу злачынства".

***12 сьнежня Мікалаю Аўтуховічу***, які галадае ўжо 60 дзён, працягнулі тэрмін утрыманьня пад вартай да 14 студзеня 2006 году. Адвакат Галіна Іванова наведала арыштаванага разам са сьледчым Мікалаем Аліхверам. Паводле яе, Аўтуховіч працягвае галадоўку. Такім чынам ён пратэстуе, перш за ўсё, супраць утрыманьня пад вартай. Пачалося азнаямленьне з матэрыяламі крымінальнай справы супраць Аўтуховіча, сьледзтва па якой скончана. Але ён заявіў сьледчаму, што ня можа знаёміцца з матэрыяламі з-за свайго стану здароўя. У пратаколе быў зроблены запіс аб гэтым. Аднак Галіна Іванова гаворыць, што адвакаты ў любым разе

павінны цяпер вывучыць справу свайго кліента: “Па такіх справах звычайна знаёмяцца так: кліент сам чытае, адвакат – сам. Потым што незразумела – абмяркоўваем. Пасьля азнаямленьня ўзгадняем пазыцыю: якія хадайніцтвы заявіць. Карацей, мы будзем знаёміцца са справай, а ён сёньня па стану здароўя ня можа знаёміцца”.

***14 сьнежня Міколу Статкевіча***, які ў Баранавічах адбывае пакараньне на “хіміі”, наведаў кіраўнік дыпмісіі Швецыі ***Стэфан Эрыксан***. Ён уручыў палітвязьню ліст падтрымкі ад міністра замежных справаў Швецыі. Мікола Статкевіч выказаў падзяку ўраду Швецыі і партнёрам з сацыялдэмакратычнай партыі за падтрымку і праявы салідарнасьці.

***14 сьнежня*** сьледчы Менскай міжраённай пракуратуры Дзьмітрый Кірыльчык вынес паўторную пастанову аб адмове ва ўзбуджэньні крымінальнай справы па факце сьмерці пазаштатнага карэспандэнта “Народнай волі” ***Васіля Гроднікава***. У першы раз ва ўзбуджэньні справы адмовілі “за адсутнасьцю складу злачынства”. Затым пракуратура РБ адмяніла гэтую пастанову і вярнула матэрыялы справы ў Менскую міжраённую пракуратуру для дадатковай праверкі. Падчас яе правядзеньня сьледчы Дзьмітрый Кірыльчык зноў прыйшоў да высновы, што Гроднікаў “мог атрымаць цялесныя пашкоджаньні ў выніку сваіх уласных неасьцярожных дзеяньняў”.

***15 сьнежня*** адміністрацыя Івацэвіцкай калоніі, дзе адбывае пакараньне лідэр гарадзенскіх прадпрымальнікаў ***Валеры Леванеўскі***, адмовілася адпусьціць яго на пахаваньне бацькі. Прычынай адмовы названа тое, што Леванеўскі неаднаразова парушаў турэмную дысцыпліну. Рашэньне не вызваляць Леванеўскага на час пахаваньня ягонага бацькі падтрымаў і пракурор Івацэвіцкага раёну. Валерыю Леванеўскаму толькі дазволілі зрабіць званок дахаты, каб выказаць сваякам спачуваньні.

***20 сьнежня*** адбылася вочная стаўка старшыні Саюзу палякаў ***Анжалікі Борыс***, якую не прызнаюць улады, з дырэктарам Дому польскага ў Шчучыне Віктарам Богданам. На чарговую вочную стаўку езьдзіў і галоўны рэдактар газеты “Glos znad Niemna у эміграцыі” ***Анджэй Пісальнік***. Яго і траіх ягоных калегаў па СПБ лічаць падазраванымі па справе запалохваньня спадара Богдана. Анжаліка Борыс ня езьдзіла з рэвізійнай праверкай у Шчучын і ня ўдзельнічала ў размове з Віктарам Богданам, пасьля якой ён напісаў скаргу на актывістаў Саюзу палякаў з Гародні. Аднак на вочнай стаўцы ўзьнікла размова пра тое, што Анжаліка Борыс нібыта таксама пагражала спадару Богдану, але — па тэлефоне. Анджэй Пісальнік быў на вочнай стаўцы з дырэктарам шчучынскага Дому польскага ўжо трэці раз. Ён так расцэньвае закіды ў адрас спадарыні Борыс, якія ўзьніклі цяпер: “На мой погляд, гэта азначае, што Богдан спрабуе перакінуць адказ-

насьць на Анжаліку Борыс, і гэта нейкая замова, праўдападобна. Улічваючы тое, што ніякіх доказаў нашай віны няма, яны спрабуюць цяпер нейкую такую сюжэтную лінію разгарнуць, што вось пагражала Анжаліка Борыс, але гэта таксама хлусьня”.

***21 сьнежня*** экс-дэпутат Палаты прадстаўнікоў ***Сяргей Скрабец***, які знаходзіцца пад сьледзтвам, вырашыў стварыць сваю ініцыятыўную групу па зборы подпісаў на рэгістрацыю кандыдатам на маючых адбыцца 19 сакавіка прэзідэнцкіх выбарах. Пакуль спадар Скрабец не асуджаны, ён мае права ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі.

***21 сьнежня*** праваслаўны сьвятар айцец Сяргей наведваў ***Мікалая Аўтуховіча*** ў турэмным шпіталі і паведаміў сябрам прадпрымальніка, што той вельмі слабы і выглядае кепска. Карэспандэнт Радыё Свабоды наведаў турэмны шпіталь і на ўмовах ананімнасьці даведаўся пра здароўе Мікалая Аўтуховіча. Лекар сказаў, што раздаваць інтэрв’ю забаронена, але прадпрымальнік адчувае сябе “здавальняюча”: «Мне даводзілася бачыць галадоўнікаў, і скажу, што стан здароўя гэтага чалавека, улічваючы 60 дзён галадоўкі, яшчэ вельмі нядрэнны”. Паводле ягоных зьвестак, Аўтуховіч працягвае адмаўляцца ад ежы, але падмацоўваецца гарбатай, кісялём і прымае глюкозу. Бацька Мікалая Аўтуховіча ня верыць падобным выказваньням і кажа, што мае іншую інфармацыю, бо днямі ягоныя знаёмыя сустракаліся з доктарам шпіталю і перадалі несуцяшальныя зьвесткі: “Перадалі іншую інфармацыю. Быццам доктар сказаў, што яшчэ дзён дзесяць працягне, і ўсё. Вось так мне сказалі”.

***23 сьнежня*** ўвечары ў Гомелі быў затрыманы малады актывіст ***Павел Маджара***. Супрацоўнікі міліцыі выцягнулі яго з машыны, паклалі на зямлю і прымусова абшукалі, нібыта знайшоўшы пры аглядзе наркотыкі. Паўла Мадшару адвезьлі ў Цэнтральны РАУС Гомеля, дзе супраць яго завялі крымінальную справу аб захаваньні наркотыкаў. Пасьля ночы ў пастарунку, зранку актывіста павезьлі дахаты, дзе правялі вобыск кватэры, пры гэтым пастанова аб правядзеньні вобыску была афармленая з пэўным парушэньнем: на ёй адсутнічала пячатка. У кватэры акрамя бел-чырвона-белага сьцягу, партыйных брашураў і розных іншых дакументаў і папер міліцыянты нічога не знайшлі — гэтыя «ўлікі» яны і канфіскавалі.

***27 сьнежня*** ваўскавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча*** выпусьцілі з-за кратаў. Начальнік дэпартаменту выкананьня пакараньняў Уладзімір Коўчур патлумачыў, што напярэдадні пракуратура зьмяніла для Аўтуховіча меру стрыманьня на хатні арышт. Мікалая Аўтуховіча вывезьлі з менскага турэмнага шпіталю на міліцэйскім аўтамабілі і павезьлі ў Ваўкавыск, даставілі адразу ў раённы ваўкавыскі шпіталь, паколькі Аўтуховіч дагэтуль 74 дні праводзіў галадоўку і патрабуе медыцынскай дапамогі. Ён сам

папрасіў, каб яго абсьледавалі, і каб доктар-дыетолаг параіў яму, як паступова выходзіць з галадоўкі. Мікалаю Аўтуховічу далі паразмаўляць з роднымі і сябрамі, але зусім нядоўга. Галадоўнік прызнаўся, што даволі цяжка перанёс пераезд з Менску. З ім дазволілі застацца ягонай дачцэ Кацярыне.

***27 сьнежня*** ўвечары ***Антона Філімонава***, сына забітай летась журналісткі ***Веранікі Чаркасавай***, і яго сябра міліцыянты затрымалі на тралейбусным прыпынку па вуліцы Бялінскага ў Менску. У міліцыі высьветлілася, што туды трапіў яшчэ адзін сябра Антона, у якога знайшлі пяцітысячную падробленую купюру. Ён патлумачыў, што атрымаў яе ад Філімонава і набыў сабе цыгарэты і каву ў шапіку. Хлопцы казалі, што яны паспрачаліся, у каго лепшы кампутар і паспрабавалі зрабіць як мага якасьней грашовыя знакі. У Антона нібыта лепш атрымалася. Усяго ў хлопцаў знайшлі чатыры дзесяцітысячныя і тры пяцітысячныя купюры. Антон Філімонаў затрыманы. Сьледчыя Першамайскага раённага аддзелу міліцыі Менску падазраюць яго ў вырабе і распаўсюдзе падробленых беларускіх грашовых купюраў. Бабуля і дзед Антона непакояцца за стан здароўя свайго ўнука. Яны лічаць, што хлопца ўзялі пад варту з мэтай псіхалагічнага ўзьдзеяньня.

***29 сьнежня*** рэспубліканская пракуратура працягнула яшчэ на месяц сьледзтва па крымінальнай справе аб запалохваньні дырэктара шчучынскага Дому польскага Віктара Богдана. Падазраванымі па справе зьяўляюцца намесьнікі старшыні непрызнанага ўладамі “Саюзу палякаў на Беларусі” (СПБ) Анжалікі Борыс ***Юзэф Пажэцкі*** і ***Веслаў Кеўляк***, а таксама журналісты ***Анджэй Пісальнік*** і ***Андрэй Пачобут***. Паводле Андрэя Пачобута, улады не плануюць судовага працэсу над імі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў і тым жа часам яны ня хочуць спыняць справу, каб трымаць усіх чатырох падазраваных у напружаньні, абмяжоўваць іхнія дзеяньні.

***29 сьнежня*** пракуратура Цэнтральнага раёну Менску распачала крымінальную справу супраць актывістаў моладзевага руху “Зубр” ***Аляксандра Казакова*** і ***Зьмітра Зубра***, якіх абвінавачваюць у супраціве міліцыянтам падчас затрыманьня паводле 363 артыкулу Крымінальнага кодэксу. Іх затрымалі ноччу з 28 на 29 сьнежня за графіці палітычнага зьместу на будынку Цэнтральнага суда Менску. Міліцыянты склалі адміністрацыйны пратакол за дробнае хуліганства і адвезьлі хлопцаў у суд. Паводле заканадаўства, за графіці прадугледжана крымінальная адказнасьць. Таму судзьдзя адмовіўся разглядаць справу, і хлопцаў адвезьлі ў дзяжурную частку. Пракурор Цэнтральнага раёну Менску Аляксандр Хадатовіч тлумачыць: “Меру стрыманьня выбірае орган расьсьледаваньня, службовая асоба. У дадзеным выпадку гэта будзе мой сьледчы. Калі спатрэбіцца санкцыя, то я буду вырашаць гэтае пытаньне. Яны пакуль падазраваныя. У межах расьсьледаваньня будзе

дадзеная ацэнка і графіці. Але пакуль найбольш актуальнае іх стаўленьне да прадстаўнікоў улады ў форме”.

***30 сьнежня*** пракурор Цэнтральнага раёну Менску Аляксандр Хадатовіч прыняў рашэньне адпусьціць студэнтаў ***Аляксандра Казакова*** і ***Зьмітра Зубра***, якія былі затрыманыя за графіці, але падазраюцца ў аказаньні супраціўленьня супрацоўнікам міліцыі, да канца сьледзтва пад падпіску пра нявыезд. Аляксандр Казакоў, як толькі выйшаў на волю, распавёў, што ніякага супраціву міліцыянтам з іх боку не было. Ён упэўнены, што ўлады папросту вырашылі не ўжываць палітычны артыкул.

***30 сьнежня*** прадпрымальнік ***Мікалай Аўтуховіч*** перабраўся з ваўкавыскага шпіталю дахаты, дзе будзе знаходзіцца пад хатнім арыштам да суда, дата якога пакуль не прызначаная. Ён адчувае сябе няблага і працягвае выходзіць з галадоўкі. Паводле ўмоваў хатняга арышту, Мікалаю Аўтуховічу абмежавалі кантакты, забаранілі выходзіць з дому, тэлефанаваць, за ім усталяванае назіраньне.

***30 сьнежня*** скончыўся тэрмін затрыманьня ***Антона Філімонава***, сына забітай летась журналісткі ***Веранікі Чаркасавай***, без прад’яўленьня абвінавачаньня, і пракурор даў санкцыю на арышт. Антона перавялі ў камеру сьледчага ізалятару. Дзед Антона, Уладзімір Мялешка пабываў на допыце: “Я не апраўдваю Антона – ён зрабіў глупства. Але я ўпэўнены, што Антон ня ставіў сваёй мэтай абагачэньне. Не зрабілі ўрону эканоміцы і гаспадарцы краіны гэтыя хлопцы. У такіх умовах хапаць хлопца, кідаць яго ў турму напярэдадні Новага году – гэта неапраўданая жорсткасьць. Лічу, што яго пасадзілі ў СІЗА з адзінай мэтай – дзеля псіхалагічнага ціску. Інакш, чым растлумачыць такія дзеяньні, калі да Антона ў ізалятар прыходзяць з прапановамі прызнацца ў забойстве сваёй маці Веранікі Чаркасавай”.

## 5. Перасьлед незалежных сродкаў масавай інфармацыі і журналістаў, парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду слова і атрыманьне праўдзівай інфармацыі

***4 студзеня*** судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Валеры Есьман пастанавіў спагнаць на карысьць міністра фінансаў РБ, кіраўніка Беларускай асацыяцыі гімнастыкі Мікалая Корбута 30 мільёнаў рублёў з рэдакцыі газеты ***“Прессбол”*** і 10 мільёнаў – з галоўнага рэдактара вы-

даньня ***Уладзіміра Беражкова***, тым самым часткова задаволіўшы зыск М. Корбута аб кампенсацыі маральных стратаў. Публікацыя, якая стала нагодай для зыску, зьявілася ў №128 газеты 22-га кастрычніка 2004 году. У прыватнасьці, прэтэнзіі высокага чыноўніка выклікаў яе загаловак, зьмешчаны на першай паласе выданьня: “В замах у министра финансов Беларуси ходит человек, разыскиваемый Интерполом за участие в организованной преступной группировке”. Зыскоўца ўспрыняў гэтую фразу як “інфармацыю з мэтай наўмысна зьняважыць мае і маіх намесьнікаў гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю”. М. Корбут прасіў абвергнуць распаўсюджаныя зьвесткі і спагнаць з журналіста газеты “Прессбол” Сяргея Вярсоцкага і галоўнага рэдактара газеты Уладзіміра Беражкова па 10 млн. рублёў, а з заснавальніка выданьня – УП “Прессбол плюс” — 50 млн. рублёў у якасьці кампенсацыі за нанесеную маральную шкоду. Яшчэ на папярэднім слуханьні ў судзе адказчыкі пагадзіліся прынесьці М. Корбуту публічныя прабачэньні ў той фармулёўцы, якую ён палічыць неабходнай. Аднак М. Корбут прабачэньняў не прыняў і пакінуў свае патрабаваньні ў сіле. У. Беражкоў зьбіраецца абскарджваць гэты прысуд “ва ўсіх магчымых інстанцыях”. Ён абураны рашэньнем суда і сумай кампенсацыі. Галоўны рэдактар упэўнены, што калі б судзьдзя задаволіў хадайніцтва адказьнікаў, даслаўшы, як яны прасілі, запыты аб інфармацыі ў МУС, Інтэрпол і Беларускую асацыяцыю гімнастыкі, то праўдзівасьць апублікаваных “Прессболом” зьвестак была б даказаная.

***5 студзеня*** ўвечары ў Навабеліцкім раёне г.Гомелю быў затрыманы гомельскі актывіст Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Артур Цурбакоў***. Да А. Цурбакова, які раздаваў газеты ***“Время”*** на вуліцы, падыйшоў міліцыянер і пасьля азнаямленьня са зьместам выданьня выклікаў нарад міліцыі. У раённым упраўленьні ўнутраных справаў на актывіста АГП склалі пратакол затрыманьня, забралі 8 асобнікаў газеты, зьнялі адбіткі пальцаў і праз паўтары гадзіны адпусьцілі. 10-га студзеня яго выклікалі ў міліцыю паўторна, папрасіўшы прынесьці копію пасьведчаньня аб рэгістрацыі газеты і копію дамовы на распаўсюд. Там на А. Цурбакова склалі яшчэ адзін пратакол, дадаўшы да яго выпіскі з прынесеных дакументаў, і папярэдзілі, што могуць выклікаць зноў. Газеты, якія міліцыя забрала 5-га студзеня, сп-ру Цурбакову аддалі.

***5 студзеня*** Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне рэдакцыі недзяржаўнай газеты ***“Прессбол”*** за артыкул “Вопросы жизни и смерти. Открытое обращение к Александру Лукашенко” (№153 (1753) ад 21.12.2004 г.). Міністэрства палічыла, што ў ім апублікаваныя матэрыялы судовай справы без пісьмовага дазволу судзьдзі (у прыватнасьці, зыскавую заяву міністра фінансаў РБ, кіраўніка Беларускай асацыяцыі гімнастыкі Мікалая Корбута). Гэта ўжо другое цягам году пісьмовае папярэ-

джаньне, вынесенае за парушэньне арт. 5 Закону аб друку, што можа стаць падставай для спыненьня дзейнасьці газеты судом.

***11 студзеня*** рэдактар ***"Местной газеты" Андрэй Шантаровіч*** і вядомы ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч атрымалі павесткі ў Ваўкавыскі РАУС у якасьці абвінавачваемых па невядомых прычынах. Як пазьней аказалася, падставаю для выкліка ў РАУС стаў матэрыял у "Местной газете", дзе Мікалай Аўтуховіч даваў свой каментар адносна падзеяў вакол ягонай фірмы. Пасьля дзьвюх гадзінаў тлумачэньняў у ваўкавыскім РАУСе Андрэй Шантаровіч і Мікалай Аўтуховіч былі адпушчаныя без прад'яўленьня абвінавачаньняў. "Праверка праводзілася па факце заявы начальніка падатковай інсьпекцыі па Ваўкавыскім раёне. У словах Аўтуховіча начальнік падатковай інсьпекцыі ўгледзеў заяву аб непадпарадкаваньні законнай уладзе. Аднак пасьля нашых тлумачэньняў нас адпусьцілі і сказалі, што справу ўзбуджаць ня будуць у сувязі з адсутнасьцю складу злачынства," — пракаментаваў Андрэй Шантаровіч.

***11 студзеня*** Міністэрства інфармацыі вынесла афіцыйныя папярэджаньні тром FM-станцыям – ***"Хіт-ФМ"***, ***"Юністар"*** і ***"Новае радыё"***. Прычына – невыкананьне патрабаваньня, каб тры чвэрці эфіру складалі беларускія музычныя творы. Міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч заявіў, што калі патрабаваньне ня будзе выкананае, міністэрства пазбавіць станцыі права вяшчаньня. Ён падкрэсьліў, што міністэрствы інфармацыі і культуры вызначаюць адзіныя крытэрыі паняцьця "беларускі выканаўца".

***12 студзеня*** ў судзе Цэнтральнага раёну Гомеля пачалося слуханьне адміністрацыйнай справы па абвінавачаньні ўласнага карэспандэнта ***"Народнай волі" Ірыны Макавецкай*** у непавазе да суду. Нагодай да судовага разьбіральніцтва стаў інцыдэнт, які адбыўся 2 сьнежня 2004 году ў судзе Чыгуначнага раёну, калі судзьдзя Тацяна Адрыбец не дазволіла журналістцы прысутнічаць на адкрытым судовым паседжаньні па адміністрацыйнай справе дырэктара замежнага паліграфічнага прадпрыемства "Іосіфа і Адзета". Журналістка адмовілася выканаць патрабаваньне судзьдзі пакінуць памяшканьне, дзе вяліся слуханьні. Судзьдзя выклікала нарад міліцыі, які даставіў І. Макавецкую ў аддзяленьне міліцыі Цэнтральнага раёну. Аднак міліцыянты, склаўшы толькі пратакол аб адміністрацыйным затрыманьні журналісткі, зноў адвезьлі яе ў суд Чыгуначнага раёну, дзе на яе ўжо склалі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні. Паводле словаў журналісткі, сьведкамі здарэньня былі абвінавачваемая па той справе дачка вядомай гомельскай прадпрымальніцы Тацяны Марчанкі Юлія, яе адвакат і супрацоўнік яе прадпрыемства. Аднак у пратаколе адзіным сьведкам пазначаны начальнік юрыдычнага аддзелу падатковай інсьпекцыі Чыгуначнага раёну Гомелю Андрэй Краўцоў. Судзьдзя па адміністрацыйных справах Цэнральнага суда Яраслаў Парэмскі адхіліў хадай-

ніцтва спн. Макавецкай, датычнае дапросу судзьдзі Адрыбец, а таксама ён адмовіўся дапытаць галоўную сьведку Юлію Марчанку, якая павінна вярнуцца з адпачынку праз тыдзень. “Закон не вызваляе судзьдзяў ад функцыяў сьведкі, тэрміны справы дазваляюць нам дачакацца вяртаньня Юліі Марчанкі. Таму ўжо зараз можна казаць пра перадузятае стаўленьне да мяне з боку судзьдзі Парэмскага”, - лічыць Ірына Макавецкая. Па меркаваньні журналісткі, яе лёс ужо вырашаны, і яна будзе пакараная, таму што ў адваротным выпадку ў дачыненьні да судзьдзі Адрыбец трэба ўзбуджаць крымінальную справу за стварэньне перашкодаў пры ажыцьцяўленьні законнай дзейнасьці журналіста.

***12 студзеня*** ў Віцебску павінна было адбыцца паседжаньне адміністрацыйнай камісіі Кастрычніцкага раёну па справе ***Кастуся Горнага***, які быў затрыманы за распаўсюд улётак і каляндарыкаў ад Радыё Свабода 28 сьнежня 2004 году. Сябры Партыі БНФ Кастусь Горны і Уладзіслаў Токараў чакалі ў калідоры свайго выкліку амаль гадзіну. Але Кастусю Горнаму старшыня камісіі Міхаіл Дзядзінкін заявіў, што разглядаць ягоную справу гэтым разам ня будзе, а на наступнае пасяджэньне выкліча нарад міліцыі з Кастрычніцкага райаддзелу — у якасьці сьведкаў сьнежаньскага затрыманьня, а таксама дзеля аховы парадку, бо гэтая справа, на ягоную думку, мае крымінальнае адценьне. Разгляд справы перанесены на 26 студзеня. А што датычыць справы Ўладзіслава Токарава, то, як высьветлілася, міліцыянты няправільна аформілі дакументы, і яны мусяць разглядацца ў адміністрацыйнай камісіі Першамайскага раёну.

***12 студзеня “Народная воля”*** са спасылкай на кіраўніка прэс-службы Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі ***Сьвятлану Краскоўскую*** паведаміла, што праграмаў вытворчасьці “Euronews” у ранішнім раскладзе беларускага тэлеканалу “Лад” больш няма: дамова на трансьляцыю была заключаная толькі на 2004 год, і зараз НДТРК давялося адмовіцца ад паказу еўрапейскіх навінаў з фінансавых прычынаў. Паводле С. Краскоўскай, канчаткова пытаньне з навінамі “Euronews” ня вырашанае: кіраўніцтва НДТРК ўсё яшчэ вядзе перамовы з тэлеканалам. Разам з тым, прэс-сакратар акцэнтавала ўвагу на тым, што праграмы “Euronews” дарага каштуюць. Аднак прычына можа быць іншай: у сьнежні 2004 г. тэлеканал “Euronews” напрацягу тыдня дэманстраваў сюжэт пра беларускіх журналістаў і сітуацыю з беларускімі СМІ, зьняты з нагоды атрыманьня ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” Сахараўскай прэміі ад Еўрапарламенту, а таксама трансьляваў цырымонію ўручэньня прэміі і прамову старшыні БАЖ Жаны Літвіной, якая выказала заклапочанасьць сітуацыяй са свабодай слова ў Беларусі і рэзка крытыкавала палітыку беларускіх уладаў у дачыненьні да незалежнай прэсы.



***17 студзеня*** ў Віцебску за распаўсюд газеты ***“Время”*** міліцыя затры-

мала намесьніцу старшыні гарадзкой арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі ***Алену Залескую***. Міліцыянты адвезьлі сп-ню Залескую ў Кастрычніцкі раённы аддзел міліцыі, дзе на яе скалі пратакол і забралі некалькі асобнікаў газеты. Давесьці ахоўнікам парадку, што гэтая газета мае выходныя дадзеныя і не зьяўляецца забароненай для распаўсюду, затрыманай так і не ўдалося. Міліцыянты заявілі, што перададуць дакументы ў суд, які і вырашыць, у якой ступені вінаватая Алена Залеская.

***18 студзеня*** суд Цэнтральнага раёну Гомелю працягнуў слуханьні, пачатыя 12 студзеня, і пастанавіў зрабіць вусную заўвагу карэспандэнту газеты ***"Народная воля"*** па Гомельскай вобласьці ***Ірыне Макавецкай***, прызнаўшы яе вінаватай у парушэньні арт. 166-прым. КоАП – праява непавагі да суда. Журналістка лічыць, што адносная мяккасьць прысуду тлумачыцца нежаданьнем уладаў разьдзьмуваць скандал, у якім прадстаўнікі правасудзьдзя праявілі сябе ня з лепшага боку.

***19 студзеня*** УП "Прессбол плюс", якое зьяўляецца заснавальнікам газеты ***"Прессбол"***, накіравала ў Вышэйшы гаспадарчы суд Беларусі зыскавую заяву, у якой просіць прызнаць несапраўдным папярэджаньне Міністэрства інфармацыі, вынесенае 5 студзеня за парушэньне артыкула 5 Закона "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". Тады выданьне абвінавацілі ў абнародваньні незавершаных у вытворчасьці матэрыялаў судовай справы без пісьмовага дазволу судзьдзі (публікацыя ў нумары за 21 сьнежня 2004 году зыскавай заявы міністра фінансаў і кіраўніка Беларускай асацыяцыі гімнастыкі Мікалая Корбута). На той час у судзе Цэнтральнага раёну г. Менску разглядаўся зыск М.Корбута да рэдакцыі газеты "Прессбол", рэдактара выданьня У.Беражкова і журналіста С.Вярсоцкага.

***20 студзеня*** стала вядома, што рэзка негатыўную рэакцыю сярод прыхільнікаў ***«Радыё Рокс»*** выклікала зьмена канцэпцыі вяшчаньня гэтай папулярнай FM-радыёстанцыі. Ня ўсе радыёслухачы зразумелі, што паварот "Радыё Рокс" на 180 градусаў і пераход на чыста расейскую папсу абумоўлены прэсінгам з боку беларускіх уладаў. Згодна з патрабаваньнямі міністэрства, у эфіры павінна гучаць 75 адсоткаў кампазіцыяў айчынных выканаўцаў. У эфіры стала гучаць ардынарная расейская папса маскоўскай вытворчасьці, а калі і беларускага выканаўцы – дык збольшага на расейскай мове.

***21 студзеня*** ўпраўленьне ідэалогіі Гарадзенскага аблвыканкаму даслала дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам гораду лісты, у якіх "не рэкамендуе" ім разьмяшчаць рэкламу ў недзяржаўных газетах. Разам з "рэкамендаўчым лістом" прадпрыемствы Гародні атрымалі сьпіс дзяржустановаў, якія разьмяшчалі рэкламу ў недзяржаўных СМІ. Начальнік упраўленьня ідэалогіі Гарадзенскага аблвыканкаму Уладзімір Амелька за-

явіў, што дакумент накіраваны на падтрымку дзяржаўных СМІ і мае рэкамендаўчы характар.

***24 студзеня*** ўвечары ў Магілёве з кабельных і эфірных недзяржаўных тэлевізійных сетак зьнік тэлеканал ***"Euronews"***. Яго замянілі "Сталічным тэлебачаньнем". У пакеце з дванаццаці каналаў, які прапануе магілёўцам эфірна-кабельнае тэлебачаньне Таварыства з абмежаванай адказнасьцю "Дыён-тэлесэрвіс", "Euronews" быў адзіным заходнім тэлеканалам, які перадаваў актуальную інфармацыю з розных сфераў жыцьця, у тым ліку і палітычную, без ідэалагічных каментароў. Дырэктар "Дыёну" Аляксандр Астапаў спаслаўся на праверку, падчас якой ад фірмы запатрабавалі выконваць дакументы ўраду і Міністэрства інфармацыі наконт сьпісу абавязковых для трансьляцыі тэлеканалаў. У ім няма "Euronews", затое ёсьць СТВ.

***25 студзеня*** пракуратура Ленінскага раёну г. Менску вылучыла абвінавачаньне журналісту недзяржаўнага штотыднёвіка ***"Белорусская газета" Кірылу Жываловічу*** па артыкуле 363 ч. 2 Крымінальнага кодэксу ("Супраціўленьне работніку міліцыі альбо іншай асобе, якая ахоўвае грамадзкі парадак"). Як паведаміў сьледчы пракуратуры Юры Варанко, 10 студзеня журналіст каля будынку Галоўпаштамту ў Менску "ўчыніў скандал" і "зьдзейсьніў гвалт" у дачыненьні да супрацоўнікаў аховы. З журналіста ўзялі падпіску аб нявыезьдзе. Кірыл Жываловіч абвінавачваньні абвяргае і сьцьвярджае, што канфлікт узнік у часе падрыхтоўкі ім матэрыялу аб дзейнасьці супрацоўнікаў пазаведамаснай аховы. Па ягоных словах, на спробу журналіста ўзяць у іх інтэрвью яны запрасілі яго ў службовае памяшканьне, дзе спачатку пагражалі, а потым ужылі ў дачыненьні да яго фізічную сілу. У пастанове ж аб прыцягненьні яго ў якасьці абвінавачанага ўтрымліваецца ілжывая інфармацыя: ён кажа, што ані яго алкагольнае ап'яненьне, ані факт зьбіцьця супрацоўнікаў аховы не пацьвердзіла медыцынская эксьпертыза. Журналіст падаў заяву ў пракуратуру Ленінскага раёну, каб крымінальную справу супраць яго спынілі з-за адсутнасьці складу злачынства. Справу, заведзеную ў дачыненьні да К. Жываловіча, у гэты ж дзень перадалі ў суд, які, па словах следчага, адбудзецца цягам месяца з моманту вывучэньня абвінавачаньня. Артыкул, па якім заведзена справа, можа карацца абмежаваньнем волі на тэрмін да 5 гадоў альбо пазбаўленьнем волі на той жа тэрмін.

***25 студзеня*** старшыня Смаргонскага райвыканкаму Мечыслаў Гой адказаў адмовай на запыт заснавальніка ***«Новой газеты Сморгони» Рамуальда Улана*** аб узгадненьні разьмяшчэньня выданьня. 3 студзеня Р. Улан накіраваў скаргу ў раённы выканаўчы камітэт, у якой ён зьвярнуў увагу выканаўчага органу на адсутнасьць падставаў для адмовы ў разьмяшчэньні выданьня. Атрыманую адмову выдавец расцэньвае як аб-


Праваабарончы Цэнтр «Вясна»

межаваньне канстытуцыйнага права на свабоду распаўсюду інфармацыі. Гэта ўжо другая адмова, атрыманая выдаўцом ад смаргонскіх уладаў за апошні час. У апошні раз яе вынес папярэдні старшыня райвыканкаму С. Юргель – яна была абскарджаная ў гаспадарчым судзе Гарадзенскай вобласьці: суд вынес прыватнае вызначэньне ў адрас Смаргонскага райвыканкаму, указаўшы на няправільнае афармленьне дакументаў.

***26 студзеня*** гандлёвае прадпрыемства “Магілёўкніга” вярнула грамадзкаму распаўсюдніку літаратуры ***Алесю Асіпцову***, які выступаў пасярэднікам паміж гэтым аб’яднаньнем і рэдакцыяй часопісу ***“ARCHE”***, нераспраданыя асобнікі выданьня. Адначасова кіраўніцтва “Магілёўкнігі” абвесьціла, што з гэтага моманту ў аднабаковым парадку скасоўвае дамову, якая была заключаная паміж прадпрыемствам і рэдакцыяй на продаж часопісу ў магілёўскіх кніжных крамах. Кіраўніцтва прадпрыемства кнігагандлю патлумачыла такое рашэньне нізкім попытам на часопіс. У сваю чаргу, А.Асіпцоў лічыць, што прадпрыемства выконвае загад сталічнага начальства. Часопіс “ARCHE” у асаблівую “няміласьць” патрапіў пасьля таго, як прысьвяціў адзін з нумароў падвядзеньню вынікаў 10-гадовага праўленьня А.Лукашэнкі. Увосень 2004 году шэраг сталічных кніжных крамаў адмовіліся прадаваць часопіс, у сярэдзіне жніўня 2003 году ў Віцебску на складзе прадпрыемства “Аблкнігагандаль” таксама адмовіліся прымаць на рэалізацыю 25 асобнікаў выданьня. Як тлумачылі тады тавараназнаўцы прадпрыемства, распараджэньне зыходзіла ад намесьніцы міністра Лілііі Ананіч.

***26 студзеня*** раённыя адміністрацыйныя камісіі Віцебску вынесьлі папярэджаньні сябрам Партыі БНФ ***Уладзіславу Токараву*** і ***Кастусю Горнаму,*** якія былі затрыманыя 28-га сьнежня 2004 году за распаўсюд каляндарыкаў Радыё Свабода.

***28 студзеня*** беларускі кансулят у Беластоку, не каментуючы свайго рашэньня, адмовіў у выдачы візы ***Яўгену Вапу*** – галоўнаму рэдактару тыднёвіка беларусаў Польшчы ***“Ніва”*** і старшыні Беларускага саюзу ў Польшчы. “Я ацэньваю гэта як прызнаньне ролі, якую адыгрывае “Ніва” ў агульнабеларускім жыцьці. Мы стараемся рознымі спосабамі, праз артыкулы, закранаць розныя асьпекты жыцьця таксама і ў Беларусі. Адзначу, што тыднёвікаў, якія выходзяць цалкам на беларускай мове і падаюць беларускі погляд на падзеі, на сёньняшні дзень усяго два – гэта “Наша ніва” ў Менску і “Ніва” ў Беластоку. Так што ў гэтым, думаю, прычына візавай адмовы”, — пракаментаваў падзеі спадар Вапа.

***28 студзеня*** на калегіі Міністэрства інфармацыі яго кіраўнік ***Уладзімір Русакевіч*** агучыў наступныя лічбы: у 2004 годзе Міністэрства інфармацыі прыпыняла дзейнасьць 25-ці сродкаў масавай інфармацыі, 81-му перыядычнаму выданьню вынесена 160 пісьмовых папярэджаньняў. Па словах

міністра, папярэджаньні сталі сьледзтвам масавых парушэньняў, выяўленых падчас рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне СМІ. З яго словаў, пісьмовыя папярэджаньні "практычна не ўплываюць на дзейнасьць СМІ", паколькі не падмацаваныя матэрыяльнымі санкцыямі. Прыпыненьне дзейнасьці СМІ міністр лічыць больш дзейсным карным захадам. Уладзімір Русакевіч падкрэсьліў, што такія захады "будуць рашуча і бескампрамісна ставіцца і ў будучым на шляху любых спробаў абысьці закон альбо выпрабаваць наша цярпеньне". "Не выключана таксама, што ў бліжэйшы час ў сферы сродкаў масавай інфармацыі і друку давядзецца на практыцы засвойваць новыя заканадаўчыя нормы і палажэньні". Па словах У. Русакевіча, "рэалізуючы дзяржаўную палітыку ў галіне электронных СМІ, у Мініфармацыі прыярытэт аддадзены тым накірункам, якія вызначаныя ў якасьці найважнейшых кіраўніцтвам краіны". Сярод іх – "павелічэньне ролі ўласнага вяшчаньня і скарачэньне рэтрансьляваных праграмаў, навядзеньне парадку ў FM-дыяпазоне і давядзеньне аб"ёму гучаньня да 75%; усталяваньне цывілізаваных, юрыдычна афармленых дачыненьняў з расійскімі партнёрамі ў інтарэсах пашырэньня беларускай інфармацыйнай прасторы". Па словах міністра Русакевіча, "менавіта для гэтых мэтаў... у міністэрстве створаны аддзел электронных СМІ, які ў лютым будзе пераўтвораны ва ўпраўленьне".

***28 студзеня*** рэдактар крычаўскага недзяржаўнага выданьня ***"Вольны горад"*** і кіраўнік раённай арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі ***Сяргей Няроўны*** быў выкліканы ў міжраённую ўправу КДБ на гутарку. У Сяргея Няроўнага пыталіся пра некаторыя матэрыялы, надрукаваныя ў газеце "Вольны горад". У прыватнасьці, пра канфлікт у Крычаўскай раённай ветэранскай арганізацыі, які асьвятляе газета і які, паводле зьвестак Няроўнага, улада хоча "замяць" напярэдадні 60-годзьдзя Перамогі. Асноўнай жа тэмай размовы ў КДБ сталі сувязі крычаўскіх дэмакратаў з Андрэем Клімавым і падрыхтоўка да яго акцыі 25 сакавіка. Сяргей Няроўны разглядае выклік у КДБ як пачатак кампаніі ціску на дэмакратычных актывістаў у рэгіёне.

***31 студзеня*** ўвесь калектыў рэдакцыі Крычаўскай раённай газеты ***"Ленінскі кліч"*** (заснавальнік — Крычаўскі райвыканкам) загадам галоўнага рэдактара ***Тацяны Іўкінай*** на 100% пазбаўлены прэміі за сьнежань 2004 году. Такім чынам работнікаў газеты пакаралі за тое, што рэдакцыя ня здолела павысіць з першага ж месяцу новага году наклад свайго выданьня да 4 000 асобнікаў. Гэткі паказчык вызначыў для газеты асабіста старшыня крычаўскага райвыканкаму Іван Пракопаў. Ягоная павышаная ўвага да праблемаў раённай газеты, у сваю чаргу, выкліканая тым, што "Ленінскі кліч" патрапіў у абласны сьпіс дзяржаўных газетаў (усяго такіх 5), якія павінныя стаць самаакупнымі ўжо з вясны бягучага году. Усе гэтыя выданьні папярэдзілі, што бюджэтнае ўтрыманьне іх будзе зьменшанае, і

што зарабляць трэба будзе самім. У прыватнасьці, кожнаму супрацоўніку крычаўскай “раёнкі” загадалі “падпісаць” на яе ня менш як па 100 чалавек.

***1 лютага*** Дзяржаўнае аб’яднаньне ***“Белтэлекам”*** па загадзе Міністэрства сувязі заблакавала выхад на тры зарэгістраваныя ў Расіі сайты сэксуальных меншасьцяў. Галоўны сьпецыяліст упраўленьня электрасувязі Міністэрства сувязі Андрэй Сабораў паведаміў, што сайты заблакавалі згодна з заключэньнем эксьпертнай камісіі. Ён патлумачыў, што ў камісію пры Міністэрстве культуры зьвярнулася маці аднаго падлетка са скаргай на тое, што яе сын разам са сваімі сябрамі ў Інтэрнэт-кавярні меў бескантрольны доступ на гей-порнасайты. Пасьля таго, як эксьпертная камісія пастанавіла, што сайты насамрэч зьяўляюцца парнаграфічнымі, іх заблакавалі. Андрэй Сабораў заявіў, што заблакаваць сайт тэхнічна вельмі проста, і ў іх ёсьць эксьпертная камісія, якая прымае рашэньні. Старшыня Лігі сэксуальных меншасьцяў ***Эдвард Тарлецкі*** так паставіўся да гэтай праблемы: “Трэба выказаць шкадаваньне адносна тых людзей, якія дзякуючы гэтым сайтам спрабавалі знайсьці сабе пару. З другога боку, менавіта гэтыя сайты, доступ да якіх забаронены, яны сапраўды зьмяшчалі і зьмяшчаюць у сабе элементы парнаграфіі, распаўсюд якой у нашай краіне забаронены”. У Лігі сэксуальных меншасьцяў раней былі аналагічныя праблемы з сайтам, але пасьля таго, як эксьпертная камісія зрабіла адпаведнае заключэньне, сайт “Apogay” зьяўляецца даступным у Беларусі і за яе межамі.

***2 лютага*** адміністрацыйная камісія Кастрычніцкага раёну Віцебску мусіла разгледзець справу паводле факту затрыманьня старшыні абласной арганізацыі АГП ***Алены Залескай***. 17 студзеня Залеская пакінула некалькі асобнікаў газеты “***Время”*** ў будынку раённага аддзяленьня аб”яднаньня “Ахова”, што было зафіксавана відэакамерай. Супрацоўнікі “Аховы” выклікалі міліцыю, каб высьветліць, што за выданьне распаўсюджвае іхняя наведніца. І хаця спадарыня Залеская даводзіла ў пастарунку, што газета “Время” зарэгістраваная ды мае належныя выходныя дадзеныя, яе справу ўсё адно перадалі на разгляд у адміністрацыйную камісію. Намесьніца старшыні камісіі Галіна Іванковіч, якая праводзіла пасяджэньне, адмовілася выказаць сваё меркаваньне пра ўчынак затрыманай Алены Залескай і ўвогуле забараніла прысутным журналістам весьці дыктафонныя запісы. Разгляд справы тым часам так і ня быў завершаны, бо намесьніца сказала, што ня ведае, як ставіцца да газеты “Время” і як суаднесьці яе распаўсюд з Адміністрацыйным кодэксам, а таму будзе кансультавацца пра гэта ў Міністэрстве інфармацыі. Алене Залескай было загадана зьявіцца праз два тыдні на чарговае пасяджэньне камісіі.

***3 лютага*** ў памяшканьні Баранавіцкага ГАУС праходзіў прыём грамадзянаў першым намесьнікам міністра ўнутраных справаў Аляксандрам

Шчурко. Карэспандэнту баранавіцкай газеты ***“Intex-press” Аляксандру Чарненку*** не дазволілі прысутнічаць падчас прыёму. Аб сваёй прысутнасьці карэспандэнт папярэдне дамовіўся з прэс-сакратаром ГАУС Наталяй Сідзельнік. Але калі на наступны дзень ён прыйшоў у будынак аддзела ўнутраных справаў, яму ня толькі не дазволілі прысутнічаць у кабінеце, але і забаранілі размаўляць у калідоры з наведнікамі, што прыйшлі да намесьніка міністра. Адказаў на пытаньні, на якой падставе яму забаранілі прысутнічаць на прыёме і ад каго зыходзіла забарона, карэспандэнт не атрымаў.

***4 лютага*** рэдакцыя гарадзенскай недзяржаўнай газеты ***“Биржа информации”*** атрымала ліст, у якім гаворыцца, што Скідальская філія Гарадзенскага райспажыву ня можа працягнуць дамову “ў сувязі з недахопам работнікаў прылаўка”. Дамова на пастаўку выданьня дзейнічала з 14 сьнежня 2003 году. Дырэктар Скідальскай філіі Галіна Кавальчук сказала, што яна асабіста ня мае прэтэнзіяў да “Биржи информации”, а рашэньне аб спыненьні дамовы проста зьвязанае з нежаданьнем надалей супрацоўнічаць з гэтай газетай.

***4 лютага*** журналіст газеты ***“Пагоня” Андрэй Пачобут*** быў выкліканы на допыт у Ленінскі РАУС г. Гародні. Падставай для гэтага сталі ягоныя артыкулы пра канфлікт у “Саюзе палякаў на Беларусі”. Раніцай журналіст даваў паказаньні сьледчаму Сяргею Савушкіну, які праводзіць расьсьледаваньне па справе падпалу машыны старшыні СПБ Тадэвуша Кручкоўскага. У прыватнасьці, сьледчы цікавіўся асабістымі адносінамі паміж журналістам і старшынёй СПБ і зьвярнуў увагу на паказаньні Тадэвуша Кручкоўскага, у якіх той абвінавáціў Андрэя Пачобута ў пагрозах. “Гэта поўная лухта. Я лічу, што такім спосабам Кручкоўскі спрабуе мне адпомсьціць за мае публікацыі пра сэксуальны скандал ва ўнівэрсітэце,” – сказаў Андрэй Пачобут. Старшыня СПБ Тадэвуш Кручкоўскі каментаваць сітуацыю катэгарычна адмовіўся. Справа ў тым, што студэнтка пятага курсу Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсітэту напісала заяву на імя рэктара Сяргея Маскевіча, у якой абвінавáціла Тадэвуша Кручкоўскага ў тым, што, выкарыстоўваючы службовае становішча, ён схіліў яе да сужыцьця.

***8 лютага*** сябры Гарадзенскай філіі ***ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”*** падалі на імя Гарадзенскага аблвыканкаму хадайніцтвы аб выдачы прадстаўнікам недзяржаўных СМІ пропускаў на мерапрыемствы ў аблвыканкаме, а таксама сьпіс журналістаў, якіх неабходна запрашаць на афіцыйныя прэс-канферэнцыі. Пастаяннае ігнараваньне прадстаўнікоў недзяржаўнай прэсы супрацоўнікамі ўпраўленьня ідэалагічнай работы Гарадзенскага аблвыканкаму стала асноўнай тэмай сустрэчы журналістаў з кіраўніком гэтага ўпраўленьня Уладзімірам Амелькам. Журналісты выказалі прэтэнзіі адносна таго, што цягам мінулага году фактычна ніводзін прадстаўнік незалежнага выданьня ня быў запрошаны на прэс-канферэн-

цыі, што ладзіліся з ініцыятывы альбо пры дапамозе ўпраўленьня ідэалагічнай работы аблвыканкаму. У. Амелька назваў гэты факт "нейкай накладкай" і даў указаньні сваім супрацоўнікам абавязкова выправіць сітуацыю. Узьнімалася і пытаньне доступу незалежных журналістаў у будынак аблвыканкаму, які цалкам перайшоў на сістэму электронных прапускоў для сваіх супрацоўнікаў, што яшчэ больш ускладніла праблему. Паводле У.Амелькі, яго ўпраўленьне аформіла пропускі толькі для журналістаў дзяржаўных выданьняў "Гродзенская праўда", "Вячэрні Гродна" і тэлерадыёкампаніі "Гродна". Удзельнікі сустрэчы прапанавалі выдаць падобныя пропускі тым прадстаўнікам недзяржаўных СМІ, якім для выкананьня сваіх прафесійных абавязкаў неабходна свабоднае наведваньне аблвыканкаму. Уладзімір Амелька запэўніў сабраных, што пастараецца дапамагчы па меры сваіх магчымасьцяў.

***8 лютага*** ў Магілёве на пашыранай калегіі абласнога ўпраўленьня ідэалагічных работнікаў намесьнік старшыні аблвыканкаму Анатоль Глаз выказаў незадаволенасьць працаю мясцовых дзяржаўных СМІ. У сваёй крытыцы ён грунтаваўся на паказьніках апошняй падпісной кампаніі, а таксама на выніках аналізу зьместу раённых перыядычных выданьняў. У якасьці прыкладу чыноўнік назваў газету Бабруйскага гарвыканкаму "Бабруйскае жыццё", якая ў першым квартале паменшыла падпіску на 100 асобнікаў і, па яго словах, "саступае дзьвюм недзяржаўным газетам па глыбіні і праблематычнасьці зьместу ". Анатоль Глаз абвінаваціў раённых журналістаў у ляноце і нятворчым падыходзе да працы, а таксама запатрабаваў павысіць актыўнасьць і дысцыпліну.

***9 лютага*** Шклоўская пашпартна-візавая служба адмовілася аформіць дазвол для часовага выезду за мяжу рэдактару недзяржаўнай газеты ***"Шклоўскія навіны" Аляксандру Шчарбаку***. Прычынай абмежаваньня выезду шклоўца за мяжу сталі прэтэнзіі падатковай інсьпекцыі. Як высьветлілася, размова ідзе пра працу Аляксандра Шчарбака ў прыватнай фірме пад назвай "Сідлер і К", якая займалася лесам. У 1996 годзе ён працаваў там выканаўчым дырэктарам, потым працадаўцы яго разьлічылі, і фірма неўзабаве была зьліквідаваная. У падатковай інсьпекцыі Шчарбаку паведамілі, што фірма вінаватая бюджэту 8 тысяч беларускіх рублёў. Гэтая запазычанасьць і стала афіцыйнай прычынай таго, што шклоўскі дэмакрат стаў невыязным. Сам Аляксандр Шчарбак ня мае сумневу ў сапраўдных прычынах пазбаўленьня яго права выезду за мяжу. Ён лічыць іх палітычнымі.

***10 лютага*** дзяржаўныя кнігарні адмовіліся браць на продаж незалежнае выданьне ***"Дзеяслоў"***. Галоўны рэдактар часопісу ***Барыс Пятровіч*** лічыць, што прычына, па якой прадпрыемства "Белкніга" скасавала дамову на продаж выданьня ў дзяржаўных кнігарнях, неабгрунтаваная: "Прычыны дзеля адмовы надуманыя, як мы лічым. Нас абвінавачваюць у

тым, што ў часопісе ёсьць публікацыі з нецэнзурнаю лексікай. І пры гэтым згадваецца шосты нумар. Можна паглядзець гэты нумар і пераканацца, што там прымаецца за нецэнзурную лексіку, — гэта слова, у якім толькі першая літара і тры кропачкі”. Барыс Пятровіч лічыць, што сапраўдная прычына забароны продажу ў дзяржаўных кнігарнях незалежнага выданьня палягае ў іншым: “Я думаю, што зьвязана гэта найперш з тым, што мы друкавалі апошнія творы Васіля Быкава: прыпавесьці, апавяданьні, аповесьць. Найперш гэта”.

З ***11 лютага*** газета ***“Прессбол”*** мусіць пачаць кампенсоўваць маральныя страты міністру фінансаў Мікалаю Корбуту, які паралельна ўзначальвае Беларускую асацыяцыю гімнастыкі. Разам газета і галоўны рэдактар павінны выплаціць чыноўніку 40 мільёнаў рублёў, альбо каля 20 тысячаў даляраў. Судовая калегія Менскага гарадзкога суда пакінула ў сіле ранейшае рашэньне суду Цэнтральнага раёну сталіцы. Галоўны рэдактар газеты “Прессбол” Уладзімір Бераждкоў выказвае заклапочанасьць будучыняй газеты і працоўнага калектыву. Ён не выключае, што газета вымушаная будзе спыніць існаваньне. Калі спачатку Мікалай Корбут казаў, што адсуджаныя ў “Прессбола” грошы пойдуць на патрэбы падшэфнага міністэрству калгасу, падчас апошніх судовых паседжаньняў ён заявіў, што сродкі яму патрэбныя на лячэньне.

***11 лютага*** падчас брыфінгу па выніках візіту ў Беларусь прадстаўнік АБСЕ па свабодзе СМІ ***Міклаш Харашці*** заявіў, што ў Беларусі існуюць сур’ёзныя праблемы: “За 14 гадоў незалежнасьці Беларусі ўмяшаньне дзяржавы ў дзейнасьць СМІ ня зьменшылася, а толькі працягвае ўзрастаць”.- Сярод асноўных праблемаў ён назваў недасканалае заканадаўства аб СМІ, якое мае “абмежавальны” характар. Беларусь сёньня – адзіная з 55 краін АБСЕ, дзе на практыцы чалавека могуць пасадзіць у турму за зьнявагу кіраўніка дзяржавы, — зазначыў М. Харашці. Недапушчальным лічыць М. Харашці права дзяржаўных чыноўнікаў прыпыняць дзейнасьць СМІ. Эксьперт АБСЕ перакананы, што выносіць такія рашэньні можа толькі суд, ён лічыць заганным тое, што ў Беларусі няма ніводнага недзяржаўнага вяшчальнага СМІ нацыянальнага маштабу. Тым ня менш, еўрапейскі эксьперт перакананы, што ўсе гэтыя і шмат якія іншыя праблемы можна вырашыць “на аснове супрацоўніцтва”.

***14 лютага*** Крычаўская раённая пракуратура вынесла афіцыйнае папярэджаньне ***Уладзіміру Кудраўцаву***, заснавальніку і рэдактару газеты ***“Вольны горад”*** (газета выдаецца больш за пяць гадоў накладам 299 асобнікаў, друкуецца ў Смаленску і бясплатна распаўсюджваецца ў Крычаўскім раёне). Спадар Кудраўцаў тлумачыць: “З выканкаму паступілі дакументы, у якіх да нашай газеты прэтэнзіі. Яны лічаць, што ў артыкулах ёсьць паклёп, абраза ў бок улады, “бацькі” нашага і нібыта заклік да рэва-

люцыі паводле Клімава". Рэдактар лічаць прэтэнзіі пракуратуры неабгрунтаванымі. Газета, па словах Уладзіміра Кудраўцава, крытыкуе ўлады, каб яны лепш працавалі, а таксама паведамляе чытачам пра розныя дэмакратычныя праекты і акцыі. Заснавальнік "Вольнага гораду" запэўніў, што газета будзе выходзіць далей і захавае свой стыль і сваю пазіцыю.

Да ***15 лютага*** ўсе юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія гандлююць перыядычнымі выданьнямі, павінныя падаць у раённыя і гарадзкія выканаўчыя камітэты для ўзгадненьня падрабязныя зьвесткі пра ўсе СМІ, якія яны прадаюць. Прадпісаньне ня тычыцца толькі ўнітарных прадпрыемстваў "Белсаюздрук" і "Белпошта". У прыватнасьці, пра гэта гаворыцца ў рашэньні Менскага аблвыканкаму ад 13-га сьнежня 2004 году. Паводле гэтага дакументу, прадпрымальнікі (арганізацыі), якія ажыцьцяўляюць раздробны гандаль перыёдыкай, павінныя падаць у ідэалагічны аддзел аблвыканкаму ня толькі падрабязныя зьвесткі пра сябе, але і адмысловы "дадатак да асартыментнага пераліку", указаўшы ў ім від, назву і тэматыку выданьня, дзяржаву яго рэгістрацыі, дату і нумар пасьведчаньня аб рэгістрацыі (і кім яно выдадзенае), дату і нумар дамовы на распаўсюд, а для замежных выданьняў (акрамя расейскіх) — дату і нумар дазволу Міністэрства інфармацыі на распаўсюд на тэрыторыі РБ. Прыкладна ў гэты ж час такія распараджэньні выпусьцілі структуры мясцовай вертыкалі ў іншых рэгіёнах. Юрысты БАЖ непакояцца, што гэта можа прывесьці да істотнага скарачэньня колькасьці распаўсюднікаў недзяржаўнай прэсы. Акрамя гэтага, некаторыя прадпрымальнікі і арганізацыі хвалююцца, што іх могуць абавязаць уключыць у асартыментны пералік "Советскую Белоруссию" і іншыя дзяржаўныя выданьні, якія былі ў ліку "абавязковых" падчас апошняй падпісной кампаніі.

***16 лютага*** на нарадзе, прысьвечанай працы рэспубліканскіх тэлеканалаў і перспектывам разьвіцьця тэлебачаньня ў Беларусі, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што, па ягоным меркаваньні, "важна ня проста данесьці да людзей навіну, але і растлумачыць, што за ёй стаіць". Сродкі масавай інфармацыі – ня толькі і ня столькі крыніца інфармацыі, яны павінныя весьці тлумачальную працу. Па словах Лукашэнкі, гэта набывае асаблівую актуальнасьць на фоне "масіраванай хлусьні" ў адносінах да нашай краіны. А. Лукашэнка лічыць, што ў апошні час назіраецца актывізацыя інфармацыйнага ціску на Беларусь як з Захаду, так і з Усходу. Па ягоным меркаваньні, гэты ціск будзе з кожным днём узмацняцца з нагоды набліжэньня палітычных падзеяў, а больш канкрэтна – палітычнай падзеі 2006 году. Прэзідэнт падкрэсьліў, што ў горшых традыцыях "халоднай вайны" адчыняюцца ўсё новыя праграмы "Голасу Амерыкі", Радыё "Свабода", якія вяшчаюць на Беларусь. Часта не адстаюць ад іх у перадузятасьці і агрэсіўнасьці антыбеларускія тэлеканалы суседніх краінаў, асабліва Расіі, — адзначыў Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы заявіў, што "праводзімая ў адносінах да нашай

краіны інфармацыйная вайна зьяўляецца прамым парушэньнем міжнароднага права". Ён лічыць, што "людзям трэба прама і сумленна пра гэта казаць. Паказваць, хто і чые інтарэсы адстойвае, хто чым жыве, якімі фінансавымі крыніцамі падпітваецца". Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што нашыя тэлеканалы прайграюць як па якасьці падачы матэрыялу, так і па своечасовасьці. Яны павінныя ўплываць на грамадзкую думку, фармаваць яе, а ня толькі распавядаць людзям пра падзеі, прычым не з пазіцыі апраўданьня. "Не апраўдвацца трэба, а даваць адпор усялякім інсінуацыям", — лічыць А. Лукашэнка. Па ягоных словах, у разьвіцьці айчыннага тэлебачаньня павінны быць ўчынены якасны прарыў. Ён лічыць, што адлікам гэтага новага кроку зьяўляецца стварэньне спадарожнікавага тэлебачаньня і новага міжнароднага каналу "Беларусь-ТВ". Лукашэнка заявіў, што ня ўмешваецца ў дзейнасьць СМІ, а "вельмі пільным чынам назірае за тым, як разьвіваюцца айчынныя сродкі масавай інфармацыі", паколькі гэта зьяўляецца "адным з прыярытэтаў яго працы". Ён выказаў жаданьне, каб айчынныя СМІ (перш за ўсё электронныя), "якія маюць сёньня найважнейшае значэньне ў сваім узьдзеяньні на розумы людзей, былі ня горш, чым у нашых суседзяў, і ўвогуле ў сьвеце".

***17 лютага ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"*** накіравала запыт міністру гандлю Аляксандру Кулічкову адносна новых правілаў, усталяваных некаторымі выканкамамі для прадаўцоў перыядычных выданьняў. Паводле пастановы Савету міністраў № 384 ад 7-га красавіка 2004 г. (якая зацьвердзіла новыя Правілы раздробнага гандлю асобнымі відамі тавараў), мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы павінныя ўзгадняць асартыментны пералік тавараў, што павінныя быць пастаянна ў продажы на гандлёвым аб'екце (так званы асартыментны мінімум). Аднак некаторыя аблвыканкамы, спасылаючыся на пастанову Саўміну, прадпісалі прадпрымальнікам (арганізацыям), якія гандлююць друкаванымі перыядычнымі выданьнямі, узгадняць з імі яшчэ і "прылажэньні" да асартыментнага пераліку з падрабязнымі зьвесткамі пра кожнае з выданьняў. У сувязі з гэтым БАЖ просіць міністра адказаць на пытаньні: – ці павінны прадпрымальнікі (арганізацыі) узгадняць з выканкамамі ўвесь асартымент тавараў альбо толькі асартыментны мінімум? – ці заснаваныя на новых "Правілах ажыцьцяўленьня раздробнага гандлю..." рашэньні аблвыканкамаў, якія абавязалі прадаўцоў перыядычных выданьняў прадастаўляць ім "прылажэньні" да асартыментнага пераліку з падрабязнай інфармацыяй пра кожнае выданьне?

***21 лютага*** Івацэвіцкі райспажыўсаюз адмовіўся ў лютым падпісаць з рэдакцыяй недзяржаўнага выданьня ***"Газета для вас"*** дамову на продаж у крамах гандлю і спажыўкааперацыі. Рэдактару газеты ***Лідзіі Цалуйка*** было заяўлена, што ніякай патрэбы прадаваць яе выданьне ў крамах спажыўкааперацыі няма, каб не ствараць канкурэнцыі афіцыйнай раён-

най газеце "Івацэвіцкі веснік". Як высьветліла Л.Цалуйка, забарона на падпісаньне дамовы зыходзіла ад намесьніка старшыні Івацэвіцкага райвыканкаму па ідэалагічнай працы Леаніда Скіндзера. Ён лічыць, што крамы гораду і раёну павінныя прадаваць толькі дзяржаўныя газеты, якія адлюстроўваюць афіцыйны пункт погляду на падзеі ў раёне. Рэдакцыі "Газеты для вас" таксама адмовілі ў распаўсюдзе праз сетку спажыўкааперацыі ў Бярозе, Пружанах і Драгічыне, дзе яе прадавалі ў якасьці рэгіянальнага выданьня.

***24 лютага*** скончыўся тэрмін прыпыненьня выхаду недзяржаўнай гарадзенскай газеты ***"Биржа информации"***. Але выданьне пакуль ня можа аднавіць выхад, паколькі гарадзенская абласная друкарня, з якой дагэтуль супрацоўнічала рэдакцыя, адмаўляецца падпісаць з ёй дамову на друк. Паводле рэдактара газеты А. Раўбецкай, адміністрацыя друкарні спасылаецца на тое, што ў прадпрыемства пакуль няма дырэктара, а ёсьць толькі выканаўца яго абавязкаў (дырэктара павінен у бліжэйшы час прызначыць Гарадзенскі аблвыканкам). А. Раўбецкая не выключае, што існуе негалосны загад аблвыканкаму не падпісваць дамовы з недзяржаўнай газетай. Санкцыі да выданьня былі ўжытыя за публікацыю, прысьвечаную рэферэндуму: Міністэрства інфармацыі палічыла, што ў артыкуле "Предательство именем народа" (№ 36 ад 9 верасьня 2004 г.) утрымліваліся "несапраўдныя зьвесткі, якія не адлюстроўваюць законнай падставы прызначанага… рэферэндуму, якія зьневажаюць гонар і годнасьць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь". За гэтую ж публікацыю А. Раўбецкая ўжо прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасьці па ч. 10 арт. 172-1 КоАП: 30-га верасьня 2004 году суд аштрафаваў яе на 70 базавых велічыняў.

***26 лютага*** на паседжаньні Гомельскага аблвыканкаму сярод іншых пытаньняў абмяркоўваліся вынікі выкананьня Дырэктывы №1 аб навядзеньні дысцыпліны і парадку ў капітальным будаўніцтве. Перад абмеркаваньнем да карэспандэнта Беларускай службы Радыё Свабода ***Казіміра Яноўскага*** падышоў прэс-сакратар аблвыканкаму Яўген Пабалавец і паведаміў, што яно адбудзецца ў адсутнасьць прэсы. На пытаньне журналіста, ці ведае прэс-сакратар пра тое, што тым самым парушае патрабаваньне Закону "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі", Я. Пабалавец адказаў станоўча. Таксама залу слуханьняў пакінулі карэспандэнт агенцтва "Інтэрфакс" Алена Альшанская і ўласны карэспандэнт газеты "Советская Белоруссия" Андрэй Новікаў.

***28 лютага*** КУП "Пінская рэгіянальная друкарня" чарговы раз адмовіла ў друку недзяржаўнай газеце ***"Мясцовы час"***. Рэдакцыя выданьня разьмяшчаецца ў Пінску, аднак друкавацца яно вымушанае за 160 км ў Баранавічах, што выклікае дадатковыя транспартныя выдаткі. Забарону на друк у Пінску аддаў былы кіраўнік пінскага гарвыканкаму В.Шуст. Пась-

ля яго сыходу з пасады рэдактар газеты Віктар Ярашук дамовіўся з дырэктарам КУП "Пінская рэгіянальная друкарня" Аляксандрам Пракопавым пра тое, што "Мясцовы час" будзе друкавацца ў Пінску. Але пасьля паездкі ў Міністэрства інфармацыі А.Пракопаў адмовіўся ад сваіх словаў.

***2 сакавіка*** начальнік упраўленьня электронных СМІ Міністэрства інфармацыі Беларусі Аляксандр Карачун паведаміў, што міністэрства ажыцьцяўляе жорсткі кантроль за выкананьнем FM-радыёстанцыямі творчых канцэпцыяў па насычэньні эфіру ў найбольш рэйтынгавы час айчыннай музыкай. Па ягоных словах, працягваецца маніторынг і кожнадзённы аналіз плэй-лістоў. Міністэрства інфармацыі заключыла дамову з Цэнтрам сацыялагічных і палітычных дасьледаваньняў БДУ пра рэгулярны маніторынг FM-эфіру. Праведзены сацыялагічнай службай маніторынг паказаў, што радыёстанцыямі **"Альфа Радыё"**, ***"Радыё Рокс"*** і ***"Пілот-FM"*** не выконваецца патрабаваньне пра 75-працэнтнае гучаньне беларускіх выканаўцаў у эфіры. Вынесеныя папярэджаньні шасьці FM-станцыям.

**3 сакавіка** унітарнае прадпрыемства «Прессбол плюс» — выдавец вядучай беларускай спартовай газеты ***«Прессбол»*** выплаціла 30 млн. рублёў па зыску міністра фінансаў, старшыні Беларускай асацыяцыі гімнастыкі Мікалая Корбута. Крыніцай сродкаў, па словах галоўнага рэдактара газеты У. Беражкова, сталі грошы чытачоў, якія падпісаліся на выданьне. Сам У. Беражкоў вінен міністру 10 млн. рублёў. Гэтыя грошы, хутчэй за ўсё, будуць вылічвацца з ягонага заробку.

***3 сакавіка*** рэдактар і выдавец газеты ***"Вольны час" Уладзімір Вярбовікаў*** быў выкліканы ў падатковую інсьпекцыю Савецкага раёну г.Гомелю. Дзяржаўны падатковы інсьпектар Алег Міpановіч паведаміў, што ён, як індывідуальны прадпрымальнік, які выдае газету, аштрафаваны за няўплату падатку на дададзеную вартасьць ў 2003 годзе на 500 тысячаў рублёў (230 даляраў ЗША). Выдавец спрабаваў давесьці, што газета не выдаецца ўжо на працягу паўтара гадоў з-за адсутнасьці сродкаў, на што падаткавы інсьпектар зазначыў, што мог бы аштрафаваць і на 1,5 мільёны рублёў.

***4 сакавіка*** журналіст ***Андрэй Пачобут***, затрыманы падчас акцыі пратэсту прадпрымальнікаў у г. Гародні, арыштаваны на 10 сутак. Суд Ленінскага раёну г. Гародні прызнаў яго вінаватым у парушэньні арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

***4 сакавіка*** на Інтэрнэт-сайце Міністэрства інфармацыі ўказана, што ў структуры міністэрства створанае новае ўпраўленьне, якое будзе рэгуляваць распаўсюд інфармацыі электроннымі СМІ – тэлеканаламі, а таксама

радыёстанцыямі ўсіх формаў уласнасьці. Куратарам упраўленьня прызначаны намесьнік міністра інфармацыі Сяргей Булацкі.

***5 сакавіка*** беларускія друкарні адмовіліся друкаваць новы нумар гарадзенскай незалежнай газеты ***"Биржа информации"***. Гэта адбылося пасьля заканчэньня 3-месячнага тэрміну, на які выданьне газеты прыпыніла Міністэрства інфармацыі. Паводле галоўнага рэдактара ***Алены Раўбецкай***, адзін сталічны чыноўнік ёй паведаміў, што "Биржа информации" трапіла ў "чорны сьпіс", і дзяржаўныя друкарні для яе сталі недаступныя. Друкавацца за мяжой рэдакцыя ня лічыць для сябе магчымым з фінансавых прычынаў. А па-другое, гаворыць Алена Раўбецкая, тады "газета ператвараецца не ў нармальны бізнэс, а ў палітычную акцыю". Таму рэдакцыя прыняла рашэньне прыпыніць выпуск газеты, скараціць максімальна свае выдаткі і пакуль рабіць Інтэрнэт-вэрсію.

***9 сакавіка*** на Праўленьні *ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"* была прынятая заява, у якой выказваецца пратэст у сувязі з адміністрацыйным арыштам сябра арганізацыі, журналіста інтэрнэт-выданьня ***"Пагоня"*** і газеты ***"День" Андрэя Пачобута***. 4 сакавіка суд Ленінскага раёну г. Гародні прызнаў А. Пачобута вінаватым у парушэньні, прадугледжаным арт. 167.1 КаАП РБ. Журналіста абвінавацілі за ягоную прысутнасьць на мітынгу прадпрымальнікаў, які адбыўся ў Гародні напярэдадні. Між тым, журналіст не зьяўляецца арганізатарам гэтага масавага мерапрыемства, а выконваў падчас яго свае прафісійныя абавязкі.

***11 сакавіка*** фотакарэспандэнт ***"Нашай Нівы" Юлія Дарашкевіч*** падала скаргі ў гарадзенскую абласную пракуратуру і начальніку Ленінскага РАУС. Яна скардзіцца на супрацоўнікаў АМАПу, якія затрымалі яе падчас мітынгу прадпрымальнікаў 10 сакавіка ў Гародні. Падчас мітынгу Ю.Дарашкевіч рабіла здымкі, калі яе схапілі два ўзброеныя гумовымі дубінкамі супрацоўнікі АМАП з маскамі на тварах і ў шлемах і павялі да мікрааўтобусу з арыштаванымі прадпрымальнікамі. Журналістка мела пасьведчаньне-бэдж, замацаваны на верхняй вопратцы, і адразу паведаміла АМАПаўцам пра свой прафесійны статус. Аднак яны адвялі журналістку на прыцілеглы ад масавай акцыі бок плошчы Леніна і адпусьцілі, пагражаючы фізічным пакараньнем, калі яна ізноў зьявіцца каля прадпрымальнікаў. У пададзенай скарзе Ю. Дарашкевіч сьцьвярджае, што супрацоўнікі міліцыі перашкодзілі ёй ў выкананьні прафесійных абавязкаў і патрабуе прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

***11 сакавіка*** ў Гародні зачынены інтэрнэт-форум, разьмешчаны па адрасе ***forum.grodno.by.*** Рэсурс разьмяшчаўся на вэб-сайце гарадзенскага аддзяленьня РА "Белтэлекам" і меў папулярнасьць карыстальнікаў Інтэрнэту гораду: яго штодня праглядалі 2000 унікальных наведнікаў. Кіраўніц-

тва “Белтэлекаму” прапанавала адміністратару аддзелу “Гарадзенскі форум” Аляксею Радсу звольніцца з пасады па ўласным жаданьні. Прычынай прапанаванага звальненьня Аляксей Радс лічыць адзін з раздзелаў “Гарадзенскага форуму”, які прысьвечаны паўторным выбарам у парламент па Гарадзенскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе №52, а таксама тэмы “Аб Еўропе і РБ”, “Наш прэзідэнт. Хто ён?”, “О пропаганде как таковой”, “Жалезная заслона” ды іншыя.

***11 сакавіка*** на паседжаньні Івацэвіцкага райвыканкаму старшыня Віталь Дзьмітраніца адкрыта даваў указаньні начальніку падатковай інсьпекцыі “разабрацца” з недзяржаўным выданьнем ***“Газета для вас”***, рэдакцыя якога разьмешчаная ў Івацэвічах. На той жа нарадзе намесьнік старшыні выканкаму па ідэалогіі Леанід Скіндзер настойваў, каб кіраўнік раённага камбінату бытавога абслугоўваньня разарвала з рэдакцыяй недзяржаўнага выданьня дамову на арэнду памяшканьня, якая дзейнічае да кастрычніка 2005 году. Але выканаць грозныя распараджэньні не пасьпелі, паколькі ў няміласьць да ўладаў патрапіў сам старшыня райвыканкаму. 13 сакавіка ён быў затрыманы па падазрэньні ў атрыманьні хабару ад мясцовага прадпрымальніка памерам 5 тысячаў даляраў.

***11 сакавіка*** па распараджэньні старшыні Ваўкавыскага райвыканкаму Міхаіла Савельева на тэрыторыі гораду і раёну спынены продаж ***“Местной газеты”***. Каб высьветліць сітуацыю, галоўны рэдактар выданьня А.Шантаровіч пайшоў на прыём да старшыні райвыканкаму. Ён не пачуў адказу на пытаньне, ці быў аддадзены загад на забарону продажу газеты. Выкліканая на размову прадстаўніца гандлёвага аддзелу райвыканкаму адсутнасьць у продажы ў крамах “Местной газеты” патлумачыла статутамі крамаў, якія самі прымаюць рашэньне, маўляў, газета мае непрыемны пах друкарскай фарбы. На гэты час “Местную газету” ў Ваўкавыску прадаюць шапікі “Белсаюздруку” і прадпрымальнікі-распаўсюднікі. 11 і 12 сакавіка ў Ваўкавыску на рынку былі затрыманыя некалькі распаўсюднікаў, нягледзячы на тое, што ўсе іх дакументы былі ў парадку. У іх супрацоўнікі міліцыі праверылі дакументы на продаж выданьня.

***14 сакавіка*** старшыня ***ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” Ж.Літвіна*** і сябра праўленьня арганізацыі ***М.Пастухоў*** накіравалі адкрыты ліст міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь У.В.Русакевічу, у якім выказалі заклапочанасьць сітуацыяй вакол гарадзенскай газеты ***“Биржа информации”***. Выданьне па заканчэньні трох месяцаў прыпыненьня ня можа аднавіць выхад, паколькі ўсе беларускія друкарні адмовіліся з ім супрацоўнічаць. “Вы, Уладзімір Васільевіч, як міністр інфармацыі павінны “хварэць” за лёс кожнай беларускай газеты. Ці не час ад “крутых” мераў перайсьці да практыкі спагады і супрацоўніцтва з усімі беларускімі журналістамі і выдаўцамі, а не падзяляць іх на “сваіх” і “чужых”? Ад вырашэньня

гэтай задачы выйграюць тысячы беларускіх чытачоў, грамадзтва цалкам, а ў выніку, і дзяржава".

***14 сакавіка*** міжнародная арганізацыя па абароне правоў журналістаў ***"Рэпарцёры бяз межаў"*** выказала абурэньне ў сувязі з адміністрацыйным арыштам яе сябра – гарадзенскага журналіста інфармацыйнага Інтэрнэт-сайту pahonia.promedia.by ***Андрэя Пачобута***, які 4 сакавіка судом Ленінскага раёну Гародні быў прызнаны вінаватым у парушэньні, прадугледжаным арт. 167.1 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях і асуджаны на 10 сутак адміністрацыйнага арышту.

***14 сакавіка*** працягвалася абмеркаваньне праекту закону аб асноўных накірунках унутранай і зьнешняй палітыкі Беларусі. У Савеце Рэспублікі адбылося паседжаньне навукова-кансультацыйнай рады пры пастаяннай камісіі па міжнародных справах. Журналістам на ім не дазволілі прысутнічаць. На пачатку гэтага паседжаньня журналістам дазволілі выслухаць меркаваньне толькі аднаго эксьперта – намесьніка старшыні КДБ Пятра Трацьцяка. Ён сказаў, што ягонае ведамства лічыць неабходным унесьці некаторыя рэдакцыйныя праўкі і ўдакладніць шэраг юрыдычных нормаў. Пасьля гэтага журналістаў папрасілі пакінуць памяшканьне.

***14 сакавіка*** ў Нью-Ёрку міжнародная арганізацыя ***"Камітэт па абароне журналістаў"*** прадставіла штогадовы даклад "Перасьлед СМІ ў 2004 годзе", у якім сьцьвярджаецца, што беларускія ўлады фактычна зьнішчылі незалежную прэсу. Адзначаецца таксама, што пракуратура, падатковыя і іншыя дзяржаўныя органы "разгарнулі кампанію перасьледу і запалохваньня журналістаў, дзячоў апазіцыі і сяброў праваабарончых арганізацыяў, якія крытыкавалі Лукашэнку ягоную рэпрэсіўную палітыку", а мясцовыя СМІ ў Беларусі "па сутнасьці выконваюць прапагандысцкія функцыі".

***16 сакавіка*** актывістка АГП ***Алена Залеская*** адстаяла права на распаўсюд незалежнай прэсы. Адміністрацыйная камісія Кастрычніцкага раёну Віцебску вярталася да разгляду справы яе затрыманьня 17 студзеня за распаўсюд газеты ***"Время"*** тройчы. Разьбіральніцтва па гэтым факце доўжылася амаль два месяцы. Гэтым разам было прынятае канчатковае рашэньне: распаўсюд законным чынам выдадзеных газет і ўлётак не зьяўляецца правапарушэньнем.

***16 сакавіка*** рэдактар ваўкавыскай ***"Местной газеты" Андрэй Шантаровіч*** быў на прыёме ў старшыні райвыканкаму Міхаіла Савельева і запытаўся, чаму аддадзенае распараджэньне аб забароне продажу газеты. Спадар Савельеў спаслаўся на парушэньне санітарных нормаў: маўляў, побач з прадуктамі не павінны прадавацца газеты, што ўтрымліваюць

друкарскую фарбу. 17 сакавіка Андрэй Шантаровіч даведаўся, што вертыкальшчык аддаў вуснае распараджэньне кіраўніцтву раённай міліцыі і дзяржаўтаінсьпекцыі не даваць інфармацыі незалежнаму выданьню.

***18 сакавіка*** ў школы Глыбоччыны накіраваны ліст, падпісаны начальнікам аддзелу адукацыі Глыбоцкага райвыканкаму Р.Тарасевічам. Чыноўнік просіць да 20 сакавіка 2005 году арганізаваць сярод настаўнікаў індывідуальную падпіску на дзяржаўныя перыядычныя выданьні. Сярод рэкамендаваных выданьняў — цэнтральныя газеты "Советская Белоруссия", "Народная газета", "Рэспубліка", "Звязда", "Знамя юности" ды іншыя, абласныя – "Віцебскі рабочы", "Народное слово" і раённая "Веснік Глыбоччыны". Адметна, што кожны настаўнік мусіць падпісацца ня менш як на 3 газеты.

***18 сакавіка*** ў віцебскім "Аблкнігагандлі" адмовіліся ўзяць на рэалізацыю нумары часопісу ***"ARCHE"***, якія напярэдадні адмыслова замаўлялі паводле запытаў з кнігарняў. Як кажа віцебскі распаўсюднік "ARCHE" ***Віктар Сьцяпанаў***, у Віцебску попытам карысталіся ня толькі сьвежыя, але і ранейшыя нумары выданьня, якія "Аблкнігагандаль" перыядычна прасіў прывезьці з Менску. У тым ліку быў замоўлены і вядомы чацьвёрты нумар часопіса за 2004 год, які чытачы назвалі "лукашэнкаўскім", і з якога пачаліся праблемы з рэалізацыяй у менскіх кнігарнях. Віцебскія таваразнаўцы сказалі, што болей гэтага часопісу браць ня будуць, спаслаўшыся на тое, што кнігарні вобласьці і так перапоўненыя.

***20 сакавіка*** адбыліся паўторныя выбары ў 52-й Гарадзенскай-Цэнтральнай акрузе. Трох польскіх журналістаў — ***Міхала Кацэвіча*** і ***Адама Тухліньскага*** з польскага выданьня ***"Newsweek"*** і ***Марціна Сьмялоўскага*** з тэлеканалу ***"Polsat"*** на выбарчых участках 38 і 39, што знаходзяцца ў адным месцы — у 3-й школе, затрымалі амапаўцы пры спробе запісаць на відэа, як адбываецца падлік галасоў. Пры гэтым прадстаўнікі ўладаў сьцьвярджалі што ў палякаў нібыта несапраўдныя акрэдытацыйныя карткі, а зроблены відэазапіс зьнішчылі. Марцін Сьмялоўскі распавёў: "Нас пасадзілі ў дзьве машыны разам з амапаўцамі і адвезьлі ў РУУС. Там напачатку пагражалі, што ўчыняць нам асабістую праверку, што адбяруць апаратуру, каб праверыць, што мы там зьнялі і сфатаграфавалі. Але мы сказалі, што бяз польскага консула мы ім нічога не дадзім і ня будзем з імі размаўляць." Калі прыехаў польскі консул Якубік, журналісты далі міліцыянтам тлумачэньні. Высьветлілася, што акрэдытацыйныя карткі ў затрыманых сапраўдныя. Міліцыянты адпусьцілі польскіх журналістаў пасьля 11 гадзінаў вечара — праз тры гадзіны пасьля затрыманьня. Між іншым, Марціна Сьмялоўскага пакаралі за тое, што ён пакінуў у гатэлі свой пашпарт, склаўшы пратакол паводле 185 артыкулу Адміністрацыйнага кодэксу за парушэньне правілаў знаходжаньня на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і вынесьлі папярэджаньне.

***21 сакавіка*** намесьнік старшыні Івацэвіцкага райвыканкаму па ідэалагічнай працы Леанід Скіндзер у размове з галоўным рэдактарам недзяржаўнай ***"Газеты для вас" Лідзіяй Цалуйка*** выказаў пажаданьне, каб гэтае выданьне ўвогуле нічога не пісала пра Івацэвіцкі раён. Ён параіў рэгіянальнаму выданьню пісаць пра іншыя суседнія раёны, але не пра Івацэвіцкі, дзе разьмешчаная рэдакцыя выданьня. Па словах Л.Скіндзера, газетныя публікацыі асабліва крытычнага зьместу адмоўна ўплываюць на аўтарытэт мясцовай улады і нібыта ўводзяць мясцовае насельніцтва ў зман наконт палітыкі ды ідэалагічнай работы, якая праводзіцца ў раёне. Як мяркуе Л.Скіндзер, грамадзкую думку павінная фармаваць толькі дзяржаўная газета, падпарадкаваная райвыканкаму.

***22 сакавіка*** ў галоўнага рэдактара газеты ***"Прессбол"*** У.Бяражкова апісалі маёмасьць з мэтаю спагнаньня 10 млн.рублёў на карысьць міністра фінансаў Беларусі Мікалая Корбута. Сярод апісанага — электрачайнік, шафа, пыласос, пральная машына і г.д. Жонка Бяражкова зьвярнулася з зыскам у суд — яна просіць выключыць з пераліку апісанага палову маёмасьці, спасылаючыся на заканадаўства, паводле якога палова нажытай у шлюбе маёмасьці належыць ёй і не падлягае апісаньню.

***24 сакавіка*** міліцыя затрымала намесьніка старшыні Партыі БНФ ***Аляксея Янукевіча,*** які раздаваў студэнтам Беларускага дзяржаўнага эканамічнага унівэрсітэту бюлетэнь ***"Дзень волі",*** прысьвечаны ўгодкам абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі 25 сакавіка 1918 году. Аляксей Янукевіч дастаўлены ў РУУС Заводзкага раёну г. Менску.

***24 сакавіка*** супрацоўнікі КДБ і міліцыі правяліператрус у рэдакцыі газеты ***"Згода"***. Яны апячаталі і вынесьлі кампутары. Праца газеты паралізаваная. Рэдактар газеты ***Аляксей Кароль*** дзеяньні ўладаў называе мэтанакіраванай палітыкай перад прэзідэнцкай кампаніяй.

***24 сакавіка*** ў раёне гандлёвага цэнтру "Імпульс" у Менску за раздачу бюлетэня ***"Дзень волі"*** міліцыяй быў затрыманы непаўнагадовы навучэнец Беларускага гуманітарнага ліцэю ***Франак Вячорка***. Затрыманы дастаўлены ў РУУС Савецкага раёну.

***24 сакавіка*** рэдактара крычаўскай недзяржаўнай газеты ***"Вольны горад" Сяргея Няроўнага*** выклікалі ў раённую пракуратуру. Там яму паказалі ўлётку з ягоным партрэтам і заклікам да крычаўцаў падтрымаць рэвалюцыю Андрэя Клімава і прыехаць 25 сакавіка ў Менск. Гэтую ўлётку, паводле інфармацыі Сяргея Няроўнага, даслалі ў пракуратуру з Крычаўскага райвыканкаму. Газета "Вольны горад" друкавала матэрыялы пра Андрэя Клімава і распавядала чытачам пра ягоныя ідэі. А вось улётку, катэгарычна заявіў Сяргея Няроўны, ён бачыць упершыню і ніякага дачынень-

ня да яе не мае. Ён назваў гэта "правакацыяй уладаў" і заклікаў крычаўскую пракуратуру разабрацца ў сітуацыі.

***24 сакавіка*** ў Менску ў раёне станцыі метро "Пушкінская" супрацоўнікамі міліцыі затрыманыя чатыры чалавекі, якія раздавалі бюлетэнь "***Дзень волі"***, прымеркаваны чарговым угодкам абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Сярод затрыманых — актывіст Партыі БНФ ***Юрась Карэтнікаў***. Затрыманыя дастаўленыя ў РУУС Фрунзенскага раёну.

***25 сакавіка*** падчас раздачы бюлетэню ***"Дзень волі"*** на станцыі метро "Усход" у Менску быў затрыманы старшыня Менскай абласной арганізацыі ГА БНФ "Адраджэньне" ***Аляксей Казлоўскі***. На затыманага быў складзены пратакол па арт.172 п.3 КаАП РБ, пасьля чаго ён быў адпушчаны. Разгляд справы А. Казлоўскага быў прызначаны на 28 сакавіка, але яна была адкладзеная на нявызначаны тэрмін.

***25 сакавіка*** стала вядома, што кантроль за распаўсюдам перыядычных выданьняў у Берасьці будзе ўзмоцнены. Пра гэта ішла гаворка падчас паседжаньня Берасьцейскага аблвыканкаму, на якім разглядалася пытаньне "Аб сістэме інфармацыйнага забесьпячэньня насельніцтва і мерах па ўпарадкаваньні розьнічнай сеткі па распаўсюдзе перыядычных выданьняў на тэрыторыі гораду". Як паведаміла начальнік ідэалагічнага аддзелу гарвыканкаму Зоя Ільюшонак, "не ўсе суб'екты гаспадараньня, якія гандлююць перыядычнымі выданьнямі, захоўваюць асартыментны пералік". У прыватнасьці, гэта тычыцца рэалізацыі недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. У выпадку ігнараваньня гэтых патрабаваньняў гарвыканкаму будзе прапанавана пазбавіць індывідуальных прадпрымальнікаў, што займаюцца такой дзейнасьцю, дазволу на продаж перыядычных выданьняў.

***1 красавіка*** кіраўнік Менскага офісу АБСЕ ***Эберхард Хайкен*** наведаў калектыў недзяржаўнага тыднёвіка ***"Згода"***, які пацярпеў ад дзеяньняў уладаў. Спадар Хайкен выказаў словы падтрымкі і салідарнасьці прадстаўнікам незалежных СМІ Беларусі. Нагодай да візыту спадара Хайкена ў калектыў газеты "Згода" стала канфіскацыя міліцыяй кампутараў гэтага выданьня, а таксама ліст супрацоўніцы рэдакцыі Наталі Валакіды ў офіс АБСЕ пра тое, як менскія амапаўцы зьбівалі яе падчас акцыі апазіцыі на Кастрычніцкай плошчы Менску 25 сакавіка. Гэты ліст спадар Хайкен перадаў у венскі офіс упаўнаважанага АБСЕ ў пытаньнях свабоды СМІ Міклаша Харашці. Самой Наталі спадар Хайкен выказаў падтрымку і спачуваньне ў сувязі з тым, што яна стала "ахвярай гвалту з боку ўладаў".

***1 красавіка*** журналістцы недзяржаўнай газеты ***"Intex-press"*** (Баранавічы) ***Аксане Лянько*** адмовіліся прадставіць зьвесткі аб рэалізацыі "Праграмы рАМАПту балконаў" начальнік ЖРЭУ Л.Астапчык і намесьнік началь-

ніка гэтай жа арганізацыі В.Кудласевіч. Журналістцы патлумачылі, што падставай для атрыманьня інфармацыі можа быць толькі пісьмовы запыт на імя кіраўніка арганізацыі. У той жа дзень начальнік упраўленьня адукацыі Баранавіцкага гарвыканкаму І.Стасевіч адмовіўся паведаміць журналісту “Intex-press” А.Чарненку вынікі праверкі трох спартыўных школ гораду, якія знаходзяцца ў кіраваньні ўпраўленьня. Чыноўнік спаслаўся на тое, што гэтыя зьвесткі зьяўляюцца ўнутранай інфармацыяй упраўленьня адукацыі і не падлягаюць апублікаваньню ў газеце.

***8 красавіка*** Еўрапейская федэрацыя журналістаў (EFJ) падчас штогадовай сустрэчы ў Більбао (Іспанія) прыняла адмысловую дэкларацыю па сітуацыі з мас-медыя ў Беларусі, у якой выказваюць вялікую занепакоенасьць сур’ёзным пагаршэньнем сітуацыі напрацягу апошніх некалькіх гадоў і асабліва пасьля парламенцкіх выбараў і рэферэндуму 2004 году. Аўтары дакументу нагадваюць пра імклівае закрыцьцё шэрагу незалежных выданьняў, а таксама пра шматлікія прыпыненьні і папярэджаньні, вынесеныя Міністэрствам інфармацыі. Апісваючы агульную сітуацыю з мас-медыя ў нашай краіне, яны адзначаюць дамінаваньне падкантрольных дзяржаве СМІ на медыя-рынку; крымінальны перасьлед журналістаў па абвінавачаньні ў зьнявазе кіраўніка дзяржавы; заканадаўства аб СМІ, якое дае шырокія кантрольныя паўнамоцтвы ўладным структурам і пасьля прыняцьця паправак абяцае стаць яшчэ больш рэпрэсіўным. “EFJ рашуча падтрымлівае сьмелую барацьбу за свабоду выказваньня і змаганьне за незалежную журналістыку, якое вядуць нашыя калегі з недзяржаўных медыяў і Беларускай асацыяцыі журналістаў”, — гаворыцца ў дэкларацыі.

***8 красавіка*** выйшаў чарговы нумар ***“Згоды”***. Па словах галоўнага рэдактара і выдаўца газеты ***Аляксея Караля***, гэта сталася магчымым толькі дзякуючы журналісцкай салідарнасьці, бо канфісакавныя 24 сакавіка кампутары і аргтэхніку дагэтуль не вярнулі. Тады ў рэдакцыі зьявіліся супрацоўнікі праваахоўных органаў і бяз санкцыі пракурора, без складаньня пратаколу канфіскавалі кампутары і аргтэхніку, нават тую, якую газеце давала ў арэнду амерыканская амбасада. Міліцыянты патлумачылі, што быццам бы нехта невядомы патэлефанаваў і паведаміў, што у рэдакцыі друкавалі ўлёткі, якія падрываюць аўтарытэт дзяржаўнай улады. Штодня Аляксей Кароль вядзе перамовы з міліцыяй Партызанскага раёну і пракуратурай: “Ніякіх дакладных адказаў я не атрымаў. Нейкія намёкі, што нешта яны яшчэ шукаюць. Што і як – я ня ведаю. Таму абвінавачаньне, якое вылучалася раней, па якім яны канфіскавалі тэхніку, ня можа быць пацьверджанае. Ніякіх улётак мы не выпускалі. Двойчы зьвязваўся з пракуратурай, заява ляжыць, яны па ёй яшчэ працуюць. Але адказу па ёй яшчэ няма. Вусна яны кажуць, што сапраўды ёсьць парушэньне, што не было санкцыі пракурора, што павінен быць выдадзены мне дакумент, які б сьцьвярджаў, што кампутары забраныя, арыштаваныя, ці як гэта тлума-

чыць, я ня ведаю. Тым ня менш, пакуль што тэхніка там". Пракуратурай парушаны 10-дзённы тэрмін адказу на скаргу: прайшло ўжо 18 дзён. Цяпер спадар Кароль зноў зьбіраецца ў пракуратуру за адказам.

***10 красавіка*** з ведамаснай падпіскі выключылі недзяржаўныя выданьні. Ідэалагічны аддзел Барысаўскага гарвыканкаму на пачатку красавіка распаўсюдзіў сярод прадпрыемстваў і арганізацыяў гораду ліст, у якім забараняе весьці ведамасную падпіску на мясцовыя недзяржаўныя выданьні ***"Курьер из Борисова"*** і ***"Борисовские новости"***. На асобных прадпрыемствах, у прыватнасьці, на Барысаўскім шпалапрапітным заводзе, адміністрацыя запатрабавала ад арганізатараў падпіскі кампенсаваць выдаткі на падпіску недзяржаўных выданьняў з уласных сродкаў.

***11 красавіка*** суд Кастрычніцкага р-ну Менску пад старшынствам судзьдзі Ганны Булаш спагнаў 50 мільёнаў рублёў з ***"Белорусской деловой газеты"*** і 10 мільёнаў з журналісткі ***Ірыны Халіп*** на карысьць Аркадзя Мара. Замежны журналіст, пра якога пісала Ірына Халіп у артыкуле "У Аклахоме не даведаюцца пра Лукашэнку", прасіў суд спагнаць з аўтаркі і газеты мільён даляраў. Але суд гонар і годнасьць Аркадзя Мара ацаніў у 28 000 даляраў. Гэтай сумы дастаткова, каб зачыніць газету. Самога Аркадзя Мара ў судзе Кастрычніцкага раёну Менску не было, ягоныя інтарэсы прадстаўляла адвакат з Фрунзенскай калегіі. Яна прынесла з сабой два нумары "Рускай Америки", патлумачыўшы, што такая газета існуе. Адвакат у судзе выказалася і наконт вялікай сумы зыску — 1 мільён даляраў. Яна спаслалася на тыя абставіны, што яе давернік зьяўляецца грамадзянінам ЗША, а там такія сумы зьяўляюцца нормай у судовай практыцы. Аўтарка артыкулу Ірына Халіп у судзе даводзіла, што газета, якую выдае Мар, не зьяўляецца масавай і ўплывовай, і што аўтар інтэрвію з Лукашэнкам атрымаў не матэрыяльнае ўзнагароджаньне, а бясплатную рэкламу. Ірына Халіп свой артыкул прысьвяціла персоне Аркадзя Мара і ягоным стасункам з першымі асобамі ў постсавецкіх краінах. У публікацыі Халіп надала журналісту характарыстыку авантурыста. Ірына Халіп упэўненая ў тым, што судовае разьбіральніцтва насамрэч спатрэбілася выключна дзеля таго, каб спыніць дзейнасьць незалежнай газеты. Галоўны рэдактар Пётра Марцаў паведаміў, што газету неаднойчы намагаліся зьнішчыць, але, на ягоную думку, каб зьнішчыць брэнд "БДГ", трэба спачатку зьнішчыць яе аўдыторыю, сярод якой дзяржаўныя чыноўнікі, у тым ліку з адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі: "Безумоўна, тут мае месца абарона гонару мундзіру. Людзі, якія рэкамендавалі прэзідэнту такую піяракцыю, намагаюцца абараніць свой гонар. Я ня ведаю, ці сам Праляскоўскі знайшоў гэтага пісьменьніка, але, як галоўны па ідэалогіі, мусіў зацьвердзіць гэтую акцыю. Цяпер яны намагаюцца рабіць добрую міну пры кепскай гульні. Ніхто дрэнна пра Мара ня думае. У кожнага чалавека свой хлеб. А тут прадставіўся такі выпадак. Ён казаў, што ў яго ўплывовая і

вялікая газета. Людзі з адміністрацыі насамрэч і аказалі прэзідэнту мядзьведжую паслугу. Цяпер зручны момант, каб расправіцца з нашай газетай. Гэтая сума, як і для кожнай незалежнай газеты, даволі вялікая. Але газету зачыняй-не зачыняй, яна ўсё роўна будзе выходзіць". Рэдакцыя "БДГ" будзе абскарджваць судовае рашэньне ў вышэйшых інстанцыях.

***13-15 красавіка*** Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньні рэдакцыям недзяржаўных газетаў ***"Народная воля"***, ***"Борисовские новости"*** і ***"Вольнае Глыбокае"***. Папярэджаньне "Народнай волі" датаванае 13 красавіка і падпісанае міністрам інфармацыі Уладзімірам Русакевічам. Падставай для яго вынясеньня сталі 2 публікацыі, што зьявіліся ў сакавіку 2005 г. Першы артыкул быў надрукаваны 3 сакавіка і называўся "Виртуальная война внучки с бабушкой". Мінінфармацыі палічыла, што аўтар (А. Сівы) апублікаваў не завершаныя вытворчасьцю матэрыялы судовай справы без пісьмовага дазволу судзьдзі. 31 сакавіка ў газеце было апублікаванае "Обращение к воинам-интернационалистам» лідэра руху ім. Юрыя Захаранкі «Защитники Отечества» А. Волчака. Мінінфармацыі палічыла гэта распаўсюдам інфармацыі ад імя незарэгістраванага аб'яднаньня. Такім чынам, на думку рэгіструючага органу, рэдакцыя двойчы парушыла ы арт. 5 Закону "Аб друку і іншых СМІ". Недзяржаўная газета "Борисовские новости", па меркаваньні Мінінфармацыі, парушыла некалькі артыкулаў заканадаўства аб СМІ. Выданьне абвінавачваюць у тым, што яно не паведаміла пісьмова міністэрству пра зьмену тэрыторыі распаўсюду (арт. 11), публікавала рэкламныя абвесткі без пацьверджаньня права рэкламадаўцы на ажыцьцяўленьне ліцэнзійнай дзейнасьці (арт 30) і мела памылкі ў выходных дадзеных газеты ды выкарыстоўвала нестандартныя шрыфты (арт. 26). Папярэджаньне рэдакцыі было вынесенае 15 красавіка і падпісанае першай намесьніцай міністра інфармацыі Ліліяй Ананіч. Практычна на тых жа прэтэнзіях грунтавалася папярэджаньне заснавальніку рэдакцыі газеты «Вольнае Глыбокае» (вынесенае 15-га красавіка). Выданьне абвінавачанае ў зьмене мовы выданьня на рускую і беларускую (замест беларускай) без інфармаваньня рэгіструючага органу; публікацыя рэкламных абвестак аб ліцэнзаваных відах дзейнасьці без указаньня нумару ліцэнзіі, а таксама парушэньні ў выходных дадзеных выданьня.

***14 красавіка*** ў рэдакцыю газеты ***"Живая вода"*** (заснавальнік – Дзяржаўны канцэрн "Белмеліяводгас"), якая выдаецца ў Пінску, прыбыў супрацоўнік Пінскага рэгіянальнага камітэту Дзяржкантролю і азнаёміў галоўнага рэдактара выданьня Валянціну Наварыч з распараджэньнем Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гаворка ў дакуменце ішла пра тое, што рэдакцыі газетаў, чыімі заснавальнікамі выступаюць дзяржаўныя ўстановы і арганізацыі, не павінныя мець сярод сваіх заснавальнікаў прыватных асобаў, індывідуальных прадпрымальнікаў і бізнэсоўцаў з удзелам замежнага капіталу. Згаданы дакумент рэдактару не пакінулі. Па просьбе

супрацоўніка Дзяржкантролю, В.Наварыч падпісалася пад тым, што ня будзе прыцягваць для выданьня газеты азначаных асобаў і карыстацца замежнай спонсарскай дапамогай. Таксама рэдактар газеты паведаміла кароткія зьвесткі пра сваё выданьне з пазнакаю даты рэгістрацыі, перыядычнасьці выхаду, тэматыкі ды пацьвердзіла, што ні ў якіх іншых друкарнях, акрамя як у КУП "Пінская рэгіянальная друкарня", падпарадкаванай Берасьцейскаму аблвыканкаму, яе газета друкавацца ня будзе.

***14 красавіка*** міжнародная арганізацыя ***"Рэпарцёры бяз межаў"*** распаўсюдзіла заяву наконт рашэньня Менскага суда, які пакараў штрафам журналістку ***Ірыну Халіп*** і рэдакцыю ***"Белорусской деловой газеты"***. "Скандальнай пародыяй на правасудзьдзе" – названае гэтае рашэньне." Рэпарцёры бяз межаў" адзначаюць, што штраф, накладзены на журналістку і рэдакцыю "БДГ" у сувязі з публікацыяй каментару да так званага інтэрв'ю з Лукашэнкам, цалкам неадпаведны. "Яшчэ раз, — адзначаецца далей ў заяве, — беларускія ўлады паказалі, што яны не зьбіраюцца талераваць галасы іншадумцаў і паспрабуюць давесьці адну з незалежных газет да банкруцтва".

***18 красавіка*** Сусьветная кампанія за свабоду слова ***"Article 19"*** даслала адкрыты ліст кіраўніку беларускай дзяржавы А. Лукашэнку, у якім выказала глыбокую занепакоенасьць у сувязі з пагаршэньнем становішча са свабодай выказваньня ў Беларусі. Асаблівую занепакоенасьць арганізацыі выклікаюць: безвыніковасьць сьледчых дзеяньняў па справе аб забойстве журналісткі ***Веранікі Чаркасавай***; закрытасьць абмеркаваньня новага законапраекту аб СМІ; стварэньне перашкодаў прафесійнай дзейнасьці некаторых журналістаў і г.д. Арганізацыя патрабуе ад беларускіх уладаў прывесьці нацыянальнае заканадаўства і яго прымяненьне ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі свабоды выказваньня.

***20 красавіка*** кіраўнік найбуйнейшага беларускага інтэрнэт-парталу Юры Зісер у адмысловай адозьве да карыстальнікаў ***TUT.BY*** – дваццаці тысячаў зарэгістраваных удзельнікаў форумаў парталу — заявіў: "Не за гарамі – судовыя працэсы, якія ўзьнікнуць з наіўнасьці і недальнабачнасьці інтэрнэт-карыстальнікаў". Цяпер з форумаў TUT.BY будуць выдаляцца любыя паведамленьні, якія пададуцца адміністрацыі супрацьпраўнымі: абразай альбо прапагандай крыміналу. У скрайніх выпадках адміністрацыя пакідае за сабой права на скасаваньне паштовых скрыняў карыстальнікаў. Юры Зісер нагадаў, што кожнага карыстальніка інтэрнэту могуць знайсьці сьпецслужбы. Звычайна на Інтэрнэт-рэсурсах ставяцца сьпецыяльныя фільтры для нецэнзурных словаў, а найбольш абразьлівыя паведамленьні выдаляюць. Юры Зісер не хавае, што ягоныя захады выкліканыя палітычнай сітуацыяй: "Нам падаецца, што так будзе больш бясьпечна для TUT.BY, калі людзі болей ня змогуць пісаць на форумах абражальныя выказваньні пра прэзі-

дэнта ці пра каго іншага наогул. Інакш мы папросту пачнём падводзіць нашых карыстальнікаў. Бо людзі думаюць, што яны ананімныя. Калі яны абражаюць адно аднаго – гэта нішто. Але калі абражаюцца службоўцы – гэта можа мець для іх наступствы. Калі будуць зыскі, яны будуць падавацца і на нас, і на тых, хто піша. Супраць нас выставяць сто мільёнаў рублёў, і нас ня будзе. Папросту, мы вырашылі застрахавацца. Мы зандыруем грамадзкае меркаваньне "наверсе" – што пра нас думаюць. І ведаем, што канкрэтна незадаволеныя нашымі форумамі".

***21 красавіка*** суд Драгічынскага раёну вынес рашэньне аб частковым задавальненьні патрабаваньняў чатырох сяброў і старшыні Драгічынскай участковай выбарчай камісіі па кампенсаваньні нанесенай ім ***Мікалаем Брычом*** маральнай шкоды ў памеры 2,7 мільёнаў рублёў. Мікалай Брыч працаваў журналістам мясцовай незалежнай ***"Газеты для вас"***, падчас выбараў 17-га кастрычніка 2004 году ён прыйшоў на выбарчы ўчастак і стаў сьведкам шэрагу парушэньняў з боку сяброў выбарчай камісіі, але быў выдалены з участку. "Пры гэтым ён заўважыў, што і сам старшыня, і шэраг сяброў камісіі "былі ў нецьвярозым стане". У сувязі з гэтым спадар Брыч падаў скаргу пракурору гораду, які арганізаваў медыцынскі агляд азначаных асобаў. Аднак аглядаліся "зусім іншыя сябры камісіі", і меркаваньне журналіста не было пацьверджанае. Тады "абвінавачаныя ў пьянстве" прадстаўнікі выбарчай камісіі распачалі адміністрацыйную справу, нягледзячы на тое, што вынікі медыцынскага агляду не прызнаў абласны наркалагічны дыспансер.

***25 красавіка*** галоўны рэдактар недзяржаўнай газеты ***"Згода" Аляксей Кароль*** атрымаў адказ з пракуратуры Партызанскага раёну г. Менску, куды ён зьвяртаўся з патрабаваньнем прыцягнуць да адказнасьці міліцыянтаў, якія ў канцы сакавіка ўварваліся ў арандаваную ім кватэру і забралі аргтэхніку. У пракурорскім лісьце гаворыцца, што ніякіх парушэньняў падчас правядзеньня агляду кватэры і выняцьця кампутараў міліцыя не дапускала. Наадварот: міліцыянты знайшлі ў кватэры матэрыялы (калажы), дэманстрацыя якіх, на думку пракуратуры, можа быць кваліфікаваная як публічная зьнявага Прэзідэнта (ч. 1 арт. 368 Крымінальнага кодэксу). Паводле пракурора Раманоўскага, кампутары міліцыя забрала "ў сувязі з тым, што меліся дастатковыя падставы меркаваць", што калажы былі зробленыя з іх дапамогай. Паводле пракуратуры Партызанскага р-ну, цяпер усе матэрыялы па гэтай справе знаходзяцца ў іх з мэтаю далейшай праверкі. Пытаньне аб вяртаньні кампутараў уладальніку будзе разглядацца толькі пасьля завяршэньня праверкі.

***2 траўня*** праўленьне ГА ***"Беларуская асацыяцыя журналістаў"*** прыняло заяву з нагоды Сусьветнага дня свабоды друку "Гарадзенская зона – тэрыторыя рызыкі для незалежных журналістаў", у якой адзначаецца, у

прыватнасьці: “Мінулы год быў адзначаны прыпыненьнем 25 друкаваных СМІ, што стала сумным рэкордам апошніх гадоў. Зонай павышанай рызыкі для незалежных медыяў стала Гарадзенская вобласьць, дзе яшчэ ў 2001 г. журналісты газеты «Пагоня» Мікола Маркевіч і Павел Мажэйка былі асуджаныя судом Ленінскага раёна г. Гародні на розныя тэрміны абмежаваньня волі. Чарговая кампанія перасьледу незалежных журналістаў на Гарадзеншчыне прыпала на 2004 год. Увесну 2005 г. Гарадзеншчына зноў прыцягнула да сябе ўвагу беларускай і міжнароднай грамадзькасьці.  Але і ў гэтых умовах незалежная прэса захоўвае адданасьць прынцыпам журналісцкай прафесіі, застаецца крыніцай, з якой грамадзяне Беларусі могуць атрымліваць аператыўную і ўсебаковую інфармацыю пра падзеі ў краіне і сьвеце”.

***5 траўня*** стала вядома, што недзяржаўныя выданьні ня ўключаныя ў “Каталог сродкаў масавай інфармацыі Гарадзеншчыны”, выдадзены ўпраўленьнем ідэалагічнай работы Гарадзенскага аблвыканкаму накладам 400 асобнікаў адмыслова да 9-й міжнароднай сьпецыялізаванай выставы “СМІ ў Беларусі”, якая адкрылася 3 траўня ў Менску. Як вынікае з назвы, каталог прэтэндуе на апісаньне ўсяго сьпектру СМІ, зарэгістраваных на тэрыторыі Гарадзенскай вобласьці. Аднак у ім адсутнічае інфармацыя пра недзяржаўныя грамадзка-палітычныя выданьні, у прыватнасьці, пра газеты “Биржа информации”, “Газета Слонімская”, “Местная газета”, “Новая газета Сморгони”, “Тэлескоп”, “Glos znad Niemna”. Адказны за выпуск каталогу начальнік аддзелу па працы са СМІ ўпраўленьня ідэалагічнай работы аблвыканкаму Мар’ян Максімонька паведаміў, што неўключэньне недзяржаўных выданьняў у каталог было сьвядомым рашэньнем ідэалагічнага ўпраўленьня. Наталя Макушына, рэдактар сацыяльнага аддзелу газеты “Биржа информации”, перакананая, што чыноўнікі ў чарговы раз падзялілі журналістаў ды газеты на сваіх і чужых па прынцыпе асабістай адданасьці: “Самае агіднае, што гэтая “кніжыца” з апісаньнем “ручных” газет выйшла на грошы падаткаплацельшчыкаў: у тым ліку “Биржи информации” і кожнага з нашых журналістаў”.

З ***8 траўня*** ў крамах КУП “Борисовский горпищеторг” перастала прадавацца газета ***“Курьер из Борисова”***. З 1-га траўня кіёскі “Мінаблсаюздруку” ў Барысаве перасталі прымаць у продаж газету “Борисовские новости”. У абодвух выпадках дамовы на рэалізацыю гэтых выданьняў былі скасаваныя арганізацыямі ў аднабаковым парадку. Акрамя гэтага, з 1-га чэрвеня будзе спыненая рэалізацыя выданьня ў паштовых аддзяленьнях г. Барысава. Выцясненьне недзяржаўнай прэсы з пунктаў рэалізацыі пачалося пасьля таго, як ідэалагічны аддзел Барысаўскага гарвыканкаму сабраў інфармацыю пра шляхі распаўсюду недзяржаўных выданьняў гораду.

***11 траўня*** рашэньне прыпыніць на два тыдні выданьне тыднёвіка “***Glos znad Niemna”*** прыняў выдавец газеты — ГА “Саюз палякаў на Беларусі” — пасьля таго, як суд у Гародні абавязаў арганізацыю аднавіць на па-

садзе галоўнага рэдактара Андрэя Дубікоўскага. А.Дубікоўскі быў звольнены з пасады галоўнага рэдактара газеты ў сярэдзіне красавіка рашэньнем Рады "Саюзу палякаў на Беларусі". Новым галоўным рэдактарам быў прызначаны Анджэй Пісальнік, пад кіраўніцтвам якога пасьля гэтага пасьпела выйсьці тры нумары "Глоса з-над Немна". Прызнаўшы звальненьне Дубікоўскага незаконным, суд абавязаў кіраўніцтва арганізацыі аднавіць яго на працы. Акрамя таго, СПБ вымушанае сплаціць у памеры каля мільёна рублёў кампенсацыю Андрэю Дубікоўскаму і судовыя выдаткі. Нястача, у выніку гэтых выплат, фінансавых сродкаў і сталася адной з прычынаў прыпыненьня выхаду газету. Галоўнае Праўленьне СПБ лічыць, што суд, прыняўшы рашэньне па справе Андрэя Дубікоўскага, стварыў "небясьпечны прэцэдэнт, які пагражае паралізаваць арганізацыю". Імі падкрэсьліваецца, што Андрэй Дубікоўскі быў звольнены з пасады галоўнага рэдактара адпаведна Статуту арганізацыі, паводле якога права прызначаць і здымаць галоўнага рэдактара газеты нададзена Радзе арганізацыі. "Дэ факта гэткае рашэньне суда азначае ўмяшальніцтва ў дзейнасьць кіраўнічых органаў нашай арганізацыі і ўводзіць двухуладзьдзе ў ГА "СПБ", — зазначана ў заяве Галоўнага Праўленьня "Саюзу палякаў на Беларусі". Кіраўніцтва арганізацыі мае намер абскардзіць рашэньне суда.

***16 траўня*** ў газету ***"Народная воля"*** прыйшлі некалькі непрыемных дакументаў: папярэджаньне Міністэрства інфармацыі і зыскі ў суд ад пяці грамадзянаў з патрабаваньнямі аб кампенсацыі маральных стратаў у памеры 50 мільёнаў рублёў кожны. І папярэджаньне, і судовыя зыскі выкліканыя публікацыяй ў газеце звароту да беларускага народу ад імя грамадзкага руху "Воля народу". Пяць супрацоўнікаў "Беларуськалію" заявілі, што не падпісваліся пад зваротам, і падалі на газету ў суд. Адначасова Мінінфармацыі папярэдзіла "Народную волю" з фармулёўкай – за публікацыю непраўдзівых зьвестак. Галоўны рэдактар "Народнай волі" Іосіф Сярэдзіч зазначае, што ён будзе вывучаць усе прэтэнзіі, але лічыць, што Мінінфармацыі дзейнічала пасьпешліва: "Міністэрства інфармацыі ўзяло на сябе функцыі судау. Яно не дае магчымасьці рэдакцыі выправіць сваю памылку ў адпаведнасьці з законам аб друку." Іосіф Сярэдзіч паведаміў, што ўсе позвы на ягоную рэдакцыю ў суд аформленыя абсалютна аднолькава – ад першага да апошняга слова, толькі прозьвішчы розныя. Спадар Сярэдзіч цытуе тэкст позваў ў суд, падпісаных пяцьцю салігорцамі: "Адзін і той жа абзац: "Я активно поддерживаю политику, проводимую президентом Республики Беларусь Лукашенко А. Г. Поэтому считаю, что мои политические взгляды скомпрометированы, и этим нарушены мои честь и достоинство". Іосіф Сярэдзіч кажа, што сьпісы больш чым 3000 грамядзянаў у рэдакцыю перадаваліся каардынатарамі руху "Воля народу", і нейкія інсінуацыі ці нават правакацыі не былі выключаныя. Каардынатар руху Аляксандр Казулін абяцае высьветліць сітуацыю з гэтымі пяцьцю подпісамі, але кажа пра ціск уладаў на гэтых людзей.

***16 траўня*** ў Івацэвічах (Берасьцейская вобласьць) у кіёсках "Белсаюздруку" перасталі выкладваць на вітрыны недзяржаўныя выданьні, сярод якіх – ***"Газета для вас", "Народная воля", "Брестский курьер"***. Адпаведнае распараджэньне зыходзіла ад начальніка Івацэвіцкага аддзяленьня "Брэстаблсаюздруку" Ірыны Міхнюк. Па словах прадаўцоў, тая, у сваю чаргу, атрымала адпаведнае прадпісаньне з Івацэвіцкага райвыканкаму. Сама І. Міхнюк катэгарычна адвяргае існаваньне як свайго распараджэньня, так і паперы з Івацэвіцкага райвыканкаму і заяўляе, што гэта — нейкая недарэчнасьць. Тым ня менш, сітуацыя з продажам недзяржаўных выданьняў у Івацэвічах не мяняецца.

***18 траўня*** галоўнага рэдактара газеты ***"Народная воля" Іосіфа Сярэдзіча*** выклікалі ў Пракуратуру РБ, каб уручыць афіцыйнае папярэджаньне "аб недапушчальнасьці парушэньня закону і распаўсюду інфармацыі ад імя незарэгістраваных... грамадзкіх аб'яднаньняў". Папярэджаньне падпісаў намесьнік Генеральнага пракурора РБ Мікалай Купрыянаў. У папярэджаньні гаворыцца, што пракуратура дала прававую ацэнку апублікаваным у лютым матэрыялам аб дзейнасьці грамадзкай ініцыятывы "Воля народу" і прыйшла да высновы, што "ў якасьці грамадзкага аб'яднаньня грамадзкая ініцыятыва "Воля народу" ва ўстаноўленым законам парадку не зарэгістраваная". Такім чынам, на думку пракуратуры, сп. Сярэдзіч як галоўны рэдактар газеты "Народная воля" дапусьціў парушэньне арт. 5 Закону РБ "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". Кіраўнік Цэнтру прававой абароны СМІ пры ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Міхаіл Пастухоў лічыць, што дзяржаўныя органы занадта шырока трактуюць паняцьце грамадзкага аб'яднаньня, што дазваляе ім значна абмяжоўваць ня толькі ініцыятыву беларускіх грамадзянаў, але і дзейнасьць СМІ, праз якія яны спрабуюць заявіць пра сябе. Ён не выключае таксама, што ўлады скарысталі чарговую нагоду, каб аказаць ціск на адзіную штодзённую недзяржаўную газету ў Беларусі.

***19 траўня*** міжнародная арганізацыя ***"Рэпарцёры бяз межаў"*** у адмысловай заяве выказала занепакоенасьць ціскам беларускіх уладаў на незалежныя медыі. Нагодай для заявы стала папярэджаньне Міністэрства інфармацыі, вынесенае газеце ***"Народная воля"***, а таксама зыскі пяці рабочых з Салігорску, якія запатрабавалі ад газеты вялікай грашовай кампенсацыі нібыта за паклёп. Міжнародная арганізацыя ў сваёй заяве прыводзіць словы рэдактара "Народнай волі" Іосіфа Сярэдзіча, які лічыць, што "Міністэрства інфармацыі выконвае адначасова ролі сьледчага, пракурора і судзьдзі".

***20 траўня*** яшчэ чатыры чалавекі, жыхары Глуску, падалі ў суд зыскі супраць рэдакцыі газеты ***"Народная воля"***. Яны заяўляюць, што не падпісваліся ў падтрымку руху "Воля народу" і патрабуюць матэрыяльнай кампенсацыі ў 5 мільёнаў рублёў кожны. Пры гэтым зыскі амаль не адрозьніваюцца адзін ад аднаго зьместам і падпісаныя ў адзін час.

***23 траўня*** Пінскі гарвыканкам разаслаў кіраўнікам прадпрыемстваў, арганізацыяў і ўстановаў ліст №26 ад 17.05.2005 г. У ім, у прыватнасьці, гаворыцца: “Зьвяртаем вашу ўвагу на неабходнасьць абавязковага афармленьня ведамаснай падпіскі на другое паўгодзьдзе 2005 году наступных газет: “Советская Белоруссия”, “Рэспубліка”, “Народная газета”, “Звязда”, “Заря” і “Пінскі веснік”. (Заснавальнікі “Зари” — Берасьцейскі абласны Савет дэпутатаў, Брэсцкі аблвыканкам, “Пінскага весніка” — Пінскі гарадзкі Савет дэпутатаў, Пінскі гарвыканкам). Далей у лісьце зьвяртаецца ўвага намесьнікаў кіраўнікоў, адказных за ідэалагічную працу на прадпрыемстве (арганізацыі, установе), на неабходнасьць аформіць падпіску на грамадзка-палітычны часопіс Адміністрацыі прэзідэнта “Беларуская думка”. Для першаснай арганізацыі ГА “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” і каардынацыі працы з моладзьдзю рэкамендуецца выпісаць газету “Знамя юности”. Ліст падпісаны старшынёй гарвыканкаму Аляксандрам Гордзічам.

***24 траўня*** ў пракуратуры Віцебскай вобласьці карэспандэнту газеты ***“Витебский курьер” Жане Пагарэлавай*** адмовіліся прадаставіць інфармацыю, суправадзіўшы адмову каментарам: “Ня ў той газеце працуеце”. Таксама на прэс-канферэнцыі, якая адбылася ў Віцебскім гарвыканкаме ў пачатку траўня, карэспандэнту “Витебского курьера” Сяргею Кочатаву не дазволілі задаць пытаньне. “А мы “Курьер” наогул не клікалі! — заявіў начальнік аддзелу інфармацыі гарвыканкаму Віцебску Алег Абросімаў. — Таму ніякіх пытаньняў з вашага боку!”. На гэтай прэс-канферэнцыі галоўны архітэктар гораду Барыс Лядзенка тлумачыў неабходнасьць будаўніцтва ў межах Віцебска аўтазаправачнай станцыі. “Витебский курьер” пісаў пра тое, што жыхары найбліжэйшых шматпавярховых дамоў абураныя будаўніцтвам дадзенага аб’екту і накіроўваюць мноства лістоў у адпаведныя дзяржаўныя органы. Менавіта з прычыны розгаласу гэтага інцыдэнту была скліканая прэс-канферэнцыя.

На ***25 траўня*** ў судзе Ленінскага раёну г. Менску прызначаныя слуханьні па зыску дэпутата Палаты прадстаўнікоў, лідэра ЛДПБ Сяргея Гайдукевіча да газеты ***“Народная воля”***. С.Гайдукевіч патрабуе прызнаць несапраўднымі зьвесткі, апублікаваныя ў газеце ад 1 сакавіка 2005 году ў артыкуле “Письмо Гайдукевича. И факс Гайдукевичу” (у прыватнасьці, зьмест тэксту апублікаванага факсу: “Кому: г-ну С.Гайдукевичу, Председателю” і фразу “Мы настойчиво просим Вас возвратить нам сумму в размере 996.798,060 доллара США, которую Вы задолжали”), і спагнаць на яго карысьць матэрыяльную кампенсацыю маральных стратаў у памеры 250 млн. рублёў. У прызначаны дзень суда не адбылося з прычыны таго, што ня ўсе дакументы, прадстаўленыя суду бакамі, перакладзеныя з ангельскай мовы. Пра гэта паведаміла судзьдзя Ленінскага раённага суда Менску Любоў Валевіч, якая павінная весьці працэс.

***26 траўня*** стала вядома, што да 15 чэрвеня прадпрыемствы і арганізацыі Гародні павінныя здаць справаздачу аб выніках правядзеньня падпіскі на газету "Советская Белоруссия" на другое паўгодзьдзе 2005 году. Пра гэта гаворыцца ў лісьце, які разаслалі адміністрацыі двух раёнаў Гародні. У дакуменце ўказваецца колькасьць асобнікаў "СБ", якія трэба выпісаць на тое альбо іншае прадпрыемства. Інфармацыю пра вынікі падпісной кампаніі рэкамендавана прадаставіць у раённыя аддзелы ідэалагічнай працы. Па зьвестках журналістаў, адміністрацыі раёнаў займаюцца падпіскай па даручэньні Гарадзенскага гарвыканкаму. Як заявіў начальнік упраўленьня ідэалогіі Гарадзенскага выканкаму Уладзімір Амелька, акрамя "СБ" выканаўчыя камітэты "прасоўваюць" яшчэ некалькі дзяржаўных рэспубліканскіх выданьняў ("Звязда", "Рэспубліка", "Белорусская нива", "Семь дней", "Знамя юности", "Беларуская думка"), "таму што яны асьвятляюць палітыку дзяржавы". У сьпіс газет, падпіска на якія падтрымліваецца адміністрацыйным рэсурсам, трапілі таксама шэсьць мясцовых дзяржаўных выданьняў, у тым ліку – "Гродненская правда", якую сам У. Амелька назваў "нецікавай".

Увечары ***26 траўня*** на расейска-беларускай мяжы быў затрыманы наклад недзяржаўнай газеты ***"День"***. Машына была дастаўленая ў Дубровенскі РУУС (Віцебская вобласьць). Быў складзены акт выняцьця накладу газеты на падставе таго, што яна "не акрэдытаваная". Па словах рэдактара газеты Міколы Маркевіча, раней у Смаленскую друкарню, дзе друкавалі газету, прыйшоў ліст з Міністэрства інфармацыі Беларусі, падпісаны намесьнікам міністра Ліліяй Ананіч. У лісьце было сказана, што міністэрства просіць друкарню спыніць друк газеты, бо яна не прайшла належную працэдуру перарэгістрацыі. "Гэта нахабная хлусьня. Мы прайшлі перарэгістрацыю і зарэгістраваныя ў вызначаным парадку",– заявіў Мікола Маркевіч.

***27 траўня*** галоўны рэдактар газеты ***"День" Мікола Маркевіч*** накіраваў скаргу на дзеяньні супрацоўнікаў Дубровенскага РУУС, якія ўвечары 26-га траўня забралі 1990 асобнікаў газеты, "не ўказаўшы ні фактычных, ні прававых падставаў" сваіх дзеяньняў. М. Маркевіч патрабуе вярнуць наклад газеты і прыцягнуць вінаватых да ўстаноўленай законам адказнасьці. Скарга накіраваная начальніку Дубровенскага РУУС. У пасланьні падкрэсьліваецца, што дзеяньні міліцыянтаў супярэчылі дзеючаму заканадаўству РБ: супрацоўнікі міліцыі афіцыйна не праінфармавалі ТДА "Деньпресс" пра свае дзеяньні і не патлумачылі іх прычыны; забралі на ўзор прадукцыі, як тое дазваляе арт. 16 Закону "Аб міліцыі", а ўвесь наклад газеты; выняцьце прадукцыі не было аформлена належным чынам; міліцыянты перашкодзілі законнаму распаўсюду СМІ без рашэньня суда, чым парушылі арт. 25 Закону аб друку, і законнай дзейнасьці рэдакцыі, выдаўца і распаўсюднікаў, чым парушылі арт. 48 гэтага ж Закону. "Указаныя парушэньні сьведчаць, што выняцьце прадукцыі СМІ — накладу №1 (190) газеты "День" зьяўляецца незаконным і пару-

шае правы і законныя інтарэсы рэдакцыі і выдаўца газеты “День” — ТДА “Деньпресс”, – гаворыцца ў скарзе.

***27 траўня*** ня выйшаў пасьля паўмесячнага перапынку новы нумар “***Glos znad Niemna”***, таму што абласная друкарня адмовілася надрукаваць наклад. Галоўны рэдактар “***Glos znad Niemna” Анджэй Пісальнік*** ня здолеў зьвязацца з дырэктарам. Праўда, у друкарні яму сказалі, што нібыта ўзьнікла запазычанасьць за друк газеты, хаця ў бухгалтэрыі “Саюзу палякаў на Беларусі” гэтага не пацьвердзілі. Усе рахункі аплачаныя, адказалі яны. Пісальнік: “Практыка іншых незалежных выданьняў паказвае, што калі друкарня ў Гародні адмовіцца друкаваць газету, то ўжо ўсе друкарні ў Беларусі нам адмовяць”. Спадар Пісальнік кажа, што друкаваць газету можна было б і за мяжой, але тады рэдакцыя ня зможа распаўсюдзіць наклад. Новы нумар “Glos znad Niemna” таксама рыхтаваў журналіст Андрэй Пачобут, ён так расцэньвае сітуацыю: “Па сутнасьці, адмову друку газеты “Glos znad Niemna” — гэта пачатак ліквідацыі Саюзу палякаў. Я лічу, што ўлады адмовіліся друкаваць яе дзеля таго, каб людзі, шараговыя сябры Саюзу палякаў не даведаліся пра тое, што ў нас адбываецца. Мы ведаем, што па ўсёй краіне цяпер ідзе запалохваньне людзей, рэгіянальных лідэраў Саюзу палякаў. У гэтым прымаюць удзел КДБ і органы мясцовай улады”.

***30 траўня*** ў другой палове дня да рэдактара газеты ***“Згода” Аляксея Караля*** прыйшлі з міліцыі. У міліцыянта быў ордэр пракуратуры на агляд кватэры. Таксама супрацоўнік міліцыі цікавіўся ліцэнзіяй на выпуск “Згоды” і выпускамі газеты. Аднак ператрусу ўдалося пазьбегнуць: дапамагло тое, што ў ордэры не было пазначана, якія прылады злачынства трэба шукаць падчас агляду, як гэтага патрабуе закон. Нагадаем, два месяцы таму пракуратура завяла крымінальную справу паводле артыкулу аб зьнявазе прэзідэнта на старонках “Згоды”. Падставай сталі гумарыстычныя калажы, якія надрукавала газета. Гэтыя калажы потым былі канфіскаваныя ў рэдакцыі разам з кампутарамі, на якіх журналісты рыхтавалі газету.

***31 траўня*** Гомельскі аблвыканкам рашэньнем №277 абавязаў індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асобаў, якія займаюцца розьнічным гандлем перыядычных выданьняў, пераўзгадніць да 1 чэрвеня пералік медыяў для продажу насельніцтву. Паводле рашэньня аблвыканкаму, узгадняць пералік перыядычных выданьняў дзеля розьнічнага гандлю абавязаныя ідэалагічныя аддзелы гарадзкіх і раённых выканкамаў. Прадпрымальнікі павінныя падаць у ідэалагічны аддзел зьвесткі ня толькі пра назву кожнага выданьня, што ён будзе прадаваць, але і пра ягоную тэматыку, дзяржаўную рэгістрацыю, указаць даты і нумары дамоваў на распаўсюд. Для замежных перыядычных выданьняў, за выключэньнем Расейскай Федэрацыі, павінен быць указаны яшчэ і нумар адмысловага даз-

волу Міністэрства інфармацыі на распаўсюд у Беларусі. Начальнік ідэалагічнага аддзелу Гомельскага гарвыканкаму Ганна Шыдлоўская ўдакладніла мэты патрабаваньня: “Каб мы ведалі, дзе яны бяруць: ці яны друкуюць недзе тут, у прыгараднай Якубоўцы ў падвальным памяшканьні, ці заключаюць з кімсьці дамовы на пастаўку? Мы павінны ведаць, з кім. І плюс яшчэ. Ня меней 70% павінна распаўсюджвацца выданьняў Рэспублікі Беларусь. Гаворка ідзе пра перыядычныя выданьні, які атрымліваюць датацыі з бюджэту”. У пералік для абавязковага продажу ўвайшлі газеты “Советская Белоруссия”, “Рэспубліка”, мясцовыя дзяржаўныя газеты “Гомельская праўда”, “Гомельские ведомости” і іншыя афіцыйныя спартовыя, дзіцячыя, культурніцкія выданьні — разам 32 найменьні. Прадпрымальнікі не ў захапленьні ад чарговага прымусу ўзгадняць пералік выданьняў дзеля продажу насельніцтву. Гаворыць намесьнік дырэктара прыватнага гандлёвага прадпрыемства “Прэс-тайм” Аляксандр Шыловіч: “Мы хочам прадаваць тое, што людзі чытаюць. У нас ня шмат месца. Калі мы зоймем свае плошчы абавязковымі выданьнямі, то што гэта будзе за гандаль?”.

***31 траўня*** журналістка ***Кацярына Ткачэнка*** чарговы раз была выкліканая ў РУУС Савецкага раёну Менску для тлумачэньняў наконт артыкулу “Нашы палякі”, апублікаванага ў газеце ***“Неделя”*** ўвосень 2004 году. У гэтым артыкуле крытыкавалася дзейнасьць былога кіраўніка “Саюзу палякаў на Беларусі” Тадэвуша Кручкоўскага. Спадар Кручкоўскі палічыў, што факты, выкладзеныя ў артыкуле, зьневажаюць ягоныя гонар і годнасьць, дыскрэдытуюць яго ў вачах грамадзкасьці. Пасьля таго, як спадар Кручкоўскі быў зьняты з пасады старшыні Саюзу палякаў, ён накіраваў у пракуратуру заяву з просьбай пачаць крымінальную справу паводле факту гэтай публікацыі. Паводле Кацярыны Ткачэнкі, тады праваахоўныя органы паведамілі, што ня лічаць мэтазгодным пачынаць справу супраць газеты. Аднак цяпер цікавасьць да гэтай публікацыі зноў зьявілася.

***31 траўня*** супрацоўнікаў незалежнай газеты ***“Народная воля” Марыну Коктыш*** і ***Віталя Гарбузава*** абавязалі даць пісьмовыя тлумачэньні старшаму інсьпектару менскай міліцыі Сяргею Сяўцу ў сувязі з публікацыяй у газеце артыкулаў пра рух “Абаронцы Айчыны”. Марына Коктыш брала інтэрвію ў лідэра “Абаронцаў Айчыны” Алега Волчака, а Віталь Гарбузаў падрыхтаваў артыкул пра прэзентацыю руху. Як паведаміла Марына Коктыш, інсьпектар цікавіўся, у прыватнасьці, якім чынам стала вядома, што да руху далучыліся былыя супрацоўнікі пракуратуры і КДБ. Нагадаем, што Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне “Народнай волі” за публікацыю “Зварот да воінаў-інтэрнацыяналістаў” лідэра руху “Абаронцы Айчыны” Алега Волчака, палічыўшы гэта распаўсюдам інфармацыі ад імя незарэгістраванага аб’яднаньня.

***1 чэрвеня*** дырэктар гарадзенскай друкарні Пётр Міронаў так і ня даў

адказу рэдакцыі газеты “Саюзу палякаў на Беларусі” (СПБ) “***Glos znad Niemna”*** на пытаньне, чаму польскамоўнае выданьне, нягледзячы на ранейшыя дамовы, не запускаецца ў вытворчасьць. Паводле галоўнага рэдактара выданьня Анджэя Пісальніка, 1-га чэрвеня скончыўся апошні тэрмін здачы газеты ў вытворчасьць. “Гэта азначае, што газета на гэтым тыдні зноў ня выйдзе”, — кажа А. Пісальнік. На думку Анджэя Пісальніка, перашкоды ў выданьні газеты “Glos znad Niemna” робяцца беларускімі ўладамі адмыслова, каб дэстабілізаваць працу рэдакцыі і выклікаць недавер з боку падпісчыкаў.

***1 чэрвеня*** пасьля некалькіх месяцаў існаваньня ў Калінкавічах на кабельным тэлебачаньні спынена трансьляцыя ўкраінскага тэлеканалу ***“Інтэр-плюс”***. Жыхары памежных раёнаў Беларусі мяркуюць, што зьвязана гэта з боязьзю беларускіх уладаў украінскай памаранчавай рэвалюцыі.

***1 чэрвеня*** рэдакцыя ***“Народнай волі”*** накіравала ў Камітэт дзяржаўнай бясьпекі запыт з мэтаю высьветліць паходжаньне ананімнага пасланьня, якое рэдакцыя атрымала па электроннай пошце 31 траўня. Гаворка ідзе аб гэтак званай “Дэкларацыі аб фармаваньні і мэтах дзейнасьці беларускай народна-вызвольнай арміі”, у якой, у прыватнасьці, гаворыцца аб правядзеньні ў Беларусі з 15 чэрвеня г.г. “шэрагу мерапрыемстваў”. Рэдакцыя газеты мяркуе, што гэты дакумент мог быць сфабрыкаваны з мэтаю “апраўдаць ужо распачатыя палітычныя рэпрэсіі супраць лідэраў апазіцыі, незалежных СМІ, грамадзкіх аб’яднаньняў, праваабарончых арганізацыяў, якія рэзка крытыкуюць парушэньні правоў чалавека ў краіне”. “Выкарыстоўваючы сваё права на атрыманьне праўдзівай інфармацыі, мы зьвярнуліся ў Камітэт дзяржаўнай бясьпекі, куды накіраваны адпаведны запыт з прылажэньнем тэксту атрыманага дакумента”, — паведамляе “Народная воля”.

***3 чэрвеня*** ў судзе Ленінскага раёну Менску пачаліся слуханьні па зыску лідэра Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Сяргея Гайдукевіча да рэдакцыі газеты ***“Народная воля”***. Адвакат, які прадстаўляў інтарэсы газеты, Уладзімір Пташкін заявіў хадайніцтва аб спыненьні судовага разьбіральніцтва ў сувязі з непадведамаснасьцю гэтай справы суду. Суд абвесьціў перапынак для вынясеньня рашэньня па гэтым хадайніцтве.

***3 чэрвеня*** Міжнародная арганізацыя ***ARTICLE 19*** накіравала адкрыты ліст А.Лукашэнку, у якім выказала вялікую заклапочанасьць паведамленьнямі пра апошнія падзеі вакол газеты ***“Народная воля”***: у прыватнасьці, пра апошнюю судовую справу па зыску лідэра ЛДПБ Сяргея Гайдукевіча, якая, на думку арганізацыі, можа прывесьці да банкруцтва выданьня. Арганізацыя прыгадвае і іншыя падзеі вакол “Народнай волі”, якія адбываліся ў апошні час: зварот намесьніка галоўнага рэдактара выданьня Аляк-

сандра Сіліча па палітычны прытулак у Бельгіі; папярэджаньне за публікацыю пра грамадзкі рух “Воля народу”; дзевяць практычна ідэнтычных зыскаў ад грамадзянаў, якія патрабуюць кампенсацыі на агульную суму зыскаў каля 125 тыс. даляраў. ARTICLE 19 заклікаў беларускае кіраўніцтва забясьпечыць: свабодны і справядлівы суд над “Народнай воляй”; строгую прапарцыянальнасьць матэрыяльнага спагнаньня (калі яно будзе) нанесенай шкодзе; абарону “Народнай волі” ад любых формаў палітычнага прэсінгу; адмену тых пунктаў заканадаўства, якія дазваляюць закрыць выданьне на падставе двух папярэджаньняў.

***7 чэрвеня*** адбыліся два падрыхтоўчыя судовыя паседжаньні па зысках да рэдакцыі ***“Народнай волі”*** ў Гаспадарчым судзе г. Менску. Адно з іх — па зыску аб абароне дзелавой рэпутацыі Вытворчага аб’яднаньня “Беларуськалій”, другое — па аналагічным зыску Салігорскага горна-хімічнага тэхнікуму. Зыскі тычыліся публікацыі ў №77 ад 23 красавіка 2005 г. артыкулу “Такая воля народа”, дзе ішла гаворка пра стварэньне грамадзкага руху “Воля народа”, і былі надрукаваныя подпісы работнікаў і навучэнцаў прадпрыемстваў. З Салігорску ў Менскі гаспадарчы суд прыбылі прадстаўніца “Беларуськалію” і дырэктар горна-хімічнага тэхнікуму Салігорску разам з адвакатам. Усе яны адмовіліся патлумачыць сутнасьць сваіх прэтэнзіяў да газеты. Як паведаміў галоўны рэдактар “Народнай Волі” Іосіф Сярэдзіч, падчас перадсудовай гутаркі бакі імкнуліся знайсьці кампраміс. На днях у ”Народнай Волі” будзе надрукаваны артыкул, у якім будуць выкладзеныя пазіцыі кіраўніцтва тэхнікуму і самой рэдакцыі, і на гэтым канфлікт можа быць вычарпаны. Што да судовых прэтэнзіяў прадпрыемства “Беларуськалій”, то, паводе Сярэдзіча, канфлікт, верагодна, можа быць вырашаны аналагічным чынам, і справа ня дойдзе да суда.

***9 чэрвеня*** судзьдзя суда Ленінскага раёну Менску Вера Тупік прыняла рашэньне прызнаць несапраўднымі і зьневажальнымі зьвесткі, надрукаваныя ў газеце ***“Народная воля”***. Маюцца на ўвазе подпісы супрацоўнікаў “Беларуськалію” з Салігорску пад зваротам аб стварэньні руху “Воля народу” Сяргея Катовіча, Ніны Грэчыц і Ніны Фраловай. Судзьдзя вынесла рашэньне выплаціць кожнаму з іх па 2 мільёны рублёў кампенсацыі. Зыск Паўла Жышкевіча судзьдзя адхіліла. У гэты ж дзень у судзе Ленінскага раёну сталіцы судзьдзя Тацяна Жулкоўская разглядала аналагічныя зыскі ад 4 жыхароў Клецку – Пятра Талайкі, галоўнага лекара медыцынскага аддзяленьня Клецку, дырэктаркі вясковай школы Ліліі Лібер, брыгадзіра Гудзько Івана і шматдзетнай маці Ірыны Закруты. Кожны з іх патрабаваў па 5 мільёнаў рублёў матэрыяльнай кампенсацыі і прызнаньня зьневажальнымі зьвестак, надрукаваных у “Народнай волі” – таксама подпісаў пад стварэньнем руху “Воля народу”. Галоўны рэдактар газеты Іосіф Сярэдзіч прапанаваў пазоўнікам, каб яны адмовіліся ад матэрыяльных прэтэнзіяў, а газета надрукуе абвяржэньне. Але жыхары Клецку, як і раней жыхары Салігорску, на

гэта не пагадзіліся. Выступаючы ў судовай зале, усе пазоўнікі казалі пра тое, што яны падтрымліваюць дзейнага прэзідэнта і ня ставілі подпісаў пад зваротам. Суд абавязаў газету выплаціць па 3 мільёны рублёў тром зыскоўцам з Клецку. Такім чынам, "Народнай волі" па гэтых рашэньнях судоў належыць выплаціць 15 мільёнаў рублёў — гэта каля 7 тысяч даляраў.

***10 чэрвеня*** выйшаў 19-ы нумар газеты "Саюзу палякаў на Беларусі" ***"Glos znad Niemna"***. У самім Саюзе, аднак, лічаць гэта правакацыяй з боку ўладаў, паколькі абласная друкарня адмовілася браць да друку новы нумар "Glosa", падрыхтаваны рэдакцыяй, але выпусьціла іншую газету, у якой нават не ўказаны рэдактар, што зьяўляецца парушэньнем Закону аб друку. Нумар падпісаны "рэдакцыйнай калегіяй", наклад пазначаны — 5500 асобнікаў. Галоўны рэдактар Анджэй Пісальнік лічыць: "Тое, што сёньня ў кіёсках зьявіўся"Glos znad Niemna", гэта — правакацыя, гэта трэба сказаць адназначна. Таму што ні "Саюз палякаў на Беларусі", ні рэдакцыя"Glos znad Niemna"ня маюць ніякага дачыненьня да гэтага нумару! Анджэй Пісальнік паведаміў дырэктару абласной друкарні Пятру Мітрафанаву, а таксама ў пракуратуру, што, на ягоную думку, было парушана заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі. Ён таксама зрабіў захады, каб спыніць распаўсюд газеты. У нумары"Glos znad Niemna" пазначана, што выдаўцом зьяўляецца Грамадзкае аб'яднаньне "Саюз палякаў на Беларусі". Але намесьнік старшыні Саюзу Юзэф Пажэцкі зазначае, што нумар выйшаў нелегальна, бяз згоды кіраўніцтва СПБ і зьяўляецца правакацыяй супраць Саюзу палякаў.

***14 чэрвеня*** судзьдзя суда Ленінскага раёну Менску Любоў Валевіч вынесла рашэньне, што ***"Народная воля"*** павінна выплаціць лідэру Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі, дэпутату Палаты прадстаўнікоў Сяргею Гайдукевічу 100 мільёнаў рублёў кампенсацыі (каля 45 500 даляраў ЗША). Суд прызнаў зьневажальнымі і несапраўднымі зьвесткі, надрукаваныя ў нумары "Народнай волі" ад 1 сакавіка 2005 году ў артыкуле "Ліст Гайдукевіча. І факс Гайдукевічу". Сума спагнаньня сталася адной з самых буйных за ўсю гісторыю судовых працэсаў з удзелам недзяржаўных беларускіх выданьняў. Галоўны рэдактар выданьня зьбіраецца абскарджваць гэтую пастанову ў Менскі гарадзкі суд.

***15 чэрвеня*** дырэктар ЗАТ ***"Выдавецкі дом "Витебский курьер"*** атрымаў ліст ад кіраўніцтва Культурна-дзелавога Цэнтру ААТ "КІМ" з просьбай "лічыць дамову... на арэнду памяшканьня пад выдавецкую дзейнасьць скасаванай з 10 ліпеня 2005 г.", вызваліць займае памяшканьне і разьлічыцца за арэнду. Неабходнасьць вызваліць памяшканьне тлумачыцца пераходам Цэнтру ў камунальную ўласнасьць .Віцебску.

***16 чэрвеня*** паўстала пагроза страты палякамі ў Беларусі незалежна-

га тыднёвіка ***"Glos znad Niemna"***. Газету "Саюзу палякаў на Беларусі" апошні раз выдала старое, залежнае ад афіцыйных беларускіх уладаў кіраўніцтва Саюзу. Адзіным аўтарам, які падпісаў усе тэксты, быў Тадэвуш Кручкоўскі, былы старшыня СПБ. Ягоныя публікацыі ў невыгодным сьвятле паказвалі польскія ўлады і новае кіраўніцтва СПБ. Палякі вырашылі востра прарэагаваць на паведамленьні з Беларусі. Томаш Ліс з Міністэрства замежных справаў сказаў, што Польшча прыпыніла фінансаваньне "Glos znad Niemna".

***16 чэрвеня*** ў Гаспадарчым судзе г. Менску пачаліся слуханьні па зыску Салігорскага дзяржаўнага горна-тэхнічнага тэхнікуму да рэдакцыі газеты ***"Народная воля"*** па абароне дзелавой рэпутацыі. Тэхнікум патрабуе прызнаць распаўсюджаныя выданьнем зьвесткі не адпавядаючымі рэчаіснасьці і ганебнымі, абавязаць газету апублікаваць абвяржэньне, а таксама спагнаць з рэдакцыі дзяржпошліну на пакрыцьцё судовых выдаткаў у памеры 10 базавых велічыняў. Зыск тычыцца публікацыі "Твёрдый голос молодых" у №77 газеты. У артыкуле гаварылася пра тое, што 37 навучэнцаў Салігорскага тэхнікуму паставілі свае подпісы ў падтрымку руху "Воля народу". Зыскоўца сьцьвярджае, што шэраг людзей з апублікаванага сьпісу не зьяўляюцца навучэнцамі гэтай установы, а яшчэ некалькі не падпісваліся ні пад якімі дакументамі.

***17 чэрвеня*** ўвечары ў Гарадзенскай абласной друкарні пачалі друкаваць несапраўдны наклад газеты Саюзу палякаў ***"Glos znad Niemna"***. Галоўны рэдактар газеты ***Анджэй Пісальнік*** даведаўся пра гэта і запатрабаваў ў друкарні дакументы, якія датычаць гэтага нумару газеты. Высьвілася, што газета паступіла без накладных папераў, а подпіс рэдактара, які падпісаў яе да друку, — неразборлівы. Спадар Пісальнік паехаў у Кастрычніцкі райаддзел міліцыі і напісаў заяву аб тым, што газета незаконна друкуецца людзьмі, якія не працуюць у рэдакцыі, прычым на паперы, якая належыць Саюзу палякаў.

***17 чэрвеня*** ўпраўленьне бытавога абслугоўваньня насельніцтва Менскага гарвыканкаму разаслала кіраўнікам сталічных прадпрыемстваў афіцыйнае распараджэньне "зрабіць захады па абавязковым забесьпячэньні падпіскі" на другое паўгодзьдзе 2005 г. на выданьне адміністрацыі прэзідэнта "Советская Белоруссия" і газету Менгарвыканкаму "Минский курьер". Дакумент падпісаны начальнікам упраўленьня А. П. Коўшарам. Нядаўна ў рэдакцыю "Народнай волі" таксама трапілі копіі двух аналагічных дакументаў: адзін быў падпісаны кіраўніком адміністрацыі Заводзкага раёну Менску Вячаславам Юхновічам, а другі — яго калегам з Першамайскага раёну Валерыем Скакуном. Абодва зьвяртаюцца да кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацыяў і ўстановаў сваіх раёнаў з просьбай паспрыяць правядзеньню ведамаснай падпіскі на дзяржаўныя выданьні і "не

дапусьціць ведамаснай падпіскі на недзяржаўныя". Кіраўнік Першамайскай адміністрацыі просіць кіраўнікоў прадпрыемстваў узяць гэтае пытаньне "пад асабісты кантоль" з улікам "палітычнай важнасьці дадзенага мерапрыемства". У дакуменце ўказваецца дакладная колькасьць асобнікаў газет, якую абавязаныя выпісаць усе структурныя падразьдзяленьні прадпрыемстваў, інтэрнатаў, бібліятэк Першамайскага раёну. Ня толькі для дзяржаўных прадпрыемстваў, але і для прыватных фірмаў і прадпрымальнікаў дзейнічае разнарадка на падпіску на дзяржаўныя выданьні, сьцьвярджаюць беларускія прадпрымальнікі. У дзяржаўных установах гэтыя зьвесткі абвяргаюць, але прызнаюць, што падпіска на недзяржаўныя выданьні ў іх не ўхваляецца. Кіраўніцтва Савецкага раёну Менску давяло да прадпрымальнікаў загад адносна падпіскі на дзяржаўныя выданьні. З кіраўнікамі фірмаў у выканкаме размаўляюць без прад'яўленьня нейкіх пісьмовых загадаў.

***20 чэрвеня*** ўпраўленьне рэгістрацыі і ліцэнзаваньня Менгарвыканкаму адмовілася рэгістраваць зьмяненьні ў Статуце прадпрыемства "День-пресс", якое выдае газету ***"День"***. Зьмяненьні датычаць новага юрыдычнага адрасу, які прадастаўлены сталічным Домам польскім. Чыноўнікі лічаць несапраўднай дамову аб арэндзе паміж ім і прадпрыемствам "День-пресс", бо новыя органы "Саюзу палякаў на Беларусі" лічацца нелегітымнымі. Рэдактар газеты "День" і кіраўнік прадпрыемства "День-пресс" Мікола Маркевіч лічыць: "Зразумела толькі адно, што гэта спроба ўнесьці дэстабілізацыю, спроба стварыць атмасферу няпэўнасьці і спроба перашкодзіць законнай дзейнасьці легальна зарэгістраванага сродку масавай інфармацыі".

***21 чэрвеня*** а 8-й раніцы ў прыватную кватэру, дзе пражывае рэдактар польскамоўнага часопісу ***"Магазын польскі" Андрэй Пачобут*** зьявіўся нарад міліцыі. Журналіст быў дастаўлены ў міліцэйскі аддзел мікрараёну Дзевятоўка. У аддзеле міліцыі дазнавацель Наталя Гайдаш паведаміла Андрэю Пачобуту, што на яго паступіла скарга ад грамадзяніна Тадэвуша Кручкоўскага. Той спасылаўся на абразьлівыя публікацыі Андрэя Пачобута ў дачыненьні да яго. Даваць паказаньні журналіст адмовіўся, пасьля чаго быў адпушчаны.

***22 чэрвеня "Народную волю"*** адмовіліся акрэдытаваць на прэс-канферэнцыю Генпракурора Беларусі Пятра Міклашэвіча, якая запланаваная на 23 чэрвеня. Афіцыйная прычына адмовы – адсутнасьць для карэспандэнта "Народнай волі" месца ў зале, дзе спадар Міклашэвіч будзе сустракацца з прадстаўнікамі медыяў. Газета выказала сумнеў наконт такой версіі і зазначае, што прэс-канферэнцыя – гэта адкрытае мерапрыемства.

***23 чэрвеня*** ГА ***"Беларуская асацыяцыя журналістаў"*** звярнулася да шэрагу дзяржаўных ўстановаў з просьбай прыняць захады для спы-

нецьня супрацьпраўных дзеяньняў, зьвязаных з нелегальным выпускам і распаўсюдам газеты ***"Glos znad Niemna"***, і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці. Зварот БАЖ накіраваны міністру інфармацыі Уладзіміру Русакевічу, міністру сувязі Уладзіміру Ганчарэнку, старшыні Камітэту дзяржаўнага кантролю Анатолю Тозіку, Генеральнаму пракурору Пятру Міклашэвічу, а таксама пракурору Гарадзенскай вобласьці, дырэктару Гарадзенскага філіялу РУП "Белпошта" і дырэктару Гарадзенскай друкарні. Нагодай для звароту стала зьяўленьне 10 і 17 чэрвеня двух запар нумароў газеты"Глос з-над Немна", друкаваньне і распаўсюд якіх ажыцьцяўляліся без дазволу галоўнага рэдактара і бяз ведама заснавальніка — ГА "Саюз палякаў на Беларусі". Арганізацыя просіць правесьці праверку выкладзеных фактаў, зрабіць захады па прадухіленьні такіх выпадкаў у будучым і прыцягнуць парушальнікаў да адказнасьці.

***24 чэрвеня*** выйшаў трэці па ліку нумар ***"Glos znad Niemna"***, да якога ня мае адносінаў рэдакцыя газеты. Яе выпускае былы кіраўнік "Саюзу палякаў на Беларусі" Тадэвуш Кручкоўскі. Гэта пацьвердзіў дырэктар Гарадзенскай абласной друкарні Пятро Мітрафанаў. У сувязі з друкам незаконнага, на думку кіраўніцтва СПБ, накладу выданьня, чарговыя заявы былі накіраваныя ў Кастрычніцкую раённую пракуратуру Гародні і ў Кастрычніцкі РАУС.

***27 чэрвеня*** Менскі гарадзкі суд пакінуў у сіле рашэньне па справе намесьніцы рэдактара ***"Белорусской деловой газеты" Ірыны Халіп***. Нагадаем, 11 красавіка Ірына Халіп і прыватнае ўнітарнае прадпрыемства "Марат" былі прызнаныя вінаватымі ў абразе гонару і годнасьці амерыканскага журналіста Аркадзя Мара. І.Халіп абавязаная выплаціць А.Мару кампенсацыю ў памеры 10 мільёнаў рублёў, а прадпрыемства "Марат" – 50 мільёнаў рублёў.

***27 чэрвеня*** Вышэйшы гаспадарчы суд адхіліў зыск рэдакцыі ***"Народнай волі"*** да Міністэрства інфармацыі, пакінуўшы ў сіле папярэджаньне газеце ад 13 красавіка, якое тычылася двух артыкулаў. Першы быў надрукаваны 3 сакавіка і называўся "Виртуальная война внучки с бабушкой". Мінінфармацыі палічыла, што аўтар (А. Сівы) апублікаваў не завершаныя вытворчасьцю матэрыялы судовай справы без пісьмовага дазволу судзьдзі. 31 сакавіка ў газеце быў апублікаваны "Зварот да воінаў-інтэрнацыяналістаў", пад якім сярод іншых падпісаўся праваабаронца Алег Волчак. Ён фігураваў у лісьце як лідэр руху "Абаронцы Айчыны", і Мінінфармацыі ўгледзела ў гэтым распаўсюд інфармацыі ад імя незарэгістраванага аб`яднаньня.

***27 чэрвеня*** стала вядома, што тры неафіцыйныя нумары ***"Глос з-над Немна"***, якія выйшлі насуперак кіраўніцтву "Саюзу палякаў на Беларусі", былі надрукаваныя за грошы Гарадзенскага аблвыканкаму. Аб гэтым га-

лоўны рэдактар газеты Анджэй Пісальнік даведаўся ад распаўсюдніка "Глосу з-над Немна" — "Белсаюздруку".

***27 чэрвеня*** Амерыканскі цэнтр абменаў і міжнародных дасьледаваньняў (IREX) заявіў аб пагаршэньні сітуацыі са свабодай слова ў Беларусі ў 2004 годзе. Пра гэта гаворыцца ў "Індэксе стабільнасьці СМІ за 2004 год". У справаздачы ацэньваецца свабода слова, плюралізм даступных грамадзянам СМІ, стандарты прафесійнай журналістыкі, стабільнасьць СМІ і эфектыўнасьць інстытутаў, якія падтрымліваюць незалежныя сродкі масавай інфармацыі.

***29 чэрвеня*** судовы разгляд зыску аб абароне дзелавой рэпутацыі вытворчага аб'яднаньня "Беларуськалій" да рэдакцыі газеты ***"Народная Воля"*** ў Гаспадарчым судзе Менску скончыўся міравым пагадненьнем. Як паведаміла адвакат "Народнай Волі" Ларыса Атаманчук, перад пачаткам судовага паседжаньня намесьнік генеральнага дырэктара "Беларуськалію" Анатоль Махлай і юрыст прадпрыемства Валянціна Якімовіч прапанавалі заключыць міравое пагадненьне на наступных умовах: рэдакцыя газеты прыносіць прабачэньне за публікацыю непраўдзівай інфармацыі аб падтрымцы руху "Воля народу" работнікамі "Беларуськалію", паколькі з 302 падпісантаў 262 чалавекі не працуюць на прадпрыемстве. У сваю чаргу "Беларуськалій" адмаўляецца ад сваіх прэтэнзіяў і бярэ на сябе аплату судовых выдаткаў. 17 чэрвеня Гаспадарчы суд спыніў вытворчасьць па аналагічнай справе аб абароне дзелавой рэпутацыі Салігорскага дзяржаўнага горна-тэхнічнага тэхнікуму з той прычыны, што гэтая спрэчка "не падлягае разгляду ў Гаспадарчым судзе".

***29 чэрвеня*** на ***Станіслава Халадовіча***, былога міліцыянта, які наведаў некалькі населеных пунктаў Івацэвіцкага раёну, у тым ліку родную вёску Горталь, і пры сустрэчах з вяскоўцамі перадаў інфармацыйныя матэрыялы пра дзейнасьць некаторых апазіцыйных структураў, складзены пратакол па арт. 172 ч.3 КаАП РБ – распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных дадзеных. Пасьля вяртаньня ў Івацэвічы Станіслаў Халадовіч даведаўся, што хтосьці з вяскоўцаў патэлефанаваў у РАУС, і адтуль у Горталь прыехалі міліцыянты, якія прайшлі па хатах і забралі распаўсюджаныя друкаваныя матэрыялы.

***30 чэрвеня*** рэдактара Магілёўскай недзяржаўнай тэлевізійнай студыі ***"Другі канал" Алену Барысаву*** ледзь не звольнілі з працы з-за таго, што мясцовы чыноўнік выказаў незадаволенасьць падрыхтаваным ёю сюжэтам. У адной з перадач цыклу "З гісторыяй поруч", якая выйшла ў сярэдзіне чэрвеня, быў паказаны сюжэт, удзельнікі якога крытычна ацэньвалі ход рэстаўрацыі магілёўскага Архірэйскага палацу 18 ст. Два гады таму палац быў вернуты Магілёўскай праваслаўнай епархіі, пасля чаго ў гіста-

рычным будынку пачаўся рэстаўрацыйны рАМАПт. Аўтарка перадачы і іншыя яе ўдзельнікі выказалі занепакоенасьць рАМАПтам, які зьнішчае пэўныя архітэктурныя асаблівасьці Палацу. Пра тэлесюжэт рэзка выказаўся старшыня абласнога камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Валерый Ванькові, які лічыць, што журналісты не павінны ўмешвацца ў працэс рэстаўрацыі маёмасьці праваслаўнай царквы. Пра незадаволенасьць абласнога чыноўніка стала вядома дырэктару “Другога каналу” А. Астапаву, які вусна заявіў журналістцы, што звальняе яе з працы. Аднак ён адмовіўся ад свайго намеру пасьля таго, як А. Барысава асабіста патэлефанавала старшыні абласнога камітэту В. Ваньковічу і прапанавала чыноўніку разабрацца з сітуацыяй у судзе, аднак той не захацеў заходзіць у спрэчцы настолькі далёка.

***30 чэрвеня*** начальнік упраўленьня спорту і турызму Гарадзенскага гарвыканкаму Уладзімір Чыгірынаў адмовіўся прадаставіць інфармацыю гарадзенскаму журналісту ***Аляксандру Дварэцкаву***. Адмову чыноўнік патлумачыў тым, што “не размаўляе з вольнымі журналістамі”. Аляксандр Дварэцкаў апошнія некалькі дзён зьбірае матэрыял для артыкулу пра разьвіцьцё турызму ў Беларусі. Па тэлефоне журналіст зьвярнуўся да Уладзіміра Чыгірынава з просьбай акрэсьліць пазіцыю ўладаў адносна турыстычных пэрсьпектываў Гародні. Чыноўнік пацікавіўся, у якой газеце працуе журналіст. Аляксандр Дварэцкаў паведаміў, што з’яўляецца вольным журналістам, а таксама сябрам ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”. Пачуўшы гэта, чыноўнік адмовіўся даваць інфармацыю.

***1 ліпеня*** скончыўся тэрмін, вызначаны Гомельскім гарвыканкамам, які прадпісаў усім юрыдычным асобам і прадпрымальнікам, якія прадаюць друкаваныя выданьні, прайсьці “пераўзгадненьне” іх асартыментнага пераліку. На гэтую працэдуру быў адпушчаны месяц. Гэта ўжо ня першы крок уладаў, які сьведчыць пра іх імкненьне кантраляваць распаўсюд друкаванай прадукцыі і ўскладніць працу тых, хто ім займаецца. У канцы 2004 году ў некалькіх рэгіёнах Беларусі мясцовыя ўлады прадпісалі прадпрымальнікам (арганізацыям), што гандлююць друкаванымі СМІ, узгадняць з імі “дадаткі” да асартыментнага пераліку з падрабязнымі зьвесткамі пра кожнае з выданьняў. Акрамя гэтага, указам А. Лукашэнкі ад 18 чэрвеня №285 “Аб некаторых захадах па рэгуляваньні прадпрымальніцкай дзейнасьці” зьмененыя ўмовы розьнічнага гандлю друкаванымі выданьнямі. Цяпер прадпрымальнік, які прадае газеты і часопісы, абавязаны будзе плаціць не адзіны, “спрошчаны”, падатак, а перайсьці на звычайнае падаткаабкладаньне.

***5 ліпеня*** зьявіўся чацьверты нумар “***Glos znad Niemna”***, які выпускаецца бяз згоды “Саюзу палякаў на Беларусі”. У ім пазначана, што абавязкі галоўнага рэдактара выконвае Віктар Кручкоўскі, родны брат былога стар-

шыні СПБ Тадэвуша Кручкоўскага, якога ўлады па-ранейшаму прызнаюць за кіраўніка Саюзу. Папярэднія тры фальшывыя нумары газеты былі падпісаныя невядомай "рэдакцыйнай калегіяй". У адной з публікацый апошняга нумару сьцьвярджаецца, што надыходзіць час, калі "з вядомых прычынаў" утрыманьне арганізацыяў нацменшасьцяў возьме на сябе дзяржава. Улады забясьпечваюць друк і распаўсюд "Glos znad Niemna". Сапраўднай рэдакцыі застаецца адно пратэставаць.

***6 ліпеня*** ў Гародні на плошчы Леніна міліцыянты затрымалі журналістаў, якія пратэставалі супраць пірацкага "***Glos znad Niemna"***. Сярод затрыманых – галоўны рэдактар "Глосу з-над Немна" ***Анджэй Пісальнік***, ягоныя супрацоўнікі ***Інэса Тодрык***, ***Ігар Банцэр***, а таксама галоўны рэдактар часопіса ***"Magazyn Polski" Андрэй Пачобут*** і карэспандэнт газеты "Салідарнасьць" Іван Роман. Іх даставілі ў пастарунак, а пасьля абеду — у суд. Вынікі суда: штрафам у 200 базавых велічыняў пакараны Андрэй Пачобут і на 20 базавых велічынь аштрафаваны Ігар Банцар. Іх судзілі за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце і непадпарадкаваньне міліцыі. Суд над астатнімі ўдзельнікамі пікету прызначаны на пазьнейшы тэрмін.

***6 ліпеня*** рэдакцыі берасьцейскіх газетаў атрымалі з мясцовага гарвыканкаму ліст за подпісам намесьніка старшыні Вячаслава Хафізава. У лісьце паведамляецца пра неабходнасьць выконваць рашэньне гарвыканкаму №310 ад 17.03.2005 "Аб сістэме інфармацыйнага забесьпячэньня насельніцтва і мерах па ўпарадкаваньні розьнічнай сеткі па распаўсюду перыядычных выданьняў на тэрыторыі гораду". У прыватнасьці, ад рэдакцый патрабуюць прадставіць у аддзел ідэалагічнай работы гарвыканкаму сьпіс грамадзкіх распаўсюднікаў мясцовых выданьняў.

***8 ліпеня*** ў Ленінскім раённым судзе Гародні завяршыліся судовыя працэсы над журналістамі, якія 6 ліпеня ў цэнтры гораду ладзілі акцыю пратэсту з патрабаваньнем вярнуць "Саюзу палякаў на Беларусі" газету ***"Glos znad Niemna"*** і былі затрыманыя міліцыянтамі. У выніку судзьдзя прыгаварыў ***Інэсу Тодрык*** да штрафу ў памеры 20 базавых велічынь (каля 230 даляраў ЗША), ***Анджэй Пісальнік*** і ***Іван Роман*** мусяць сплаціць штраф у памеры 100 базавых велічыняў (каля 1200 даляраў ЗША) кожны. Нагадаем, што двумя днямі раней ***Ігар Банцэр*** быў аштрафаваны на 510 тыс. рублёў (каля 230 даляраў ЗША), і ***Андрэй Пачобут*** — на 5 млн. 125 тыс. рублёў (каля 2400 даляраў ЗША). Цяпер Анджэй Пісальнік і Андрэй Пачобут чакаюць яшчэ і рашэньня адміністрацыйнай камісіі, бо на іх складзеныя пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні "за антысанітарыю" (гэтыя журналісты ў часе акцыі 6 ліпеня паклалі свае рэчы на траву на плошчы Леніна).

**11 ліпеня** ў Ашмянах пamежнікі затрымалі намесьніка старшыні Саюзу

палякаў Юзэфа Пажэцкага і галоўнага рэдактара часопісу ***“Magazyn Polski” Андрэя Пачобута***. Журналісты прыехалі ў ашмянскі Дом польскі, каб сустрэцца з кіраўніцтвам мясцовага аддзелу Саюзу палякаў. Але там нечакана зьявіліся памежнікі і забралі абодвух у камендатуру. Яны здалі пашпарты ў АВІР, аднак мелі іншыя дакументы і камандзіровачныя пасьведчаньні. Журналістам вынесьлі папярэджаньне за парушэньне рэжыму знаходжаньня ў памежнай зоне, у якую ўключаны горад Ашмяны. З камендатуры ў суправаджэньні памежнікаў Юзэфу Пажэцкаму і Андрэю Пачобуту давялося ехаць у міліцыю, дзе іх папярэдзілі, што калі наступным разам затрымаюць у Ашмянах, то прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці. А.Пачобут: “Сэнс акцыі супраць нас — гэта абмежаваць кантакты кіраўніцтва Саюзу палякаў з рэгіянальнымі структурамі”. Спадар Пачобут гаворыць, што ім адкрыта сказалі: іх затрымалі паводле аператыўнай інфармацыі, а значыць, за імі сочаць і праслухоўваюць тэлефоны, мяркуе ён.

***13 ліпеня*** адміністрацыйная камісія Івацэвіцкага райвыканкаму пакарала мясцовага жыхара ***Станіслава Халадовіча*** штрафам у памеры 204 тысячы рублёў штрафу за незаконны распаўсюд друкаваных выданьняў. Падставай для пакараньня стала тое, што спадар Халадовіч распаўсюджваў у вёсцы Горталь Івацэвіцкага раёну расейскую “Новую газету”, брашуру Васіля Лявонава “Бяз права на памылку” і інфармацыйныя матэрыялы пра дзейнасьць кааліцыі “Пяцёрка плюс”.

***13 ліпеня*** журналісты аддзела польскага публічнага тэлебачаньня (TVP) у г. Лодзь (Польшча) пачалі збор сродкаў на аплату штрафаў журналістаў газеты “Glos znad Niemna”, якія былі прысуджаныя судом Ленінскага раёну Гародні. Лодзкія журналісты заклікаюць грамадзянаў Польшчы праявіць жэст салідарнасьці і далучыцца да акцыі падтрымкі. Гарадзенскія журналісты павінны выплаціць штрафы ў 15-ці дзённы тэрмін.

***15 ліпеня*** ў Віцебску міліцэйскі патруль затрымаў распаўсюднікаў незалежнае прэсы ***Барыса Хамайду*** і ***Алеся Мудрычэнку***, якія каля Віцебскага аблвыканкаму распаўсюджвалі часопіс ***“ARCHE”***, газету ***“Витебский проспект»***, а таксама незалежніцкае выданьне ***«Выбар»***.

***15 ліпеня*** Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне рэдакцыі недзяржаўнай газеты ***“Витебский курьер М”***. Папярэджаньне падпісала першая намесьніца міністра інфармацыі Лілія Ананіч. Выданьне абвінавачваюць у тым, што яно не прайшло перарэгістрацыі ў сувязі з унясеньнем зьменаў у назву (арт. 11 Закону аб друку і пастанова Саўміну № 727 ад 30.05.2003). Акрамя гэтага, Мінінфармацыі заўважыла, што ў выходных дадзеных газеты прыведзена няпоўная назва заснавальніка (арт. 26), што “падзагаловачныя дадзеныя... ня ўключаюць імя выдаўца”, а імя рэдактара газеты “прыводзіцца не над выпускнымі дадзенымі”.

***19 ліпеня*** ў галоўнага рэдактара спартовай газеты ***"Прессбол" Уладзіміра Беражкова*** апісаная маёмасьць. Згодна з рашэньнем суда Цэнтральнага раёну Менска па зыску міністра фінансаў Мікалая Корбута, Беражкоў мусіць выплаціць чыноўніку амаль 5 тысячаў даляраў (з рэдакцыі газеты Корбут ужо спагнаў каля 15 тысячаў даляраў).

***21 ліпеня*** з бюджэту Берасьцейскай вобласьці выдаткавана 70 мільёнаў рублёў на новае абсталяваньне для дзяржаўных газетаў. Пра гэта паведамляецца на афіцыйным сайце Берасьцейскага аблвыканкаму. Грошы былі выдаткаваныя па рашэньні абласнога Савету дэпутатаў. Паводле галоўнага сьпецыяліста ўпраўленьня ідэалагічнай работы аблвыканкаму Т. Гагакавай, за кошт новага абсталяваньня значна палепшыцца матэрыяльна-тэхнічная база рэдакцыяў абласной газеты "Заря" (сярод заснавальнікаў — Берасьцейскі абласны Савет дэпутатаў, Берасьцейскі аблвыканкам), раённых "Полесская правда" (заснавальнікі — Пінскі раённы Савет дэпутатаў, Пінскі райвыканкам), "Чырвоная звязда" (заснавальнік — Іванаўскі райвыканкам), "Драгічынскі веснік" (сярод заснавальнікаў — Драгічынскі райвыканкам, Драгічынскі раённы Савет дэпутатаў), гарадзкой газеты "Пінскі веснік" (Пінскі гарадзкі Савет дэпутатаў, Пінскі гарвыканкам). З набытага часткова будуць укамплектаваныя рэдакцыі абласной газеты "Народная трыбуна", раённых "Савецкае Палессе" (Ганцавічы), "Заря над Бугом" (Берасьце) , "Навіны Палесся"(Столін) і іншыя. Заснавальнікамі гэтых выданьняў таксама выступаюць выканкамы і Саветы дэпутатаў розных узроўняў.

***25 ліпеня*** калегія па грамадзянскіх справах Менскага гарадзкога суду не задаволіла касацыйную скаргу прыватнага ўнітарнага прадпрыемства ***"Народная воля"***. Рэдакцыя газеты дамагалася адмены рашэньняў суду Ленінскага раёну, паводле якіх "Народная воля" вінаватая ў абразе гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргея Гайдукевіча, а таксама трох жыхароў Клецку, у выніку чаго рэдакцыя павінна выплаціць лідэру Ліберальна-дэмакратычнай партыі ў якасьці кампенсацыі 100 мільёнаў рублёў і па 3 мільёны рублёў жыхарам Клецку Пятру Талайку, Івану Гудзько і Ірыне Закрута. Галоўны рэдактар "Народнай волі" Іосіф Сярэдзіч надалей зьбіраецца абскарджваць гэтыя рашэньні, цяпер ужо ў Вярхоўным судзе, бо лічыць гэта справай гонару, справай прынцыпаў.

***26 ліпеня*** намесьнік начальніка КУРЭП ЖРЭУ па ідэалагічнай працы г. Баранавічы Вольга Кудласевіч адмовілася адказваць на пытаньні пазаштатнага карэспандэнта недзяржаўнай газеты ***"Інтэкс-прэс" Людмілы Гурман***. В.Кудласевіч запэўніла, што яна гатовая падрыхтаваць усе адказы, калі на гэта дасьць дазвол аддзел ідэалогіі Баранавіцкага гарвыканкаму. Па словах В. Кудласевіч, ім паступіла ўказаньне "зьверху" прадастаўляць інфармацыю СМІ толькі на запыт з аддзелу ідэалагічнай пра-

цы Баранавіцкага гарвыканкаму. Начальнік гэтага аддзелу Тацяна Жыдко ў вуснай размове з журналісткай Людмілай Гурман заявіла, што КУРЭП ЖРЭУ не валодае інфармацыяй, якая цікавіць журналіста (карэспандэнт спрабавала атрымаць адказы на пытаньні датычна збору сьмецьця і падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезону 2005-2006 гг.).

***27 ліпеня*** беларуская міліцыя затрымала журналістаў польскай "***Gazety Wyborczej" Вацлава Радзівіновіча*** і ***Робэрта Кавалеўскага***, якія ехалі з Гародні ў Ліду. "Ужо калі мы выходзілі з будынку Саюзу палякаў у Гародні, за намі сачылі двое супрацоўнікаў сьпецслужбаў з аўтамабілю, а трэці здымаў кожны наш рух на камеру", - заявіў Вацлаў Радзівіновіч. Паводле ягоных словаў, як толькі журналісты выехалі з Гародні, іх аўтамабіль затрымалі міліцыянты, праўдзілі дакументы, выпісалі штраф, але потым ім нехта пазваніў, і тады з аўтамабілю зьнялі нумары, а кіроўцу – брата намесьніка старшыні СПБ Юзэфа Пажэцкага – Ежы, затрымалі. Польскія журналісты былі вымушаныя ехаць далей таксоўкай.

***27 ліпеня*** супрацоўнікі міліцыі ў Шчучыне затрымалі журналістку польскай публічнай тэлевізіі ***TVP1 Агнешку Рамашэўску***. Падставай для затрыманьня сталася тое, што журналістка ня мела пры сабе акрэдытацыі Міністэрства замежных справаў Беларусі. Агнешку Рамашэўску затрымалі адразу па яе прыезьдзе ў Шчучын, каля Польскага дому, дзе адбывалася паседжаньне старога праўленьня "Саюзу палякаў на Беларусі". Журналістка спрабавала задаць пытаньне мужчыну, якога пазнала з выступаў па БТ, аднак была адразу затрыманая супрацоўнікамі міліцыі і дастаўленая ў мясцовае аддзяленьне.

***28 ліпеня*** шэрагу журналістаў недзяржаўных беларускіх СМІ не дазволілі прысутнічаць на прэс-канферэнцыі Тадэвуша Кручкоўскага. Не змаглі трапіць на сустрэчу таксама некаторыя польскія журналісты. Прэс-канферэнцыя пачалася ў 15.00 у будынку Саюзу палякаў, куды ўвечары 27 ліпеня Т. Кручкоўскі прайшоў з дапамогаю атраду міліцыі асобага прызначэньня. Перад пачаткам сустрэчы ля ўваходу зьявіўся паплечнік І. Кручкоўскага Казімер Знайдзінскі, які асабіста правяраў дакументы ў кожнага журналіста і вырашаў, хто можа прайсьці на прэс-канферэнцыю, а хто — не. Побач з ім знаходзіўся нарад міліцыі. Кіраўнік Гарадзенскай філіі БАЖ Павел Мажэйка, рэдактар газеты "Glos znad Niemna" Анджэй Пісальнік і журналіст гэтага выданьня Ігар Банцэр, галоўны рэдактар газеты "День" і інтэрнэт-сайту www.pahonia.promedia.by Мікола Маркевіч, журналіст газеты "Салідарнасьць" Іван Роман, карэспандэнт сайту www.hrodna.by Андрэй Кусельчук не змаглі патрапіць у будынак. Не дазволілі прайсьці таксама журналістам польскай радыёстанцыі RMF-FM. Бесперашкодна трапілі на прэс-канферэнцыю здымачная група тэлерадыёкампаніі "Гродна", журналісты дзяржаўных СМІ — "Звязда", "Перспектива" (заснавальнікі — Га-

радзенскі раённы Савет дэпутатаў, райвыканкам), а таксама карэспандэнты польскай тэлевізіі.

***30 ліпеня*** сябры філіі "Саюзу польскіх журналістаў" у горадзе Жэшуў, а таксама Цэнтр маніторынгу свабоды прэсы "Саюзу журналістаў" стварылі Фонд дапамогі незалежным беларускім медыям. Стваральнікі Фонду кажуць, што пратэсты журналістаў усяго сьвету супраць парушэньняў правоў чалавека і супраць таго, што беларускія ўлады не шануюць прынцыпаў свабоды слова — гэта недастаткова. Паводле іхных словаў, патрэбныя сродкі, напрыклад, на юрыдычную дапамогу журналістам, якіх перасьледуюць улады. "Фонд будзе падтрымліваць незалежных журналістаў у Беларусі – як польскіх, так і беларускіх. Гэта будзе наш невялікі ўнёсак у пашырэньне свабоды ў Беларусі", — заявіў кіраўнік жэшуўскай філіі "Саюзу польскіх журналістаў" Юзэф Матуш.

***1 жніўня*** карэспандэнту баранавіцкай недзяржаўнай газеты ***"Інтэкспрэс" Аксане Лянько*** адмовілася даваць інфармацыю начальнік упраўленьня гандлю Валянціна Маховік, якая заявіла, што інфармацыя можа быць прадастаўленая гэтаму выданьню толькі з санкцыі аддзелу ідэалагічнай працы. Пасьля неаднаразовых зваротаў у аддзел ідэалагічнай працы і ўпраўленьне гандлю А. Лянько вымушаная была адмовіцца ад ідэі публікацыі (журналіст планавала апублікаваць сьпіс работнікаў гандлю, узнагароджаных граматамі і падзякамі ў гонар іх прафесійнага сьвята).

***4 жніўня*** ў машыне журналістаў першага каналу польскага тэлебачаньня *TVP 1*, якія асьвятлялі канфлікт у Саюзе палякаў, уначы былі прабітыя колы. Журналісты лічаць, што гэта быў своеасаблівы акт застрашэньня польскіх журналістаў у Беларусі.

***4 жніўня*** ў актавай зале Смаргонскай школы мастацтваў адбылася сустрэча кіраўнікоў Смаргонскага раёну з сябрамі раённага аддзяленьня "Саюзу палякаў на Беларусі". На сходзе таксама павінны былі абірацца дэлегаты на абласны зьезд арганізацыі. Прыйшлі на сход і прадстаўнікі мясцовай прэсы. Аднак старшыня раённага аддзяленьня арганізацыі Тэрэза Пятрова яшчэ да пачатку сходу публічна заявіла, што прэсу на сход ніхто не запрашаў, таму яе прадстаўнікоў палякі не жадаюць бачыць у зале, бо, маўляў, менавіта прэса раздзьмувае канфлікт вакол Саюзу палякаў. Спробу справадзіць з залы карэспандэнта "Местной газеты" Сьвятлану Станкевіч, здымачную групу мясцовага тэлеканалу "Окс-ТВ" у складзе карэспандэнткі Ганны Шатурка і аператара Аляксандра Бурава, а таксама карэспандэнтку дзяржаўнай раёнкі Іну Дабрыдзень паўтараліся неаднаразова, але безвынікова. Кропку ў спрэчцы прэсы і палякаў паставіў старшыня Смаргонскага райвыканкаму Мечыслаў Гой. Ён настойліва пап-

расіў прэсу пакінуць сход, таму што гэтага "патрабуе народ". Прадстаўнікі СМІ выйшлі з залы.

***6 жніўня*** з Гародні быў дэпартаваны фотакарэспандэнт часопісаў ***"Przekroj***" і "***Newsweek" Адам Тухліньскі*** за тое, што ён нібыта ажыцьцяўляў журналісцкую дзейнасьць без акрэдытацыі МЗС. Яму забаронены ўезд у Беларусь цягам пяці гадоў. Спадар Тухліньскі быў зьдзіўлены, што затрымлівалі яго два міліцыянты ў цывільным, якія ўцягнулі яго ў звычайны аўтамабіль. Спадар Тухліньскі гаворыць, што прыехаў у Беларусь па турыстычнай візе, і рабіў здымкі як турыст у агульнадаступным месцах, што не забаронена законам. Цягам свайго знаходжаньня ў Гародні ніякіх здымкаў у свае СМІ ён не перадаваў. Нічога не здымаў ён і ў момант затрыманьня. Аднак беларускія міліцыянты і не высьвятлялі ў яго ніякіх акалічнасьцяў знаходжаньня ў Беларусі. У той жа дзень ня быў дапушчаны ў Беларусь іншы польскі карэспандэнт, які меў візу і сталую акрэдытацыю МЗС – тэлежурналіст Марцін Сьмялоўскі. Беларускія памежнікі пратрымалі яго некалькі гадзінаў, а потым заявілі, што ягонае знаходжаньне ў Беларусі непажаданае. Прычынаў не патлумачылі.

***10 жніўня*** ўвечары падчас праверкі на гарадзенскай мытні затрымалі журналіста польскага тэлебачаньня ***Міколу Ваўранюка***, які зьбіраўся цягніком выехаць з Горадні ў Беласток. У яго адабралі відэакасеты з матэрыяламі аб падзеях у Беларусі. Самога журналіста вярнулі назад – у Польшчу ён так і не паехаў. Мікола Ваўранюк працуе на трэцяй праграме польскага тэлебачаньня ў Беластоку. У Горадні ён некалькі дзён быў у камандзіроўцы і здымаў сюжэты аб падзеях, зьвязаных з сітуацыяй у "Саюзе палякаў на Беларусі".

***10 жніўня "Міжнародны інстытут прэсы"*** выказаў занепакоенасьць нарастаючым перасьледам журналістаў і медыяў у Беларусі, "у прыватнасці тых, хто працуе для прэсы польскай меншасьці". "Мы асуджаем апошнюю расправу з мясцовымі і замежнымі журналістамі, што працуюць у Беларусі. Мы заклікаем уладу да забесьпячэньня права кожнага "да пошуку, атрыманьня і распаўсюду інфармацыі і поглядаў усялякімі сродкамі, не зважаючы на межы" – сказаў дырэктар "Міжнароднага інстытуту прэсы" Ёхан Фрыц. "Міжнародны інстытут прэсы" — гэта найстарэйшая арганізацыя, якая абараняе свабоду прэсы. У 1950 годзе яе заснавалі 34 журналісты з 15 краінаў. Цяпер сябрамі інстытуту зьяўляюцца 2000 журналістаў і выдаўцоў са 120 краін сьвету.

З ***16 жніўня*** на працягу тыдня чатыры разы былі атакаваныя сайты ***АГП*** і ***"Праваабарончага альянсу"***. Спачатку наведнікі сайту АГП папросту не маглі яго адчыніць, каб пазнаёміцца з інфармацыяй, апошнім разам хакеры зьмясьцілі на ім уласную версію ацэнкі апошніх падзеяў у

краіне. Тое ж адбылося і з Інтэрнэт-старонкай “Праваабарончага альянсу”. Лідэр АГП Анатоль Лябедзька лічыць, што падчас выбарчай кампаніі гэта будзе пасьлядоўна адбывацца з Інтэрнэт-сайтамі ўсіх незалежных выданьняў і грамадзкіх арганізацыяў. Кацярына Ткачэнка, выканаўца абавязкаў кіраўніка прэс-службы АГП, паведаміла, што ў КДБ створаны адпаведны аддзел, на працу ў які запрасілі лепшых праграмістаў. Кацярына ўпэўненая, што яны будуць адсочваць непажаданую ўладам інфармацыю і блакаваць сайты.

***19 жніўня*** Менгарвыканкам ліквідаваў таварыства з абмежаванай адказнасьцю “Деньпресс”, якое зьяўляецца выдаўцом недзяржаўнай газеты ***“День”***. Газета “День” увесь час мела праблемы з юрыдычным адрасам, перасьледам праваахоўных органаў. Але, нягледзячы на ціск, выданьне працягвала існаваць. Рашэньне пра ліквідацыю “Деньпресс” было падпісанае на падставе прадстаўленьня падатковай інсьпекцыі Цэнтральнага раёну Менску. Прычынай названа “неажыцьцяўленьне ТАА прадпрымальніцкай дзейнасьці цягам 6 месяцаў запар і ненакіраваньне камерцыйнай арганізацыяй падатковаму органу паведамленьня аб прычынах гэтага”. Ліквідацыя заснавальніка азначае аўтаматычную ліквідацыю газеты. На думку рэдактара газеты Міколы Маркевіча, улады пайшлі на гэты крок, каб такім чынам спыніць выхад ягонага выданьня. Ён мяркуе, што ўлады адмыслова імкнуліся зрабіць так, каб гэты выпадак нібыта ня меў дачыненьня да праблемы свабоды слова ў Беларусі.

***23 жніўня*** беларускія памежнікі забралі пашпарт у журналіста ***“Gazety Wyborczej” Вацлава Радзівіновіча***. Гэты выпадак здарыўся ў цягніку, які ішоў з Кузьніцы Беластоцкай у Гародню. “Беларускія памежнікі сказалі, што аддадуць яго ў Гародні, пасьля выкананьня нейкіх там фармальнасьцяў”, – паведаміў Радзівіновіч. Пасьля таго, як на мяжы ў журналіста забралі пашпарт, адразу пасьля прыезду ў Гародню ён быў затрыманы, абшуканы і дапытаны беларускай міліцыяй. “Былі падлічаныя мае грошы, на шчасьце, я ўказаў іх у дэкларацыі, таму не было падставы да мяне прычапіцца. Я баяўся, што мне падкінуць што-небудзь у багаж”, – заявіў польскі журналіст. Вацлаў Радзівіновіч мяркуе, што ўлады шукаюць прычыну, каб выдаліць яго з Беларусі. У бліжэйшыя дні мае адбыцца паўторны шосты з’езд Саюзу палякаў. На думку Радзівіновіча, беларускія ўлады ня хочуць, каб яго асьвятлялі незалежныя журналісты.

***24 жніўня*** Гаспадарчы суд Менскай вобласьці задаволіў зыск Менскага аблвыканкаму аб ліквідацыі ТДА “Пресс-сервис”, якое выступае заснавальнікам газеты ***“Курьер из Борисова”***. Зыск быў пададзены 17 чэрвеня. Сутнасьць заўважаных Менаблвыканкамам парушэньняў зводзілася да таго, што ў статуце “Пресс-сервис” не былі адзначаныя мэты і задачы выдаваемага ім сродку масавай інфармацыі (“Курьера из Борисова”), пра-

вы працоўнага калектыву і іншыя палажэньні, якія, згодна з законам, павінныя быць у статуце рэдакцыі СМІ, хаця на той момант функцыі рэдакцыі "Курьера из Борисова" выконвала іншая юрыдычная асоба і, адпаведна, у статуце ТДА і не былі адлюстраваныя гэтыя моманты. Судзьдзя Тамара Бянчук прыняла пазіцыю аблвыканкаму і вырашыла прызнаць несапраўднай рэгістрацыю "Пресс-сервис", прызначыць ліквідацыйную камісію і зьліквідаваць прадпрыемства да 1 студзеня 2006 г. З моманту ўступленьня рашэньня ў законную сілу функцыі кіраўніка таварыства пяройдуць да кіраўніка ліквідацыйнай камісіі (зьвяртае на сябе ўвагу той факт, што кіраўніком ліквідацыйнай камісіі суб'екту гаспадараньня суд прызначыў начальніка ўпраўленьня ідэалагічнай працы Менаблвыканкаму). Адказнікі маюць магчымасьць напрацягу 15 дзён абскардзіць гэтае рашэньне ў апеляцыйную інстанцыю Менскага абласнога гаспадарчага суда. У рэдакцыі газеты лічаць рашэньне суда палітычнай замовай. "У нас ад нядаўняга часу была рэдкая для Беларусі сітуацыя, калі ў рэгіёне выходзілі дзьве незалежныя газеты, чый ("Курьер из Борисова" і "Борисовские новости"), наклад у 7 разоў перавышаў наклад афіцыйнай мясцовай газеты "Адзінства". Натуральна, што такая сітуацыя не магла задавальняць улады", — лічыць карэспандэнт газеты Павел Магілін. На думку журналістаў, пра сапраўдныя матывы дзеяньняў Мінаблвыканкаму сьведчыць сам тэкст зыскавай заявы, дзе гаворыцца, што дзейнасьць ТДА "Пресс-серсвис" супярэчыць дзяржаўным і грамадзкім інтарэсам.

***24 жніўня*** адміністрацыйная камісія Ленінскага раёну Гародні пакарала штрафамі рэдактара часопісу ***"Magazyn Polski" Андрэя Пачобута*** і рэдактара газеты"***Глос з-над Немна" Анджэя Пісальніка***. Кожны з іх павінен сплаціць дзьве базавыя велічыні за тое, што нібыта вытоптвалі газон падчас несанкцыянаванага пікету. Пікет у абарону газеты Саюзу палякаў "Glos znad Niemna" адбыўся на плошчы Леніна 6 ліпеня і працягваўся прыблізна хвіліну, пасьля чаго міліцыянты затрымалі ўдзельнікаў акцыі.

***25 жніўня*** пракуратура Барысаву вынесла афіцыйнае папярэджаньне галоўнаму рэдактару недзяржаўнай газеты ***«Борисовские новости» Анатолю Букасу***. У папярэджаньні гаворыцца, што, калі выяўленыя парушэньні будуць дапушчаныя паўторна, пракуратура «будзе вырашаць пытаньне аб прад`яўленьні зыску аб спыненьні дзейнасьці» выданьня. Падставай для папярэджаньня сталі две карэспандэнцыі пад назвай «Суд проходил в одни ворота», апублікаваныя ў №№26 і 27 газеты ў чэрвені - ліпені і прысьвечаныя судоваму працэсу па крымінальнай справе ў дачыненьні да А. Букаса. На думку пракуратуры, у гэтых карэспандэнцыях быў парушаны арт. 5 Закону аб друку, які забараняе апублікаваньне альбо абнародаваньне не завершаных вытворчасьцю матэрыялаў судовай справы без пісьмовага дазволу судзьдзі. Пракуратура сьцьвярджае, што прысуд па справе А. Букаса ўступіў у законную сілу пасля зьяўленьня згада-

ных публікацый: хаця суд Барысаўскага раёну вынес рашэньне яшчэ 16 чэрвеня, касацыйная інстанцыя пацьвердзіла яго толькі 22 ліпеня. Такім чынам, да гэтага часу судовая справа была не завершаная вытворчасьцю, лічаць у пракуратуры. Юрысты Цэнтру прававой дапамогі СМІ пры ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», са свайго боку, зьвяртаюць увагу на тое, што ў публікацыях ня ўтрымлівалася ніякіх цытатаў з матэрыялаў справы. Журналіст уласнымі словамі пераказваў тое, што ўбачыў і пачуў на адкрытым судовым паседжаньні. Праверка, вынікам якой стала папярэдэжаньне А. Букасу, была праведзеная на падставе звароту рэдактара газеты Барысаўскага гарвыканкаму «Адзінства» Веры Пратасевіч.

***25 жніўня*** на КПП "Брузгі" не пусьцілі ў Беларусь аператара Польскага тэлебачаньня з Беластоку ***Рамана Варшыцкага***. Яму не патлумачылі прычыну і параілі зьвярнуцца па тлумачэньні ў Генеральнае консульства РБ у Беластоку. Аўтамабілем Польскага тэлебачаньня ў Гародню ехалі чатыры беластоцкія журналісты, ім паставілі пячаткі ў пашпартах, але потым надоўга затрымалі, спраўджвалі дакументы і багаж. У Рамана Варшыцкага пячатку ў пашпарце на ўезд у Беларусь потым анулявалі. Аб усім гэтым паведаміў ягоны калега Мікола Ваўранюк. Раман Варшыцкі некалькі разоў прыяжджаў у Гародню асьвятляць канфлікт вакол Саюзу палякаў.

***25 жніўня*** на працягу дня наведнікі віцебскага гарадзкога парталу ***www.vitebsk.by*** ня мелі магчымасьці ўзяць удзел у абмеркаваньні грамадзка-палітычных тэмаў, бо ўсе ранейшыя матэрыялы форуму былі зьнішчаныя. Як паведаміў мадэратар форуму ***Сяржук Серабро***, форум "Палітыка, грамадзтва, улада" праіснаваў у Віцебску крыху больш за год. Ён даваў людзям магчымасьць вольна выказвацца пра палітычныя падзеі ў сьвеце, і, па сутнасьці, заставаўся апошнім беларускім палітычным форумам, зьмешчаным на афіцыйнай гарадзкой інтэрнэт-старонцы. Тым ня менш, на думку мадэратара, пакуль няма падставаў гаварыць пра гвалтоўнае закрыцьцё форуму афіцыйнымі ўладамі, і найбольш верагоднай зьяўляецца версія пра чарговую хакерскую атаку.

***1 верасьня*** ў вёсцы Дарашэвічы Петрыкаўскага раёну ўзброеная група сьпецназу пад камандаваньнем маёра С. Кутасава затрымала на паўтары гадзіны журналіста, кіраўніка Гомельскай арганізацыі ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" ***Анатоля Гатоўчыца***. Журналіст браў інтэрв'ю ў жыхароў вёскі і фатаграфаваў агароджу, што аддзяляе Дарашэвічы ад ракі Прыпяць (фотарэпартаж прызначаўся для газеты "Народная воля"). У А. Гатоўчыца забралі два дыктафоны SONY (лічбавы і касетны), фотаапарат "Зеніт", а таксама абшукалі аўтамабіль, з якога забралі 4 аўдыёкасеты з музыкай. Кіраўнік групы сьпецназу зьвязваўся з некім па рацыі, а на пытаньне журналіста, ці парушыў ён якія-небудзь правілы, адказаў: "Нічога не парушыў, але трэба пачакаць начальства". Прыкладна праз га-

дзіну прыехаў малады чалавек у цывільным, які назваўся кіраўніком службы аховы прэзідэнта Уладзімірам Мікалаевічам і заявіў, што ў сувязі з прыездам Аляксандра Лукашэнкі ў Петрыкаўскі раён праводзіцца аперацыя “Антытэрор”, у межах якой неабходна прад’яўляць на праверку дыктафоны, фотаапараты і ўсю іншую тэхніку.

***1 верасьня*** пракуратура г. Барысаву не задаволіла звароту галоўнага рэдактара газеты ***“Борисовские новости” Анатоля Букаса***, які прасіў разабрацца з выпадкамі незаконнага чыненьня перашкодаў у распаўсюдзе яго выданьня. У звароце А. Букас выказваў меркаваньне, што работнікі Барысаўскага выканкаму Валянціна Шутко і Наталя Касьперская наўмысна перашкаджаюць продажу яго выданьня праз сетку гарадзкога раздробнага гандлю. А. Букас перакананы, што згаданыя супрацоўніцы Барысаўскага гарвыканкаму “па-свойму трактуюць Дэкрэт №4”: нягледзячы на тое, што дакумент вызначае мінімальны асартыментны пералік тавараў пры афармленьні ліцэнзіі на раздробны гандль, яны патрабуюць ад прадпрымальнікаў і дырэктароў крамаў аформіць поўны асартыментны пералік. Галоўны рэдактар прасіў пракуратуру “ўказаць на недапушчэньне парушэньня закону з боку вышэйназваных чыноўнікаў. Аднак у лісьце, які падпісаў пракурор г. Барысаву В. Шпакоўскі, сьцьвярджаецца, што “ўказаныя асобы не пацьвердзілі абставінаў, выкладзеных у звароце”, і “іншых доказаў парушэньня заканадаўства ў ходзе праверкі не здабыта”.

***2 верасьня*** Міністэрства інфармацыі за некалькі гадзінаў да заканчэньня адведзенага ўказам А. Лукашэнкі тэрміну перарэгістрацыі СМІ са словамі “беларускі” і “нацыянальны” ў назвах выпісала новае пасьведчаньне аб рэгістрацыі газеты пад назвай ***“БДГ. Деловая газета”***. Спрэчка паміж Міністэрствам інфармацыі і рэдакцыяй наконт расшыфроўкі абрэвіятуры “БДГ” завяршылася на карысьць газеты. “БДГ” перарэгістравалі апошняй. Праблемы ўзьніклі пасьля таго, як Мініфармацыі запатрабавала рэдакцыю расшыфраваць прапанаваны ёю варыянт назвы выданьня “БДГ. Деловая газета”. У рэдакцыі лічылі гэтае патрабаваньне незаконным і меркавалі, што Міністэрства шукае прыдзіркі, каб зусім не перарэгістраваць выданьня. Галоўны рэдактар “БДГ” Пётр Марцаў лічыць, што перамога справядлівасьці часовая: наперадзе прэзідэнцкія выбары, і ягоная газета змушаная будзе далей змагацца за сваё існаваньне, як і іншыя незалежныя СМІ Беларусі. Песімізм рэдактара вынікае з таго, што газету перасьледуюць з 2003 году: ёй было адмоўлена друкавацца на тэрыторыі краіны, наладжваць распаўсюд праз “Белсаюздрук” і пошту.

***9 верасьня*** чыноўнікі Ганцавіцкага райвыканкаму адмовіліся прадаставіць газеце ***“Ганцавіцкі час”*** інфармацыю пра тое, якія сем’і маюць права на атрыманьне матэрыяльнай дапамогі ў падрыхтоўцы да школы дзяцей. Карэспандэнт “Ганцавіцкага часу” Ірына Дамарацкая адрасавала

гэтае пытаньне напярэдадні пачатку новага навучальнага году начальніку райфінаддзелу райвыканкаму Але Стральчэні, якая адказала, што нічога патлумачыць ня можа. Між тым, па зьвестках выданьня, сродкі для аказаньня матэрыяльнай дапамогі былі выдаткаваныя менавіта з раённага бюджэту. Адмовіўся даць якія-небудзь тлумачэньні на гэты конт і начальнік раённага аддзелу адукацыі Уладзімір Муха, які адказаў карэспандэнту "ГЧ": "Усё чытайце ў газеце "Савецкае Палессе".

***9 верасьня*** прэсавая служба Еўракамісіі абвясьціла пра новы конкурс праектаў вяшчаньня на Беларусь. Кіраўніцтва Еўрасаюзу выказала зацікаўленасьць у дэмакратызацыі Беларусі і доступе насельніцтва да альтэрнатыўнай афіцыйнай прапагандзе інфармацыі. Камісар Еўрасаюзу Бэніта Фэрэра-Вальднэр заявіла: "Ціск на СМІ ў Беларусі зьяўляецца пытаньнем нашай вялікай заклапочанасьці. І калі Беларусь хоча знайсьці шлях да дэмакратыі, яе людзям патрэбны доступ да незалежных СМІ".

***13 верасьня*** новая загадчыца аддзелу ідэалогіі Пінскага гарвыканкаму Валянціна Кулак пачала сваю працу з таго, што даручыла галоўнаму сьпецыялісту аддзелу Аляксандру Колбу асабіста патэлефанаваць кіраўнікам арганізацый і прадпрыемстваў Пінску і давесьці да іх ведама інфармацыю пра абавязковую падпіску на газету "Советская Белоруссия".

***16 верасьня*** ГА ***"Беларуская асацыяцыя журналістаў"*** адзначыла 10-гадовы юбілей. Журналісцкая арганізацыя аб'ядноўвае каля тысячы сябраў. "Мы дзесяць гадоў разам. Ідзём адным шляхам. Жывём надзеяй на перамены. Каб яны адбыліся, нам варта і надалей трымацца разам" — з такім дэвізам сустрэў БАЖ свае дзясятыя ўгодкі.

***16 верасьня*** Камітэт па юрыдычных пытаньнях і правах чалавека Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы (ПАРЕ) прыняў у Парыжы заяву, у якой асудзіў "сістэматычную кампанію перасьледу незалежных журналістаў і актывістаў грамадзянскай супольнасьці ў Рэспубліцы Беларусь", а таксама "рэпрэсіі ў дачыненьні да Саюзу палякаў і польскамоўных сродкаў масавай інфармацыі". Камітэт ПАРЕ выказаў заклапочанасьць крымінальным перасьледам аўтараў мультфільмаў, расцэненых беларускімі ўладамі як зьнявага кіраўніка дзяржавы, і лічыць, што такія дзеяньні "несумяшчальныя са свабодай слова і правам на мірныя сходы", якія Беларусь "абавязалася выконваць у адпаведнасьці з Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах ААН і Хельсінскім заключным актам АБСЕ".

***19 верасьня*** ваўкавыская вертыкаль забараніла продаж ***"Местной газеты"***, уладальнікам і рэдактарам якой зьяўляецца Андрэй Шантаровіч, у 18 прыватных кіёсках гораду, у крамах – на зьмену прыватнай газеце прыйшла "правільная" раёнка. Распачатае яшчэ вясной эканамічнае ўду-

шэньне працягваецца: наклад выданьня ўпаў з васьмі да пяці тысячаў асобнікаў, супрацоўнікі рэдакцыі з красавіка не атрымліваюць заробак, бо падатковая інсьпекцыя аштрафавала газету на 32 мільёны рублёў, арыштавала банкаўскі рахунак, дый сама "Местная газета" друкуецца ўжо ў Смаленску. Фармальнай забаронай продажу газеты называецца "неадпаведнасьць асартыментнаму пераліку". Выдавец А.Шантаровіч перакананы, што прычынай таму – публікацыя першага артыкулу пра карупцыю ў падатковай сістэме Ваўкавыскага раёну.

***21 верасьня*** барысаўская пошта пачала дастаўляць жыхарцы гораду замест недзяржаўнай газеты ***"Борисовские новости"*** афіцыйнае выданьне Барысаўскага райвыканкаму "Адзінства". Каб высьветліць недарэчнасьць, рэдактар "Борисовских новостей" Анатоль Букас патэлефанаваў на пошту, дзе даведаўся, што ў даставачнай картцы выкрэсьленая газета "Борисовские новости" разам з індэксам, а замест яе ўпісаная газета "Адзінства". Загадчык вузла паштовай сувязі запэўніў, што гэта "памыліліся на пошце".

***21 верасьня*** стала вядома, што пачаўся ціск на студэнтаў, выкладчыкаў і дзяржаўных службоўцаў – іх прымушаюць падпісвацца на дзяржаўныя выданьні. Некаторых проста ўгаворваюць. Курсантаў, вайскоўцаў, міліцыянтаў прымушаюць загадам. А выкладчыкаў ВНУ і настаўнікаў шантажуюць. На гуманітарныя факультэты Белдзяржуніверсітэту накіраваны дакумент з Міністэрства адукацыі, падпісаны намесьнікам міністра адукацыі Тацянай Кавалёвай. У лісьце канстатуецца, што на сустрэчы з творчай інтэлігенцыяй у канцы 2003 году прэзідэнт даручыў падтрымаць так званыя "холдынгавыя выданьні" – "ЛіМ", "Полымя", "Нёман, "Маладосьць" і "Всемирную литературу". Але цяпер Міністэрства адукацыі прызнае "неналежнае выкананьне даручэньня кіраўніка дзяржавы". "Асабліва насьцярожвае, – гаворыцца ў дакуменце, – што пералічаныя выданьні апынуліся па-за прафесійным зацікаўленьнем настаўнікаў і выкладчыкаў ВНУ. Пра гэта сьведчыць невялікая колькасьць індывідуальных падпісчыкаў сярод гэтай катэгорыі педагогаў". Далей Міністэрства адукацыі патрабуе падаць яму дакладную інфармацыю пра колькасьць індывідуальных падпісчыкаў сярод педагогаў.

***26 верасьня*** беларуская рэспубліканская пракуратура вынесла папярэджаньне журналістцы ***Ірыне Халіп*** за публікацыю артыкулу "Час выкідаць граблі" у расейскай ***"Новой газете".*** На пачатку жніўня артыкул "Час выкідаць граблі" расейскае выданьне надрукавала з пытаньнем "Ці адбудзецца рэвалюцыя ў Беларусі?". У артыкуле журналістка Ірына Халіп аналізавала сітуацыю ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкай кампаніі. Аўтарка артыкулу зрабіла выснову, што беларуская ўлада зьменіцца ў выніку вулічнай рэвалюцыі. Пракуратура кваліфікавала выказваньні жур-

налісткі як заклікі да дэстабілізацыі грамадзкага парадку і зьмены канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь неправавымі сродкамі. Супрацоўнік аддзелу Сьвятаслаў Гарэлік папярэдзіў журналістку аб тым, што ў выпадку публікацыі новых артыкулаў з падобнымі выказваньнямі пракуратура будзе кваліфікаваць іх як заклікі да гвалтоўнай зьмены ўлады. Паводле крымінальнага кодэксу, за гэта прадугледжана пакараньне пазбаўленьнем волі тэрмінам ад аднаго да пяці гадоў.

***26 верасьня*** рэдактар недзяржаўнай газеты ***“Згода” Аляксей Кароль*** і ягоны намесьнік ***Аляксандр Сьдзьвіжкоў*** аштрафаваныя на 100 базавых велічыняў кожны (прыблізна па 1200 даляраў ЗША). Адпаведнае рашэньне вынес суд Першамайскага раёну Менску. Суд пакараў кіраўнікоў незалежнага выданьня за “распаўсюд наўмысна няпраўдзівых зьвестак”. Падставай для такога рашэньня суда сталі калажы, якія друкаваліся ў некалькіх нумарах “Згоды”. Журналісты выкарыстоўвалі вядомыя карціны, прыкладам, Сальвадора Далі, на якіх замест твараў з арыгіналаў зьмяшчалі выявы шэрагу беларускіх палітыкаў, прычым, як падкрэсьліў спадар Кароль, гэта былі ня толькі прадстаўнікі ўлады.

***26 верасьня*** калегія Гаспадарчага суда Менскай вобласьці не задаволіла касацыйную скаргу барысаўскага недзяржаўнага прадпрыемства “Прэс-сэрвіс”. Нагадаем, што 24 жніўня гэты суд пастанавіў ліквідаваць “Прэс-сэрвіс”, які зьяўляецца заснавальнікам газеты ***“Курьер из Борисова”***. Кіраўнік “Прэс-сэрвісу” Анатоль Удавічэнка паведаміў судовай калегіі, што тое рашэньне неабгрунтаванае. Прадпрыемства, паводле ягоных словаў, тры гады працавала без парушэньняў заканадаўства. У сваю чаргу, прадстаўнік юрыдычнага ўпраўленьня аблвыканкаму Андрэй Лагачоў пацьвердзіў ранейшую пазіцыю, што “Прэс-сэрвіс”, маўляў, тры гады таму парушыў парадак пры рэгістрацыі, а таму яна павінна быць скасаваная. Калегія на чале са спадаром Аляксандравым падтрымала гэтую ініцыятыву і адхіліла скаргу барысаўскага прадпрыемства. Між тым, Анатоль Удавічэнка лічыць, што такое рашэньне мае палітычную афарбоўку.

***27 верасьня*** ў ***“Народнай волі”*** надрукаваны зварот заснавальніка і галоўнага рэдактара газеты Іосіфа Сярэдзіча з заклікам да ўсіх грамадзянаў Беларусі дапамагчы газеце выплаціць кампенсацыю 100 мільёнаў рублёў. Менавіта столькі суд Ленінскага раёну Менску прысудзіў выплаціць дэпутату Палаты прадстаўнікоў Сяргею Гайдукевічу ў якасьці матэрыяльнай кампенсацыі ў сувязі з публікацыяй артыкулу пра супрацоўніцтва Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі з рэжымам Садама Хусэйна і выдзяленьні ёй сьпецыяльных ільготных квотаў на атрыманьне нафты. У рэдакцыі газеты апісаная маёмасьць, арыштаваная папера, банкаўскі рахунак заблакаваны, пакуль ня будзе выплачаная кампенсацыя.

***28 верасьня*** стала вядома, што гандлёвае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства “Белсаюздрук” у аднабаковым парадку скасоўвае дамову з рэдакцыяй газеты “***Народная воля”*** на распаўсюд гэтага выданьня з 1 кастрычніка. Па словах дырэктара “Белсаюздруку” Міхаіла Падгайнага, дамову скасавалі за неаднаразовае парушэньне газетай заканадаўства аб друку. У рэдакцыі “Народнай волі” лічаць, што “Белсаюздрук” сам груба парушыў заключаную з газетай дамову, не папярэдзіўшы яе ў належны тэрмін. “У дамове гаворыцца, што “Белсаюздрук” павінен за месяц папярэдзіць пра свой намер скасаваць дамову з выданьнем”, — гаворыць намесьніца галоўнага рэдактара “Народнай волі” Сьвятлана Калінкіна. “Папярэджаньні выносяцца і дзяржаўным газетам, але ж не было ніводнага прэцэдэнту, каб з якой-небудзь з іх скасавалі дамову на распаўсюд...”

***28 верасьня*** ГА ***“Беларуская асацыяцыя журналістаў”*** прыняла заяву ў сувязі з сітуацыяй вакол газеты “Народная воля”. У заяве гаворыцца: “Беларускія ўлады нанесьлі самы моцны за апошні час удар па незалежнай прэсе. Адзіная штодзённая недзяржаўная беларуская газета ***“Народная воля”*** знаходзіцца пад пагрозай спыненьня выпуску — ужо 1 кастрычніка дзясяткі тысячаў яе чытачоў могуць не атрымаць свайго любімага выданьня. Нягледзячы на тое, што рэдакцыя пералічыла па рашэньні суда больш за 70 млн. са 100 млн. рублёў па зыску дэпутата Палаты прадстаўнікоў Сяргея Гайдукевіча, дзяржаўныя чыноўнікі пасьпяшаліся скасаваць дачыненьні падпарадкаваных ім служб (друкарні, сістэмы распаўсюду) з газетай. Прычыны, указаныя ў лістах аб спыненьні дачыненьняў ў газетай, уражваюць ня толькі юрыдычнай непісьменнасьцю, але і сваім адкрытым цынізмам”. “Беларуская асацыяцыя журналістаў” расцэньвае дзеяньні беларускіх уладаў у дачыненьні да газеты як “яўна супрацьпраўны акт, накіраваны на зьнішчэньне незалежнага выданьня напярэдадні важных грамадзка-палітычных падзеяў”.

***28 верасьня*** галоўны рэдактар ***“Народнай волі” Іосіф Сярэдзіч*** накіраваў тэлеграму Аляксандру Лукашэнку, у якой патрабуе, каб Лукашэнка “спыніў бюракратычнае бязладзьдзе і свавольства чынавенства”. Адначасова Іосіф Сярэдзіч зьвярнуўся да кіраўніка офісу АБСЕ ў Беларусі Оке Петэрсана. Спадар Сярэдзіч спадзяецца на тэрміновую дапамогу міжнароднай супольнасьці.

***29 верасьня*** намесьнік пракурора Ленінскага раёну Гародні Аляксандр Абрамовіч афіцыйна папярэдзіў ***Анджэя Пісальніка*** аб недапушчальнасьці прадстаўляцца галоўным рэдактарам штотыднёвіка “Саюзу палякаў на Беларусі” — ***“Glos znad Niemna”.*** Скаргу ў пракуратуру напісаў былы старшыня Саюзу палякаў Тадэвуш Кручкоўскі яшчэ перад паўторным зьездам СПБ. Тады ў Польшчы выйшлі два нумары газеты “Glos znad Niemna”, і галоўным рэдактарам быў падпісаны А.Пісальнік.

***29 верасьня*** намесьнік старшыні Пінскага гарвыканкаму Аляксандр Канеўскі правёў нараду з супрацоўнікамі гэтай установы, падчас якой, сярод іншага, прадпісаў сьпецыялістам упраўленьняў і аддзелаў гарвыканкаму не прадастаўляць інфармацыі супрацоўнікам недзяржаўнай газеты "Мясцовы час". Сваё ўказаньне ён матываваў тым, што рэдакцыя, маўляў, па-свойму каментуе падзеі і факты, якія тычацца сацыяльнага боку жыцьця гараджан і часта падае іх ня так, як хацелася б мясцовым уладам. Як паведаміў рэдактар "Мясцовага часу" Віктар Ярашук, адміністрацыя гатэлю "Спорт", куды рэдакцыя пераехала некалькі месяцаў таму, атрымала вуснае распараджэньне старшыні гарвыканкаму Аляксандра Гордзіча скасаваць дамову арэнды з рэдакцыяй. Акрамя гэтага, Пінскае аддзяленьне РУП "Белсаюздрук", спасылаючыся не перагружанасьць кіёскаў перыёдыкай, у чарговы раз адмовілася заключаць дамовы з рэдакцыяй на розьнічны продаж "МЧ". Між тым усіх паштальёнаў і аператараў Пінскага раённага вузла паштовай сувязі абавязалі аформіць штомесячную падпіску на газету гарвыканкаму "Пінскі веснік" (50 асобнікаў) і "Советскую Белоруссию" (25 асобнікаў).

***30 верасьня*** рэдакцыя ***"Народнай волі"*** цалкам выплаціла суму ў 100 млн. рублёў, якую суд вызначыў у якасьці кампенсацыі маральнай шкоды С. Гайдукевіча.

***30 верасьня*** суд Кастрычніцкага раёну Менску прыняў рашэньне спагнаць з рэдакцыі ***"БДГ. Деловая газета"*** і журналіста ***Сяргея Сацука*** адпаведна 50 і 5 мільёнаў рублёў. У такую суму суд ацаніў зыск аб абароне гонару і годнасьці былога байца АМАПу Сяргея Бядрыцкага – героя адной з публікацыяў Сяргея Сацука. Зыск быў пададзены ў суд у чэрвені. У сваім артыкуле пад назваю "Рэкламная акцыя", апублікаваным ў 2003 годзе, Сяргей Сацук апавядаў пра крымінальную справу аднаго з рэкламных агенцтваў, па якой праходзіў былы амапавец Сяргей Бядрыцкі. Праз два гады спадар Бядрыцкі вырашыў, што ў гэтым артыкуле Сяргей Сацук абразіў ягоныя гонар і годнасьць, распаўсюдзіўшы нібыта непраўдзівыя зьвесткі. Бядрыцкі прасіў спагнаць з рэдакцыі газеты і аўтара на ягоную карысьць па 100 і 10 мільёнаў рублёў. У ходзе разьбіральніцтва высьветлілася, што зьвесткі, апублікаваныя ў артыкуле, былі ўсё ж такі праўдзівымі. Аднак суд ўсё роўна вырашыў спагнаць з рэдакцыі БДГ – 50, а з Сяргея Сацука – 5 мільёнаў рублёў. Нібыта на той падставе, што рэдакцыя і аўтар ня мелі права называць імя і прозьвішча Бядрыцкага публічна. Галоўны рэдактар выданьня Пётр Марцаў і аўтар артыкулу лічаць, што з дапамогай суду ўлады хочуць канчаткова расправіцца з незалежным выданьнем.

***30 верасьня***, выступаючы на паседжаньні Савету Бясьпекі, Аляксандр Лукашэнка заявіў пра неабходнасьць абараняць беларускае грамадства

ад замежнай інфармацыйнай экспансіі і "ўнясеньня нестабільнасьці антыбеларускімі інфармацыйнымі рэсурсамі". Ён сказаў, што "ў апошняе дзесяцігодзьдзе ўсе ваенныя канфлікты, разьвязаныя ў сьвеце ЗША і іх сатэлітамі, пачыналіся менавіта з інфармацыйных атак, з масіраваных прапагандысцкіх кампаній супраць той ці іншай краіны, вызначанай для ваеннага ўдару". Па словах кіраўніка дзяржавы, "вядучая заходняя дзяржава актыўна выкарыстоўвае інфармацыйную інфраструктуру і рэсурсы як інструменты аднабаковага прасоўваньня сваіх геапалітычных інтарэсаў". "Яны спрабуюць з дапамогай СМІ і Інтэрнэту маніпуляваць масавай сьвядомасьцю, дыскрэдытаваць нязручныя ім краіны і іх кіраўніцтва, штучна ствараць у іх перадумовы да абвастрэньня сацыяльнай напружанасьці, у тым ліку з мэтаю зьмены ўлады". Па словах А. Лукашэнкі, памежныя з Беларусьсю Польшча і краіны Балтыі "даўноператварыліся ў плацдарм, дзе разгорнутыя ня толькі НАТАўскія сродкі радыёэлектроннай барацьбы і выведкі". "Ужо заяўленая і разрэкламаваная праграма шырокамаштабнага вяшчаньня СМІ на Беларусь", — заявіў ён. "Захад і падкантрольная яму так званая беларуская апазіцыя не шкадуюць намаганьняў для пошуку новых спосабаў фармаваньня негатыўнага грамадзкага меркаваньня і распаўсюджаньня пра нашу краіну дэструктыўных зьвестак".

***1 кастрычніка*** падчас цырымоніі адкрыцьця каля райцэнтру Бяроза (Берасьцейская вобласьць) першых у Беларусі нямецкіх вайсковых могілак часоў Другой сусьветнай вайны кіраўнікі мясцовага райвыканкаму рэкамендавалі прадстаўнікам нямецкага боку адмовіцца ад кантактаў з прэсай. Пра гэта паведаміла газета ***"Вечерний Брест"***. Паводле інфармацыі выданьня, адзін з кіраўнікоў Бярозаўскага раёну "параіў" карэспандэнтам агенцтва Reuters не рабіць фотаздымкаў з гэтага мерапрыемства.

***3 кастрычніка*** стала вядома, што ўсе беларускія друкарні, да якіх зьвярталася рэдакцыя ***"Народнай волі"***, адмовіліся супрацоўнічаць з выданьнем. Рэдакцыя "Народнай волі" заключыла дамову з друкарняй у Смаленску, дзе спадзяецца ўжо з 4 кастрычніка аднавіць выпуск газеты. Між тым, у падтрымку выданьня выказваюцца ўсё новыя ўплывовыя прадстаўнікі міжнароднай супольнасьці. Заяву пратэсту супраць дзеяньняў уладаў у дачыненьні газеты "Народная воля" прыняла Сусьветная кампанія за свабоду слова "Article 19". Заява накіраваная ў Адміністрацыю Прэзідэнта і Міністэрства інфармацыі. Прадстаўнік АБСЕ па свабодзе СМІ Міклаш Харашці даслаў аналагічныя лісты на адрас некалькіх афіцыйных асобаў у Менску: у прыватнасьці, міністру замежных справаў Сяргею Мартынаву і міністру інфармацыі Уладзіміру Русакевічу. "Я ўпэўнены, што закрыцьцё "Народнай волі" абернецца моцным рэгрэсам у разьвіцьці свабоднай прэсы ў Беларусі і будзе вялікай стратай для беларускага грамадзтва. Я зьвярнуўся да ўладаў з просьбай зрабіць усё магчымае, каб прадухіліць гэта", — паведаміў сп. Харашці. Уплывовая міжнародная аргані-

зацыя "Рэпарцёры бяз межаў" зьвярнулася да Аляксандра Лукашэнкі з патрабаваньнем спыніць уціск незалежных беларускіх выданьняў. Нагодай для звароту стала скасаваньне дамоваў на друк і распаўсюд "Народнай волі" і буйны штраф рэдакцыі ***"БДГ. Деловая газета***". Еўрапейскі Саюз выступіў з заявай у падтрымку "Народнай волі". "Еўрапейскі Зьвяз выказвае заклапочанасьць будучым незалежнай прэсы ў Беларусі ў сувязі з перасьледам апошняй штодзённай незалежнай газеты, — гаворыцца ў дакуменце. — Еўрасаюз асуджае несправядлівы штраф, накладзены на газету, а таксама ануляваньне кантрактаў на друк і распаўсюд дзяржаўнымі друкарнямі і дыстрыб'ютарамі-манапалістамі". Акрамя гэтага, Еўрасаюз зьвярнуўся да міністра інфармацыі Беларусі Уладзіміра Русакевіча з просьбай сустрэцца з кіраўнікамі дыпламатычных місій краін ЕС у Менску і абмеркаваць становішча са СМІ ў краіне. Заяву ЕС падтрымалі Балгарыя, Румынія, Турцыя, Харватыя, Албанія, Босьнія і Герцагавіна, Македонія, Сербія і Чарнагорыя, Ісландыя, Ліхтэнштэйн, Нарвегія і Украіна.

***3 кастрычніка*** газеце ***"Прессбол"*** прад'яўлены зыск на 14 мільёнаў 510 тысячаў. На газету пакрыўдзілася галоўны бухгалтар дзяржаўнай вучэльні алімпійскага рэзерву Сьвятлана Рамановіч. Па яе меркаваньні, артыкул "Вести с полей" нанёс ёй вялікую маральную шкоду. Хаця ў гэтым матэрыяле, які напісала вядомая біятланістка Сьвятлана Парамыгіна, прозьвішча Рамановіч нават не ўказвалася. Суд супраць выданьня распачынаецца 10 кастрычніка.

***4 кастрычніка*** амерыканскі грамадзка-палітычны часопіс ***"Time"*** назваў вядомую беларускую журналістку, намесьніцу рэдактара ***"БДГ. Деловая газета" Ірыну Халіп*** "Героем Еўропы" — 2005 у катэгорыі "Мужнае сэрца". "Журналістка выкрывае карупцыю ва ўладзе, не шкадуючы нават Аляксандра Лукашэнку. Яе не раз дапытвалі, зьбівалі", — гаворыцца ў артыкуле, прысьвечаным беларускай журналістцы.

***6 кастрычніка*** Ганцавіцкі раённы вузел электрасувязі (РВЭС) адмовіў газеце ***"Ганцавіцкі час"*** (ТАА "Выдавецкі дом "Інтэкс-прэс") у разьмяшчэньні рэкламнай абвесткі на мясцовым радыё аб правядзеньні падпіскі на гэтае выданьне. Як гаворыцца ў адказе начальніка Ганцавіцкага вузла электрасувязі Рылкі на імя дырэктара ТАА "Выдавецкі дом "Інтэкс-прэс" Уладзіміра Янукевіча, "выканаць просьбу не прадстаўляецца магчымым з-за вялікай колькасьці заявак віншавальнага характару і неабходнасьці разьмяшчэньня інфармацыі РВЭС ва ўказаны прамежак часу".

***7 кастрычніка*** пракуратура Менскай вобласьці не задаволіла скаргі галоўнага рэдактара газеты ***"Борисовские новости" Анатоля Букаса*** на папярэджаньне, вынесенае яму пракурорам г. Барысаву. Кіраўніцтва абласной пракуратуры ўпэўненае, што журналіст ня мае права абнарода-

ваць ня толькі матэрыялы суда, але і сваё меркаваньне пра яго. У лісьце, які падпісаў намесьнік пракурора вобласьці Кампанец, сьцьвярджаецца, што А. Букас няправільна трактуе ч.2 арт. 5 Закону “Аб друку і іншых СМІ”, лічачы, што забаронена публікаваць толькі копіі дакументаў, што знаходзяцца ў крымінальнай справе. Сп. Кампанец лічыць, што арт. 5 забараняе ня толькі распаўсюд інфармацыі, атрыманай у ходзе судовага слуханьня крымінальнай справы, але і “давядзеньне да ведама чытачоў асабістых вымыслаў аўтара”. У лісьце ўказваецца, што “пісьмовага дазволу на апублікаваньне якіх-небудзь артыкулаў пра дадзены судовы працэс да ўступленьня прысуду ў законную сілу” ні аўтару публікацыі, ні рэдакцыі “Борисовских новостей” не давалася. Нагадаем: падставай для папярэджаньня сталі 2 карэспандэнцыі пад назвай “Суд проходил в одни ворота”, апублікаваныя ў №№26 і 27 газеты ў чэрвені - ліпені і прысьвечаныя судоваму працэсу па крымінальнай справе ў дачыненьні да А. Букаса.

***6 кастрычніка*** патруль трэці раз за апошнія 10 дзён затрымаў сяброў КХП БНФ ***Аляксандра Салаўяна*** і ***Уладзіміра Плешчанку***, якія кожны чацьвер і панядзелак выходзяць на вуліцу Леніна ў Віцебску, каб распаўсюджваць партыйныя выданьні. Разам з імі быў затрыманы і беспартыйны ***Барыс Хамайда***, які распаўсюджвае ў Віцебску часопіс ***“ARCHE”*** і газету ***“Выбар”***. Але ў міліцыянтаў выклікалі падазрэньні ня гэтыя выданьні, а два асобнікі “Навінаў БНФ”, што ляжалі ў сумцы спадара Хамайды, і яго вырашылі везьці ў суд. Рашэньне міліцыянтаў адмяніў адзін з кіраўнікоў Чыгуначнага райаддзелу, якому спадар Хамайда здолеў давесьці, што бюлетэнь Партыі БНФ ён не распаўсюджвае. Аднак пад дзьвярыма кватэры апазіцыянера чакаў судовы выканаўца, які прыйшоў рабіць вопіс маёмасьці - для пагашэньня ранейшых нясплочаных штрафаў. Агульная сума гэтых штрафаў вельмі вялікая, а маёмасьці, якую можна было б канфіскаваць на такую суму, у кватэры спадара Хамайды не знайшлося.

***7 кастрычніка*** супрацоўнікі міліцыі ў Віцебску затрымалі ***Барыса Хамайду***. У пастарунку Чыгуначнага раёну ў яго забралі ўсе наяўныя асобнікі ***“БДГ. Деловая газета”***, газеты ***“Выбар”*** і часопіса ***“ARCHE”***, нягледзячы на наяўнасьць выходных дадзеных, “для вывучэньня”.

***7 кастрычніка*** міліцыянты затрымалі ў Гародні прафсаюзнага актывіста Івана Романа, які раздаваў рабочым заводу аўтаагрэгатаў нумар газеты ***“Народная Воля”***, прысьвечаны Кангрэсу дэмакратычных сілаў. У пастарунку мікрараёну “Дзевятоўка” на Івана Романа склалі пратакол аб распаўсюдзе ім газеты, пратакол дагляду ягоных рэчаў, пасьля чаго адпусьцілі. Іван Роман зазначае, што распаўсюд афіцыйна зарэгістраванага выданьня, якое выходзіць легальна, не забаронены законам.

***11 кастрычніка*** дэпутат Палаты прадстаўнікоў ***Вольга Абрамава*** на-

кіравала міністру інфармацыі Уладзіміру Русакевічу запыт з нагоды дзеяньняў уладаў у дачыненьні да ***“Народнай волі”*** і ***“БДГ. Деловая газета”***. “Прашу адказаць Вас на пытаньне, што абазначаюць фармулёўкі для датэрміновага скасаваньня дамоваў, раней заключаных з УП “Народная воля” адпаведна УП “Белсаюздрук” і ТАА “Чырвоная зорка”?”, - пытаецца дэпутат. “Наколькі я зразумела, рэдакцыю абвінавачваюць у апублікаваньні ў сродках масавай інфармацыі зьвестак і матэрыялаў, якія супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь... Мне незразумела, што хаваецца за гэтым расплывістым вызначэньнем...” В. Абрамава адзначае, што санкцыі ў дачыненьні да газеты зьвязаныя са “справай Гайдукевіча” і што рэдакцыя цалкам выканала свае матэрыяльныя абавязкі па судовым рашэньні. “Што перашкаджае аднавіць выпуск і раздробны гандаль выданьня на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь?” - задае пытаньне міністру інфармацыі В. Абрамава. Пры гэтым яна адзначае, што яе хадайніцтва аб аднаўленьні друку і масавага распаўсюду ў Беларусі датычыць ня толькі “Народнай волі”, але і “БДГ. Деловая газета”.

***11 кастрычніка*** галоўны рэдактар газеты ***“Народная воля” Іосіф Сярэдзіч*** накіраваў 109 дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Беларусі (усім, апроч Сяргея Гайдукевіча) просьбу вынесьці на наступнае паседжаньне парламенту пытаньне пра “Народную волю”. “Лічым незаконнымі дзеяньні кіраўнікоў “Беласаюздруку”, “Менгарсаюздруку”, “Менаблсаюздруку” і друкарні “Чырвоная Зорка”, якія ў аднабаковым парадку скасавалі дамовы на распаўсюд і друкаваньне газеты”, — піша ў сваім звароце да дэпутатаў Іосіф Сярэдзіч. Галоўны рэдактар “Народнай волі” просіць дэпутатаў “у межах прадастаўленай ім кампетэнцыі ініцыяваць вынясеньне пытаньня аб уціску “Народнай волі”, прыняць пастанову на адрас выканаўчай улады аб тэрміновым прыпыненьні перасьледу выданьня, а таксама аб выкананьні міжнародных абавязкаў у адносінах да СМІ”. Напярэдадні галоўны рэдактар “Народнай волі” сустракаўся з міністрам інфармацыі Ўладзімірам Русакевічам і абмяркоўваў з ім лёс незалежнага выданьня. Як распавёў Іосіф Сярэдзіч, размова з міністрам была складаная і безвыніковая.

***11 кастрычніка*** на паседжаньні Выканаўчага бюро Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) прынятае рашэньне арганізаваць масавую падпіску на ***“Народную волю”*** і аказаць дапамогу ў яе распаўсюджваньні з удзелам сяброў рэгіянальных партыйных структураў.

***12 кастрычніка Барыса Хамайду*** затрымалі за распаўсюд недзяржаўных выданьняў — ***“БДГ. Деловая газета”***, часопісу ***«ARCHE»*** і мясцовай газеты ***“Выбар***”. Прэтэнзіі супрацоўнікаў міліцыі Чыгуначнага райаддзелу Віцебску палягалі ў тым, што “Выбар” ня мае належных выходных дадзеных: замест адрасу рэдакцыі Барыс Хамайда, які выдае газету, пазначае, што яна выходзіць Крапівеньскім полі пад Воршай. На рэдакта-

ра і распаўсюдніка ў адной асобе склалі пратакол – за распаўсюд незарэгістраванага выданьня. Да пратаколу яны далучылі і сем нумароў газеты, каб усё разам перадаць на разгляд раённай адміністрацыйнай камісіі.

***12 кастрычніка*** кіраўніка Гарадзенскай суполкі ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" ***Паўла Мажэйку*** выклікалі ў Шчучынскі РАУС для допыту ў якасьці сьведкі. Спадар Мажэйка атрымаў позву па пошце, у ёй не ўказана, па якой справе яго выклікаюць, але было зазначана, што яго могуць даставіць у РАУС прымусова альбо аштрафаваць, калі ён будзе "злосна ўхіляцца" ад дачы паказаньняў. Павел Мажэйка не паехаў на допыт: яму не паведамілі прычыну, па якой выклікаюць, а таксама тое, хто яму аплаціць праезд у Шчучын і назад.

***24 кастрычніка*** Міністэрства інфармацыі выдала загад аб прызнаньні несапраўдным пасьведчаньня аб рэгістрацыі недзяржаўнай газеты ***"Курьер из Борисова"***. У загадзе гаворыцца, што пасьведчаньне прызнана несапраўдным на падставе рашэньня Гаспадарчага суда Менскай вобласьці ад 22 жніўня і выпіскі з пратаколу ліквідацыйнай камісіі ТДА "Пресс-сервис" ад 28 верасьня. Загад падпісала першая намесьніца міністра інфармацыі Лілія Ананіч. Нагадаем, што ў жніўні суд задаволіў зыск Менскага аблвыканкаму аб ліквідацыі ТДА "Пресс-сервис", якое выступае заснавальнікам газеты "Курьер из Борисова". Судзьдзя Тамара Бянчук прыняла пазіцыю аблвыканкаму і вырашыла прызнаць несапраўднай рэгістрацыю "Пресс-сервис", прызначыць ліквідацыйную камісію і зьліквідаваць прадпрыемства да 1 студзеня 2006 г.

***24 кастрычніка*** ў Лондане адбылося ганараваньне беларускай журналісткі, намесьніцы галоўнага рэдактара ***"БДГ. Деловой газеты" Ірыны Халіп*** прэміяй "Герой Еўропы" ў намінацыі "Мужнае сэрца". "Гэта прызнаньне таго, што няма нічога страшнага ў тым, што журналіст у таталітарнай дзяржаве бярэ на сябе яшчэ і нейкія функцыі грамадзкага дзеяча і праваабаронцы", – заявіла Ірына Халіп напярэдадні ўручэньня прэміі.

***24 кастрычніка*** — Сусьветны дзень дзеяньняў за доступ да інфармацыі. Міжнародная няўрадавая арганізацыя ***"Рэпарцёры бяз межаў"*** апублікавала справаздачу 2005 году аб сітуацыі са свабодай прэсы ў сьвеце. Першыя радкі займаюць паўночна-еўрапейскія краіны – Данія, Фінляндыя, Ісландыя, Ірландыя, Нарвегія. Замыкаюць сьпіс Туркменістан, Эрытрэя і Паўночная Карэя. Беларусь у гэтым сьпісе са 167-мі краінаў заняла 152-е месца, апусьціўшыся на 8 пунктаў – летась Беларусь была на 144-м месцы. Амаль усе постсавецкія краіны значна вышэй за Беларусь ў рэйтынгу, горш сітуацыя толькі ва Узьбекістане і Туркменістане (адпаведна 155-е і 164-е месцы). У рэйтынгу іншай арганізацыі – «Freedom House», якая таксама сочыць за свабодай прэсы, Беларусь займае 185-е месца

са 194-х. Такім чынам, за дзяржавай цьвёрда замацавалася слава “несвабоднай” у адносінах да СМІ.

З ***25 кастрычніка*** жыхары Гародні пазбаўленыя магчымасьці глядзець першую праграму Польскага тэлебачаньня. Замест гэтага аператар кабельных сетак ТАА “Гарадзенскі абласны тэхнагандлёвы цэнтр “Гарант” рэтранслюе Polsat. Як патлумачыў адзін са сьпецыялістаў прадпрыемства, зроблена гэта паводле адмысловага загаду Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. “Рэкамендацыя” Міністэрства інфармацыі дзіўным чынам супала з рашэньнем Польскага тэлебачаньня адкрыць у Гародні сталы карэспандэнцкі пункт, – каментуе сітуацыю вядомы гарадзенскі журналіст Андрэй Пачобут. – Фактычна беларускія ўлады зрабілі прэвентыўны ўдар па свабодзе слова, прадпрынялі контрмеру, дзеля таго, каб пазбавіць гарадзенцаў магчымасьці карыстацца з альтэрнатыўнай, непадкантрольнай крыніцай інфармацыі”.

***26 кастрычніка*** Вышэйшы гаспадарчы суд пакінуў у сіле папярэджаньне Міністэрства інфармацыі рэдакцыі газеты ***“Белорусы і рынок”*** у частцы, якая тычылася назвы выданьня. Судзьдзя Кацярына Караткевіч адмяніла толькі другую частку папярэджаньня, датычную парушэньня газетай ГОСТ 7.4-95. Такім чынам, выданьне пакуль ня зможа выкарыстоўваць абрэвіятуру “БР”, па якой чытач пазнае газету на працягу ўжо двух гадоў. Папярэджаньне рэдакцыі было вынесенае Міністэрствам інфармацыі ў верасьні. Падставай Мініфармацыі палічыла зьмяненьне назвы газеты “Белорусы и рынок” на “БР. Белорусы и рынок” без праходжаньня перарэгістрацыі, а таксама неналежнае афармленьне выпускных і падзагаловачных дадзеных.

***27 кастрычніка Уладзіміра Плешчанку*** аштрафавалі за распаўсюд партыйнай літаратуры, але паводле артыкулу “дробнае хуліганства”. Памер грашовага штрафу, які прысудзіў віцебскаму сябру КХП БНФ судзьдзя Чыгуначнага раённага суду Юры Урбан, складае адну базавую велічыню. Міліцыянты, якія затрымалі апазіцыянера, абвінавацілі яго ў тым, што ён абражаў віцебскіх мінакоў падчас распаўсюду партыйнага бюлетэню “Беларуская салідарнасьць”. Судзьдзя прызнаў спадара Плешчанку вінаватым у дробным хуліганстве, хаця распаўсюд газетаў пад гэты артыкул ніякім чынам не падпадае.

***28 кастрычніка*** прэс-сакратар Гомельскага аблвыканкаму Яўген Пабалавец адмовіўся прадаставіць уласнай карэспандэнтцы агенцтва ***БелаПАН Алене Пасканнай*** інфармацыю аб праграме візіту ў вобласьць міністра замежных справаў Беларусі Сяргея Мартынава. Ён заявіў, што журналістка пазбаўленая акрэдытацыі, якая дае магчымасьць працаваць карэспандэнтам інфармацыйнага агенцтва. Алена Пасканная папрасіла прадаставіць ёй афіцыйны дакумент, у якім былі б выкладзеныя прычыны

адмовы ў акрэдытацыі. Праз некаторы час прэс-сакратар аблвыканкаму патэлефанаваў і сказаў, што на нейкія мерапрыемствы журналістку будуць пускаць, а на нейкія — не. “Баюся, што пры такім варыянце хутка ўся інфармацыя для мяне стане недаступнай”, — сказала Алена Пасканная. Па інфармацыі БАЖ, пагроза пазбаўленьня А. Пасканнай акрэдытацыі ўзьнікла з-за незадаволенасьці прадстаўнікоў аблвыканкаму тым, што некаторыя паведамленьні карэспандэнткі БелаПАН перадрукоўвала газета “Народная воля”.

***31 кастрычніка*** на ўезьдзе ў Гародню на пасту ДАІ міліцыя затрымала аўтамабіль актывістаў Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Уладзіміра Чырвоненку*** і ***Юрыя Істоміна***. Супрацоўнік ДАІ, які іх затрымаў, адразу запатрабаваў адчыніць багажнік. Там знаходзіліся 4 тысячы асобнікаў газеты ***“Народная воля”***. ДАІшнік выклікаў супрацоўнікаў міліцыі з Гародні. Адразу на месцы быў складзены рапарт пра тое, што груз перавозіцца без дакументаў. Ю.Істоміна і У.Чырвоненка міліцыянты накіравалі ў РАУС Гарадзенскага раёну для разьбіральніцтва. Там быў складзены пратакол выняцьця накладу “Народнай волі”. Пасьля гэтага прадстаўнікоў АГП адпусьцілі, заявіўшы, што аддадуць газеты пасьля прадастаўленьня дакументаў, якія б пацьвярджалі іх права на распаўсюд і перавозку выданьня. Паміж рэдакцыяй выданьня і АГП заключаная дамова на распаўсюд “Народнай волі”, якую сябры АГП маюць намер прад’явіць начальніку Гарадзенскага РАУС. Партыйцы акцэнтуюць увагу на тым, што газеты былі прызначаныя для бясплатнага распаўсюду, пра што сьведчыў штамп на кожным з асобнікаў: “Для рэкламных мэтаў”.

***У канцы кастрычніка*** зьявіўся першы нумар часопісу ***“Magazyn Polski”***, як пазначана на вокладцы — “у эміграцыі”. Часопіс надрукаваны ў Польшчы накладам дзьве тысячы асобнікаў. “Magazyn Polski” раней выдаваў у Гародні Саюз палякаў. Цяперашняе выданьне зроблена Андрэем Пачобутам, які стаў галоўным рэдактарам “Magazyna Polskiego” пры старшыні Саюзу палякаў Анжаліцы Борыс. Аднак яму не ўдалося выпусьціць у Беларусі аніводнага нумару. Гаворыць Андрэй Пачобут: “Magazyn Polski” быў выдадзены ў Польшчы пры дапамозе нашых сяброў з партыі “Закон і справядлівасьць”. Гэты часопіс адрозьніваецца ад таго, які выдае афіцыйны Саюз палякаў. Афіцыйнае выданьне мае гісторыка-культурніцкі, краязнаўчы характар. Новы часопіс выглядае як грамадзка-палітычны.

***2 лістапада*** пракуратура Ленінскага раёну Гародні вынесла афіцыйнае папярэджаньне журналісту ***Анджэю Пісальніку*** за тое, што ён “абразіў беларускі народ” у адной са сваіх публікацыяў. Падставай для папярэджаньня стаў артыкул А. Пісальніка “Палякі Аляксандра Рыгоравіча”, які зьявіўся ў № 21 газеты “Glos znad Niemna”, што выдаецца ў Польшчы. Пракурор Урублеўскі, які падпісаў папярэджаньне, палічыў, што зьмест

гэтага артыкулу "прыніжае нацыянальны гонар і годнасьць" грамадзянаў РБ і цяперашняга старшыні Саюзу палякаў сп-ра Лучніка. У выпадку "працягу супрацьзаконнай дзейнасьці" пракуратура абяцае прыцягнуць журналіста да адказнасьці "ва ўстаноўленым законам парадку". У пракуратуры А. Пісальніку патлумачылі, што яго дзеяньні могуць быць кваліфікаваныя як парушэньне арт. 130 Крымінальнага кодэксу. На думку А. Пісальніка, прынцыпова тое, што ў гэтым папярэджаньні выданьне "Glos znad Niemna" фігуруе як "газета Рэспублікі Польшча": гэта значыць, што пракуратура сьвядома прымяніла да журналіста санкцыі за публікацыю ў замежнай прэсе. Ён расцэньвае гэты крок пракуратуры як спробу спыніць выданьне ў Польшчы газеты "Glos znad Niemna", які мае вялікі ўплыў на польскую супольнасьць у Беларусі.

***3 лістапада*** Гаспадарчы суд Менску пакінуў у сіле рашэньне Менгарвыканкаму аб ліквідацыі ТДА "Деньпресс" — заснавальніка і выдаўца газеты ***"День"***. У рашэньні Менгарвыканкаму падставай для ліквідацыі названа "неажыцьцяўленьне прадпрымальніцкай дзейнасьці на працягу 6 месяцаў запар і ненакіраваньне камерцыйнай арганізацыяй падатковаму органу паведамленьня аб прычынах неажыцьцяўленьня такой дзейнасьці". Кіраўніцтва ТДА "Деньпресс" палічыла гэтае рашэньне палітычна матываваным і падало ў суд. Паводле кіраўніка — Міколы Маркевіча, дзяржаўныя органы не жадаюць прызнаваць таго, што прадпрыемства ажыцьцяўляла гаспадарчую дзейнасьць: 26 траўня выпусьціла нумар газеты ў Смаленску, заключыла дамовы на яго распаўсюд і рэалізацыю, праводзіла аплату паслуг і г.д.

***7 лістапада*** ў Гомелі на плошчы Леніна супрацоўнікі міліцыі затрымалі сябра АГП ***Марыю Багдановіч***, калі яна раздавала гараджанам газеты ***"Товарищ"*** (выданьне Партыі камуністаў Беларускай) з укладзенымі ўлёткамі аб праблемах жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. М. Багдановіч пратрымалі ў апорным пункце міліцыі каля 2 гадзін, узяўшы з яе тлумачэньні і забраўшы 72 асобнікі газеты. Пратаколу супрацоўнікі міліцыі не складалі. Як адзначыла М. Багдановіч, асноўныя прэтэнзіі ахоўнікаў парадку былі зьвязаныя з улёткай, якая ня мела выходных дадзеных і, па іх меркаваньні, не падлягала распаўсюду. Праз тры дні Марыя Багдановіч была выкліканая ў пракуратуру Цэнтральнага раёну Гомелю. Памочнік пракурора Андрэй Лагуновіч абвясьціў, што ў дачыненьні да яе заведзеная адміністрацыйная справа паводле артыкулу 172, частка 8 – "Незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі сродку масавай інфармацыі", бо, як ён патлумачыў апазіцыйнай актывістцы, улёткі былі ўкладзеныя ў сярэдзіну газеты, і пракуратура расцэньвае іх цяпер як незарэгістраваны дадатак. Адміністрацыйную справу пракуратура накіравала ў суд.

***8 лістапада*** стала вядома, што газеты ***"Народная воля"*** і ***"Салідар-***

***насьць"*** выдаленыя з падпіснога каталогу на 2006 год. Рэдактары гэтых выданьняў атрымалі лісты ад кіраўніцтва прадпрыемства "Белпошта", у якіх тлумачыцца, што з 1 студзеня наступнага году спыняецца супрацоўніцтва з гэтымі газетамі. Кіраўніцтва "Белпошты" тлумачыць свой крок наступнымі словамі: "Кожны суб'ект гаспадараньня ў сваёй камерцыйнай дзейнасьці мае права кіравацца эканамічнай мэтазгоднасьцю". Рэдактар "Салідарнасьці" Аляксандр Старыкевіч і шэф-рэдактар "Народнай волі" Сьвятлана Калінкіна мяркуюць, што гэтае рашэньне ня ўласна "Белпошты", а хутчэй за ўсё, было прынятае значна вышэй. Сьвятлана Калінкіна лічыць, што пазбаўленьне чытачоў "Народнай волі" падпіскі зьяўляецца працягам кампаніі супраць газеты. Аляксандр Старыкевіч і Сьвятлана Калінкіна лічаць, што ў цяперашніх умовах стварыць незалежную сістэму распаўсюду ня вельмі рэальна, бо гэтая дзейнасьць падлягае ліцэнзаваньню. Сьвятлана Калінкіна сумняецца, што Міністэрства сувязі дасьць дазвол на такую дзейнасьць недзяржаўным распаўсюднікам. "Пасьля гэтага кроку ўладаў для недзяржаўных СМІ надыходзіць эпоха самвыдату і Інтэрнэту", — сказаў Аляксандр Старыкевіч. А Сьвятлана Калінкіна гаворыць, што выданьне газеты цяпер ня можа існаваць як бізнэс. На яе думку, грамадзка-палітычную недзяржаўную газету трэба выдаваць так, каб яе можна было раздаваць на вуліцы людзям бясплатна, а яе наклад мусіць быць ня меншым за наклад "Советской Белоруссии".

***8 лістапада*** ў Барысаве невядомы зьбіў журналіста недзяржаўнай газеты ***"Борисовские новости" Алеся Абрамовіча***. Здарэньне адбылося позна ўвечары непадалёк ад кватэры Алеся Абрамовіча. Невядомы напаў на яго і нанёс некалькі ўдараў па галаве, твары і тулаве. Непадалёк аказаліся знаёмыя журналіста, якія затрымалі нападніка і адвялі яго ў міліцыю. Барысаўская міліцыя заявіла, што мела месца "канфліктная сітуацыя паміж Абрамовічам і ўстаноўленай асобай" і зьбіраецца дасьледаваць гэты інцыдэнт. Міліцыянты па настойлівай просьбе А. Абрамовіча паведамілі яму імя і прозьвішча нападніка, які аказаўся супрацоўнікам аднаго з менскіх прыватных прадпрыемстваў. Аднак просьба пацярпелага аб узбуджэньні крымінальнай справы па факце яго зьбіцьця павінна быць разгледжаная толькі праз 10 дзён. І сам пацярпелы, і калегі журналіста зьвязваюць напад з яго прафесійнай дзейнасьцю.

***8 лістапада*** РУП "Белпошта" не ўключыла газету ***"Згода"*** ў падпісны каталог на першае паўгодзьдзе 2006 году. Пра гэта рэдакцыя даведалася з ліста в.а. генеральнага дырэктара прадпрыемства Ірыны Самсонавай. "Белпошта" спасылаецца на "немэтазгоднасьць" свайго далейшага супрацоўніцтва са "Згодай". "Белпошта" абвінавачвае выданьне ў парушэньні ўмоваў дамовы і пералічвае некалькі выпадкаў, калі рэдакцыя не паведаміла своечасова аб пераносе даты выхаду альбо не выйшла ў належны

час. Са свайго боку, галоўны рэдактар “Згоды” Аляксей Кароль кажа, што заўсёды інфармаваў прадпрыемства пра зьмены ў графіку выхаду газеты. Ён разглядае гэта як працяг доўгатэрміновай кампаніі па зачыстцы інфармацыйнай прасторы напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 г.

***9 лістапада*** асабістую акцыю пратэсту супраць таго, што з шапікаў “Белсаюздруку” зьнікла газета ***“Народная воля”***, правёў горацкі незалежны журналіст Эдуард Брокараў. Скарыстаўшыся ўвядзеньнем ва ўстановах і арганізацыях краіны так званых “Кніг прапаноў”, журналіст Эдуард Брокараў пакінуў свае скаргі на адсутнасьць “Народнай волі” ў “саюздрукаўскіх” шапіках Горак, суседняй Воршы і абласнога цэнтру. Неўзабаве ён атрымаў афіцыйны адказ з Воршы, які падпісаў начальнік раённага “Саюздруку” Аляксандр Кохаў. У адказе паведамляецца, што падначаленая сп.Кохаву арганізацыя “зьяўляецца структурным падразьдзяленьнем рэспубліканскага прадпрыемства “Саюздрук”, і што менавіта гэтае цэнтральнае ведамства мае права заключаць дамовы на продаж у сваіх гандлёвых кропках тых альбо іншых тавараў”. Такі адказ Э.Брокарава не задаволіў, паколькі кожнае раённае прадпрыемства “Саюздруку” мае статус юрыдычнай асобы і валодае поўнай гаспадарчай самастойнасьцю.

***10 лістапада*** ў судзе Цэнтральнага раёну Менску пачаўся судовы працэс па зыску былога бухгалтараДзяржаўнай вучэльні алімпійскага рэзерву Сьвятланы Рамановіч да газеты ***“Прессбол”***. Да суду спрычыніўся газетны артыкул “Весткі з палёў”, які, на думку хработніка, закрануў яе гонар і годнасьць. І хоць прозьвішча самой Рамановіч у матэрыяле ня ўзгадвалася, яна запатрабавала матэрыяльнай кампенсацыі ў памеры 14,5 мільёны рублёў. Месяц таму, падчас папярэдняй размовы ў судзе Сьвятланы Рамановіч з рэдактарам газеты “Прессбол” Уладзімірам Беражковым і аўтаркай артыкулу Сьвятланай Парамыгінай, да міравога пагадненьня бакі не прыйшлі. Як паведаміў галоўны рэдактар “Прессбола”, усе чатыры сьведкі з боку адказьніка пацьвердзілі праўдзівасьць выкладзеных у артыкуле зьвестак. З боку зыскоўцы сьведкаў не было.

***10 лістапада*** на міні-рынку ў Ваўкавыску міліцыя затрымала распаўсюдніцу недзяржаўнай ***“Местной газеты” Маргарыту Макавецкую*** і забрала ў яе 400 асобнікаў выданьня. Міліцыянты склалі на М. Макавецкую пратакол і даставілі ў суд Ваўкавыскага раёну, які ў той жа дзень аштрафаваў яе на 10 тысячаў рублёў за гандаль у неналежным месцы. Галоўны рэдактар газеты А. Шантаровіч лічыць, што міліцыя дзейнічала па распараджэньні старшыні райвыканкаму Міхаіла Савельева. Ён лічыць, што санкцыі ў дачыненьні да газеты зьвязаныя з актыўным асьвятленьнем у ёй канфлікту паміж мясцовымі ўладамі і ваўкавыскім прадпрымальнікам Мікалаем Аўтуховічам.

***10 лістапада*** Грамадзкае аб'яднаньне ***"Беларуская асацыяцыя журналістаў"*** заклікала чытачоў выступіць у абарону сваіх правоў і падтрымку незалежных газетаў. Пратэсты і звароты БАЖ прапанаваў накіроўваць генеральнаму дырэктару РУП "Белпошта" і міністру сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, па меркаваньні БАЖ, кожны можа ўнесьці запіс у Кнігу заўвагаў і прапановаў у сваім паштовым аддзяленьні. У адпаведнасьці з прэзідэнцкім дэкрэтам № 2 ад 14 студзеня 2005 году "Аб удасканаленьні працы з насельніцтвам" гэтая кніга павінна быць прад'яўлена па першым патрабаваньні грамадзяніна, а прапановы і заўвагі — разгледжаныя на працягу 15 дзён. "Надышоў той момант, калі трэба сказаць "не" свавольству. Разам абаронім сваё права на атрыманьне інфармацыі", — гаворыцца ў заяве "Беларускай асацыяцыі журналістаў".

***11 лістапада*** рэдакцыя недзяржаўнай газеты ***"Згода"*** атрымала папярэджаньне ад Міністэрства інфармацыі. Выданьне абвінавачваюць у распаўсюдзе зьвестак, якія зьневажаюць гонар і годнасьць Аляксандра Лукашэнкі. Паводле Міністэрства інфармацыі, зьнявага ўтрымліваецца ў шэрагу публікацыяў і калажаў, надрукаваных у некалькіх нумарах "Згоды". Галоўны рэдактар газеты Аляксей Кароль тлумачыць, якія менавіта публікацыі зьявіліся падставай для папярэджаньня: "У нас быў калаж з мапай краінаў СНД, і на месцы, дзе была Беларусь, не было падпісана, што гэта Беларусь, а зьмяшчаўся твар, падобны да твару прэзідэнта Беларусі. Што да тэкстаў, то было інтэрв'ю са мной пра рэвалюцыю 1905 году. Там быў такі загаловак – гэта была фраза з інтэрв'ю – "Жывучы ў лукашэнкаўскай Беларусі, я лепш разумею падзеі 1905 году". І вось гэты загаловак гэтаксама трактаваны як інфармацыя, якая абражае гонар прэзідэнта". Галоўны рэдактар "Згоды" Аляксей Кароль зьвяртае ўвагу на тое, што большасьць публікацыяў, згаданых у папярэджаньні, ужо фігуравалі ў адміністрацыйных справах супраць яго і спадара Зьдзьвіжкова. У верасьні іх аштрафавалі на 100 базавых велічыняў кожнага за распаўсюд праз СМІ зьневажальных для прэзідэнта зьвестак.

***11 лістапада*** стала вядома, што ў Пінску супрацоўнікі паштовых аддзяленьняў "ня раюць" выпісваць недзяржаўную газету ***"Мясцовы час"***, спасылаючыся на тое, што паштары ня будуць яе дастаўляць па хатніх адрасах падпісчыкаў ужо з новага году. У прыватнасьці, такую "рэкамендацыю" супрацоўніца службы маніторынгу ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" пачула ў паштовым аддзяленьні №16. Супрацоўнікі пошты адмовіліся патлумачыць, ад каго зыходзіць гэтая інфармацыя і хто прадпісаў ім "інструктаваць" падпісчыкаў "Мясцовага часу". Недзяржаўная газета "Мясцовы час", якая выдаецца ў Пінску, даўно адчувае на сабе прэсінг мясцовых уладаў. Пінскае аддзяленьне "Белсаюздруку" адмаўляецца заключаць з выданьнем дамову на продаж яго ў кіёсках, спасылаючыся на перагружанасьць прэсай. Грамадзкім распаўсюднікам "МЧ" забараняюць гандляваць газетай у людных месцах пад пагрозай карных санкцыяў. Па

інфармацыі галоўнага рэдактара выданьня Віктара Ярашука, на нарадзе аддзелу ідэалогіі Пінскага гарвыканкаму адкрыта гаварылася пра неабходнасьць "выжыць" з гораду гэтую газету.

***12 лістапада*** ў Вілейцы міліцыянтамі былі затрыманыя мясцовыя актывісты дэмакратычнага руху ***Уладзімір Малярчук*** і ***Мікалай Сусла***. Яны распаўсюджвалі на гарадзкім рынку бюлетэнь з заклікам да грамадзянаў далучыцца 16 лістапада да Дня салідарнасьці. Каля дзьвюх гадзінаў У.Малярчук і М.Сусла правялі ў пастарунку, дзе ў іх былі канфіскаваныя звыш ста асобнікаў бюлетэню і складзены пратакол, пасьля чаго актывісты былі адпушчаныя.

***12 лістапада*** стала вядома, што рэдакцыю Івацэвіцкай недзяржаўнай ***"Газеты для Вас"*** могуць выселіць з памяшканьня, дзе яна месьцілася на працягу апошніх трох гадоў. Па зьвестках рэдакцыі, ініцыятарам скасаваньня арэндных дамоўленасьцяў з газетай выступае райвыканкам. Адзін з кіраўнікоў раёну (які папрасіў не называць яго імя) паведаміў галоўнаму рэдактару выданьня ***Лідзіі Цалуйка,*** што на адной з нарадаў у райвыканкаме быў аддадзены загад усім аб'ектам камунальнай уласнасьці і прадпрымальнікам не прадастаўляць рэдакцыі "Газеты для Вас" памяшканьняў для арэнды. Арандаванае рэдакцыяй памяшканьне належыць райбыткамбінату. У гутарцы з Л. Цалуйкай старшыня Івацэвіцкага райвыканкаму Анатоль Ткачук заявіў, што ў верасьні 2006 году ў Івацэвічах будуць праводзіцца "Дажынкі", і таму рэдакцыйнае памяшканьне спатрэбіцца для канторы райбыткамбінату.

***14 лістапада*** рэдакцыя газеты ***"Народная воля"*** падала ў Гаспадарчы суд Менску зыск супраць РУП "Белпошта", якое адмовілася ўключаць выданьне ў падпісны каталог на 2006 год. "Мы патрабуем ад суда прымусіць адказчыка заключыць дамову на распаўсюд газеты "Народная воля" на ўмовах, прадугледжаных аналагічнай дамовай на 2005 год", — заявіў галоўны рэдактар выданьня Іосіф Сярэдзіч. Па яго словах, у бліжэйшых нумарах "Народнай волі" падпісчыкам выданьня патлумачаць, якім чынам яны могуць адстаяць сваё права падпіскі на газету. "Мы проста дамо юрыдычную кансультацыю нашым чытачам. Пасьля гэтага, я ўпэўнены, "Белпошта" атрымае тысячы аналагічных зыскаў ад нашых падпісчыкаў", — адзначыў І. Сярэдзіч.

***14 лістапада Аляксандр Манцэвіч*** – дырэктар ТАА ***"Рэгіянальная газета"*** і галоўны рэдактар аднайменнага выданьня — атрымаў ліст ад генеральнага дырэктара РУП "Белпошта", у якім паведамляецца, што яго выданьне ня ўключанае ў падпісны каталог на першае паўгодзьдзе 2006 г. ТАА "Рэгіянальная газета" абвінавачваюць у тым, што яно "неаднаразова парушала" свае абавязальніцтвы перад "Белпоштай": у прыватнасьці, не плаціла за ўключэньне выданьня ў падпісны каталог на 2005 г.; не аплоч-

вала рахункаў за дастаўку газетаў павышанай палоснасьці; нясвоечасова паведамляла пра неабходнасьць павышэньня палоснасьці. У лісьце, які падпісала генеральны дырэктар Аляксандра Чарняк, гаворыцца, што "РУП "Белпошта" знаходзіцца ў складаным эканамічным становішчы", і што "выкананьне фінансавай дысцыпліны – найважнейшая з умоваў заключэньня дамоваў". "Акрамя таго, адсутнасьць своечасовай інфармацыі пра павелічэньне палоснасьці выданьня дэстабілізуе працу падразьдзяленьняў паштовай сувязі, занятых эксьпедыяваньнем і перавозкай друку", — гаворыцца ў лісьце. Паводле А. Манцэвіча, фармальныя "зачэпкі" для скасаваньня дамоўленасьцяў з выданьнем у "Белпошты" былі. Але ўсе пералічаныя "парушэньні абавязальніцтваў" адбываліся з ведама "Белпошты" і без усялялкіх прэтэнзіяў з боку прадпрыемства, якое заўсёды пакрывала свае дадатковыя выдаткі з "падпісных" грошай "Рэгіянальнай газеты". "Па сутнасьці, гэта зачэпкі, якія можна знайсьці ў дзейнасьці любога суб'екта гаспадараньня, — лічыць А. Манцэвіч.— Мяне абурае такая розьніца ў стаўленьні да прадпрыемстваў дзяржаўнай і недзяржаўнай формы ўласнасьці… На маю думку, гэта палітычнае рашэньне…».

***14 лістапада*** са старонак вядучага беларускага парталу ***TUT.BY*** былі зьнятыя банеры з заклікам прыняць удзел у Дні салідарнасьці з палітзьняволенымі. Гэта яшчэ адно сьведчаньне кантролю ўладаў над інтэрнэт-рэсурсамі.

***15 лістапада*** стала вядома пры тыя метады, з дапамогай якіх улады намагаюцца кантраляваць інтэрнэт. Паводле правілаў для кампутарных клубаў, усе карыстальнікі, якія прыйшлі папрацаваць у інтэрнэце, абавязаныя пакінуць у журнале свае пашпартныя зьвесткі і адрас. Апроч таго, у клубе мусіць быць усталяванае праграмнае забесьпячэньне, якое запісвае ўсё, што карыстальнік робіць у інтэрнэце. Сябра арганізацыі "Трэці шлях" Андрэй Абозаў, які праходзіць сьведкам па крымінальнай справе за разьмяшчэньне мультфільмаў палітычнага зьместу на сайце, патлумачыў: "Дзяржава намагаецца кантраляваць інтэрнэт, уплываць на яго, абмяжоўваць доступ да іІнтэрнэту. Дастаткова згадаць блакаваньне сайтаў апазіцыйных арганізацыяў падчас выбарчай кампаніі. Гэта непрымальна для дэмакратычнай краіны. У нас манаполія на інтэрнэт — калі ўсе правайдэры вымушаныя атрымліваць доступ у інтэрнэт толькі праз канал "Белтэлекам", то гэта таксама рычаг уціску". У інтэрнэт-кавярнях карыстальнікі далёка не заўсёды могуць наведаць сайты апазіцыйных арганізацыяў, а таксама моладзевых студэнцкіх структураў, альтэрнатыўных БРСМ. Ва ўнівэрсітэтах у кампутарных аўдыторыях студэнцкая моладзь пазбаўленая такой магчымасьці цалкам.У 2001 годзе ў Крымінальным кодэксе зьявіўся адмысловы разьдзел: "Злачынства супраць інфармацыйнай бясьпекі". Крымінальная адказнасьць прадугледжаная за несанкцыянаваны доступ у інтэрнэт, зьнішчэньне інфармацыі і псаваньне сайту.

***15 лістапада "Рэпарцёры бяз межаў"*** апублікавалі штогадовы сьпіс дзяржаваў – "ворагаў інтэрнэту". Узначальваюць яго Кітай і Іран. Беларусь, Узьбекістан і Туркменістан названыя ў шэрагу рэпрэсіўных дзяржаваў, якія спрабуюць кантраляваць віртуальную прастору дзеля змаганьня з палітычнай апазіцыяй. Кіраўнік аддзелу інтэрнэту арганізацыі "Рэпарцёры бяз межаў" Жульен Пэн лічыць, што самая вялікая пагроза правам чалавека ў віртуальнай прасторы – дыктатарскія ўрады. Цэнзураваньне і забарона – дзьве асноўныя стратэгіі змаганьня дыктатараў з сусьветнай павуцінай. Беларусь трапіла ў сьпіс у 2003 г. разам з Зімбабвэ, лідэр якой лічыць сусьветную павуціну абсалютным злом. У сёлетнім дасьледаваньні "Рэпарцёры бяз межаў" зазначаюць: у Беларусі лягчэй за ўсё сачыць за карыстальнікамі Інтэрнэту, бо доступ да яго забясьпечвае дзяржаўны правайдэр, які ахвотна дае прыватную інфармацыю аб сваіх кліентах сьпецслужбам. Улетку 2005 г., адзначаюць праваабаронцы, беларускія ўлады перасьледавалі арганізацыю "Трэці шлях" (3dway.org), якая разьмясьціла мультфільмы пра Аляксандра Лукашэнку на сваім сайце.

***15 лістапада*** рэдакцыя ***"Нашай Нівы"*** высьветліла, што газету не ўключылі ў падпісны каталог на 2006 год. Пры гэтым ніякіх паведамленьняў ад "Белпошты" рэдакцыя не атрымлівала. Такі вось падарунак да 100-годзьдзя выданьня. Рэдактар "Нашай Нівы" Андрэй Дынько даведаўся, што на газету нельга падпісацца, ад чытачоў. На пошце насамрэч высьветлілася, што яе няма ў каталогу. Апроч "Нашай Нівы", з яго зьніклі рэгіянальныя недзяржаўныя выданьні "Газета Слонімская", "Вольнае Глыбокае", "Витебский курьер", "Брестский курьер" і баранавіцкая газета "IntexPress". Андрэй Дынько лічыць, што калі газеты ня будуць распаўсюджвацца праз "Белпошту", то гэта будзе злачынствам супраць беларускай культуры. "Гэта сьведчыць аб тым, што ў краіне няма больш ніякіх правілаў, і аб тым, што ў Беларусі больш ня можа быць свабодных выбараў. Таму, на маю думку, стратэгічна гэта моцна аслабляе сам рэжым. Што ж датычыць "Нашай Нівы", рэгіянальных газет, то гэта яшчэ і культурнае злачынства. Беларуская прэса, беларускамоўныя выданьні, складаюць 10% ад усіх выданьняў, але яны складаюць 70% ад усіх забароненых выданьняў. Гэта вынішчэньне беларускай культуры", — заявіў Андрэй Дынько.

***15 лістапада*** адбылася прэсавая канферэнцыя амбасадара ЗША ***Джорджа Крола***, якая была скліканая пасьля шэрагу скандальных паведамленьняў дзяржаўных тэлеканалаў Беларусі ў адрас ураду Злучаных Штатаў і супрацоўнікаў амерыканскай амбасады ў Менску. Спадар Крол сьцьвярджае: "Амаль штодзённа дзяржаўныя медыі Беларусі заяўляюць, што Злучаныя Штаты нібыта жадаюць дэстабілізаваць сітуацыю ў Беларусі, распаліць тут рэвалюцыю і падпарадкаваць амерыканскай "імперскай волі". Іншыя прадстаўнікі беларускага ўраду робяць абсурдныя заявы пра тое, што ЗША нібыта распрацавалі план дэстабілізацыі Беларусі, цы-

тую: "ажно да інтэрвенцыі"… У той жа час дзяржаўныя медыі малююць амерыканскіх дыпламатаў як злавесных шпіёнаў. Такія фармулёўкі з дэзінфармацыяй, скажэньнямі і нават хлусьнёй закліканыя не інфармаваць беларускае грамадзтва, а хутчэй фармаваць адмоўнае стаўленьне да ЗША, да каштоўнасьцяў дэмакратыі і свабоднага выбару, якія доўгі час падтрымліваюць ЗША і іншыя дэмакратыі рэгіёну". Амбсадар Крол параўнаў атмасферу, якую ствараюць беларускія СМІ, з тым, што было падчас халоднай вайны ў краінах Варшаўскай дамовы і СССР. Ён паведаміў, што сваю занепакоенасьць з гэтай прычыны амбасада ЗША выказала беларускім уладам — у прыватнасьці, Міністэрству замежных справаў, зазначыўшы, што яна разглядае гэта як кампанію супраць Злучаных Штатаў у дзяржаўных медыях Беларусі. Спадар Крол катэгарычна заявіў, што Злучаныя Штаты паважаюць суверэннае права беларускага народу вызначаць свой уласны палітычны лёс і выбіраць накірункі разьвіцьця без запалохваньня і прымусу, як унутранага, гэтак і зьнешняга, а таксама, што ягоная краіна адкрыта выступае за дэмакратычныя працэдуры, свабодныя і справядлівыя выбары ў Беларусі, вольныя СМІ, свабоду ад прымусу, запалохваньня і пагрозаў на адрас грамадзянаў ці арганізацыяў, якія імкнуцца мірна ўдзельнічаць у палітычным жыцьці нацыі.

***17 лістапада*** стала вядома, што з менскіх крамаў і інтэрнэт-кавярняў канфіскаваныя асобнікі часопісу ***"Студэнцкая думка"***. Часопіс быў заснаваны ў 1924 годзе, у сучасным выглядзе паўстаў напрыканцы 1980-х у асяродку нацыянальна-дэмакратычнай моладзі. Выданьне было зарэгістраванае, але ў 2003 годзе пазбаўленае рэгістрацыі. Апошнія гады "Студэнцкая думка" выходзіць як каляровы моладзевы часопіс накладам 299 асобнікаў, што не патрабуе рэгістрацыі. Сярод іншага, часопіс бясплатна распаўсюджваўся больш як у дзесяці крамах і інтэрнэт-кавярнях у цэнтры Менску. Часопіс быў канфіскаваны з крамы "Трафік" і інтэрнэт-кавярні "Саюз он лайн", а таксама ў краме "Падземка". Паводле сьведкаў, двое мужчынаў, якія гэта рабілі, былі ў міліцэйскай форме, а двое — у цывільным. Прадстаўнік рэдакцыі часопісу, які выступае пад псеўданімам Андрыяс Копыс, наступным чынам пракаментаваў сітуацыю: "Мы толькі дзіву даемся: хто ці што прымусіла дарослых ахоўнікаў правапарадку бегаць не за менскімі бандзюкамі, а ў пошуках часопісу".

***17 лістапада*** Гаспадарчы суд Менску прызнаў неістотнымі падставы для скасаваньня дамовы друкарняй "Чырвоная зорка" з газетай ***"Народная воля"*** і запатрабаваў, каб было аднаўленае выданьне газеты на гэтым паліграфічным прадпрыемстве. Рашэньне судзьдзі Менскага гаспадарчага суда Нэлі Арлоўскай абавязаць друкарню аднавіць друкаваньне газеты галоўны рэдактар "Народнай волі" Іосіф Сярэдзіч пракаментаваў так: "Я іншага і не чакаў. Тут нават і не было за што зачапіцца. Калі б суд прыняў іншае рашэньне, то для нас гэта было б адназначна, што ў нашай

краіне судоў няма наогул. А так, дзякуй Богу, справядлівасьць аднавілася". Разам з тым Гаспадарчы суд Менску не задаволіў зыску "Народнай волі" да прадпрыемства "Белсаюздрук". Падчас судовага працэсу старшыня гэтага прадпрыемства былы міністр інфармацыі Міхаіл Падгайны спасылаўся на тое, што дамова была датэрмінова скасаваная ў аднабаковым парадку на падставе дадатковага пагадненьня, якое нібыта было заключанае з "Народнай воляй" сёлета ў студзені. У адпаведнасьці з ім "Белсаюздрук" мае права скасаваць дамову ў аднабаковым парадку без папярэдняга папярэджаньня, калі газета парушае Закон аб сродках масавай інфармацыі. Міхаіл Падгайны згадаў тры сёлетнія папярэджаньні Міністэрства інфармацыі ў адрас "Народнай волі". Аднак даць арыгінал дадатковага пагадненьня, які падпісалі б абодва бакі, Міхаіл Падгайны ня здолеў. Паводле яго, яно згубілася. Патрабаваньні "Народнай волі" аднавіць распаўсюд газеты ў сталіцы праз сістэму прадпрыемства "Менгарсаюздрук" Гаспадарчы суд Менску таксама не задаволіў. Іосіф Сярэдзіч заявіў, што будзе абскарджваць гэтыя рашэньні ў судах вышэйшай інстанцыі. Судовае паседжаньне па справе з "Менаблсаюздрукам" перанесенае на 21 лістапада ў сувязі з хваробай прадстаўніка адказьніка.

***18 лістапада*** Еўрасаюз і Нарвескі Саюз журналістаў выступілі з заявамі адносна сітуацыі вакол недзяржаўных СМІ Беларусі. Нарвежскі саюз журналістаў выступіў з асуджэньнем ціску, які дзяржава робіць на прыватныя медыі ў Беларусі. "Рашэньне дзяржаўнай кампаніі "Белпошта" спыніць распаўсюд прыватных выданьняў у год прэзідэнцкіх выбараў — гэта чарговы сур'ёзны ўдар па свабодзе выказваньня ў Беларусі... Нарвескі саюз журналістаў разглядае рашэньне "Белпошты" як частку цынічнай кампаніі па зьнішчэньні незалежных галасоў напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў", — гаворыцца ў заяве.  Еўрасаюз выказаў "сурьёзную занепакоенасьць" рашэньнем РУП "Белпошта" не ўключаць у падпісны каталог на першае паўгодзьдзе 2006 г. газетаў "Згода", "Народная воля" і "Салідарнасьць", што можа "рэзка абмежаваць" распаўсюд гэтых выданьняў. "Недастатковае захаваньне свабоды СМІ і свабоды выказваньня ў Беларусі працягвае сур'ёзна непакоіць Еўрасаюз", — адзначаецца ў заяве.

***18 лістапада*** Міністэрства інфармацыі РБ анулявала пасьведчаньне пра рэгістрацыю незалежнай газеты ***"Маладзёжны праспект"***.

***18 лістапада*** стала вядома, што Барысаўскі раённы вузел паштовай сувязі ня будзе заключаць дамовы з недзяржаўнай газетай ***"Борисовские новости"*** на першае паўгодзьдзе 2006 году. Пра гэта галоўны рэдактар выданьня ***Анатоль Букас*** даведаўся з афіцыйнага ліста ад начальніка Барысаўскага РУПС, у якім гаворыцца, што прадпрыемства "ня лічыць мэтазгодным" супрацоўнічаць з газетай, паколькі рэдакцыя парушала да-

мову на прыём і дастаўку падпісных накладаў газеты на 2-е паўгодзьдзе 2005 году.

***21 лістапада*** Менскі гарадзкі гаспадарчы суд адхіліў зыск рэдакцыі газеты ***"Народная воля"*** да унітарнага прадпрыемства "Менаблсаюздрук", якое з 1 кастрычніка скасавала дамову на раздробны продаж газеты праз кіёскі ў Менскай вобласьці.

***21 лістапада*** галоўны рэдактар газеты "***Борисовские новости" Анатоль Букас*** паведаміў, што пракуратура правярае некаторыя публікацыі ў выданьні, якое ён узначальвае. Пракуратура г. Барысаву павінна даць "прававую ацэнку" некалькім артыкулам, што былі апублікаваныя ў газеце (№№29-31 за 2005 г.), і "прыняць адпаведнае рашэньне аб мерах пракурорскага рэагаваньня". Адпаведнае распараджэньне прыйшло з пракуратуры Менскай вобласьці, якая, у сваю чаргу, атрымала даручэньне з Пракуратуры РБ (аддзел па наглядзе за выкананьнем правоў і свабодаў грамадзянаў). У пасланьні рэспубліканскай пракуратуры гаворыцца, што Міністэрства інфармацыі па даручэньні Менаблвыканкаму прааналізавала шэраг артыкулаў на прадмет "злоўжываньня свабодай масавай інфармацыі" рэдакцыяй газеты "Борисовские новости", але "не знайшло падставаў для прымяненьня да рэдакцыі санкцыяў у апаведнасьці з Законам РБ "Аб друку і іншых СМІ". У той жа час з ліста вынікае, што менавіта Міністэрства інфармацыі зьвярнулася ў пракуратуру з просьбай "даць прававую ацэнку" гэтым жа публікацыям. (Гаворка ідзе пра артыкулы "Душат свободу слова", "Александра Григорьевича сменит Виктор Александрович?", "Я буду защищать власть с оружием в руках", "Белорусское чудо", "К лицу ли лавровый венок", "Бесит позиция ЕС", "Трудоустроил сыновей", "Лингвинисты" нам не нужны", "Последняя стройка коммунизма", "Дипломатический скандал" і др). "Я мяркую, што на самым высокім узроўні прынятае рашэньне любымі шляхамі перашкодзіць распаўсюду інфармацыі праз газету "Борисовские новости" для жыхароў Барысаўшчыны", — заявіў галоўны рэдактар выданьня Анатоль Букас.

***21 лістапада*** намесьнік старшыні Бабруйскага гарадзкога выканаўчага камітэту па ідэалогіі Міхаіл Кавалевіч забараніў мясцовым газетам прымаць рэкламныя абвесткі, у якіх гаворыцца пра прыезд 24 лістапада ў Бабруйск лідэра дэмакратычных сілаў Беларусі Аляксандра Мілінкевіча. Паводле Алеся Чыгіра, які зьяўляецца адным з арганізатараў візіту Аляксандра Мілінкевіча, актывісты дэмакратычных сілаў гораду зьвярнуліся ў рэдакцыі мясцовых газетаў "Камерцыйны кур'ер" і "Вячэрні Бабруйск" з просьбай зьмясьціць на іх старонках рэкламную платную абвестку пра гарачую тэлефонную лінію Аляксандра Мілінкевіча з жыхарамі гораду. Адна з газетаў нават прыняла аплату за рэкламу, але пасьля ўмяшальніцтва чыноўнікаў гарвыканкаму рэдакцыя прыняла рашэньне

не друкаваць абвестку і вярнула арганізатарам гарачай тэлефоннай лініі пералічаныя грошы.

***23 лістапада*** Івацэвіцкі раённы вузел паштовай сувязі прыпыніў падпіску на недзяржаўную ***"Газету для Вас"***. Пра гэта галоўны рэдактар газеты ***Лідзія Цалуйка*** даведалася ад супрацоўнікаў РВПС, якія спасылаліся на пісьмовае распараджэньне "зьверху" не падпісваць на выданьне "да асобага ўказаньня". Паводле Л. Цалуйкі, нягледзячы на адсутнасьць газеты ў падпісным каталогу на 2006 г., да гэтага дня падпіска на яе прымалася. У верасьні рэдакцыя атрымала ад Брэсцкай філіі РУП "Белпошта" прапанову прадаставіць зьвесткі аб выданьні для фармаваньня падпіснога кошту на яго, а таксама прапанову заплаціць за ўключэньне ў падпісны каталог (што выданьне і зрабіла). Рэдакцыя атрымала з Івацэвіцкага РВПС паведамленьне аб зацьверджаных коштах на падпіску. Л. Цалуйка абураная тым, што раённая пошта, з якой газета працуе столькі гадоў запар, не дае рэдакцыі інфармацыі аб прычынах спыненьня падпіскі.

***28 лістапада*** стала вядома, што больш як 1200 гарадзенцаў падпісалі ліст да міністра інфармацыі з патрабаваньнем аднавіць трансьляцыю Першага каналу Польскага тэлебачаньня ***TVP-1***. У лісьце зазначаецца, што Першая праграма Польскага тэлебачаньня дазваляе жыхарам Гарадзеншчыны аператыўна атрымліваць інфармацыю аб жыцьці суседзяў, што спрыяе наладжваньню добрых дачыненьняў і ўмацаваньню сяброўства паміж народамі Беларусі і Польшчы.

***28 лістапада*** прадпрыемства "Менгарсаюздрук" скасавала дамову з недзяржаўнай газетай ***"Салідарнасьць"*** па падпісцы на выданьне. Пра гэта рэдакцыя газеты даведалася з афіцыйнага ліста ад дырэктара прадпрыемства І. Дудзіч. Аб прычынах скасаваньня дамовы, якая была заключаная толькі ў сярэдзіне верасьня, у пасланьні не гаворыцца. Як патлумачыў галоўны рэдактар газеты Аляксандр Старыкевіч, ніякіх парушэньняў з боку газеты не магло быць, бо дамова яшчэ нават не пачала выконвацца: гэта была дамова аб супрацоўніцтве на 2006 г. Днямі недзяржаўная газета "Витебский курьер" атрымала аналагічнае пасланьне ад дырэктара УП "Віцебскаблсаюздрук" Л. Южык. У лісьце паведамляецца, што прадпрыемства спыняе "договорные отношения" з выданьнем з 01.01.2006 г. Прадпрыемствы "Віцебскаблсаюздрук" і "Менгарсаюздрук" уваходзяць у сістэму Міністэрства інфармацыі і займаюцца рэалізацыяй друкаванай прадукцыі оптам і раздробна; распаўсюдам паасобна і па падпісцы перыядычных выданьняў праз сетку крамаў і кіёскаў; самі праводзяць падпіску на перыядычныя выданьні.

***28 лістапада*** стала вядома, што Менская друкарня "Чырвоная зорка" не зьбіраецца працягваць кантракт на друкаваньне газеты ***"Народная***

***воля”*** на 2006 год. Галоўны рэдактар выданьня Іосіф Сярэдзіч сказаў, што галоўнае цяпер — прымусіць друкарню друкаваць газету з другога сьнежня, а “далей будзем глядзець, што рабіць”.

***1 сьнежня*** Гомельскі аблвыканкам пазбавіў акрэдытацыі ***Алену Пасканную*** — уласную карэспандэнтку ў рэгіёне прыватнай інфармацыйнай кампаніі ***БелаПАН.*** Афіцыйны ліст наконт пазбаўленьня акрэдытацыі Алены Пасканнай дасланы ў БелаПАН за подпісам намесьніка старшыні аблвыканкаму Пятра Кірычэнкі. У ім сказана, што карэспандэнтка пазбаўленая акрэдытацыі ў сувязі з парушэньнем ёю вызначаных правілаў акрэдытацыі. Прэсавы сакратар аблвыканкаму Яўген Пабалавец сьцьвярджае, што карэспандэнтка Пасканная пазбаўленая акрэдытацыі за некаторую прадузятасьць і неаб’ектыўнасьць: маўляў, журналістка ў адной інфармацыі спасылалася на аддзел ідэалогіі гарвыканкаму, хаця ў аддзел яна нібыта не зьвярталася. Дырэктар інфармацыйнай кампаніі БелаПАН Алесь Ліпай лічыць рашэньне аблвыканкаму адносна сваёй супрацоўніцы неабгрунтаваным. Пазбаўленьне акрэдытацыі азначае, што аблвыканкам ня будзе дапускаць журналістку БелаПАН яе на свае паседжаньні ды іншыя мерапрыемствы.

***1 сьнежня*** рэдакцыя недзяржаўнай газеты ***“Брестский курьер”*** атрымала афіцыйны ліст за подпісам начальніка Берасьцейскага філіялу РУП “Белпошта” Г.Цітова. У пасланьні паведамляецца, што тэрмін дамовы на распаўсюд выданьня канчаецца 31 сьнежня 2005 і падоўжаны ня будзе. Раней газета “Брестский курьер” не трапіла ў падпісны каталог на 2006 год. Акрамя гэтага, апошнім часам у Берасьці перасталі выкладваць газету ў кіёсках “Белсаюздруку”. Па інфармацыі галоўнага рэдактара выданьня ***Мікалая Аляксандрава***, прадаўцы спасылаюцца на адпаведнае распараджэньне “зьверху” і кажуць, што выкананьне гэтага ўказаньня рэгулярна правяраюць два тавараназнаўцы.

***1 сьнежня*** стала вядома, што Гарадзенскі філіял РУП “Белпошта” скасоўвае дамову на распаўсюд і дастаўку падпісных накладаў ***“Газеты Слонімскай***” з 31 сьнежня 2005 г. Пра гэта паведамляецца ў лісьце, які атрымаў галоўны рэдактар выданьня Віктар Валадашчук ад намесьніка дырэктара гэтага прадпрыемства С. Казукевіча. Пасланьне датаванае 28-м лістапада. Між тым, усяго тыдзень таму той жа С. Казукевіч рассылаў начальнікам раённых вузлоў паштовай сувязі афіцыйнае распараджэньне ўнесьці “Газету Слонімскую” ў падпісны каталог на першае паўгодзьдзе 2006 г. у разьдзел абласных выданьняў, прыклаўшы да ліста ўстаноўленыя кошты на падпіску.

***2 сьнежня*** Баранавіцкі раённы вузел паштовай сувязі (РВПС) адмовіўся працягваць дамовы на распаўсюд і дастаўку недзяржаўных газет ***“Intex-***

***press"*** і ***"Мясцовы час"*** у 2006 годзе. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным лісьце, які атрымаў дырэктар ТАА "Выдавецкі дом "Інтэкс-прэс" Уладзімір Янукевіч ад начальніка РВПС Сташынскага.

***2 сьнежня*** РУП "Белсаюздрук" скасаваў дамовы на 2006 г. з дзьвюма недзяржаўнымі газетамі: ***"Салідарнасьць"*** і ***"Згода"***. Пра гэта гаворыцца ў пасланьнях, якія атрымалі галоўныя рэдактары гэтых выданьняў ад дырэктара "Белпошты" Міхаіла Падгайнага. Абодва дакументы маюць практычна аднолькавы тэкст. Аб прычынах такога рашэньня нічога не гаворыцца.

***2 сьнежня*** кіраўніцтва РУП "Белпошта" прыняло рашэньне выключыць з падпіснога каталогу на 2006 г. газету ***"Товарищ"***, заснаваную ЦК Партыі камуністаў Беларускай. Пра гэта рэдакцыя даведалася з ліста генеральнага дырэктара "Белпошты" Аляксандра Чарняка. У адрозьненьне ад астатніх газет, якіх няма ў падпісным каталогу на наступны год, газета "Товарищ" у ім спачатку прысутнічала, а цяпер будзе выкрэсьленая. У якасьці падставы для выключэньня газеты з каталогу "Белпошта" называе нявыхад выданьня ў студзені-сакавіку 2005 году. Рэдакцыя, са свайго боку, нагадвае, што затрымка выхаду адбылася з-за скасаваньня Беларускім домам друку дамовы з газетай і адмовы іншых беларускіх друкарняў выпускаць "Товарищ". Выданьне змагло аднавіць выхад толькі ў красавіку 2005 г., дамовіўшыся са Смаленскай друкарняй. Рэдакцыя зьвяртае ўвагу на тое, што пасьля аднаўленьня выхаду газеты "Белпошта" ні разу не ўздымала пытаньня пра запазычанасьць перад падпісчыкамі: газета была без праблемаў уключаная ў падпісны каталог на другое праўгодзьдзе 2005 г.

***2 сьнежня*** кіраўнік Камітэту дзяржаўнай бясьпекі Беларусі Сьцяпан Сухарэнка заявіў, што "замежныя СМІ будуць пазбаўляцца акрэдытацыі і высылацца з краіны" ў выпадку "прадастаўленьня заведама ілжывай інфармацыі пра Беларусь". Беларускім журналістам, якія працуюць на замежныя СМІ, С. Сухарэнка параіў "чытаць закон і думаць". "Ніхто ня ставіў за мэту абмежаваць чыесьці дзеяньні, а мы стараліся, каб гэтыя дзеяньні былі цывілізаванымі, у межах закону і не наносілі шкоды дзяржаўным інтарэсам", – заявіў журналістам С. Сухарэнка, каментуючы папраўкі ў Крымінальны кодэкс Беларусі.

***3 сьнежня*** сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Мікалай Коўш прыехаў у офіс адной з берасьцейскіх грамадзкіх арганізацыяў. Нечакана ў памяшканьне зайшоў участковы міліцыянт і выказаў прэтэнзіі наконт таго, што аўтамабіль актывіста АГП няправільна прыпаркаваны. Затым супрацоўнік міліцыі сказаў, што ёсьць паведамленьне, нібыта ў машыне знаходзяцца наркотыкі. Міліцыянт разам Мікалаем Каўшом паехалі ў Мас-

коўскі РАУС, але там наркотыкаў не знайшлі. Падчас агляду аўтамабілю замест наркотыкаў увагу міліцыянтаў прыцягнулі некалькі нумароў незалежных газет "Народная воля", "Брестский курьер", а таксама брашура Васіля Лявонава "Выбірай свой шлях". Амаль паўтары гадзіны Мікалай Коўш знаходзіўся ў міліцэйскім пастарунку і даваў паказаньні наконт гэтай друкаванай прадукцыі.

***5 сьнежня*** ў адміністрацыйнай камісіі пры Вілейскім выканкаме адбылося паседжаньне па справе распаўсюднікаў інфармацыйнага бюлетэню, прысьвечанага Дню Салідарнасьці, — лідэра мясцовай арганізацыі АГП Уладзіміра Малярчука і актывіста Таварыства беларускай мовы Мікалая Суслы. У выніку разгляд справы перанесены на наступнае паседжаньне.

***6 сьнежня*** дахаты да галоўнага рэдактара часопіса ***"Magazyn Polski" Андрэя Пачобута*** прыходзіў участковы міліцыянт, каб узяць тлумачэньні па факце выхаду ў Польшчы часопісу "Magazyn Polski" і газеты "Glos znad Niemna" ў эміграцыі". Журналісту даслалі заказным лістом позву ў пракуратуру, але ён ня мог атрымаць ліст, бо ня мае пашпарту, які забралі памежнікі. Міліцыянт патлумачыў, што з заявай наконт часопісу і газеты ў пракуратуру зьвярнуўся Камітэт па справах рэлігіяў і нацыянальных меншасьцяў, і Ленінская раённая пракуратура Гародні мусіць праводзіць праверку.

***6 сьнежня*** стала вядома, што да 20 сьнежня кіраўнікі і намесьнікі па ідэалагічнай працы прадпрыемстваў Дзяржынскага раёну (Менская вобл.) павінныя падаць у райвыканкам пісьмовыя справаздачы пра вынікі правядзеньня ведамаснай і індывідуальнай падпіскі на шэраг дзяржаўных выданьняў. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным пасланьні старшыні Дзяржынскага райвыканкаму А. Кадэта. "У сувязі з пачаткам падпіснай кампаніі на 1 паўгодзьдзе 2006 г. і ўлічваючы палітычную важнасьць дадзенага мерапрыемства", А. Кадэт просіць адрасатаў "узяць пад асабісты кантроль стан ведамаснай падпіскі" на "Советскую Белоруссию", "Рэспубліку", "Звязду", "Менскую праўду", "Сцяг Кастрычніка" і іншыя выданьні. Падшыўкі "вядучых" газет павінныя знаходзіцца "ў даступным для супрацоўнікаў месцы на кожным вытворчым участку", - падкрэсьлівае аўтар пасланьня. Індывідуальную падпіску старшыня райвыканкаму таксама не абышоў увагай і прадпісаў дзеля яе пасьпяховага правядзеньня "арганізаваць працу грамадзкіх распаўсюднікаў ва ўзаемадзеяньні з намесьнікам кіраўніка па ідэалагічнай працы і прафсаюзнай арганізацыяй", а таксама за кошт арганізацыі "аказаць матэрыяльную падтрымку ў падпісцы на асноўныя дзяржаўныя выданьні" ветэранам і маламаёмасным.

***6 сьнежня*** стала вядома, што Слонімскае аддзяленьне "Белсаюздруку" не працягне дамовы на продаж недзяржаўнай ***"Газеты Слонімскай"***

праз сетку кіёскаў у 2006 годзе. Пра гэта галоўнаму рэдактару выданьня Віктару Валадашчуку паведамілі супрацоўнікі аддзяленьня, спасылаючыся на атрыманы “зьверху” факс са сьпісам каля 20-ці выданьняў, з якімі не рэкамендуецца працягваць супрацоўніцтва.

***6 сьнежня*** прадпрыемствы “Саюздруку” адмовіліся працягнуць дамову са штотыднёвікам ***“Наша Ніва”*** на распаўсюд выданьня ў 2006 годзе. Паводле галоўнага рэдактара выданьня Андрэя Дынько, у рэдакцыю паступілі паведамленьні аб тым, што “Белсаюздрук” і “Менаблсаюздрук” спыняюць распаўсюд газеты з 1 студзеня 2006 году. “Прычым, у “Менаблсаюздруку” скасаваньне дачыненьняў з рэдакцыяй тлумачаць паніжаным попытам на штотыднёвік”, — сказаў галоўны рэдактар “Нашай Нівы” Андрэй Дынько.

***6 сьнежня*** ў Гомельскім лядовым палацы невядомым чалавекам у цывільным быў зытрыманы актывіст Партыі БНФ Сяргей Трыфанаў, які распаўсюджваў улёткі з інфармацыяй пра адзінага кандыдата Аляксандра Мілінкевіча. Чалавек у цывільным перадаў Сяргея Трыфанава супрацоўнікам міліцыі, якія даставілі яго ў аддзяленьне міліцыі, дзе без складаньня пратаколу былі канфіскаваеыя 67 улётак, а С. Трыфанава прымусілі напісаць тлумачальную.

***6 сьнежня*** Праўленьне ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” выступіла з заявай з нагоды адмовы прадпрыемстваў “Белпошта” і “Белсаюздрук” супрацоўнічаць практычна з усімі недзяржаўнымі грамадзка-палітычнымі выданьнямі. “Лічым, што сваімі дзеяньнямі дзяржаўныя прадпрыемствы “Белпошта” і “Белсаюздрук” дапусьцілі свавольства. Парушаныя канстытуцыйныя правы грамадзянаў на свабоду слова, атрыманьне і распаўсюд інфармацыі (артыкулы 33, 34 Канстытуцыі РБ). Фактычна дэзавуяваны артыкул 3 Закона РБ “Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі”, які гарантуе свабоду друку і дэкларуе падтрымку дзяржавай усіх сродкаў масавай інфармацыі. Парушаныя таксама патрабаваньні Закона РБ “Аб паштовай сувязі”, які абавязвае прадпрыемства “Белпошта” распаўсюджваць прадукцыю перыядычных друкаваных выданьняў. Упэўненыя, што за гэтымі супрацьзаконнымі дзеяньнямі “Белпошты” і “Белсаюздруку” хаваюцца сапраўдныя намеры беларускіх уладаў правесьці татальную “зачыстку” інфармацыйнай прасторы перад прэзідэнцкімі выбарамі 2006 году”, — гаворыцца ў заяве БАЖ. Журналісцкая арганізацыя зьвярнулася таксама ў Канстытуцыйны суд з заклікам ацаніць адпаведнасьць Канстытуцыі і міжнародна-прававым абавязальніцтвам Беларусі паправак у Крымінальны кодэкс РБ; да Савету Рэспублікі БАЖ зьвярнуўся з заклікам адхіліць Законапраект “Аб унясеньні дапаўненьняў і зьмяненьняў у некаторыя заканадаўчыя акты РБ па пытаньні ўзмацненьня адказнасьці за дзеяньні, накіраваныя супраць чалавека і грамадзкай бясьпекі”.

***7 сьнежня*** некалькі дзясяткаў актывістаў АГП падалі зыскавыя заявы ў суд у сувязі з адмовай РУП "Белпошта" ўнесьці газету ***"Народная воля"*** ў каталог перыядычных выданьняў Рэспублікі Беларусь. Зыскоўцы патрабуюць распачаць грамадзянскую справу і прызнаць іх права на заключэньне публічнай дамовы аб аказаньні паслуг паштовай сувязі па распаўсюджваньні "Народнай волі".

***7 сьнежня*** стала вядома, што Менская адміністрацыя прымушае прыватныя фірмы падпісвацца на дзяржаўныя выданьні. Дакументальнае пацьверджаньне гэтага — афіцыйны ліст ад намесьніка кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёну сталіцы Н.Н.Бурага на адрас адной з камерцыйных фірм. У ім сп. Буры "просіць" кіраўніка прадпрыемства аформіць падпіску на выданьне Адміністрацыі прэзідэнта "Советская Белоруссия" і друкаваны орган Менгарвыканкаму "Минский курьер". Інфармацыю аб падпісцы на згаданыя выданьні адрасат павінен прадаставіць у аддзел ідэалагічнай працы адміністрацыі не пазьней 19-га сьнежня "з абавязковым прыкладаньнем дакументаў, якія пацьвярджаюць афармленьне падпіскі" на згаданыя газеты.

***8 сьнежня*** рэдакцыя недзяржаўнай Пінскай газеты ***"Мясцовы час"*** (выдавецкі дом "Інтэкс-прэс") атрымала ад кіраўніцтва гатэлю "Спорт" пісьмовае паведамленьне аб скасаваньні дамовы арэнды офіснага памяшканьня з 31 студзеня 2006 г. Адміністрацыя гатэлю, які належыць Беларускаму абаронна-спартыўнаму тэхнічнаму таварыству (БелОСТО), ніяк не абгрунтоўвае свайго рашэньня. Тэрмін дамовы арэнды паміж адміністрацыяй гатэлю і рэдакцыяй скончыцца толькі ў ліпені 2006 г. Рэдакцыя рэгулярна плаціла за арэнду і камунальныя паслугі і прэтэнзій з боку арандадаўцаў ніколі не атрымлівала. Галоўны рэдактар газеты Віктар Ярашук лічыць гэта чарговым крокам мясцовых уладаў па ўдушэньні незалежнага выданьня.

***8 сьнежня*** ў Наваполацку пачалася кампанія падтрымкі перыядычных выданьняў, выкінутых РУП "Белпошта" з падпіснога каталогу на 2006 год. Таварыствам беларускай мовы ды іншымі грамадзкімі арганізацыямі пачаўся распаўсюд узораў пісьмовых зваротаў да кіраўніцтва "Белпошты" з патрабаваньнем забясьпечыць грамадзянам канстытуцыйнае права атрымліваць па пошце свае любімыя газеты. Апроч таго на буйных прадпрыемствах і ў мясцовым універсітэце вядзецца збор подпісаў пад калектыўнымі лістамі з аналагічнымі патрабаваньнямі.

***9 сьнежня*** на чыгуначным вакзале ў Гародні памежнікі затрымалі пенсіянера ***Станіслава Клімовіча***, які хацеў перадаць машыністу польскай электрычкі газету ***"Glos znad Niemna"***, якая выходзіць у эміграцыі. Пенсіянера завялі ў будынак вакзалу і пачалі дапытваць – спачатку маёр у форме, потым прыйшоў чалавек у цывільным. Іх цікавіла, адкуль Станіслаў

Клімовіч узяў газету. Той адказаў, што купіў яе на рынку. Дапытваліся, за колькі і ад каго. Потым выклікалі перакладчыцу. Яна пабачыла, што ў нумары ёсьць інтэрв'ю з Клімовічам. Пачалі пытаць, дзе журналістка брала ў яго інтэрв'ю. Допыт працягваўся тры з паловай гадзіны. С. Клімовіча адпусьцілі, але сказалі, што яшчэ будуць выклікаць.

***9 сьнежня*** апеляцыйны суд пакінуў у сіле рашэньні Менскага гарадзкога гаспадарчага суда па зысках рэдакцыі ***"Народная воля"*** да прадпрыемстваў "Менгарсаюздрук", "Менаблсаюздрук" і "Белсаюдрук", якія ў аднабаковым парадку скасавалі дамовы з рэдакцыяй з 1-га кастрычніка. Рэдакцыя спадзявалася змусіць гэтыя прадпрыемствы вярнуцца да выкананьня сваіх абавязкаў па дамовах.

***10 сьнежня*** ўвечары беларускія памежнікі не пусьцілі ў Беларусь здымачную групу Польскага грамадзкага тэлебачаньня. Журналістка ***Агнешка Рамашэўска*** накіроўвалася ў Менск разам з аператарам і кіроўцам, каб адкрыць там сталае бюро тэлебачаньня. Яна мела ўсе неабходныя дакументы — візу і акрэдытацыю МЗС Беларусі. Аднак, нягледзячы на гэта, памежнікі з пераходу Кузьніца-Брузгі пратрымалі пашпарты палякаў паўтары гадзіны, а потым заявілі, што Агнешка Рамашэўска ня можа ўехаць на тэрыторыю Беларусі, а два яе супрацоўнікі — могуць. Пасьля гэтага Рамашэўска накіравалася ў Варшаву, разам з ёй адправіліся аператар і кіроўца — яны вырашылі ня ехаць у Беларусь без журналісткі. Агнешка Рамашэўска заявіла, што з патрабаваньнем праясьненьня справы яна зьвернецца да Консульства Беларусі ў Польшчы і будзе спрабаваць зноў уехаць у Беларусь.

***10 сьнежня*** ў Гародні быў затрыманы міліцыянтамі ***Віталь Курса*** нібыта за распаўсюд улётак. Яго адвезьлі ў апорны пункт, дзе ўчастковы інспектар Мельнічак канфіскаваў поліэтыленавы пакет, у якім было 6 бюлетэняў і 350 інфармацыйных лісткоў Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Міліцыянты запісалі, дзе Віталь вучыцца і працуе. Хлопца пратрымалі на ўчастку паўтары гадзіны, пасьля чаго адпусьцілі.

***11 сьнежня*** АМАПам былі затрыманыя ***Валеры Кісель*** з Партыі БНФ і ***Сяргей Левановіч*** з Грамадзкага аб'яднаньня БНФ "Адраджэньне". Амапаўцы сказалі Валерыю Кісялю, што ён затрыманы па падазрэньні ў тым, што дакументы ў яго фальшывыя. У Валерыя канфіскавалі ўлётку кандыдата ад аб'яднанай апазіцыі на будучых прэзідэнцкіх выбарах Аляксандра Мілінкевіча, 2 брашуры "Нераскрытыя злачынствы найноўшай гісторыі", 4 брашуры па правах чалавека ААН. Хлопцаў пратрымалі каля дзьвюх гадзінаў, склалі пратакол канфіскацыі і запісалі тлумачэньне, пасьля чаго адпусьцілі.

***12 сьнежня*** журналіст ***тэлекампаніі "Мір" Ігар Станкевіч*** з аддзе-

лу палітыкі і эканомікі паведаміў, што яго прымусілі звольніцца з-за падазрэньняў у сувязях з апазіцыяй. Прычынай стала дэманстрацыя дакументальнага фільму падчас правядзеньня Кангрэсу дэмакратычных сілаў 1 кастрычніка. Паводле сп. Станкевіча, сьпецслужбы западозрылі, што нехта з журналістаў дзяржаўных СМІ даў стужкі апазіцыянерам, каб тыя іх выкарысталі ў кінахроніцы палітычных падзеяў у Беларусі. Ігару Станкевічу паведамілі, што падазраюць менавіта яго. Сам Ігар сьцьвярджае, што нікому стужкі не даваў. Ён упэўнены, што гэта пачатак новай кампаніі пазбаўленьня ад палітычна ненадзейных журналістаў у дзяржаўных СМІ: “Тая “зачыстка”, якая пачалася з недзяржаўных СМІ, я мяркую, будзе тычыцца і дзяржаўных. Ёсьць факты, якія сьведчаць аб гэтым. Напрыклад, на дзяржаўным радыё працавала дзяўчына, якая належала да пратэстантаў. Яна папросту шукала інфармацыю пра пратэстанцкія цэрквы ў інтэрнэце на сваім працоўным месцы. Яе вылічылі і сказалі: “Звальняйся”. Ну і я таксама яскравы прыклад”.

***12 сьнежня*** некаторыя супрацоўнікі гандлёвых прадпрыемстваў Глыбоччыны атрымалі пісьмовыя распараджэньні аформіць індывідуальную падпіску на шэраг дзяржаўных выданьняў. Адзін з такіх дакументаў, адрасаваны шараговаму супрацоўніку вясковай крамы, трапіў у ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”. Распараджэньне падпісаў начальнік Глыбоцкага раённага спажывецкага таварыства М. Толкач. “Вам неабходна аформіць індывідуальную падпіску на рэспубліканскую, абласную і ў абавязковым парадку на раённую газету “Веснік Глыбоччыны”, — гаворыцца ў пасланьні.

***13 сьнежня*** прадпрымальнікі Віцебска, Оршы, Полацку і Наваполацку пачалі збор подпісаў у падтрымку папулярнай у рэгіёне газеты ***“Витебский курьер”.*** У сваім лісьце ў падтрымку газеты прадпрымальнікі адзначаюць, што ціск, які аказваецца ўладамі на недзяржаўную прэсу, “гэта прамое парушэньне канстытуцыйнага права грамадзянаў на свабоднае атрыманьне інфармацыі і заканадаўства аб СМІ. Сітуацыя не была б настолькі вострай, працягваюць аўтары ліста, калі б у краіне існавала альтэрнатыўная сістэма распаўсюду друкаваных выданьняў. Аднак у гэтай дзейнасьці фактычна ўсталяваная дзяржаўная манаполія, таму адмова ў распаўсюдзе можа прывесьці да закрыцьця газет, якія выходзяць значным для рэгіёну накладам – 7 000 асобнікаў”.

***13 сьнежня*** другі раз запар карэспандэнтцы Польскага тэлебачаньня ***Агнешцы Рамашэўскай*** было адмоўлена ва ўездзе на Беларусь. 10 сьнежня яе не ўпусьцілі ў краіну на пераходзе Кузьніца Беластоцкая — Брузгі. Яна ўспрыняла гэта як непаразуменьне і вырашыла, што ў Менску такога ня будзе, таму вырашыла паляцець у Беларусь самалётам Польскіх авіялініяў. Пасьля праверкі дакументаў памежнікі заявілі ёй, што паводле

закону аб знаходжаньні ў Беларусі замежных грамадзянаў яна ня мае права ўехаць на тэрыторыю краіны. Памежнікі спрабавалі дэпартаваць яе тым жа самалётам, але капітан самалёту адмовіўся яе браць без білету і пастановы аб дэпартацыі. Паколькі самалёт у Варшаву адляцеў, спадарыня Рамашэўская засталася ў памежнай зоне аэрапорту "Менск" бяз пашпарту і пад вартай, дзе і правяла ноч. Да журналісткі быў дапушчаны польскі консул, але і ён ня змог высьветліць, чаму такая пільная ўвага да журналісткі TVP1.

***14 сьнежня*** Польскае грамадзкае тэлебачаньне выказала абурэньне дэпартацыяй з Менску сваёй карэспандэнткі. Прадстаўнік тэлебачаньня заявіў, што будзе рабіцца ўсё, каб дамагчыся дазволу на працу ў Беларусі для ***Агнешкі Рамашэўскай***.

***14 сьнежня*** гарадзенскія журналісты, сябры ***"Беларускай асацыяцыі журналістаў"*** прынялі адмысловую заяву да беларускіх уладаў у сувязі з дэпартацыяй карэспандэнткі ***TVP-1 Агнешкі Рамашэўскай***. "Мы перакананыя, што сапраўднай прычынай дэпартацыі сталася тое, што Агнешка Рамашэўская працавала згодна з журналісцкімі прафесійнымі стандартамі, а не так, каб дагадзіць беларускім ўладам. Яна асьвятляла самыя вострыя тэмы грамадзкага і палітычнага жыцьця Беларусі: канфлікт вакол "Саюзу палякаў на Беларусі", Кангрэс дэмакратычных сілаў, становішча палітычных зьняволеных", гаворыцца ў заяве.

***14 сьнежня*** стала вядома, што ў Барысаве зь 1 студзеня 2006 году спыняецца распаўсюд праз шапікі "Саюздруку" недзяржаўнай газеты ***"Гоман Барысаўшчыны"***. Як паведаміў рэдактар выданьня Міхась Мяцельскі, такое рашэньне прыняла Барысаўскае аддзяленьне "Менскаблсаюздруку". У афіцыйным тлумачэньні гаворыцца, што скасаваньне дамовы на распаўсюд газеты выклікана яе нізкай рэалізацыяй.

***14 сьнежня*** Вышэйшы гаспадарчы суд адмовіўся задаволіць скаргу недзяржаўнага прадпрыемства "Прэс-сэрвіс" — заснавальніка і выдаўца газеты ***"Курьер из Борисова"***. Як вынік, газета спыняе існаваньне. Разглядала скаргу калегія Вышэйшага гаспадарчага суду на чале з Людмілай Калесьнікавай.

***14 сьнежня*** 180 жыхароў Салігорску падпісаліся пад зваротам да беларускіх уладаў у абарону недзяржаўнай газеты ***"Народная воля"***. Жыхары Салігорску накіравалі зварот у Канстытуцыйны суд, Палату прадстаўнікоў, пракуратуру, Міністэрства інфармацыі і офіс АБСЕ ў Беларусі. Яны патрабуюць спыніць беззаконьне ў дачыненьні да штодзённай незалежнай газеты і патрабуюць даць прававую ацэнку дзеяньням дырэктара друкарні "Чырвоная зорка" Ігара Маланяка і дырэктара "Белсаюздруку"

Міхаіла Падгайнага, якія, як лічаць падпісанты звароту, скасавалі дамовы на друкаваньне і распаўсюд газеты з парушэньнямі беларускага заканадаўства. Як сьведчыць галоўны рэдактар выданьня Іосіф Сярэдзіч, цяпер сотні падпісчыкаў газеты зьвяртаюцца ў суды, патрабуючы вяртаньня "Народнай волі" ў падпісны каталог і ў газетныя шапікі.

***15 сьнежня*** Камітэт абароны журналістаў (CPJ, ЗША) выказаў занепакоенасьць дэпартацыяй з Беларусі польскай журналісткі ***Telewizji Polskaj Агнешкі Рамашэўскай***. "Мы абураныя дэпартацыяй Агнешкі Рамашэўскай і патрабуем, каб журналістцы Польскага грамадзкага тэлебачаньня неадкладна было дазволена вярнуцца ў Беларусь і свабодна працаваць", – заявіла выканаўчы дырэктар Камітэту абароны журналістаў Эн Купер.

***15 сьнежня*** ў Віцебску затрыманыя ***Уладзімір Плешчанка, Аляксандр Салаўян*** і ***Барыс Хамайда***. На момант затрыманьня спадар Салаўян трымаў бел-чырвоны-белы сьцяжок, а спадар Плешчанка распаўсюджваў улёткі Кансерватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ. Асоба спадара Хамайды, які распаўсюджваў газеты ***"Згода", "Народная воля"*** ды іншыя выданьні, цікавіла міліцыянтаў найбольш: распаўсюдніка пратрымалі ў пастарунку Чыгуначнага раёну паўтары гадзіны і пільна агледзелі ягоныя асабістыя рэчы. Не засьведчыўшы факту правапарушэньня, затрыманых адпусьцілі, патлумачыўшы на разьвітаньне, што падставай для затрыманьня быў тэлефонны званок кагосьці з "пільных грамадзянаў", незадаволеных праявамі палітычнага іншадумства.

***15 сьнежня*** Гаспадарчы суд Менску пад старшынствам судзьдзі Алены Мельнікавай вырашыў спыніць справу паводле зыску ***"Народнай волі"*** да прадпрыемства "Белпошта" на той падставе, што гэтая справа нібыта ня можа разглядацца ў гэтай судовай інстанцыі. Рэдакцыя "Народнай Волі" праз суд дамагалася прымусіць "Белпошту" ўключыць газету ў падпісны каталог на 2006 год. На пытаньне галоўнага рэдактара "Народнай волі" Іосіфа Сярэдзіча, а ў якой судовай установе ў такім разе трэба разглядаць гэтае пытаньне, прадстаўнікі "Белпошты" адказалі, што яно ня будзе разглядацца нідзе.

***16 сьнежня*** карэспандэнтку ***"Витебского курьера" Тацяну Чабатарову*** не пусьцілі на сесію гарсавету. Яна зьвярталася па дазвол прысутнічаць на 13-й сесіі гарсавету двойчы: да кіраўніцы аддзелу ідэалагічнай работы гарвыканкаму Наталі Царовай і асабіста да старшыні гарсавету Генадзя Грыцкевіча. Прадстаўніца гарвыканкаму заўважыла, што ў пераліку запрошаных ёсьць толькі тры дзяржаўныя віцебскія газеты, а старшыня гарсавету параіў "Витебскому курьеру" пашукаць іншых тэмаў, завяршыўшы гаворку парадай "адпачнуць ад гэтай сесіі". Прайсьці ў залу пасяджэньняў "явачным парадкам" карэспандэнтцы Тацяне Чабатаровай

таксама не ўдалося: на ўваходзе, разгледзеўшы рэдакцыйнае пасьведчаньне, яе спыніў ахоўнік. Па той жа прычыне на сесію гарсавету ня здолеў трапіць і кіраўнік абласной арганізацыі Партыі БНФ Кастусь Смолікаў. Старшыня гарсавету папярэдне адмовіў яму на той падставе, што ў зале паседжаньняў не бывае вольных месцаў.

***17 сьнежня*** ў Пінску падчас распаўсюду незалежных выданьняў — газетаў ***“Народная воля”, “Салідарнасьць”*** і ***“Белгазеты”***— быў зьбіты ***Аляксандр Васільеў***. Аднак з пацярпелага ён пераўтварыўся ў падазраванага па абвінавачаньні ў хуліганстве. Да Аляксандра падышла загадчыца крамы, каля якой ён раздаваў газеты, і загадала, каб ён “не перашкаджаў працаваць”. Васільеў адказаў, што распаўсюджвае газеты ня ў краме, а на вуліцы, таму нікому перашкаджаць ня можа. Пасьля гэтага зьявіліся грузчыкі крамы і пачалі яго зьбіваць. Васільеў па тэлефоне выклікаў міліцыю. Прыехалі міліцыянты, але замест дапамогі на яго быў складзены пратакол за хуліганства — нібыта ён перашкаджаў людзям хадзіць ля крамы і ўвогуле быў завадатарам бойкі. У сваю чаргу, грузчыкі напісалі на Васільева заявы, пасьля чаго яго забралі ў міліцыю. Да суда Аляксандр Васільеў утрымліваўся ў міліцэйскім пастарунку, а падчас судовага разьбіральніцтва запатрабаваў выклікаць сьведкаў бойкі. Пасьля гэтага яго зноў адвезьлі ў міліцыю.

***19 сьнежня*** афіцыйнае паведамленьне пра тое, што дамова паміж ТАА ***“Выдавецкі дом “Інтэкс-прэс”*** і Гандлёвым рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам “Брэстаблсаюздрук” ня будзе працягнутая, атрымаў дырэктар выдавецкага дому ***Уладзімір Янукевіч***. Як сказана ў лісьце за подпісам дырэктара “Брэстаблсаюздруку” Марэйкі, дамова на 2006 год “працягнутая ня будзе на падставе артыкулу 3091 Грамадзянскага кодэксу Рэспублікі Беларусь”.

***19 сьнежня*** недзяржаўная газета ***“Народная воля”*** паведаміла, што наладжвае альтэрнатыўную сістэму падпіскі. Галоўны рэдактар ***Іосіф Сярэдзіч*** патлумачыў, што не зьбіраецца складаць рукі, і газета ўсё роўна будзе трапляць да чытачоў: “Мы маем ліцэнзію на продаж газеты ў рэдакцыі. Таму зьвярнуліся да чытачоў: хочаце атрымаць студзеньскія нумары — пералічыце грошы ў выглядзе перадаплаты, а мы вам даставім газету”. Альтэрнатыўную сістэму падпіскі цягам месяцу стварае і недзяржаўная газета ***“Наша Ніва***”. Як сьведчыць яе галоўны рэдактар ***Андрэй Дынько***, штодня ў рэдакцыю паступаюць дзясяткі прыватных ахвяраваньняў ад людзей, якія хочуць чытаць “Нашу Ніву”.

***20 сьнежня*** стала вядома, што жыхары Віцебску сабралі больш за паўтары тысячы подпісаў у падтрымку газеты ***“Витебский курьер”***. Пасьля таго, як “Віцебскаблсаюздрук” абвясьціў, што газета болей ня будзе пра-

даваццa ў шапіках, у Віцебску была створаная ініцыятыўная група, якая склала лісты пратэсту супраць уціску незалежнага выданьня. Гэтыя лісты накіраваныя ў абласную пракуратуру, аблвыканкам і гарвыканкам, Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Свае подпісы пад імі паставілі пісьменьнікі Уладзімір Арлоў і Ірына Жарнасек, акторы Беларускага акадэмічнага тэатру імя Якуба Коласа і тэатру "Лялька", 167 подпісаў даслалі жыхары Воршы, прадпрымальнікі Полацку і Наваполацку правялі прафсаюзны сход у падтрымку газеты. Паводле сяброў ініцыятыўнай групы, подпісаў на карысьць "Витебского курьера" магло б быць у некалькі разоў болей: многія жыхары Віцебску хацелі б падтрымаць газету, але апасаюцца ўказваць у падпісным лісьце свае адрасы і імёны, баючыся праблемаў на працы ва ўмовах кантрактнай сістэмы.

***22 сьнежня*** амбасада Чэхіі ў Беларусі выступіла з заяваю, у якой абвяргае інфармацыю, пададзеную 18 сьнежня ў праграме Беларускага тэлебачаньня "У цэнтры ўвагі". Як зазначана ў заяве, журналісты БТ "у дыскрымінацыйным тоне накінуліся на працу консульскага аддзелу амбасады Чэхіі, а таксама на консульскія аддзелы іншых пасольстваў краін Еўрапейскага Саюзу". "Мы катэгарычна не прымаем агучанага па Беларускім тэлебачаньні сьцьверджаньня, што для атрыманьня візаў заяўнікі павінны ўдзельнічаць у мітынгах апазіцыі", – падкрэсьліваецца ў заяве чэскага амбасады. "Прапагандысцкія рэпартажы, не абгрунтаваныя рэальнымі фактамі, адбіваюцца на чэска-беларускіх дачыненьнях і, безумоўна, не спрыяюць іх паляпшэньню", – лічаць чэскія дыпламаты.

З ***23 сьнежня*** недзяржаўная прафсаюзная газета ***"Салідарнасьць"*** прыпыніла свой выхад. Галоўны рэдактар выданьня Аляксандр Старыкевіч тлумачыць гэта тым, што ўлады пазбавілі "Салідарнасьць" усіх магчымых крыніцаў прыбытку – на газету нельга падпісацца і яна ня можа распаўсюджвацца праз сістэму "Саюздруку". ***Аляксандр Старыкевіч*** гаворыць: "У дадзенай сітуацыі наладзіць нейкае свае прадпрыемства па распаўсюду мы проста ня мелі магчымасьці, бо гэта таксама патрабуе нейкіх грошай і, прынамсі, нейкага запасу трываласьці. А ў нас яго не было ўсе гэтыя два з паловай гады. Мы працавалі маленькім калектывам – 3-4 чалавекі, працавалі, так бы мовіць, з колаў. Я лічу персьпектывы легальных незалежных выданьняў у любым разе вельмі сьціплымі на бліжэйшы час. Калі б мы выжылі і працягвалі выходзіць, пазбавіўшыся падпіскі і раздробу, то былі б новыя рэпрэсіі і ўсё роўна вынік быў бы аднолькавы. Наша бліжэйшая персьпектыва – гэта інтэрнэт і самвыдат".

***26 сьнежня*** ў рэдакцыю газеты ***"Борисовские новости"*** прыйшоў афіцыйны ліст ад кіраўніка аддзелу ідэалагічнай працы Барысаўскага гарвыканкаму, які паведаміў галоўнаму рэдактару выданьня Анатолю Букасу

пра неабходнасьць штомесяц прадастаўляць інфармацыю “об осуществляемой рекламе” ў выданьні. Ідэолаг спасылаецца на нараду ў намесьніка прэм’ер-міністра РБ Кабякова, якая прайшла 29 верасьня. Інфармацыю належыць прадастаўляць у прыёмную Барысаўскага гарвыканкаму.

***27 сьнежня*** Гаспадарчы суд г. Менску адмовіўся разглядаць зыск галоўнага рэдактара газеты ***“Борисовские новости” Анатоля Букаса*** да РУП “Белпошта”, якое не ўключыла газету ў падпісны каталог на 2006 г. і адмовілася заключаць дамову на прыём і дастаўку падпісных накладаў на 1 паўгодзьдзе 2006 г. Анатоль Букас зьвяртаўся ў суд як індывідуальны прадпрымальнік, каб змусіць “Белпошту” да заключэньня дамовы. 1 сьнежня суд афіцыйна паведаміў яму, што зыскавая заява прынятая і што ўзбуджана вытворчасьць па справе. Аднак у судзе прадстаўнікі “Белпошты” падалі хадайніцтва аб спыненьні вытворчасьці па справе, і судзьдзя Аксана Брадко задаволіла іх просьбу на падставе таго, што справа не падлягае разгляду ў гаспадарчым судзе.

***29 сьнежня*** рабочую трактарнага заводу ***Раісу Кацько*** пакаралі штрафам за продаж кніг і газетаў у неналежным месцы. Жанчына гандлявала кнігамі і газетамі побач з уваходам на станцыю метро “Усход”. Гандлярка мела сярод іншых выданьняў кнігу Аляксандра Фядуты “Аляксандр Лукашэнка. Палітычная біяграфія”. Яна раздавала людзям недзяржаўную газету “Народная воля”, калі да яе падышоў чалавек у цывільным, які назваўся супрацоўнікам райвыканкаму. Мужчына паглядзеў на кнігу Фядуты, і сказаў, што гэта абраза прэзі,і выклікаў нарад міліцыі. Раісу Кацько затрымалі, склалі пратакол, газеты і кнігі сканфіскавалі. Судзьдзя Першамайскага суда Менску Гарбатоўскі пакараў Раісу Кацько штрафам на 58 тысяч рублёў. Судзьдзя вырашыў, што жанчына гандлявала газетамі і літаратурай у неналежным месцы.

***29 сьнежня*** ў горадзе Белаазёрску Берасьцейскай вобласьці супрацоўнікамі міліцыі затрыманы і дастаўлены ў пастарунак ***Уладзімір Казека***, кіраўнік Іванаўскага раённага штабу адзінага прэтэндэнта ад дэмсілаў Аляксандра Мілінкевіча. Ён прыехаў у Белаазёрск для атрыманьня пасьведчаньняў сяброў ініцыятыўнай групы. Пасьля атрыманьня пасьведчаньняў ён накіраваўся да сваёй машыны, дзе яго спынілі супрацоўнікі Белаазёрскага аддзяленьня міліцыі. Яны дагледзелі машыну і канфіскавалі дзьве пачкі (каля 800 асобнікаў) газеты “Народная воля”. Уладзімір Казека правёў у пастарунку шэсьць гадзінаў.

***31 сьнежня*** ў Гомелі быў затрыманы актывіст Партыі камуністаў Беларускай ***Анатоль Ільінчык***, калі ён у шматпавярховых дамах на вуліцы Малайчука раскладаў у паштовыя скрыні газету ***“Товарищ”*** і ўлёткі пра Кангрэс дэмакратычных сілаў і Аляксандра Мілінкевіча. У пастарунку спа-

дара Ільінчыка трымалі больш за тры гадзіны. У яго канфіскавалі каля дзясятку ўлётак і ўзялі тлумачэньні. Газету “Товарищ” камуністу вярнулі. Міліцыянты папярэдзілі Анатоль Ільінчыка – адміністрацыйная справа ў адносінах да яго будзе перададзена ў адпаведную камісію адміністрацыі Чыгуначнага раёну Гомеля.

## 6. Парушэньне права на плюралізм меркаваньняў, цэнзура, увядзеньне дзяржаўнай ідэалогіі

***20 студзеня*** ў Віцебску была прыпыненая калектыўная выстава “Доўгая дарога дадому”. Творцы, чые працы экспанаваліся ў Цэнтры сучаснага мастацтва, зьнялі свае работы ў знак пратэсту супраць забароны паказваць партрэт Васіля Быкава, напісаны Алесем Пушкіным. Па афіцыйнай версіі, выказанай дырэктарам Цэнтру сучаснага мастацтва Валянцінай Кірылавай, карціну зьнялі з-за слабой мастацкай вартасьці. Тым часам Вадзім Баршчэўскі, адзін з арганізатараў экспазіцыі, сябра Культурна-асьветніцкага цэнтру імя Язэпа Драздовіча сказаў, што па ягоных зьвестках, улады думалі ўвогуле прыкрыць выставу, але абвясьціць звыш сямідзесяці работ усіх 25 мастакоў слабымі занадта рызыкоўна — ніхто б не паверыў.

***20 студзеня*** міністр адукацыі Беларусі Аляксандр Радзькоў падчас калегіі міністэрства заявіў, што ідэалагічную працу, якая праводзіцца ў ВНУ Беларусі, неабходна працягнуць і зрабіць яе “больш прадметнай, даходлівай да кожнага студэнта і выкладчыка”. Міністр адзначыў, што падразьдзяленьні Мінадукацыі павінныя больш пасьлядоўна і мэтанакіравана вырашаць пытаньні ўдасканаленьня ідэалагічнага, грамадзянска-патрыятычнага і духоўнага выхаваньня навучэнцаў. А. Радзкоў таксама адзначыў, што зараз у ВНУ краіны ўзмоцненыя ідэалагічны зьмест навучальна-выхаваўчага працэсу сярод моладзі, навукова-метадычнае забесьпячэньне навучальна-выхаваўчай і ідэалагічнай працы, а таксама зацьверджаныя крытэрыі і паказчыкі яе эфектыўнасьці. Вынікам праведзенай працы, па ягоных словах, стаў рэферэндум і парламенцкія выбары, якія паказалі, што студэнцкая моладзь зьяўляецца “дзяржаўна мысьлячай”, верыць і падтрымлівае палітыку ўраду.

***21 студзеня*** стала вядома, што Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт ужо амаль тыдзень працуе без прарэктара па выхаваўчай працы. Нагодай для звальненьня ў разгар навучальнага году прарэктара Рэгіны Венцэль і яе намесьніка па працы з моладзьдзю Івана Кіцуна стаў жарт сту-

дэнтаў пятага курсу падчас выступу на КВЗ (Клуб вясёлых і знаходлівых), дзе студэнты разыгралі сцэнку з крытыкай кіраўніка дзяржавы. І. Кіцун быў звольнены на працягу сутак, Р. Венцэль і іншыя адміністрацыйныя асобы атрымалі вымовы, а са студэнтамі правялі строгую размову. Пазьней прарэктара па выхаваўчай працы звольнілі. Хаця ніхто з адміністрацыі ўніверсітэту не адмаўляе, што звальненьне Рэгіны Венцэль зьвязанае са студэнцкім жартам, у працоўнай кніжцы адлюстраванае толькі скасаваньне дамовы па згодзе бакоў. Намесьнік старшыні Берасьцейскага выканкаму, які курыруе адукацыю, Леанід Цупрык, каментуючы сітуацыю, заявіў: “Адказныя за выхаваньне моладзі людзі павінныя былі праверыць праграму і растлумачыць студэнтам, што непавага да прэзідэнта, які столькі зрабіў для гораду і іх навучальнай установы непасрэдна, недапушчальная. Гэтая выхадка – непавага да ўласнай краіны”.

***21 студзеня*** студэнты філалагічнага факультэту Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэту ім.Ф.Скарыны былі запрошаныя на размову пра будучае разьмеркаваньне. На самой жа справе такім чынам ладзілася сустрэча філолагаў з актывістамі БРСМ, мэтай якой першы сакратар Гомельскага абкаму гэтай арганізацыі Аляксандр Лаўрыненка назваў “жаданьне, каб студэнты ведалі больш, чым дагэтуль”. Гэтае “больш” выявілася ў цытаваньні А.Лукашэнкі. Лаўрыненка падкрэсьліў, што “вялікая колькасьць членаў арганізацыі сьведчыць пра давер моладзі да дзеючага прэзідэнта”, а амаль поўная адсутнасьць членаў БРСМ сярод філолагаў пятага курсу тлумачыцца распаўсюдам ва ўніверсітэце “няправільных зьвестак”. Прымусовае ж разьмеркаваньне (часьцей у Чарнобыльскую зону) бээрэсэмавец апраўдаў неабходнасьцю аддаць пазыку за грошы, якія плаціла дзяржава за навучаньне, і пажадаў студэнтам “сьмялей ісьці ў новы шлях”.

***24 студзеня*** студэнтаў Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэту абавязалі падпісацца на шэраг дзяржаўных газетаў. Пачынаючы з гэтай сесіі, студэнты гуманітарных факультэтаў павінныя зьяўляцца на залікі і іспыты па “дзяржаўнай ідэалогіі” з квітанцыяй, якая пацьвярджала б факт падпіскі. Будучыя выкладчыкі гісторыі і грамадазнаўства павінныя падпісацца на “Советскую Белоруссию” і “Магілёўсія ведамасьці” - друкаваны орган аблвыканкаму.

***26 студзеня*** ў Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце, пасьля скандалу са звальненьнем прарэктара па ідэалагічнай працы, зьвязаным з жартам пра Аляксандра Лукашэнку падчас гульні Клубу вясёлых і знаходлівых, студэнтам паведамілі, што ад гэтага часу ўсе сцэнары перад выступленьнямі будуць праходзіць “ідэалагічную экспертызу” ў адміністрацыі ўніверсітэту. З гэтага часу студэнтам, удзельнікам КВЗ, увогуле забаронена ўзгадваць у сваіх жартах прозьвішча Лукашэнкі і слова “прэзідэнт”,

а таксама імітаваць ягоны голас. Належныя аргвысновы з няўдалага жарту зрабілі і вышэйшыя чыноўнікі краіны. Міністр адукацыі Беларусі Аляксандр Радзькоў даў сваім падначаленым загад узмацніць выхаваўчую працу ў ВНУ.

***27 студзеня*** стала вядома, што з 3 лютага з пасады дэкана факультэту журналістыкі Белдзяржуніверсітэту звальняюць Васіля Вараб'ёва. Паводле афіцыйнай інфармацыі, спадар Вараб'ёў спыняе сваё кіраваньне журфакам па ўласным жаданьні. Аднак на факультэце сьцьвярджаюць, што дэкан пакідае пасаду паводле рашэньня "дырэктыўных органаў". Камэнтаваць сваю адстаўку Васіль Вараб'ёў адмовіўся. Некаторыя звальненьне Васіля Вараб'ёва зьвязваюць зь нядаўнім сьвяткаваньнем 60-годзьдзя факультэту, калі на неафіцыйную імпрэзу былі запрошаныя вядомыя ў Беларусі апазіцыйныя грамадзкія дзеячы, а таксама з прыняцьцем у шэрагі студэнтаў актывіста руху ліцэістаў Глеба Лабадзенкі і іншымі абставінамі.

***28 студзеня*** Уладзіміра Падгола, аўтара кнігі "Куля для прэзідэнта", сьледчы Аляксандр Пікараў выклікаў у Менскую гарадзкую пракуратуру на размову. Сам аўтар называе гэта прэзентацыяй свайго літаратурнага выданьня. Ён распавёў сьледчаму пра зьмест сваёй кнігі і нават падарыў асобнік супрацоўнікам пракуратуры.

З ***1 лютага*** ўсе беларускія ВНУ абавязаныя выкладаць студэнтам курс "Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы". Курс на ідэалагізацыю ВНУ ўзяў прэзідэнт Лукашэнка на семінары "вертыкалі" 27-28 сакавіка 2004 году. Міністэрства юстыцыі таксама з 2004 году стварыла ўпраўленьне кадраў і ідэалагічнай працы, якое мусіць мацаваць выхаваўчую і ідэалагічную працу ў органах юстыцыі. У Акадэміі кіраваньня пры прэзідэнце зьявілася цэлая кафедра ідэалогіі. Курс ідэалогіі выкладаецца і для беспрацоўных у службах занятасьці, што, як мінімум на паўмесяцу, павялічвае тэрмін навучаньня. Каб набыць, напрыклад, спецыяльнасьць "аператар ЭВМ з веданьнем кампутарнай вёрсткі", трэба прайсьці цярністым шляхам ідэалогіі працягласьцю 50 гадзінаў. На пачатку студзеня завяршыўся першы тур конкурсу на лепшы падручнік-макет "Асноваў ідэалогіі беларускай дзяржавы", пераможцамі з якога выйшлі восем рукапісаў. Тры макеты-падручнікі пісалі цэлымі калектывамі. Адзін макет, аб'ёмам каля 700 старонак, падрыхтаваны пад кіраўніцтвам рэктара Акадэміі кіраваньня пры прэзідэнце Станіслава Князева і дырэктара інстытуту дзяржаўнага кіраваньня пры Акадэміі доктара палітычных навук Сяргея Рашэтнікава; іхні макет падае ідэалогію як каштоўнасьці і мэты беларусаў, што выбіраюць дэпутатаў і прэзідэнта. Другі "ідэалагічны талмуд" пісаў, і нават выдаў, усім штатам Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы Беларускага дзяржаўнага педуніверсітэту (навучальны дапаможнік для падвышэньня кваліфікацыі кіруючых кадраў і сьпецыялістаў сістэмы адукацыі пад рэдакцыяй старшыні КС Рыгора Васілевіча і прарэктара Інстытуту Ядзьвігі

Яскевіч). Трэці радок займае ідэалагічны праект "Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы (гісторыя і тэорыя)", падрыхтаваны кафедрай філасофскіх навук Акадэміі кіраваньня пры прэзідэнце. Астатнія пяць падручнікаў выйшлі з-пад пяра асобных аўтараў: філосафа Льва Крывіцкага, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Ігара Катлярова, Васіля Шынкарова ў суаўтарстве з Л.Вартанавай, ужо названай Ядзьвігі Яскевіч ды В.Патапава. Курс "Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы" разьлічаны больш чым на 10 лекцыяў. Да сярэдзіны лютага адмысловая камісія з 10 навукоўцаў НАНБ і беларускіх ВНУ вызначыць лепшы падручнік, якому і дадуць пуцёўку ў жыцьцё.

***4 лютага*** ў мястэчку Зэльва адбыўся пажар у хаце, дзе жыла паэтка Ларыса Геніюш. Пажар заўважылі суседзі і пасьпелі патушыць агонь у спальні ды выкінуць на вуліцу ахопленую полымем вопратку п'яных насельнікаў хаты. Ларыса Геніюш жыла ў гэтай хаце два гады да вайны і пасьля вяртаньня з Гулагу – з 1956 да сваёй сьмерці ў 1983 годзе. Тут напісаныя яе знакамітая "Споведзь" ды паэтычныя кнігі "Невадам з Нёмана" і "На чабары настоена". У хаце ў розны час гасьцявалі Васіль Быкаў, Максім Танк, Уладзімір Караткевіч, Мікола Ермаловіч, Зянон Пазьняк ды многія іншыя слынныя дзеячы айчыннай культуры. Пасьля сьмерці паэткі будынак стаў дзяржаўнай уласнасьцю, і ў яго засялілі выпадковых людзей. Гадоў пяць таму ў зэльвенскі гарвыканкам быў накіраваны падпісаны зэльвенцамі ліст з просьбай надаць вуліцы Савецкай імя Ларысы Геніюш, а ў самой хаце адчыніць літаратурны музей. Але на зварот грамадзкасьці пра годнае ўшанаваньне славутай зямлячкі з Зэльвенскага гарвыканкаму адказу няма.

***3 сакавіка*** Міністэрства інфармацыі разьмясьціла на сваім сайце сьпіс аўтараў і выканаўцаў для трансьляцыі іх музычных твораў у беларускім FM-эфіры. Улічваючы недастатковае разьвіцьцё айчыннага шоу-бізнэсу і, як вынік, аб'ектыўны недахоп беларускіх кампазіцыяў для забесьпячэньня паўнацэннага кругласутачнага эфіру з разьліку прапорцыі 75%, Міністэрства інфармацыі сумесна з Міністэрствам культуры прапануць лічыць айчыннымі выканаўцамі выхадцаў з Беларусі (этнічных беларусаў), якія часова ці стала пражываюць за яе межамі. Акрамя таго, прапануецца лічыць беларускай музыкай выкананьне замежных песень і кампазіцыяў беларускімі музыкамі, cover-версіі замежных кампазіцыяў, музычныя праграмы, падрыхтаваныя беларускімі ды-джэямі, а таксама творы з аранжыроўкамі беларускіх музыкаў і творы групаў, у складзе якіх працуюць беларускія музыкі. Разам з тым, супрацоўнікі FM-станцыяў, самі музыкі і журналісты з лета патрабавалі ад Міністэрстваў інфармацыі і культуры абнародаваць так званы "чорны сьпіс" забароненых выканаўцаў. Дакумента так і не зьявіўся. Адказныя чыноўнікі ў вуснай форме давалі ўказаньні кіраўнікам станцыяў, каб ў эфіры не было музыкаў, якія "засьведчылі сваю пазіцыю на апазіцыйных акцыях".

***18 сакавіка*** Наваполацкая гарадзкая тапанімічная камісія адмовілася назваць вуліцу ў гонар Васіля Быкава. Такім чынам, не была падтрыманая ініцыятыва мясцовых жыхароў, якія хацелі ўвекавечыць памяць народнага пісьменьніка Беларусі. Патрыятычна настроеныя навапалачане прапаноўвалі зьмяніць назву якога-небудзь гарадзкога тапоніма (напрыклад, вуліцы Кірава) і надаць яму імя ўраджэнца Віцебшчыны Васіля Быкава. Аднак сябры камісіі спаслаліся на вялікія фінансавыя выдаткі і на тое, што гэтая ініцыятыва не абмяркоўвалася грамадзкасьцю.

***18 траўня*** канцэрт-прэзентацыя папулярнага комікс-дуэту "Саша і Сірожа" апынуўся пад пагрозаю забароны. Імпрэза мусіла адбыцца ў менскім клубе "Рэактар" 19 траўня. Аднак напярэдадні адміністрацыя гэтай установы адмовіла арганізатарам у арэндзе залы. У адміністрацыі клубу адмовіліся паведаміць прычыны забароны. Вось што паведаміў арт-дырэктар "Рэактару": "Мне сказалі часова афішы зьняць, я так і зрабіў. Я ня ведаю, чаму адмянілі канцэрт, чаму такая сітуацыя склалася, мне самому цікава". А вось што паведаміў прадʼюсар дуэту Яўген Калмыкоў: "Нехта патэлефанаваў дырэктару клубу "Рэактар" і сказаў, каб гэтага канцэрту не было. Вось і ўсё. Цяпер жа вельмі цяжка ад некага дамагчыся нейкіх афіцыйных тлумачэньняў. Гэта ж зразумела". Чаму артыстаў не жадаюць папулярызаваць на радзіме, дырэктар дуэту Віталь Драздоў патлумачыў так: "Дробныя чыноўнікі ад культуры і ад іншых галінаў дзяржавы баяцца невядома чаго, а таму лішні раз вельмі моцна перастрахоўваюцца". Комікс-дуэт "Саша і Сірожа" — гэта праект мастака Алеся Хацкевіча і лідэра гурту "Ляпіс Трубецкой" Сяргея Міхалка. У 2003 годзе "Саша і Сірожа" мелі адмысловую гумарыстычную праграму "Зьвезданутыя" на першым канале Беларускага тэлебачаньня. Але пасьля інтэрвію расейскаму тэлеканалу, падчас якога артысты жартавалі над падзеямі ў Беларусі, праграма была зачыненая. Цяпер "Саша і Сірожа" зьяўляюцца вядучымі тэле- і радыёпраграмаў ва Украіне.

***25 траўня*** стала вядома, што канцэрт беларускага гурта "Крамбамбуля" ў Доме літаратара, які быў прызначаны на 8 чэрвеня, адменены. У асяродку музыкаў упэўненыя, што загад зыходзіць з уладных структураў.

***22 чэрвеня*** полацкая інтэлігенцыя, якая зьвярталася да ўраду з калектыўным лістом, у якім прасіла яго кіраўніцтва "зрабіць усё магчымае дзеля захаваньня імя вялікага палачаніна Францыска Скарыны ў назове галоўнага прасьпекту беларускай сталіцы", атрымала афіцыйны адказ за подпісам начальніка ўправы культуры Менгарвыканкаму В.Кураша. Адказ напісаны па-расейску. У ім паведамляецца, што галоўны прасьпект беларускай сталіцы бярэ свой пачатак з пляцу Незалежнасьці і зьяўляецца яго неадʼемнай часткай. На прасьпекце штогоду ўрачыста адзначаюцца Дні Незалежнасьці і сьвята Перамогі, апроч таго, у 1944 годзе там ладзіўся

знакаміты партызанскі парад. З гэтай нагоды, паводле прэзідэнцкага ўказу, прасьпект Скарыны быў пераназваны ў прасьпект Незалежнасьці. Паводле аўтараў калектыўнага звароту, адказ начальніка ўправы культуры Менгарвыканкаму будзе імі захаваны для нашчадкаў у якасьці яскравага ўзору эпісталярнай казуістыкі.

***30 чэрвеня*** на 28-м кіламетры шашы Менск-Маладэчна адкрыўся гістарычна-культурны комплекс “Лінія Сталіна”. Ветэранам, запрошаным на адкрыцьцё комплексу, прадстаўнікі Беларускага рэспубліканскага саюзу моладзі ўручалі выдадзены нядаўна ў Менску зборнік артыкулаў “Сталину, Европа, поклонись”. На цырымоніі адкрыцьця прысутнічаў Аляксандр Лукашэнка. Шэраг беларускіх гісторыкаў напярэдадні адкрыцьця комплексу ацэньвалі рэанімацыю “Лініі Сталіна” як чарговы крок да апраўданьня на дзяржаўным узроўні злачынстваў сталінскай эпохі. Цяпер у Беларусі ёсьць бюст Сталіна, які стаіць у пасёлку Сьвіслач на Гарадзеншчыне. Таксама ў Слуцку, дзе рабочыя аднаго з будаўнічых упраўленьняў раскапалі бюст Сталіна і ўсталявалі ў двары свайго прадпрыемства. Слова “Сталін” на фасадзе Сувораўскай вучэльні ў Менску паўтараецца больш за дзесяць разоў – згодна з рашэньнем Менгарвыканкаму аб рэстаўрацыі будынку.

***4 ліпеня*** мастак ***Алесь Пушкін*** быў дастаўлены ва ўправу ўнутраных справаў Ленінскага раёну за перформанс, які ён ладзіў у 5 гадзінаў раніцы на прыступках Мастацкага музею, дзе ён паставіў 4 партрэты беларускіх дзеячоў, загорнутых у чорную тканіну і абвязаных чырвонымі ланцугамі. Алесь на вачах у мінакоў, якія вярталіся пасьля сьвяточнага феерверку, пачаў здымаць з партрэтаў тканіну, але міліцыянты не далі яму працягнуць акцыю і затрымалі мастака. Паколькі Алесь Пушкін аказаў супраціў, на яго начапілі кайданкі і несьлі ў гарадзкі аддзел міліцыі на вуліцу Карла Маркса тварам уніз. Мастака з аддзяленьня міліцыі адпусьцілі, ня склаўшы на яго пратакол. Разам з Пушкіным у міліцыю трапілі фотакарэспандэнт агенцтва Associated Press Сяргей Грыц і фотакарэспандэнт газеты “Наша Ніва” Юлія Дарашкевіч. Карэспандэнтаў трымалі ў пастарунку тры гадзіны, ім не дазвалялі выйсьці на вуліцу і адпусьцілі толькі тады, калі прыехаў намесьнік кіраўніка Ленінскага раёну. На думку фотакарэспандэнтаў, міліцыянты злоўжывалі сваім службовым становішчам, бо ім былі прад’яўленыя ўсе неабходныя дакументы.

***7 ліпеня*** стала вядома, што ў хуткім часе на Інтэрнэт-старонцы “Мартыралог Беларусі” зьявяцца больш чым 50 тысячаў імёнаў людзей, рэпрэсаваных у Менску ў часы кіраваньня Іосіфа Сталіна. Гэтыя сьпісы былі атрыманыя ў супрацоўніка КГБ, і цяпер стваральнікі сайту “Мартыралог Беларусі” рыхтуюць іх для разьмяшчэньня ў інтэрнэт. Сайт апавядае пра злачынствы і ахвяраў камунізму ў Беларусі ў ХХ-ым стагодзьдзі. На сайце выстаўленыя больш за 6 тысячаў імёнаў рэпрэсаваных жыхароў Беларусі

і некалькі соцень імёнаў карнікаў, некалькі дзясяткаў архіўных фатаграфіяў з Курапатаў, а таксама кнігі пра гісторыю палітычных рэпрэсіяў у Беларусі. Апошнім часам у Беларусі адбываецца рэабілітацыя Сталіна, у той час, як тэма палітычных рэпрэсіяў амаль не ўздымаецца ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі. Менавіта таму праца ў гэтым накірунку набывае яшчэ больш істотнае значэньне.

***20 ліпеня*** металічны крыж, які ўсталяваны ў Магілёве памяці ахвярам Чарнобылю, невядомыя сагнулі да зямлі. Чарнобыльскі крыж магілёўскія дэмакраты паставілі да 10-годзьдзя аварыі на ўзгорку ля Лаўсанаўскіх могілак, дзе пахаваныя людзі, якія пацярпелі ад радыяцыйнай навалы. Вандалы двойчы ці тройчы зьнішчалі драўляны крыж, аднак два гады таму паставілі новы знак — металічны, надзейна зацэментаваны, з гранітнай плітой “Вечная памяць ахвярам Чарнобылю”. Аднак цяпер паспрабавалі зьнішчыць і яго. Лідэр Магілёўскай абласной арганізацыі Партыі БНФ ***Рыгор Костусеў*** і прадстаўнік магілёўскіх сацыял-дэмакратаў ***Павел Усаў*** зьвярнуліся з заявай у адміністрацыю Кастрычніцкага раёну. Яны просяць разабрацца, хто і па якіх прычынах паспрабаваў зьнішчыць чарнобыльскі крыж і, калі ёсьць магчымасьць, дапамагчы аднаўленьню памятнага знаку.

***21 ліпеня*** спаўняецца год канцэрту на менскім пляцы Бангалор з удзелам шэрагу беларускіх рок-гуртоў і выканаўцаў. Сярод іх былі “N.R.M.”, “Нейра-дзюбель”,”Палац”, Аляксандр Памідораў і іншыя. Музыкі выступілі ў знак падтрымкі мітынгу пад лозунгам: “Не – трэцяму тэрміну” і была дазволеная гарадзкой адміністрацыяй. Аднак улады распачалі перасьлед удзельнікаў канцэрту, які доўжыцца і па сёньня. Гаворыць лідэр “N.R.M.” Лявон Вольскі: “Забароны негалосныя і раней здараліся. Пасьля гэтага ж канцэрту зьявіліся “чорныя” сьпісы на радыё, тэлебачаньні, у іншых дзяржаўных СМІ. І шэраг гуртоў зараз не фігуруюць у беларускім эфіры. Пэўна, узьнікла нейкая генеральная лінія, зараз вельмі цяжка правесьці канцэрт. А калі гэты канцэрт не адбываецца, то вельмі цяжка даказаць, што ён забаронены. Бо зараз вельмі добра адладжаная бюракратычная сістэма”. Яшчэ адзін удзельнік канцэрту, лідэр гурту “Нейра-дзюбель” Аляксандр Кулінковіч таксама заяўляе, што скіраванасьць уладаў на зьнішчэньне беларускай рок-музыкі была заўжды, а выступ на Бангалоры стаўся ўсяго толькі падставаю для далейшага наступу. Забароненыя рок-музыкі адзінадушна заяўляюць, што не шкадуюць пра свой удзел у так званым “апазіцыйным” канцэрце. І нават маюць з гэтага карысьць, бо ўсё гэтае іх толькі зблізіла, кажа лідэр гурту “Палац” Алег Хаменка.

***2 жніўня*** стала вядома, што штраф памерам у адну базавую велічыню атрымаў адзін з актывістаў дэмакратычных сілаў Гародні ***Андрэй Янушкевіч***. Менавіта такое пакараньне прызначыла адміністрацыйная камісія Кастрычніцкага раёну юнаку за распаўсюд улётак з патрабаваньнем да

уладаў аб перайменаваньні адной з вуліцаў Гародні ў вуліцу Васіля Быкава (арт. 172 ч.3 КаАП РБ).

***5 жніўня*** Зэльвенскі райвыканкам не дазволіў праводзіць 95-ыя ўгодкі з дня нараджэньня слыннай беларускай паэткі Ларысы Геніюш, якая ў свой час адмовілася прыняць савецкае грамадзянства і на ўсё жыцьцё засталася грамадзянкай Беларускай Народнай Рэспублікі. Адзін з арганізатараў сьвята ***Міхась Скобла*** папярэдне дамовіўся праводзіць прэзентацыю кніжкі Ларысы Геніюш "Эпісталярная спадчына" ў Зэльвенскай школе мастацтваў. Аднак за два дні да пачатку мерапрыемства гарвыканкам адхіліў заяву "Саюза беларускіх пісьменьнікаў". Спадару Скоблу патлумачылі, што ў школе мастацтваў пацякла страха. У музычнай школе яму сказалі, што яна на рАМАПце, а кінатэатр апячатаны пажарнымі службамі. Арганізатары пастанавілі не адкладваць сьвяткаваньне і перанесьці яго на прыроду.

***9 жніўня*** ў Менску забароненае выступленьне папулярнага фольк-гурту "Палац". Канцэрт мусіў адбыцца ў клубе "Белая вежа" 18 жніўня па ініцыятыве ўладальнікаў гэтай установы. Аднак кіраўніцтва ўпраўленьня культуры Менгарвыканкаму адмовіла арганізатарам у выдачы гастрольнага пасьведчаньня, якое дае права на правядзеньне імпрэзы. Гэта мусіў быць першы канцэрт пасьля выступленьня "Палацу" на мітынгу на пляцы Бангалор у ліпені 2004 году. Кіраўнік "Палацу" Алег Хаменка быў аўтарам і вядучым праграмы "Настаўніцкая" на канале "Лад" беларускага тэлебачаньня. Аднак пасьля выступу на пляцы Бангалор праграму забаранілі, а калектыў гурту ў поўным складзе звольнілі з працы ў «Белканцэрце». Яшчэ аднаго ўдзельніка канцэрту на Бангалоры, Аляксандра Памідорава, звольнілі з тэлеканалу "СТВ", дзе ён вёў праграму "Тэхналогія". Сёлета ў менскім клубе "Рэактар" былі забароненыя два канцэрты: гуртоў "N.R.M." і "Нейра дзюбель". Музыкі распаўсюдзілі адкрыты ліст да ўладаў з патрабаваньнем патлумачыць, па якіх прычынах вядзецца іх перасьлед, аднак адказу не атрымалі.

***15 жніўня*** Пінскі гарвыканкам не дазволіў незалежнай газеце "Мясцовы час" ладзіць канцэрт бардаўскай песьні з нагоды выхаду 100-га нумару выданьня. Рэдактар газеты ***Віктар Ярашук*** атрымаў ліст з гарвыканкаму, у якім гаворыцца, што ўлады не даюць дазвол на правядзеньне канцэрту ў гарадзкім парку. Намесьнік старшыні Пінскага гарвыканкаму Аляксандр Канеўскі, які падпісаў гэты ліст, адмовіўся паведаміць, чаму ўлады не жадаюць правядзеньня такога канцэрту. У супрацоўнікаў рэдакцыі зьявіліся зьвесткі і пра тое, што прыватных асобаў, што займаюцца распаўсюдам "Мясцовага часу", прымушаюць скасаваць свае дамовы з гэтым выданьнем. Да гэтага варта дадаць, што зараз "Мясцовы час" вымушаны друкавацца ня ў Пінску, а ў Баранавічах, а пінскае прадпрыемства "Белсаюздруку" не бярэ гэтае незалежнае выданьне для распаўсюду праз свае шапікі.

***2 верасьня*** стала вядома, што на радзіме беларускага першадрукара Францыска Скарыны ўпершыню за апошнія гады не адбудзецца традыцыйнага сьвята кнігі. Усе творчыя асобы і калектывы, якія раней атрымалі запрашэньне ў Полацк на 3-4 верасьня, папярэджаныя аб адмоўным рашэньні мясцовай улады. Асноўнай прычынай адмены сёлетняга мерапрыемства полацкія ўлады называюць дэфіцыт сродкаў у гарадзкім бюджэце.

***4 верасьня*** ў райцэнтры Камянец на Берасьцейшчыне адбыўся Дзень беларускага пісьменства. Арганізатары афіцыйнага мерапрыемства адмежавалі ад удзелу у ім сяброў "Саюзу беларускіх пісьменьнікаў" – ніводзін сябра не атрымаў запрашэньня. Старшыня "Саюзу беларускіх пісьменьнікаў" Алесь Пашкевіч так пракаментаваў сітуацыю: "Уладныя структуры падзялілі беларускае пісьменства на "чэсных" і "нячэсных". "Нячэсныя" не прадстаўленыя ў афіцыйных днях паэзіі, у дзяржаўных часопісах, у літаратурных штотыднёвіках. Губляе па вялікім рахунку літаратура, беларуская сучасная культура. Звычайны з глыбінкі беларускі чалавек, чытач не задае сабе пытаньні: чаму не прыехалі, ці не запрасілі альбо не пусьцілі? Ён робіць банальную выснову: няма сучаснай беларускай літаратуры, няма вядомых пісьменьнікаў. Ён так мяркуе, бо ня бачыць, яны да яго не даяжджаюць у значныя традыцыйныя сьвяты пісьменства, сьвяты кнігі".

***15 верасьня*** Менскі гарадзкі суд адмовіў у задавальненьні скаргі жыхароў беларускай сталіцы, якія абскардзілі перайменаваньне цэнтральных праспектаў і вуліц А. Лукашэнкам. Спачатку група менчукоў абскардзіла дзеяньні па перайменаваньні вуліц у судзе Цэнтральнага раёну Менску, аднак гэты суд адмовіўся разглядаць іх скаргу, спаслаўшыся на тое, што ў ягоную кампетэнцыю не ўваходзіць разгляд нарматыўных актаў кіраўніка дзяржавы. Ініцыятары справы палічылі такую пазіцыю не адпаведнай заканадаўству і падалі касацыю ў суд вышэйшай інстанцыі – Менскі гарадзкі, аднак і Менскі гарадзкі суд палічыў, што разглядаць указы А. Лукашэнкі беларуская судовая сістэма ня мае права.

***3 кастрычніка*** міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў падчас выступу ў Палаце прадстаўнікоў сказаў, што Міністэрства адукацыі абавязана сачыць за тым, каб навучальны працэс "ня быў палітызаваным". Так ён пракаментаваў выдадзены міністэрствам у канцы траўня 2005 году дакумент для службовага карыстаньня "Аб мерах па недапушчэньні спробаў уцягваньня навучэнцаў і студэнтаў у супрацьпраўную дзейнасьць палітычнага кшталту". Як адзначыў А. Радзькоў, дадзены дакумент ніякім чынам не абмяжоўвае канстытуцыйных правоў студэнтаў. Па ягоных словах, яны "маюць права ўдзельнічаць у палітычным жыцьці", але навучальныя ўстановы – ня месца "для дэкляраваньня сваіх падыходаў і палітычных поглядаў".

***На пачатку лістапада*** ля будынку № 27 на вуліцы Гандлёвай у Менску

адбыўся шэраг пікетаў пратэсту супраць разбурэньня культурна-гістарычнага помніка пачатку XIX-га стагодзьдзя. Так, у рэестры пазначаны гэты адзіны будынак, які захаваўся на схіле ад плошчы Свабоды да ракі Сьвіслач. Мінгарвыканкам даў дазвол разбурыць будынак, каб на яго месцы пабудаваць праваслаўную духоўную семінарыю. У будынку № 27 на вуліцы Гандлёвай спачатку быў жылы дом, фасад якога ўпрыгожвалі балконы з унікальнымі ажурнымі парэнчамі з чыгуну. Потым там месьціўся інтэрнат журфаку. У гады студэнцтва там жыў Алесь Адамовіч. Нягледзячы на пратэсты грамадзкасьці, помнік архітэктуры XIX-га стагодзьдзя быў зьнесены.

***10 лістапада*** ў Гомелі рэктар універсітэту імя Францішка Скарыны Аляксандр Рагачоў заявіў пра ўзмацненьне прапаганды у сваёй справаздачы на выязным паседжаньні гарвыканкаму. Перад гэтым супрацоўнікі выканкаму, ідэалагічныя работнікі, кіраўнікі навучальных установаў пабывалі ў студэнцкіх інтэрнатах, моладзевым і спартовым комплексах. У абмеркаваньні справаздачы рэктара браў удзел памочнік кіраўніка дзяржавы ў рэгіёне Віктар Шчэцька. Начальнік ідэалагічнай управы аблвыканкаму Анатоль Каціла прапаноўваў кіраўніцтву ўніверсітэту ўмацоўваць пярвічную арганізацыю БРСМ, арганізаваць радыёвяшчаньне ў студэнцкіх інтэрнатах, павялічыць падпіску на дзяржаўныя перыядычныя выданьні ў асяродку выкладчыкаў і студэнтаў. Пільная ўвага надаецца і сярэднім школам. Цяпер кіраўнікі ад адукацыі моцна заклапочаныя афармленьнем куткоў з дзяржаўнай сімволікай. Такое патрабаваньне зыходзіць ад абласнога ўпраўленьня адукацыі. Распавядае начальніца аддзелу адукацыі адміністрацыі Савецкага раёну Наталя Жгірава: “У кожным класе павінны быць герб і сьцяг. А ў школе, у фае, калі ўваходзіш у школу, трэба, каб там была дзяржаўная сімволіка. Як у чырвоным куце афармлена – герб, сьцяг і гімн”. Галоўная сьпецыялістка аддзелу адукацыі Алена Сурава ўдакладняе, як павінны выглядаць куткі з сімволікай: “Гэта – куток такі, як, напрыклад, у вайсковых часьцях афармляецца”.

***28 лістапада*** ў Курапатах чарговы раз пашкоджаны Мемарыяльны знак “Ад народу ЗША народу Беларусі дзеля памяці”, які ўсталяваў у 1994 годзе падчас візіту ў Беларусь Біл Клінтан. Верхнюю пліту мемарыяльнага знаку адарвалі ад апораў і кінулі на зямлю. Ва ўрочышчы зламаныя больш за дзесяць крыжоў, пашкоджаныя таблічкі на гэтак званым “польскім крыжы” і на некалькіх імянных крыжах. З многіх крыжоў сарваныя іконы. На ікону Маці Божай Курапацкай, якую намаляваў мастак Аляксей Марачкін, вандалы нанесьлі фашыстоўскую свастыку. З курапацкага каменю зьнікла таблічка “Ахвярам сталінскіх рэпрэсій”.

***1 сьнежня*** амбасадары краінаў Еўрасаюзу наведалі ўрочышча Курапаты. Яны выказалі абурэньне актамі вандалізму ў месцы масавых расстрэлаў ахвяраў палітычных рэпрэсіяў.

***7 сьнежня*** адбылося паседжаньне прадстаўнікоў грамадзкасьці ў справе ўратаваньня Курапатаў. Гэта сябры Міжнароднага праваабарончага таварыства "Мемарыял", Асацыяцыі ахвяраў палітычных рэпрэсіяў, вядомыя гісторыкі, археолагі і палітыкі. Удзельнікі паседжаньня прынялі рашэньне аб зборы подпісаў пад зваротам да грамадзкасьці, а таксама вырашылі патрабаваць ад уладаў даць прававую ацэнку акту вандалізму ў Курапатах. Сход таксама прыняў рашэньне не прыбіраць апаганеныя крыжы і помнікі да тае пары, пакуль сьляды злачынства не прыбяруць улады. Мясцовыя органы правапарадку распачалі ў Курапатах патруляваньне, міліцыя Менскага раёну па факце апаганьваньня Курапацкіх помнікаў распачала крымінальную справу.

***12 сьнежня*** аўтар мемарыяльных комплексаў "Хатынь" і "Яма" архітэктар Леанід Левін асудзіў факты вандалізму ва ўрочышчы Курапаты і заклікаў улады належным чынам расьсьледаваць гэтую справу і пакараць вінаватых: "Гэта наша агульная справа. І калі яны малююць на гэтых камянях, на гэтых крыжах, то яны малююць на нашых сэрцах. Я лічу, што гэта ня толькі выклік юдэям, мусульманам і хрысьціянам. Гэта выклік усім нам, гэта выклік уладам, якія нічога ня могуць зрабіць. Для нас Курапаты і тая ж Хатынь, той жа Трасьцянец, тая ж Яма – гэта ўсё куткі нашай памяці пра тых, хто загінуў".

***21 сьнежня*** дзяржаўны тэлеканал БТ-1 пачаў рэтрансьляцыю дакументальнага фільму пра Сталіна пад назвай "Генералісімус". Пасьля першай жа часткі шматсерыйнай кінастужкі некаторыя гісторыкі ацанілі фільм як тэндэнцыйны. Гаворачы пра тэндэнцыйнасьць, гісторык сталінскіх рэпрэсіяў Ігар Кузьняцоў адзначае наступнае: "Фактычна ідзе рэанімацыя і Сталіна, і ідэяў сталінізму на тэрыторыі Беларусі. Сам фільм зроблены даволі тэндэнцыйна: Сталін станоўчая фігура, але было ў яго атачэньне… Ён спрабаваў зрабіць, але ў яго не атрымалася... Апраўданьне Сталіна, і асабліва пошук ворагаў сярод іншых нацыянальнасьцяў. Выразна прасочваецца антысеміцкая лінія фільму".

***27 сьнежня*** заснавальнікі незарэгістраванага "Свабоднага тэатру" заявілі пра ўсё больш акрэсьлены намер выцісьнуць іх з Беларусі. Фактычна, забароненыя ня толькі паказы сьпектакляў на ранейшых пляцоўках, але нават аказваецца ціск на гаспадароў кватэраў, дзе ладзяцца прагляды пастановак. Тэатральны менеджэр Наталя Каляда паведаміла, што падобныя перашкоды ніяк не зьвязаныя са зьместам п'есаў, а зьяўляюцца негатыўнай рэакцыяй на шыльду "Свабоднага тэатру". Удакладняе заснавальнік "Свабоднага тэатру" Мікалай Халезін: "Тэатр павінен працаваць у падпольлі толькі таму, што гэта іншая стылістычная мова. Зьвярніце ўвагу: антрэпрызных тэатраў амаль ня стала. Усіх загналі пад нейкія дзяржаўныя дахі. Сучасны мастацкі тэатар – пад дах канцэртнай залы "Менск".

Малы тэатр спыніў існаваньне. Усе прыватныя ініцыятывы ў сферы культуры пераводзяцца пад дзяржаўныя структуры, каб можна было ажыцьцяўляць прэсінг. Каго не атрымліваецца кудысьці загнаць – дык гэта “Свабодны тэатар”. Спрабавалі нас не заўважаць, але пасьля замежных гастроляў, асабліва пасьля рэзанансу ад рыжскіх гастроляў, нас пачалі “лавіць”, дзе б мы ні зьяўляліся”.

## 7. Перасьлед і забарона дзейнасьці няўрадавых грамадзкіх арганізацыяў і палітычных партыяў, перасьлед актывістаў НДА і палітычных партыяў

***6 студзеня*** Міністэрства юстыцыі накіравала на адрас ***Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада)*** ліст аб выключэньні з БСДП (НГ) старшыні партыі М. Статкевіча, першага намесьніка старшыні партыі У. Нісьцюка, намесьніка старшыні У. Малашкі і сябра Цэнтральнага Камітэту Ю. Маркоўскага за подпісам міністра юстыцыі В. Галаванава. Міністэрствам юстыцыі была праведзеная праверка правамоцнасьці выключэньня з партыі ўказаных асобаў і ўстаноўлена, што “...рашэньне Менскага гарадзкога камітэту БСДП (НГ) ад 8.12.2004 г. аб выключэньні з партыі У. Нісьцюка, В. Малашкі і Ю. Маркоўскага зьяўляецца неправамоцным. У ходзе вывучэньня правамоцнасьці рашэньня Менскага гарадзкога камітэту БСДП (НГ) ад 11.12.2004 г. аб выключэньні з партыі яе старшыні М. Статкевіча парушэньняў не выяўлена. Дадзенае рашэньне Міністэрствам юстыцыі прызнанае правамоцным. Такім чынам, выконваючым абавязкі старшыні БСДП (НГ) становіцца У. Нісьцюк.

***10 студзеня*** стала вядома, што да 17 студзеня ***Гарадзенскае гарадзкое ГА БНФ “Адраджэньне”*** павінна вызваліць памяшканьне па вул. К.Маркса, 11 у Гародні, дзе знаходзіцца сядзіба арганізацыі. З такім патрабаваньнем выступіла Унітарнае жыльлёвае рАМАПтна-эксплуатацыйнае прадпрыемства Ленінскага раёна Гародні. Старшыня арганізацыі Мікола Воран атрымаў ліст за подпісам дырэктара гэтай установы А.Ліцьвіна, у якім прапануецца спыніць дамову арэнды памяшканьня “па згодзе бакоў” у тыднёвы тэрмін. УЖРЭП хоча скасаваць дамову аб арэндзе памяшканьня ў сувязі з тым, што нібыта памяшканьне знаходзіцца “ў аварыйна-небясьпечным стане і патрабуе тэрміновага правядзеньня рАМАПтных прац у сувязі з пагрозай абвалу будынку”. Такое заключэньне вынесла Гарадзенскае унітарнае праектнае прадпрыемства “Інстытут Гроднаграма-

Праваабарончы Цэнтр «ВЯСНА»

дзянпраект". Мікола Воран лічыць, што такія дзеяньні гарадзенскіх уладаў ставяць пад пагрозу існаваньне арганізацыі. На ягоную думку, дзеяньні ўладаў выкліканыя падрыхтоўкай да прэзідэнцкіх выбараў.

***13 студзеня*** Вярхоўны суд не задаволіў наглядную скаргу ***"Задзіночаньня Беларускіх Студэнтаў"*** аб адмене рашэньня аб ліквідацыі арганізацыі, прынятага 3 сьнежня 2001 году. "Дзейнасьць ЗБС без рэгістрацыі стала толькі больш актыўнай, што чарговы раз сьведчыць пра перакананьне сяброў арганізацыі ў тым, што можна ліквідаваць рэгістрацыю арганізацыі, але нельга зьнішчыць тысячы студэнтаў, аб'яднаных агульнай ідэяй," – каментуе Рада ЗБС. "Задзіночаньне Беларускіх Студэнтаў" стала першай арганізацыяй, ліквідаванай у межах кампаніі Міністэрства юстыцыі па зачыстцы няўрадавых грамадзкіх аб'яднаньняў.

***14 студзеня*** дэпутат Гарадзенскага гарсавету Сяргей Антусевіч зьвярнуўся з дэпутацкім запытам да кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёну Гародні ў сувязі з высяленьнем з памяшканьня ***ГА БНФ "Адраджэньне"***. У сваім запыце дэпутат патрабуе прадставіць дакументы, якія пацьвярджаюць, што будынак, у якім месьцяцца юрыдычныя адрасы гарадзенскіх аддзяленьняў ГА БНФ "Адраджэньне" і ПКБ, сапраўды знаходзіцца ў аварыйным стане. Сяргей Антусевіч таксама заявіў, што БНФ "Адраджэньне" заўсёды прымала актыўны ўдзел у любой кампаніі, у першую чаргу ў вылучэньні назіральнікаў на выбары. Цяпер гэта будзе складана зрабіць.

***17 студзеня*** гарадзенскі офіс ***ГА БНФ "Адраджэньне"*** наведалі прадстаўнікі УЖРЭП Ленінскага раёну, якія паведамілі, што будынак знаходзіцца ў аварыйным стане і трэба яго вызваліць. Аднак патрабаваньні камунальнікаў былі праігнараваныя. На наступны дзень раніцай на ўваходных дзьвярах офіснага будынку зьявілася паведамленьне наступнага зьместу: "У сувязі з аварыйным станам будынку ўваход у дом №11 па вул. К. Маркса забаронены".

***18 студзеня*** нямецкі ***Фонд «Памяць, адказнасьць і будучыня»*** прыняў заяву, у якой абвяргае зьвесткі, прадстаўленыя беларускім тэлебачаньнем. У матэрыяле, што быў паказаны ў навінах на канале ОНТ 13 студзеня, выказваецца шэраг прэтэнзіяў да Беларускага рэспубліканскага Фонду "Узаемаразуменьне і прымірэньне". У прыватнасьці, камісіі Фонду з некаторых абласных гарадоў Беларусі абвінавачваліся ў тым, што беспадстаўна адмаўлялі былым фашысцкім вязьням у прыняцьці дакументаў на атрыманьне грашовай кампенсацыі. У сувязі з гэтым праўленьне нямецкага Федэральнага Фонду "Памяць, адказнасьць і будучыня" прыняло заяву, у якой абвяргаюцца ўсе прэтэнзіі да Беларускага рэспубліканскага Фонду "Узаемаразуменьне і прымірэньне". Паводле заявы, беларускі Фонд заўжды адстойваў інтарэсы ўсіх ахвяраў нацыянал-

сацыялістычнага перасьледу з Беларусі, а ўсе праверкі дзейнасьці, што напрацягу многіх гадоў праводзіліся ў Беларусі, паказалі, як выдатна Беларускі Фонд прадстаўляе інтарэсы пакрыўджаных і з якім тактам ён аддае даніну іх цяжкаму лёсу.

***18 студзеня*** стала вядома, што многія віцебскія аб’яднаньні, якія працавалі пры жыльлёва-камунальных службах, пазбаўленыя памяшканьняў. Заяўлена, што клубы па месцы жыхарства зачыненыя за тое, што яны не спраўляюцца са сваімі задачамі і патрабуюць вялікіх выдаткаў. Арганізацыі, якія займаюцца дзецьмі, альбо зачынілі, альбо перадалі аддзелам адукацыі. Напрыклад, з клубуу па месцы жыхарства, які да нядаўняга часу разьмяшчаўся у памяшканьнях, што належаць Кастрычніцкаму ЖРЭТ, выкінутыя краязнаўчае аб’яднаньне “Спадкаемцы”, некалькі мастацкіх гурткоў, лялечны тэатар, арганізацыя калекцыянэраў, група псіхалагічнай дапамогі, клуб сямейнага выхаваньня, спартовая секцыя.

***18 студзеня*** начальнік эксплуатацыйнай службы Гародні Анатоль Ліцьвін запатрабаваў ад чатырох грамадзкіх арганізацыяў, у тым ліку ***ГА БНФ “Адраджэньне”***, высяленьня з памяшканьняў на Карла Маркса, 11, матывуючы рашэньне заключэньнем інстытуту “Горадняграмадзянпраект” аб аварыйна-небясьпечным стане будынку. Галоўны камунальшчык гораду патрабуе выселіцца, а наўзамен нічога не прапаноўвае, бо нібыта вольных месцаў для арэнды камунальныя службы гораду ня маюць. Сябры грамадзкіх арганізацыяў уражаныя такім станам рэчаў, тым больш што ў будынку таксама знаходзіцца прыватная крама будаўнічых матэрыялаў, але ад яе ўладальнікаў не патрабуюць высяленьня, а толькі рэкамендуюць зрабіць рАМАПт даху і перакрыцьцяў. Чатыры грамадзкія арганізацыі: абласная рада ГА БНФ “Адраджэньне”, гарадзкая і Ленінскага раёну, а таксама гістарычна-культурны клуб “Паходня” ў выніку іх высяленьня страцяць свае юрыдычныя адрасы.

***24 студзеня*** гаспадарчы суд Гарадзенскай вобласьці ўзбудзіў вытворчасьць па зыску ўнітарнага жыльлёва-рАМАПтна-эксплуатацыйнага прадпрыемства Ленінскага раёну адносна высяленьня чатырох грамадзкіх арганізацыяў, у тым ліку ***ГА БНФ “Адраджэньне”,*** з будынку па вуліцы К.Маркса, 11. Кіраўнік эксплуатацыйнага прадпрыемства Анатоль Ліцьвін у зыску спасылаецца на заключэньне інстытуту “Гародняграмадзянпраект”, у якім гаворыцца, што будынак знаходзіцца ў аварыйным стане і далейшая яго эксплуатацыя немагчымая. Ён просіць суд скасаваць дамову з грамадзкімі аб’яднаньнямі і выселіць іх з будынку. Прадстаўнікі грамадзкіх арганізацыяў лічаць, што высяленьне іх на вуліцу зьвязанае з жаданьнем гарадзкіх уладаў пазбавіць іх юрыдычных адрасоў.

***26 студзеня*** па выніках праверкі ***Беларускага саюзу моладзевых***

***і дзіцячых грамадзкіх аб’яднаньняў “Рада”*** падатковая інсьпекцыя Цэнтральнага раёну Менску пастанавіла спагнаць з арганізацыі нявыплачаныя падаткі, эканамічныя санкцыі і пеню. Агульная сума прэтэнзіяў падаткавікоў да “Рады” перавышае 125 мільёнаў рублёў – гэта рэкордныя эканамічныя санкцыі супраць беларускіх няўрадавых арганізацыяў. Падставы для такіх вялікіх штрафаў былі выяўленыя намесьнікам начальніка падатковай інсьпекцыі Цэнтральнага раёну г.Менску В.Л.Мірановічам і падатковым інсьпектарам Е.В.Пшанічнай падчас мінулагодняй праверкі арганізацыі. Падаткавікі прыйшлі да высновы, што ў 2002 і ў 2003 годзе “Рада” беспадстаўна не плаціла падаткаў з міжнароднай тэхнічнай дапамогі, атрыманай ад Еўрапейскай камісіі па праграме TACIS і ад Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў па праграме ЮНІСЕФ. Пры гэтым у 2004 годзе ў падобных сітуацыях ўсе судовыя інстанцыі прызналі, што сродкі TACIS скарыстоўваюцца паводле беларускага заканадаўства ў беспадаткавым рэжыме, і арганізацыі не павінныя плаціць падаткаў з атрыманых грантаў.

***27 студзеня*** ў судзе Чыгуначнага раёну Гомелю распачалася дасудовая падрыхтоўка да разгляду зыску прадстаўніка ***Фонду спрыяньню лакальнаму разьвіцьцю*** Віктара Карніенкі да пашпартна-візавай службы АУС Чыгуначнага раёну. З восені 2004 г. міліцыя адмаўляе Віктару Карняенку ў дазвольным запісе, неабходным для паездак за мяжу. Сваю адмову супрацоўнікі пашпартна-візавай службы матывуюць тым, што, па атрыманай імі інфармацыі з падатковай інсьпекцыі Савецкага раёну Гомеля, у сп.Карніенкі ёсьць запазычанасьць перад дзяржавай. Маецца на ўвазе запазычанасьць звыш 6 млн. рублёў грамадзкай арганізацыі “Грамадзянскія ініцыятывы”, якую ўзначальваў сп.Карніенка і якая была ліквідаваная ўладамі яшчэ ў 2003 годзе. “Той штраф, які асабіста мне прызначыў суд, я сплаціў. Калі б “Грамадзянскія ініцыятывы” дзейнічалі, то яны таксама б разьлічыліся зь дзяржавай. Паводле беларускага заканадаўства, грамадзянін не нясе адказнасьць па пазыках грамадзкай арганізацыі. Таму я разглядаю дзеяньні чыноўнікаў як абмежаваньне маіх грамадзянскіх свабодаў”, – пракаментаваў сітуацыю Віктар Карніенка.

***31 студзеня*** жыхары Кастрычніцкага раёну Віцебску выказалі пратэст супраць масавага закрыцьця клубаў пры жыльлёвых рАМАПтна-эксплуатацыйных таварыствах. Яны сабралі звыш тысячы подпісаў у абарону ***клубу “Доблесьць”***. На пачатку году Віцебскі гарвыканкам дзеля эканоміі сродкаў ліквідаваў клубы па месцы жыхарства, што працавалі пры ЖРЭТах. Іх перадалі ўстановам адукацыі, аднак насамрэч шмат якія гурткі, секцыі ці студыі, дзе праводзілі вольны час як школьнікі, так і дарослыя, зьніклі. Клуб “Доблесьць” абслугоўваў насельнікаў густанаселенага мікрараёну, яго наведвалі каля сотні чалавек. Тут дзейнічалі некалькі дзіцячых гурткоў, рыцарскі клуб, тэатр мод, праводзіліся заняткі па аэробіцы і кітай-

скай гімнастыцы, сустракаліся ветэраны, аказваліся бясплатныя юрыдычныя паслугі. Сярод падобных структураў клуб лічыўся адным з лепшых. Ён атрымаў нямала дыпломаў і граматаў на розных конкурсах, выставах і спаборніцтвах.

***31 студзеня*** акруговая камісія Гарадзенскай-Цэнтральнай выбарчай акругі №52 вынесла папярэджаньне ініцыятыўнай групе па вылучэньні кандыдатам у дэпутаты намесьніка старшыні АГП ***Яраслава Раманчука***. Кандыдат папярэджаны за тое, што сябры яго ініцыятыўнай групы распаўсюджвалі ўлёткі, у якіх утрымліваўся агітацыйны матэрыял. Камісія абавязала ініцыятыўную групу выняць улёткі з паштовых скрыняў “уласнымі сіламі”. Уся недарэчнасьць сітуацыі ў тым, што, па словах кіраўніка выбарчага штабу ***Юрыя Істоміна***, улёткі былі распаўсюджаныя сіламі сябраў гарадзенскай арганізацыі АГП яшчэ да 13 студзеня – дня пачатку рэгістрацыі ініцыятыўных групаў па вылучэньні кандыдатаў у дэпутаты. “Мы распаўсюдзілі легальную прадукцыю з праграмай нашай партыі сіламі сябраў АГП яшчэ на пачатку месяцу, калі ніякіх ініцыятыўных груп нават і блізка не было! Распаўсюджаныя ўлёткі з’яўляюцца афіцыйнай прадукцыяй партыі з усімі выходнымі дадзенымі, так, як патрабуе заканадаўства”.

***31 студзеня*** на паседжаньні ўправы ***Партыі БНФ*** прагучалі наступныя лічбы: толькі 10 адсоткаў мясцовых зарэгістраваных арганізацыяў партыі здолелі знайсьці замену юрыдычных адрасоў у нежылым сектары. Гаворка ішла пра патрабаваньне Міністэрства юстыцыі, даведзенае да палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў 18 кастрычніка 2004 году, вывесьці ўсе арганізацыйныя структуры з жылога сектару ў нежылы. “Нягледзячы на настойлівыя намаганьні мясцовых структураў перарэгістраваць юрыдычныя адрасы, толькі 10 адсоткаў зарэгістраваных мясцовых арганізацыяў партыі змаглі знайсьці нейкія варыянты. Нас накіроўвалі на аўкцыёны арэнды з абсалютна нерэальнымі для нас коштамі альбо ў прыватныя дамы – там зазвычай шлях закрывалі ці пажарнікі, ці санстанцыя. Для нас абсалютна відавочна, што існуе загад да мясцовых уладаў і згаданых ужо службаў ні ў якім выпадку не рэгістраваць мясцовыя структуры Партыі БНФ. Аднак мы будзем дзейнічаць у любых умовах – прыстасоўвацца да ўладаў мы не зьбіраемся. Фактычна ўлада стварае ўсе перадумовы для высяленьня партыі ў падпольле,” – заявіў старшыня партыі Вінцук Вячорка.

***2 лютага*** ў судзе Першамайскага раёну Менску пачаўся разгляд па зыску старшыні ***Слонімскага грамадзкага аб’яднаньня “Воля да разьвіцьця” Міхася Варанца*** да Першага нацыянальнага тэлеканалу (БТ) аб абароне яго гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі, а таксама аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі няўрадавай арганізацыі. Зыск пададзены ў сувязі з тым, што 16 сакавіка 2004 году ў праграме БТ “Панарама” быў паказаны сюжэт гарадзенскага журналіста Мікалая Мэльнічэнкі

пра тое, што Міхась Варанец ухіляецца ад уплаты падаткаў з гранту, атрыманага арганізацыяй "Воля да разьвіцьця" па праграме Еўрапейскага саюзу TACIS. У прыватнасьці, у сюжэце сьцьвярджалася, што Міхась Варанец на грошы Еўразьвязу, выдаткаваныя на падтрымку падлеткавага цэнтру "Сьвятліца", арганізаваў фінансаваньне апазіцыі. І, маўляў, толькі слонімская інсьпекцыя па падатках і зборах спыніла дзейнасьць "гора-прадпрымальніка" Варанца, арыштаваўшы маёмасьць грамадзкай арганізацыі і аштрафаваўшы яе старшыню на 34 мільёны рублёў. Міхась Варанец сьцьвярджае, што падатковая інсьпекцыя хацела спагнаць з яго ня 34, а трохі больш за 14 мільёнаў рублёў, бо ўся сума гранту TACIS складае толькі 25 мільёнаў. Пры гэтым ён абскардзіў рашэньне слонімскіх падаткавікоў у Гаспадарчым судзе Гарадзенскай вобласьці, і суд ягоную скаргу задаволіў, бо паводле дамоўленасьці ўраду Беларусі з Еўрапейскай камісіяй, гранты праграмы TACIS не абкладаюцца падаткам. У сувязі з гэтым сп. Варанец зьвяртаўся да кіраўніцтва Першага нацыянальнага тэлеканалу з просьбай даць абвяржэньне. Атрымаўшы адказ аб тым, што БТ ня будзе даваць абвяржэньняў, таму што не атрымлівала ніякіх прэтэнзіяў да зьместу сюжэту ў судовым парадку, Міхась Варанец 27 лістапада 2004 году накіраваў пазоў аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі ў суд.

***2 лютага Крычаўская гарадзкая арганізацыя Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада)*** атрымала другое па ліку папярэджаньне ад упраўленьня юстыцыі Магілёўскага аблвыканкаму. Нагодай стала адсутнасьць у партыі новага юрыдычнага адрасу.

***4 лютага*** ў інтэрвію газеце "Рэспубліка" начальнік упраўленьня грамадзкіх аб'яднаньняў Міністэрства юстыцыі Алег Сьліжэўскі адхіліў абвінавачаньне ў тым, што Мінюст наўмысна не рэгіструе новыя грамадзкія арганізацыі, і заявіў, што што летась было зарэгістравана 155 новых аб'яднаньняў. Галоўнымі ж перашкодамі пры рэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў, з ягоных словаў, зьяўляюцца некампетэнтнасьць іх арганізатараў і недакладнае складаньне рэгістрацыйных дакументаў.

***4 лютага*** ў Гомелі супрацоўнікі Чыгуначнага райаддзелу міліцыі затрымалі дэпутата Рагачоўскага райсавету ***Дзьмітрыя Шкулькова*** блізу чыгуначнага вакзалу. Яны перапынілі таксоўку, у якой ехаў дэпутат, учыніліператрус ягоных рэчаў. У дэпутата міліцыянты знайшлі 2 тысячы ўлётак ініцыятывы "Партнёрства" пра рэформу беларускай жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. Міліцыянты даставілі дэпутата Шкулькова ў пастарунак, канфіскавалі ўлёткі і склалі пратакол пра незаконны выраб друкаванай прадукцыі. У пастарунак падтрымаць дэпутата Шкулькова прыехалі кіраўнікі рэгіянальных аддзяленьняў БХК Алесь Яўсеенка і "Партнёрства" Сьвятаслаў Шаламаў. Калі дэпутата адпусьцілі, спадары Яўсеенка і Шаламаў вярнуліся ў свой офіс на вуліцы 50 год БССР. Але за імі прыехалі міліцыянты, якія сталі

стукаць рукамі, нагамі, званіць, а потым узялі і адключылі электрычнасьць. Офісны пакой у доме №21 на вуліцы 50 год БССР міліцыя трымала ў аблозе блізу дзьвюх гадзінаў. Аблогавую каманду міліцыянтаў узначальваў старшы лейтэнант Чыгуначнага РАУС Аляксандр Кошман.

***7 лютага*** Упраўленьне юстыцыі Магілёўскага аблвыканкаму вынесла пісьмовае папярэджаньне радзе ***Грамадзкага аб'яднаньня "Бялыніцкае краязнаўчае таварыства"*** за парушэньне арт. 8 Жыльлёвага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Радзе таварыства прапанавана ў тэрмін да 1 сакавіка прывесьці юрыдычны адрас аб'яднаньня ў адпаведнасьць з патрабаваньнямі заканадаўства. У выпадку невыкананьня прапановы, можа быць пастаўлена пытаньне аб ліквідацыі аб'яднаньня.

***8 лютага*** ў Гарадзенскім абласным гаспадарчым судзе пачаўся разгляд справаў аб высяленьні гарадзкой і абласной радаў ***Грамадзкага аб'яднаньня БНФ "Адраджэньне"***. Каб іх выселіць з арандаваных памяшканьняў, у суд зьвярнулася жыльлёвае рАМАПтна-эксплуатацыйнае прадпрыемства Ленінскага раёну гораду. Першай разглядалася справа адносна гарадзкой арганізацыі. Судзьдзя Сяргей Кулакоўскі зазначыў, што жыльлёва-камунальная служба просіць скасаваць дамову аб арэндзе з БНФ і выселіць арганізацыю. У БНФ былі зьдзіўлены гэтаму: у лістападзе 2004 году дамова аб арэндзе была працягнутая, а 6 студзеня іх раптам пачалі высяляць. Камунальная служба спасылаецца на тое, што дом у аварыйным стане. Адразу за гэтым суд зьвярнуўся да справы аб высяленьні абласной Рады БНФ "Адраджэньне", якая месьціцца ў тым жа будынку на вуліцы К.Маркса, 11.Судовае паседжаньне прыпыненая да 21 лютага, каб суд меў час сабраць дадатковыя матэрыялы, якія датычаць справы.

***8 лютага*** Цэнтрвыбаркам пакінуў у сіле папярэджаньне ініцыятыўнай групе ***Я.Раманчука***. ЦВК палічыў, што ўлёткі Аб'яднанай грамадзянскай партыі, намесьнікам старшыні якой зьяўляецца Яраслаў Раманчук, зьяўляюцца заўчаснай агітацыяй на ягоную карысьць. Яраслаў Раманчук спрабаваў тлумачыць, што ягоная партыя цяпер праводзіць вялікую агітацыйную кампанію, якая зьвязаная з прэзідэнцкімі выбарамі, аднак сябры ЦВК ягоныя доказы адхілілі.

***8 лютага*** ўлады прапанавалі ***аналітычнаму цэнтру "Сацыяльныя тэхналогіі"*** "добраахвотна самаліквідавацца". Няўрадавая арганізацыя праіснавала крыху меней за пяць гадоў, і яе дзейнасьць мусіць быць спыненая да канца лютага з прычыны трох афіцыйных папярэджаньняў, атрыманых ад Міністэрства юстыцыі . Кіраўнік цэнтру Аляксандр Фядута тлумачыць ініцыятыву ўпраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму тым, што гэткае рашэньне – вынік мэтанакіраванай кампаніі супраць трэцяга сектару. Праца аналітыкаў канцэнтравалася на некалькіх праектах: гэта выпуск "Бела-

рускага штогодніка" – маніторынгу важнейшых падзеяў за год, праект "Сацыяльных тэхналогіяў" – інтэрнэт-сайт "Наша меркаваньне" (www.nmnby.org), дзе зьмяшчаюцца аналітычныя матэрыялы беларускіх і замежных экспертаў. Спадар Фядута выказаў спадзяваньне, што з ліквідацыяй цэнтру гэтыя праекты захаваюцца, паколькі аналітычныя працы вельмі запатрабаваныя.

***8 лютага*** у Вярхоўны суд пададзены зыск Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі ***Грамадзкага аб'яднаньня "Беларускі жаночы рух "Адраджэньне Айчыны"***. У сувязі з гэтым у Вярхоўным судзе адбылося распарадчае пасяджэньне бакоў. На ім стала вядома, што зыск аб ліквідацыі грамадзкага аб'яднаньня падпісаная міністрам юстыцыі Віктарам Галаванавым 27 студзеня 2005 году. Гэтаму дзеяньню папярэднічала працяглая праверка арганізацыі. Асноўныя прэтэнзіі да арганізацыі, выкладзеныя ў зыску, тычацца няправільнага вядзеньня справаводзтва ў грамадзкім аб'яднаньні і непрадастаўленьне кантралёрам міністэрства патрэбных дакументаў. Міністэрства юстыцыі ў якасьці грубага парушэньня заканадаўства адзначае, напрыклад, што 21.12.2003 году , напярэдадні Калядаў і Новага году, Управа арганізацыі пастанавіла "падрыхтаваць віншаваньні сябрам нашай арганізацыі.

***9 лютага*** старшыню сеткі незалежнага назіраньня ***"Партнёрства" Мікалая Астрэйку*** выклікалі ў РАУС Цэнтральнага раёну Менску. Каардынатару сеткі прад'яўленае абвінавачаньне ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі паводле артыкулу 172 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях.

***10 лютага Рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне "Незалежны інстытут сацыяльна- эканамічных і палітычных дасьледваньняў"*** абскардзіла ў Вярхоўным судзе афіцыйнае папярэджаньне Мінюсту за адмову падаць анкету аднаго са сваіх сацыялагічных апытаньняў. Унікальнасьць гэтага працэсу ў тым, што навукоўцы з НІСЭПД адстойваюць сваё права праводзіць непадкантрольныя ўладзе сацыялагічныя дасьледаваньні, заснаваныя на ананімнасьці рэспандэнтаў і інтэрв'юераў. Менавіта ананімнасьць гарантуе аб'ектыўны вынік сацыапытаньняў. Зыходзячы з гэтага прынцыпу, навукоўцы заўсёды зьнішчаюць адпрацаваныя анкеты пасьля таго, як зьвесткі з іх заносяцца ў кампутар. Мінюст жа запатрабаваў экземпляр запоўненай анкеты сацапытаньня НІСЭПД і, не атрымаўшы яго, вынес арганізацыі папярэджаньне. Прадстаўнік Мінюсту Аляксандр Харытон заявіў у Вярхоўным судзе, што анкеты адносяцца да статутнай дзейнасьці НІСЭПД і іх трэба праверыць, каб ацаніць рэпрэзентатыўнасьць сацапытаньня, вызначыць, ці можа яно называцца агульнанацыянальным. Спадар Харытон патрабуе, каб НІСЭПД забясьпечыў такім чынам празрыстасьць сваёй дзейнасьці. Дырэктар НІСЭПД Алег Манаеў лічыць, што Мінюст намагаецца кантраляваць сацыялагічныя дасьледаваньні, тых людзей, якія бяруць у іх удзел.

***14 лютага*** абвешчанае рашэньне па справе аб абароне дзелавой рэпутацыі ***грамадзкага аб'яднаньня "Воля да разьвіцьця"*** і гонару і годнасьці ягонага кіраўніка Міхася Варанца. Суд прызнаў, што Белтэлерадыёкампанія і журналіст Мікалай Мельнічэнка ў праграме "Панарама" распаўсюдзілі непраўдзівую інфармацыю пра дзейнасьць арганізацыі і яе старшыні Міхася Варанца. Згодна з рашэньнем суда Першамайскага раёну сталіцы, Белдзяржтэлерадыёкампанія абавязаная на працягу 10 дзён агучыць у праграме "Панарама" Першага нацыянальнага тэлеканалу рэзалютыўную частку судовага рашэньня. У прыватнасьці, падлягае абвяржэньню сьцаварджэньне "По некоторым данным, кроме подросткового клуба господин Воронец создал так называемый ресурсный центр, целью которого является финансирование оппозиционных структур. Да видно, так увлёкся этой деятельностью, что подростковый клуб ушел на вторые роли". Таксама будзе абвергнутае наступнае паклёпніцкае выказваньне журналіста на адрас арганізацыі "Воля да разьвіцьця" і Міхася Варанца: "Если иностранные фонды не поддержат финансово горе-предпринимателя, его сомнительная деятельность на этом прекратится". У судовым паседжаньні адказчыкі не прывялі аніякіх пацьверджаньняў гэтых выказваньняў, прызнаўшы, што гэта былі толькі іхнія меркаваньні, не падмацаваныя фактамі. Паводле судовага рашэньня, Белдзяржтэлерадыёкампанія таксама мусіць аплаціць усе судовыя выдаткі заяўляльнікаў, зьвязаныя з вядзеньнем гэтай справы.

***15 лютага*** кіраўніцтва ***"Саюзу беларускіх пісьменьнікаў"*** атрымала з Адміністрацыі прэзідэнта ліст, які заканчваецца папярэджаньнем аб хуткім высяленьні пісьменьніцкай арганізацыі з памяшканьняў у будынку па вуліцы Фрунзэ, 5. Гэта адказ на зварот шасьці пісьменьнікаў-ветэранаў вайны з прапановай стварыць у Доме літаратара мемарыяльны пакой імя Максіма Танка ў былым ягоным кабінеце. "Саюз беларускіх пісьменьнікаў" мае ў Доме літаратара толькі гэты кабінет з прыёмным пакоем, палову бібліятэкі і тры пакойчыкі для захаваньня дакументаў арганізацыі. Некалькі памяшканьняў пісьменьнікам было пакінута ў Доме літаратара пасьля таго, як у 1997 годзе ўвесь будынак рашэньнем кіраўніка краіны быў перададзены галоўнаму гаспадарчаму ўпраўленьню кіраўніцтва справаў прэзідэнта. Цяпер пісьменьнікаў змушаюць вызваліць і гэтыя памяшканьні на той падставе, што яны ня маюць ніякіх дакументаў на знаходжаньне ў іх. Апрача высяленьня з Дому літаратара Саюзу пісьменьнікаў чыноўнікі пагражаюць спагнаць у судовым парадку 113 мільёнаў рублёў запазыкі за камунальныя паслугі. Пакідаць гэтыя апошнія свае памяшканьні пісьменьнікі не зьбіраюцца. Старшыня Саюзу пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч спадзяецца на станоўчае вырашэньне праблемы.

***16 лютага*** суд Чыгуначнага раёну Гомеля задаволіў скаргу ***Віктара Карніенкі*** да раённай пашпартна-візавай службы. Судзьдзя Ларыса Казырэвіч, якая разглядала скаргу, сваёй пастановаю абавязала пашпарт-

на-візавую службу Чыгуначнага райаддзелу міліцыі выдаць спадару Карніенку дазвол на часовы выезд за межы Беларусі. Дадзенаму судоваму рашэньню папярэднічалі тры паседжаньні. Выканаўца абавязкаў начальніка пашпартна-візавай службы Чыгуначнага РАУС Мікалай Прыймачук тлумачыў суду, што абмежаваньне на выезд Віктару Карніенку было абумоўленае дасланым ва ўправу міграцыі і грамадзянства паведамленьнем падатковай інсьпекцыі Савецкага раёну пра наяўнасьць у палітыка нясплачанага ў бюджэт штрафу. Падчас судовага разьбіральніцтва высьветлілася, што супрацоўнікі пашпартна-візавай службы не зрабілі неабходнай праверкі на наяўнасьць у спадара Карніенкі прычынаў дзеля абмежаваньня выезду за мяжу. Службоўцы парушылі закон і ведамасную інструкцыю наконт парадку выезду грамадзянаў за межы Беларусі. Начальнік падатковай інспэкцыі Савецкага раёну Валянцін Крылоў беспадстаўна паінфармаваў абласную ўправу міграцыі і грамадзянства пра нібыта ня сплачаны палітыкам штраф. Насамрэч падатковая інсьпекцыя мае прэтэнзіі да закрытага судом паводле ініцыятывы самой інсьпекцыі грамадзкага аб'яднаньня "Грамадзянскія ініцыятывы", якім кіраваў спадар Карніенка. Управа ўнутраных справаў аблвыканкаму павінна сплаціць палітыку 120 тысячаў рублёў судовых выдаткаў.

***16-17 лютага*** кіраўнікі ***Партыі БНФ, АГП, ПКБ*** атрымалі папярэджаньні Мінюсту за невыкананьне загаду па вывядзеньні юрыдычных адрасоў партыйных арганізацыяў з жылога сектару. Міністэрства юстыцыі патрабуе ад партыяў у месячны тэрмін правесьці перарэгістрацыю сваіх структураў, якія разьмешчаныя ў жылым фондзе, або ліквідаваць іх. У адваротным выпадку Мінюст выказаў пагрозу "прыняць меры ў адпаведнасьці зь дзеючым заканадаўствам", што партыі зразумелі як пагрозу іх ліквідацыі. Кіраўнікі партыяў яшчэ ў студзені зьвярнуліся да міністра юстыцыі з прапановай аб сустрэчы і абмеркаваньні канфліктнай сытуацыі. Згода на размову прыйшла толькі пасьля таго як Мінюст ужо вынес усім папярэджаньні. Сустрэча ў Мінюсьце прызначаная на 22 лютага.

***18 лютага*** каля прахадной ***абутковага прадпрыемства "Чырвоны кастрычнік"*** у Віцебску за распаўсюд улётак і газетаў былі затрыманыя міліцэйскім патрулём актывісты АГП. Партыйцы праводзілі чарговую сустрэчу з работнікамі віцебскіх прадпрыемстваў. Яны раздалі людзям каля 800 улётак "Пяць крокаў да лепшага жыцьця" і расейскай "Новай газеты", дзе пададзеныя зьвесткі пра рэферэндум – афіцыйныя і паводле інстытуту Гэлапа. На трамвайным прыпынку пяцёхра актывістаў затрымалі. Разам з партыйцамі міліцыянты пачалі затрымліваць і тых людзей, якія атрымалі ўлёткі і газеты, загадалі ім таксама ехаць у пастарунак, бо, як выказаўся старшына Сяргей, тут было ўчыненае крымінальнае злачынства – абраза прэзідэнта. Партыйцы на чале з намесьніцай старшыні гарадзкой арганізацыі АГП Аленай Залескай ехаць у Кастрычніцкі райаддзел

адмовіліся, даводзячы, што распаўсюд падобных друкаваных выданьняў – гэта ніяк не крымінал і нават не адміністрацыйнае парушэньне, бо і ўлёткі, і газеты маюць усе выходныя дадзеныя. Тады міліцыянты вырашылі выклікаць, як яны сказалі, "эксьперта", і праз некалькі хвілінаў да іх пад'ехаў чалавек у цывільным. Паглядзеўшы газеты і ўлёткі, ён загадаў усіх адпусьціць – і сяброў АГП, і затрыманых мінакоў.

***18 лютага*** адміністрацыйная камісія Рагачоўскага райвыканкаму, якую ўзначальвае кіраўніца справаў выканкаму Валянціна Зайцава, аштрафавала на 120 тысячаў рублёў дэпутата мясцовага раённага Савету, сябра АГП ***Дзьмітрыя Шкулькова***. Дэпутата абвінавацілі ў незаконным вырабе ўлётак пра рэформу жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. Пратакол на Шкулькова паступіў з міліцыі Чыгуначнага раёну Гомелю. 4 лютага гомельскія міліцыянты і супрацоўнікі ДАІ перапынілі таксоўку, у якой дэпутат Шкулькоў ехаў на вакзал, і ўчынілі ператрус ягоных рэчаў, знайшлі ўлёткі ініцыятывы "Партнёрства" пра рэформу беларускай жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. Быў складзены пратакол пра распаўсюд улётак, зьмест якіх скіраваны на нанясеньне ўрону дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку. Калі на адміністрацыйнай камісіі дэпутат Шкулькоў заявіў, што ён ня мог у Гомелі распаўсюджваць улёткі, бо ехаў у таксоўцы, камісія аштрафавала яго за незаконны выраб улётак.

***21 лютага*** судзьдзя Вярхоўнага суда Беларусі Сакалоўская прыняла рашэньне пра ліквідацыю ***грамадзкага аб'яднаньня "Беларускі жаночы рух "Адраджэньне Айчыны"***. Падставай для ліквідацыі сталі знойдзеныя кансультантам Міністэрства юстыцыі А. Харытонам памылкі ў вядзеньні справаводзтва і ў афармленьні пратаколаў кіруючага органу арганізацыі, а таксама нясвоечасовае прадстаўленьне Мінюсту запатрабаванай інфармацыі пра дзейнасьць аб'яднаньня. Акрамя таго, у судовым рашэньні сьцьвярджаецца, што арганізацыя парушыла нормы ўласнага статуту падчас арганізацыі і правядзеньня ў сьнежні 2004 году круглага стала "Пытаньні гендэрнага балансу ў сучасным грамадзтве", а таксама падчас абмеркаваньня на паседжаньні ўласнай Управы пытаньняў выхаваўчай працы з дзецьмі. Як адзначыла кіраўніца БЖР "Адраджэньне Айчыны" Зінаіда Ганцук, з самага пачатку быў зразумелы характар будучага судовага рашэньня: "Нам вядома, што існуе загад на ліквідацыю нашай арганізацыі ў сувязі з пэўнай нашай актыўнай дзейнасьцю. Таму мы нават і не імкнуліся ў судзе пабудаваць нейкую стратэгію ўласнай абароны, паколькі наяўнасьць палітычнай замовы робіць другараднымі ўсе юрыдычныя асьпекты справы". ГА "Беларускі жаночы рух "Адраджэньне Айчыны" было заснаванае ў 1997 годзе. Яго дзейнасьць была скіраваная на дапамогу жанчынам у рэалізацыі іхніх палітычных, грамадзянскіх і сацыяльных правоў.

***21 лютага*** ў гаспадарчым судзе Гарадзенскай вобласьці адбылося

паседжаньне па зыску УЖРЭП Ленінскага раёну Гародні да ***гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ***, якую ў судзе прадстаўляў старшыня абласной арганізацыі Сяргей Мальчык. З боку зыскоўцы на паседжаньні быў начальнік УЖРЭП Ленінскага раёну Аляксей Ліцьвін. “Ліцьвін яшчэ раз пацьвердзіў, што яны ня маюць новага памяшканьня, якое маглі б нам прадставіць у якасьці замены. Я ў сваю чаргу ўнёс хадайніцтва аб тым, што зараз я буду прадстаўляць гарадзкую арганізацыю і ў сувязі з гэтым папрасіў перанесьці паседжаньне, каб мець магчымасьць пазнаёміцца з дакументамі па справе і падрыхтаваць адказ. Аднак я цудоўна ведаю адно – рашэньне будзе такое, які будзе загад зьверху. І ўсё ж змагацца трэба,” – сказаў Сяргей Мальчык. Суд задаволіў хадайніцтва спадара Мальчыка і перанёс судовае паседжаньне на 24 лютага.

***22 лютага*** Рада ***“Саюзу беларускіх пісьменьнікаў”*** на сваім пасяджэньні адхіліла ультыматум кіраўніцтва Адміністрацыі справаў прэзідэнта, якое раней запатрабавала арганізацыю вызваліць большасьць займаемых ім плошчаў у Доме літаратара. Кіраўніцтва справаў прэзідэнта запатрабавала ў Саюзу пісьменьнікаў скараціць займаемую ім плошчу ў Доме літаратара больш чым у 10 разоў – з 614 да 58 метраў. “Такім чынам арганізацыя можа страціць бібліятэку, кабінет старшыні і доступ да актавай залы, — сьцьвярджае старшыня СБП Алесь Пашкевіч. — Не будзе дзе захоўваць тысячы асабовых справаў пісьменьнікаў, пачынаючы ад Янкі Купалы і Якуба Коласа, пісьменьніцкія архівы, асабовыя справы літаратараў. Нам прапанавана гэтыя справы ці ў склеп здаць, ці ў архіў. Як можа існаваць арганізацыя, калі асабовыя справы здаюцца ўжо ў архіў. У архіў мы яшчэ не сьпяшаемся”. Паводле спадара Пашкевіча, у выпадку адмовы кіраўніцтва справаў прэзідэнта, якое дамаглося права ўласнасьці на Дом літаратара, пагражае зусім выселіць пісьменьніцкую арганізацыю праз суд за няўплату запазычанасьці па арэнднай плаце ў памеры 133 мільёнаў рублёў. Рада СПБ не прызнала гэтую запазычанасьць і аспрэчыла іншыя патрабаваньні кіраўніцтва справаў прэзідэнта. Большасьць пісьменьнікаў выказала перакананьне, што ўлады хочуць канчаткова выселіць Саюз з будынку і дамагчыся спыненьня ягонай працы. Кіраўніцтву СБП Рада даручыла зьвярнуцца да беларускай і міжнароднай грамадзкасьці па падтрымку і даць адказ чыноўнікам, што лічаць іх патрабаваньні зьнявагай. Паводле прадстаўніцы кіраўніцтва спраў прэзідэнта Алены Малой, сітуацыя ня выкліканая нейкай палітычнай замовай, ва ўладаў няма мэты закрыцьця СПБ, проста да саюзу паставіліся як да іншых грамадзкіх арганізацыяў, якім дзяржавай гарантаваныя 70 квадратных метраў офісу па льготнай стаўцы арэнднай платы.

***22 лютага*** адбылася сустрэча прадстаўнікоў апазіцыйных партыяў з намесьнікам міністра юстыцыі Алегам Краўцовым. У сустрэчы бралі ўдзел прадстаўнікі ***Партыі БНФ, Аб’яднанай грамадзянскай партыі, Партыі камуністаў Беларускай, Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, Бе-***

***ларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) і партыі жанчын "Надзея"***. Усе гэтыя партыі днямі атрымалі ад Міністэрства юстыцыі папярэджаньні за тое, што многія іх рэгіянальныя структуры маюць юрыдычныя адрасы ў жылых памяшканьнях. Паводле ж патрабаваньня Мінюсту, да 1 лютага ўсе зарэгістраваныя партыйныя структуры павінны былі знайсьці сабе памяшканьні ў нежылым фондзе. Апазіцыйныя лідэры патлумачылі намесьніку міністра, што гэтае патрабаваньне Мінюсту незаконнае і выканаць яго немагчыма, бо партыйныя структуры рэгістраваліся ў жылых памяшканьнях паводле дзеючага заканадаўства, а закон ня мае зваротнай сілы. Паводле прадстаўнікоў партыяў, мінюстаўскае распараджэньне немагчыма выканаць яшчэ і таму, што ніхто з уладальнікаў офісных будынкаў ня хоча здаваць у арэнду свае памяшканьні партыйным структурам па льготных расцэнках, на якія партыі маюць права паводле закону. Алег Краўцоў прасіў выпрацаваць прапановы па справе ўрэгуляваньня сітуацыі вакол партыйных структураў і перадаць іх у Міністэрства юстыцыі.

***22 лютага*** ў Менску была ўчыненая спроба затрыманьня старшыні Партыі БНФ ***Вінцука Вячоркі***. Супрацоўнікі міліцыі спрабавалі затрымаць яго ў Міністэрстве юстыцыі адразу пасьля сустрэчы з намесьнікам міністра юстыцыі Краўцовым для прымусовай дастаўкі на допыт у пракуратуру. Вінцука Вячорку адпусьцілі пасьля тэлефоннай размовы са сьледчым пракураты Кухаронкам, падчас якой лідэр Партыі БНФ сказаў, што зьявіцца ў пракуратуру самастойна.

***25 лютага*** Магілёўскае абласное ўпраўленьне юстыцыі вынесла папярэджаньне жаночаму ***грамадзкаму аб'яднаньню "Любава"*** з г.Горкі. Чыноўнікі лічаць, што НДА разьмяшчае сваю сядзібу ў шматкватэрным доме і мусіць знайсьці для юрыдычнага адрасу іншае памяшканьне. Грамадзкія актывісткі зьдзіўленыя такому патрабаваньню, бо маюць юрыдычны адрас не ў шматкватэрным доме, а ў прыватным, у якім ёсьць два асобных выхады. "Любава" была зарэгістраваная ў 2001 годзе і зьяўляецца адной з самых вядомых арганізацыяў гораду, арганізатарам шматлікіх сацыяльных акцыяў для дзяцей-сіротаў і сацыяльна неабароненых сем'яў.

***3 сакавіка*** лідэры шасьці палітычных партыяў накіравалі ў Міністэрства юстыцыі свае прапановы "па прывядзеньні працэсу рэгістрацыі арганізацыйных структураў партыяў і іх юрыдычных адрасоў у прававое рэчышча, якое адпавядае духу і літары Асноўнага закону". Свае подпісы пад дакументам паставілі лідэры ***АГП, Партыі БНФ, БСДП (НГ), ПКБ*** і ***Беларускай экалагічнай партыі "зялёных"***. Нагадаем, што з 1 лютага партыі павінныя былі перавесьці свае структуры з жылога ў нежылы фонд. Аднак ні адной з іх зрабіць гэтага не ўдалося. Таму лідэры партыяў прапануюць Міністэрству юстыцыі не распаўсюджваць свае новыя патрабаваньні на раней зарэгістраваныя структуры, а таксама дакладна падзяліць пат-

рабаваньні аб прадастаўленьні юрыдычнага адрасу для арганізацыяў, якія надзяляюцца правамі юрыдычнай асобы, і структураў, якія гэткімі правамі не валодаюць. У лісьце ўтрымліваецца патрабаваньне адмяніць папярэджаньні, вынесеныя партыям за невыкананьне патрабаваньняў Мінюсту па пераводзе структураў у нежылы фонд, і ўнесьці неабходныя зьмены ў Закон “Аб палітычных партыях” і Жыльлёвы кодэкс, якія б ліквідавалі існуючую прававую калізію. Аўтары ліста таксама прапануюць стварыць грамадзкую раду з удзелам прадстаўнікоў Мінюсту і партыяў “дзеля абмеркаваньня праблемаў і выпрацоўкі прапановаў па пытаньнях дзейнасьці палітычных партыяў”.

***4 сакавіка*** дырэкцыя ***Рэспубліканскага грамадзкага аб’яднаньня “Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў”*** (РГА “НІСЭПД”) распаўсюдзіла заяву, у якой гаворыцца, што супраць грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі “разгортваецца сапраўдная вайна – без маральных нормаў і юрыдычных правілаў”, пра што сьведчыць сітуацыя, якая склалася вакол незалежнага інстытуту. Як паведаміў намесьнік кіраўніка НІСЭПД Аляксандр Сасноў, 24 лютага чацьвёра супрацоўнікаў Міністэрства юстыцыі наведалі адміністрацыйны корпус Фаніпальскага рАМАПтна-механічнага заводу, у якім арганізацыя арандуе пакой пад юрыдычны адрас (офіс арганізцыі знаходзіцца па іншым адрасе), і самавольна пранiклі ў яго. “Ніякіх дакументаў у тым пакоі мы не захоўвалі, — сказаў Сасноў. – Тым ня менш, імі быў скадзены нейкі акт, зьмест якога нам невядомы”. Па ягоным меркаваньні, гэтыя дзеяньні сьведчаць пра тое, што “пачатая некалькі месяцаў таму атака органаў дзяржаўнай улады на незалежны інстытут, вынікі дасьледаваньняў якога не задавальняюць беарускае кіраўніцва, працягваецца”. “Але мы зноўку заяўляем, што пакуль мы тут жывем і знаходзімся на волі, будзем і далей вывучаць, што думаюць беларусы пра сваё жыцьцё, і знаёміць іх з іх уласным меркаваньнем”, — падкрэсьліваецца ў заяве.

***4 сакавіка*** стала вядома, што кіраўніцтва “***Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў”*** рыхтуе скаргу ў пракуратуру, заяўляючы, што прадстаўнікі Міністэрства юстыцыі з парушэньнем закону ўварваліся ў іх офіснае памяшканьне. “Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў” зарэгістраваны ў Фаніпалі, дзе наймае офіснае памяшканьне ў канторы рАМАПтна-механічнага заводу. Днямі гэтае памяшканьне наведалі чацьвёра супрацоўнікаў Міністэрства юстыцыі. Намесьнік дырэктара інстытуту Аляксандр Сасноў паведаміў: “Яны запалохалі сакратарку дырэктара, бо дырэктара не было, загадчыцу гаспадаркі таксама, і тыя адчынілі ім пакой бяз нас”. З меркаваньняў бясьпекі прадстаўнікі заводу маюць права наведваць офіс НІСЭПД без наймальнікаў, аднак чыноўнікі Мінюсту бяз іх маглі трапіць у офіс толькі з міліцыяй.

***15 сакавіка Рэспубліканскае грамадзкае аб’яднаньне «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны»*** (ТБМ) абскардзіла ў Вярхоўным судзе пісьмовае папярэджаньне, вынесенае Міністэрствам юстыцыі 16 лютага. Свае дзеяньні Мінюст матываваў тым, што некаторыя структуры ТБМ выкарыстоўвалі жылыя памяшканьні для рэгістрацыі сваіх юрыдычных адрасоў і такім чынам парушылі палажэньні Жыльлёвага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Першы намесьнік старшыні ТБМ Сяргей Кручкоў адзначыў, што арганізацыі, да якіх Мінюст мае прэтэнзіі, былі ўзятыя на ўлік мясцовымі органамі ўлады пасьля ўступленьня ў дзеяньне Жыльлёвага кодэксу і насуперак ягоным палажэньням. “Такім чынам, пры пастаноўцы структураў ТБМ на ўлік закон парушалі не яны, а органы мясцовай улады”, — сказаў С. Кручкоў. Акрамя таго, па ягоных словах, Вярхоўны суд павінен даць адпаведнае тлумачэньне пра тое, якім чынам можна паставіць грамадзкія структуры на афіцыйны ўлік, калі немагчыма знайсьці памяшканьне для рэгістрацыі іх юрыдычных адрасоў.

***17 сакавіка Партыя БНФ*** атрымала ліст ад Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, дзе паведамляецца аб нелегітымнасьці з’езду партыі (адбыўся 15 студзеня), на якім кандыдатам у дэпутаты па 52-ай Гарадзенскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе быў вылучаны Сяргей Антусевіч. Ліст падпісаны начальнікам упраўленьня грамадзкіх аб’яднаньняў спадаром А.С.Сьліжэўскім. У лісьце гаворыцца аб тым, што Міністэрства юстыцыі вылучыла шэраг парушэньняў. Па-першае, супрацоўнікі Мінюсту лічаць, што “Сойм Партыі БНФ зрабіў спробу схаваць ад рэгіструючага органу той факт, што большая частка пратаколаў сходаў аргструктураў партыі ці вынятак з адпаведных пратаколаў былі атрыманыя кіруючым органам партыі па факсе”. Па-другое, большасьць пратаколаў аргструктураў партыі “ня маюць зьвестак пра тое, хто канкрэтна прымаў удзел у працы адпаведных форумаў”. Да таго ж, “супастаўленьне подпісаў, што зроблены ў рэгістрацыйных лістах ад імя шэрагу фізічных асобаў не адпавядаюць подпісам, зьмешчаным у пратаколах”. “Мы разглядаем гэта як палітычны ціск, жаданьне спыніць кампанію спадара Антусевіча”, — пракаментаваў гэты ліст старшыня арганізацыйна-прававой камісіі Партыі БНФ Уладзімір Лабковіч.

***18 сакавіка Партыя БНФ*** паведаміла, што мае намер абскардзіць ліст ад Мінюсту, дзе абвяшчаецца аб нелегітымнасьці з’езду партыі, на якім кандыдатам у дэпутаты быў вылучаны Сяргей Антусевіч. Па словах старшыні арганізацыйна-прававой камісіі Партыі БНФ Уладзіміра Лабковіча, гэты дакумент не рэгламентуецца ніводным заканадаўчым актам Рэспублікі Беларусь, такой працэдуры і такога фармату, як прызнаньне альбо непрызнаньне зьезду партыі пакуль яшчэ няма.

***18 сакавіка*** ў Менску быў затрыманы аўтамабіль, у якім перавозіліся некалькі тысячаў рэкламных буклетаў ***Аб’яднанай грамадзянскай***

***партыі***. Актывіста АГП ***Ігара Шынкарыка***, які іх перавозіў, пратрымалі ў міліцыі тры гадзіны. Усе буклеты, якія знаходзіліся ў ягоным аўтамабілі, арыштавалі, спаслаўшыся на адсутнасьць дакументаў на груз.

***19 сакавіка*** павінен быў прайсьці аб’яднаўчы зьезд беларускіх сацыял-дэмакратаў. Яго арганізатары мелі наступны сцэнарны план – сябры ***Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады ўваходзяць у склад Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада)***, пасьля чаго абіраецца кіраўніцтва новай аб’яднанай партыі. На пасаду яе старшыні меркавалася вылучыць былога рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту Аляксандра Казуліна. Аднак запланаванае мерапрыемства так і не адбылося, бо кіраўніцтва матэлю-кемпінгу пад Менскам, дзе павінен быў прайсьці зьезд, нечакана адмовілася ад папярэдняй дамоўленасьці, спаслаўшыся на адсутнасьць электрычнасьці, хаця яна – зьезд хацелі пачаць а 12-й гадзіне дня – дэлегатам была зусім не патрэбная. У сувязі з гэтым было вырашана перанесьці зьезд на іншы дзень, а 180 дэлегатаў накіраваліся на аўтобусах у менскі комплекс “Журавінка” на абед. Там ім спачатку прынесьлі салаты, але потым прыбылі супрацоўнікі сьпецслужбаў, і кіраўніцтва комплексу адмовілася далей абслугоўваць прысутных. Пасьля гэтага дэлегаты пачалі разьяжджацца па сваіх рэгіёнах.

***23 сакавіка*** кіраўніцтва ***жаночага грамадзкага аб’яднаньня “Любава”*** з Горак прыняло рашэньне пачаць працэс яго ліквідацыі. Прычынай гэтага сталася немагчымасьць выканаць патрабаваньне абласнога ўпраўленьня юстыцыі па зьмене юрыдычнага адрасу грамадзкага аб’яднаньня. У лютым “Любава” атрымала папярэджаньне за парушэньне артыкулу 8 новага Жыльлёвага кодэксу. Паводле магілёўскіх чыноўнікаў, горацкае грамадзкае аб’яднаньне разьмяшчае свой юрыдычны адрас у шматкватэрным доме, што забараняецца заканадаўствам. Паводле словаў лідэра аб’яднаньня Тацяны Кіраенкавай, пасьля атрыманьня з абласнога ўпраўленьня юстыцыі дакументу, кіраўніцтва “Любавы” паспрабавала ўпарадкаваць свой юрыдычны статус, але ўсе спробы аказаліся безвыніковымі. “У такім стане нам проста няма сэнсу чакаць нейкіх санкцыяў ці штрафаў, — кажа Т. Кіраенкава. — Мы ня хочам нейкіх судоў ці скандалаў вакол нашых людзей”. Падобнае рашэньне было прынятае і кіраўніцтвам Бялыніцкага краязнаўчага таварыства, якое таксама атрымала папярэджаньне ад органаў юстыцыі.

***25 сакавіка*** Вярхоўны суд Беларусі пад старшынствам А. Забары прыняў рашэньне аб ліквідацыі ***Аб’яднаньня беларускіх скаўтаў (АБС)*** па іску Міністэрства юстыцыі. Гэтае адно з найстарэйшых грамадзкіх аб’яднаньняў краіны праіснавала трынаццаць гадоў і тры дні. Сярод прэтэнзіяў да арганізацыі з боку Мінюсту — парушэньне патрабаваньняў, зьвязаных з юрыдычным адрасам, нелегітымнасьць Сойму, праведзенага ў 2002 г. у

сувязі з недастатковай колькасьцю зарэгістраваных структурных адзінак. Канцлер АБС Кастусь Хадыка, які прадстаўляў грамадзкае аб'яднаньне ў судзе, не пагадзіўся з вылучанымі прэтэнзіямі і заявіў аб немэтазгоднасьці змаганьня з Мінюстам, бо апошні "ператварыўся ў карны орган". Паводле яго словаў, цяпер важна абмеркаваць і абагульніць веды, досьвед АБС па скаўцкай сістэме выхаваньня, каб быць гатовымі да будучай працы.

***31 сакавіка*** падчас распарадчага паседжаньня ў Вярхоўным судзе судзьдзя Натальля Кулік прызначыла судовы працэс па скарзе Партыі БНФ на пісьмовае папярэджаньне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь па ліквідацыі арганізацыйных структураў партыі на 14 красавіка. Міністэрства юстыцыі Беларусі абвінавачвае ***Партыю БНФ*** у разьмяшчэньні больш за 80 арганізацыйных структураў партыі ў жылых кватэрах, што, на думку Мінюсту, зьяўляецца парушэньнем арт. 8 Жыльлёвага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Згодна з гэтым артыкулам, жыльлёвыя памяшканьні павінны скарыстоўвацца толькі для пражываньня грамадзянаў. Згодна з прапанове Мінюсту, усе азначаныя арганізацыйныя структуры Партыі БНФ па ўсёй Беларусі павінны быць ліквідаваныя. Сітуацыю каменттуе юрыст Уладзімір Лабковіч: "Працэс па зьнішчэньні арганізацыйных структураў палітычных партый, які распачаў Мінюст, ня мае нічога агульнага з беларускім заканадаўствам, а носіць выключна палітычны характар. Ні ў адным нарматыўным акце ня ўтрымліваецца патрабаваньне да арганізацыйных структураў палітычных партыяў мець юрыдычныя адрасы. Партыя БНФ вырашыла ўдзельнічаць у гэтым працэсе, каб яшчэ раз указаць на тое, што палітычныя партыі ў Беларусі знаходзяцца ў дыскрымінацыйным становішчы".

***5 красавіка РГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны"*** абскардзіла ў Вярхоўным судзе папярэджаньне, якое было вынесенае Міністэрствам юстыцыі за рэгістрацыю структураў у прыватных кватэрах. Старшыня "Таварыства беларускай мовы" Алег Трусаў лічыць, што на гэтым судзе вырашаецца лёс арганізацыі, якую ён узначальвае, і лёс іншых грамадзкіх арганізацыяў і палітычных партыяў. Дзяесяткі з іх нядаўна атрымалі папярэджаньні Мінюсту за рэгістрацыю сваіх рэгіянальных структураў на прыватных кватэрах сяброў арганізацыяў. Жыльлёвы кодэкс гэта забараняе, але ў 2000 годзе сам жа Мінюст дазволіў такі парадак. У адпаведным лісьце гэты дазвол тлумачыўся жаданьнем "пазьбегнуць напружанасьці грамадзка-палітычнай абстаноўкі". Прайшло пяць гадоў — і тое, што было дазволена, цяпер стала парушэньнем, за якое караюць, і два запар папярэджаньні зьяўляюцца падставай для закрыцьця арганізацыі. ТБМ першай з грамадзкіх арганізацыяў паспрабавала аспрэчыць вынесенае Мінюстам папярэджаньне ў судзе. Актывісты Таварыства настойліва даводзілі судзьдзі Галіне Жукоўскай свае аргументы: казалі пра цяжкасьці з рэгістрацыяй структураў на месцах, пра сваю згоду новыя структуры рэгістраваць толькі па юрыдычных адрасах у адпаведнасьці з апошнім

патрабаваньнем Мінюсту. Таксама актывісты ТБМ зьвярнулі ўвагу суда на тое, што цяпер Мінюст фактычна прызнае, што гэта з ягонай ініцыятывы з 2000 году парушаўся закон. Прадстаўнік міністэрства Аляксандр Харытон часткова гэта пацьвердзіў. У прыватнасьці, ён назваў "юрыдычна нікчэмным" ліст 2000 году, які дазволіў рэгістрацыю структураў на прыватных кватэрах. Паводле прадстаўніка Мінюсту, гэты ліст ня быў адкліканы ці абвергнуты іншым загадам альбо інструкцыяй. Ніхто ня быў пакараны за выкананьне "юрыдычна нікчэмнага ліста", прызнаў Аляксандр Харытон. - Суд выслухаў абодва бакі і вывучаў дакументы справы. Рашэньне мяркуецца абвясьціць 7 красавіка.

***5 красавіка*** Вярхоўны суд пачаў разгляд зыску ***Партыі камуністаў Беларускай***, якая аспрэчвае пісьмовае папярэджаньне Мінюсту за невыкананьне патрабаваньня пра перавод усіх арганізацыйных структураў партыі да 1-га лютага 2005 году з жылога ў нежылы фонд. Першы сакратар ЦК ПКБ Сяргей Калякін перакананы, што пісьмовае папярэджаньне неабгрунтаванае: "У Міністэрства юстыцыі не было ніякіх падставаў вылучаць партыі падобныя патрабаванні. Больш за тое, у заканадаўстве пра палітычныя партыі няма такога паняцьця, як "юрыдычны адрас партыйнай структуры", а з 1999 году нашыя арганізацыі станавіліся на ўлік ва ўпраўленьнях Міністэрства юстыцыі, і ніякіх пытаньняў з гэтай нагоды не ўзьнікала. Калі Вярхоўны суд будзе кіравацца законам, то рашэньне будзе на карысьць ПКБ, калі ж суд будзе кіравацца нейкімі іншымі матывамі, то можа быць прынята любое рашэньне", – заявіў Сяргей Калякін. Судовы разгляд справы працягнецца да 7-га красавіка.

***7 красавіка*** Вярхоўны суд не задаволіў скаргу ***"Таварыства беларускай мовы"*** (ТБМ) на папярэджаньне Міністэрства юстыцыі. Два дні аказалася дастаткова для гэтага судзьдзі Галіне Жукоўскай.

***7 красавіка*** Вярхоўны суд пакінуў у сіле пісьмовае папярэджаньне, вынесенае Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ) Міністэрствам юстыцыі за невыкананьне патрабаваньняў Мінюсту аб пераводзе да 1 лютага 2005 года партыйных структур з жылога ў нежылы фонд.

**8 красавіка** Міністэрства юстыцыі вынесла папярэджаньне г***рамадзкаму аб'яднаньню "Саюз палякаў на Беларусі"***. Падставай зьявілася тое, што "Саюз палякаў на Беларусі" не прадаставіў у Міністэрства юстыцыі матэрыялы 6-га зьезду арганізацыі, які праходзіў 12-13 сакавіка ў Гародні.

***12 красавіка*** пад пагрозай ліквідацыі апынулася ***Асіповіцкая раённая арганізацыя ТБМ***. Прычынай сталася рэгістрацыя арганізацыі на прыватнай кватэры старшыні Асіповіцкай суполкі ТБМ Тацяны Барэль. Спадарыня Барэль наведала галоўнага ідэолага раёну сп.Кулакоўскага, які

прапанаваў памяшканьні пад юрыдычны адрас ТБМ толькі на агульных умовах арэнды, без усялякіх ільгот. Такіх сродкаў асіповіцкія тэбээмаўцы ня маюць.

***На 12 красавіка*** ў Вярхоўным судзе прызначаны разгляд справы па зыску Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі ***Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў"*** — аднаго з вядучых недзяржаўных аналітычных цэнтраў Беларусі. Актыўны ціск на НІСЭПД з боку Мінюсту і іншых органаў улады, у тым ліку праваахоўных, стаў наступствам публікацыі вынікаў сацапытаньняў, зьвязаных з кастрычніцкім рэферэндумам, якія не спадабаліся ўладам. У канцы 2004 году Мінюст вынес папярэджаньне НІСЭПД за адмову падаць анкеты аднаго з агульнанацыянальных сацапытаньняў. Інстытут спрабаваў абскардзіць гэтае папярэджаньне ў судзе, паколькі палічыў такія патрабаваньні незаконным умяшальніцтвам у сваю дзейнасьць, але справу прайграў. У зыску ў Вярхоўны суд Мінюст абвінавачвае інстытут у паўторным ўчыненьні дзеяньня, за якое было вынесенае папярэджаньне, — за адмову падаць органу рэгістрацыі ўзоры анкетаў. У зыску дзесяць старонак тэксту з рознага роду прэтэнзіямі Мінюсту да НІСЭПД за апошнія два гады. Такое разьвіцьцё падзеяў ня стала нечаканасьцю для дырэктара інстытуту Алега Манаева, які глыбока перакананы ў законнасьці дзеяньняў інстытуту: "Мы не парушаем ніякіх законаў і нормаў, ні прававых, ні маральных, мы выконваем тую місію, якая і запісаная ў нас у статуце з першых дзён нашага існаваньня, з пачатку лютага 1992 году: спрыяньне фармаваньню грамадзянскай супольнасьці, дэмакратыі, рынкавай эканомікі ў незалежнай Беларусі пры дапамозе сацыяльных дасьледаваньняў. Менавіта гэта стала галоўным раздражняльным фактарам для ўлады пасьля кастрычніцкага рэферэндуму".

***12 красавіка ў*** Вярхоўным судзе Беларусі пачаўся працэс аб ліквідацыі ***Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў". Прадстаўніком Міністэрства юстыцыі зьяўляецца кансультант Мінюсту*** Аляксандр Харытон, вядомы тым, што мае асабістае дачыненьне да закрыцьця шэрагу грамадзкіх арганізацыяў. На працэсе спадар Харытон быў зноў скіраваны на безумоўнае дасягненьне пастаўленай мэты: "Было прынята рашэньне аб ліквідацыі гэтай юрыдычнай асобы з наступных прычынаў. Першае — з-за таго, што не знаходзіўся па статутным юрыдычным адрасе, другое — з прычыны таго, што інстытут шматразова не давалі патрэбных зьвестак і дакументаў, трэцяе — з-за таго, што ў складзе арганізацыі ёсьць нестатутны орган — назіральная рада, і чацьвертае — яны шмат разоў выкарыстоўвалі няпоўную назву юрыдычнай асобы". Пры гэтым частку прэтэнзіяў Аляксандр Харытон зьняў. У прыватнасьці, што НІСЭПД праз вынікі сваіх дасьледаваньняў распаўсюджвае "сфальшаваныя зьвесткі". Кіраўнік НІСЭПД

прафесар Алег Манаеў не пагадзіўся з абвінавачаньнямі ў адрас арганізацыі. Адны з іх ён назваў “відавочна абсурднымі”, іншыя — “хлусьлівымі”.

***12 красавіка*** у Вярхоўным судзе распачаўся працэс па скарзе Партыі БНФ на пісьмовае папярэджаньне Міністэрства юстыцыі, якое абвінавачвае партыю ў разьмяшчэньні больш як 80 арганізацыйных структураў у жылых кватэрах, што, на думку Мінюсту, зьяўляецца парушэньнем арт. 8 Жыльлёвага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Паводле прапановы міністэрства, усе згаданыя арганізацыйныя структуры Партыі БНФ па ўсёй Беларусі павінны быць ліквідаваныя. Інтарэсы партыі прадстаўлялі ў судзе кіраўнік арганізацыйна-праўнай камісіі Уладзімір Лабковіч і сябра гэтай камісіі Юрый Чавусаў, якія ў сваіх выступах адстойвалі довады, якія даказвалі неабгрунтаванасьць патрабаваньняў Мінюсту. Прадстаўніца Міністэрства юстыцыі Людзьміла Калячка, наадварот, “ня здолела абгрунтавана адказаць ні на воднае пытаньне, чым нават выклікала раздражненьне судзьдзі Вярхоўнага суда Наталя Кулік”. У выніку яна была вымушаная абвесьціць перапынак, каб даць магчымасьць прадстаўніку Мінюсту падрыхтавацца да судовага паседжаньня.

***13 красавіка*** ў Вярхоўным судзе Беларусі працягваўся працэс па справе аб закрыцьці ***“Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў”*** (НІСЭПД) па ініцыятыве Міністэрства юстыцыі. Падрабязна абвінавачаньні Мінюсту вывучаў суд, які прадстаўляла судзьдзя Ларыса Філіманіхіна. На пачатку паседжаньня прадстаўнікі інстытуту выказалі ёй недавер, але іх хадайніцтва судзьдзя адхіліла. Далей яна заслухала сьведкаў, якія мусілі распавесьці пра тое, як інстытут карыстаўся сваім офісам на плошчах Фаніпальскага рАМАПтна-механічнага заводу. Пасьля суд падрабязна вывучаў дакументы, на якіх пазначаная назва інстытуту. Прадстаўнік Мінюсту Аляксандр Харытон прадставіў суду бюлетэні інстытуту, на якіх не пазначана, што інстытут зьяўляецца грамадзкай арганізацыяй. Затым суд перайшоў да наступнага пытаньня – якое месца ў структуры арганізацыі займае назіральная рада. У Мінюсьце лічаць, што гэтая рада зьяўляецца кіруючым органам, утвораным насуперак статуту. Кіраўнік інстытуту прафесар Алег Манаеў у адказ раіў высьветліць функцыі назіральнай рады і патлумачыў, хто ў яе ўваходзіць: “Задумайцеся толькі: сем чалавек у радзе, з іх адзін віцэ-прэм’ер Украіны, другі – старшыня арганізацыі ў Нью-Ёрку, трэці – прэзідэнт фонду ў Варшаве. І гэтак далей. Як рэальна гэтыя людзі з розных кантынентаў могуць кіраваць арганізацыяй у Беларусі? Запытайцеся сябе пра гэта і стане зразумела, што гэта проста група кансультантаў-эксьпертаў”. Судзьдзя Ларыса Філіманіхіна заявіла, што канчатковае рашэньне пра лёс інстытуту будзе прынятае, магчыма, чатырнаццатага красавіка.

***14 красавіка*** вынесенае канчатковае рашэньне Вярхоўнага суда па

скарзе ***Партыі БНФ*** на пісьмовае папярэджаньне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Суд не задаволіў скаргу партыі, але вынес у адрас Мінюсту "прыватнае вызначэньне аб парушэньні дзеючага заканадаўства пры рэгістрацыі арганізацыйных структураў Партыі БНФ". Такім чынам, каля 80 арганізацыйных структураў Партыі БНФ па ўсёй краіне мусяць быць зачыненыя, юрыстам удалося адстаяць рэгістрацыю толькі шэрагу структураў у Берасьцейскай і Гомельскай абласьцях. Трэба адзначыць, што Мінюст замяніў свайго прадстаўніка ў судзе на сп. Зінкевіча ў сувязі з тым, што ранейшы прадстаўнік сп-ня Калячка "захварэла на сэрца". Паводле У.Лабковіча, які прадстаўляў інтарэсы партыі ў судзе, "гэтае рашэньне безумоўна зьяўляецца працягам палітычнага працэсу па зьнішчэньні арганізацыйных структураў партыяў".

***14 красавіка*** Вярхоўны суд Беларусі вынес рашэньне ліквідацыі ***Грамадзкага аб'яднаньня "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў"*** (НІСЭПД). Судзьдзя Ларыса Філіманіхіна цалкам задаволіла зыск Мінюстыцыі аб ліквідацыі інстытуту. Яна пагадзілася з меркаваньнем чыноўнікаў, што супрацоўнікі інстытуту неаднаразова парушалі розныя законы, у тым ліку закон "Аб грамадзкіх арганізацыях". У прыватнасьці, што інстытут не дасылаў своечасова патрэбных дакументаў, выкарыстоўваў недакладную назву і ствараў перашкоды Мінюсту ў ягонай дзейнасьці як установы рэгістрацыі. Кіраўнік інстытуту Алег Манаеў назваў рашэньне аб закрыцьці "неправавым і палітычна матываваным". Ён нагадаў, што інстытут дзейнічаў з 1992 году, за гэты час правёў дзесяткі сацыялагічных дасьледаваньняў, якія былі высока ацэненыя навукоўцамі і запатрабаваныя ў беларускім грамадзтве і ў сьвеце. Паводле Алега Манаева, суд выканаў загад найвышэйшых беларускіх уладаў, якія не жадаюць, каб людзі ведалі рэальны стан справаў у Беларусі. Супрацоўнікі інстытуту заявілі, што будуць дамагацца аднаўленьня працы сваёй установы.

***19 красавіка*** стала вядома паводле зьвестак, якія фігуравалі на нядаўняй сесіі Камісіі правоў чалавека ААН, што ў бягучым годзе па ініцыятыве Мінюсту зьліквідаваныя каля дзесяці грамадзкіх арганізацыяў, сярод якіх – ***"Саюз беларускіх скаўтаў", Жаночы рух "Адраджэньне Айчыны", "Інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў"***. У Мінюсьце між тым сьцьвярджаюць, што закрыцьцё грамадзкіх арганізацыяў — гэта не палітычная кампанія, а вынік кантролю за выкананьнем законаў. У якасьці доказу чыноўнікі кажуць пра рэгістрацыю новых грамадзкіх арганізацыяў. Праваабаронца Алесь Бяляцкі падзяліўся сваімі назіраньнямі: "На жаль, такі працэс не адбываецца, прынамсі, у раўназначных лічбах. Рэгістрацыя ідзе, але… Вось Асамблея няўрадавых арганізацыяў аналізавала спробы незалежных арганізацыяў зарэгістравацца, і аказалася, што з дзесяці арганізацыяў, што падалі дакументы на

рэгістрацыю, пасьпяхова яе праходзіць толькі адна. І рэгіструюць толькі краязнаўчыя, спартовыя, нейкія прафесійныя”.

***21 красавіка*** амбасада Злучаных Штатаў Амерыкі прыняла заяву ў сувязі з рашэньнем Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь аб ліквідацыі ***“Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў”*** (НІСЭПД). “Закрываючы НІСЭПД — паважаную арганізацыю, адданую правядзеньню прафесійных сацыялагічных дасьледаваньняў і апытаньняў грамадзкай думкі, беларускія ўлады зрабілі яшчэ адзін крок да пазбаўленьня беларускага грамадзтва крыніц незалежнай думкі і дыялогу. Урад Беларусі ізноў прадэманстраваў поўную адсутнасьць павагі да прынцыпаў дэмакратычнага грамадзтва, якія Беларусь павінна абараняць як член АБСЕ. Злучаныя Штаты заклікаюць беларускія ўлады прытрымлівацца сваіх абавязацельстваў перад АБСЕ і адмяніць рашэньне, прынятае ў парушэньне гэтых абавязацельстваў”, — гаворыцца ў заяве.

***3 траўня Беларускі саюз моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб’яднаньняў “Рада*** ” распачаў судовы працэс супраць падатковай інсьпекцыі, якая аштрафавала аб’яднаньне на 100 мільёнаў рублёў за тэхнічную дапамогу ў межах Праграмы TACIC. У гэты дзень прайшло першае паседжаньне Гаспадарчага суда Менска, наступнае прызначанае на 2 чэрвеня. Нагадаем, што інсьпекцыя Міністэрства па падатках і зборах Цэнтральнага раёну Менску у выніку комплекснай праверкі БСМДГА “Рада” дадаткова налічыла падаткаў на суму звыш 100 мільёнаў рублёў на прыбытак і транспартны збор, а таксама пеню за тэхнічную дапамогу. «Рада» не пагадзілася з рашэньнем падатковай інсьпекцыі і падала сустрэчны зыск у Гаспадарчы суд Менску.

***13 траўня Жодзінская філія Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны*** атрымала ліст з гарвыканкаму з папярэджаньнем пра магчымую ліквідацыю. У лісьце, які падпісаны першым намесьнікам старшыні гарвыканкаму Уладзімірам Сямашкам, паведамляецца, што ў выпадку, калі грамадзкае аб’яданьне ня зьменіць юрыдычны адрас, “які б адпавядаў патрабаваньням жыльлёвага заканадаўства”, то “будзе прынятае рашэньне гарвыканкаму пра зьняцьце з уліку”. Па словах старшыні жодзінскага ТБМ ***Аляксея Лапіцкага***, захады па пошуку памяшканьня ў нежылых будынках рабіліся ад пачатку рэгістрацыі арганізацыі. “Мы зьвярталіся афіцыйна да выканкаму і афіцыйна атрымлівалі адмовы. Нам тлумачылі, што горад ня мае вольных памяшканьняў для нашай арганізацыі”, — адзначыў А. Лапіцкі. На чарговы запыт ТБМ старшыня гарвыканкаму Валер Кашэўскі зноў адказаў, што вольных памяшканьняў няма. Калі ТБМ зьвярнулася з афіцыйным лістом у жыльлёва-камунальную гаспадарку, яе кіраўнік Вацлаў Марко паўтарыў тое самае. “Насамрэч сітуацыя такая: ёсьць па-

мяшканьні, якія здадзеныя нейкім службам, а яны без дазволу гарвыканкаму ня могуць прымаць ніякіх рашэньняў, бо ня маюць права распараджацца памяшканьнямі, — гаворыць А. Лапіцкі. — Кантроль над памяшканьнямі знаходзіцца ў выканаўчай улады. А яна кажа, што памяшканьняў няма".

***17 траўня Міколу Статкевіча*** наведаў сьледчы міліцыі Маскоўскага раёну Менску. Ён высьвятляў, за якія грошы ўтрымліваецца офіс партыі, ці ёсьць на балансе якая-небудзь маёмасьць і іншыя пытаньні. Сьледчы паведаміў, што гарадзкая пракуратура загадала правесьці новае расьсьледаваньне. У лютым ужо праводзілася праверка паводле заявы былога паплечніка лідэра сацыял-дэмакратаў спадара Ляўковіча, у якой той прасіў прыцягнуць Міколу Статкевіча да крымінальнай адказнасьці. Мікола Статкевіч заявіў, што новая крымінальная справа паставіць пад пагрозу ліквідацыі рэгіянальныя структуры.

***20 траўня*** пад прымусам чыноўнікаў камітэту па ідэалогіі Менгарвыканкаму адміністрацыя гатэлю "Беларусь" адмовіла ў арэндзе памяшканьня на правядзеньне кантактнай беларуска-швецкай канферэнцыі. Арганізатарамі канферэнцыі выступілі швецкі цэнтр разьвіцьця міжнароднага супрацоўніцтва грамадзкіх арганізацыяў ***Forum Syd (Форум Сюд)*** і аддзяленьне ў Менску амбасады Каралеўства Швецыі ў Маскве. Пра ўдзел у канферэнцыі заявілі больш за 100 беларускіх грамадзкіх арганізацыяў, з якіх да ўдзелу было адабрана 30. Да таго ж, у гэты дзень ў Менск павінныя былі прыбыць 17 прадстаўнікоў швецкіх няўрадавых арганізацыяў, але беларуская амбасада ў Швецыі ў апошні момант адмовіла ім у атрыманьні візаў. "Абмежаваньне кантактаў беларусаў з замежнымі партнёрамі з дэмакратычных краінаў, якое рэалізуецца ўладамі ў такой грубай форме, не застанецца незаўважаным і зьяўляецца проста абуральным. І тое, што нас пазбаўляюць магчымасьцяў легальна праводзіць сустрэчы з замежнымі партнёрамі, не азначае, што мы адмовімся ад падобных кантактаў наогул. Мы будзем шукаць іншыя формы рэалізацыі нашых правоў. А кожны з замежнікаў, хто сутыкаецца з падобным стаўленьнем беларускіх уладаў да беларусаў і да сябе асабіста, як паказвае практыка, пасьля пачынае прыкладаць больш намаганьняў для зьмяненьня сітуацыі ў Беларусі", – пракаментаваў забарону канферэнцыі старшыня Рабочай групы Асамблеі НДА Сяргей Мацкевіч.

***27 траўня*** Вярхоўны суд Беларусі прыняў рашэньне аб скасаваньні двух раённых суполак ***Партыі БНФ*** у Гародні. Падставай для ліквідацыі стала знаходжаньне юрыдычных адрасоў суполак у жылым фондзе. "Зачыстка перад выбарамі, – менавіта так каментуе сітуацыю старшыня гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ Сяргей Мальчык. — Улады зробяць усё магчымае, каб мінімізаваць магчымасьці Партыі БНФ для легальнага ўплыву на выбарчы працэсс. Ліквідацыя партыйных структураў — гэта толькі

першая ластаўка. Але рэальна існуючая структура партыі будзе працягваць сваю працу незалежна ад наяўнасьці юрыдычнай рэгістрацыі".

***30 траўня*** жыхара Берасьця ***Ігара Маслоўскага*** выклікалі ў абласную пракуратуру, дзе ён атрымаў афіцыйнае папярэджаньне за подпісам пракурора Валерыя Амельянюка. Абласная пракуратура спасылаецца на высновы Міністэрства юстыцыі, якое лічыць, што надрукаваныя ў газеце "Народная воля" матэрыялы пра грамадзкую ініцыятыву "Воля народу" не адпавядаюць патрабаваньням закону. У прыватнасьці, Ігара Маслоўскага, які зьяўляецца каардынатарам гэтай ініцыятывы на Берасьцейшчыне, папярэдзілі адносна недапушчальнасьці дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Паводле словаў Ігара Маслоўскага, такія пагрозы яго не палохаюць, але пэўныя высновы трэба рабіць: "Я думаю, што сёньняшнія факты сьведчаць аб тым, што любыя грамадзянскія ініцыятывы проста будуць вынішчацца. Таму што гэта не патрэбна ўладзе. Яскравы прыклад — гэтае папярэджаньне. Улада баіцца згуртаваньня людзей".

***1 чэрвеня*** гарадзенец ***Франц Аўдзей*** атрымаў афіцыйнае папярэджаньне пракуратуры Гарадзенскага раёну за дзейнасьць ад імя ***грамадзкага руху "Воля народу"***. Пракуратура спасылаецца на высновы Міністэрства юстыцыі, якое лічыць, што надрукаваныя ў газеце "Народная воля" матэрыялы пра грамадзкую ініцыятыву "Воля народу" не адпавядаюць патрабаваньням закону. У прыватнасьці, Ф. Аўдзея папярэдзілі пра адказнасьць за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. У выпадку працягу падобнай дзейнасьці, яго абяцаюць прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасьці. У той жа дзень такое ж папярэджаньне ад Мастоўскай пракуратуры атрымаў грамадзкі актывіст Язэп Палубятка.

***2 чэрвеня*** ў Менскім гаспадарчым судзе пачаўся працэс паміж ***Беларускім саюзам моладзевых і дзіцячых аб'яднаньняў "Рада"*** і падатковай інсьпекцыяй Цэнтральнага раёну беларускай сталіцы. "Рада" патрабуе адмяніць спагнаньне падаткаў і штрафных санкцыяў з міжнароднай дапамогі, якую арганізацыя атрымлівала ад Еўрасаюзу і ААН у 2002-2003 гадах. Усяго прэтэнзіі падатковых чыноўнікаў вымяраюцца сумай 140 мільёнаў рублёў. Каб забраць гэтыя грошы, два месяцы таму ў офісе "Рады" была апісаная ўся маёмасьць. Між тым, актывісты арганізацыі спасылаюцца на міжнародныя дамовы, паводле якіх падаткі з гэтак званай тэхнічнай дапамогі не спаганяюцца. На працэсе выступілі прадстаўнікі абодвух бакоў. Судовыя спрэчкі адкладзеныя, пакуль ня будуць далучаныя неабходныя дакументы.

***2 чэрвеня*** Бялыніцкі райвыканкам афіцыйна папярэдзіў мясцовыя структуры рэспубліканскіх грамадзкіх недзяржаўных аб'яднаньняў ***"Маладая Грамада"*** і ***"Саюз палякаў на Беларусі"*** аб тым, што здымае іх з

афіцыйнага ўліку. Такім чынам, легальнасьць згубілі яшчэ дзьве НДА Магілёўшчыны. Па падліках праваабаронцаў, на дадзены момант ад перарэгістрацыі юрыдычных адрасоў, якую ініцыявала Міністэрства юстыцыі, пацярпелі 15 грамадзкіх аб'яднаньняў вобласьці.

***6 чэрвеня*** ў Празе, у будынку сенату Чэскай Рэспублікі, адбылася прэзентацыя ***міжнароднага аб'яднаньня "Грамадзянская Беларусь"***. Яно створанае для дапамогі беларускім недзяржаўным арганізацыям, якія адчуваюць ціск уладаў альбо ўвогуле былі зачыненыя. Заснавальнікам новага аб'яднаньня выступіў Вацлаў Гавэл, а таксама іншыя вядомыя чэскія палітыкі. "Грамадзянская Беларусь" будзе зарэгістраваная і ў Чэхіі, і ў Брусэлі пры Еўрапейскім Саюзе – актывісты ж забароненых беларускіх арганізацыяў будуць прадстаўнікамі ў Беларусі.

***7 чэрвеня*** стала вядома, што ў сувязі з выкананьнем загаду Міністэрства юстыцыі аб пераводзе суполак партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў з жылога ў нежылы фонд пацярпелі арганізацыйныя структуры ўсіх апазіцыйных партыяў. З 90 структураў БСДГ толькі дзьве разьмяшчаюцца ў нежылых памяшканьнях. Нават цэнтральны орган партыі зарэгістраваны ў кватэры. Выканаць патрабаваньне Мінюсту БСДГ аб пераводзе ўсіх партыйных структураў у нежылы фонд партыя ня можа з матэрыяльных прычынаў — штомесяц за арэнду памяшканьняў для 90 офісаў трэба было б плаціць 8 тысячаў еўра, падлічыў лідэр БСДГ Станіслаў Шушкевіч. Ён аспрэчыў апошнія рашэньні Мінюсту ў лісьце міністру Галаванаву, назваўшы ягоную трактоўку патрабаваньняў Жыльлёвага кодэксу нелагічнай, незаконнай і несправядлівай, "эканамічным уціскам, які робіць існаваньне палітычных партыяў немагчымым". Іншыя апазіцыйныя партыі таксама пацярпелі, страціўшы да 50% аргструктураў, як Партыя камуністаў Беларуская. Лідэр ПКБ Сяргей Калякін паведаміў, што ў тым ліку будзе страчана дваццаць раённых арганізацыяў, і там могуць узьнікнуць праблемы падчас выбарчых кампаніяў. У Міністэрстве юстыцыі паведамілі, што ўсе партыйныя і грамадзкія структуры, зарэгістраваныя ў жылым фондзе, зьнятыя з уліку. Прадстаўнік міністэрства Алег Сьліжэўскі нагадаў, што ўлады пайшлі на гэтыя захады пасьля шматразовых напамінаў аб неабходнасьці прывядзеньня юрыдычных адрасоў у адпаведнасьць з Жыльлёвым кодэксам. Паводле спадара Сьліжэўскага, падобныя парушэньні былі ў большасьці палітычных партыяў і 10% грамадзкіх аб'яднаньняў.

***7 чэрвеня*** Віцебскі абласны суд пазбавіў рэгістрацыі ***ГА "Усяслаў Чарадзей"*** з-за юрыдычнага адрасу. Праблемы з "прапіскай" у "Усяслава Чарадзея" пачаліся з моманту перарэгістрацыі ў 1999 годзе, калі недзяржаўная арганізацыя фармальна пазбавілася свайго юрыдычнага адрасу ў будынку Цэнтру рамёстваў і нацыянальнай культуры. Аднавіць "прапіску" на старым месцы ці знайсьці яе ў іншым памяшканьні аказалася не-

магчымым. “У гарвыканкаме афіцыйна гарантавалі, што нам пакінуць юрыдычны адрас у Цэнтры рамёстваў, — распавядае кіраўнік арганізацыі В. Храмцоў. — Насамрэч свае абяцаньні ўлада ня выканала. Мы пастаянна зьвярталіся да гарадзкой адміністрацыі са скаргамі, у якіх прасілі выдзеліць нам абяцанае памяшканьне ці нейкія іншыя плошчы, дзе мы маглі б плаціць па льготным тарыфе”. Тым часам упраўленьне юстыцыі некалькі разоў рабіла папярэджаньні, нагадваючы НДА пра адсутнасьць юрыдычнага адрасу. Нарэшце кіраўнік упраўленьня Пранік падаў заяву ў суд аб ліквідацыі “Усяслава Чарадзея”. Суд прыняў рашэньне ня толькі пра ліквідацыю арганізацыі, было вырашана, што “Усяслаў Чарадзей” павінен аплаціць паслугі па сваёй ліквідацыі ў судзе — 127500 рублёў.

***10 чэрвеня*** кіраўніцтва ***Гарадзенскай філіі БСДГ*** атрымала ліст з упраўленьня юстыцыі Гарадзенскага абласнога выканаўчага камітэту, за подпісам начальніка ўпраўленьня юстыцыі А.Н.Сянькевіча. У ім паведамляецца, што ў сувязі з тым, што Гарадзенская гарадзкая філія БСДГ, а таксама першасныя партыйныя суполкі Ленінскага і Кастрычніцкага раёнаў Гародні зарэгістраваныя на юрыдычных адрасах, якія знаходзяцца ў шматкватэрных жылых дамах, гэтыя партыйныя структуры выключаныя з рэгістрацыі. Кіраўніцтву гарадзенскіх партыйных структураў БСДГ прапаноўваецца да 15 чэрвеня здаць пасьведчаньні аб рэгістрацыі і іншыя партыйныя дакументы.

***14 чэрвеня*** старшыня ***Берасьцейскай абласной арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі*** (Грамада) Гяоргі Руцкі атрымаў адказ ад Берасьцейскага аблвыканкаму наконт магчымасьці правядзеньня на тэрыторыі вобласьці пазачарговага партыйнага зьезду. У лісьце, падпісаным намесьнікам старшыні аблвыканкаму Леанідам Цупрыкам, паведамляецца, “што рашэньне дадзенага пытаньня не ўваходзіць у кампетэнцыю аблвыканкаму”. Раней актывісты БСДП (Грамада) ужо двойчы спрабавалі правесьці партыйны зьезд у Менску і ваколіцах беларускай сталіцы, аднак не маглі дамовіцца аб выдзяленьні дзеля гэтага неабходнага памяшканьня.

***21 чэрвеня*** адміністрацыйная камісія пры Полацкім гарвыканкаме вынесла афіцыйнае папярэджаньне старшыні мясцовага ***гістарычнага клубу “Вытокі” Міхасю Баўтовічу***. Нагодаю дзеля таго стала падзея, якая адбылася 15 траўня, падчас абласной сустрэчы дэмакратычных арганізацыяў рэгіёну, якая ладзілася ў лясным масіве паблізу Віцебску і на якой прысутнічаў спадар Баўтовіч. Да М. Баўтовіча тады падышоў начальнік абласнога аддзелу па аператыўным вышуку палкоўнік Іваноў і папрасіў паглядзець бюлетэнь недзяржаўных арганізацыяў рэгіёну “Полацкі край”, які той трымаў у руках. Неўзабаве старшыня гістарычнага клубу быў затрыманы і дастаўлены ў Першамайскі РАУС Віцебску. Там на яго быў склад-

зены пратакол аб парушэньні артыкулу 172 часткі 3 КаАП — распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак. Пры гэтым было канфіскавана 11 асобнікаў бюлетэню.

***27 чэрвеня*** раніцай было выяўлена, што дзьверы сядзібы Партыі БНФ запэцканыя чорнай фарбай, а на асфальце перад дзьвярыма чырвонай фарбай было выведзена “Чемодан-вокзал-Варшава”. Падпісана гэтае пасланьне было абрэвіятурай НБП, што значыць “Нацыяналістычная бальшавіцкая партыя”. Якіх мэтаў хацела дасягнуць расейская камунафашыстоўская групоўка — невядома, але характэрна, што хуліганства было бесьперашкодна ўчыненае ў цэнтры гораду літаральна за некалькі метраў ад Акадэміі міліцыі.

***1 ліпеня*** адбылася прэзентацыя аналітычнага агляду “Асноўныя тэндэнцыі разьвіцьця і існаваньня беларускага трэцяга сектару”, на якім актывісты Асамблеі няўрадавых арганізацыяў паведамілі, што з 1 сьнежня 2004 году да 1 чэрвеня 2005 году былі ліквідаваныя праз суд ці былі вымушаныя самаліквідавацца 38 грамадзкіх арганізацыяў. Аўтары агляду адзначылі, што за апошнія тры месяцы ўлады распачалі шырокамаштабны наступ на грамадзкія аб’яднаньні. Для многіх з іх сур’ёзнай стала праблема набыцьця юрыдычнага адрасу ў сувязі з патрабаваньнем Міністэрства юстыцыі перавесьці арганізацыйныя структуры партыяў і грамадзкіх арганізацыяў у памяшканьні нежылога фонду. Многім аб’яднаньням у гэтай справе вынесеныя афіцыйныя папярэджаньні, дзясяткі рэгіянальных структураў страцілі рэгістрацыю. Юрыст выканаўчага бюро Асамблеі няўрадавых арганізацыяў Юры Чавусаў не выключае, што ў найбліжэйшы час рэпрэсіі ўладаў супраць грамадзкіх аб’яднаньняў могуць узмацніцца. Нядаўна прынятыя Палатай прадстаўнікоў зьмены і дадаткі да Закону аб грамадзкіх аб’яднаньнях даюць шырокія магчымасьці прыпыняць дзейнасьць і ліквідоўваць арганізацыі. А 1 ліпеня Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ №302, паводле якога істотна абмяжоўваецца дзейнасьць няўрадавых фондаў.

***8 ліпеня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада)*** зноў не дазволілі правесьці аб’яднаўчы зьезд. Уладзімір Нісьцюк, першы намесьнік старшыні партыі тлумачыць: “Нам адмовілі зноў. Сказалі, што будзе сьвята беларускай музыкі, нейкі фестываль. І ў рамках гэтага фестывалю — і ў парку імя 50-годзьдзя Вялікага Кастрычніка, і на Бангалоры – будуць мерапрыемствы...” Кіраўніцтва партыі зьбіралася зрабіць яшчэ адну спробу арганізацыі зьезду 10 ліпеня. Да гэтага тры спробы ня мелі посьпеху — прынамсі, Міністэрства юстыцыі не прызнала легітымным той сход, які прайшоў 10 красавіка на прыступках Дому культуры ў вёсцы Сеньніца Менскага раёну, на якім старшынёй партыі быў абраны Аляксандр Казулін.

***9 ліпеня*** позна ўвечары каля 15 асобаў, большасьць з якіх былі ў цывільным, і некалькі чалавек ў міліцэйскай форме, гвалтоўным чынам уварваліся ў прыватны дом старшыні Менскай гарадзкой арганізацыі ***Партыі БНФ Уладзіміра Кішкурны***. На той момант у доме знаходзіўся толькі сын лідэра беларускай апазіцыі, які ніяк ня мог перашкодзіць падобным дзеяньням так званых ахоўнікаў парадку. Падставай для несанкцыянаванага пранікненьня ў прыватнае жыльлё нібыта паслужылі зьвесткі пра распаўсюд наркотыкаў. Ня маючы ордэру на вобыск, міліцыянты разьбілі вакно, выламалі дзьверы, распілавалі замкі на дзвярах у гаспадарчую прыбудову і падвал. Яны ўважліва рыліся ў паперах гаспадара – усё гэта праводзілася без панятых і называлася проста аглядам. У выніку супрацоўнікі міліцыі знайшлі друкарскі станок, які канфіскавалі, і без прад'яўленьня абвінавачаньня затрымалі сына Уладзіміра Кішкурны Антона. Праваабаронца Алесь Бяляцкі каментуе падзеі наступным чынам: “Гэта грубейшае парушэньне правоў чалавека і заканадаўчых актаў, а таксама працэсуальных нормаў. Практычна быў праведзены несанкцыянаваны вобыск – сапраўдная маштабная аперацыя. Вылучаныя абсалютна надуманыя абвінавачаньні супраць сына актывіста апазіцыйнай партыі. Відавочна, што асноўнай прычынай вобшуку якраз і было друкаванае абсталяваньне, што б там ні казалі беларускія ўлады. Канфіскавана яно незаконна”.

***10 ліпеня*** па тэлеканалах БТ і ОНТ быў паказаны сюжэт пра тое, як супрацоўнікі Цэнтральнай раённай управы міліцыі Менску праводзілі вобыск у прыватным доме старшыні гарадзкой арганізацыі ***Партыі БНФ Уладзіміра Кішкурны*** і затрымалі сына гаспадара Антона. У сюжэце сьцьвярджалася, што апазіцыя ня толькі друкуе антыдзяржаўныя ўлёткі, але і захоўвае зброю ды наркотыкі. У сына Уладзіміра Кішкурны знайшлі паляўнічы патрон, а таксама два набоі да пісталета Макарава і адзін да снайперскай вінтоўкі СВД. У гаспадарчай прыбудове да дому міліцыянты знайшлі друкарскую машыну. ***Антон Кішкурна*** быў затрыманы і зьмешчаны ў ізалятар часовага ўтрыманьня. Паводле адваката Аляксандра Галіева, Антон сказаў міліцыянтам, што зьбіраўся здаць патроны міліцыі ў рамках аперацыі “Арсенал”. Сваю датычнасьць да распаўсюду наркотыкаў ён адмаўляе. Таксама адвакат Антона паведаміў, што пакуль супраць затрыманага распачатая справа па факце незаконнага абароту наркотыкаў. Жонка Уладзіміра Кішкурны Валянціна тлумачыць: “Гэта тры патроны, якія ён назьбіраў за ўсё сваё жыцьцё. І ён пра іх проста забыўся. Адзін патрон ён знайшоў у паляўнічым доміку, а другі ў свайго дзядзькі. Трымаў іх, выкінуць хацеў, а Антон убычыў і — дай мне, дай мне. Прывёз, кінуў, і ўсе забыліся”. Валянціна Кішкурна 11 ліпеня напісала заяву пракурору з просьбай вызваліць сына пад падпіску пра нявыезд. Уладзімір Кішкурна абураны фактам незаконных дзеяньняў з боку улады і лічыць гэтую міліцэйскую акцыю правакацыяй, скіраванай супраць яго і ягонай сям'і. Ён гаво-

рыць, што ніякіх улётак і газетаў у сябе дома не друкаваў, а абсталяваньне пакінуў яму на захаваньне адзін знаёмы. Акрамя таго, ператрус быў цалкам незаконны, бо адбываўся бяз санкцыі пракурора.

***12 ліпеня*** ў газеце ***"Могилевские ведомости"***, заснавальнікам якой зьяўляецца Магілёўскі аблвыканкам, зьмешчаны пералік арганізацыйных структураў палітычных партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў, зьнятых з уліку упраўленьнем юстыцыі Магілёўскага аблвыканкаму ў першым паўгодзьдзі 2005 году. Спіс складаецца з 35 (!) назваў ліквідаваных па розных прычынах арганізацыйных структураў. У надрукаваным сьпісе – 5 суполак Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), 13 пярвічных арганізацыяў Аб'яднанай грамадзянскай партыі, 3 пярвічныя арганізацыі Ліберальна-дэмакратычнай партыі, 1 гарадзкая суполка Партыі БНФ, 6 раённых арганізацыяў Партыі камуністаў Беларускай, 2 пярвічныя арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, 2 пярвічныя арганізацыі Сацыяльна-спартыўнай партыі, пярвічная арганізацыя Беларускай партыі жанчын "Надзея" і 2 грамадзкіх аб'яднаньні.

***12 ліпеня*** быў афіцыйна дапытаны 22-гадовы ***Антон Кішкурна***. Падчас гэтага допыту было прад'яўлена сыну актывіста Партыі БНФ ***Уладзіміра Кішкурны*** афіцыйнае абвінавачаньне. Пра гэта распавёў адвакат Антона Аляксандр Галіеў: "Быў допыт, было прад'яўлена абвінавачаньне па артыкуле 328 частка 2, а таксама па артыкуле 295, частка 2. Гэта незаконны абарот наркотыкаў і захаваньне боезапасаў. Антон прызнаў сябе вінаватым у захаваньні боезапасаў. Ён знайшоў іх недзе ў паляўнічым доміку і ня ведаў, што гэта злачынства. Што тычыцца незаконнага абароту наркотыкаў — тут ён сябе вінаватым не прызнае". Аляксандр Галіеў гаворыць, што знойдзеная ў доме друкарская машына, вывезеная з дому невядомымі асобамі ў цывільным, у крымінальнай справе не фігуруе. Уладзіміра Кішкурну пакуль на допыты не выклікалі. Пасьля прад'яўленьня яго сыну абвінавачаньня спадар Кішкурна сказаў: "Лухта, шытая белымі ніткамі! Я старшыня Менскай гарадзкой арганізацыі, і трэба падставіць Партыю БНФ. Трэба дыскрэдытаваць і запалохаць нас".

***19 ліпеня*** ўлады сарвалі правядзеньне летняга лагера па правах чалавека для будучых беларускіх юрыстаў. Лагер планаваў адкрыць у Вілейскім раёне "Інавацыйны фонд прававых тэхналогіяў", аднак за дзень да адкрыцьця кіраўніцтва цэнтру "Надзея", з якім была заключаная дамова аб арэндзе, адмовіла ў прадастаўленьні месца і харчаваньня. У цэнтры "Надзея" спасылаліся на парушэньні санітарных нормаў, якія нібыта знайшлі ў палатачным гарадку летняга лагеру. Арганізатары лагеру планавалі, што ў ім пройдуць навучаньне 48 студэнтаў юрыдычных факультэтаў розных ВНУ Беларусі. Праграма была разьлічаная на 10 дзён, у ёй былі розныя курсы ў галіне правоў чалавека. Кіраўніцтва "Інавацыйнага

фонду прававых тэхналогіяў" зьвярнулася да міжнародных арганізацыяў з просьбай дапамагчы правесьці лагер за межамі Беларусі.

***26 ліпеня*** ўвечары ў Пінску затрымалі старшыню Берасьцейскай ***абласной арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі*** Сьцяпана Навасельчана. На адной з пінскіх вуліцаў да яго падышлі супрацоўнікі міліцыі і заявілі, што валодаюць інфармацыяй пра тое, што ў машыне актывіста АГП могуць знаходзіцца наркотыкі. Падчас агляду аўтамабілю міліцыянты знайшлі некалькі газетаў і бюлетэняў, прысьвечаных наступнай выбарчай кампаніі. На Сьцяпана Навасельчана быў складзены пратакол за распаўсюд друкаваных выданьняў з парушэньнем закону, пасьля чаго ён быў адпушчаны.

***27 ліпеня*** трое сяброў ***Партыі БНФ*** былі затрыманыя ўвечары памежнікамі ў вёсцы Знаменка Берасьцейскага раёну. Паводле старшыні Берасьцейскай гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ Зьміцера Шыманскага, настаўнік Уладзімір Красько, студэнты Віталь Коўш і Юрый Асеевіч распаўсюджвалі сярод вясковых жыхароў інфармацыйныя выданьні, прысьвечаныя працэсу вылучэньня адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў Беларусі на наступныя прэзідэнцкія выбары. На сяброў БНФ складзеныя пратаколы за парушэньне правілаў знаходжаньня ў памежнай зоне. Сапраўдная мэта затрыманьня, такім чынам, была толькі агучаная вусна, і не зафіксаваная дакументальна. Актывістаў чакае суд.

***30 ліпеня*** ў Докшыцах пасьля нарады дэмакратычнага актыву на тры гадзіны быў затрыманы аўтамабіль, у якім ехаў старшыня ***Партыі БНФ Вінцук Вячорка*** і сябра Сойму ***Аляксей Кавалец***. Абвінаваціўшы іх у распаўсюдзе друкаванай прадукцыі, міліцыянты загадалі даставіць аўтамабіль на тэрыторыю РАУС. Аляксей Кавалец, у якога забралі правы, пайшоў "даваць тлумачэньні", а Вінцук Вячорка, нягледзячы на пагрозы начальніка міліцыі, катэгарычна адмовіўся выходзіць з аўтамабілю без дакладнага вызначэньня ўчыненага ім правапарушэньня. Міліцыянты правялі "агляд" аўтамабілю і высьветлілі, што ў ім знаходзяцца афіцыйна зарэгістраваныя газеты, а таксама партыйныя бюлетэні ў колькасьцях, меншых за 300 асобнікаў. Праз тры гадзіны франтаўскія лідэры былі вызваленыя. Вінцук Вячорка пракаментаваў докшыцкія падзеі наступным чынам: "Намі "займалася" дзевяць чалавек, з іх сем афіцэраў, на чале з кіраўніком РАУС. У гэты час мы пачулі, што ў раёне адбылося рабаваньне, але ў сувязі з "занятасьцю" нашыя ахоўнікі парадку доўга не маглі вырашыць, хто ж туды паедзе. Мне шкада, што беларускую міліцыю так прыніжаюць, вымушаюць не шанаванай ва ўсім сьвеце паліцэйскай працай займацца, а быць палітычнымі жандарамі. Зрэшты, пасьля ўсяго мы разьвіталіся з докшыцкімі міліцыянтамі па-добраму. Нам разам жыць на гэтай зямлі".

***6 жніўня*** арганізатары Нацыянальнага кангрэсу дэмакратычных сілаў

не атрымалі ад уладаў дазволу на арэнду памяшканьня для правядзеньня мерапрыемства. Паводле старшыні аргкамітэту ***Аляксандра Бухвостава***, атрыманыя адмовы ад 10 выканкамаў з 21-го, куды былі накіраваныя заяўкі, атрыманыя таксама адмовы ад 17 палацаў культуры з 51-го.

***10 жніўня*** сталая рада дэмакратычных сілаў вырашыла зьвярнуцца да кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі з просьбай выдзеліць памяшканьне для правядзеньня Нацыянальнага кангрэсу дэмакратычных сілаў. На гэты крок арганізатары Кангрэсу пайшлі пасьля таго, як усе мясцовыя вертыкальныя структуры адмовілі ў прадастаўленьні такога памяшканьня. Адпаведна з законам, запыты былі накіраваныя ў 21 райвыканкам, а таксама ў 51 Палац культуры па ўсёй краіне. Памяшканьне павінна зьмясьціць каля 800 дэлегатаў. Большасьць адказаў уладальнікаў памяшканьняў – аднатыпныя адпіскі: яны, маўляў, ня маюць магчымасьці прадаставіць залу, аднак прычыны гэтаму не тлумачацца. Многія наогул не даслалі ніякіх адказаў. Каля двух тыдняў таму арганізатары Кангрэсу напісалі старшыні камісіі па правах чалавека Палаты прадстаўнікоў Юрыю Кулакоўскаму, які заклікаў палітычныя партыі зьвяртацца да яго па дапамогу, аднак аргкамітэт Кангрэсу так і не атрымаў ад дэпутата ніякага адказу.

***18 жніўня*** ў Лоеве міліцыя затрымала намесьніка старшыні абласной арганізацыі АГП Уладзіміра Кацору і сакратара абласной арганізацыі ПКБ Уладзіміра Сякерку. Затрыманьнем кіраваў сам начальнік райаддзелу міліцыі маёр Хмялянок. Партыйных актывістаў абвінавачваюць у парушэньні правілаў уезду ў памежную зону (Лоеўскі раён мяжуе з Украінай). Пры ўезьдзе ў райцэнтр міліцыя і памежнікі спынялі аўтамашыну з актывістамі апазіцыйных партыяў. Спадары Кацора і Сякерка паказалі камандзіровачныя пасьведчаньні і іх першапачаткова прапусьцілі, але затым – усё ж затрымалі. Старшы лейтэнант памежных войскаў Уладзімір Дземідзенка склаў адміністрацыйныя пратаколы.

***27 жніўня*** стала вядома, што ў Віцебску прымусова высяляюць з памяшканьня мясцовую ***філію Фонду імя Льва Сапегі***. У лісьце, які грамадзкае аб'яднаньне атрымала з адміністрацыі Першамайскага раёну, загадана да 1-га верасьня вызваліць арандаваны офіс – двухпакаёвую кватэру ў жылым доме на прасьпекце Чарняхоўскага. Начальнік раённай камунальнай гаспадаркі Уладзімір Іваноў, які падпісаў гэты загад, паведаміў таксама, што працяг тэрміну арэнды ніяк немагчымы, бо памяшканьне вырашана здаць іншым часовым гаспадарам. На думку старшыні праўленьня Віцебскай філіі Фонду Хрыстафора Жаляпава, прычына адмовы зусім іншая: "Нас высяляюць не таму, што гэтае памяшканьне камусьці патрэбнае. Проста ёсьць падстава зачыніць нашу арганізацыю, бо яна губляе юрыдычны адрас".

***1 верасьня*** ў Менску адбылася прэзентацыя Нацыянальнай справаз-

дачы аб чалавечым разьвіцьці 2004-2005 гадоў "Эканоміка і грамадзтва Беларусі: дыспрапорцыі і персьпектывы разьвіцьця". Гэта ўжо восьмая па ліку справаздача, якую рыхтуюць сумесна прадстаўніцтва ААН ў Рэспубліцы Беларусь і нацыянальныя эксьперты, грамадзяне Беларусі, яна носіць рэкамендацыйны характар. Каэфіцыенты "глыбіні" і "вастрыні" беднасьці ў Беларусі даволі нізкія, але доля людзей з даходам ніжэй за пражытковы мінімум і асобаў, якія жывуць у адноснай беднасьці, у суме складае больш за чвэрць насельніцтва краіны – амаль 29%. Упершыню эксьперты ААН прааналізавалі стан і дзейнасьць няўрадавых арганізацыяў у Беларусі. У гэтай сферы яны адзначылі вельмі шмат праблемаў: абмежаваныя рэсурсы, надзвычай складаная і дарагая працэдура рэгістрацыі і дзейнасьці NGO, татальны кантроль за іх дзейнасьцю з боку дзяржавы – бясконцыя праверкі, папярэджаньні, закрыцьцё... Супрацоўніцтва NGO з замежнымі партнёрамі таксама кантралюецца дзяржавай, вельмі цяжка атрымаць дазвол на дабрачынную замежную дапамогу. Меркаваньне прадстаўніцы ААН/ПРААН у Беларусі Джыхан Султанаглу наступнае: "Адна з рэкамендацыяў, якую мы даем у справаздачы – неабходнасьць пашырэньня прасторы для індывідуальных ініцыятываў і разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці. Трэба даць больш шырокія магчымасьці грамадзянам Беларусі самастойна вырашаць уласныя праблемы".

***8 верасьня*** кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка дазволіў прадставіць памяшканьне ў Менску для правядзеньня Нацыянальнага кангрэсу дэмакратычных сілаў, які прызначаны на пачатак кастрычніка. Пытаньне дазволу на правядзеньне Кангрэсу дэміслаў у Менску абмяркоўвалася падчас сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Менскага гарвыканкаму Міхаілам Паўлавым. Паводле спадара Паўлава, гэтае мерапрыемства не ўваходзіць у кампетэнцыю і абавязкі Менгарвыканкаму, аднак у горадзе шмат памяшканьняў, каб правесьці кангрэс на высокім узроўні. І менскія ўлады гатовыя аказаць усялякае садзеяньне. Паўлаў даклаў кіраўніку краіны пра гатоўнасьць прапанаваць некалькі варыянтаў для правядзеньня апазіцыйнага кангрэсу. Паводле афіцыйных крыніцаў, А. Лукашэнка падтрымаў такую пазіцыю менскіх уладаў. Старшыня аргкамітэту Кангрэсу дэмакратычных сілаў Аляксандр Бухвостаў нагадаў, што адпаведна закону былі накіраваны 52 запыты ўласьнікам памяшканьняў па ўсёй краіне, у тым ліку такі запыт быў накіраваны ў Менскі гарвыканкам. Аднак адусюль былі адмоўныя адказы альбо адказаў не было зусім, пакуль у гэты працэс не ўмяшаўся кіраўнік Беларусі. Чаму ж кіраўніцтва Беларусі пайшло на саступкі? А. Бухвостаў лічыць: " Гэта пытаньне палітычнага прэстыжу. Лукашэнку было б цяжка даказаць, што ён не дыктатар".

***8 верасьня*** Мінюст запатрабаваў выключыць з ***"Саюзу беларускіх пісьменьнікаў"*** замежных грамадзянаў. У выпадку невыкананьня гэтага патрабаваньня Мінюст пагражае ліквідаваць пісьменьніцкую арганізацыю.

Саюз мае ў сваім складзе шаснаццаць літаратараў, якія стала жывуць за межамі краіны, такіх як прафесар Варшаўскага ўніверсітэту паэт Алесь Баршчэўскі, празаік і літаратуразнаўца з Масквы Аляксей Каўка, паэтка і журналістка з Палтавы Іна Снарская, публіцыст і навуковец з Санкт-Пецярбургу Валянцін Грыцкевіч ды яшчэ больш за дзясятак выбітных беларускамоўных творцаў, якія жывуць за межамі краіны. У пісьменьніцкую арганізацыю іх прымалі ў розныя гады, некаторых яшчэ ў час СССР. Усе яны актыўна працуюць на карысьць беларускай літаратуры, сказаў старшыня “Саюзу беларускіх пісьменьнікаў” Алесь Пашкевіч, і няма ніякіх падставаў выключаць іх з творчае арганізацыі, як таго патрабуе Міністэрства юстыцыі ў сваім лісьце. Алесь Пашкевіч гаворыць, што нікога выключаць з пісьменьніцкай арганізацыі ня будуць менавіта таму, што сяброўства замежных грамадзянаў не супярэчыць статуту пісьменьніцкага саюзу, зацьверджанага ў прадугледжаным заканадаўствам парадку. Алесь Пашкевіч упэўнены, што сапраўдныя прычыны карных санкцыяў да пісьменьнікаў з боку чыноўнікаў палягаюць у іншым: “Саюз пісьменьнікаў як грамадзкая арганізацыя выцясьняецца з прававога поля дзейнасьці. Саюз пісьменьнікаў як найстарэйшая творчая арганізацыя нашай краіны на сёньня ня толькі рэальнай дзяржаўнай падтрымкі пазбаўленая, але і юрыдычнага статусу, можа так стацца, таксама будзе пазбаўленая”.

***16 верасьня*** кіраўнік аргкамітэту правядзеньня Кангрэсу дэмакратычных сілаў Аляксандр Бухвостаў паведаміў, што атрымаў пісьмовы ліст за подпісам намесьніка старшыні Менскага гарвыканкаму Міхаіла Пятрушына, у якім даецца афіцыйны дазвол на правядзеньне Кангрэсу 1—2 кастрычніка ў Палацы культуры Менскага аўтазаводу. Для выкарыстаньня гэтага памяшканьня застаецца заключыць дамову з кіраўніцтвам Палацу культуры і пералічыць грошы.

***20 верасьня*** ўдзень недалёка ад пасёлка Кіраўскі Віцебскага раёну супрацоўнікі міліцэйскай дарожна-паставой службы спынілі дзьве машыны, якія ехалі з Віцебску ў Наваполацк. У адным легкавіку ехалі Аляксандр Мілінкевіч і кіраўнік абласной арганізацыі Партыі БНФ ***Канстанцін Смолікаў***, а ў другім – сябра тае ж партыі Хрыстафор Жэляпаў. Пасьля праверкі дакументаў першая машына рушыла далей, а другую міліцыянты не прапусьцілі, бо заўважылі некалькі асобнікаў бюлетэню “Навіны БНФ”, а таксама ўлёткі, якія спадар Жэляпаў меркаваў распаўсюдзіць у Наваполацку. Затрыманаму кіроўцу спачатку загадалі ехаць у Чыгуначны райаддзел Віцебску, нягледзячы на тое, што затрыманьне адбылося за межамі гораду, а потым і ў райаддзел Віцебскага раёну, дзе ў яго з машыны забралі ўсю наяўную друкаваную прадукцыю. Гэты працэс быў зьняты на відэастужку, а спадара Жэляпава змусілі напісаць тлумачэньні: адкуль у яго бюлетэні ды ўлёткі, і што ён зьбіраўся з імі рабіць. Ад часу затрыманьня да моманту складаньня пратаколу прайшло каля пяці гадзінаў. У Навапо-

лацак Хрыстафор Жэляпаў паехаў са спазьненьнем ды зьвесткамі пра тое, што чакае позву ў суд або на адміністрацыйную камісію, бо ў міліцэйскім пратаколе зафіксавана, што ўлёткі, якія ён вёз, ня маюць выходных дадзеных.

***26 верасьня*** стала вядома, што Гарадзенская арганізацыя БНФ "Адраджэньне" да 30 верасьня павінна сплаціць 1 мільён 440 тысячаў рублёў судовых пошлінаў. Уведамленьне пра гэта атрымала кіраўніцтва гарадзкой арганізацыі за подпісам судовага выканаўцы Гаспадарчага суда Гарадзенскай вобласьці С.Якацука. Пошліны былі ўскладзеныя пасьля пройгрышу судовага працэсу аб высяленьні фронтаўскіх арганізацыяў з памяшканьня па вул. К.Маркса,11 у Гародні. Тады прычынай высяленьня быў названы аварыйны стан будынку. Пасьля высяленьня прайшло больш за паўгады, але ніякія рАМАПтныя работы за гэты час так і не пачаліся.

***1 кастрычніка*** ў Менску пачаўся Кангрэс дэмакратычных сілаў, у якім удзельнічаюць каля тысячы дэлегатаў, кіраўнікі дыпламатычных місіяў ЗША, Вялікай Брытаніі, Францыі, Італіі, Чэхіі, прадстаўнікі палітычных партыяў еўрапейскіх краінаў. Зала ўпрыгожаная ў белых і чырвоных колерах, тут вялікі бел-чырвона-белы сьцяг. Лозунгі, пад якімі праходзіць сход: "Разам за свабоду і перамены", "Мы любім Беларусь". Але не абышлося без правакацыяў: раніцай дэлегаты Кангрэсу, якія прыйшлі да Палацу культуры менскага аўтазаводу, дзе праходзіць гэты форум, убачылі на сьценах вялікія надпісы па-расейску, зробленыя чырвонай фарбай: "Слава – Союзу, нет – Евросоюзу!", "Нет продажной оппозиции!" і "Руки прочь от Беларуси!" А таксама намаляваны серп з молатам ды абрэвіятура НБП, нацыянал–бальшавіцкая партыя. На працягу паўгадзіны работнікі палацу зафарбавалі гэтыя надпісы. Таксама за некалькі гадзінаў да пачатку Кангрэсу да Палацу культуры МАЗ прывезьлі гурт артыстаў. Яны былі пераапранутыя ў герояў дзіцячага мультфільму "Кракадзіл Гена». Артысты сьпявалі песьню "Голубой вагон" і пазавалі перад тэлекамерамі беларускіх дзяржаўных каналаў БТ, ОНТ і СТВ. Пасьля да камераў падышлі мужчыны ў парыках і пачалі цалавацца. Тэлежурналісты пачалі рабіць апытаньні на тэму, як прысутныя ставяцца да аднаполых шлюбаў? Прадстаўнікі незарэгістраванай арганізацыі "Ліга сэксуальных меншасьцяў" называюць правакацыяй акцыю, якую правялі перад камерамі дзяржаўных тэлеканалаў невядомыя асобы нібыта ад імя геяў і лесьбіянак у знак падтрымкі адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад апазіцыі. Лідэр аб'яднаньня гееў і лесьбіянак Эдвард Тарлецкі ўпэўнены, што акцыя перад будынкам, дзе адбываўся Кангрэс дэмакратычных сілаў, была запланаваная ўладамі за некалькі дзён да правядзеньня паседжаньня. У пацьверджаньне гэтага ён спасылаецца на тое, што яму і некальkім актывістам руху за два дні да Кангрэсу тэлефанавалі журналісты з інфармацыйных агенцыяў і прасілі выказацца наконт таго, ці падтрымаюць адзінага кандыдата, калі ён будзе выступаць за аднаполыя шлюбы. Журналістам у каментары адмовілі. Паводле

неафіцыйных крыніцаў, перад камерамі беларускага тэлебачаньня абдымаліся і цалаваліся пазаштатныя акторы, якія здымаюцца ў масавых сцэнах на "Беларусьфільме" і часам прапануюць свае паслугі ў тэатрах.

***2 кастрычніка*** Кангрэс дэмакратычных сілаў прыняў Рэзалюцыю аб незаконнасьці ўдзелу Аляксандра Лукашэнкі ў прэзідэнцкіх выбарах 2006 году. У Рэзалюцыі Кангрэсу гаворыцца, што рэферэндум 17 кастрычніка 2004 году быў прызначаны і праведзены з парушэньнем Канстытуцыі і Выбарчага кодэксу. Дэлегаты Кангрэсу дэмакратычных сілаў таксама вылучылі патрабаваньні да беларускіх уладаў у сувязі з правядзеньнем выбараў 2006 году:

— забясьпечыць доступ апазіцыі да дзяржаўных СМІ і стварыць роўныя ўмовы для дзейнасьці СМІ розных формаў уласнасьці;

— прывядзеньне дзеючага заканадаўства, у першую чаргу выбарчага, у адпаведнасьць з дэмакратычнымі стандартамі;

— узнаўленьне прынцыпу падзелу ўладаў;

— прэзідэнцкія выбары 2006 году павінныя прайсьці без удзелу А. Лукашэнкі;

— Кангрэс дэмакратычных сілаў патрабуе расьсьледаваньня справаў аб зьнікненьні вядомых людзей – Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзьмітрыя Завадзкага, прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці асобаў, вінаватых у гэтых злачынствах, спыніць палітычны перасьлед апанентаў рэжыму.

***6 кастрычніка Моладзевая ініцыятыва "Вока"*** вырашыла спыніць сваю дзейнасьць, што зьвязана з боязьзю перасьледу з боку ўладаў. Рашэньне было прынятае на падставе загаду Міністэрства юстыцыі, якое абавязала кожныя кааліцыі ды ініцыятывы станавіцца на ўлік ў Мінюсьце.

***7 кастрычніка*** Міністэрства юстыцыі трэці раз за апошнія паўтары гады адмовіла ў рэгістрацыі Партыі свабоды і прагрэсу (ПСП). Прычынамі адмовы сталі неадпаведнасьці ў пратаколах па вылучэньні дэлегатаў на ўстаноўчы зьезд і прызнаньне 45 подпісаў заснавальнікаў несапраўднымі. "Большасьць прычынаў, указаных у лісьце Міністэрства юстыцыі, беспадстаўныя і не вытрымліваюць ніякай крытыкі. Мы перадалі ўсе неабходныя для рэгістрацыі дакументы, у тым ліку і запатрабаваныя дадаткова, але чамусьці двух пратаколаў у міністэрстве не аказалася, затое замест прадстаўленых 1 006 подпісаў заснавальнікаў аказалася 1 031, — каментуе рашэньне Мінюсту старшыня ПСП Уладзімір Навасяд. – Адкуль узяліся яшчэ 25 подпісаў – для мяне загадка. Практычна ўсё, што выкладзена на трох старонках у адмове Мінюсту – альбо сьледзтва няўважлівасьці, альбо мэтанакіраванага ігнараваньня перададзеных дакументаў. Зразумела, што беларускім уладам не патрэбная ліберальная партыя, але яна патрэбная грамадзянам Беларусі, якія ўжо ў трэці раз, нягледзячы на ціск і запалохваньне з боку ўладаў, ставяць свае подпісы пад устаноўчымі дакументамі".

***17 кастрычніка*** дэпартамент грамадзянства і міграцыі МУС падсумаваў вынікі перарэгістрацыі і абвясьціў юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія цягам бліжэйшых пяці гадоў маюць права працаўладкоўваць грамадзянаў Беларусі за межамі краіны. Міністэрскае “сіта” прайшлі толькі 10 арганізацыяў і прадпрымальнікаў з ранейшых 50. Сьпіс юрыдычных асобаў, якім у бліжэйшую “пяцігодку” дазволена накіроўваць беларусаў за мяжу, пачынае БРСМ са сваімі філіямі ў абласных цэнтрах і ў сталіцы. Пад другім нумарам пазначаны Моладзевы цэнтр “Штаб студэнцкіх атрадаў”, які мае непасрэднае дачыненьне да БРСМ і, насуперак логіцы, будзе куратарам не студэнцкіх атрадаў, а “базай” дзеля адпраўкі рабочых у Чэхію. Большасьць астатніх фірмаў заявілі, што арыентуюцца на будаўнічыя сьпецыяльнасьці ў Расіі.

***20 кастрычніка*** Партыя БНФ атрымала ліст ад начальніка ўпраўленьня грамадзкіх аб’яднаньняў Міністэрства юстыцыі Алега Сьліжэўскага, які называецца “Аб прадастаўленьні інфармацыі”. З яго вынікае, што чыноўнікі ад юстыцыі распачалі пошук прадстаўнікоў грамадзкіх арганізацыяў, якія прымалі ўдзел у Кангрэсе дэмакратычных сілаў. Чыноўніку патрапіў у рукі бюлетэнь Аб’яднаных дэмакратычных сілаў, які распаўсюджваўся падчас Кангрэсу. А. Сьліжэўскі заўважае, што ў адным з артыкулаў бюлетэню гаворыцца пра актыўны ўдзел у раённых сходах па вылучэньні дэлегатаў на Кангрэс арганізацыяў “Персьпектыва” і “Правы альянс”. Абедзьве структуры выступілі арганізатарамі некалькіх сходаў, у напружанай барацьбе правялі на Кангрэс сваіх дэлегатаў. Мінюст запатрабаваў ад Партыі БНФ сьпіс дэлегатаў ад гэтых арганізацыяў. Як паведамляе арганізацыйна-прававая камісія Партыі БНФ, гэтымі зьвесткамі партыя не валодае, пра што і было паведамлена ў Міністэрства юстыцыі.

***22 кастрычніка*** ў Менску адбылася канферэнцыя “Новае заканадаўства пра няўрадавыя арганізацыі: досьвед уплыву на прыняцьце палітычных рашэньняў у Беларусі”. Канферэнцыя была прысьвечаная вынікам рэалізацыі чарговага этапу кампаніі па прасоўваньні інтарэсаў грамадзкіх аб’яднаньняў у 2004-2005 гадах. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі няўрадавых арганізацыяў, якія былі заангажаваныя ў кампанію “Наша Салідарнасьць”. Прысутныя азнаёміліся з вынікамі зваротаў да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў трэцяга скліканьня з папярэдне абмеркаванымі і ўзгодненымі прапановамі па зьмяненьні заканадаўства пра няўрадавыя арганізацыі. Гэтыя звароты былі накіраваныя ўсім дэпутатам ніжняй палаты парламенту і датычылі пазіцыі грамадзкага сектару ў дачыненьні да Закону “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”, новая рэдакцыя якога разглядалася парламентам увесну. Усе члены парламенту былі праінфармаваныя пра патрэбы НДА ў сферы юрыдычнага рэгуляваньня “трэцяга сектару”, пра еўрапейскія стандарты ў гэтай галіне, пра існуючыя неабгрунтаваныя абмежаваньні ў беларускім заканадаўстве, што на практыцы перашкаджа-

юць свабоднаму разьвіцьцю грамадзянскай актыўнасьці. Шэраг дэпутатаў тады выказалі пазітыўнае стаўленьне да прапановаў грамадзкіх актывістаў і заявілі пра намер ініцыяваць абмеркаваньне гэтых прапановаў падчас сваёй заканатворчай дзейнасьці. Аднак гэты намер не знайшоў сваёй рэалізацыі: прапанаваны ўрадам праект новай рэдакцыі Закону “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” быў прыняты ў надзвычайным рэжыме і з парушэньнем традыцыйнай парламенцкай працэдуры. Дэпутаты фактычна самаўхіліліся ад заканатворчай дзейнасьці па гэтым законапраекце і прынялі яго без абмеркаваньня. Такім чынам, спроба лабіяваньня інтарэсаў НДА праз грамадзкі ціск на заканатворцаў не прывяла да станоўчага выніку. У зьвязку з гэтым удзельнікі канферэнцыі канстатавалі практычную вычэрпанасьць дадзенага накірунку ўзьдзеяньня на прававое поле. Прагучала прапанова завяршыць кампанію “Наша Салідарнасьць” вынясеньнем грамадзкага вотуму недаверу дзеючаму складу парламенту.

***24 кастрычніка*** ад Віцебскай абласной філіі ***Фонду імя Льва Сапегі*** ў чарговы раз запатрабавалі пакінуць офіс, дзе арганізацыя мае юрыдычны адрас. Яшчэ ў жніўні ЖРЭТ Першамайскага раёну Віцебску накіраваў у Фонд Сапегі ліст, у якім паведаміў, што дамова арэнды памяшканьня “перазаключацца ня будзе”, бо плошчы, на якіх месьціцца недзяржаўная арганізацыя, плануецца выкарыстоўваць “па іншым прызначэньні”. Камунальшчыкі прапанавалі НДА да 1 верасьня пакінуць памяшканьне. Старшыня мясцовай філіі Фонду Сапегі Хрыстафор Жэляпаў зьвярнуўся да Віцебскага гарадзкога выканаўчага камітэту з просьбай дазволіць працягнуць арэнду памяшканьня, якое НДА займае ўжо каля дзесяці гадоў. З гарвыканкаму прыйшоў адказ: маўляў, пытаньне зьнятае з разгляду паседжаньнем гарадзкой адміністрацыі і перададзенае ў ЖРЭТ Першамайскага раёну. Такім чынам выканкамаўскія чыноўнікі зьнялі з сябе адказнасьць, а прадстаўнікі жыльлёва-камунальных службаў зноў запатрабавалі ад грамадзкай арганізацыі вызваліць памяшканьне. Віцебская абласная філія Фонду імя Л. Сапегі зьбіраецца падаваць скаргу ў суд.

***27 кастрычніка*** стала вядома, што ўлады не дазваляюць правесьці чарговы дзявяты зьезд ***“Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны”*** (ТБМ) у Доме літаратара. Заяўку на арэнду вялікай залы Дому літаратара гаспадарчае ўпраўленьне кіраўніцтва справамі прэзідэнта, якому належыць цяпер гэты будынак, не задаволіла. На зьезд абрана каля ста пяцідзесяці дэлегатаў з розных рэгіёнаў краіны, а таксама з замежных суполак ТБМ. На сёньня “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны” – гэта самая масавая грамадзкая арганізацыя абаронцаў нацыянальных каштоўнасьцяў.

***29 кастрычніка*** віцебскай арганізацыі ***Партыі БНФ*** загадана пакінуць арандаванае тры месяцы таму памяшканьне. Старшыня Кастусь

Смолікаў паведаміў: “Прадаецца будынак, у якім гарадзкая арганізацыя Партыі БНФ мела памяшканьне і юрыдычны адрас. Акцыянернае таварыства «Арыён» цяпер знаходзіцца ў стане санацыі, прызначаны іншы кіраўнік, і гэты кіраўнік заявіў, што наступныя гаспадары будынку ня будуць даваць месца і юрыдычнага адрасу нашай арганізацыі. Давядзецца шукаць іншы адрас”.

***29 кастрычніка*** каля сямідзесяці актывістаў грамадзянскай ініцыятывы ***“Партнёрства”*** з усіх рэгіёнаў Беларусі сабраліся правесьці ўстаноўчы зьезд аднайменнай арганізацыі ў незвычайным месцы – менскім кінатэатры “Цэнтральны”, паколькі ў іншых месцах ім адмовілі ў арэндзе залы. Але пасьля пачатку зьезду ў залу кінатэатру зайшло шмат міліцыянтаў у форме і ў цывільным, яны вывелі дэлегатаў на вуліцу і аўтобусамі даставілі іх у РУУС Маскоўскага раёну Менску. Кіраўнік ініцыятывы “Партнёрства” Мікола Астрэйка зазначыў, што іх зьезд праводзіўся ў сувязі з новымі патрабаваньнямі Мінюста, якія забараняюць дзейнасьць незарэгістраваным аб’яднаньням. Пасьля дачы пісьмовых тлумачэньняў каля 60 актывістаў “Партнёрства” былі адпушчаныя, на чатырох арганізатараў зьезду складзеныя пратаколы аб адміністрацыйным парушэньні за несанкцыянаваны сход. Спадар Астрэйка і два ягоныя намесьнікі Эніра Браніцкая і Аляксандр Бондараў зьмешчаныя ў менскі сьпецпрыёмнік на вуліцы Акрэсьціна. Яшчэ адна арганізатарка зьезду Сьвятлана Конава, на якую складзены пратакол, адпушчаная да суда дадому, бо ў яе ёсьць непаўнагадовае дзіця. Каля 20 актывістаў “Партнёрства”, якія ехалі з Гомелю, на зьезд не патрапілі, іх аўтобус часова затрымалі.

***31 кастрычніка*** суд Маскоўскага раёну Менску пакараў чатырох удзельнікаў устаноўчай канферэнцыі грамадзкага аб’яднаньня ***“Партнёрства”***, якая ставіць за мэту назіраньне за выбарамі, арыштамі і штрафам. Лідэра аб’яднаньня Міколу Астрэйку, а таксама Аляксандра Бондарава і Эніру Браніцкую арыштавалі на 15 сутак. Сьвятлану Конаву суд пакараў штрафам на 30 базавых велічыняў. Суд прызнаў іх арганізатарамі несанкцыянаванага сходу. Сьвятлана, Эніра, Мікола і Аляксандр скончылі юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэту. Мікола Астрэйка паведаміў у судовай зале Маскоўкага суда: “Гэта абсурд. З аднаго боку, Міністэрства юстыцыі патрабуе ад грамадзкіх арганізацыяў рэгістрацыі. З другога боку, АМАП перашкаджае гэтай рэгістрацыі. Гэта дэманструе тое, што ўлады зацікаўленыя ў зьнішчэньні трэцяга сектару. Ні ў якім разе не дапамога, не ўпарадкаваньне, а толькі выключна зьнішчэньне ўсімі метадамі. Фактычна, улады заганяюць нас у падпольле”.

***8 лістапада*** намесьнік старшыні Вярхоўнага суда Беларусі Валеры Вышкевіч падаў пратэст на рашэньне суда Першамайскага раёну Менску. Судзьдзя палічыў, што суд першай інстанцыі няправільна выкарыстаў за-

канадаўства і неабгрунтавана задаволіў частку зыскавых патрабаваньняў ГА ***“Воля да разьвіцьця”*** (г. Слонім) супраць Белтэлерадыёкампаніі аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі яго старшыні Міхася Варанца і аб абароне дзелавой рэпутацыі гэтага грамадзкага аб’яднаньня. Нагадаем, што ў лютым суд пад старшынствам судзьдзі Лідзіі Целіцы часткова задаволіў гэты зыск грамадзкага аб’яднаньня. Суд прызнаў, што распаўсюджаныя ў праграме БТ “Панарама” зьвесткі пра грамадзкае аб’яднаньне “Воля да разьвіцьця” зьяўляюцца хлусьнёй, якая ганьбіць гонар і годнасьць грамадзкіх актывістаў. Суд абавязаў дзяржаўнае тэлебачаньне абвергнуць гэтыя зьвесткі. Адказчык адмовіўся выконваць судовае рашэньне нават пасьля таго, як касацыйная інстанцыя прызнала абгрунтаванасьць прысуду, што нават прывяло да накладаньня на кіраўніцтва БТ адміністрацыйнага штрафу за невыкананьне рашэньня суда. Юрысты БТ падавалі адну за адной наглядныя скаргі, і ўрэшце рэшт гэта прынесла вынік. Судзьдзя Вярхоўнага суда В. Вышкевіч накіраваў пратэст, які грунтуецца на пазіцыі, што журналісты БТ маглі агучваць уласнае меркаваньне пра грамадзкае аб’яднаньне, нават ня маючы пры гэтым ніякіх фактаў у яго абгрунтаваньне. Згодна з пратэстам В. Вышкевіча, наглядная справа будзе разгледжаная Прэзідыумам Менскага гарадзкога суда.

***8 лістапада*** са сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку пасьля 10 сутак арышту выйшла намесьніца старшыні грамадзянскай ініцыятывы ***“Партнёрства” Эніра Браніцкая.*** Яна трымалася бадзёра, нягледзячы на тое, што ў камеры абвастрылася захворваньне – язва страўніка.

***9 лістапада*** Прэзідыум Менскага гарадзкога суда адмяніў рашэньне суда Першамайскага раёну Менску, згодна з якім Белтэлерадыёкампанія павінна была абвергнуць распаўсюджаную ў праграме “Панарама” інфармацыю пра Слонімскае грамадзкае аб’яднаньне “Воля да разьвіцьця”. Такім чынам суд задаволіў пратэст намесьніка старшыні Вярхоўнага суда Аляксандра Федарцова. Каментуючы рашэньне ПрэзідыўмуМенгарсуда, кіраўнік арганізацыі М. Варанец выказаў меркаваньне, што, калі б суд пакараў недобрасумленных прапагандыстаў, яны б з меншай ахвотай выконвалі такія “замовы”.

***16 лістапада*** супрацоўнікі ДАІ Полацку затрымалі тры машыны, у якіх знаходзіліся адзіны прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта ад дэмакратычных сілаў Аляксандр Мілінкевіч, сябры ягонае каманды і журналісты. Міліцыянты патлумачылі затрыманьне аўтамабіляў тым, што нібыта гэтыя машыны знаходзяцца ў вышуку як скрадзеныя ў законных гаспадароў. Затрыманьне доўжылася 40 хвілінаў. У выніку работнікі ДАІ перапісалі нумары машынаў і ўсіх адпусьцілі. Аляксандр Мілінкевіч і кіраўнік штабу палітычнай кампаніі Сяргей Калякін назвалі інцыдэнт спланаванай правакацыяй мясцовай вертыкалі.

***18 лістапада*** ў Менску адбыўся ўстаноўчы зьезд новай праўладнай рэспубліканскай арганізацыі ***“Грамадзкае аб’яднаньне ”Саюз пісьменьнікаў Беларусі”***. Узначаліў яе Мікалай Чаргінец. Як паведаміла дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва “БелТА”, “празаікі, паэты, драматургі і крытыкі ў сваіх выступах на сходзе адзначалі, што цяперашняя арганізацыя ”Саюз беларускіх пісьменьнікаў” у апошнія гады не задавальняла іх прафесійныя запыты, у цэнтры яе ўвагі былі ў асноўным палітычныя памкненьні. У шэрагу выпадкаў праца вялася ў накірунку супрацьстаяньня з уладай, дыскрэдытацыі існуючага дзяржаўнага ладу. У выніку саюз апынуўся ў глыбокім творчым крызісе. Ініцыятары стварэньня новай арганізацыі вырашылі зрабіць Саюз пісьменьнікаў па-сапраўднаму творчай структурай, дзе б захоўваліся традыцыі мінулых гадоў”. Пры гэтым кіраўніцтва “Саюзу беларускіх пісьменьнікаў” — Алеся Пашкевіча, Барыса Сачанку (Пятровіч) і Эдуарда Акуліна, а таксама журналістаў недзяржаўных медыяў не пусьцілі на ўстаноўчы зьезд новага Саюзу. “Якая можа быць пастаўлена новая творчая задача перад новым Саюзам пісьменьнікаў? Яны што, інакш вершы будуць пісаць ці раманы? Не. Ім, хутчэй за ўсё, пастаўлена канкрэтная задача Адміністрацыяй прэзідэнта — выбіць глебу з-пад ног дзеючага, ”неправавернага” Саюзу. Хутчэй за ўсё, ім аддадуць памяшканьні ў Доме літаратара. Можа, ім нейкую яшчэ і датацыю дадуць... А цяперашні “Саюз беларускіх пісьменьнікаў”, магчыма, прызнаюць несапраўдным”, — такім чынам пракаментаваў стварэньне ў Беларусі яшчэ аднаго Саюзу пісьменьнікаў паэт, старшыня беларускага ПЭН-цэнтру Уладзімір Някляеў.

***18 лістапада*** дзьверы сядзібы ***Партыі БНФ*** былі апаганеныя неанацыстамі. Калі намесьнік старшыні партыі Віктар Івашкевіч прыйшоў у сядзібу, ён пабачыў, што ўваходныя дзьверы апаганеныя расейскімі фашыстамі. На дзьвярах чорнай фарбай былі накрэмзаныя вялікая свастыка і надпіс “СЛАВ. СОЮЗ”. Старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка зазначыў: “Гэта чацьвёрты выпадак за апошні час. Мы ведаем, што сядзіба БНФ знаходзіцца пад стацыянарным аўдыёвізуальным кантролем лукашэнкаўскіх сьпецслужбаў. Акрамя таго, літаральна побач – Акадэмія міліцыі, уваходы ў якую безупынна вартуюцца. Але нягоднікі спакойна робяць сваю чорную справу. Таму я маю падставы сьцьвярджаць, што яны знаходзяцца пад прыхільнай апекай лукашэнкавай улады”.

***21 лістапада*** Слонімскае моладзевае ***грамадзкае аб’яднаньне «Ветразь»*** атрымала афіцыйны ліст з Упраўленьня юстыцыі Гарадзенскага аблвыканкаму аб вынесеным яму пісьмовым папярэджаньні. Па словах кіраўніка «Ветразя» Алеся Масюка, папярэджаньне вынесенае на падставе праведзенай у кастрычніку Упраўленьнем юстыцыі праверкі статутнай дзейнасьці арганізацыі. У афіцыйным лісьце за подпісам начальніка ўпраўленьня А.Сянькевіча адзначаецца, што прычынай вынясеньня папярэджаньня стала адсутнасьць дакументу, які б пацьвярджаў наяўнасьць

у грамадзкага аб'яднаньня юрыдычнага адрасу. Таксама чыноўнік піша пра неперарэгістраваную ў вызначаным парадку сімволіку «Ветразі» і недакладна аформленыя некаторыя пратаколы сходаў за перыяд 2000 — 2004 гадоў (ранейшыя праверкі гэтага не заўважалі). Упраўленьне юстыцыі прапанавала грамадзкаму аб'яднаньню "Ветразь" да канца бягучага году «прааналізаваць сітуацыю» і даслаць матэрыялы пра выпраўленьне «недахопаў, якія мелі месца».

***24 лістапада*** пад Гальшанамі былі затрыманыя ***Сяргей Мальчык*** (кіраўнік абласной арганізацыі Партыі БНФ), ***Анатоль Хацько*** (актывіст Партыі працы) і праваабаронца ***Віктар Сазонаў*** быццам бы за парушэньне памежнага рэжыму. Супрацоўнікі ДАІ спынілі іх машыну і суправаджалі ў РУУС Ашмянаў, дзе на іх быў накладзены штраф ў памеры 250 тыс. рублёў. Пасьля гэтага машыну актывістаў апазіцыі ў суправаджэньні міліцэйскіх машын з мігалкамі праводзілі за межы Ашмянскага раёну. Усёй аперацыяй кіравалі людзі ў цывільным, якія ўвесь час перагаворваліся па мабільных тэлефонах і тлумачылі мясцовым супрацоўнікам міліцыі: што і як трэба рабіць.

***1 сьнежня*** Пракуратура Рэспублікі Беларусь узяла тлумачэньні ў дырэктара зарэгістраванага ў Вільні "Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў" (НІСЭПД) Алег Манаева. Старшы сьледчы пракуратуры Беларусі Станіслаў Новікаў выклікаў прафесара Алега Манаева ў сувязі з ягонымі публікацыямі ў "Нашай Ніве" наконт рэйтынгу адзінага кандыдата ад аб'яднанай апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча і ў "Белгазеце" пра рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі. Сьледчы высьвятляў, ці не парушае прафесар Манаеў заканадаўства, дзейнічаючы ад імя закрытай у судовым парадку арганізацыі (у красавіку Вярхоўны суд Беларусі закрыў НІСЭПД паводле зыску Мінюсту, і арганізацыя была вымушаная зарэгістравацца ў Літве). Прафесар Манаеў патлумачыў пракуратуры, што ён дзейнічае як прыватная асоба, навукоўца, які разам з калегамі спрыяе правядзеньню ў Беларусі розных дасьледаваньняў, у тым ліку сацыялагічных апытаньняў.

***2 сьнежня*** кіраўнік выбарчага штабу адзінага кандыдата ад аб'яднаных дэмакратычных сілаў па Гарадзенскай вобласьці Анатоль Хацько, кіраўнік Гарадзенскай філіі Партыі БНФ Сяргей Мальчык і праваабаронца Віктар Сазонаў падалі скаргі ў суд Ашмянскага раёна на рашэньне начальніка Ашмянскага РАУС, які вынес ім пакараньні за парушэньне памежнай зоны. На думку гарадзенскіх актывістаў, дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі Ашмянскага РАУС і ДАІ былі незаконнымі, а вынесенае ім пакараньне (штраф за парушэньне памежнай зоны па 250 000 рублёў кожнаму) беспадстаўным. Гарадзенскія актывісты сьцьвярджаюць, што затрымалі іх не на тэрыторыі памежнай зоны і пад прымусам транспартавалі ў г.

Ашмяны, дзе супрацоўнікі міліцыі, якія не прымалі ўдзелу ў затрыманьні, склалі на іх пратаколы, ня ўзяўшы тлумачэньняў ні ў іх, ні ў супрацоўніка ДАІ, які затрымліваў машыну з гарадзенцамі. Гарадзенскія актывісты лічаць, што іх затрыманьне і пакараньне носіць палітычны характар.

***5 сьнежня*** дырэктар ***"Беллітфонду" Вячаслаў Корбут*** паведаміў, што ў тэрміновым парадку арганізацыя мусіць сплаціць запазыкі арэнднай платы за 2005 год, якія складаюць 17 мільёнаў рублёў. "Беларускі літаратурны фонд" створаны разам з "Саюзам беларускіх пісьменьнікаў", і ўсе ягоныя сябры аўтаматычна становяцца і сябрамі "Літфонду". Ён існуе на пісьменьніцкія складкі, а таксама прыбыткі ад выдавецкай дзейнасьці. - Пасьля таго, як у 1997 годзе Дом літаратара быў гвалтоўна перададзены гаспадарчаму ўпраўленьню Кіраўніцтва справаў прэзідэнта, "Беллітфонду" было выдзелена ў гэтым доме два пакойчыкі, за якія ўстаноўленая вялікая арэндная плата. Запазычанасьць па ёй за гэты год стала прычынай канфлікту "Літфонду" з адміністрацыяй будынку, якая апячатала пакоі "Літфонду". Але праз некалькі гадзінаў доступ на працоўныя месцы супрацоўнікам быў адчынены з умовай аплаты запазычанасьцяў цягам двух дзён. У выпадку невыкананьня гэтае ўмовы дырэктара "Беллітфонду" Вячаслава Корбута папярэдзілі аб скасаваньні дамовы на арэнду памяшканьняў у Доме літаратара.

***9 сьнежня*** ў Менску прайшоў нечарговы сход ***"Саюзу беларускіх пісьменьнікаў"***. На сходзе прысутнічала каля 200 сяброў Саюзу, яны аднагалосна выключылі са свайго аб'яднаньня 12 літаратараў, якія самі вырашылі пакінуць арганізацыю і напісалі заявы. Алесь Пашкевіч пералічыў іх прозьвішчы: "Чаргінец, Марчук, Трахімёнак, Баравікова, Аўруцін, Сульянаў, Марціновіч Алесь, Карызна, Папова, Пазьнякоў, Сакалоўскі Рыгор і Палікаміна". Сход СБП выказаў адзінадушную падтрымку свайму кіраўніцтву на чале з Алесем Пашкевічам. У адмысловай адозве сход канстатаваў "адзінства арганізацыі ў адстойваньні свабоды слова і дэмакратычных прынцыпаў дзяржаваўладкаваньня", заявіў пра свой непакой "катастрафічным звужэньнем сферы ўжываньня беларускай мовы, пратэст супраць чыноўніцкага наступу на незалежныя СМІ, супраць публічных паклёпаў і неабгрунтаванай крытыкі дзейнасьці СБП з боку нядаўніх яго сяброў, якія з прычынаў уласных амбіцый ці ў жаданьні дагадзіць уладзе, абвясьцілі пра стварэньне "правільнага" саюзу пісьменьнікаў".

***13 сьнежня*** Менскі гарвыканкам забараніў правядзеньне ўстаноўчага зьезду грамадзкага аб'яднаньня беларускіх пенсіянераў "Старэйшыны". У сваёй адмове намесьнік старшыні гарвыканкаму Міхаіл Пятрушын спаслаўся на адсутнасьць у горадзе памяшканьня для правядзеньня гэтага зьезду. Адзін з арганізатараў зьезду пенсіянераў Уладзімір Раманоўскі сказаў, што яму і яго калегам адмовілі ў прадастаўленьні памяшканьня адмініст-

рацыі Менскага міжнароднага адукацыйнага цэнтру, палацу культуры “Сукно” і канцэртнай залы “Менск”. На думку Уладзіміра Раманоўскага, улада паступіла амаральна ў адносінах да старэйшынаў беларускага грамадзтва.

**15 сьнежня** гарадзенскія актывісты ***Анатоль Хацько, Сяргей Мальчык*** **і** ***Віктар Сазонаў*** атрымалі лісты з суда Ашмянскага раёну за подпісам судзьдзі Т.В.Емельяновіч, у якіх сказана, што суд Ашмянскага раёна адмаўляе ім у ўзбуджэньні справы па скарзе на пастанову начальніка Ашмянскага РАУС маёра міліцыі Атрашкевіча С.В., спасылаючыся на тое, што адмова зробленая “ в сьвязи с неподсудностью дела суду Ашмянского района Гродненской области”. Аднак гарадзенцы яшчэ ў Ашмянскім РАУС атрымалі інструкцыі, што абскарджваць дзеяньні Ашмянскай міліцыі яны могуць у дзесяцідзённы тэрмін у судзе Ашмянскага раёну. Нагадаем, што гарадзенцы зьвярнуліся ў суд з патрабаваньнем адмяніць штрафы, якія наклаў на іх начальнік РАУСа Ашмянскага райвыканкама за парушэньне памежнай зоны. Гарадзенцы зьбіраюцца абскардзіць гэтае рашэньне у Гарадзенскім абласным судзе.

***15 сьнежня*** Гарадзенскі абласны суд пад старшынствам судзьдзі С.Н.Піпко па заяве ўпраўленьня юстыцыі Гарадзенскага аблвыканкама вырашыў ліквідаваць у прымусовым парадку Гарадзенскае гарадское грамадзкае аб’яднаньне “Таварыства вышэйшай беларускай школы. У заяве ўпраўленьня юстыцыі сказана, што “Таварыства вышэйшай беларускай школы” не прайшло перарэгістрацыю ў сувязі з указам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 траўня 2005 году № 247 “Аб дадатковых мерах па ўпарадкаваньні выкарыстаньня слоў “нацыянальны і беларускі”. Паводле гэтага ўказу, дзейнасьць арганізацый і сродкаў масавай інфармацыі, якія не прайшлі перарэгістрацыю, зьяўляецца незаконнай і забараняецца.

***16 сьнежня*** Міністэрства юстыцыі Беларусі вынесла афіцыйнае папярэджаньне пяці палітычным партыям. ***Партыю БНФ, Беларускую сацыял-дэмакратычную Грамаду, Партыю зялёных, Партыю жанчын “Надзея”*** і ***Патрыятычную партыю*** такім чынам пакаралі за адсутнасьць зарэгістраваных структураў у некаторых рэгіёнах. Прадстаўнікі апазіцыі лічаць, што такім чынам улады, магчыма, рыхтавалі ліквідацыю партыяў. Але ў перыяд прэзідэнцкай выбарчай кампаніі закон забараняе ліквідацыю ці прыпыненьне дзейнасьці партыяў.

***17 сьнежня*** ў сьпецпрыёмнік-разьмеркавальнік у Менску прывезьлі лідэра незарэгістраванай непалітычнай арганізацыі ***“Партнёрства” Міколу Астрэйку***. Справа ў тым, што яшчэ 29 кастрычніка яго затрымалі разам з 70 сябрамі ўстаноўчай канферэнцыі супрацоўнікі сьпецназу. Маскоўскі суд прысудзіў тады Міколу Астрэйку 15 сутак арышту. Але Міколу Астрэйку са сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку «хуткая дапамога» завез-

ла ў шпіталь — у яго была тэмпература і праблемы з ныркамі. Цяпер, калі Мікола Астрэйка паправіўся, супрацоўнікі міліцыі наведалі яго дома, калі там нікога з родных не было, і забралі яго адбываць пакараньне. Мікола Астрэйка мусіць адседзець яшчэ 11 сутак, якія ён не адседзеў з тых 15-ці.

***23 сьнежня*** позна ўвечары па дарозе з Менску ў Гомель дзяржаўтаінсьпекцыяй быў затрыманы на асабістай аўтамашыне кіраўнік рэгіянальнага штабу кандыдата ад аб'яднанай апазіцыі ***Уладзімір Кацора***. Міліцыянтаў зацікавілі паштоўкі, на вонкавым баку якіх было напісана: "Новы 2006 год – Новыя магчымасьці!» На зваротным – віншаваньні Аляксандра Мілінкевіча з надыходзячым Новым годам і Калядамі, пажаданьнем кожнаму паасобку і ўсяму беларускаму народу ўчыненьня надзейяў на добрыя перамены, цьвёрдай веры ў лепшы лёс Беларусі. У спадара Кацоры канфіскавалі 57 тысячаў паштовак. Паводле спадара Кацоры, у затрыманьні ды ператрусе аўтамашыны ўдзельнічала 7-8 міліцыянтаў. Дагляд вяла група следчага Івана Яўтушэнкі, а кіраваў усім падпалкоўнік Холапаў. Начальнік Жлобінскай міліцыі Алег Прахарэнка паведаміў, што пасьля праверкі справа пра затрыманьне паштовак будзе перададзеная ў суд.

***27 сьнежня*** Гарадзенскі абласны суд па ініцыятыве ўпраўленьня юстыцыі аблвыканкаму ліквідаваў гарадзкое грамадзкае аб'яднаньне "Таварыства вышэйшай беларускай школы". Кіраўнік арганізацыі – прафесар Алесь Астроўскі – ня быў нават запрошаны ў суд, ён толькі атрымаў па пошце судовае рашэньне. У заяве ўпраўленьня юстыцыі, прадстаўленай у суд, адзначалася: грамадзкае аб'яднаньне "Таварыства вышэйшай беларускай школы" не прайшло перарэгістрацыю ў сувязі з указам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 траўня 2005 году № 247 "Аб дадатковых мерах па ўпарадкаваньні выкарыстаньня слоў "нацыянальны" і "беларускі". У судзе прадстаўнік Гарадзенскага аблвыканкаму настойваў, што далейшая дзейнасьць арганізацыі зьяўляецца незаконнай і таму павінна быць забароненай.

***27 сьнежня*** Міністэрства юстыцыі паўторна заявіла пра "грубыя парушэньні патрабаваньняў закону з боку шэрагу палітычных партыяў". У гэтым месяцы Мінюст ужо вынес пісьмовыя папярэджаньні за парушэньне артыкулу 10 закону "Аб палітычных партыях***" Беларускай партыі зялёных, Беларускай Сацыял-дэмакратычнай партыі "Грамада", Партыі БНФ і Беларускай патрыятычнай партыі***. Паводле новай рэдакцыі закону "Аб палітычных партыях", прынятай у ліпені, кожная партыя павінна мець менскую гарадзкую, а таксама рэгіянальныя арганізацыі ня менш як у чатырох абласьцях краіны. У папярэджаных Мінюстам партыяў у некаторых абласьцях такіх структураў не было. У паведамленьні, апублікаваным на інтэрнэт-сайце міністэрства, адзначаецца, што "некаторыя палітычныя партыі ігнаруюць патрабаваньні дзеючага заканадаўства". У сувязі з гэтым, гаво-

рыцца ў паведамленьні, міністэрства “вымушанае паўторна зьвярнуць увагу палітычных партыяў на неабходнасьць дзейнічаць у дакладнай адпаведнасьці з заканадаўствам Беларусі і сваімі статутамі”.

***28 сьнежня грамадзкае аб’яднаньне “Прыватныя ініцыятывы”*** атрымала ліст з аддзелу па кіраваньні камунальнай уласнасьцю ўпраўленьня эканомікі Віцебскага гарадзкога выканаўчага камітэту, у якім прапануецца “перапыніць дамову арэнды” офісу. На думку старшыні арганізацыі Сяргея Шэлегава, гэты адказ падводзіць рысу пад спробамі захаваць памяшканьне, дзе дагэтуль былі “прапісаныя” “Прыватныя ініцыятывы”. Восеньню нечакана высьветлілася, што “Прыватныя ініцыятывы” ад 13 ліпеня “незаконна” знаходзяцца ў офісе, які займаюць ужо шмат гадоў. Таму УП “ЖРЭТ Першамайскага раёну” прапанаваў прадстаўнікам НДА вызваліць памяшканьне. Двойчы офіс апячатвалі. Кіраўніцтва “Прыватных ініцыятываў” два разы зьярталася ў гарвыканкам, каб выправіць становішча. Аднак мясцовыя чыноўнікі ад ідэалогіі не пайшлі насустрач просьбам НДА. Такія адносіны ўладаў да нас сьведчаць пра тое, што яна ня надта ахвочая да дыялогу з недзяржаўным сектарам наогул і не імкнецца зразумець патрэбы грамадзкіх арганізацыяў”, – лічыць С. Шэлегаў.

***30 сьнежня*** старшы сьледчы пракуратуры Беларусі Станіслаў Новікаў выклікаў дырэктара зарэгістраванага ў Вільні “***Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў”*** Алега Манаева і ўручыў яму папярэджаньне аб недапушчэньні парушэньня заканадаўства. Дакумент падпісаны намесьнікам генеральнага пракурора Мікалаем Купрыянавым, які сьцьвярджае, што праверкай выяўлена, што нягледзячы на тое, што НІСЭПД пазбаўлены ў Беларусі рэгістрацыі, спадар Манаеў працягвае праводзіць апытаньні грамадзкай думкі. “У выпадку паўтарэньня парушэньняў устаноўленага парадку правядзеньня сацапытаньняў у перыяд падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь вашыя дзеяньні будуць расцэненыя як парушэньне заканадаўства, за што вы можаце быць прыцягнутымі да адказнасьці”,— сьцьвярджаецца ў папярэджаньні пракуратуры. Прафесар Манаеў лічыць гэтае папярэджаньне неабрунтаваным, бо ў пракуратуры спасылаюцца на пастанову Саўміну, якая рэгулюе парадак акрэдытацыі юрыдычных асобаў, што праводзяць сацапытаньні, ён жа займаецца імі як прыватная асоба, што не рэгулюецца ніякім заканадаўствам.

***30 сьнежня*** ноччу на Маскоўскім праспекце Віцебску міліцыянты спынілі машыну кіраўніка Віцебскага штабу адзінага прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта ад апазіцыі Хрыстафора Жэляпава і правялі несанкцыянаваны дагляд. Пакуль адны міліцыянты рабілі несанкцыянаваны дагляд, іншыя апытвалі спадара Жэляпава ў Кастрычніцкім райаддзеле. Тамсама яго папрасілі напісаць тлумачэньне, адкуль у яго матэрыялы пра Аляк-

сандра Мілінкевіча, ягоныя навагоднія віншаваньні для беларускіх грамадзянаў і інструкцыі, прызначаныя зьбіральнікам подпісаў. Хрыстафор Жэляпаў настояў, каб у дакуменце было зафіксавана, што дагляд рабіўся без адпаведных санкцыяў.

***30 сьнежня*** Міністэрства юстыцыі Беларусі зарэгістравала грамадзкае аб'яднаньне ***"Саюз пісьменьнікаў Беларусі"*** пад старшынствам сябра Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі ***Мікалая Чаргінца.*** Кіраўніцтва "Саюзу беларускіх пісьменьнікаў" на чале з ***Алесем Пашкевічам*** зьбіраецца зьвярнуцца ў Мінюст па тлумачэньні: на якой падставе зарэгістраванае гэтае літаратурнае аб'яднаньне, калі ў 1996 годзе папраўкамі ў законе "Аб грамадзкіх арганізацыях" назва краіны для выкарыстаньня было забароненае.

***31 сьнежня*** ў Жодзіне ліквідаваная ***гарадзкая арганізацыя "Таварыства беларускай мовы"*** па рашэньні гарвыканкаму. Як паведаміў старшыня арганізацыі Аляксей Лапіцкі, прэтэнзіі жодзінскіх уладаў зьвязаныя з юрыдычным адрасам арганізацыі, якая была "прапісана" у жыльлёвым фондзе гораду: "З пачатку ўтварэньня гарадзкой арганізацыі мы зьвярталіся ў гарвыканкам для таго, каб атрымаць памяшканьне. У нас у горадзе было памяшканьне, вылучанае для пазакласнай працы з дзецьмі – чатырохпакаёвая кватэра, вылучаная з жыльлёвага фонду. І мы хацелі, каб на праспекце Францішка Скарыны ў горадзе Жодзіна быў офіс "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны". І каб ён меў магчымасьць арэнды на ільготных умовах. Але нам пастаянна ўсе гэтыя гады і не прапаноўвалі, і не давалі гэтае памяшканьне". Як мяркуе Аляксей Лапіцкі, у жодзінскіх уладаў была і яшчэ адна прычына для скасаваньня рэгістрацыі мясцовай арганізацыі ТБМ – гэта распачатая кампанія выбараў прэзідэнта: "Яны за месяц да фармаваньня камісіяў робяць палітычную замову на ліквідацыю арганізацыі, якая вельмі актыўна працавала на выбарах, вылучала людзей для назіраньня і ў камісіі".

# 8. Перасьлед арганізатараў і ўдзельнікаў масавых акцыяў пратэсту. Парушэньне правоў грамадзянаў на мірныя сходы

***30 студзеня***, роўна праз месяц пасьля несправядлівага прысуду ***Міхаілу Марынічу***, у некалькіх гарадах краіны апазіцыйна настроеныя грамадзяне выстраіліся ў "Ланцуг неабыякавых людзей". У Віцебску на плошчу Свабоды прыйшлі каля 35 мясцовых грамадзкіх і палітычных актывістаў, якія патрабавалі ад уладаў вызваленьня Міхаіла Марыніча. На саракавой

хвіліне пікету міліцыянты паспрабавалі спыніць недазволенае мерапрыемства, аднак апазіцыянеры не паддаліся ціску і працягнулі акцыю. Агулам пікет доўжыўся запланаваныя 60 хвілінаў.

З ***2 лютага*** старшыні Гарадзенскага аддзяленьня Партыі БНФ ***Сяргею Мальчыку*** забаронены выезд за мяжу. Палітык не сплаціў штраф за ўдзел у несанкцыянаваным шэсьці ў гонар братоў Каліноўскіх 31 кастрычніка 2004 году ў раённым цэнтры Сьвіслач — 70 “базавых велічыняў”. С.Мальчык атрымаў копію прадстаўленьня суда Ленінскага раёну Гародні, у якім той зьвяртаецца да УУС аблвыканкаму з просьбай абмежаваць правы Сяргея Мальчыка на выезд за межы Беларусі. Рашэньне было прынятае без удзелу партыйнага актывіста ў судовым працэсе.  С. Мальчык зьбіраецца абскарджваць гэтае рашэньне ў судзе.

***5 лютага*** больш за дзесяць амапаўцаў і асобы ў цывільным уварваліся ў арэндаваную дэпутатам Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня Сяргеем Антончыкам прыватную кватэру, дзе сабраліся грамадзкія актывісты з розных рэгіёнаў Беларусі. Міліцыя затрымала ***Сяргея Антончыка***, ягоную жонку Тамару і яшчэ каля 20 грамадзкіх актывістаў. Усе затрыманыя знаходзіліся ў аддзеле міліцыі Савецкага раёну, дзе міліцыянты спраўджвалі асобы затрыманых. Пасьля таго, як на Антончыка склалі пратакол за арганізацыю несанкцыянаванага сходу (арт. 167.1 ч.2 КаАП РБ), ён быў адпушчаны.

***5 лютага*** віцебскі сябра КХП-БНФ ***Уладзімір Плешчанка*** пасьля спробаў міліцыі затрымаць яго трапіў у кардыялагічны шпіталь. Міліцыянты зьявіліся каля так званага “Сіняга дому “, калі сябры партыі выйшлі туды з плакатам “Ствараецца ініцыятыўная група дзеля вылучэньня Зянона Пазьняка на пасаду прэзідэнта”. Супрацоўнікі праваахоўных органаў спрабавалі затрымаць Плешчанку, і пасьля гутаркі з імі яму зрабілася дрэнна з сэрцам. Уладзімір Плешчанка мае групу інваліднасьці па сардэчных хваробах. У Чыгуначны райаддзел міліцыі быў дастаўлены ***Барыс Хамайда***, якога затрымалі з асобнікамі газетаў “Выбар” і “БДГ”, якія ён распаўсюджваў, але яго неўзабаве адпусьцілі.

***7 лютага*** ў судзе Савецкага раёну Менску пачаўся судовы разгляд справы Сяргея Антончыка за арганізацыю несанкцыянаванага сходу 5 лютага ў арэндаванай прыватнай кватэры, дзе сабраліся грамадзкія актывісты з розных рэгіёнаў Беларусі. Суд палічыў неабходным заслухаць сьведкаў, у тым ліку – супрацоўнікаў міліцыі, якія складалі пратаколы аб адміністрацыйным затрыманьні, таму разгляд быў перанесены на 14 лютага. Юрыст ***Валянцін Стэфановіч*** лічыць грубым парушэньнем Канстытуцыі тое, што здарылася з Сяргеем Антончыкам і ягонымі аднадумцамі, паколькі Канстытуцыя Беларусі гарантуе ўсім грамадзянам свабоду сходаў: “Гэта асабістая спра-

ва кожнага чалавека – зьбірацца на кватэры, абмяркоўваць і рабіць, што лічыць патрэбным. У тым ліку і абмяркоўваць пытаньні грамадзка-палітычнага жыцьця краіны". Паводле праваабаронцы, новая рэдакцыя закону аб масавых мерапрыемствах неабгрунтавана шырока трактуе паняцьце сходу. "Цяпер сходам лічыцца нават тое, што людзі сабраліся на кватэры", – нагадаў Валянцін Стэфановіч. — Аднак закон патрабуе ад міліцыянтаў прадставіць доказы, што было пэўнае парушэньне. Міліцыянты не патлумачылі, чым могуць пацьвердзіць, што Антончык праводзіў несанкцыянаваны сход. Паводле тлумачэньняў, якія ўзялі ў грамадзянаў, яны сабраліся, каб папіць гарбаты і ніякіх сходаў там не праводзілася. Таму мы расцэньваем гэтыя дзеяньні ўладаў як абсалютна незаконныя".

***7 лютага*** стала вядома, што ўдзельнікаў антырэферэндумных акцыяў пратэсту 18 і 19 кастрычніка 2004 году ў Менску пачалі выклікаць на допыты ў міліцыю. Сьледчыя цікавяцца ня толькі падрабязнасьцямі кастрычніцкіх падзеяў, але і тым, чаму хлопцы і дзяўчаты сталі сябрамі незарэгістраваных апазіцыйных арганізацыяў, хто іх фінансуе, чым займаюцца іх бацькі і г.д. На допыты выклікалі актывіста БСДГ Міколу Арцюхова, маладафронтаўцаў Аляксея Шэіна, Паўла Красоўскага, Насту Азарку, Ірыну Пярвойкіну, Артура Фіњкевіча, Ігара Каткоўскага і лідэра Партыі свабоды Сяржука Высоцкага.

***10 лютага*** супрацоўнікамі міліцыі быў дапытаны лідэр ***Барысаўскай грамадзянскай ініцыятывы "Волат"*** Дзьмітрый Бародка ў сувязі з ягоным удзелам у акцыях пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў парламенцкіх выбараў і рэферэндуму, якія адбыліся ў Менску 18-20 кастрычніка 2004 году. У гэтыя дні па факце масавых выступленьняў апазіцыі была ўзбуджаная крымінальная справа. Дзеля таго, каб дапытаць Дзьмірыя Бародку, супрацоўнікі міліцыі Барысаўскага ГУУС прыехалі да яго дадому. Супрацоўніка Барысаўскага ГУУС, лейтенанта міліцыі Уланава цікавіла, як Дзьмітрый Бародка апынуўся ў Менску ў пасьлярэферэндумныя дні, з кім дамаўляўся пра ўдзел у акцыях пратэсту, хто ў іх удзельнічаў, як адбывалася ягонае затрыманьне 20 кастрычніка на Кастрычніцкай плошчы ў Менску. Нагадаем, што за ўдзел у акцыях пратэсту супраць падтасовак вынікаў выбараў і рэферэндуму Зьміцер Бародка быў асуджаны на 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Міліцыянта таксама цікавіла, дзе працуе Бародка і за якія сродкі існуе.

***10 лютага*** з-за эпідэміі грыпу быў забаронены мітынг супраць падвышэньня камунальных плацяжоў, які мусіў адбыцца ў Гомелі 12 лютага. Менавіта такую прычыну назваў гомельскі гарвыканкам. Заяўку на правядзеньне мітынгу падаваў дэпутат гомельскага гарсавету Юры Глушакоў, аб сваім удзеле ў ім заявілі шэраг структураў грамадзянскай супольнасьці, якія займаюцца вырашэньнем сацыяльных праблемаў насельніцтва.

***14 лютага*** экс-дэпутат Палаты прадстаўнікоў, генерал ***Валеры Фралоў*** быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі ў сябе дома і дастаўлены ў Ленінскі РУУС г. Гародні дзеля “размовы” з начальнікам раённага аддзелу ўнутраных справаў. У адзьдзяленьні міліцыі на яго быў складзены пратакол за арганізацыю несанкцыянаванага масавага мерапрыемства — акцыі пратэсту ў Гародні ў дзень агульнарэспубліканскага страйку прадпрымальнікаў 10 лютага. Пратакол адразу быў перададзены ў суд. Судзьдзя суда Ленінскага раёну г. Гародні вынесла рашэньне пакараць В. Фралова штрафам ў 300 базавых велічыняў (прыкладна 3 300 даляраў ЗША). В.Фралоў адмаўляе сваю датычнасьць да арганізацыі акцыі пратэсту. Па ягоных словах, суд доказам ягонай вінаватасьці палічыў подпіс генерала на ўлётцы, у якой прадпрымальнікаў заклікалі сабрацца 10 лютага ў цэнтральным парку г. Гародні. Да таго ж 10 лютага В. Фралова ўвогуле не было ў Гародні – у гэты дзень ён знаходзіўся ў Менску. На той жа ўлётцы былі таксама подпісы кіраўніка арганізацыі “Гарадзенскі выбар” Дзьмітрыя Іваноўскага і дэпутата Палаты прадстаўнікоў другога скліканьня, лідэра парламенцкай групы “Рэспубліка” Сяргея Скрабца.

***14 лютага*** працягваўся суд над ***Сяргеем Антончыкам***, які быў затрыманы разам з двума дзясяткамі чалавек у прыватнай кватэры 5 лютага. Тады на С.Антончыка быў складзены пратакол за арганізацыю несанкцыянаванага сходу. Першае судовае паседжаньне адбылося 7 лютага. Паколькі Сяргей Антончык заявіў хадайніцтва, каб дапыталі некалькіх сьведкаў, далейшы разгляд справы перанесьлі на 14 лютага. Але і гэтым разам канчатковае рашэньне ў справе не было вынесенае. Судзьдзя Аксана Рэлява зачытала паказаньні ўсіх сьведкаў і пратакол, паводле якога Сяргей Антончык парушыў грамадзкі парадак, бо арганізаваў несанкцыянаваны ўладамі сход, і абвесьціла перапынак да 21 лютага. Сяргей Антончык у судзе заявіў, што падаў скаргу ў пракуратуру на дзеяньні міліцыянтаў.

***24 лютага*** судзьдзя Савецкага р-ну г. Менску Аксана Рэлява прызнала ***Сяргея Антончыка*** вінаватым у арганізацыі несанкцыянаванага сходу ў арандаванай ім прыватнай кватэры. Згодна з ч. 2 арт. 167.1 КаАП Рэспублікі Беларусь, С. Антончык быў падвергнуты адміністрацыйнаму штрафу ў памеры 150 базавых адзінак. Паводле судзьдзі А. Рэлявы, паколькі кватэра была арандаваная, прысутнасьць у ей некалькіх грамадзянаў трэба кваліфікаваць як несанкцыянаваны сход. Гэта ўжо другі выпадак прыцягненьня да адміністрацыйнай адказнасьці С. Антончыка за арганізацыю несанкцыянаваных сходаў у закрытых памяшканьнях.

***27 лютага*** невядомыя людзі ў цывільным затрымалі дэпутата Палаты прадстаўнікоў другога скліканьня ***Сяргея Скрабца***, які прыехаў у Гародню, каб сустрэцца са студэнтамі ў інтэрнаце медыцынскага універсітэту. Студэнты паставілі свае подпісы за вылучэньне яго кандыдатам у дэ-

путаты Палаты прадстаўнікоў па 52-й Гарадзенскай-Цэнтральнай акрузе, аднак камісія не зарэгістравала прэтэндэнта, спаслаўшыся на 81 выбаршчыка, якія адклікалі свае подпісы. Гэтыя выбаршчыкі пражываюць у студэнцкім інтэрнаце. Затрыманьне Сяргея Скрабца адбылося каля дому генерала Валерыя Фралова на вуліцы Сьвярдлова. Пакінуўшы дом, ён сеў у машыну, але яе "падрэзала" другая машына, з якой выйшлі людзі ў цывільным. Паводле сп.Фралова, за ягоным домам сочаць і праслухоўваюць ягоны тэлефон. Ён лічыць, што толькі таму міліцыянты ведалі, дзе знаходзіцца С.Скрабец, якога, хутчэй за ўсё, хочуць пакараць за мітынг гарадзенскіх прадпрымальнікаў, які адбыўся 10 лютага. Напярэдадні мітынгу ў горадзе зьявілася ўлётка, пад якой, у прыватнасьці, стаялі прозьвішчы Фралова і Скрабца. Самога В.Фралова за ўлётку пакаралі штрафам на суму 7 мільёнаў 200 тысяч рублёў (300 базавых велічыняў). Сяргея Скрабца даставілі ў Ленінскі райаддзел міліцыі і зьмясьцілі ў ізалятары часовага утрыманьня, дзе ён правёў ноч.

***28 лютага*** ў Гародні былога лідэра дэпутацкай групы "Рэспубліка" ***Сяргея Скрабца*** аштрафавалі на 200 базавых велічыняў (4 мільёны 800 тысяч рублёў) за мітынг гарадзенскіх прадпрымальнікаў. Напярэдадні несанкцыянаванага мітынгу была распаўсюджаная ўлётка з заклікам правесьці аднадзённы страйк. Пад ёй былі тры прозьвішчы – аднаго з лідэраў прадпрымальнікаў Дзьмітрыя Іваноўскага, генерала Валерыя Фралова і Сяргея Скрабца. Судзьдзя Наталя Козел адміністрацыйную справу разгледзела хутка. Хаця Сяргей Скрабец не прызнаў, што быў арганізатарам мітынгу, судзьдзі было досыць ягонага прозьвішча ва ўлётцы.

**28 лютага** намесьнік старшыні грамадзкага аб'яднаньня ***"Перспектыва"*** Дзмітрый Іваноўскі асуджаны на 15 сутак арышту. Такое рашэньне вынесла судзьдзя суда Ленінскага раёну Гародні Наталя Козел. Д.Іваноўскага абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу гарадзенскіх прадпрымальнікаў, што адбыўся 10-га лютага. Напярэдадні акцыі на гарадзенскіх рынках распаўсюджваліся ўлёткі з заклікам прыняць удзел у акцыі пратэсту. Гэтую улётку падпісалі Валерый Фралоў, Сяргей Скрабец, а таксама Дзьмітрый Іваноўскі.

***1 сакавіка*** пасьля заканчэньня мітынгу прадпрымальнікаў у Менску супрацоўнікамі міліцыі была затрыманая актывістка АГП ***Марына Багдановіч***. Падставай для затрыманьня паслужыла "неабходнасьць высьвятленьня асобы". Марыну Багдановіч даставілі ў РУУС Цэнтральнага р-ну г. Менску, дзе супрацоўнікі міліцыі склалі на яе пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні па арт. 167.1 КаАП Рэспублікі Беларусь (парушэньне парадку правядзеньня і арганізацыі масавых мерапрыемстваў).

***2 сакавіка*** суд Цэнтральная раёну г. Менску прызнаў актывістку АГП

***Марыну Багдановіч*** вінаватай у парушэньні арт. 167.1 КаАП РБ і пакараў удзельніцу акцыі пратэсту прадпрымальнікаў штрафам у памеры 200 базавых адзінак (болей за 2 тысячы даляраў ЗША).

***11 сакавіка*** на Кастрычніцкай плошчы Менску прайшла акцыя пад лозунгам “Свабоду палітзьняволеным!”. Каля 50 актывістаў палітычных партыяў і рухаў выйшлі ў цэнтр гораду з партрэтамі беларускага палітзьняволенага ***Міхаіла Марыніча***, які адбывае пакараньне ў аршанскай калоніі №8. Некалькі дзён таму палітзьняволены па віне адміністрацыі калоніі, якая не аказала 65-гадоваму палітыку неабходнай медыцынскай дапамогі, перанёс інсульт. Акцыя працягвалася каля гадзіны і прыцягнула вялікую ўвагу супрацоўнікаў праваахоўных органаў: на плошчы прысутнічала ўся “вярхушка” ГУУС Менгарвыканкаму. Затрыманыя трое ўдзельнікаў акцыі. Двое – Вераніка Лазоўская і Дзьмітрый Дубіцкі – за тое, што трымалі ў руках расцяжку “Свабоду палітзьняволеным!” і Максім Вінярскі – затрыманы па дарозе ў арадзкі аддзел міліцыі, куды ён ішоў патрабаваць вызваленьня сваіх сяброў.

***18 сакавіка*** на Кастрычніцкай плошчы Менску адбылася чарговая акцыя ў падтрымку палітзьняволеных. Удзельнікі дамагаюцца вызваленьня ***Міхаіла Марыніча,*** лідэраў прадпрымальніцкага руху Валерыя Леванеўскага, Аляксандра Васільева і Анатоля Шумчанкі, а таксама пакараных адміністрацыйным арыштам маладафронтаўцаў Зьміцера Дашкевіча, Артура Фінькевіча і і актывіста “Зубра” Максіма Вінярскага.

***22 сакавіка*** суд Цэнтральнага раёну Гомелю разглядаў пазоў дэпутата гарсавету Юрася Глушакова і сяброў ***сацыяльнага руху “Разам!”*** да гарадзкога выканаўчага камітэту. Дэпутат Глушакоў са сваімі паплечнікамі дамагаўся, каб суд абавязаў гарвыканкам дазволіць мітынг гараджанаў супраць павышэньня камунальных плацяжоў, прымусовых кантрактаў, увядзеньня платнай адукацыі і медыцыны. Судзьдзя пазоў дэпутата ды ягоных паплечнікаў вырашыў пакінуць без разгляду на той падставе, што яны не абскарджвалі рашэньне гарвыканкаму пра забарону мітынгу ў абласным выканкаме.

***22 сакавіка*** на Кастрычніцкай плошчы Менску сабралася 35 чалавек, якія расьцягнуліся ланцугом уздоўж плошчы і стаялі, трымаючы ў руках партрэты ***Міхаіла Марыніча***, а таксама зьняволеных лідэраў прадпрымальніцкага руху Валерыя Леванеўскага, Аляксандра Васільева і Анатоля Шумчанкі. Пасьля заканчэньня акцыі міліцыянты затрымалі каардынатараў “Хартыі–97” Зьміцера Бандарэнку і руху “Зубр” Мікіту Сасіма. Іх адвезьлі ў РУУС Цэнтральнага раёну. На Зьміцера Бандарэнку і Мікіту Сасіма ў міліцэйскім пастарунку былі складзеныя пратаколы па артыкулах 156 і 166 Адміністрацыйнага кодэксу – “непадпарадкаваньне патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі” і “хуліганства”.

***23 сакавіка*** судзьдзя Цэнтральнага раёну г. Менску Аляксей Бычко асудзіў актывіста “Зубра” ***Мікіту Сасіма*** на 10 сутак адміністрацыйнага арышту. Каардынатар грамадзянскай ініцыятывы “Хартыя’97” Зьміцер Бандарэнка таксама пакараны Аляксеем Бычко арыштам на 10 сутак. Яны прызнаныя вінаватымі ў парушэньні арт. 156 и 166 КаАП (дробнае хуліганства і непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі). Зьміцер Бандарэнка і Мікіта Сасім былі затрыманыя пасьля акцыі “Свабоду палітвязьням!”, якая адбывался напярэдадні на Кастрычніцкай плошчы ў Менску.

***25 сакавіка*** навучэнцаў старэйшых класаў большасьці менскіх школаў і прафесійна-тэхнічных вучэльняў, а таксама студэнтаў ВНУ па загадзе адміністрацыяў навучальных установаў не адпускалі з заняткаў да трох-чатырох гадзінаў дня, каб яны не далучыліся а акцыі на Кастрычніцкай плошчы сталіцы. Некаторых студэнтаў наўпрост папярэджвалі пра недапушчальнасьць удзелу ў апазіцыйных акцыях, прымеркаваных да Дня Волі. У Міністэрстве адукацыі запэўніваюць, што ніякіх загадаў з гэтай нагоды падначаленым навучальным установам не давалі, аднак удакладняюць: адміністрацыі школаў і ВНУ самі могуць карэктаваць расклад заняткаў.

***25 сакавіка*** ў Менску адбылася акцыя, прымеркаваная да Дня Волі, падчас якой удзельнікі патрабавалі адстаўкі А. Лукашэнкі. На плошчу іх заклікаў вядомы палітык ***Андрэй Клімаў***. Цэнтр Менску быў блакаваны ўзмоцненымі сіламі АМАПу і вайскоўцаў — больш за два дзясяткі аўтобусаў з амапаўцамі стаялі вакол Кастрычніцкай плошчы, паўтары дзясяткі машын з унутранымі войскамі дзяжурылі каля прэзідэнцкай адміністрацыі. Былі таксама службовыя сабакі і тэхніка Міністэрства надзвычайных сітуацыяў. Сілы дэманстрантаў былі больш сьціплымі — каля 2 тысячаў актывістаў апазіцыі. Людзі прайшлі з нацыянальнымі беларускімі сьцягамі і сьцягамі Еўразьвязу, аранжавымі стужкамі і лозунгамі ў абарону палітзьняволеных. Аднымі зь першымі на Кастрычніцую плошчу выйшлі прадпрымальнікі з асацыяцыі “Персьпектыва” з партрэтамі затрыманага лідэра арганізацыі Анатоля Шумчанкі і іншых палітвязьняў. Яны выказалі незадаволенасьць адказам Лукашэнкі на іх патрабаваньні. Арганізатар акцыі Андрэй Клімаў прыйшоў каля 15-й гадзіны, аднак шэрагі АМАПу не далі яму магчымасьці ступіць на плошчу, як і сотням іншых ўдзельнікаў акцыі. Большасьць з іх была блакаваная на ходніках прасьпекту Скарыны, разьдзеленая шэрагамі АМАПу на часткі і выціснутая з плошчы. Андрэй Клімаў прызнаў, што яму разам з іншымі давялося адступіць, але не па сваёй волі. Падчас процістаяньня дэманстрантаў і АМАПу было некалькі лакальных сутычак, адзін раз дэманстранты пачалі кідаць у міліцэйскія шэрагі сьнег і лёд. Міліцыя ў адказ пачала затрыманьні. Затрыманымі былі запоўненыя некалькі аўтобусаў, ёсьць зьбітыя і пацярпелыя ад дзеяньняў міліцыі. Некалькі дзясяткаў чалавек дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага р-ну г. Менску.

***25 сакавіка*** ў Віцебску палітычныя партыі, грамадзкія арганізацыі ды ініцыятывы адзначылі Дзень Волі некалькімі вулічнымі мерапрыемствамі. Зранку на галоўных вуліцах гораду зьявіліся ўлёткі з творамі вядомых беларускіх паэтаў, прысьвечаныя роднаму краю, нацыянальнай годнасьці. У другой палове дня “лятучая” брыгада на розныя галасы чытала вершы, расклееныя на прыпынках грамадзкага транспарту. Увечары каля 40 прадстаўнікоў “Новай плыні” ды іншых моладзевых нефармальных аб’яднаньняў прайшлі па цэнтру Віцебску да помніку Уладзіміру Караткевічу, дзе прадэкламавалі патрыятычную паэзію ды ўсклалі кветкі. Міліцыя спрабавала сарваць гэтую культурніцкую імпрэзу, але моладзь аказалася рашучай і не дапусьціла супрацьзаконнага ціску. Апоўдні 4 сябры Кансерватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ з разгорнутымі бел-чырвона-белымі сьцягамі і віншавальным плакатам прайшлі па цэнтры гораду, але ім не ўдалося зладзіць ніякай сьвяточнай акцыі, бо амаль адразу ж яны былі дастаўленыя ў Кастрычніцкі РУУС, а адтуль — у суд. Ігару Мацьвееву, Алесю Салаўяну і Барысу Хамайду вынесьлі папярэджаньні. Алесь Пазьняк, які падчас мерапрыемства трымаў плакат, пакараны ня быў.

***25 сакавіка*** старшыня каардынацыйнай рады магілёўскага Агенцтва рэгіянальнага разьвіцьця і міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ***Зьміцер Салаўёў*** з сябрамі наладзіў традыцыйнае гуляньне па вуліцах роднага гораду з віншаваньнямі сустрэчных са сьвятам і кароткім расповедам пра 25 сакавіка. З сабой яны несьлі валізку апельсінаў і стосік віншавальных улётак. Але павіншаваць грамадзкія актывісты пасьпелі толькі некалькіх міліцыянтаў на чале з начальнікам аддзела аховы грамадзкага парадку УУС аблвыканкаму падпалкоўнікам Ермаковым. Былі затрыманыя шэсьць удзельнікаў акцыі, сярод якіх — кіраўнік гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ Віталь Макаранка і актывіст “Маладога Фронту” Сяргей Нягацін. Затрыманыя былі дастаўленыя ў бліжэйшы пастарунак, дзе з кожнага ўзялі пісьмовае тлумачэньне наконт таго, ці не яны зьяўляюцца тымі невядомымі людзьмі, якія папсавалі цокальныя паверхі ў цэнтры гораду фарбавымі графіці “Жыве Беларусь!”. Працэдура высьвятленьня асобаў затрыманых і зьняцьця паказаньняў заняла некалькі гадзінаў. У той жа вечар пасьля сканчэньня рабочага дня каля свайго прадпрыемства быў затрыманы старшыня абласной арганізацыі Партыі БНФ Рыгор Костусёў. “Аперацыю” па яго дастаўцы ў Кастрычніцкі РУУС зьдзейсьнілі трое супрацоўнікаў АМАПу на чале з капітанам Волкавым. Як высьветлілася, Р. Костусёў спатрэбіўся міліцыі таксама ў сувязі з пошукам аўтараў усё тых жа графіці. Пасьля высьвятленьня таго відавочнага факту, што адным з іх Кастусёў ня мог быць і напісаньня пісьмовага тлумачэньня на гэты конт, актывіста адпусьцілі.

***28 сакавіка*** ў судзе Цэнтральнага раёну г. Менску пачаліся суды над затрыманымі ўдзельнікамі акцыі 25 сакавіка.

1. ***Канстанцін Кароль*** – 5 сутак адміністрацыйнага арышту. Старшыня суда Цэнтральнага раёну Мікалай Самасейка, выносячы такое пакараньне, нават ня ўлічваў, што К. Каралю дактары паставілі дыягназ “чэрапна-мазгавая траўма” – вынік зьбіцьця ў “аўтазаку” пасьля затрыманьня. У суботу, 26 сакавіка, у сьпецпрыёмнік на Акрэсьціна была выкліканая “хуткая дапамога”, якая даставіла К.Караля ў бальніцу, дзе быў пастаўлены дадзены дыягназ. Падчас судовага паседжаньня К. Кароль паведаміў, што супрацоўнік АМАП ГУУС Менгарвыканкаму Ахрамовіч, які выступаў у якасьці сьведкі, пагражаў выкарыстаць катаваньні — у аўтобусе, дзе знаходзіліся затрыманыя ўдзельнікі акцыі, ён спрабаваў вырваць у Канстанціна пірсінг. Гэтая акалічнасьць не была ўзятая пад увагу судом.

2. ***Дзяніс Краўчонак*** — 5 сутак адміністрацыйнага арышту (рашэньне вынес старшыня суда Мікалай Самасейка);

3. ***Аляксей Падневіч*** — 3 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Ільліна);

4. ***Карэн Акопаў*** — 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Суд адмовіў яму ў задавальненьні хадайніцтва пра выклік у суд сьведкаў затрыманьня. Рашэньне пра арышт вынес судзьдзя Аляксей Бычко.

5. ***Георгі Байкоў*** — 5 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Есьман);

6. ***Ігар Новікаў*** — адміністрацыйны арышт на 3 сутак (судзьдзя Каралькова);

7. ***Анатоль Ціхановіч*** — 10 сутак адміністрацыйнага арышту (старшыня суда Цэнтральнага раёну Мікалай Самасейка);

8. ***Аляксандр Хаперскаў*** – 3 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Вера Грабоўская-Дайнэка);

9. ***Сяргей Бежанаў*** – 3 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Есьман);

10. ***Іван Быкоўскі*** — 3 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя – старшыня суда Мікалай Самасейка);

11. ***Вадзім Таптуноў*** — 10 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя – старшыня суда Мікалай Самасейка);

12. ***Юры Бугаёў*** – 3 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя – старшыня суда Мікалай Самасейка);

13. ***Віктар Савіцкі*** – штраф памерам 50 базавых адзінак (судзьдзя – старшыня суда Мікалай Самасейка);

14. ***Вячаслаў Сіўчык*** – 15 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Аляксей Бычко);

15. ***Павел Мятліцкі*** – 3 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Інга Лабыніч);

16. ***Зьміцер Гарбуноў*** — штраф памерам 50 базавых адзінак (судзьдзя – старшыня суда Мікалай Самасейка);

17. ***Алег Мінулін*** — 3 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Аляксей Бычко);

18. ***Пётр Сакольчык*** — 3 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя – старшыня суда Мікалай Самасейка);

19.***Уладзіслаў Бародка*** — 3 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Інга Лабыніч);

20. ***Сяргей Логінаў*** — 7 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Аляксей Бычко);

21. ***Юры Фабішэўскі*** — 15 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя – старшыня суда Мікалай Самасейка);

22. ***Валянцін Семак*** – штраф у памеры 50 базавых велічынь (судзьдзя Аляксей Бычко);

23. ***Андрэй Баранаў*** — 15 сутак адміністрацыйнага арышту (судзьдзя Аляксей Бычко). А. Баранаў быў дастаўлены з суда ў 9-ую клінічную бальніцу г. Менску з чэрапна-мазгавымі пашкоджаньнямі, атрыманымі ў выніку зьбіцьця. Рашэньне па справе судзьдзя вынес у адсутнасьць сьведкаў – амапаўцаў, якія праводзілі затрыманьне.

***28 сакавіка*** юрысты, якія назіралі за ходам адміністрацыйных працэсаў у судзе Цэнтральнага раёну Менску, далі ацэнку судовых працэсаў па справах удзельнікаў акцыі 25 сакавіка.

***Валянцін Стэфановіч:*** “Трэба адзначыць, што ў нас у апошнія часы суды перасталі выносіць папярэджаньні. Я ўжо не кажу пра спыненьні справаў у сувязі з адсутнасьцю складу правапарушэньня. Суды перасталі выносіць папярэджаньні нават у тых выпадках, калі чалавек затрымліваецца ўпершыню і прызнае віну. Нават у такіх выпадках суд выносіць выключна рашэньне пра арышт альбо ў крайнім выпадку – штраф. 28 сакавіка суд выносіў у асноўным арышты. У некаторых выпадках сьведкі-амапаўцы проста ня здолелі даць ніякіх паказаньняў адносна таго, што ўчыніў менавіта гэты затрыманы. Усе рапарты былі напісаны абсалютна аднолькава: удзельнічаў у несанкцыянаваным шэсьці, крычаў “Жыве Беларусь!” і на гэтым усё. Па справе актывіста руху “Зубр” Андрэя Баранава судзьдзя Аляксей Бычко вынес рашэньне наогул без удзелу ў працэсе сьведкаў. У сувязі з масавымі затрыманьнямі зьявілася неабходнасьць у вялікай колькасьці судзьдзяў, каб разглядаць адміністрацыйныя справы ўдзельнікаў акцыі 25 сакавіка. Таму 28 сакавіка ў судзе Цэнтральнага раёну адміністрацыйныя справы разглядалі як мінімум пяць судзьдзяў разам са страшынёй суда Самасейкам. Гэта былі не толькі судзьдзі па адміністрацыйных справах, алі і судзьдзі, якія вядуць і грамадзянскія і крымінальныя справы”.

***Уладзімір Лабковіч:*** “Трэба адзначыць практыку, якая склалася ў апошні час, — затрыманых у судзе не знаёмяць з іх правамі. Суд абсалютна ня ўлічвае супярэчнасьці ў паказаньнях сьведкаў-супрацоўнікаў міліцыі. Напрыклад, падчас разгляду справы Вячаслава Сіўчыка супрацоўнікі міліцыі так і ня здолелі патлумачыць, дзе яны яго затрымалі, і не былі наогул упэўненыя, што яны яго затрымлівалі. Супрацоўнік АМАПу па прозьвішчы Пачценны, згодна з рапаратамі, у адную і тую ж секунду зат-

рымліваў чалавек дваццаць у розных месцах, што сьведчыць альбо пра яго незвычайныя здольнасьці адразу быць паўсюль, альбо пра нешта іншае... Тым больш, што Пачценны на працэсе по справе Сіўчыка так і ня здолеў растлумачыць тое, як ён яго затрымаў. 25 сакавіка былі затрыманыя людзі, якія не прымалі ўдзелу ў акцыі і ня мелі ніякіх адносінаў да гэтага мерапрыемства. Быў масавы захоп, і выпадкова захопленыя людзі патрапілі за краты. І нават яны ня здолелі давесьці суду сваю невінаватасьць. У працэсе па справе Сіўчыка былі паказаныя відэаматэрыялы, у якіх ні на адным з кадраў не фігураваў Сіўчык. І тым ня менш судзьдзя Бычко ў аснову рашэньня пра арышт узяў паказаньні сьведкаў і відэаматэрыялы".

***29 сакавіка*** ў мясцовы РУУС выкліканы старшыня Слонімскай арганізацыі Партыі БНФ ***Іван Бедка***, які падаваў заяўку на правядзеньне мітынгу 26 сакавіка, прысьвечанага Дню Волі. Акцыя была санкцыянаваная, прайшла арганізавана і пад пільным наглядам праваахоўных органаў. Падчас правядзеньня затрыманьняў не было. Але 29 сакавіка на І. Бедку быў складзены пратакол за распаўсюд улётак згодна артыкулу 172 ч.3 КаАП РБ. Пры гэтым І. Бедка ўлётак не раздаваў.

***1 красавіка*** ў Менску затрыманы актывіст Аб'яднанай грамадзянскай партыі ***Аляксандр Бяспалы*** за распаўсюд улётак з заклікам прыйсьці 6 красавіка на Кастрычніцкую плошчу, каб ушанаваць памяць Генадзя Карпенкі.

***5 красавіка*** ў судзе Кастрычніцкага р-ну Менску пачаўся суд над актывістам Аб'яднанай грамадзянскай партыі ***Аляксандрам Бяспалым***, якога разам з двума іншымі актывістамі партыі затрымалі 1 красавіка за распаўсюд улётак з заклікам прыйсьці на Кастрычніцкую плошчу, каб ушанаваць памяць Генадзя Карпенкі. Згодна з законам аб масавых мерапрыемствах за распаўсюд аналагічных улётак караюць як за арганізацыю несанкцыянаванага мерапрыемства. Супрацоўнікі міліцыі Кастрычніцкага раёну прыехалі па Аляксандра Бяспалага дадому і адвезьлі яго ў суд. Там ён папрасіў, каб яго абараняў адвакат. Судзьдзя прызначыла паседжаньне на 7 красавіка.

***6 красавіка*** ўлады не дазволілі правесьці акцыю памяці "Ланцуг неабыякавых людзей" у памяць Генадзя Карпенкі, а таксама зьніклых вядомых людзей. Акцыя пачалася а 18-й гадзіне на Кастрычніцкай плошчы сталіцы. Прыйшло каля 100 чалавек, але прастаялі яны некалькі хвілінаў. Узброены падразьдзел АМАПу у грубай форме выштурхнуў людзей з плошчы. Тыя, хто засталіся, стаялі за Палацам Рэспублікі. Арганізатары і ўдзельнікі адзначылі беспрэцэдэнтнасьць дзеяньняў сілавых структураў, бо ёсьць пастанова Вярхоўнага суда, паводле якой такія акцыі не патра-

буюць афіцыйнага дазволу. Намесьнік старшыні “Беларускага Хельсінскага камітэту” ***Гары Паганяйла*** лічыць, што АМАПаўцы кіруюцца выключна загадам Аляксандра Лукашэнкі, таму нават на пастанову Вярхоўнага суда не зьвяртаюць увагі.

***6 красавіка Мікола Статкевіч*** атрымаў позву з Цэнтральнага РУУС Менску зьявіцца ў райаддзел у якасьці абвінавачваемага ў актыўным удзеле ў несанкцыянаваным мітынгу прадпрымальнікаў 1 сакавіка ў Менску. У Цэнтральным РУУС на яго склалі пратакол аб выступленьні на несанкцыянаваным мітынгу прадпрымальнікаў па частцы 2 артыкулу 167 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях (паўторны ўдзел на працягу году ў несанкцыянаваных акцыях, бо ў кастрычніку 2004 году ён адседзеў адміністрацыйны арышт за акцыі пратэсту 18-19 кастрычніка). “Увогуле, мяне зьдзівіла тое, чаму праз столькі часу згадалі пра гэты мітынг, чаму з паўтара дзясятку выступоўцаў вырашылі прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасьці мяне, тым больш, што на мітынгу выступаў і Андрэй Кабякоў (віцэ-прэм’ер)”, — адзначыў М. Статкевіч. Судзьдзя Аляксей Бычко вынес М. Статкевічу штраф памерам 150 базавых велічыняў – гэта прыкладна 3 мільёны 800 тысяч рублёў. Сьледам за першым судом адбыўся другі: Міколу Статкевіча аштрафавалі на 5 базавых велічыняў за зьнявагу судзьдзі.

***14 красавіка*** суд Кастрычніцкага раёну Менску пакараў штрафам у 150 базавых велічыняў (гэта каля 2000 даляраў ЗША) сябра Аб’яднанай грамадзянскай партыі, студэнта чацьвертага курсу ўнівэрсітэту ***Аляксандра Бяспалага***. Судзьдзя Наталя Пратасавіцкая вынесла пастанову аб тым, што Аляксандр Бяспалы парушыў закон аб масавых мерапрыемствах. Аляксандр распаўсюджваў улёткі, у якіх была інфармацыя аб тым, што 6 красавіка людзі прыйдуць на Кастрычніцкую плошчу, каб ушанаваць памяць Генадзя Карпенкі. Згодна з Адміністрацыйным кодэксам, гэта зьяўляецца заклікам да ўдзелу ў несанкцыянаванай уладамі акцыі. Судзьдзя пакарала Аляксандра як арганізатара мерапрыемства.

***21 красавіка*** стала вядома, што ўлады Бабруйску не дазволілі правесьці 26 красавіка ў цэнтры гораду пікет да 19-х угодкаў чарнобыльскай катастрофы, заяўку на які падавалі прадстаўнікі розных палітычных партыяў і арганізацыяў — АГП, Партыі БНФ, Свабоднага прафсаюзу, сацыял-дэмакратаў і інш. Аднаго з заяўнікаў, старшыню Бабруйскай гарадзкой арганізацыі АГП ***Уладзіміра Куртукова***, наведала цэлая дэлегацыя з адміністрацыі Ленінскага раёну Бабруйску. Яму афіцыйна паведамілі, што дазволу на акцыю няма па той прычыне, што ў заяве на правядзеньне ня вызначаныя адказныя за правядзеньне мерапрыемства. Уладзімір Куртукоў назваў прычыну адмовы фармальнай. Прычым, сказаў лідэр АГП у Бабруйску, з падобнымі заявамі дэмакраты штогод зьвяртаюцца да гарадзкіх уладаў, і кожны раз чыноўнікі знаходзяць новыя прычыны для адмовы.

***26 красавіка*** ў Нью-Ёрку каля штаб-кватэры ААН адбыўся мітынг у памяць гадавіны Чарнобыльскай аварыі і супраць рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Паводле старшыні КХП-БНФ ***Зянона Пазьняка***, у мітынгу ўзялі ўдзел больш за 100 чалавек, збольшага – маладыя беларусы.

***26 красавіка*** ў Магілёве каля будынку гарвыканкаму затрыманыя каля 30 удзельнікаў акцыі з нагоды 19-х угодкаў Чарнобыльскай катастрофы. Пра гэта паведаміў адзін з затрыманых — старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі Партыі БНФ ***Рыгор Костусеў***.

***6 траўня*** ў Капылі актывіст дэмакратычнага руху ***Віктар Дашкевіч*** планаваў правесьці пікетаваньне ў знак пратэсту супраць затрымкі з афармленьнем пенсіі па інваліднасьці. Распавядае спадар Дашкевіч: "Я даў заяўку на пікет. У адказе мне паведамілі, што я ня маю падставы для выяўленьня свайго пратэсту ў выглядзе пікетаваньня. Падпісала адказ старшыня райвыканкаму, а намесьніца адказала па тэлефоне, што ў нас такое месца нават не адведзена. Таму што ў нас усе людзі пакорныя, сьмірныя, паважаюць чыноўнікаў". Намесьніца старшыні Капыльскага райвыканкаму Іна Былюк лічыць адмову у дазволе на пікетаваньне абгрунтаванай: "На плошчы ён перашкаджае дарожнаму руху. Ён ня мае права гэтага рабіць".

***6 траўня*** суд Цэнтральнага раёну Гомелю разглядаў зыск траіх гараджанаў да гарадзкога выканаўчага камітэту, якія абскарджвалі забарону выканкаму на правядзеньне мітынгу супраць павышэньня камунальных плацяжоў, увядзеньня прымусовых кантрактаў, платнай адукацыі і медыцыны. Зыскі падалі ў суд дэпутат гарсавету ***Юрась Глушакоў***, а таксама ***Марыя Багдановіч*** і ***Дзьмітры Шкрабаў***. Першапачаткова скарга была адхіленая судом Цэнтральнага раёну. Настойлівымі патрабаваньнямі і касацыйнай скаргай у абласны суд зыскоўцы прымусілі раённы суд разглядаць іх прэтэнзіі. Прадстаўніца гарвыканкаму Ірына Раманюк патлумачыла ў судзе, што спачатку гарвыканкам даў дазвол на мітынг, але за два дні да яго ён быў скасаваны. Арганізатары нібыта яшчэ да атрыманьня рашэньня выканкаму расклеілі ў горадзе аб'явы пра мітынг. Да таго ж санітарная служба абвясьціла ў горадзе эпідэмію грыпу. Зыскоўцы абвергі сьцьвярджэньне прадстаўніцы гарвыканкаму. Яны зьвярнулі ўвагу суда на тое, што санслужба ніякіх забаронаў на вулічныя мерапрыемствы не рабіла, у той час яны праводзіліся ў горадзе. Гарвыканкам не ўпершыню забараняе мітынгі пэўнай катэгорыі грамадзянаў. Пастанову паводле зыску судзьдзя Віктар Казачок павінен абвясьціць 11 траўня.

***9 траўня*** Гомельскі гарвыканкам не дазволіў рэгіянальным арганізацыям апазіцыйных палітычных партыяў удзельнічаць у агульнагарадзкой цырымоніі ўскладаньня вянкоў да помніку загінулых салдат і падпольш-

чыкаў. Прадстаўнікі палітычных партыяў загадзя зьвярталіся ў гарвыканкам з просьбай удзельнічаць у Дзень Перамогі ў цырымоніі ўшанаваньня загінулых салдат ды падпольшчыкаў на пляцы Працы. Аднак выканкам дазволіў гэта рабіць толькі аб 11-й гадзіне, калі ветэраны ды вайсковыя падразьдзяленьні пакінулі пляц і накіраваліся на тэатралізаванае сьвята на Цэнтральны стадыён. Толькі пасьля гэтага каля паўсотні прадстаўнікоў Аб’яднанай грамадзянскай партыі, Партыі БНФ, Партыі камуністаў Беларускай прынесьлі да помніку вянкі ды жывыя кветкі. На жалобнай служцы ад гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ было напісана: “Палеглым за Радзіму”. Кіраўнік гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ Анатоль Паплаўны лічыць: “У такія сьвяты не павінна быць падзелу на нашых і ня нашых. Улада спрабуе цяпер прыватызаваць і сьвяты — сумныя і вясёлыя. Быццам бы толькі яна робіць дабро, памятае пра тых, хто загінуў”.

***11 траўня*** ў Гародні ў судзе Кастрычніцкага раёну судзілі шасьцярых удзельнікаў ланцуга неабыякавых людзей, які адбыўся 7 траўня з нагоды шостых угодкаў зьнікненьня Юрыя Захаранкі: ***Міколу Ворана, Рамана Юргеля, Юрыя Істоміна, Артура Сьмятаніна, Зьміцера Аўдзейчыка*** і ***Андрэя Янушкевіча***. Іх абвінавачвалі ў тым, што яны ўдзельнічалі ў несанкцыянаваным пікеце. Пачатку суда ўдзельнікі акцыі чакалі амаль тры гадзіны: доўга не было міліцэйскіх пратаколаў, потым судзьдзя Зінаіда Барцэвіч знаёмілася з матэрыяламі справы. У выніку судзьдзя паведаміла, што рашэньне шасьцярым гарадзенцам будзе абвешчанае 16 траўня. Вырашана дадаткова вывучыць справу ўдзельнікаў акцыі.

***11 траўня*** суд у Гомелі не задаволіў патрабаваньняў дэпутата гарсавету ***Юрыя Глушакова***, а таксама ***М.Багдановіч*** і ***Д.Шкрабава*** прызнаць незаконнай забарону гарвыканкаму на мітынг супраць падвышэньня камунальных плацяжоў і ўвядзеньня прымусовых кантрактаў. Гарвыканкам спасылаўся на тое, што арганізатары парушылі закон пра масавыя мерапрыемствы — расклеілі ў горадзе абвесткі пра мітынг яшчэ да атрыманьня дазволу. Абвесткі да таго ж нібыта не адпавядалі замоўленай мэце мітынгу і выпушчаныя былі з парушэньнем закону пра друк ды іншыя сродкі масавай інфармацыі. І нарэшце, выканкам, забараняючы мітынг, быццам бы дбаў пра абарону здароўя гараджанаў, бо ў горадзе ў той час была абвешчана эпідэмія грыпу. Судзьдзя Віктар Казачок у сваім рашэньні па сутнасьці паўтарыў матывы гарвыканкаму на забарону мітынгу.

***12 траўня*** старшыня Віцебскай гарадзкой арганізацыі АГП ***Алена Залеская*** напісала скаргу на імя пракурора вобласьці, пад якой паставілі свае подпісы і прадстаўнікі іншых апазіцыйных партыяў. Спадарыня Залеская запатрабавала, каб органы пракуратуры або міліцыянты з Кастрычніцкага райаддзелу прадставілі ёй юрыдычныя дакументы, на падставе якіх нельга выходзіць на вуліцу з партрэтамі, а таксама апранаць бел-

чырвона-белыя шалікі. Менавіта гэтая дэталь адзеньня асабліва абурыла супрацоўнікаў міліцыі, якія 7 траўня пад пагрозаю затрыманьня загадалі разысьціся ўдзельнікам “Ланцуга неабыякавых людзей”. Паколькі прадстаўнікі АГП і Партыі БНФ ня мелі ні сьцягоў, ні плакатаў і стаялі моўчкі, спадарыня Залеская абвяргае меркаваньне міліцыянтаў пра тое, што гэтую вулічную акцыю можна кваліфікаваць як несанкцыянаваны пікет і караць ўдзельнікаў за парушэньне правапарадку.

***16 траўня*** ў Кастрычніцкім раённым судзе Гародні пакаралі штрафамі шасьцярых ўдзельнікаў “Ланцуга неабыякавых людзей”, які адбыўся 7 траўня з нагоды шостых угодкаў зьнікненьня Юрыя Захаранкі. Іх абвінавацілі ў тым, што яны ўдзельнічалі ў несанкцыянаваным пікеце. Судзьдзя Зінаіда Барцэвіч аштрафавала на 25 базавых адзінак пяцярых удзельнікаў акцыі — ***Міколу Ворана, Юрыя Істоміна, Артура Сьмятаніна, Зьміцера Аўдзейчыка*** і ***Андрэя Янушкевіча***. А ***Раману Юргелю*** самы вялікі штраф — 160 базавых адзінак, гэта прыблізна 4 мільёны рублёў.

***17 траўня*** судовы выканаўца Аляксандра Шумейка з суда Першамайскага раёну Менску апісала мэблю ды некаторую іншую маёмасьць ***Сяргея Скрабца***, які знаходзіцца ў сьледчым ізалятары ў Берасьці. Мэбля ды іншыя прадметы хатняга ўжытку апісаныя ў кошт пагашэньня запазычанасьці згодна з рашэньнем гарадзенскага суда, які вынес экс-парламентару штраф у памеры 4 мільёны 800 тысячаў рублёў за быццам бы арганізацыю несанкцыянаванага ўладамі мітынгу прадпрымальнікаў. Сяргей Скрабец, які апошнім часам зьяўляецца беспрацоўным, змог пакуль выплаціць толькі адзін з амаль пяці мільёнаў штрафу. На кароткі час ён атрымаў адтэрміноўку, але 17 траўня яна скончылася. Апісаньне маёмасьці адбылося ў кватэры, дзе пражываюць бацькі Скрабца і дзе прапісаны ён сам. Падчас гэтай працэдуры бацьку экс-дэпутата, у якога хворыя сэрца і ногі, стала блага. У выніку яму спатрэбілася неадкладная медыцынская дапамога.

***20 траўня*** кватэру ***Міколы Статкевіча*** наведаў судовы выканаўца Першамайскага суда Менску, які апісаў маёмасьць. Паводле рашэньня суда, Мікола Статкевіч мусіць заплаціць штраф 2000 даляраў за выступ на мітынгу прадпрымальнікаў 1 сакавіка. Лідэр сацыял-дэмакратаў лічыць, што працэдурай вопісу маёмасьці ўлады імкнуцца аказаць на яго псіхалагічны ціск напярэдадні суда, які павінен пачацца 23 траўня.

***20 траўня*** судзьдзя Кастрычніцкага раённага суда г. Віцебску Валянціна Міхасёва вынесла папярэджаньне старшыні гарадзкой арганізацыі АГП ***Алене Залескай*** за ўдзел у несанкцыянаваным шэсьці 26 красавіка. Нягледзячы на тое, што затрыманьняў падчас гэтай акцыі не было, віцебскія міліцыянты праз дзесяць дзён склалі на Алену Залескую пратакол

***Адзіны кандыдат у Прэзідэнты Беларусі ад аб'яднанай апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч.*** ➲





***Ідзе галасаваньне.***



***У зале паседжаньня Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч.***



***Прэс-канферэнцыя па выніках Кангрэсу дэмакратычных сілаў Беларусі – на прэзідэнцкія выбары ідзем разам!***



*Галоўны рэдактар газеты «Народная воля» Іосіф Сярэдзіч.*




*Акцыя пратэсту ў Баранавічах супраць забароны падпіскі на «Народную волю», «Нашу Ніву», «БДГ» і іншыя недзяржаўныя выданьні.*



*У рэдакцыі «Белорусской деловой газеты» пасьля паведамленьня аб рашэньні судовых органаў.*






*Журналісты Польшчы правялі акцыю салідарнасьці з беларускімі калегамі.*

*Галоўны рэдактар «БДГ» Пётр Марцаў.*



↑ *Старшыня Саюзу палякаў на Беларусі Анжаліка Борыс.*

↓ *Арыштаваны галоўны рэдактар часопісу “Magazyn Polski” Андрэй Пачобут.*



*Журналіст Анджэй Пісальнік.*








***У акцыях пратэсту супраць дзяржаўнага ўціску на СПБ ўдзельнічалі сотні палякаў і беларусаў.***










*Алег Мініч з-за крымінальнага перасьледу за «мульцікі» вымушаны быў эміграваць з Беларусі.*

*Аўтары «мульцікаў» пра Лукашэнку і К°. Андрэй Абозаў і Павел Марозаў і некалькі кадраў з іх твораў.*









*Суд над Міколам Статкевічам і Паўлам Севярынцам.*




*Андрэй Клімаў праз некалькі гадзінаў у другі раз стане палітвязьнем.*





*На акцыях к Менску на знак салідарнасьці з палітвязьнямі Міхаілам Марынічам, Андрэем Клімавым, Міколам Статкевічам, Паўлам Севярынцам...*





*Палітвязень Юры Бандажэўскі па выхадзе з турмы.*





*Сяргей Скрабец.*

*Мікалай Аўтуховіч.*



*Студэнтка Тацяна Хома.*



*Сьвятлана Завадзкая з сынам Юрыем.*



*На акцыях салідарнасьці «Хочам ведаць праўду!».*





*На акцыях салідарнасьці «Хочам ведаць праўду!».*







*На акцыях салідарнасьці «Хочам ведаць праўду!».*







*«Дзень Волі» – 2005.*











*«Дзень Волі» – 2005.*











*«Чарнобыльскі шлях» – 2005.*









*«Чарнобыльскі шлях» – 2005.*







*Арышты моладзевых актывістаў падчас акцыяў пратэсту.*







*Арышты моладзевых актывістаў падчас акцыяў пратэсту.*







***На моладзевай акцыі «Хочам вучыцца па-беларуску».***








***Навучэнцы Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Я.Коласа не здаюцца, працягваюць вучыцца па-беларуску і ў «падпольлі».***








*Дзень салідарнасьці – 16 число кожнага месяца.*



*Прэс-канферэнцыя лідэраў Маладога Фронту.*



*Страйкуюць прадпрымальнікі.*








***Рабочыя Менскага мотавелазаводу выйшлі на страйк.***

***Лідэр страйкаму прадпрымальнікаў Анатоль Шумчанка.***



*Канфіскацыя маёмасьці ў актывісткі прафсаюзнага руху Марыны Багдановіч.*





*Незалежныя прафсаюзы змагаюцца за правы працоўных.*









*На акцыях пратэсту супраць перайменаваньня менскіх вуліцаў.*











*На акцыях пратэсту супраць перайменаваньня менскіх вуліцаў.*





***Вынікі начнога нападу «невядомых» на офіс ПЦ «Вясна» ў Жодзіне.***





***Прэзентацыя кнігі «Маніторынг парламенцкіх выбараў і рэспубліканскага рэферэндуму...», выдадзенай .***






***Праваабаронца Алесь Бяляцкі.***





*Імгненьні 2005-га.*

пра адміністрацыйнае парушэньне і перадалі яго ў суд. Паводле міліцэйскага пратаколу, які склаў Аляксей Захаранкаў, адказны за ахову правапарадку ў Кастрычніцкім райаддзеле, спадарыня Залеская кіравала несанкцыянаванай акцыяй “Чарнобыльскі шлях”.

***23 траўня*** у Менску прайшла акцыя супраць перайменаваньня прасьпектаў і вуліц сталіцы. Некалькі дзясяткаў чалавек з партрэтамі Пятра Машэрава выстраіліся уздоўж прасьпекту, які да нядаўняга часу насіў яго імя. У шэраг жывога ланцуга сталі лідэры і прадстаўнікі палітычных партыяў, аднак пераважнай бальшасьцю пратэстоўцаў былі людзі сталага веку, некаторыя з якіх адмыслова прыехалі з рэгіёнаў. Тэхнічным арганізатарам акцыі выступіла Партыя камуністаў Беларуская. Пра мэту акцыі гаворыць адзін з лідэраў партыі ***Валеры Ухналёў***: “Прэзідэнт разумее, што ён не аўтарытэт для большасьці народу, а таму стараецца адсунуць на ўзбочыну такія аўтарытэтныя імёны, як Скарына і Машэраў. І сёньняшняя акцыя паказала, што гэта непрыймальна для ўсіх слаёў насельніцтва”. За хадою акцыю назіралі міліцыянты і супрацоўнікі сьпецслужбаў у цывільным. Акцыя доўжыўся каля гадзіны і завяршылася без затрыманьняў.

***26 траўня Юры Істомін***, адзін з асуджаных удзельнікаў акцыі ў чарговую гадавіну зьнікненьня Юрыя Захаранкі, падаў скаргу на рашэньне Кастрычніцкага раённага суда Гародні ў Гарадзенскі абласны суд. Па словах спадара Істоміна, рашэньне суда было не юрыдычным, а палітычным: “Яшчэ на першым паседжаньні мы падалі хадайніцтва, каб да справы былі дададзеныя пастановы Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь, падпісаныя яго старшынём Сукалам і цяперашнім Генеральным пракурорам краіны Міклашэвічам, паводле якіх знаходжаньне людзей на вуліцы з партрэтамі зьніклых палітыкаў не кваліфікуецца як пікетаваньне”. Юры Істомін склаў таксама скаргі ў Гарадзенскае абласное УУС, пракуратуру Кастрычніцкага раёну Гародні і Гарадзенскі гарадзкі Савет дэпутатаў на дзеяньні падпалкоўніка крымінальнай міліцыі Кастрычніцкага РУУС Г. Зайку на прадмет незаконных дзеяньняў супрацоўнікаў міліцыі.

***27 траўня*** ў актывісткі Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Марыны Багдановіч*** судовыя выканаўцы канфіскавалі маёмасьць. Суд Цэнтральнага раёну Менску прысудзіў ёй штраф 200 базавых велічынь (гэта каля дзьвюх з паловай тысячаў даляраў) за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі прадпрымальнікаў на Кастрычніцкай плошчы ў Менску 1 сакавіка. У Марыны Багдановіч канфіскавалі ўсю бытавую тэхніку і частку мэблі. 1 чэрвеня адбудзецца наступны вопіс маёмасьці Марыны Багдановіч. Яна павінна яшчэ выплаціць штраф за ўдзел у “Чарнобыльскім шляху” – 150 базавых велічыняў. Усяго Марына Багдановіч павінна заплаціць каля 4 з паловай тысячаў даляраў. Па словах М.Багдановіч, пасьля канфіскацыі маёмасьці застаўся яе ложак, дачкі, стол, кухонны стол і невялікі сервант на

кухні. Усю бытавую тэхніку ацанілі ўсяго на 300 даляраў. Абскарджваць канфіскацыю маёмасьці Марына Багдановіч не зьбіраецца. Па-першае, у яе няма грошай на судовыя выдаткі. Па-другое, яна ня верыць у справядлівы суд. Але Марына Багдановіч ня траціць аптымізму. Яе дачка сёньня скончыла школу, і Марына атрымала ганаровую грамату як найлепшая маці, бо яе дачка – найлепшая вучаніца ў класе.

***30 траўня*** ў Менску каля трыццаці чалавек сталі ўвечары жывым ланцугом на прасьпекце Машэрава ў знак пратэсту супраць яго перайменаваньня. Яны трымалі ў руках партрэты Пятра Машэрава. Праз некалькі хвілінаў пасьля пачатку акцыі АМАПаўцы ў цывільным пачалі вырываць у людзей з рук партрэты і загадалі ўсім разысьціся. Дэпутат Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня ***Валеры Шчукін*** не падпарадкаваўся. Яго схапілі і даставілі ў РУУС Цэнтральнага раёну.

***31 траўня*** ў Менску на прасьпекце Францішка Скарыны каля трыццаці чалавек спрабавалі зладзіць акцыю супраць перайменаваньня прасьпекту. Амапаўцы адразу ж, як толькі зьявіліся людзі з партрэтамі Скарыны, пачалі выціскаць іх з прасьпекту ў бок плошчы Незалежнасьці, а потым да стадыёну “Дынама”. Лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька паведаміў, што, нягледзячы на перасьлед, акцыі супраць перайменаваньня вуліцаў будуць адбывацца кожны панядзелак і аўторак.

***1 чэрвеня*** ў камісіі па справах непаўнагадовых адміністрацыі Ленінскага раёну г. Магілеву адбыўся разгляд справы навучэнкі СШ № 22 ***Ганны Петраковіч***, удзельніцы акцыі “Ланцуг неабыякавых людзей”, якая прайшла 7 траўня. Старшыня камісіі, намесьнік старшыні адміністрацыіі Ленінскага раёну г. Магілёву Валерый Клепчукоў не дазволіў азнаёміцца з матэрыяламі справы прадстаўніку Ганны Барысу Бухелю, не дазволіў яму выступіць, не заслухаў сьведакаў з боку дзяўчыны, не дазволіў далучыць да справы фотаздымкі, якія прасьвятлялі абставіны моманту затрыманьня. У адносінах да бацькоў Ганны было вынесенае адміністрацыйнае спагнаньне ў выглядзе штрафу памерам 2 базавыя велічыні па арт. 162 КаАП РБ. — “злоснае невыкананьне бацькамі абавязкаў па выхаваньні дзяцей. У той жа дзень у судзе Леніскага раёну г. Магілёву пад старшынствам судзьдзі Панасенкі адбыўся суд над актывістам руху “Зубр” Валадаром Цурпанавым за ўдзел у той жа акцыі. Падчас разгляду справы судзьдзя не зьвярнула ўвагі на доказы “правапарушальніка” і ягонага прадстаўніка Б. Бухеля. В. Цурпанаў быў пакараны штрафам у памеры 30 базавых велічыняў па арт. 167-1 КаАП РБ – удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве.

***2 чэрвеня*** стала вядома, што гарадзенскія ўдзельнікі акцыі “Мы памятаем” , якая адбылася 7 траўня, атрымалі папярэджаньне, што яны павінны “добраахвотна” сплаціць штрафы цягам дзесяці дзён, інакш у іх апі-

шуць маёмасьць. ***Юры Істомін, Артур Сьмятанін, Зьміцер Аўдзейчык, Андрэй Янушкевіч, Мікола Воран*** і ***Раман Юргель*** каля гадзіны трымалі фотаздымкі Юрыя Захаранкі, які зьнік шэсьць гадоў таму. Потым іх затрымалі міліцыянты. Кастрычніцкі раённы суд Гародні аштрафаваў за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце пяцёх удзельнікаў— на 25 базавых адзінак кожнага, а Рамана Юргеля — на 160 базавых адзінак.

***3 чэрвеня*** суд Цэнтральнага раёну Менску спыніў супраць ***Валерыя Шчукіна*** адміністрацыйную справу. Было прызнана, што ў ягоных дзеяньнях няма правапарушэньня. В.Шчукін быў затрыманы ўвечары 30 траўня на менскім прасьпекце Пераможцаў, былым Машэрава, падчас акцыі пратэсту супраць яго перайменаваньня. Судовае разьбіральніцтва па абвінавачаньні Валерыя Шчукіна ў дробным хуліганстве і непадпарадкаваньні міліцыянтам працягвалася прыкладна дзьве гадзіны. Сьведкі-АМАПаўцы Лелеш і Васількоў, што затрымалі спадара Шчукіна, сьцьвярджалі, што ён нецэнзурна лаяўся, чапляўся да пасажыраў грамадзкага транспарту і ўвогуле паводзіў сябе "асацыяльна". Да ўсяго, паводле сьведчньняў міліцыянтаў, Шчукін адмаўляўся праехаць з імі ў пастарунак, і яны вымушаныя былі ўжыць супраць яго сілу. Валер Шчукін сьцьвярджаў адваротнае: стаяў на прасьпекце спакойна і нікога не чапаў; да яго падышлі некалькі невядомых асобаў у цывільным, парвалі партрэты Пятра Машэрава, якія Шчукін трымаў у руках, і запатрабавалі, каб ён сеў у іхнюю машыну. Валер Шчукін адмовіўся, бо незнаёмцы не прадставіліся. У выніку судзьдзя Аляксей Бычко прызнаў, што ў дзеяньнях Валерыя Шчукіна не было складу адміністрацыйнага правапарушэньня і пастанавіў спыніць супраць яго справу.

***7 чэрвеня Мікола Воран***, пакараны судом Кастрычніцкага раёну Гародні штрафам у памеры 25 базавых велічыняў за акцыю з нагоды шостых угодкаў зьнікненьня Юрыя Захаранкі, атрымаў паведамленьне ад судовага выканаўцы. У паведамленьні за подпісам В. Курыловіч сказана, што калі спадар Воран ня выплаціць штраф, то да яго будуць прынятыя адпаведныя меры, адной з якіх можа быць апісаньне маёмасьці.

***7 чэрвеня*** ў Менску адбылася акцыя супраць перайменаваньня прасьпектаў і вуліцаў сталіцы. Удзельнікі сабраліся на прасьпекце Францішка Скарыны каля станцыі метро "Усход", трымалі ў руках партрэты Скарыны, а таксама раздавалі іх мінакам. На завяршэньне да ўдзельнікаў акцыі пад'ехалі некалькі аўтобусаў з АМАПам. Яны запатрабавалі згарнуць партрэты і разысьціся.

***10 чэрвеня*** Менскі гарвыканкам не дазволіў правесьці сход ініцыятыўнай групы, якая прыняла рашэньне арганізаваць гарадзкі рэферэндум наконт вяртаньня ранейшых назваў цэнтральным вуліцам і прасьпектам гораду, перайменаваным у траўні ўказам А.Лукашэнкі. Актывісты грамадз-

кай кампаніі зьбіраліся правесьці сход ініцыятыўнай групы 13 чэрвеня ў парку 50-годзьдзя Кастрычніка. Гэтыя дата і месца былі пададзеныя ў адпаведнай заяўцы гарадзкім уладам. Аднак Менскі гарвыканкам прыслаў адмоўны адказ, спаслаўшыся на тры фармальныя прычыны: што нібыта заяўка была аформленая няправільна, не была ўказаная мэта сходу і колькасьць яго ўдзельнікаў, а таксама не акрэсьленыя захады дзеля бясьпекі грамадзянаў. Адзін з кіраўнікоў аргкамітэту па правядзеньні рэферэндуму Сяргей Альфер паведаміў, што новая заяўка ў гарвыканкам падавацца ня будзе, і каб не парушаць заканадаўства, сход ініцыятыўнай групы пройдзе ў закрытым памяшканьні.

***14 чэрвеня*** акцыя супраць зьмяненьня назваў прасьпектаў Машэрава і Скарыны была праведзеная ў Менску паводле новай тактыкі – удзельнікі разьдзяліліся на некалькі групаў і праводзілі акцыю ў тры этапы. А 6-й вечара некалькі дзясяткаў сяброў розных апазіцыйных палітычных партыяў сабраліся ля будынку Акадэміі тэатра і мастацтва. Сярод іх былі лідэр Партыі БНФ ***Вінцук Вячорка*** і лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Анатоль Лябедзька***. Праз некалькі хвілінаў побач з імі спыніўся аўтобус. Адтуль выйшлі АМАПаўцы і адразу пачалі выціскаць людзей у двор інтэрнату акадэміі. Другая група апазіцыянераў, пераважна моладзь, знаходзілася ля будынку кінатэатру “Кастрычнік”. Пакуль АМАПаўцы выціскалі людзей ад Акадэміі мастацтва, яны раздавалі мінакам інфармацыйныя бюлетэні. Калі да іх падышлі прадстаўнікі міліцэйскага кіраўніцтва Савецкага раёну і АМАПаўцы, улётак ужо не засталося. Маладыя людзі папросту стаялі і не разыходзіліся. На плошчы Якуба Коласа каля сарака чалавек сталі жывым ланцугом з партрэтамі Пятра Машэрава і Францыска Скарыны. Яшчэ некалькі чалавек раздавалі мінакам улёткі. Ім удалося пратрымацца амаль з паўгадзіны. Разгубленыя супрацоўнікі патрульна-паставой службы выклікалі сваіх калегаў з аддзелу грамадзкай бясьпекі. Яны затрымалі аднаго студэнта, які атрымаў з рук пікетоўцаў улётку. На пытаньне журналістаў: “За што?”, яны адказалі: “А ня трэба было браць”. Хлопцы ня сталі чакаць, пакуль на плошчу прыедуць АМАПаўцы. Яны хутка пайшлі па прасьпекце Францыска Скарыны да будынку КДБ з партрэтамі ў руках.

***15 чэрвеня*** а 18-й гадзіне ў Сьветлагорску павінен быў пачацца першы сход па вылучэньні дэлегатаў на Нацыянальны кангрэс дэмакратычных сілаў, але за гадзіну да пачатку адказныя за правядзеньне сходу — кіраўнік Гомельскага аддзяленьня Партыі БНФ ***Віктар Раманішка*** і кіраўнік Сьветлагорскай гарадзкой філіі Партыі БНФ ***Вадзім Болбас*** — былі затрыманыя міліцыяй, калі выходзілі з дому. Непасрэдна аперацыяй па затрыманьні камандаваў маёр міліцыі Аляксандр Зазетка. Нягледзячы на перашкоды з боку міліцыі, сход усё ж адбыўся, хаця ён пачаўся са спазьненьнем на дзьве гадзіны, і не ў будынку, а на адкрытым паветры: у лесе, на беразе ракі Бярэзіны.

***17 чэрвеня*** ў Маладэчне быў запланаваны сход па выбарах дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Аднак пажарныя службы гораду загадалі дэлегатам пакінуць памяшканьне цэнтру “Модуль”, дзе першапачаткова зьбіраліся актывісты апазіцыі. Будынак заблакавалі тры пажарныя машыны, прадстаўнікі сьпецслужбаў, хаця ніякага пажару не было. На сходзе зарэгістраваліся болей за трыццаць актывістаў апазіцыі з Маладэчна, і ў запасным памяшканьні ўдзельнікам удалося выканаць усе працэдуры, заслухаць прэтэндэнтаў на званьне адзінага кандыдата і абраць двух дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў.

***21 чэрвеня*** ў Мазыры вялікая група міліцыянтаў спрабавала сарваць сход мясцовых актывістаў па абраньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Каля 19 гадзінаў у прыватны дом каля Прымаставога пляцу, дзе адбываўся сход, уварваліся чацьвёра міліцыянтаў з відэакамерай. Яны заявілі, што ў пастарунак паступіў тэлефонны званок пра бойку ў доме. Групу мазырскіх міліцыянтаў ачольваў намесьнік начальніка аддзелу ўнутраных справаў падпалкоўнік Леанід Чобчыц. Жыхары з суседняга дому засьведчылі, што міліцыянты на аўтамашыне нават прывезьлі двух п’яных мужчын і паказалі: трэба ламацца ў прыватны дом кіраўніка абласной арганізацыі АГП ***Леаніда Арлова***, дзе распачаўся сход. Так і зьявіўся сігнал пра “бойку” ў доме. Правакацыя не ўдалася, і сход абраў дэлегатаў на Кангрэс.

***22 чэрвеня*** каля двух дзясяткаў прадстаўнікоў апазыцыйных палітычных партыяў сабраліся на Пляцы Волі ў Віцебску, каб выказаць сваю нязгоду з прысудамі двум лідэрам беларускай апазіцыі — ***Паўлу Севярынцу*** і ***Міколу Статкевічу***. Дарэчы, сам Павел Севярынец і ягоная маці Тацяна Севярынец таксама прыйшлі на плошчу, каб сустрэцца з землякамі. Праз 40 хвілін ад пачатку акцыі зьявіліся тры машыны міліцыянтаў і некалькі байцоў АМАПу. Некалькі хвілінаў удзельнікам акцыі ўдавалася стрымліваць напор міліцыянтаў, якія загадвалі ўсім разысьціся. Партыйцы пачалі пакідаць Пляц волі толькі тады, калі старшыню “Маладога фронту” ***Яніса Чучмана*** гвалтам запхнулі ў міліцэйскі легкавік. Сябра Партыі БНФ ***Хрыстафора Жэляпава*** затрымалі ўжо тады, калі ён сышоў з плошчы і рухаўся па вуліцы Леніна. Яго схапілі за рукі, пасадзілі ў машыну і павезьлі ў Кастрычніцкі райаддзел. А палове на дзевятую вечара Яніса Чучмана і Хрыстафора Жэляпава адпусьцілі. На іх абодвух склалі пратаколы за распаўсюд улётак без выходных дадзеных, зьмест якіх нясе шкоду дзяржаўнаму ладу і грамадзкаму парадку.

***28 чэрвеня*** ў Рэчыцы ўлады спрабавалі сарваць выбары дэлегатаў на Кангрэс дэмсілаў. У 19.30 міліцыянты, якіх ачольваў маёр, уварваліся ў прыватны дом на вуліцы Заслонава, дзе ладзіўся сход дэмакратычных актывістаў. Патлумачылі, што паступіў сігнал у пастарунак – у доме сабраліся бандыты. Міліцыянты запатрабавалі ў прысутных пашпарты, пагражаючы адвесьці ўсіх у пастарунак.

***29 чэрвеня*** Гарадзенскі абласны суд адмовіў актывістам АГП у задавальненьні скаргі на рашэньне Кастрычніцкага раённага суда Гародні, які пакараў удзельнікаў акцыі, наладжанай у гадавіну зьнікненьня Юрыя Захаранкі, па ч.1 арт.167-1 КаАП РБ: пяцёра аштрафаваны на 25 базавых велічынь, а ***Раман Юргель*** атрымаў штраф 160 базавых велічыняў. Удзельнікі ланцуга неабыякавых людзей зьвярнуліся ў Гарадзенскі абласны суд са скаргай на незаконную пастанову Кастрычніцкага раённага суду, але атрымалі адмоўны адказ: “Прызначанае вам пакараньне суадносіцца з характарам ўчыненага правапарушэньня”. Актывісты АГП зьбіраюцца абскарджваць рашэньні гарадзенскіх судоў у Вярхоўным судзе РБ.

***6 ліпеня*** ўвечары паўдзясятку міліцыянтаў з Чачэрску, якіх ачольваў маёр міліцыі Цалка, прыехалі ў вёску Залесьсе, каб сарваць раённы сход па абраньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Свой візіт у прыватны вясковы дом міліцыянты патлумачылі пошукам забітага чалавека і наркотыкаў. Яны ўчынілі пашпартную праверку ўсіх ўдзельнікаў сходу. З гаспадара дому ўзятае пісьмовае тлумачэньне.

***6 ліпеня*** пяцёа пакараных  удзельнікаў ланцуга неабыякавых людзей, прымеркаванага да шостых угодкаў зікненьня Юрыя Захаранкі падалі скаргі ў Вярхоўны суд краіны. Гэта ўжо трэццяя інстанцыя, у якой робіцца спроба абскардзіць незаконнае рашэньне Кастрычніцкага раённага суда Гародні.

***12 ліпеня*** старшыня Гарадзенскай абласной арганізацыі Партыі БНФ ***Сяргей Мальчык*** атрымаў адмоўны адказ на заяўку аб правядзеньні масавай акцыі, прымеркаванай да 595-х угодкаў Грунвальдзкай бітвы. “Гэтая адмова толькі апошняя ў шэрагу іншых: за апошнія тры гады гарвыканкам не даў дазволу на правядзеньне ніводнай акцыі, нягледзячы на тое, што ўсе паперы былі падрыхтаваныя і пададзеныя згодна з дзеючым заканадаўствам. Але тым ня менш, усе запланаваныя акцыі ў Гародні заўсёды адбываліся,” — зазначыў сп. Мальчык.

***16 ліпеня*** баранавіцкая міліцыя спрабавала сарваць сход грамадзкасьці па вылучэньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Сход, у якім удзельнічала больш за 40 чалавек, праходзіў у штаб-кватэры баранавіцкай арганізацыі Партыі камуністаў Беларускай. Падчас яго правядзеньня ў партыйны офіс прыйшлі больш дзясятку міліцыянтаў. Яны затрымалі ***Анатоля Лябедзьку, Сяргея Калякіна*** і старшыню Менскай гарадзкой арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Ігара Шынкарыка***. У спадара Шынкарыка канфіскавалі 40 партыйных інфармацыйных бюлетэняў, а на спадароў Калякіна і Лябедзьку спрабавалі скласьці пратаколы за правядзеньне несанкцыянаванага мітынгу. Абодва палітыкі адмовіліся даваць паказаньні і пакінулі міліцэйскі пастарунак.

***18 ліпеня*** ў Чачэрску адбыўся суд над прадстаўнікамі Аб'яднанай грамадзянскай партыі ***Аркадзем Корхавым*** і ***Васілём Чытаевым***. Яны абвінавачваліся ў арганізацыі несанкцыянаванага сходу ў прыватным доме ў вёсцы Залесьсе Чачэрскага раёну – гэта быў сход па вылучэньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Апазіцыйных актывістаў аштрафавалі на 510 тысячаў рублёў кожнага.

***18 ліпеня*** жыхарам гораду Белазёрску ***Юрасю Губарэвічу*** і ***Зьміцеру Трацяку*** намесьнікам начальніка Берасьцейскага РУУС быў вынесены штраф у памеры 5 базавых велічыняў па 130 артыкулу КК РБ за тое, што яны 9 ліпеня знаходзіліся ў г.п. Дамачава без адпаведных дакументаў, чым парушылі правілы знаходжаньня грамадзянаў у памежнай зоне. Нагадаем, у той дзень у г.п. Дамачава адбыўся сход грамадзянаў па вылучэньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. На сход былі запрошаныя прадстаўнікі кааліцыі "Пяцёрка-плюс", але яны не змаглі сустрэцца з грамадзянамі. Па прыбыцьці ў г.п. Дамачава (дзе знаходзіцца памежны пераход з Польшчай) усе яны былі затрыманыя. Першым затрымалі старшыню АГП А. Лябедзьку, потым на працягу 10 хвілінаў былі затрыманыя С. Шушкевіч, Т.Ваніна, А.Бухвостаў і шэраг іншых грамадзянаў, на кожнага былі складзеныя адмысловыя пратаколы, некаторыя аўто дагледжаныя, наяўная літаратура канфіскаваная.

***18 ліпеня*** ў Кіраўску судзьдзёй Уліцінай за правядзеньне адукацыйнага семінару арганізатару вынесены штраф памерам 50 базавых адзінак. 16 чэрвеня ў Кіраўску Магілёўскай вобласьці па ініцыятыве "Беларускага рэспубліканскага клубу выбаршчыкаў" быў арганізаваны адукацыйны семінар, на якім асьвятляліся некаторыя асьпекты працоўнага заканадаўства. На семінары прысутнічалі намесьнік начальніка Кіраўскага РАУС Пётр Пятроў, а таксама начальнік Кіраўскага РАУС Бізуноў. Пасьля выступу прадстаўніцы "Беларускага рэспубліканскага клубу выбаршчыкаў" ***Ганны Гатавец*** яна была запрошаная вышэй згаданымі супрацоўнікамі міліцыі "для размовы" у Кіраўскі раённы аддзел унутраных справаў, дзе на яе быў складзены пратакол па артыкуле 167 ч. 1 КаАП РБ — парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў.

***23 ліпеня*** каля 60 чалавек сабралася на сход у Бабруйску, каб вылучыць дэлегатаў на Кангрэс дэмсілаў. Каля 15 супрацоўнікаў міліцыі спрабавалі ўвайсьці ў прыватны дом, дзе праходзіў сход, і перапісаць імёны яго ўдзельнікаў. Паколькі на падобныя дзеяньні міліцыянты ня мелі афіцыйнай санкцыі, таму іх папросту не пусьцілі.

***26 ліпеня*** моладзевы летнік на базе адпачынку "Белае возера" у Берасьцейскім раёне, у якім бралі ўдзел каля 30-ці прадстаўнікоў беларускіх і украінскіх грамадзкіх арганізацыяў і палітычных партыяў, наведалі прад-

стаўнікі раённай міліцыі і некалькі асобаў у цывільным. Нагодай для візіту нібыта сталася праверка пашпартнага рэжыму, аднак неўзабаве міліцыянты пачалі складаць пратаколы на некаторых удзельнікаў летніку – намесьніка старшыні абласной арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) ***Ігара Маслоўскага***, лідэра абласной суполкі Свабоднага прафсаюзу ***Валянціна Лазарэнкава***, дэпутатку Белаазёрскага гарсавету ***Наталю Акаронка***, а таксама трох грамадзянаў Украіны. Усе яны былі абвінавачаныя ў арганізацыі несанкцыянаванага сходу. Асобам, на якіх склалі пратаколы, загадалі 1 жніўня зьвіцца ў суд Берасьцейскага раёну, а пакуль дзейнасьць летніку прыпыненая, нягледзячы на тое, што арганізатары сплацілі выдаткі за арэнду памяшканьня.

***27 ліпеня*** жыхары Віцебску ***Барыс Хамайда*** і ***Сяргей Міркушоў*** атрымалі па тры мільёны штрафу за віншаваньне з Днём Незалежнасьці гараджанаў. У гэты дзень яны выйшлі ў цэнтр Віцебску з бел-чырвона-белым сьцягам і плакатам “Віншуем усіх з Днём Незалежнасьці!” Гэткім чынам яны вырашылі нагадаць землякам пра ўгодкі Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, прынятай Вярхоўным Саветам БССР 27-га ліпеня 1990-га году. Ужо праз 25 хвілінаў апазіцыйных актывістаў затрымалі міліцыянты і байцы АМАПу. Пасьля складаньня пратаколу абодвух затрыманых адразу з пастарунку накіравалі ў Чыгуначны раённы суд, дзе згодна з рашэньнем суда іх прызналі вінаватымі ў арганізацыі грамадзкай акцыі без дазволу ўладаў. Між тым, у Віцебску прайшло і санкцыянаванае гарвыканкамам сьвяткаваньне ўгодкаў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце: сябрам Партыі БНФ, якія падавалі заяўку на правядзеньне сьвяточнае акцыі, улады дазволілі праводзіць імпрэзу. Але ня ў цэнтры гораду, на Пляцы Волі, як прасілі арганізатары, а ў Парку культуры і адпачынку «Мазурына», які на ўскрайку. Арганізатары пагадзіліся і на такія ўмовы, бо ў Віцебску ўпершыню за апошнія некалькі гадоў сьвяткуецца Дзень Незалежнасьці паводле ініцыятывы прадстаўнікоў апазіцыйных сілаў.

***1 жніўня*** на заклік лідэраў партыяў дэмакратычнай апазіцыі праявіць салідарнасьць са ***Сьвятланай Завадзкай***, зьбітай тры тыдні таму міліцыянтам, на Кастрычніцкую плошчу выйшлі больш за 30 чалавек. Трымаючы ў руках партрэты яе мужа Дзьмітрыя Завадзкага, удзельнікі акцыі расьцягнуліся уздоўж плошчы. Сьвятлана Завадзкая дзякавала ўсім, хто прыйшоў выказаць з ёй сваю салідарнасьць. Удзельнікаў акцыі атачыў аддзел АМАПу і пачаў выціскаць з плошчы. Афіцэр, які кіраваў гэтай аперацыяй, загадаў сваім падначаленым паводзіць сябе вельмі карэктна. Удзельнікі акцыі былі выціснутыя на вуліцу Няміга, дзе іх пакінулі.

***8 жніўня*** баранавіцкая міліцыя абвінаваціла ***Міколу Статкевіча*** ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу на тэрыторыі сьпецкамендатуры,

дзе ён адбывае пакараньне за арганізацыю вулічных дэманстрацыяў 18 і 19 кастрычніка 2004 году супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і рэферэндуму. Адміністрацыйная справа супраць Міколы Статкевіча распачатая паводле 167-га артыкулу Адміністрацыйнага кодэксу. Несанкцыянаваным мітынгам супрацоўнікі баранавіцкай міліцыі палічылі тое, што ў дзень прыезду да брамы сьпецкамендатуры палітыка праводзілі паплечнікі і прадстаўнікі мясцовых дэмакратычных арганізацыяў. Справу вядзе Берасьцейскае абласное аддзяленьне Камітэту па выкананьні пакараньняў. Мікола Статкевіч лічыць, што справу распачалі дзеля таго, каб пазбавіць яго некаторых свабодаў, прадугледжаных унутраным распарадкам. Калі Міколу Статкевіча пакараюць паводле адміністрацыйнага артыкулу, то гэта будзе лічыцца першым парушэньнем рэжыму. Паводле інструкцыі, калі няма парушэньняў, то асуджанаму могуць дазволіць жыць са сваёй сям'ёй (пры ўмове, што яна будзе арандаваць жыльё ў мясцовасьці, дзе знаходзіцца сьпецкамэндатура). У выніку трох парушэньняў асуджанага наагул могуць пазбавіць магчымасьці наведваць сям'ю на выходныя. Апроч таго, на такіх пакараных не распаўсюджваецца амністыя.

***11 жніўня*** паводле рашэньня Берасьцейскага раённага суда кіраўнік абласнога аддзяленьня "Беларускага Хельсінкскага камітэту" ***Ігар Маслоўскі*** і старшыня абласной арганізацыі Свабоднага прафсаюзу ***Валянцін Лазарэнкаў*** аштрафаваныя на 20 базавых велічыняў (510 тысячаў рублёў) кожны за арганізацыю летніка. Суд разглядаў справу на падставе складзеных міліцыянтамі адміністрацыйных пратаколаў, дзе міжнародны летнік з удзелам беларускай і ўкраінскай моладзі, які ладзіўся напрыканцы ліпеня на базе адпачынку "Белае возера", прызнаны несанкцыянаваным сходам.

***12 жніўня*** а палове на шостую ў Барысаве пачалася акцыя ў знак падтрымкі незалежных газетаў "Барысаўскія навіны" і "Курьер из Борисова". Гэтым выданьням спачатку адмовілі распаўсюдзе праз дзяржаўную сетку, а потым забаранілі прыватным прадпрымальнікам гандляваць незалежнымі выданьнямі на вуліцы. Калектывы рэдакцыяў амаль штодня наведваюць суд, бо там ідзе разгляд зыскаў супраць газетаў. На цэнтральную плошчу Барысаву насупраць будынку гарвыканкаму выйшлі калектывы рэдакцый "Барысаўскіх навін" і "Курьер из Борисова", а таксама некалькі дзясяткаў актывістаў моладзевага руху "Зубр", "Маладога Фронту", аб'яднаньня "Волат". Яны трымалі ў руках асобнікі незалежных газет.

***21 жніўня*** ў Ельску мясцовыя міліцыянты блакавалі дом на вуліцы Калініна, дзе павінен быў адбыцца сход па абраньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Яны спынялі ўсіх, хто падыходзіў да дому. Адключана была тэлефонная сувязь. На тры гадзіны затрымала міліцыя і кіроўцу прыватнага мікрааўтобусу ***Уладзіміра Шыцікава***, які прывёз у райцэнтр

каардынатараў сходаў з Гомелю ***Уладзіміра Кацору*** і ***Андрэя Толчына***. За імі вялося вонкавае назіраньне. Маёр міліцыі Аляксей Шаўчук спрабаваў затрымаць спадароў Кацору і Толчына на рынку ў кавярні, дзе тыя спыніліся папіць мінеральнай вады. Ахоўнік патлумачыў, што ў міліцыі выклікаюць падазрэньні ўсе новыя людзі, што прыязджаюць у Ельск. Але паколькі ў актывістаў былі з сабою пашпарты, то прычапіцца маёру больш не было да чаго. Сход у Ельску па абраньні дэлегатаў на Кангрэс не адбыўся.

***23 жніўня*** каля дзесяці чалавек прынялі ўдзел у санкцыянаванай акцыі пратэсту на плошчы Бангалор супраць планаў расейскамоўнага вяшчаньня на Беларусі радыёстанцыяй “Нямецкая хваля”. Першая такая акцыя прайшла таксама на плошчы Бангалор 22 жніўня. Падчас акцыяў праводзіцца збор подпісаў за тое, каб вяшчаньне на Беларусь новай праграмы “Нямецкай хвалі” вялося на беларускай мове.

***26 жніўня*** адміністрацыйная камісія Бярозаўскага райвыканкаму разгледзела пратакол, складзены ў Дамачаўскім аддзяленьні міліцыі Берасьцейскага РУУС на дэпутата Белаазёрскага гарсавету ***Юрася Губарэвіча***. З яго вынікае, што Губарэвіч быў затрыманы пры распаўсюдзе інфармацыйнага бюлетэню, які нібыта пагражае існуючаму дзяржаўнаму ладу. З абвінавачаньнямі, вылучанымі ў яго бок, Ю. Губарэвіч не пагадзіўся. Ён патлумачыў, што бюлетэнь ім не распаўсюджваўся, а быў знойдзены ў багажніку ягонага аўтамабілю. Акрамя таго, бюлетэнь — інфармацыйнае выданьне, у якім зьмешчаная інфармацыя пра магчымых кандыдатаў у прэзідэнты, пра дзейнасьць недзяржаўных арганізацыяў, і ён ня носіць антыдзяржаўнага характару. Да таго ж, бюлетэнь мае выходныя дадзеныя. Па словах Юрася Губарэвіча, згодна з Адміністрацыйным кодэксам Беларусі, такія справы разглядае камісія на месцах, а дэпутата чамусьці выклікалі ў Бярозаўскі райвыканкам. Зьвяртаючы ўвагу на шматлікія парушэньні, дэпутат запатрабаваў выклікаць сьведкаў інцыдэнту і папрасіў перанесьці разгляд справы. З патрабаваньнем дэпутата камісія пагадзілася.

***29 жніўня*** ў Берасьцейскім раённым судзе пад старшынствам судзьдзі Мікалая Сенько адбыўся разгляд адміністрацыйнай справы сябра Партыі камуністаў Беларускай ***А.Новіка*** па ч.1 арт.167-1 — правядзеньне несанкцыянаванага сходу. Як несанкцыянаваны сход супрацоўнікі міліцыі, а затым і суд расцанілі сход арганізацыйнай структуры ПКБ па вылучэньні дэлегатаў на Кангрэс дэмсілаў ад Берасьцейскага раёну, які адбываўся 9 ліпеня па яе юрыдычным адрасе. У судзе А.Новік патлумачыў, што па юрыдычным адрасе першаснай арганізацыі ПКБ праводзіўся планавы сход, які быў адкрытым, і супрацоўнікі міліцыі на ім не прысутнічалі, а таму выказаў зьдзіўленьне класіфікацыяй апошнімі цалкам законнага мерапрыемства “несанкцыянаваным сходам”. Выкліканыя ў суд у якасьці сьвед-


Праваабарончы Цэнтр «Вясна»

каў міліцыянты прызналі, што на самім сходзе не былі, але бачылі людзей на падворку, а таксама спасылаліся на шматлікія званкі “пільных грамадзянаў”, якія ўказалі на арганізатараў “несанкцыянаванага сходу”. Судзьдзя вынес рашэньне пакараць А. Новіка штрафам у памеры 40 базавых велічыняў (каля 500 даляраў ЗША).

***2 верасьня*** ў Ваўкавыскі раённы суд выклікалі двух мясцовых актывістаў АГП ***Аляксандра Барадаўкіна*** і ***Віталя Гуляку***, на якіх былі складзеныя пратаколы аб удзеле ў несанкцыянаваным пікеце 27 жніўня — падчас паўторнага правядзеньня 6-га зьезду Саюзу палякаў. Абодва партыйцы ў суд не зьявіліся. Як патлумачыў гарадзенскі лідэр АГП Юры Істомін, была парушаная працэдура ўручэньня судовай позвы. А.Барадаўкіну і В.Гуляку ўкінулі позвы ў паштовыя скрынкі, хаця павінны былі ўручыць ім асабіста ці іхнім родным.

***7 верасьня*** ў Ваўкавыску суд аштрафаваў на 600 тысяч рублёў актывіста Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Віталя Гуляку***. Ён пакараны за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце падчас правядзеньня у Ваўкавыску паўторнага зьезду Саюзу палякаў.

***8 верасьня*** ў Ваўкавыску да трох сутак арышту асуджаны старшыня мясцовай раённай арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Аляксандр Барадаўкін***. Такое пакараньне суд вызначыў яму за нібыта ўдзел у несанкцыянаваным пікеце 27 жніўня, калі ў Ваўкавыску адбываўся паўторны зьезд “Саюзу палякаў на Беларусі”.

***8 верасьня*** чацьвёра віцяблянаў затрыманыя за тое, што віншавалі з Днём беларускай вайсковай славы. Віцебскія сябры Кансерватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ ***Уладзімір Плешчанка*** і ***Аляксандр Салаўян***, а таксама беспартыйны апазіцыянер ***Барыс Хамайда*** і прадпрымальнік ***Сяргей Міркушоў*** выйшлі аб 11-й раніцы на вуліцу Леніна з бел-чырвон-белым сьцягам і вялікімі каляровымі плакатамі. Першы плакат —“Сёньня Дзень беларускай вайсковай славы”. Другі пра тое, што канкрэтна адбылося ў гэты дзень: “8 верасьня 1514 году 30 тысяч беларускіх ваяроў пад Воршай разьбілі ўшчэнт 80-тысячнае маскоўскае войска. Слава беларускім героям!” Апошні плакат — “Вось так трэба бараніць сваю незалежнасьць і волю Радзімы!”. Дачакаўшыся зьяўленьня маёра з Чыгуначнага райаддзелу, некалькі байцоў АМАПу загадалі апазіцыянерам сядаць у міліцэйскія машыны. У пастарунку на кожнага склалі пратакол за несанкцыянаванае пікетаваньне, і затрыманых скіравалі ў раённы суд. У якасьці рэчавых доказаў туды ж перадалі і сьцяг з усімі плакатамі, але судзьдзя Грабянчук адклала разгляд справы.

***12 верасьня*** амаль па 4 мільёны штрафу (каля 2 тысячаў даляраў

кожны) атрымалі віцебскія грамадзка-палітычныя актывісты ***Уладзімір Плешчанка, Аляксандр Салаўян, Барыс Хамайда*** і прадпрымальнік ***Сяргей Міркушоў*** за віншаваньне з Днём беларускай вайсковай славы. Віншавальная акцыя была прызнаная судом несанкцыянаваным пікетам, і усім ўдзельнікам судзьдзя Чыгуначнага раённага суда Наталя Грабянчук вынесла пакараньне ў выглядзе штрафу ў памеры 150 базавых велічыняў.

***14 верасьня*** пасьля жалобнага разьвітаньня з Уладзімірам Падалянам, першым сакратаром Магілёўскага абласнога аддзяленьня Партыі камуністаў Беларусі, былі затрыманыя магілёўскія грамадзка-палітычныя дзеячы. У гэты дзень разьвітацца з Уладзімірам Падалянам прыйшло больш сотні чалавек, сярод якіх было шмат актывістаў маглёўскіх дэмакратычных арганізацыяў. Падчас разьвітаньня працэсія ўвесь час была аточаная супрацоўнікамі міліцыі ў форме і ў цывільным. Асобамі ў цывільным вяліся здымкі падзеяў на відэа. На шляху да могілак труну з целам У. Падаляна зьбіраліся даставіць да будынку абласнога ліцэю, у якім нябожчык працаваў з часу ягонага заснаваньня, для таго, каб з ім маглі разьвітацца ягоныя былыя супрацоўнікі. Але ўлады не дазволілі гэтыму адбыцца: заняткі ў ліцэі па загадзе з райвыканкаму былі датэрмінова скончаныя, вучні ды настаўнікі “адпраўленыя па дамах”; дарога да навучальнай установы была заблакаваная аўтамабілямі ДАІ ды МУС, а таксама супрацоўнікамі камунальных службаў, якім тэрмінова спатрэбілася “прыбраць тэрыторыю”. Чатыры актывісты магілёўскіх дэмакратычных арганізацыяў не змаглі прыняць удзелу ў пахаваньні. Каля будынку ліцэю ***Рыгор Костусеў*** (кіраўнік магілёўскай абласной арганізацыі Партыі БНФ), ***Барыс Бухель*** (праваабаронца), ***Валянціна Шчэтнікава*** (актывіст Партыі БНФ) і ***Ларыса Шукайла*** (актывіст КХП-БНФ) больш гадзіны былі заблакаваныя ў аўтамабілі сп. Костусева. Кіраваў затрыманьнем падпалкоўнік міліцыі, намесьнік загадчыка Кастрычніцкага РУУС г. Магілёву Пётр Шашкоў. Толькі пасьля таго, як пахавальная працэсія вярнулася з могілак, актывісты былі вызваленыя. Рыгор Костусеў лічыць, што міліцыянтам быў дадзены загад затрымаць іх, каб не дапусьціць выступу на пахаваньні.

***14 верасьня*** актывісты беларускай дыяспары ў ЗША правялі акцыю пратэсту, прымеркаваную да прыезду Аляксандра Лукашэнкі на сесію ААН у Нью-Ёрку. Удзельнікі акцыі стаялі адразу ля агароджанага для прэсы і супрацоўнікаў ААН праходу ў будынак арганізацыі. Усе, хто ішлі ў будынак ААН, праходзілі каля бел-чырвона-белых сьцягоў і чулі лозунгі “Belarus - YES!, Lukashenka – NO!”.

***26 верасьня*** Берасьцейскі абласны суд не задаволіў скаргу актывістаў, якія абвінавачваліся ў правядзеньні несанкцыянаванага сходу. Нагадаем, што ў ліпені шэрагам грамадзкіх арганізацыяў пры падтрымцы Фон-

ду Эберта на Белым возеры (Берасьцейскі раён) быў праведзены семінар на тэму Еўрасаюзу. Тады на кіраўніка Берасьцейскай абласной арганізацыі работнікаў адукацыі Свабоднага прафсаюзу Беларускага ***Валянціна Лазарэнкава*** і кіраўніка Берасьцейскага аддзяленьня БХК ***Ігара Маслоўскага*** міліцыянтамі былі складзеныя пратаколы аб парушэньні закону “Аб масавых мерапрыемствах”. Берасьцейскі раённы суд у жніўні пакараў актывістаў штрафам у 510 000 рублёў кожнага. І вось цяпер судзьдзя Берасьцейскага абласнога суду Н. Сянько пакінула рашэньне раённага суда бяз зьменаў.

***28 верасьня*** Берасьцейскі абласны суд не задаволіў скаргу ***Анатоля Новіка*** — актывіста Брэсцкай раённай арганізацыі (ПКБ), дзе ён абскарджваў рашэньне пра штраф у памеры 40 базавых велічыняў. Штраф быў вынесены за правядзеньне быццам бы “несанкцыянаванага сходу» ў двары дому ў пасёлку Дамачава па юрыдычным адрасе пяершаснай партыйнай арганізацыі.

***30 верасьня*** адбыўся суд над ***Сяргеем Касьцюковічам***, які ўзначальвае пінскую арганізацыю Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), а таксама гарадзкую суполку прадпрымальнікаў у Свабодным прафсаюзе. У офіс свайго паплечніка па партыі ***Уладзіміра Зянько*** ён зайшоў з прыватнай справай. Тамсама з living рознымі службовымі клопатамі былі яшчэ некалькі чалавек. Неўзабаве зьявіўся нарад міліцыі на чале з намесьнікам кіраўніка гарадзкой управы Валерыем Грынько, які заявіў, што ім вядома пра наркотыкі ў памяшканьні. Калі наркотыкаў не знайшлі, тады на дзевяцярых прысутных асобаў былі складзеныя пратаколы за ўдзел у несанкцыянаваным сходзе. Гарадзкі суд прызнаў Сяргея Касьцюковіча вінаватым у арганізацыі несанкцыянаванага сходу і пакараў штрафам у 20 базавых велічыняў. Іншым прысутным у офісе было вынесена папярэджаньне. Спадар Касьцюковіч перакананы, што гэтак мясцовыя ўлады распраўляюцца за палітычную і грамадзкую актыўнасьць пінчукоў.

***11 кастрычніка*** ў Берасьці адбыўся суд над старшынёй Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Анатолем Лябедзькам***. Судзьдзя Берасьцейскага раёну Валянціна Кавенка спыніла разгляд адміністрацыйнай справы ў дачыненьні да лідэра АГП у сувязі з адсутнасьцю ў ягоных дзеяньнях складу правапарушэньня. У суд Анатоля Лябедзьку выклікалі паводле абвінавачаньня ў арганізацыі несанкцыянаванага сходу ў паселішчы Дамачава 9 ліпеня, калі адбывалася вылучэньне дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў.

***16 кастрчыніка*** ў Дні салідарнасьці ўзялі ўдзел больш за 100 тысяч жыхароў Беларусі. Акцыю актыўна падтрымалі ў многіх беларускіх гара-

дах і краінах сьвету. У сувязі з гэтым прадстаўнікі грамадзянскай супольнасьці Беларусі прапанавалі працягнуць правядзеньне Дзён салідарнасьці з палітвязьнямі, зьніклымі апазіцыянерамі, іх сем'ямі, незалежнымі журналістамі, з усімі, хто змагаецца за свабоду і дэмакратыю ў Беларусі 16 чысла кожнага месяца. Яны заклікалі 16 лістапада ў 20.00 выключыць у сваіх дамах сьвятло і запаліць сьвечкі Свабоды.

***30 кастрычніка*** больш за паўтысячы чалавек прайшлі шэсьцем да ўрочышча Курапаты і ўшанавалі памяць ахвяраў палітычных рэпрэсіяў. Акцыя, арганізаваная сябрамі Кансерватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ, была прымеркаваная да Дня памяці продкаў – Дзядоў. Стала ўжо традыцыяй, што шэсьце на Курапаты пачынаецца ад парку Чалюскінцаў, дзе сталінскім часам карнікі НКВД расстрэльвалі бязьвінных людзей. Калона з бел-чырвона-белымі сьцягамі па ходніках прайшла ў накірунку ўрочышча Курапаты – усяго каля дзесяці кіламетраў пешшу. Дэманстранты несьлі крыжы і плакаты з надпісамі: “Ушануем памяць ахвяраў Курапатаў”. Жалобнае шэсьце і мітынг былі санкцыянаваныя ўладамі, калону суправаджалі супрацоўнікі міліцыі ў цывільным. Па заканчэньні жалобнага мітынгу ўдзельнікі акцыі ўстанавілі ў Курапатах 11 крыжоў, запалілі сьвечкі і прасьпявалі “Магутны Божа”.

***2 сьнежня*** Вярхоўны суд не задаволіў скаргу ўдзельнікаў гарадзенскай акцыі з нагоды шостых угодкаў зьнікненьня Юрыя Захаранкі і не знайшоў падставаў для адмены рашэньня Кастрычніцкага суда Гародні, пакінуўшы накладзеныя раней пакараньні ў выглядзе штрафаў. Удзельнікі гарадзенскай акцыі ***Андрэй Янушкевіч, Раман Юргель, Дзьмітрый Андрэйчык, Артур Сьмятанін, Юры Істомін*** і ***Мікола Воран*** ня лічаць свае дзеяньні незаконнымі.

***5 сьнежня*** жыхары Віцебску распачалі акцыю пратэсту супраць зьнікненьня газеты “Витебский курьер” з шапікаў — віцебская філія “Саюздруку” адмовілася распаўсюджваць гэтую недзяржаўную газету. Пры гэтым рэдактар газеты ***Уладзімір Базан*** атрымаў пісьмовае паведамленьне без аніякіх тлумачэньняў. У апошнім нумары “Витебского курьера” зьмешчаны адкрыты ліст чытачоў, якія не задаволеныя тым, што недзяржаўную газету ўціскаюць. Яны расцэньваюць гэта як парушэньне ўласных грамадзянскіх правоў на атрыманьне незаангажаванай інфармацыі, прапануюць іншым жыхарам гораду таксама пісаць лісты пратэсту ва ўсе адпаведныя інстанцыі.

***7 сьнежня*** кіраўнік Брэсцкай арганізацыі “Беларускага Хельсінкскага камітэту” ***Ігар Маслоўскі*** атрымаў ад мясцовых уладаў адмову на правядзеньне пікету 11 сьнежня, прымеркаванага да Міжнароднага дня правоў чалавека. Намесьнік старшыні гарвыканкаму Вячаслаў Хафізаў паве-

даміў, што заяўка арганізатараў мерапрыемства не адпавядае патрабаваньням, бо ў ёй адсутнічаюць "меры дзеля забесьпячэньня грамадзкага парадку і бясьпекі", а таксама не прадугледжаныя медыцынскае абслугоўваньне і ўборка тэрыторыі пасьля правядзеньня акцыі.

***10 сьнежня*** каля Дому сувязі ў Баранавічах прайшла акцыя ў абарону свабоды слова, прысьвечаная чарговай гадавіне прыняцьця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Каля дзясятку жыхароў гораду сталі ў ланцуг каля Дому сувязі, трымаючы ў руках газеты "Народная воля", "Наша Ніва" і "Товарищ", якія нядаўна былі выключаныя з падпіснога каталогу на 2006 год. Пасьля акцыі, якая доўжылася каля 20 хвілінаў, некалькі чалавек накіравалася ў аддзяленьне сувязі, каб падпісацца на газету "Народная воля". Там ім паведамілі, што падпіска на гэтую газету, як і на шэраг іншых, больш не прымаецца, пасьля чаго некалькі чалавек выказалі сваё абурэньне гэтым фактам у кнізе водгукаў і прапаноў.

***13 сьнежня*** амаль на дзьве гадзіны супрацоўнікі міліцыі затрымалі кіроўцу і мікрааўтобус, на якім дэлегацыя разам з ***Аляксандрам Мілінкевічам*** перамяшчалася па Берасьці. Міліцыянты ўважліва агледзелі машыну і рэчы, высьвятлялі, ці ня скрадзены гэты аўтамабіль. У міліцыянтаў выклікалі падазрэньне відэакасеты з мультфільмамі "Прыгажуня ў сонным лесе", "Папялушка" ды іншымі, якія Аляксандр Мілінкевіч прывёз дзіцячаму сірочаму прытулку. У райаддзеле міліцыі ўсе гэтыя касеты прагледзелі, але нічога крамольнага там не знайшлі. Пасьля гэтага кіроўцу адпусьцілі, а касеты вярнулі. За два дні паездкі па Берасьцейшчыне транспарт каманды Мілінкевіча затрымлівалі чатыры разы. Міліцыянты тлумачылі свае дзеяньні правядзеньнем аперацыі "Нелегал". Літаральна за 5 хвілін да сустрэчы на прахадной берасьцейскага заводу "Сьветатрон" супрацоўнікі Дзяржаўтаінсьпекцыі зноў затрымалі аўтамабіль Аляксандра Мілінкевіча. І кіроўцу, і аўтамабіль старанна правяралі супрацоўнікі ДАІ. Спадару Мілінкевічу давялося перасесьці ў іншы аўтамабіль, каб не спазьніцца на сустрэчу. Увечары міліцыянты сарвалі сустрэчу з інтэлігенцыяй, якая планавалася на кватэры аднаго з мясцовых актывістаў. На сустрэчу сабраліся каля 70 чалавек. Але літаральна праз 20 хвілін прыйшлі два супрацоўнікі міліцыі і сказалі, што ім паступіў сігнал аб правядзеньні ў памяшканьні несанкцыянаванага сходу. Яны прыгразілі, што выклічуць сьпецпадразьдзяленьне, і па просьбе сп. Мілінкевіча удзельнікі сустрэчы вымушаныя былі разысьціся. Аднак на гаспадара, кіраўніка гарадзкога штабу ***Зьміцера Шыманскага*** усё роўна быў складзены пратакол за правядзеньне несанкцыянаванага сходу.

***16 сьнежня*** а 19-й гадзіне ў Сьветлагорску каля гандлёвага цэнтру міліцыя спрабавала перапыніць акцыю салідарнасьці "Запалі сьвечку", пяцёра ўдзельнікаў былі затрыманыя і дастаўленыя ў міліцэйскі паста-

рунак. Сярод затрыманых – старшыня раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы ***Тэльман Масьлюкоў***, намесьнік кіраўніка раённай арганізацыі ПКБ ***Мікалай Міхалькевіч***, а таксама трое маладых актывістаў – ***Андрэй Музычэнка, Вадзім Данільчанка*** і ***Руслан Лютарэвіч***. Маладых актывістаў у пастарунку проста сфатаграфавалі і ўзялі адбіткі пальцаў. Як патлумачыў намесьнік начальніка міліцыі Пётр Зыкун, спадара Масьлюкова абвінавацілі ў распаўсюдзе друкаванай прадукцыі ад імя незарэгістраванай арганізацыі “Зубр”. Прадстаўніка ПКБ Мікалая Міхалькевіча абвінавацілі ў непадпарадкаваньні супрацоўнікам міліцыі.

***23 сьнежня*** сябра партыі БНФ ***Віктара Мезяка*** з Баранавічаў наведалі міліцыянты і склалі пратакол за адміністрацыйнае парушэньне па арт. 167 КаАП (несанкцыянаванае масавае мерапрыемства). Справа тычылася правядзеньня акцыі ў падтрымку недзяржаўнай прэсы 10 сьнежня. Тады супрацоўнікі праваахоўных органаў нікога не чапалі, але потым пачалі хадзіць па кватэрах і складаць пратаколы. Два дні таму міліцыянты прыходзілі да Аркадзя Блінкоўскага, Сяргея Гоўшы і Віктара Сырыцы. Баранавіцкія актывісты складзеныя пратаколы адмаўляюцца падпісваць.

***27 сьнежня*** пачаўся суд над удзельнікамі акцыі ў абарону газеты “Витебский курьер”, якая праходзіла ў Віцебску 10-га сьнежня. Сямёра затрыманых партыйных актывістаў былі выкліканыя ў Кастрычніцкі раённы суд, але зьявіцца туды змаглі ня ўсе: ***Аляксандр Дарафееў*** раней быў арыштаваны і перавезены ў Менск. Спачатку яго нібыта падазравалі ў дачыненьні да віцебскіх выбухаў, а потым – у групавым разбойным нападзе. Сацыялдэмакраты ***Аляксей Гаўруцікаў, Зьміцер Караткевіч, Кацярына Самкоева, Іван*** і ***Аляксандра Церашы***, а таксама кіраўнік абласной арганізацыі Партыі БНФ ***Кастусь Смолікаў*** зайшлі ў судовую залу а палове на трэцюю дня, а выйшлі толькі ў пачатку восьмай вечару. Усіх актывістаў апыталі ў якасьці сьведкаў. Міліцыянты прадэманстравалі дакументальную хроніку акцыі, зьнятую службовым апаратарам. Але судовы працэс судзьдзя Валянціна Міхасёва так і не завершыла. Вынясеньне судовага рашэньня адкладзенае на наступны дзень. Дарэчы, адзін з удзельнікаў акцыі Іван Цераш ужо атрымаў спагнаньне за сваю апазіцыйную дзейнасьць: як толькі ў газеце “Витебский курьер” зьявіўся рэпартаж пра затрыманьне з ягоным фотаздымкам, адміністрацыя прадпрыемства кацельных і цеплавых сетак даслала папярэджаньне, што з ім ня будзе працягнуты кантракт.

***28 сьнежня*** адмовай адказаў Баранавіцкі гарвыканкам на заяву аб правядзеньні 29 сьнежня пікету ў падтрымку недзяржаўнай газеты “Intex-press”, якая была выключаная з падпіснога каталогу на 2006 год. Жыхары Баранавічаў ***Сяргей Гоўша, Віктар Сырыца*** і ***Карней Пятровіч*** прасілі гарвыканкам дазволіць ім правесьці пікет каля цэнтральнага вузла сувязі. Планавалася, што ў акцыі возьме ўдзел каля 30 чалавек. Сваю адмову

Баранавіцкі гарвыканкам аргументаваў найперш тым, што, паводле рашэньня гарвыканкаму ад 1998 году, пікеты ў горадзе можна праводзіць толькі ў старым і маладым парках. Па-другое, да заявы арганізатараў пікету не было прыкладзена пісьмовага абавязальніцтва захоўваць грамадзкі парадак падчас мерапрыемства.Як зазначыў Віктар Сырыца, у бліжэйшы час ён мае намер падаць яшчэ адну заяву на пікет, якая будзе адпавядаць усім патрабаваньням гарвыканкаму.

***28 сьнежня*** ў Кастрычніцкім раённым судзе Віцебску завяршыўся судовы працэс над удзельнікамі акцыі ў падтрымку газеты "Витебский курьер" 10 сьнежня. Судзьдзя Валянціна Міхасёва вынесла рашэньне, згодна з якім ***Аляксей Гаўруцікаў, Канстанцін Смолікаў, Зьміцер Караткевіч, Кацярына Самкоева, Іван*** і ***Аляксандра Церашы*** аштрафаваныя на 20 базавых велічыняў (па 580 тысяч рублёў) па артыкуле 167-1 КаАП РБ (несанкцыянаваны пікет). Справа Аляксандра Дарафеева адкладзеная, бо ён знаходзіцца ў сталічным СІЗА.

## 9. Перасьлед прафсаюзаў, рабочага руху і прадпрымальнікаў. Парушэньне правоў грамадзянаў на працу і сацыяльную абароненасьць

***12 студзеня*** старшыню першаснай арганізацыі прыватных прадпрымальнікаў Гомелю ***Тацяну Марчанка*** выклікалі ў падатковую інсьпекцыю Савецкага раёну гораду. Там Дзьмітры Ждан, супрацоўнік названай установы, пагражаў ёй вялікімі штрафнымі санкцыямі і спыненьнем дзейнасьці арганізацыі ў выпадку, калі да 1 лютага юрыдычны адрас арганізацыі ня будзе прыведзены ў адпаведнасьць з патрабаваньнямі Жыльлёвага кодэксу. Паводле словаў Т. Марчанкі, зрабіць гэта немагчыма, таму што ахвотных прадаставіць офіс пад юрыдычны адрас "нячэсным" арганізацыям у Гомелі ўжо не засталося.

***27 студзеня*** ў Менску быў затрыманы былы дырэктар менскага заводу імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ***Міхаіл Крывамаз***, адзін з заснавальнікаў Грамадзянскай партыі Беларусі пад кіраўніцтвам Васіля Шлындзікава і сябра Беларускай асацыяцыі "Дзелавая ініцыятыва", якую ўзначальвае Міхаіл Марыніч. Васілю Шлындзікаву невядома, каб да Міхаіла Крывамаза былі нейкія прэтэнзіі праваахоўных органаў, і ён не выключае, што адной з прычынаў увагі ўладаў да Міхаіла Крывамаза было тое, што ён быў сябрам асацыяцыі "Дзелавая ініцыятыва".

***27 студзеня*** кіраўніцтва Лунінецкага заводу “Палесьсеэлектрамаш” абвясьціла рабочым, што да 28 лютага ўсе яны знаходзяцца ў вымушаным адпачынку. У загадзе дырэктара заводу Георгія Міцянёва гаворыцца, што прастой выкліканы немагчымасьцю атрымаць з Расіі сыравіну і матэрыялы пасьля ўвядзеньня новага прынцыпу спагнаньня падатку на дададную вартасьць. Раней лунінецкае прадпрыемства за гэтую сыравіну разьлічвалася электрарухавікамі, але цяпер бартэрныя аперацыі “Палесьсеэлектрамашу” рабіць забаранілі. У самім Лунінцы паведамленьне пра спыненьне заводу выклікала сапраўдны шок. Адна з мясцовых жыхарак паведаміла: “Людзі вельмі абураныя, яны нават за кватэру ня могуць разьлічыцца. Напрыклад, на ўчастку электракамфоркі ўвогуле спынілася ўся праца. За лістапад там атрымалі 70 тысяч рублёў, нават менш за пражытковы мінімум. Цяпер яны за дзьве траціны тарыфнай стаўкі атрымаюць тысяч 40, ня болей. Яны нават ня здолеюць аплаціць камунальныя паслугі”.

***28 студзеня*** з лідэрам арганізацыі АГП Першамайскага раёну г. Бабруйску ***Ірынай Качан***, якая працавала псіхолагам у Цэнтры сацыяльнага абслугоўваньня насельніцтва, без тлумачэньня прычынаў не працягнулі кантракт. Ірына намагалася ў якасьці кандыдата ў дэпутаты браць удзел у апошніх парламенцкіх выбарах, і калегі, якія ўвайшлі ў ініцыятыўную групу, зьбіралі подпісы за яе вылучэньне. Аднак кіраўніцтва Цэнтру забараніла жанчынам здаваць падпісныя лісты ў выбарчую камісію, і адным аргументам таксама былі кантракты і іх тэрміны. Ірына Качан гаворыць, што страта працы – вельмі непрыемная сітуацыя, аднак аптымізму не губляе і спадзяецца, што яны з сынам не застануцца без кавалка хлеба. Жанчына вырашыла, што яна не скарыцца і не саступіць ціску з боку ўлады.

***1 лютага*** Рада Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) прыняла рашэньне аб правядзеньні ў Менску 24 лютага пікету. Актывісты незалежнага прафруху з усіх рэгіёнаў Беларусі зьбіраюцца правесьці яго на плошчы Ванеева. Сябры Рады лічаць важным яшчэ раз публічна выказаць сваё меркаваньне з нагоды працэсаў, якія адбываюцца ў краіне і ўшчамляюць інтарэсы працоўных. Мэта акцыі – выказаць пратэст супраць павальнай кантрактызацыі, прыцягнуць увагу грамадзкасьці да гэтай праблемы, а таксама выказаць салідарную падтрымку сябрам незалежных прафсаюзаў, якія пацярпелі ў выніку пераводу на кантрактную форму найму. Гэта зьвязана з фактамі звальненьня, напрыклад, старшыні першаснай арганізацыі работнікаў Наваполацкай ЦЭЦ Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ) ***Вадзіма Духоменкі***, а таксама сяброў Рады СПБ ***Юрыя Абухова*** і ***Юрыя Гайчанкі***. У кастрычніку 2004 году адміністрацыя РУП “Белаэранавігацыя” звольніла ў сувязі з заканчэньнем тэрміну заключанага на год кантракту былога віцэ-прэзідэнта Беларускага прафсаюзу авіядысьпетчараў Алега Долбіка.

***1 лютага*** пачаўся абвешчаны ў Пінску страйк прадпрымальнікаў, які падтрымалі амаль усе гандляры цэнтральнага рынку і кірмашу “Зорны”. Страйк пінскіх гандляроў скіраваны на тое, каб дамагчыся адмены падатку на дададзеную вартасьць у дачыненьні да тавараў, увезеных з Расіі. Акрамя таго, прадпрымальнікі выступаюць супраць абавязковых страхавых унёскаў у фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Кіраўнік прафсаюзай суполкі прадпрымальнікаў гораду ***Сяргей Касьцюковіч*** паведаміў: “Наша акцыя адбываецца пад лозунгамі “Мы ня хочам павышаць цэны” і “Не — зьнішчэньню малога бізнэсу”. Справа ў тым, што калі горад зьдзейсьніць запланаванае, значная частка прадпрымальнікаў будзе вымушаная сысьці з рынкаў і папоўніць шэрагі беспрацоўных, а кошт тавараў вырасьце на 40 – 50%”.

***1 лютага*** Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў накіраваў у Міжнародную арганізацыю працы заяву пра нежаданьне ўладаў Беларусі выпраўляць становішча з правамі прафсаюзаў. Гэтае пытаньне мусіць стаць адной з тэмаў абмеркаваньня на рэгіянальнай Еўрапейскай канферэнцыі МАП, якая пройдзе ў Будапешце з 14 да 18 лютага. Міжнародная арганізацыя працы дасьледавала і прызнала факт парушэньня правоў незалежнага прафсаюзнага руху Беларусі і прапанавала выправіць становішча. Беларускі ўрад паабяцаў іх выканаць, але цягам некалькіх месяцаў ніякіх захадаў у гэтым кірунку ня зроблена.

***3 лютага*** ў Пінску працягваўся страйк прадпрымальнікаў цэнтральнага кірмашу, распачаты 1 лютага. Кожную раніцу а дзявятай гадзіне прадпрымальнікі зьбіраюцца на сход. Абмяркоўваюць план дзеяньняў, апошнія навіны і падзеі. Яны намерваюцца змагацца да перамогі. 2 лютага ў памяшканьні пінскай падатковай інсьпекцыі адбылася сустрэча прадпрымальнікаў-страйкоўцаў, якіх было каля ста чалавек, з намесьнікам міністра па падатках і зборах Аляксандрам Дарашэнкам. Сустрэча прайшла спакойна. Чыноўнік спрабаваў растлумачыць бізнэсоўцам сэнс апошніх наваўвядзеньняў, супраць якіх прадпрымальнікі якраз і змагаюцца. На гэтай сустрэчы Аляксандр Дарашэнка выказаўся ў тым сэнсе, што гэтыя нова-ўвядзеньні зьяўляюцца вынікам міждзяржаўных пагадненьняў паміж Беларусьсю і Расіяй, і таму ніякія высілкі прадпрымальнікаў ягонай установай улічвацца ня будуць.

***8 лютага*** ў Гародні супрацоўнікі міліцыі спрабавалі затрымаць старшыню незарэгістраванага дэмакратычнага руху “Гарадзенскі выбар” ***Дзьмітрыя Іваноўскага*** з-за маючага адбыцца 10 лютага мітынгу пратэсту гарадзенскіх прадпрымальнікаў. Раніцай у майстэрню Іваноўскага прыйшлі невядомыя. “Яны пастукалі ў дзверы і прапанавалі мне адчыніць. Я папрасіў, каб прадставіліся. Гэтага яны не зрабілі,” – распавёў Дзьмітрый Іваноўскі. Пасьля гэ-

тага машына з супрацоўнікамі міліцыі ў цывільным цэлыя суткі дзяжурыла ля майстэрні.

***9 лютага*** лідэру мясцовых прадпрымальнікаў Лепелю, сябру грамадзкага аб'яднаньня "Персьпектыва" ***Алегу Тычыну*** ўручана позва зьявіцца ў пракуратуру раніцай 10 лютага з мэтай "даць тлумачэньні". Паводле спадара Тычыны, выклік яго у пракуратуру – невыпадковы. На 10 лютага ў гэтым горадзе запланаваны страйк прадпрымальнікаў.

***10 лютага*** старшыня РГА "Персьпектыва" ***Анатоль Шумчанка*** асуджаны судом Цэнтральнага раёну Менску да 10 сутак адміністрацыйнага арышту па артыкуле 167.3 КаАП РБ – арганізацыя несанкцыяванага шэсьця. А.Шумчанка быў затрыманы ўвечары 9 лютага па падазрэньні ў тым, што ягоны аўтамабіль патрапіў у ДТЗ, у выніку якога пацярпеў пешаход. Шумчанку даставілі ў Партызанскі РУУС Менску, і толькі каля 22 гадзінаў стала вядома, што на яго складзены пратакол за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу. Ноч Анатоль Шумчанка правёў у Партызанскім РУУС, раніцай яго даставілі ў сьпецпрыёмнік-разьмеркавальнік ГУУС Менгарвыканкаму , адтуль — у суд. 10 сутак адміністрацыйнага арышту А.Шумчанку вынесьлі за тое, што 5-9 лютага ён на рынку "Ждановічы" раздаваў бюлетэнь "Камерсант" з заклікам далучацца да папераджальнага страйку 10 лютага.

***10 лютага*** ўсебеларускі прадпрымальніцкі страйк падтрымалі ва ўсіх гарадах Беларусі. Асноўнае патрабаваньне прадпрымальнікаў – адмена падатку на даданую вартасьць. Падатак стаў вынікам міжурадавага пагадненьня Беларусі і Расіі аб зьмене прынцыпу спагнаньня падатку на даданую вартасьць. Беларускія ўлады сьцьвярджалі напачатку пра дамову з расейцамі, што пры пераходзе на гэты новы прынцып паводле краіны прызначэньня расейцы зьменшаць на 18 адсоткаў кошты сваіх тавараў, у тым ліку для індывідуальных прадпрымальнікаў. Але насамрэч нічога гэтага не адбылося. Беларускія бізнэсоўцы апынуліся пад дадатковы фінансавым прэсам у 18 адсоткаў, які, паводле іх падлікаў, ім не па плячы. Даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасьці, якія яны мелі дагэтуль, будуць цалкам "зьедзеныя" падаткам на даданую вартасьць. У гэты дзень не працавалі 85 адсоткаў гандлёвых пляцовак. У шэрагу гарадоў дробныя гандляры сабраліся на мітынгі – лік удзельнікаў гэтых акцыяў ішоў на тысячы.

***10 лютага*** ў Менску адбыўся стыхійны мітынг дробных прадпрымальнікаў, якія патрабавалі ад уладаў адмены для іх падатку на даданую вартасьць. Ня менш за 2 тысячы дробных бізнэсоўцаў з Менску, а таксама іншых гарадоў апоўдні сабраліся каля дэпартаменту прадпрымальніцтва Мінэканомікі. Яны настойвалі на сустрэчы з прадстаўнікамі міністэрства. Асноўнае патрабаваньне — адмена ПДВ для індывідуальных прадпрымальнікаў. Прадстаўнікі Мінэканомікі не захацелі сустракацца з прадпрымальнікамі –

адпаведны пісьмовы адказ на сваю прапанову зладзіць круглы стол атрымалі гандляры. Тады прадпрымальнікі рушылі да Міністэрства падаткаў і збораў. Туды да пратэстуючых выйшаў віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў і выступіў перад натоўпам. Ён заявіў пра немагчымасьць адмены ПДВ для індывідуалаў. Пасьля выступу віцэ-прэм'ера ў Міністэрства падаткаў і збораў на перамовы запрасілі восем прадстаўнікоў прадпрымальніцкага руху. Перамовы доўжыліся амаль тры гадзіны. У гэты час на прыступках урадавага будынку адбываўся мітынг. У выніку бакі дамовіліся пра тое, што будзе створаная працоўная група, якая мусіць вырашыць праблему з ПДВ да 20 лютага. У працоўную групу ўвойдуць прадстаўнікі ўраду і прадпрымальніцкага аб'яднаньня "Персьпектыва". Асноўныя гандлёвыя пляцоўкі сталіцы не працавалі ў знак падтрымкі страйку прадпрымальнікаў. За адмену падатку падпісаліся ўжо каля 30 тысяч чалавек.

***10 лютага*** ў Гомельскай вобласьці страйк падтрымалі звыш 10 тысячаў дробных прадпрымальнікаў буйнейшых рынкаў Гомелю, Рэчыцы, Сьветлагорску, Рагачову і іншых гарадоў. Амаль тры тысячы дробных прадпрымальнікаў Цэнтральнага рынку Гомелю ня выйшлі на працу. А 10-й гадзіне многія з іх паміж парожніх гандлёвых радоў падпісвалі зварот да ўладаў супраць увядзеньня падатку на дададаную вартасьць. У другой палове дня страйкоўцы гомельскіх рынкаў перадалі свае пісьмовыя патрабаваньні да ўладаў у аблвыканкам, дзе прысутнічалі і чыноўнікі Міністэрства падаткаў і збораў.

***10 лютага*** больш за чатыры тысячы гарадзенскіх прадпрымальнікаў прынялі ўдзел у акцыі пратэсту супраць увядзеньня падатку на дададаную вартасьць. Збор удзельнікаў акцыі пратэсту быў абвешчаны дэмакратычным рухам "Гарадзенскі выбар" у парку Жылібера аб 11-ай гадзіне. Ужо за поўгадзіны да акцыі на тэрыторыі парку былі сьцягнуты ўзмоцненыя нарады міліцыі. Дзеяньнямі міліцыі асабіста кіраваў намесьнік начальніка Упраўленьня ўнутраных справаў Гарадзенскага аблвыканкаму Юрый Чабанаў. Міліцыянты заклікалі людзей "разысьціся і не парушаць заканадаўства Рэспублікі Беларусь". Калі пратэстуючых сабралася больш за тры тысячы , яны рушылі ў бок цэнтральнай плошчы гораду. Дарогу ім перагарадзілі шэрагі АМАПаўцаў і салдатаў унутраных войскаў. Пасля некалькіх хвілінаў тузаніны прадпрымальнікі здолелі прарваць міліцэйскія кардоны і выйсьці на плошчу Леніна. Тут да ўдзельнікаў акцыі пачалі далучацца прадпрымальнікі, якія ня здолелі прайсьці ў парк Жылібера. У гэтыя хвіліны агульная колькасьць удзельнікаў пратэста перавысіла чатыры тысячы чалавек. "Свабоду!", "Далоў  НДС!" — скандавалі прадпрымальнікі. Да людзей выйшаў старшыня Гарадзенскага гарвыканкаму Аляксандр Антоненка, які сказаў, што паўнамоцтвы адмяняць ПДВ – гэта рэспубліканскі ўзровень. Прадпрымальнікаў цікавіў лёс лідэра дэмакратычнага руху "Гарадзенскі выбар" Дзьмітрыя Іваноўскага, якога напярэдадні спрабавалі

затрымаць супрацоўнікі міліцыі. Антоненка запэўніў, што ўлады гораду ня зробяць нічога, што выходзіла б за межы закону. Пасьля перамоваў ён сышоў. Праз паўтары гадзіны мітынг скончыўся. Калі людзі пачалі разыходзіцца, невядомыя ў цывільным зрабілі некалькі спробаў затрымаць найбольш актыўных удзельнікаў акцыі, але прадпрымальнікам удалося адбіць сваіх сяброў.

***10 лютага*** ў Віцебску прадпрымальнікі захапілі тры раённыя адміністрацыі. У гэты дзень зранку яны панесьлі ў раённыя адміністрацыі Віцебску заявы аб спыненьні сваёй дзейнасьці ў сувязі з увядзеньнем падатку на дададуную вартасьць. Адміністрацыі фактычна былі на некалькі гадзінаў блакаваныя. Чыноўнікі былі ў шоку. Удзел у акцыі прынялі больш за тысячу прадпрымальнікаў. На месца здарэньня былі выкліканыя ўзмоцненыя нарады міліцыі з аўтаматамі. Акцыя ў Віцебску адбылася ў рамках агульнарэспубліканскага страйку, які абвешчаны ў сувязі з увядзеньнем з 1 студзеня ПДВ на тавары, якія ўвозяцца ў Беларусь з Расіі.

***10 лютага*** адбылося першае паседжаньне суда Ленінскага раёна г.Гародні па зыску ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***, які запатрабаваў кампенсацыю маральнай шкоды ад трох адказчыкаў: тэлерадыёкампаніі "Гродна", журналісткі і падатковай інсьпекцыі Гарадзенскай вобласьці. Спадар Аўтуховіч патрабуе абвергнуць распаўсюджаныя тэлекампаніяй зьвесткі, прынесьці публічныя прабачэньні і кампенсаваць нанесеную яму маральную шкоду сумай у 40 мільёнаў рублёў. Прадпрымальнік сьцьвярджае, што тэлеканал зьняважыў яго гонар і годнасьць ў тэлевізійным сюжэце, які быў тройчы паказаны 28-га і 29-га верасьня 2004 г. У прыватнасьці, прадпрымальнік мае прэтэнзіі да аўтаркі сюжэту, журналісткі Вольгі Максімчык, якая паставіла пад сумнеў дабрачынную дапамогу Аўтуховіча дзіцячаму дому, а таксама заявіла, што прадпрымальнік хаваецца ад падаткаў, якія павінны ісьці на "рэальнае" ўтрыманьне дзяцей. М.Аўтуховіч падчас паседжаньня заявіў, што журналістка, рыхтуючы сюжэт, не зьвярталася ні да яго, ні да кіраўнікоў дзіцячых дамоў. Прадпрымальнік мае афіцыйныя лісты з дзіцячага дому і іншых установаў, якія пацвярджаюць зьвесткі аб аказанай ім дабрачыннай дапамозе. Першапачаткова зыск быў пададзены толькі супраць Гарадзенскага тэлебачаньня, але судзьдзя прыцягнула ў якасьці адказчыкаў таксама аўтарку ***Вольгу Максімчык*** і падатковую інсьпекцыю Гарадзенскай вобласьці, бо журналістка заявіла, што рабіла сюжэт на падставе зьвестак з гэтай установы. 23-га лютага адбудзецца чарговае паседжаньне.

***11 лютага*** ўвечары ў Сьветлагорску затрыманы намесьнік кіраўніка грамадзкага аб'яднаньня "Персьпектыва", мясцовы прадпрымальнік ***Анатоль Зьмітровіч.*** Трое міліцыянтаў у цывільным канфіскавалі ў актывіста 75 ксеракопіяў першай старонкі газеты "Народная воля", у якой апавядаецца пра мітынг у Менску і страйкі прадпрымальнікаў у рэгіёнах. У скла-

даньні пратаколу на Анатоля Зьмітровіча браў удзел і намесьнік начальніка сьветлагорскай міліцыі спадар Зыкун.

На ***11 лютага*** кіраўніцтва гомельскага акцыянернага таварыства "Локан" запрасіла сябра АГП, юрысконсульта ***Леаніда Судаленку*** забраць сваю працоўную кніжку і разьлік. Спадар Судаленка распавёў: "Мой дырэктар настойліва прапанавала мне звольніцца з працы. Да мяне як да юрыста пытаньняў не было. Звольніць мяне патрабуюць уладныя чыноўнікі. Дырэктарка патлумачыла: ня звольнюся я, яе выкінуць з працы. Я вымушаны быў напісаць заяву пра звальненьне. Уціск цалкам стасуецца з жаданьнем уладаў зганьбіць актывістаў, паказаць, што яны, маўляў, гультаі, працаваць ня хочуць".

***17 лютага***, пасьля перамоваў з уладамі, у выніку якіх бакі не прыйшлі да паразуменьня ў пытаньні падатку на дададеную вартасьць, беларускія прадпрымальнікі заявілі, што будуць рыхтавацца да новых акцыяў пратэсту. Перамовы паміж прадпрымальнікамі і ўладамі адбыліся ў дэпартаменце прадпрымальніцтва Міністэрства эканомікі. Сцэнар, які быў прапанаваны ўладамі, прадугледжваў стварэньне адмысловай рабочай групы для вырашэньня канфліктных пытаньняў у доўгатэрміновай перспектыве. Гэты парадак, аднак, не задаволіў лідэраў грамадзкага аб'яднаньня "Перспектыва". Намесьнік старшыні гэтага аб'яднаньня Аляксандр Лапотка абвясьціў чыноўнікам, што дэмагагічны характар перамоваў ня адпавядае той напружанасьці, што склалася зараз у прадпрымальніцкім асяродзьдзі. Кіраўнік урадавай дэлегацыі, намесьнік міністра эканомікі Андрэй Тур абвясьціў на перамовах, што ўрадавыя чыноўнікі ня маюць паўнамоцтваў адмяняць падатак на дададеную вартасьць. Ён паведаміў, што ўрад накіраваў Аляксандру Лукашэнку адмысловы ліст пра гэты падатак, у якім выказаны прапановы наконт урэгуляваньня канфліктнай сітуацыі, і цяпер яны чакаюць адказу. Разам з тым, паводле спадара Тура, ён не чакае, што Лукашэнка адменіць для прадпрымальнікаў падатковае новаўвядзеньне. Сябры "Перспектывы" палічылі далейшыя перамовы бессэнсоўнымі.

***18 лютага*** беларускія прадпрымальнікі абвясьцілі, што пытаньне ўвядзеньня падатку на дабаўленую вартасьць (ПДВ) яны зьбіраюцца абскардзіць у Канстытуцыйным судзе. Паводле бізнэсоўцаў, зварот у Канстытуцыйны суд таксама ёсьць адной з формаў іхняга пратэсту супраць увядзеньня згаданага падатку. Ініцыявалі зварот Беларускі саюз прадпрымальнікаў і прафсаюз "Садружнасьць". Рашэньне пра зварот у Канстытуцыйны суд разглядалася і грамадзкім аб'яднаньнем прадпрымальнікаў "Перспектыва".

***18 лютага*** пінскія прадпрымальнікі падчас сходу гандляроў на цэнт-

ральным рынку гораду прынялі рашэньне страйкаваць да 1 сакавіка. Раніцай гандляры рынкаў “Цэнтральны” і “Зорны” сабраліся на сход, дзе заслухалі сваіх калегаў, якія 17 лютага бралі ўдзел у перамовах з уладамі. Перамовы тычыліся спагнаньня з індывідуальных прадпрымальнікаў падатку на дададаную вартасьць на тавары, завезеныя з Расіі. Адразу пасьля сходу прадпрымальнікі зьбіраліся ісьці ў суд, каб падтрымаць свайго прафсаюзнага лідэра Сяргея Касьцюковіча, адносна якога павінна была разглядацца адміністрацыйная справа — нібыта за арганізацыю несанкцыянаванага сходу. Аднак высьветлілася, што суда ня будзе: міліцыянты адклікалі складзены на спадара Касьцюковіча пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні.

***19 лютага*** ў Бярозе пачалі страйкаваць рабочыя сумеснага прадпрыемства “Транс-Экспрэс”.  Да акцыі пратэсту рабочых падштурхнулі вельмі нізкія заробкі, якія не перавышаюць 80 тысячаў рублёў у месяц. Прадпрыемства “Транс-Экспрэс” сьпецыялізуецца на перапрацоўцы крэветак, якіх прывозяць у Беларусь з Нямеччыны і Галандыі. Сыравіна, што пастурае ў зімовы час – вельмі нізкай якасьці. Каб выканаць сваю дзённую норму, рабочыя вымушаныя працаваць да 12 гадзінаў, але гэта ніяк не адбіваецца на іхніх заробках. На прадпрыемстве працуе каля 200 чалавек (у асноўным жыхары Бярозы, Івацэвічаў і навакольных вёсак, дзе знайсьці іншую працу вельмі складана). Рабочыя кажуць, што кіраўніцтва “Транс-Экспрэсу” карыстаецца гэтым іхнім безвыходным становішчам.

***22 лютага*** на нарадзе лідэраў прадпрымальніцкага руху ў Менску было заяўлена, што беларускія прадпрымальнікі возьмуць актыўны ўдзел у бестэрміновым агульнабеларускім страйку, які плануецца пачаць 1 сакавіка. Мэта страйку — пратэст супраць увядзеньня падатку на дададаную вартасьць. У большасьці рэгіёнаў, як прагучала на нарадзе, працягваецца кампанія пісьмовага папярэджаньня падатковых інсьпекцыяў пра прыпыненьне бізнэсоўцамі ад 1 сакавіка падатковых выплатаў. Аднак падатковыя органы пакуль не рэагуюць на масавыя звароты бізнэсоўцаў. Прадстаўнік прэсавай службы Міністэрства падаткаў і збораў Сяргей Эйсмант пракаментаваў сітуацыю гэтак: “Пытаньне ўвядзеньня і адмены падаткаў не ўваходзіць у кампетэнцыю Міністэрства падаткаў і збораў. Мы выконваем закон. Было ўказана, што індывідуальныя прадпрымальнікі, якія выплачваюць адзіны падатак, пры ўвозе тавараў з Расейскай Федэрацыі павінны плаціць падатак на дададаную вартасьць у адпаведнасьці з пагадненьнем. На сёньняшні дзень гэтага ніхто не адмяняў. Таму падатковыя органы будуць патрабаваць уплаты падатку на дададаную вартасьць”.

***23 лютага*** на сходзе, што адбыўся на Прудкоўскім рынку Гомелю, прадпрымальнікі вырашылі спыніць працу з 1 сакавіка. Пасьля папераджальнага страйку з прычыны ўвядзеньня падатку на дададаную вартасьць

прайшло амаль два тыдні, аднак з боку мясцовай улады ніякай рэакцыі няма. Лідэр гарадзкой арганізацыі Свабоднага прафсаюзу прадпрымальнікаў Тацяна Марчанка тлумачыць: "Да гэтага часу, да сёньняшняга дня нашы ўлады не парупіліся сустрэцца з прадпрымальнікамі і пагаварыць пра гэтую праблему". Рашучасьць прадпрымальнікаў выкліканая надзвычай цяжкімі ўмовамі працы дробных бізнэсоўцаў.

***25 лютага*** актывіста БСДП (Народная грамада) ***Васіля Ваўранюка*** звольнілі з працы. Ён лічыць, што такім чынам яго пакаралі за палітычную і грамадзкую дзейнасьць: "Са мной ня быў працягнуты кантракт пасьля 24-гадовай працы ў Берасьцейскай мытні, хаця я не парушыў ніводнага пункту кантракту. Затое я браў актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі 2004 году на баку апазіцыі". Спадар Ваўранюк кажа, што ў леташнюю выбарчую кампанію ад мытнікаў увогуле патрабавалі рабіць шмат таго, што ніяк не зьвязана зь іхняй службовай дзейнасьцю: "На выбарах мытнікі прымусова павінны былі галасаваць датэрмінова. За гэтым пільна сачыла кіраўніцтва мытні. Кожны дзень даваліся даведкі начальніку Берасьцейскай мытні Мікалаю Сьвірыду пра тое, хто яшчэ не прагаласаваў датэрмінова. Непасрэдна на выбарах я быў назіральнікам і склаў пратакол аб фальсыфікацыях падчас падліку галасоў". Паводле ягоных словаў, адразу пасьля выбараў кіраўніцтва мытні папярэдзіла яго, што актыўная палітычная дзейнасьць можа паўплываць на падаўжэньне кантракту, які скончыўся сёлета ў лютым. Намесьнік кіраўніка Берасьцейскай мытні Канстанцін Руцкі абвяргае версію пра тое, што Васіля Ваўранюка звольнілі паводле матываў, не зьвязаных з ягонай прафесійнай дзейнасьцю.

***27 лютага*** ў Рэчыцы арыштаваны актывіст аб'яднаньня прадпрымальнікаў "Персьпектыва" ***Леанід Невар***. На вуліцы Чырвонаармейскай міліцыянты заблакавалі мікрааўтобус "Фіат", у якім ехаў Леанід Невар са сваёю жонкаю. Фармальнай зачэпкай сталася адсутнасьць на кузаве дубляванага нумару дзяржаўнай рэгістрацыі мікрааўтобуса. Спадар Невар пагадзіўся падпісаць адпаведны пратакол парушэньня, але мікрааўтобуса не пакінуў. Пад кіраўніцтвам начальніка Уладзімера Манжоса рэчыцкія міліцыянты дасталі з мікрааўтобусу задняе шкло. Жонка Леаніда Невара спрабавала клікаць людзей на дапамогу. Аднак міліцыянты ўсё адно гвалтам арыштавалі Леаніда Невара, абвінаваціўшы яго ў закліку да масавых беспарадкаў. Ноч прадпрымальнік правёў у адзіночнай камеры ізалятару часовага ўтрыманьня. Ад адваката родныя даведаліся, што ўначы ў спадара Невара былі сардэчныя прыступы, тры разы прыязджала "хуткая дапамога". Нараніцу ў Рэчыцкім судзе быў прызначаны разгляд адміністрацыйнай справы ў адносінах да Л. Невара. Яго абвінавачваюць ужо у дробным хуліганстве і непадпарадкаваньні міліцыі.

***28 лютага*** судзьдзя Ленінскага раёну Гародні Наталя Собалева ад-

хіліла зыск ***Мікалая Аўтуховіча*** да Гарадзенскага тэлебачаньня, журналісткі Вольгі Максімчык і падатковай інсьпекцыі па Гарадзенскай вобласьці. Прадпрымальнік сьцьвярджаў, што тэлеканал зьняважыў яго гонар і годнасьць ў тэлевізійным сюжэце, які быў тройчы паказаны 28-га і 29-га верасьня 2004 г., і ў якім ставілася пад сумнеў дабрачынная дапамога Аўтуховіча дзіцячаму дому.

***1 сакавіка*** адбыўся агульнанацыянальны страйк прадпрымальнікаў. Галоўная мэта акцыі – пратэст прадстаўнікоў дробнага бізнэсу супраць увядзеньня падатку на дабаўленую вартасьць на тавары, што ўвозяцца з Расіі. Бізнэсоўцы спадзяваліся, што ўлады пасьля дэталёвага аналізу наступстваў новаўвядзеньня яго скасуюць альбо знойдуць некія кампенсацыйныя механізмы. Нічога гэтага не адбылося. Індывідуальныя прадпрымальнікі спынілі падатковыя выплаты ў бюджэт. Як паведаміў намесьнік старшыні РГА “Персьпектыва” Аляксандр Лапотка, па стане на 1 сакавіка падатак ня выплацілі 80 тысячаў прадпрымальнікаў. Напярэдадні намесьнік міністра падаткаў і збораў Васіль Каменка чарговы раз заклікаў прадпрымальнікаў адумацца і прыняць прапанаваныя ўрадам “правілы гульні”.

***1 сакавіка*** ў Менску на Кастрычніцкім пляцы сабраліся каля трох тысяч гандляроў з менскіх рынкаў, а таксама прадстаўнікі прадпрымальніцкіх суполак з розных гарадоў. На прыступках Палацу рэспублікі адбыўся мітынг. Некаторыя ўдзельнікі акцыі трымалі ў руках плакаты з надпісамі “Далоў ПДВ!” Лідэр аб’яднаньня “Персьпектыва” ***Анатоль Шумчанка***, які выступіў на мітынгу, заклікаў прысутных захоўваць парадак ды не выгукваць палітычных лозунгаў. Прадпрымальнікі мітынгавалі каля трох гадзінаў. Міліцэйскае кіраўніцтва знаходзілася ўвесь час побач з мітынгоўшчыкамі, але не патрабавала разысьціся, нягледзячы на тое, што акцыя была несанкцыянаваная. Пасьля выступу ўсіх ахвотных прадпрымальнікі вырашылі пайсьці да будынку адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі, каб перадаць яму свае патрабаваньні. Але на лесьвіцы, якая вядзе да Дому афіцэраў, дарогу ім перагарадзілі АМАПаўцы. Яны разам з іншымі міліцыянтамі пачалі выціскаць натоўп з лесьвіцы і са скверу. Некалькі жанчын не ўтрымаліся на нагах і паваліліся на сьнег. Дэманстранты прынялі рашэньне вярнуцца на плошчу і там стаяць, пакуль улады не прапануюць правесьці перамовы. Прадпрымальнікі папрасілі міліцыянтаў перадаць асабіста Аляксандру Лукашэнку, што яны прызвычаіліся гандляваць у цяжкіх умовах і стаяць на марозе могуць доўгі час.

***1 сакавіка*** на Меншчыне агульнанацыянальны страйк падтрымалі прадпрымальнікі найбуйнейшых райцэнтраў вобласьці. Прыпынілі працу гандляры Барысаву, Жодзіна, Салігорску, Слуцку, Маладэчна і іншых гарадоў. Частка барысаўскіх прадпрымальнікаў прыйшла выказаць пратэст з нагоды ўвядзеньня падатку на дададную вартасьць да будынка гарвы-

канкаму. Другая частка на чале з лідэрам тутэйшай суполкі грамадзкага аб'яднаньня "Персьпектыва" Віктарам Гарбачовым накіравалася ў Менск на Кастрычніцкую плошчу. Аднак у дарозе спадар Гарбачоў быў затрыманы міліцыянтамі.

***1 сакавіка*** у Гомельскай вобласьці агульнанацыянальны страйк падтрымалі прадпрымальнікі абласнога цэнтру, Рэчыцы, Сьветлагорску, Жлобіну, Рагачову ды іншых гарадоў. У Гомелі на працу ня выйшлі каля 95% прадпрымальнікаў Цэнтральнага, Прудкоўскага рынкаў. Цалкам не працавалі Давыдаўскі рынак, шэраг аўтамабільных кірмашоў. Апоўдні дзясяткі дробных бізнэсоўцаў з розных рынкаў гораду пікетавалі будынак аблвыканкаму. Тых, хто сабраўся каля аблвыканкаму, міліцыя не чапала. А вось у Рэчыцы міліцыянты сарвалі выезд замоўленага аўтобусу, на якім паўсотні дробных бізнэсоўцаў зьбіраліся ад'ехаць у Менск для ўдзелу ў мітынгу пратэсту.

***1 сакавіка*** ў Віцебску 90% прадпрымальнікаў спынілі сваю працу. Апоўдні на ганку Віцебскага аблвыканкаму сабраўся натоўп у некалькі соцень прадпрымальнікаў, і дзяжурныя міліцыянты вырашылі выклікаць падмацаваньне з Кастрычніцкага райадзьдзелу. Супрацоўнікі міліцыі сагналі людзей з прыступак і загадалі не набліжацца да будынку абласной адміністрацыі. Туды было дазволена ўвайсьці ўсяго чатыром дэлегатам ад розных віцебскіх кірмашоў, якія мусілі перадаць у аблвыканкам адмысловы зварот ад усіх прадпрымальнікаў вобласьці з іхнымі патрабаваньнямі. Зварот быў адрасаваны асабіста ***Уладзіміру Андрэйчанку***, які зьяўляецца ня толькі старшынёй аблвыканкаму, але і сябрам Савету Рэспублікі. Адказу на свой зварот яны чакалі цягам дзьвюх гадзінаў, стоячы на 12-градусным марозе, аднак іхныя дэлегаты вярнуліся практычна ні з чым. Ім нават не ўдалося сустрэцца са старшынёй аблвыканкаму. Абураныя безвыніковым стаяньнем на холадзе, прадпрымальнікі рушылі да будынку аблвыканкаму, але міліцыянты папярэдзілі, што выклічуць АМАП, і стыхійны мітынг будзе разагнаны. Загадчыку абласной управы гандлю Валянціну Цьвяткову – адзінаму прадстаўніку ўладаў, які выйшаў да прадпрымальнікаў, удалося пераканаць іх у тым, што ўсе адказы на праблемныя пытаньні яны атрымаюць назаўтра а другой гадзіне.

***1 сакавіка*** прадпрымальнікі Віцебскай вобласьці падтрымаі агульнанацыянальны страйк. Буйнейшыя рынкі і гандлёвыя цэнтры Віцебску, Полацку і Наваполацку былі практычна пустымі. Частка прадпрымальнікаў Полацку і Наваполацку, нягледзячы на халоднае надвор'е, сабралася а 10-й гадзіне перад будынкамі гарвыканкамаў. Пры гэтым, калі ў Наваполацку гарадзкія ўлады да страйкоўцаў не выходзілі, дык у Полацку супакойваць натоўп выходзіў сам старшыня гарвыканкаму Уладзімір Тачыла. Страйкоўцаў нават запрашалі зайсьці ў будынак гарвыканкаму пагрэцца.

Міліцыя спыніла мікрааўтобус з наваполацкімі прадпрымальнікамі, якія спрабавалі выехаць на акцыю пратэсту ў Менск. У выніку прафсаюзныя актывісты вымушаныя былі дабірацца да сталіцы на спадарожных машынах.

***1 сакавіка*** большасьць прыватных прадпрымальнікаў на Берасьцейшчыне спынілі сваю працу. Замест іх мясцовыя ўлады прымусілі выйсьці на рэчавыя рынкі са сваім таварам гандляроў райспажыўсаюзаў і дзяржаўных крамаў. На Берасьцейшчыне страйк таксама падтрымалі амаль усе гандляры ў Белаазёрску, Іванаве і Століне.

***1 сакавіка*** ў Магілёве спынілі працу ўсе рэчавыя і аўтамабільны рынкі, большасьць гандлёвых цэнтраў і частка прыватных крамаў. На цэнтральную плошчу Магілёву прыйшло каля 700 прадпрымальнікаў, якія аб’явілі акцыю пратэсту. Прыватныя гандляры напісалі заявы кіраўніцтву гораду, што спыняюць працу і таму ня змогуць плаціць за камунальныя паслугі. На плошчу перад магілёўскім Домам Саветаў прыйшлі падтрымаць прадпрымальнікаў лідэры дэмакратычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў. Дэлегацыя прадпрымальнікаў была прынятая ў аблвыканкаме, аднак там заявілі, што на мясцовым узроўні нічога зрабіць ня могуць. Таму чыноўнікі заклікалі прыватных гандляроў аднавіць працу. Прадпрымальнікі не пагадзіліся і дамовіліся штодня зьбірацца на цэнтральнай плошчы Магілёву да таго часу, пакуль ня будзе скасаваны спрэчны падатак.

***1 сакавіка*** ў Гародні ў акцыі пратэсту прадпрымальнікаў удзельнічалі прыблізна тры тысячы чалавек. Прадпрымальнікі пачалі зьбірацца каля 12 гадзінаў у парку Жылібера. Адчуўшы, што іх даволі шмат, удзельнікі акцыі перайшлі вуліцу і занялі плошчу Леніна перад гарвыканкамам. Лідэраў не было. Напярэдадні пасадзілі на 15 сутак аднаго з кіраўнікоў прадпрымальніцкага руху Дзьмітрыя Іваноўскага, якога пакаралі за ранейшы несанкцыянаваны мітынг прадпрымальнікаў 10 лютага. Удзельнікі акцыі скандавалі: “Работу!” На плошчу выйшлі старшыня гарвыканкаму Аляксандр Антоненка і намесьнік старшыні аблвыканкаму Аляксандр Радзевіч. Адбылася доўгая і бясплённая гутарка. Людзі пакрысе сталі разыходзіцца. Міліцыянтаў на плошчы амаль не было, але міліцыя чакала напагатове. Акцыя пратэсту працягвалася дзьве гадзіны, нікога з удзельнікаў пасьля яе заканчэньня не затрымлівалі.

***2 сакавіка*** суд Цэнтральнага раёну сталіцы вынес рашэньне пакараць кіраўніка грамадзкага аб’яднаньня “Персьпектыва” Анатоля Шумчанку 10 суткамі адміністрацыйнага арышту па артыкуле 167.1 КаАП РБ – за парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў – акцыі пратэсту прадпрымальнікаў у Менску 1 сакавіка.

***3 сакавіка*** на цэнтральныя вуліцы Гародні выйшлі каля дзьвюх тыся-

чаў мясцовых прадпрымальнікаў. Людзі прайшлі да аблвыканкаму, скандуючы лозунгі “Працы!” Прыкладна ў 13.00 мітынгоўцы пачалі перакрываць вуліцы ў раёне перакрыжаваньняў вуліц Дзяржынскага і Сацыялістычнай. Насупраць мітынгоўцаў выстраіліся шэрагі ваеннаслужачых унутраных войскаў, якія пачалі выціскаць мітынгоўцаў з праезжай часткі. Некалькі чалавек затрыманыя, сярод іх — праваабаронца ***Мікола Лемяноўскі***, які прысутнічаў на акцыі ў якасьці назіральніка (затрымліваў оперупаўнаважаны Уладзімір Бузюк). Мікола Лемяноўскі дастаўлены ў РУУС Ленінскага раёну г. Гародні, дзе на яго склалі пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэньнях па арт. 156 (дробнае хуліганства) і арт. 166 (непадпарадкаваньне патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі). Затрыманы таксама журналіст Андрэй Пачобут. Ён абвінавачваецца ва ўдзеле ў несанкцыянаванай дэманстрацыі, на яго складзены пратакол па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

***3 сакавіка*** намесьнік старшыні рэгіянальнай арганізацыі Беларускага незалежнага прафсаюзу і нефармальны лідэр прадпрымальніцкага страйку на Полаччыне ***Валеры Шаўчэнка*** выкліканы па тэлефоне ў Полацкі гарадзкі аддзел унутраных справаў. Калі ён прыйшоў у аддзел, даведаўся пра абвінавачаньне ў парушэньні артыкулу 167-1 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях – арганізацыя несанкцыянаванага мітынгу. Абвінавачаньне прад’яўленае за штодзённыя вахты страйкоўцаў на цэнтральным гарадзкім пляцы. А 19-й гадзіне спадар Шаўчэнка быў дастаўлены ў Полацкі гарадзкі суд. Падчас разгляду справы абвінавачаны запатрабаваў заслухаць сьведкаў, і судзьдзя Наталя Абрамава вымушаная была перанесьці судовае паседжаньне на 10 сакавіка.

***3 сакавіка*** судзьдзя Рэчыцкага раённага суда Сьвятлана Пырх пастанавіла арыштаваць прадпрымальніка ***Леаніда Невара*** на 10 сутак нібыта за дробнае хуліганства і непадпарадкаваньне міліцыі. Спадара Невара з высокаю тэмпературай і хворым сэрцам зьмясьцілі ў тую ж камеру ізалятару, дзе ён ужо правёў суткі да суда і атрымаў моцную прастуду. У вокнах камеры замест шкла – поліэтыленавая плёнка. Тэмпература ўнутры камеры амаль не адрозьніваецца ад вонкавай, блізкая да нулю.

***4 сакавіка*** ў памяшканьні Гарадзенскага гарвыканкаму супрацоўнікамі міліцыі ў цывільным быў затрыманы актывіст Партыі БНФ ***Вадзім Саранчукоў***, які зайшоў у гарвыканкам, каб аддаць плацёжку аб уплаце арэнднай платы за офіс Партыі БНФ. Ён быў дастаўлены ў раённае аддзяленьне, дзе на яго склалі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні па ч.2 арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў) за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, якая адбылася 10 лютага ў Гародні.

***4 сакавіка*** актывіст Партыі БНФ ***Вадзім Саранчукоў*** пакараны судом Ленінскага раёну г. Гародні на 10 сутак адміністрацыйнага арышту за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, якая адбылася 10 лютага.

***4 сакавіка*** лідэр гомельскіх прадпрымальнікаў ***Таццяна Марчанка*** атрымала папярэджаньне ад міліцыі. Яна была выкліканая на размову да намесьніка начальніка УУС Цэнтральнага раёну Гомелю Сяргея Яфіменкі. Маёр Яфіменка зачытаў Т. Марчанка яе правы, а таксама артыкулы 167 і 172 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях, у якіх гаворыцца аб адказнасьці за несанкцыянаваныя масавыя акцыі і незаконны друк улётак. Спн. Марчанка пацікавілася наяўнасьцю ў міліцыі фактаў, якія б сьведчылі пра парушэньне ёю названых артыкулаў. Фактаў такіх не знайшлося. “Тады ён толькі сказаў, што папярэджвае мяне, каб я не рабіла такіх дзеяньняў, і папрасіў напісаць аб гэтым расьпіску. Я адмовілася і сышла”, - паведаміла Т. Марчанка.  У той жа дзень Т. Марчанка напісала заяву ў пракуратуру з патрабаваньнем расьсьледаваньня сочкі за ёй невядомымі асобамі.

***5 сакавіка*** суд Ленінскага раёну Гародні пацьвердзіў рашэньне адміністрацыйнай камісіі Ленінскага раёну, якая прысудзіла сябру прафсаюзу РЭПАМ ***Юрыю Курганскаму*** штраф у 5 базавых велічыняў за распаўсюд прафсаюзнай газеты “Шабер”. Судовы працэс пачаўся для Курганскага новым пакараньнем: на першым жа паседжаньні судзьдзя Сабалеўская вынесла зыскоўцы папярэджаньне і штраф у 3 базавыя велічыні за зацягваньне судовага працэсу. Зацягваньнем, па версіі суда стала тое, што Курганскі выступіў з хадайніцтвам аб дапушчэньні да ўдзелу ў працэсе ў якасьці абаронцы яго прадстаўніка Андрэя Кусяльчука. Аднак судзьдзя адхіліла ягонае хадайніцтва і прапанавала яму наняць адваката. Потым Юрый Курганскі некалькі разоў падаваў хадайніцтвы аб дапушчэньні да працэсу ў якасьці абаронцы яго прадстаўніка і аб адводзе судзьдзі. Усе хадайніцтвы судзьдзя Сабалеўская адхіліла і пакінула рашэньне адміністрацыйнай камісіі ў сіле.

***10 сакавіка*** падчас акцыі пратэсту гарадзенскіх прадпрымальнікаў у парку імя Жылібера міліцыянты затрымалі дзевяць прадпрымальнікаў. У гэты ж дзень усе яны былі дастаўленыя ў суд. Аднак прысуд пасьпелі вынесьці толькі сямі з іх. Людміла Цежына, Іван Мельнічак, Віталь Дзетчык, Наталя Івашка, Галіна Вішнеўская, Зьміцер Краўцэвіч, Алег Сямашка судом Ленінскага раёну г. Гародні пакараныя штрафам у памеры 20 базавых велічыняў паводле артыкулу 167.1, частка 1 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях за ўдзел у несанкцыянаваным сходзе. Яшчэ два удзельнікі акцыі пратэсту былі адпушчаныя дадому да суда.

***10 сакавіка*** ў судзе г. Полацку і Полацкага р-ну адбыўся разгляд адміні-

страцыйнай справы намесьніка старшыні рэгіянальнай арганізацыі Беларускага незалежнага прафсаюзу, лідэра полацкіх прадпрымальнікаў Валерыя Шаўчэнкі. Згодна з пратаколам аб адміністрацыйным правапарушэньні, які быў складзены на В. Шаўчэнку супрацоўнікамі міліцыі, ён абвінавачваўся ва ўдзеле ў несанкцыянаваным мітынгу прадпрымальнікаў 1 і 2 сакавіка ў г. Полацку. Суддзя Наталя Абрамава прызнала В. Шаўчэнку вінаватым у парушэньні ч.1 арт. 167.1 КаАП Рэспублікі Беларусь і пастанавіла падвергнуць яго штрафу ў памеры 40 базавых велічыняў. Падтрымаць свайго калегу ў суд прыйшлі больш за 80 мясцовых прадпрымальнікаў.

***14 сакавіка*** Віцебскі абласны гаспадарчы суд пачаў разглядаць справу прадпрымальніка ***Барыса Элькіна***, машыну якога затрымала міліцыя ўночы 8 кастрычніка 2004 году па дарозе са Смаленску на Віцебск, у якой знаходзіліся 9 тысяч асобнікаў кнігі “Выпадковы прэзідэнт”. Справа была ініцыяваная Віцебскім раённым аддзелам па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі, і ягоны кіраўнік Віктар Пракаповіч сфармуляваў адразу два абвінавачаньні ў адрас спадара Элькіна: неадпаведнасьць рэальнай колькасьці асобнікаў той лічбе, што была ўказаная ў дакументах, і тое, што юрыдычны адрас маскоўскай фірмы, якая гандлюе гэтымі кнігамі, не адпавядае сапраўднаму месцазнаходжаньню. Паводле меркаваньня Барыса Элькіна, ніводзін з дакументаў на набыцьцё гэтых кніг падчас затрыманьня ня выклікаў у іх сумневу. Кнігі былі арыштаваныя да правядзеньня адмысловай літаратуразнаўчай экспертызы, якая мусіла высьветліць, ці няма ў творы “Выпадковы прэзідэнт” паклёпу або абразаў годнасьці Аляксандра Лукашэнкі. У студзені ў абласную пракуратуру была дасланая папера, што ніякае крамолы ў кнізе Сьвятланы Калінкінай і Паўла Шарамета няма. Але 9 тысячаў асобнікаў міліцыянты Барысу Элькіну так і не вярнулі, а яшчэ праз месяц абвінавацілі ў эканамічных правапарушэньнях. Судзьдзя Людміла Іванова прызначыла наступнае паседжаньне на 17 сакавіка.

***15 сакавіка*** ў Ваўкавыску прадпрымальнік ***Мікалай Аўтуховіч*** абвясьціў бестэрміновую галадоўку. Уладальнік прыватнага “Радыётаксі 22222” пратэстуе супраць дзеяньняў чыноўнікаў падатковых і фінансавых установаў, у выніку якіх ён і яго супрацоўнікі застаюцца бяз працы. Паводле сьцьверджаньняў Міколы Аўтуховіча, канфлікт пачаўся паўтара года таму. “Я, як грамадзянін гэтай краіны, вырашыў не маўчаць і даць паказаньні аб фактах злоўжываньня службовымі паўнамоцтвамі некаторымі падатковымі чыноўнікамі. Замест абароны на мяне як сьведку з усіх бакоў пачалі аказваць ціск”, — тлумачыць Аўтуховіч. Ён зазначае, што падатковыя праверкі, якім была падвергнутая яго прадпрымальніцкая дзейнасьць і дзейнасьць яго дзелавога партнёра “Ніка-транс” ставіла за мэту адстаяць сваіх калег, а бізнэсоўцаў выставіць злоснымі неплацельшчыкамі падаткаў. Неўзабаве да справы падключыліся іншыя выканаўчыя органы, судзьдзі, пракуроры, прадстаўнікі Камітэту дзяржкантролю. У выніку Аўтуховічу былі прад`яўленыя вялікія штрафныя санкцыі.

***17 сакавіка*** старшыню абласной арганізацыі Свабоднага прафсаюзу ***Валянціна Лазарэнкава*** выклікалі ў Маскоўскі РУУС Берасьця, дзе на яго склалі адміністрацыйны пратакол. Спадара Лазарэнкава абвінавачваюць у арганізацыі несанкцыянаванага сходу прадпрымальнікаў на адным з рэчавых рынкаў. Суд прызначаны на 25 сакавіка.

***21 сакавіка*** — шосты дзень галадоўкі ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча.*** У фірме “Ніка-транс” адбыўся сход, на якім супрацоўнікі вырашылі далучыцца да акцыі пратэсту. Аб галадоўцы заявілі яшчэ восем чалавек — сем кіроўцаў таксовак, якія належаць прадпрымальніку, і яшчэ адзін беспрацоўны. Усе галадоўнікі — былыя ўдзельнікі вайны ў Афганістане. Як лічыць Мікалай Аўтуховіч, галадоўка можа прыцягнуць увагу ня толькі да праблемаў прадпрымальніцтва ў Ваўкавыску, але і наогул да становішча малога бізнэсу ў краіне. Сам галадоўнік адчувае сябе пакуль някепска.

***24 сакавіка*** — дзесяты дзень галадоўкі ў Ваўкавыску прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***. Крыху менш галадаюць яшчэ 11 чалавек. Прадстаўнікі галадоўнікаў зьвярнуліся ў адміністрацыю прэзідэнта з лістом да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай разабрацца ў іхняй справе, аднак ліст у іх не прынялі. З лістом, які падпісалі разам з галадоўнікамі 75 чалавек, азнаёміўся супрацоўнік прэзідэнцкай адміністрацыі, які займаецца заявамі грамадзянаў. Але ён сказаў, што ў судовыя пытаньні адміністрацыя ня будзе ўмешвацца.

***25 сакавіка*** стала вядома, што лідэру віцебскай гарадзкой арганізацыі БСДП (Грамада) ***Аляксею Гаўруцікаву***, які працаваў вядучым юрыстам прадпрыемства кацельных і цеплавых сетак, не працягнулі кантракт. Сп.Гаўруцікаў лічыць, што гэта пакараньне за ягоны ўдзел у выбарах. Дарэчы, не працягнулі кантракту і з жонкай Аляксея, якая працавала на гэтым жа прадпрыемстве.

***25 сакавіка*** ў Баранавічах пакаралі лідэра мясцовых прадпрымальнікаў Мікалая Чарнавуса штрафам 240 тысяч рублёў. Яго абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу падчас страйку прадпрымальнікаў 1 сакавіка, а таксама за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

***29 сакавіка*** да ваўкавыскіх галадоўнікаў далучыліся новыя ўдзельнікі – цяпер у акцыі пратэсту ўдзельнічаюць 25 чалавек. Да кіроўцаў фірмы “Ніка-транс”, якіх большасьць сярод галадоўнікаў, далучыліся два вэтэраны вайны ў Афганістане, якія не працуюць у фірме. Раніцай яны занесьлі свае заявы аб галадоўцы ў райвыканкам, а потым заявы напісалі яшчэ шэсьць кіроўцаў таксовак і сьпецыяльная карэспандэнтка газэты “Биржа информации” ***Сьвятлана Кухарава***. Найбольш галадае прадпрымальнік

***Мікалай Аўтуховіч***, які адмаўляецца ад ежы ўжо 14-дзень. Ён адчувае кволасьць, але гаворыць, што здолее галадаць досыць доўга.

***1 красавіка*** галадоўнікаў на чале з ваўкавыскім прадпрымальнікам ***Мікалаем Аўтуховічам*** наведалі прадстаўніца офісу АБСЕ ў Менску Хайдзі Сьміт, а таксама вэтэраны савецка-афганскай вайны са сталіцы. Да масавай галадоўкі далучылася новая ўдзельніца — 32-гадовая Людміла Парэмбская, якая працуе ў Мікалая Аўтуховіча менэджэрам, цяпер іх 30 чалавек. Да галадоўнікаў зноўку прыяжджала “хуткая дапамога”. Але яны патлумачылі, што не запрашалі “хуткую”, і што некаторыя яшчэ спалі, іншыя не пасьпелі нават памыцца пасьля сну. Медыкі сказалі, што іх адправілі праверыць стан здароўя галадоўнікаў, але мусілі зьехаць.

***4 красавіка*** — 21-ы дзень галадоўкі ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***. Да акцыі пратэсту далучыліся яшчэ пяць удзельнікаў: дысьпетчары таксі ***Анжэла Мацяс*** і ***Анжэла Шукава***, кіроўцы грузавікоў ***Іван Жук*** і ***Іван Мацьвейчык***. Да іх далучыўся ***Канстанцін Уланаў*** з Менску, які служыў некалі ў Афганістане ў адной дывізіі з Мікалаем Аўтуховічам. Канстанцін Уланаў гаворыць, што прачытаў пра галадоўку ў Ваўкавыску ў “Народнай волі”. Усяго, паводле саміх галадоўнікаў, у ёй цяпер удзельнічаюць 35 чалавек.

***5 красавіка*** – 22-гі дзень галадоўкі ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***. Заявы аб галадоўцы напісалі яшчэ тры чалавекі. Да акцыі пратэсту далучыліся дысьпетчары таксі ***Алена Ліцьвін***, ***Валянціна Талашка*** і гараджанін ***Андрэй Сазон***. Паводле галадоўнікаў, іх разам з прыхільнікамі, якія абвясьцілі галадоўку дзеля салідарнасьці, стала 38 чалавек. Мікалай Аўтуховіч гаворыць, што адчувае сябе горш – у яго кволасьць, галавакружэньне, у вачах часам мутнее. Але пакуль ніхто з удзельнікаў галадоўкі не згадзіўся легчы ў шпіталь.

***6 красавіка*** сябра Рады грамадзкага аб’яднаньня “Персьпектыва” з Рэчыцы ***Леанід Невар***, вярнуўшыся з Менску, дзе ўдзельнічаў у перамовах урадавай камісіі і прадпрымальнікаў наконт увядзеньня падатку на дададуную вартасьць, даведаўся, што атрымаў яшчэ два пакараньні — гэтым разам як кіроўца аўтамашыны. Начальнік Рэчыцкай дзяржаўтаінсьпекцыі Аляксандр Фядак даслаў на адрас Леаніда Невара дзьве пастановы. Паводле адной з іх прадпрымальнік аштрафаваны нібыта за язду на мікрааўтобусе без прышпіленых рамянёў бясьпекі. Другая пастанова пазбаўляе спадара Невара права кіраваньня аўтамашынай на 36 месяцаў. Прадпрымальнік нібыта не спыніўся на патрабаваньне дарожнай міліцыі.

***7 красавіка***, на 24-ы дзень галадоўкі ваўкавыскага прадпрымальніка

***Мікалая Аўтуховіча***, у яго значна панізілася тэмпература і крывяны ціск, ён схуднеў на 14 кілаграмаў. Доктар “хуткай дапамогі”, агледзеўшы ўсіх кіроўцаў, сказаў, што ў М.Аўтуховіча могуць пачацца вельмі небясьпечныя незваротныя працэсы, але прадпрымальнік адмовіўся спыніць галадоўку. Галадоўнікаў стала на аднаго болей: 39-й у сьпісе пазначаная Марына Хітрык, якая калісьці стажыравалася ў дысьпетчарскай таксі Мікалая Аўтуховіча.

***8 красавіка*** – 25-ы дзень галадоўкі ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***. “Хуткая дапамога” забрала дысьпетчара таксі ***Алену Ліцьвін*** з-за падазрэньня на апендыцыт. У справе галадоўнікаў адбыліся невялікія зрухі. Два дні таму Вышэйшы гаспадарчы суд прыпыніў дзеяньне штрафных санкцыяў (267 мільёнаў рублёў) супраць Мікалая Аўтуховіча. Паводле яго, на днях у Генеральнай пракуратуры быў падрыхтаваны пратэст адносна рашэньня Вышэйшага гаспадарчага суда, што датычыць штрафных санкцыяў супраць “Ніка-транс” — фірмы-партнёра Аўтуховіча. Аднак пратэст гэты не падпісваюць, таму галадоўка не спыняецца.

***12 красавіка*** — 29-ы дзень галадоўкі ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча. Ён адчувае сябе даволі кепска. Пагоршыўся стан здароўя і некаторых іншых галадоўнікаў. Да акцыі далучыўся яшчэ адзін чалавек — гэта былы супрацоўнік падатковай інсьпекцыі ***Анатоль Дзешка***. Такім чынам, галадоўнікаў амаль 40 чалавек.

***13 красавіка*** старшыня Берасьцейскай абласной арганізацыі Свабоднага прафсаюзу ***Валянцін Лазарэнкаў*** аштрафаваны на 20 базавых велічыняў (510 тысячаў беларускіх рублёў). Судзьдзя Руслана Сянько прызнала спадара Лазарэнкава вінаватым у арганізацыі несанкцыянаванага сходу на рэчавым рынку Берасьця ў часе страйку прадпрымальнікаў 15 сакавіка. Валянцін Лазарэнкаў спрабаваў давесьці, што ня меў ніякага дачыненьня да арганізацыі сходу і быў запрошаны самімі прадпрымальнікамі выступіць як госьць. Паводле словаў спадара Лазарэнкава, акрамя яго ў гэтым сходзе бралі ўдзел і прадстаўнікі ўладаў, аднак ніхто з іх ня быў прыцягнуты да адказнасьці. Лідэр берасьцейскай суполкі Свабоднага прафсаюзу лічыць рашэньне суду неправамерным і зьбіраецца яго абскарджваць.

***15 красавіка*** скончылася акцыя пратэсту ваўкавыскіх галадоўнікаў — прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча***, які распачаў яе 31 дзень таму, а таксама кіроўцаў ды іх прыхільнікаў. Улады ня цалкам задаволілі патрабаваньні ўдзельнікаў акцыі, аднак яны лічаць, што перамаглі, паколькі ў рэйс цяпер могуць выехаць аўтамабілі фірмы “Ніка-транс”, што былі спыненыя больш чым на тры месяцы. Пакуль застаецца правамоцным штраф фірме “Ніка-транс”— больш за 440 мільёнаў рублёў — за парушэньне парадку разьлікаў і прыёму наяўных грашовых сродкаў. Гэты штраф узако-

нены рашэньнем Вышэйшага гаспадарчага суда. Апроч гэтага, Міністэрства падаткаў і збораў пастанавіла, што фірма не заплаціла падаткі за грошы, якія кіроўцы "Ніка-транс" атрымалі ад пасажыраў і здалі Аўтуховічу на працягу 2003-2004 гадоў. Гэты падатак разам са штрафам і пеняй складае больш за 1 мільярд і 813 мільёнаў рублёў.

***18 красавіка*** Віцебскі абласны гаспадарчы суд завяршыў разгляд справы прадпрымальніка ***Барыса Элькіна*** і прыняў рашэньне аб канфіскацыі дзевяці тысячаў асобнікаў кнігі "Выпадковы прэзідэнт", якія ён на ўласнай машыне перавозіў са Смаленску. Месяц таму гаспадарчы суд разглядаў прэтэнзіі міліцыянтаў наконт таго, што ў транспартных дакументах была няправільна ўказаная колькасьць асобнікаў кнігі, і што юрыдычны адрас маскоўскай фірмы, якая іх выпусьціла, не адпавядае сапраўднасьці. Гэтыя абвінавачаньні былі абвергнутыя, судовая справа закрытая. Цяперашні судовы працэс быў ініцыяваны Віцебскім раённым аддзелам па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. І сутнасьць абвінавачаньня, выказанага кіраўніком аддзелу Віктарам Пракаповічам, заключалася ў тым, што прадпрымальнік парушыў "Канвенцыю пра міжнародныя перавозкі грузаў", бо тавара-транспартныя накладныя ў яго былі неадпаведнага ўзору. Была ініцыяваная новая судовая справа. Выступаючы на судзе, прадстаўнік Віцебскага райаддзелу Віктар Пракаповіч заявіў, што тавара-транспартныя накладныя на гэтую кнігу мусілі б быць іншага ўзору. На думку спадара Элькіна, вельмі паказальна, што падчас затрыманьня, 8-га кастрычніка 2004 году, ніякіх прэтэнзіяў да афармленьня дакументаў у міліцыянтаў не было. Тады сумненьні выклікала толькі назва і зьмест кнігі, але лінгвістычная эксьпертыза, праведзеная паводле распараджэньня абласной пракуратуры, нічога крамольнага ў кнізе Сьвятланы Калінкінай і Паўла Шарамета не знайшла. Цяпер міліцыянты зьвярнулі пільную ўвагу на выгляд і зьмест дакументаў прадпрымальніка. Пасьля першай, няўдалай спробы знайсьці ў ягонай дзейнасьці склад эканамічнага правапарушэньня, гаспадарчы суд у асобе судзьдзі Людмілы Івановай урэшце прызнаў Барыса Элькіна парушальнікам закону, а кнігі вырашыў канфіскаваць.

***16 траўня*** скончыўся тэрмін, адведзены Свабоднаму прафсаюзу Беларускаму на высяленьне з памяшканьня. Камунальнікі працягваюць настойваць на высяленьні, спасылаючыся на запазычанасьць па аплаце і завяршэньне тэрміну арэнды. Прафсаюзныя лідэры гэтыя абвінавачаньні абвяргаюць. У ЖРЭА Партызанскага раёну такое становішча патлумачыць адмаўляюцца, а лідэр Свабоднага прафсаюзу Беларускага Генадзь Быкаў пракаментаваў сітуацыю наступным чынам: "Ня ЖРЭТ жа вырашае такія пытаньні. Мы там адзінаццаты год і, ніякіх праблемаў ніколі не было. Гэтак закрываюцца ўсе арганізацыі, якія не кантралююцца ўладай. Самі ўлады штурхаюць нас у плечы, каб мы займаліся не эканомікай, не сацы-

яльнымі ці прафсаюзнымі пытаньнямі, а палітыкай". Прафсаюзнае кіраўніцтва заяўляе, што не пакіне займанае памяшканьне і будзе дамагацца вырашэньня спрэчкі ў судах.

***16 траўня*** стала вядома, што супрацоўніцу Гомельскага краязнаўчага музею звальняюць за грамадзкую дзейнасьць. Дырэктар музею Аляксандр Алейнік падпісаў загад на звальненьне актывісткі сацыяльнага руху "Разам!", супрацоўніцы музею ***Марыі Багдановіч***. Прычыну звальненьня намесьнік дырэктара краязнаўчага музею Алег Ражкоў патлумачыў так: "Яна недакладна выконвала ўказаньні, якія даваліся. Яна была захоплена грамадзкай працаю. У яе склалася такая практыка — займацца ў рабочы час грамадзкай працаю". Сама Марыя Багдановіч лічыць сваё звальненьне палітычна матываваным: "Тут відавочныя палітычныя матывы звальненьня. Наймальнік не хаваў гэтага. Калі я прыйшла да дырэктара музею ў кабінет, ужо ведаючы, што будзе канчатковы загад, то першае ў яго было пытаньне: "Ці не адмовіцеся вы ад сваёй дзейнасьці?" Я адказала: "Не!" Я не лічу сябе вінаватай. Я супраць таго, каб пагаджацца з уладамі, таму што сёньня ад мяне наймальнік патрабуе пагадненьня, а заўтра выклічуць у гарвыканкам і скажуць: пагаджайцеся, а то нідзе ня знойдзеце працы". Паводле М. Багдановіч, прэтэнзіі да яе пачаліся пасьля афіцыйнай дэманстрацыі з нагоды кастрычніцкай рэвалюцыі ў 2004 годзе. Тады група гараджанаў, у тым ліку і спадарыня Багдановіч, выйшлі на дэманстрацыю з лозунгам "Далоў самаўладзьдзе!", пра гэта распавяла "Народная воля". У дзень выхаду газеты ў музей патэлефанавала намесьніца начальніка ўпраўленьня культуры Лілія Буланава, якая нагадала М. Багдановіч, што яна працуе ў дзяржаўнай установе, дзе існуе дзяржаўная ідэалогія. Гэта было афіцыйнае папярэджаньне. Таксама сёлета Марыя Багдановіч разам з дэпутатам гарсавету Юрасём Глушаковым, таксама супрацоўнікам музею, замаўляла мітынг супраць павышэньня камунальных плацяжоў, платнай медыцыны і прымусовага разьмеркаваньня выпускнікоў універсітэтаў у чарнобыльскія раёны. Калі гарвыканкам дазволіў, а пасьля забараніў мітынг, спадарыня Багдановіч з аднадумцамі стала дамагацца ў судах адмены забароны. Акурат у гэты самы час дырэкцыя музею і стала выносіць Марыі Багдановіч і дэпутату Глушакову заўвагі і вымовы.

***18 траўня***, пасьля працяглай галадоўкі чарнобыльскага ліквідатара, інваліда 2-й групы, ***Васіля Сіліверста*** з Калінкавічаў медыкі тэрмінова накіроўваюць яго ў санаторый на аздараўленьне. Васіль Сіліверст галадаваў тры тыдні ў знак пратэсту супраць таго, што ягоныя захворваньні ды інваліднасьць не прызнаюць вынікам удзелу ў ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы.

***25 траўня*** падчас паседжаньня выканкаму Міжнароднай федэрацыі металістаў у Вене было вырашана выключыць са складу гэтай сусьветнай

арганізацыі Беларускі рэспубліканскі прафсаюз аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудаваньня (АСМ). Сярод прычынаў называюцца адыход ад дэмакратычных прынцыпаў, незаконнае зьмяшчэньне з пасады былога лідэра галіновага прафсаюзу Аляксандра Бухвостава і згодніцкая палітыка з беларускімі ўладамі. Год таму на тэрмінова скліканым па ініцыятыве беларускіх уладаў і кіраўніцтва Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі пазачарговым зьезьдзе ***Аляксандр Бухвостаў*** быў зьняты з пасады старшыні галіновай арганізацыі. Ня згодныя з падобным рашэньнем сябры прафсаюзу стварылі новую структуру — Незалежны прафсаюз АСМ і абралі Бухвостава сваім лідэрам. Правамоцнасьць звальненьня Бухвостава і перасьлед шэрагу актывістаў АСМ трапілі ў цэнтр увагі Камісіі Міжнароднай арганізацыі працы, якая неўзабаве засьведчыла сістэматычныя парушэньні правоў прафсаюзаў у Беларусі. Аляксандр Бухвостаў перакананы, што рашэньне аб выключэньні прафсаюзу АСМ з Міжнароднай федэрацыі металістаў — лагічнае завяршэньне той гісторыі. Супраць такога рашэньня, па словах спадара Бухвостава, выступалі толькі асобныя прадстаўнікі Расеі.

***26 траўня*** кангрэс Міжнароднай федэрацыі металістаў прыняў адмысловую рэзалюцыю аб парушэньні правоў працоўных у Беларусі. У рабоце кангрэсу бяруць удзел прадстаўнікі 200 прафсаюзаў са 100 краінаў сьвету. Рэзалюцыя аб парушэньні правоў працоўных, акрамя Беларусі, была прынятая ў дачыненьні да яшчэ трох краінаў сьвету — Калумбіі, Непалу і Парагваю. У дакуменце, у прыватнасьці, гаворыцца, што Міжнародная федэрацыя мэталістаў пратэстуе супраць перасьледу незалежных прафсаюзаў і асобных людзей, супраць невыкананьня міжнародных абавязкаў і патрабуе ад ураду Беларусі неадкладна выправіць такое становішча.

***27 траўня*** стала вядома, што ў Лепелі ліквідуецца сямейны бізнэс лідэра тутэйшага прадпрымальніцкага руху ***Алега Тычыны***. Такое рашэньне прынялі ўлады гэтага райцэнтру. Распавядае Алег Тычына: “Яны даслалі сёньня паперы, што нам адмоўлена ў адводзе зямлі. Не знайшоўшы ніякіх сродкаў, каб вырваць мяне з лагеру апазіцыі, Лепельскі гарвыканкам у асобе яго старшыні Шыкшняна Пятра ўзяў ды зачыніў дзьве крамы маёй жонкі Зінаіды Тычыны. Я гэта кваліфікую як перасьлед. Рэжым ня можа знайсьці ніякіх іншых сродкаў, апроч вось такога, калі людзі пазбаўляюцца працы. Калі людзі ня могуць зарабляць сабе на жыцьцё”. Паводле Алега Тычыны, ліквідацыя бізнэсу яго сям’і не паўплывае на яго палітычную пазіцыю.

***3 чэрвеня*** суд Цэнтральнага раёну Гомелю разглядаў зыск дэпутата гарсавету ***Юрася Глушаков***а да дырэкцыі абласнога краязнаўчага музею. Спадар Глушакоў дамагаецца адмены трох вымоваў і заўвагі, вынесеных яму як старшаму навуковаму супрацоўніку музею. У судзе спадар Глушакоў патлумачыў, што спагнаньні яму выносяць найперш з прычыны

ягонай актыўнай грамадзкай і палітычнай дзейнасьці. Дырэктар музею спадар Алейнік у судзе імкнуўся даказаць, што Юрась Глушакоў сістэматычна спазьняецца на працу. У якасьці сьведкаў прывёў некалькі супрацоўнікаў. Як высьветлілася, адна з вымоваў спадару Глушакову вынесеная за 1-хвіліннае спазьненьне. Судзьдзя Віктар Казачок, які разглядае зыск Ю. Глушакова, паведаміў, што рашэньне абвесьціць 6 чэрвеня.

***6 чэрвеня*** судзьдзя Цэнтральнага раёну Гомелю Віктар Казачок адмовіў дэпутату гарсавету ***Юрасю Глушакову*** ў задавальненьні зыску да дырэкцыі абласнога краязнаўчага музею. Судзьдзя прыняў бок дырэкцыі музею і вырашыў не адмяняць загаду наконт вымовы Юрасю Глушакову за спазьненьне на працу на адну хвіліну.

***7 чэрвеня*** Міністэрства аховы здароўя адклікала ліцэнзію найбуйнейшага прыватнага медыцынскага цэнтру “Экамедсэрвіс”. Ліцэнзія прыпыненая на падставе вынікаў комплекснай праверкі. Як распавялі ў цэнтры, рашэньне Міністэрства аховы здароўя аб прыпыненьні ліцэнзіі прынятае на падставе таго, што некаторыя адмыслоўцы на момант праверкі ня мелі вышэйшай катэгорыі ў сваіх сьпецыяльнасьцях. Аднак кіраўніцтва “Экамедсэрвісу” яшчэ спадзяецца знайсьці паразуменьне з галіновым ведамствам. Сігнал для прыватных медыцынскіх установаў паступіў яшчэ ў сакавіку, падчас нарады па пытаньнях рэфармаваньня сістэмы аховы здароўя. Тады Аляксандр Лукашэнка заявіў: медыцына ў Беларусі мусіць быць даступнай кожнаму. Практычна адразу ж пасьля гэтага шэраг буйных медыцынскіх цэнтраў — “Экамедсэрвіс”, “Нардын”, “Ладэ” — патрапілі ў цэнтр увагі Камітэту дзяржаўнага кантролю. Практычна ўсім камерцыйным установам, куды наведаліся кантралёры, былі прад’яўленыя розныя прэтэнзіі.

***8 чэрвеня*** ў Менску адбылася нарада актывістаў прадпрымальніцкага руху Беларусі, у якой бралі ўдзел лідэры бізнэсоўцаў Менску, Віцебску, Берасьця, Баранавічаў, Рэчыцы і іншых рэгіёнаў. 1 ліпеня для дробнага бізнэсу завяршаецца пераходны перыяд, вызначаны сакавіцкім указам Аляксандра Лукашэнкі. Згаданы ўказ быў выдадзены ў сувязі з масавымі пратэстамі прадпрымальнікаў супраць увядзеньня падатку на дададзеную вартасьць. Як прагучала на нарадзе, калі ўплата гэтага падатку будзе з 1 ліпеня захаваная, то больш як палова гандляроў мусяць спыніць прадпрымальніцкую справу. Таму ўдзельнікі нарады вырашылі яшчэ раз зьвярнуцца да Лукашэнкі і яго падначаленых з ініцыятывай адмены падатку. У гэтым звароце канстатуецца, што з моманту сакавіцкай сустрэчы Лукашэнкі і прадпрымальнікаў ніякага паляпшэньня ў дзейнасьці прадпрымальнікаў не адбылося.

***10 чэрвеня*** Міністэрства аховы здароўя пагадзілася перагледзець гісторыю захворваньняў інваліда-чарнобыльца з Калінкавічаў ***Васіля Сілверста***. Гэта адбылося пасьля ягонай працяглай галадоўкі і лістоў пратэсту.

Першы намесьнік міністра аховы здароўя Віктар Калбанаў пісьмова паведаміў спадару Сіліверсту, што паўторны разгляд ягонай медыцынскай справы Нацыянальным экспертным саветам адбудзецца пасьля дадатковага дасьледаваньня шчытападобнай залозы ды іншых хворых органаў. Такая выснова зроблена на падставе аналізу ранейшых медыцынскіх дакументаў, якія Васіль Сіліверст як афіцэр запасу, удзельнік ліквідацыі Чарнобыльскай катастрофы, падаваў у Цэнтральную вайскова-лекарскую камісію Міністэрства абароны, Гомельскі абласны і Рэспубліканскі міжведамасны экспэртныя саветы. Спадар Сіліверст аб’явіў галадоўку ў Калінкавічах напярэдадні 26 красавіка і трымаў яе больш як тры тыдні. Ён патрабаваў ад Міністэрства аховы здароўя прызнаньня прычыннай сувязі сваіх захворваньняў і інваліднасьці з удзелам у ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы.

***16 чэрвеня*** зранку ня выйшлі на працу работнікі ўпраўленьня вытворча-тэхналагічнай камплектацыі Полацкага будаўнічага трэсту №22. Яны сабраліся ля будынку ўпраўленьня, патрабуючы павышэньня зарплаты, а таксама паляпшэньня ўмоваў працы. Па словах работнікаў, яны атрымліваюць ад 115 да 180 тысяч рублёў у месяц, і грошай тых бракуе на самыя пільныя патрэбы. Работнікі цэху каля гадзіны стаялі моўчкі, пасьля чаго да іх выйшаў начальнік упраўленьня Леанід Бут-Гусаім. Ён паведаміў, што разумее настроі рабочых, але папрасіў іх распачаць працу, паабяцаўшы, што ў бліжэйшыя дні да іх мусіць прыехаць для перамоваў кіраўніцтва трэсту. У выніку рабочыя прыступілі да працы, заявіўшы, аднак, што калі іхнія патрабаваньні ня будуць задаволеныя, яны вымушаныя будуць распачаць бестэрміновы страйк.

***22 чэрвеня*** дырэкцыя Беларускага металургічнага заводу звольніла з працы намесьніка начальніка цэха, старшыню Жлобінскай раённай арганізацыі Партыі камуністаў Беларускай ***Валерыя Рыбчанку***. У загадзе на звальненьне, падпісаным выканаўцам абавязкаў генеральнага дырэктара Віктарам Матачкіным, сказана, што звальняецца Валеры Рыбчанка за сістэматычнае невыкананьне без паважных прычынаў абавязкаў, ускладзеных працоўнай дамовай. Паводле спадара Рыбчанкі, вымовы за нібыта няякасны рАМАПт абсталяваньня дырэкцыя БМЗ пачала выносіць зь мінулай восені, калі ён не паслухаўся кіраўніцтва і стаў балатавацца на выбарах кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.

***29 чэрвеня*** Цэнтральны суд Гомелю задаволіў зыск старшага навуковага супрацоўніка, дэпутата гарадзкога Савету ***Юрася Глушакова*** да дырэкцыі абласнога краязнаўчага музею. Судзьдзя Сяргей Шыцікаў адмяніў заўвагу дырэктара музею Аляксандра Алейніка, вынесеную спадару Глушакову нібыта за ”грэбаваньне працоўнымі адносінамі”. Нагадаем, што дэпутат аспрэчваў вымову за спазьненьне на працу на паўтары хвіліны.

***30 чэрвеня*** ліцэнзія прыватнага медыцынскага цэнтру “Нардын” ануляваная з тых жа прычынаў, што і кампаніі “Экамедсэрвіс”. Памочнік міністра аховы здароўя Алег Матусевіч паведаміў, што, паводле агучанай на калегіі фармулёўкі, прычынай зьяўляецца грубае парушэньне ўмоваў медыцынскай дзейнасьці і неадпаведнасьць прэзідэнцкаму дэкрэту №17 аб ліцэнзійнай дзейнасьці. Акрамя таго, спагнаньні ў дачыненьні да “Нардыну” рыхтуе Камітэт дзяржкантролю. Кіраўніцтва “Нардыну” кажа, што афіцыйныя дакументы аб ануляваньні іх ліцэнзіі яшчэ не прыйшлі. Раней Міністэрства аховы здароўя анулявала ліцэнзію прыватнай кампаніі “Экамедсэрвіс”. Адной з прычынай гэтага называлася неадпаведная кваліфікацыя некалькіх медыкаў. Аднак у цэнтры гэтаму ня вераць, кажа прадстаўніца “Экамедсэрвісу” Наталя Крамнёва: “Наўрад ці гэта зьвязана з якасьцю медыцынскіх паслугаў, паколькі ў дзяржструктурах яны пакідаюць жадаць лепшага ”. Нагадаем, што падчас выступленьня ў Палаце прадстаўнікоў міністр аховы здароўя Людміла Пастаялка паведаміла, што Міністэрства аховы здароўя распачынае ствараць сетку дзяржаўных медыцынскіх цэнтраў, абслугоўваньне ў якіх будзе цалкам платнае.

***12 ліпеня*** прыватны медыцынскі цэнтр “Нардын” накіраваў у Вышэйшы гаспадарчы суд Беларусі зыск да Міністэрства аховы здароўя. Кіраўніцтва кампаніі просіць адмяніць рашэньне міністэрства аб ануляваньні ліцэнзіі, фармальнай падставай для якога стала адсутнасьць належнай кваліфікацыі некаторых сьпецыялістаў. Паводле аналагічных прычынаў Міністэрства аховы судзіцца яшчэ з адной камерцыйнай кампаніяй — “Экамэдсэрвіс”. Кіраўнікі прадпрымальніцкіх структураў называюць гэта наступам уладаў на недзяржаўны сектар медыцыны з мэтай перадзелу ўласнасьці.

***15 ліпеня*** ў Цэнтральным судзе Гомелю распачаты разгляд двух зыскаў актывісткі грамадзкага руху “Разам” ***Марыі Багдановіч*** да дырэкцыі абласнога краязнаўчага музею наконт пакараньня і аднаўленьня на працы. Як малодшы навуковы супрацоўнік музею спадарыня Багдановіч была звольненая з працы ў чэрвені пасьля трэцяй вымовы. Прадстаўнік музею ў судзе Валеры Дамасканаў не пагадзіўся прызнаць патрабаваньні Марыі Багдановіч наконт аднаўленьня яе на працы. Адмаўляе ён і палітычныя матывы звальненьня. Судзьдзя Жана Андрэйчык вырашыла працягнуць разьбіральніцтва праз некалькі дзён.

***22 ліпеня*** Вышэйшы гаспадарчы суд не задаволіў зыску прыватнага медыцынскага цэнтру “Нардын” да Міністэрства аховы здароўя. Кіраўніцтва кампаніі прасіла прызнаць беспадстаўным рашэньне міністэрства аб ануляваньні ліцэнзіі. “Нардын” спыніў сваю дзейнасьць. Яшчэ ў адным прыватным цэнтры, “Экамедсэрвіс”, які чакае судовага рашэньня па аналагічнай справе, кажуць, што цяпер амаль ня маюць спадзяваньняў на лепшы

вынік і для сябе. Адначасова ў Вярхоўным судзе адстойвае права на медыцынскую дзейнасьць яшчэ адна прыватная кампанія — “Аптымед”. Міністэрства аховы здароўя пазбавіла яе ліцэнзіі на падставе тых жа прэтэнзіяў да кваліфікацыі персаналу, што і ў дачыненьні да “Экамэдсэрвісу” і “Нардыну”. Кіраўнік Беларускага саюзу прадпрымальнікаў Аляксандр Патупа, мяркуе, што гэта адмысловы наступ уладаў на прыватны бізнэс.

***28 ліпеня*** Вышэйшы гаспадарчы суд не задаволіў зыску прыватнага медыцынскага цэнтру “Экамедсэрвіс-інвэст” да Міністэрства аховы здароўя. Суд прызнаў дзеяньні міністэрства законнымі, і “Экамедсэрвіс-інвэст” спыніў сваю дзейнасьць. Рашэньне Міністэрства аховы здароўя набыло законную сілу адразу пасьля завяршэньня разгляду зыску. У цэнтры працавала каля 200 чалавек, 140 з іх — сярэдне-сьпецыяльны і тэхнічны персанал. Зараз усе яны беспрацоўныя. Адмыслоўцы ў справе бізнэсу заяўляюць, што ануляваньне ліцэнзіяў такіх буйных медыцынскіх цэнтраў, як “Экамедсэрвіс”, зьяўляецца спланаванай кампаніяй уладаў супраць прыватнай медыцыны і прыватнага бізнэсу ўвогуле.

***29 ліпеня*** ў Цэнтральным судзе Гомелю дырэкцыя абласнога краязнаўчага музею падпісала пагадненьне з актывісткай грамадзкага руху “Разам”, былой супрацоўніцай музею ***Марыяй Багдановіч***. Дырэкцыя Гомельскага краязнаўчага музею пагадзілася сплаціць звольненай Марыі Багдановіч двухмесячную кампенсацыю за вымушаны прагул. Марыя Багдановіч аспрэчвала ў судзе вымову і загад дырэктара музею Аляксандра Алейніка на сваё звальненьне.

З ***1 жніўня*** індывідуальныя прадпрымальнікі Беларусі, якія займаюцца гандлёвай дзейнасьцю, пераходзяць на новыя ўмовы працы. Новыя правілы ўводзяцца ў адпаведнасьці з указамі Аляксандра Лукашэнкі. Неабходнасьць зьмены правілаў прадпрымальніцкай дзейнасьці была абумоўленая тым, што ад 1 студзеня Беларусь у гандлі з Расіяй перайшла на прынцып спагнаньня падатку на дададзеную вартасьць паводле краіны прызначэньня. Беларускія ўлады пастанавілі пашырыць гэты парадак і на прадпрымальнікаў, што гандлююць расейскімі таварамі. Але такое рашэньне выклікала з боку дробных гандляроў пратэст, і ў сакавіку яны правялі шматдзённы агульнанацыянальны страйк. З прадпрымальнікамі сустрэўся Аляксандр Лукашэнка. Неўзабаве ён падпісаў два ўказы, якімі ўвёў для дробных бізнэсоўцаў новыя правілы гандлю расейскімі таварамі. Гэтыя правілы ўступаюць у дзеяньне якраз 1 жніўня. Паводле агульнага меркаваньня гандляроў, новыя ўмовы горшыя за старыя. Як заяўляюць гандляры, фактычна ніякай кампенсацыі не адбылося.

***9 жніўня*** Гаспадарчы суд Менску прыняў рашэньне пра высяленьне Свабоднага прафсаюзу Беларускага з арандаванага ім памяшканьня. З

адпаведным зыскам у суд зьвярнулася адміністрацыя ЖРЭА Партызанскага раёну Менску. Судовае паседжаньне прайшло бяз ведама і удзелу кіраўніцтва СПБ. Пра рашэньне суда стала вядома толькі праз дзень пасьля судовага паседжаньня, кажа лідэр прафсаюзу Генадзь Быкаў. Сакратарка Менскага гаспадарчага суда Алена Гладкова сказала, што яны накіроўвалі адпаведныя паперы па адрасу юрыдычнай рэгістрацыі. Але ўсе яны вярнуліся, і таму справа разглядалася без удзелу адказчыка. Аб прычынах высяленьня незалежнага прафсаюзу, які месьціўся ў арандаваным памяшканьні 11 гадоў, у адміністрацыі ЖРЭА Партызанскага раёну Менску дакладных тлумачэньняў не далі. Старшыня Свабоднага прафсаюзу Беларускага Генадзь Быкаў, заявіў, што лічыць патрабаваньні чыноўнікаў і рашэньне суда несправядлівымі й намерваецца зьвяртацца ў вышэйшыя судовыя інстанцыі.

***19 жніўня*** ў Беларусі зьявіўся яшчэ адзін пасярэднік між уладаю і прафсаюзнымі арганізацыямі. Паводле загаду Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, створаны Савет для ўдасканальваньня працоўнага заканадаўства. Аналітыкі канстатуюць, што афіцыйны Менск мае цяпер вострыя праблемы ў стасунках з Міжнароднай арганізацыяй працы (МАП). Паводле юрыдычнай справы МАП за № 20/90, у краіне парушаецца працоўнае заканадаўства і ігнаруюцца нормы Канвенцыі МАП, да якіх далучылася Беларусь. Кантраляваць сітуацыю павінен Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаньнях. Але да яго працы не допушчаныя прадстаўнікі дэмакратычных прафсаюзаў. І калі ў 2004 годзе ў Беларусі працавала сьпецыяльная камісія МАП ў дазнаньні, то ўрад Беларусі атрымаў рэкамендацыю выправіць тую памылку. Кіраўніцтва Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Беларусі ня мае намеру байкатаваць працу Савету. Як сказаў старшыня Кангрэсу Аляксандр Ярашук: “Мы ніколі ня здымем пытаньня аб паўнавартасным аднаўленьні нашага статусу як нацыянальнага прафцэнтру у Нацыянальным савеце па працоўных і сацыяльных пытаньнях. Але нам цяпер прыадчынілі шчыліну. Мы абавязаныя дзеля арганізацыі ў гэтую шчыліну прасочвацца”.

***14 верасьня*** ў Гародні пачаўся разгляд адміністрацыйнай справы карэспандэнта газеты “Салідарнасьць” ***Івана Романа***. Яго абвінавачваюць у дзейнасьці ад імя незарэгістраванага прафсаюзу. Заяву ў міліцыю на Івана Романа напісаў кіраўнік аховы заводу аўтаагрэгатаў Уладзімір Малаткоў. Маўляў, 23 жніўня той распаўсюджваў сярод рабочых бюлетэнь незарэгістраванага прафсаюзу РЭПАМ — радыёэлектроннай прамысловасьці, аўтамабілебудаваньня і металаапрацоўкі. Іван Роман зазначае, што ў яго была з сабой толькі газета “Салідарнасьць”, а таксама, што ён належыць да прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасьці — РЭП, а РЭПАМ сапраўды летась быў ліквідаваны. На пачатку паседжаньня прадстаўнік Ленінскага райаддзелу міліцыі папрасіў судзьдзю Наталю Козел

адкласьці разгляд справы, бо адсутнічала адна сьведка — ахоўніца з заводу аўтаагрэгатаў. Разгляд перанесены на 20 верасьня.

***15 верасьня*** стала вядома, што газета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі "Беларускі час" атрымала права на выкарыстаньне ў сваёй назьве слова "беларускі". Магчымасьць выкарыстаньня азначэньня "беларускі" выданьне ФПБ і ўстанова "Рэдакцыя газеты "Беларускі час" набыла паводле ўказу А.Лукашэнкі №425. Права пакінуць у сваіх назвах азначэньні "беларускі" і "нацыянальны" таксама дадзенае часопісам "Вестник Ассоциации белорусских банков", "Вестник Ассоциации белорусских банков. Банковское дело", а таксама шэрагу камерцыйных і некамерцыйных установаў і арганізацый (усяго 11 юрыдычным асобам). Шэраг недзяржаўных выданьняў былі вымушаныя зьмяніць свае назвы і прайсьці перарэгістрацыю, сярод іх "Белорусская деловая газета" (цяпер яна выдаецца пад імем "БДГ. Деловая газета", "Белорусы и рынок" (ранейшая назва "Белорусский рынок"), "Экономическая газета" ("Национальная экономическая газета").

***20 верасьня*** ў Гародні адбылося судовае паседжаньне па справе ***Івана Романа***. На працэсе былі заслуханыя сьведкі з абодвух бакоў, а таксама тлумачэньні самога І.Романа. Нагадаем, што сп. Романа абвінавачваюць у дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі – незалежнага прафсаюзу. Вынясеньне рашэньня суддзя Козел прызначыла на 27 верасьня.

***20 верасьня*** ў Берасьці пачалі галадоўку ўладальнікі маршрутных таксовак. Індывідуальныя прадпрымальнікі пратэстуюць супраць неабходнасьці дадаткова сплачваць у бюджэт дзясяткі мільёнаў рублёў з кожнай машыны за выкарыстаньне ў камерцыйных мэтах. Гэты збор усталяваны на падставе ўказу Аляксандра Лукашэнкі №140 летась у красавіку, аднак у падатковых інсьпекцыях лічаць, што ён тычыцца і тых прадпрымальнікаў, што ўвезьлі свае аўтамабілі з-за мяжы значна раней. Як вынік, уладальнікі таксовак мусяць сплаціць у бюджэт дадаткова ад 25 да 50 мільёнаў рублёў. Пакуль падобныя рахункі выстаўленыя толькі некаторым гаспадарам таксовак, якія ня здолелі пераканаць у тым, што закон ня мае зваротнай сілы, ані падатковыя органы, ані гаспадарчы суд. Калегі пакараных прадпрымальнікаў мяркуюць, што неўзабаве гэты рэспубліканскі збор абавяжуць плаціць іншых уладальнікаў таксовак і ня толькі ў Берасьці. Таму прадпрымальніца Любоў Рэзановіч называе галадоўку вымушаным крокам: "Цяпер адмаўляемся ад ежы, два-тры тыдні — калі ўлады не адрэагуюць, адмовімся ад вады. Будзем галоднай сьмерцю паміраць, у нас няма такіх грошай". Паводле спадарыні Рэзановіч, яна асабіста і чацьвёра калегаў галадоўку ўжо распачалі. Далучыцца да іх гатовыя яшчэ каля дваццаці мясцовых прадпрымальнікаў. 26 верасьня, паводле зьвесткаў прадпрымальнікаў, у Вышэйшым гаспадарчым судзе з удзелам прадстаўнікоў Берасьцейскага аблвыканкаму будзе абмяркоўвацца пытаньне на-

конт правамоцнасьці спагнаньня з уладальнікаў таксовак рэспубліканскага збору. Першы намесьнік старшыні Вышэйшага гаспадарчага суда Беларусі Яўген Сьмірноў выдаў распараджэньне, паводле якога на паўтары месяцы прыпыняюцца санкцыі ў дачыненьні да берасьцейскіх прадпрымальнікаў, якім падатковая інсьпекцыя выставіла патрабаваньне сплаціць рэспубліканскі збор за выкарыстаньне аўтамабіляў у камерцыйных мэтах. Адна з галадоўніц Любоў Лаўрукова, з якой падатковыя органы спрабуюць спагнаць дадаткова ў бюджэт каля 30 мільёнаў рублёў, лічыць гэтае судовае распараджэньне недастатковым, яна распавяла, на што разьлічваюць удзельнікі галадоўкі: “Каб трактавалі ўказ так, як патрэбна яго трактаваць. Нам больш нічога ад уладаў ня трэба. Мы іншага нічога не патрабуем”.

***20 верасьня*** ваўкавыскі прадпрымальнік ***Мікалай Аўтуховіч*** распачаў ужо трэцюю за апошнія два гады галадоўку. Ён сьцьвярджае, што супраць ягонага бізнэсу пачаўся чарговы наступ з боку падатковых органаў і мясцовых уладаў. Жонцы прадпрымальніка, якая зьяўляецца сузаснавальніцай фірмы “Ніка-Транс”, днямі была ўручаная пастанова аб прыцягненьні яе ў якасьці падазраванай па крымінальнай справе аб ухіленьні ад выплаты падаткаў у асабліва буйных памерах. Разам з ёй падазраваным прызнаны і дырэктар фірмы Юры Лявонаў. У абодвух прадпрымальнікаў апісана маёмасьць. Усю маёмасьць пагражаюць канфіскаваць і ў фірмы. Ухіленьнем ад выплаты падаткаў сьледзтва лічыць тое, што фірма давала прадпрымальніку Аўтуховічу для работы на ягоных таксоўках сваіх кіроўцаў па дамове. Сьледзтва лічыць, што паслугі таксі аказвала фірма, а не прадпрымальнік, а фірма ня мае ліцэнзіі на перавозку пасажыраў. І значыць, яна павінна вярнуць дзяржаве выручку за ўвесь перыяд працы, з вясны 2003 па восень 2004 году.

***28 верасьня*** вынясеньнем штрафу ў 50 базавых адзінак (1 275 000 рублёў) завяршыўся адміністрацыйны працэс па справе гарадзенскага актывіста прафсаюзу РЭП ***Івана Романа***. Сп. Роман быў абвінавачаны ў ажыцьцяўленьні дзейнасьці ад імя арганізацыі, не зарэгістраванай ва ўстаноўленым парадку. Нягледзячы на прадстаўленыя доказы — прафсаюз РЭП зарэгістраваны Міністэрствам юстыцыі і мае статус рэспубліканскага прафсаюзу (г.зн., мае права дзейнічаць на ўсёй тэрыторыі Беларусі), судзьдзя Козел угледзела ў дзеяньнях Івана Романа прыкметы правапарушэньня. Аргументы абароны былі расцэнены як надуманыя і не прыняты пад увагу. “Такім чынам, становіцца незразумелым неабходнасьць наяўнасьці велізарнага апарату Міністэрства юстыцыі, калі звычайны раённы судзьдзя выносіць рашэньне, якое супярэчыць рашэньню Мінюсту”, — так пракаментаваў сітуацыю сп. Роман.

***29 верасьня*** прэзідыум Вышэйшага гаспадарчага суда скасаваў ра-

шэньні ўсіх судовых інстанцыяў і накіраваў справу ваўкавыскага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча*** на новы разгляд. У гэтай сувязі Мікалай Аўтуховіч, які ў знак пратэсту супраць судовага перасьледу галадае 9-ы дзень, заявіў, што спыняе галадоўку. Пастанову Вышэйшага гаспадарчага суда, на якім старшыняваў Віктар Камянкоў, Мікалай Аўтуховіч успрыняў як перамогу.

***5 кастрычніка*** Беларускі Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў выказаў пратэст супраць выказваньняў Аляксандра Лукашэнкі ў адрас незалежных прафсаюзаў. Падчас выступу на зьезьдзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі прэзідэнт негатыўна адазваўся пра незалежныя і свабодныя прафсаюзы. Ён абвінаваціў прафсаюзных лідэраў у палітаканстве, заявіў, што я ны быццам бы патрабуюць увядзеньня эканамічных санкцыяў супраць сваёй краіны. Лукашэнка даў даручэньне генеральнаму канцэрну “Белнафтахім” Б. Сівому, а таксама старшыні ФПБ Л. Козіку пакончыць з незалежнымі прафсаюзнымі арганізацыямі ў галіне. Як сказаў намесьнік старшыні Кангрэсу Мікалай Канах, БКДП расцэньвае такія выказваньні кіраўніка дзяржавы не інакш, як заклік да зьнішчэньня незалежнага прафсаюзнага руху.

***10 кастрычніка*** Свабодны прафсаюз Беларускі пазбаўлены права арэнды памяшканьня на вуліцы Захарава ў Менску і на днях вымушаны пакінуць штаб-кватэру. Такое рашэньне прыняў Гаспадарчы суд Менску паводле зыску адміністрацыі ЖРЭА Партызанскага раёну сталіцы. Прычынай сталася нібыта пратэрміноўка арэнднай платы. Гэткім чынам Свабодны прафсаюз пазбаўлены юрыдычнага адрасу, і ў сувязі з гэтым лідэры арганізацыі асьцерагаюцца новых карных захадаў уладаў. ***Генадзь Быкаў*** заяўляе, што адказныя супрацоўнікі Мінюсту папярэдзілі, што маюць намер абмеркаваць з кіраўніцтвам прафсаюзу некаторыя пытаньні. Паводле спадара Быкава, ня выключана, што гаворка будзе тычыцца менавіта юрыдычнага адрасу.

***11 кастрычніка*** суд у Баранавічах адмяніў рашэньне адміністрацыйнай камісіі гарвыканкаму, якая пакарала лідэра мясцовых прадпрымальнікаў ***Мікалая Чарнавуса*** за распаўсюд улетак. У жніўні на спадара Чарнавуса склалі адміністрацыйны пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі, якая ня мае выходных зьвестак. Гэтай прадукцыяй міліцыянты палічылі ўлёткі Аб’яднанай грамадзянскай партыі. У баранавіцкім судзе Мікалай Чарнавус здолеў давесьці, што не парушыў заканадаўства, распаўсюджваючы партыйныя улёткі. У судзе таксама высьветлілася, што міліцыянты сфальсіфікавалі гэтую справу: адміністрацыйны пратакол быў складзены 18 жніўня, а сам факт распаўсюду ўлётак адбываўся 20 жніўня. Гэта сталася падставай для адмены адміністрацыйнага пакараньня.

***12 кастрычнік***а старшыня Беларускага прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП) ***Генадзь Фядыніч*** быў вымушаны напісаць тлумачальную з нагоды інфармацыі, надрукаванай у прафсаюзным бюлетэні «Экспресс-Инфо» № 22 за 8 жніўня 2005 году. Генеральная пракуратура палічыла, што ў бюлетэні ўтрымліваецца "шмат негатыўнай інфармацыі". Прафсаюзнага лідэра выклікалі на размову і папрасілі паведаміць наклад бюлетэню, а таксама дзе ён друкуецца і як распаўсюджваецца. Супрацоўніца Генеральнай пракуратуры Сьвятлана Ганчарова выказала сумненьне з нагоды таго, што ў прафсаюзным бюлетэні можна разьмяшчаць негатыўную інфармацыю пра сацыяльна-эканамічнае становішча ў краіне. Генадзь Фядыніч заявіў, што інфармацыя павінна быць перш за ўсё праўдзівай і падкрэсьліў, што бюлетэнь выпускаецца і распаўсюджваецца строга ў адпаведнасьці з законам.

***13 кастрычніка*** лідэра Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў ***Аляксандра Ярашука*** выклікалі ў рэспубліканскую пракуратуру, дзе ў яго ўзялі тлумачэньні з нагоды яго заяваў наконт выступу Аляксандра Лукашэнкі на зьезьдзе Федэрацыі прафсаюзаў. Аляксандр Ярашук паведаміў: "Мне прад'яўленая прэтэнзія, што я пашыраю інфармацыю, якая не знаходзіла свайго пацьверджаньня ў афіцыйных сродках масавай інфармацыі аб тым, што прэзідэнт Лукашэнка, выступаючы 20 верасьня на зьезьдзе ФПБ, даваў даручэньні адпаведным асобам, маюцца на ўвазе старшыня канцэрну "Белнафтахім" Браніслаў Сівы і старшыня ФПБ Леанід Козік, пра тое, што трэба пакласьці канец незалежнаму прафсаюзнаму руху. Пыталіся, адкуль я ўзяў гэтую інфармацыю і ці магу пацьвердзіць яе".

***19 кастрычніка*** Беларускі Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў, які меркаваў 22 кастрычніка правесьці на плошчы Бангалор у Менску акцыю пратэсту супраць прыцясьненьня незалежных прафсаюзаў, атрымаў нечаканую прапанову ад Менгарвыканкаму. Разам з фармальным дазволам на акцыю сталічныя ўлады запатрабавалі ад БКДП заключыць дамовы на аказаньне паслугаў з МУС, хуткай дапамогай – усяго з шасьцю суб'ектамі. Трэба аплаціць іхнія паслугі, аднесьці квіткі ў Менгарвыканкам, і толькі тады можна ісьці пратэставаць. "Гэта ня ўкладваецца ні ў здаровы сэнс, ні ў заканадаўства," – сказаў лідэр БКДП Аляксандр Ярашук.

***20 кастрычніка*** Рада Беларускага Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) разгледзела пытаньне аб магчымасьці правядзеньня чарговага VI зьезду за межамі Беларусі, бо ўсе звароты, каб адшукаць памяшканьне, засталіся незадаволенымі. У парадку дня таксама разглядалася пытаньне наконт акцыі пратэсту, якую БКДП планаваў правесьці 22 кастрычніка на плошчы Бангалор. Рада Беларускага Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў прыняла рашэньне адмовіцца ад правядзеньня запла-

securing-none
наванай акцыі пратэсту, паколькі яна лічыць неабгрунтаванымі і незаконнымі фінансавыя патрабаваньні Менгарвыканкаму.

***26 кастрычніка*** сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі ***Сяргей Панамароў,*** які ўжо некалькі гадоў займаецца ў Клецку дробным бізнэсам, паведаміў, што на яго аказваецца ціск. Як паведаміў спадар Панамароў, у 2002 годзе Клецкі райвыканкам дазволіў яму арандаваць адно з памяшканьняў былой вайсковай часткі з наступным правам выкупу. Майстар-прадпрымальнік выплаціў грошы за памяшканьне, але з афармленьнем яго ва ўласнасьць улады не сьпяшаліся. І цяпер пры дапамозе гаспадарчага суда райвыканкам вырашыў выкінуць яго на вуліцу. Сяргей Панамароў зьвязвае гэта з апазіцыйнай дзейнасьцю сваёй сям'і. Ён, жонка і сын – актывісты Аб'яднанай грамадзянскай партыі. У райвыканкаме адмаўляюць сувязь паміж палітычнай дзейнасьцю клецкага прадпрымальніка і канфіскацыяй вытворчага памяшканьня.

***3 лістапада*** суд Ленінскага раёну Магілёву адмовіўся задаволіць зыск былога рабочага Магілёўскага металургічнага заводу, старшыні суполкі прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасьці ***Юрася Дарашэнкі***, які зьбіраўся дабіцца скасаваньня загаду адміністрацыі аб яго звальненьні з працы. Юрась Дарашэнка быў звольнены з працы ў жніўні з фармулёўкай "за прагулы і сістэматычнае невыкананьне сваіх абавязкаў". Абвінавачаньне ён не прызнаў і заявіў, што яго пазбавілі працы незаконна, за крытыку. Паводле ягонай заявы, у тыя гадзіны, у якія ён нібыта прагульваў працу, ён хварэў і можа прадставіць адпаведную медыцынскую даведку. Юрась Дарашэнка лічыць, што яго звольнілі з працы за актыўную прафсаюзную дзейнасьць. Справа ў тым, што рабочы з шматгадовым працоўным стажам абвінаваціў дырэктара Леаніда Маркава ў злоўжываньні службовым становішчам і выклаў сваю пазіцыю ў інфармацыйным выпуску "Экспрэсс-інфо", а потым у звароце да Генеральнага пракурора. Суд не ўлічыў аргументы прафсаюзнага лідэра і схіліўся да рашэньня на карысьць адказчыка. Паводле старшыні Ленінскага раённага суда Галіны Кужалевай, просьба аб аднаўленьні на працы ня можа быць задаволеная, бо ініцыятар зыску зьвярнуўся ў суд праз месяц пасьля свайго звальненьня.

***15 лістапада*** стала вядома, што ў Заслаўі звальняюць лідэра суполкі Свабоднага прафсаюзу акцыянернага таварыства "Заслаўебурвод" ***Уладзіміра Феакцістава.*** Як зазначыў Уладзімір Феакцістаў, дырэктар прадпрыемства абвінавачвае яго ў прафесійнай непрыдатнасьці. У "Заслаўебурводзе" прафсаюзны актывіст працуе начальнікам гідрагеалагічнага аддзелу. Усяго ж працоўны стаж спадара Феакціства на гэтым прадпрыемстве складае 34 гады. Ён адмаўляе абвінавачаньне ў некампетэнтнасьці, а перасьлед зьвязвае выключна з прафсаюзнай дзейнасьцю: "Сьпецыяльна выжываюць, ціснуць на прафсаюз, размаўляюць з сябрамі прафса-

юзу, каб выходзілі. Тут, відаць, выканкам мае дачыненьне. Яшчэ б: адзіная арганізацыя Свабоднага прафсаюзу, якая 12 гадоў існуе ў Заслаўі. Як гэта можна цярпець перад выбарамі?!" Паводле яго, гэта ня першая спроба пакараньня. Толькі сёлета яму інкрымінавалі парушэньні вытворчай дысцыпліны, абвінавачвалі ў пашырэньні прафсаюзнай газеты "Салідарнасьць", спрабавалі звольніць. Кіраўніцтва рэспубліканскай арганізацыі Свабоднага прафсаюзу лічыць дзеяньні адміністрацыі гэтага прадпрыемства праявай масавай кампаніі ўладаў супраць дэмакратычных прафсаюзаў.

***25 лістапада*** ў Менску некалькі соцень рабочых мотавелазаводу правялі акцыю пратэсту ля прахадной свайго прадпрыемства – на паўтары гадзіны яны перакрылі рух па Партызанскім праспекце. Рабочыя адмыслова падкрэсьлівалі, што іх акцыя носіць непалітычны характар. Паводле актыўных удзельнікаў акцыі пратэсту, усяго забаставала каля шасьцісот чалавек, гэта каля 20% рабочых Менскага мотавелазаводу. Паўтары сотні з іх выйшлі на праезную частку Партызанскага праспекту, скандуючы адно слова: "Зарплату!", "Зарплату!".

***2 сьнежня*** Гарадзенскі абласны суд не задаволіў скаргу гарадзенскага актывіста ***Івана Романа*** на рашэньне Ленінскага раённага суда Гародні. І. Романа абвінавачваюць у распаўсюдзе інфармацыйнага бюлетэню прафсаюзу РЭП, сьцьвярджаючы, што ён дзейнічаў ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Іван Роман ня лічыць сябе вінаватым і падаў скаргу ў Вярхоўны суд.

***5 сьнежня*** кіроўцы аўтобусаў г. Гомелю выйшлі на плошчу Леніна, каб выказаць пратэст супраць нізкіх заробкаў і высокіх планаў на транспартныя перавозкі пасажыраў. Акцыя пратэсту працягвалася гадзіну і скончылася тым, што кіроўцы падпісалі калектыўную скаргу ў Камітэт дзяржкантролю. Напярэдадні адзін з кіроўцаў, ***Аляксандр Еўсяйчук***, быў выклікаsuccessfully да дырэктара аўтапарку, дзе яго чакалі намесьнік начальніка РУУС Савецкага раёну і невядомы чалавек у цывільным, якія сталі пагражаць звальненьнем ды іншымі пакараньнямі ў выпадку, калі А. Еўсяйчук прыме ўдзел у акцыі пратэсту. Пасьля акцыі пачаліся рэпрэсіі супраць яе ўдзельнікаў. Так, актывісту Партыі БНФ ***Андрэю Баранаву*** дырэктар аўтопарку пагражаў тым, што супраць яго КДБ рыхтуе "справу" за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу і перадачу "непраўдзівых зьвестак" Радыё Свабода.

***5 сьнежня*** шасьцёра галадоўнікаў спынілі сваю акцыю салідарнасьці з ***Мікалаем Аўтуховічам***, якая цягнулася з 14 лістапада. Яны сабралі подпісы пад зваротам да прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з просьбай зьмяніць меру стрыманьня Мікалаю Аўтуховічу, які знаходзіцца за кратамі. У галадоўцы ўдзельнічалі беспрацоўны ***Уладзімір Асіпенка***, сакратар фірмы "Ніка-транс" ***Людміла Парэмбская***, прадпрымальнік ***Анатоль Дзешка*** і тры кіроўцы — ***Іван Янушкевіч, Міхаіл Семярыч*** і

***Дзьмітры Лянкевіч***, якія працуюць на машынах прадпрымальніка Аўтуховіча.

***9 сьнежня*** стала вядома, што суполку Свабоднага прафсаюзу металістаў прадпрыемства "Лёс" у Барані на Аршаншчыне пазбаўляюць офісу. Прафсаюзная суполка, паводле яе лідэра ***Васіля Леўчанкава***, атрымала афіцыйны ліст ад дырэктара прадпрыемства: "Піша, што ёсьць такі ўказ прэзідэнта. Каб я альбо вызваліў памяшканьне, альбо дамовіўся з Міністэрствам сувязі аб арэндзе за грошы. Але я так думаю, што калі нават зьвярнуся ў Міністэрства сувязі, то нават на ўмовах арэнды нам не дадуць гэтае памяшканьне. Кіраўнік да гэтага дадумаўся, на маю думку, ня сам, бо яму насамрэч не да гэтага, не да прафсаюзу. Праблем на вытворчасьці хапае. Я так думаю, што гэта на яго зьверху ціснуць. Мы тут ужо знаходзімся больш як 12 гадоў. Апошнія паўтары гады – страшэнны ціск, запалохваньне. Кіраўнік цэху выклікае рабочага і кажа: альбо выходзь з прафсаюзу альбо не прадоўжым кантракт". Паводле прафсаюзнага лідэра, ініцыятыва пазбаўленьня офісу супярэчыць калектыўнай дамове паміж наймальнікам і прафсаюзам. Між тым, у адміністрацыі прадпрыемства паведамілі, што дырэктар дзейнічае ў адпаведнасьці з заканадаўствам. Паводле памочніка дырэктара Любові Ісаковіч, прэзідэнцкія дакументы не дазваляюць бясплатна прадастаўляць заводзкія памяшканьні у арэнду, за выключэньнем арганізацыяў, якія ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў.

***14 сьнежня*** прафсаюз радыёэлектроннай прамысловасьці выступіў з заявай, у якой патрабуе спыніць запалохваньні і інсінуацыі ў бок незалежных прафсоюзаў і іх лідэраў і своечасова пачаць выконваць рэкамендацыі Міжнароднай арганізацыі працы па ўзнаўленьню свабоды аб'яднаньняў у Рэспубліцы Беларусь. Яны лічаць, што прынятыя папраўкі ў Крымінальны кодэкс ня маюць ніякага дачыненьня да права прафсаюзаў зьвяртацца ў МАП са скаргамі на парушэньне ў Беларусі прафсаюзных правоў. Лідэр прафсаюзу ***Генадзь Фядыніч*** сьцьвярджае, што правы прафсаюзаў і правы працоўных пастаянна парушаюцца з боку дзяржавы: "Улады нічога не вырашаюць, а наадварот, робяць усё для таго, каб зьнішчыць незалежны прафсаюзны рух. І мы ў адпаведнасьці з законам зьвяртаемся да міжнароднай супольнасьці, да Міжнароднай арганізацыі працы. Адтуль прыяжджаюць юрысты вельмі высокага ўзроўню і знаходзяць, што ўсе нашыя скаргі пацьвярджаюцца. І Міжнародная арганізацыя працы ўжо не адзін год дае адны і тыя ж рэкамендацыі".

***16 сьнежня*** ў Калінкавіцкім раённым судзе чарнобыльскі ліквідатар, інвалід другой групы ***Васіль Сіліверст*** абвясьціў галадоўку, паколькі суд пакінуў чарговую ягоную заяву без разгляду. "У сувязі з тым, што мая справа ў Калінкавіцкім судзе разглядаецца ўжо чатыры месяцы і ніякіх зрухаў няма, я вымушаны быў у судзе абвясьціць галадоўку. Судзьдзя Сарнаўская мне

адказала – добра!" — пракаментаваў сваё рашэньне сп. Сіліверст. У судзе Васіль Сіліверст дамагаўся прызнаньня прычыннай сувязі сваіх захворваньняў ды інваліднасьці з удзелам у ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Ён вымушаны быў пісаць заявы ў суд. Ранейшыя звароты ў Міністэрства аховы здароўя, рэспубліканскі міжведамасны эксьпертны савет, іншыя інстанцыі станоўчых вынікаў ня мелі. Судзьдзя Сьвятлана Сарнаўская, якая разглядала заяву, паведаміла, што абскарджваць адмову эксьпертнага савету зьвязаць інваліднасьць з удзелам у ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі Сіліверсту неабходна ў раённым судзе Менску – там дзе знаходзіцца рэспубліканскі міжведамасны эксьпертны савет.

***19 сьнежня*** арганізацыя Свабоднага прафсаюзу адкрытага акцыянернага таварыства "Полацакшкловалакно" атрымала афіцыйнае папярэджаньне мясцовага гарвыканкаму ў сувязі з тым, што яна працуе без юрыдычнага адрасу. Юрыдычны адрас прафсаюзная арганізацыя страціла пасьля таго, як была выселеная са свайго офісу. Згаданая прафсаюзная суполка была ўтвораная ў красавіку 1999 году і да апошняга часу займала офіс у адміністрацыйным будынку прадпрыемства. Паўтары месяца таму дырэкцыя адмовілася працягнуць дамову арэнды памяшканьня, і арганізацыя засталася бяз офісу і без юрыдычнага адрасу.

***21 сьнежня*** гаспадарчы суд Менскай вобласьці адхіліў скаргу актывіста дэмакратычнага руху і прадпрымальніка з Клецку ***Сяргея Панамарова*** на рашэньне мясцовых уладаў канфіскаваць у яго вытворчае памяшканьне. На судовым паседжаньні Сяргей Панамароў паведаміў, што ў Клецку ў яго быў дрэваапрацоўчы цэх, дзе ён вырабляў розныя драўляныя рэчы, якія заказвалі майстру мясцовыя жыхары. Гэты цэх прадпрымальнік абсталяваў у памяшканьні, якое тры гады таму выдзелілі яму клецкія ўлады. Спадар Панамароў выплаціў грошы за памяшканьне, але аформіць яго ва ўласнасьць чыноўнікі тады не дазволілі. А цяпер яны, як прагучала на судзе, вырашылі і наогул адабраць яго і разваліць бізнэс. Як заявіў актывіст дэмакратычнага руху, падставай таму стала яго палітычная дзейнасьць: "Я сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі, я даю артыкулы ў газеты, абнародую ўсе хібы нашага раёну пра нячыстыя справы кіраўніцтва раёна". Спадар Панамароў заявіў на судзе, што мясцовыя ўлады хочуць, каб яго сям'я зьехала з Клецкага раёну. Бо, паводле прадпрымальніка, апроч яго палітычнай дзейнасьцю займаецца і яго жонка Сьвятлана Панамарова, якая летась балатавалася ў парламент як прадстаўніца апазіцыі.

***22 сьнежня*** стала вядома, што адміністрацыя Магілёўскага аўтазаводу ўзмацніла перасьлед актывістаў філіі незалежнага прафсаюзу радыёэлектроннай прамысловасьці. Як сьцьвярджаюць прафсаюзныя ак-

тывісты, іх выклікалі да начальнікаў цэхаў і распавядалі пра перавагі, якія яны атрымаюць пры ўступленьні ў дзяржаўны прафсаюз. Намесьнік дырэктара прадпрыемства па ідэалогіі спадар Суханаў падрыхтаваў ліст, паводле якога прадстаўнікі адміністрацыі мусяць "правесьці тлумачальную працу дзеля прыцягваньня работнікаў у заводзкі прафсаюз". Да ліста прыкладзены сьпіс працоўных, куды патрапілі некалькі дзясяткаў сяброў незалежнага прафсаюзу. Першапачаткова рабочым казалі пра перавагі, а потым сталі наўпрост сталі запалохваць: нібыта іх не перавядуць на працу на Беларускі аўтамабільны завод, якому падпарадкоўваецца магілёўскі аўтазавод. Спадар Суханаў выклікаў да сябе старшыню заводзкай філіі прафсаюзу РЭП ***Аляксандра Карыткіна***, які ахарактарызаваў дзеяньні адміністрацыі як уціск правоў рабочых. 74 рабочыя падпісалі зварот да Аляксандра Лукашэнкі і інфармуюць яго пра сітуацыю на прадпрыемстве.

***24 сьнежня*** Беларускі саюз прадпрымальнікаў паведаміў: за 2005 год індывідуальных прадпрымальнікаў у Беларусі паменела на 30 тысячаў – гэта амаль пятая частка ад іх агульнай колькасьці на пачатак году. Яшчэ дваццаць тысячаў індывідуалаў знаходзяцца ў стане ліквідацыі. У Беларусі каля 186 тысячаў зарэгістраваных індывідуальных прадпрымальнікаў, разам з тымі, хто ўжо не працуе і ліквідуецца. Са словаў намесьніка старшыні Беларускага саюзу прадпрымальнікаў Рыгора Рылькова, яны і надалей будуць пакідаць бізнэс. Да таго ж, могуць істотна абмежаваць пералік тавараў, якімі можна будзе гандляваць на рынку, сьцьвярджае спадар Рылькоў. Аглядальнік газеты "Індывідуальны прадпрымальнік" Ірына Найдовіч кажа, што колькасьць індывідуалаў даўно перастала расьці, гэта канстатуюць нават прадстаўнікі Міністэрства эканомікі: "І яны не чакаюць таго, што будзе далейшы рост, і рэкамендуюць прадпрымальнікам, якія гандлююць, пераходзіць у сферу паслугаў альбо ствараць юрыдычныя асобы".

# 10. Парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду веравызнаньня

***13 студзеня*** кіраўнікі шэрагу пратэстанцкіх канфесіяў Беларусі накіравалі лісты пратэсту на адрас кіраўніка краіны, ураду, міністра адукацыі, скіраваныя супраць наўмыснай дыскрэдытацыі пратэстанцкіх цэркваў у грамадстве праз школьны падручнік "Асновы бясьпекі жыцьцядзейнасьці". Яны сьцьвярджаюць, што тэрмін "секта" не адпавядае сьпецыфіцы веравучэньня пратэстанцкіх цэркваў. Паводле пратэстантаў, распаўсюд непраў-

дзівай інфармацыі разьвязвае рэлігійную варожасьць і нянавісьць, а таму яны патрабуюць выдаліць падручнік з праграмы школьнага навучаньня. У Міністэрстве адукацыі абвінавачаньняў не прызнаюць, але абяцаюць перагледзець зьмест параграфу “Асьцярожна, секты”. Паводле прадстаўнікоў пратэстанцкіх цэркваў, зьняважлівая інфармацыя ў іх адрас у школьных падручніках зьяўляецца не ўпершыню. Раней гэта было ў падручніку “Чалавек. Грамадзтва. Дзяржава”, а таксама “Чалавек у сьвеце культуры”. І кожны раз на пратэсты вернікаў чыноўнікі абяцалі выправіць становішча. Вось як пракамэнтаваў пазыцыю ўладаў старшы прасьвітэр па Менскай вобласьці Генадзь Брудзкі: “Спачатку нас аблаялі ў падручніку, а пасьля сказалі, што гэта было агулам – паклёп, але не на вас накіраваны. І раней нам абяцалі гэта выправіць, і мы верылі, але пры перавыданьні кожнага новага падручніку матэрыял падаецца яшчэ з большым паклёпам, непрафесійна: зьмяшаць “Белае брацтва” з баптыстамі можа чалавек, які ўвогуле не арыентуецца ў гэтым, альбо яму добра заплацілі, каб ён зьняславіў баптыстаў. Калі мы будзем завяршаць размовы толькі такімі адпіскамі, то хутка можа распачацца рэлігійны шавінізм. Трэба неяк спыняць гэтую рэлігійную вайну”. Кіраўнікі шэрагу цэркваў абмяркоўваюць магчымасьць звароту ў суд па справе абароны гонару і годнасьці пратэстанцкай царквы ў Беларусі.

***23 студзеня*** на пляцоўку ў былой вёсцы Сухарава, дзе ***царква “Новае жыцьцё”*** праводзіць свае штонядзельныя набажэнствы, прыйшлі супрацоўнікі адміністрацыі і міліцыі Маскоўскага раёну Менску. Яны патрабавалі ад кіраўніцтва царквы дазвол на правядзеньне набажэнстваў. Гэтага дазволу ў пратэстантаў няма, бо яшчэ ў сьнежні старшыня Менскага гарвыканкаму Міхаіл Паўлаў адмовіў царкве ў дзяржаўнай перарэгістрацыі, таму кіраўнікі царквы “Новае жыцьцё” – пастар ***Вячаслаў Ганчарэнка*** і адміністратар ***Васіль Юрэвіч*** – 24 студзеня былі запрошаныя на размову да намесьніка начальніка Маскоўскага райаддзелу міліцыі Мікалая Кудзінава.

***26 студзен***я ў судзе Пружанскага раёну павінен быў адбыцца разгляд адміністрацыйнай справы ў дачыненьні да жыхароў Ружанаў, якіх абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага набажэнства. Аднак працэс так і не распачаўся: паводле меркаваньня судзьдзі, складзеныя міліцыянтамі пратаколы не адпавядаюць нормам, і гэтая справа ўвогуле ня можа разглядацца ў судовай установе. Справа ў тым, што больш за 100 праваслаўных вернікаў у Ружанах ужо амаль тры гады адмаўляюцца наведваць мясцовую Сьвята-Петрапаўлаўскую царкву. Вернікі тлумачаць гэта тым, што цяперашні сьвятар айцец Аляксандр Сень згубіў іхны давер. Пэўны час свае набажэнствы вернікі ладзілі ў звычайнай хаце, а сёлета вырашылі афіцыйна абвесьціць пра стварэньне ў Ружанах яшчэ адной праваслаўнай суполкі. Аднак кіраўніцтва Берасьцейска-Кобрынскай епархіі адмовілася прызнаваць гэтае рашэньне. Да перасьледу вернікаў і запроша-

нага імі з Берасьця сьвятара айца Іаана Грудніцкага далучыліся праваахоўныя органы.

***3 лютага*** аднаго з кіраўнікоў ***Евангельскай царквы "Новае жыцьцё" Васіля Юрэвіча*** запрасілі ў аддзел Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Маскоўскага раёну Менску, дзе абвясьцілі пра намер зачыніць прыход царквы ў мікрараёне Сухарава. Кіраўніцтва МНС тлумачыць такое рашэньне нямэтавым выкарыстаньнем аб'екту: маўляў, хрысьціяне зьбіраюцца ў былым калгасным кароўніку, які не адпавядае патрабаваньням пажарнай бясьпекі. Самі ж вернікі кажуць, што іншыя памяшканьні з гарадзкога фонду ім выдзеліць адмаўляюцца. "Мы напісалі лісты ва ўсе выканкамы гораду з адным пытаньнем: дзе на тэрыторыі вашага раёну мы можам праводзіць статутную дзейнасьць? І ўсе як пад дыктоўку адказалі: прабачце, але для вас у нас месца няма", — сьцьвярджае адзін з кіраўнікоў пратэстанцкай царквы Васіль Юрэвіч. Сітуацыю вакол уласнасьці царквы "Новае жыцьцё" пракаментавала кіраўнік Камітэту ў справах рэлігіяў Менскага гарвыканкаму Ала Рабіцава: "Выдзяленьне зямельных участкаў пад культавыя збудаваньні ідзе з асабістага ўзгадненьня прэзідэнта – і толькі. Перадача любых збудаваньняў – толькі з асабістага дазволу прэзідэнта. Яны самі стварылі гэтую сітуацыю. Пакуль рыса гораду не была зьмененая, мы іх і не чапалі. А цяпер гэта наш галаўны боль".

***10 сакавіка ў*** судах Берасьця і Пружанаў разглядаліся адразу дзьве справы ў адносінах да праваслаўнага сьвятара айца ***Іаана Грудніцкага***. Яны тычыліся складзеных на яго адміністрацыйных пратаколаў за арганізацыю несанкцыянаванага сходу вернікаў і ўдзел у рэлігійных мерапрыемстваў у часе пахаваньня аднаго з прыхаджанаў. Абодва выпадкі здарыліся ў паселішчы Ружаны, дзе ўжо больш за два гады цягнецца канфлікт паміж мясцовымі вернікамі і сьвятарамі Сьвята Петрапаўлаўскай праваслаўнай царквы. Частка вернікаў адмаўляецца наведваць храм, пакуль ім ня будзе паведамлена: куды з царквы зьніклі каштоўныя іконы ды іншыя рэчы? Апошнім часам вернікі ў Ружанах зьбіраюцца на малітвы ў жылым будынку і запрашаюць берасьцейскага сьвятара айца Іаана Грудніцкага. У Берасьцейскай праваслаўнай епархіі адмовіліся каментаваць сітуацыю, спаслаўшыся на тое, што справы царквы аддзеленыя ад дзяржаўных, а айцец Іаан Грудніцкі пазбаўлены права весьці службу. Рашэньня ў гэтых дзьвюх справах у адносінах да спадара Грудніцкага пакуль абвешчана не было: судзьдзі запатрабавалі дадатковыя зьвесткі пра склад правапарушэньняў з боку сьвятара.

***22 сакавіка*** судзьдзя суда Маскоўскага раёну г. Менску Надзея Рэўцкая вынесла рашэньне пра спагнаньне штрафу ў памеры 720 тысяч рублёў з ***Вячаслава Ганчарэнкі*** — пастара ***царквы "Новае жыцьцё"*** Аб'яднаньня суполак хрысьціян Поўнага Евангельля. Суд прызнаў пастара віна-

ватым у незаконнай арганізацыі 23 студзеня сходу вернікаў, які адбываўся ў былым кароўніку. Нягледзячы на штрафы, вернікі працягваюць зьбірацца ў будынку кожную нядзелю і патрабуюць ад уладаў дазволіць рэканструкцыю кароўніку ў раёне Сухарава дзеля таго, каб памяшканьне было прыстасаваным для правядзеньня богаслужэньняў.

***6 красавіка*** Радзе пратэстанцкай абшчыны ***царквы "Новае жыцьцё"*** Аб'яднаньня абшчын хрысьціян поўнага Евангельля ў Рэспубліцы Беларусь з афіцыйнага ліста, дасланага з гарвыканкаму, стала вядома, што 30 сакавіка Менскі гарвыканкам вынес другое пісьмовае папярэджаньне царкве. У лісьце сказана, што 30 сакавіка ў Менскі гарвыканкам паступіла копія пастановы суда Маскоўскага раёну ад 22 сакавіка пра адміністрацыйнае правапарушэньне, прадугледжанае ч. 1 арт. 167 КаАП Рэспублікі Беларусь, у адносінах да пастара царквы ***Вячаслава Ганчарэнкі***. За парушэньне ўстаноўленага парадку арганізацыі і правядзеньня рэлігійных мерапрыемстваў 23 студзеня і 20 лютага гэтага года суд аштрафаваў В.Ганчарэнку на 720 тыс. рублёў. "У сувязі з гэтым і на падставе арт. 37 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях" Менскі гарвыканкам, як рэгіструючы орган, выносіць рэлігійнай абшчыне "папярэджаньне" – адзначана ў лісьце. Прадстаўнік абшчыны ***Васіль Юрэвіч*** упэўнены, што чарговае "папярэджаньне" ўлады вынесьлі з мэтай "запалохваньня вернікаў".

***20 красавіка*** кіраўніцтва каталіцкага касьцёлу ў Беларусі зьвярнулася да ўладаў краіны з патрабаваньнем вярнуць у сваю ўласнасьць менскі касьцёл сьвятога Язэпа і кляштар бэрнардынцаў. Цяпер у будынку колішняга касьцёлу месьціцца Архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі, а таксама Архіў літаратуры і мастацтва Беларусі. Будынак былога кляштару займае вайсковая камендатура і пракуратура. Пра ініцыятыву касьцельных уладаў вернікам паведаміў настаяцель катэдральнага касьцёлу імя Панны Марыі, ксёндз Антоні Клімантовіч. Гэткія ж абвесткі зробленыя таксама ў іншых менскіх парафіях. Намесьнік кіраўніка Камітэту па архівах і справаводзтве Аляксей Забалотны гэтую сітуацыю пракаментаваў наступным чынам: "Сапраўды, ёсьць жаданьне вярнуць той будынак, але пакуль няма такога рашэньня. Яго, пэўна, ніхто ня можа прыняць, бо мы ж ня выселімся на вуліцу, нам няма кудыісьці. Гэты ж будынак даўно ў нас. Пакуль у нас ня будзе куды пераехаць — канечне ж, мы яго не аддамо". Паводле спадара Забалотнага, некалі існавала перспектыва ўзьвядзеньня асобнага будынку на патрэбы архіўнай справы, але з-за адсутнасьці грошай гэткіх спадзяваньняў зараз няма. Меркавалася таксама, што архівы пераедуць у цяперашнія памяшканьні Нацыянальнай бібліятэкі пасьля яе высяленьня. Але ні рашэньня на гэты конт, ні грошай на рАМАПт і пераезд таксама няма. У найлепшым выпадку так можа адбыцца гадоў праз пяць. Не сьпяшаецца пакінуць будынак кляштару таксама і вайско-

вая камендатура. За вяртаньне сьвятыняў вернікі распачалі набажэнствы на прыступках будынкаў. Да людзей сталых далучылася і моладзь. На прыступках былога касьцёлу сьвятога Язэпа і кляштара бернардынцаў, якія цяпер займаюць архівы і вайскоўцы, моляцца парафіяне розных менскіх касьцёлаў. Паводле іх, гэтыя набажэнствы вернікі намерваюцца зрабіць штодзённымі. Паводле гістарычных крыніцаў, касьцёл і кляштар ордэну бернардынцаў у Менску быў заснаваны ў 15 стагодзьдзі. Яны ўваходзілі ў кляштарны комплекс, дзе ў розныя гады працавала пачатковая школа, школа філязофіі, існавала бібліятэка на паўтары тысячы тамоў унікальнай літаратуры. У 1863 годзе манахі-бернардынцы падтрымалі паўстаньне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Пасьля яго падаўленьня па загадзе Мураўёва-вешальніка ўсе яны былі гвалтоўна выселеныя ў Магілёў, а кляштар зачынены. У касьцёле некаторы час месьцілася праваслаўная царква, а з 1872 году ён быў перабудаваны пад архіў, і ў гэткім выглядзе захаваўся да сёньняшняга дня.

***30 красавіка*** ў Менску прайшла супольная багаслужба прадстаўнікоў больш за 60 пратэстанцкіх ***цэркваў Поўнага Евангельля*** з усіх рэгіёнаў Беларусі – прыкладна 2 000 чалавек. Пратэстанцкія вернікі прынялі зварот да ўладаў з патрабаваньнем неадкладна спыніць ціск на менскую абшчыну “Новае жыцьцё”, зарэгістраваць гэтую царкву і дазволіць яе вернікам бесьперашкодна маліцца ў сваім малітоўным доме. Прычынай малітоўнага збору стаў пастаянны ціск на пастара і вернікаў гэтай царквы з боку мясцовых уладаў. Гаворыць адміністратар гэтай поўнаевангельскай абшчыны ***Васіль Юрэвіч***: “Мы хочам паказаць гэтай акцыяй, што той ціск, які аказваецца на нас сёньня, можа быць праз вельмі кароткі час аказаны і на іншыя цэрквы ў Беларусі. Таму мы хочам паказаць уладам, усім навокал, што мы разам, што мы адзіныя і мы адзінае цэлае”. Царква “Новае жыцьцё” некалькі гадоў таму выкупіла на тэрыторыі вёскі Сухарава будынак былога кароўніку і хацела перабудаваць яго пад малітоўны дом. З таго часу ў іх і пачаліся праблемы з уладамі, якія мелі свае пляны забудовы гэтай тэрыторыі. У выніку напрыканцы 2004 году царква не прайшла дзяржаўную перарэгістрацыю, перабудоўваць былую ферму пратэстантам забаранілі, і цяпер улады патрабуюць, каб вернікі як мага хутчэй вызвалілі гэтае памяшканьне. Актывісты царквы “Новае жыцьцё” зьвярнуліся да вернікаў іншых поўнаевангельскіх цэркваў з просьбаю аказаць ім падтрымку.

***24 траўня*** Камісія па міжнародных рэлігійных свабодах пры Кангрэсе ЗША прадставіла традыцыйную гадавую справаздачу адносна стану свабоды веравызнаньня ў сьвеце. Паводле амерыканскіх экспертаў, Беларусь разам з Кубай, Егіптам і Нігерыяй уваходзіць у гэтак званы “Watch List“, альбо сьпіс краін, за якімі трэба ўважліва назіраць, паколькі правы на веравызнаньне захоўваюцца тут недастаткова. Паводле высноваў

Камісіі, найбольш складаная сітуацыя ў галіне права на веравызнаньне назіраецца ва Узьбекістане.

***30 траўня*** каля 19.00 у Менску былі затрыманыя пяць рыма-католікаў, якія патрабавалі ад уладаў вярнуць касьцёл і кляштар бернардынцаў. Затрыманьне адбылося падчас малітвы на прыступках сьвятыняў. Вернікі былі дастаўленыя ў міліцыю, дзе на іх склалі праткол за несанкцыянаваны пікет і праз дзьве гадзіны адпусьцілі. Нагадаем, што католікі Беларусі зьвярнуліся да ўладаў краіны з патрабаваньнем вярнуць у сваю ўласнасьць менскі касьцёл сьвятога Язэпа і кляштар бернардынцаў. Цяпер у будынку касьцёлу месьціцца Архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі, а таксама Архіў літаратуры і мастацтва Беларусі. Будынак былога кляштару займае вайсковая камендатура і пракуратура. За вяртаньне каталіцкіх сьвятыняў вернікі распачалі набажэнствы на прыступках будынкаў.

***18 ліпеня*** ў Менскім гарадзкім судзе па ініцыятыве Менгарвыканкаму пачаўся разгляд справы па ліквідацы рэлігійнай суполкі ***Беларускай евангельскай царквы***, якую ўзначальвае пастар ***Эрнэст Сабіла***. Беларуская евангельская царква была зарэгістраваная Менгарвыканкамам у 1993 годзе. Жыльлёвы кодэкс 1999 году забараніў грамадзкім арганізацыям мець юрыдычныя адрасы на прыватных кватэрах, а паводле закону аб рэлігійных арганізацыях ад 2002 году, суполкі маюць права зьбірацца выключна ў нежылых памяшканьнях. Беларуская евангельская царква гэтых умоваў ня выканала. У судзе Эрнэст Сабіла заявіў хадайніцтва, каб працэс слухаўся на беларускай мове. Судзьдзя Ала Крапіўка патлумачыла, што не абавязаная размаўляць па-беларуску, пратакол таксама будзе напісаны па-расейску. Пастар заявіў, што для яго гэта пытаньне прынцыповае, і патрабаваў, каб у яго быў перакладчык з расейскай мовы. Судзьдзя задаволіла гэтае хадайніцтва. Прадстаўніца Менгарвыканкаму нечакана паведаміла суду, што супрацоўнікі аддзелу ў справах рэлігіі вельмі прыязна ставяцца да персоны Эрнэста Сабілы. Яна распавяла аб тым, што ўсе намагаліся яму дапамагчы і нават самі прасілі Саюз хрысьціян-баптыстаў даць суполцы Сабілы юрыдычны адрас, але атрымалі адмову. Чыноўніца казала, што ім вельмі шкада, але трэба выконваць закон. Сам сьвятар патлумачыў, што вернікі ня маюць такіх грошай, каб плаціць за арэнду памяшканьня. Тады судзьдзя папрасіла чыноўніцу дапамагчы пастару. Яна параіла яму зьвярнуцца ў дзяржаўныя структуры. На ўсе гэтыя працэдуры судзьдзя Ала Крапіўка вызначыла тэрмін — два месяцы.

***2 жніўня*** стала вядома, што ў Воршы ў ***Сьвята-Троіцкай царкве Куцеінскага манастыра*** ўсіх ахвотных запрашаюць падпісацца супраць “рыма-каталіцкай экспансіі на Беларусь” – у прыватнасьці, супраць будаўніцтва другога на ўвесь горад касьцёлу. У ідэалагічным аддзеле гарвыканкаму лічаць, што тутэйшыя каталікі самі справакавалі гэтае абві-

навачаньне ў свой бок, бо, маўляў, таксама зьбіралі подпісы – за будаўніцтва новага храму. Хто прынёс у царкву гэты сшытак, і куды потым пойдуць сабраныя подпісы, ніхто з вернікаў дакладна адказаць ня можа. Нічога ня ведае пра гэтую ініцыятыву і Благачынны пратаіерэй ***Айцец Мікалай (Вабішчэвіч)***, які апякуецца аршанскімі праваслаўнымі храмамі. Паводле ягонага меркаваньня, гэтая ініцыятыва магла быць выкліканая тым, што ў тым самым мікрараёне "Задняпроўе" задумалі пабудаваць новы храм аршанскія каталікі. У Воршы працуюць пяць цэркваў і адзін касьцёл. На будаўніцтва другога каталіцкага храму гарадзкія ўлады дазволу пакуль не даюць, паміж іншых прычынаў адтэрміноўкі называючы і неабходнасьць вывучэньня грамадзкае думкі. Як распавёў прадстаўнік каталіцкай суполкі ***Эдвард Асьвяцінскі***, вернікі самі скіраваліся па кватэрах, каб правесьці грамадзкае апытаньне і гэтым самым паскорыць вырашэньне гэтага пытаньня. Праваслаўныя вернікі, дачуўшыся пра грамадзкае апытаньне каталікоў, пачалі праводзіць сваё ўласнае. У аршанскім гарвыканкаме кажуць, што і адны, і другія парушылі закон, але вінаватыя перш за ўсё прадстаўнікі каталіцкае грамады, бо не захацелі чакаць, пакуль адпаведнае апытаньне правядуць дзяржаўныя структуры. Супрацоўніца гарвыканкаму Хамутоўская лічыць, што да абвінавачаньня ў рэлігійнай экспансіі на адрас мясцовых каталікоў ня варта ставіцца занадта сур'ёзна, пакуль справа не дайшла да адкрытага міжканфесійнага канфлікту, вартага ўвагі ўладаў.

***15 жніўня*** Менская гарадзкая землеўпарадкавальная геадэзічная служба назвала незаконным выкарыстаньне зямельнаго надзелу, які належыць ***царкве "Новае жыцьцё"*** Аб'яданьня суполак хрысьціянаў поўнага Евангельля ў Рэспубліцы Беларусь. Як паведаміў адміністратар суполкі ***Васіль Юрэвіч***, адміністрацыя Маскоўскага раёну сталіцы ў канцы чэрвеня адмовіла суполцы ў перарэгістрацыі ў доме № 72 па вуліцы Кавалёва. "У другой палове ліпеня мы атрымалі адказ ад намесьніка старшыні Менскага гарвыканкаму Міхаіла Пятрушына, у якім гаворыцца, што перарэгістрацыя суполкі ў дадзеным будынку немагчымая, бо яно не зьяўляецца культавым ці офісным", – адзначыў В.Юрэвіч. З ягоных словаў, у канцы ліпеня землеўпарадкавальная служба сталіцы ў сваім лісьце паведаміла, што надзел зямлі па адрасе Кавалёва, 72 у раёне былой вёскі Сухарава выкарыстоўваецца не па прызначэньню, бо ён быў выдзелены для абслугоўваньня кароўніку бяз зьменаў яго мэтавага прызначэньня. "На думку землеўпарадкавальнікаў, пытаньне аб скасаваньні суполкі права на ўласнасьць на гэты надзел зямлі павінен быць разгледжаны на бліжэйшым паседжаньні Менгарвыканкамуа", — сказаў В.Юрэвіч. Разам з тым сябры суполкі зьвярнуліся з лістамі да старшыні Менгарвыканкаму і кіраўніка дзяржавы з просьбай не дапусьціць самавольства. Суполка патрабуе дазволіць рэканструяваць кароўнік у культавы будынак, праводзіць набажэнствы на тэрыторыі свайго зямельнага надзелу, а таксама спыніць

ціск, які аказвае на царкву міліцыя, супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і санітарна-эпідэміялагічныя службы.

***19 жніўня*** Менскі гарадзкі суд вынес рашэньне аб ліквідацыі ***Хрысьціянскай рэлігійнай кангрэгацыі "Беларускі евангелічны рэфармацкі збор"***. Менгарвыканкам падаў на вернікаў пазоў у суд — за тое, што яны не прайшлі перарэгістрацыю. Судзьдзя Менскага гарадзкога суда Ала Салаўёва разгледзела справу аб ліквідацыі царквы на працягу адной гадзіны. Яна зачытала дакументы аб тым, што хрысьціянская рэлігійная кангрэгацыя "Беларускі Евангелічны рэфармацкі збор" зарэгістраваная ў Мінюсьце з 1992 году. У адпаведнасьці з новым заканадаўствам, усе грамадзкія і рэлігійныя арганізацыі мусяць мець юрыдычны адрас у нежылым фондзе. Вернікі-кальвіністы за два гады пасьля зьяўленьня Закону не падалі ў Менгарвыканкам новых дакументаў. Пастар Леанід Ліпень заявіў у судзе, што байкатуе новы закон і патрабуе, каб кальвіністам вярнулі іхнія храмы, якія гістарычна былі замацаваныя за гэтай канфесіяй: "Мы ня можам прызнаць дыскрымінацыйнага закону. Ён парушае свабоду сумленьня. Нам трэба, каб вярнулі нам свабоду, каб вярнулі нам гістарычныя будынкі (хаця б адзін з іх) і каб спынілі перасьлед. У нас сканфіскавалі ўсе будынкі. Сканфіскавалі, а цяпер патрабуюць нейкага юрыдычнага адрасу. Я думаю, што яны ўсё ведаюць. Ведаюць пра гісторыю рэфармацыі. Усё гэта зроблена сьвядома". Сусьветны альянс рэфармаваных цэркваў даслаў ліст на імя кіраўніка беларускай праваслаўнай царквы з Жэневы, у якім прасіў патрыяршага экзарха Філарэта паспрыяць вырашэньню пытаньня аб передачы храму кальвіністам ў Заслаўі, дзе цяпер спраўляецца праваслаўнае набажэнства. Але — безвынікова. Пастар Ліпень назваў справу ліквідацыі царквы палітычнай і замоўленай уладамі.

***2 верасьня*** стала вядома, што пратэстанцкай ***царкве "Новае жыцьцё"*** пагражае ліквідацыя. Менгарвыканкам патрабуе, каб вернікі аддалі свой будынак дзяржаве. Менгарвыканкам два тыдні таму пазбавіў царкву зямельнага надзелу, вернікам прапанавалі пакінуць памяшканьне. Прыватную ўласнасьць плануецца перавесьці ў дзяржаўную, пералічыўшы грошы на рахунак царквы. Такім чынам, з прычыны таго, што ў пратэстантаў ня будзе юрыдычнага адрасу, іхнюю суполку ліквідуюць. Пастар ***Вячаслаў Ганчарэнка*** называе некалькі прычынаў гэткай сітуацыі: "Я лічу, што наша сітуацыя абумоўлена некалькімі прычынамі. Першая — ідэалогія дзяржавы, якая аддае перавагу праваслаўнай канфесіі. Другая — ня выключана, што чыноўнікі зацікаўленыя забраць зямлю і будынак, каб на гэтым месцы пачаць будаўніцтва прыватных катэджаў. Трэцяя — небясьпечнае ўзмацненьне рэлігійнай нецярпімасьці". Дыякан царквы "Новае жыцьцё" Васіль Юрэвіч паведаміў, што вернікі пачалі бестэрміновую акцыю пратэсту. Яны будуць кругласуткава заставацца ў храме, зьмяняючы адзін аднаго. Міліцэйскае кіраўніцтва Маскоўскага раёну пагражае вернікам сілавымі метадамі, калі яны добраахвотна не пакінуць будынку.

***15 верасьня*** вернікі пратэстанцкай ***царквы "Новае жыцьцё"*** разам са сваімі дзецьмі зьбіраліся правесьці акцыю на плошчы Незалежнасьці. Менгарвыканкам месяц таму пазбавіў царкву зямельнага ўчастку, вернікам прапанавалі пакінуць памяшканьне. Царква апынулася пад пагрозай ліквідацыі. Паколькі вернікі запрашалі да сябе старшыню Менгарвыканкаму Міхаіла Паўлава, але ён праігнараваў запрашэньне, то яны вырашылі самі прыйсьці да яго. За дзьве гадзіны да правядзеньня акцыі адміністратара царквы Васіля Юрэвіча і пастара Вячаслава Ганчарэнку запрасіў да сябе намесьнік міністра ўнутраных справаў Віктар Філістовіч і паабяцаў вырашыць іх пытаньне, калі вернікі адмовяцца праводзіць вулічную акцыю. Гаворыць Васіль Юрэвіч: "Мы пайшлі насустрач толькі таму, каб нас потым не абвіначвавалі, што не намагаліся вырашыць пытаньне мірным шляхам".

***15 верасьня*** беларускія крышнаіты атрымалі адказ-рэзалюцыю з Камітэту правоў чалавека ААН, у якім сьцьвярджаецца, што беларускія ўлады парушылі правы вернікаў. Па-першае, абмежавалі іх права на дачыненьні і права запрашаць прапаведнікаў. Па-другое, не далі магчымасьці вернікам адкрыць свае навучальныя ўстановы, а таксама штучна стварылі невыносныя ўмовы для існаваньня арганізацыі. Камітэт правоў чалавека абавязаў беларускі ўрад у трохмесячны тэрмін надрукаваць рэзалюцыю ААН у СМІ.

***19 верасьня*** адбыліся перамовы кіраўніцтва менскай пратэстанцкай ***царквы "Новае жыцьцё"*** з прадстаўнікамі Міністэрства ўнутраных справаў, Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў і Менскага гарвыканкаму. Намесьнік міністра ўнутраных справаў Віктар Філістовіч у сваім кабінеце арганізаваў сустрэчу пастара царквы "Новае жыцьцё" ***Вячаслава Ганчарэнкі***, адміністратара ***Васіля Юрэвіча*** і юрыста ***Сяргея Луканіна*** з начальнікам аддзелу Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Аляксандрам Калінавым і прадстаўніцай Менскага гарвыканкаму Аленай Радчанка. Аднак сустрэча ня вырашыла праблемаў царквы "Новае жыцьцё", паведаміў адміністратар царквы Васіль Юрэвіч. Прадстаўнікі ўладаў прапанавалі пратэстантам шукаць новы юрыдычны адрас царквы, паколькі цяперашняе памяшканьне будзе ўсё роўна адабранае. Нагадаем, што канфлікт узьнік пасьля нацыяналізацыі ўчастку, на якім разьмешчаны малітоўны дом рэлігійнай суполкі, і адмовы ў яе перарэгістрацыі.

***20 верасьня*** судзьдзя Менскага гарадзкога суда Ала Крапіўка паставіла кропку ў справе ліквідацыі ***Беларускай евангельскай царквы***. Пастар ***Эрнэст Сабіла*** захварэў і ня змог прыйсьці на суд. Нягледзячы на гэта, судовае паседжаньне адбылося. Рэлігійная суполка евангелістаў была зарэгістраваная ў 1994 годзе. Праблемы пачаліся пасьля 2002 году. Паколькі царква была зарэгістраваная на кватэры пастара Сабілы, Менгар-

выканкам запатрабаваў, каб вернікі знайшлі новы юрыдычны адрас. Але царква налічвае менш за дваццаць чалавек. Грошай на арэнду офісу яны ня маюць. Судзьдзя Ала Крапіўка першае паседжаньне правяла ў ліпені і дала час пастару на пошук кампрамісу з чыноўнікамі. Але тыя адмовіліся дапамагчы знайсьці новы юрыдычны адрас. Як вынік, суд ліквідаваў царкву. Раней суд ужо ліквідаваў пратэстанцкую царкву кальвіністаў, пастарам якой зьяўляецца Леанід Ліпень. Пад пагрозай ліквідацыі пратэстанцкая царква “Новае жыцьцё”, дзе пастарам служыць Вячаслаў Ганчарэнка.

***23 верасьня*** суд Маскоўскага раёну сталіцы працягнуў разгляд справы адміністратара ***царквы “Новае жыцьцё” Васіля Юрэвіча***. Супрацоўнікі міліцыі абвінавацілі яго ў арганізацыі набажэнства, на правядзеньне якога не было дазволу ўладаў. Пратакол быў складзены 24 ліпеня. Разгляд справы доўжыўся каля паўгадзіны, пасьля чаго было прынятае рашэньне: прызнаць адміністратара царквы Васіля Юрэвіча вінаватым і накласьці штраф у адпаведнасьці з арт.167 частка 2 у памеры 160 базавых велічыняў, што складае 4 мільёны 80 тысячаў рублёў (каля 2 тысячаў даляраў). Вернікі царквы лічаць, што ўлады ініцыявалі суд, каб зьбіць хвалю пратэсту і ня даць выйсьці на вулічныя акцыі супраць ліквідацыі пратэстанцкай суполкі.

***5 кастрычніка*** ў Маскоўскім судзе Менску другі раз запар судзяць адміністратара пратэстанцкай ***царквы “Новае жыцьцё” Васіля Юрэвіча***. Яго абвінавачваюць у правядзеньні набажэнства, на якое не было дазволу ўладаў, 4 верасьня — менавіта ў той дзень вернікі чакалі ля будынку царквы старшыню Менгарвыканкаму Міхаіла Паўлава. Судзьдзя Надзея Рэўцкая дапытала Васіля Юрэвіча, а вось складальнікі пратаколу на суд не прыйшлі. Наогул, высьветлілася, што пратакол складаўся адным чалавекам у будынку міліцыі, а рапартаў супрацоўнікаў міліцыі, якія б зафіксавалі склад правапарушэньня, няма. Далейшае судовае разьбіраньне прызначанае на 7 кастрычніка.

***7 кастрычніка*** суд Маскоўскага раёну Менску вынес рашэньне аштафаваць за правядзеньне нядзельнага набажэнства адміністратара пратэстанцкай ***царквы “Новае жыцьцё” Васіля Юрэвіча*** амаль на 2 тысячы даляраў. Цяпер ён мусіць заплаціць дзяржаве ўжо каля 6 тысячаў даляраў.

***20 кастрычніка*** прадстаўнікі Кобрынскага райвыканкаму, пажарнай інсьпекцыі і санстанцыі наведалі незарэгістраваныя суполкі ***цэркваў Хрысьціянаў веры евангельскай і Евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў***. У будынках цэркваў былі выяўлены розныя парушэньні, у тым ліку і пажарнай бясьпекі, і на пастыраў гэтых рэлігійных грамадаў склалі адпаведныя пратаколы. Пастар кобрынскай царквы Хрысьціянаў веры евангельскай Мікалай Радковіч за парушэньне тэхнікі пажарнай бясьпекі ашт-

рафаваны на 25 тысячаў рублёў. Пратакол дзяржаўная камісія склала і на пастара незарэгістраванай кобрынскай царквы Евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў Сьцяпана Канавальчука. Супрацоўнік інфармацыйнага цэнтру “Свабода сумленьня” Станіслаў Акінчыц так пракаментаваў дзеяньні кобрынскіх чыноўнікаў: “Тут улады дзейнічаюць старым савецкім спосабам. Яны чапляюцца да вернікаў. Прычым, гэта робіцца ня ў форме парушэньня іх правоў, а ў форме менавіта прыдзірак розных службаў. Дэманструючы, што гэта пытаньне не рэлігійнае”. Праблемы таксама зьявіліся і ў незарэгістраванай грамады Евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў у Берасьці. Днямі ўлады нават хацелі апячатаць іх царкву на той падставе, што яна знаходзіцца занадта блізка ад жылых дамоў і гаспадарчых пабудоваў. Вернікі пакуль сваю сьвятыню адстаялі.

***26 кастрычніка*** епіскапы пратэстанцкіх саюзаў і грамадаў Беларусі падпісалі адкрыты зварот да кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Віктара Шэймана, у якім яны хадайнічаюць за хрысьціянскую поўнаевангельскую ***царкву “Новае жыцьцё”***. Епіскапы просяць “адклікаць рашэньне Менгарвыканкаму аб выманьні зямельнага ўчастку і прымусовым выкупе будынка ў царквы. На гэтым ці раўназначным участку выдзеліць зямлю пад будаўніцтва культавага будынку. На перыяд будаўніцтва пакінуць будынак па Каралёва, 72 для часовага правядзеньня набажэнстваў”. Пад зваротам падпісаліся: Сяргей Хоміч – епіскап Саюзу хрысьціянаў веры евангельскай, Мікалай Сінкавец – епіскап Саюзу евангельскіх хрысьціянаў баптыстаў, Аляксандр Саковіч – епіскап Рэлігійнага аб’яднаньня хрысьціянаў поўнага Евангельля і Майсей Астроўскі – епіскап Канферэнцыі Цэркваў хрысьціянаў адвентыстаў сёмага дня. Кіраўнікі пратэстанцкіх канфесіяў адзначаюць, што “ня ўсюды і не заўсёды мясцовыя органы ўлады ў асобе некаторых чыноўнікаў зацікаўленыя ў наладжваньні і захаваньні добрых, канструктыўных узаемаадносінаў з евангельскімі грамадамі”. Зварот кіраўнікоў пратэстанцкіх канфесіяў накіраваны таксама прэм’ер-міністру Сяргею Сідорскаму і старшыні Менгарвыканкаму Міхаілу Паўлаву.

***10 лістапада*** Дзярждэпартамент ЗША апублікаваў штогадовую справаздачу аб сітуацыі ў галіне свабоды рэлігіі ў сьвеце. У дакуменце прааналізаваная сітуацыя ў 197 краінах сьвету за перыяд ад ліпеня 2004 да ліпеня 2005 году. 13 старонак з гэтага дакументу прысьвечаныя Беларусі. Сярод краінаў, у якіх існуе дыскрымінацыйнае заканадаўства і прадузятае стаўленьне да некаторых рэлігіяў, названыя Беларусь, Расія і Азербайджан. Канстытуцыя Беларусі 1996 году пацьвердзіла рэлігійныя свабоды і роўны статус усіх веравызнаньняў. Беларускае грамадзтва ў асноўным талерантнае, што мае станоўчы ўплыў на дзейнасьць розных канфесіяў. Аднак на практыцы адчуваецца варожае стаўленьне да некаторых рэлігійных меншасьцяў з боку беларускага ўраду. У адпаведнасьці з законам (“Аб свабодзе веравызнаньняў і рэлігійных арганізацыях”) з 2002 году і

згодна з заключаным дзяржавай Канкардатам з Праваслаўнаю Царквою, БПЦ знаходзіцца ў прывілеяванай сітуацыі. Паводле справаздачы Дзярждэпартаменту, беларускія ўлады дыскрымінуюць тыя канфесіі, якія, на іхнюю думку, прапагандуюць іншую культуру і зьнешнія палітычныя ўплывы. На падставе закону аб перарэгістрацыі ўлады не зарэгістравалі 12 рэлігійных асацыяцыяў і 104 рэлігійныя грамады, пераважна пратэстанцкія суполкі. Сярод незарэгістраваных, у прыватнасьці, парафіі “Царквы Поўнага Евангельля”, але таксама Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква, Саюз Габрэяў і крышнаіты. Улады абвінавацілі беларускіх крышнаітаў ў нелегальным распаўсюджваньні рэлігійнай літаратуры. Паводле Закону, рэлігійная грамада павінна налічваць як мінімум 20 дарослых чалавек, а рэлігійныя асацыяцыі павінны налічваць як мінімум 10 грамадаў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі краіны мінімум 20 гадоў. Бяз юрыдычнага адрасу, статуту і дазволу на сходы, рэлігійныя арганізацыі ня маюць права праводзіць выдавецкую, педагагічную, дабрачынную і місіянерскую дзейнасьць. Улады адмаўляюць у рэгістрацыі тых грамадаў, асабліва пратэстанцкіх, якія праводзяць свае малітоўныя сходы ў прыватных кватэрах. Мясцовыя ўлады націскаюць на ўласьнікаў аб’ектаў, каб тыя не арандавалі іх пратэстантам, як гэта было ў Слоніме. Дагэтуль ня можа знайсьці памяшканьня менская грамада Царквы “Новае жыцьцё”. У справаздачы Дзярждэпартамэнту адзначаецца, што перарэгістрацыя стала магутным сродкам ўзьдзеяньня беларускіх уладаў на непажаданыя ім рэлігійныя арганізацыі. За справаздачны перыяд у Беларусі не адбывалася рэстытуцыі рэлігійнай маёмасьці. Для гэтага працэсу ў краіне няма заканадаўчай базы, закон нават забараняе рэстытуцыю будынкаў, якія выкарыстоўваюцца для культурных альбо адукацыйных мэтаў. За справаздачны перыяд урад неаднаразова штрафаваў прадстаўнікоў розных рэлігійных канфэсіяў за “незаконнае правядзеньне рэлігійных набажэнстваў” і “недазволеную рэлігійную дзейнасьць”. У 2004 годзе неаднаразова былі зафіксаваныя акты вандалізму на габрэйскіх могілках ды іншых памятных месцах у розных гарадах Беларусі, праваахоўным органам ніколі не ўдавалася знайсьці і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых.

***18 лістапада*** Бюро тэхнічнай інвентарызацыі Менску выдала прадстаўнікам пратэстанцкай ***царквы “Новае жыцьцё”*** тэхнічны пашпарт на будынак, у якім праводзяцца набажэнствы. Паводле новага пашпарту, будынак лічыцца культавым. Такім чынам, цяпер вернікі маюць законнае права ім валодаць. Але Менгарвыканкам будзе аспрэчваць рашэньне БРТІ. Вернікі пратэстанцкай царквы “Новае жыцьцё” лічаць, што новы тэхнічны пашпарт дае ім толькі часовы перапынак, бо Менгарвыканкам не адмовіўся ад свайго намеру пазбавіць вернікаў будынку.

***24 лістапада*** судзьдзя Партызанскага раённага суда г.Менску Мікалай Трубнікаў вынес папярэджаньне пастару менскай рэфармацкай ***цар-***

***квы "Запавет Хрыста" Георгію Вязоўскаму*** за "правядзеньне несанкцыянаванага набажэнства". Падчас судовага паседжаньня ўчастковы інсьпектар Сяргей Сівалобцаў паведаміў, што 30 кастрычніка ў прыватным доме № 30 па вуліцы Баграцiёна ў Менску без дазволу ўладаў адбыўся рэлігійны сход з удзелам каля 30 чалавек, якія маліліся і выконвалі рэлігійныя сьпевы. Вядучы сьпецыяліст аддзелу па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Менскага гарвыканкаму Ала Мартынава заявіла, што набажэнствы ў непрыстасаваных для іх правядзеньня месцах могуць ажыцьцяўляцца толькі з дазволу рэгіструючых органаў. Апрача таго, па яе словах, рэлігійнай суполцы ўжо былі вынесеныя тры пісьмовыя папярэджаньні гарадзкіх уладаў за адсутнасьць юрыдычнага адрасу. Царква "Запавет Хрыста" была зарэгістраваная ў 1994 годзе, а ў 2004 – не прайшла перарэгістрацыі, ня мае юрыдычнага адрасу, і вернікі зьбіраюцца ў прыватным доме, які належыць Г.Вязоўскаму.

***19 сьнежня*** пробашчу каталіцкай парафіі ў Барысаве айцу Роберту Кшывіцкаму, які зьяўляецца грамадзянінам Польшчы, адмоўлена ў працягу візы на 2006 год. Паводле айца Роберта, на парацяг яго знаходжаньня ў Беларусі не пагадзіўся Камітэт па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў. Сьвятар лічыць гэтае рашэньне беларускіх уладаў палітычным. Айцец Роберт працуе ў Беларусі больш за дзесяць гадоў. У Барысаве ён узначальвае каталіцкую парафію Зыходжаньня Сьвятога Духа. Барысаўскія вернікі і моладзь пачалі збор подпісаў за адмену рашэньня ўладаў.

***20 сьнежня*** стала вядома, што ***пратэстанцкай суполцы "Сьвятло Сьвету"*** пагражае ліквідацыя. Суполка была зарэгістраваная ў 1998 годзе ў Менгарвыканкаме. Яна ўваходзіць у аб'яднаньне суполак "Хрысьціянаў поўнага Евангельля". У 2004 годзе вернікі прайшлі перарэгістрацыю. Дамова арэнды скончылася сёлета 31 кастрычніка. Пастар Андрэй Сідар паведаміў, што ня можа зарэгістраваць царкву па новым адрасе, бо, паводле яго словаў, чыноўнікі выканкаму забараняюць уладальнікам офісаў даваць вернікам свой адрас.

## 11. Дыскрымінацыя правоў грамадзянаў па прыкметах мовы і нацыянальнай прыналежнасьці

***26 студзеня***, у 15-ю гадавіну прыняцьця беларускага Закону аб мовах, моладзевая ініцыятыва "Вока" выступіла з адкрытым зваротам да грамадзянаў краіны, у якім заклікала далучыцца да акцыі "Беларусізацыя ТБ".

“Вядома, адразу перавесьці ўсю сістэму тэлевізійнага вяшчаньня на беларускую мову вельмі складана ці немагчыма, але стварыць некалькі перадачаў, якія б выходзілі на беларускай мове, чытаць навіны на ёй жа магчыма”, — лічаць ініцыятары акцыі. На іх думку, “зараз мы павінны проста заявіць пра сваё жаданьне пастаянна чуць на тэлебачаньні нашу родную мову”.

***27 студзеня*** Фонд разьвіцьця і падтрымкі цыганскіх традыцыяў накіраваў адкрыты ліст Лукашэнку, у якім выказаў меркаваньне пра існаваньне ў краіне расавай дыскрымінацыі. Кіраўніца грамадзкай арганізацыі віцяблянка ***Вера Грахоўская*** інфармуе, што Фонд створаны выключна для аказаньня ромам матэрыяльнай і сацыяльнай дапамогі. Паперы на рэгістрацыю арганізацыя падала ў Віцебскі аблвыканкам у сьнежні 2003 году. Сярод тых дакументаў быў і гарантыйны ліст Кастрычніцкага ЖРЭТ Віцебску, дзе абяцалася пасьля набыцьця фондам юрыдычнага статусу заключыць з арганізацыяй дамову на арэнду памяшканьня. Аднак пасьля рэгістрацыі ёй адмовілі: маўляў, плошчы ўжо здадзеныя. Спачатку раілі пачакаць, а праз нейкі час жыльлёва-эксплуатацыйныя службы “накіравалі ў Віцебскі гарвыканкам”. Там аказалася, што стварэньне Фонду ня было ўзгоднена з аддзелам прапаганды і ідэалогіі гарадзкога выканаўчага камітэту, а таму аблвыканкам ня меў права надаваць НДА юрыдычны статус. “Гэта парушэньне нашых канстытуцыйных правоў на аб’яднаньне і вельмі падобна на расавую дыскрымінацыю”, – мяркуе сп. Грахоўская.

***4 лютага*** Галоўнае праўленьне ***“Саюзу палякаў на Беларусі”*** зьвярнулася да кіраўніцтва Польшчы з заклікам аб падтрымцы і маніторынгу дзейнасьці арганізацыі да моманту правядзеньня зьезда СПБ. Справа тычыцца папярэджаньня Саюзу палякаў, якое вынесла 28 студзеня Міністэрства юстыцыі. Міністэрства палічыла, што, прыпыняючы выкананьне Тадэвушам Кручкоўскім абавязкаў старшыні СПБ і прызначаючы зьезд арганізацыі, праўленьне перавысіла свае паўнамоцтвы. Галоўнае праўленьне СПБ з гэтым ня згодна. “Статут СПБ ня быў парушаны, а Міністэрства юстыцыі было падманута старшынёй Галоўнай Рады і старшынёй СПБ,” – гаворыцца ў звароце. На думку намесніка старшыні СПБ, Юзэфа Пажэцкага, у пратаколе паседжаньня Галоўнай Рады СПБ, які знаходзіцца ў Тадэвуша Кручкоўскага, гаворыцца, што рашэньне пра правядзеньне з’езда прыняў гэты орган, і менавіта непрадстаўленьне гэтага дакументу ў Мінюст стала прычынай вынясеньня папярэджаньня арганізацыі за “перавышэньне Галоўным праўленьнем сваіх паўнамоцтваў”. Ужо пасля вынясеньня папярэджаньня, Галоўнае праўленьне пацьвердзіла сваё рашэньне аб правядзеньні Зьезду СПБ 12-13 сакавіка. Спроба Тадэвуша Кручкоўскага сабраць надзвычайнае паседжаньне Галоўнага праўленьня пацярпела крах. На паседжаньне з’явіліся толькі дзве асобы. Таму з-за адсутнасьці кворуму Кручкоўскі яго нават не праводзіў. Старшыня Галоўнай Рады СПБ Канстанцін Тарасевіч, гарачы прыхільнік

Кручкоўскага, заявіў, што Саюзу палякаў пагражае раскол. Гэта можа азначаць, што групоўка Кручкоўскага гатовая для захаваньня сваіх паўнамоцтваў пры падтрымцы беларускіх уладаў ісьці нават на знішчэньне старэйшай польскай арганізацыі ў Беларусі.

***11 лютага*** Вярхоўны суд Беларусі прызнаў законным афіцыйнае папярэджаньне Мінюсту на адрас "Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў", вынесенае 24 лістапада 2004 году за адмову падаць анкету сацыялагічнага апытаньня. У пастанове судзьдзі Вярхоўнага суда Валянціны Кулік, якою папярэджаньне Мінюсту на адрас НІСЭПД пакідаецца ў сіле, зазначаецца, што ў адпаведнасьці з артыкулам 25 Закону аб грамадзкіх аб'яднаньнях любыя іх дакументы і матэрыялы, што адносяцца да статутнай дзейнасьці, павінны прадстаўляцца Мінюсту. Паколькі сацыялагічныя дасьледаваньні адносяцца да статутнай дзейнасьці НІСЭПД, то ўсе матэрыялы, якія пры гэтым выкарыстоўваюцца, у тым ліку і запоўненыя анкеты, павінны зьберагацца і падавацца паводле запытаў органу рэгістрацыі. Такім чынам, ананімнасьць сацыялагічных дасьледаваньняў пастаўленая судом пад пагрозу. Судзьдзя таксама патлумачыла, што Мінюст мае права правяраць і інфармацыю, якая ўтрымлівае камерцыйную таямніцу, калі, напрыклад, інстытут праводзіць маркетынгавыя дасьледаваньні. Дырэктар НІСЭПД Алег Манаеў лічыць гэтае рашэньне знакавым для грамадзтва: "Такім чынам створаны прэцэдэнт, гэта ўпершыню за апошнія гады, які пашырае кантроль дзяржаўнай улады, у гэтым выпадку праз Мінюст, над грамадзянскай супольнасьцю".

***15 сакавіка*** першы віцэ-старшыня Саюзу беларускіх яўрэйскіх грамадзкіх аб'яднаньняў і абшчынаў ***Якаў Басін*** агучыў высновы адносна аналізу падзеяў у студзені-лютым 2005 году, якія сьведчаць, што праявы ксенафобіі і антысемітызму носяць "усё болей неанацысцкі характар пры поўным патураньні ўладаў, якія працягваюць рабіць выгляд, што такая зьява ў краіне адсутнічае". Па ягоных словах, улады спрабуюць схаваць праявы дзейнасьці моладзевых неанацысцкіх груповак. Ён указаў, што побытавы антысемітызм падпітваецца мноствам кніжак антысеміцкага зьместу, большая частка якіх трапляе з Расіі. Прычым гэтая літаратура рэалізуецца ў дзяржаўных кнігарнях.

***19 красавіка*** падчас выступу з пасланьнем Нацыянальнаму сходу Аляксандр Лукашэнка нечакана закрануў далікатную тэму міжнацыянальных і міжканфесійных адносінаў, зазначыўшы, што паміж беларускімі каталікамі, палякамі, палешукамі праводзіцца нейкая праца, каб схіліць іх супраць дзеючай улады. Гэтая размова вялася ў кантэксьце вострага непрыняцьця А. Лукашэнкам магчымасьці аксамітнай рэвалюцыі ў Беларусі па прыкладзе Украіны і Грузіі. Асаблівы акцэнт быў зроблены А. Лукашэнкам на

беларускіх паляках, ці сапраўды сярод іх вялікае незадавальненьне ўладамі, якое магло б перарасьці ў рэвалюцыйныя настроі. Аляксандр Лукашэнка абвінаваціў польскую амбасаду ў Менску ў падрыўной працы, у агітацыі беларускіх палякаў супраць дзеючай улады, нават праз касьцёл. У самой амбасадзе былі відавочна зьбянтэжаныя такой заявай, ды і прадстаўнікі польскай меншасьці – таксама. Адзін з лідэраў польскага нацыянальнага руху ў Беларусі Тадэвуш Гавін лічыць, што ні амбасада, ні касьцёл ніякай палітычнай працы супраць уладаў не вядуць. Скандальнымі і пазбаўленымі сэнсу назваў антыпольскія заявы Аляксандра Лукашэнкі сьпікер польскага Сейму, былы міністр замежных справаў, Уладзімеж Цімашэвіч. “Падобныя заявы не дастойныя чалавека, які займае пасаду прэзідэнта”, – падкрэсьліў Цімашэвіч.  Паводле ягоных словаў, беларускім уладам можа не падабацца тое, што “Саюз палякаў на Беларусі” ўзначаліў ня той чалавек, на якога яны ставілі.

***29 красавіка*** у Менску адбыўся Марш памяці ахвяраў Халакосту, у якім узялі ўдзел прадстаўнікі габрэйскай грамады Беларусі, прадстаўнікі дэлегацыі з Нямеччыны, дыпламаты, акрэдытаваныя ў Беларусі. Завяршыўся Марш памяці жалобным мітынгам ля мемарыяльнага комплексу “Яма”.

***6 траўня*** ў Віцебску невядомыя вандалы намалявалі свастыку на будынку сінагогі. Сябры габрэйскай рэлігійнай суполкі зьвярнуліся ў міліцыю, а таксама ў гарадзкія газеты, каб зьвярнуць увагу грамадзкасьці на гэты факт. Яны лічаць, што выява свастыкі невыпадкова зьявілася на будынку сіногогі менавіта ў дзень, калі габрэі ўсяго сьвету адзначалі “Дзень катастрофы” (“Йом А-Шоа”) – дзень памяці ахвяраў Халакосту. У Віцебску падобнае здарылася ўпершыню, і таму габрэі-вернікі лічаць неабходным папярэдзіць ня толькі ўсіх адзінаверцаў, але і ўсіх віцяблян пра тое, што напярэдадні Дня Перамогі ў горадзе актывізаваліся прыхільнікі фашызму і нацызму.

***11 траўня*** ў судзе польскага гораду Беласток адбыўся першы разгляд па справе штотыднёвіка беларусаў у Польшчы “Ніва”. Абвінавачваюць 11 асобаў. Галоўны рэдактар “Нівы” ***Яўген Вапа*** паведаміў: “Сёньня абвінаваўца, а гэта значыць пракуратура, прадставіла нам прапановы так званага “ўмоўнага пакараньня”. Гэта значыць, каб мы пагадзіліся быць вінаватымі. Калі мы прызнаем сябе вінаватымі, то ў гэтым выпадку атрымаем ўмоўнае пакараньне з адтэрміноўкай на год і штраф у памеры да 600 злотых. Але мы ня лічым сябе вінаватымі. І гатовыя прадстаць перад судом, каб давесьці гэта грамадзкасьці! Таму ўсе абвінавачаныя сябры Праграмнай Рады тыднёвіка “Ніва” на такую прапанову не пагадзіліся, і судзьдзя прыняў рашэньне накірваць справу на судовае дасьледаваньне. Тэрмін пачатку судовага паседжаньня пакуль што не вызначаны”. Нагадаем, што сябрам Праграмнай Рады штотыднёвіка беларусаў Польшчы “Ніва” — аўтарытэтным грамадзкім дзеячам прад’яўленыя абвінавачаньні ў

няправільным выкарыстаньні грашовых сродкаў, выдаткаваных польскай дзяржавай на падтрымку выданьня. Беларускія праваабаронцы ўспрымаюць гэтыя дзеяньні польскіх уладаў як форму запалохваньня беларускай нацыянальнай меншасьці з мэтай выключэньня яе з культурнага, грамадзкага і палітычнага жыцьця Польшчы.

***12 траўня*** стала вядома, што Міністэрства юстыцыі прызнала несапраўдным шосты зьезд грамадзкага аб’яднаньня ***“Саюз палякаў на Беларусі”***, які адбыўся два месяцы назад у Гародні. Гэтую інфармацыю намесьніку старшыні СПБ у тэлефоннай размове пацьвердзіў начальнік упраўленьня грамадзкіх аб’яднаньняў Мінюсту Алег Сьліжэўскі. Ён таксама дадаў, што пісьмовае рашэньне выслана на адрас сядзібы “Саюзу палякаў на Беларусі”. Гэта азначае, што і рашэньні зьезду, і перавыбранае новае кіраўніцтва арганізацыі неправамоцныя. Сваё рашэньне Мінюст тлумачыць тым, што на працягу апошніх двух месяцаў да іх паступіла мноства скаргаў ад сяброаў СПБ: маўляў, у іх людзі выказваюць абурэньне масавымі парушэньнямі пры вылучэньні дэлегатаў на зьезд ад раённых філіяў. Падкрэсьліваецца нават, што ў зьезьдзе бралі ўдзел і галасавалі людзі, якія не зьяўляліся дэлегатамі. Міністэрства юстыцыі рэкамендуе быламу кіраўніку СПБ Тадэвушу Кручкоўскаму, якога новая кіраўніца Анжаліка Борыс нядаўна абвінаваціла ў крадзяжы дакументацыі арганізацыі, на працягу двух тыдняў правесьці новы зьезд. А. Борыс заявіла, што яна абраная на сакавіцкім зьезьдзе дэмакратычным шляхам, што на новае кіраўніцтва аказваецца непасільны ціск з боку ўладаў Беларусі, і што яна будзе прыкладаць усе намаганьні, каб нармалізаваць дзейнасьць “Саюзу палякаў на Беларусі”.

***13 траўня*** амбасада Ізраіля ў Беларусі накіравала лісты у Міністэрства замежных справаў Беларусі, а таксама ў Міністэрства інфармацыі і галоўнае ідэалагічнае ўпраўленьне адміністрацыі прэзідэнта, у якіх выказваецца пратэст на артыкул, надрукаваны ва ўрадавай газеце “Рэспубліка”. Паводле ізраільскай амбасады, публікацыя галоўнага рэдактара “Інфармацыйнага бюлетэню Адміністрацыі прэзідэнта” Эдуарда Скобелева “Не дапусьціць беларускага “Майдана”, надрукаваная 5 красавіка, зьяўляецца “мацёрым антысеміцкім артыкулам, які ў першую чаргу наносіць шкоду прэстыжу Беларусі”. Амбасада Ізраілю заяўляе, што публікацыя ў “Рэспубліцы” грунтуецца на адной з антысеміцкіх фальшывак, “Пратаколах сіёнскіх мудрацоў”, што зьяўляецца “спробай пасеяць міжнацыянальную варожасьць ”. Як адзначае амбасада, “у якасьці галоўнай мэты Другой сусьветнай вайны Скобелеў указвае на стварэньне дзяржавы Ізраіль, распальвае нянавісьць да Ізраілю”, артыкул “пазнавальны па лексыцы часоў “справы ўрачоў” ці запазычаны з больш старажытных антысеміцкіх крыніцаў”. Раней амбасада накіроўвала ліст у газету “Рэспубліка”, аднак цягам двух тыдняў рэдакцыя яго не апублікавала і нават ніяк не адказала.

Першы намесьнік галоўнага рэдактара Міхаіл Валькоўскі спаслаўся на закон аб друку, які, маўляў, дазваляе рэдакцыі рэагаваць цягам месяца, калі для гэтага ёсьць падстава. А вось як паставіўся да артыкулу ў газеце "Рэспубліка" кіраўнік Саюзу беларускіх габрэйскіх арганізацыяў і суполак Леанід Левін: "Мы таксама падрыхтуем сваё стаўленьне ў газету і вышэй. Мы лічым, што гэта проста правакацыя, таму мы таксама будзем абурана адказваць. Скобелеў проста нейкі пункцік мае на гэты конт. Гэта проста нельга так чалавеку, які працуе ў адказных нашых органах, гэта як бы твар кіраўніцтва. Яго выступленьне – гэта проста запалкі ў порах. Навошта гэта рабіць, навошта гэта правакаваць?"

***14 траўня*** Галоўная Рада ***"Саюзу палякаў на Беларусі"*** аднагалосна вырашыла не прызнаваць патрабаваньні Міністэрства юстыцыі аб правядзеньні новага зьезду. У пасяджэньні, якое адбылося ў Гародні, бралі ўдзел прадстаўнікі большасьці абласьцей Беларусі. З 35 сяброў Рады прысутнічалі 25, большасьць іншых далі сваю згоду на прыняцьце рашэньня па тэлефоне.

***17 траўня*** супрацоўнік амбасады Польшчы ў Беларусі ***Марэк Буцька*** абвешчаны беларускімі ўладамі персонай нон-грата і мусіць цягам месяцу пакінуць тэрыторыю Беларусі. Марэк Буцька адказвае ў польскай амбасадзе за кантакты з палітычнымі партыямі, грамадзкімі арганізацыямі і СМІ. Ён таксама падтрымліваў кантакты з "Саюзам палякаў на Беларусі", які цяпер апынуўся ў цэнтры ўвагі беларускіх уладаў.

***18 траўня*** Галоўная Рада "Саюзу палякаў на Беларусі" накіравала заявы ў Генеральную пракуратуру, Міністэрства юстыцыі і адміністрацыю прэзідэнта, у якіх выказала пратэст супраць дзеяньняў, якія, як сьцьвярджаецца ў дакуменце, абражаюць пачуцьці палякаў у Беларусі. Канфлікт быў справакаваны рашэньнем Міністэрства юстыцыі аб непрызнаньні вынікаў сакавіцкага зьезду СПБ і фільмам Беларускага тэлебачаньня "Хто заказаў Саюз палякаў?" Удзельнікам захадаў супраць "Саюзу палякаў на Беларусі" пагражаюць візавыя санкцыі. У амбасадзе Польшчы ў Менску пацьвердзілі, што адносна асобаў, якія ўдзельнічалі ў нядаўніх дзеяньнях супраць СПБ, будуць уведзеныя візавыя санкцыі.

***20 траўня*** ў польскім Сейме прайшло надзвычайнае сумеснае паседжаньне парламенцкай камісіі замежных справаў і камісіі па справах кантактаў з палякамі за мяжой, падчас якога абмяркоўваліся польска-беларускія дачыненьні. Дэпутаты Сейму прапануюць канкрэтныя меры, у тым ліку — увесьці забарону на ўезд у Польшчу для беларускіх чыноўнікаў, якія датычныя да канфлікту з "Саюзам палякаў на Беларусі". Гаворыць сябра камісіі па справах кантактаў з палякамі за мяжой Марыюш Каменскі: "Прадстаўнік МЗС, які прысутнічаў на паседжаньні камісіі, паведаміў нам, што ў сьпіс асобаў, чый уезд на тэрыторыю Польшчы непажаданы, унесе-

ныя шэраг палякаў, якія супрацоўнічаюць з Лукашэнкам, маючы на мэце раскалоць Саюз палякаў, а таксама беларускія чыноўнікі, якія маюць да гэтага дачыненьне. І яшчэ адна канкрэтная рэч – калі здарыцца так, што адбудзецца пераварот і да ўлады ў Саюзе палякаў прыйдуць людзі, што скампраметавалі сябе супрацоўніцтвам з рэжымам Лукашэнкі, мы спынім усялякую фінансавую падтрымку гэтай арганізацыі".

***20 траўня*** кіраўніцтва ***"Саюзу палякаў на Беларусі"*** паведаміла, што прадстаўнікі ўладаў аказваюць ціск на некаторых актывістаў СПБ, якія зьбіраюць подпісы пад лістом-зваротам да Аляксандра Лукашэнкі. Сябрам СПБ пагражаюць непрыемнасьцямі, нават звальненьнем з працы. Такія сігналы паступілі, у прыватнасьці, з Ліды і Смаргоні. Подпісы зьбіраюцца трэці дзень, іх сабралі ўжо каля тысячы. У лісьце зазначана, што падпісанты абураныя фільмам "Хто замовіў Саюз палякаў", які паказала Беларускае тэлебачаньне, і "масіраванай інфармацыйнай атакай" на сваю арганізацыю. Сябры СПБ таксама пішуць прэзідэнту, што не займаюцца палітыкай і "не зьбіраюцца нікога выводзіць на барыкады".

***24 траўня*** міністр юстыцыі Беларусі Віктар Галаванаў "са зьдзіўленьнем успрыняў інфармацыю пра тое, што Польшча ўнесла яго ў сьпіс "неўязных" за рашэньне міністэрства аб прызнаньні нелегітымным апошняга зьезду ***"Саюзу палякаў на Беларусі"***. "Мне шкада, што польскі бок такім чынам рэагуе на патрабаваньне да грамадзкіх арганізацыяў выконваць дзеючае заканадаўства", – заявіў міністр. Спадар Галаванаў паўтарыў меркаваньне Мінюсту, што шосты зьезд СПБ прайшоў з парушэньнямі заканадаўства. Ён таксама прыгадаў, што Саюз ужо атрымаў сёлета адно пісьмовае папярэджаньне. "Калі быць да канца прынцыповымі, можна падаваць у суд справу аб ліквідацыі Саюзу палякаў", – падкрэсьліў Віктар Галаванаў і дадаў, што "беларускі бок пайшоў насустрач Саюзу, не жадаючы правакаваць канфлікт". Паводле міністра, калі Саюз не абскардзіць рашэньня Мінюсту і не правядзе новага зьезду, на чале Саюзу палякаў Беларусі павінна застацца папярэдняе кіраўніцтва.

***24 траўня*** ў Гародні прайшоў "круглы стол" з удзелам прадстаўнікоў шасьці суполак нацыянальных меншасьцяў. Яны аднагалосна выказалі маральную падтрымку сябрам ***"Саюзу палякаў на Беларусі"***. Падчас дыскусіі высьветлілася, што і прадстаўнікі грамадзкага аб'яднаньня "Абшчына беларускіх чувашоў", літоўскай "Тэвіне", габрэйскай суполкі "Мінора" і "Рускага таварыства", а таксама грамадзкага аб'яднаньня татараў Гародні маюць пэўныя праблемы ў адносінах з уладамі. Так, кіраўнік літоўскай суполкі Альгімантас Дзіргінчус канстатаваў, што пасьля таго, як у мінулым годзе яны адмовіліся ад удзелу ў Фестывалі нацыянальных культур, у аб'яднаньня адразу пачаліся праблемы з падатковай інсьпекцыяй. Прадстаўніца габрэйскай суполкі Алена Куцэвіч гаварыла пра тое, што ўлады

не спрыяюць у справе аднаўленьнягарадзенскай сінагогі. Падсумаваў усе крыўды кіраўнік грамадзкага аб’яднаньня татараў Гародні Аляксандр Крыніцкі: “Мы пакрыўджаныя дзяржавай. Пра нас згадваюць толькі раз на два гады, калі ўладам трэба праводзіць Фестываль нацыянальных культураў…”.

***25 траўня*** новае кіраўніцтва ***“Саюзу палякаў на Беларусі”*** атрымала ліст з Міністэрства юстыцыі, у якім зьмешчанае настойлівае патрабаваньне паўторна правесьці зьезд арганізацыі. Нагадаем, што Мінюст на падставе быццам бы шматлікіх парушэньняў пры падрыхтоўцы і правядзеньні шостага зьезду СПБ, прызнаў яго нелегітымным. Новае кіраўніцтва арганізацыі на чале з Анжалікай Борыс лічыць, што зьезд быў цалкам дэмакратычным і правамоцным. У Міністэрства юстыцыі быў накіраваны ліст з просьбай яшчэ раз праверыць тыя факты, у абгрунтаваньні якіх існуюць сумненьні. І вось прыйшоў адказ, з якога вынікае, што Мінюст застаўся на старых пазіцыях і па-ранейшаму патрабуе правядзеньня паўторнага зьезду СПБ. Прэсавы сакратар арганізацыі Анджэй Пісальнік заявіў, што СПБ хацела вырашыць канфлікт з Мінюстам законным чынам, таму і зьвярнулася яшчэ раз да яго з просьбай уважліва разабрацца. Але з гэтага нічога ня выйшла. Цяпер гэтае рашэньне новае кіраўніцтва СПБ будзе абскарджваць у судзе.

***26 траўня*** ў Бабруйску пачалася акцыя «Не –фашызму», ініцыятарамі якой сталі Партыя БНФ, “Малады Фронт” і грамадзкая арганізацыя «Свая справа». Дэмакраты заклікалі кіраўніцтва Бабруйска зьнішчыць антысеміцкія надпісы на будынках гораду. Невядомыя малююць шыбеніцу, і на ёй – зорку Давіда. Трэба адзначыць, што гэта – не масавая зьява. Але справа ў тым, што некаторыя надпісы гарадзкія службы не заўважаюць некалькі месяцаў. У бабруйскіх дэмакратаў ёсьць яшчэ адна прычына займацца зьнішчэньнем антысеміцкіх малюнкаў. Справа ў тым, што частка з іх падпісаная «АКМ» («Авангард чырвонай моладзі»), а іншая частка падпісаная літарамі «БНФ». Лідэр Партыі БНФ у Бабруйску Дзяніс Шэйко запэўнівае, што яго арганізацыя ніякага дачыненьня да гэтага ня мае, і разам з іншымі ўдзельнікамі акцыі зьвярнуўся да гарадзкіх уладаў з заклікам зьнішчыць антысеміцкія надпісы. Удзельнікі акцыі прапанавалі гарадзкім уладам склікаць моладзевую канферэнцыю для таго, каб пагутарыць пра нацыянальныя меншасьці – у прыватнасьці, пра габрэйскую грамаду. І стварыць там грамадзкі камітэт, які будзе кантраляваць сітуацыю, калі гарадзкая ўлада і далей ня будзе заўважаць зьняважальныя надпісы на будынках Бабруйску. Загадчык аддзелу ідэалогіі Бабруйскага гарвыканкаму Сяргей Біткін сказаў, што ня бачыў антысеміцкіх надпісаў, затое пагадзіўся, што час ад часу на сьценах дамоў зьяўляецца свастыка. Хто малюе – невядома, але ідэолаг лічыць, што гэта ад недахопу выхаваньня. Старшыня бабруйскай габрэйскай грамады Леанід Рубінштэйн бачыў прама ў цэнтры гораду намаляваныя шыбеніцу з зоркай Давіда. Ён сказаў, што

гэта вельмі непрыемна, тым больш што зьневажальны малюнак не зьнішчаюць ужо як мінімум два месяцы.

***30 траўня*** кіраўніцтва ***"Саюзу палякаў на Беларусі"*** накіравала ліст старшыні КДБ Беларусі і міністру унутраных справаў. У ім гаворыцца, што Галоўная управа СПБ "абураная перасьледам з боку ўпраўленьня КДБ Берасьцейскай вобласьці і органаў МУС старшыні Берасьцейскага аддзелу СПБ Аліны Ярашэвіч і іншых актывістаў арганізацыі". Сябраў Саюзу выклікаюць на допыты і спрабуюць завербаваць, гаворыцца ў лісьце. Кіраўніцтва СПБ просіць спыніць рэпрэсіі супраць арганізацыі, а вінаватых у гэтых дзеяньнях — прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці. Намесьнік старшыні Саюзу палякаў Юзэф Пажэцкі патлумачыў, што кіраўнік Берасьцейскага аддзелу Аліна Ярашэвіч мусіла зьвярнуцца па дапамогу да кіраўніцтва СПБ, зважаючы на ціск з боку супрацоўнікаў сьпецслужбаў і прадстаўнікоў уладаў. Апроч іншага, у Берасьці была закрытая польская нядзельная школка. Юзэф Пажэцкі зазначае таксама, што ўлады ў розных мясьцінах Беларусі імкнуцца ўплываць на Саюз палякаў: "Улада праводзіць работу па ўсёй Беларусі, размаўляюць з кіраўнікамі нашых аддзелаў, таксама дзейнічае праз мясцовую прэсу. У многіх раённых газетах надрукавалі апошнім часам артыкулы, што датычаць нібыта нелегітымнасьці шостага зьезду СПБ. Некаторыя газеты перадрукоўваюць артыкул, які быў апублікаваны ў "Советской Белоруссии".

***7 чэрвеня*** старшыня ***"Саюзу палякаў на Беларусі" Анжаліка Борыс*** накіравала заяву беларускаму ваеннаму пракурору Вячаславу Любавіцкаму, у якой просіць прыцягнуць вінаватых у "распальваньні міжнацыянальнай варожасьці" да крымінальнай адказнасьці. А. Борыс спасылаецца на публікацыю "Гульня краплёнымі картамі" ў афіцыйным друкаваным органе Міністэрства абароны Беларусі "Во славу Родины", у якой "тэндэнцыйна і аднабакова прадстаўлена сітуацыя, што склалася вакол СПБ", а радкі надрукаванага там жа вершу "прынізілі і абразілі нацыянальную годнасьць" беларускіх палякаў. Анжаліка Борыс лічыць, што аўтары публікацыі "ўчынілі злачынства паводле артыкулу 130 Крымінальнага кодэксу РБ "Распальваньне расавай, нацыянальнай ці рэлігійнай варожасьці".

***15 чэрвеня*** стала вядома паводле польскіх афіцыйных асобаў, у сьпісе непажаданых у Польшчы асобаў – больш за 10 беларускіх чыноўнікаў, якія маюць дачыненьне да перасьледу ***"Саюзу палякаў на Беларусі"***. У сьпісе знаходзіцца, сярод іншых, міністр юстыцыі Беларусі Віктар Галаванаў.

***21 чэрвеня*** Гарадзенскі гарвыканкам ня даў дазволу ***"Саюзу палякаў на Беларусі"*** на правядзеньне Купальля 25 чэрвеня, сьвята, якое палякі называюць "Сьвятаянскай ноччу" і штогод праводзяць у цэнтры гораду на беразе Нёману. Забарону Саюз палякаў атрымаў упершыню. Гарадзенс-

кія ўлады спаслаліся на тое, што на беразе ракі адбываюцца земляныя работы, аднак у той жа час яны дазволілі правесьці Купальле іншай групе палякаў. Намесьнік старшыні гарвыканкаму Валянцін Лявонаў паведаміў намесьніку старшыні Саюзу палякаў Юзэфу Пажэцкаму, што выканкам даў дазвол на правядзеньне Купальля Казімеру Знайдзінскаму — паплечніку былога старшыні Саюзу палякаў Тадэвуша Кручкоўскага, якога па-ранейшаму прызнаюць улады. Праўда, гэтае сьвята адбудзецца на левым беразе Нёмана, а не на правым, дзе звычайна праводзілася Саюзам палякаў. Трэба яшчэ дадаць, што Кручкоўскага і Знайдзінскага некалькі дзён таму выключылі з сяброў Саюзу палякаў.

***21 чэрвеня*** кіраўнікі шэрагу міністэрстваў краіны адмовіліся прыняць удзел у круглым стале пад назваю “Стан мовы тытульнай нацыі ў сьвятле майскага рэферэндуму 1995 году”. Такое паведамленьне распаўсюдзіла ***“Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны”***. Адначасна становішча беларускай мовы ў краіне працягвае пагаршацца – заяўляе кіраўніцтва ТБМ. Кіраўнік ТБМ Алег Трусаў гаворыць, што мова карэннай нацыі амаль цалкам выціснутая з сістэмы справаводзтва, адукацыі і іншых галінаў дзяржаўнага ўладкаваньня. Улады па-ранейшаму ігнаруюць ініцыятыву адкрыцьця беларускай вышэйшай навучальнай установы. Школьнікі, якія навучаюцца па-беларуску, складаюць каля 21% ад агульнай колькасьці навучэнцаў. Амаль не засталося беларускіх дзіцячых садкоў. Да прыкладу, у Менску іх толькі тры сярод амаль чатырох сотняў, хоць попыт на беларускую адукацыю расьце.

***22 чэрвеня “Саюз палякаў на Беларусі”*** даслаў у Адміністрацыю прэзідэнта ліст да Аляксандра Лукашэнкі і каля трох тысячаў подпісаў пад ім. У лісьце — просьба да кіраўніка дзяржавы “спыніць зьнішчэньне Саюзу палякаў”.

***27 чэрвеня*** ў ***“Саюз палякаў на Беларусі”*** прыйшоў кароткі ліст з Беларускага тэлебачаньня. У ім напісана: “На ваш запыт паведамляем, што тэлефільм “Хто замовіў Саюз палякаў” 13 траўня ў эфіры Першага нацыянальнага тэлеканалу не выходзіў”. Адказ падпісаў намесьнік старшыні Дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Аляксандр Мартыненка. 13 траўня ўвечары па Беларускім тэлебачаньні паказалі 45-хвілінны фільм, накіраваны супраць новага кіраўніцтва “Саюзу палякаў на Беларусі” і некаторых польскіх дыпламатаў. Галоўная рада СПБ прыняла заяву, у якой гаварылася: “Запатрабаваць ад Беларускага тэлебачаньня абвяржэньне паклёпніцкіх выдумак фільму “Хто замовіў Саюз палякаў”. Прасіць пракуратуру Рэспублікі Беларусь прыцягнуць аўтараў і ўдзельнікаў фільму да крымінальнай адказнасьці”.

***13 ліпеня*** ваенная пракуратура адмовіла ***“Саюзу палякаў на Беларусі”*** ва ўзбуджэньні справы па факце публікацыі ў газеце “Во славу Роди-

ны". Публікацыя называлася "Гульня краплёнымі картамі". У Саюзе палякаў палічылі, што аўтар абражае і прыніжае нацыянальную годнасьць палякаў, імкнецца распаліць нацыянальную варожасьць. У адказе з пракуратуры сказана: склад злачынства ня знойдзены, крымінальную справу паводле публікацыі распачынаць ня будуць. Маўляў, карэспандэнт газеты Уладзімір Кажэўнікаў "атрымаў рэдакцыйнае заданьне напісаць аб сітуацыі, якая склалася пасьля правядзеньня 6-га зьезду Саюзу палякаў", ён нават "спрабаваў адстойваць правы этнічных палякаў, права на аб'яднаньне якіх было (нібыта) парушана нелегітымнымі выбарамі Саюзу палякаў Беларусі".

***16 ліпеня*** беларускія ўлады прынялі рашэньне выдаліць з тэрыторыі краіны кіраўніка консульскага аддзелу амбасады Польшчы ў Менску ***Анджэя Бучэка***. Гэтае рашэньне прынятае ў адказ на прапанову ўладаў Польшчы пакінуць тэрыторыю іх краіны дарадцы беларускай амбасады ў Варшаве Максіму Рыжанкову. Польскі бок лічыць, што галоўнай прычынай гэтай напружанасьці ў двухбаковых дыпламатычных адносінах стаў дэмакратычны выбар новага кіраўніцтва "Саюзу палякаў на Беларусі".

***20 ліпеня*** Міністэрства замежных справаў (МЗС) Польшчы распаўсюдзіла афіцыйную заяву ў сувязі з прызнаньнем беларускімі ўладамі персонай нон грата кіраўніка консульскага аддзелу польскай амбасады ў Менску ***Анджэя Бучэка***. МЗС Польшчы падкрэсьліла, што падобнае рашэньне беларускіх уладаў будзе мець шкодныя наступствы перадусім для грамадзянаў Беларусі, бо "ускладніць вырашэньне фармальных пытаньняў, зьвязаных з падарожжамі ў Польшчу". У заяве негатыўна ацэньваюцца захады, якія апошнім часам робяць беларускія ўлады супраць Польшчы і польскай грамады ў Беларусі, замест таго, каб разам знайсьці выхад з сітуацыі, якая склалася ў двухбаковых дачыненьнях у выніку рэпрэсіяў супраць "Саюзу палякаў на Беларусі".

***21 ліпеня*** а 19-й гадзіне да старшыні ***"Саюзу палякаў на Беларусі" Анжалікі Борыс*** прыйшоў супрацоўнік пракуратуры Ленінскага раёна горада Гародні Янцурэвіч, які ўручыў ёй афіцыйнае папярэджаньне за подпісам пракурора Ленінскага раёна горада Гародні Урублеўскага. Папярэджанене Анжалікі Борыс вынесена за тое, што яна, як указана ў дакуменце, "перашкаджае сапраўднаму сходу Саюзу палякаў".

***21 ліпеня*** былы кіраўнік консульскага аддзелу польскай амбасады ў Менску ***Анджэй Бучэк*** пакінуў Беларусь. Ён быў выдалены беларускімі ўладамі як персона нон грата. Ад'яжджаючы, спадар Бучэк даслаў факсам ліст на імя кіраўніка "Саюзу палякаў на Беларусі" Анжалікі Борыс. У лісьце ён дзякуе ўсяму польскаму асяродзьдзю Беларусі за супрацоўніцтва на ніве адраджэньня польскай мовы, культуры і традыцыяў. Польскі дыпламат піша, што "ў гэты цяжкі перыяд для польскага асяродзьдзя" ў

Беларусі ён жадае ўсім прыхільнікам польскай справы “адвагі, трываласьці і самаахвярнасьці ў рэалізацыі статутных мэтаў СПБ”.

***22 ліпеня*** Міністэрства замежных справаў Беларусі прыняло рашэньне аб закрыцьці менскага прадстаўніцтва ***Еўрапейскага фонду “Дыялог”***, зарэгістраванага ў Варшаве. Падставай сталі зьвесткі пра тое, што пад прыкрыцьцём навуковых інтарэсаў прадстаўнікі фонду нібыта займаліся шпіёнскай дзейнасьцю. Кіраўніцтва фонду “Дыялог” называе падобныя абвінавачаньні абсурднымі, а закрыцьцё фонду ставіць у адзін шэраг з гісторыяй вакол “Саюзу палякаў на Беларусі” і высылкай польскіх дыпламатаў. Кіраўнік Еўрапейскага фонду “Дыялог” Славамір Тэцлаў лічыць, што беларускія ўлады паставілі за мэту зьнішчыць усе польскія арганізацыі ў Беларусі.

У ноч ***з 23 на 24 ліпеня*** ўваходныя дзьверы і шыльда ў менскай штабкватэры ***“Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны”*** былі залітыя чорнай фарбаю і заклееныя нацыянал-бальшавіцкімі лістоўкамі. Побач з уваходам у галоўны офіс ТБМ таксама была намаляваная абрэвіятура нацыянал-бальшавікоў – НБП – і серп з молатам. Паводле актывіста Таварыства беларускай мовы, пісьменьніка Кастуся Тарасава, гэты акт вандалізму, хутчэй за ўсё, быў учынены людзьмі, якія ненавідзяць усё нацыянальнае, беларускае. Прадстаўнікі ТБМ падалі заяву ва ўпраўленьне міліцыі Партызанскага раёну Менску з патрабаваньнем знайсьці і прыцягнуць вінаватых у акце вандалізму да адказнасьці.

***26 ліпеня*** ўвечары ў Шчучыне былі затрыманыя трое лідэраў ***“Саюзу палякаў на Беларусі”***– Юзэф Пажэцкі, Мечыслаў Яшкевіч і Андрэй Пачобут па абвінавачаньні ў правядзеньні ў Шчучыне 3 ліпеня несанкцыянаванага пікету. На гэты раз Юзэф Пажэцкі, Мечыслаў Яшкевіч і Андрэй Пачобут прыехалі ў Шчучын, каб прысутнічаць у якасьці назіральнікаў на чарговым арганізацыйным фарсе былога кіраўніцтва Саюзу палякаў – стары склад Галоўнай рады зьбіраўся ў гэты дзень з мэтай прызначэньня даты паўторнага зьезду. Стала вядома, што суд над затрыманымі ў Шчучыне, па ўсёй верагоднасьці, адбудзецца ў Лідзе 27 ліпеня. Рэч у тым, што жонка кіраўніка мясцовай філіі СПБ Віктара Богдана, які падтрымлівае Кручкоўскага, Тамара Богдан, працуе судзьдзёй у мясцовым судзе.

***26 ліпеня*** ўвечары міліцыянты спрабавалі ўварвацца ў кватэру старшыні ***“Саюзу палякаў на Беларусі” Анжалікі Борыс***. Каля 11-й гадзіны вечара на кватэру да спадарыні Борыс зьявіўся нарад міліцыі і запатрабаваў адчыніць дзьверы, спасылаючыся на тое, што неабходна ўручыць ёй позву. Старшыня Саюзу адмовілася ўпусьціць міліцыянтаў, паколькі для ўручэньня позваў ужо быў занадта позьні час. Апроч таго, у гэты дзень яна ўжо атрымала дзьве позвы: у пракуратуру і ў міліцыю. Калі міліцыянты прыгразілі, што ўварвуцца ў кватэру сілай, Анжаліка Борыс папярэдзіла, што тут жа

затэлефануе польскім журналістам. Нарад міліцыі вымушаны быў сысьці. За два дні Анжаліка Борыс атрымала тры позвы ў абласную пракуратуру і міліцыю. З-за ціску з боку ўладаў спадарыні Борыс стала кепска ў сядзібе Саюзу. Давялося выклікаць ёй хуткую дапамогу. Кіраўнік Саюзу адмовілася ехаць у бальніцу, паколькі лічыць гэта небясьпечным. Яна таксама паведаміла, што не адчувае сябе ў стане ісьці на размовы па позвах.

***27 ліпеня*** ў Лідзе адбыліся суды над затрыманымі сябрамі ***"Саюзу палякаў на Беларусі"*** за нібыта правядзеньне 3 ліпеня несанкцыянаванага пікету. Галоўны рэдактар "Магазына польскего" Андрэй Пачобут асуджаны да 15 сутак адміністрацыйнага арышту, Мечыслаў Яськевіч і Юзэф Пажэцкі атрымалі па 10 сутак арышту. У гэты дзень сябры старога складу Галоўнай рады Саюзу палякаў, якія разам з былым старшынём Тадэвушам Кручкоўскім і Міністэрствам юстыцыі не прызналі вынікаў апошняга зьезду арганізацыі, правялі сваё паседжаньне ў Шчучынскім Доме палякаў. Па словах аднаго з удзельнікаў гэтай нарады Канстанціна Тарасевіча, на паседжаньні прысутнічала 14 чалавек. Усяго ў складзе папярэдняй Галоўнай рады Саюзу палякаў Беларусі было 35 чалавек. Напярэдадні Кручкоўскі разам са сваімі прыхільнікамі выключылі з арганізацыі 8 чалавек разам з Анжалікай Борыс, якая была абраная новым старшынёй СПБ. У Шчучын прыехала 13 чалавек, якія прывезьлі яшчэ 5 паперак з так званымі дэлегаванымі галасамі. Тыя, хто сабраўся ў Шчучыне цьвердзяць зараз пра наяўнасьць кворуму і легітымнасьць паседжаньня. Стала вядома, што правядзеньне новага зьезду запланавана на 27 жніўня, вызначана, што ён адбудзецца ў Ваўкавыску. Згаданае паседжаньне адбывалася пры ўзмоцненай ахове міліцыі і іншых сьпецыяльных атрадаў, пад'езд да Дому палякаў у Шчучыне фактычна быў заблакаваны.

***27 ліпеня*** ў горадзе Крычаве неафашысты з ***"Русского национального Единства"*** ўчынілі правакацыю супраць журналістаў незалежнай крычаўскай газеты "Вольны горад". Уся вуліца Крупскай, дзе месьціцца рэдакцыя, была ўсыпаная ўлёткамі правакацыйнага зьместу: "Убирайтесь к своим американским хозяевам, продажные БНФовцы!" – пагражалі рускія неанацысты.

***27 ліпеня*** каля 22.00 адбыўся гвалтоўны захоп Галоўнай сядзібы ***Саюзу палякаў*** у Гародні. Якія падразьдзяленьні сілавых структураў ажыцьцяўлялі гэтую "аперацыю", сказаць цяжка, бо нападнікі былі апранутыя ў спартовую форму. Кіраўніцтва арганізацыі брутальным спосабам папросту было выкінута з сядзібы. Людзей выцягвалі з будынку і валаклі па зямлі, аднаму са старэйшых сяброў арганізацыі Лявону Падляху падралі кашулю. Такім чынам улады ўвялі ў галоўную сядзібу Саюзу палякаў былое кіраўніцтва на чале з Тадэвушам Кручкоўскім. Каля 20 чалавек былі затрыманыя, на міліцэйскіх машынах іх разьвезьлі па розных пастарунках гораду. Праз тры гадзіны, каля гадзіны ночы, усіх затрыманых адпусьцілі.

***28 ліпеня*** а 9-й гадзіне раніцы каля будынку ***“Саюзу палякаў на Беларусі”*** сабралася каля трох дзесяткаў актывістаў арганізацыі, якія выказывалі абурэньне па прычыне гвалтоўных дзеяньняў па захопу сядзібы. Уваход у будынак пільна ахоўвалі высокія міліцэйскія чыны, непадалёк таксама стаялі людзі ў цывільным. Старшыню арганізацыі ***Анжаліку Борыс***, якая хацела забраць свае асабістыя рэчы, у памяшканьне не пусьцілі. “Правільныя” кіраўнікі баяцца выйсьці з будынку і паказацца на людзі. А адзін з актыўных удзельнікаў тэлевізійных “агітак”, выкладчык аграрнага ўніверсітэту Вальдэмар Краўцэвіч, які прыйшоў да сядзібы, пад воклічы “здрайца” быў змушаны ратавацца ўцёкамі. Людзі, сярод якіх пераважаюць жанчыны сталага веку, былі настроеныя не агрэсіўна. Прысутныя сьпявалі рэлігійныя песьні і знакаміты гімн “Рота” на вершы Марыі Канапніцкай, пасьля ўкленчылі і сталі маліцца.

***28 ліпеня*** кіраўнік МЗС Польшчы Адам Ротфельд заявіў, што Варшава адклікае свайго амбасадара з Беларусі для кансультацыяў. Пасьля таго, як беларускі АМАП захапіў сядзібу Саюзу палякаў у Гародні, Ротфэльд заявіў, што “беларуска-польскія дачыненьні аказаліся ў вельмі глыбокім крызісе”. Польскі бок яшчэ раз падкрэсьліў, што падтрымлівае законна абраныя ўлады СПБ на чале з Анжалікай Борыс.

***28 ліпеня*** Беларусь не дала паветраны калідор самалёту з польскай урадавай дэлегацыяй. Гэтая дэлегацыя накіроўвалася ў Расію, каб узяць удзел у жалобных урачыстасьцях з нагоды 5 гадавіны адкрыцьця польскіх Вайсковых могілак у Катыні. Самалёт паляцеў у Смаленск праз тэрыторыю Украіны. Адмова афіцыйнага Менску прадставіць польскаму самалёту паветраны калідор над тэрыторыяй Беларусі адбылася ў разгар сур’ёзнага міждзяржаўнага беларуска-польскага крызісу і рэпрэсіяў супраць дэмакратычна абранага кіраўніцтва “Саюзу палякаў на Беларусі”.

***28 ліпеня*** зранку старшыню ***“Саюзу палякаў на Беларусі” Анжаліку Борыс*** дапыталі ў Ленінскім РАУС Гародні. Адразу ж пасля допыту ў РАУС яна была выклікана ў абласную пракуратуру, дзе яе пратрымалі каля трох гадзінаў. У Ленінскім РАУС Анжаліку Борыс дапытвалі як сьведку па двух скаргах, складзеных на яе. Першая, ад старшыні шчучынскай арганізацыі СПБ Віктара Богдана, у якой ён ставіць у віну спадарыні Борыс спробу захопу мясцовага будынка Дому палякаў. Другая, ад сябры Гарадзенскага СПБ Вальдэмара Краўцэвіча, на тое, быццам сп. Борыс крала грошы і маёмасьць у Саюзе. Пакуль невядома, ці будзе ўзбуджана на яе крымінальная справа. Яна адхіляе ўсе абвінавачванні і лічыць, што яны зьяўляюцца правакацыяй і спробай яе запалохаць. У абласной пракуратуры ў Анжалікі Борыс цікавіліся, якім чынам у СПБ трапіў нумар “Glosu znad Niemna”, выдадзены пры падтрымцы “Gazety Wyborczej”, і хто займаўся яго выданьнем.

***28 ліпеня*** горад Уроцлаў разарваў парнёрскую дамову аб супрацоўніцтве з Гародняй у знак пратэсту супраць пераследу беларускімі ўладамі ***"Саюзу палякаў на Беларусі".*** Дзеяньні беларускіх уладаў па гвалтоўнаму захопу гарадзенскай сядзібы Саюза палякаў ва Уроцлаве ацанілі як "рэпрэсіі".

***1 жніўня*** першы старшыня ***"Саюзу палякаў на Беларусі" Тадэвуш Гавін*** зьвярнуўся з заклікам да сяброў Саюзу і ўсіх сімпатызуючых арганізацыі. Зварот распаўсюджваўся сярод людзей, якія пратэстуюць пад сядзібай Саюзу ў Гародні, напісаны польскай мовай на трох старонках. У ім сказана: "Устанем усе разам на абарону легальна абраных уладаў нашага Саюзу. Зробім усё, што толькі можна, каб прызначаны пад міліцэйскімі дубінкамі псеўда-з'езд не адбыўся. Салідарызуемся з сапраўднай полькай Анжалікай Борыс, якая зьяўляецца старшынёй нашага Саюза. Я сьведчу, што яна зьяўляецца паважанай, працавітай, дасьведчанай асобай і шмат зрабіла для адраджэньня польскасці ў Беларусі".

***1 жніўня*** журналіст "Glosu z-nad Niemna" ***Ігар Банцэр*** затрыманы зранку каля чыгуначнага вакзалу. Ён нёс зварот першага старшыні Саюза палякаў Тадэвуша Гавіна да палякаў Беларусі. Каля двух с паловай гадзінаў яго пратрымалі ў Ленінскім РАУС Гродна. На Банцэра склалі пратакол канфіскацыі "зваротаў". У яго перапісалі нумар мабільнага тэлефона.

***1 жніўня*** каля будынку ***"Саюзу палякаў на Беларусі"*** ў Гародні сабралася каля 120 чалавек. Прадстаўнікі міліцыі палохалі прысутных арыштамі і штрафамі за нібы несанкцыянаваны пікет, але ніхто не разыходзіўся. Людзі сьпявалі песьні. Усе чакалі прыезду віцэ-маршалка Сойму Польшчы Дональда Туска. А палове першай дня Дональд Туск, які зьяўляецца таксама лідэрам партыі "Грамадзянская платформа", прыехаў да сядзібы. Разам з ім прыехала некалькі дэпутатаў Еўрапарламенту. Дональд Туск зьвярнуўся да прысутных з словамі падтрымкі. Сярод іншага ён сказаў: "Мы выразна ўсьведамляем, што гэта ня ёсьць канфлікт беларусаў і палякаў. У вас забралі сядзібу, але ў кожнага яна застаецца ў сэрцы. Трымайцеся, ніхто ў Польшчы вас ні на хвіліну не забудзе". Пад час гэтай імправізаванай сустрэчы інцыдэнтаў не адбылося. Але пасьля таго, як людзі разышліся, пачаліся затрыманьні.

***1 жніўня*** каля 14 гадзінаў у Гародні міліцыянты затрымалі ***Анджэя Пісальніка***, прэс-сакратара абранага ўвесну кіраўніцтва Саюзу палякаў. Журналіст знаходзіўся ля будынку Саюзу палякаў, каля якога з сябрамі СПБ сустрэўся віцэ-маршалак польскага Сойму Дональд Туск. Пасьля заканчэньня сустрэчы міліцыянты затрымалі А.Пісальніка. Затрыманага спачатку даставілі ў Шчучын, а пасьля ў Ліду (у Лідзе знаходзіцца міжраёны суд), каб пакараць за ўдзел у сьвяце польскай песьні, якое адбылося 3 лі-

пеня ў райцэнтры. У той дзень у Шчучын прыехаў начальнік упраўленьня аховы грамадзкага парадку з абласной міліцыі Юры Чабанаў, да Дому польскага прыбылі міліцыянты, раённы пракурор, прадстаўнікі мясцовай улады. Адбывалася аператыўная відэаздымка. Дом польскі аказаўся зачынены, Генеральны консул РП Анджэй Крэнтоўскі прадставіўся вартаўніку і папрасіў адамкнуць памяшканьне, але той адмовіўся. Тады спадар Крэнтоўскі і старшыня СПБ Анжаліка Борыс выступілі перад мясцовымі сябрамі Саюзу палякаў, затым на ганку будынку адбыўся канцэрт.

***2 жніўня*** ў Гародні міліцыя затрымала ***Веслава Кеўляка***, аднаго з намесьнікаў старшыні Саюзу палякаў, і даставіла ў Ленінскі РУУС. Там капітан Вечар пачаў браць у Кеўляка тлумачэньні адносна падзеяў, якія адбываліся 1 жніўня побач з сядзібай Саюзу.

***2 жніўня*** ў Гародні супрацоўнікамі Ленінскага РУУС быў затрыманы адзін з заснавальнікаў “Саюзу палякаў на Беларусі” ***Тадэвуш Гавін.*** Яго абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным мітынгу, якім яны палічылі акцыю каля Саюзу палякаў у Гародні 1 жніўня. Суд Ленінскага раёну вынес пакараньне Тадэвушу Гавіну – 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Заснавальнік Саюзу палякаў адвезены адбываць пакараньне ў РУУС Кастрычніцкага раёну Гародні.

***3 жніўня Анджэя Пісальніка***, прэс-сакратара новага кіраўніцтва Саюзу палякаў, які абвесьціў галадоўку ў міліцэйскім ізалятары ў Шчучыне ў знак пратэсту супраць незаконнага ўтрыманьня яго за кратамі, наведаў гарадзенскі адвакат Аляксандр Бірылаў. Анджэя Пісальніка ўжо даставілі ў Лідзкі суд, ён падаў хадайніцтва аб адвакацкай дапамозе, судзьдзя хадайніцтва задаволіў і, наколькі вядома, быў гатовы адпусьціць журналіста, але міліцыянты мелі загад завезьці яго назад у шчучынскі ізалятар. Каб падпісаць дамову з кліентам, адвакат сам мусіў прыехаць у Шчучын. Вось што сказаў Аляксандр Бірылаў пасьля сустрэчы з Анджэем Пісальнікам: “Ён лічыць, што незаконна знаходзіцца ў вязьніцы. Я таксама лічу, што гэта незаконна. Ён патрабаваў сустрэчы з пракурорам, які назірае за законнасьцю ў месцах агульнага ўтрыманьня, падаў скаргу яму, і цяпер шчучынская пракуратура будзе разьбірацца з гэтым пытаньнем”.

***3 жніўня*** на 15 сутак арышту асудзілі намесьніка старшыні Саюзу палякаў ***Веслава Кеўляка*** за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі каля будынку СПБ 1 жніўня. Міліцыянты не пусьцілі ў будынак суда ні журналістаў, у тым ліку польскіх, ні старшыню СПБ ***Анжаліку Борыс***.

***3 жніўня*** Брытанскае старшынёўства Еўразьвязу выступіла з дэкларацыяй адносна падзеяў у Беларусі, у якой асуджаюцца апошнія дзеяньні ўладаў супраць ***“Саюзу палякаў на Беларусі”***, рост рэпрэсіяў і ціску на

палітычную апазіцыю, грамадзянскую супольнасьць і незалежныя СМІ. Заява старшынёўства Еўрасаюзу па Беларусі падтрыманая 25 краінамі-сябрамі арганізацыі, а таксама краінамі-кандыдатамі ды патэнцыйнымі кандыдатамі ў яе склад: Балгарыяй, Румыніяй, Турэччынай, Харватыяй, Албаніяй, Сербіяй, Украінай, Малдовай і іншымі дзяржавамі.

***3 жніўня*** каля амбасады Польшчы ў Менску адбылася акцыя БРСМ пад лозунгам "Ня ўмешвайцеся ва ўнутраныя справы Беларусі". Разам з транспарантамі і сьцягамі актывісты БРСМ прынесьлі пілу і бервяно з надпісам "Дружба", ад якога насупраць уваходу ў амбасаду Польшчы яны адпілавалі кавалак. Гаворыць арганізатар акцыі Дзьмітрый Жалко: "Другі дзень мы пілуем гэтай польскай пілой наш сумесны дом, нашу сумесную будучыню. На жаль, яшчэ знаходзяцца такія людзі, такія хлопцы, якія ня могуць жыць у міры, дружбе і згодзе".Спадар Жалко, як і большасьць іншых удзельнікаў акцыі, якіх удалося апытаць, ня змог патлумачыць, якія канкрэтныя прэтэнзіі ў іх да польскай дзяржавы. Выявілася, што ніхто з дзясятка апытаных удзельнікаў акцыі ні разу ня быў у Польшчы і нават ня ведае прозьвішча дзейнага прэзідэнта польскай дзяржавы. Адначасова дзяржаўныя беларускія СМІ працягваюць распаўсюджваць негатыўныя ацэнкі польскай палітыкі адносна Беларусі: першы нацыянальны тэлеканал заявіў, што Саюз палякаў з дапамогай Польшчы зьбіраўся арганізаваць незалежнае назіраньне на выбарах 2006 году; газета "Рэспубліка" напісала, што Польшча марыць пра вяртаньне "крэсаў усходніх" і мае "доўгатэрміновыя планы рэвізіі межаў". Дзьве камісіі Палаты прадстаўнікоў ухвалілі рэзалюцыю з пратэстам супраць умяшаньня Польшчы ва ўнутраныя беларускія справы. Тым часам МЗС Чэхіі выступіла з заявай, у якой выказваецца абурэньне дзеяньнямі беларускіх уладаў, скіраванымі супраць Саюзу палякаў і яго новага дэмакратычна абранага кіраўніцтва. "Чэская Рэспубліка будзе і надалей у адпаведнасьці з палітыкай Еўрасаюзу прапаноўваць падтрымку беларускім грамадзянам з дэмакратычнымі поглядамі дзеля ўмацаваньня грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі", — заявіла зьнеўнепалітычнае ведамства Чэхіі.

***3 жніўня*** ў Варшаве ў знак пратэсту супраць перасьледу ***"Саюзу палякаў на Беларусі"*** пачалося кругласутачнае пікетаваньне беларускай амбасады ў Польшчы – каля будынку амбасады зьявіўся намёт. Амбасаду пікетуюць сябры арганізацыі "Усяпольская моладзь". Пікетоўцы кажуць, што ніхто з амабасады да іх не выходзіў.

***3 жніўня*** Дзярждэпартамент ЗША выступіў з заяваю наконт сітуацыі вакол ***"Саюзу палякаў Беларусі"***. "Злучаныя Штаты асуджаюць акцыі ўраду Беларусі супраць Саюзу палякаў Беларусі. Арышты сяброў Саюзу, выкарыстаньне АМАПу для захопу памяшканьня арганізацыі – гэтыя акцыі

зьяўляюцца часткаю няспыннай сістэмы цкаваньня тых, хто намагаецца мірна выказваць свае погляды”.

***4 жніўня*** Міністэрства замежных справаў Беларусі выступіла з адмысловай заявай, у якой даецца адказ на ацэнкі Еўрасаюзам і Злучанымі Штатамі Амерыкі канфлікту вакол “Саюзу палякаў на Беларусі”. Заявы Еўрасаюзу і ЗША на гэты конт называюцца абсалютна надуманымі, Яны, на думку беларускага МЗС, адлюстроўваюць палітыку падвойных стандартаў, якую праводзяць Еўрасаюз і ЗША. Спробы маніпуляваць “Саюзам палякаў на Беларусі” з мэтай яго штучнага супрацьпастаўленьня існай уладзе ёсьць грубае ўмяшальніцтва ў справы сувэрэннай дзяржавы – падкрэсьліваецца ў заяве.

***4 жніўня*** ў судзе Лідзкага раёну судзьдзём Валянцінам Шэўчыкам быў вынесены прысуд па адміністрацыйнай справе прэс-сакратара “Саюзу палякаў на Беларусі” Анджэя Пісальніка – 10 сутак адміністрацыйнага арышту. Анджэй Пісальнік абвінавачаны ў парушэньні двух артыкулаў Адміністрацыйнага кодэксу: арт. 167.1 – удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве (акцыя 3 ліпеня ў Шчучыне) і арт. 166 – непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі. Перад пачаткам працэсу судзьдзя забараніў праводзіць фота- і відэаздымкі. За спробы зрабіць некалькі здымкаў з залы суда быў выдалены журналіст польскай “Газеты Выборчай” сп. Кавалеўскі (але потым яго ўсё ж пусьцілі на суд). Супрацоўнікі міліцыі перад уваходам у залу, дзе адбываўся працэс, перапісвалі ўсіх тых, хто прыйшоў на судовае паседжаньне, асаблівая ўвага пры гэтым надавалася журналістам замежных выданьняў. Адвакат Анджэя Пісальніка Аляксандр Бірылаў прадставіў судзьдзі дакументы, якія пацьвярджаюць, што ў Анджэя Пісальніка застаецца хворая дачка, якую няма каму даглядаць (жонка Пісальніка знаходзіцца за межамі Беларусі). Нягледзячы на прыведзеныя довады і хворае дзіця, судзьдзя Валянцін Шэўчык вынес рашэньне аб пакараньні журналіста 10 суткамі адміністрацыйнага арышту. Пакараньне Анджэй Пісальнік павінен адбываць у Лідзе.

***4 жніўня*** каля амбасады Польшчы ў Менску адбыліся два пікеты. Актывісты праўрадавага Беларускага рэспубліканскага саюзу моладзі патрабавалі ад афіцыйнай Варшавы спыніць міждзяржаўны крызіс адносінаў, які, на іх думку, ініцыяваны польскім бокам. Пасьля таго, як пікет актывістаў БРСМ скончыўся, на пляцоўцы каля польскай амбасады зьявіліся 10 актывістаў “Маладога фронту”. Яны трымалі ў руках транспаранты з надпісам “Польшча + Беларусь = Салідарнасьць”. Маладафронтаўцы перадалі ў амбасаду зварот, у якім выказалі сваю падтрымку законна абранаму кіраўніцтву Саюзу палякаў Беларусі на чале з Анжалікай Борыс, уладам Польшчы і яе народу, а таксама арыштаваным актывістам СПБ Тадэвушу Гавіну і Анджэю Пісальніку.

***4 жніўня*** старшыня Саюзу палякаў ***Анжаліка Борыс*** атрымала афіцыйнае папярэджаньне ад пракурора Ленінскага раёну Гародні. Яе абвінавачваюць у тым, што яна неаднаразова ў перыяд з 27 ліпеня па 3 жніўня распаўсюджвала непраўдзівыя зьвесткі аб парушэньні правоў грамадзянаў польскай нацыянальнасьці ў РБ, выступала з заклікамі аб невыкананьні загадаў супрацоўнікаў міліцыі, заклікала грамадзянаў да ўдзелу ў несанкцыянаваных мерапрыемствах. Як гаворыцца ў пракурорскай пастанове, падобныя дзеяньні могуць прывесьці да ўзьнікненьня канфліктаў на нацыянальнай глебе. Анжаліка Борыс адмовілася даваць каментар пракурору і заявіла, што папярэджаньне абскардзіць у вышэйстаячай інстанцыі.

***4 жніўня*** віцэ-сьпікер польскага Сойму Дональд Туск, які наведаў на днях Гародню, зьвярнуўся да прэзідэнта Польшчы Аляксандра Квасьнеўскага з заклікам даць польскае грамадзянства ўсім перасьледаваным актывістам “Саюзу палякаў на Беларусі” (СПБ), калі яны аб гэтым папросяць.

***5 жніўня*** — чацьвёрты дзень, як працягваецца пікет актывістаў праўрадавай моладзевай арганізацыі БРСМ каля польскай амбасады ў Менску. Бэрэсэмаўцы гэтымі днямі “пілуюць бервяно сяброўства” паміж Беларусьсю і Польшчай. Да польскай амбасады прыйшлі і прадстаўнікі “Маладога Фронту”, але каб выказаць падтрымку “Саюзу палякаў на Беларусі”. Актывістаў праўрадавай арганізацыі ніхто не чапаў, а вось пяцёра сяброў “Маладога Фронту” – ***Зьміцер Дашкевіч, Артур Фінькевіч, Настася Палажанка, Зьміцер Рабчык*** і ***Антаніна Вежнавец*** былі затрыманыя амапаўцамі. Малададаронтаўцы дастаўленыя ў РУУС Партызанскага раёну сталіцы.

***6 жніўня*** ў Менску праходзіла канферэнцыя, прысьвечаная праблемам нацыянальных меншасьцяў і рэлігійных канфесіяў у Беларусі. Быў прыняты зварот да прэзідэнта краіны з патрабаваньнем спыніць перасьлед лідэраў Саюзу палякаў, які падпісалі прадстаўнікі 6 нацыянальных дыяспараў. Адзін з лідэраў габрэйскай нацыянальнай меншасьці ў Беларусі Якаў Басін выказаў занепакоенасьць выкарыстаньнем уладай міліцэйскіх падразьдзяленьняў пры завалодваньні офісам Саюзу палякаў у Горадні, арыштамі лідэраў арганізацы. Паводле спадара Басіна, беларуская дзяржава мала робіць для зьберажэньня культураў і самабытнасьці нацыянальных меншасьцяў. Кіраўнік Беларускага грамадзкага аб’яднаньня ўкраінцаў “Ватра” Віктар Гутоўскі зазначыў, што разьвіцьцё падзеяў вакол Саюзу палякаў турбуе і ўкраінцаў, асабліва бянтэжаць арышты лідэраў СПБ. Прадстаўнік цыганскай дыяспары Мікола Калінін адносіны ўлады да СПБ назваў тыповым прыкладам парушэньня правоў чалавека і недэмакратычнасьці ўлады ў Беларусі, якая хоча кантраляваць у краіне ўсё. Мікола Калінін на шляху да месца правядзеньня канферэнцыі быў затрыманы міліцыянтамі ў цывільным. Міліцыянты паведамілі, што ў раёне

учыненае злачынства, таму затрымліваюцца ўсе падазроныя для высьвятленьня. Спадар Калінін быў дастаўлены ў Савецкі РУУС, дзе патлумачыў у пісьмовым выглядзе сваё знаходжаньне ў 11.40 каля станцыі метро Якуба Коласа. Таксама супрацоўнікі міліцыі зьнялі ягоныя адбіткі пальцаў і зьнялі на відэа. Ніякіх пратаколаў не складалі і абвінавачваньняў не прад'яўлялі, адпусьцілі праз тры гадзіны. Мікалай Калінін лічыць гэтыя дзеяньні акцыяй запалохваньня.

***6 жніўня*** праўрадавы "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі" працягваў праводзіць пікеты ля амбасады Польшчы ў Беларусі. Таксама з 4 жніўня БРСМ ажыцьцяўляе пікетаваньне консульства Рэспублікі Польшча ў Гародні. Гэтымі дзеяньнямі БРСМ парушае беларускае заканадаўства. Паводле закону Рэспублікі Беларусь "Аб масавых мерапрыемствах", забароненае правядзеньне масавых мерапрыемстваў, у тым ліку пікетаў, на адлегласьці меней як 50 метраў ад дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх установаў. Сітуацыю каментуе праваабаронца Уладзімір Лабковіч: "Так, пікеты БРСМ парушаюць закон аб масавых мерапрыемствах з пункту гледжаньня забароны правядзеньня пікетаў ля дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаваў. Акрамя таго, ёсьць сур'ёзныя падставы да сумневаў, што БРСМ падаў заяўку на правядзеньне гэтых акцыяў у вызначаны законам 15-дзённы тэрмін. Калі б такое парушэньне ўчыніла любая іншая арганізацыя — яна была б ліквідаваная, а яе кіраўніцтва было б асуджанае на 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Аднак, напэўна, БРСМаўцы маюць дазвол ад уладаў на парушэньне закону". Уладзімір Лабковіч паведаміў, што беларускія праваабаронцы рыхтуюць звароты ў міліцыю і пракуратуру з патрабаваньнем спыніць парушэньні закону з боку БРСМ. Таксама праваабаронцы пратэстуюць супраць дзеяньняў міліцыі 5 жніўня, калі былі арыштаваныя сябры "Маладога Фронту" ***Зьміцер Дашкевіч*** і ***Артур Фінькевіч***. "Калі б беларускія міліцыянты сапраўды ахоўвалі парадак, яна б мусілі не затрымліваць Дашкевіча і Фінькевіча, а спыніць незаконнае мерапрыемства ля польскай амбасады", — адзначыў Уладзімір Лабковіч.

***8 жніўня*** дэлегацыю Еўрапарламенту ў складзе намесьніка старшыні Еўрапарламенту Яцэка Сарыюш-Вольскага, кіраўніка дэпутацкай групы па сувязях з Беларусьсю Богдана Кліха і дэпутатаў Багуслава Соніка і Барбару Кудрыцкую не пусьцілі ў Беларусь. Гэта адбылося на памежным пераходзе Кузьніца Беластоцкая – Брузгі. Разам з імі ў Гародню ехаў кіраўнік гарадзкіх уладаў Беластоку Рышард Тур. Планавалася, што госьці з Еўрапарламенту ў Генеральным консульстве сустрэнуцца з кіраўніком Саюзу палякаў Анжалікай Борыс.

***9 жніўня*** Еўракамісія асудзіла адмову беларускіх уладаў дазволіць уезд дэлегацыі Еўрапарламенту ў Беларусь. "Улады Беларусі чарговы раз да-

казалі, што не паважаюць асноўныя правы сваіх грамадзянаў і парушаюць прынятыя міжнародныя правілы", – гаворыцца ў заяве Еўракамісіі.

***10 жніўня*** ў Ленінскі РАУС Гародні была выкліканая старшыня Саюзу палякаў ***Анжаліка Борыс*** па чарговай скарзе Тадэвуша Кручкоўскага, які заявіў у міліцыю, што ў сядзібе Саюзу палякаў зьніклі штандары і пячатка. Пасьля размовы ў міліцыі Анжаліка Борыс сказала журналістам: "Я мусіла пісаць тлумачэньне. Напісала, што нас выцягнуў з будынку Дому польскага АМАП, і я ўсе свае рэчы там пакінула. Былі сьведкі гэтага. Я напісала, што ў Доме польскім дасюль застаўся яшчэ кампутар журналіста "Газеты Выборчай" і іншыя рэчы – нам гэтага ніхто не вярнуў. Напісала, што калі 28 ліпеня прыйшлі забраць свае рэчы, то нас міліцыя не пусьціла ў Дом польскі".

***12 жніўня Тадэвуш Гавін***, першы старшыня "Саюзу палякаў на Беларусі", які адбывае пакараньне ў Гарадзенскім сьпецпрыёмніку, асуджаны яшчэ на 15 сутак арышту. Судзьдзя Зінаіда Барцэвіч прызнала яго вінаватым ва ўчыненьні ў камеры бойкі з сукамернікам Малішэўскім. Як апавядаў Тадэвуш Гавін у судзе, раніцай аднаго з сукамернікаў адправілі на працу, і ён застаўся з Малішэўскім, які быў асуджаны за дробнае хуліганства. Гавін хацеў адпачыць, але сукамернік пачаў да яго агрэсіўна чапляцца, даводзіў, што Гавін, маўляў, нешта супраць яго мае. Па словах Гавіна, ён адразу адчуў небясьпеку правакацыі і хацеў пастукаць у дзьверы, але Малішэўскі схапіў яго за шыю і пачаў душыць. Малішэўскі ў судзе паказаў, што пасправачаўся з Гавіным на палітычнай глебе: нібыта той дрэнна казаў пра ўладу і пра Лукашэнку. У міліцэйскім пратаколе запісана, што дзяжурны пачуў, як з камеры даносілася лаянка абодвух пакараных. Ён адчыніў дзьверы і ўбачыў, што яны разьвязалі бойку і гэтым самым парушылі грамадзкі парадак.

***12 жніўня*** грамадзкія арганізацыі Літвы, якія прадстаўляюць нацыянальныя меншасьці, перадалі ў амбасаду Беларусі зварот да ўладаў Беларусі з заклікам спыніць дзеяньні, накіраваныя супраць "Саюзу палякаў на Беларусі" і яго сяброў. У звароце адзначаецца, што сваімі дзеяньнямі беларускія ўлады парушаюць ня толькі правы нацыянальных меншасьцяў, але і саміх беларусаў. Зварот ініцыявала грамадзкая арганізацыя "Інфорум" ("Інфармацыйная палата народаў Літвы"), у складзе якой цэнтры-прадстаўніцтвы усіх асноўных этнічных супольнасьцяў Літвы, у тым ліку беларускі, польскі, габрэйскі, расейскі, украінскі. Раней у амбасаду Рэспублікі Беларусь у Літве быў перададзены зварот да ўладаў Беларусі "Адносна абароны свабоды друку і польскай нацыянальнай меншасьці у Беларусі" ад польскіх журналістаў Літвы пасьля акцыі салідарнасьці з журналістамі польскамоўных выданьняў у Беларусі, якія церпяць ад перасьледу беларускіх уладаў. Зварот прыняў супрацоўнік амбасады, які прадставіўся дзяжурным, ніякага адказу польскія журналісты не атрымалі.

***16 жніўня*** ў Менску невядомыя вандалы апаганілі мемарыял ахвяраў нацызму “Яма”, які знаходзіцца па вуліцы Мельнікайтэ: былі абпаленыя пластыкавыя вянкі, раскіданыя каменьчыкі, якія традыцыйна кладуцца ў знак памяці пра загінуўшых, на самім манументе вандалы паклалі гронку рабіны, у якую ўваткнулі крумкачовае пяро. Пра гэта паведаміў віцэ-прэзідэнт Союзу беларускіх яўрэйскіх грамадзкіх аб’яднаньняў і суполак Якаў Басін. Па ягоных словах, кіраўніцтва аб’яднаньня мае намер зьвярнуцца з заявай у пракуратуру, хаця ня верыць, што злачынцы будуць знойдзеныя, бо гэта ўжо трэці выпадак вандалізму на тэрыторыі мемарыялу.

***18 жніўня*** польскія ўлады ўвялі забарону на ўезд у Польшчу 13 сябрам Рады 5-га скліканьня “Саюзу палякаў на Беларусі”, якія ўдзельнічалі 27-га ліпеня ў Шчучыне ў падрыхтоўцы паўторнага 6-га зьезду арганізацыі. Былы старшыня Саюзу палякаў Тадэвуш Кручкоўскі, пераабраны на зьезьдзе аганізацыі ў сакавіку, ужо меў забарону на ўезд. Сярод іншых сяброў арганізацыі, якія прынялі ўдзел у паседжаньні так званай старой Рады ў Шчучыне, забарону на ўезд атрымаў таксама адзін з паплечнікаў Кручкоўскага, юрыст СПБ Эдвард Калоша.

***22 жніўня*** ў Гародні старшыню Саюзу палякаў ***Анжаліку Борыс*** апоўдні выклікалі ў Ленініскі РАУС. Пасьля допыту ў якасьці сьведкі Анжаліка Борыс паведаміла, што ў яе цікавіліся: дзе яна была ў ноч з 6-га на 7-га студзеня, калі нехта невядомы спаліў аўтамабіль “Опель” Тадэвуша Кручкоўскага, экс-старшыня Саюзу палякаў.

***24 жніўня*** кіраўнік аддзелу камунікацыяў радыёстанцыі “Нямецкая хваля” Яганэс Гофман заявіў, што інтэрнэт-версія радыёпраграмы, якая будзе трансьлявацца на Беларусь, будзе часткова беларускамоўнай. Гэтае рашэньне прынятае ў сувязі з вялікай колькасьцю лістоў, якія прыходзяць на станцыю, у якіх грамадзяне Беларусі асуджаюць ідэю вяшчаньня на Беларусь на расейскай мове. Прадстаўнік “Нямецкай хвалі” ня выключыў, што ў будучыні вяшчаньне можа весьціся на беларускай мове.

***26 жніўня*** ўвечары ў Гародні быў затрыманы юрыст і праваабаронца ***Вадзім Саранчукоў.*** Ён прыйшоў на вакзал, каб узяць квіток да Ваўкавыску і ехаць на зьезд Саюзу палякаў. Калі В.Саранчукоў стаяў у чарзе, да яго падышоў нарад міліцыі, папрасіў прад’явіць дакументы. Пашпарт у Саранчукова быў пры сабе. Але, нягледзячы на гэта, яму загадалі прайсьці ў прывакзальны пастарунак “для высьвятленьня ассобы”, якое цягнулася так доўга, што зьехаць у гэты дзень ў Ваўкавыск Вадзім Саранчукоў ня здолеў.

***26 жніўня*** затрыманыя актывіст Саюзу палякаў журналіст ***Андрэй Пачобут*** і карэспандэнт газеты “Салідарнасьць” ***Іван Роман*** на вы-

езьдзе са Шчучыну ў напрамку Ваўкавыску. Міліцыянты сказалі, што нібыта іхняя машына крадзеная. Іх даставілі ў гарадзенскі Ленінскі РАУС, а потым завезьлі назад у Шчучын і пакінулі ў пастарунку да раніцы. А тым часам у Ваўкавыску затрымалі кіраўніка Гарадзенскага гарадзкога аддзелу Саюзу палякаў Мечыслава Яскевіча — нібыта для высьвятленьня ягонай асобы. Супрацоўніца Польскага тэлебачаньня Агнешка Рамашэўска прыехала ў Шчучын, каб пацікавіцца лёсам затрыманых журналістаў. Яе затрымалі міліцыянты, хацелі забраць відэакасету, але неўзабаве яны адпусьцілі журналістку. У гэты ж дзень у Гародні ў міліцыю выклікалі старшыню Саюзу палякаў Анжаліку Борыс, яе намесьніка Веслава Кеўляка і журналіста Анджэя Пісальніка. Анджэй лічыць, што гэта ня проста зьбег акалічнасьцяў, уся гэтая кампанія запалохваньня зьвязана з паўторным зьездам Саюзу палякаў, які мае адбыцца 27 жніўня ў Ваўкавыску: “Улады баяцца нашай прысутнасьці. Напэўна, нават не таго, што можа адбыцца нейкая акцыя пратэсту, нейкая маніфестацыя, а магчыма таго, што нашая прысутнасьць неяк паўплывае на дэлегатаў, якіх загналі на гэты зьезд амаль сілай, прынамсі пад прымусам. І калі б такі дэлегат, што ўвесь час вагаецца — ці ўдзельнічаць у гэтым? — раптам убачыў бы каго-небудзь з нас, дык, можа, ён вырашыў бы дзейнічаць ня так, як хочацца ўладам, каб ён рабіў падчас правядзеньня гэтага зьезду”.

***26 жніўня*** на уездах ў горад Ваўкавыск Гарадзенскай вобласьці выстаўленыя пасты ДАІ. Гэта тлумачыцца, нібыта, пошукам засуджаных, якія ўцяклі з месцаў абмежаваньня волі. Жыхары гораду заўважылі міліцэйскі транспарт, які мае не мясцовыя нумары. Так рыхтуюцца да правядзеньня зьезду палякаў Беларусі. Паводле галоўнага рэдактара “Местной газеты” Андрэя Шантаровіча, сілавыя структуры таксама рыхтуюцца да зьезду: “Па маёй інфармацыі, АМАП і гарадзенскі батальён міліцыі будуць у рэзерве, а правапарадак будуць забясьпечваць сіламі мясцовага райаддзелу міліцыі”. Дэлегатаў зьезду цяпер возяць на экскурсіі па горадзе. Гаворыць Шантаровіч: “Ім паказваюць, як мы тут добра жывём. Наперадзе ехала міліцэйская машына, два аўтобусы і ззаду — я на сваім аўтамабілі. Яны ехалі на прадпрыемства “Беллакт”, якое выпускае малочныя прадукты. Калона спынілася, людзі пачалі выходзіць. Натуральна, я пачаў фатаграфаваць гэтых дэлегатаў. Да мяне падышоў чалавек з павязкай і сказаў, што я ня маю права тут здымаць. Да іх не падпускаюць. Усе адварочваюцца, нікога немагчыма сфатаграфаваць. Дастаткова сур’ёзная ахова: яны пачалі тэлефанаваць, паказваць на мяне пальцам і запісваць нумары маёй машыны”. Дапамогу ў правядзеньні зьезду аказваюць прадстаўнікі Ваўкавыскага райвыканкаму. Паводле намесьніка старшыні райвыканкаму Уладзіміра Захарчука, “кожнаму ёсьць сваё даручэньне”. У Ваўкавыск прыязджаюць журналісты, але мясцовы гатэль зачынены, бо ўсе месцы забраніраваў райвыканкам.

***27 жніўня***, у дзень правядзеньня т. зв. паўторнага 6 зьезду "***Саюзу палякаў на Беларусі"***, улады зрабілі неверагодныя захады па недапушчэньні ў Ваўкавыск непажаданых для сябе людзей, якія мелі намер падтрымаць легітымнае кіраўніцтва арганізацыі. Па дарозе з Менску ў Ваўкавыск тройчы затрымліваўся аўтобус, у якім ехалі прадстаўнікі моладзевых ініцыятываў, хрысьціянскіх суполак, культурных аб'яднаньняў нацыянальных меншасьцяў, а таксама журналісты шэрагу незалежных выданьняў. Падставай для затрыманьня супрацоўнікі праваахоўных органаў называлі ўцёкі асабліва небясьпечных злачынцаў з "хіміі" з-пад Ваўкавыску. Паводле вызначанага для міліцыянтаў парадку, яны двойчы праверылі дакументы. У сувязі з тым, што ў 12 чалавек з групы не было дакументаў, аўтобус пасьля трэцяга спыненьня пад канвоем даставілі ў Стоўбцы. У Стаўбцоўскім РУУС з кіраўніка групы ўзялі тлумачэньні, а тых, у каго не было дакументаў, запрасілі для высьвятленьня асобаў ва ўпраўленьне. У трэці раз разам з міліцыянтамі і супрацоўнікамі ДАІ аўтобус правяраў намесьнік начальніка аддзелу транспартнага кантролю па Менску і Менскай вобласьці Алег Бурак. У гэты дзень у стаўбцоўскіх міліцыянтаў і супрацоўнікаў КДБ адмянілі выходны, а ім на дапамогу прыбылі некалькі машынаў міліцыянтаў з Менску. Агульнымі высілкамі яны знайшлі шэраг падставаў для далейшага затрыманьня аўтобусу, але затрымаць усіх людзей, што ехалі ў аўтобусе, ім не ўдалося. Некаторыя журналісты і грамадзкія дзеячы, хоць і са спазьненьнем, але ўсё ж такі дабраліся да Ваўкавыску. Разам з тым былі зьнятыя з дызельнага цягніка, які накіроўваўся з Баранавічаў у Ваўкавыск, шэсьць актывістаў баранавіцкіх апазіцыйных моладзевых арганізацыяў. Падстава была тая ж — "уцёкі асабліва небясьпечных злачынцаў". Таксама вядома, што ў Ваўкавыск не змаглі дабрацца і актывісты моладзевага руху "Зубр", якія ехалі падтрымаць актывістаў СПБ на чале з Анжалікай Борыс. Тым часам абраны старшыня СПБ Юзэф Лучнік на сваёй першай прэс-канферэнцыі гаварыў пра тое, што яму невядомыя факты рэпрэсіяў супраць актывістаў арганізацыі, ня ведае ён і пра выпадкі ўмяшальніцтва ўладаў у яе дзейнасьць і стварэньне перашкодаў для тых людзей, якія хацелі на ўласныя вочы пабачыць 6 зьезд "Саюзу палякаў на Беларусі".

***29 жніўня*** кіраўнік ***"Саюзу палякаў на Беларусі"***, абраная на 6 зьезьдзе СПБ у сакавіку, ***Анжаліка Борыс*** выказала сваё меркаваньне аб паўторным зьезьдзе Саюзу палякаў: "Калі зьезд адбываецца пры зачыненых дзьвярах, калі туды не пускаюць журналістаў, калі людзей затрымліваюць па дарозе, каб яны не даехалі да Ваўкавыску, калі сябры Саюзу палякаў, якія закладалі гэту арганізацыю, стаяць пад дзьвярыма і міліцыя не дазваляе ім туды ўвайсьці, калі людзей шукаюць і сілай змушаюць, каб яны прынялі ўдзел у зьезьдзе, і ў працы яго ўдзельнічаюць улады, кіруюць зьездам, то, я думаю, зьезд можа лічыцца дэмакратычным толькі паводле ўладаў, а не міжнародных стандартаў". Што датычыць кандыдатуры нова-

абранага старшыні, спадарыня Борыс выказала меркаваньне, што Юзэф Лучнік – адзін з заснавальнікаў СПБ, але наўрад ці ён будзе кіраваць, будзе сапраўдным лідэрам, бо ў радзе арганізацыі ў асноўным асобы даволі адыёзныя. Што да далейшай працы, Анжаліка Борыс сказала наступнае: “Я думаю, што дзейнасьць будзе працягвацца, мы будзем працаваць на Беларусі. А ўся гэтая сітуацыя дала мне магчымасьць пазнаёміцца з людзьмі іншых нацыянальнасьцяў, якія выказалі з намі салідарнасьць. Мы будзем працаваць дзеля таго, каб на тэрыторыі Беларусі ўсё ж такі запанавала дэмакратыя”.

***29 жніўня*** двое следчых крымінальнага вышуку Гарадзенскага УВД наведаліся ў кватэру непрызнанай беларускімі ўладамі старшыні ***“Саюзу палякаў на Беларусі” Анжалікі Борыс*** і дапытвалі яе па справе зьбіцця грамадзяніна Польшчы Міхала Дворчака. Допыт працягваўся на працягу паўгадзіны. Пытаньне сьледчых “Ці не зьбілі Міхала Дворчака вашыя прыхільнікі?” выклікала ў Анжалікі Борыс недаўменьне і зьдзіўленьне. Актывіст польскага камітэту “Салідарныя з Беларусьсю”, створанага партыяй “Закон і справядлівасьць”, Міхал Дворчак напярэдадні зьезду СПБ быў зьбіты невядомымі ў двары дому, дзе жыве Анжаліка Борыс.

***29 жніўня*** ў Шчучыне адбыўся суд над галоўным рэдактарам “Magazyna polskiego” ***Андрэем Пачобутам*** па абвінавачаньні ў дробным хуліганстве — нібыта за нецэнзурную лаянку каля Шчучынскага райаддзелу міліцыі. Судзьдзя раённага суда ў Шчучыне Тацяна Тадароўская прысудзіла журналісту штраф памерам у адну мінімальную велічыню. Нагадаем, 26 жніўня міліцыянты затрымалі ў Шчучыне Андрэя Пачобута і Івана Романа, журналіста газеты “Салідарнасьць”. Іх даставілі ў гарадзенскі Ленінскі РАУС, а потым завезьлі назад у Шчучын і пакінулі ў пастарунку да раніцы. Івана Романа адпусьцілі 27 жніўня, аштрафаваўшы на дзьве базавыя велічыні быццам бы за дробнае хуліганства. Штраф вынес намесьнік начальніка Шчучынскай міліцыі Генрых Зубель.

***31 жніўня*** ў мясцовы суд Ваўкавыску перададзеныя матэрыялы адміністрацыйнай справы актывіста Саюзу палякаў ***Мечыслава Яскевіча***, што была заведзеная на яго ваўкавыскай міліцыяй. Кіраўнік Гарадзенскага гарадзкога аддзелу СПБ Мечыслаў Яскевіч быў затрыманы ў Ваўкавыску 26 жніўня міліцыянтамі, на яго быў складзены пратакол паводле артыкула 167-2 КаАП як на арганізатара несанкцыянаванага сходу, які нібыта павінен быў адбыцца 27 жніўня побач з раённым Домам культуры падчас паўторнага правядзеньня 6-га зьезду СПБ. Пратрымаўшы спадара Яскевіча больш за суткі ў ізалятары, яго выпусьцілі, як скончыўся зьезд. У матэрыялах справы фігуруе ананімка, дасланая нібыта ў абласную ўправу ўнутраных справаў. У ёй сьцьвярджаецца, што 27 жніўня актывісты СПБ пры дапамозе палітычных актывістаў з розных беларускіх гарадоў зьбіра-

юцца ўчыніць масавыя акцыі, дзеля чаго падрыхтавалі бутэлькі з запальнай сумесьсю, завостраныя металічныя пруты і інш. Паводле Мечыслава Яскевіча, гэтую паперу 26 жніўня пры ім перадаў міліцыянтам чалавек у цывільным, які не назваўся. Таксама стала вядома, што міліцыянты склалі пратаколы і на мясцовых актывістаў Аб'яднанай грамадзянскай партыі Аляксандра Барадаўкіна і Віталя Гуляку, якіх абвінавачваюць ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікеце падчас паўторнага 6-га зьезду СПБ.

***1 верасьня***, пасьля 30-ці дзённага адміністрацыйнага арышту, на свабоду выйшаў ***Тадэвуш Гавін***, першы старшыня "Саюзу палякаў на Беларусі". Раніцай ён быў таемна вывезены на міліцэйскай машыне з Кастрычніцкага сьпецпрыёмніка Гародні. На вуліцы яго чакалі журналісты і сябры.

***1 верасьня*** ў гарадзенскую школу №36 з польскай мовай навучаньня ў першы клас з усяго гораду прыйшло толькі 15 вучняў. У папярэднія гады ў пачатковых класах існавала па некалькі паралеляў. Дырэктарка школы пані Рэгіна Гулецка кажа, што гэта наўпрост зьвязана з сітуацыяй вакол Саюзу палякаў: "Бацькі кажуць, што вельмі ня ўпэўненая палітычная сітуацыя. Кажуць, невядома, што будзе далей, а можа, нашых дзяцей ня будуць браць вучыцца ў Польшчу".

***5 верасьня*** Беларускае тэлебачаньне ў праграме "У цэнтры ўвагі" паказала рэпартаж, у якім польскі Генеральны консул у Гародні Анджэй Крэнтоўскі быў абвінавачаны ў перадачы праз мяжу экзэмпляраў "Glosu znad Niemna", надрукаваных у Польшчы. Затым быў абвінавачаны выконваючы абавязкі амбасадара ў Менску Мар'ян Семаковіч у тым, што пад канец жніўня ён прыехаў у Гародню, сабраў сяброў "Саюзу палякаў на Беларусі" ў консульстве і тры гадзіны вучыў іх, як арганізоўваць непарадкі ў Ваўкавыску, дзе павінен быў адбыцца зьезд СПБ. Абвінавачаньні былі ілюстраваны відэазапісамі з міліцэйскіх камераў, якія ўстаноўлены пры польскім консульстве ў Гародні.

***6 верасьня Анжаліка Борыс*** сустрэлася ў Варшаве з амбасадарамі краінаў Еўрасаюзу, што акрэдытаваныя ў Польшчы. Пасьля завяршэньня сустрэчы Анжаліка Борыс заявіла, што задаволеная вынікамі спатканьня і што паслы краінаў Еўрасаюзу прынялі яе "вельмі пазітыўна і вельмі цёпла". Анжаліка Борыс падкрэсьліла, што верыць, што дапамога аб'яднанай Еўропы зьменіць сітуацыю ў Беларусі.

***7 верасьня*** ў Варшаве непрызнаная беларускімі ўладамі лідэр Саюзу палякаў ***Анжаліка Борыс*** сустрэлася з прэм'ер-міністрам Польшчы Маркам Бэлькам, які заявіў, што Польшча ўсімі спосабамі, у тым ліку і фінансава, будзе дапамагаць кіраўніцтву СПБ на чале са спадарыняй Борыс.

***8 верасьня*** ў Страсбургу непрызнаная беларускімі ўладамі старшыня СПБ ***Анжаліка Борыс*** сустрэлася з Генеральным сакратаром Рады Еўропы, а таксама выступіла з прамовайу перад сябрамі дэлегацыі Еўрапарламенту ў справах Беларусі і сябрамі найвялікшай фракцыі Еўрапарламенту – фракцыі Еўрапейскай народнай партыі. Анжаліка Борыс некалькі разоў падкрэсьліла, што трэба памятаць ня толькі пра перасьлед польскай меншасьці ў Беларусі, але таксама і пра рэпрэсіі супраць беларускай апазіцыі. “Нам, палякам, пашчасьціла, што мы маем яшчэ адну айчыну – Польшчу, якая пра нас дбае... У беларусаў гэтага няма”, – заявіла спадарыня Борыс.

***8 верасьня*** ў зьнешнепалітычным ведамстве Беларусі пракаментавалі нядаўнюю афіцыйную адмову МЗС Польшчы прызнаць кіраўніцтва СПБ, абранае на зьезьдзе ў Ваўкавыску ў канцы жніўня, наступным чынам: “ Не зразумела, як урадавы орган, тым больш замежнай дзяржавы, можа прызнаваць альбо не прызнаваць кіраўніцтва грамадзкай арганізацыі ў іншай краіне. І зусім недарэчная спроба МЗС Польшчы выступаць судзьдзёй у прымяненьні беларускіх законаў”. Напярэдадні МЗС Польшчы паведаміў, што партнёрамі польскіх уладаў у справах палякаў у Беларусі застанецца кіраўніцтва Саюзу на чале з Анжалікай Борыс, абранае на зьезьдзе СПБ у сакавіку.

***22 верасьня*** стала вядома, што Белдзяржуніверсітэт зьбірае сьпісы студэнтаў, якія ідэнтыфікуюць сябе як літоўцы альбо палякі. У дэканаты факультэтаў з Упраўленьня кадраў Белдзяржуніверсітэту былі накіраваныя лісты з просьбай сабраць гэтыя зьвесткі. З 1994 году, калі зьявіўся першы беларускі нацыянальны пашпарт з “Пагоняй” — у ім была адмененая графа “нацыянальнасьць”. Няма такой графы і ў беларускім цяперашнім пашпарце (узору 1996 году). Начальнік кадравага ўпраўленьня БДУ Алег Клімковіч пракаментаваў сітуацыю наступным чынам: штогод зьбіраюцца зьвесткі пра замежнікаў сярод студэнтаў і выкладчыкаў — маўляў, кадравае ўпраўленьне “павінна ведаць пра кантынгент. І гэтыя зьвесткі для ўнутранага карыстаньня і нікуды далей не ідуць”. Адметна, што зьяўленьне такога ліста па часе супала з абвастрэньнем стасункаў Беларусі з Літвой і Польшчай.

***29 верасьня*** ў Жодзіне ўлады працягваюць ігнараваць жаданьне 9-гадовага Янкі Лапіцкага вучыцца па-беларуску. Беларускамоўны клас, у якім вучыўся Янка, быў расфармаваны напярэдадні мінулага навучальнага году. У ім былі два вучні. Паводле жодзінскіх чыноўнікаў, трымаць клас дзеля двух вучняў — дорага для бюджэту. Бацькі Янкі адмовіліся ад прапанаванага навучаньня сына ў расейскамоўнай школе. Бацькі Янкі Аляксей і Сьвятлана Лапіцкія зьвярнуліся па дапамогу да міністра адукацыі Аляксандра Радзькова. У лісьце, дасланым міністру, паведамляецца, што з 2004 году з-за рашэньняў мясцовай улады яны пазбаўленыя “эле-

ментарнага права” на атрыманьне сынам абавязковай і бясплатнай адукацыі на роднай мове, якая зьяўляецца дзяржаўнаю мовай у Беларусі. За год прымусовага, як лічаць Лапіцкія, пазбаўленьня Янкі магчымасьці навучацца па-беларуску яны ў Жодзіне не дачакаліся ад мясцовага аддзелу адукацыі вырашэньня іх пытаньня. Лапіцкія выказалі ў лісьце да міністра “рашучы пратэст” дыскрымінацыйным, на іх думку, дзеяньням Жодзінскага гарадзкога аддзелу адукацыі.

***5 кастрычніка*** стала вядома, што прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяў і рэлігійных канфесіяў, якія падпісалі Зварот да Аляксандра Лукашэнкі ў абарону непрызнанай уладамі старшыні Саюзу палякаў ***Анжалікі Борыс***, пачалі выклікаць у пракуратуру. Зварот падпісалі восем чалавек. Падпісанты, сярод якіх прадстаўнікі нямецкай, цыганскай, татарскай і польскай дыяспар, патрабавалі спыніць умяшальніцтва ўладаў ва ўнутраныя справы нацыянальных грамадзкіх аб’яднаньняў і наладзіць дыялог з іх прадстаўнікамі. Нягледзячы на тое, што з дня падпісаньня Звароту прайшло два месяцы, пісьмовага адказу з адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі сябры ініцыятывы не атрымалі. Але на яго зрэагаваў Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў, які даручыў пракуратуры правесьці праверку. Загадчык аддзелу нагляду за выкананьнем прававых актаў Павел Елісееў выклікае кожнага з падпісантаў і высьвятляе ў іх прыналежнасьць да той ці іншай дыяспары.

***5 кастрычніка Віктару Борысу*** — брату Анжалікі Борыс, непрызнаванай беларускімі ўладамі старшыні “Саюзу палякаў на Беларусі”, які працуе ў гарадзенскай міліцыі, прапанавалі добраахвотна звольніцца. Анжаліка Борыс паведаміла таксама, што яе брат стане перад дысцыплінарнай камісіяй за тое, што ня выканаў загаду і не прывёз сястру на адзін з допытаў.

***5 кастрычніка*** былому старшыні “Саюзу палякаў на Беларусі” Тадэвушу Кручкоўскаму адмоўлена ва ўезьдзе ў Польшчу. Польскія памежнікі анулявалі ўязную візу Кручкоўскаму на памежным пераходзе ў Кузьніцы. Былому старшыні СПБ выдадзены дакумент, з якога вынікае, што Кручкоўскі ўяўляе небясьпеку для абароназдольнасьці і грамадзкага парадку Польшчы. Кручкоўскі стаў трэцім актывістам СПБ, які мае афіцыйную забарону на ўезд у Польшчу. Усе яны ўдзельнічалі ў жнівеньскім зьезьдзе СПБ у Ваўкавыску, падчас якога было абранае новае кіраўніцтва СПБ, прызнанае афіцыйным Менскам.

***10 кастрычніка*** Міністэрства юстыцыі прызнала легітымным зьезд “Саюзу палякаў на Беларусі”, які адбыўся 27 жніўня ў Ваўкавыску. На гэтым паўторным зьезьдзе было абранае новае кіраўніцтва СПБ, старшынём Саюзу палякаў стаў Юзэф Лучнік, якога падтрымалі беларускія ўлады.

***10 кастрычніка*** ў Жодзіне адбыліся перамовы паміж бацькамі ***Янкі Лапіцкага*** і прадстаўнікамі сістэмы адукацыі. Паводле словаў бацькі Янкі ***Аляксея Лапіцкага***, намесьніца кіраўніка Жодзінскага гарадзкога аддзелу адукацыі Людміла Талмачова паведаміла, што рашэньне аб адкрыцьці беларускамоўнага навучаньня для ягонага сына прынятае на паседжаньні выканкаму. “Мы не атрымалі пакуль афіцыйнай паперы. Трэба будзе глядзець афіцыйнае рашэньне, як яно сфармулявана. Але так, як мы і дамаўляліся, заўтра Янка можа прыступаць да заняткаў. Аднаго настаўніка яны знайшлі” — сказаў Аляксей Лапіцкі. Янка будзе навучацца па-беларуску ў мясцовай гімназіі №1, але па індывідуальнай праграме. Вестка пра аднаўленьне беларускамоўнага навучаньня ўзрадавала жодзінскага хлопчыка, які ўжо другі год ня ходзіць у школу.

***12 кастрычніка*** калегія Гарадзенскага абласнога суда пакінула бяз зьменаў часовае абмежаваньне права на выезд за мяжу для актывіста Саюзу палякаў, журналіста ***Андрэя Пачобута***. 27 ліпеня Ленінскі раённы суд вырашыў, што спадар Пачобут нібыта ўхіляецца ад выплаты штрафу за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце, што адбыўся 6 ліпеня. Хаця ён на той момант заплаціў больш за 3 мільёны 700 тысяч рублёў з агульнай сумы 5 мільёнаў 100 тысяч. Калегія абласнога судау палічыла, што абмежаваньне на выезд будзе япасьля таго, як ён цалкам сплаціць усю суму штрафу.

***12 кастрычніка*** Менская гарадзкая пракуратура вынесла афіцыйныя папярэджаньні актывістам шэрагу нацыянальных меншасьцяў і рэлігійных канфесіяў, якія ў жніўні накіравалі ліст у абарону ***Анжалікі Борыс***. Паводле актывіста цыганскага руху ***Міколы Калініна,*** нядаўна ўдзельнікі жнівеньскага сходу былі выкліканыя ў гарадзкую пракуратуру. Яго ж знайсьці не маглі (ён знаходзіўся на семінары ў Чэхіі) і таму абвесьцілі ў росшук. “Па вяртаньні я зьявіўся ў гарадзкую пракуратуру да загадчыка аддзелу нагляду за выкананьнем прававых актаў Паўла Елісеева, — распавядае М.Калінін. — Задаваліся пытаньні наконт майго ўдзелу ў сустрэчы 6 жніўня, мне закідалася, што я, нібыта, паўсюдна выступаю ад імя рэспубліканскай ГА “Беларуская цыганская дыяспара”, хаця ніколі ад яе імя я не выступаў і ня меў да яе ніякіх адносінаў. Паводле Елісеева, на наступны дзень пасьля прыняцьця намі звароту ў рэспубліканскую пракуратуру прыйшоў кіраўнік гэтай арганізацыі Алег Казлоўскі з афіцыйнай скаргай на мяне і патрабаваньнем прыняць да мяне адпаведныя захады”. Паводле М. Калініна, “нягледзячы на дзікі ціск на падпісантаў, ніхто сваіх подпісаў у абарону Анжалікі Борыс не адклікаў і рабіць гэта не зьбіраецца”.

***19 кастрычніка*** старшыня ТБМ назваў справаздачу МЗС “Аб сучасным становішчы беларускай мовы ў Рэспубліцы Беларусь” неаб’ектыўнай. У публікацыі МЗС сьцьвярджаецца: “Працэс пашырэньня ўжытку бе-

ларускай мовы адбываецца ў розных галінах жыцьця грамадзтва, перш за ўсё, у сістэме адукацыі, галіне культуры, СМІ і іншых”. МЗС прыводзіць прыклады: 60% усіх установаў сярэдняй адукацыі краіны працуюць па-беларуску, 40% дзіцячых садкоў — беларускамоўныя, у Беларускім дзяржаўным педуніверсітэце на беларускай мове навучаецца больш за 3000 студэнтаў, ад 2000 году агульная колькасьць беларускамоўных школаў у гарадах вырасла ўдвая. Аднак дакладных лічбаў такіх школ МЗС Беларусі не прыводзіць, як і адсотку беларускамоўных навучэнцаў у школах і ВНУ. Старшыня “Таварыства беларускай мовы” Алег Трусаў называе такі падыход неаб’ектыўным: “Яны зноў лічаць маленькія вясковыя школы, дзе вучыцца некалькі дзясяткаў вучняў, і не называюць рэальнага ліку беларускамоўных вучняў. А сітуацыя такая, што колькасьць усіх беларускамоўных вучняў меней за 30%. Гэта катастрафічна, у адпаведнасьці са стандартамі ЮНЕСКО”. Алег Трусаў пры гэтым зазначае, што колькасьць беларускіх школ у гарадах не павялічваецца, а зьмяншаецца — напрыклад, у Менску яшчэ нядаўна было 11 беларускамоўных школ, а цяпер засталося толькі 4, што гвалтоўна закрыты адзіны беларускамоўны ліцэй, скасаваны выпускны экзамен па беларускай літаратуры, што ў Беларусі няма ніводнай ВНУ, дзе б усе прадметы выкладаліся па-беларуску, пра што МЗС маўчыць. Інфармацыю МЗС аб тым, што расьце колькасьць кінастужак, якія здымаюцца па-беларуску, спадар Трусаў увогуле абвяргае. Гаворачы пра СМІ, аўтары справаздачы МЗС зазначаюць, што на дзяржаўных радыёканалах 80% беларускамоўнага эфіру, але пры гэтым не падаюць, які адсотак беларускамоўных перадач на тэлеканалах. Ды і ў цэлым ніякіх прыкладаў звужэньня выкарыстаньня беларускай мовы ў дзяржаве, ніякіх праблемных фактаў справаздача МЗС не прыводзіць. На думку Алега Трусава, МЗС такім чынам сьвядома ўводзіць у зман замежных партнёраў Беларусі, падаючы неаб’ектыўную і несправядлівую інфармацыю. У МЗС Беларусі патлумачылі, што гэтая публікацыя — калектыўная праца супрацоўнікаў іх ведамства, зробленая на падставе зьвестак, атрыманых з міністэрстваў адукацыі, інфармацыі, культуры ды іншых ведамстваў. Прадстаўнік МЗС Руслан Есін заявіў, што заўвагі наконт неаб’ектыўнасьці публікацыі будуць вывучаныя і праз тыдзень на іх будзе дадзены адказ.

***20 кастрычніка*** ў Гародні міліцыя затрымала актывіста Саюзу палякаў ***Андрэя Пачобута***. Андрэй Пачобут, галоўны рэдактар часопісу “Magazyn polski” і супрацоўнік газеты “Glos znad Niemna”, выйшаў з працы і чакаў на вуліцы свайго знаёмага, які незадоўга да гэтага па тэлефоне паабяцаў забраць яго на машыне. Аднак замест сябра пад’ехала міліцэйская машына: супрацоўнікі праваахоўных органаў заявілі, што ў міліцыі ёсьць да яго пытаньні ў сувязі з нумарамі газеты “Glos znad Niemna”, якія выйшлі ў Польшчы і распаўсюджваліся ў Беларусі. Журналіста адвезьлі ў Ленінскі РУУС Гародні, дзе паведамілі, што да іх зьвярнуўся намесьнік пракурора вобласьці сп. Труцко і даручыў правесьці праверку на прадмет

парушэньня заканадаўства падчас выпуску і распаўсюду згаданага выданьня. А. Пачобуту прапанавалі даць тлумачэньні, аднак ён адмовіўся. Пасьля гэтага міліцыянты вызвалілі яго, але паведамілі, што ён павінен дачакацца сьледчых, якія едуць у Гародню са Шчучыну (па крымінальнай справе, заведзенай Шчучынскай пракуратурай, дзе А. Пачобут праходзіць як адзін з падазраваных). Каля 20.00 прыехалі два міліцыянты, якія павезьлі яго ў Шчучын, дзе ўручылі падпіску пра нявыезд. А. Пачобут адмовіўся яе падпісваць, заявіўшы, што ня згодны з такой мерай стрыманьня і ня будзе прадпрымаць якіх-небудзь дзеяньняў без адваката.

***21 кастрычніка*** стала вядома, што трохгадовае змаганьне сям'і ***Каральковых*** у Горках за права на атрыманьне адукацыі на беларускай мове прынесла плён. Іх ініцыятыву, нягледзячы на адмоўнае стаўленьне мясцовых уладаў, падхапілі іншыя жыхары гораду. Тут зараз навучаецца па-беларуску каля чатырох дзясяткаў дзяцей. ***Маша Каралькова*** вучыцца ў восьмым класе горацкай школы №4. Яна – адзіная ў Горках васьміклясьніца, якая атрымлівае адукацыю на беларускай мове. Магчымасьць навучацца па-беларуску яна атрымала ў выніку ўпартага змаганьня сям'і Каральковых з горацкімі ўладамі. Віктар Каралькоў, бацька Машы, – вядомы ў Горках актывіст дэмакратычнага руху, сябра сойму Кансерватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ і лідэр мясцовай суполкі гэтай партыі. У адказ на ўпартае нежаданьне дачкі апазіцыянера пайсьці ў расейскамоўны клас на сям'ю Каральковых пачаўся жорсткі ціск дзяржаўных структураў: "Былі ўсялякія розныя нажымы. І праз пракуратуру. І праз міліцыю, і нават ставілі пытаньне пазбавіць нас бацькоўскіх правоў. Потым усё ж пачало рэагаваць Міністэрства адукацыі".

***24 кастрычніка*** Ленінскі раённы суд Гародні разгледзеў скаргу актывіста Саюзу палякаў журналіста ***Андрэя Пачобута*** на рашэньне адміністрацыйнай камісіі Ленінскага раёну. Камісія аштрафавала яго на адну базавую велічыню нібыта за тое, што журналіст вытоптваў газон падчас несанкцыянаванага пікету ў абарону газеты "Glos znad Niemna", што адбыўся 6 ліпеня на плошчы Леніна ў Гародні. Суд вынес прыватнае азначэньне на адрас адміністрацыйнай камісіі за парушэньні ў вядзеньні пратаколу, аднак пакінуў правамоцным яе рашэньне адносна А.Пачобута.

***28 кастрычніка*** на памежным пераходзе "Берастaвіца—Баброўнікі" на беларуска-польскай мяжы была затрыманая машына, на якой ехала ***Анжаліка Борыс*** — старшыня непрызнанага беларускімі ўладамі Саюзу палякаў. Трапіць у Польшчу яна змагла толькі праз сем гадзінаў. Анжаліка Борыс сказала, што мытнікі нават чакалі нейкую адмысловую апаратуру для агляду машыны. Паводле старшыні Саюзу палякаў, службоўцы патлумачылі ўсё гэта камандай з Менску. Яна лічыць, што ёй урэшце да-

зволілі праехаць у Польшчу толькі таму, што яна паведаміла пра сваё затрыманьне на мяжы польскім сродкам масавай інфармацыі.

***1 лістапада*** стала вядома, што ў чатыры тамы гісторыка-дакументальнай хронікі “Памяць”, прысьвечанай Менску, не ўключаныя матэрыялы пра яўрэяў — найбольш вядомых ураджэнцах гораду. Пра гэта заявіў доктар гістарычных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэту імя М.Танка ***Эмануіл Іофе*** на міжнароднай навуковай канферэнцыі “Славутыя мінчане XIX—XX стагодзьдзяў”. Паводле словаў вучонага, на мяжы стагодзьдзяў Менск быў адным з найбуйнейшых гарадоў у межах яўрэйскай аседласьці, і, паводле зьвестак І Усерасійскага перапісу насельніцтва 1897 году, 52,3 працэнты яго жыхароў складалі яўрэі. “Я падрыхтаваў адпаведныя матэрыялы, але яны так і не ўвайшлі ў хроніку”, — сказаў Э.Іофе.

***3 лістапада*** беларускія памежнікі не прапусьцілі ў Польшчу ***Анжаліку Арэхву*** — актывістку Саюзу палякаў, непрызнанага ўладамі, якая ехала ў Беласток з Гародні. Яна набыла квіток на цягнік да Кузьніцы Беластоцкай. У зале дагляду пасажыраў яе вельмі пільна агледзелі мытнікі і прапусьцілі, а вось памежны кантроль прайсьці не ўдалося. “У мяне забралі пашпарт і матывавалі гэта тым, што сумняваюцца ў сапраўднасьці маёй пячаткі аб выезьдзе “ва ўсе краіны сьвету”. Пячатка была зроблена паскораным чынам у абласным АВІРы. Памежнікі сказалі: у вас прапіска лідзкая, чаму вы рабілі ў абласным АВІРы і чаму паскорана? Мы сумняваемся, трэба спраўдзіць”, — распавяла Анжаліка Арэхва. Анжаліка раней была дырэктарам грамадзкай школы пры Саюзе палякаў.

***6 лістапада*** ў мястэчку Сапоцкін Гарадзенскага раёну ў сельсавеце павінна была адбыцца сустрэча сяброў Саюзу палякаў з Юзэфам Лучнікам — кіраўніком СПБ, якога прызнаюць улады. Пра сустрэчу з кіраўніком афіцыйнага Саюзу палякаў паведамлялі абвесткі, некаторых запрашалі ў сельсавет асабіста, аднак жыхары мястэчка па сутнасьці праігнаравалі мерапрыемства: сустрэцца з ім прыйшлі толькі два чалавекі. У Сапоцкіне большасьць насельніцтва палякі, але яны па-ранейшаму падтрымліваюць дэмакратычна абранага старшыню СПБ Анжаліку Борыс, не прызнаную беларускімі ўладамі.

***8 лістапада*** ў міліцыю быў выкліканы ганаровы старшыня “Саюзу палякаў на Беларусі” ***Тадэвуш Гавін***. Сьледчы яго прасіў узгадаць, як разьмяркоўваліся сродкі Саюзу палякаў у той час, калі ён узначальваў арганізацыю. Па словах Гавіна, сьледчага найбольш цікавіла дапамога з-за мяжы, якая прыходзіла для дзяцей Гарадзеншчыны. Гэты допыт зьвязаны са справай, якая вядзецца па праверцы дзейнасьці на пасадзе старшыні Саюзу палякаў Анжалікі Борыс.

***11 лістапада*** заснавальнік Саюзу палякаў ***Тадэвуш Гавін*** атрымаў пастанову Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь, у якой гаворыцца, што Старшыня Вярхоўнага суда В.А.Сукала, разгледзеўшы матэрыялы адміністрацыйнай справы ў адносінах да Т.Ф.Гавіна, скасаваў рашэньне судзьдзі Кастрычніцкага раёну г. Гародні ад 12 жніўня, згодна з якім сп.Гавін быў прызнаны вінаватым у парушэньні арт. 259 КаАП (дробнае хуліганства) і атрымаў пакараньне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту тэрмінам 15 сутак. Дадзеная справа тычылася абставінаў, калі Тадэвуш Гавін, які ўжо знаходзіўся пад адміністартыўным арыштам, быў абвінавачаны ў хуліганскіх дзеяньнях да іншага пакаранага адміністрацыйным арыштам, і дадаткова пакараны 15 суткамі. Як высьветлілася з рашэньня Вярхоўнага суда – незаконна. Тадэвуш Гавін, які правёў месяц пад адміністрацыйным арыштам, абураны незаконнымі дзеяньнямі ўладаў і лічыць, што вінаватыя павінны панесьці пакараньне за незаконныя дзеяньні. Ён намераны зьвярнуцца ў суд з позвай на судзьдзю Кастрычніцкага суда Гародні з патрабаваньнем маральнай кампенсацыі.

***14 лістапада*** пяць прадстаўнікоў непрызнанага беларускімі ўладамі ***“Саюзу палякаў на Беларусі”*** былі выкліканыя на допыт у гарадзенскае сьледчае аддзяленьне міліцыі. На допыт выкліканая ***Анжаліка Борыс*** і яе чатыры бліжэйшыя супрацоўнікі. Сьледчы Дзьмітры Лабоўскі дамагаўся ад прадстаўнікоў СПБ прызнаньняў – куды і як разьмяркоўваліся фінансавыя сродкі, а таксама гуманітарная дапамога для арганізацыі. Аб гэтым сьледчы, напрыклад, пытаўся ў Інэсы Тодрык, якая працавала вярстальшчыкам газеты Саюзу палякаў. Інэса Тодрык, натуральна, гаварыла, што яна не ўваходзіла ў кіраўніцтва СПБ і ня мае да гэтага дачыненьня. Сьледчы, у сваю чаргу, нагадваў ёй увесь час аб крымінальнай адказнасьці за ілжывыя зьвесткі. У дадатак паведаміў, што на 16 лістапада ёй прызначаная вочная стаўка. Старшыня СПБ Анжаліка Борыс зьдзіўлена гэтымі допытамі, паколькі за час яе кіраваньня СПБ ніякая гуманітарная дапамога не прыходзіла. Анжаліка Борыс перакананая, што, выклікаючы яе ды іншых на допыты, улады хочуць запалохаць тых сяброў СПБ, якія яе падтрымліваюць.

***17 лістапада*** прадстаўнікі цыганскай нацыянальнай меншасьці, абураныя двухсерыйным дакументальным фільмам «Табор уходит в зону», паказаным па ОНТ, зьвярнуліся з лістом да старшыні Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. У лісьце сьцьвярджаецца, што дадзены фільм “утрымлівае вялізную колькасьць негатыўнай інфармацыі пра прадстаўнікоў цыганскага народу”. Далей у лісьце прадстаўнік цыганскага народу, праваабаронца Мікалай Калінін патрабуе, каб аўтар фільму папрасіў прабачэньня ў эфіры каналу ОНТ, а фільм “Табор уходит в зону” забаранілі для паказу па тэлебачаньні.

***20 лістапада*** галоўны рэдактар часопісу “Magazyn Polski” ***Анд-***

***рэй Пачобут*** быў затрыманы позна ўвечары беларускімі памежнікамі, калі вяртаўся з Польшчы праз памежны пераход Кузьніца-Брузгі. Спадара Пачобута пратрымалі некалькі гадзінаў, а потым адабралі ў яго пашпарт. Андрэя Пачобута затрымалі разам з Мечыславам Яскевічам – старшынёй гарадзенскай філіі СПБ, які, як і Пачобут, напярэдадні браў удзел у сустрэчы з прэм’ер-міністрам Польшчы Казімежам Марцінкевічам у Варшаве.

***23 лістапада*** беларускія памежнікі не пусьцілі ў Польшчу дзьвюх актывістак непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў: ***Інэсу Тодрык*** і ***Анжаліку Арэхву***. Яны зьбіраліся ехаць цягніком з Гародні ў Беласток па службовых справах. Памежнік, які ўзяў іх дакументы для праверкі, праз некаторы час вярнуў пашпарты назад і ня змог патлумачыць прычыны адмовы ў выезьдзе за мяжу. Адзінае, што ён параіў, — прыйсьці да наступнага цягніка, тады, маўляў, будзе вышэйшае начальства, і калі ізноў не прапусьцяць, то абавязкова патлумачаць прычыну.

***8 сьнежня*** ў судзе Ленінскага раёну Гародні адбылася папярэдняя сустрэча судзьдзі з Анджэем Пісальнікам і прадстаўніком Саюзу палякаў – юрыстам Яўгенам Калошам па зыску старшыні праўладнага Саюзу палякаў Юзэфа Лучніка, які сьцвярджае, што былы рэдактар газеты “Glos znad Niemna” Анджэй Пісальнік скраў рэдакцыйны фотаапарат вартасьцю ў паўтары тысячы даляраў і патрабуе, каб той яго вярнуў. Анджэй Пісальнік патлумачыў судзьдзі, што ў траўні пад расьпіску, як асоба матэрыяльна адказная, прымаў гэты фотаапарат. І увесь час сябры рэдакцыі ім карысталіся. Але ў ліпені адбыўся штурм Дома польскага. АМАП і міліцыя сілаю вывелі каля 20 сяброў СПБ разам з Анжалікай Борыс з будынку. Забраць фотаапарат ніякай магчымасьці, па словах Пісальніка, не было. Тады апячаталі ўнутры ўсе дзьверы. Усіх затрыманых адразу адвезьлі ў міліцыю, дзе дапытвалі і пратрымалі некалькі гадзінаў. А пасьля гэтага ў будынку дзяжурылі ўвесь час міліцыянты і нікога туды не ўпускалі. З таго часу А.Пісальнік наогул ніводнага разу не наведваў Дом польскі. Перадачы маёмасьці, як гэта прынята згодна з заканадаўствам, новым супрацоўнікам Саюза палякаў, у тым ліку і новаму рэдактару газеты “Glos znad Niemna” не праводзілася.

***9 сьнежня*** ў АВІРы Ленінскага раёну Гародні журналісту ***Андрэю Пачобуту*** вярнулі пашпарт з гербавай пячаткай з надпісам ад рукі “часова абмежаваны выезд за мяжу” і подпісам начальніка абласнога АВІРу Грыгор’ева. Журналіст лічыць, што такім чынам міліцыянты спадзяюцца перашкодзіць яму ў спробе паехаць у Польшчу цераз Украіну. Спадару Пачобуту раней анулявалі штамп у пашпарце, які дазваляе выезд “ва ўсе краіны сьвету”. Гэта было зроблена, каб актывіст непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў ня езьдзіў у Польшчу.

***12 сьнежня*** Беларускія памежнікі не пусьцілі ў Беларусь дарадцу прэм'ер-міністра Польшчы па справах палякаў за мяжой Міхала Дворчыка, які накіроўваўся на Гарадзеншчныу, каб, сярод іншага, сустрэцца з сябрамі непрызнанага афіцыйным Менскам Саюзу палякаў. Міхал Дворчык накіроўваўся ў Беларусь у складзе ўрадавай дэлегацыі разам з дзяржсакратаром канцылярыі прэм'ера Адамам Ліпіньскім і генеральным консулам Польшчы Анджэем Крэнтоўскім. На памежным пераходзе Кузьніца-Брузгі беларускія памежнікі забралі ў яго пашпарт, а потым пакінулі чакаць у памяшканьні, асобна ад ягоных калегаў па дэлегацыі. Затым дарадцу сказалі, што ягонае знаходжаньне на тэрыторыі Беларусі непажаданае. Па падрабязнасьці памежнікі параілі зьвярнуцца ў амбасаду Беларусі ў Варшаве. Між тым прэм'ер-міністр Польшчы Казімеж Марцінкевіч заявіў журналістам, што захады беларускіх уладаў не застануцца без адказу з боку Варшавы: "Гэта вельмі нядобрая практыка. Будзе адпаведная рэакцыя польскіх дыпламатычных службаў па гэтай справе".

***26 сьнежня*** ўвечары памежнікі затрымалі трох актывістаў ***"Саюзу палякаў на Беларусі"***, непрызнанага ўладамі. Гэта адбылося на пад'езьдзе на мястэчка Сапоцкін Гарадзенскага раёну. У Сапоцкін на калядную сустрэчу з актывістамі СПБ ехалі галоўны рэдактар газеты "Glos znad Niemna у эміграцыі" ***Анджэй Пісальнік***, галоўны рэдактар часопісу "Magazyn Polski" ***Андрэй Пачобут*** і кіроўца ***Анджэй Лісоўскі***. Супрацоўнікі памежнай службы затрымалі польскіх актывістаў і склалі на іх адміністрацыйныя пратаколы за парушэньне рэжыму знаходжаньня ў памежнай зоне і адпусьцілі.

## 12. Абмежаваньне акадэмічных свабодаў, парушэньне права на адукацыю

***28 студзеня*** новы старшыня БСДП (Народная Грамада) ***Анатоль Ляўковіч*** атрымаў вымову па месцы сваёй працы. Вымову Анатолю Ляўковічу, які працуе дацэнтам кафедры філасофіі Берасьцейскага дзяржаўнага ўнівэрсітэту, абвясьціў рэктар гэтай навучальнай установы Мечыслаў Часноўскі. Нагодай нібыта стаўся той факт, што спадар Ляўковіч не зрабіў ніякіх высноваў з мінулагодняй атэстацыі, якая адбывалася ва ўнівэрсітэце. Ужо тады кіраўніцтва навучальнай установы шукала прычыны, каб пазбавіцца ад выкладчыка, які працуе тут больш за 25 гадоў. Новаабраны лідэр "Народнай Грамады" лічыць, што вынесеная вымова не зьвязаная непасрэдна з ягонай працай ва ўнівэрсітэце і можа сьведчыць пра пачатак перасьледу паводле іншых матываў.

***4 лютага*** агульны сход Нацыянальнай Акадэміі навук не зацьвердзіў новага статуту акадэміі, прапанаванага кіраўніцтвам НАН. Навукоўцы называюць гэта адкрытым актам непадпарадкаваньня і пратэсту супраць парушэньня акадэмічных правоў і свабодаў. У новай рэдакцыі статуту было прапанавана ўвесьці ў Акадэміі кантрактную сістэму, агульным сходам і праз адкрытае галасаваньне абіраць акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў, забараняць навукоўцам займацца палітычнай дзейнасьцю. Акрамя таго, навукоўцы заяўляюць пра рашучасьць адстойваць сваю пазіцыю і надалей, а таксама пра намер стварыць рух інтэлігенцыі.

***10 сакавіка*** стала вядома, што адміністрацыя Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэту прымусіла напісаць заяву аб звальненьні па ўласным жаданьні лідэра гарадзкой арганізацыі “Маладыя сацыял-дэмакраты” і Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) ***Паўла Усава***, які чытаў курс па менеджменце паліталогіі і PR. Грамадзкі актывіст вымушаны быў напісаць заяву, якая ў той жа дзень неадкладна была падпісаная рэктарам. Павел Усаў паведаміў, што за апошні навучальны год за яго грамадзкую дзейнасьць яму выносіліся два папярэджаньні: першае - за тое, што балатаваўся ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, другое – за тлумачальную працу са студэнтамі. Тлумачальная праца са студэнтамі палягала ў тым, што выкладчык заклікаў вучняў прыходзіць на выбарчыя ўчасткі толькі ў дзень выбараў, за што яго абвінавацілі ў антыдзяржаўнай прапагандзе. Пасьля другога папярэджаньня сп.Усаву таксама паведамілі, што для яго будзе праблематычна абараніць кандыдацкую працу. Крыху нечаканым для грамадзкага актывіста аказалася тое, што яго папрасілі звольніцца пасярэдзіне навучальнага году, калі навучальны працэс у самым разгады. Звальненьня чакалі ўлетку. 4 сакавіка Паўла Усава выклікаў загадчык кафедры, на якой ён працаваў, і сказаў, што адміністрацыя настойвае на звальненьні і лепш, каб заяву аб звальненьні па ўласным жаданьні напісаў сам Павел.

***22 сакавіка*** суд у Берасьці адмовіў старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) ***Анатолю Ляўковічу*** ў спробе дамагчыся скасаваньня вымовы, што была вынесеная яму рэктарам мясцовага ўніверсітэту. Пасьля абраньня лідэрам партыі Анатоль Ляўковіч вырашыў звольніцца з універсітэту, але гэта не паўплывала на ягоны намер аспрэчыць вынесеную вымову. Спадар Ляўковіч сказаў, што гэта для яго справа гонару. Судовыя слуханьні цягнуліся ўвесь дзень, а ўвечары судзьдзя Сяргей Беразюк абвесьціў сваё рашэньне, паводле якога вымова, вынесеная Анатолю Ляўковічу, ня можа быць скасаваная.

***1 красавіка*** стала вядома, што студэнтаў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі гораду Горкі Магілёўскай вобласьці не пускаюць на вытворчую практыку за мяжу. Студэнты моцна расчараваныя, а кіраўн-

іцтва акадэміі тлумачыць, што ў краіне ідзе навядзеньне парадку ў сферы выезду за мяжу. Паводле інфармацыі дэкана па міжнародных сувязях Сьвятланы Насковай, у 2004 годзе за мяжу выязджала 600 студэнтаў, у асноўным на фермы ў Вялікабрытанію. Гэта была легальная магчымасьць для маладых людзей папрацаваць за мяжой, атрымаць досьвед і зарабіць грошы. Цяпер, каб адпраўляць студэнтаў за мяжу, трэба мець ліцэнзію. У акадэміі яе няма, а таму, гаворыць Васіль Неўдах, які выконвае абавязкі рэктара, у справах выезду за мяжу ад навучальнай установы ўжо нічога не залежыць: "Гэта справа дзяржаўная, і пры навядзеньні парадку ў дзяржаве і складаных узаемаадносінах з замежжам гэтае пытаньне трэба рэгуляваць".

***19 красавіка*** міністр замежных справаў Літвы Антанас Валёніс пасьля нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў МЗС краінаў Еўрапейскага Саюзу ў Люксембургу паведаміў, што афіцыйнае адкрыцьцё Еўрапейскага гуманітарнага універсітэту (ЕГУ), зачыненага беларускімі ўладамі, прызначанае на 9 чэрвеня ў Літве. У паведамленьні Міністэрства замежных справаў Літвы адзначаецца, што Антанас Валёніс заявіў пра "тэндэнцыі ў Беларусі, якія выклікаюць занепакоенасьць". Антанас Валёніс падкрэсьліў важную ролю Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту ў памкненьнях Літвы "як мага шырэй перадаваць агульныя еўрапейскія каштоўнасьці акадэмічнай супольнасьці суседняй краіны".

***21 красавіка*** агульны сход Нацыянальнай акадэміі навук не зацьвердзіў у новым статуце большасьці палажэньняў, супраць якіх выступіла група акадэмікаў. Навукоўцы называюць гэта актам непадпарадкаваньня і прыкладам у справе змаганьня за акадэмічныя правы і свабоды, а таксама за агульначалавечыя каштоўнасьці. Некалькі гадзінаў сходу навукоўцы вызначалі працэдуру працы. У выніку было прынятае рашэньне за кожны ўнёсак у статут галасаваць асобна. Аднак кіраўніцтва акадэміі на чале з Міхаілам Мясьніковічам, каб зацьвердзіць найбольшую колькасьць сваіх прапановаў, некалькі пунктаў аб'ядноўвала ў адзін. Гэткім чынам, была прынятая папраўка пра абавязковую кантрактную сістэму і некаторыя іншыя. Аднак прапанова, якая выклікала найбольшы пратэст навукоўцаў, — пра адкрытае галасаваньне пры абраньні акадэмікаў і член-карэспандэнтаў на агульным сходзе — была адхіленая.

***Ад 16 траўня*** ў Берліне адчынілася фотавыстава "Мы працягваем". Імпрэза прысьвечаная гісторыі зачыненага беларускімі ўладамі менскага Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту. Мэта выставы – прыцягнуць увагу нямецкага федэральнага міністэрства культуры і адукацыі да лёсу беларускіх студэнтаў-выгнаньнікаў і да пытаньня прызнаньня дыплому гэтага ўніверсітэту ў Еўропе. Ініцыятарамі фотавыставы сталі 17 беларускіх юнакоў і дзяўчат, якім даў прытулак Берлінскі Вольны ўніверсітэт.

***20 траўня*** начальнік раённага аддзелу адукацыі забараніў віцебскім старшакласьнікам езьдзіць на экскурсіі ў Кіеў. Але вучні 10 “А” класу сярэдняй школы №40 разам з бацькамі і класным кіраўніком Тацянай Севярынец, маці Паўла Севярынца, змусілі начальніка Першамайскага раённага аддзелу адукацыі Уладзімера Шлому адмяніць сваё рашэньне. На думку Тацяны Севярынец, чыноўнікі ад адукацыі, баючыся “аранжавых” наступстваў пасьля паездкі на Ўкраіну, далі яе вучням выдатную магчымасьць набыць досьвед змаганьня за свае ўласныя правы, і, што асабліва важна, перамагчы.

***20 чэрвеня Валеры Руселік*** і ***Ганна Кавалёва*** — студэнты трэцяга курса завочнага аддзяленьня факультэту журналістыкі БДУ, накіравалі міністру адукацыі і рэктару універсітэту скаргу на дзеяньні свайго выкладчыка. Студэнты лічаць, што выкладчык па прадмеце “Гісторыя беларускай журналістыкі першай паловы ХХ стагодзьдзя” Алег Слука паставіў ім 2 балы на экзамене з-за прадузятага стаўленьня да іх. Абодва студэнты зьвязваюць гэта з тым, што яны паставілі подпісы пад заявай у абарону сваёй былой аднакурсьніцы ***Вольгі Класкоўскай***. Валеры Руселік і Ганна Кавалёва просяць склікаць эксьпертную камісію для аб’ектыўнай ацэнкі іх пісьмовых прац, а таксама зрабіць захады па аднаўленьні іх правоў і “прадухіленьні ў будучымі незаконных і дыскрымінацыйных дзеяньняў у дачыненьні да студэнтаў, якія праяўляюць сваю грамадзянскую пазіцыю і выказваюць уласныя меркаваньні”.

***21 чэрвеня*** Гомельскі гарадзкі аддзел адукацыі адмовіўся прыняць на працу выпускніцу універсітэту імя Францішка Скарыны, актывістку незарэгістраванага моладзевага руху “Лімон” ***Юлію Сівец***. Вясною, калі адбывалася афіцыйнае разьмеркаваньне выпускнікоў філфаку, гарадзкі аддзел адукацыі даслаў ва ўніверсітэт персанальную замову на філолага Юлію Сівец. Аднак на днях аддзел адукацыі адклікаў сваю замову. Сама выпускніца ўніверсітэту ўпэўнена, што сапраўднай прычынай зьяўляецца яе грамадзка-палітычная дзейнасьць. Юля Сівец кажа: “Канечне, яны знойдуць нейкую афіцыйную прычыну, каб мяне пераразьмеркаваць у глухое месца. Так робіцца паўсюдна, і ня толькі ў зьвязку з разьмеркаваньнем. Тое ж самае робіцца і з выключэньнямі з універсітэтаў. Ніхто ня кажа, што за грамадзка-палітычную дзейнасьць”.

Ад ***29 чэрвеня*** да 1 верасьня калектыў закрытага ўладамі Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа будзе знаходзіцца ў Варшаве. Ліцэісты будуць вучыцца і слухаць лекцыі па рэжысуры кіно. Асноўную частку арганізацыйнай працы ўзяў на сябе Клуб каталіцкай інтэлігенцыі ў Варшаве. Дырэктар ліцэю Уладзімір Колас паведаміў, што галоўнай мэтай паездкі ў Варшаву ёсьць тое, што калектыў будзе мець магчымасьць зноў адчуць дух братэрства. Такім чынам, у Варшаву накіраваліся 100 чалавек. 87 з іх ліцэісты, астатнія — педагагічны калектыў і некалькі бацькоў.

***30 чэрвеня*** ў Менску прайшоў сход выкладчыкаў і студэнтаў Інстытуту сучасных ведаў, дзе было абвешчана пра намер ліквідаваць тры філіі гэтай навучальнай установы ў Віцебску, Гародні і Берасьці, а таксама сталічны факультэт сацыяльных тэхналогіяў і права. Як было заяўлена на сходзе, ініцыюе ліквідацыю гэтых структурных падразьдзяленьняў інстытуту Міністэрства адукацыі, паводле якога ўзровень ведаў студэнтаў, якія навучаюцца тут, нібыта не адпавядае сучасным патрабаваньням. Паводле ўдзельнікаў сходу, адміністрацыйнае рашэньне насамрэч выклікана толькі тым, што гэтая ўстанова – прыватная і што яе чакае лёс, які напаткаў Еўрапейскі гуманітарны універсітэт і гуманітарны ліцэй імя Коласа.

***30 чэрвеня*** вучоная рада Інстытуту гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук вывела са свайго складу вядомага дасьледчыка беларускага сярэднявечча, аўтара многіх папулярных кніг пра дачыненьні Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы, выдаўца незалежнага часопісу “Беларускі гістарычны агляд” ***Генадзя Сагановіча***. Перад тым ён быў звольнены з працы. Сагановіча фармальна звольнілі за парушэньне працоўнай дысцыпліны, якое выявілася ў тым, што ён без дазволу дырэкцыі інстытуту паехаў у навуковую камандзіроўку ў Кракаў, хоць тая паездка была за ўласны кошт, бо інстытут ня мае грошай на гэта. Але калегі спадара Сагановіча кажуць, што сапраўдная прычына ягонага звальненьня палягае ў прынцыповай навуковай пазіцыі гісторыка. І спасылаюцца на напісаны ня так даўно на замову расейскага часопісу “Родина” артыкул пра сучасны стан беларускае гістарыяграфіі. У якім, у прыватнасьці, спадар Сагановіч зазначыў, што ў цяперашніх акадэмічных беларускіх гістарычных працах непажаданыя крытычныя ацэнкі войнаў Вялікага Княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай у XVI—XVIII стагодзьдзях. Вось як пракаментаваў звальненьне Генадзя Сагановіча ягоны калега прафесар Захар Шыбека: “Лічу яго адным з самых вядомых і таленавітых і прафесійных гісторыкаў Беларусі. Калі Інстытуту гісторыі не патрэбныя такія гісторыкі, то я ня ведаю, хто ім патрэбен. Гэтае звальненьне, я думаю, не адаб’ецца на працы Сагановіча. Я думаю, такі чалавек такога ўзроўню і таленту, ён зможа працягнуць сваю працу па вывучэньні гісторыі, тым больш, што Генадзь піша гісторыю на еўрапейскім узроўні, і ён мае, на жаль, большую папулярнасьць за мяжой, чым тут у нас, у Беларусі”.

***15 ліпеня*** ўвечары прафесара Тэры Бэша выклікалі ва ўправу міжнародных сувязяў Белдзяржуніверсітэту і паведамілі, што ўлады патрабуюць, каб ён і дзьве ягоныя дачкі 10 і 13 гадоў за дзьве гадзіны пакінулі тэрыторыю Беларусі. Спадар Бэш патэлефанаваў у амбасаду ЗША. Амерыканскія дыпламаты зьвязаліся з беларускім Міністэрствам замежных справаў і прасілі, каб Тэры Бэшу і ягонай сям’і далі на зборы некалькі дзён. Беларускі бок пагадзіўся, каб Тэры Бэш разам з дочкамі пакінуў

Беларусь 19 ліпеня, пасьля таго, як прадстаўнікі аддзелу грамадзянства і міграцыі вернуць прафесару ягоны пашпарт. Ва ўправе па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэту ня ведаюць, з якой прычыны Тэры Бэшу забаронена знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. 40-гадовы Тэры Бэш працаваў у Беларусі два гады. Ён ня толькі выкладаў міжнароднае права ў БДУ, але і арганізоўваў дабрачынныя акцыі для адукацыйных установаў Беларусі. Арганізоўваў міжнародныя студэнцкія канферэнцыі, семінары і курсы. Па словах спадара Бэша, ён займаўся ў Беларусі толькі навуковымі праектамі. На думку спадара Бэша, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 году Аляксандр Лукашэнка пачаў вялікую чыстку, скіраваную супраць прадстаўнікоў Захаду. Амерыканскі прафесар лічыць, што ягоная справа стаіць у адным шэрагу з закрыцьцём Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту.

***19 ліпеня*** аддзел адукацыі Сьветлагорскага райвыканкаму адмовіўся працягваць кантракт з настаўнікам хіміі і біялогіі Прудкоўскай базавай школы Генадзем Бядой. Спадар Бяда зьяўляецца сябрам Кансерватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ. Прадметы ён выкладаў выключна на беларускай мове. Адміністрацыя школы сьцьвярджае, што кантракт з настаўнікам не падоўжаны з прычыны адсутнасьці ў яго педагагічнай адукацыі. Генадзь Бяда скончыў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, мае сьпецыяльнасьць вучонага-агранома. Настаўнікам у школе працаваў звыш пяці гадоў.

***20 ліпеня*** амерыканскі прафесар Тэры Бэш, які два гады працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце, пакінуў Беларусь. Беларускія ўлады адмовіліся працягваць ягоную службовую візу. Спадар Бэш прызнаўся, што цягам апошніх 72 гадзінаў адчуваў на сабе пільную ўвагу беларускіх сьпецслужбаў. На чыгуначны вакзал яго прыйшлі праводзіць больш за дзясятак студэнтаў і людзей, якія ўдзельнічалі ў беларускіх навучальных праграмах амерыканскага прафесара.

***3 жніўня*** Міністэрства адукацыі не дало дазволу на выезд у Злучаныя Штаты Амерыкі, у рамках праграмы абмену FLEX, 60 беларускіх школьнікаў, якія перамаглі ў конкурсе, абвешчаным у кастрычніку 2004 году ў органе Міністэрства адукацыі “Настаўніцкай газеце”. Сёлета ў сакавіку Аляксандр Лукашэнка выдаў дэкрэт “Аб асобных мерах у справе супрацьдзеяньня гандлю людзьмі”. На падставе гэтага дакументу Міністэрства адукацыі распрацавала адмысловую інструкцыю. Бацькі беларускіх школьнікаў гавораць, што чыноўнікі міністэрства тлумачаць забарону на выезд дзяцей у ЗША менавіта парушэньнем аднаго з палажэньняў гэтай інструкцыі, а таксама тым, што з імі не былі ўзгодненыя ўмовы правядзеньня конкурсу. Бацькі школьнікаў спадзяюцца, што Міністэрства адукацыі адменіць сваё рашэньне.



***22 жніўня*** стала вядома, што напярэдадні новага навучальнага году

ў Гомельскай вобласьці закрыта 8 школаў. Пра гэта на прэсавай канферэнцыі паведаміла выканаўца абавязкаў начальніка ўпраўленьня адукацыі аблвыканкаму Марына Бондар. Закрываюцца, як правіла, вясковыя школы з беларускай мовай навучаньня па прычыне невялікай колькасьці навучэнцаў і фінансавай немэтазгоднасьці. Дзеці вымушаныя езьдзіць на вучобу ў больш адаленыя вёскі альбо ў райцэнтры.

***23 жніўня*** застаўся бяз працы дырэктар Верхоўскай БШ ***Леанід Гаравы***, які адпрацаваў на гэтай пасадзе 18 гадоў. Падставай стала заканчэньне кантракту і, як мяркуе пакуль былы дырэктар, нежаданьне начальніка аддзелу адукацыі працаваць з асобай, які выказвае свае думкі па розных пытаньнях грамадзкага жыцьця і кіраваньня сістэмай адукацыі.Спадар Гаравы актыўна удзельнічаў у выбарах у Палату прадстаўнікоў ў 2004 годзе, зьяўляецца дэпутатам Гарадоцкага райсавету, сябрам Цэнтральнага камітэту БСДП(Грамада), уваходзіць у Цэнтральную Раду ТБМ і актыўна ўдзельнічае ў працы Асамблеі дэпутатаў мясцовых Саветаў.

***1 верасьня*** акцыя “Моладзь за навучаньне па-беларуску” пачалася пасьля ўрачыстай лінейкі каля будынку зачыненага ўладамі беларускага ліцэю на вуліцы Кірава ў Менску. Выкладчыкі павіншавалі дзяцей і іх бацькоў з новым навучальным годам і падзякавалі за добрыя вынікі навучаньня падчас летніх вакацыяў. Паколькі дзеці працавалі ўсё лета ў Польшчы, калектыў ліцэю вырашыў працягнуць навучальны працэс ад 1 кастрычніка. Тым часам некаторыя моладзевыя арганізацыі разаслалі ў аддзелы адукацыі беларускіх гарадоў і раённых цэнтраў лісты, у якіх яны просяць чыноўнікаў даць адказ, якая сітуацыя ў іх рэгіёнах з навучаньнем па-беларуску і ці хапае неабходных падручнікаў і школьных прыналежнасьцяў для беларускіх школаў. Яны просяць чыноўнікаў даць адказ, чаму на іх тэрыторыі няма беларускіх класаў.

***2 верасьня*** стала вядома, што ў забраным уладамі ў 2003 годзе будынку ***Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа*** на вуліцы Кірава, 21 у Менску будзе разьмяшчацца суд Цэнтральнага раёну сталіцы. Ірына Сідарэнка, адна з кіраўнікоў гуманітарнага ліцэю, нагадала, што рашэньне выселіць навучальную ўстанову з будынку на вуліцы Кірава ўлады матывавалі неабходнасьцю правядзеньня рАМАПту, пасьля якога абяцалі вярнуць будынак дзецям.

***8 верасьня*** навучэнцам ***гімназіі-каледжу мастацтва імя Ахрэмчыка***, якая дагэтуль была беларускамоўнай, паведамілі, што ў новым навучальным годзе асобныя дысцыпліны пачнуць выкладаць па-расейску. У прыватнасьці, было абвешчана, што няма грошай на набыцьцё беларускамоўнага падручніка матэматыкі. Падобная навіна абурыла ня толькі

гімназістаў, але і многіх бацькоў. Напярэдадні навучэнцы напісалі ліст у адміністрацыю гімназіі з прапановай адмовіцца ад абедаў, каб на заашчаджаныя сродкі купіць беларускія кнігі. Прадстаўніца бацькоўскага камітэту Валянціна Лойка апавядае, што спроба русіфікацыі навучальнага працэсу характэрная ня толькі для гэтай гімназіі: “Справа ня ў тым, што падручнікаў няма. Магчыма, гэта проста нагода адмовіцца ад беларускай мовы ўвогуле, вось што. Я ўжо цікавілася — такая самая сітуацыя і ў 26-й мастацкай школе, але калі там нічога не тлумачаць, проста кажуць, што пераходзім на расейскую мову, то ў нас яшчэ крыху баяцца адназначна канстатаваць, таму ўсё робіцца проста для адводу вачэй”.

***3 кастрычніка*** ў 9-гадовага ***Янкі Лапіцкага*** з Жодзіна зьявілася надзея працягнуць адукацыю па-беларуску. Міністэрства адукацыі зьвярнулася ў мясцовы гарвыканкам з ініцыятывай урэгуляваньня канфлікту. Сям’я Лапіцкіх атрымала копію ліста Міністэрства адукацыі, накіраванага ў Жодзінскі гарвыканкам. Як паведаміў бацька Янкі Аляксей Лапіцкі, у гэтым лісьце намесьнік міністра адукацыі Казімір Фарыно просіць жодзінскіх чыноўнікаў прыняць неабходныя меры, каб забясьпечыць канстытуцыйныя правы Янкі Лапіцкага і яго бацькоў на атрыманьне іх сынам адукацыі на беларускай мове.

***5 кастрычніка*** прэзідэнт Лукашэнка падпісаў новы ўказ, якім акрэсьліў узроставую мяжу ў справе аздараўленьня беларускіх школьнікаў за мяжой. Паводле гэтага дакументу, падчас навучальнага году вывозіць за мяжу больш як на 15 дзён дазволена толькі вучняў 1-4 класаў сярэдніх школаў і вучняў 1-5 класаў сьпецшколаў. Паводле афіцыйнай інфармацыі, падставай для гэтага стала патрэба захаваць бесьперапынны навучальны працэс. Педагогі мяркуюць, што сапраўдным клопатам уладаў зьяўляецца жаданьне абмежаваць кантакты школьнай моладзі з Захадам. Паводле ўказу Аляксандра Лукашэнкі, пра факты невяртаньня дзяцей ці асобаў, якія іх суправаджаюць, арганізатары выезду мусяць паведамляць у міністэрствы адукацыі і аховы здароўя, а таксама ў дэпартамент гуманітарнай дзейнасьці Кіраўніцтва справаў прэзідэнта на працягу сутак.

***12 кастрычніка*** кіраўніцтва Інстытуту гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адмовілася працягнуць кантракт з дасьледчыкам пытаньняў гісторыі эканомікі XIX стагодзьдзя ў Беларусі, старшым навуковым супрацоўнікам, кандыдатам гістарычных навук ***Андрэем Кіштымавым***. Навукоўца сказаў, што ягоны кантракт з Інстытутам заканчваўся 30 верасьня, хаця праца над планавай тэмай дасьледаваньня, праводзімага ім ва ўстанове, завяршалася толькі 31 сьнежня. “Аднак мяне запрасілі ў аддзел кадраў і азнаёмілі з загадам дырэктара Аляксандра Кавалені аб маім звальненьні ў сувязі з заканчэньнем тэрміну дзеяньня кантракту. За перы-

яд з 1979 году я прайшоў у Інстытуце ўсе ступені службовай лесьвіцы ад малодшага лабаранта да старшага навуковага супрацоўніка", — сказаў Андрэй Кіштымаў. У кіраўніцтве Інстытуту паведамілі, што звальненьне А.Кіштымава, які працаваў ва ўстанове на 25 адсоткаў стаўкі, выклікана недастатковым фінансаваньнем. Андрэй Кіштымаў зьяўляецца вядучым у краіне дасьледчыкам гісторыі айчыннай эканомікі XIX стагодзьдзя. Яго імя шырока вядома ў Беларусі, Літве, Польшчы, Расіі і Украіне. Каля 5 гадоў на Беларускім тэлебачаньні вучоны вёў папулярныя цыклы перадач, прысьвечаныя гісторыі айчыннай эканомікі і беларускім прадпрымальнікам. Вясной гэтага году выйшаў IV том акадэмічнага шасьцітомніку "Гісторыя Беларусі", у якім уступ, заключэньне і разьдзел тому, прысьвечаны праблемам эканомікі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі, напісаны А.Кіштымавым.

***14 кастрычніка*** Гарадоцкі раённы суд у асобе судзьдзі Адяксандра Ляшковіча не падтрымаў зыску зволненага дырэктара Вархоўскай базавай школы ***Леаніда Гаравога***. У жніўні з сябрам Цэнтральнага камітэту БСДП (Грамада) Леанідам Гаравым Гарадоцкі раённы аддзел адукацыі адмовіўся працягнуць кантракт нават у якасьці шараговага настаўніка. Упэўнены, што яго звольнілі незаконна і па палітычных прычынах, спадар Гаравы меркаваў праз суд аднавіцца на працы, а таксама атрымаць сярэдні заробак за час вымушанага беспрацоўя і матэрыяльную кампенсацыю маральных стратаў у памеры 2 мільёнаў рублёў. Аднак у судзе ўсё вырашылася на карысьць ягоных апанентаў – раённага аддзелу адукацыі, які прадстаўляла юрыст райвыканкаму Ірына Дзям'яненка. Леанід Гаравы мае 18-гадовы досьвед дырэктарскае працы, і школа пад ягоным кіраўніцтвам зрабілася адной з найлепшых у раёне. Тым ня менш, прадстаўнік аддзелу адукацыі спадарыня Дзям'яненка заявіла, што звальненьне спадара Гаравога зьяўляецца звычайным выпадкам сканчэньня тэрміну кантракту, які наймальнік проста вырашыў не ўзнаўляць. З меркаваньнем Леаніда Гаравога пра тое, што яго звольнілі з парушэньнем закону аб статусе дэпутата мясцовага Савету, суд не пагадзіўся. Паводле гэтага закону, дазвол на звальненьне яго як дэпутата Гарадоцкага райсавету мусіў быць падтрыманы іншымі дэпутатамі, але суд вырашыў, што ў дадзеным выпадку, калі гаворка ідзе пра кантрактную сістэму, гэтая працэдура непатрэбная.

***20 кастрычніка*** ў Першамайскім райсудзе Менску пачалі разгляд зыскаў выкладчыкаў Інстытуту сучасных ведаў. 30 выкладчыкаў гэтай навучальнай установы намагаюцца прызнаць праз суд незаконным скасаваньне з імі тэрміновай працоўнай дамовы. Яны патрабуюць грашовай кампенсацыі за матэрыяльныя страты за той час, што не працуюць. Інстытут сучасных ведаў, заснаваны ў 1990 годзе, быў першай небюджэтнай вышэйшай навучальнай установай, меў тры філіі — у Берасьці, Віцебску і Гародні.

Сёлета іх закрылі згодна з загадам Міністэрства адукацыі. Суд цягам некалькіх дзён будзе разглядаць зыскі выкладчыкаў.

***15 лістапада***, пасьля сустрэчы Аляксандра Мілінкевіча са студэнтамі Баранавіцкага недзяржаўнага эканоміка-юрыдычнага каледжу, вымушаны быў напісаць заяву аб звальненьні выкладчык ***Віктар Сырыца***. Адзін са старэйшых выкладчыкаў эканоміка-юрыдычнага каледжу Віктар Сырыца канстатуе, што яго прымусілі пакінуць навучальную ўстанову. Ён нямала зьдзіўлены такім рашэньнем і Міністэрства адукацыі, і ўласна кіраўніцтва каледжу, паколькі падчас запрашэньня студэнтаў на сустрэчу з Аляксандрам Мілінкевічам спадар Сырыца сам усіх супакойваў: будзе звычайная гутарка, мерапрыемства цалкам законнае, да таго ж адбываецца пасьля заняткаў. У выніку здарылася з дакладнасьцю да наадварот. Гаворыць Сырыца: “Прымалі ўдзел у сустрэчы мае студэнты, на якіх аказваўся вельмі моцны ціск. Перадусім, іх запалохвалі выключэньнем. Каб спыніць вось гэты ціск, я напісаў заяву аб звальненьні. Да таго ж, дырэктара нашага каледжу выклікаў намесьнік міністра адукацыі Жук і фактычна загадаў яму: альбо звальняеце Сырыцу, альбо навучальная ўстанова не праходзіць атэстацыю. Дырэктар мне ў прысутнасьці ўсёй адміністрацыі так і сказаў: калі ты не напішаш заяву, наша навучальная установа ня пройдзе атэстацыю сёлета ў сьнежні. Але самае галоўнае: я напісаў заяву, бо быў супраць рэпрэсіяў. Студэнтаў запалохвалі выключэньнем”.

***15 сьнежня*** Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) прыняла заяву пратэсту супраць палітычных перасьледаў студэнтаў і выкладчыкаў. У заяве сказана: “14 сьнежня рэктар Гомельскага тэхнічнага дзяржаўнага універсітэту Станіслаў Сарэла звольніў выкладчыка паліталогіі, асьпіранта БДУ і магістранта Еўрапейскага гуманітарнага універсітэту Яўгена Фурсеева. Звальненьне Яўгена Фурсеева з працы ў БСДП разглядаюць як расправу за яго палітычную і грамадзкую дзейнасьць. Яўген Фурсееў зьяўляецца старшынёю Гомельскай гарадзкой арганізацыі БСДП і сябрам Цэнтральнага Камітэту партыі. Зачэпкай для звальненьня Я.Фурсеева стаў выклік яго на сесію ў ЕГУ. Рэктар С.Сарэла адмовіўся прадаставіць водпуск на час сесіі, хоць у адпаведнасьці з законам і калектыўнай дамовай ён ня меў права гэтага рабіць. Нядаўна адлічылі з Беларускага эканамічнага універсітэту студэнтку Тацяну Хому, цяпер звольнілі з працы выкладчыка Яўгена Фурсеева… У сакавіку гэтага года з працы ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя Аркадзя Куляшова быў звольнены наш таварыш, старшыня Магілёўскай гарадзкой арганізацыі, старшы выкладчык кафедры паліталогіі і сацыялогіі Павел Усаў. Такія дзеяньні кіраўнікоў ВНУ не павінны заставацца беспакаранымі”.

# 13. Перасьлед апазіцыйна настроенай моладзі і моладзевых арганізацыяў

***12 студзеня*** ўначы магілёўскі актывіст моладзевага руху "Зубр" ***Максім Дварэцкі*** быў затрыманы за графіці "Свабоду Марынічу!" і дастаўлены ў РУУС Ленінскага раёну г. Магілёву, дзе на яго быў складзены пратакол па арт. 156 КаАП РБ (дробнае хуліганства). У 11.00 Максім Дварэцкі быў дастаўлены ў суд. Разгляд справы доўжыўся некалькі хвілінаў. Сьведкі-міліцыянты сьцьвярджалі, што малады чалавек "лаяўся матам і дэбашырыў" у момант напісаньня графіці. Судзьдзя Тыбленка адмовілася выслухаць сьведкаў з боку затрыманага. Акрамя таго, яна не задаволіла хадайніцтва аб прадастаўленьні адваката.

***17 студзеня*** з пажарнага атраду звольнілі двух 23-гадовых братоў-блізьнятаў ***Аляксея*** і ***Сяргея Жураўлёвых*** з Полацку, што былі даверанымі асобамі кандыдата ад Партыі БНФ Леры Сом на мінулых парламенцкіх выбарах. Пры звальненьні – а іх прымусілі звольніцца па "ўласным жаданьні" – намесьнік начальніка атрада па выхаваўчай працы паведаміў братам, што яны звальняюцца з-за палітычнай дзейнасьці, якую нібыта разгарнулі ў рэжымнай установе. Аляксей Жураўлёў звальненьне разглядае як парушэньне элементарных правоў чалавека і Канстытуцыі і кажа, што звальненьне іх не зламала, а нават умацавала ў перакананьнях.

***19 студзеня*** актывісты моладзевага руху "Зубр" правялі пікет на знак салідарнасьці з палітвязьнямі. У чатыры гадзіны каля двух дзясяткаў "зуброў" з партрэтамі М.Марыніча сталі ланцугом на вуліцы Валадарскага насупраць будынку Менскага СІЗА, дзе ўтрымліваецца палітзьняволены. Пікет доўжыўся поўгадзіны. Супрацоўнікі міліцыі прыехалі на месца правядзеньня акцыі праз некалькі хвілінаў пасьля яе заканчэньня.

***23 студзеня*** ў Гомелі затрыманыя моладзевыя актывісты, якія раздавалі аранжавыя ўлёткі з нагоды інаўгурацыі прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі. Ва ўлётках незарэгістраванага моладзевага руху "Лімон", у прыватнасьці, асуджалася "памаранчавая" рэвалюцыя за тое, што грамадзяне Украіны прачнуліся ў вольнай краіне, могуць самі абіраць прэзідэнта, і Вярхоўны суд аказаўся вышэй за прэзідэнцкае слова. "Глядзець БТ, чытаць СБ і цешыцца шчасьліваму жыцьцю, якім адарыла нас мудрае кіраваньне Рыгоравіча!" – раілі "Лімоны" ва ўлётцы. Сярод затрыманых: ***Арцём Бурыла, Сяргей Восіпаў, Юрый Лапіцкі, Вольга Сыцько, Канстанцін Лесуноў.*** У дачыненьні да затрыманых былі складзеныя пратаколы за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, а таксама за распаўсюд друкаванай прадукцыі, зьмест якой накіраваны на нанясеньне ўрону дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку.

***28 студзеня*** актывіст “Маладой грамады”, былы студэнт Беларускай акадэміі мастацтваў ***Зьміцер Чарткоў*** перадаў свой зварот з просьбай аб прадастаўленьні палітычнага прытулку ў амбасаду Украіны ў Беларусі. Ён так патлумачыў свой учынак: “Падчас апошніх здарэньняў, што адбыліся са мною — гэта ціск на мяне, каб я забраў дакументы з Акадэміі, і ўся мая ранейшая палітычная дзейнасьць — падчас мінулай выбарчай кампаніі некаторыя са службоўцаў казалі, што рыхтуецца фізічная расправа нада мной і Ваўчаніным, і каб мы вельмі асьцярожна сябе паводзілі. А пасьля ціск, каб я забраў з Акадэміі дакументы. Для мяне галоўнае, каб адвесьці пагрозу ад сваіх сяброў, ад сваёй сям’і. Я вырашыў зрабіць нават больш палітычны ход і падаць просьбу даць мне прытулак ва Украіне”. Зьміцер Чарткоў сказаў, што прычынамі ціску было ягонае затрыманьне і адміністрацыйны арышт падчас пасьлярэферэндумнай вулічнай акцыі пратэсту 19 кастрычніка, а таксама ўдзел ва ўкраінскай памаранчавай рэвалюцыі.

***28 студзеня*** трое актывістаў руху “Зубр” – ***Павел Угрыновіч, Максім Дварэцкі*** і ***Мікалай Ільін*** — былі затрыманыя ў Магілёве ў Расейска-беларускім універсітэце за распаўсюд незалежнай газеты “Выбар”. Затрыманыя дастаўленыя ў ГАМ Ленінскага раёну г. Магілёву.

***2 лютага*** ў адміністрацыйнай камісіі Чыгуначнага раёну Гомелю разглядалася пытаньне аб пакараньні ***Вольгі Сузько*** і ***Канстанціна Лясунова*** за распаўсюд улётак ад імя незарэгістраванага моладзевага руху “Лімон” 23 студзеня з нагоды інаўгурацыі новага прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі. Маладыя людзі патлумачылі, што ня мелі да распаўсюду дачыненьня: яны прыйшлі на рынак па прадукты, пабачылі, як людзі чытаюць нейкія яркія паперкі, і на адным з прылаўкаў узялі пару асобнікаў. В. Сузько і К. Лесунову вынесеныя штрафы па дзьве мінімальныя вялічыні. “Няхай наступны раз не чытаюць абы-што!” — так сваё рашэньне патлумачылі ў камісіі.

***3 лютага*** ў судзе Чыгуначнага раёну Гомелю пачаўся разгляд адміністрацыйных справаў у дачыненьні да ***Вольгі Сузько*** і ***Канстанціна Лесунова***, якія абвінавачваюцца ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванага моладзевага руху “Лімон”. 23 студзеня Вольга і Канстанцін былі затрыманыя на рынку “Прудкоўскі” у момант, калі трымалі ў руках улёткі незалежнай арганізацыі. Судзьдзя Козыраў, які разглядае справу, паслухаўшы Вольгу і Канстанціна, пастанавіў дапытаць у якасьці сьведкаў міліцыянтаў, якія складалі пратаколы, і панятых, якія былі запрошаныя пасьля таго, як маладыя людзі адмовіліся іх падпісваць. Наступнае паседжаньне прызначанае на 15 лютага.

***10 лютага*** два актывісты моладзевага руху “Зубр” ***Павел Юхневіч*** і ***Андрэй Баранаў*** былі затрыманыя каля прахадной Менскага трактарна-

га заводу за распаўсюд «Свободной газеты», прысьвечанай беларускім палітзьняволеным Міхаілу Марынічу, Валерыю Леванеўскаму і Аляксандру Васільеву. Затрыманыя былі дастаўленыя ў РУУС Партызанскага раёну Менску, дзе на іх былі складзеныя пратаколы па арт. 172 ч.3 КаАП РБ – распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных.

***14 лютага*** ўвечары на Кастрычніцкую плошчу Менску прыйшло каля 100 маладых апазіцыйных актывістаў: сябры “Маладога Фронту”, “Задзіночаньня беларускіх студэнтаў”, навучэнцы Беларускага гуманітарнага ліцэю. Актывісты дэмакратычных моладзевых аб’яднаньняў арганізавалі акцыю-перформанс “Сэрца Еўропы”, прысьвечаную Дню сьвятога Валянціна. Усе яны мелі ў сваім адзеньні элементы сьцягу Еўрапейскага саюзу – шалікі, хусткі і навязкі валошкавага колеру з жоўтымі зоркамі. Удзельнікі акцыі запалілі бенгальскія агні і пад гукі гімну Еўрапейскага саюзу пачалі віншаваць са сьвятам мінакоў. Праз некалькі хвілінаў на плошчы зьявіліся АМАПаўцы, якія пачалі выціскаць з яе ўдзельнікаў акцыі. Тым часам на Кастрычніцкую плошчу заехала калона камунальнай тэхнікі, якая пачала ўборку сьнегу, і такім чынам акцыя скончылася. Групы маладых людзей паехалі віншаваць з Днём сьвятога Валянціна прэтэндэнтаў у адзіныя кандыдаты ад дэмакратычных сілаў – Анатоля Лябедзьку, Станіслава Шушкевіча і Аляксандра Мілінкевіча. Удзень 14 лютага актывісты “Маладога Фронту” таксама павіншавалі з Днём сьвятога Валянціна дыпламатаў 11 краінаў Еўрапейскага Саюзу, Злучаных Штатаў Амерыкі і Украіны. Аднаго з арганізатараў акцыі “Сэрца Еўропы”, намесьніка сустаршыні “Маладога Фронту” ***Сяргея Лісічонка*** па дарозе дахаты спрабаваў затрымаць нейкі чалавек у цывільным. Акцыі featurнага фармату былі арганізаваныя маладымі людьмі яшчэ ў 17 гарадах Беларусі.

***17 лютага*** ў Гомелі судзьдзя Чыгуначнага раёну Гомелю Віталь Козыраў аштрафаваў ***Вольгу Сузько*** і ***Канстанціна Лесунова*** за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай грамадзкай арганізацыі. Гэта ўжо другое пакараньне маладых гамельчукоў. Прадметам разьбіральніцтва ў судзе былі міліцэйскія пратаколы, складзеныя 23 студзеня. У той дзень на Прудкоўскім рынку невядомыя маладыя людзі сапраўды раздавалі ўлёткі ад імя незарэгістраванага руху ”Лімон” з нагоды інаўгурацыі прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі. Міліцыянт у цывільным убачыў, што ўлёткі былі ў руках Вольгі і Канстанціна і затрымаў іх. 2 лютага адміністрацыйная камісія Чыгуначнага раёну ўжо аштрафавала іх за распаўсюд улётак без выходных зьвестак, на гэты раз у судзе за тыя ж самыя ўлёткі маладых людзей абвінавацілі ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванага маладзевага руху “Лімон”.

***26 лютага*** ўвечары супрацоўнікі міліцыі прыйшлі дадому да барыскаўкага актывіста руху “Зубр” ***Аляксандра Малчанава***. Маладога чала-

века дока не было, і яны склалі пратакол па арт. 162 КаАП (невыкананьне бацькоўскіх абавязкаў) на ягоную маці. Нагодай для гэтага сталі неаднаразовыя затрыманьні маладога чалавека.

***2 сакавіка*** стала вядома, што ў Барысаве аказваецца ціск на непаўнагадовага актывіста “Зубра” ***Міхаіла Старавойтава***. Падлетка і ягоную маці некалькі разоў выклікалі ў інсьпекцыю па справах непаўнагадовых на размову. Аднойчы маладога чалавека выклікалі проста з заняткаў у ПТВ-205, дзе ён вучыцца.

***9 сакавіка*** адзін з каардынатараў руху “Зубр” ***Яўген Афнагель*** затрыманы супрацоўнікамі міліцыі. Маладога чалавека спынілі і абшукалі ў цэнтры Менску. Пры сабе ў яго знайшлі бел-чырвона-белы сьцяг, пасьля чаго ён быў дастаўлены ў ГАМ-1 Ленінскага раёну сталіцы.

***10 сакавіка*** актывістку моладзевага руху “Зубр” ***Ірыну Тоўсьцік***, якая добра вучылася, адлічылі з апошняга курсу педуніверсітэту. Ірына заявіла, што на рашэньне адміністрацыі паўплывала яе актыўная грамадзка-палітычная дзейнасьць, і загад аб адлічэньні ня стаўся для яе нечаканасьцю. Паводле Ірыны, дэкан факультэту філалогіі і культуры Аляксандр Лугоўскі неаднаразова выклікаў яе і прасіў спыніць дзейнасьць у моладзевым руху “Зубр”. Кіраўнік упраўленьня выхаваўчай працы з моладзьдзю педуніверсітэту Аляксандр Ігнатчык абверг палітычныя прычыны выключэньня студэнткі. Але ён лічыць, што сумяшчаць апазіцыйную дзейнасьць з навучаньнем у дзяржаўнай установе нельга: “БРСМ – гэта грамадзкае аб’яднаньне, а я ня ведаю, што такое “Зубр”. Гэта незарэгістраванае аб’яднаньне. Адэкватныя нормы паводзінаў павінны быць, асабліва, калі мы выхоўваем будучых настаўнікаў. Цягам апошняга году з навучальных установаў выключылі каля дзясятку сяброў моладзевага руху “Зубр”, якіх затрымлівалі на апазіцыйных акцыях. Сярод іх ***Максім Дварэцкі, Дзяніс Ляшчынскі, Сяргей Андросенка, Раман Казакевіч, Алесь Курсевіч*** і ***Яўген Скрабатун***. Некаторыя з іх падалі заявы, каб аднавіцца на вучобе, але адміністрацыі ВНУ ім адмовілі.

***11 сакавіка*** актывіст руху “Зубр” ***Максім Вінярскі*** быў затрыманы пасьля акцыі ў падтрымку палітзьняволенага Міхаіла Марыніча, якая прайшла ў гэты дзень на Кастрычніцкай плошчы Менску. У канцы 2004 году актывіст “Зубра” быў асуджаны судом Фрунзенскага раёну сталіцы на 15 сутак за распаўсюд незалежных газет, аднак не адбыў свой тэрмін. Пасьля затрыманьня Максіма Вінярскага адразу ж павезьлі ў РУУС Фрунзенскага р-ну, а адтуль – у сьпецпрыёмнік-разьмеркавальнік.

***12 сакавіка*** актывістамі руху “Зубр” на скрыжаваньні вуліц Піянерская і

Ленінская ў Магілёве з даху тэхнапарку былі скінутыя ўлёткі, якія заклікалі вызваліць з турмы палітвязьня Міхаіла Марыніча. Падчас правядзеньня акцыі затрыманы ***Яўген Сувораў***. Ён быў дастаўлены ў Ленінскі РУУС Магілёву, дзе ў адносінах да яго склалі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных. У яго былі адабраныя некалькі дзесяткаў асобнікаў улётак.

***15 сакавіка*** на Кастрычніцкай плошчы з ужываньнем фізічнай сілы былі затрыманыя актывісты "Маладога Фронту" ***Зьміцер Дашкевіч*** і ***Артур Фінкевіч***. Маладыя людзі планавалі прыняць удзел у акцыі, прысьвечанай чарговым угодкам Канстытуцыі 1994 году, якая была зьмененая рэферэндумам 1996 году, што даў прэзідэнту А. Лукашэнку аўтарытарныя паўнамоцтвы. Затрыманыя дастаўленыя ў РУУС Цэнтральнага раёну г. Менску.

***15 сакавіка*** судзьдзя суда Цэнтральнага р-ну г. Менску Бычко ў выніку разгляду адміністрацыйных справаў прызнаў сяброў "Маладога Фронту" ***Зьміцера Дашкевіча*** і ***Артура Фінькевіча*** вінаватымі і ў парушэньні ч. 2 арт. 167.1 КаАП Рэспублікі Беларусь і падверг абодвух адміністрацыйнаму арышту тэрмінам на 15 сутак. Пры гэтым судзьдзя праігнараваў заяўленыя З. Дашкевічам і А. Фінькевічам хадайніцтвы аб удзеле пры разглядзе справы адвакатаў, а таксама не дапусьціў у судовую залу маладафронтаўцаў, якія прыйшлі падтрымаць сваіх сяброў. Такім чынам судзьдзя Бычко парушыў канстытуцыйнае права З. Дашкевіча і А. Фінькевіча на абарону і фактычна правёў закрытае судовае паседжаньне.

***23 сакавіка*** ў Гомелі каля ўніверсітэту імя Францішка Скарыны старэйшы лейтэнант міліцыі Чучвага з напарнікам затрымаў студэнтку ***Юлю Сівец*** і маладога рабочага ***Аляксандра Гехта***. Іх абвінавацілі ў распаўсюдзе ўлётак незарэгістраванага моаладзевага руху "Лімон", зьмест якіх нібыта наносіць шкоду дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку.

***24 сакавіка*** адміністрацыйная камісія барысаўскага выканкаму вынесла папярэджаньні актывістам руху "Зубр" ***Аляксандру Малчанаву*** і ***Міхаілу Старавойтаву,*** якія былі затрыманыя за тое, што зьбіралі подпісы ў падтрымку палітвязьня Міхаіла Марыніча.

***25 сакавіка***, Дзень волі, моладзь Партыі БНФ распачала правядзеньнем акцыі па разьвешваньні бел-чырвона-белых стужак на дрэвах у цэнтры Менску. Акцыя пачалася ў палову трэцяй гадзіны раніцы, стужкі разьвешваліся на Плошчы Перамогі, Кастрычніцкай плошчы і на праспекте Скарыны. Прыкладна праз паўгадзіны пасьля пачатку акцыі трох яе ўдзельнікаў затрымалі супрацоўнікі міліцыі і адвезьлі ў РУУС Цэнтральнага раёну. Аднаго актывіста адразу адпусьцілі, на астатніх склалі пратаколы аб парушэньні арт. 143.2 Кодэксу аб адміністрацыйных правапару-

шэньнях. Акрамя таго, аднаму з удзельнікаў акцыі міліцыянты парвалі пашпарт. А сёмай гадзіне затрыманыя былі адпушчаныя.

***25 сакавіка*** сябра "Задзіночаньня беларускіх студэнтаў" ***Аляксей Трубкін*** прыйшоў у рэктарат Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту, каб павіншаваць з Днём Волі. У яго з сабой былі лісткі-віншаваньні з інфармацыяй пра значэньне гэтага дня для гісторыі і дзяржаўнасьці Беларусі. Рэктар універсітэту Д. Лазоўскі папрасіў маладога чалавека затрымацца, а сам у гэты час выклікаў службу аховы правапарадку (студэнцкі орган) і міліцыю. А. Трубкіна да прыезду супрацоўнікаў міліцыі трымалі ў кабінеце прарэктара Беларусавай, туды ж накіраваўся прарэктар універсітэту па ідэалагічнай працы Цыганкоў. Супрацоўнікі міліцыі склалі ў адносінах да актывіста ЗБС пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні па арт. 172 ч.3 КаАП РБ (распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных дадзеных).

***25 сакавіка*** ў Жодзіне быў затрыманы кіраўнік абласной арганізацыі "Маладога Фронту" ***Павел Красоўскі*** разам з яшчэ трыма маладафронтаўцамі. Нагодай для затрыманьня сталі шэсьць вывешаных у розных раёнах гораду бел-чырвона-белых сьцягоў. У гэтай акцыі абвінавацілі маладых людзей. Праз 5 гадзінаў, праведзеных у аддзяленьні міліцыі, сябры "Маладога Фронту" былі адпушчаныя. Па словах П. Красоўскага, "з гэтай нагоды супрацоўнікі органаў унутраных справаў пагражалі завесьці крымінальную альбо адміністрацыйную справу".

***1 красавіка*** сямёра актывістаў "Зубра" затрыманыя ў Смалявічах за ўдзел у акцыі прадтрымкі палітзьняволеных. Маладыя людзі з партрэтамі былога міністра і дыпламата Міхаіла Марыніча, а таксама лідэраў прадпрымальніцкага руху Валерыя Леванеўскага і Аляксандра Васільева сталі ў шэраг насупраць Смалявіцкага райвыканкаму. Праз некалькі хвілінаў да іх пад'ехалі некалькі аўтамабіляў міліцыі, і ўсе ўдзельнікі акцыі былі зарыманыя і дастаўленыя ў Смалявіцкі РУУС.

***1 красавіка*** ў Гомелі прадстаўнікі незарэгістраванага моладзевага руху "Лімон" хацелі правесьці мітынг у падтрымку палітыкі Аляксандра Лукашэнкі, аднак гарвыканкам ня даў на яго дазволу. Сябра руху ***Сяргей Сямёнаў*** мэту мітынгу патлумачыў так: "Галоўнай мэтаю мітынгу быў збор подпісаў дзеля зьмены ў Гомелі назвы плошчы Леніна на плошчу Аляксандра Лукашэнкі. Планавалі распаўсюдзіць цукеркі са смакам лімону і фотаздымкі першага прэзідэнта з такім тэкстам, што гэта – лекавыя цукеркі і фотаздымкі. Калі ты зьясі гаючую цукерку ці паглядзіш на фотаздымак, цябе будзе адразу задавальняць заробак, кошты на камунальныя паслугі. Таксама мы планавалі выкарыстоўваць транспаранты з такімі тэкстамі: "Прымусовае разьмеркаваньне – гэта мара студэнта", "Чарнобыль-

ская зона – лепшы адпачынак”. Відавочна, што мітынг меў усе атрыбуты першакрасавіцкай імпрэзы, калі ўчыняюцца гумарыны, розыгрышы, жарты. Словам, усё тое, што пасуе Дню сьмеху. Першакрасавіцкая імпрэза “Лімону” ўсё ж адбылася і стала адказам на забарону гарвыканкамам афіцыйна замоўленага мітынгу.

***1 красавіка*** ў Гомелі на тралейбусным прыпынку ўчастковым міліцыянтам Андрэем Піскуновым затрыманы сябра незарэгістраванага маладзевага руху “Лімон” ***Сяргей Сямёнаў*** дзеля “высьвятленьня асобы”. У пастарунку Цэнтральнага р-ну Сяргея Сямёнава трымалі роўна тры гадзіны, правялі дагляд рэчаў. У торбе Сяргея яны знайшлі партрэты Аляксандра Лукашэнкі і цукеркі. Міліцыянты наважаныя былі сканфіскаваць партрэты кіраўніка дзяржавы, але спадар Сямёнаў не аддаў іх.

***2 красавіка*** ў Магілёве быў затрыманы актывіст руху “Зубр” ***Максім Дварэцкі***, які раздаваў улёткі з заклікам вызваліць Міхаіла Марыніча ля ўваходу на цэнтральны рэчавы рынак на гарадзкім стадыёне “Спартак”. Малады чалавек быў дастаўлены ў аддзяленьне міліцыі Ленінскага РУУС, дзе ў адносінах да яго быў складзены пратакол аб адміністрацыйным парушэньні па артыкуле 172 ч. 3 КаАП РБ (распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных дадзеных). Пасьля гэтага М. Дварэцкі быў вызвалены, пратакол накіраваны на разляд адміністрацыйнай камісіі.

***2 красавіка*** актывісты “Маладога Фронту” зладзілі перфоманс каля расейскай амбасады, дзе прысутнічала амаль усё міліцэйскае кіраўніцтва з упраўленьня ўнутраных справаў Цэнтральнага раёну Менску. Юнакі несьлі ў расійскую амбасаду віншаваньне з нагоды гадавіны падпісаньня саюзнай дамовы паміж Беларусьсю і Расеяй і падарунак – торт з надпісам: “Расія + Беларусь = рэвалюцыя”. Віншаваньне хлопцы перадалі сакратару амбасады, які запэўніў маладафронтаўцаў, што перадасьць заяву расейскаму амбасадару. Супрацоўнікі міліцыі прэвентыўна затрымалі некалькі чалавек на падыходзе да амбасады. Падчас затрыманьня торт вываліўся з рук ***Барыса Гарэцкага*** і спачатку патрапіў яму на вопратку, а потым на ногі міліцыянтаў. Гэтым разам міліцыянты прынялі рашэньне адпусьціць хлопцаў без складаньня пратаколаў. Групу маладафронтаўцаў нейкі час суправаджалі міліцыянты ў цывільным, пакуль хлопцы не зайшлі ў грамадзкі транспарт.

У ноч на ***9 красавіка*** ў Магілёве супрацоўнікамі міліцыі затрыманы актывіст руху “Зубр” ***Павел Угрыновіч***, якога абвінавачваюць у напісаньні графіці “Свабоду Марынічу!” на плоце непадалёк ад Беларуска-Расейскага ўнівэрсітэту. Затрыманьне адбылося на процілеглым баку вуліцы. Гэтая акалічнасьць вымусіла міліцыянтаў адпусьціць Паўла, бо доказаў яго датычнасьці да зьяўленьня надпісаў не было. Аднак у “зуброўца” быў адаб-

раны балончык з фарбай. Падчас затрыманьня не было складзена ніякіх працэсуальных актаў, прадугледжаных заканадаўствам. Супрацоўнікі міліцыі катэгарычна адмовіліся паказваць свае пасьведчаньні асобы.

***12 красавіка*** стала вядома, што навучэнцу вучэльні алімпійскага рэзерву ў Плешчаніцах ***Паўлу Каранюхіну*** пагражаюць адлічэньнем з вучобы за сяброўства ў “Маладым Фронце”. Павел Каранюхін гаворыць, што яго сталі часта выклікаць на размову дырэктар вучэльні і яго намесьнік. Яны настойліва прапаноўвалі яму ўстрымацца ад удзелу ў апазіцыйных акцыях. Павел неаднойчы распаўсюджваў улёткі і ўдзельнічаў у шэрагу мерапрыемстваў “Маладога Фронту”. Гэта не перашкаджае яму добра вучыцца і займацца лыжным спортам. Намесьнік дырэктара Юры Ціхан, пра якога гаворыць Павел Каранюхін, месяц таму ўладкаваўся на працу ў вучэльню. Ён патлумачыў сітуацыю наступным чынам: “Кожны, хто ў нас вучыцца, павінен быць патрыётам сваёй радзімы. Патрыёт — гэта той, хто любіць сваю радзіму, каб гэтая радзіма была вядомая  ў сусьветным спорце, і каб ён ня зьбег за мяжу, калі яму рубель больш вялікі дадуць. Перш за ўсё, трэба разабрацца, хто яго на гэта ўсё намовіў, што прэзідэнт кепскі, што ён яго ненавідзіць. Я з ім размаўляў шмат разоў. У яго паняцьцяў ніякіх няма. Ён яшчэ несасьпелы матэрыял. Таму з дзіцем трэба працаваць”. Юры Ціхан запэўніў, што Паўла Каранюхіна за іншадумства ня выключаць з вучэльні. Але які лёс чакае хлопца, стане вядома пасьля чарговай педагагічнай нарады. Сам Павел ня надта спадзяецца, што пытаньне вырашыцца на яго карысьць. Яго бацькі жывуць у Жодзіне. Там ён пазнаёміўся з Алесем Смольскім — сябрам “Маладога фронту”, якога па ідэалагічных меркаваньнях выключылі з сувораўскай вучэльні.

***2 красавіка*** ў Барысаве адміністрацыйная камісія мясцовага гарвыканкаму разгледзела справы непаўнагадовых актывістаў руху “Зубр”, якія былі затрыманыя міліцыянтамі 31 сакавіка за ўдзел у акцыі салідарнасьці з палітзьняволеным Міхаілам Марынічам. У выніку трох чалавек аштрафавалі: ***Аляксандра Малчанава*** пакаралі штрафам памерам 60 тысячаў рублёў, ***Васіля Габрыленку*** – 60 тысячаў рублёў, ***Міхаіла Старавойтава*** — таксама 60 тысячаў рублёў. Чатыром непаўнагадовым актывістам “Зубра” з Барысаву адміністрацыйная камісія вынесла папярэджаньні.

***14 красавіка*** адміністрацыйная камісія Наваполацкага гарвыканкаму разгледзела матэрыялы адміністрацыйнай справы сябра “Задзіночаньня беларускіх студэнтаў” ***Аляксея Трубкіна***, які 25 сакавіка ў Полацкім дзяржаўным універсітэце віншаваў студэнтаў і супрацоўнікаў з Днём Волі, раздаючы ім улёткі. На яго быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні па арт. 172 ч.3 КаАП РБ (распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных дадзеных). На разгляд справы, нягледзячы на тое, што ён насіў адкрыты характар, не былі дапушчаныя прадстаўнікі грамадз-

касьці і прэсы. Пасьля паўгадзіннага разгляду кіраўнік адміністрацыйнай камісіі вынес рашэньне аштрафаваць Аляксея на 102 тысячы рублёў.

***21 красавіка*** студэнты Полацкага дзяржаўнага уўніверсітэту ***Вольга Семенчукова*** і ***Алег Вяжэвіч*** былі затрыманыя за распаўсюд студэнцкага бюлетэню "Макасін" сярод студэнтаў універсітэту. У затрыманьні бралі ўдзел першы прарэктар універсітэту Беларусава і прарэктар па ідэалогіі Цыганкоў. Менавіта яны і выклікалі міліцыю, якая даставіла студэнтаў у аддзяленьне міліцыі, дзе на іх былі складзеныя пратаколы адміністрацыйнага правапарушэньня па арт. 172 ч.3 КаАП РБ – распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных, зьмест якой накіраваны на нанясентьне шкоды канстытуцыйнаму і грамадзкаму ладу, правам і законным інтарэсам грамадзянаў. Разгляд адміністрацыйных матэрыялаў студэнтаў прызначаны ў адміністрацыйнай камісіі Наваполацкага гарвыканкаму: 28 красавіка па справе Алега Вяжэвіча і 12 траўня – па справе Вольгі Семенчуковай.

***21 красавіка*** за распаўсюд недзяржаўных выданьняў у Воршы затрыманы кіраўнік мясцовай Рады моладзевых арганізацыяў ***Ігар Казімірчак***. Моладзевыя актывісты распаўсюджвалі бюлетэнь "Маладога Фронту" — "Моладзь – ЗА" і буклеты "Згуртаваньня беларускіх студэнтаў" паміж навучэнцаў Аршанскага педагагічнага каледжу. Супрацоўнікі педкаледжу спачатку запрасілі І. Казімірчака на гутарку ў службовы кабінет, каб высьветліць больш дакладна, што за выданьні раздаюць навучэнцам. Спадар Казімірчак пагадзіўся, але замест размоваў з ім выкладчыкі адразу патэлефанавалі ў аддзел ідэалогіі гарвыканкаму, дзе ім параілі зьвярнуцца ў міліцыю. Ігар Казімірчак быў дастаўлены ў аддзяленьне міліцыі, дзе на яго склалі пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных.

***22 красавіка*** дзьве актывісткі руху "Зубр" — ***Наталя Ушка*** і ***Алена Капач*** — затрыманыя за распаўсюд незалежнай газеты "Выбар" у сярэдняй школе № 19 г. Менску. Выклікала міліцыю намесьніца дырэктра Людміла Аніфер. Дзяўчаты дастаўленыя ў РУУС Савецкага р-ну.

***22 красавіка*** супрацоўнікі РУУС Ленінскага р-ну Менску затрымалі ***Алу Ковач*** і ***Надзею Носік*** з падазрэньнем на тое, што яны вывесілі бел-чырвона-белы сьцяг на даху будынку насупраць рэзідэнцыі Аляксандра Лукашэнкі. Актывістак моладзевага руху "Зубр" схапілі, калі яны пакідалі дах. Міліцыянты перапісалі ў аддзяленьні міліцыі дадзеныя дзяўчат і адпусьцілі, бо ў іх не было доказаў, што сьцяг вывесілі менавіта яны.

***25 красавіка*** ў судзе Ленінскага раёну Магілёву пачалося судовае слуханьне справы ***Сержука Нягаціна***, каардынатара магілёўскай арганізацыі "Маладога Фронту". Яго абвінавачваюць у распаўсюдзе друкаваных

матэрыялаў без выходных дадзеных, а таксама ў дробным хуліганстве і супраціўленьні міліцыі. Па словах Сержука Нягаціна, 23 красавіка ўвечары ў цэнтры Магілёва з ім адбылася недарэчнасьць – парваўся пакет, з якога пасыпаліся на тратуар каля трох сотняў асобнікаў розных дэмакратычных газетаў. Гэтае здарэньне прыцягнула ўвагу міліцэйскага патруля, які і затрымаў лідэра “Маладога Фронту”. Рашэньне па справе Сержука Нягаціна павінна быць абвешчанае 29 красавіка.

***26 красавіка*** пяцёра маладых людзей былі затрыманыя ўвечары міліцыяй у Гародні. Моладзь раздавала ўлёткі з інфармацыяй аб шкоднасьці радыяцыі і з парадамі — як выводзіць з арганізму радыёнукліды. Маладзёнаў завезьлі ў Ленінскі райаддзел міліцыі, забралі ў іх каля 30 улётак, а потым адпусьцілі.

***26 красавіка***, у дзень чарговай гадавіны Чарнобыльскай катастрофы, некалькі сотняў актывістаў апазіцыі сабраліся ў Менску на рагу праспекту Францыска Скарыны і вуліцы Энгельса з мэтай перадаць петыцыю ў адміністрацыю Аляксандра Лукашэнкі і прайсьці традыцыйным “Чарнобыльскім шляхам”. Улады далі загад разагнаць мірную дэманстрацыю. Усе падыходы да адміністрацыі былі блакаваныя міліцыяй. У прылеглых вуліцах стаялі каля трох дзясяткаў машынаў і аўтобусаў з амапаўцамі і ўнутранымі войскамі. Тым ня меней, некалькі сотняў чалавек здолелі прайсьці да рогу Кастрычніцкай плошчы. Сярод іх былі лідэры АГП, Партыі БНФ, БПС. Прадстаўнік “Маладога Фронту” Зьміцер Дашкевіч агучыў тэкст патрабаваньня да кіраўніцтва краіны і сабраў звароты грамадзянаў, каб перадаць іх у адміністрацыю. Дэлегацыя ўдзельнікаў “Чарнобыльскага шляху” на чале з актывісткай АГП Марынай Багдановіч здолела дамовіцца з міліцыяй і ў суправаджэньні прадстаўнікоў Менскага ГУУС занесьці звароты ў адміністрацыю. Сярод удзельнікаў акцыі вылучалася група актывістаў украінскай моладзевай арганізацыі «Нацыянальны альянс» і расейскіх рухаў «Идущие без Путина», «Оборона», моладзевых фракцыяў СПС і “Яблока”. Украінцы прынесьлі свае транспаранты і сьцягі аранжавага колеру. Яшчэ да пачатку акцыі былі затрыманыя каля Кастрычніцкай плошчы чатырнаццаць грамадзянаў Расіі, як толькі яны выйшлі з метро. Іх завезьлі ў міліцэйскі пастарунак, што на вуліцы Карла Маркса. Міліцыянты перапісалі іх дадзеныя і адпусьцілі. Расейцы адразу пайшлі на месца збору дэманстрантаў. Там літаральна праз некалькі хвілінаў пачалася так званая “зачыстка”. Амапаўцы перш за ўсё хапалі людзей, якія трымалі плакаты і сьцягі. У калоне разам з “Маладым Фронтам” было чацьвёра ўкраінцаў. На плячах яны трымалі жоўта-блакітныя сьцягі. Іх затрымлівалі з асаблівай жорсткасьцю. Адзін сьцяг амапавец сарваў з плячэй і разарваў. У расейцаў адабралі сьцяг арганізацыі “Идущие без Путина”. Каардынатар руху “Идущие без Путина” Максім Пятроў распавёў: “Першы раз нас зьбівалі амапаўцы па нагах. Расейскія студэнты ішлі з расьцяжкай: “За нашу і вашу свабоду”. Амапаўцы выхапілі

наш сьцяг, разарвалі яго і спалілі”. Трох сьвятароў, якія мелі намер узяць удзел у «Чарнобыльскім шляху», амапаўцы завялі ў двор Цэнтральнага ўніверсаму. Там іх трымалі некалькі хвілінаў і адпусьцілі. Сярод затрыманых – актывісты “Маладога Фронту” ***Павел Лісічонак***, ***Зьміцер Дашкевіч***, былы навучэнец сувораўскай вучэльні ***Алесь Смольскі, Сяржук Мурашка*** з Жодзіна, старшыня Менскай абласной арганізацыі Аб’яднанай грамадзянскай партыі ***Марына Багдановіч***, лідэр Партыі Свабоды ***Сяржук Высоцкі***, шмат гімназістаў і школьнікаў. Каля дваццаці чалавек адвезьлі ў Ленінскае ўпраўленьне ўнутраных справаў г. Менску. Яшчэ каля дзясятку затрыманых – у Цэнтральны РУУС. Усяго амапаўцы затрымалі больш за сорак удзельнікаў вулічнай дэманстрацыі. Амаль палова з іх – грамадзяне Расіі, а таксама чацьвёра грамадзянаў Украіны. Як ужо сказана, украінскія і расейскія актывісты былі ў ліку тых, каго міліцыянты затрымлівалі першымі і моцна зьбівалі. затрыманыя ноч правялі ў сьпецпрыёмніку-разь-меркавальніку на вуліцы Акрэсьціна.

***27 красавіка*** стала вядома, што ўсяго сярод арыштаваных 14 грамадзянаў Расіі, 5 – Украіны і 8 – Беларусі. У гэты дзень у Цэнтральным судзе Менску разглядалі справы чатырох грамадзянаў Украіны і дзесяці грамадзянаў Расійскай Федэрацыі. Міліцыянты абвінавачвалі ўсіх у парушэньні грамадзкага парадку падчас правядзеньня вулічнай акцыі. Першым судзілі дэпутата мясцовага Савету Валынскай вобласьці ***Ігара Гузя***, якога пакаралі арыштам на 10 сутак. ***Андрэй Бокач*** павінен правесьці за кратамі 15 сутак. На 10 сутак судзьдзя арыштаваў ***Аляксандра Мафлая***, ***Аляксея Панасюка*** і ***Андрэя Грымалюка***. Украінскі консул Васіль Сэрдэга некалькі гадзінаў намагаўся сустрэцца з затрыманымі грамадзянамі. Яму дазволілі прысутнічаць на судзе. Пасьля судовага паседжаньня ён паведаміў журналістам, што быў вельмі зьдзіўлены, калі пачуў, што вокліч: “Жыве Беларусь!” – парушэньне беларускага заканадаўства. Расейцаў з розных палітычных арганізацыяў “Оборона”, СПС, “Молодое Яблоко” і “Идущие без Путина” пакаралі арыштамі ад 5 да 15 сутак. Сярод арыштаваных расейцаў тры журналісты, якія ня мелі пры сабе акрэдытацыі МЗС Беларусі. Павел Раманаў, якога арыштавалі на 10 сутак, працуе ў “Московском комсомольце”. Аляксей Аметаў з расейскага выданьня “Newsweek” будзе адбываць арышт 15 сутак. Супрацоўнікі міліцыі паведамлялі, што ўсіх затрыманых грамадзянаў Расіі будуць судзіць у Доме правасудзьдзя, дзе месьціцца Ленінскі раённы суд. Туды з раніцы прыйшлі іх паплечнікі. Сярод іх была дэпутат Яраслаўскага муніцыпальнага савету ***Юлія Малышава***. Яна не магла дабіцца ад міліцыянтаў і старшыні суда Любові Жалнерчык адказу на пытаньне: “Калі і хто будзе судзіць грамадзянаў Расіі?” У выніку старшыня суда адказала ёй і сакратару амерыканскай амбасады, што ўсіх пакаралі ўжо арыштамі на першым паверсе будынку і адвезьлі. Але ніхто іх ня бачыў. Юлія Малышава сказала: “Мы абураныя. Абсалютна патаемным чынам судзілі нашых сяброў. Нам нічога не сказалі. Мы ня ведаем, дзе яны знаходзяцца. Судзьдзя выйшла і сказала, што судзілі 14 чалавек.

Колькі з іх расіянаў, мы ня ведаем. Судзьдзя заявіла, што ня будзе даваць ніякай інфармацыі, ніякіх прозьвішчаў.” У Ленінскім судзе судзілі беларускіх грамадзянаў. Актывіст “Маладога Фронту” ***Зьміцер Дашкевіч*** асуджаны на 12 сутак. Намесьніка лідэра “Маладога Фронту” ***Сержука Лісічонка*** арыштавалі на 10 сутак. Старшыню Менскай абласной арганізацыі АГП ***Марыну Баградановіч*** Ленінскі суд пакараў штрафам у 150 базавых велічыняў (гэта каля 2 000 даляраў).

***28 красавіка*** кіраўніцтва расейскай партыі “Яблоко” выказала абурэньне з нагоды пакараньня менскім судом актывістаў моладзевага крыла гэтай партыі, а таксама іншых грамадзянаў Расіі. У прыватнасьці, вось што заявіла прэс-сакратар лідэра “Яблока” Рыгора Яўлінскага Яўгенія Дзілендорф: “Гэта абсалютнае беззаконьне. Людзей абвінавачваюць у злачынствах, якіх яны не ўчынялі. Частку людзей затрымалі на санкцыянаваным мітынгу, прычым яны не парушалі ніякіх парадкаў. Частку людзей, дарэчы, большую, затрымалі наогул пасьля мітынгу. Калі яны не дэманстравалі ніякай палітычнай агітацыі: ні лозунгаў, ні значкоў, нічога. Іх акружыў АМАП, запіхалі ў аўтобус – усё. Пра аблічча цяперашняй беларускай улады ва ўсіх склалася абсалютнае ўражаньне. Затрыманьні нашых “яблычнікаў” зьяўляюцца толькі маленькім, ледзь прыкметным штрыхом, у параўнаньні з тым, што Лукашэнка робіць у Беларусі шмат гадоў”.

***28 красавіка*** адміністрацыйная камісія пры Наваполацкім гарвыканкаме разгледзела справу па факце затрыманьня падчас распаўсюду студэнцкага беларускамоўнага бюлетэню “Макасін” студэнта 2 курсу Полацкага дзяржуніверсітэту ***Алега Вяжэвіча***. Азнаёміўшыся з пратаколам затрыманьня і зьместам канфіскаваных бюлетэняў, адміністрацыйная камісія вынесла пастанову: справу з прычыны адсутнасьці складу правапарушэньня закрыць, а канфіскаваныя міліцыяй асобнікі бюлетэню вярнуць уладальніку. У Наваполацку гэта першы выпадак, калі адміністрацыйная камісія апраўдвае затрыманых за распаўсюд незалежных выданьняў.

***29 красавіка*** амбасадар Расейскай Федэрацыі ў Беларусі ***Аляксандр Блахін*** зьвярнуўся да ўладаў з просьбай пра зьмякчэньне адміністрацыйнага пакараньня. 30 красавіка Менскі гарадзкі суд зьменшыў тэрміны арышту, у другой палове дня маладыя людзі выехалі ў Маскву на цягніку.

Сярод арыштаваных расейцаў былі:

1. ***Аметаў Аляксей*** (журналіст часопісу «Русский Newsweek»);
2. ***Бальшакоў Іван***;
3. ***Гурд Сямён***;
4. ***Вераб’ёва Ірына***;
5. ***Ганчароў Яўген***;
6. ***Елізараў Павел***;
7. ***Зінгер Анатоль***;

8. ***Кабіла Ганна***;
9. ***Пермякоў Міхаіл***;
10. ***Пятроў Максім***;
11. ***Рэзвы Вадзім***;
12. ***Рэзьнікаў Віталь***;
13. ***Раманаў Міхаіл*** (журналіст газеты «Московский комсомолец”);
14. ***Яшын Ільля***.

***30 красавіка*** ўвечары сябры беларускіх моладзевых апазіцыйных рухаў разам з прадстаўнікамі моладзевых арганізацыяў Расіі і Украіны правялі акцыю ля сьценаў сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку на вуліцы Акрэсьціна. Ля брамы сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку сабраліся каля 40 чалавек – прадстаўнікі розных палітычных партыяў і рухаў: “Малады Фронт”, моладзевы рух «Зубр», прыйшоў старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка. Былі і прадстаўнікі расейскіх апазіцыйных партыяў «Идущие без Путина», «Оборона», СПС. Супрацоўнікі міліцыі ніяк не рэагавалі на гэтую акцыю. Людзі запалілі сьвечкі і стаялі моўчкі: такім чынам яны выказвалі салідарнасьць з палітвязьнямі, якія застаюцца за кратамі сьпецпрыёмніку: гэта 4 сябры ўкраінскай партыі «Нацыянальны альянс», 8 чалавек з “Маладога Фронту”, а таксама лідэр Партыі Свабоды Сяржук Высоцкі. Удзельнікі акцыі заклікалі выказаць салідарнасьць з вязьнямі, затрыманымі 26 красавіка падчас Чарнобыльскага шляху. За кратамі засталіся:

1. ***Панасюк Аляксей*** (Украіна) — арышт 9 сутак;
2. ***Лісічонак Сяржук*** (Беларусь) — арышт 10 сутак;
3. ***Гнедчык Алег*** (Беларусь) — арышт 10 сутак;
4. ***Шымановіч Кірыл*** (Беларусь) — арышт 10 сутак;
5. ***Высоцкі Сяржук*** (Беларусь) — арышт 10 сутак;
6. ***Дзядзюшка Мікіта*** (Беларусь) — арышт 10 сутак;
7. ***Бякасаў Анатоль*** (Беларусь) — арышт 10 сутак;
8. ***Гузь Ігар*** (Украіна) — арышт 10 сутак;
9. ***Машлай Аляксандр*** (Украіна) — арышт 10 сутак;
10. ***Грымалюк Андрэй*** (Украіна) — арышт 10 сутак;
11. ***Дашкевіч Зьміцер*** (Беларусь) — арышт 12 сутак;
12. ***Бокач Андрэй*** (Украіна) — арышт 15 сутак.

У ноч на ***1 траўня Сяргей Лісічонак***, які адбывае адміністрацыйны арышт за ўдзел у Чарнобыльскім шляху, быў дастаўлены са сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку ў інфекцыйную бальніцу на вул Крапоткіна. У маладога чалавека павысіўся ціск. З болямі ў нырках і падозраньнем на інфекцыйнае захворваньне яго разьмясьцілі ў асобную палату. Дыягназ павінен быць вызначаны пасьля такога, як будуць вядомыя вынікі аналізаў.

***1 траўня*** ў Гомелі супрацоўнікі міліцыі затрымалі маладых людзей з моладзевага руху «Лімон», якія планавалі правесьці акцыю, каб раздаваць

гараджанам лімонныя цукеркі і партрэты Лукашэнкі са словамі «Соладка ня будзе». Маладых людзей пратрымалі ў аддзяленьні міліцыі Цэнтральнага раёну г. Гомелю 3 гадзіны. Ніякіх пратаколаў складзена не было. Падобная акцыя павінна была адбыцца і ў Менску, але яе каардынатар гамяльчанін ***Сяргей Сямёнаў*** быў затрыманы ў Менску 30 красавіка і дастаўлены ў РУУС Ленінскага раёну, адтуль ў сьпецпрыёмнік-разьмеркавальнік.

***2 траўня*** суд Ленінскага раёну Менску разгледзеў адміністрацыйную справу ***Сяргея Сямёнава***, гомельскага прадстаўніка руху “Лімон”, і вынес рашэньне – 2 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 156 КаАП РБ (хуліганства).

***6 траўня*** са сьпецпрыёмніка-размеркавальніка ў Менску на волю выйшлі 9 палітвязьняў, арыштаваных за ўдзел у акцыі 26 красавіка: чацьвёра грамадзянаў Украіны і пяцёра – Беларусі. Сустракаць зьняволеных ля брамы сьпецпрыёмніку сабралася больш за паўсотні чалавек, сярод якіх — лідэры апазіцыйных партыяў і актывісты моладзевых арганізацыяў. Скончыўся тэрмін пакараньня 10 сутак арышту для лідэра “Нацыянальнага альянсу” ***Ігара Гузя, Аляксандра Мафлая*** і ***Андрэя Грымалюка***. ***Андрэя Бокача*** арыштавалі на 15 сутак, але яго адпусьцілі датэрмінова, каб разам з паплечнікамі дэпартаваць з Беларусі. Напярэдадні з Беларусі дэпартавалі ***Аляксея Панасюка***, якога суд пакараў на 9 сутак арышту. Консул Васіль Сэрдэга на сваім аўтамабілі адвёз хлопца ва Ўкраіну. Нагадаем, што прысуды грамадзянам Украіны Менскі гарадзкі суд пакінуў бяз зьменаў, і яны цакам адбылі вызначаныя судом пакараньні. Усім украінскім грамадзянам пасьля адбыцьця арыштаў у пашпарты паставілі штампы аб забароне ўезду на тэрыторыю Беларусі цягам 5 гадоў і дэпартавалі з краіны. Супрацоўнікі ўкраінскай амбасады на сваім транспарце павезьлі хлопцаў ва Украіну. Калі адчынілася брама сьпецпрыёмніка і адтуль выехаў аўтамабіль амбасады, людзі пабудавалі “жывы калідор” і ўрачыста праводзілі ўкраінскіх грамадзянаў. Апрача украінскіх грамадзянаў на волю выйшлі лідэр незарэгістраванай Партыі Свабоды ***Сяржук Высоцкі***, сябры “Маладога Фронту” ***Кірыл Шымановіч, Анатоль Бекасаў, Алег Гнедчык*** і ***Сяржук Дзядзюшка***. За кратамі сьпецпрыёмніка застаецца актывіст “Маладога Фронту” ***Зьміцер Дашкевіч***.

***6 траўня*** ў Віцебску “маладафронтаўцы” правялі акцыю на знак салідарнасьці з асуджанымі за ўдзел у “Чарнобыльскім шляху”: замацавалі на парэнчах маста імя Блахіна вялікую расьцяжку з заклікам “Свабоду палітвязьням!”. На віцебскіх прадпрыемствах у гэты час скончылася працоўная зьмена, і шмат хто з мінакоў зьвяртаў увагу на транспарант.

***7 траўня*** ўвечары ў цэнтры Магілёву былі затрыманыя 12 актывістаў руху “Зубр”, якія наладзілі пікет, прысьвечаны гадавіне зьнікненьня Юрыя Захаранкі, насупраць будынку абласной управы КДБ. У акцыі брала ўдзел

каля 30 чалавек. Актывісты "Зубра" апранулі на пікет чырвоныя кашулі з белымі крыжамі і выявамі Юрыя Захаранкі, Анатоля Красоўскага, Віктара Ганчара і Дзьмітрыя Завадзкага, а таксама трымалі ў руках партрэты зьніклых. "Зуброўцам" удалося прастаяць літаральна некалькі хвілінаў да ўмяшальніцтва міліцыянтаў. Потым частка ўдзельнікаў несанкцыянаванай акцыі была затрыманая.

***7 траўня*** Басманны суд Масквы разглядаў справы ўдзельнікаў акцыі пратэсту каля амбасады Беларусі ў Расіі. Яе ўдзельнікі патрабавалі вызваленьня арыштаваных у Менску падчас "Чарнобыльскага шляху" грамадзянаў Беларусі і Украіны. Актывіст моладзевага руху "Яблоко" ***Іван Бальшакоў***, які быў сярод арыштаваных у Менску падчас "Чарнобыльскага шляху", за ўдзел у пікеце каля амбасады Беларусі ў Расеі атрымаў 4 сутак арышту. Увечары Такі ж прысуд вынесены сябру "Яблока" ***Ягору Шалаеву***. Яшчэ аднаму ўдзельніку пікету каля беларускай амбасады ў Расеі ***Вадзіму Рэзваму***, сябру руху "Идущие без Путина", суд прысудзіў 4 сутак арышту. Удзельнік акцыі, беспартыйны ***Пётр Карнавухаў***囗аштрафаваны на 1000 расейскіх рублёў. Раней суд вынес пакараньне яшчэ тром удзельнікам акцыі: сябра руху "Оборона" ***Дзьмітрый Кокараў***, сябры "Яблока" ***Сямён Бурд*** і ***Віталь Рэзьнікаў*** атрымалі па 6 сутак арышту. Другая ўдзельніца пікету ***Ірына Вераб'ёва*** (рух "Яблоко") аштрафаваная на 500 расійскіх рублёў. Большасьць асуджаных – удзельнікі "Чарнобыльскага шляху" ў Менску. Зьняволеныя на Пятроўцы, 38 ***Дзьмітрый Кокараў, Сямён Бурд*** і ***Віталь Рэзьнік*** аб'явілі галадоўку.

***10 траўня*** на Кастрычніцкай плошчы Менску адбылася моладзевая акцыя пратэсту супраць перайменаваньня вуліц у сталіцы, у якой узялі ўдзел каля 400 чалавек: прадстаўнікі моладзевай ініцыятывы "Вока", Моладзі БНФ, "Маладога Фронту", навучэнцы Беларускага гуманітарнага ліцэю ды інтэрнэт-супольнасьць. Інфармацыя пра акцыю распаўсюджвалася выключна праз інтэрнэт і тэлефонныя СМС-весткі. Такім чынам атрымаўся адзін з найбольш масавых флэш-мобаў у Менску. А 19-й гадзіне моладзь стала жывым ланцугом на Кастрычніцкім пляцы, пачалі надзяваць бел-чырвона-белыя нарукаўныя павязкі з надпісам "SOS", аднак два ўзводы АМАПу пачалі адціскаць іх углыб пляцу. Калі ўдзельнікі акцыі засьпявалі нацыянальны гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі", АМАПаўцы пачалі выхопліваць з шэрагу актывістаў. Калі іншыя селі на кукішкі, на іх скіраваўся АМАПаўскі аўтобус. Былі затрыманыя Францішак Вячорка, Павал Шавель, Міхась Воўчак, Арцём Цеплякоў, Барыс Гарэцкі і яшчэ двое хлопцаў. Затрыманых (некаторых з ужываньнем сілы) кінулі ў АМАПаўскі аўтобус і адвезьлі іх у Цэнтральны РАУС. Каля 21.15 усе былі адпушчаныя без тлумачэньняў і прабачэньняў.

***12 траўня*** адміністрацыйная камісія Наваполацкага гарвыканкаму разгледзела справу студэнткі Вольгі Семенчуковай, якая 21 красавіка рас-

паўсюджвала ў мясцовым універсітэце незалежны студэнцкі бюлетэнь і была затрыманая работнікамі міліцыі. ***Вольга Семенчукова*** была абвінавачаная ў распаўсюдзе друкаваных выданьняў без выходных зьвестак, пра што быў складзены адпаведны пратакол. Азнаёміўшыся з пратаколам і зьместам бюлетэню “Макасін”, які распаўсюджвала дзяўчына, камісія вынесла пастанову: справу спыніць з прычыны адсутнасьці складу правапарушэньня.

***12 траўня*** Наваполацкі гарадзкі суд мусіў разглядаць скаргу ***Аляксея Трубкіна*** на дзеяньні адміністрацыйнай камісіі Наваполацкага гарвыканкаму. У Дзень Волі спадар Трубкін уручыў сябрам рэктарату Полацкага дзяржуніверсітэту віншавальныя ўлёткі, за што быў аштрафаваны камісіяй на 102 тысячы рублёў. Судовае паседжаньне перанесенае на 18 траўня.

***13 траўня*** ў Жодзіне выключаны з мясцовага палітэхнікуму актывіст “Маладога Фронту” 17-гадовы ***Сяргей Мурашка***, які вучыўся на 2 курсе. 12 траўня, як звычайна, ён прыйшоў на заняткі. Яго запрасіў намесьнік дырэктара па выхаваўчай частцы, які сказаў, што прыйшоў загад на выключэньне Сержука з тэхнікуму за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі 26 красавіка. У той дзень Сяргей Мурашка быў затрыманы ў Менску падчас акцыі “Чарнобыльскі шлях”. Паплечнікі жодзінскага актывіста з мясцовай суполкі “Маладога Фронту” на знак пратэсту супраць выключэньня яго з тэхнікуму правялі акцыю каля Жодзінскага гарвыканкаму. Распавядае лідэр суполкі Павал Красоўскі: “Мы правялі пікет у падтрымку Сержука Мурашкі, якога адлічылі з навучаньня. Таму што ён нармальна вучыцца, але гэтая сістэма ўзяла сваё, і яго адлічылі. На пікет сабраліся каля 15 чалавек. Каля будынку гарвыканкаму мы стаялі з плакатамі: “Смольскі, Мурашка, Чарткоў, Красоўскі і Савіч: хто наступны?”. Гэта ўжо пяты выпадак у Жодзіне, калі выганяюць актывіста нашай арганізацыі. Мы перадалі петыцыю і заяву ў жодзінскі гарвыканкам. У заяве мы патрабавалі аднавіць Сержука Мурашку і спыніць перасьлед жодзінскай актыўнай моладзі. Акцыя адбылася без затрыманьняў. Але былі перапісаныя прозьвішчы ўдзельнікаў. Я мяркую, што гэты перасьлед можа прадоўжыцца”.

***13 траўня*** адміністрацыя жодзінскай сярэдняй школы, дзе вучыцца маладафронтавец ***Алесь Смольскі***, прапанавала яго бацькам перавесьці сына ў іншую школу. Алеся Смольскага затрымалі ў Менску ў часе разгону акцыі 26 красавіка. У школу даслалі адпаведнае паведамленьне з міліцыі. Раней Алеся выключылі з сувораўскай вучэльні за сяброўства ў “Маладым Фронце” і збор подпісаў за перайменаваньне навучальнай установы. Ад перасьледу пацярпелі многія сябры жодзінскай філіі “Маладога Фронту”. З педагагічнага каледжу выключылі ***Паўла Красоўскага***, ***Сержука Савіча*** — з акадэміі ўнутраных справаў, ***Зьміцера Чарткова*** адлічылі з рэжысёрскага аддзяленьня мастацкай акадэміі. Днямі з політэхнічнага

каледжу выключылі ***Сяржука Мурашку***, якога затрымалі на “Чарнобыльскім шэсьці”. Маладафронтаўцы распавялі, што адміністрацыі жодзінскіх школаў правялі апытаньне навучэнцаў. Іх прасілі адказаць: “Што такое патрыятызм і нацыяналізм?”, а таксама: “Ці будзеце вы ўдзельнічаць у несанкцыянаванай апазіцыйнай акцыі?”. Такім чынам улады высьвятлялі, наколькі эфэктыўна адміністрацыя школаў праводзіць ідэалагічную працу. У Гародні адміністрацыя дзяржаўнага ўніверсітэту адлічыла спачатку двух маладафронтаўцаў — ***Алеся Курсевіча*** і ***Яўгена Скрабутана***, а потым яшчэ аднаго, ***Алеся Зарэмбюка***. Усе яны вучыліся на філалагічным факультэце. Алеся Курсевіча і Яўгена Скрабутана затрымалі і судзілі за надпіс: “Спынім русіфікацыю!”. Яўген — непаўнагадовы, і яму ўдалося аднавіцца на вучобе. Ён паведаміў: “Нас з Алесем выключылі з вучобы за графіці. Мне не было 18 гадоў, таму давялося падаваць скаргу ў пракуратуру. А мой сябар вымушаны быў зьехаць на вучобу ў Польшчу. Ён і цяпер там вучыцца”. Алесь Зарэмбюк быў выдатнікам. Праблемы пачаліся пасьля таго, як ён пачаў рэгістравацца на выбарах кандыдатам у дэпутаты Мастоўскага савету. Зарэмбюк распавёў: “Адміністрацыя навучальных установаў, рэктарат — гэтыя людзі працуюць сапраўды паводле загадаў зьверху. Першую сесію я быў выдатнікам. Зьяўляюся сябрам “Маладога Фронту”. Рэгістраваўся кандыдатам як студэнт Гарадзенскага універсітэту. Канкурэнтам гэта было недаспадобы. Прыйшоў ва універсітэт, а мне кажуць, што выключаюць. Афіцыйная папера была, дзе напісана: “За несвоечасовы выход з акадэмічнага адпачынку”. Выключылі мяне абсалютна незаконна. Апроч таго, з парушэньнем закону аб статусе дэпутата мясцовага Савету. Буду падаваць заяву ў суд на незаконнае выключэньне мяне з ліку студэнтаў Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэту”. Актывіст “Маладога Фронту” ***Кірыл Шымановіч*** — навучэнец юрыдычнага каледжу пры БДУ, адседзеў 10 сутак арышту за ўдзел у “Чарнобыльскім шляху”. У выніку адміністрацыя каледжу спрабуе выключыць яго за пропускі заняткаў без уважлівай прычыны. Сябры моладзевага руху “Зубр” ***Мікіта Шуцянкоў*** і ***Ільля Палонскі*** вучацца ў політэхнічнай гімназіі. Іх затрымалі за распаўсюд газеты “Выбар”. Адміністрацыя папярэдзіла іх бацькоў, што вучыцца ў гімназіі хлопцы больш ня будуць. Ім дазволілі давучыцца апошнюю чвэрць. З наступнага году яны мусяць уладкавацца ў іншую школу. Раней з педагагічнага каледжу за апазіцыйную дзейнасьць выключылі ***Максіма Громава***, ***Кацярыну Клімко***, з педуніверсітэту ***Ірыну Тоўсьцік***, з радыётэхнічнага універсітэту ***Рамана Казакевіча***. Цягам шасьці месяцаў з вучобы адлічылі 17 сяброў моладзевага руху “Зубр”. Лідэры моладзевых арганізацыяў лічаць, што ціск на апазіцыйную моладзь з боку адміністрацыяў навучальных установаў яшчэ больш узмоцніцца напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў.

***14 траўня*** — 10-я гадавіна рэферэндуму, у выніку якога беларуская мова пазбавілася статусу адзінадзяржаўнай, а таксама перасталі быць дзяржаўнымі сімваламі бел-чырвона-белы сьцяг і герб “Пагоня”. У ноч на

14 траўня актывісты “Маладога Фронту” вывесілі некалькі дзясяткаў бел-чырвона-белых сьцягоў у знак нязгоды з антыдзяржаўным рэферэндумам па зьмене сімволікі. Нацыянальныя сьцягі былі ўзьняты ў Менску, Віцебску, Берасьці, Гомелі, Магілёве, Гародні, Лідзе, Мастах, Зэльве, Жодзіне, Воршы, Баранавічах, Бабруйску, Смалявічах, Асіповічах, Полацку і Хоцімску. У Менску “Малады Фронт” узьняў сьцягі на ўезьдзе ў горад па маскоўскай шашы, на даху двух будынкаў скрыжаваньня прасьпекту Скарыны і вуліцы Варвашэні, а таксама велізарны нацыянальны штандар быў вывешаны на мосьце праз Сьвіслач. У Віцебску трохметровае палотнішча зьявілася насупраць будынку аблвыканкаму, а ўвесь горад залеплены налепкамі “Горад наш!”

***15 траўня*** на сталічным прасьпекце Францішка Скарыны, які А.Лукашэнка днямі перайменаваў сваім указам, прайшла чарговая мірная акцыя пратэсту супраць зьнявагі гістарычнае памяці беларусаў. Каля пяцідзесяці маладых людзей — прадстаўнікоў моладзевай ініцыятывы “Вока”, “Вольнае моладзі” і Моладзі БНФ — з партрэтамі Францішка Скарыны і ягонай крылатай фразай пра патрыятызм, з кнігамі ў руках прайшлі ад метро “Кастрычніцкая” да пляцу Якуба Коласа. Да моладзі далучаліся іншыя людзі. На шляху іх некалькі разоў затрымлівалі міліцыянты. Захапленьне ўдзельнікаў і шматлікіх сымпатызантаў-гледачоў выклікаў эпізод на пл. Перамогі, калі патрульны міліцыянт стаў чытаць па радыё свайму начальству Скарынаву цытату пад партрэтам: “Понеже от прирожения звери ходящие в пустыни знають ямы своя, птицы ведають гнезды своя, пчолы боронять ульев своих, тако ж и люди игде зродилися и ускормлены суть по Бозе к тому месцу великую ласку имають”. Спытаўшыся, што рабіць, ён атрымаў па рацыі распараджэньне: “Пажадаць удачы”. Аднак, увайшоўшы на тэрыторыю Савецкага РУУС, удзельнікі імправізаванага шэсьця напаткалі больш агрэсіўнае стаўленьне міліцыі. Каля філармоніі быў затрыманы Францішак Вячорка, які ў мантыі, са Скарынавай Бібліяй пад пахай граў ролю першадрукара; пры ўскладаньні кветак да помніку Якубу Коласу затрымалі Аляксея Галаўню, Паўла Мятліцкага, Уладзіміра Бычынава, Васіля Верамейчыка, Зьміцера Шостака, Руслана Сербіна, Арцёма Русаненку. Усіх зьвезьлі ў Савецкі РУУС, адкуль неўзабаве без пратаколаў, тлумачэньняў і прабачэньняў адпусьцілі.

***18 траўня*** ў Наваполацкім гарадзкім судзе адбыўся разгляд скаргі ***Аляксея Трубкіна,*** які быў затрыманы 25 сакавіка за віншаваньне з Днём Волі, на пастанову адміністрацыйнай камісіі аб прыцягненьні да адказнасьці па ч.3 арт.172 КаАП РБ. Судзьдзя А.Федзюкевіч, палічыўшы што на ўлётцы-віншаваньні павінны быць выходныя зьвесткі як на перыядычным выданьні, пакінуў пастанову аб вынясеньні штрафу ў памеры 102 тысячаў рублёў бяз зьменаў.

***19 траўня*** адміністрацыйная камісія Ленінскага раёну Берасьця разглядала справу студэнткі ***Аксаны Цімчанкі*** на падставе складзенага на яе 26 красавіка пратаколу. У гэты дзень у Берасьці адбывалася акцыя "Сьвечка памяці", прысьвечаная гадавіне аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Міліцыянты тады затрымалі Аксану нібыта за распаўсюд улётак, якія былі зробленыя з парушэньнем закону. У прыватнасьці, міліцыянты сьцьвярджалі, што паколькі ўлёткі надрукаваныя ў Смаленску, яны ня могуць распаўсюджвацца ў Беларусі. Паводле рашэньня адміністрацыйнай камісіі, Аксана Цімчанка пакараная штрафам памерам 30 тысячаў рублёў.

***24 траўня*** затрыманыя шэсьць удзельнікаў моладзевага пікету ў абарону захаваньня назвы цэнтральнага праспекту імя Францыска Скарыны ў Менску. Моладзь выйшла на вуліцу з партрэтамі славянскага першадрукара. Сярод затрыманых — ***Франак Вячорка***, які быў на пікеце ў строі, падобным да скарынаўскага. Затрыманыя дастаўленыя ў РУУС Ленінскага раёну.

***25 траўня*** ў знак пратэсту супраць адлічэньняў з навучальных установаў чатыры сябры жодзінскага "Маладога Фронту" абвясьцілі галадоўку. Паводле ***Паўла Красоўскага***, старшыні жодзінскай арганізацыі "Маладога Фронту", за апошні месяц па палітычных прычынах былі адлічаныя: ***Кірыл Шымановіч*** — з юрыдычнага каледжу БДУ, ***Сяржук Мурашка*** — з політэхнічнага каледжу, ***Алесь Смольскі*** — з сувораўскай вучэльні, ***Сяржук Савіч*** — з акадэміі ўнутраных справаў, ***Зьміцер Чарткоў*** — з мастацкай акадэміі. 24 траўня з Плешчаніцкай дзяржаўнай вучэльні алімпійскага рэзерву адлічылі ***Паўла Каранюхіна***. Сябрам МФ ***Наталі Максімавай*** і ***Вользе Галубец***, якія вучацца ў Жодзінскай жаночай гімназіі, пагражаюць тым, што дзяўчаты будуць пазбаўленыя магчымасьці працягваць навучаньне. У знак пратэсту супраць рэпрэсіўных дзеяньняў уладаў Зьміцер Чарткоў, Яўген Валкавец, Аляксандр Вінаградаў і непаўнагадовы Сяржук Мурашка абвясьцілі галадоўку. Яны лічаць гэта адзінай магчымасьцю адстаяць сваё права на навучаньне. Удзельнікі галадоўкі заяўляць, што акцыя скончыцца толькі пасьля прадастаўленьня магчымасьці працягнуць навучаньне Сяржуку Мурашку, а таксама пасьля спыненьня ціску на Наталю Максімаву і Вольгу Галубец. Яны спадзяюцца, што такім чынам ім удасца спыніць рэпрэсіі супраць моладзі, чые палітычныя погляды разыходзяцца з ўладнай палітыкай. Напярэдадні галадоўкі жодзінскія маладафронтаўцы зьвярнуліся ў мясцовы гарвыканкам з патрабаваньнем спыніць рэпрэсіі супраць сваіх адзінадумцаў. Пад зваротам падпісаліся некалькі дзясяткаў маладых людзей. Але ўлады пакуль ніякім чынам не адрэагавалі на заяву. У першы дзень галадоўкі ўдзельнікі акцыі адчуваюць сябе добра, усе чатыры чалавекі знаходзяцца разам, каб падтрымліваць адзін аднаго і сачыць за станам здароўя.

***25 траўня*** ў Магілёве за ўдзел у акцыі 7 траўня з нагоды чарговай гадавіны зьнікненьня былога міністра ўнутраных справаў Беларусі Юрыя Захаранкі пакараныя два актывісты моладзевага руху "Зубр". Згодна з рашэньнем суда, Андрэю Разумкову трэба заплаціць 20 базавых велічыняў штрафу, а Яўгену Сувораву — 25 базавых велічыняў.

***26 траўня*** ў судзе Ленінскага раёну г. Магілёву судзьдзёй Сяргеем Каралёвым пакараны штрафам у памеры 20 базавых велічыняў актывіст руху "Зубр" ***Іван Шаўчэнка*** за ўдзел у акцыі "Ланцуг неабыякавых людзей", якая адбылася 7 траўня.

***27 траўня*** ў Жодзіне павялічылася колькасьць галадоўнікаў. Да ***Зьміцера Чарткова, Аляксандра Вінаградава, Яўгена Валкаўца*** і ***Сержука Мурашкі***, якія трымаюць галадоўку ад 25 траўня, далучыліся ***Павел Каранюхін*** і ***Сяржук Марчык***. Як патлумачыў Павел Каранюхін, да нядаўняга часу ён навучаўся ў спартовай школе алімпійскага рэзерву, што месьціцца ў Лагойскім раёне. Яго ўзялі на навучаньне як перспектыўнага лыжніка. Жодзінскі юнак выступаў на раённых і абласных спаборніцтвах. Аднак, паводле Паўла, як толькі школьнае начальства паінфармавалі пра ягоную сувязь з дэмакратычнай моладзьдзю, юнага лыжніка тут жа прызналі бесьперспектыўным спартоўцам. Гаворыць яшчэ адзін новы ўдзельнік галадоўкі пратэсту Сяржук Марчык: "Я прыехаў з Баранавічаў. Я ўзначальваю ў Баранавічах суполку "Маладога Фронту". Прыехаў для таго, каб падтрымаць сваіх сяброў у Жодзіне ". У Жодзінскім гарвыканкаме пра акцыю моладзевых актывістаў ведаюць. Аднак, паводле кіраўніка ідэалагічнага аддзелу Аксаны Грышкевіч, мясцовыя ўлады ня маюць дачыненьня да іх праблемаў: "Гарвыканкам зробіць усё, што ад яго залежыць. Але паверце мне: гарвыканкам хлопцаў не адлічаў. І нічога не зрабіў дзеля таго, каб іх адлічылі. Адлічвае дырэктар, рэктар і гэтак далей. І ўзнаўляе таксама ён. А тое, што пішацца і друкуецца нашымі страйкоўцамі, — амаль хлусьня".

***30 траўня*** актывіст барысаўскага аддзяленьня руху «Зубр» ***Міхаіл Кандрашоў*** абвесьціў аб далучэньні да галадоўкі жодзінскіх маладафронтаўцаў. ***Зьміцер Чарткоў, Аляксандр Вінаградаў, Яўген Валкавец, Сяржук Мурашка, Павел Каранюхін*** і ***Сяржук Марчык*** трымаюць галадоўку ўжо шосты дзень. Яны пратэстуюць супраць выключэньня студэнтаў з навучальных установаў па палітычных прычынах. Міхаілу Кандрашову гатая праблема вельмі знаёмая. Мінулай восеньню ён сам быў выключаны з Барысаўскай вучэльні № 85 за ўдзел у палітычных акцыях.

***30 траўня*** прадстаўнік "Маладога Фронту" ва Украіне ***Ігар Шчакарэвіч*** абвесьціў галадоўку ў падтрымку патрэбаваньняў жодзінскіх сяброў. Свой учынак ён пракаментаваў так: "Я аб'явіў галадоўку таму, што сітуацыя, у якой апынуліся хлопцы, мне знаёмая, я сам у 2004 годзе падчас парла-

менцкіх выбараў быў адлічаны з Гарадзенскага універсітэту, у мяне пачаліся праблемы з праваахоўнымі органамі, я быў вымушаны выехаць на Украіну. Мая галадоўка – гэта акт салідарнасьці з хлопцамі і спроба зьвярнуць увагу ўкраінскіх уладаў, СМІ на сітуацыю ў Беларусі, якая склалася вакол моладзі, апазіцыйнай моладзі”.

***30 траўня*** прайшла прэсавая канферэнцыя “Маладога Фронту”. Было абвешчана, што да жодзінскіх галадоўнікаў далучыліся яшчэ тры актывісты моладзевай арганізацыі — ***Валеры Мацкевіч, Артур Фінькевіч*** і ***Зьміцер Дашкевіч***. На 1 чэрвеня “Малады Фронт” запланаваў шэраг акцыяў – іх партнёры ў краінах Еўрасаюзу, Украіне і ў Расіі будуць ладзіць пікеты насупраць беларускіх амбасадаў у гэтых краінах. Апрача таго, 1 чэрвеня маладафронтаўцы зьбіраюцца перадаць зварот Аляксандру Лукашэнку і міністру адукацыі Аляксандру Радзькову, патрабуючы спыніць “дзяржаўны тэрор у дачыненьні да апазіцыйнай моладзі”.

***1 чэрвеня*** ўвечары студэнтку журфаку БДУ ***Алену Андрэеву*** выклікаў дэкан факультэту Сяргей Дубовік. Размова тычылася ініцыятывы Алены па зборы подпісаў за аднаўленьне на факультэце журналісткі газеты “Народная воля” ***Вольгі Класкоўскай***. Афіцыйная прычына адлічэньня студэнткі трэцяга курсу Вольгі Класкоўскай – “акадэмічная непасьпяховасьць”. Аднак яе аднакурсьнікі перакананыя, што гэтая “непасьпяховасьць” створаная штучна і зьвязаная з яе працай у незалежнай газеце. Пра гэта студэнты напісалі ў заяве, якую перадалі дэкану факультэту Сяргею Дубовіку. Андрэевай у дэканаце сказалі, што ў сваёй заяве яна ўсё нахлусіла, а за любую хлусьню студэнтаў адлічваюць. Алена Андрэева па-ранейшаму перакананая, што ў дачыненьні да яе сяброўкі Вольгі Класкоўскай ужытыя больш жорсткія карныя захады, чым тыя, якія звычайна практыкуюцца ў выпадках акадэмічнай запазычанасьці: у прыватнасьці, ёй не далі нават магчымасьці пераздаць іспытаў. Аднакурсьнікі Вольгі Класкоўскай патрабуюць спыненьня практыкі перасьледу студэнтаў за іх грамадзкую актыўнасьць і прафесійную дзейнасьць.

***1 чэрвеня*** актывісты “Маладога Фронту” выстраіліся перад уваходам у Міністэрства адукацыі з плакатамі: “Дзеці хочуць вучыцца”. Акрамя маладафронтаўцаў да міністэрства прыйшлі многія вядомыя палітыкі і грамадзкія дзеячы. Сярод іншых – кіраўнік ПЭН-цэнтру ***Лявон Баршчэўскі***, дырэктар зачыненага Беларускага ліцэю ***Уладзімір Колас***, старшыня Партыі БНФ ***Вінцук Вячорка***, старшыня АГП ***Анатоль Лябедзька***. Разам з маладымі палітыкамі яны перадалі кіраўніцтву міністэрства адукацыі ліст, у якім выказваецца пратэст супраць рэпрэсіяў адносна моладзі, што адкрыта выказвае сваю палітычную і грамадзкую пазіцыю. Гэты ліст падпісалі каля трыццаці вядомых у краіне навукоўцаў, літаратараў і грамадзкіх дзеячоў такіх, як Аляксандр Вайтовіч, Ніл Гілевіч, Юры Хашчавацкі і іншыя.

***1 чэрвеня*** ў Жодзіне восьмыя суткі працягваецца галадоўка супраць выключэньня з навучальных установаў дэмакратычнай моладзі. У акцыі, якая пачалася 25 траўня, бяруць удзел шасьцёра юнакоў. Жодзінскіх галадоўнікаў наведалі сябры Рады беларускай інтэлігенцыі Лявон Баршчэўскі, Сяргей Законьнікаў, Георгі Ліхтаровіч, а таксама старшыня Рады Уладзімір Колас: "Уражаньні супярэчлівыя. З аднаго боку, вялікую сімпатыю выклікаюць гэтыя дзеці, гэтыя маладзёны, якія праявілі такую рашучасьць у адстойваньні сваіх правоў і сваіх поглядаў. А з другога боку, вельмі балюча, што дзяржава, улады, якія павінны клапаціцца і па-сапраўднаму дапамагаць моладзі, даводзяць нашых дзяцей да такога стану і да такіх учынкаў. Безумоўна, мы заклікалі іх спыніць гэтую галадоўку. Таму што, з аднаго боку, гэта пратэст, а з другога, напэўна, ня варта дзеля гэтага ахвяраваць здароўем". Паводле словаў лідэра жодзінскай суполкі "Маладога Фронту" Паўла Красоўскага, да галадоўнікаў прыяжджалі і іншыя наведнікі: "Сёньня прыходзілі лекары, якіх прыслаў Жодзінскі гарвыканкам і якія абсьледавалі нашых людзей. Таксама былі прадстаўнікі Праваабарончага цэнтру "Вясна", якія таксама прывозілі з сабой лекара. Гэта быў Андрэй Вітушка, выканаўчы дырэктар "Беларускай асацыяцыі медыкаў", які параіў, як галадаць". Тым часам, пайшоў трэці дзень галадоўкі яшчэ пяцёх актывістаў моладзевага руху, якія далучыліся да акцыі жодзінскіх удзельнікаў 30 траўня. У іх ліку 22-гадовы Валеры Мацкевіч, які трымае галадоўку ў Бабруйску.

***1 чэрвеня*** старшыню віцебскай суполкі "Маладога Фронту" ***Яніса Чучмана*** выклікаў у мясцовы апорны пункт аховы правапарадку ўчастковы міліцыянт Аляксандр Каваленка. Напачатку супрацоўнік міліцыі абвясьціў, што хоча правесьці прафілактычную гутарку з Янісам, але ў пастарунку высьветлілася, што галоўнай мэтаю сустрэчы было складаньне пратаколу. На стале ў супрацоўніка міліцыі Яніс Чучман убачыў ксеракопію артыкула з недзяржаўнай газеты "Витебский курьер", дзе было напісана пра плакат "Свабоду палітвязьням!", вывешаны віцебскімі "маладафронтаўцамі" ў знак падтрымкі пакараных за ўдзел у акцыі "Чарнобыльскі шлях" аднадумцаў. Паколькі ў артыкуле было згадана прозьвішча Чучмана, гэты газетны матэрыял і стаўся галоўным рэчавым доказам ягонае віны. Складаньне пратаколу стала ў Віцебску беспрэцэдэнтным выпадкам: упершыню прадстаўніка моладзевага руху абвінавачваюць у парушэньні заканадаўства паводле газетнага артыкулу.

***3 чэрвеня*** студэнтаў, якія паставілі свае подпісы пад заявай пратэсту супраць выключэньня журналісткі "Народнай волі" ***Вольгі Класкоўскай*** з універсітэту, выклікаў да сябе дэкан Сяргей Дубовік. Як паведаміла ініцыятарка збору подпісаў ***Алена Андрэева***, кіраўніцтва факультэту спрабавала пераканаць студэнтаў, што яна іх "падставіла". Кіраўніцтва журфаку выклікала Алену на размову і заявіла, што яна распаўсюдзіла паклёпніцкія зьвесткі, а не наступны ж дзень дэкан не прыняў у яе заліку па сваім

прадмету "Сацыяльна-палітычная праблематыка СМІ", сказаўшы, што яна "маральна не гатовая" здаваць гэтую дысцыпліну.

***3 чэрвеня*** ў Жодзіне адбылося паседжаньне камісіі па справах непаўнагадовых пры гарвыканкаме. На паседжаньне запрасілі бацьку ***Сяргея Мурашкі***, адлічанага з політэхнікумуа за ўдзел у акцыі "Чарнобыльскі шлях". На паседжаньні камісіі дырэктар політэхнікума паставіў пытаньне аб тым, каб камісія па справах непаўнагадовых дала дазвол на адлічэньне С.Мурашкі з тэхнікума. Сітуацыю каментуе юрыст Валянцін Стэфановіч: "Працэдура адлічэньня з каледжаў прапісаная ў Палажэньні аб прафесійна-тэхнічных навучальных установах, якое зацверджана Пастановай Міністэрства адукацыі ў 2003 г. Паводле пункту 38 дадзенага Палажэньня, непаўнагадовы можа быць адлічаны толькі за сістэматычнае парушэньне Статуту і ўнутранага распарадку навучальнай ўстановы. За гэтыя парушэньні спачатку можа быць вынесеныя вымова, папярэджаньне, а апошні крок – адлічэньне. Калі адлічаюць непаўнагадовага, то гэта магчыма толькі са згоды камісіі па справах непаўнагадовых пры мясцовым гарвыкаме, прычым пры ўмове, што іншыя меры ўзьдзеньня да гэтага не далі плёну. У дадзенай сітуацыі атрымалася, што загад аб адлічэньні Мурашкі быў выдадзены без усялякіх дазволаў Камісіі па справах непаўнагадовых. Спачатку адміністрацыя тэхнікума зрабіла загад аб адлічэньні, а пасьля стала запытвацца дазволу ў камісіі, а не наадварот, як належыць па законе. Гэта ёсьць грубае парушэньне закону. Ня кажучы пра тое, што ў Мурашкі не было дысцыплінарных спагнаньняў на працягу году – яму не выносілі ні вымоваў, ні папярэджаньняў. Акрамя таго, бацькам Сяргея так і не далі азнаёміцца з правіламі ўнутранага распарадку каледжу. Таму невядома, ці ёсьць там пункт аб тым, што навучэнцаў можна адлічаць за ўдзел у несанкцыянаваных масавых акцыях. Гэта вядома толькі са словаў дырэктара. Таму бацькі Мурашкі будуць аспрэчваць загад дырэктара тэхнікуму аб выключэньні ў судзе".

***6 чэрвеня***, на трынаццаты дзень галадоўкі, моладзевыя актывісты ў Жодзіне вырашылі завяршыць акцыю пратэсту. На гэтым настойваюць бацькі і блізкія галадоўнікаў. Таксама вельмі раілі ім спыніць галадоўку фактычна ўсе наведнікі, якія прыяжджалі ў Жодзіна падчас акцыі. Адным з вынікаў акцыі стала тое, што жодзінская моладзь фактычна ўпершыню зьвярнула ўвагу грамадзтва, што супраць удзельнікаў моладзевага дэмакратычнага руху праводзіцца мэтанакіраваная кампанія па выключэньні іх з установаў адукацыі. Толькі ў адным 60-тысячным горадзе Жодзіна сямёра юнакоў былі выкінутыя на вуліцу з такіх установаў. Можна казаць пра дыскрымінацыю ў Беларусі моладзі, якая мае апазіцыйныя настроі.

***7 чэрвеня*** міліцыя затрымала аднаго з удзельнікаў галадоўкі пратэсту ў г. Жодзіне ***Аляксандра Вінаградава***. Па словах аднаго з арганізата-

раў і ўдзельнікаў жодзінскай акцыі пратэсту Паўла Красоўскага, 6 чэрвеня ўдзень яму патэлефанаваў намесьнік начальніка Жодзінскага ГАУС і кіраўнік інсьпекцыі па справах непаўнагадовых сп. Гарошка і запрасіў яго зьявіцца на размову. Красоўскі ў адзьдзяленьне міліцыі не пайшоў. У той жа час на кватэру да іншага ўздельніка акцыі Вінаградава Аляксандра прыйшлі супрацоўнікі крымінальнага вышуку і забралі яго.

***8 чэрвеня*** студэнткі завочнага аддзяленьня журфаку БДУ ***Алена Андрэева*** і ***Ганна Кавалёва*** перадалі рэктару гэтай навучальнай установы Васілю Стражаву і міністру адукацыі Аляксандру Радзькову скаргу на дзеяньні дэкана журфаку Сяргея Дубовіка. Тыдзень таму дэкан адмовіўся прымаць у навучэнак залік на той падставе, што, маўляў, яны “маральна не гатовыя” здаваць прадмет. Самі студэнткі перакананыя, што такім чынам ён адпомсьціў за ініцыяваную імі кампанію збору подпісаў па аднаўленьні на факультэце іх аднакурсьніцы і журналісткі “Народнай волі” Вольгі Класкоўскай. У заяве студэнткі пішуць, што дзеяньні дэкана Сяргея Дубовіка “неправамоцныя, парушаюць правы студэнтаў і пагражаюць стратаю магчымасьці атрымаць вышэйшую адукацыю”. Студэнткі-трэцякурсьніцы Алена Андрэева і Ганна Кавалёва просяць дасканала праверыць усе спрэчныя факты і зрабіць адпаведныя захады да аднаўленьня правоў студэнтаў дзеля атрыманьня вышэйшай адукацыі.

***8 чэрвеня*** ў Сьветлагорску затрыманы актывіст Гомельскага моладзёвага цэнтра “Гарт” ***Сяргей Сямёнаў***. Патрульныя міліцыянты затрымалі яго разам з кіроўцам легкавіка, заявіўшы, што паступіў ананімны званок пра магчымае набыцьцё імі наркотыкаў. Аднак у пастарунку пасьля дагляду намесьнік начальніка райадзелу міліцыі, маёр Зыкун склаў пратакол пра  дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, бо ў сумцы спадара Сямёнава былі налепкі “Трэці шлях”. Міліцыянты канфіскавалі таксама ў актывіста 100 даляраў ЗША і 100 еўра.

***9 чэрвеня*** актывісты моладзевай арганізацыі Партыі БНФ, ініцыятываў “Вока” і “Час” арганізавалі ўвечары ў Менску каля станцыі метро “Акадэмія навук” акцыю супраць перайменаваньня прасьпекту Скарыны. Маладыя хлопцы і дзяўчаты расьцягнуліся ланцугом каля станцыі метро з шыльдамі “прасьпект Францішка Скарыны” ў руках. Некаторыя ўдзельнікі акцыі раздавалі людзям улёткі з інфармацыяй пра перайменаваньне галоўнага менскага прасьпекту, а таксама партрэты беларускага першадрукара. Акцыя працягвалася 15 хвілінаў. Пасьля АМАПаўцы выштурхалі яе ўдзельнікаў на аддаленыя вуліцы гораду ў мікраён Сьляпянка, дзе ўсіх адпусьцілі.

***11 чэрвеня*** ў Гомелі блізу апоўдні пяцёра афіцэраў міліцыі Чыгуначнага райаддзелу ўнутраных справаў пералезьлі цераз высокую агарод-

жу прыватнага дому вядомага ў горадзе палітыка ***Віктара Карніенкі*** і ўварваліся ў дом. Гвалтоўнае ўварваньне капітан міліцыі Прышчэпаў патлумачыў тым, што ў райаддзел нібыта паступіў ананімны сігнал пра гвалт у доме над невядомаю дзяўчынай. Насамрэч у доме ў гэты час прадстаўнікі незарэгістраванага руху "Лімон" за кавай вялі гаворку са сваімі маладымі калегамі з Расіі ды Украіны пра надзённыя моладзевыя праблемы. Міліцыянты спрабавалі зьняць прысутных на відэакамеру, але моладзь перашкодзіла ім гэта зрабіць. Узяўшы тлумачэньне ў актывіста "Лімону" Сяргея Сямёнава, міліцыянты пакінулі прыватны дом. Гвалтоўныя дзеяньні міліцыянтаў спадар Карніенка наважаны абскардзіць у суд і пракуратуру.

***3 ліпеня*** шаснаццаць актывістаў арганізацыі "Моладзевы хрысьціянска-сацыяльны саюз – Маладыя дэмакраты" (моладзевае аддзяленьне Аб'яднанай грамадзянскай партыі) выйшлі апоўдні на менскую вуліцу Сурганава, дзе раздавалі мінакам значкі з выявамі Францішка Скарыны і Пятра Машэрава, а таксама ўлёткі з заклікам супольна выступіць у абарону ранейшых назваў цэнтральных менскіх прасьпектаў і вуліц, перайменаваных згодна з указам Аляксандра Лукашэнкі. Удзельнікі акцыі прайшлі ўсяго некалькі сотняў метраў, як у раёне ўніверсаму "Рыга" іх нагнаў аддзел АМАПу. Міліцыянты атачылі маладых людзей колам, загадалі паказаць дакументы, пасьля чаго пад канвоем павялі да службовага міліцэйскага аўтобуса. Восем удзельнікаў акцыі даставілі ў Савецкую раённую ўправу міліцыі. Там у маладых людзей узялі тлумачэньні, канфіскавалі агітацыйныя матэрыялы і праз тры гадзіны адпусьцілі. Яшчэ адну акцыю пратэсту ў гэты дзень планавалі правесьці на водах Сьвіслачы, у раёне прасьпекту Машэрава, актывісты моладзі Партыі БНФ. Але міліцянты прэвентыўна затрымалі каардынатараў акцыі ***Андрэя Сухаверхага*** і ***Зьмітра Казлоўскага***, у выніку чаго акцыя не адбылася.

***3 ліпеня*** ў Гародні стартавала акцыя моладзевага крыла Аб'яднанай грамадзянскай партыі пад лозунгам: "У кожным абласным цэнтры Беларусі павінна быць вуліца імя Васіля Быкава". Удзельнікі раздавалі гарадзенцам лістоўкі з прапановаю назваць адну з вуліц абласнога цэнтру імем Быкава. У ходзе акцыі гарадзенская міліцыя затрымала семярых актывістаў АГП.

***12 ліпеня*** супрацоўнікі міліцыі Заводзкага раёну Менску затрымалі двух актывістаў моладзевага руху "Зубр". Непаўнагадовы ***Мікіта Шуцянкоў*** і ***Максім Вінярскі*** распаўсюджвалі ля прахадной аўтамабільнага заводу газету "Выбар". Юнакоў даставілі ў дзяжурную частку міліцыі Заводзкага раёну. Міліцыянты атрымалі загад уважліва вывучыць зьмест газеты, каб вызначыцца, паводле якога артыкулу Адміністрацыйнага кодэксу складаць пратакол аб правапарушэньні.

***14 ліпеня*** студэнт факультэту беларускай філалогіі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Францыска Скарыны, актывіст "Зубра" ***Павел Маджара*** выключаны з навучальнай установы за палітычную дзейнасьць. Праблемы ў яго пачаліся яшчэ месяц таму, калі Павел Маджара здаваў летнюю сесію, і яго выклікалі ў ваенкамат. Там яго сустрэў чалавек, які прадставіўся супрацоўнікам КДБ. Ён настойліва прапанаваў Паўлу супрацоўніцтва, абяцаючы дапамогу ў здачы экзаменаў. У выпадку адмовы, супрацоўнік КДБ пагражаў маладому чалавеку сур'ёзнымі праблемамі падчас сесіі. Павел катэгарычна адмовіўся ад супрацоўніцтва. Праз некалькі дзён яго выклікалі да дэкана факультэту, дзе папярэдзілі, што гэтую сесію ён ня здасьць. Першыя два экзамены ён здаў пасьпяхова, але пасьля пачаліся праблемы. Затым быў падпісаны загад пры выключэньне Паўла Маджары.

***19 ліпеня*** ў Магілёве з трэцяга курсу Беларуска-расейскага ўніверсітэту за палітычную дзейнасьць адлічаны актывіст руху "Зубр", студэнт будаўнічага факультэту ***Андрэй Разумкоў.*** Раней яго неаднаразова затрымлівалі падчас правядзеньня вулічных акцыяў пратэсту. Апошні раз гэта адбылося сёлета ў траўні за акцыю ў гадавіну зьнікненьня Юрыя Захаранкі. За ўдзел у гэтай акцыі Андрэй Разумкоў быў пакараны буйным штрафам. Хутчэй за ўсё актывіст «Зубра» быў адлічаны з універсітэту на падставе сумнавядомага загаду міністра адукацыі А.Радзькова "Пра захады дзеля недапушчэньня спробаў уцягваньня навучэнцаў і студэнтаў у супрацьпраўную дзейнасьць палітычнага кшталту", які прадугледжвае адлічэньне студэнтаў з навучальных установаў за ўдзел у акцыях пратэсту.

***19 ліпеня*** ў Магілёве затрымалі двух актывістаў незарэгістраванага руху "Зубр". ***Валадар Цурпанаў*** і ***Максім Дварэцкі*** раздавалі магілёўцам каля Цэнтральнага універмагу газету "Выбар". Міліцыянты іх затрымалі і пратрымалі ў апорным пункце каля трох гадзінаў, склалі пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэньнях: за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак, а на Валадара Цурпанава — яшчэ і за непадпарадкаваньне патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі.

***21 ліпеня*** а 17 гадзіне актывісты "Зубра" выйшлі на плошчу Якуба Коласа Менску. Маладыя людзі разгарнулі расьцяжку "Свабоду палітвязьням!", а таксама партрэты палітзняволеных Міхаіла Марыніча, Сяргея Скрабца, Андрэя Клімава, Валерыя Леванеўскага, Міколы Статкевіча і Паўла Севярынца. Прыкладна праз пяць хвілінаў пасьля пачатку акцыі на актывістаў наляцелі амапаўцы, колькасьць якіх значна перавышала колькасьць удзельнікаў акцыі, і затрымалі амаль усіх. Некаторыя ўдзельнікі акцыі селі на асфальт, каб выказаць пратэст незаконнаму затрыманьню. Супрацоўнікі АМАПу спрабавалі падняць іх, вырывалі з рук партрэты, цягнулі па зямлі. У выніку ўдзельнікаў акцыі ***Ільлю Богдана, Яна Давідовіча,***

***Дар'ю Барабась, Уладзіслава Несьцера, Наталю Ушко, Аляксандра Ушко, Алену Капач*** і ***Аляксандра Курбіцкага*** затрымалі і адвезьлі ў Савецкі РАУС. На Аляксандра Ушко і Аляксандра Курбацкага складзеныя пратаколы па арт. 167-1 КаАП.

***30 ліпеня*** ўвечары ў Гомелі група супрацоўнікаў Чыгуначнага райаддзелу міліцыі і людзей у цывільным уварвалася ў прыватны дом вядомага палітыка ***Віктара Карніенкі*** на вуліцы Палескай. Гаспадара дому ў гэты час не было, а ў двары сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Алесь Карніенка разам з маладымі гомельцамі праводзілі дыскусію на тэму "Праблемы моладзі ў Беларусі". Міліцыянты патлумачылі ўварваньне тым, што атрымалі тэлефонны званок – нібыта ў доме знаходзіцца міна. Ніякага выбуховага прыстасаваньня ні міліцыя, ні дастаўленыя ёю сапёры не знайшлі. Дарэчы, многія зьвярнулі ўвагу, што сапёры вайсковай часткі 5525 прыязджалі без сьпецыяльна вучаных сабак. Замест таго, каб прапанаваць нейкі бясьпечны варыянт эвакуацыі, міліцыянты пад камандаваньнем начальніка Чыгуначнага райаддзелу палкоўніка Некрашэвіча пачалі хапаць прысутных у двары маладых людзей, дзесяцярых з іх адвезьлі ў пастарунак, дзе, як патлумачылі, высьвятлялі іх асобы. Сярод затрыманых былі і непаўнагадовыя. Пакуль у пастарунку ў затрыманых дапытваліся, чаго яны сабраліся ў доме на Палескай, там на другім паверсе ўзламалі дзьверы аднаго з пакояў, нібыта шукабчы міны. Нічога выбухованебясьпечнага не знайшлі, пра што склалі акт. Знайшлі, аднак, тры пакункі кніг Шарамета і Калінкінай "Выпадковы прэзідэнт", выдадзенай ў Расіі. Кнігі цікавілі абласную ўправу КДБ. Яе прадстаўнік старшы аператыўны супрацоўнік Аляксандр Ардаб'еў адмовіўся даць хоць які каментар. Аднак пасьля таго, як быў падпісаны акт пра адсутнасьць у доме выбуховага прыстасаваньня і сапёры пакінулі прыватную сядзібу, пад кіраўніцтвам супрацоўніка КДБ пачаўся другіператрус у доме палітыка. Міліцыянты і сам Ардаб'еў пераглядалі кнігі, газеты, бюлетэні, што знаходзіліся ў доме. Канфіскаваныя былі ня толькі асобнікі "Выпадковага прэзідэнта", але і бюлетэні "Грамадзянскія ініцыятывы", "Тут і цяпер" і некаторыя іншыя.

***30 ліпеня*** ў Барысаве затрыманыя актывісты шэрагу моладзевых арганізацыяў, якія бяруць удзел у традыцыйным футбольным турніры на кубак Незалежнасьці, які праводзіцца пяты год запар. 30 ліпеня ў ім бралі ўдзел каманды з Маладэчна, Магілёву, Менску, Смалявічаў і Барысаву. Міліцыянты праявілі цікавасьць да спартовага мерапрыемства і затрымалі чатырох яго ўдзельнікаў, сяброў "Зубра", "Свабоднай Беларусі" і цэнтру "Волат". Старшыня моладзевага цэнтру "Волат" ***Зьміцер Барадка*** гаворыць: "Яны перад пачаткам турніру ішлі рабіць футбольнае поле, абазначаць разьмётку і несьлі з сабой невялічкія сьцяжкі, якімі абазначаюць так званыя вуглавыя. Сьцяжкі былі бел-чырвона-белага колеру, невялічкія, трымалі яны іх у руках. Праяжджаў міма патруль, спыніўся, затрымалі

іх і недзе гадзінаў пяць трымалі ў райаддзеле міліцыі". На аднаго з затрыманых, сябра цэнтру "Волат" ***Алеся Гігеля*** міліцыянты склалі пратакол.

***8 жніўня*** актывісты "Маладога Фронту" ***Зьміцер Дашкевіч*** і ***Артур Фінькевіч***, затрыманыя за ўдзел у акцыі салідарнасьці з "Саюзам палякаў на Беларусі" каля амбасады Польшчы ў Менску, судом Партызанскага р-ну Менску асуджаныя на 10 сутак арышту.

***15 жніўня*** інтэрнэт-старонка "Маладога Фронту" (www.mfront.net) была заблакаваная. Па меркаваньні сустаршыні "Маладога Фронту" ***Зьміцера Дашкевіча***, акцыя блакаваньня сайту была інсцыявана супрацоўнікамі сьпецслужбаў. Каб гэтыя правакацыі больш не паўтараліся, "Малады Фронт" бліжэйшым часам зьбіраецца вывесіць аўтэнтычную Інтэрнэт-старонку пад іншаю назваю і з дапамогаю іншага хостынгу.

***17 жніўня*** ў Вільні моладзь з дэмакратычных арганізацыяў з Беларусі разам з украінскімі і літоўскімі калегамі зладзілі тэатралізаваную акцыю пратэсту "За свабодную Беларусь". Моладзь з заклеенымі вуснамі і рукамі, зьвязанымі адной вяроўкай, з плакатамі і бел-чырвона-белымі сьцягамі прайшла ад будынку амбасады Беларусі да віленскай Ратушы. Пры будынку Ратушы хлопцы і дзяўчаты разьвязалі рукі – гэта сімвалізавала жаданьне беларускай моладзі зьмяніць існуючую сітуацыю. Каб паказаць, што далей яны маўчаць ня будуць, удзельнікі акцыі адклеілі стужкі з вуснаў і хорам крычалі "Жыве Беларусь!". Акцыю ініцыявала моладзевая арганізацыя «Рух маладых цэнтрыстаў Літвы». Паводле старшыні гэтай арганізацыі, Юліі Лісоўскай, акцыя ладзілася з мэтай зьвярнуць увагу Літвы і Еўрасаюзу на адсутнасьць свабоды ў Беларусі і перасьлед дэмакратычных палітычных сілаў. Гэта таксама праява салідарнасьці моладзі трох краінаў, якія адпачываюць тут у летніку і, паводле іхных словаў, зладзілі акцыю спантанна, падрыхтаваўшы ўсё за некалькі гадзінаў. У амбасаду ўдзельнікі акцыі перадалі дэкларацыю з пратэстамі супраць уціску ўладаў на сем'і актывістаў, зьнікненьня палітыкаў у Беларусі і парушэньняў дэмакратычных прынцыпаў.

***24 жніўня ўдзень*** ў Менску на плошчы Перамогі міліцыянты затрымалі каардынатара руху "Зубр" ***Уладзіміра Кобеца*** і актывістаў грузінскай моладзевай арганізацыі "Кхмара" ***Георгія Кандэлакі*** і ***Луку Цуладзэ***. Людзі, якія праводзілі затрыманьне, назваліся супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Маскоўскага раёну Менску. Адзін з іх назваў і сваё прозьвішча — Калацэй. Затрыманых прывезьлі ў аддзел крымінальнага вышуку Маскоўскага раёну, дзе з імі паасобку размаўлялі супрацоўнікі міліцыі. У Кобеца зьнялі адбіткі пальцаў, зрабілі відэаздымкі; ніякіх абвінавачаньняў не прад'яўлялі, цікавіліся толькі месцам працы. Праз некалькі гадзінаў Уладзіміра Кобеца адпусьцілі, а месца ўтрыманьня гра-

мадзянаў Грузіі засталося невядомым. Тым часам аддзел інфармацыі Менскага ўпраўленьня міліцыі пацьвердзіў затрыманьне двух грамадзянаў Грузіі "ў ходзе аператыўнай адпрацоўкі гатэлю "Зьвязда", дзе яны жылі". Кіраўнік аддзелу інфармацыі сталічнай міліцыі Алег Сьлепчанка заявіў, што падазрэньні міліцыянераў выклікалі дакументы грамадзянаў Грузіі, "у іх былі ці то выпраўленьні, ці то пацёртасьці".

***26 жніўня*** тэма затрыманых у Менску актывістаў грузінскай моладзевай арганізацыі "Кхмара" абмяркоўвалася ў Грузіі. Абвінавачаньні беларускага КДБ, нібыта ***Георгі Кандэлакі*** і ***Лука Цуладзэ*** ўмешваліся ва ўнутраныя справы Беларусі, у Тбілісі называюць абсурднымі. Міністр адукацыі і навукі ўраду Грузіі Каха Лумая асабіста ведае Георгія Кандэлакі і Луку Цуладзэ. Ён кажа, што арышт іх у Менску грузіны ўспрынялі з болем, бо, на думку міністра, тыя ні чым не вінаватыя, і затрыманыя незаконна. Міністр Лумая перакананы, што арышты і дэпартацыі, якія ажыцьцяўляюць беларускія ўлады, сьведчаць пра іхнюю слабасьць. Актывіст руху "Кхмара" Георгі Меладзэ, блізкі сябар Георгія Кандэлакі і Лукі Цуладзэ, зазначыў, што ня верыць заявам беларускага КДБ, паводле якіх ягоныя паплечнікі быццам бы ўмешваліся ва ўнутраныя справы Беларусі, бралі ўдзел у несанкцыянаваных акцыях апазіцыі ці распаўсюжвалі друкаваныя выданьні дэструктыўнага зьместу. Спадар Меладзэ паведаміў, што Лука Цуладзэ — рэжысёр, ён закончыў тэатральны інстытут і цяпер ставіць свае сьпектаклі ў розных грузінскіх тэатрах. А Георгі Кандэлакі атрымаў сьпецыяльнасьць палітолага на філасофскім факультэце ўніверсітэту, цяпер працуе журналістам, піша для розных СМІ Грузіі. Разам з тым, і Цуладзэ, і Кандэлакі сапраўды зьяўляюцца актывістамі "Кхмары", яны бралі ўдзел у рэвалюцыйных падзеях у Грузіі. Міністэрства замежных справаў Грузіі з нагоды затрыманьня ў Менску актывістаў арганізацыі "Кхмара" апублікавала заяву, у якой асудзіла "беспадстаўнае затрыманьне грузінскіх грамадзян беларускім бокам". МЗС Грузіі расцаніў гэтыя дзеяньні як "правакацыйныя" і катэгарычна запатрабаваў "неадкладнага вызваленьня" затрыманых.

***26 жніўня*** адміністрацыя сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку Менгарвыканкаму адмовіла затрыманым актывістам "Кхмары" ў праве на абарону, не дапусьціўшы да іх адваката, і на харчовую перадачу. Супрацоўнікі сьпецпрыёмніку патлумачылі сваю адмову тым, што кіраўніцтва адсутнічае, а самі яны нічога вырашыць ня могуць. У сьпецпрыёмнік прыязджаў прадстаўнік амбасады Грузіі з Кіеву, які паспрабаваў вырашыць пытаньні адносна грузінскіх грамадзянаў, але нічога не атрымалася.

***26 жніўня*** ў Менску арыштаваныя трое з пяці ўдзельнікаў пікету, які ладзілі сябры моладзевага руху "Зубр" на знак салідарнасьці са зьняволенымі грузінскімі партнёрамі з руху "Кхмара". Пікетоўцы на прасьпекце

Скарыны 20 хвілінаў трымалі нацыянальныя грузінскі і беларускі сьцягі і расьцяжку: “Свабоду грузінскім братам!” Калі пад’ехаў аўтобус з АМАПаўцамі, пікетоўцы селі на тратуар. АМАПаўцы зацягнулі іх у аўтобус і адвезьлі ў Ленінскі аддзел міліцыі. Двух непаўнагадовых, склаўшы пратакол за несанкцыянаваны пікет, адпусьцілі, а трох удзельнікаў пікету – ***Аляксея Ляўковіча, Аляксандра Курбіцкага*** і ***Натальлю Ушко*** – павезьлі ў суд, нягледзячы на тое, што працоўны дзень скончыўся. Іх больш за гадзіну трымалі ў аўтобусе, пакуль не прыехала судзьдзя. За дзьве гадзіны судзьдзя Любоў Валевіч разгледзела адміністрацыйныя справы ўдзельнікаў пікету. Аляксея Ляўковіча, Аляксандра Курбіцкага і Наталю Ушко судзьдзя Любоў Валевіч арыштавала на 10 сутак. Сьведкамі ў справе былі супрацоўнікі чацьвёртай роты АМАПу.

***26 жніўня*** ўвечары ў Менску беларуская моладзь выйшла на незвычайны флэш-моб, каб яшчэ раз нагадаць грамадзтву пра праблему перайменаваньня галоўных прасьпектаў ды вуліц сталіцы. Каля дваццаці маладых людзей падзяліліся на тры групы і зрабілі сімвалічны “забег” па прасьпекце Скарыны ад галоўпаштамту да батанічнага саду. Спачатку стартавалі веласіпедысты. Каля васьмі чалавек на веласіпедах пашыхталіся ў адзін шэраг і паехалі па прасьпекту, у людных месцах яны крычалі слоганы ды сьпявалі песьні. Праз некалькі хвілінаў стартавала другая група пад умоўнай назвай “спартоўцы”. Каля дзесяці чалавек зрабілі забег па перайменаванам прасьпекце. А завяршалі флэш-моб прыхільнікі ролікаў. Усе ўдзельнікі былі апранутыя ў майкі з выявай вялікага беларускага дзеяча-асьветніка Ф.Скарыны. Як адзначыў адзін з удзельнікаў, Віталь Дабранач, “з цягам часу неяк мы ўжо звыкліся з новай назвай, ды слова “незалежнасьць” для нас таксама не пустое месца, але факт варварскіх адносінаў да культуры нашай краіны ўражвае!”

***27 жніўня*** стала вядома, што затрыманыя грамадзяне Грузіі ***Георгій Кандэлакі*** і ***Лука Цуладзэ*** не былі дэпартаваныя з Беларусі і дагэтуль утрымліваюцца ў прыёмніку-разьмеркавальніку ГУУС Менгарвыканкаму. Паводле афіцыйнай інфармацыі, рашэньне аб прымусовай дэпартацыі грамадзянаў Грузіі было прынятае КДБ у сувязі “з умяшальніцтвам ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь”. Згодна з версіяй КДБ, “умяшальніцтва” заключалася ў тым, што Георгі Кандэлакі і Лука Цуладзэ падчас свайго знаходжаньня ў Беларусі мелі шэраг сустрэчаў з прадстаўнікамі незарэгістраваных моладзевых арганізацыяў “Зубр”, “Малады Фронт”, “Лімон”, а таксама нібыта ўдзельнічалі ў распаўсюдзе незарэгістраванай друкаванай прадукцыі. Затрыманьне Георгія Кандэлакі і Лукі Цуладзе было санкцыянаванае пракурорам Маскоўскага р-ну г. Менску.

***29 жніўня*** адвакат Павел Сапелка, паўнамоцтвы якога афармленыя ў адпаведнасьці з дзеючым заканадаўствам яшчэ 26 жніўня, у другі раз без-

вынікова наведаў сьпецпрыёмнік-размеркавальнік Менгарвыканкаму з мэтай сустрэчы з затрыманымі грамадзянамі Грузіі ***Георгіем Кандэлакі*** і ***Лукой Цуладзэ***. Ён хацеў азнаёміць сваіх падабаронных са скаргай, складзенай на незаконнае рашэньне беларускіх уладаў, а таксама перадаць падрыхтаваную Праваабарончым цэнтрам "Вясна" харчовую перадачу.

***29 жніўня*** ў судзе Маскоўскага раёну Менску адбыўся суд над грамадзянамі Грузіі ***Георгіем Кандэлакі*** і ***Лукой Цуладзэ*** па арт.156 КаАП РБ — дробнае хуліганства. Згодна з рашэньнем суда, актывісты руху "Кхмара" арыштаваныя на 15 сутак. Суд праходзіў тайна, без удзелу адваката.

***30 жніўня*** ў сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку ГУУС Менгарвыканкаму трэці раз адмовілі беларускім праваабаронцам прыняць перадачы для актывістаў руху "Кмара" з Грузіі ***Георгія Кандэлакі*** і ***Лукі Цуладзэ***. Прычынай адмовы назвалі тое, што ў сьпецпрыёмніку каранцін – дзень завозу бамжоў, і перадачы не прымаюць.

***30 жніўня*** консулу Грузіі ва Украіне Зурабу Квачадзэ дазволілі наведаць менскі сьпецпрыёмнік на вуліцы Акрэсьціна і сустрэцца з актывістамі грузінскай моладзевай арганізацыі "Кхмара" ***Георгіем Кандэлакі*** і ***Лукой Цуладзэ***. Спадар Квачадзэ заявіў, што пасьля гэтай сустрэчы грамадзянам Грузіі "палепшылі ўмовы ўтрыманьня". Паводле яго, цяпер працягваюцца перамовы з афіцыйнымі асобамі Беларусі аб вызваленьні Георгія Кандэлакі і Лукі Цуладзэ і іх ад'езьдзе ў Грузію. Падчас сустрэчы са сваімі суайчыньнікамі Зураб Квачадзэ таксама высьвятляў, што з імі адбылося ў сьпецпрыёмніку (29 жніўня кіраўнік менскай міліцыі генерал Куляшоў заявіў, што ў камеры грузіны нібыта ўчынілі бойку з сукамернікамі, таму і былі асуджаныя на 15 сутак). Амбасадар Грузіі ва Украіне Грыгол Катамадзэ, які сваім загадам накіраваў у Менск консула для аказаньня дапамогі затрыманым грузінскім грамадзянам, пракаментаваў: "Найперш хачу сказаць: вельмі шкадую, што вось ужо амаль тыдзень двое грамадзянаў Грузіі знаходзяцца ў ізалятары ў Менску, і да сёньняшняй раніцы не было магчымасьці сустрэцца з імі ні ў адваката, ні ў прадстаўнікоў нашай амбасады. Перакананы, што зусім на роўным месцы была створана гэтая праблема. Мы прасілі прадстаўнікоў міністэрстваў унутраных і замежных справаў Беларусі перадаць нам грамадзян Грузіі. Мы былі гатовы адразу вывезьці іх у Грузію. Але, на жаль, дагэтуль праблема ня вырашаная". Амбасадар Грыгол Катамадзэ быў зьдзіўлены ўмовамі, у якіх апынуліся ў менскім ізалятары актывісты "Кхмары" Георгій Кандэлакі і Лука Цуладзэ: "Бялізны няма, двойчы спрабавалі перадаць ім ежу — не прымаюць. Хіба гэтак можна? Мы ж у XXI стагодзьдзі жывём, здаецца. Трэба ставіцца да гэтага крыху больш цывілізавана". Спадар амбасадар паведаміў, што Георгі Кандэлакі і

Лука Цуладзэ зьбіраюцца падаць скаргу на прысуд, вынесены ім у Маскоўскім раённым судзе Менску. Паводле зьвестак з менскага ізалятару, раніцай 30 жніўня, на сёмы дзень знаходжаньня ў ізалятары, Георгію Кандэлакі і Луку Цуладзэ дазволілі памыцца ў душы.

***30 жніўня Лалі Кандэлак***і і ***Аціко Мікадзэ***, маці арыштаваных у Беларусі актывістаў грузінскай арганізацыі “Кхмара”, запатрабавалі ад беларускіх уладаў вярнуць іх дзяцей у сем’і. Беларускія праваахоўныя органы ні разу не далі іх сынам патэлефанаваць дадому. Лалі Кандэлакі вельмі хвалюецца і ня можа схаваць сваіх эмоцыяў: “Тое, што яго затрымала міліцыя ў Беларусі, ведаеце, мне так страшна, я думаю, што яго б’юць там, можа быць, яго атручваюць там, праз усё гэта я магу проста страціць розум”, — кажа жанчына. Такая ж напружаная сітуацыя цяпер і ў сям’і Цуладзэ. Маці арыштаваных у Менску грамадзянаў Грузіі сказалі, што сыны ніколі раней не былі ў Беларусі, яны ня вераць, што іхнія сыны маглі ўчыніць у Беларусі нейкае злачынства: гэта маладыя інтэлігентныя людзі.

***1 верасьня*** ўкраінскія грамадзкія арганізацыі і грузінскі дзіцячы харэаграфічны ансамбль, які прыехаў у Кіеў на гастролі, зладзілі каля амбасады Беларусі паўгадзінную акцыю пратэсту “Урок дэмакратыі і культуры”супраць арышту ў Менску ***Георгія Кандэлакі*** і ***Лукі Цуладзэ***. Да пачатку акцыі ахоўваць амбасаду Беларусі прыехалі два “ўазікі” з міліцыянтамі, дзясятак якіх утварылі ланцуг перад будынкам дыпмісіі. Міліцыя ставілася да арганізатараў акцыі прыхільна, адзін з міліцыянтаў на вачах у журналістаў нават падняў з асфальту іпрымацаваў да слупа ўлётку з партрэтам спадара Кандэлакі ды надпісам “Ён журналіст, а не бандыт”. Пасьля таго, як украінскія арганізатары праскандавалі “Свабоду палітвязьням!”, “Свабоду не спыніць”, “Кхмара” і пераклад гэтага слова (“Досыць”), да іх далучыўся дзіцячы калектыў ансамблю “Імэдзі”. Падлеткі ў нацыянальных строях таксама скандавалі “Грузія” і “Сакартвэло”, пасьля чаго пачалі танчыць. “Урок дэмакратыі і культуры” скончыўся спробай перадаць у амбасаду петыцыю з просьбай вызваліць Георгія Кандэлакі, Луку Цуладзэ і трох іх беларускіх аднадумцаў. Аднак з амбасады ніхто ня выйшаў, таму арганізатары акцыі пратэсту паабяцалі даслаць гэты ліст з некалькімі подпісамі наўпрост у Менск Аляксандру Лукашэнку.

***2 верасьня*** Менскі гарадзкі суд адмяніў рашэньне Маскоўскага раённага суда, паводле якога грамадзяне Грузіі ***Георгій Кандэлакі*** і ***Лука Цуладзэ*** асуджаныя да 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Паводле супрацоўніцы канцылярыі суда, справа Георгія Кандэлакі і Лукі Цуладзэ адпраўленая на перагляд, суд пастанавіў вызваліць іх з-пад арышту. Паводле консула Грузіі ва Украіне Зураба Квачадзэ, які адмыслова прыехаў у Менск для дапамогі сваім суайчыньнікам, Георгій Кандэлакі і Лука Цуладзэ вызваленыя з гарадзкога ізалятару на Акрэсьціна і знаходзяцца разам з ім.

***2 верасьня*** адбылося першае азнаямляльнае паседжаньне па факце неправамернага адлічэньня ***Сяргея Мурашкі*** з Жодзінскага політэхнікуму, у якім прынялі ўдзел судзьдзя Жодзінскага суда А.Паплёўка, заяляльнік Сяргей Мурашка, ягоны адвакат Павел Сапелка і адказчык – дырэктар Жодзінскага політэхнікуму П.Талерчык. Праваабаронцу Аляксея Лапіцкага і бацьку заяўніка Аляксея Мурашку не запрашалі і не заслухвалі, бо судзьдзя Ала Паплёўка абвесьціла, што будзе праводзіць толькі перадсудовае паседжаньне, збор дадатковых матэрыялаў і дакументаў для высьвятленьня прадмету спрэчкі і довадаў абодвух бакоў. На паседжаньні бакі выклалі ўласныя пазіцыі, прадставілі довады, заявілі хадайніцтвы.

***5 верасьня*** са сьпецпрымальніку-разьмеркавальніку на волю выйшлі трое актывістаў моладзевага руху “Зубр”. Яны адседзелі 10 сутак за пікет на знак салідарнасьці з арыштаванымі грузінскімі партнёрамі Георгіем Кандэлакі і Лукой Цуладзэ. Каля двух дзясяткаў сяброў моладзевага руху “Зубр”, якія ўвесь гэты час клапаціліся аб арыштаваных, перадавалі ім прэсу і прадукты, сустрэлі з кветкамі і шампанскім ***Наталю Ушко, Аляксея Ляўковіча*** і ***Аляксандра Курбіцкага***.

***6 верасьня*** на прэсавай канферэнцыі ў кіеўскай штаб-кватэры агенцтва УНІАН старшыня Камітэту па справах абароны і бясьпекі парламенту Грузіі Гіві Таргамадзэ назваў апошнія падзеі вакол двух грузінскіх грамадзянаў у Менску “аперацыяй вызваленьня”. Спадар Таргамадзэ заявіў, што гэтая тэма гучала і падчас нядаўняга саміту СНД у Казані, нават прадстаўнікі авіякампаніі “Украінскія міжземнаморскія авіялініі” пайшлі на беспрэцэдэтны крок – на паўтары гадзіны затрымалі рэйс самалёту, каб хлопцы пасьпелі сесьці на яго, бо іх далейшае знаходжаньне ў Менску было зьвязанае з небясьпекай новай правакацыі. ***Георгій Кандэлакі*** сказаў, што па-ранейшаму будзе падтрымліваць кантакты з беларускімі сябрамі ды прыедзе ў Менск “пры першай мажлівасьці”, бо ў ягоным пашпарце штампу пра забарону на ўезд няма. ***Лука Цуладзэ*** гэтак ацаніў сітуацыю ў Беларусі: “Усе, усе баяцца. Абстаноўка робіцца больш напружанай, але па-мойму, там усё скончыцца добра. Мы так спадзяемся”. “Грузія ня мае намеру ўмешвацца ва ўнутраныя справы Беларусі, але мы не дазволім незаконных дзеяньняў у міждзяржаўных адносінах і адносна нашых грамадзянаў, мы будзем абараняць нашых грамадзянаў ва ўсім сьвеце, асабліва калі яны не вінаватыя”, – пра гэта заявіў прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі на сустрэчы з актывістамі моладзевага руху “Кхмара” Лукай Цуладзэ і Георгіем Кандэлакі. Прэзідэнт Грузіі падзякаваў за вызваленьне Цуладзэ і Кандэлакі грузінскаму міністэрству замежных справаў, грузінскай амбасадзе ва Украіне і ўкраінскім дыпламатам.

***10 верасьня*** актывіст барысаўскага аддзяленьня руху “Зубр” ***Алесь Гігель*** атрымаў адказ на сваю скаргу на незаконныя дзеяньні міліцыі.

Алесь і яшчэ трое актывістаў "Зубра" былі затрыманыя міліцыяй 31 ліпеня падчас правядзеньня ў Барысаве рэспубліканскага турніру сярод дваровых камандаў "Кубак Незалежнасьці". Супрацоўнікі міліцыі затрымалі маладых людзей за тое, што яны несьлі да месца правядзеньня турніру бела-чырвона-белыя сьцяжкі для абазначэньня вуглавых і абвінавацілі ў несанкцыянаваным шэсьці. У адказе на скаргу, якая прыйшла з Барысаўскага РУУС, гаворыцца, што дзеяньні міліцыі прызнаныя часткова неправамоцнымі, і дзеяньні старэйшага лейтенанта ППС В. Беразінскага будуць разгледжаныя судом гонару малодшага каманднага саставу міліцыі.

***14 верасьня*** Жодзінскі суд пачаў разгляд скаргі актывіста "Маладога Фронту" ***Сяргея Мурашкі*** на выключэньне яго з Жодзінскага політэхнікуму. Разглядае скаргу судзьдзя Ала Паплёўка. Як высьветлілася на судовым паседжаньні, Сяржук Мурашка меў добрыя адзнакі. За гэта ён атрымліваў у політэхнікуме павышаную стыпендыю. Паколькі выкладчыкі політэхнікуму быццам бы ня памяталі падрабязнасьцяў, зьвязаных з выключэньнем Мурашкі, судзьдзя папрасіла іх даць дадатковыя матэрыялы, а таксама выклікаць у якасьці сьведкаў шэраг навучэнцаў тэхнікуму, якія вучыліся разам з Мурашкам.

***16 верасьня*** ў Магілёве затрыманыя два актывісты руху "Зубр". ***Яўген Суводаў*** і ***Уладзіслаў Бародка*** раздавалі мінакам улёткі з інфармацыяй аб зьнікненьнях грамадзкіх дзеячоў у Беларусі, а таксама з інфармацыяй аб палітвязьнях. Маладыя людзі дастаўленыя ў РУУС Ленінскага р-ну Магілёва.

***19 верасьня*** ў Барысаве актывісты моладзевых рухаў правялі акцыю ў абарону свабоды слова. Яны пратэставалі супраць перасьледу гарадзкімі ўладамі мясцовых незалежных выданьняў. Акцыя прайшла на цэнтральнай плошчы Барысава. Тут сабралася каля паўсотні актывістаў моладзевых рухаў. Паводле мясцовага актывіста руху "Зубр" ***Міхася Кандрашова***, яны зладзілі флэш-моб: "Нам пачалі навязваць газеты, якія падпарадкаваныя нашай уладзе. Яны друкуюць тое, што патрэбна ўладзе, а ня тое, што ёсьць насамрэч. Мы газету "Адзінства" дэманстратыўна выкідалі ў сьметніцу". Недзяржаўныя выданьні — "Барысаўскія навіны" і "Кур'ер з Барысаву" — насамрэч сёлета апынуліся ў складанай сітуацыі. Вядомы барысаўскі журналіст Магілін так пракаментаваў сітуацыю: "У горадзе была ўнікальная сітуацыя з незалежнымі выданьнямі. Іх агульны наклад у 8 разоў перавышаў наклад выканкамаўскай газеты. Безумоўна, такое становішча не магло задаволіць улады".

***19 верасьня*** Жодзінскі гарадзкі суд стаў на бок адміністрацыі політэхнікуму, якая адлічыла актывіста "Маладога Фронту" ***Сержука Мурашку***.

Як вынікае з рашэньня судзьдзі Алы Паплёўкі, кіраўніцтва політэхнікуму адлічыла Сержука без парушэньня заканадаўства. Дырэктар політэхнікуму Пётр Талерчык і група выкладчыкаў даводзілі на судзе, што выключылі хлопца за парушэньне правілаў унутранага распарадку навучальнай установы. Маўляў, яму неаднаразова абвяшчаліся вымовы за пропускі заняткаў і канфлікты з педагогамі. Што тычыцца добрай пасьпяховасьці, за якую жодзінскі юнак атрымліваў павышаную стыпендыю, то кіраўнікі тэхнікуму пры яго адлічэньні гэтага паказьніка ня бралі пад увагу. Бацька Сержука Аляксей Мурашка расчараваны вынікам судовага разгляду скаргі сына: “Сорамна весьці змаганьне з дзецьмі”. Адвакат Павел Сапелка, які абараняў на судзе інтарэсы Сержука Мурашкі, лічыць, што жодзінскі актывіст моладзевага дэмакратычнага руху адлічаны незаконна: “Згода камісіі па справах непаўналетніх, якая патрабуецца ў дадзеным выпадку, была атрыманая ўжо пасьля адлічэньня. Інакш кажучы, толькі паводле адной гэтай падставы фармальна можна лічыць выключэньне незаконным. Гэта па-першае. Па-другое, паводле закону, можна адлічыць толькі за сістэматычныя парушэньні”. Сяржук Мурашка зьбіраецца абскардзіць рашэньне ў Менскім абласным судзе.

***22 верасьня*** ў Варшаве адбылося адразу некалькі акцыяў у падтрымку дэмакратыі, правоў чалавека і свабоды слова ў Беларусі. Адна з іх – спроба ўручыць петыцыю ў беларускую амбасаду, другая – пікет у цэнтры польскай сталіцы. У будынку беларукай амбасады выйсьці да адмысловага ўпаўнаважанага мэра Варшавы па справах жанчын і сям’і Яны Клюзік-Расткоўскай ніхто з беларускіх дыпламатаў не пажадаў, а пасьля пэўнага часу голас ў дамафоне параіў пакінуць зварот у паштовай скрынцы. Амаль адначасова ў цэнтры Варшавы адбылася акцыя “Факсам у рэжым”, арганізаваная моладзевым крылом уплывовай партыі “Закон і справядлівасьць”. Каля трох дзесяткаў яе ўдзельнікаў раздавалі мінакам аркушы паперы з заклікам спыніць перасьлед апазіцыі і вольных медыяў і нумарамі факсаў беларускіх чыноўнікаў і заклікалі высылаць іх у Беларусь. У абедзьвюх акцыях з нацыянальнымі сьцягамі ўзялі ўдзел і беларусы са «Зьвязу на карысьць дэмакратыі ў Беларусі».

***22 верасьня*** стала вядома, што міліцыя актыўна шукае арганізатараў выбуху ў Віцебску, падчас якога пацярпелі людзі. Затрыманыя 5 падазраваных, у лік якіх трапілі і маладыя актывісты апазіцыі. Праводзячы ў іх дома ператрусы, прадстаўнікі аддзелаў па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю напачатку пыталіся пра выбуховыя рэчывы, але забіралі з сабою ўлёткі, партыйныя дакументы ды бел-чырвона-белыя сьцягі. На думку моладзевых актывістаў, сілавыя структуры выкарыстоўваюць складаную сітуацыю ў горадзе, каб перадусім аказаць на іх маральны ціск. Ператрусы ў моладзевых апазіцыйных актывістаў распачаліся ноччу: а палове на другую чацьвёра міліцыянтаў зьявіліся да 22-гадовай студэнткі

***Алены Стук*** з “Маладога Фронту”. Дзяўчына ўражаная тым, што яе падазраюць у злачынстве, у выніку якога ў шпіталях апынуліся калі 4-х дзясяткаў чалавек: “Сказалі мне зброю здаць! Я што, самая небясьпечная тэрарыстка тут – нажы сталовыя толькі і ёсьць у доме! Гэта праўда. Яны і ў шафах глядзелі, і пад ложкам глядзелі. Паказалі пастанову, што мяне трэба абшукаць – і наперад!” Нічога не знайшоўшы, міліцыянты сышлі. А зранку стала вядома пра новыяператрусы. Кіраўніка тутэйшай моладзевай філіі АГП ***Дзяніса Дзянісава*** на той час дома не было, аднак міліцыянты патлумачылі ягоным бацькам, што шукаюць арганізатараў выбуху 22-га верасьня ці датычныя да гэтых падзеяў доказы. Аднак, паводле іхнага аповяду, большую частку часу міліцыянты правялі ў сынавым пакоі і, не знайшоўшы нічога больш падазронага, забралі з сабою дыскі з палітычнымі мультфільмамі, дакументы, якія Дзяніс прывозіў з семінараў у Польшчы і Украіне, а таксама аркушы з подпісамі за наданьне імя Васіля Быкава адной з вуліц гораду. Прыблізна па такім самым сцэнары праходзіўператрус і ў кватэры кіраўніка “Маладога Фронту” ***Віктара Шляхціна***: “Яны прад’явілі мне пастанову, дзе было напісана, што 22-га адбыўся выбух, і ў мяне могуць быць рэчы, здабытыя злачынным шляхам, а таксама якія маюць адносіны да гэтае справы. Яны паглядзелі тое-сёе ў кампутары, а калі потым заўважылі скрыню са старымі ўлёткамі Шчукіна ды Севярынца, то ўсё астатняе іх перастала цікавіць,і яны заняліся толькі гэтым. Некуды патэлефанавалі, параіліся, а потым забралі ўлёткі, дзьве кніжкі і два бел-чырвона-белых сьцягі”. Наступныператрус адбыўся ў ***Сьцяпана Цішуціна***, сябра моладзевай суполкі “Седьмая грань”. Выбуховых прыстасаваньняў там не знайшлі, але калі ў кватэру Цішуціных паспрабавалі ўвайсьці праваабаронца Валеры Шчукін і сябар БХК Павел Левінаў, прысутныя там міліцыянты загадалі ім зараз жа пакінуць памяшканьне, паабяцаўшы за непадпарадкаваньне выклікаць на дапамогу АМАП.

***25 верасьня*** ў Барысаве падчас распаўсюду раскладу беларускіх перадачаў навіновага тэлеканалу Euronews быў затрыманы 19-гадовы актывіст грамадзкай ініцыятывы “За чысты Барысаў!” ***Андрэй Маласай***, навучэнец Барысаўскага прафесійнага экалагічнага ліцэю. У хлопца канфіскавалі 330 улётак. А.Маласай быў дастаўлены ў ГАУС, дзе ў яго былі ўзятыя паказаньні, зьнятыя адбіткі пальцаў, зроблены відэазапіс. На наступны дзень справу А.Маласая разглядала адміністрацыя навучальнай установы. Падчас разгляду хлопцу недвухсэнсоўна далі зразумець, што ён можа быць выключаны з ліцэю.

***27 верасьня*** стала вядома, што ў 17-гадовага школьніка ***Андрэя Ушэнкі*** і 24-гадовага рабочага-будаўніка ***Уладзіслава Анішчанкі*** з Віцебску былі праведзеныя вобыскі ў межах расьследаваньня фактаў выбухаў. Але міліцыянты, якія прыходзілі да іх, цікавіліся ня столькі выбуховымі рэчы-

вамі, колькі распытвалі пра структуры і дзейнасьць "Зубра". Такім чынам, усяго за апошнія дні адбылося 6 ператрусаў у віцебскім моладзевым апазіцыйным асародзьдзі. Таксама супрацоўнікі Чыгуначнага райаддзелу правялі асабісты дагляд сяброў КХП БНФ Уладзіміра Плешчанкі ды Аляксандра Салаўяна, затрыманых на вуліцы. Спадару Плешчанку было загадана чакаць выкліку на адміністрацыйную камісію, бо ў ягонай сумцы знайшлі ўлёткі.

***1 кастрычніка*** дэлегат Кангрэсу дэмсілаў ад "Маладога Фронту" ***Сяржук Марчык*** вымушаны быў вярнуцца ў Баранавічы. Супрацоўнікі міліцыі патэлефанавалі маці лідэра баранавіцкай філіі "Маладога фронту" і паведамілі, што, калі Сяржук ня прыйдзе ў аддзел міліцыі, каб там адзначыцца, то яго выключаць з навучальнай установы, а бацьку хлопца звольняць з працы. Маці хлопца, плачучы, папрасіла яго не рызыкаваць.

***8 кастрычніка*** актывісты руху "Зубр" вывесілі над Барысавам нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг над адной з найвышэйшых вежаў гораду побач з гарадзкім рынкам. Тысячы барысаўчан бачылі, як бел-чырвона-белае палотнішча лунае над іх горадам.

***10 кастрычніка*** каардынатара руху "Зубр" ***Мікіту Сасіма***, затрыманага 7 кастрычніка, судзьдзя Аляксей Бычко суда Цэнтральнага раёну Менску пакараў арыштам на трое сутак. Мікіта Сасім з даху дому ля будынку КДБ скінуў пачак улётак з заклікам далучыцца да акцыі 16 кастрычніка. Калі ён спусьціўся з даху па пажарнай лесьвіцы, яго затрымаў супрацоўнік КДБ, пасьля чаго на хлопца спачатку склалі пратакол за антысанітарыю — менавіта так міліцыянты расцанілі раскіданьне ўлётак. Але пасьля гэтага Мікіту абвінавацілі ў дробным хуліганстве. З пратаколу вынікала, што хлопец нецэнзурна лаяўся і не рэагаваў на заўвагі супрацоўнікаў міліцыі. Тры дні Сасім правёў у сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку на Акрэсьціна. З улікам таго, што хлопец іх ужо фактычна адседзеў, з суда Мікіту адпусьцілі. Вярнуўшыся за сваімі рэчамі ў Цэнтральны РУУС, Мікіта Сасім зноў быў затрыманы і адвезены ў Баранавіцкі ваенкамат, дзе пад роспіс атрымаў позву, згодна з якой павінен зьявіцца на наступны дзень на медагляд.

***11 кастрычніка*** моладзевы актывіст ***Мікіта Сасім*** прад'явіў у Баранавіцкім ваенкамаце медыцынскія даведкі аб тым, што 16 верасьня ён атрымаў траўму чэрапу з сатрасеньнем мозгу, пасьля чаго яму былі выпісаныя накіраваньні на далейшае абсьледаваньне. На днях актывіст-зубровец атрымаў адмову ва ўзбуджэньні крымінальнай справы па факце ягонага зьбіцьця АМАПаўцам падчас акцыі.

***11 кастрычніка*** ў Менску затрыманыя за распаўсюд улётак з заклі-

кам да ўдзелу ў Дні салідарнасьці з ахвярамі рэжыму ***Максім Вінярскі*** і ***Яўген Алелькаў***. Яны скінулі некалькі сотняў ўлётак з даху высотнага дому каля Камароўскага рынку, пасьля чаго былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі. Хлопцаў даставілі ў апорны пункт аховы правапарадку № 96, дзе склалі пратаколы за парушэньне арт. 143 КаАП (антысанітарыя). У гэты ж час сьпецыяльна выкліканы нарад міліцыі зьбіраў улёткі, якія не пасьпелі падабраць мінакі.

***12 кастрычніка*** стала вядома, што лідэру Гарадзенскай арганізацыі "Маладога Фронту" ***Яўгену Скрабутану*** пагражаюць выключэньнем з універсітэту. Падставай для гэтага сталі правакацыйныя ўлёткі, распаўсюджаныя ў навучальнай установе ад імя "Маладога Фронту". Яўген Скрабутан, студэнт 3 курсу беларускай філалогіі Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэту быў выкліканы да прарэктара па навучальнай працы Тацяны Бадзюковай. Яна паказала хлопцу ўлётку, на якой быў малюнак чалавека ў масцы з рагаткай і надпісам: "Не дазволім запляміць гонар і славу нацыі". На ўлётцы таксама зьмешчаны нумар мабільнага тэлефону, якім, па словах прарэктаркі, карыстаўся Я. Скрабутан. "Гэта брудная правакацыя, – кажа маладафронтавец. - Пазначаны нумар быў зарэгістраваны на імя маёй аднакурсьніцы, якая аддала мне SIM-карту. Аднак я даўно яе згубіў і цяпер у мяне абсалютна іншы нумар. Я ня маю ніякага дачыненьня да гэтай улёткі". Т. Бадзюкова абвінавацiла студэнта ў распаўсюдзе маладафронтаўскіх улётак, "здрадзе дзяржаўнай моладзевай палітыцы" і ў "тэрарызме". Яна паабяцала выключыць з універсітэту Скрабутана і ягоных аднакурсьнікаў, якія зьвязаныя з Маладым Фронтам.

***14 кастрычніка*** ў Берасьці адбыўся напад на памяшканьне, у якім месьціцца Фонд падтрымкі моладзевых ініцыятываў "Дзедзіч". Супрацоўнікі Маскоўскага РАУС Берасьця пагрукалі ў дзьверы офісу "Дзедзіча" ў 17 гадзінаў, але ім не адчынілі. Пакінуўшы "вонкавае назіраньне" (як высьветлілася потым), яны сышлі. Недзе праз гадзіну, калі кіраўнік арганізацыі ***Зьміцер Шыманскі*** ўжо зьбіраўся зачыняць офіс, у дзьверы пагрукалі зноў. Зьміцер выйшаў да міліцыянтаў і зачыніў за сабой дзьверы офісу, але намесьнік начальніка Маскоўскага РАУС капітан Мікалай Сямёнаў паведаміў, што на пульт дзяжурнага "02" паступіла інфармацыя аб тым, што ў офісе "Дзедзіча" адбываецца бойка і чутныя крыкі. Ён загадаў адкрыць памяшканьне для правядзеньня дагляду. Зьміцер Шыманскі адмовіўся адчыняць дзьверы з-за адсутнасьці ў міліцыянтаў санкцыі пракурора на правядзеньне агляду памяшканьня. Пасьля гэтага міліцыянты гвалтам забралі ключы ў старшыні Фонду. Увайшоўшы ў памяшканьне "Дзедзіча", міліцыянты праявілі цікаўнасьць да знойдзеных друкаваных матэрыялаў: бюлетэняў "Дзедзіч" і "Навіны БНФ", а таксама да ўлётак "Ці будзе ў Беларусі рэвалюцыя". Разам з тым, супрацоўнікі міліцыі забаранілі карыстацца мабільнай сувязьзю, правялі асабісты дагляд прысутных у памяшканьні,

абшукаўшы ў тым ліку і кішэні. Міліцыянты выказалі падазрэньне, што пры выпуску бюлетэню "Дзедзіч" і ўлётак дапушчана парушэньне заканадаўства. Таму супрацоўнікі міліцыі запрасілі панятых і пачалі складаць акт выняцьця друкаванай прадукцыі. Затым актывістаў "Дзедзіча" даставілі ў Маскоўскі РАУС, дзе сп. Шыманскі даў тлумачэньні адносна знойдзенай у офісе друкаванай прадукцыі. У прыватнасьці, ён заявіў, што бюлетэнь "Дзедзіч" выдаецца з 2000 г. у поўнай адпаведнасьці з заканадаўствам, а зьмест іншых друкаваных матэрыялаў не парушае заканадаўства. Нікога, апроч старшыні арганізацыі сп.Шыманскага, міліцыянты не апытвалі.

***15 кастрычніка*** ў розных краінах сьвету адбыліся дабрачынныя маршы ў падтрымку дэмакратыі ў Беларусі. Арганізатарам выступае рух "Студэнты за дэмакратыю ва ўсім сьвеце". Гэтая акцыя прымеркаваная да гадавіны рэферэндуму па ўнясеньні зьменаў у Канстытуцыю Беларусі, якія зьнялі абмежаваньні адносна колькасьці прэзідэнцкіх тэрмінаў. Студэнты арганізоўваюць 12-ці кіламетровыя маршы па парках і вуліцах – па адным кіламетры за кожны год знаходжаньня Аляксандра Лукашэнкі ва ўладзе. Мэта акцыі – інфармаваць студэнтаў пра дзеяньні рэжыму Лукашэнкі і сабраць сродкі на падтрымку дэмакратычных моладзевых рухаў, як "Зубр" і "Трэці шлях". Як паведаміў прэзідэнт арганізацыі, студэнт факультэту гісторыі і паліталогіі універсітэту Індыяны Чарлі Шром, ініцыятыву падтрымалі шэсьць універсітэтаў са штатаў Каліфорнія, Мічыган, Індыяна, Масачусэц і Вашынгтон і яшчэ шэсьць замежных аддзяленьняў арганізацыі.

***21 кастрычніка*** валожынская міліцыя затрымала каля трох дзясяткаў прадстаўнікоў моладзевых арганізацыяў, якія ехалі трыма мікрааўтобусамі ў Гародню, каб узяць удзел у Моладзевым форуме. Паводле аднаго з затрыманых — ***Васіля Лепеша***, ДАІ спыніла тры мікрааўтобусы непадалёк ад Валожыну каля 9-й раніцы. Затрыманыя правялі ў мясцовым райаддзеле міліцыі каля чатырох гадзінаў. Васіль Лепеш пераказвае афіцыйную прычыну затрыманьня: "Прычына была такая, што праводзіцца сьпецмерапрыемства ў сувязі з нядаўнімі выбухамі ў Віцебску. І ёсьць такая інфармацыя, што на гэтай трасе будзе нешта адбывацца, зьвязанае з віцебскімі падзеямі. І каб перастрахавацца, нібыта, нас вырашылі затрымаць і праверыць". У выніку затрыманьня групы ўдзельнікаў пад Валожынам Моладзевы форум у Гародні быў сарваны. Тлумачыць арганізатар мерапрыемства ***Сьвятлана Каралёва***: "Зразумела, што гэта яшчэ адзін паказьнік таго, як складана арганізоўваць працэсы ў Рэспубліцы Беларусь. Форум будзе перанесены, бо задача форуму — кансалідацыя моладзевых арганізацыяў. А таксама пошук эфэктыўнага шляху ўзаемадзеяньня і працы ў Беларусі". Сьвятлана Каралёва ўзначальвае Нацыянальную раду моладзевых і дзіцячых арганізацыяў.

***21 кастрычніка*** на гарадзкой плошчы ў Бабруйску праходзіў рок-кан-

цэрт "Рок за баброў". На канцэрт у падтрымку піва "Баброў" сабралася каля двух тысячаў бабруйчанаў. Пасьля адной з прамоваў вядучага – лідэра гурта "N.R.M" ***Лявона Вольскага***, які зазначыў, што ў будучым годзе спадзяецца правесьці законны канцэрт у Бабруйску свайго забароненага гурту, моладзь пачала скандаваць "Жыве Беларусь!", а затым над натоўпам залунаў бел-чырвона-белы сьцяг, які разгарнулі два маладафронтаўцы ***Дзяніс Буйніцкі*** і ***Сяржук Лацінскі***. Сьцяг выклікаў імгненную рэакцыю магілёўскага АМАПу, супрацоўнікі якога затрымалі маладафронтаўцаў і пацягнулі ў машыну. У Першамайскім РАУС ў Дзяніса Буйніцкага знайшлі маладафронтаўскія буклеты, якія адразу былі канфіскаваныя кіраўніком мясцовага КДБ. На маладафронтаўцаў былі складзеныя пратаколы па артыкуле 156 КаАП — хуліганства. Праз гадзіну пасьля першага інцыдэнту на плошчы адбылася ідэнтычная акцыя з удзелам сямі маладафронтаўцаў, чатыры з якіх былі затрыманыя. Хлопцаў даставілі ў бліжэйшы пункт аховы правапарадку, але праз тры гадзіны адпусьцілі. Суд над Дзянісам Буйніцкім і Сяржуком Лацінскім прызначаны на 24 кастрычніка.

***22 кастрычніка*** ў Мазыры міліцыя затрымала актывістаў моладзевай арганізацыі АГП, моладзевага цэнтру "Гарт", а таксама грамадзянку Францыі ***Сафі Вазьняк*** і грамадзяніна Польшчы ***Міхала Папіну***. Моладзевыя актывісты праводзілі спачатку ў Гомелі, а затым у Мазыры інфармацыйныя сустрэчы, на якіх распавядалася пра Еўрасаюз. Сустрэча ў Мазыры праходзіла ў прыватным доме, але была спыненая дзясяткам афіцэраў міліцыі, якія шукалі ў памяшканьнях зброю. Зброі яны не знайшлі, але праверылі дакументы і затрымалі замежнікаў, а таксама тых беларусаў, што ня мелі пашпартоў. Спадарыня Вазьняк паведаміла, што пасьля допыту ёй і яе польскаму калегу пашпарты не вярнулі: міліцыя сказала, што павязе іх на вакзал і праз Менск дэпартуе ў Польшчу. Сафі Вазьняк зьдзіўленая такім рашэньнем беларускай міліцыі, паколькі ўсе дакументы ў яе ў парадку, і ніякіх парушэньняў у Беларусі яна не зрабіла. Спадарыня Вазьняк зьяўляецца валанцёркаю Варшаўскага цэнтру міжнародных адносінаў, спадар Папіна – Ніжнясьлёнскага Цэнтру стратэгічных дасьледаваньняў.

***24 кастрычніка*** ў Бабруйскім ІЧУ адбыўся закрыты адміністрацыйны працэс. Судзьдзю па адміністрацыйных справах Тацяну Тарабуеву выклікалі ў ізалятар, дзе яна судзіла маладафронтаўцаў ***Дзяніса Буйніцкага*** і ***Сяргея Лацінскага***. Згодна з рашэньнем судзьдзі, маладафронтаўцы пакараныя арыштам на 2 сутак. Закрыты адміністрацыйны працэс – яшчэ адно вынаходніцтва сучаснай беларускай судовай сістэмы. Паводле арт. 229 КаАП, "справа па адміністрацыйным правапарушэньні разглядаецца адкрыта. У мэтах павышэньня выхаваўчай і папераджальнай ролі вытворчасьці па справах па адміністрацыйных правапарушэньнях такія справы могуць разглядацца непасрэдна ў працоўных калектывах, па месцы

вучобы альбо жыхарства правапарушальніка”. Нідзе ў Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэньнях ня сказана, што адміністрацыйныя справы могуць разглядацца ў ізалятары часовага ўтрыманьня без допуску прадстаўнікоў грамадзкасьці.

***25 кастрычніка*** на перасячэньні праспекту Незалежнасьці і вуліцы Казлова ў Менску затрыманыя сябры “Моладзі БНФ” ***Павел Батуеў*** і ***Алесь Мазанік*** за распаўсюд чарговага нумару незалежнай газеты “Народная воля”. Супрацоўнікі міліцыі даставілі затрыманых у РУУС Цэнтральнага раёну сталіцы. “Затрыманьне за распаўсюд “Народнай волі” – незаконнае, — каментуе падзею юрыст Валянцін Стэфановіч. – Гэтае выданьне афіцыйна зарэгістраванае ў Рэспубліцы Беларусь, адпаведна, яно можа распаўсюджвацца, у тым ліку і бясплатна. Затрыманыя маладыя людзі ніякім чынам не парушылі дзеючага заканадаўства. Хутчэй за ўсё, перад супрацоўнікамі міліцыі пастаўленая задача любымі шляхамі спыніць распаўсюд незалежнай газеты”.

***26 кастрычніка*** ў Гародні міліцыянты затрымалі студэнта універсітэту імя Янкі Купалы ***Яўгена Скрабутана***. У гарадзенскім універсітэце ў той дзень праходзіла канферэнцыя, прысьвечаная студэнцкаму самакіраваньню. Студэнт 3-га курсу беларускай філалогіі Яўген Скрабутан таксама прысутнічаў на ёй. Ахову ў памяшканьні ажыцьцяўлялі студэнты старэйшых курсаў. Паводле Яўгена, адзін з іх падышоў да яго падчас мерапрыемства і сфатаграфаваў проста ў твар, а потым перадаў здымак міліцыянтам. Канферэнцыя закончылася, і калі Яўген Скрабутан выходзіў з залы, яго чакалі міліцыянты і хлопцы з універсітэцкай аховы, якія сьцьвярджалі, што ён распаўсюджваў улёткі. Яўгена забралі ў Ленінскі РАУС, дзе пратрымалі прыблізна дзьве гадзіны. На стале ў сьледчага ляжаў стосік улётак, у якіх было напісана пра тое, што з універсітэту выганяюць студэнтаў. Хлопец сказаў міліцыянтам, што ня мае да гэтага дачыненьня.

***2 лістапада*** моладзь у Магілёве правяла акцыю у падтрымку незалежнай газеты “Народная воля”. Некалькі дзясяткаў актывістаў руху “Зубр” і іншых дэмакратычных моладзевых арганізацый прыйшлі на прыпынак грамадзкага транспарту насупраць будынку Магілёўскага гарвыканкаму з нумарамі “Народнай волі”. Тут яны разгарнулі газеты і пачалі іх чытаць. Акцыя салідарнасьці з “Народнай воляй” не абышлася без міліцыянтаў, якія, аднак, не перашкаджалі яе ўдзельнікам.

***2 лістапада Павел Батуеў***, затрыманы за распаўсюд газеты “Народная воля”, абскардзіў дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі ў пракуратуры. Батуеў Павел сумесна з Алесем Мазанікам 25 кастрычніка на скрыжаваньні пр. Незалежнасьці і пр. Машэрава ў Менску бясплатна распаўсюджваў газету “Народная воля”. Да яго падышлі супрацоўнікі міліцыі, якія, не прад-

ставіўшыся, загадалі прайсьці ў службовую машыну і прасьледаваць у Цэнтральны РУУС. Прычынаў і падставаў затрыманьня яны не растлумачылі. У Цэнтральным РУУС старшы інсьпектар маёр міліцыі Г.Камера сканфіскаваў у распаўсюдніка шэсьцьсот дваццаць сем асобнікаў газеты “Народная воля”, пра што быў складзены пратакол выняцьця. Супрацоўнікі міліцыі ўзялі з Паўла Батуева пісьмовыя тлумачэньні, а таксама хацелі падвергнуць дактэласкапіі і відэаздымкам, ад чаго затрыманы адмовіўся. У скарзе ў пракуратуру П. Батуеў указаў: “Лічу, што дзеяньні спрацоўнікаў міліцыі, якія выразіліся ў маім незаконным затрыманьні, канфіскацыі газет насілі незаконны характар, парушалі мае законныя правы і інтарэсы. Газета “Народная воля” зьяўляецца афіцыйна зарэгістраваным у Рэспубліцы Беларусь выданьнем, адпаведна я меў поўнае права яго бясплатна распаўсюджваць”. П. Батуеў запатрабаваў правесьці пракурорскую праверку і прыцягнуць вінаватых у парушэньні ягоных правоў да вызначанай законам адказнасьці.

***5 лістапада*** у Гомелі былі затрыманыя актывісты «Зубра» ***Павел Мадшара*** і ***Андрэй Голышаў***. Затрыманьне праводзілі супрацоўнікі крымінальнага вышуку. «Зубрам» сказалі, што іх падазраюць ва «ўчыненьня забойства і крадзяжы. Маладых людзей даставілі ў Цэнтральны РУУС, дзе падверглі асабістаму дагляду і праз дзьве гадзіны адпусьцілі.

***8 лістапада*** ўвечары ў раёне Савецкага пляцу Магілёву былі затрыманыя сябра руху “Зубр” Уладзіслаў Бародка і сябра АГП ***Дзяніс Залуцкі***. Затрыманьнем кіраваў старшына міліцыі Руслан Савіцкі. Маладыя людзі займаліся распаўсюдам газеты “16”. Пасьля таго, як затрыманых даставілі ў апорны пункт АП-1 Ленінскага раёну, у іх былі канфіскаваныя каля 400 асобнікаў выданьня, налепкі, прысьвечаныя “Дню салідарнасьці” і значкі “Люблю Беларусь”. Пасьля складаньня пратаколу выняцьця рэчаў затрыманыя былі вызваленыя.

***9 лістапада*** студэнты Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэту, сябры “Маладога Фронту” былі выкліканыя на размову ў дэканат. Размова з імі тычылася распаўсюду сярод студэнтаў інфармацыі пра прыезд у Баранавічы адзінага кандыдата ад апазіцыі А.Мілінкевіча. Кіраўнік баранавіцкага “Маладога Фронту” ***Сяргей Марчык*** распавёў: “Да мяне падышла выкладчыца і папрасіла зайсьці ў дэканат. Я адразу зразумеў, з-за чаго мяне выклікаюць. У кабінеце дэкана мяне чакала прарэктар па выхаваўчай працы. Яна адразу пачала з пытаньняў: “Дзеля чаго я раздаваў газеты? Адкуль я ўзяў такую іх колькасьць? Хто яшчэ з універсітэту займаўся распаўсюдам такой літаратуры? Хто і колькі нам за гэта плаціць?” Пасьля да прарэктара далучылася дэкан нашага факультэту. Уся нашая размова (каля 45 хвілінаў) суправаджалася пагрозамі: маўляў, хутка сесія, і я разам з маімі сябрамі, якія таксама займаліся распаўсюдам газет,аў можам

нават і не спадзявацца, што здадзім іспыты. Акрамя таго, яны пагражалі вялікімі цяжкасьцямі на працы ў нашых бацькоў".

***12 лістапада*** ў кватэры Вадзіма Богдана, аднаго з грамадзкіх актывістаў г.Сьветлагорску на Гомельшчыне, праведзены вобыск. Сам гаспадар у гэты дзень у горадзе адсутнічаў. Паводле інфармацыі, якую ён атрымаў ад бацькоў, супрацоўнікі міліцыі (разам з якімі, магчыма, быў супрацоўнік КДБ) прад'явілі ордэр і заявілі, што нібыта прычынай ператрусу зьяўляецца інфармацыя пра наркотыкі. У ордэры замест імя "Вадзім" было ўказана імя "Уладзімір". Шукалі друкаваныя матэрыялы і памнажальную тэхніку. Канфіскавалі інфармацыйныя бюлетэні "16" (аб акцыі "Дзень салідарнасьці"), налепкі на гэтую ж тэму, іншыя друкаваныя матэрыялы, а таксама каля 30 асобнікаў газеты "Рэгіянальныя навіны".

У ноч ***з 12 на 13 лістапад***а ў Магілёве на мосьце праз раку Днепр, які злучае мікраараёны Юбілейны і Кірава, пры расклейцы ўлётак з выявай лічбы "16" былі затрыманыя актывісты руху "Зубр" ***Яўген Сувораў*** і ***Андрэй Баскораў,*** якія былі дастаўленыя ў Кастрычніцкі РАУС, дзе на іх склалі пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні па арт. 143 КаАП (антысанітарыя).

***13 лістапада*** на Цэнтральным рынку ў Гародні быў затрыманы ***Уладзімір Леванеўскі***, сын лідэра гарадзенскіх прадпрымальнікаў Валерыя Леванеўскага. У сына Леванеўскага быў канфіскаваны бюлетэнь "Прадпрымальнік", пратакол ня быў складзены.

***15 лістапада*** ў Гомелі затрыманыя ***Павел Мадшара*** і ***Руслана Глазкова*** затрымалі за распаўсюд інфармацыі пра Дзень салідарнасьці. Затрыманьне ажыцьцяўляў асабіста начальнік 3-га аддзяленьня Чыгуначнага РУУС г. Гомелю – Хадосаў. Актывісты "Зубра" былі дастаўленыя ў міліцыю, быццам бы для "высьвятленьня асобы", там іх абшукалі і адпусьцілі без складаньня пратаколаў. Пры гэтым супрацоўніцкі міліцыі лаяліся матам і абражалі затрыманых.

***15 лістапада Вадзім Богдан*** – актывіст моладзевага руху ў Сьветлагорску (Гомельская вобласьць) – быў выкліканы ў мясцовы аддзел міліцыі ў другі раз для дачы паказаньняў па выніках дагляду ягонай кватэры. Дагляд быў праведзены міліцыяй "з мэтаю пошуку наркотыкаў", але ў выніку дагляду былі канфіскаваныя друкаваныя выданьні. Зраніцы 15 лістапада сьледчы вырашыў правесьці паўторны дагляд кватэры "для пошуку самагону". Калі са сьледчым пагутарыў прадстаўнік БХК А. Яўсеянка, а каля дому Вадзіма сабраліся для назіраньня актывісты мясцовых грамадзкіх арганізацыяў, міліцыя адмовілася ад гэтага намеру. Пасьля гэтага ў міліцыі пабываў супрацоўнік мясцовага аддзяленьня КДБ, які

абмеркаваў з міліцэйскім сьледчым матэрыялы па справе Вадзіма. Па словах Вадзіма, тры супрацоўнікі міліцыі, якія працавалі з ім у другой палове дня, дзейнічалі карэктна, псіхалагічны ціск больш не ўжываўся. У выніку паказаньняў Вадзіма міліцыя кваліфікавала яго дзеяньні як перавозку незарэгістраванай друкаванай прадукцыі – бюлетэняў “16”.

***16 лістапада*** адміністрацыя Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэту адмяніла правядзеньне “круглага стала” на тэму “Моладзевая палітыка ў Рэспубліцы Беларусь”. З ініцыятывай яго правядзеньня выступіў мясцовы Моладзевы цэнтр “Спадчына”. Чакалася, што ў гэтым мерапрыемстве возьмуць удзел прадстаўнікі выканаўчай і заканадаўчай улады розных узроўняў, якія абмяркуюць з лідэрамі і актывістамі трэцяга сектару пытаньні ўзаемадзеяньня паміж НДА і дзяржструктурамі. У апошні момант адміністрацыя ўніверсітэту паведаміла арганізатарам “круглага стала”, што “прарвала трубу”, таму спатканьне няма дзе правесьці.

***16-17 лістапада*** перад візітам Лукашэнкі ў Магілёў было затрымана каля 30 актывсітаў незарэгістраванага руху “Зубр” ды іншых апазіцыйных арганізацыяў (амаль ўсе, хто праходзіў хаця б адзін раз па адміністрацыйных справах). ***Андрэя Палуду*** і ***Яўгена Суворава*** затрымалі 16 лістапада ўвечары, калі яны разам з аднадумцамі вярталіся дахаты. Аўтамабіль “Форд” пры выезьдзе з Магілёву быў спынены супрацоўнікам аўтаінсьпекцыі. Маладыя людзі сьцьвярджаюць, што інсьпектар заўважыў на заднім шкле аўтамабілю налепку “Пагоні”. Зуброўцаў абвінавацілі ў тым, што яны нібыта абражалі міліцыянтаў, адмовіліся выконваць іхнія патрабаваньні. ***Андрэя Палуду*** і ***Яўгена Суворава*** павезьлі ў ізалятар часовага ўтрыманьня. 17 лістапада ***Валадар Цурпанаў*** быў затрыманы ва ўласнай кватэры і дастаўлены ў Кастрычніцкі РАУС “для прафілактычнай размовы”. Прадстаўніку затрыманага Барысу Бухелю супрацоўнікі міліцыі не дазволілі на ёй прысутнічаць. Па заканчэньні трох гадзінаў “размовы” В.Цурпанаў ня быў вызвалены. Б.Бухелю было паведамлена, што ён дапытваецца ў якасьці сьведкі. В. Цурпанаў утрымліваўся ў Кастычніцкім РАУСе больш за 5 гадзінаў. Усе арышты ў Магілёве былі абсалютна беспадстаўнымі, маладых людзей забіралі з кватэраў, дастаўлялі ў Кастрыніцкі РУУС г. Магілёву і задавалі пытаньні пра рух “Зубр” ды іншыя апазіцыйныя арганізацыі, пратаколы затрыманьня пры гэтым не складаліся. У міліцыянераў былі сьпісы апазіцыянераў, згодна з якімі праводзіліся затрыманьні.

***17 лістапада*** ў пераходзе метро “Плошча Якуба Коласа” старшынёй міліцыі Касьпяровічам быў затрыманы актывіст Моладзі БНФ ***МакарВаўчок***, які распаўсюджваў газету “Народная воля” і дастаўлены ў Савецкі РУУС Менску.

***21 лістапада*** ў Магілёве пачаліся суды над актывістамі моладзевага


Праваабарончы Цэнтр «ВЯСНА»

руху “Зубр” ***Андрэем Палудам*** і ***Яўгенам Суворавым***, якіх міліцыя затрымала ў Дзень салідарнасьці і абвінавачвае ў дробным хуліганстве. Міліцыянты заявілі, што зуброўцы ўжывалі нецэнзурныя словы, выказвалі незадавальненьне дзеяньнямі міліцыянтаў. Паводле сьведчаньня двух супрацоўнікаў абласной аўтаінсьпекцыі, калі яны спынілі аўтамабіль Андрэя Палуды, сам кіроўца і Яўген Сувораў не адрэагавалі на іхнія патрабаваньні і сталі лаяцца. Сьведкамі на судах выступалі толькі два супрацоўнікі аўтаінсьпекцыі. Тыя, хто складаў пратакол, на суды не прыйшлі, як патлумачыла судзьдзя, “з прычыны сямейных абставінаў”. Адсутнасьць асноўных сьведкаў стала падставай для пераносу судовых паседжаньняў.

***23 лістапада*** судзьдзя Ленінскага суда г. Магілёву Каралёў вынес рашэньне аб пакараньні актывіста руху “Зубр” ***Андрэя Палуды*** штрафам у памеры адной базавай адзінкі.

***23 лістапада*** ў Менску супрацоўнікі міліцыі Фрунзенскага раёну затрымалі каардынатара руху “Зубр” ***Яўгена Афнагеля*** разам з кіроўцам аўтамабіля, у якім ён ехаў. Яўгена Афнагеля дзьве гадзіны трымалі ў аддзеле грамадзкай бясьпекі РУУС. Міліцыянты знайшлі ў яго налепкі з лагатыпам акцыі Дзень салідарнасьці. Супрацоўнікі міліцыі ўзялі з Я. Афнагеля пісьмовае тлумачэньне і адпусьцілі без складаньня пратаколаў.

***24 лістапада Тацяне Хома***, студэнтцы факультэту міжнародных эканамічных адносінаў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага унівэрсітэту, прарэктар С.В. Шаўрук паведаміў, што яе выключаюць з унівэрсітэту. Афіцыйнай прычынай выключэньня адміністрацыя называе тое, што Тацяна прапусьціла 3 дні заняткаў без дазволу дэканату для ўдзелу ў Зьезьдзе Саюзу нацыянальных студэнцкіх аб’яднаньняў Эўропы (ESIB) – буйнейшай еўрапейскай студэнцкай арганізацыі, якая займаецца абаронай правоў і інтарэсаў студэнтаў у Еўропе. На зьезьдзе ESIB адбываліся выбары новага кіраўніцтва, і Тацяна была абраная ў Праўленьне арганізацыі. У загадзе пра выключэньне студэнткі напісана: “адміністрацыяй унівэрсітэту выяўлены факт самавольнага і беспадстаўнага выезду студэнткі Тацяны Хомы ў Францыю і знаходжаньня яе ў гэтай краіне ад 11 да 14 лістапада 2005 году ў перыяд вучэбных заняткаў. Улічваючы складаную ўнутрыпалітычную сітуацыю і ўвядзеньне надзвычайнага становішча ў гарадах Францыі, учынак студэнткі Т.Хомы мог прывесьці да непрадказальных трагічных вынікаў. Паводзіны названай студэнткі неабходна кваліфікаваць ня толькі як надзвычай грубае (і ўжо ня першае) парушэньне правілаў унутранага распарадку унівэрсітэту, але і як адкрытую непавагу да БДЭУ як арганізацыі, якая нясе юрыдычную і маральную адказнасьць за забесьпячэньне бясьпекі студэнтаў у працэсе навучаньня”. Тацяна Хома заявіла, што насамрэч прычына выключэньня палітычная: “Падставай для адлічэньня наваны “неафіцыйны самавольны выезд за мяжу” і адсутнасьць на занятках на працягу трох дзён. Падчас маёй паездкі ў Францыю

я была абраная ў кіраўніцтва еўрапейскай студэнцкай арганізацыі ESIB. Калі ў рэктараце пра гэта даведаліся, мяне вырашылі выключыць. Кіраўніцтва універсітэту кваліфікавала мой выезд як абразу БДЭУ і "адпаведна правілам унутранага распарадку і артыкулам працоўнага Кодэксу" да мяне прымянілі такую форму дысцыплінарнага пакараньня. Хачу зазначыць, што, давучыўшыся да чацьвёртага курсу, я ня мела ніводнага папярэджаньня і зьяўлялася адной з лепшых студэнтак на курсе. Я неаднаразова ўдзельнічала ў канферэнцыях, абараняла гонар факультэту і ўніверсітэту. Я абураная: рэктар нават ні разу са мной не размаўляў. Мяне выклікалі ў дэканат. У пакоі намесьніка дэкана сядзеў чалавек, які хацеў са мной паразмаўляць. Я запыталася, хто ён. Ён сказаў, што прадстаўляе выхаваўчы аддзел універсітэту. Мы размаўлялі каля гадзіны. Ён пытаўся пра арганізацыю ESIB, кім яна фінансуецца і якая ў яе пазіцыя адносна Беларусі. Прозьвішча сваё ён мне так і не назваў. Пасьля ў адной з размоваў з прадстаўнікамі універсітэту мне сказалі, што гэты чалавек быў з КДБ, і па выніках гэтай размовы маё "пытаньне" было так хутка вырашанае. 25 лістапада, калі я даведалася, што загад аб адлічэньні быў падпісаны, мяне прымусілі выселіцца з інтэрнату. Прычым зрабіць гэта трэба было літаральна за дзве гадзіны. Сітуацыя выглядала так, што мяне проста выкінулі з універсітэту і з інтэрнату на вуліцу, у дзень калі была завіруха. Усе супрацоўнікі універсітэту, з якімі пре прыходзілася сустракацца і размаўляць выказвалі сваю падтрымку. Я веру, што існуе салідарнасьць сярод беларускіх студэнтаў. Я гэта адчуваю. Кіраўніцтва ESIB зьвязалася з міжнароднымі адукацыйнымі, студэнцкімі і праваабарончымі арганізацыямі. Дзякуючы ім, аб маёй сітуацыі зараз ведаюць вельмі шмат людзей у шматлікіх краінах Еўропы. Я вельмі ўдзячна ўсім за падтрымку". Сітуацыю каментуе юрыст Валянцін Стэфановіч: " Упершыню кіраўніцтва універсітэту не хавала сапраўдных прычынаў выключэньня. У загадзе так і напісана: "адлічаная за самавольны выезд за мяжу". Атрымліваецца, што, каб паехаць за мяжу, студэнтка павінна была ўзяць дазвол у рэктара. Гэтым парушана Канстытуцыя РБ, дзе арт. 30 гарантуе грамадзянам права бесперашкоднага выезду за мяжу і вяртаньня".

***25 лістапада*** ў Жодзіне міліцыя "зацікавілася" недзяржаўнай газетай "Назіральнік". Як паведаміў яе выдавец — актывіст "Маладога Фронту" ***Павел Красоўскі***, ён быў выкліканы для тлумачэньняў у жодзінскую міліцыю. "Назіральнік", які выдаецца накладам 299 асобнікаў, распавядае пра падзеі ў горадзе, акцэнтуе ўвагу на сацыяльна-эканамічным становішчы яго жыхароў.

***28 лістапада*** ў судзе Ленінскага раёну г. Магілёву адбылося паседжаньне па адміністрацыйнай справе актывіста руху "Зубр" ***Яўгена Суворава***. Моладзевы актывіст асуджаны па арт 156 КаАП (дробнае хуліганства) да штрафу ў памеры адной базавай велічыні. Рашэньне вынесла судзьдзя Алена Дыбленка.

***30 лістапада*** адлічаная з факультэту міжнародных эканамічных адносінаў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэту ***Тацяна Хома*** падала скаргу ў Міністэрства адукацыі на загад рэктара. Паводле працэдуры, міністэрства мае месяц на разгляд скаргі. Але Тацяна моцна спадзяецца, што адказ будзе хутчэй, паколькі хутка ў студэнтаў пачынаецца заліковая сесія. Таксама Тацяна лічыць, што калі адказ Міністэрства адукацыі будзе адмоўны, то гэта пацьвердзіць чуткі, якія ходзяць па універсітэце, аб тым, што загад пра выключэньне студэнткі прыйшоў з міністэрства. У такім выпадку Тацяна Хома будзе зьвяртацца ў суд. Адвакат Тацяны Хома Павел Сапелка лічыць, што загад выдадзены без законных на тое падставаў і мусіць быць абскарджаны.

***У лістападзе*** ў Сьветлагорску (Гомельская вобласьць) улады актывізавалі ціск на моладзь, якая мае дэмакратычныя погляды. Пасьля акцыі “Дзень салідарнасьці” раённыя ўлады на базе школы-інтэрнату правялі нараду кіраўнікоў навучальных установаў, на якой прысутнічаў супрацоўнік КДБ. Па выніках гэтай нарады дырэктары навучальных установаў вымушаныя ціснуць на вучнёўскую моладзь – у прыватнасьці, у мясцовым тэхнікуме і ў сярэдніх школах №№ 4, 9 і 10. “Выклікаюць да дырэктараў усіх старшакласьнікаў, хто сябруе з актыўнай моладзьдзю, і вядуць з імі размовы ў жорсткай форме. Адзначана прысутнасьць падчас размоваў незнаёмых мужчын у цывільным, якія ў школах не працуюць. Навучэнцаў запалохваюць тым, што яны будуць выключаныя, што ім не дазволяць езьдзіць за мяжу і г. д. Таксама звоняць бацькам з аналагічнымі пагрозамі. Дырэктары кажуць, што ім “трэба напісаць справаздачу” аб гэтых захадах”, – расказаў мясцовы актывіст ***Вадзім Богдан.***

***1 сьнежня*** Нарвескі Хельсінскі камітэт і Фундацыя дамоў правоў чалавека (Нарвегія) асудзілі выключэньне з універсітэту ***Тацяны Хомы***. Адпаведны ліст яны накіравалі міністру адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандру Радзькову. У звароце нарвескіх праваабаронцаў гаворыцца: “Мы разглядаем рашэньне выключыць сп-ню Хома з універсітэту як палітычна матываваную і цалкам непрапарцыйную рэакцыю на ўчынкі студэнткі-старшакурсьніцы. Нарвежскі Хельсінскі камітэт і Фундацыя дамоў правоў чалавека ня маюць доступу да ўнутраных правілаў і пастановаў, у парушэньні якіх абвінавачваецца сп-ня Хома. Аднак, у адпаведнасьці з артыкулам 13 Сусьветнай Дэкларацыі Правоў Чалавека любая асоба мае права пакідаць межы любой краіны, уключаючы сваю ўласную, і вяртацца ў яе. Любыя абмежаваньні гэтага права могуць накладвацца ў адпаведнасьці з законам і ў тым выпадку, калі яны разглядаюцца як цалкам неабходныя ў дэмакратычным грамадзтве.(…) Больш таго, права сп-ні Хомы на навучаньне ахоўваецца Міжнародным пактам аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, паводле якога яна мае права на вышэйшую адукацыю на недыскрымінацыйнай аснове. Выключэньне за замежную паездку студэнткі старэйшых

курсаў, якая даказала сваю акадэмічную пасьпяховасьць, можа разглядацца толькі як дыскрымінацыя, заснаваная на дапушчэньнях аб ейных палітычных поглядах. Таму Нарвескі Хельсінскі камітэт і Фундацыя дамоў правоў чалавека просяць вас ануляваць незаконнае рашэньне аб выключэньні сп-ні Тацяны Хомы, прынятае адміністрацыяй Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта". Зварот падпісалі Марыя Дале — выканаўчы дырэктар Фундацыі дамоў правоў чалавека і Б'ёрн Энгесланд — Генеральны сакратар Нарвескага Хельсінскага камітэту.

***1 сьнежня*** моладзь з 15 краінаў Эўропы — Літвы, Кіпру, Вялікай Брытаніі, Польшчы, Украіны, Беларусі і іншых краінаў — пратэставала каля амбасады Беларусі ў Вільні супраць выключэньня ***Тацяны Хомы*** з ВНУ. Акцыю ладзіў Літоўскі саюз студэнцкіх прадстаўніцтваў, буйнейшая літоўская студэнцкая арганізацыя. Студэнты тлумачылі, што гэта акцыя пратэсту супраць парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, і што яны абураныя выключэньнем з ВНУ актыўнай студэнткі, якая ўдзельнічае ў міжнародным студэнцкім руху. Моладзь трымала лісты шпалераў з малюнкам цаглянага мура – як сімвал "дзяржаўнага мура", а на ім – плакаты на розных мовах з надпісам "Свабоду руху!" і бел-чырвона-белы сьцяг. Студэнты не зьвярталіся па дазвол на пікет у Віленскую мэрыю, так што акцыя была не санкцыянаваная, і прыехала паліцыя. Паліцыянты патлумачылі, што без папярэдняга дазволу нельга ладзіць акцыі з удзелам болей як 9 чалавек, іначай ім могуць прызначыць штраф. Пасьля гэтага ўдзельнікі падзяліліся на меншыя групы, і праблема была вырашаная.

***2 сьнежня*** Эўрапейская асацыяцыя універсітэтаў прыпыніла супрацоўніцтва з БДЭУ ў сувязі з загадам рэктара Ўладзіміра Шымава выключыць студэнтку 4 курсу ***Тацяну Хому*** за ўдзел у сустрэчы нацыянальных студэнцкіх зьвязаў Эўропы (ESIB) у Францыі без дазволу універсітэту. Эўрапейская асацыяцыя ўніверсітэтаў таксама заклікала "падтрымаць кампанію ESIB па аднаўленьні Тацяны Хомы ва ўніверсітэце і магчымасьці працягнуць заняткі і іншую дзейнасьць свабодна ад імя студэнтаў, без прыніжэньня".

***2 сьнежня*** ў Менску на Кастрычніцкай плошчы за распаўсюд незалежнай газеты "Народная воля" затрыманы сябра Моладзі БНФ ***Алесь Маланік*** і дастаўлены ў Цэнтральны РУУС. Там яго пратрымалі тры гадзіны. Спачатку хлопца абвінавацілі ў распаўсюдзе незарэгістраванага выданьня, але пазьней высьветлілі, што "Народная воля" – афіцыйна выдадзеная газета, і адпусьцілі.

***2 сьнежня*** ў Гомелі на вакзале затрыманыя актывісты руху "Зубр" ***Павел Маджара*** і ***Андрэй Гурэвіч***, якія ехалі з Менску. Ім патлумачылі, што іх падазраюць у дачыненьні да крадзяжу мабільнага тэлефону ў Жлобіне.

Пры затрыманьні ў маладых людзей былі канфіскаваныя матэрыялы, датычныя Дня салідарнасьці з палітзьняволенымі.

***6 сьнежня*** рэктар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэту Ўладзімір Шымаў адмовіўся сустрэцца з дэлегацыяй паслоў Еўрапейскага Зьвязу, якія мелі намер абмеркаваць з рэктарам сітуацыю, што склалася вакол адлічэньня з універсітэту студэнткі ***Тацяны Хома***. Кіраўнікі дыпламатычных місіяў краінаў Еўрасаюзу выказалі занепакоенасьць абмежаваньнем правоў і свабодаў беларускіх студэнтаў. Яны выказалі шкадаваньне з прычыны абмежаваньня свабоды руху, што “супярэчыць міжнародным абавязкам краіны, аб прыхільнасьці якім яна заяўляе”. Амбасадары выказалі спадзяваньне, што Тацяна Хома зможа працягнуць навучаньне ў БДЭУ.

***8 сьнежня*** адміністрацыя віцебскай ветэрынарнай акадэміі правялаператрус у пакоі студэнткі-актывісткі “Зубра” ***Любові Кучынскай*** у яе адсутнасьць і без аніякіх дазвольных дакументаў. Пасьля гэтага студэнтка была выкліканая да прарэктара, які сказаў, што ўсе матэрыялы, забраныя ў пакоі, ён перадасьць адразу ў КДБ, і што з ягонага пакою дзяўчына выйдзе ў наручніках. Затым студэнтку выклікаў рэктар акадэміі і пагражаў, што яе выключаць з навучальнай установы. Як распавялі Любові Кучынскай суседзі,ператрус у ейным пакоі правялі адзін з кіраўнікоў прафкаму спадар Аўдачонак, прарэктар па выхаваўчай працы спадарыня Лукіна і невядомы чалавек у цывільным. У асабістых рэчах Любові Кучынскай знайшлі каля тысячы асобнікаў розных улётак і налепак. Усё гэта ініцыятарыператрусу забралі з сабой. Нагодай дляператрусу нібыта стаў ананімны тэлефонны званок пра тое, што ў пакоі студэнткі ёсьць забароненыя друкаваныя матэрыялы.

***12 сьнежня*** на студэнтаў БДЭУ, якія на працягу двух тыдняў зьбіралі подпісы ва ўніверсітэце ў падтрымку ***Тацяны Хомы***, пачалі аказваць ціск з боку адміністрацыі. Калі подпісаў назьбіралася болей за 500, студэнтаў пачалі выклікаць у дэканаты для правядзеньня тлумачальнай працы. Прадстаўнікі дэканатаў таксама падчас лекцыяў тлумачылі, што БДЭУ — універсітэт дзяржаўны і мусіць трымацца дзяржаўнай палітыкі, і ў зьвязку з гэтым рэктар мусіў адлічыць Тацяну Хому. Сяброў Тацяны Хома, якія жывуць у інтэрнаце БДЭУ №3, наведаў чалавек, які назваўся Уладзімірам Мікалаевічам. Гэты ж самы чалавек сустракаўся і з Тацянаю ў дзень яе выключэньня 24 лістапада.

***12 сьнежня*** студэнты Эканамічнай акадэміі ў Познані пачалі зьбіраць подпісы пад просьбай аб прыняцьці ***Тацяны Хомы*** ў гэтую навучальную ўстанову з прызначэньнем ёй стыпендыі. З такой ініцыятывай выступіў Беларускі культурна-асьветніцкі цэнтр у Познані.

***13 сьнежня*** ў судзе Першамайскага раёну г. Бабруйску прайшоў раз-

гляд адміністрацыйнай справы маладафронтаўцаў ***Дзяніса Буйніцкага*** і ***Сяргея Лацінскага***. Нагадаем, што Дзяніс Буйніцкі і Сяржук Лацінскі былі затрыманыя 22 кастрычніка падчас рок-канцэрту “Рок за баброў” за тое, што разгарнулі бел-чырвона-белы сьцяг. На маладафронтаўцаў тады быў складзены пратакол па артыкуле 156 КаАП — дробнае хуліганства. Першы адміністрацыйны працэс над маладафронтаўцамі адбыўся ў Бабруйскім Ізалятары часовага ўтрыманьня, і па яго выніках Дзяніс Буйніцкі і Сяргей Лацінскі былі арыштаваныя на 2 сутак. На гэты раз моладзевых актывістаў абвінавацілі ў выкарыстаньні незарэгістраванай сімволікі. Пратакол пра выкарыстаньне бел-чырвона-белага сьцягу быў складзены ня ў дзень затрыманьня, а праз два тыдні. Такім чынам, маладафронтаўцаў зноў судзяць за тое ж “праваапарушэньне” па розных артыкулах.

***14 сьнежня*** суд Сьветлагорскага раёну наклаў штраф у памеры 300 тысяч рублёў на ***Вадзіма Богдана*** – аднаго з моладзевых актывістаў. Справа тычылыся агляду кватэры моладзевага актывіста 11 лістапада міліцыяй, калі былі знойдзеныя друкаваныя выданьні пра Дзень салідарнасьці. Адміністрацыйны кодэкс Рэспублікі Беларусь прадугледжвае парушэньні ў парадку вырабу і распаўсюду друкаванай прадукцыі. Але, па словах В.Богдана, міліцыя ня выявіла вырабу ці распаўсюду выданьняў — было выяўлена толькі тое, што яны захоўваліся ў кватэры.

***15 сьнежня*** ў Жодзіне заведзеная адміністрацыйная справа на рэдактара незалежнага інфармацыйнага бюлетэню “Назіральнік” ***Паўла Красоўскага***, які падазраецца ў парушэньні закону аб друку іншых сродках масавай інфармацыі. Рэдактар “Назіральніка” неаднаразова патрапляў у поле зроку жодзінскіх праваахоўных органаў. Калі пабачыў сьвет чацьвёрты нумар, то рэдактар быў выкліканы для тлумачэньняў: “Мне сказалі, што на мяне хочуць завесьці справу па факце зьнявагі дзяржаўнай асобы. У міліцыі прычапіліся да карыкатуры, якую даслалі мне жыхары гораду Жодзіна па электроннай пошце і папрасілі надрукаваць. Гэта малюнкі, у якія ўстаўленыя фотаздымкі твараў шэрагу нашых чыноўнікаў”. Супрацоўнік жодзінскай міліцыі Вячаслаў Ільіч удакладніў, што рэдактар “Назіральніка” парушыў 172 артыкул адміністрацыйнага кодэксу, які ўстанаўлівае адказнасьць за незаконны выраб і распаўсюд сродкаў масавай інфармацыі.

***15 сьнежня*** ў Гомелі затрыманы ***Павел Мадшара*** супрацоўнікамі Чыгуначнага РУУС за распаўсюд ўлётак з інфармацыяй пра акцыю Дзень салідарнасьці. Паводле меркаваньня праваабаронцы з Гомелю Анатоля Паплаўнага, за Паўлам Мадшарам сачылі, бо ў момант затрыманьня ён не распаўсюджваў улёткі, а проста ішоў па вуліцы з пляцаком, у якім ляжалі ўлёткі. Усё ўлёткі былі канфіскаваныя.

***15 сьнежня*** Праваабарончы цэнтр “Вясна” атрымаў ліст, які сьведчыць

пра прыгнёт у студэнцкіх інтэрнатах: “Пішу таму , што вельмі абураны тым, што адбылося сёньня раніцай. Да нас завітала адміністрацыя інтэрнату, у якім я жыву, прымусіла падпісацца ў тым, што 16 (Дзень салідарнасьці) у нашым пакоі з 20-00 да 20-30 будзе запаленае сьвятло і дадала, што гэта абавязкова . Што было б, калі б я адмовіўся, мяркую, тлумачыць ня трэба. Гэта сьведчыць, што уладу палохаюць нават такія акцыі. Заклікаю усіх: Запаліце сьвечку на 15 хвілінаў і распавядзіце пра гэта сваім знаёмым блізкім, бо ВОЛЯ не павінна быць пустым гукам!” Звычайны студэнт. (Не падпісваюся, бо навучаюся ў дзяржаўным універсітэце, і мяне могуць за гэты ліст выключыць).

***15 сьнежня***, напярэдадні Дня салідарнасьці, адміністрацыі 5-га і 6-га інтэрнатаў Беларускага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэту забаранілі студэнтам выходзіць з інтэрнатаў пасьля 18-ай гадзіны. Акрамя таго, у адпаведнасьці з загадам, з гэтага часу і да 20.30 ва ўсіх пакоях павінна быць уключанае сьвятло.

***19 сьнежня*** ў в судзе Першамайскага раёну г. Бабруйску адбыўся працяг слуханьня адміністрацыйнай справы ***Сяргея Лацінскага*** і ***Дзяніса Буйніцкага*** па артыкуле 167-2 КаАП (выкарыстаньне незарэгістраванай сімволікі).- Пасьля тлумачэньняў і выступаў сьведкаў судзьдзя Тацяна Тарабуева пастанавіла: пратакол і матэрыялы справы вярнуць у АУС Бабруйскага гарвыканкаму для далучэньня да іх доказаў таго, што сьцяг, які быў выкарыстаны на канцэрце, не зарэгістарваны, а таксама для далучэньня самога сьцяга.

***20 сьнежня*** Рада Сьветлагорскай раённай арганізацыі ТБМ атрымала адказ начальніка мясцовага аддзела ўнутраных справаў на адкрытую заяву адносна агляду кватэры ***Вадзіма Богдана*** — сябра рэспубліканскай рады ТБМ. Заява была прынятая 17 лістапада на паседжаньні Сьветлагорскай рады ТБМ з нагоды таго, што пры правядзеньні агляду кватэры супрацоўнікі міліцыі абвінавачвалі Вадзіма у фашысцкіх поглядах. У заяве таксама адзначалася, што на В. Богдана ў міліцыі аказваўся ціск пры ўзяцьці ў яго тлумачэньняў. У адказе М. М. Раговіча — начальніка раённага аддзелу міліцыі, у прыватнасьці, гаворыцца: “Пры вонкавым аглядзе кватэры супрацоўнікамі міліцыі былі выяўленыя друкаваныя выданьні, у якіх апісвалася дзейнасьць незарэгістраваных палітычных рухаў “Зубр”, “Белы легіён”, клейкія буклеты з лічбай “16”, налепкі з надпісам “Сёньня Украіна — заўтра Беларусь”, а таксама сьпіс адрасоў службовых асобаў раёну. З прычыны таго, што зьмест друкаванай прадукцыі накіраваны на ўчыненьне страты дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку, супрацоўнікамі міліцыі было прынята рашэньне аб канфіскацыі друкаванай прадукцыі. У адносінах да Богдана В. М. быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні па арт. 167-10 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэньнях РБ”. Ніякага ціску на В. Богдана супрацоўнікі міліцыі, лічыць

начальнік, не аказвалі. Як адзначаецца ў адказе, па просьбе В. Богдана з дадзенымі матэрыяламі быў азнаёмлены прадстаўнік Беларускага Хельсінскага камітэту, які парушэньняў заканадаўства ня выявіў. В. Богдана ніхто з міліцыянтаў, гаворыцца ў адказе, у фашысцкіх поглядах не абвінавачваў.

***20 сьнежня*** ўвечары каля будынку Гомельскага УКДБ былі затрыманыя міліцыяй ***Андрэй Кірылаў, Зьміцер Саўчанка*** і ***Дзяніс Чыкалёў***, якія расклейвалі партрэты актывіста “Зубра” ***Андрэя Зайцава***, даведзенага запалохваньнямі з боку КДБ да самагубства чатыры гады таму. Затрыманых даставілі ў Цэнтральны РАУС, дзе начальнік аддзяленьня сказаў, што калі хлопцы будуць працягваць гэтую дзейнасьць, то атрымаюць мінімум па пяць сутак арышту. Пасьля гэтага без складаньня пратаколу іх адпусьцілі.

***22 сьнежня*** ў Пінску супрацоўнікам міліцыі затрыманы ***Алесь Люльчаў*** нібыта для ўстанаўленьня асобы. Яго пасадзілі ў машыну і адвезьлі ў Ленінскі ГАУС, дзе без прысутнасьці панятых правялі асабісты дагляд, сьведкам якога быў супрацоўнік ГАУС В.Таняловіч. На патрабаваньне Люльчава прадставіць панятых, начальнік аддзяленьня Грынько сказаў, што хлопец зараз атрымае па галаве, і бот адпячатаецца ў яго на лобе. Акрамя таго пагражалі завесьці хлопца ў падвал і паказаць яму кузькіну маці, абражалі і запалохвалі. У выніку вобыску ў Алеся Люльчава канфіскавалі ўлёткі пра Аляксандра Мілінкевіча і склалі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні па арт.172 КаАП (распаўсюд друкаваных выданьняў, выробленых з парушэньнем устаноўленага парадку).

***22 сьнежня*** на Цэнтральным рынку Гародні міліцыянты затрымалі ***Уладзіміра Леванеўскага*** — сына палітвязьня Валерыя Леванеўскага. Хлопца даставілі ў Кастрычніцкі райаддзел міліцыі Гародні, там склалі два пратаколы, датычныя бюлетэню “Предприниматель”. Пры гэтым Уладзімір не распаўсюджваў бюлетэнь, а проста меў пры сабе пачак гэтага выданьня. Каля 250 асобнікаў бюлетэню ў Леванеўскага ў пастарунку забралі, сказаўшы, што будуць праводзіць эксьпертызу, каб высьветліць — ці надрукаваны “Предприниматель” без парушэньняў заканадаўства. Міліцыянты склалі адзін пратакол аб канфіскацыі бюлетэню, другі — паводле часткі 3 артыкулу 172 Адміністрацыйнага кодэксу, што датычыць распаўсюду друкаванай прадукцыі, якая ня мае выходных дадзеных.

***23 сьнежня*** ў Віцебску супрацоўнікамі КДБ затрыманы ***Аляксандр Дарафееў,*** актывіст дэмакратычнага руху, сябра ініцыятыўнай групы адзінага кандадата ад апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча. Улады нібыта падазраюць яго ў дачыненьні да віцебскіх выбухаў. А. Дарафееў перавезены з Віцебску ў сталіцу і знаходзіцца ў менскім КДБ. Праваабаронца Алесь Бяляцкі лічыць, што такім чынам ўлады спрабуюць запалохаць праціўнікаў

пануючага рэжыму, у першую чаргу ў Віцебску, і прыкладаюць розныя намаганьні для дасягненьня гэтай мэты.

***24 сьнежня*** актывіст "Зубра" ***Павел Юхневіч*** быў затрыманы каля касьцёлу Сьвятых Сымона і Алены ў цэнтры Менску. Да моладзевага актывіста падышлі некалькі чалавек у цывільным, пасадзілі ў машыну і адвезьлі ў Маскоўскі РУУС. Там "зубра" абшукалі. Пры вобыску знайшлі некалькі налепак. У адносінах да маладога чалавека складзены пратакол за парушэньне ч.3 арт. 172 КаАП РБ (распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных дадзеных). Праз чатыры гадзіны ён быў адпушчаны.

***27 сьнежня*** раніцай у кватэры актывіста "Зубра" ***Сяргея Рыкава*** адбыўся вобыск, які праводзілі чалавек у форме міліцыі і двое ў цывільным. Былі сканфіскаваныя знойдзеныя інфармацыйныя матэрыялы. Пасьля вобыску Сяргея павезьлі ў гарадзкі аддзел міліцыі №2 Маскоўскага раёну, а адтуль – у Маскоўскі РУУС. У РУУС яго дапытвалі двое супрацоўнікаў КДБ. Яны пыталіся пра месцы захоўваньня друкаваных матэрыялаў і пра кіраўніцтва "Зубра". Пасьля таго, як Сяргей адмовіўся адказваць на гэтыя пытаньні, яго адпусьцілі без складаньня пратаколу. Уся друкаваная прадукцыя была канфіскаваная.

***27 сьнежня*** намесьнік начальніка Сьветлагорскага райаддзелу міліцыі маёр Пётра Зыкун азнаёміў грамадзкага актывіста ***Тэльмана Масьлюкова*** з пратаколам адміністрацыйнага парушэньня, складзенага па выніках ператрусу кватэры. Паводле міліцыі, ён падазраваўся ў захоўваньні зброі і наркотыкаў.У пратаколе міліцыянты запісалі Масьлюкову наступнае абвінавачаньне: "Прывёз з Менску друкаваныя выданьні з заклікамі незарэгістраванай арганізацы "Зубр" і такім чынам дзейнічаў ад імя незарэгістраванай палітычнай арганізацыі". Размова ідзе пра інфармацыйныя бюлетэні "16", прысьвечаныя Дню салідарнасьці. У бюлетэні надрукаваны матэрыял за подпісам арганізацыі "Зубр" пра тое, што джынсавая вопратка і джынсавая атрыбутыка сталі ў Беларусі сімваламі імкненьня да свабоды.

***27 сьнежня*** ў сябра ініцыятыўнай групы Аляксандра Мілінкевіча і дэпутата Мастоўскага раённага Савету ***Алеся Зарэмбюка*** ў міліцыі ўзялі тлумачэньні адносна бюлетэню "Мастоўская праўда". Пасьля сесіі райсавету да Зарэмбюка падышоў міліцыянт і запрасіў у РАУС. Там дэпутату паказалі ліст з абласнога ўпраўленьня па ідэалагічнай працы, у якім гаворыцца, што бюлетэнь "Мастоўская праўда" з накладам 299 асобнікам не патрабуе рэгістрацыі як сродак масавай інфармацыі, аднак ён выдадзены з парушэньнем заканадаўства, паколькі ў ім не ўказаны нумары ліцэнзіі і замовы на друк, а таксама месца друку. У сваіх тлумачэньнях Алесь Зарэмбюк заявіў, што ня мае дачыненьня да выданьня і друку бюлетэню.

# 14. Ціск сьпецслужбаў на палітычна і грамадзка актыўных грамадзянаў і іншадумцаў

***23 студзеня Віталь Ругайны***, вучань 11-га класу адной з магілёўскіх школаў, быў выкліканы ў дырэктарскі кабінет. Там да яго зьвярнуўся "чалавек у цывільным", які назваўся супрацоўнікам КДБ, але адмовіўся паведаміць сваё прозьвішча. Ягоныя пытаньні тычыліся правядзеньня 21-22 студзеня адукацыйнага семінару для журналістаў, зладжанага ў Магілёве ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" і беларускім прадстаўніцтвам Фонду імя Ф. Эберта. Супрацоўнік КДБ папярэдзіў юнака, які збіраецца стаць журналістам і не ў першы раз бярэ ўдзел у навучальных мерапрыемствах БАЖ, што той "зьвязаўся з дрэннымі людзьмі". На заўвагу юнака, што і БАЖ, і Фонд Эберта дзейнічаюць у краіне адкрыта і законна, ананімны візіцёр заявіў, што з гэтым будзе хутка "пакончана".

***25 студзеня*** былы кандыдат у дэпутаты, актывіст АГП ***Аляксандр Ваўчанін*** з Жодзіна перадаў зварот да Віктара Юшчанкі ў амбасаду Украіны ў Беларусі. У сваім звароце ён сьцьвярджае, што існуе пагроза ягонаму здароўю і жыцьцю з боку беларускіх уладаў і сьпецслужбаў і просіць даць палітычны прытулак. Таксама спадар Ваўчанін паведаміў, што быў адным з удзельнікаў памаранчавай рэвалюцыі ў Кіеве. Прыкладна праз месяц пасьля таго, як ён вярнуўся з Кіеву, жодзінскія чыноўнікі правяралі, за чый кошт ён езьдзіў ва Украіну і чаму ён у гэтыя дні не працаваў.

***30 студзеня*** ў пад'ездзе ўласнага дому ў Оршы была жорстка зьбітая ***Людміла Ананьева*** – жонка выдаўца і рэдактара незалежнай газеты "Время" Генадзя Ананьева. Жанчына каля 16 гадзінаў увайшла ў пад'езд і тут жа атрымала моцны ўдар у твар ад мужчыны, які спускаўся па лесьвіцы. Пасьля другога ўдару Людміла Ананьева звалілася на падлогу, а невядомы біў ужо ляжачую ў лужыне крыві жанчыну. На крыкі жанчыны выбеглі суседзі, што і стала падставай для ўцёкаў злачынцы. За вуглом дому невядомага чакаў аўтамабіль. Суседзі распавялі, што на чацвёртым паверсе снаўдаўся падазроны мужчына; відаць, нехта папярэдзіў злачынцу, што Людміла Ананьева падыходзіць да пад'езду. На арганізаваны характар злачынства паказвае і той факт, што злачынцу чакала машына, а вырваны з рук жанчыны поліэтыленавы пакет з апельсінамі пазьней быў знойдзены непадалёк ад дому.

***5 лютага*** актывіст Аб'яднанай грамадзянскай партыі ***Аляксандр Ваўчанін*** заявіў, што жодзінскія праваахоўныя органы намагаюцца яго запалохаць. Яго абвінавачваюць у паклёпе на беларускія сьпецслужбы пасьля таго, як ён папрасіў прытулку ва Украіне. Да А. Ваўчаніна на працу прыйшоў пракурор Жодзіна Віктар Літвіненка і запатрабаваў, каб ён пас-

тавіў свой подпіс на публікацыі звароту ў “Народнай волі” і на дакуменце, дзе было напісана, што супраць актывіста АГП распачалі крымінальную справу за паклёп на беларускія сьпецслужбы.

***7 лютага*** ў аварыю ледзь не патрапіў былы дэпутат, лідэр парламенцкай групы “Рэспубліка” ***Сяргей Скрабец.*** Ён ацэньвае здарэньне як наўмысны акт з боку сьпецслужбаў і падаў заяву ў пракуратуру з патрабаваньнем правесьці расьследаваньне па факце. У асабістым аўтамабілі былога дэпутата парламента нечакана зламалася рулявое ўпраўленьне, у выніку чаго аўтамабіль ледзь не сутыкнуўся з іншым транспартным сродкам, а Сяргей Скрабец і ягоны сябра цудам здолелі пазьбегнуць сур’ёзных траўмаў.

***17 лютага*** адміністрацыйная камісія Фрунзенскага райвыканкаму Менску абмежавалася вуснай заўвагай у дачыненьні да ***Аксаны Новікавай***, затрыманай 11 студзеня за збор сродкаў на “аранжавую рэвалюцыю” ў Беларусі. Аксану абвінавачвалі ў жабраваньні. На паседжаньне запрасілі двух сьведкаў, мужчыну і жанчыну, якія казалі, што Аксана хадзіла са скрыняй з аранжавай стужкай і зьбірала грошы на рэвалюцыю. Менавіта гэта міліцыянты кваліфікавалі як жабраваньне. Старшыня камісіі Юры Капчынскі зачытаў рашэньне – справу спыніць з-за нязначнасьці правапарушэньня і абмежавацца вуснай заўвагай аб недапушчальнасьці такіх паводзінаў.

***22 лютага Сяргею Скрабцу*** адмовілі ў палітычным прытулку ў Расіі. Адпаведны адказ паступіў з Адміністрацыі прэзідэнта Расейскай Федэрацыі, куды кіраўнік дэпутацкай групы “Рэспубліка” Палаты прадстаўнікоў другога скліканьня зьвяртаўся напрыканцы 2004 году. Свой зварот аб палітычным прытулку Сяргей Скрабец абгрунтоўваў перасьледам з боку беларускіх уладаў і імкненьнем гарантаваць бясьпеку сабе і сваёй сям’і. Аднак станоўчага адказу з Масквы экс-дэпутат не дачакаўся. “Там напісана, што ня могуць мне даць палітычнага прытулку з той нагоды, што паміж нашымі краінамі няма візавага рэжыму,” – паведаміў С. Скрабец.

***2 сакавіка*** выдавецкая фірма “Сьпектр” адмовілася друкаваць перадвыбарчыя ўлёткі кандыдата ў дэпутаты па Гарадзенскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе №52 ***Сяргея Антусевіча***. Гэта адбылося пасьля таго, як 27 лютага нявядомыя ў цывільным забралі з друкарні 2 200 асобнікаў надрукаваных улётак кандыдата ў дэпутаты. У той дзень некалькі чалавек у цывільным увайшлі ў памяшканьне друкарні, прад’явілі пасьведчаньні чырвонага колеру і без складаньня якіх-небудзь актаў канфіскавалі перадвыбарчыя ўлёткі. Пра гэта кандыдату на наступны дзень паведамілі мэнеджэры “Сьпектру”. Пасьля гэтага фірма вярнула на рахунак гарвыканкаму грошы, на якія, згодна з законам, павінны друкавацца ўлёткі і адмовілася

друкаваць любую агітацыйную прадукцыю, датычную выбараў. У сувязі з гэтым інцыдэнтам кандыдат зьвярнуўся ў акруговую камісію і пракуратуру.

***24 сакавіка*** стала вядома, што супрацоўнікі КДБ спрабавалі завербаваць актывістку руху «Зубр» ***Вераніку Лазоўскую***, якая была затрыманая падчас акцыі ў Менску 11 сакавіка за тое, што разгарнула плакат “Свабоду палітвязьням!”. 22 сакавіка ёй патэлефанавалі і прапанавалі прыйсьці ў Фрунзенскае раённае ўпраўленьне КДБ для “размовы”. Вераніка Лазоўская адмовілася ісьці бяз позвы, замест яе пайшоў яе бацька. Супрацоўнік КДБ прадэманстраваў бацьку Веранікі дыскету, на якой, па ягоных словах, сабраная інфармацыя пра дзяўчыну, і заявіў, што, каб ня мець праблемаў пры паступленьні ў ВНУ, Лазоўская масіць пагадзіцца на супрацоўніцтва з КДБ.

***30 сакавіка*** намесьнік старшыні “Маладога Фронту” ***Сяргей Лісічонак*** у цэнтры Менску быў спынены супрацоўнікам КДБ, які прадставіўся “Кірылам” і завёў спачатку гутарку пра “Малады Фронт” і актывізацыю дзейнасьці моладзевай арганізацыі падчас апошніх вулічных акцыяў. Затым “Кірыл” сказаў пра Паўла Севярынца, які праходзіць у якасьці абвінавачваемага па крымінальнай справе, што той “пасаджаны на кручок”, таму абмяжоўваць ягоную палітычную дзейнасьць стала значна прасьцей. Таксама было заяўлена, што мэта КДБ – вымусьць Севярынца папрасіць палітычны прытулак за мяжою. Затым супрацоўнік КДБ пераключыўся на асобу самога Сяргея Лісічонка, якому было прапанавана прадстаўляць у Камітэт інфармацыю, датычную “Маладога Фронту”. За гэта прапаноўвалася “карысная інфармацыя” аб іншых палітычных партыях, моладзевых арганізацыях, а таксама гарантавалася магчымасьць для “Маладога Фронту” праводзіць любыя сходы і сустрэчы, пазьбягаючы непрыемнасьцяў з боку ўлады. С.Лісічонку было заяўлена аб тым, што ў выпадку адмовы да яго будуць ужытыя палітычныя правакацыі з мэтаю дыскрэдытацыі. Палохалі маладафронтаўца і іншымі формамі ўзьдзеяньня, у тым ліку для таго, каб вымусіць пакінуць краіну. Нягледзячы на тое, што С.Лісічонак адмовіўся ад такой прапановы, яму параілі “сур’ёзна падумаць”.

***3 траўня*** хворага сябра “Маладога Фронту” ***Сержука Лісічонка***, які знаходзіцца ў інфекцыйнай бальніцы Менску, наведаў прадстаўнік КГБ і спрабаваў схіліць да супрацоўніцтва. Гутарка цягнулася літаральна хвілінаў пяць і скончылася безвынікова для супрацоўніка сьпецслужбаў.

***17 траўня*** стала вядома, што колькасны склад атраду міліцыі асобага прызначэньня ў Менску будзе павялічаны на 15—20 %. У Міністэрстве ўнутраных справаў гэта тлумачаць неабходнасьцю лепшай арганізацыі бясьпекі грамадзянаў падчас культурна-масавых мерапрыемстваў. Атрад міліцыі асобага прызначэньня — гэта адмыслова падрыхтаваная, узброеная структура сістэмы Міністэрства ўнутраных справаў, якая была ство-

раная на пачатку 1990-х з мэтай барацьбы з арганізаванай узброенай злачыннасьцю. І прыцягненьне АМАПу на ахову грамадзкага парадку апошнімі гадамі зьяўляецца палітычна матываваным рашэньнем і пачаткам падрыхтоўкі ўладаў да прэзідэнцкіх выбараў, лічаць лідэры апазіцыйнага палітычнага руху. Нагадаем таксама, што на пачатку году ўступіла ў дзеяньне распараджэньне Аляксандра Лукашэнкі, паводле якога супрацоўнікі праваахоўчых органаў мусяць выконваць усе непасрэдныя адмысловыя загады кіраўніка краіны.

***9 чэрвеня*** беларускія памежнікі амаль пяць гадзінаў пратрымалі на мяжы аўтамабіль старшыні Менскай гарадзкой арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) ***Ігара Шынкарыка***, на якім ехалі на аздараўленьне ў адзін з санаторыяў Літвы адзін з лідэраў прадпрымальніцкага руху Анатоль Шумчанка, жонка Міколы Статкевіча Тацяна, жонка Юрыя Хадыкі Валянціна, маці Вячаслава Сіўчыка Галіна, старшыня Менскай гарадзкой арганізацыі АГП Ігар Шынкарык і актывістка АГП з Бабруйску Ірына Качан. У дачыненьні да ўсіх іх была ўжытая працэдура асабістага дагляду. Цягам усяго часу памежнікі тэлефанавалі вышэйшаму начальству па далейшыя ўказаньні. Машыну Ігара Шынкарыка ў пошуках кампрамату разабралі "літаральна на часткі". Праўда, у выніку мытнікі знайшлі толькі некалькі ўлётак.

***2 жніўня*** Рада Сьветлагорскай раённай арганізацыі "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" паведаміла, што супрацоўнік міжраённага аддзяленьня ў г. Сьветлагорску ўпраўленьня па Гомельскай вобласьці КДБ выклікаў ***Аляксандра Раўценку*** дзеля размовы. А. Раўценка пабываў за мяжой у складзе групы прадстаўнікоў грамадзкасьці, якая знаёмілася ў Чэхіі з дзейнасьцю органаў мясцовага кіраваньня ў сферы адукацыі, культуры, вырашэньня сацыяльных пытаньняў. У групу ўваходзілі прадстаўнікі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, іншых грамадзкіх аб'яднаньняў, бізнэсу, журналісты. 24-гадовы А. Раўценка браў удзел у візіце ў якасьці пазаштатнага карэспандэнта (публікаваў матэрыялы на розныя тэмы ў шэрагу газетаў, удзельнічаў у падрыхтоўцы рэпартажаў для мясцовага тэлебачаньня ў Сьветлагорску). Супрацоўнік КДБ запатрабаваў ад А. Раўценкі адказаць на пытаньні: для чаго ўсе гэтыя людзі езьдзілі за мяжу, чым займаліся там, якія месцы наведвалі, аб чым размаўлялі і г.д. Асабліва настойліва цікавіўся Тэльманам Маслюковым (адзін з каардынатараў візіту) і прадстаўнікамі грамадзкіх аб'яднаньняў. А. Раўценка быў выкліканы супрацоўнікам КДБ без павесткі (па тэлефоне), па зададзеных пытаньнях ня быў складзены пратакол. У той жа дзень А. Раўценка паведаміў іншым удзельнікам паездкі пра размову, у выніку чаго ўдзельнікі візіту, адносна якіх супрацоўнік КДБ задаваў пытаньні, склалі сумесную заяву і накіравалі яе начальніку аддзяленьня КДБ у Сьветлагорску і пракурору міжраённай пракуратуры.

***23 жніўня*** ў Гомелі міліцыянты затрымалі на паўгадзіны супрацоўніка палітычнага аддзелу амбасады ЗША ў Беларусі Лайла Макмілана. Сустрэча амерыканскага дыпламата з грамадзкімі актывістамі Гомелю мелася адбыцца ў доме гомельскага палітыка ***Віктара Карніенкі***. Але міліцыя і пажарныя яшчэ за некалькі гадзінаў перакрылі пад'езд да дому пад выглядам таго, што ў суседнім доме знойдзена міна часоў вайны. Таму сустрэча была перанесеная ў прыватную кватэру прадстаўніка Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Юрася Захаранкі. Супрацоўнікі міліцыі пад выглядам аперацыі па барацьбе з незаконнымі мігрантамі зьявіліся ў прыватную кватэру правяраць пашпарты. Пагражалі нават узламаць дзьверы, калі гаспадар іх не адчыніць. Нават пасьля прад'яўленьня Лайлам Макміланам дыпламатычных дакументаў міліцыянты не дазвалялі амерыканцу пакінуць кватэру, патрабуючы яшчэ і ягоны пашпарт. Джып амерыканскага дыпламата суправаджалі ня толькі міліцыянты ды людзі ў цывільным, але і здымачная група абласнога тэлебачаньня. Амбасада ЗША выказала занепакоенасьць з нагоды затрыманьня ў Гомелі свайго супрацоўніка Лайла Макмілана, які зьбіраўся правесьці з гомельскімі палітычнымі актывістамі сустрэчу на прыватнай кватэры. Як паведамляецца ў афіцыйным каментары амбасады, факт затрыманьня дыпламата абмяркоўваецца з беларускімі афіцыйнымі асобамі.

***1 верасьня*** больш за дзьве з паловай гадзіны праходзіў памежную і мытную праверку ў Нацыянальным аэрапорце "Менск-2" лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Беларусі ***Анатоль Лябедзька***, які вяртаўся з Польшчы са сьвяткаваньняў, прысьвечаных 25-годзьдзю прафсаюзу "Салідарнасьць". У выніку ў яго канфіскавалі 11 носьбітаў інфармацыі: праграмы канферэнцыі, сьпісы яе ўдзельнікаў, іх біяграфіі, кампакт-дыскі, зборнік вершаў на украінскай і ангельскай мовах "Памаранчавая паэзія" ды кнігу "Канец Ялты", прысьвечаную паўстаньню прафсаюза "Салідарнасьць". У пратаколе было запісана, што гэтая інфармацыя можа нанесьці страты палітычным і эканамічным інтарэсам Рэспублікі Беларусь.

***20 верасьня*** "крайне агрэсіўнай і істэрычнай" назваў працу замежных сьпецслужбаў супраць Беларусі старшыня КДБ Сьцяпан Сухарэнка падчас выступу перад маладымі чэкістамі. "На захадзе і за акіянам многім становіцца дрэнна, калі яны глядзяць на той курс, якім вядзе краіну беларускі прэзідэнт", — заявіў ён. Сьцяпан Сухарэнка запэўніў, што беларускія сьпецслужбы могуць распавесьці "пра пэўныя вынікі працы ў справе выкрыцьця шпіёнаў і спыненьня спробаў вярбоўкі беларускіх грамадзянаў". Кіраўнік КДБ таксама заявіў, што камітэт "не зьбіраецца адмаўляцца ад ідэалаў Фелікса Дзяржынскага". Варта нагадаць, што менавіта Фелікс Дзяржынскі заклаў практыку расстрэлаў закладнікаў і масавага тэрору паводле класавага прынцыпу. Ідэалы, на якія спасылаецца Сьцяпан Сухарэнка, сам Фэлікс Дзяржынскі фармуляваў наступным чынам: "ЧК – гэта ня суд. ЧК – абарона рэ-

валюцыі. ЧК павінна абараняць рэвалюцыю і перамагаць ворага, нават калі яе меч пры гэтым выпадкова патрапіць на галовы невінаватых... Права расстрэлу для ЧК надзвычай важнае". Карэспандэнт Радыё Свабода зьвярнуўся ў прэсавую службу КДБ Беларусі з просьбай паведаміць гэтыя пэўныя зьвесткі пра замежных шпіёнаў, якіх выкрылі беларускія чэкісты. Кіраўнік цэнтру сувязяў з грамадзкасьцю КДБ Валеры Надтачаеў такіх дадзеных не паведаміў. Не назваў ён і замежных фондаў, пад прыкрыцьцём якіх нібыта вядзецца выведкавая праца супраць Беларусі.

***20 верасьня*** ў Менску распачаў службу полк міліцыі сьпецыяльнага прызначэньня, у які ўвайшлі часткі былога сталічнага АМАПу сталіцы. Паводле кіраўніка прэсавай службы менскай міліцыі Алега Сьлепчанкі, полк падпарадкаваны асабіста начальніку менскай міліцыі генералу Анатолю Куляшову, а камандзірам палка прызначаны Юры Падабед, які раней камандаваў менскім АМАПам і якому забаронены ўезд у краіны Еўрасаюзу з-за жорсткага разгону мірных дэманстрацыяў у 2004 годзе. Новы полк фактычна нічым не адрозьніваецца ад АМАПу, акрамя колькасьці службоўцаў. Мэтаў новага фармаваньня ў гарадзкой міліцыі не хаваюць — забясьпечваць грамадзкі парадак падчас масавых вулічных мерапрыемстваў, у тым ліку і акцыяў пратэсту апазіцыі. Кіраўнік менскай міліцыі генерал Анатоль Куляшоў ужо заявіў, што гэтай справай мусяць займацца добра і адмыслова падрыхтаваныя супрацоўнікі. Апазіцыйны палітык, у мінулым супрацоўнік структураў МУС ***Андрэй Клімаў*** лічыць, што стварэньне новага палку міліцыі сьпецыяльнага прызначэньня тлумачыцца падрыхтоўкай Аляксандра Лукашэнкі да прэзідэнцкіх выбараў 2006 году.

***23 верасьня*** кіраўнік палітычнага і эканамічнага аддзелу амбасады ЗША ў Беларусі Дэрэк Хоган наведаў Берасьце. У часе знаходжаньня дыплямата ў гэтым горадзе за ягонымі дзеяньнямі ўвесь час назіралі прадстаўнікі праваахоўных службаў і супрацоўнікі дзяржаўнага тэлебачаньня. Адна з сустрэчаў спадара Хогана была прысьвечаная стану незалежнай рэгіянальнай прэсы ў Беларусі і адбылася ў рэдакцыі газеты "Брестский курьер". На самым пачатку візіту ў памяшканьні нечакана зьявілася здымачная група мясцовага тэлебачаньня, аператар якой адразу пачаў рабіць відэазапіс удзельнікаў сустрэчы. Асаблівая ўвага была нададзеная асобе Дэрэка Хогана, але ніякіх пытаньняў яму журналісты дзяржаўнага тэлебачаньня не задавалі. Увесь час, пакуль амерыканскі дыпламат знаходзіўся ў памяшканьні рэдакцыі, каля будынку стаяла міліцэйская машына і тая ж здымачная група мясцовага тэлеканалу.

***23 верасьня*** адбылася спроба вярбоўкі кіраўніка магілёўскай філіі маладзевага грамадзкага аб'яднаньня "Маладыя сацыял-дэмакраты — Маладая Грамада" ***Паўла Усава***. Актывіст якраз вярнуўся з паездкі ў Польшчу, дзе знаходзіўся па запрашэньні партнёрскай арганізацыі для вывучэньня

ходу падрыхтоўкі парламенцкіх выбараў. Менавіта гэтая яго "камандзіроўка" і цікавіла чэкіста. Каб заманіць вядомага ў горадзе актывіста на гутарку, супрацоўнік КДБ прыдумаў цэлую камбінацыю. Невядомы чалавек па тэлефоне папрасіў у П. Усава кансультацыі па пытаньні нібыта рэгістрацыі новай грамадзкай арганізацыі. Аднак слухаць парады па тэлефоне ён не захацеў, настойваючы на непасрэднай сустрэчы. У прызначаны час і ў прызначаным месцы ў цэнтры гораду да Усава з аўтамашыны выйшаў малады чалавек і прапанаваў, каб не стаяць на вуліцы, сесьці ў аўтамашыну. Як толькі гэта адбылося, незнаёмец паказаў сваё службовае пасьведчаньне і папрасіў (як у "патрыёта сваёй краіны") зусім іншую "кансультацыю". Супрацоўнік КДБ, як указана ў пасьведчаньні, зьяўляецца старшым аператыўным упаўнаважаным абласной управы КДБ па прозьвішчы Грыбайла. Ён прапанаваў Паўлу распавесьці пра ягоную паездку ў Польшчу і ўвогуле падзяліцца інфармацыяй наконт таго, што думаюць пра Беларусь нашыя замежныя суседзі. П.Усаў адмовіўся весьці з ім размову і сыйшоў. Пры гэтым ён пасьпеў папярэдзіць Грыбайлу, што факт гэтай сустрэчы абавязкова стане вядомы незалежным СМІ.

***30 верасьня*** беларускія памежнікі не пусьцілі ў Беларусь групу палітыкаў польскай партыі "Закон і справядлівасьць", якія накіроўваліся на Кангрэс дэмакратычных сілаў у Менск. Чацьвёра палякаў, сярод якіх дэпутат Сейму Філіп Лібіцкі, двое дарадцаў партыі і палітолаг, адмыслоўца па справах Беларусі, Пшэмыслаў Фалігоўскі, прыехалі на памежны пераход Кузьніца-Брузгі а 19-й гадзіне. Пасьля 8 гадзінаў чаканьня польскія палітыкі атрымалі канчатковы адказ – у Беларусь іх ня пусьцяць. Па словах спадара Лібіцкага, прычына была нібыта ў адсутнасьці натарыяльна зацьверджанага ды яшчэ і перакладзенага на расейскую мову дазволу ад уладальніцы аўтамабілю – жонкі кіроўцы – на тое, што ён можа на гэтым аўтамабілі ехаць у Беларусь. "Так ці іначай, гэтага патрабаваньня няма на Інтэрнэт-старонцы беларускага МЗС, і ніхто ў беларускай амбасадзе, калі мы зьвярталіся па візы, не сказаў, што такая папера патрэбная".

***4 кастрычніка*** ў адказ на зварот групы грамадзянаў Сьветлагорску (Гомельская вобласьць) пракурор Сьветлагорскай міжраённай пракуратуры і начальнік Сьветлагорскага міжраённага аддзяленьня КДБ прызналі правамоцнымі дзеяньні супрацоўніка КДБ у адносінах да мясцовага журналіста. Зварот быў накіраваны ў сярэдзіне жніўня, пасьля таго, як супрацоўнік КДБ па тэлефоне выклікаў на размову 24-гадовага жыхара раённага цэнтру ***Аляксандра Равуценку***. У якасьці пазаштатнага карэспандэнта шэрагу газет і гарадзкога тэлебачаньня А. Равуценка ў складзе групы прадстаўнікоў грамадзкасьці наведаў Чэхію. Паездка праводзілася з мэтай азнаямленьня з дзейнасьцю органаў мясцовага самакіраваньня ў галіне адукацыі, культуры і сацыяльнай сферы. Падчас размовы супрацоўнік КДБ запатрабаваў ад А. Равуценкі, які зьяўляўся адным з самых маладых

удзельнікаў групы, адказаць на шэраг пытаньняў, у тым ліку і пра мэту і зьмест паездкі за мяжу. У звароце групы грамадзянаў Сьветлагорску нагадвалася, што свабодны выезд за межы сваёй краіны і вяртаньне на Радзіму зьяўляюцца неад'емным правам кожнага чалавека, замацаваным ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Дзеяньні супрацоўніка КДБ заяўляльнікі расцанілі як праяву палітычнага вышуку і спробу сьпецслужбаў паставіць пад кантроль дзейнасьць грамадзкіх арганізацыяў, а таксама аказаць маральна-псіхалагічнае ўзьдзеяньне на грамадзянаў, тым больш, што паездка ні ад каго не ўтойвалася.

***15 кастрычніка*** супрацоўніцы прэсавай службы грамадзянскай ініцыятывы "Хартыя-97" ***Наталі Радзінай*** кампанія сотавай сувязі Velcom заблакавала SIM-карту мабільнага тэлефону. У кампаніі паведамілі, што гэта зроблена па распараджэньні службы бясьпекі кампаніі. Адключэньне адбылося без папярэджаньня, нягледзячы на наяўнасьць дастатковых сродкаў на рахунку. Напярэдадні журналістка разаслала па сваіх кантактных тэлефонах sms-паведамленьні з заклікам узяць удзел у Дні салідарнасьці 16 кастрычніка. Паведамленьне атрымалі таксама супрацоўнікі прэсавых службаў МУС, КДБ, ГУУС Менгарвыканкама і інш. Тэлефон быў падключаны толькі 17 кастрычніка.

***21 кастрычніка*** сьпецслужбы пачалі перасьлед студэнтаў Баранавіцкага універсітэту. Старшыня Баранавіцкага "Маладога Фронту" ***Сяржук Марчык*** паведаміў: "20 кастрычніка ў Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт на фінансава-прававы факультэт завіталі сьледчыя. У нашу группу падчас лекцыі прыйшоў дэкан факультэту і выклікаў мяне на размову. Пры размове прысутнічаў сьледчы. Ён распавёў пра тое, што вартаўнік Баранавіцкай школы №11, на якой было прылеплена некалькі налепак "Вецер пераменаў-Малады Фронт", апісаў чалавека, падобнага да мяне. Сьледчы задаваў пытаньні кшталту: дзе я быў увечары 18 кастрычніка, ці бачыў я такія налепкі раней, ці ведаю я людзей, якія займаюцца "антигосударственной деятельностью", сябрам якой арганізацыі я зьяўляюся і г.д. Пасьля таго, як мяне адпусьцілі, на размову быў запрошаны мой аднагрупнік Юруць Андрусь. Яму задавалі тыя ж пытаньні, што і мне. Пасьля таго, як сьледчыя сышлі, мяне выклікалі ў дэканат і ў чарговы раз (трэці за апошні месяц) праводзілі ідэалагічную працу, пагражалі выключэньнем з універсітэту, абяцалі "дапамагчы" мне ня здаць сесію. Мне сказалі, што я ўжо "дастаў іх сваім плюралізмам" — цікава гэта было чуць ад адміністрацыі фінансава-прававога факультэту. Пасля гэтых падзей я пайшоў дадому, дзе мяне чакалі навіны. Маці расказала, што бацьку на працу тэлефанаваў намесьнік старшыні Баранавіцкага КДБ і пагражаў выключэньнем мяне з універсітэту, пагражаў правесьці ў нас у хацеператрус і завесьці ў адносінах да мяне адміністрацыйную справу за распаўсюд антыдзяржаўнай літаратуры. Акрамя таго, бацьку двойчы выклікаў загадчык ідэалагічнага аддзелу

заводу станкапрыладаў (месца працы майго бацькі) і вёў з ім размовы адносна маіх паводзінаў".

***25 кастрычніка*** ў Гародні знаходзіліся прадстаўнікі амбасады ЗША Дэрэк Хоган і Лайл Макмілан. Яны сустрэліся з прадстаўнікамі мясцовых арганізацыяў і палітычных партый. Падчас сустрэчы з журналістамі незалежных інтэрнэт-сайтаў у пакой нечакана завітала здымачная група з трох чалавек, адзін з якіх сказаў, што яны хочуць паразмаўляць з прадстаўніком амерыканскай амбасады. Здымачнай групе было адмоўлена, паколькі іх не запрашалі на сустрэчу. Пасьля яе заканчэньня амерыканскія дыпламаты выйшлі з памяшканьня, дзе іх, не пытаючыся дазволу, пачаў запісваць на відэа аператар.

***27 кастрычніка*** з Нацыянальнана аэрапорту "Менск-2" кіраўнік Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) ***Аляксандр Казулін*** зьбіраўся выляцець у Мальме на зьезд Сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі Швецыі. Аднак падчас мытнага дагляду ў яго знайшлі дакументы, якія спадар Казулін назваў партыйнай перапіскай. Менавіта з-за іх палітыка не пусьцілі ў самалёт, які вылятаў у Франкфурт-на-Майне. Спадар Казулін сьцьвярджае, што ніякіх процівазаконных рэчаў і дакументаў ў яго не было: "Гэтую ўсю інфармацыю можна знайсьці ў Інтэрнэце. Там няма ніякай інфармацыі, якая б вяла да падрыву..." Аляксандр Казулін заявіў, што падасьць заяву ў суд за зьнявагу маральнай і дзелавой рэпутацыі.

***27 кастрычніка*** ў Нацыянальным аэрапорце "Менск-2" затрымалі лідэра АГП ***Анатоля Лябедзьку,*** якія вяртаўся са Страсбургу, дзе разам з ***Вінцуком Вячоркам*** праводзіў перамовы з кіраўніцтвам Еўрасаюзу, дэпутатамі Еўрапарламенту і прадстаўнікамі Рады Еўропы. У Лябедзькі былі канфіскаваныя рабочыя матэрыялы, якія ён вёз з сабою. Беларускія памежнікі і мытнікі разам з супрацоўнікам КГБ пратрымалі палітыка ў аэрапорце паўтары гадзіны. Яны ўвесь час узгаднялі дзеяньні са сваім кіраўніцтвам у Менску, правялі дагляд рэчаў, падчас якога праваахоўнікаў зацікавілі інфармацыйныя матэрыялы, якія вёз спадар Лябедзька. Усе гэтыя матэрыялы былі канфіскаваныя, прычым у пратаколе сказана, што яны нясуць пагрозу палітычным і эканамічным інтарэсам Беларусі.

***28 кастрычніка*** каардынатару праваабарончай службы "Зубра" ***Ірыне Тоўсьцік*** ў пашпартна-візавай службе Кастрычніцкага раёну Менску адмовілі ставіць пячатку, якая сьведчыць аб тым, што "пашпарт прыгодны для шматразовых выездаў ва ўсе краіны сьвету". У пашпартна-візавай службе Ірыне Тоўсьцік сказалі, што да яе "ўзьніклі пытаньні ў Камітэта дзяржаўнай бясьпекі".



***2 лістапада*** амбасадары з 10 краінаў Еўрасаюзу наведалі Магілёў,

Шклоў і Горкі. Азнаямляльна-дзелавы візіт на Магілёўшчыну распачаўся з сустрэчы з прадстаўнікамі недзяржаўных аб'яднаньняў і палітычных рэгіянальных структураў. Сустрэчу наладзіў грамадзкі Фонд спрыяньня ўстойліваму разьвіцьцю. Увесь час сустрэчы перад прыватным будынкам, дзе яна адбывалася, удзельнікаў пільнавалі тэлеаператары дзяржаўнага тэлебачаньня і амаль непрыкметныя людзі ў цывільным.

***6 лістапада*** у Гомелі актывіста руху “Зубр” студэнта 5 курса Гомельскага універсітэту ***Алега Петуха*** выклікаў у дэканат намесьнік прарэктара па ідэалагічнай працы С. Ханеня. Размова адбывалася ў прысутнасьці «чалавека ў цывільным», які не прадставіўся. Гэты чалавек прапанаваў Алегу Петуху паведамляць яму інфармацыю пра рух “Зубр”. Калі Алег адмовіўся, гэты чалавек стаў пагражаць, што ў яго могуць узьнікнуць праблемы са здароўем і вучобай.

***10 лістапада*** сьпецслужбамі была ўчыненая спроба завербаваць актывістку руху «Зубр» ***Алену Капач***. Павесткай яе выклікаклі ў УУС метрапалітэну, дзе яе чакалі два “чалавекі ў цывільным” . Адзін з іх прадставіўся супрацоўнікам крымінальнага вышуку С. Сазонавым, другі не прадставіўся, але задаваў пытаньні пра рух “Зубр”, яго структуры, цікавіўся, дзе захоўваюцца інфармацыйныя матэрыялы, якія распаўюджваюць актывісты “Зубра”. Пры гэтым ён казаў, што ад адказаў Алены залежыць яе вучоба ва універсітэце. Пасьля таго, як дзяўчына дамовілася адказваць, ён прыгаразіў ёй, што яны “яшчэ сустрэнуцца”.

***28 лістапада*** старшыня КДБ Сьцяпан Сухарэнка заявіў, што “КДБ Беларусі зробіць усё, каб не дапусьціць дэстабілізацыі сітуацыі ў краіне у выніку магчымых масавых пратэстаў апазіцыі падчас прэзідэнцкіх выбараў 2006 году”. Паводле Сухарэнкі, “шэраг заходніх дзяржаваў, асабліва ЗША, апошнім часам ня раз заяўлялі, што зацікаўленыя ў зьмене ўлады ў Беларусі падчас прэзідэнцкіх выбараў на ўзор “каляровых” рэвалюцыяў у іншых краінах СНД”. Кіраўнік КДБ заявіў, што ЗША выкарыстоўваюць рэсурсы міжнародных і замежных недзяржаўных арганізацыяў для падрыхтоўкі сьпецгрупаў, якія мяркуецца задзейнічаць для арганізацыі масавых вулічных выступаў у Беларусі. Паводле Сухарэнкі, асноўнымі арганізатарамі вулічных выступаў могуць стаць незарэгістраваныя моладзевыя арганізацыі “Малады Фронт” і “Зубр”. Аднак кіраўнік КДБ падкрэсьліў, што галоўнай пагрозай нацыянальнай бясьпецы могуць стаць ня выступы апазіцыі, якая, на ягоны погляд, “расьцярушаная і не карыстаецца падтрымкай у грамадзтве”, а ціск з боку Захаду, які ўзмацняецца. Генерал Сухарэнка назваў планы ЗША і Еўрасаюзу прафінансаваць замежнае тэле- і радыёвяшчаньне на Беларусь “пагрозай нацыянальнай бясьпецы”. Менавіта Сьцяпан Сухарэнка ад імя кіраўніка дзяржавы ўнёс у Палату прадстаўнікоў папраўкі ў Крымінальны кодэкс, якія прадугледжваюць крымі-

нальны перасьлед за арганізацыю масавых беспарадкаў, дзейнасьць ад імя незарэгістраваных арганізацыяў, перадачу замежным дзяржавам і арганізацыям “заведама ілжывых зьвестак” пра Беларусь.

***2 сьнежня*** ўвечары міліцыя абшукала кватэру ***Тэльмана Масьлюкова*** — сябра Партыі БНФ са Сьветлагорску (Гомельская вобласьць). Вобыск праводзілі 6 міліцыянтаў, у тым ліку – Пётр Зыкун (намесьнік начальніка раённага аддзелу міліцыі), Аляксандр Зязётка, Канстанцін Кухарэнка, Дзьмітрый Рагалевіч. Участковы міліцыянт К. Кухарэнка сказаў, што ў пад’езьдзе “пахне наркотыкамі” і што ёсьць запіс тэлефоннага званка ў міліцыю пра выраб наркотыкаў у дадзеным пад’езьдзе, таму яны “хочуць агледзіць некалькі кватэраў”. Міліцыянты прад’явілі ордэр на агляд, але адчынялі шафы, пісьмовыя сталы, тумбы — гэта значыць, фактычна праводзілі не агляд, а вобыск. Адзін з міліцыянтаў хацеў пачаць відэазапіс, але калі Т. Масьлюкоў папрасіў яго прад’явіць пасьведчаньне, камера была выключаная. У выніку былі забраныя нумары трох выпускаў газеты “Рэгіянальныя навіны” (рэдактар — Т. Масьлюкоў), кожны нумар якой не перавышаў 299 асобнткаў, інфармацыйныя бюлетэні і налепкі да Дня салідарнасьці 16 сьнежня, улёткі пра А. Мілінкевіча, некалькі брашураў з рэзалюцыяй ААН аб правах чалавека ў Беларусі, чатыры кнігі “Беларусь — сцэнары рэформаў”, кніга А. Фядуты “Палітычная біяграфія Аляксандра Лукашэнкі”, 5 кампьютарных кампакт-дыскаў. Таксама забраныя 2 капіравальныя апараты. На пытаньне Т. Масьлюкова аб прычыне выняцьця апаратаў Пётр Зыкун адказаў: ён падазрае, што на іх выраблялася друкаваная прадукцыя, “якая затым уначы разносіцца па горадзе”. Па словах П. Зыкуна, калі не пацьвердзіцца, што прадукцыя друкавалася на дадзеных апаратах, то яны будуць вернутыя. Т. Масьлюкоў зьяўляецца таксама старшынёй раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Да друкаванай прадукцыі і дакументацыі ТБМ міліцыя прэтэнзіяў ня мела.

***5 сьнежня*** ў Менску да актывісткі руху “Зубр” ***Юліі Ліскоўскай*** на працу прыйшлі двое, якія прадставіліся супрацоўнікамі КДБ. Яны задавалі пытаньні пра моладзевы рух, яго актывістаў, пра друкаваную прадукцыю і крыніцы фінансаваньня. Пасьля таго, як дзяўчына адмовілася адказваць на пытаньні, супрацоўнікі КДБ перайшлі да абразаў і запалохваньняў: адзін сказаў, што на галаву Ліскоўскай, напрыклад, можа зваліцца цагліна. Акрамя таго, з размовы дзяўчына зразумела, што КДБ вядзе праслухоўваньне тэлефонаў некаторых яе сяброў. Калі Ліскоўская запатрабавала прадставіцца, тыя адказалі, што іх прозьвішчы ведаць ёй не абавязкова.

***5 сьнежня*** сябра Сьветлагорскай раённай арганізацыі Партыі БНФ ***Тэльман Масьлюкоў*** быў выкліканы ў раённы аддзел міліцыі “у якасьці правапарушальніка” для апытаньня па выніках агляду яго кватэры, праведзенага 2 сьнежня. Апытаньне праводзілі начальнік раённага аддзелу міліцыі пал-

коўнік М. Раговіч, намесьнік начальніка маёр П. Зыкун, намесьнік начальніка аддзяленьня правапарадку К. Кухарэнка і участковы інсьпектар, старшы лейтэнант В. Новікаў. Т. Масьлюкову таксама былі зададзеныя пытаньні і запісаныя зьвесткі адносна таго, што ён зьяўляецца сябрам Партыі БНФ і старшынёй рады Сьветлагорскай раённай арганізацыі грамадзкага аб'яднаньня "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны". Зададзеныя былі пытаньні пра тое, што ён ведае пра "палітычныя арганізацыі" — "Белы легіён", "Зубр" і "Мы памятаем", каго з членаў гэтых арганізацыяў ён ведае. Гэтыя пытаньні не адносіліся да агляду кватэры і вынятых рэчаў, таму Т. Масьлюкоў сказаў, што нічога не можа адказаць на іх.

***9 сьнежня*** берасьцейскі грамадзкі дзеяч ***Зьміцер Шыманскі*** дамогся вынясеньня пракуратурай афіцыйнага папярэджаньня ў адносінах да аднаго з супрацоўнікаў Маскоўскага РАУС Берасьця, які 14 кастрычніка ўдзельнічаў уператрусе ў офісе Фонду падтрымкі моладзевых ініцыятываў "Дзедзіч". Кіраўнік "Дзедзіча" З. Шыманскі амаль адразу пасьля кастрычніцкіх падзеяў накіраваў у пракуратуру Маскоўскага раёну скаргу, у якой патрабавалася ўзбудзіць у дачыненьні да міліцыянтаў крымінальную справу. У выніку праведзенай праверкі пракуратура Маскоўскага раёну Берасьця адмовіла грамадзкаму актывісту ва ўзбуджэньні крымінальнай справы па факце незаконных дзеяньняў міліцыянтаў. Разам з тым, пракуратура пагадзілася, што пасьля агляду кватэры і вядзеньня фота- і відэаздымкаў супрацоўнікамі праваахоўных органаў ня быў складзены адпаведны пратакол. У выніку гэтага дазнавальніку Маскоўскага РАУС Міхайлаву было вынесенае афіцыйнае папярэджаньне.

***17 сьнежня*** ўвечары ў кватэру актывіста Партыі БНФ, удзельніка акцыі пратэсту кіроўцаў аўтобусаў ***Андрэя Баранава*** патэлефанаваў невядомы. У гэты час дома была жонка з малым дзіцём. Сам Андрэй Баранаў быў на маршруце, працаваў. Чалавек, які тэлефанаваў, пачаў пагражаць: "Ваш муж у апазіцыйнай партыі, якая выступае супраць існуючай улады, трэба выходзіць з партыі, бо могуць быць дрэнныя наступствы ў будучым". Усяго за вечар у кватэры актывіста Партыі БНФ Андрэя Баранава прагучалі тры тэлефонныя званкі з пагрозамі.

***19 сьнежня*** амбасады Францыі і Нямеччыны выступілі з заявамі з нагоды зьяўленьня сюжэту "Візавы шантаж" у эфіры нядзельнай праграмы беларускага тэлебачаньня "У цэнтры ўвагі". Францускія дыпламаты абураныя тым, што ў сюжэце сьцьвярджалася, нібыта супрацоўнікі гэтай дыпмісіі агітуюць беларускую моладзь удзельнічаць у акцыях апазіцыі. Пра гэта нібыта распавялі журналістам два маладыя чалавекі, якіх зьнялі са сьпіны і прозьвішчы якіх не паведамілі. Паводле словаў гэтых людзей, у "прыватных гутарках" з супрацоўнікамі амбасады ім нібыта раілі "ўдзельнічаць у вулічных акцыях апазіцыі", каб без праблем атрымоўваць візы ў краіны

Еўрасаюзу. “Амбасада Францыі катэгарычна абвяргае факт падобнай размовы. Гэта зьяўляецца часткай грубай прапаганды, якая спрабуе прадставіць грамадзтву Еўрасаюз у выглядзе ворага Беларусі”, – гаворыцца ў заяве амбасады Францыі. Абурэньне выклікаў сюжэт БТ і ў дыпламатаў амбасады Нямеччыны ў Беларусі. Амбасадар Марцін Хэкер назваў сюжэт хлусьнёй, якая “падрывае беларуска-нямецкія стасункі”. “Паказальна тое, што высокапастаўленыя беларускія афіцыйныя асобы, сябры ўраду і парламенту разам са сваякамі ахвотна езьдзяць у Нямеччыну, якую крытыкуюць. Зразумела, дагэтуль яны атрымлівалі звычайна доўгатэрміновую візу для шматразовага ўезду. Пры гэтым мне невядома ніводнага выпадку, каб дэпутат Бундэстагу ці сябра Федэральнага ўраду атрымаў бы аналагічную доўгатэрміновую візу для ўезду ў Беларусь. Але калі асобы, якія прымаюць дзяржаўныя рашэньні, і прадстаўнікі дзяржаўных медыяў кажуць адваротнае, нам цяжка будзе падтрымліваць адносна іх нашае добрасуседзтва ў былым памеры”, – сказаў нямецкі амбасадар спадар Хэкер.

***23 сьнежня*** Аляксандр Лукашэнка загадаў яшчэ больш узмацніць сістэму органаў дзяржаўнай бясьпекі, укамплектаваўшы яе “сапраўднымі чэкістамі” і павысіўшы фінансаваньне КДБ. Такую задачу паставіў Лукашэнка, калі каментаваў новыя прызначэньні ў КДБ: “Я не баюся гэта сказаць напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, і людзі мусяць ведаць, што мы створым моцную сьпецслужбу, каб абараняць інтарэсы дзяржавы і нашага народу”. Паводле бюджэту на 2006 год, на праваахоўныя структуры і сьпецслужбы выдаткавана 760 мільярдаў рублёў альбо болей за 350 мільёнаў даляраў. Аднак у бюджэце не раскрываецца, колькі грошай пойдзе на міліцыю, а колькі на КДБ ці службу бясьпекі прэзідэнта. У беларускага парламента, які зацьвярджаў гэты бюджэт, няма і механізмаў кантролю за выкарыстаньнем гэтых грошай.

***27 сьнежня*** ў адным з менскіх пунктаў абмену валюты з адным з лідэраў Кансерватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ ***Сяргеем Папковым*** адбыўся інцыдэнт: касірка паведаміла, што адна з дадзеных на абмен купюраў фальшывая. Пасьля гэтага Сяргей Папкоў некалькі гадзінаў правёў у міліцыі, дзе даваў сьведчаньні. Затым ў кватэры палітыка правялі вобыск. Міліцыя Савецкага райаддзелу Менску спраўджвала, ці няма ў доме Сяргея Папкова фальшывых грошай. Вобыск у доме Сяргея Папкова адбываўся наступным чынам – сьведчыць намесьнік старшыні КХП-БНФ Юрась Беленькі, які там прысутнічаў: “Глядзелася ўсё: партыйныя дакументы, што знаходзіліся там, гарталіся… Глядзеўся кампутар, раскрываліся файлы, якія ёсьць у кампутары. Калі мы спыталі, каб ведаць стопрацэнтна, на падставе якіх нарматыўных актаў праводзіцца вобыск, і папрасілі зрабіць ксеракопію гэтага дакументу, нам было адмоўлена”. Сам Сяргей Папкоў лічыць, што адбылася правакацыя. Заведзеная крымінальная справа. Паводле пацярпелага, міліцыянты не сьцьвярджалі, што купюра на сто

працэнтаў фальшывая, але толькі мае прыкметы падробкі. Інцыдэнт адбыўся адразу пасьля рэгістрацыі ініцыятыўнай групы старшыні Кансерватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ Зянона Пазьняка.

## 15. Факты жорсткага ці негуманнага абыходжаньня з удзельнікамі масавых акцыяў пратэсту, затрыманымі і зьняволенымі

***7 сакавіка*** стала вядома, што ў вязьня Аршанскай калоніі №8 ***Міхаіла Марыніча*** быў інсульт, паралізаваная правая частка цела. Анатоль Лукашэвіч, начальнік Аршанскай калоніі, пацьвердзіў гэтыя зьвесткі толькі часткова. Ён сказаў, што Міхаіл Марыніч цяпер знаходзіцца ў медычнай частцы калоніі і стан ягонага здароўя “здавальняючы”.

***10 сакавіка*** ў жаночай калоніі УЖ-15/4, што разьмешчаная ў Гомелі на вуліцы Антошкіна, шпіталізаваныя дзясяткі асуджаных жанчын. Сімптомы ва ўсіх мала чым адрозьніваюцца: жанчыны пакутуюць на галаўны боль, высокую тэмпературу і ванітаваньне. У вязьніцы ёсьць свая ўнутраная медычная служба, якая разам з кіраўніцтвам калоніі запрасіла дапамогі ў абласнога цэнтру гігіены і эпідэміялогіі ў справе высьвятленьня прычынаў нечаканага захворваньня. Галоўны ўрач цэнтру Віктар Нараленкаў пацьвердзіў, што іхнія лабаранты ўзялі шмат пробаў у жаночай вязьніцы. Дасьледуюцца паўтары дзясяткі найменьняў прадуктаў харчаваньня, якія выкарыстоўваліся для прыгатаваньня ежы. Што выклікала захворваньне – нейкая кішэчная інфекцыя ці звычайны побытавы бруд, будзе вядома пасьля атрыманьня вынікаў адмысловых дасьледваньняў.

***14 сакавіка*** ў Гародні з ізалятару часовага ўтрыманьня выйшаў ***Вадзім Саранчукоў***, арыштаваны на 10 сутак нібыта за ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу прадпрымальнікаў. Вадзім Саранчукоў сядзеў у халоднай адзіночнай камеры. Першыя чатыры дні яму не дазвалялі перадаць зубную пасту і шчотку і адразу забралі інгалятар, якім Вадзім карыстаўся, бо ў яго астма. Яму пашанцавала, што сур’ёзных прыступаў астмы падчас знаходжаньня за кратамі ў яго не было.

***15 сакавіка*** стала вядома, што родныя ***Міхаіла Марыніча*** ня могуць дабіцца сустрэчы з ім. Пра гэта паведаміў сын палітзьняволенага Павел Марыніч. “Нам сказалі – прыходзьце праз чатыры месяцы. Па нашай інфар-

мацыі, бацька знаходзіцца ў стацыянары бальнічнага ізалятару калоніі №8 і ляжыць у палаце зусім адзін, таму ніякай інфармацыі пра стан ягонага здароўя мы атрымаць ня можам", — сказаў П. Марыніч. 14 сакавіка ў калоніі, дзе адбывае пакараньне палітык, павінен быў сабрацца кансіліум дактароў, каб ацаніць стан здароўя зьняволенага і вызначыць далейшае лячэньне. 11 сакавіка Павел Марыніч накіраваў тэрміновую тэлеграму Генеральнаму пракурору Беларусі Пятру Міклашэвічу, у якой напісаў: "На дадзены момант медыцынская дапамога М. Марынічу з-за адсутнасьці сьпецыялізаваных дактароў не аказваецца, з-за чаго стан здароўя Міхаіла Марыніча кардынальна пагоршыўся. Патрабую неадкладнага пракурорскага рэагаваньня". Ніякага адказу на тэлеграму сын палітыка пакуль не атрымаў. Родныя і адвакат працягваюць дамагацца пераводу Міхаіла Марыніча ў Менск дзеля кампетэнтнага медыцынскага абсьледаваньня.

***21 сакавіка*** у першай палове дня ***Міхаіла Марыніча*** прывезьлі з гарадзкога турэмнага шпіталю ў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр кардыялогіі, дзе прайшоў кансіліюм з удзелам дактароў цэнтру. Сынам Міхаіла Марыніча, аднак, не паведамілі пра вынікі. Убачыцца з бацькам ім удалося толькі здалёк і на вельмі кароткі час. Вось што распавёў малодшы сын Марыніча Павел: "Бачылі яго, прычым спачатку нават не пазналі. Быў апрануты ў чорную турэмную робу, паголеная галава, цягне нагу, вельмі худы, колер твару вельмі нездаровы. Стан ягонага здароўя нас палохае". У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры кардыялогіі ня кажуць пра тое, да якой высновы прыйшлі дактары ў выніку кансіліуму. Там спасылаюцца на лячэбную таямніцу. Пасьля кансіліуму Міхаіла Марыніча адвезьлі ў турэмны шпіталь на вуліцы Кальварыйскай.

***5 траўня Ларыса Барысевіч***, маці пацярпелага ад дзеяньняў амапаўцаў падчас акцыі 26 красавіка чатырнаццацігадовага ***Данілы Барысевіча***, зьвярнулася ў пракуратуру Ленінскага раёну Менску з заявай, ў якой патрабуе ўзбудзіць крымінальную справу і прыцягнуць супрацоўнікаў міліцыі да крымінальнай адказнасьці. Ларыса Барысевіч распавяла, што 26 красавіка яна з сынам Данілам знаходзілася ў Менску на праспекце Скарыны ў раёне перакрыжаваньня з вул. Леніна, збоку назіраючы за мітынгам, які адбываўся там у гэты час. Калі яны ўжо зьбіраліся пакідаць праспект, нечакана на Данілу накінуліся два чалавекі ў форме менскага АМАПу, якія без тлумачэньняў заламалі рукі за сьпіну, так што падлетак закрычаў ад болю, і пацягнулі яго ў суседні двор. Там знаходзіўся аўтобус, у які хлопчыка зацягнулі, нематывавана прымяняючы фізічную сілу. Затым аўтобус паехаў у РУУС Ленінскага раёну, куды была выклікана "хуткая дапамога", паколькі рука хлопчыка моцна апухла. У траўматалагічным аддзяленьні 6 клінічнай бальніцы Данілу была зробленая рэнтгенаграфія, якая паказала пашкоджаньне сьвязачнага апарату правага прамнезапяснага суставу.

***25 траўня Мікола Статкевіч*** абвясьціў галадоўку пратэсту супраць зьневажальных умоваў утрыманьня пад вартай. Палітык лічыць, што супрацоўнікі міліцыі і сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку адмыслова стварылі для яго невыносныя ўмовы існаваньня. Пасьля вынясеньня прысуду яго доўгі час трымалі ў камеры, што ў дзяжурнай частцы міліцыі, а потым доўгі час вазілі ў так званым "аўтазаку" па менскіх вуліцах. Толькі ўначы Міколу Статкевіча прывезьлі ў сьпецпрыёмнік на вуліцу Акрэсьціна. "У камеры яшчэ пяць чалавек. Усе яны не адзін раз пабывалі ў калоніях, але людзі спакойныя. Сярод іх ёсьць адзін хворы на дызентэрыю. Майго досьведу афіцэра, які вазіў салдат з поўначы ў пустыню на стрэльбы, хапае, каб ведаць, што гэта за хвароба. Яго не шпіталізуюць, а чалавеку вельмі кепска. Ужо ўсе прыкметы абязводжваньня. Ён ляжыць пластом. У мяне такое ўражаньне, што жывога хворага чалавека выкарыстоўваюць як бактэрыялягічную зброю, каб аказаць ціск на мяне, каб пагрозай заражэньня прымусіць мяне зьмяніць свае паводзіны. Па-сутнасьці, у мяне ёсьць адзіны сродак спыніць гэты зьдзек з чалавека — абвясьціць галадоўку", — паведаміў Мікола Статкевіч.

***21 чэрвеня*** ў Праваабарончы цэнтр "Вясна" былі перададзеныя лісты і скаргі асуджаных з Мазырскай калоніі строгага рэжыму. Зьняволеныя прасілі перадаць іх у міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, каб тыя зьвярнулі ўвагу на агульнае становішча асуджаных у Беларусі і ў Мазырскай калоніі, у прыватнасьці. У перададзеных лістах утрымліваецца інфармацыя, якая сьведчыць аб тым, як абыходзяцца са зьняволенымі ў турмах Беларусі. Трэба адзначыць, што Беларусь займае адно з першых месцаў у Еўропе па колькасьці асуджаных на душу насельніцтва. Праваабарончы цэнтр "Вясна" працягвае праводзіць маніторынг выкананьня Рэспублікай Беларусь патрабаваньняў Канвенцыі ААН супраць катаваньняў і іншых жорсткіх бесчалавечных ці прыніжаючых годнасьць відаў абыходжаньня ад 10 сьнежня 1984 г., ратыфікаванай нашай краінай. Інфармацыя, зьмешчаная ў лістах, сьведчыць пра тое, што ў Мазырскай калоніі строгага рэжыму ў адносінах да вязьняў выкарыстоўваюцца катаваньні, іншыя жорсткія і бесчалавечныя віды абыходжаньня. Ахвяры гэтых катаваньняў, нягледзячы на патрабаваньні Выканаўча-папраўчага кодэксу Рэспублікі Беларусь, ня маюць магчымасьці зьвярнуцца са сваімі скаргамі ў органы пракуратуры і кіраўніцтва Камітэта па выкананьні пакараньняў. Дадзены стан рэчаў парушае ня толькі дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь, але і прынцыпы, закладзеныя ў Мінімальных стандартных правілах абыходжаньня са зьняволенымі, прынятымі ААН 30 жніўня 1955 г. Як вынікае з лістоў, у месцах пазбаўленьня волі адсутнічае належны кантроль з боку органаў пракуратуры, якая павінна ажыцьцяўляць нагляд за захаваньнем законнасьці ў месцах пазбаўленьня волі. Таксама адсутнічае належная праца з боку Камітэту па выкананьні пакараньняў, жахлівыя ўмовы ўтрыманьня, амаль адсутнічае медыцынская дапамога зьняволе-

ным. Гэта прыводзіць да таго, што ў турмах адбываюцца катаваньні зьняволеных, масавыя галадоўкі пратэсту, сьвядомыя самапашкоджаньні зьняволеных.

***4 ліпеня*** сыны палітзьняволенага ***Міхаіла Марыніча*** сустрэліся з бацькам у турэмным шпіталі, куды яго зьмясьцілі напярэдадні ў сувязі з рэзкім пагаршэньнем зроку. Распавядае Павел Марыніч: “Адчувае ён сябе ня вельмі добра, мы бачылі прыкметы інсульту. Ягоная рука і нага яшчэ не вярнулі былых здольнасьцяў. А інфекцыя вачэй аказалася вельмі сур’ёзнай, ён казаў, што мог застацца бяз зроку”.

***8 ліпеня*** жонка зьніклага аператара расейскага тэлеканалу ОРТ ***Дзьмітрыя Завадзкага Сьвятлана Завадзкая*** падала заяву ў пракуратуру па факце нанясеньня ёй траўмы падчас разгону акцыі на Кастрычніцкай плошчы ў Менску, калі адзін з амапаўцаў у званьні старшыны моцна ўдарыў жанчыну ў твар. Увечары Сьвятлана Завадзкая адчула сябе кепска і вырашыла зьвярнуцца ў бальніцу, каб зафіксаваць нанесеныя ёй пабоі. Паводле словаў медыкаў, у жонкі зьніклага журналіста, хутчэй за ўсё, чэрапна-мазгавая траўма. Сьвятлана Завадзкая не намераная пакідаць гэты выпадак беспакараным, тым больш, што факт зьбіцьця зафіксаваны аператарам Першага расейскага тэлеканалу і паказаны ў тэлеэфірах. За гэтыя дні гледачы тэлеканалаў ОРТ і НТВ ужо некалькі разоў пасьпелі пабачыць, як ўсё адбывалася. Сьпіны амапаўцаў, якія адціскаюць людзей з пляцу, жанчыны, сярод якіх у цэнтры Сьвятлана Завадзкая. Раптам АМАПавец выкідае ўперад левую руку, а за ёй – імгненны ўдар правым кулаком у твар Сьвятланы Завадзкай. У менскай міліцыі ўжо заявілі, што нібыта сама Завадзкая першай напала на міліцыянта і ў якасьці доказу агрэсіўнасьці жанчыны кажуць, што міліцыянт таксама пацярпеў – нібыта Сьвятлана разьбіла яму губу.

***26 ліпеня*** жонку зьніклага беларускага журналіста ***Сьвятлану Завадзкую*** выклікалі для размовы ў пракуратуру Цэнтральнага раёну Менску. Сьледчы цікавіўся падзеямі на Кастрычніцкай плошчы, калі падчас разгону ўдзельнікаў акцыі памяці АМАПавец двойчы ўдарыў жанчыну ў твар. Размова са сьледчым Цэнтральнай пракуратуры Дзьмітрыем Лугіным доўжылася каля гадзіны. Пасьля таго, як Сьвятлана падрабязна апісала сьледчаму ўсё, што тычыцца інцыдэнту, яе зноў накіравалі на медыцынскі агляд. Дагэтуль медыкі канстатавалі ў жанчыны сьляды прынамсі двух удараў у твар, і гэты дыягназ быў пацьверджаны. Таксама падчас размовы са сьледчым Сьвятлана назвала людзей, якія б маглі засьведчыць яе пазіцыю. Нагадаем, жонка зьніклага аператара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага настойвае на тым, што яе першым ударыў АМАПавец і патрабуе прыцягнуць яго да крымінальнай адказнасьці. Прозьвішча гэтага чалавека ёй невядомае, але яго твар ёсьць на стужцы, якую дэманстравалі расейскія

тэлеканалы пасьля інцыдэнту. Паводле Сьвятланы Завадзкай, сьледчы не назваў ёй імя гэтага чалавека. Паводле Сьвятланы Завадзкай, сьледчы папярэдзіў яе, што, хутчэй за ўсё, праверка зацягнецца.

***1 жніўня*** стала вядома, што ***Сьвятлане Завадзкай*** адмоўлена ў завядзеньні крымінальнай справы супраць АМАПаўца, які 7 ліпеня ўдарыў яе ў твар. Пасьля трохтыднёвай праверкі пракуратура прыйшла да высновы, што ў дзеяньнях АМАПаўца няма складу злачынства. Раней прадстаўнікі Менскай гарадзкой управы ўнутраных справаў заяўлялі, што ў інцыдэнце вінаватая сама Сьвятлана Завадзкая, якая, нібыта, справакавала АМАПаўца на бойку, і той мусіў бараніцца. Сьвятлана мае намер абскардзіць рашэньне ў вышэйшай інстанцыі.

**9 жніўня** стала вядома, што ў Сьветлагорску ў мясцовым медвыцьвярэзьніку забіты начальнік зьмены цеплаэлектрацэнтралі 30-гадовы ***Васіль Шаўляленка***. Намесьнік начальніка Сьветлагорскай міліцыі Пётр Зыкун па сутнасьці, адмовіўся ад каментару інцыдэнту ў медвыцьвярэзьніку, намесьнік пракурора Сьветлагорскага раёну Дзьмітры Вараб’ёў паведаміў, што арыштаваны міліцыянт -- адзін з супрацоўнікаў медвыцьвярэзьніку. Супраць яго ўзбуджаная крымінальная справа паводле артыкулу 426-га – перавышэньне ўлады альбо службовых паўнамоцтваў. Імя арыштаванага намесьнік пракурора назваць адмовіўся. Бацька забітага ў медвыцьвярэзьніку Васіля Шавяленкі, былы афіцэр сьветлагорскай міліцыі, які цяпер на пенсіі, распавёў пра абставіны забойства сына: “Я быў у пракурора. Ён мне паведаміў, што гэта адбылося 4 жніўня каля першай гадзіны ночы. Сына даставілі ў выцьвярэзьнік аўтамашынай яго супрацоўнікі. Ён ішоў дадому і метраў 30 не дайшоў да свайго пад’езду. Яго спынілі. Ён прасіўся: “Я тут жыву!” Не, скруцілі, заламалі, павезьлі ў выцьвярэзьнік”. Паводле словаў бацькі забітага, фізічны зьдзек з сына ў выцьвярэзьніку міліцыянты пачалі пасьля таго, як той наважыўся патэлефанаваць дадому: “Галава разьбіта, нос паламаны. Пабоі на галаве, на нагах, на шыі. І вязалі яго -- рукі сінія, што толькі ні рабілі. Ужо мёртвага ўкінулі ў камеру. Там ёсьць нейкі выканаўца абавязкаў дзяжурнага. Ён і задушыў рукамі майго хлопца. Узяў так пад бараду локцем і тры разы душыў. Думаю, што такога злачынства ў нашым аддзеле міліцыі не было ніколі. Ня ведаю, можа, і ў Беларусі не было такога, што ўчынілі тут гэтыя міліцыянты”, – лічыць Міхаіл Шавяленка.

***10 жніўня Сьвятлана Завадзкая*** азнаёмілася з матэрыяламі праверкі сваёй заявы ў пракуратуры Цэнтральнага раёну Менску. Цяпер Сьвятлана Завадзкая ведае прозьвішчы двух АМАПаўцаў, якія давалі тлумачэньні, гэта Давідовіч і Марцінкевіч. У пастанове пракуратуры гаворыцца: “Толькі пасьля атрыманьня ад Завадзкай ўдару ў твар, Давідовіч з мэтай самаабароны і прадухіленьня неправамерных паводзінаў Завадзкай, выкінуў у яе бок рукі і пры гэтым закрануў правай далонью твар. Пры такіх

дзеяньнях складу злачынства ў дзеяньнях Давідовіча не ўтрымліваецца". З матэрыялаў вынікае, што пастанова грунтуецца толькі на паказаньнях міліцыянтаў і самой Завадзкай, ніхто з удзельнікаў акцыі ня быў дапытаны. Дзіўным выглядае і тое, што АМАПавец Давідовіч а палове першай, у ноч з 7 на 8 ліпеня, зьвярнуўся ў другую гарадзкую лякарню, каб зьняць пабоі. Гэта адбылося пасьля таго, як Завадзкая падала скаргу ў пракуратуру, пайшла здымаць пабоі ў медыцынскай установе. Сьвятлана Завадзкая сумняваецца ў аб'ектыўнасьці праведзенай пракуратурай праверкі: "Там жа ўказваецца, што гэта я ўчыніла проціпраўныя дзеяньні і аказваецца нават зьбіла не аднаго амоўнаўца, а двух. Я думаю, што ўсё, што мы будзем абскарджваць, будзе захоўвацца да пэўнага часу і я думаю, што не пры гэтай уладзе такія дзеяньні міліцыі будуць пакараныя, але рана ці позна ім давядзецца адказваць за такія ўчынкі".

***З 28 на 29 жніўня*** ноччу ў Магілёве затрыманы актывіст руху "Зубр" ***Яўген Сувораў*** і дастаўлены ў 1-ае аддзяленьне Ленінскага РУУС. Там у адносінах да актывіста "Зубра" ўжывалі катаваньні, наклаўшы кайданкі, рабілі так званую "ластаўку". Пры гэтым ніякіх дакументаў пра затрыманьне складзена не было. На пытаньне, за што над ім зьдзекваліся, Я. Сувораў атрымаў адказ – для прафілактыкі.

***30 жніўня*** журналіст ***Іван Роман*** накіраваў скаргу ў пракуратуру на нялюдзкія ўмовы ўтрыманьня ў шчучынскім ізалятары. Напярэдадні правядзеньня у Ваўкавыску паўторнага зьезду Саюзу палякаў Івана Романа затрымалі ў Шчучыне разам з актывістам СПБ журналістам Андрэем Пачобутам і пратрымалі суткі ў розных камерах. Разам з І.Романам, як ён піша ў скарзе, сядзелі хворыя на сухоты. Яго самога гэтак пакусалі скочкі, што сьляды добра бачныя праз трое сутак.

***17 верасьня*** адзін з удзельнікаў акцыі пратэсту, якая была разагнаная менскім АМАПам 16 верасьня, шпіталізаваны. Пасьля акцыі ***Мікіта Сасім*** адчуў моцны галаўны боль і зьвярнуўся ў 2-ю клінічную бальніцу. Адтуль малады чалавек быў накіраваны ў 9-ю клінічную бальніцу з дыягназам "чэрапна-мазгавая траўма". Апрача Мікіты Сасіма ў гэты дзень атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасьці яшчэ шэсьць удзельнікаў.

***17 верасьня*** зьбіты супрацоўнікамі АМАПу каардынатар руху "Зубр" ***Мікіта Сасім*** падаў скаргу на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў АМАПу. Заяву прынялі супрацоўнікі Цэнтральнага РУУС г. Менску.

***22 верасьня*** выйшаў са шпіталю актывіст "Зубра" ***Мікіта Сасім***, якога тыдзень таму зьбілі АМАПаўцы падчас акцыі памяці зьніклых палітыкаў. Мікіта Сасім заяўляе, што будзе дамагацца пакараньня праз суд АМАПаўцаў, якія яго зьбілі, паколькі лічыць, што сілу супраць яго ўжылі

незаконна. Прозьвішчаў гэтых міліцыянтаў актывіст "Зубра" ня ведае, але кажа, што пры жаданьні гэта магчыма высьветліць, паколькі яны ёсьць на відэаздымках. Разьбіральніцтва вакол зьбіцьця актывіста "Зубра" вядзе міліцыя Цэнтральнага раёну Менску.

***30 верасьня*** Калегія рэспубліканскай пракуратуры на адмысловым паседжаньні прызнала, што ўмовы утрыманьня асуджаных да абмежаваньня волі ў адкрытых папраўчых калоніях, г.зв. "хіміі", не адпавядаюць патрабаваньням закону. У адкрытых папраўчых установах адбываюць пакараньне больш за 7 тысяч чалавек, альбо амаль кожны пяты асуджаны. Пракуратура Беларусі праверыла ўмовы, у якіх знаходзяцца гэтыя людзі. Чарговым разам высьветлілася, што шматлікія беларускія "хіміі" перанаселеныя, побытавыя ўмовы там не адпавядаюць патрабаваньням закону, шмат хто з вязьняў ня мае сталай працы альбо не атрымлівае своечасова заробку. Пракуратура вырашыла ліквідаваць недахопы праз два асноўных захады. Па-першае, падвысіць патрабавальнасьць да кіраўнікоў гэтых установаў і нават караць іх ў службовым парадку за нядбайнасьць. Па-другое, ужо непасрэдна супрацоўнікам пракуратуры рэкамендавана скарэкціраваць сваю пазіцыю на працэсах, дзе судзьдзі вагаюцца паміж рашэньнем аб абмежаваньні волі і рэальным пазбаўленьнем волі.

***12 кастрычніка*** гарадзенскі прафсаюзны актывіст і журналіст ***Іван Роман*** атрымаў адказ са Шчучынскай раённай пракуратуры, куды ён скардзіўся на ўмовы ўтрыманьня ў міліцэйскім ізалятары ў гэтым райцэнтры. Яго пратрымалі ноч з 26 на 27 жніўня ў цеснай камеры з хворымі на сухоты, дзе яго моцна пакусалі насякомыя. У адказе, падпісаным пракурорам Г.Дыско, гаворыцца, што праз два тыдні ў Шчучыне, куды выклікалі І.Романа, медэксьпертыза не прызнала яго пакусаным насякомымі, хаця ён прадставіў адпаведную даведку са скурна-венералагічнага дыспансэру. А што датычыць ложкаў і пасьцельнай бялізны, дык іх у ізалятары няма таму, што ў міліцыянтаў няма на гэта грошай, адказаў пракурор.

***19 кастрычніка*** ў праваабарончы цэнтр «Вясна» перададзеная заява асуджанага ***Сяргея Карыткіна***, які адбывае пакараньне ў Мазырскай ПК-20, дзе прыводзяцца сьведчаньні нечалавечага абыходжаньня са зьняволенымі. Асуджаны ня змог дабіцца разгляду сваіх скаргаў у адпаведных дзяржаўных інстанцыях, таму апошняй ягонай надзеяй стаўся зварот у праваабарончую незалежную арганізацыю з мэтай прыцягнуць увагу міжнародных структур да стану пенітэнцыярнай сістэмы Беларусі і канкрэтнага выпадку, у прыватнасьці. Каментуе юрыст ***Уладзімір Лабковіч***: "Факты, выкладзеныя ў лісьце, насамрэч могуць мець месца ў нашых папраўчых установах, таму што, на жаль, ні беларускія праваабаронцы, ні міжнародныя ня маюць доступу ў гэтыя месцы. Да нас даволі часта зьвяртаюцца з падобнымі зваротамі, і трэба адзначыць, што катаваньні ў месцах пазбаў-

леньня волі – гэта звычайная зьява. У той жа час трэба адзначыць, што пракуратура, якая мусіць сачыць за надзорам за выкананьнем пакараньня, не надзяляе пэўнай увагі да падобных зьяваў і вельмі зрэдку рэагуе на іх у адпаведнасьці з законам”.

***21 кастрычніка*** Праваабарончы цэнтр “Вясна” заявіў, што ў Беларусі захоўваецца практыка выкарыстаньня катаваньняў у адносінах да ўдзельнікаў мірных вулічных акцыяў. Праваабаронцамі вядзецца адпаведны маніторынг, у якім выкарыстоўваюцца сьведчаньні ўдзельнікаў вулічных акцый, пацярпелых ад дзеяньняў супрацоўнікаў міліцыі; зьвесткі атрыманыя ад актывістаў грамадзкіх арганізацыяў ды палітычных партыяў, якія сутыкнуліся з жорсткім абыходжаньнем з боку праваахоўных органаў. Сярод іх — сьведчаньні актывістаў руху “Зубр”, зьбітых падчас акцыі “Мы памятаем!” 16 верасьня. Сьведчаньні каардынатара праваабарончай службы руху “Зубр” ***Ірыны Тоўсьцік***: “16 верасьня я разам з іншымі прадстаўнікамі грамадзкасьці выйшла на Кастрычніцкую плошчу, каб засьведчыць сваю салідарнасьць з сем’ямі зьніклых людзей і палітвязьняў, і з усімі, для каго неабыякавы лёс Беларусі (16 верасьня 1999 году зьніклі Віктар Ганчар і Анатоль Красоўскі). Супрацоўнікі АМАПу пачалі ачапляць людзей з партрэтамі зьніклых і жорстка адцясьняць з плошчы. У адказ на пытаньні, “на якіх падставах?” чулася толькі брудная лаянка і пагрозы фізічнай расправы. Праз некаьлкі хвілінаў пачалі ўжываць фізічную сілу, з усёй моцы наступалі людзям на пяты, заломвалі рукі ўдзельнікам акцыі. Пры гэтым працягвалі лаянку, абразы і пагрозы ў бок людзей з партэтамі. ***Мікіта Шуцянкоў быў*** схоплены за твар, на ім засталіся сьляды ад пальцаў супрацоўнікаў АМАПу. Супрацоўнікі АМАПу, не разьбіраючыся, хто перад імі — хлопец ці дзяўчына, піхалі ў сьпіны, галовы, жываты і грудзі. У выніку ў ***Наталі Ушко*** зафіксаваны ў паліклініцы ўшыб правай нагі ў вобласьці калена. ***Мікіта Сасім*** патрапіў у бальніцу з чэрапна-мазгавой траўмай (пададзеная скарга ў пракуратуру). ***Павел Юхневіч*** і ***Уладзь Несьцер*** атрымалі пабоі ў вобласьць грудзей, сьпіны і ног. У мяне (Ірыны Тоўсьцік) былі сінякі на руках, бо АМАПаўцы моцна хапалі за рукі. На маю думку, значна болей чалавек атрымалі пабоі ў той дзень ад супрацоўнікаў АМАПу. Аднак ня ўсіх удалося знайсьці, каб зафіксаваць пабоі”.

Сьведчыць удзельніца акцыі ***Ушко Наталя***: “Я ўдзельнічала ў ланцугу неабыякавых людзей 16 верасьня, прысьвечаным гадавіне зьнікненьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Супрацоўнкі АМАПу пачалі выцягваць людзей, ужываючы фізічную сілу, а таксама абражалі і пагражалі фізічнай расправай. У выніку ў мяне ў бальніцы зафіксавалі ўшыб правай нагі ў вобласьці калена, акрамя гэтага, супрацоўнікі АМАПу мне парвалі джынсы, а таксама сьпецыяльна наступалі на ногі, білі ў грудзі”.

Сьведчыць ***Шуцянкоў Мікіта***: “Я ўдзельнічаў на Кастрыніцкай плошчы ў акцыі, якая была жорстка разагнаная супрацоўнікамі АМАПу. Яны лаяліся матам, супраць удзельнікаў акцыі ўжывалі грубую фізічную сілу:

білі па нагах, па нырках, піхалі ў сьпіну. Адзін з іх скінуў з маёй галавы кепку і ўдарыў мяне па твары, потым я атрымаў удар па правай назе, пасьля чаго нага балела некалькі дзён, і на ей быў кровападцёк".

Сьведчыць ***Юхневіч Павел***: "16 верасьня я браў удзел у акцыі, прысьвечанай зьніклым людзям у Беларусі. А 18-ай гадзіне я, як і ўсе ўдзельнікі акцыі, стаў з партрэтам на Кастрычніцкай плошчы. Праз некалькі хвілінаў да нас падбеглі супрацоўнікі АМАПу і без тлумачэньнў пачалі выціскаць з плошчы. Мяне і яшчэ некалькіх удзельнікаў, адціснулі да Палацу рэспублікі, пасьля чаго, узяўшы нас у кола, супрацоўнікі міліцыі пачалі біць нас на галаве, нырках, нагах. Падчас зьбіцьця яны абражалі нас і пагражалі".

***1 лістапада*** кіраўніка грамадзянскай ініцыятывы "Партнёрства" ***Мікалая Астрэйку*** перавялі са сьпецпрыёмніка-разьмеркавальніку ў 2-ю бальніцу г. Менску. У Астрэйкі пасьля некалькіх дзён знаходжаньня ў камеры узьніклі праблемы з ныркамі. Нагадаем, што ён арыштаваны на 15 сутак за арганізацыю ўстаноўчага сходу ініцыятывы "Партнёрства".

***11 лістапада*** суд Цэнтральнага раёну Менску не задаволіў скаргу ***Сьвятланы Завадзкай*** на сьледчых пракуратуры Цэнтральнага раёну. Жонка зьніклага аператара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага скардзілася ў суд па прычыне таго, што не была заведзеная крымінальная справа супраць АМАПаўца Юрыя Давідовіча, які зьбіў яе падчас акцыі напаміну пра зьніклых апазіцыянераў на Кастрычніцкай плошчы 7 ліпеня. Пачалося паседжаньне з таго, што судзьдзя Валеры Есьман ня даў дазволу праваабаронцы Алегу Гулаку абараняць у судзе інтарэсы Сьвятланы Завадзкай. Далей суд прагледзеў відэастужку тых падзеяў. Але, паводле Сьвятланы Завадзкай, відэастужка была змантажаваная: "Аказалася, што стужка часткова сьцёртая. Раней пасьля моманту, як мяне ўдарыў міліцыянт, быў добра відаць ягоны твар. На твары няма ніякіх сьлядоў сутычкі, няма крыві ці драпінаў. Але замест гэтага кавалка ў стужцы зьявіўся запіс нейкай праграмы ОРТ. Пракурор сказаў, што такую стужку з ОРТ перадалі ў пракуратуру, але ў судзе прысутнічалі прадстаўнікі бюро ОРТ у Беларусі. Яны пацьвердзілі, што ў стужцы, якую перадалі ў пракуратуру, гэтага кавалку не было. Увогуле, іх стужка была на 35 хвілінаў, а тут паказалі фрагмент толькі на дзьве хвіліны. Таму я лічу, што матэрыялы праверкі яўна сфальшавалі". Пасьля вывучэньня іншых дакументаў судзьдзя Валеры Есьман агучыў вердыкт, паводле якога скарга Сьвятланы Завадзкай на пракуратуру не задаволеная.

***15 лістапада*** палітвязень ***Міхаіл Марыніч*** атрымаў інваліднасьць другой ступені. Інвалідам другой групы прызналі зьняволенага былога міністра і амбасадара Міхаіла Марыніча дактары з адмысловай камісіі Міністэрства аховы здароўя, якія агледзелі вязьня. Пра гэта паведаміла жонка Міхаіла Марыніча Тацяна, якая сустракалася з ім у калоніі. Былы міністр

і амбасадар Міхаіл Марыніч праходзіць курс лячэньня ў рэспубліканскім турэмным шпіталі пры менскай калоніі, дзе ён адбывае пакараньне.

***21 лістапада*** ў Менску быў затрыманы каардынатар Моладзі БНФ ***Алесь Каліта*** за распаўсюд газеты “Народная воля”. Пры затрыманьні была ўжытая фізічная сіла, Алесю пашкодзілі руку. Затрыманьне ажыцьцяўляў сяржант міліцыі Іван Дулуб. Пасьля таго, як Алесь Каліта быў дастаўлены ў РУУС Савецкага раёну, на яго быў складзены пратакол па арт.156 КаАП (дробнае хуліганства). Пры гэтым Алесю ў пастарунку зрабілася кепска з-за вывіхнутай рукі, і супрацоўнікі міліцыі былі вымушаныя выклікаць “хуткую дапамогу”, якая даставіла яго ў бальніцу. “У выпадку з Алесем Калітой затрыманьне абсалютна незаконнае, бо “Народная воля” – афіцыйна зарэгістраваная газета, і ніхто не прымаў рашэньняў пра забарону яе распаўсюду, – пракаментаваў сітуацыю юрыст Валянцін Стэфановіч. — І калі супрацоўнік міліцыі (у дадзеным выпадку ён адзін) затрымаў і пашкодзіў руку Каліце, то пасьля яго калегі зразумелі, што ўчыненае незаконное дзеяньне і вырашылі скласьці пратакол па арт. 156 КаАП – дробнае хуліганства. Гэта вельмі пашыраная практыка супрацоўнікаў міліцыі. Калі яны бачаць, што затрымаць няма за што, альбо разумеюць, што ўчынілі незаконнае затрыманьне, тады яны пачынаюць “выходзіць з сітуацыі” – складаць пратакол за дробнае хуліганства. Як паказвае практыка, у судовым парадку вельмі цяжка аспрэчваць пратакол і рапарты супрацоўнікаў міліцыі, складзеныя паводле гэтага артыкулу. Некалькі супрацоўнікаў міліцыі напішуць, што чулі, як “правапарушальнік” лаяўся матам у адрас супрацоўнікаў міліцыі. А чалавек быў адзін і сьведкаў у яго няма. Адпаведна суд прымае рашэньне на падставе сьведчаньняў супрацоўнікаў міліцыі”.

***28 лістапада*** арыштаванага прадпрымальніка ***Мікалая Аўтуховіча*** агледзеў кансіліум дактароў, які прызнаў, што ягоны стан пасьля 46 дзён галадоўкі вельмі сур’ёзны. Дактары адзначылі, што калі ён ня згодзіцца легчы пад кропельніцу і ня скончыць галадоўку, яго варта будзе пакласьці ў шпіталь. Дактары свае высновы накіравалі ня толькі кіраўніцтву турмы, але і сьледчаму ўпраўленьня фінансавых расьсьледаваньняў, а таксама ў пракуратуру, якая павінна ажыцьцяўляць нагляд за сьледзтвам.

***15 сьнежня*** прадпрымальнік ***Мікалай Аўтуховіч*** пераведзены з гарадзенскай турмы ў рэспубліканскі турэмны шпіталь у Менск. 63 дні таму ён абвясьціў галадоўку, пратэстуючы супраць свайго арышту. Вядома, аднак, што напярэдадні ў выніку працяглай галадоўкі стан Мікалая Аўтуховіча пагоршыўся, яму было цяжка ўзьнімацца з ложка і хадзіць, узьніклі праблемы са зрокам.

# 16. Праваабарончая дзейнасьць. Ціск на праваабаронцаў і праваабарончыя арганізацыі

***19 студзеня*** Міністэрства юстыцыі вынесла пісьмовае папярэджаньне Радзе РГА ***"Беларускі Хельсінскі камітэт"*** (БХК). Па выніках праверкі дзейнасьці Гомельскага аддзяленьня БХК упраўленьне юстыцыі Гомельскага аблвыканкаму заявіла, што прыём і выхад з арганізацыі ў аддзяленьні адбываецца з парушэньнямі Статуту, а таксама што на выбарчыя ўчасткі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у кастрычніку 2004 году Гомельскім аддзяленьнем накіроўваліся ў якасьці назіральнікаў асобы, якія быццам бы не зьяўляліся на той момант сябрамі БХК. Міністэрства юстыцыі таксама лічыць, што Берасьцейскае абласное аддзяленьне БХК з 1 лістапада 2003 году "фактычна ня мае юрыдычнага адрасу", паколькі дамова субарэнды паміж аддзяленьнем БХК і Берасьцейскай абласной арганізацыяй БСДП (НГ), прадстаўленая ва ўпраўленьне юстыцыі Берасьцейскага аблвыканкаму, быццам бы ня мае юрыдычнай моцы. "Улады ідуць выпрабаваным шляхам, выносячы папярэджаньні па чыста фармальных прычынах. Рэжым пераўтварае нас у класічных дысідэнтаў", — пракаментавала вынясеньне папярэджаньня старшыня БХК Тацяна Процька.

***21 студзеня*** сябры БХК ***Васіль Берасьнеў*** і ***Сяргей Трафімаў*** запатрабавалі ад былога Старшыні Аршанскай акруговай выбарчай камісіі 5 мільёнаў рублёў у якасьці кампенсацыі за нанесеную маральную шкоду падчас падвядзеньня вынікаў парламенцкіх выбараў восеньню 2004 году. Актывісты былі накіраваныя адным з рэспубліканскіх выданьняў для асьвятленьня падзеяў, што адбываліся падчас галасаваньня па 26-й акрузе гораду, дзе ЦВК прызначыла паўторны падлік галасоў у сувязі з тым, што выніковы пратакол акруговай камісіі ня быў падпісаны двума яе сябрамі. Аднак журналісты да перападліку дапушчаныя не былі па загадзе старшыні Аршанскай акруговай выбарчай камісіі Алега Казлова. Мясцовая пракуратура падтрымала грамадзкіх дзеячоў і вынесла сп.Казлову папярэджаньне. Але на гэтым пацярпелыя вырашылі не спыняцца. На іхнюю думку, выдаленьне з участку, дзе адбываўся перападлік галасоў, ня толькі парушыла заканадаўства аб выбарах, але і перашкодзіла выкананьню абавязкаў журналістаў, у сувязі з чым яны накіравалі скаргу ў суд.

***28 студзеня*** стала вядома, што ўрад Беларусі накіраваў у Жэневу "інфармацыю ў адносінах паведамленьня, якое паступіла ў Камітэт ААН па правах чалавека ад А.В.Бяляцкага". Адказ ураду зьвязаны з тым, што працягваецца працэдура разгляду скаргі ў Камітэце па правах чалавека

ААН па справе аб ліквідацыі ***Грамадзкага аб'яднаньня "Праваабарончы цэнтр "Вясна".*** У адпаведнасьці з працэдурай быў дасланы запыт ураду Беларусі, той, ў сваю чаргу, накіраваў у Камітэт непраўдзівую інфармацыю, якая, па сутнасьці, супадае з рашэньнем Вярхоўнага суда аб ліквідацыі "Вясны ". "Яны перапісалі фактычна рашэньне суда, — каментуе юрыст Праваабарончага цэнтру "Вясна" Валянцін Стэфановіч. — У адказе Ураду сьцьвярджаецца, што "Вясна" была ліквідаваная за парушэньне ў 2001 годзе выбарчага заканадаўства. Парушэньне гэтае, паводле меркаваньня чыноўнікаў, пацьвярджаецца папярэджаньнем Міністэрства юстыцыі ад 28 жніўня 2001 году і пастановай Цэнтральнай камісіі ад 8 верасьня 2001 году. У пастанове ЦВК на падстве дадзеных праверкі Міністэрства юстыцыі і пракуратуры Рэспублікі Беларусь былі зробленыя высновы, што "Вясна" парушыла нормы выбарчага заканадаўства пры накіраваньні назіральнікаў на выбарчыя ўчасткі падчас выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2001 годзе. Урад абвяргае сьцьвярджэньні А.Бяляцкага пра тое, што былі парушаныя прынцыпы роўнасьці перад судом і права на справядлівае разьбіральніцтва незалежным судом. Мы напісалі ў Жэневу свае каментары да адказу ўраду. Мы зноўку абвяргаем гэта і сьцьвярджаем, што суд не зьяўляўся незалежным і рашэньне суда было палітычна матываванае. Акрамя таго, урад абыходзіць увагай арт. 117 Выбарчага кодэксу, на які мы спасылаліся ў судзе. Гэта значыць, што дзейнасьць грамадзкіх арганізацыяў рэгулюецца Законам "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях". Гэты закон па пунктах прадуглежвае выпадкі, у якіх арганізацыя можа быць ліквідаваная. Ніводны з гэтых пунктаў Праваабарончы цэнтр "Вясна" не парушыў на працягу сваёй дзейнасьці. Таму мы лічым, што рашэньне суда было незаконным. І факт таго, што рашэньне было палітычным, мы пацьвярджаем і заключэньнем FIDH (Міжнародная федэрацыя правоў чалавека), эксьперты якога праводзілі маніторынг судовага паседжаньня і прыйшлі да высновы, што рашэньне было палітычна матываваным".

***1 лютага*** адбылася сустрэча праваабаронцаў з Утай Цапф – старшынёй сьпецыяльнай Працоўнай групы Парламенцкай асамблеі (ПА) АБСЕ па Беларусі. У сустрэчы прымалі ўдзел прадстаўнікі ***ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"*** (БАЖ), ***РГА "Беларускі Хельсінскі камітэт", "Незалежнага таварыства прававых дасьледаваньняў", Праваабарончага цэнтру «Вясна»*** і інш. Абмяркоўваліся пытаньні, зьвязаныя з забесьпячэньнем права на свабоду асацыяцыяў на фоне падрыхтоўкі новай рэдакцыі Закону «Аб грамадзкіх аб'яднаньнях»; грубыя парушэньні правоў грамадзянаў на свабоду сходаў; павелічэньне фактаў выкарыстаньня катаваньняў у адносінах да грамадзянаў краіны, якія затрымліваюцца пасьля акцыяў пратэсту; увядзеньне новага дыскрыімнацыйнага закону пра СМІ, у выніку якога на незалежнай прэсе будзе пастаўлены крыж; сітуацыя са свабодай слова ў Беларусі і крымінальны перасьлед журналістаў за "паклёп" і "абразу" ў дачыненьні да прэзідэнта. Ішла гавор-

ка і пра недасканалае выбарчае заканадаўства, у прыватнасьці, што вельмі важна настойваць на выкананьні «чатырох умоваў» АБСЕ, якія дагэтуль ня выкананыя і зьяўляюцца актуальнымі, а таксама пра неабходнасьць унясеньня зьменаў у выбарчае заканадаўства з улікам рэкамендацыяў, зробленых падчас папярэдніх выбарчых кампаніяў.

***1 лютага***, праз некалькі месяцаў пасьля завяршэньня выбараў у парламент, пракуратура Глускага раёну вынесла афіцыйнае папярэджаньне старшыні аднаго з выбарчых камісіяў Бабруйскай сельскай акругі за ігнараваньне зваротаў грамадзянаў. У першы дзень датэрміновага галасаваньня на парламенцкіх выбарах ***“Глускі раённы клуб выбаршчыкаў”*** і мясцовае прадстаўніцтва ***“Беларускага Хельсінскага камітэту”*** вылучылі назіральнікаў на выбарчыя ўчасткі ў Глуску і сельскім раёне. Аднак ва ўчастковых камісіях спаслаліся на недакладнае афармленьне пратаколаў і з гэтай нагоды ў назіраньні адмовілі. На заявы прадстаўнікоў арганізацыяў некаторыя старшыні нават не адказвалі. Тады са скаргай яны зьвярнуліся ў раённую пракуратуру. У выніку пракуратура аб’явіла афіцыйнае папярэджаньне старшыні Гагарынскай участковай камісіі Валянціне Дашкевіч у сувязі з парушэньнем закону “Аб зваротах грамадзянаў”.

***15 лютага Зьміцер Салаўёў*** быў выкліканы ў пракуратуру горада Наваполацку, дзе ад яго запатрабавалі тлумачэньняў наконт праваабарончай дзейнасьці і выпуску бюлетэню “Наша права”. Падставай для гэтага стала заява Наваполацкага гарвыканкаму, падпісаная старшынёй Аляксандрам Камаровым, у якой сьцьвярджаецца, што у Наваполацку ў вялікай колькасьці распаўсюджваецца праваабарончы бюлетэнь “Наша права”, дзе зьмешчана абвестка Салаўёва аб бясплатнай дапамозе людзям у выпадку парушэньня іх правоў. Гарвыканкам зьвярнуўся ў пракуратуру з просьбай разабрацца з гэтым і даць прававую адзнаку дзеяньням Салаўёва. Карыстаючыся артыкулам 27 Канстытуцыі РБ, Дзьмітры Салаўёў адмовіўся адказваць на пытаньні. Цікава, што нумар “Нашага права”, які выклікаў такую нервовую рэакцыю гарвыканкаму, быў прысьвечаны падзеям ва Украіне – з падрабязным апісаньнем спробаў фальсіфікацыі выбараў з боку Януковіча і пераможным адказам на гэта ўкраінскага народу.

***15 лютага Людміла Гразнова*** паведаміла, што сьледчы з аддзелу нагляду за выкананьнем заканадаўства ў СМІ Павел Радзівонаў цікавіўся, адкуль яна ўзяла інфармацыю для складаньня маніторынгу парушэньня правоў чалавека. На думку праваабаронцы, было б больш лагічна праверыць інфармацыю, выкладзеную ў маніторынгу, і ўжыць меры пракурорскага рэагаваньня да тых, хто парушае грамадзянскія правы ў Беларусі.

***15 лютага*** дэпутат Маларыцкага раённага Савету, праваабаронца

***Уладзімір Малей*** быў выкліканы ў пракуратуру г. Маларыта, дзе пракурор Біліцкі ўручыў яму пастанову аб узбуджэньні супраць яго крымінальнай справы "за распаўд заведама ілжывых, ганьбячых зьвестак, распаўсюджаных у друкаваным выданьні інфармацыйнага бюлетэню "Наша слова" у адносінах да старшыні Маларыцкага райвыканкаму Казіміра Лапіча па ч.2 арт. 188 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Справа датычыць дэпутацкага запыту У. Малея (быў таксама надрукаваны ў дэпутацкім лістку "Наша слова"), у якім ён указаў на тое, што былы старшыня Маларыцкага райвыканкаму А. Няхаеў пасьля пераводу яго на іншае месца працы (старшыні Івацэвіцкага райвыканкаму) незаконна пакінуў за сабой службовае жыльлё ў Маларыце. У Маларыцкім райвыканкаме нават ня ставілася пытаньне аб вызваленьні ім службовага жыльля ў сувязі са сканчэньнем дамовы найму. Цяперашні старшыня Маларыцкага райвыканкаму Казімір Лапіч ня толькі не прыняў належных мераў па захаваньні законнасьці, але і вылучыў на адрас Уладзіміра Малея абвінавачаньні ў паклёпе.

***17 лютага*** Рада рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня ***"Беларускі Хельсінскі Камітэт"*** разгледзела пісьмовае папярэджаньне, вынесенае Міністэрствам юстыцыі ў студзені 2005 г., у якім Мінюст прызнаў незаконным накіраваньне ў якасьці назіральнікаў асобаў, якія не зьяўляліся членамі БХК, і накіраваньне прадстаўнікоў БХК для абароны правоў асобаў, якія не зьяўляліся сябрамі аб'яднаньня, а таксама выказаў прэтэнзіі да юрыдычнага адрасу Берасьцейскага аддзяленьня БХК. Аналіз Выбарчага кодэксу (ВК) сьведчыць, што заканадаўца дакладна разьмежаваў паняцьці "прадстаўнік аб'яднаньня" і "прадстаўнік з ліку сяброў аб'яднаньня". Так, згодна з ч. 1 арт. 35 ВК, палітычныя партыі, іншыя грамадзкія аб'яднаньні могуць накіроўваць у склад выбарчых камісій прадстаўнікоў толькі з ліку сваіх членаў. Аднак у адносінах да права накіроўваць назіральнікаў падобных абмежаваньняў не ўстаноўлена. У адпаведнасьці з ч. 3 арт.13 ВК, назіральнікамі на выбарах ва ўстаноўленым парадку накіроўваюцца прадстаўнікі грамадзкіх аб'яднаньняў. Таму ў якасьці назіральнікаў за падрыхтоўкай і правядзеньнем выбараў грамадзкае аб'яднаньне мае права накіроўваць сваіх прадстаўнікоў не толькі з ліку сваіх членаў. У адпаведнасьці са Статутам, галоўная мэта БХК – абарона ў Беларусі правоў чалавека, гарантаваных Канстытуцыяй, дзеючым заканадаўствам, а таксама Хельсінскімі пагадненьнямі, іншымі міжнароднымі дамовамі аб правах чалавека, інфармаваньне грамадзкасьці аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і сьвеце. Дзеля рэалізацыі гэтай мэты БХК мае права прадстаўляць і абараняць правы і законныя інтарэсы асобаў, якія лічаць, што іх правы парушаныя, і якія зьвярнуліся ў адпаведным парадку ў БХК, у судах, дзяржаўных, гаспадарчых і грамадзкіх органах і арганізацыях (п. 3.1 Статуту). Дадзеныя статутныя палажэньні цалкам адпавядаюць нацыянальнаму заканадаўству і міжнародным стандартам. Палажэньні п. 2 арт. 22 Закону "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях" не забараняюць праваба-


Праваабарончы Цэнтр «ВЯСНА»

рончаму аб'яднаньню працаваць дзеля дасягненьня сваіх статутных мэтаў, а ўстанаўліваюць агульныя для любых грамадзкіх аб'яднаньняў мінімальныя правы абараняць сваіх сяброў незалежна ад статутных мэтаў самога аб'яднаньня. Такім чынам, у дадзенай частцы вынесенае БХК папярэджаньне супярэчыць заканадаўству і неабгрунтавана абмяжоўвае правы БХК, і Рада БХК прыняла рашэньне падаць адпаведную скаргу ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь. Аналіз прэтэнзіяў Міністэрства юстыцыі да юрыдычнага адрасу Брэсцкага аддзяленьня БХК паказвае, што беларускім заканадаўствам устаноўлены надзвычай жорсткія патрабаваньні да дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў, а іх фармальнае парушэньне зьяўляецца падставай для прымяненьня адміністрацыйных санкцый і ліквідацыі аб'яднаньняў. У гэтых умовах дзеля ліквідацыі парушэньняў, адзначаных у папярэджаньні, і ня маючы магчымасьці надалей гарантавана забясьпечыць безумоўнае выкананьне ўсіх патрабаваньняў рэгіянальнымі аддзяленьнямі, Рада БХК вырашыла ліквідаваць іх ва ўстаноўленым парадку і ўнесла адпаведныя зьмены ў Статут БХК. Праваабарончая праца ў рэгіёнах краіны будзе весьціся ўпаўнаважанымі прадстаўнікамі БХК.

***22 лютага Праваабарончы цэнтр "Вясна"*** сумесна з ***Міжнароднай Федэрацыяй правоў чалавека*** (FIDH) — недзяржаўнай арганізацыяй, якая мае сьпецыяльны кансультацыйны статус у Эканамічным і Сацыяльным Савеце ААН (ECOSOC), падрыхтавалі зварот да 61-ай Сесіі Камісіі ААН па правах чалавека. У дакуменце адлюстраваныя асноўныя факты парушэньняў правоў чалавека за 2004 год. Праваабаронцы адзначаюць, што ўзмацніліся рэпрэсіі супраць апанентаў рэжыму, былі прынятыя новыя дыскрымінацыйныя законы, працягваліся парушэньні правоў на свабоду асацыяцыяў, мірных сходаў і свабоду слова. А таксама, што выбары 2004 году былі далёкія ад дэмакратычных стандартаў. У сумесным звароце "Вясны" і FIDH зьвяртаецца ўвага на тое, што на працягу 2004 году сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі значна пагоршылася. Улічваючы, што прагрэсу ў галіне правоў чалавека ў Беларусі не назіраецца, "Вясна" і FIDH заклікаюць Камісію па правах чалавека прыняць Рэзалюцыю па правах чалавека ў Беларусі, а таксама працягнуць мандат сьпецыяльнага дакладчыка па Беларусі да разгляду чарговага Даклада на 62-ой Камісіі. А таксама зьвярнуцца да ўладаў з наступнымі рэкамендацыямі: выкарыстоўваць сьпецыяльныя механізмы Камісіі па правах чалавека, гарантаваць незалежнасьць судовай уладзе, улічыць рэкамендацыі Працоўнай групы ААН, зрабіць неабходныя крокі па расьсьледваньні выпадкаў зьнікненьняў палітычных апанентаў і перадаць вінаватых у гэтых злачынствах незалежнаму суду, гарантаваць свабоду слова, асацыяцыяў і мірных сходаў у адпаведнасьці з міжнароднымі і рэгіянальнымі стандартамі ў галіне правоў чалавека. Праваабаронцы патрабуюць спыніць у Беларусі перасьлед іншадумцаў, ліквідацыю НДА і адукацыйных установаў, прызнаць роль праваабаронцаў у полі дэмакратыі ў адпаведнасьці з "Дэклара-

цыяй аб праваабаронцах”, прывесьці ў адпаведнасьць міжнародным стандартам Закон аб асацыяцыях, ліквідаваць сьмяротнае пакараньне. З падобнымі прапановамі Праваабарончы цэнтр “Вясна” і FIDH зьвярнуліся і да сьпецыяльнага дакладчыка па Беларусі.

***22 лютага*** на офіс да праваабаронцы ***Зьміцера Салаўёва*** ў Наваполацку зьявіліся супрацоўнікі падатковай інсьпекцыі, якія заявілі прысутным, што “некаторыя органы цікавяцца вашай дзейнасьцю”. Апрача таго, правяраючых цікавіла, ці аказваюць праваабаронцы платныя юрыдычныя паслугі. Праверку ажыцьцяўлялі Зьміцер Цымбалюк, Андрэй Аляксеенак, Віталь Ушакоў.

***23 лютага*** сьледчы па асабліва важных справах Менскай гарадзкой пракуратуры Аляксей Пікараў на месяц працягнуў тэрмін сьледзтва па крымінальнай справе ў дачыненьні да намесьніка старшыні ***Беларускага Хельсінскага камітэту Гары Паганяйлы,*** якога падазраюць ў паклёпе на прэзідэнта. Прычынай гэтага, паводле словаў сьледчага, стала тое, што Гары Паганяйла “загрузіў сьледзтва вельмі сур’ёзнымі дакументамі і матэрыяламі”. Г.Паганяйла яшчэ ў сьнежні 2004 году накіраваў Генеральнаму пракурору хадайніцтва аб спыненьні ў дачыненьні да яго крымінальнай справы з-за адсутнасьці складу злачынства. Да хадайніцтва юрыст прыклаў шэраг дакументаў, якія, на яго думку, павінныя пацьвердзіць слушнасьць ягоных аргументаў. Генпракуратура пераадрасавала гэтае хадайніцтва ў пракуратуру г. Менску, даручыўшы сьледзтву вывучыць гэтыя паперы. Нагадаем, справа ў дачыненьні да Г. Паганяйлы па ч. 2 арт. 367 КК РБ (паклёп у дачыненьні да Прэзідэнта РБ, спалучаны з абвінавачаньнем ва ўчыненьні цяжкога злачынства) была ўзбуджаная ў лістападзе 2004 году. Падставай для завядзеньня справы стала інтэрв’ю швецкаму тэлеканалу “ТВ-4”, дзе Г. Паганяйла выказваў падазрэньні наконт спрычыненасьці вышэйшых дзяржаўных кіраўнікоў (у тым ліку і Аляксандра Лукашэнкі) да зьнікненьняў і магчымых забойстваў беларускіх апазіцыйных лідэраў. Калі замежны журналіст выязджаў з нашай краіны, стужку з відэазапісам забралі беларускія мытнікі.

***24 лютага*** ў Маскве з ініцыятывы Савету па зьнешняй і абароннай палітыцы адбыўся круглы стол “Правы чалавека ў Рэспубліцы Беларусь”. Расійскі бок на дадзеным мерапрыемстве быў прадстаўлены кіраўніком Савету Сяргеем Караганавым, упаўнаважаным па правах чалавека Уладзімірам Лукіным, кіраўніком Камісіі па правах чалавека пры прэзідэнце Расейскай Федэрацыі Элай Памфілавай, дырэктарам Інстытуту па правах чалавека Валянцінам Гефтэрам і шэрагам вядомых грамадзкіх дзеячоў, палітолагаў. З Беларусі ў круглым стале ўзялі ўдзел старшыня Беларускага Хельсінскага камітэту ***Тацяна Працька***, юрыст БХК ***Алег Гулак***, прадстаўнік Праваабарончага цэнтру “Вясна” ***Тацяна Рэвяка***, намесьнік

дырэктара НІСЭПД ***Аляксандр Сасноў***, кіраўнік аналітычнага цэнтру "Стратэгія" ***Леанід Заіка***, намесьнік рэдактара газеты "Народная воля" ***Сьвятлана Калінкіна*** і іншыя. Асноўная ўвага засяроджвалася на трох асьпектах: праблема палітычных зьнікненьняў у Беларусі, адсутнасьць свабоды слова і СМІ, пазбаўленьне грамадзянаў Беларусі права ўдзельнічаць у кіраваньні дзяржавай шляхам правядзеньня свабодных выбараў.

***25 лютага*** трое сяброў ***Праваабарончага цэнтру «Вясна»*** накіраваліся ў складзе міжнароднай місіі ENEMO назіраць за правядзеньнем выбараў дэпутатаў парламенту Кыргыскай Рэспублікі.

***28 лютага*** сьледчы па асабліва важных справах пракуратуры Менску Аляксандр Пікараў паведаміў намесьніку старшыні ***Беларускага Хельсінскага камітэту Гары Паганяйлу***, што крымінальная справа супраць яго па частцы 2 артыкулу 367 Крымінальнага кодэксу – "Паклёп у адносінах да прэзідэнта РБ"спыненая за адсутнасьцю складу злачынства. "Гэта вынік маёй сумеснай працы са сьледчым. Я пастараўся максімальна насыціць матэрыялы справы інфармацыяй, дакументамі, якія б пацьвярджалі маю невінаватасьць. Сьледчы, відаць, з-за адсутнасьці судовай персьпектывы крымінальнай справы, параіўшыся з законам і сумленьнем, вырашыў спыніць крымінальны перасьлед," – адзначыў Гары Паганяйла.

***1 сакавіка*** сьпецыяльны дакладчык ААН па правах чалавека ў Беларусі Адрыян Севярын (Румынія) зрабіў заяву, што сітуацыя з парушэньнем правоў чалавека ў Беларусі "ня толькі ўнутраная, мясцовая праблема, але і міжнародная". Адрыян Севярын адзначыў, што адзін з элементаў ягонай стратэгіі як дакладчыка ААН, — "стварыць салідарны падыход да беларускіх праблемаў сярод розных прадстаўнікоў міжнароднай супольнасьці, якія на самой справе могуць нешта зрабіць". "Размова ідзе не пра спробы асобных арганізацыяў зьмяніць нешта, а пра аб'яднаньне высілкаў усяго сьвету", — падкрэсьліў А. Севярын. Палітык адзначыў, што за апошні час сітуацыя з захаваньнем правоў чалавека ў краіне "пагоршылася". Па ягоным меркаваньні, "афіцыйны Менск абсалютна адвяргае магчымасьць дыялогу, і персьпектыва, што гэтая сітуацыя зьменіцца, выглядае сумнеўна". Ён лічыць, што тое, што адбываецца ў Беларусі, неабходна разглядаць "ня толькі як пагрозу правам чалавека, але і як пагрозу бясьпецы краіны і рэгіёну".

***1 сакавіка*** Дзярждэпартамент ЗША адзначыў пагаршэньне сітуацыі ў Беларусі з правамі чалавека. У дакуменце згадваецца пра нерасьсьледаванае зьнікненьне вядомых апазіцыйных дзеячаў, злоўжываньні міліцыі, катаваньні вязьняў і неабгрунтаваныя затрыманьні, "дзедаўшчына" ў арміі ды перанасяленьне турмаў. Дзярждэпартамент зноў канстатаваў, што ўла-

ды Беларусі далей абмяжоўвалі свабоду слова і друку ды не прызнавалі права на аб'яднаньні і сходы ды іншыя парушэньні правоў чалавека.

***4 сакавіка*** намесьнік начальніка ўпраўленьня інфармацыі МЗС Руслан Есін заявіў, што даклад ДзяржДэпартаменту ЗША пра сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі ў цэлым носіць "аднабокі і палітызаваны характар". Па ягоных словах, папярэдняе азнаямленьне з гэтым дакументам паказвае, што ЗША "працягваюць лінію на прадузятае адлюстраваньне сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі". Па ягоных словах, МЗС падрыхтуе разгорнуты камэнтар да дакладу Дзярждэпартаменту ЗША пасьля яго дэталёвага вывучэньня міністэрствамі і ведамствамі Беларусі.

***4 сакавіка*** ў судзе Ленінскага р-ну Гародні адбылося судовае паседжаньне па адміністрацыйнай справе праваабаронцы ***Міколы Лемяноўскага***, затрыманага падчас правядзеньня акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. Згодна з пратаколамі, ён абвінавачваўся ва ўчыненьні дробнага хуліганства (арт.156 КаАП РБ) і непадпарадкаваньні патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі (арт.166 КаАП РБ). Суд прызнаў М. Лемяноўскага вінаватым у абодвух правапарушэньнях і вынес пастанову аб адміністрацыйным арышце на 15 сутак.

***11 сакавіка*** Радай ***Праваабарончага цэнтру "Вясна"*** прынятая заява ў сувязі з пагаршэньнем здароўя палітычнага вязьня Міхаіла Марыніча, у якога 8 сакавіка здарыўся інсульт і які знаходзіцца ў цяжкім, пагражаючым ягонаму здароўю і жыцьцю стане. У сувязі з гэтым Праваабарончы цэнтр "Вясна" запатрабаваў ад уладаў Беларусі неадкладнага вызваленьня Міхаіла Марыніча і прыняцьця неабходных мераў па аказаньні яму кваліфікаванай медыцынскай дапамогі.

***25 сакавіка Праваабарончы цэнтр "Вясна"*** прыняў заяву, у якой адзначыў, што беларускія ўлады выкарыстоўваюць усё больш жорсткія, бязлітасныя і правакацыйныя метады барацьбы са сваімі апанентамі. Праваабарончы цэнтр "Вясна" выказаў надзвычайную занепакоенасьць узмацненьнем рэпрэсіяў супраць прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі на працягу апошніх месяцаў. Адзначаючы сур'ёзнае ўзрастаньне палітычных рэпрэсіяў у Беларусі, Праваабарончы цэнтр "Вясна" зьвярнуўся да беларускай грамадзкасьці, міжнароднай супольнасьці з заклікам праявіць салідарнасьць з перасьледуемымі па палітычных матывах у Беларусі, запатрабаваць ад беларускага рэжыму тэрміновага спыненьня рэпрэсіяў і вызваленьня ўсіх незаконна асуджаных па палітычных матывах зьняволеных. Праваабарончы цэнтр "Вясна" выказаўся за прыняцьце 61 сесіяй Камісіі па правах чалавека ААН адмысловай рэзалюцыі па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, а таксама працягненьне мандату сьпецыяльнага дакладчыка ААН па правах чалавека ў Беларусі.

***29 сакавіка*** ў Жэневе ў Палацы Нацыяў прайшоў брыфінг на тэму «Пятля на шыі грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі», арганізаваны пры дапамозе Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека і Міжнароднай Лігі Правоў Чалавека. У брыфінгу бралі ўдзел беларускія праваабаронцы ***Алесь Бяляцкі, Зьміцер Маркушэўскі, Сьвятлана Завадзкая*** — жонка зьніклага журналіста Дзьмітрыя Завадзкага і іншыя. Выступоўцы асьвятлялі сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі, гаворачы пра такія праблемы, як зьнікненьне вядомых людзей, узмацненьне рэпрэсіяў супраць актывістаў грамадзянскай супольнасьці і прадстаўнікоў палітычнай апазіцыі, парушэньне правоў няўрадавых арганізацыяў, парушэньне лінгвістычных і культурных правоў у Беларусі. Усе выступоўцы падкрэсьлівалі важную ролю міжнароднай супольнасьці ў стрымліваньні і асуджэньні дзеяньняў рэжыму А.Лукашэнкі. Пасьля брыфінгу адбылася іх сустрэча са сьпецдакладчыкам па Беларусі пры Камісіі па правах чалавека Адрыянам Севярынам.

***29 сакавіка*** сьпецыяльны дакладчык па правах чалавека ў Беларусі Адрыян Севярын падчас 61-ай сесіі Камісіі па правах чалавека ААН у Жэневе прадставіў свой даклад па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Даклад утрымлівае крытыку беларускіх уладаў па шэрагу пазіцыяў, што тычацца сітуацыі з захаваньнем правоў чалавека ў Беларусі, а таксама шэраг рэкамендацыяў да беларускага ўраду і міжнароднай супольнасьці. Кіраўнік беларускай дэлегацыі ў ААН С.Алейнік не прызнаў відавочных парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі і заявіў, што даклад моцна палітызаваны, зьневажае беларускі народ, і запатрабаваў ад А.Севярына прынесьці прабачэньні беларускаму народу. У падтрымку пазіцыі Алейніка выступілі прадстаўнікі Расіі, Кубы, Кеніі. Прадстаўнік Кітаю засумняваўся ў дакладнасьці фактаў, пададзеных у дакладзе сьпецдакладчыка, прааргументаваўшы гэта тым, што А.Севярын ня быў на працягу гэтага году ў Беларусі. У падтрымку дакладу выступілі прадстаўнікі ЗША, Люксембургу, які выказаўся ад імя ўсіх краінаў Еўразьвязу, і Канады.

***29 сакавіка Міжнародная ліга правоў чалавека*** (The International League for Human Rights), міжнародная няўрадавая арганізацыя, якая мае адмысловы дарадчы статус пры Эканамічнай і сацыяльнай радзе ААН, накіравала ліст Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку, у якім выказала глыбокую заклапочанасьць з прычыны нядаўняе атакі на свабоду сходаў і выказваньняў у Беларусі пасьля арыштаў і судовых прысудаў удзельнікам мірнай акцыі пратэсту ў Менску. “Бязьлітасны напад Вашага ўраду на палітычную апазіцыю мусіць быць спынены. Беларусь усклала на сябе абавязкі прытрымлівацца міжнародных стандартаў у галіне захаваньня свабоды сходаў і свабоды выказваньняў. Гэтыя прававыя стандарты зьяўляюцца асновай дэмакратычнай грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі і павінны гарантавацца беларускай юрыдычнай сістэ-

май. Беларускія грамадзяне павінны мець права на свабоду дзеяньняў без страху пагрозаў ці рэпрэсіяў з боку ўладаў. Ліга заклікае Вас і Вашых службовых асобаў паважаць асноўныя правы беларускіх грамадзянаў і спыніць Вашыя атакі на грамадзянскую супольнасьць Беларусі", — гаворыцца ў звароце.

***30 сакавіка*** ў Жэневе ў рамках свабоднай альтэрнатыўнай трыбуны была арганізаваная канферэнцыя «Бачыць, асуджаць, пратэставаць: Камісія па правах чалавека мусіць выконваць свае абавязкі». Падчас канферэнцыі абмяркоўвалася эфектыўнасьць механізмаў працы Камісіі па правах чалавека ды іншых інструментаў ААН, якія дазваляюць бараніць правы чалавека ў сьвеце. Сярод выступоўцаў былі прадстаўнікі Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека, Міжнароднай Амністыі, а таксама нацыянальных праваабарончых арганізацыяў з Кітаю, Ірану, Тога, Чылі і Беларусі. Прадстаўнік Беларусі ***Алесь Бяляцкі*** ў сваім выступе падрабязна спыніўся на сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, а таксама зазначыў важнасьць прынятай у мінулым годзе Камісіяй па правах чалавека Рэзалюцыі па Беларусі. Ён зазначыў, што і галоўная задача беларускіх праваабаронцаў, якія прысутнічаюць падчас працы Камісіі – дабіцца разгляду і прыняцьця чарговай Рэзалюцыі па Беларусі, а таксама захаваць пасаду сьпецпрадстаўніка Камісіі па Беларусі.

***30 сакавіка*** ў сваім выступе на брыфінгу (The UN democracy caucus) сьпецыяльны прадстаўнік ААН па правах чалавека ў Беларусі Адрыян Севярын заявіў, што пасьля году працы па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі ў яго засталіся негатыўныя ўражаньні. Палітычныя эліты пэўных краінаў, адзначыў А.Севярын, нават не спрабуюць усталяваць дэмакратыю. Прадстаўнікі Беларусі ў адказ на аб'ектыўную крытыку з розных бакоў заяўляюць, што Беларусь – дэмакратычная краіна, якая і надалей удасканальвае сваю дэмакратычную сістэму. Але такія словы – крывадушша. Таксама А.Севярын зазначыў, што правы чалавека моцна зьвязаныя з палітычнай сістэмай, якая ёсьць у краіне. Недэмакратычная краіна ня будзе разьвіваць правы чалавека і наадварот. Для прыярытэту правоў чалавека заўсёды патрэбныя палітычныя рэформы.

***1 красавіка*** прадстаўнікі беларускіх няўрадавых арганізацыяў са зьдзіўленьнем заўважылі, як адразу пасьля сустрэчаў з нацыянальнымі дэлегацыямі, якія бяруць удзел у працы 61-й сесіі Камісіі па правах чалавека, па іхніх сьлядах ідуць прадстаўнікі афіцыйнай беларускай дэлегацыі і праводзяць «контрсустрэчы», спрабуючы абвергнуць тую інфармацыю па парушэньнях правоў чалавека, якую давалі прадстаўнікі беларускіх НДА. У гэтай гонцы па «гарачых сьлядах» браў удзел асабіста кіраўнік афіцыйнай беларускай дэлегацыі сп.Алейнік.

***1 красавіка*** праваабарончая арганізацыя ***Freedom House*** да працы

61-й Сесіі Камісіі ААН па правах чалавека прадставіла Сьпецыяльны даклад пад назваю «Найгоршыя сярод найгоршых. Найбольш рэпрэсіўныя грамадзтвы ў сьвеце. 2005» (“The worst of the worst” The World“s Most Repressive Societies. 2005). Першай у сьпісе краінаў, якія прыцягнулі ўвагу Freedom House, стаіць Беларусь. Па рэйтынгавай шкале парушэньняў сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі, па ацэнцы Freedom House, у параўнаньні з мінулым годам пагоршылася. Прычынай, па якой Беларусь умацавала свой статус «Несвабоднай» краіны, былі, як лічыць Freedom House, масавыя парушэньні і фальсіфікацыі падчас парламенцкіх выбараў і рэферэндуму ўвосень 2004 году.

***1 красавіка*** ў Гародні сябра ***Беларускага Хельсінскага камітэту Раман Юргель*** аштрафаваны за несанкцыянаваны пікет, які адбыўся ля гарадзенскага абласнога драматычнага тэатру. Раман Юргель стаў на прыступках з плакатам: “Не — захопу Беларусі Расіяй!” На плакаце быў напісаны таксама верш Ніла Гілевіча “Будзьце пракляты вы, каты свабоды!” Р. Юргель пікетаваў з нагоды гэтак званага сьвята “яднаньня з Расіяй”. Акцыя доўжылася каля 15 хвілінаў, бо на месца падзеі прыехалі міліцыянты з Ленінскага райаддзелу міліцыі на чале з маёрам Хілько і забралі спадара Юргеля ў пастарунак для разьбіральніцтва. Суд адбыўся хутка. 50 базавых адзінак — на такую суму аштрафаваны Раман Юргель.

***1 красавіка*** парламент Грузіі выступіў у падтрымку палітычных зьняволеных ***Міхаіла Марыніча, Валерыя Леванеўскага*** і ***Аляксандра Васільева***, а таксама пакараных арыштамі ўдзельнікаў менскай апазіцыйнай акцыі 25 сакавіка. У заяве Камітэту замежных сувязяў грузінскага парламенту зьмешчаны заклік да ўладаў Беларусі “паважаць асноватворныя прынцыпы правоў чалавека і як мага хутчэй вызваліць усіх затрыманых”.

***14 красавіка*** прадстаўлены даклад аб становішчы праваабаронцаў ва ўсім сьвеце. Кожны год у гэты дзень Абсерваторыя па абароне праваабаронцаў, якая з’яўляецца агульным праектам Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека (FIDH) і Сусьветнай Арганізацыі Супраць Катаваньняў (OMCT) прадстаўляюць даклад пра становішча праваабаронцаў у сьвеце (у Беларусі асацыяваным сябрам FIDH зьяўляецца пазбаўлены афіцыйнай рэгістрацыі ў 2003 годзе Праваабарончы цэнтр “Вясна”). Даклад выходзіць на ангельскай, французскай і іспанскай мовах. У гэты дзень праходзяць сьпецыяльныя прэс-канферэнцыі і мерапрыемствы па дадзенай праблематыцы ў многіх краінах сьвету – Дакары, Жэневе, Парыжы, Тунісе, Зімбабве… Мэтай праекту зьяўляецца прыцягненьне ўвагі да праблемаў праваабаронцаў у іх краінах. У дакладзе 2004 году разглядаюцца факты перасьледу і ціску на праваабаронцаў у 90 краінах сьвету. На жаль, канстатуюць аўтары праекту, частка, прысьвечаная Беларусі, становіцца болей насычанай: утрымлівае факты перасьледу, арыштаў, затрыманьнь-

няў і іншых формаў ціску на праваабаронцаў, факты закрыцьця праваабарончых арганізацыяў і забароны на праваабарончую дзейнасьць і іншыя факты, якія адлюстороўваюць рэальнае становішча праваабаронцаў у Беларусі.

***14 красавіка*** Камісія па правах чалавека ААН прыняла Рэзалюцыю па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. За праект рэзалюцыі, прапанаванай Злучанымі Штатамі Амерыкі і Еўрасаюзам, прагаласавалі прадстаўнікі 23 краінаў-сяброў Камісіі ААН, прадстаўнікі 16 краінаў прагаласавалі супраць, 14-ці – устрымаліся. Суаўтарамі ўхваленай рэзалюцыі сталі Балгарыя, Ізраіль, Македонія, Турцыя і Харватыя. Камісія ААН запатрабавала ад беларускіх уладаў дапусьціць у краіну сьпецыяльных прадстаўнікоў Камісіі для вывучэньня шматлікіх абвінавачаньняў у парушэньнях у Беларусі правоў чалавека. Аўтары дакументу выказалі заклапочанасьць у сувязі з магчымым дачыненьнем высокапастаўленых службовых асобаў Беларусі да зьнікненьня лідэраў апазыцыі і журналіста Дзьмітрыя Завадзкага. Рэзалюцыя “настойліва заклікае” ўрад Беларусі звольніць службовых асобаў, падазраваных у дачыненьні да памянёных зьнікненьняў, а таксама правесьці незалежнае і поўнае расьсьледваньне зьнікненьняў. Камісія ААН выказала таксама занепакоенасьць працэсам арганізацыі і правядзеньня выбараў у Беларусі, адвольнымі арыштамі і затрыманьнямі, перасьледам і закрыцьцём няўрадавых арганізацыяў, незалежных мэдыяў і апазіцыйных палітычных партыяў. Рэагуючы на рэзалюцыю, сталы прадстаўнік Беларусі пры міжнародных арганізацыях у Жэневе Сяргей Алейнік адзначыў: “Гэта ні што іншае, як чарговая спроба сфармаваць у міжнароднай супольнасьці скажонае ўяўленьне пра сітуацыю ў нашай краіне, каб апраўдаць жаданьне яе аўтараў умешвацца ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы... Беларусь прынцыпова адмаўляе выкарыстаньне праваабарончай тэматыкі ў мэтах палітычнага ціску на суверэнныя дзяржавы... Мы ня можам прыняць гэтай рэзалюцыі ні па форме, ні па сутнасьці”. Беларускага прадстаўніка падтрымаў сталы прадстаўнік Расейскай Федэрацыі Леанід Скотнікаў, які заклікаў зьняць гэтую рэзалюцыю з галасаваньня. За зьняцьце выступілі таксама прадстаўнікі Кітаю і Кубы, але іх прапанова не прайшла.

***18 красавіка*** на брыфінгу перад прадстаўнікамі мас-медыяў міністр замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў заявіў, што беларускія ўлады ня хочуць бачыць у Менску сьпецыяльнага дакладчыка ААН Адрыяна Севярына. Паводле Мартынава, спадар Севярын на паседжаньні Камісіі па справах правоў чалавека ААН у Жэневе агучыў ня ўласную справаздачу, а кампіляцыю з дакладу Дзярждэпартаменту ЗША. Размове з журналістамі папярэднічала сумеснае паседжаньне сяброў міжнароднай камісіі Палаты прадстаўнікоў і супрацоўнікаў МЗС, на якім шмат увагі аддалі выступу спадара Севярына. Міністр замежных справаў Беларусі ацаніў дак-

лад Адрыяна Севярына надзвычай негатыўна: "Мы ўзаемадзейнічаем шмат з якімі працэдурнымі камісіямі ў справе правоў чалавека, і пры гэтым пасьпяхова – што, дарэчы, і адзначалася на цяперашняй сесіі гэтай камісіі. Што тычыцца канкрэтна так званага адмысловага дакладчыка ў справах Беларусі (у дадзеным выпадку ім зьяўляецца Адрыян Севярын), дык як і раней мы лічылі яго знаходжаньне на тэрыторыі Беларусі недарэчным у гэтай якасьці, так і цяпер мы лічым тое ж самае".

***22 красавіка*** намесьнік старшыні БХК ***Гары Паганяйла***, старшыня грамадзкай арганізацыі "Жаночы незалежны дэмакратычны рух" ***Людміла Пеціна*** і шэф-рэдактар газеты "Народная воля" ***Сьвятлана Калінкіна*** пасьля сустрэчы ў Вільні з дзяржсакратаром ЗША Кандалізай Райс і высокапастаўленым прадстаўніком Еўрапейскага Саюзу Хавіерам Саланам былі пільна абшуканыя на беларускім памежна-прапускным пункце. Што шукалі беларускія мытнікі і памежнікі — невядома, але яны нічога не знайшлі.

***16 траўня Праваабарончы цэнтр "Вясна"*** прыняў заяву, у якой адзначыў, што ў апошні месяц у Беларусі ўзмацніліся рэпрэсіі супраць прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі. Праваабарончы цэнтр "Вясна" называе арышт Сяргея Скрабца палітычна матываваным, зьвязаным з ягонай грамадзка-палітычнай і дэпутацкай дзейнасьцю, а таксама патрабуе вызваліць усіх палітычных зьняволеных у Беларусі, спыніць інфармацыйную істэрыю, накіраваную супраць беларускай дэмакратычнай апазіцыі і суседніх краінаў.

***19 траўня*** касацыйная калегія Вышэйшага гаспадарчага суда прыняла да разгляду касацыйную скаргу падатковай інсьпекцыі Маскоўскага раёну Менску ў дачыненьні да Беларускага Хельсінкскага камітэту (БХК). Падатковыя інсьпектары настойваюць на тым, што БХК павінен плаціць падаткі з фінансавых сродкаў, што выдзяляюцца арганізацыі ў межах еўрасаюзаўскай праграмы TACIC.

***20 траўня*** пракуратура Менску аднавіла крымінальную справу супраць намесьніка старшыні ***Беларускага Хельсінкскага камітэту Гары Паганяйлы***. Праваабаронцу падазраюць у паклёпе на прэзідэнта, які сьледчыя ўбачылі ў ягоным інтэрв'ю швецкаму тэлебачаньню ў жніўні 2004 году. Сёлета ў лютым крымінальную справу супраць Гары Паганяйлы закрылі, абвясьціўшы ў пастанове, што ў дзеяньнях праваабаронцы злачынства не было, хаця паклёп на прэзідэнта прысутнічаў. Гары Паганяйла не пагадзіўся з гэтай фармулёўкай і зьвярнуўся ў суд, патрабуючы прызнаньня, што ён цалкам невінаваты. "Прызнаваць гэта ў пракуратуры Менску не жадаюць, таму і аднавілі супраць мяне крымінальную справу", — пракаментаваў дзеяньні гарадзкой пракуратуры Гары Паганяйла.

***25 траўня “Міжнародная амністыя”*** абнародавала штогадовую справаздачу аб сітуацыі з правамі чалавека ў сьвеце. У разьдзеле, прысьвечаным Беларусі, адзначаецца, што “няма прагрэсу ў расьследаваньні чатырох справаў зьніклых, працягваюцца сьмяротныя прысуды і пакараньні, працягваецца падаўленьне свабоды выказваньня і права на аб’яднаньні, да апазіцыйных актывістаў ужываюцца адвольныя затрыманьні і кепскае абыходжаньне з боку міліцыі, працягваецца ціск на недзяржаўныя арганізацыі і іх ліквідацыя”. Беларускі разьдзел справаздачы “Міжнароднай амністыі” пачынаецца са згадкі, што ў студзені 2004 году Парламенцкая асамблея Рады Еўропы адмовіла Беларусі ў аднаўленьні статусу адмыслова запрошанай краіны ў Радзе Еўропы. У красавіку 2004 году Камісія ААН па правах чалавека заснавала пасаду адмысловага дакладчыка ААН па Беларусі. У сьнежні гэтаму міжнароднаму прадстаўніку беларускія ўлады не далі візы для ўезду ў краіну. “Міжнародная амністыя” нагадвае таксама, што паводле назіральнікаў АБСЕ парламенцкія выбары і рэферэндум 2004 году ў Беларусі былі далёкімі ад стандартаў гэтай арганізацыі.

***28 траўня*** кіраўнік Ваўкавыскага грамадзкага аб’яднаньня абароны правоў падаткаплацельшчыкаў і спажыўцоў ***“Аслона” Мікола Кавальчук*** падаў скаргу ў Гарадзенскае абласное ўпраўленьне юстыцыі на вынесенае ягонай арганізацыі чарговае папярэджаньне. Паводле афіцыйнай версіі, “Аслону” папярэдзілі за неадпаведную яе задачам дзейнасьць. У першую чаргу, за аказаньне юрыдычнай дапамогі насельніцтву. Але кіраўнік арганізацыі сьцьвярджае, што менавіта гэтая дзейнасьць і зьяўляецца адным з галоўных прыярытэтаў грамадзкага аб’яднаньня. Тым больш, што бясплатна юрыдычныя парады можа даваць любы чалавек, які валодае юрыдычнымі ведамі.

***30 траўня*** сябра ліквідаванай праваабарончай арганізацыі ***“Прававая дапамога насельніцтву” Раіса Міхайлоўская*** папрасіла палітычнага прытулку ў Канадзе. Раіса Міхайлоўская паехала ў Канаду па запрашэньні партнёрскай арганізацыі, але падзеі апошняга часу вымусілі яе папрасіць прытулку. У апошнія месяцы яна атрымоўвала частыя тэлефанаваньні невядомых людзей з пагрозамі. Падчас парламенцкай выбарчай кампаніі Раіса Міхайлоўская, якая працавала ў камандзе кандыдата ў дэпутаты Алега Волчака, падверглася нападу. Апошні напад на яе быў учынены пасьля акцыі памяці Юрыя Захаранкі 6 траўня каля пад’езду ўласнага дому. Органы сьледзтва як у першы, так і у другі раз адмовіліся ўзбуджаць справы па фактах нападу на сп-ню Міхайлоўскую. Раіса Міхайлоўская – прафесійны юрыст. Яна займалася прававой дапамогай малазабясьпечаным грамадзянам, працавала над выданьнямі, прысьвечанымі зьнікненьням вядомых палітычных дзячоў – асабліва шмат па зьнікненьні Юрыя Захаранкі, трагедыі на Нямізе і інш.

***31 траўня Праваабарончы цэнтр "Вясна"*** прыняў заяву з нагоды абвінаваўчага прысуду, вынесенага па крымінальнай справе актывістаў беларускай дэмакратычнай апазіцыі Паўла Севярынца і Міколы Статкевіча. Праваабарончы цэнтр "Вясна" заяўляе рашучы пратэст працягу палітычных рэпрэсіяў у краіне і лічыць вынесены прысуд незаконным і палітычна матываваным. "Абвінаваўчы прысуд яшчэ раз яскрава пацьвердзіў адсутнасьць незалежнай судовай улады ў Рэспубліцы Беларусь, дзе суды служаць ня мэтам правасудзьдзя і абароны правоў грамадзянаў, а выконваюць рэпрэсіўныя функцыі аўтарытарнага рэжыму А. Лукашэнкі", — гаворыцца ў заяве. Праваабарончы цэнтр "Вясна" зьвярнуўся да кіраўнікоў краінаў Еўразьвязу, Рады Еўропы, Еўрапарламенту з заклікам далучыць да сьпісу грамадзянаў Рэспублікі Беларусь, якім быў забаронены ўезд у краіны Еўрасаюзу за грубыя парушэньні правоў чалавека ў Беларусі, судзьдзяў суда Цэнтральнага раёну гораду Менску: Леаніда Ясіновіча, Аляксея Бычко і пракурора Вадзіма Пазьняка – асобаў, якія прымалі асабісты ўдзел у рэпрэсіях супраць палітычных апанентаў дзеючага рэжыму ў Беларусі.

***1 чэрвеня*** Вышэйшы гаспадарчы суд Беларусі пацьвердзіў перамогу ***"Беларускага Хельсінскага камітэту"*** ў спрэчцы з падатковай службай. Паводле гэтага рашэньня, з праваабаронцаў зьнятыя прэтэнзіі аб нявыплаце 70 тысячаў даляраў падаткаў. Прадстаўнік БХК у судзе ***Алег Гулак*** не хаваў, што задаволены гэтым рашэньнем: "Для нас вельмі добра, што рашэньне засталося ў сіле. Гэта значыць, што мы можам хаця б у гэтым сэнсе спакойна працаваць далей. Таксама вельмі важна, што засталося ў сіле рэдкае для Беларусі рашэньне, якім зацьверджанае вяршэнства міжнароднай дамовы ў параўнаньні з нацыянальным заканадаўствам".

***2 чэрвеня*** дэпутат ніжняй палаты чэскага парламенту, праваабаронца, былы дысідэнт і падпісант ***"Хартыі-77" Сватаплук Карасак*** не атрымаў візу ў Беларусь. Беларуская амбасада ў Празе не прадставіла аніякіх прычынаў адмовы чэскаму парламентару. Сватаплук Карасак, які ўваходзіць фракцыю "Унія Свабоды", быў у Беларусі падчас апошняга рэферэндуму 2004 году і на наступны дзень пасля рэферэндуму на мітынгу ў Менску зачытаў прысутным ліст ад былога прэзідэнта Чэхіі Вацлава Гавэла ў падтрымку беларускай дэмакратыі.

***7 чэрвеня*** адбылася прэзентацыя "Агляду-Хронікі парушэньня правоў чалавека ў Беларусі", выдадзеная на трох мовах, якую штогод рыхтуе Праваабарончы цэнтр "Вясна". "Кніга пярэчыць той абманлівай цішыні, якая пануе на менскіх вуліцах, — сказаў ***Алесь Бяляцкі***. – Насамрэч, памеры Агляду-Хронікі, а ў гэтым годзе кніга выйшла на 375 старонках, сьведчаць пра тое, што правы парушаюцца, і сітуацыя штодня пагаршаецца".

***7 чэрвеня Праваабарончы цэнтр "Вясна"*** накіраваў адкрыты ліст

да Міністэрства адукацыі і кіраўнікоў навучальных установаў, у якім заявіў рашучы пратэст з нагоды фактаў палітычнага перасьледу студэнтаў беларускіх ВНУ з боку адміністрацыямі навучальных установаў. "За апошні час праваабарончымі арганізацымі Беларусі зафіксаваныя шматлікія факты палітычнага перасьледу студэнтаў ВНУ і навучэнцаў іншых навучальных установаў па месцы вучобы", — гаворыцца ў лісьце. Праваабаронцы таксама заявілі, што "мы лічым падобныя дзеяньні несумяшчальнымі з прынцыпамі універсітэцкіх акадэмічных свабодаў, ганебнымі для людзей, якія займаюць пасады дэканаў, зьяўляюцца навуковымі супрацоўнікамі". Гэтая практыка сьведчыць аб вяртаньні Беларусі ў таталітарныя часы СССР, лічаць праваабаронцы і папярэджваюць кіраўнікоў дадзеных навучальных установаў "аб недапушчальнасьці падобных дзеяньняў. У адваротным выпадку мы, прадстаўнікі праваабарончых арганізацыяў Беларусі, пакідаем за сабой права ініцыяваць грамадзянскую кампанію, скіраваную на прыпыненьне кантактаў навучальных і навуковых арганізацыяў краінаў Еўропы з кіраўніцтвам дадзеных навучальных установаў і Міністэрства адукацыі Беларусі".

***9 чэрвеня*** дэпутат Маларыцкага райсавету і праваабаронца ***Уладзімір Малей*** атрымаў уведамленьне Аддзелу дазнаньня УУС Берасьцейскага аблвыканкаму аб аднаўленьні ў адносінах да яго крымінальнай справы па ч.2 арт.188 КК Рэспублікі Беларусь за распаўсюд паклёпу на старшыню Маларыцкага райвыканкаму Лапіча. Дадзеная крымінальная справа была ўзбуджаная 2 лютага 2005 г. і спыненая 2 траўня ў сувязі з адсутнасьцю ў дзеяньнях У.Малея складу злачынства. Зараз папярэдняе расьсьледаваньне крымінальнай справы зноў адноўленае.

***15 чэрвеня*** прэзідэнцкі дэпартамент па гуманітарнай дапамозе забараніў ***"Беларускаму Хельсінскаму камітэту"*** скарыстаць замежную дапамогу. Яшчэ ў красавіку БХК накіраваў у дэпартамент просьбу на рэгістрацыю і вызваленьне ад падаткаў у адпаведнасьці з заканадаўствам дапамогу ў памеры тысячы даляраў ад Міжнароднай Хельсінкскай Федэрацыі, сябрам якой зьяўляецца БХК. Грошы меркавалася выдаткаваць на статутныя мэты арганізацыі – аплату офісу, тэлефонныя перамовы, набыцьцё канцэлярскіх тавараў. Дэпартамент пры ўпраўленьні справамі прэзідэнта паведаміў, што задаволіць просьбу БХК ня можа, бо пазначаныя мэты выкарыстаньня дапамогі не адпавядаюць тым, якія пазначаныя ў дэкрэце прэзідэнта аб атрыманьні і выкарыстаньні замежнай дапамогі. На думку эксьпертаў БХК, такія дзеяньні беларускіх уладаў парушаюць канстытуцыйны прынцып свабоды аб'яднаньняў, а таксама міжнародныя абавязкі Беларусі.

***16 чэрвеня*** Менская гарадзкая пракуратура на месяц працягнула сьледзтва па крымінальнай справе ў адносінах да намесьніка старшыні

“Беларускага Хельсінскага камітэту” Гары Паганяйлы, якога падазраюць у паклёпе на прэзідэнта і іншых высокіх службовых асобаў. Такія падазрэньні ўзьніклі пасьля інтэрвію Гары Паганяйлы швецкаму тэлебачаньню, у якім ён ня выключыў датычнасьці Аляксандра Лукашэнкі ды іншых высокіх чыноўнікаў да зьнікненьня палітычных апанентаў. Гэтую крымінальную справу пракуратура расьсьледуе з лістапада 2004 году.

***21 чэрвеня*** Беларуска-расейская праваабарончая камісія Савету пры прэзідэнце Расіі ў справе спрыяньня разьвіцьцю інстытутаў грамадзянскай супольнасьці і правоў чалавека, створаная на пачатку чэрвеня ў Маскве, апублікавала свой першы дакумент – афіцыйную заяву. У ёй гаворыцца, што цягам шэрагу гадоў беларускія праваахоўныя органы ня могуць адказаць на пытаньне пра лёс зьніклых вядомых палітыкаў. Адначасова ў Беларусі працягваюцца палітычныя “зачысткі”. У месцах зьняволеньня знаходзяцца вядомыя грамадзкія дзеячы і палітыкі, некаторыя асуджаныя, а супраць іншых узбуджаныя крымінальныя справы. У дакуменце гаворыцца, што дзейнасьць супольнай камісіі будзе сканцэнтравана на пяцёх кірунках. Адзін з іх — выбарчае заканадаўства Беларусі. Паколькі Беларусь ухілілася ад падпісаньня выбарчай Канвенцыі ў рамках СНД, то мінімальныя прававыя стандарты, якія б дазвалялі прызнаць беларускія выбары і рэферэндумы дэмакратычнымі, адсутнічаюць. Другім істотным кірункам камісіі будзе абарона свабоды сродкаў масавай інфармацыі. У заяве адзначаецца, што ў Беларусі практычна не функцыянуе інстытут недзяржаўных грамадзка-палітычных медыяў. Яшчэ адзін накірунак дзейнасьці камісіі зьвязаны са свабодай асацыяцыяў. У заяве гаворыцца, што ў Беларусі паэтапна ліквідуюцца ўмовы для існаваньня і нармальнай дзейнасьці незалежных грамадзкіх і праваабарончых арганізацыяў. Справай камісіі будзе абарона правоў расейцаў у Беларусі і беларусаў у Расіі. Да прыкладу, расейцы ў Беларусі не могуць скарыстацца паслугамі расейскіх адвакатаў, што істотна абмяжоўвае іх права на судовую абарону. Дагэтуль ніводная арганізацыя не займалася маніторынгам парушэньняў правоў расейцаў у Беларусі і беларусаў у Расіі і абаронай гэтых правоў. У сваёй дзейнасьці камісія плануе арыентавацца на супрацоўніцтва з шырокімі слаямі беларуска-расейскай грамадзкасьці. Сустаршынямі камісіі абраныя палітолаг Сяргей Караганаў і генерал Валеры Паўлаў, каардынатар сувязяў беларускіх дэмакратычных рухаў з Расеяй.

***27 чэрвеня Міжнародная Хельсінская Федэрацыя*** (IHF) па абароне правоў чалавека саштаб-кватэрай у Вене апублікавала гадавую справаздачу адносна сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў 38 краінах АБСЕ з Еўропы, Каўказу і Паўночнай Амерыкі. 14 старонак справаздачы прысьвечаныя Беларусі. Згодна з высновамі IHF, адносна вяршэнства закону, дэмакратыі і правоў чалавека Беларусь застаецца адной з найгоршых краінаў у Еўропе. Улады не паважаюць шэрагу базавых правоў. Яны ўвялі жорсткія

абмежаваньні на свабоду слова, згуртаваньняў і медыяў. Дрэннымі застаюцца ўмовы ўтрыманьня ў турмах і сьледчых ізалятарах, міліцыя праводзіць неабгрунтаваныя арышты, Крымінальны кодэкс ды іншыя законы дапускаюць адвольныя абвінавачаньні. У дакуменце нагадваецца, што леташнія рэферэндум і выбары ў Палату прадстаўнікоў не адпавядалі міжнародным стандартам. Аўтары справаздачы робяць высноўу – сітуацыя ў галіне правоў чалавека ў Беларусі сістэматычна пагаршаецца.

***29 чэрвеня*** каля 20-й гадзіны вечара ў Калінкавічах міліцыя затрымала праваабаронцу з Мазыра ***Уладзіміра Целепуна***. Ён быў затрыманы ў хуткім часе пасьля таго, як намесьнік старшыні абласной арганізацыі АГП Уладзімір Кацора перадаў яму адрамантаваны прыватны кампутар. Міліцыянты патлумачылі затрыманьне тым, што нібыта недзе ў нейкай невядомай арганізацыі быў скрадзены гэты кампутар. Сьледчы міліцыі Сурма і міліцэйскі эксьперт Валяк, аднак, затрымаўшы праваабаронцу, ня столькі спрабавалі ідэнтыфікаваць кампутар Уладзіміра Целепуна, а колькі правяралі зьмест яго прыватных файлаў. У гэты ж вечар у Калінкавічах пяцёра афіцэраў міліцыі, якіх узначальваў маёр Таран, уварваліся ў прыватную кватэру на вуліцы Князева, дзе ладзіўся сход па абраньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў, і спрабавалі яго сарваць.

***12 ліпеня*** Беларуская-расійская праваабарончая камісія Савету пры прэзідэнце Расіі ў справе спрыяньня разьвіцьцю інстытутаў грамадзянскай супольнасьці і правоў чалавека заклікала ўрад Расейскай Федэрацыі ўключыць тэму захаваньня грамадзянскіх правоў і свабодаў у пастаянны парадак дня дыялогу з уладамі Беларусі. Пра гэта гаворыцца ў заяве для СМІ, распаўсюджанай камісіяй. У ёй сябры камісіі выказваюць абурэньне ў сувязі з жорсткім спыненьнем супрацоўнікамі беларускіх органаў правапарадку акцыі, якая праходзіла 7 ліпеня ў Менску і была прысьвечаная 5-й гадавіне зьнікненьня аператара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага. Неразумнымі і ганебнымі лічаць яны збіцьцё ўдавы Сьвятланы Завадзкай.

***12 ліпеня*** дэпутат Маларыцкага райсавету, праваабаронца ***Уладзімір Малей*** атрымаў чарговае ўведамленьне адзьдзелу дазнаньня УУС Берасьцейскага аблвыканкаму, што тэрмін следзтва па крымінальнай справе, распачатай у адносінах да яго па арт. 188 ч.2 КК РБ, працягнуты пракуратурай Брэсцкай вобласьці да 6 месяцаў.

***27 ліпеня*** праваабаронцу з Мазыра ***Уладзіміру Целяпуну*** вынесенае папярэджаньне. Гаворыць Уладзмір Целяпун: “Я зьявіўся ў пракуратуру г. Калінкавічы дзе, без аніякіх пытаньняў, за подпісам ст. саветніка юстыцыі С. Ярмоленкі мне было ўручанае “Официальное предупреждение о недопустимости нарушения Закона», якое тычыцца артыкулаў 367, 368 КК РБ “Аб абразе гонару і годнасьці прэзідэнта РБ”. Папярэджаньне вынесена

нае падставе рапарту лейтэнанта Калінкавіцкага РАУС А.Даманчука, у якім таксама пазначана, што пры адкрыцьці файлаў кампутара, які быў забраны ў праваабаронцы, былі выяўленыя файлы з “изображениями и карикатурами президента РБ”.

***17 жніўня*** яшчэ на месяц працягнутае расьследаваньне крымінальнай справы супраць вядомага праваабаронцы ***Гары Паганяйлы***, якога абвінавачваюць у паклёпе на прэзідэнта Беларусі. Справа цягнецца з кастрычніка 2004 году, калі Паганяйла ў інтэрвію швецкаму тэлебачаньню выказаў падазрэньні ў датычнасьці да зьнікненьняў дзеячоў апазіцыі некаторых высокапастаўленых чыноўнікаў, у тым ліку — Аляксандра Лукашэнкі. Паводле Гары Паганяйлы, у інтэрв’ю ён агучыў відавочныя рэчы. У пацьвярджэньне сваіх словаў адвакат перадаў сьледзтву стос дакументаў, якія пацьвярджаюць абгрунтаванасьць падазрэньняў у адрас Аляксандра Лукашэнкі і людзей з ягонага атачэньня. На падставе гэтых дакументаў справу аб паклёпе даўно можна было закрыць, лічыць праваабаронца. Тое, што справа дагэтуль не закрытая, праваабаронца тлумачыць палітычнымі прычынамі.

***19 жніўня*** сусьветна вядомыя людзі, сярод якіх: Вацлаў Гавэл, Андрэ Глуксман, Вартан Грэгарыян, Фрэдэрык Вілем дэ Клерк, Майк Мур (былы прэм’ер-міністр Новай Зеландыі), Мэры Робінсан, Ёогэй Сасакава, Карэл Шварцэнбэрг, Дэсмонд Туту, Рыхард вон Вайцзакэр, Джордж Сорас, Міхаэл Новак, Прынц Эль Гассан бін Талал напісалі зварот пад назвай “Апошняя таталітарная дзяржава ў Эўропе”, у якім асуджаюць таталітарную палітыку Аляксандра Лукашэнкі і заклікаюць Еўрасаюз спрыяць дэмакратызацыі Беларусі. У звароце гаворыцца: “Мы лічым, што неабходна выкарыстаць кожную магчымасьць для прарыву гэтага муру незацікаўленасьці ды няздольнасьці сусьветнай супольнасьці даць адпор постсавецкаму аўтакрату ды ягоным памкненьням здушэньня рэшткаў незалежных ініцыятываў у Беларусі. Адначасова трэба працягваць навязваньне кантактаў і супрацоўніцтва з беларускімі незалежнымі ініцыятывамі. Еўрапейскі Саюз, які дасюль быў няздольны падтрымаць сілы, што змагаліся за пабудову Беларусі на дэмакратычных каштоўнасьцях, мусіў бы хутка знайсьці такія інструменты, якія б гэта дазволілі. Еўрапейскі Саюз таксама мусіць максімальна адкрыць свае праграмы па адукацыі ды абмену для дэмакратычна арыентаванай моладзі з Беларусі. Еўрапейскі Саюз разам з Украінаю мусіць хутка зрэагаваць на адозву польскіх еўрапарламентароў Януша Анышкевіча ды Богдана Кліха даць доступ беларускім грамадзянам да нецэнзураванай і незманіпуляванай інфармацыі пасярэдніцтвам радыё- і тэлевізійнага вяшчаньня з навакольных краінаў. Мы заклікаем да супольнага поступу ЕС, ЗША і ўсіх дэмакратычных краінаў, якія б мусілі быць зацікаўленыя ў дэмакратызацыі Беларусі”.

***8 верасьня Беларускі Хельсінскі камітэт*** падаў у суд на Кіраўніцтва справамі прэзідэнта Беларусі. Праваабаронцы скардзяцца ў Вышэйшы гаспадарчы суд на тое, што дэпартамент гуманітарнай дапамогі Кіраўніцтва справамі адмаўляецца зарэгістраваць грашовую дапамогу, якая прыйшла на рахунак БХК з Міжнароднай Хельсінскай федэрацыі. У БХК разьлічвалі гэтымі сродкамі расплаціцца за арэнду памяшканьня, заплаціць за тэлефонныя размовы і пакрыць выдаткі на чарговую канферэнцыю арганізацыі. Аднак зарэгістраваць дапамогу адмовілі. “Найбольш абурае, што нават не ўказаная матывацыя адмовы. Вынік суду пакажа, гэта проста свавольства чыноўнікаў ці замова на ўдушэньне нашай арганізацыі”, — заявіў выканаўчы дырэктар БХК ***Алег Гулак***.

***8 верасьня*** праваабарончыя арганізацыі ***“Amnesty International”, “Human Rights Watch”*** і міжнародная асацыяцыя па барацьбе з беднасьцю ***“Оксфам”*** заклікалі шэраг краінаў, у тым ліку Беларусь, не перашкаджаць прыняцьцю мераў па абароне правоў чалавека, выкараненьні генацыду, умацаваньні бясьпекі і барацьбе з беднасьцю. Пра гэта гаворыцца ў адкрытым звароце, з якім гэтыя арганізацыі выступілі напярэдадні сусьветнай сустрэчы на вышэйшым узроўні, якая павінна прайсьці ў сярэдзіне верасьня ў Нью-Ёрку ў рамках 60-й сесіі Генеральнай асамблеі ААН. На думку міжнародных праваабарончых арганізацыяў, дзеяньні ўрадаў асобных краінаў сьвету могуць “падарваць саміт”, паколькі адным з пунктаў парадку дня гэтай сустрэчы зьяўляецца ўхвала пагадненьня аб стварэньні замест Камісіі ААН па правах чалавека Рады па правах чалавека, якая будзе функцыянаваць увесь год. Як адзначаецца ў звароце, сярод 15 краінаў, якія выступаюць супраць рэформы камісіі, – Беларусь, Венесуэла, Вьетнам, Куба, М’янма, Пакістан, Сірыя і Туркменістан, менавіта тыя краіны, дзе фіксуецца найбольшая колькасьць парушэньняў правоў чалавека.

***9 верасьня*** ў Баку падчас семінару па міжнароднай сістэме абароны правоў чалавека праваабаронцы ***Алесь Бяляцкі*** і ***Барыс Звозскаў*** сустрэліся са Сьпецыяльным прадстаўніком ААН па абароне праваабаронцаў Хінай Джылані. Абмяркоўвалася сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Падчас гэтай сустрэчы спадарыня Хіна Джылані паведаміла, што яна ў чэрвені 2005 году зьвярталася да беларускага амбасадара ў ААН сп. Алейніка з просьбай даць дазвол на яе візіт у Беларусь. І гэта ўжо ня першая яе такая просьба. Ужо некалькі разоў яна зьвярталася з падобнымі просьбамі. Але раней яе просьбы не былі падтрыманыя, і гэтым разам сп.Хіна Джылані практычна нічога не дабілася, але спадар Алейнік сказаў, што “можа быць, у наступным годзе” Сьпецпрадстаўніку дазволяць прыехаць у Беларусь. Падчас размовы з беларускімі праваабаронцамі спадарыня Хіна Джылані выказала заклапочанасьць у сувязі выпадкамі перасьледу праваабаронцаў у Беларусі. Узгадала пра ўзбуджэньне кры-

мінальных справаў, адміністрацыйных арыштах і штрафах, а таксама пра напады праваахоўных органаў і падаткавай інсьпекцыі на офісы праваабарончых арганізацыяў на працягу апошняга году ў Беларусі.

***15 верасьня*** падчас выступу на сесіі ААН у Нью-Ёрку Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ААН дазваляе выкарыстоўваць сябе як інструмент у палітыцы, якая мае на мэце пабудову аднапалярнага сьвету. Беларускі кіраўнік выказаў нязгоду з пастановамі Камісіі правоў чалавека ААН аб парушэньнях правоў чалавека ў Беларусі.

***26 верасьня*** сьпецыяльны дакладчык ААН па пытаньнях правоў чалавека ў Беларусі Адрыян Севярын завяршыў працоўную паездку па краінах-суседзях Беларусі, якую ён выкарыстаў для атрыманьня інфармацыі наконт сітуацыі ў Беларусі. Беларускія ўлады па-ранейшаму не пускаюць яго на сваю тэрыторыю, не адказваюць на ягоныя пісьмовыя звароты. МЗС Беларусі выказвае незадаволенасьць зьместам сёлетняй справаздачы спадара Севярына, якая стала асновай для крытычнай рэзалюцыі Камісіі па правах чалавека ААН па Беларусі. Камісія па правах чалавека ААН даручыла Адрыяну Севярыну падрыхтаваць новую справаздачу наконт разьвіцьця сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, якая мусіць быць прадстаўленая на 62-й сесіі камісіі ў Жэневе вясной 2006 году. Аднак беларускія ўлады адмовіліся спрыяць у падрыхтоўцы гэтай справаздачы, не дапускаючы спадара Севярына на сваю тэрыторыю, нягледзячы на ягоныя актыўныя намаганьні наладзіць дыялог. Адрыян Севярын, тым ня меней, зьбіраецца накіраваць першы чарнавы варыянт сваёй справаздачы ўсім зацікаўленым у сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, у тым ліку ўраду самой краіны. І спадзяецца атрымаць заўвагі і каментары: “Калі ніякіх каментароў ня прыйдзе ад беларускага ўраду, адзінай магчымай інтэрпрэтацыяй гэтага для мяне будзе тое, што ўрад пагаджаецца з інфармацыяй, якую я атрымаў з іншых крыніц”. Ацэньваючы сітуацыю ў цэлым, спадар Севярын прызнаў, што зыходзячы з той інфармацыі, якую ён мае, зрухаў да лепшага з правамі чалавека ў Беларусі няма.

***29 верасьня*** ў Страсбургу Еўрапейскі парламент ухваліў рэзалюцыю па Беларусі, дзе, у прыватнасьці, гаворыцца, што “замест паляпшэньня, ў Беларусі сітуацыя, наадварот пагоршылася”. Еўрапейскі парламент рашуча асудзіў “масавыя атакі беларускага рэжыму супраць медыяў, журналістаў, актывістаў меншасьцяў, праваабаронцаў, апазіцыянераў і ўсіх, хто спрабуе адкрыта крытыкаваць прэзідэнта і рэжым”. “Калі беларускія ўлады не палепшаць сітуацыю адносна свабоды слова, аб’яднаньняў і рэлігіі, Камісія, Рада і Парламент Еўрапейскага Саюзу павінны пачаць працэдуру ўнясеньня прозьвішчаў прадстаўнікоў беларускіх уладаў у сьпісы асобаў, якім забаронены ўезд на тэрыторыю Еўрасаюзу. Санкцыі супраць рэ-

жыму Лукашэнкі павінны ўключаць замарожваньне грашовых сродкаў улады, якія знаходзяцца за мяжой", — гаворыцца ў рэзалюцыі. Адначасова дэпутаты заклікалі ўсе краіны, што ўваходзяць у склад аб'яднанай Эўропы, выдаваць грамадзянам Беларусі бясплатныя візы.

***30 верасьня*** сябры ***Праваабарончага цэнтру "Вясна"*** наведалі палітвязьня Міколу Статкевіча, які адбывае пакараньне на "хіміі" ў Баранавічах. Праваабаронцы перадалі зьняволенаму інструменты, кнігі і асцылограф, які патрэбны для рамонту і тэставаньня тэлевізараў. Нагадаем, што Мікола Статкевіч працуе ў майстэрні баранавіцкага Дому быту, рамантуе бытавую тэхніку.

***14 кастрычніка*** намесьнік старшыні Вышэйшага гаспадарчага суда Яўген Сьмірноў апратэставаў ранейшае рашэньне калегіі Вышэйшага гаспадарчага суда, паводле якога былі зьнятыя прэтэнзіі падатковай службы да ***Беларускага Хельсінскага камітэту***. Гэта азначае, што прэзідыум гаспадарчага суда зноў вернецца да справы, паводле якой ад праваабаронцаў патрабуюць заплаціць каля 200 тысяч даляраў падаткаў з міжнароднай дапамогі ў межах праграмы TACIS. Выканаўчы дырэктар БХК Алег Гулак не хавае занепакоенасьці з прычыны гэтага рашэньня: "У папярэдніх працэсуальных дакументах Вышэйшы гаспадарчы суд пацьвярджаў законнасьць нашай пазіцыі. Чаму цяпер ён зьмяніў сваю пазіцыю, нам незразумела. Ніякай матывацыі такой метамарфозе мы ня бачым у пастанове аб вынясеньні пратэсту. Застаецца спадзявацца на прэзідыюм, хаця, здаецца, надзея вельмі туманная". У БХК заявілі, што рашэньне аб спагнаньні 200 тысяч даляраў падаткаў будзе фактычна азначаць закрыцьцё праваабарончай арганізацыі.

18 кастрычніка завяршае сваю дзейнасьць Гомельская абласная філія ***"Беларускага Хельсінскага камітэту"***. Рашэньне аб ліквідацыі ўсіх рэгіянальных структураў БХК прыняла Рада гэтага грамадзкага аб'яднаньня з-за складанасьцяў з юрыдычнымі адрасамі. Па словах старшыні філіі Алеся Яўсеенкі, яе ліквідацыя не азначае, што Хельсінкскі камітэт спыніць сваю дзейнасьць у Гомельскай вобласьці: замест філіі ў Гомелі будзе дзейнічаць рэгіянальны прадстаўнік.

***24 кастрычніка*** зафіксаваны абстрэл вакна кватэры жодзінскіх праваабаронцаў ***Аляксея*** і ***Сьвятланы Лапіцкіх***. Была выкліканая міліцыя. Прыехала брыгада міліцыянтаў з чатырох чалавек, якія дасьледавалі прабоіны, апыталі суседзяў, склалі пратакол аб здарэньні і тлумачэньні пацярпелых. Як мяркуюць сьпецыялісты, вакно было абстралянае 6-цю зарадамі з пнеўматычнага пісталету нямецкай вытворчасьці па ніжняй частцы вакна на ўзроўні працоўнага месца ў кабінеце. Гэта ўжо другі выпадак акцыі застрашэньня праваабаронцаў. 18 кастрычніка вакно было залітае

чырвона-карычневай фарбай. На наступную ноч пасьля абстрэлу вокны зноў былі залітыя – на гэты раз чорнай фарбай.

***25 кастрычніка*** Жодзінскім ГАУС узбуджаная крымінальная справа па факце абстрэлу вакна кватэры Лапіцкіх па ч.1 арт. 339 КК Беларусі – хуліганства. Заяўнікі прызнаныя пацярпелымі.

***26 кастрычніка*** да праваабаронцаў ***Аляксея*** і ***Сьвятланы Лапіцкіх*** завітаў амбасадар, кіраўнік Офісу АБСЕ ў Менску сп. Оке Петэрсан. Кіраўніка ўплывовай міжнароднай арганізацыі цікавіла сутнасьць таго, што адбываецца ў Жодзіне, меркаваньні і ацэнкі саміх пацярпелых. Акрамя таго, амбасадар цікавіўся лёсам Янкі Лапіцкага, які больш за год быў пазбаўлены права на навучаньне на роднай мове і нарэшце здолеў пайсьці ў беларускі клас. Былі абмеркаваныя таксама пытаньні, зьвязаныя з лёсам адлічанага з Жодзінскага політэхнікуму за ўдзел у “Чарнобыльскім шляху” Сяргея Мурашкі. Сп. Петэрсан выказаў вялікую заклапочанасьць у сувязі з апошнімі падзеямі ў Жодзіне і выказаў сваю падтрымку. Разьвітаўшыся, ён сутыкнуўся на выхадзе з групаю міліцыянтаў на чале з начальнікам аддзелу дазнаньня Жодзінскага ГАУС Зьміцерам Удовіным і выказаў яму свае пажаданьні аб хутчэйшым затрыманьні і пакараньні злачынцаў.

***27 кастрычніка*** Вялікабрытанія, якая старшынюе ў Еўразьвязе, ад імя краін-удзельніц распаўсюдзіла ліст адносна справы Беларускага Хельсінскага камітэту. Палітыка беларускіх уладаў адносна грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі атрымала ў лісьце вельмі жорсткую адзнаку. “Мы застаёмся занепакоенымі перасьледам грамадзянскай супольнасьці. Падзеі 2005 году прадэманстравалі, што Беларусь значна адышла ад дэмакратычных прынцыпаў, якія падзяляюць краіны Еўропы”, – сказана ў лісьце. У ім таксама зьмешчаны заклік да беларускіх уладаў “спыніць кампанію перасьледу і выконваць свае міжнародныя абавязацельствы”.

***13 лістапада*** ўвечары ў раёне віцебскага чыгуначнага вакзалу быў затрыманы намесьнік старшыні беларускага аддзяленьня ***«Міжнароднай Амністыі» Вячаслаў Бортнік***. У яго былі канфіскаваныя даклады і матэрыялы «Міжнароднай Амністыі», пасьля 40-хвілiннай размовы ён быў адпушчаны. Супрацоўнікаў міліцыі цікавіла “мэта візіту ў Віцебск” і род заняткаў В. Бортніка.

***16 лістапада*** ў Капенгагене на 51-й сесіі ПА НАТО была прынятая рэзалюцыя па Беларусі. У дакуменце даецца крытычная ацэнка палітычнай сітуацыі ў Беларусі, аўтары заклікаюць беларускае кіраўніцтва “неадкладна вызваліць з-за кратаў усіх палітзьняволеных, паскорыць расьсьледаваньні палітычных зьнікненьняў, а таксама спыніць рост колькасьці міліцэйскіх падразьдзяленьняў у Беларусі”. Як вынікае з тэксту дакумен-

ту, парламентары краінаў Паўночнаатлантычнага альянсу “глыбока шкадуюць”, што ў выніку палітыкі афіцыйнага Менску шлях інтэграцыі Беларусі як еўрапейскай краіны, непасрэднай суседкі Еўрасаюзу і НАТО, у сям’ю еўрапейскай дэмакратыі надзвычай ускладнены. Ад Беларусі на сесію ПА НАТО былі запрошаныя лідэр Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады Станіслаў Шушкевіч і жонка зьніклага беларускага журналіста, заснавальніца журналісцкага фонду імя Дзьмітрыя Завадзкага Сьвятлана.

***26 лістапада*** ў Гомелі супрацоўнікі міліцыі затрымалі ***Вячаслава Андрэева*** з Віцебскай ініцыятыўнай групы ***Amnesty International*** і ***Сяргея Разумава*** з Гомельскай групы Amnesty International, якія прымалі ўдзел у працы Каардынацыйнага камітэту грамадзянскай ініцыятывы “Беларуская арганізацыя Міжнароднай Амністыі”. Затрыманыя былі дастаўленыя ў 2-е аддзяленьне міліцыі, дзе іх дапытвалі больш за пяць гадзінаў. Усе пытаньні тычыліся працы Каардынацыйнага камітэту і прынятых на сходзе рашэньняў.

***28 лістапада*** Менская гарадзкая пракуратура спыніла крымінальную справу супраць вядомага праваабаронцы, намесьніка старшыні ***“Беларускага Хельсінскага камітэту” Гары Паганяйлы***, якога падазравалі ў паклёпе на прэзідэнта Беларусі і высокапастаўленых чыноўнікаў. У Менскай гарадзкой пракуратуры паведамілі, што не знайшлі ў дзеяньнях спадара Паганяйлы складу злачынства. Падазраваным у паклёпе Гары Паганяйла стаў у лістападзе 2004 году за інтэрв’ю швецкім тэлежурналістам, у якім зьвярнуў увагу на тое, што пад уплывам чыноўнікаў з найбліжэйшага атачэньня Аляксандра Лукашэнкі фактычна замаруджанае расьследаваньне крымінальных справаў аб выкраданьні апазіцыйных палітыкаў. Як вынік, Гары Паганяйла сам быў абвінавачаны ў тым, што нібыта ўчыніў крымінальнае злачынства.

***1 сьнежня*** адноўленая крымінальная справа ў дачыненьні да дэпутата Маларыцкага райсавету, праваабаронцы ***Уладзіміра Малея*** па абвінавачаньні ў паклёпе на старшыню Маларыцкага райвыканкаму Казіміра Лапіча. У заяве ў пракуратуру кіраўнік мясцовай вертыкалі сьцьвярджаў, што Уладзімір Малей у сваім дэпутацкім запыце, які пасьля быў надрукаваны ў інфармацыйным бюлетэні “Наша слова”, распаўсюдзіў пра яго паклёпніцкія зьвесткі. Дэпутацкі запыт тычыўся службовага жыльля для былога старшыні райвыканкаму, якое засталося ў прыватнай уласнасьці пасьля ягонай адстаўкі. Паводле словаў спадара Малея, цяперашняе маларыцкае кіраўніцтва не зрабіла ніякіх захадаў, каб гэтая маёмасьць была вернутая дзяржаве. Спадар Малей мяркуе, што аднаўленьне крымінальнага перасьледу супраць яго можа быць зьвязанае з прэзідэнцкай выбарчай кампаніяй.

***10 сьнежня***, у Міжнародны дзень правоў чалавека, у Менску на праспекце Незалежнасьці каля будынку КДБ і Міністэрства ўнутраных справаў вядомыя беларускія праваабаронцы ***Гары Паганяйла, Алег Гулак, Алесь Бяляцкі, Валянцін Стэфановіч*** і ***Алег Жлутка*** раздавалі мінакам надрукаваную справаздачу сьпецыяльнага дакладчыка па Беларусі Камітэту па правах чалавека ААН Адрыяна Севярына на беларускай мове. Адзін з асобнікаў справаздачы быў перададзены праз дзяжурнага супрацоўніка старшыні КДБ Сьцяпану Сухарэнку. Усяго праваабаронцы раздалі каля 1400 асобнікаў гэтай брашуры, каб людзі змаглі азнаёміцца з праблемай правоў чалавека на Беларусі і яе аналізам еўрапейскімі структурамі. Супрацоўнікі праваахоўных органаў назіралі за акцыяй, але перашкодаў не чынілі. Ім таксама далі некалькі асобнікаў справаздачы сьпецдакладчыка.

***12 сьнежня*** Аргкамітэт грамадзянскай ініцыятывы ***“Хартыя-97”*** абвясьціў лаўрэатаў Нацыянальнай прэміі ў галіне правоў чалавека за 2005 год. Імі сталі палітвязьні ***Мікола Статкевіч, Павел Севярынец, Сяргей Скрабец, Мікола Аўтуховіч, Андрэй Клімаў***, а таксама ***“Саюз палякаў на Беларусі”*** і ***Нацыянальны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа***, якія працягваюць сваю дзейнасьць пад ціскам уладаў. 15 сьнежня ў офісе “Хартыі’97” адбылася ўрачыстая цырымонія ўручэньня прэміяў. Ніводзін з персанальных лаўрэатаў не прысутнічаў на ўрачыстасьці. Мікола Статкевіч, Павел Севярынец, Андрэй Клімаў за арганізацыю вулічных дэманстрацыяў адбываюць пакараньне на “хіміі”. Мікола Аўтуховіч і Сяргей Скрабец знаходзяцца за кратамі. Прэмія была заснаваная “Хартыяй-97” у 1998 годзе.

***20 сьнежня*** праваабаронца з Берасьця ***Уладзімір Вялічкін*** атрымаў з ААН адказ на свой індывідуальны зварот, дзе прасіў даць ацэнку судовай справе, у выніку якой ён быў аштрафаваны на 20 базавых велічыняў. У Міжнародны дзень правоў чалавека 10 сьнежня 2000 году спадар Вялічкін раздаваў жыхарам Берасьця афіцыйны дакумент – Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека, за што быў затрыманы праваахоўнымі органамі на суткі, якія правёў у пастарунку. Пратакол быў складзены па арт. 167 КаАП, і на наступны дзень Ленінскі раённы суд вынес рашэньне аб пакараньні праваабаронцы штрафам у памеры 20 базавых велічыняў. Уладзімір Вялічкін быў ня згодны з вынесеным прысудам і абскардзіў яго ў вышэйстаячых інстанцыях Беларусі, але атрымаў адмоўны адказ. Пасьля гэтага ён зьвярнуўся ў Камітэт па правах чалавека ААН з просьбай даць ацэнку дадзенаму выпадку. Камітэт па правах чалавека ў Жэневе азнаёміўся з матэрыяламі справы беларускага праваабаронцы і прыйшоў да высновы, што афіцыйныя ўлады дапусьцілі парушэньні Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах (параграфы 19.2 і 21 – права на меркаваньне і распаўсюд інфармацыі, свабода мірных сходаў). Камітэт накіра-

ваў афіцыйны ліст да дзяржаўных органаў, каб улады прынялі эфектыўныя меры па дадзеным выпадку, уключаючы кампенсацыю сумы штрафу, а таксама іншых выплат, якія панёс Уладзімір Вялічкін, і ў 90-дзённы тэрмін праінфармавалі аб выкананьні гэтага рашэньня. Акрамя таго, Камітэт заклікае беларускія ўлады ў далейшым не парушаць правы чалавека і грамадзяніна.

***20 сьнежня*** Прэзідыум Вышэйшага гаспадарчага суда Беларусі пад старшынствам судзьдзі Віктара Камянкова на адмысловым паседжаньні адмяніў усе ранейшыя рашэньні гаспадарчых судоў па справе “Беларускага Хельсінскага камітэту” і прызнаў сапраўднымі прэтэнзіі падатковай службы Маскоўскага раёну Менску да БХК, паводле якіх праваабарончая арганізацыя мусіць сплаціць каля 75 тысячаў даляраў падаткаў і штрафных санкцыяў. Нагадаем, гэтыя падаткі налічылі на гранты, якія арганізацыя атрымала ад еўрапейскіх структураў у межах праграмаў разьвіцьця дэмакратыі ў Беларусі. Падатковая інсьпекцыя Маскоўскага раёну Менску палічыла, што нават з дапамогі, якая згодна з дамовамі не абкладаецца падаткамі, усё ж трэба падаткі плаціць. Праваабаронцы лічылі, што падаткаў плаціць ня трэба і спасылаліся на дамовы, якія Беларусь падпісала з еўрапейскімі структурамі. Тройчы гаспадарчыя суды розных узроўняў, у тым ліку Вышэйшы гаспадарчы суд, станавіліся ў гэтай спрэчцы на бок БХК, але з чацьвертай спробы падатковай інсьпекцыі ўдалося перамагчы. Намесьнік старшыні БХК Гары Паганяйла, які перад сябрамі прэзідыуму Вышэйшага гаспадарчага суда, лічыць, што рашэньне было прадвызначанае: “Рашэньне суда незаконнае і палітычна матываванае. Вось што я мушу сказаць, і хай мяне прыцягнуць да адказнасьці за дыскрэдытацыю. Гэтае рашэньне прывядзе да ліквідацыі арганізацыі, паколькі атрымліваецца, што мы парушаем закон”. Больш як год таму супраць старшыні БХК Тацяны Процькі і галоўнай бухгалтаркі арганізацыі Тацяны Рудкевіч была заведзеная крымінальная справа аб нявыплаце падаткаў. Пазьней гэтая справа была спыненая, але цяпер, ня выключана, справу адновяць.

# Паказальнік імёнаў

Абаджан Ваграм ***73***
Абозаў Андрэй ***74, 76, 78, 166, 260***
Абрамава Вольга ***156-157***
Абрамава Наталя ***311, 313***
Абрамовіч Алесь ***162***
Абрамовіч Аляксандр ***152***
Абросімаў Алег ***127***
Абухоў Юры ***12, 300***
Адамовіч Алесь ***193***
Адрыбец Тацяна ***99-100***
Азарка Наста ***242***
Азаронак Юры ***42***
Акаронка Наталя ***290***
Акінчыц Станіслаў ***343***
Акопаў Карэн ***248***
Акулін Эдуард ***234***
Алейнік Аляксандр ***318, 320-321, 323, 484***
Алейнік Сяргей ***473-474, 476***
Алелькаў Яўген ***426***
Аліеў Аляксандр ***92***
Аліхвер Мікалай ***89***
Альфер Сяргей ***286***
Альшанская Алена ***111***
Аляксандраў Мікалай ***172***
Аляксандраў, судзьдзя Гаспадарчага суда Менскай вобласьці ***151***
Аляксеенак Андрэй ***470***
Амелька Уладзімір ***101, 106-107, 128***
Амельянюк Валеры ***218***
Аметаў Аляксей ***399-400***
Анан Кофі ***51***
Ананіч Алена ***58***
Ананіч Лілія ***103, 121, 128, 140, 158***
Ананьева Людміла ***442***
Ананьеў Генадзь ***442***
Андросенка Сяргей *392*
Андрэева Алена ***409, 410, 412***
Андрэеў Вячаслаў ***488***
Андрэйчанка Уладзімір ***309***
Андрэйчык Дзьмітрый ***296***
Андрэйчык Жана ***322***
Аніфер Людміла ***397***
Анішчанка Уладзіслаў ***12, 424***
Антоненка Аляксандр ***303-304, 310***
Антончык Сяргей ***11, 241-243***
Антончык Тамара ***241***
Антусевіч Сяргей ***196, 209, 443***
Анышкевіч Януш ***483***
Ардаб'еў Аляксандр ***415***
Арлоў Леанід ***287***
Арлоў Уладзімір ***69, 182***
Арлоўская Нэлі ***168***
Арцюхоў Мікола ***242***
Арэхва Анжаліка ***376, 378***
Асеевіч Юрый ***224***
Асіпенка Уладзімір ***330***
Асіпцоў Алесь ***103***
Астапаў Аляксандр ***102, 138***
Астапчык Л., начальнік ЖРЭУ ў Баранавічах ***118***
Астроўскі Алесь ***238***
Астроўскі Майсей ***343***
Астрэйка Мікалай ***18, 202, 232, 463, 237-238***
Асьвяцінскі Эдвард ***339***
Атаманчук Ларыса ***137***
Атрашкевіч С., начальнік Ашмянскага РАУС, маёр міліцыі ***237***
Афнагель Яўген ***392, 433***
Аўдачонак, кіраўнік прафкаму Віцебскай ветэрынарнай акадэміі ***437***
Аўдзей Франц ***218***
Аўдзейчык Зьміцер ***253-254, 285***
Аўруцін Анатоль ***236***
Аўтуховіч Алена ***89***

Аўтуховіч Каця ***89, 96***
Аўтуховіч Мікалай ***10, 84-85, 87-90, 92-93, 95-97, 99, 163, 263, 304, 308, 313-316, 326-327, 330-331, 464, 489***
Ахрамовіч, супрацоўнік АМАП ГУУС Менгарвыканкаму ***248***

Багдановіч Марына ***46-47, 244-245, 277, 283-284, 398-399, 400***
Багдановіч Марыя ***12, 161, 252-253, 318, 322-323***
Бадзюкова Тацяны ***426***
Базан Уладзімір ***296***
Байкоў Георгі ***248***
Бальшакоў Іван ***400, 403***
Бандажэўская Галіна ***59, 73***
Бандажэўскі Юры ***8, 45, 48, 50, 55-56, 58-59, 61-62, 72-73, 263***
Бандарэнка Зьміцер ***246***
Банцэр Ігар ***139, 142, 359***
Барабась Дар’я ***415***
Баравікова Раіса ***236***
Барадаўкін Аляксандр ***293, 370***
Барадулін Рыгор ***69***
Баранаў Андрэй ***249, 330, 390, 453***
Бародка Зьміцер ***242, 415***
Бародка Уладзіслаў ***249, 422, 430***
Барцэвіч Зінаіда ***253-254, 365***
Баршчэўскі Алесь ***227***
Баршчэўскі Вадзім ***184***
Баршчэўскі Лявон ***409-410***
Барысава Алена ***137-138***
Барысевіч Даніла ***456***
Барысевіч Ларыса ***456,***
Барэль Тацяна ***212***
Басін Якаў ***347, 363, 366***
Баскораў Андрэй ***431***
Бастунец Андрэй ***69***
Батуеў Павел ***429-430***
Баўтовіч Міхась ***220***
Бедка Іван ***250***
Бежанаў Сяргей ***248***
Бекасаў Анатоль ***402***
Беларусава, першы прарэктар Наваполацкага універсітэту ***397***
Беленькі Юрась ***454***
Беражкоў Уладзімір 1***6, 98, 101, 108, 112, 117, 141, 163***
Беразінскі В., старэйшы лейтэнант Барысаўскага РУУС ***422***
Беразюк Сяргей ***380***
Берасьнеў Васіль ***465***
Бізуноў, начальнік Кіраўскага РАУС ***289***
Біліцкі, пракурор ***468***
Бірылаў Аляксандр ***51, 59, 68, 76, 88, 360, 362***
Біткін Сяргей ***352***
Блахін Аляксандр ***400, 402***
Блінкоўскі Аркадзь ***298***
Блэр Тоні ***75***
Богдан Вадзім ***431-432, 435, 438-440***
Богдан Віктар ***78, 80, 86, 89-92, 94, 96, 356, 358***
Богдан Ільля ***414***
Богдан Тамара ***356***
Бокач Андрэй ***399, 401-402***
Болбас Вадзім ***286***
Бондар Марына ***385***
Бондараў Аляксандр ***18, 232***
Бортнік Вячаслаў ***487***
Борыс Анжаліка ***10, 74, 89-90, 94-96, 160, 258, 349, 352-353, 355-359,360, 362-363, 364-371, 372-373, 375-378***
Борыс Віктар ***372***
Браніцкая Эніра ***18, 232-233***
Бранчэль Іван ***40***
Брок Джордж ***51***
Брокараў Эдуард ***163***
Брудзкі Генадзь ***334***
Брыч Мікалай ***123***
Брэжнеў Леанід ***75***
Бугаёў Юры ***248***
Бузюк Уладзімір ***311***
Буйніцкі Дзяні***с 428, 438-439***
***Букас Анатоль 47-48, 67-68, 146-148, 150, 155-156, 169-170, 182-183***
Буланава Лілія ***318***
Булацкі Сяргей ***113***
Булаш Ганна ***120***
Бурак Алег ***368***
Бураў Аляксандр ***143***
Бурд Сямён ***403***
Буры Н., кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёну г. Менску ***176***
Бурыла Арцём ***389***
Бут-Гусаім Леанід ***321***
Бухвостаў Аляксандр ***225-227, 289, 319***
Бухель Барыс ***284, 294, 432***
Буцька Марэк ***350***

Бучэк Анджэй ***355***
Буш Джордж ***42***
Быкаў Васіль ***108, 184, 187-188, 191, 413,424***
Быкаў Генадзь ***317, 324, 327***
Быкоўскі Іван ***248***
Былюк Іна ***252***
Бычко Аляксей ***63, 246, 248-249, 251, 285, 393, 425, 479***
Бычынаў Уладзімір ***406***
Бэлька Марк ***370***
Бэнэт Браян ***73***
Бэш Тэры ***383-384***
Бяда Генадзь ***384***
Бядрыцкі Сяргей ***153***
Бякасаў Анатоль ***401***
Бяляцкі Алесь ***22, 26, 32, 34, 39, 58, 215, 222, 281, 440, 465-466, 473-474, 479, 484, 489***
Бянчук Тамара ***146, 158***
Бяспалы Аляксандр ***250-251***

Вабішчэвіч (Айцец Мікалай) ***339***
Вазьняк Сафі ***428***
Вайтовіч Аляксандр ***409***
Вайцюшкевіч Зьміцер ***69***
Вайцяховіч Наталя ***66***
Валадашчук Віктар ***172, 175***
Валакіда Наталя ***118***
Валевіч Любоў ***127, 133, 418***
Валёніс Антанас ***381***
Валкавец Яўген ***13, 407-408***
Валяк, эксьперт Калінкавіцкага РАУС ***482***
Ван дэр Ліндэн Рэнэ ***38***
Ваніна Тацяна ***289***
Ванькові Валерый ***138***
Вапа Яўген ***103, 348***
Вараб’ёў Васіль ***186***
Вараб’ёў Дзьмітры ***459***
Варанец Міхась ***199-200, 203, 233***
Варанецкі Алег ***76, 80***
Варанко Юры ***102***
Варашкевіч Ігар ***69***
Вартанава Л.***187***
Варшыцкі Раман ***147***
Васілевіч Рыгор ***186***
Васільева Наталя ***55***
Васільеў Аляксандр ***8, 47, 50-51, 54-55, 57-59, 71, 84, 181, 245, 391, 394,475***
Васількоў, амапавец ***285***
Ваўранюк Мікола ***144, 147, 307***
Ваўчанін Аляксандр ***390, 442***
Ваўчок Макар ***432***
Вежнавец Антаніна ***363***
Венцэль Рэгіна ***184-185***
Вераб’ёва Ірына ***400, 403***
Верамейчык Васіль ***406***
Вечар, капітан Ленінскага РУУС Гародні ***360***
Вілем дэ Клерк Фрэдэрык ***483***
Вінаградаў Аляксандр ***407-408, 411-412***
Вінярскі Максім ***245-245, 392, 413, 426***
Вітушка Андрэй ***410***
Вішнеўская Галіна ***312***
Волчак Алег ***38-39, 42-43, 46, 121, 130, 136, 478***
Вольскі Лявон ***69, 190, 428***
вон Вайцзакэр Рыхард ***483***
Воран Мікола 1***96, 253-254, 285, 296***
Восіпаў Сяргей ***389***
Воўчак Міхась ***403***
Высоцкі Сяржук ***242, 399, 401-402***
Вышкевіч Валеры ***232-233***
Вяжэвіч Алег ***397, 400***
Вязоўскі Георгій ***345***
Вялічкін Уладзімір ***489-490***
Вярбовікаў Уладзімір ***112***
Вярсоцкі Сяргей ***98, 101***
Вячорка Вінцук ***52, 199, 207, 224, 234, 286, 401, 409, 450***
Вячорка Франак ***117, 403, 406-407***

Габрыленка Васіль ***396***
Гавін Тадэвуш ***348, 359, 362, 365, 370, 376-377***
Гавэл Вацлаў ***219, 479, 483***
Гагакава Т., галоўны сьпецыяліст упраўленьня ідэалагічнай работы Берасьцейскага аблвыканкаму ***141***
Гайдаш Наталя ***135***
Гайдукевіч Сяргей ***16, 127, 131, 133, 141, 151-153, 157***
Гайчанка Юры ***12, 300***
Галаванаў Віктар ***23, 195, 202, 351, 353***
Галаганюк Сяргей ***62-63***
Галаўня Аляксей ***406***
Галіеў Аляксандр ***222-223***
Галубец Вольга ***13, 407***
Ганцук Зінаіда ***205***

Ганчар Віктар ***21, 38-40, 42-45, 229, 403, 462***
Ганчар Зінаіда ***39-40, 42, 44***
Ганчар Сьвятлана ***65-66***
Ганчароў Яўген ***400***
Ганчарэнка Вячаслаў ***11,334-336, 340-342***
Ганчарэнка Уладзімір ***136***
Гаравой Леанід ***12, 385, 387***
Гарбатоўскі, судзьдзя Першамайскага суда г. Менску ***183***
Гарбачоў Віктар ***309***
Гарбузаў Віталь ***130***
Гарбуноў Зьміцер ***248***
Гарэлік Сьвятаслаў ***151***
Гарэцкі Барыс ***395, 403***
Гатавец Ганна ***289***
Гатоўчыц Анатоль ***147***
Гаўруцікаў Аляксей ***298-299, 314***
Геніюш Ларыса ***191***
Гефтэр Валянцін ***470***
Гехт Аляксандр ***393***
Гігель Алесь ***416, 421-422***
Гілевіч Ніл ***255, 409, 475***
Гладкова Алена ***324***
Глаз Анатоль ***107***
Глазкова Руслана ***431***
Глуксман Андрэ ***483***
Глушакоў Юрась ***242, 245, 252-253, 318-321***
Гнедчык Алег ***401-402***
Гой Мечыслаў ***102, 143***
Голышаў Андрэй ***430***
Гордзіч Аляксандр ***127, 153***
Горны Кастусь ***100, 103***
Гоўша Сяргей ***298***
Гофман Яганэс ***366***
Грабоўская-Дайнэка Вера ***248***
Грабянчук Наталя ***293-294***
Гразнова Людміла ***467***
Грахоўская Вера ***346***
Гроднікаў Васіль ***14, 84-87, 90-91, 94***
Гроднікаў Мікалай ***84***
Громава Максіма ***405***
Грудніцкі Іаан ***335***
Грыб Мечыслаў ***36-37***
Грымалюк Андрэй ***399, 401-402***
Грынько Валерый ***295, 440***
Грыц Сяргей ***189***
Грыцкевіч Валянцін ***227***
Грыцкевіч Генадзь ***180***
Грышкевіч Аксана ***408***
Грэгарыян Вартан ***483***
Грэчыц Ніна ***132***
Губарэвіч Юрась ***289, 292***
Гудзько Іван ***132, 141***
Гузь Ігар ***399, 401-402***
Гулак Алег ***30, 463, 470, 479, 484, 486, 489***
Гулецка Рэгіна ***370***
Гуляка Віталь ***293, 370***
Гурд Сямён ***400***
Гурман Людміла ***141-142***
Гурэвіч Андрэй ***436***
Гутоўскі Віктар ***363***

Дабравольна Эда ***37***
Дабранач Віталь ***418***
Дабрыдзень Іна ***143***
Давідовіч Юры ***10, 459-460, 463***
Давідовіч Ян ***414***
Даманчук А., лейтэнант Калінкавіцкага РАУС ***483***
Дамарацкая Ірына ***148***
Дамасканаў Валеры ***322***
Данільчанка Вадзім ***298***
Дарафееў Аляксандр ***298-299, 440***
Дарашкевіч Юлія ***113, 189***
Дарашэнка Аляксандр ***301***
Дарашэнка Юрась ***12, 329***
Дашкевіч Валянціна ***467***
Дашкевіч Віктар ***252***
Дашкевіч Зьміцер ***245, 363-364, 393, 398-402, 409, 416***
Дварэцкаў Аляксандр ***138***
Дварэцкі Максім ***389-390, 392, 395, 414***
Дворчак Міхал ***369, 379***
Джылані Хіна ***484***
Дземідзенка Уладзімір ***225***
Дзетчык Віталь ***312***
Дзешка Анатоль ***316, 330***
Дзілендорф Яўгенія ***400***
Дзіргінчус Альгімантас ***351***
Дзьмітраніца Віталь ***114***
Дзюба Уладзімір ***69***
Дзядзінкін Міхаіл ***100***
Дзядзюшка Мікіта ***401***
Дзядзюшка Сяржук ***402***
Дзям’яненка Ірына ***387***
Дзянісаў Дзяніс ***424***
Дзяржынскі Фелікс ***446***
Долбік Алег ***300***
Драздоў Віталь ***188***
Дранько-Майсюк Леанід ***69***

Дубавец Алег ***77***
Дубікоўскі Андрэй ***125***
Дубіцкі Дзьмітрый ***245***
Дубовік Сяргей 4***09-410, 412***
Дудзіч І., дырэктар прадпрыемства “Менгарсаюздрук” ***171***
Дулуб Іван ***464***
Духоменка Вадзім ***12, 300***
Дыбленка Алена ***434***
Дынько Андрэй ***167, 175, 181***
Дыско Г., пракурор ***461***
Дэ Голь Шарль ***75***

**Е**лізараў Павел ***400***
Елісееў Павел *373*
Емельяновіч Т., судзьдзя ***237***
Ермакоў, падпалкоўнік, начальнік аддзелу аховы грамадзкага парадку УУС Магілёўскага аблвыканкаму ***247***
Ермаловіч Мікола ***187***
Ерын Леанід ***39***
Есін Руслан ***374***
Есьман Валеры ***97, 248, 463***
Еўсяйчук Аляксандр ***330***

**Ж**алко Дзьмітрый ***361***
Жалнерчык Любові ***399***
Жаляпаў Хрыстафор ***225, 227-228, 231, 239-240, 287***
Жарнасек Ірына ***182***
Жгірава Наталя ***193***
Ждан Дзьмітры ***299***
Жлутка Алег ***489***
Жук Іван ***315***
Жукоўская Галіна ***211-212***
Жулкоўская Тацяна ***132***
Жураўлёў Аляксей ***389***
Жураўлёў Сяргей ***389***
Жываловіч Кірыл ***102***
Жыдко Тацяна ***142***
Жышкевіч Паўла ***132***

**З**абалотны Аляксей ***336***
Завадзкая Вольга ***40, 69***
Завадзкая Сьвятлана ***10, 43, 264, 290, 458-460, 463, 473, 482, 488***
Завадзкі Дзьмітрый ***10, 21, 38, 40, 43-44, 69, 91, 229, 290, 403, 458, 463, 473, 476, 482, 488***
Завадзкі Юры ***43, 264***
Зазетка Аляксандр ***286***
Заіка Леанід ***471***
Зайцава Валянціна ***205***
Зайцаў Андрэй ***440***
Законьнікаў Сяргей ***410***
Закрута Ірына ***141, 132***
Залеская Алена ***101, 105, 115, 204, 253-254, 283***
Залога А., сьледчы Шчучынскай міліцыі ***90***
Залуцкі Дзяніс ***430***
Зарэмбюк Алесь ***13, 405, 441***
Захаранка Алена ***42***
Захаранка Вольга ***42***
Захаранка Ульяна ***40***
Захаранка Юлія ***42***
Захаранка Юрась, прадстаўнік Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) ***446***
Захаранка Юры ***21, 38-44, 121, 229, 253-254, 283, 285, 288, 296, 403, 408, 478***
Захаранкаў Аляксей ***283***
Захарчук Уладзімір ***367***
Звозскаў Барыс ***484***
Зінгер Анатоль ***400***
Зінкевіч, прадстаўнік Мінюсту ***215***
Зісер Юры ***122***
Знайдзінскі Казімер ***89, 142, 354***
Зубель Генрых ***369***
Зубр Зьміцер ***96-97***
Зыкун Пётр ***298, 305, 412, 441, 452, 459***
Зьмітровіч Анатоль ***304-305***
Зэругі Лэйла ***58***
Зязетка Аляксандр ***452***
Зянько Уладзімір ***295***

**І**ванковіч Галіна ***105***
Іванова Галіна ***92-93***
Іванова Людміла ***313***
Іваноў Уладзімір ***225***
Іваноў, палкоўнік, начальнік Віцебскага абласнога аддзелу па аператыўным вышуку ***220***
Іваноўскі Дзьмітрый ***243-244, 301, 303, 310***
Івашка Наталя ***312***
Івашкевіч Віктар ***73***
Ігнатовіч Валеры ***40, 69***
Ігнатчык Аляксандр ***392***
Ільін Мікалай ***390***

Ільіна Алена ***71***
Ільінчык Анатоль ***183-184***
Істомін Юры ***160, 199, 253-254, 283, 285, 293, 296***
Іофе Эмануіл ***376***
Іўкіна Тацяна ***104***

Кіштымаў Андрэй ***12, 386-387***
Кабіла Ганна ***401***
Кабякоў Андрэй ***183, 251, 303***
Кавалёва Ганна ***382, 412***
Кавалёва Тацяна ***150***
Кавалевіч Міхаіл ***170***
Каваленка Аляксандр ***410***
Каваленя Аляксандр ***386***
Кавалеўскі Робэрт ***142, 362***
Кавалец Аляксей ***224***
Кавальчук Галіна ***106***
Кавальчук Мікола ***478***
Кавенка Валянціна ***295***
Кадэт А., старшыні Дзяржынскага райвыканкаму ***174***
Кажэўнікаў Уладзімір ***355***
Казакевіч Раман ***392, 405***
Казакоў Аляксандр ***96-97***
Казачок Віктар ***252-253, 320***
Казека Уладзімір ***183***
Казімірчак Ігар ***397***
Казлоў Алег ***465***
Казлоў Сяргей ***47***
Казлоўскі Алег ***373***
Казлоўскі Аляксей ***118***
Казлоўскі Зьміцер ***413***
Казукевіч С., намесьнік дырэктара Гарадзенскага філіялу РУП "Белпошта" ***172***
Казулін Аляксандр ***125, 210, 221, 450***
Казырэвіч Ларыса ***203***
Калінковіч, намесьнік старшыні Вярхоўнага суда ***57***
Калацэй, супрацоўнік крымінальнага вышуку Маскоўскага раёну Менску ***416***
Калбанаў Віктар ***321***
Калесьнікава Людміла ***179***
Калінаў Аляксандр *341*
Калінін Мікалай ***363-364, 373, 377***
Калінкіна Сьвятлана ***152, 162, 313, 317, 415, 471, 477***
Каліноўскі Кастусь ***337***
Каліта Алесь ***464***
Калмыкоў Яўген ***188***
Калоша Эдвард ***366***
Калоша Яўген ***378***
Каляда Наталя ***194***
Калякін Сяргей ***212, 219, 233, 288***
Калячка Людзьміла ***214, 215***
Камароў Аляксандр ***467***
Каменка Васіль ***308***
Каменскі Марыюш ***350***
Камера Г., маёр міліцыі, старшы інсьпектар Цэнтральнага РУУС г. Менску ***430***
Кампанец, намесьнік пракурора Менскай вобласьці ***156***
Камянкоў Віктар ***327, 490***
Канавальчук Сьцяпан ***343***
Канаплёў Уладзімір ***36***
Канапніцкая Марыя *358*
Кандрашоў Міхась ***408, 422***
Кандэлакі Георгій ***416-421***
Кандэлакі Лалі ***420***
Канеўскі Аляксандр ***153, 191***
Каннах Мікалай ***327***
Капач Алена ***397, 415, 451***
Капчынскі Юры ***443***
Караганаў Сяргей ***470, 481***
Каралёва Сьвятлана ***427***
Каралёў Сяргей ***408, 433***
Каралькова Маша ***375***
Каралькова, судзьдзя ***248***
Каралькоў Віктар ***375***
Каранюхін Павел ***13, 396, 407-408***
Карасак Сватаплук ***479***
Караткевіч Зьміцер ***298-299***
Караткевіч Кацярына ***90, 159***
Караткевіч Уладзімір ***187, 247***
Карачун Аляксандр ***112***
Карманович Міхаіл ***92***
Карнавухаў Пётр ***403***
Карніенка Алесь ***415***
Карніенка Віктар ***198, 203-204, 413, 415, 446***
Кароль Аляксей ***117, 119-120, 123, 129, 151, 163-164***
Кароль Канстанцін ***248***
Карпенка Генадзь ***250-251***
Карпенка Людміла ***44***
Карызна Уладзімір***236***
Карыткін Аляксандр ***333***
Карыткін Сяргей ***461***
Карэтнікаў Юрась ***118***
Касьперская Наталя ***148***
Касьцюковіч Сяргей ***295, 301, 306***
Касьцян Сяргей ***25***
Катамадзэ Грыгол ***419***

Каткоўскі Ігар ***242***
Катляроў Ігар ***187***
Катовіч Сяргей ***132***
Каўка Аляксей ***227***
Каціла Анатоль ***193***
Кацора Уладзімір ***225, 238, 292, 482***
Кацько Раіса ***183***
Кацэвіч Міхал ***116***
Качан Ірына ***300, 445***
Кашэўскі Валеры ***216***
Квасьнеўскі Аляксандр ***363***
Квачадзэ Зураб ***419-420***
Кеўляк Веслаў ***10, 78, 80, 90, 96, 360, 367***
Кіраенкава Тацяна ***210***
Кірылава Валянціна ***184***
Кірылаў Андрэй ***440***
Кірыльчык Дзьмітрый ***91, 94***
Кірычэнка Пятро ***172***
Кісель Валеры ***177***
Кіцун Іван ***184-185***
Кішкурна Антон ***222-223***
Кішкурна Валянціна ***222***
Кішкурна Уладзімір ***222-223***
Класкоўская Вольга ***13, 382, 409-410***
Клепчукоў Валерый ***284***
Клімантовіч Антоні ***336***
Клімаў Андрэй ***8-9, 53, 57-61, 65-67, 73, 82, 109-104, 117, 246, 261-262, 414, 447, 489***
Клімко Кацярына ***405***
Клімковіч Алег ***371***
Клімовіч Станіслаў ***176-177***
Клінтан Біл ***193***
Кліх Богдан ***55, 364, 483***
Князеў Станіслаў ***186***
Кобец Уладзімір ***416-417***
Ковач Ала ***397***
Козел Наталя ***244, 324***
Козік Леанід ***327***
Козыраў Віталь ***390-391***
Кокараў Дзьмітрый ***403***
Коктыш Марына ***130***
Колас Уладзімір ***382, 410***
Колас Якуб ***206***
Колб Аляксандр ***149***
Конава Сьвятлана ***232***
Копыс Андрыяс (псеўданім) ***168***
Корань Вячаслаў ***69***
Корбут Вячаслаў ***236***
Корбут Мікалай ***16, 97-98, 101, 108, 112, 117, 141***
Корхаў Аркадзь ***289***
Костусеў Рыгор ***190, 247, 252, 294***
Коўчур Уладзімір ***64-65, 95***
Коўш Віталь ***224***
Коўш Мікалай ***173-174***
Коўшар А., начальнік упраўленьня Менгарвыканкаму ***134***
Коханаў Мікалай ***28***
Кохаў Аляксандр ***163***
Кочатаў Сяргей ***127***
Кошман Аляксандр ***201***
Краеўскі, пракурор ***78***
Крамнёва Наталя ***322***
Крапіўка Ала ***338, 341-342***
Краскоўская Сьвятлана ***100***
Красоўскі Анатоль ***21, 38, 43-44, 229, 403, 462***
Красоўскі Павел ***13, 242, 394, 404, 407, 410, 412, 434, 438***
Красько Уладзімір ***224***
Краўцоў Алег ***206-207***
Краўцоў Андрэй ***99***
Краўцэвіч Вальдэмар ***358***
Краўцэвіч Зьміцер ***312***
Краўчонак Дзяніс ***248***
Крол Джордж ***47, 167-168***
Крот І., судзьдзя ***53***
Кручкоў Сяргей ***209***
Кручкоўскі Віктар ***138***
Кручкоўскі Тадэвуш ***90, 106, 130, 134-136, 139, 142, 152, 346-347, 349, 354, 356-357, 365-366, 372***
Крывіцкі Леў ***187***
Крывамаз Міхаіл ***299***
Крыніцкі Аляксандр ***352***
Крэнтоўскі Анджэй ***360, 370, 379***
Кудзінаў Мікалай ***334***
Кудласевіч Вольга 1***19, 141***
Кудраўцаў Уладзімір ***108-109***
Кужалева Галіна ***329***
Кузьняцоў Ігар ***194***
Кулак Валянціна ***149***
Кулакоўскі Сяргей ***201***
Кулакоўскі Юрый ***225***
Кулік Валянціна ***347***
Кулік Наталя ***214***
Кулікоў Анатоль ***51***
Кулікоў В., адвакат ***53***
Кулінковіч Аляксандр ***69, 190***
Кулічкоў Аляксандр ***110***
Куляшоў Анатоль ***53, 447***
Купала Янка ***206***
Купер Эн ***180***
Купрыянаў Мікалай ***70, 239***

Кураш В., начальнік упраўленьня культуры Менгарвыканкаму ***188***
Курбіцкі Аляксандр ***415, 418, 421***
Курганскі Юры ***312***
Курса Віталь ***177***
Курсевіч Алесь ***13, 392, 405***
Куртукоў Уладзімір ***251***
Курыловіч В., судзьдзя ***285***
Кусельчук Андрэй ***142, 312***
Кутасаў С., маёр сьпецназу ***147***
Кухарава Сьвятлана ***314***
Кухаронак Сяргей ***46, 52***
Кухарэнка Канстанцін ***452***
Кухцюк Андрэй ***88***
Куцэвіч Алена ***351***
Кучынская Любоў ***437***
Кушкіс Алдзіс ***55***
Кшывіцкі Роберт ***345***

**Л**абадзенка Глеб ***186***
Лабковіч Уладзімір ***24, 31, 209, 211, 214-215, 249, 364, 461***
Лабоўскі Дзьмітрый ***89, 377***
Лабыніч Інга ***248-249***
Лагачоў Андрэй ***151***
Лагуновіч Андрэй ***161***
Лазарэнкаў Валянцін ***290-291, 295, 314, 316***
Лазоўская Вераніка ***13, 245, 444***
Лазоўскі Д., рэктар Наваполацкага універсітэту ***394***
Лапіцкая Сьвятлана ***21, 371-373, 486-487***
Лапіцкі Аляксей ***21, 216-217, 240, 386, 421, 486-487***
Лапіцкі Аляксей ***371-373***
Лапіцкі Юры ***389***
Лапіцкі Янка ***371-373, 386***
Лапіч Казімір *480, 488*
Лапотка Аляксандр ***305, 308***
Лаўруковіч Любоў ***326***
Лаўрыненка Аляксандр ***185***
Лацінскі Сяржук ***428, 438-439***
Леановіч Тацяна ***61, 65-66***
Леванеўскі Валеры ***8, 47-51, 53-57, 64-66, 68-69, 71, 76, 79, 81-85, 88, 91-92, 94, 245, 391, 394,414, 440, 475***
Леванеўскі Уладзімір ***48, 54, 68-69, 79, 84, 91, 431, 440***
Леvановіч Сяргей ***177***
Левін Леанід ***194, 350***
Левінаў Павел ***424***
Лелеш, амапавец ***285***
Лемяноўскі Мікола ***311, 472***
Лепеш Васіль ***427***
Лесуноў Канстанцін ***389-391***
Леўчанкаў Васіль ***331***
Лібер Лілія ***132***
Лібіцкі Філіп ***448***
Ліванаў Андрэй ***62, 69***
Ліпай Алесь ***172***
Ліпень Леанід ***340, 342***
Ліпіньскі Адам ***379***
Ліс Томаш ***134***
Лісічонак Павел ***399***
Лісічонак Сяржук ***391, 400-401, 444***
Ліскоўская Юлія ***416, 452***
Лісоўскі Анджэй ***379***
Літвіна Жана ***100, 114***
Літвіненка Віктар ***442***
Ліхтаровіч Георгі ***410***
Ліцьвін Алена ***315-316***
Ліцьвін Аляксей ***206***
Ліцьвін Анатоль ***195,197***
Логінаў Сяргей ***249***
Лойка Валянціна ***386***
Лось Яўген ***70***
Лугін Дзьмітрый ***458***
Лугоўскі Аляксандр ***392***
Лук’янаў В., пракурор Гарадзенскай абласной пракуратуры ***77***
Луканін Сяргея ***341***
Лукашэвіч Анатоль ***455***
Лукашэнка Аляксандр ***3, 4, 7-10, 12. 22, 24-25, 27-31, 33, 36-38, 41, 47-49, 54, 58-61, 63, 65, 67, 71, 74-79, 91, 98, 103, 109-110, 120, 122, 125, 131, 138, 148, 152-155, 160, 164, 167, 170, 185-186, 189, 192, 221, 225-226, 229, 235, 246, 251, 260, 285, 305, 308, 313-314, 320, 323, 325, 327-328, 330, 333, 347, 351, 354-355, 365, 372, 384, 386, 393-395, 397-398, 402, 406, 409, 420, 427, 445, 447, 452, 454, 470, 473, 481, 483, 485, 488***
Лукін Уладзімір ***470***
Лукіна, прарэктар па выхаваўчай працы Віцебскай ветэрынарнай акадэміі ***437***
Лумая Каха ***417***
Лучнік Юзэф ***161, 368-369, 372, 376, 378***
Люльчаў Алесь ***440***

Лютарэвіч Руслан ***298***
Лябедзька Анатоль ***46-47, 63, 145, 284, 286, 288, 295, 391, 409, 446, 450***
Лявонаў Валянцін ***354***
Лявонаў Васіль ***140, 174***
Лявонаў Юры ***84, 326***
Лянкевіч Дзьмітры ***331***
Лянько Аксана ***118, 143***
Ляўковіч Аляксей ***418, 421***
Ляўковіч Анатоль ***217, 379-380***
Ляшковіч Аляксандр ***387***
Ляшчынскі Дзяніс ***392***

**М**агілін Павел ***146, 422***
Маджара Павел ***95, 414, 430-431, 436, 438***
Мажэйка Павел ***69, 124, 142, 158***
Мазанік Алесь ***429, 436***
Макавецкая Ірына ***99-101***
Макавецкая Маргарыта ***163***
Макаранка Віталь ***247***
Макмілан Лайл ***446, 450***
Максімава Наталя ***13, 407***
Максімонька Мар’ян ***124***
Максімчык Вольга ***304,308***
Макушына Наталя ***124***
Маланяк Ігар **179**
Маласай Андрэй ***424***
Малаткоў Уладзімір ***324***
Малахаў Леанід ***59***
Малашка Уладзімір ***195***
Малая Алена ***206***
Малей Уладзімір ***21, 468, 480, 482, 488***
Малішэўскі, сукамернік Тадэвуша Гавіна ***365***
Малчанаў Аляксандр ***391, 393, 396***
Малышава Юлія ***399***
Мальчык Сяргей ***92, 206, 217, 235, 237, 241, 288***
Малярчук Уладзімір ***165, 174***
Манаеў Алег ***202, 213-215, 235, 239, 347***
Манжос Уладзімір ***307***
Манцэвіч Аляксандр ***165-166***
Мар Аркадзь ***120, 136***
Марачкін Аляксей ***193***
Маркаў Леанід ***329***
Маркевіч Мікола ***124, 128, 135, 142, 145, 161***
Марко Вацлаў ***216***
Маркоўскі Ю. ***195***
Маркушэўскі Зьміцер ***473***
Марозаў Павел ***74, 76, 78-79, 260***
Мартынава Ала ***345***
Мартынаў Сяргей ***154, 159, 476***
Мартыненка Аляксандр ***354***
Марцаў Пётр ***120, 148, 153, 257***
Марцінкевіч Казімеж ***378-379***
Марцінкевіч, амапавец ***459***
Марціновіч Алесь ***236***
Марчанка Тацяна ***99, 299, 307, 312***
Марчанка Юлія ***99-100***
Марчук Георгій ***236***
Марчык Сяржук ***14, 408, 425, 430, 449***
Марыніч Ігар ***56***
Марыніч Міхаіл ***8, 45-46, 50-52, 54-56, 58, 61, 70-73, 76, 80, 82-83, 87, 93, 240, 245, 262, 299, 389, 391-396, 414, 455-456, 458, 463-464, 472, 475***
Марыніч Павел ***56, 58, 70, 455-456, 458***
Марыніч Тацяна ***87, 80, 82, 463***
Маскевіч Сяргей ***106***
Маслоўскі Ігар ***218, 290-291, 295-296***
Маслюкоў Тэльман ***298, 441, 445, 452***
Масюк Алесь ***234***
Матусевіч Алег ***322***
Матуш Юзэф ***143***
Мафлай Аляксандр ***399, 402***
Махлай Анатоль *137*
Маховік Валянціна ***143***
Мацкевіч Валеры ***409-410***
Мацкевіч Сяргей ***217***
Мацуура Коішыра ***51***
Мацьвееў Ігар ***247***
Мацьвейчык Іван ***315***
Мацяс Анжэла ***315***
Мачышак Ёзэф ***71***
Машлай Аляксандр ***401***
Машэраў Пятро ***283-286, 413***
Мезяк Віктар ***298***
Меладзэ Георгі ***417***
Мельнікава Алена ***180***
Мельнікаў Эдуард ***43***
Мельнічак Іван ***312***
Мельнічэнка Мікалай ***199, 203***
Мікадзэ Аціко ***420***
Міклашэвіч Пётр ***48, 51, 135-136, 283, 456***

Мікалаеў А.***52***
Мілінкевіч Аляксандр ***170, 175, 177, 183, 227, 233, 235, 238, 240, 255, 297, 388, 391, 430, 440-441, 452***
Мініч Алег ***75-77, 80, 260***
Мініч Галіна ***76-77, 80***
Мінулін Алег ***248***
Міраповіч Алег ***112***
Мірановіч В., намесьнік начальніка падатковай інсьпекцыі Цэнтральнага раёну г.Менску ***198***
Міркушоў Сяргей ***290, 293-294***
Міронаў Пётр ***130***
Міхайлоўская Раіса ***478***
Міхалок Сяргей ***69, 188***
Міхалькевіч Мікалай ***298***
Міхасёва Валянціна ***254, 298-299***
Міхнюк Зінаіда ***41***
Міхнюк Ірына ***126***
Міцянёў Георгій ***300***
Мора Майра ***61***
Мудрычэнка Алесь *140*
Музычэнка Андрэй ***298***
Мур Майк ***483***
Мураўёў-вешальнік ***337***
Мурашка Аляксей ***421, 423***
Мурашка Сяржук ***13, 399, 404-405, 407-408, 411, 421, 422-423, 487***
Мурашка Яўген ***42***
Муха Уладзімір ***149***
Мялешка Уладзімір ***60, 97***
Мясьніковіч Міхаіл ***381***
Мятліцкі Павел ***248, 406***
Мяцельскі Міхась ***179***

**Н**аварыч Валянціна ***121-122***
Навасельчан Андрэй ***41***
Навасельчан Сьцяпан ***41, 224***
Навасяд Уладзімір ***229***
Навумаў Уладзімір ***38, 51***
Надзея Рэўцкая ***335***
Надтачаеў Валеры ***447***
Найдовіч Ірына ***333***
Напалеон Банапарт ***75***
Нараленкаў Віктар ***455***
Наскова Сьвятлана ***381***
Невар Леанід ***307, 311, 315***
Несьцер Уладзіслаў ***415, 462***
Неўдах Васіль ***381***
Нісьцюк Уладзімір ***195, 221***
Новак Міхаэл ***483***
Новік Анатоль ***11, 292-293, 295***
Новікава Аксана ***443***
Новікаў Андрэй ***111***
Новікаў В., старшы лейтэнант, участковы інсьпектар Сьветлагорскага РУУС ***453***
Новікаў Ігар ***248***
Новікаў Станіслаў ***235, 239***
Носік Надзея ***397***
Нягацін Сяржук ***247, 397-398***
Някляеў Уладзімір ***69, 234***
Няроўны Сяргей ***104, 117***

**О**'Рэйлі Кэвін ***51***

**П**ікараў Аляксандр ***471***
Пабалавец Яўген ***111, 159, 172***
Паганяйла Гары ***21, 40, 251, 470-471, 477, 481, 483, 488-490***
Пагарэлава Жана ***127***
Падабед Юры ***447***
Падалян Уладзімір ***294***
Падгайны Міхаіл ***152, 169, 173, 180***
Падгол Уладзімір ***186***
Падлях Лявон ***357***
Падневіч Аляксей ***248***
Пажэцкі Юзэф ***78, 80, 89-90, 96, 133, 140, 142, 346, 353-354, 356-357***
Пазьняк Алесь ***247***
Пазьняк Вадзім ***64-67, 479***
Пазьняк Зянон ***187, 252, 455***
Пазьнякоў Міхась ***236***
Палажанка Настася ***363***
Паліканіна Валянціна ***236***
Палонскі Ільля ***405***
Палуда Андрэй ***432-433***
Памідораў Аляксандр ***190-191***
Памфілава Эла ***470***
Панамарова Сьвятлана ***332***
Панамароў Сяргей ***329, 332***
Панасенка, судзьдзя ***284***
Панасюк Аляксей ***399, 401-402***
Папін Міхал ***428***
Папкоў Сяргей ***454***
Паплаўны Анатоль ***253, 438***
Паплёўка Ала ***421-423***
Папова Алена ***236***
Парамыгіна Сьвятлана ***155, 163***
Парфяновіч Уладзімір ***68***
Парэмбская Людміла ***315, 330***
Парэмскі Яраслаў ***99-100***

Пермякоў Міхаіл ***401***
Пасканная Алена ***159, 172***
Паслаўскас Ёнас ***61***
Пастаялка Людміла ***322***
Пастухоў Міхаіл ***25, 69, 114, 126***
Патапаў В.***187***
Патупа Аляксандр *323*
Паўлаў Валеры ***481***
Паўлаў Міхаіл ***226, 341-343***
Пачобут Андрэй ***10, 78, 80, 86, 96, 106, 112-113, 115, 129, 135, 139-140, 146, 159-160, 174, 258, 311, 356-357, 366, 369, 373-375, 378-379, 460***
Пачценны, супрацоўнік АМАПу ***249-250***
Пашкевіч Алесь ***192, 203, 206, 227, 234, 236, 240***
Петраковіч Ганна ***284***
Петрушкевіч Дзьмітрый ***39***
Петух Алег ***451***
Петэрсан Окэ ***35, 84, 152, 487***
Пеціна Людміла ***477***
Пікараў Аляксандр ***57, 186, 470***
Піпко С., судзьдзя ***237***
Пісальнік Анджэй ***10, 78, 80, 91-92, 94, 96, 125, 129, 131, 133-134, 137, 139, 142, 146, 152, 160-161, 258, 352, 359-360, 362, 367, 378-379***
Піскуноў Андрэй ***395***
Плешчанка Уладзімір ***156, 159, 180, 241, 293-294, 425***
Пракаповіч Віктар ***313, 317***
Пракопаў Аляксандр ***112***
Пракопаў Іван ***104***
Праляскоўскі Алег ***120***
Пранік, кіраўнік упраўленьня Віцебскага гарвыканкаму ***220***
Пратасавіцкая Наталя ***251***
Пратасевіч Вера ***47, 67, 69, 147***
Прахарэнка Алег ***238***
Прахарэнкаў Ігар ***60***
Процька Тацяна ***21, 465, 470, 490***
Прыймачук Мікалай ***204***
Прышчэпаў, капітан, Чыгуначнага райаддзелу міліцыі г. Гомелю ***413***
Пташкін Уладзімір ***131***
Пургурыдэс Хрыстас ***52***
Пуцін Уладзімір ***8, 75, 398-399***
Пушкін Алесь ***184, 189***
Пшанічная Е., падатковы інсьпектар ***198***
Пырх Сьвятлана ***311***
Пэн Жульен ***167***
Пярвойкіна Ірына ***242***
Пятрова Тэрэза ***143***
Пятровіч Барыс ***107-108, 234***
Пятровіч Карней ***298***
Пятроў Максім ***398, 401***
Пятроў Пётр ***289***
Пятрушын Міхаіл ***227, 236, 339***

**Р**абіцава Ала ***335***
Рабцэвіч, сьпецназавец ***69***
Рабчык Зьміцер ***363***
Равуценка Аляксандр ***448***
Рагалевіч Дзьмітрый ***452***
Рагачоў Аляксандр ***193***
Раговіч М., палкоўнік, начальнік Сьветлагорскага РУУС ***439, 453***
Радзевіч Аляксандр ***310***
Радзівіновіч Вацлаў ***142, 145***
Радзівонаў Павел ***467***
Радзіна Наталя ***449***
Радзькоў Аляксандр ***12, 25-26, 184, 186, 371, 409, 412, 414***
Радковіч Мікалай ***342***
Радс Аляксей ***114***
Радчанка Алена ***341***
Ражкоў Алег ***318***
Разумаў Сяргей ***488***
Разумкоў Андрэй ***408-414***
Райс Кандаліза ***477***
Раманаў Міхаіл ***401***
Раманаў Павел ***399***
Раманішка Віктар ***286***
Рамановіч Сьвятлана ***155, 163***
Раманоўскі Уладзімір ***236-237***
Раманчук Яраслаў ***199, 201***
Раманюк Ірына ***252***
Рамашэўска Агнешка ***142, 177, 179-180, 367***
Расэл Роберт ***79***
Раўбецкая Алена ***111, 113***
Раўценка Аляксандр ***445***
Рашэтнікаў Сяргей ***186***
Робінсан Мэры ***483***
Роман Іван ***139, 142, 156, 324-326, 330, 366, 369, 460-461***
Ротфельд Адам ***358***
Рубінштэйн Леанід ***352***
Ругайны Віталь ***442***
Рудкевіч Тацяна ***21, 490***
Румл Уладзімер ***71***
Русакевіч Уладзімір ***23, 99, 103-104, 114, 121, 136, 154-155, 157***

Русаненка Арцём ***406***
Руселік Валеры ***382***
Руцкі Канстанцін ***307***
Рыбчанка Валеры ***12, 321***
Рыжанкоў Максім ***355***
Рыкаў Сяргей ***441***
Рылка, начальнік Ганцавіцкага вузла электрасувязі ***155***
Рылькоў Рыгор ***333***
Рэвяка Тацяна ***470***
Рэзановіч Любоў ***325***
Рэзвы Вадзім ***401, 403***
Рэзьнікаў Віталь ***401, 403***
Рэлява Аксана ***243***
Рэўцкая Надзея ***342***

**С**аакашвілі Міхаіл ***421***
Сабалеўская, судзьдзя ***312***
Сабіла Эрнэст ***338, 341***
Сабораў Андрэй ***105***
Савельеў Міхаіл ***114-115, 163***
Савіцкі Віктар ***248***
Савіч Сяржук ***13, 404, 407***
Савушкін Сяргей ***106***
Сагановіч Генадзь ***12, 383***
Садам Хусэйн ***70***
Сазон Андрэй ***315***
Сазонаў Віктар ***235, 237***
Сазонаў С., супрацоўнік крымінальнага вышуку ***451***
Сакалоўская, судзьдзя Вярхоўнага суда Беларусі ***205***
Сакалоўскі Рыгор ***236***
Саковіч Аляксандр ***343***
Сакольчык Пётр ***249***
Салана Хавіер ***477***
Салаўёва Ала ***340***
Салаўёў Анатоль ***44***
Салаўёў Зьміцер ***247, 467, 470***
Салаўян Аляксандр ***156, 180, 247, 293-294, 425***
Самасейка Мікалай ***248-249***
Самкоева Кацярына ***298-299***
Самсонава Ірына ***162***
Самцэвіч Алена ***69***
Сапелка Павел ***418, 421, 423, 435***
Саранчукоў Вадзім ***311-312, 366, 455***
Сарнаўская Сьвятлана ***332***
Сарыюш-Вольскі Яцэк ***364***
Сарэла Станіслаў ***388***
Сасім Мікіта ***11, 45-46, 58, 245-246, 425, 460, 462***
Сасакава Ёогэй ***483***
Сасноў Аляксандр ***208, 471***
Саўчанка Зьміцер ***440***
Саўчанка Уладзімір ***89***
Сацук Сяргей ***16, 60, 153***
Севярын Адрыян ***21, 39, 471, 473-474, 476-477, 485, 489***
Севярынец Павел ***8, 57, 59-60, 63-65, 70, 72-74, 81-82, 261-262, 287, 382, 414, 424, 479, 489***
Севярынец Тацяна ***287, 382***
Семак Валянцін ***249***
Семаковіч Мар'ян ***370***
Семенчукова Вольга ***397, 403-404***
Семярыч Міхаіл ***330***
Сень Аляксандр ***334***
Сенько Мікалай ***292***
Серабро Сяржук ***147***
Сербін Руслан ***406***
Сівалобцаў Сяргей ***345***
Сівец Юлія ***382, 393***
Сівохін Віктар ***92-93***
Сівы Алесь ***121, 136***
Сівы Браніслаў ***328***
Сідар Андрэй ***345***
Сідарэнка Ірына ***385***
Сідзельнік Наталя ***106***
Сідорскі Сяргей ***343***
Сіліверст Васіль ***318, 320-321, 331-332***
Сіліч Аляксандр ***132***
Сінкавец Мікалай ***343***
Сіўчык Вячаслаў ***57, 248-250, 445***
Сіўчык Галіна ***445***
Скакун Валерый ***134***
Скарына Францішак ***192, 283-286, 413, 418***
Скіндзер Леанід ***111, 114, 117***
Скобелеў Эдуард ***349***
Скобла Міхась ***191***
Скотнікаў Леанід ***476***
Скрабатун Яўген ***392***
Скрабец Аляксандр ***63, 65, 72, 77, 81-83, 86, 88***
Скрабец Ніна ***71, 83***
Скрабец Сяргей ***8-9, 61-63, 65, 68-69, 70-73, 77, 80, 82-83, 86, 88-89, 95, 243-244, 254, 263, 414, 443, 477, 489***
Скрабутан Яўген ***13, 405, 426, 429***
Слука Алег ***382***
Случак Алег ***39***
Смаль Алег ***79***
Смолікаў Кастусь ***181, 227, 232,***

***298-299***
Смольскі Алесь ***13, 396, 399, 404, 407***
Снарская Іна ***227***
Собалева Наталя ***307***
Сом Лера ***389***
Сорас Джордж ***483***
Сталін Іосіф ***189, 194***
Станкевіч Ігар ***177-178***
Станкевіч Надзея ***85***
Станкевіч Сьвятлана ***143***
Старавойтаў Мікалай ***49***
Старавойтаў Міхаіл ***392-393, 396***
Старыкевіч Аляксандр ***60, 80, 162, 171, 182***
Стасевіч І. начальнік упраўленьня адукацыі Баранавіцкага гарвыканкаму ***119***
Статкевіч Мікола ***8-9, 56, 59, 64-65, 63, 70, 73, 78, 81, 85-87, 88, 94, 195, 217, 251, 254, 261-262, 287, 290-291, 414, 445, 457, 479, 486, 489***
Статкевіч Тацяна ***445***
Сташынскі, начальнік Баранавіцкага РВПС ***173***
Стражаў Васіль ***412***
Стральчэня Ала ***149***
Стук Алена ***424***
Стэфановіч Валянцін ***22, 241-242, 249, 411, 429, 434, 464, 466, 489***
Сувораў Яўген ***393, 408, 422, 431-434, 460***
Судаленка Леанід ***305***
Сузько Вольга ***390-391***
Сукала Валянцін ***37, 283, 377***
Султанаглу Джыхан ***226***
Сульянаў Анатоль ***236***
Сурава Алена ***193***
Сурвілла Івонка ***68***
Сурма, сьледчы Калінкавіцкага РАУС ***482***
Сусла Мікалай ***165, 174***
Сухаверхі Андрэй ***413***
Суханаў, намесьнік дырэктара Магілёўскага аўтазаводу па ідэалогіі ***333***
Сухарэнка Сьцяпан ***173, 446, 451, 489***
Сырыца Віктар ***298-299, 388***
Сыцько Вольга ***389***
Сьвірыд Аляксандр ***22***
Сьвірыд Мікалай ***307***
Сьдзьвіжкоў Аляксандр ***151***
Сьлепчанка Алег ***417, 447***
Сьліжэўскі Алег ***23, 209, 219, 230, 349***
Сьмірноў Яўген ***326, 486***
Сьміт Хайдзі ***315***
Сьмялоўскі Марцін ***116, 144***
Сьмятанін Артур ***253-254, 285, 296***
Сьцяпанаў Віктар ***116***
Сэрдэга Васіль ***399***
Сявец Сяргей ***130***
Сякерка Уладзімір ***225***
Сямашка Алег ***312***
Сямашка Уладзімір ***216***
Сямёнаў Мікалай ***426***
Сямёнаў Сяргей ***394-395, 402, 412- 413***
Сянькевіч А., начальнік упраўленьня юстыцыі Гарадзенскага аблвыканкаму ***220, 234***
Сянько Руслана ***316***
Сярэдзіч Іосіф ***16, 125-126, 132, 141, 151-152, 157, 165, 168-169, 172, 180-181, 256***

Тадароўская Тацяна ***369***
Талайка Пятро ***141, 132***
Талашка Валянціна ***315***
Талерчык Пётр ***421, 423***
Талмачова Людміла ***373***
Танк Максім ***187***
Таняловіч В., супрацоўнік Пінскага ГАУС ***440***
Таптуноў Вадзім ***248***
Тарабуева Тацяна ***428, 439***
Таран, маёр міліцыі Калінкавіцкага РАУС ***482***
Тарас Валянцін ***69***
Тарасаў Кастусь ***356***
Тарасевіч Канстанцін ***346, 357***
Тарасевіч Р., начальнік аддзелу адукацыі Глыбоцкага райвыканкаму ***116***
Таргамадзэ Гіві ***421***
Тарлецкі Эдвард ***105, 228***
Тачыла Уладзімір ***309***
Ткачук Анатоль ***165***
Ткачэнка Кацярына ***130, 145***
Тодрык Інэса ***139, 377-378***
Тозік Анатоль ***136***
Токараў Уладзіслаў ***100, 103***
Толчын Андрэй ***292***

Толкач М., начальнік Глыбоцкага раённага спажывецкага таварыства ***178***
Тоўсьцік Ірына ***13, 392, 405, 450, 462***
Трафімаў Сяргей ***465***
Трахімёнак Сяргей ***236***
Трацьцяк Пятро ***115***
Трацяк Зьміцер ***289***
Трубкін Аляксей ***394, 396-397, 404, 406***
Трубнікаў Мікалай ***344***
Трусаў Алег ***211, 354, 374***
Труцко, намесьнік пракурора Гарадзенскай вобласьці ***374***
Трыфанаў Сяргей ***175***
Тупік Вера ***132***
Тур Андрэй ***305***
Тур Рышард ***364***
Туск Дональд ***359, 363***
Туту Дэсмонд ***483***
Тухліньскі Адам ***116, 144***
Тыбленка, судзьдзя ***389***
Тычына Алег ***302, 319***
Тычына Зінаіда ***319***
Тэцлаў Славамір ***356***

Угрыновіч Павел ***390, 395***
Удавічэнка Анатоль ***151***
Удовін Зьміцер ***487***
Улан Рамуальд ***48, 102***
Уланаў Канстанцін ***315***
Уліціна, судзьдзя ***289***
Урбан Юры ***159***
Урублеўскі, пракурор Ленінскага раёну г. Гародні ***160, 355***
Усаў Павел ***12, 190, 380, 388, 447-448***
Ухналёў Валеры ***283***
Ушакоў Віталь ***470***
Ушко Аляксандр ***415***
Ушко Наталя ***397, 415,418, 421, 462***
Ушэнка Андрэй ***424***

Фабішэўскі Юры ***249***
Фалігоўскі Пшэмыслаў ***448***
Феактыстаў Уладзімір ***12, 329***
Федарцоў Аляксандр **233**
Федзюкевіч А., судзьдзя ***406***
Фешчанка Віктар ***85***
Філановіч Аляксандр ***30***
Філарэт, патрыяршы экзарх Беларусі ***340***
Філіманіхіна Ларыса ***214-215***
Філімонаў Антон ***48-51, 53, 85, 96-97***
Філістовіч Віктар ***341***
Фінькевіч Артур ***13, 242, 245, 393, 416, 363-364, 409***
Фралова Ніна ***132***
Фралоў Валеры ***68, 243-244***
Фурсееў Яўген ***388***
Фэрэра-Вальднэр Бэніта ***149***
Фядак Аляксандр ***315***
Фядута Аляксандр ***183, 201-202, 452***
Фядыніч Генадзь ***328, 331***

Хадатовіч Аляксандр ***96-97***
Хадатовіч В., пракурор ***52***
Хадосаў, начальнік 3-га адзьдзяленьня Чыгуначнага РУУС г. Гомелю ***431***
Хадыка Валянціна ***445***
Хадыка Кастусь ***211***
Хадыка Юры ***445***
Хайкен Эберхард ***46, 62, 118***
Халадовіч Станіслаў ***137, 140***
Халезін Мікалай ***194***
Халіп Ірына ***20, 120, 122, 136, 150, 155, 158***
Хамайда Барыс ***140, 156-157, 180, 241, 247, 290, 293-294***
Хаменка Алег ***69, 190-191***
Ханеня Сяргей ***451***
Хаперскаў Аляксандр ***248***
Харашці Міклаш ***46, 75, 108, 118, 154***
Харытон Аляксандр ***202, 205, 212-214***
Хафізаў Вячаслаў ***139, 296***
Хацкевіч Алесь ***188***
Хацько Анатоль ***235, 237***
Хашчавацкі Юры ***409***
Хітрык Марына ***316***
Хоган Дэрэк ***447, 450***
Ходзька Ігар ***67***
Холапаў, падпалкоўнік Жлобінскага РУУС ***238***
Хома Тацяна ***13, 264, 388, 433, 435-437***
Хоміч Міхаіл ***68, 70, 343***
Храмцоў В., кіраўнік ГА “Усяслаў Чарадзей” ***220***

Хусэйн Садам ***151***
Хэкер Марцін ***88, 454***

Цалка, маёр Чачэрскага РУУС ***288***
Цалуйка Лідзія ***110-111, 117, 165, 171***
Цапф Ута ***50, 466***
Царова Наталя ***180***
Цежына Людміла ***312***
Целіца Лідзія ***233***
Целяпун Уладзімір ***482***
Цеплякоў Арцём ***403***
Цераховіч Вячаслаў ***72, 77***
Цераш Аляксандра ***298-299***
Цераш Іван ***298***
Цімашэвіч Уладзімеж ***348***
Цімашэнка Юлія ***79***
Цімошчанка Васіль ***35***
Цімчанка Аксана ***407***
Цітоў Г., начальнік Берасьцейскага філіялу РУП “Белпошта” ***172***
Ціхан Юры ***396***
Ціхановіч Анатоль ***248***
Цішуцін Сьцяпан ***424***
Цуладзэ Лука ***416, 418-421***
Цупрык Леанід ***185, 220***
Цурбакоў Артур ***98***
Цурпанаў Валадар ***284, 414, 432***
Цыганкоў, прарэктар па ідэалогіі Наваполацкага універсітэту ***397***
Цымбалюк Зьміцер ***470***
Цынкевіч Аляксандр ***46, 49, 51-52***

Чабанаў Юры ***303, 360***
Чабатарова Тацяна ***180***
Чавусаў Юры ***27, 214, 221***
Чаргінец Мікалай ***234, 236, 240***
Чаркасава Вераніка ***14, 43, 48-51, 53, 60, 69-70, 80, 85, 91, 96-97***
Чаркасава Дыяна ***48-51, 60, 70, 85***
Чарнавус Мікалай ***314, 327***
Чарненка Аляксандр ***106, 119, 166***
Чарняк Аляксандр ***173***
Чарткоў Зьміцер ***13, 390, 404, 407-408***
Часноўскі Мечыслаў ***379***
Чобчыц Леанід ***287***
Чумачэнка Уладзімір ***49***
Чучвага, старэйшы лейтэнант міліцыі ***393***
Чучман Яніс ***287, 410***
Чыгір Алесь ***170***
Чыгірынаў Уладзімір ***138***
Чыкалёў Дзяніс ***440***
Чырвоненка Уладзімір ***160***
Чытаеў Васіль ***289***

Шабан Віктар ***76***
Шавель Павал *403*
Шавяленка Васіль ***459***
Шавяленка Міхаіл ***459***
Шаламаў Сьвятаслаў ***200***
Шалаў Ягор ***403***
Шантаровіч Андрэй ***99, 114-116, 149-150, 163, 367***
Шарамет Павел ***313, 317, 415***
Шатурка Ганна ***143***
Шаўчук Аляксей ***292***
Шаўчэнка Валеры ***311, 313***
Шаўчэнка Іван ***408***
Шаханцова Валянціна ***72, 76, 93***
Шаховіч Аляксей ***41***
Шашкоў Пётр ***294***
Шварцэнбэрг Карэл ***483***
Шкрабаў Дзьмітры ***253***
Шкулькоў Дзьмітры ***200, 205***
Шлома Уладзімер ***382***
Шлындзікаў Васіль *299*
Шляхцін Віктар ***424***
Шостак Зьміцер ***406***
Шпакоўскі В., пракурор г. Барысаву ***148***
Шром Чарлі ***427***
Шукава Анжэла ***315***
Шукайла Ларыса ***294***
Шумейка Аляксандра ***254***
Шумчанка Анатоль ***54-56, 58, 245-246, 276, 302, 308, 310, 445***
Шуст В., былы кіраўнік Пінскага гарвыканкаму ***111***
Шутко Валянціна ***148***
Шуцянкоў Мікіта ***405, 413, 462***
Шушкевіч Станіслаў ***219, 289, 391, 488***
Шчакарэвіч Ігар ***13, 408***
Шчарбак Аляксандр ***107***
Шчукін Валеры ***41, 284-285, 424***
Шчурко Аляксандр ***106***
Шчэтнікава Валянціна ***294***
Шчэцька Віктар ***193***
Шыбека Захар ***383***

Шыдлоўская Ганна ***130***
Шыкшнян Пятро ***319***
Шымановіч Кірыл ***13, 401-402, 405, 407***
Шыманскі Зьміцер ***224, 297, 426-427, 453***
Шынкароў Васіль ***187***
Шынкарык Ігар ***210, 288, 445***
Шыцікаў Сяргей ***321***
Шыцікаў Уладзімір ***291***
Шэін Аляксей ***242***
Шэйко Дзяніс ***352***
Шэйман Віктар ***343***
Шэлегаў Сяргей ***239***
Шэўчык Валянцін ***362***

Эйсмант Сяргей ***306***
Эль Гассан бін Талал ***483***
Элькін Барыс ***313, 317***
Эрыксан Стэфан ***88, 94***

Южык Л., дырэктар УП "Віцебскаблсаюздрук" ***171***
Юргель Раман ***253-254, 285, 288, 296, 475***
Юргель С., старшыня Смаргонскага райвыканкаму ***103***
Юруць Андрусь ***449***
Юрэвіч Васіль ***11, 334-337, 339-342***
Юхневіч Павел ***54, 390, 441, 462-463***
Юхновіч Вячаслаў ***134***
Юшчанка Віктар ***442, 389-390***

Яган Фрыц ***86***
Якацук С., судовы выканаўца Гаспадарчага суда Гарадзенскай вобласьці ***228***
Якімовіч Валянціна ***137***
Яноўскі Казімір ***111***
Янукевіч Аляксей ***117***
Янукевіч Уладзімір ***155, 173, 181***
Януковіч Віктар ***467***
Янушкевіч Андрэй ***190, 253-254, 285, 296***
Янушкевіч Іван ***330***
Янцурэвіч, супрацоўнік пракуратуры Ленінскага раёна гораду Гародні ***355***
Ярашук Аляксандр ***27, 30, 324, 328***
Ярашук Віктар ***112, 153, 165, 176, 191***
Ярашэвіч Аліна ***353***
Ярмоленка С., саветнік юстыцыі ***482***
Ясіновіч Леанід ***479***
Яскевіч Ядзьвіга ***187***
Яскевіч Мечыслаў ***367, 369-370, 378***
Яўлінскі Рыгор ***400***
Яўсеенка Алесь ***200, 486***
Яўтушэнка Іван ***238***
Яфіменка Сяргей ***312***
Яшкевіч Мечыслаў ***356-357***
Яшын Ільля ***401***

# Зьмест

Уступ: асноўныя тэндэнцыі і абагульненьні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .3

1. Прававая база і зьмены ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, якія вядуць да абмежаваньня правоў грамадзянаў . . . . . . . . . . . . . . . . . .22

2. Сьмяротнае пакараньне – парушэньне права на жыцьцё . . . . . . . . . . 37

3. Адстойваньне права на праўдзівую інфармацыю пра зьніклых 38

4. Палітычна матываваныя крымінальныя справы . . . . . . . . . . . . . . . . .45

5. Перасьлед незалежных сродкаў масавай інфармацыі і журналістаў, парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду і атрыманьне праўдзівай інфармацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .97

6. Парушэньне права на плюралізм меркаваньняў, цэнзура, увядзеньне дзяржаўнай ідэалогіі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .184

7. Перасьлед і забарона дзейнасьці няўрадавых грамадзкіх арганізацыяў і палітычных партыяў, перасьлед актывістаў НДА і палітычных партыяў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .195

8. Перасьлед арганізатараў і ўдзельнікаў масавых акцыяў пратэсту. Парушэньне правоў грамадзянаў на мірныя сходы . . . . . . . . . . . . . . . .240

9. Перасьлед прафсаюзаў, рабочага руху і прадпрымальнікаў. Парушэньне правоў грамадзянаў на працу і сацыяльную абароненасьць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .299

10. Парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду веравызнаньня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .333

11. Дыскрымінацыя правоў грамадзянаў па прыкметах мовы і нацыянальнай прыналежнасьці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .345

12. Абмежаваньне акадэмічных свабодаў, парушэньне права на адукацыю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .379

13. Перасьлед апазіцыйна настроенай моладзі і моладзевых арганізацыяў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .389

14. Ціск сьпецслужбаў на палітычна і грамадзка актыўных грамадзянаў і іншадумцаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .442

15. Факты жорсткага ці негуманнага абыходжаньня з удзельнікамі масавых акцыяў пратэсту, затрыманымі і зьняволенымі . . . . . . . . . . . .455

16. Праваабарончая дзейнасьць. Ціск на праваабаронцаў і праваабарончыя арганізацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .. . . . . . . . . . . . .465

Паказальнік імёнаў. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .491

**У «Аглядзе-Хронiцы  парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2005 годзе» скарыстаныя фотаздымкі photo.bymedia.net, Юрыя Дзядзінкіна, а таксама інфармацыя інтэрнэт-сайтаў: svaboda.org, baj.ru, charter97.org, belngo.info, belapan.by, zubr-belarus.com, pahonia.promedia.by**